АНАТОЛЬ АСТАПЕНКА

# ...Ѝ где зродилиса ѝ оскормлены сутъ по Бозе...



АНАТОЛЬ АСТАПЕНКА

# ...И ГДЕ ЗРОДИЛИСѦ И ОСКОРМЛЕНЫ СУТЬ ПО БОЗЕ...

## ДОСЛЕД БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛІЗМУ

Санкт-Петербург
"Невский Простор"
2010

УДК 821.161.3-31
ББК 84 (4Беи)-44
Б 30

**Астапенка, А.**
**А 79** Игде зродилися иускормлены суть по Бозе. Дослед беларускага нацыяналізму / Анатоль Астапенка. — Санкт-Петербург: "Невский Простор", 2010. — 734 с.

ISBN 978-5-94716-225-7.

УДК 821.161.3-31
ББК 84 (4Беи)-44

© Астапенка А., 2010
© Васюк У., вокладка, 2010

**ISBN978-5-94716-225-7**

*Памяці бацькоў –*
*Уладзіміра Іосіфавіча*
*і Наталлі Андрэеўны*
*прысвячаецца*

# АД АЎТАРА

У 2000 годзе я меў ласку ад Госпада надрукаваць кнігу "Паслухайце нацыяналіста". Гэта была мая ці не першая спроба шырокага выступлення ў друку. Праўда, гэтую кнігу запабягаў шэраг публікацыяў, якія колькі гадоў змяшчаліся ў газетах "Літаратура і мастацтва", "Наша слова", "Пагоня", "Выбар", часопісе "Маладосць", іншых выданнях.

Выявілася, што маё бачанне нацыянальнай ідэі сугучнае думкам іншых беларусаў, бо я атрымаў шмат добрых водгукаў. Асабліва прыемна ўразіў нечаканы званок ад патрыярха беларускай літаратуры Янкі Брыля, з якім асабістага знаёмства ў мяне не было. Ён даў кнізе станоўчую адзнаку і параіў працягваць даследаванне беларускай нацыянальнай ідэі і нацыяналізму.

Годам раней, у 1999 г., у горадзе Горадна адбылася першая і пакуль што апошняя навукова-практычная канферэнцыя на тэму "Беларуская нацыянальная ідэя" (далей БНІ). Каардынаваў праект будучы кандыдат у прэзідэнты, а тады старшыня Горадзенскага выканкома Сямён Домаш. На канферэнцыі я зрабіў два даклады ў секцыі "Хрысціянства і БНІ". Дыяпазон шуканняў нацыянальнай ідэі беларусаў быў вельмі шырокі. Пазней выйшла ёмістая кніга, зборнік матэрыялаў канферэнцыі, пад назвай "Беларуская нацыянальная ідэя".

Хоць я быў удзельнікам толькі адной секцыі, мне – і тады, і пазней – шмат чаго хацелася сказаць па іншых аспектах БНІ. Мажлівасць выступаць перад аўдыторыяй, якая вывучае беларускую нацыянальную ідэю з пазіцый сучаснай навукі, давалі канфе-

рэнцыі Навукова-асветніцкага цэнтра імя Францішка Скарыны. У 90-я гады XX стагоддзя я рэгулярна выступаў на канферэнцыях Цэнтра, іншых навуковых форумах. Такім парадкам, мае даследаванні беларускага нацыяналізму і блізкіх да яго тэмаў сталі набываць і, здаецца, набылі навуковы характар. У шэрагу дзяржаўных, гэтак званых "рэцэнзаваных", выданняў з'явіліся мае артыкулы[1]. Урэшце, у 2004 годзе ў выдавецтве "Беларускі кнігазбор" выйшла мая манаграфія "Нацыянальная ідэя ў сучасным свеце". Такая нейтральная, і разам з тым глабальная тэма гэтай манаграфіі дазваляла, на думку майго навуковага кансультанта, прайсці бар'еры ВАКаўскае цэнзуры пры абароне доктарскай дысертацыі. Аднак і гэтага было замала для "трыумфальнага ўваходжання ў беларускую палітычную навуку". Замала з іншых важкіх прычынаў, сярод якіх – і нястача адпаведнай спецыяльнасці ў рэестры беларускіх Навуковых Саветаў палітычных навук.

Далей я надумаў не траціць часу на тупіковы шлях "развіцця беларускай дзяржаўнай ідэалогіі" (бо беларуская нацыянальная ідэя – галоўны складнік гэтай "ідэалогіі"), а засяродзіць усю ўвагу на сваім галоўным прадмеце – беларускім нацыяналізме, каб падрыхтаваць кнігу пра нацыянальную ідэю. І ўжо не "ўва ўсім свеце", як у папярэдняй манаграфіі, а кнігу пра існасць нацыянальнай ідэі і аспекты яе праяўлення ў нашым, беларускім, свеце. Каб не залежаць ад рамак навуковых артыкулаў ды кніг, каб мець адначасова шырэйшую чытацкую аўдыторыю – выбраў знаёмы мне жанр – публіцыстыкі, але такой, якая грунтуецца на палітычнай, гістарычнай і філасофскай навуцы.

---

[1] Асаблівасці нацыяналізму ў еўрапейскім кантэксце // Веснік БДУ. Серыя 3. Гісторыя, філасофія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, права. 2000, № 3; Неадназначнасць паняццяў нацыяналізм і фашызм у дыскурсе сучасных ідэалогій // Весці Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. 2003. № 1.

Дазволю тут сабе невялікае адступленне. Мой сябра, выдатны матэматык Слава Ружанскі, неяк надумаўся зрабіць пераварот у навуцы – стварыць тэорыю распазнавання гукаў, каб потым яе практыкаваць пры канструяванні спецыяльных прылад. Скажам, для тых, хто не мае змогі вольна авалодаць гэтымі гукамі, а можа стасавацца з іншымі толькі праз кампутар. Але ў майго сябры быў адзін дзіўны прынцып: не азірацца на зробленае іншымі і ўсё рабіць з нуля. Адным словам, ён рабіў згодна з прынцыпам "адкрыцця ровара". Праз колькі гадоў працы Славу чакала жорсткае расчараванне – цэлыя інстытуты ўжо даўно працавалі над праблемай распазнавання гукаў і ў выніку вынайшлі патрэбныя прыборы. Мала таго, такія прыборы ўжо паступілі ў серыйны выпуск!

Дык я не стаў "адкрываць ровара". Я правёў досыць грунтоўны агляд адпаведнай літаратуры, прааналізаваў яе і тое-сёе выкарыстаў пры фармаванні свайго пагляду на беларускі нацыяналізм.

Адразу скажу пра сваё агульнае ўражанне ад знаёмства з нашай літаратурай на гэтую тэму: яно досыць-такі сумнае, калі не адмоўнае. Тэорыі беларускага нацыяналізму і беларускай нацыянальнай ідэі няма. Агульная тэорыя, дактрына нацыяналізму ў сусветнай навуцы ёсць. Існуе вельмі разгалінаваная дактрына рускага нацыяналізму. Мы маем кнігі і нават падручнікі польскай, украінскай нацыянальнай ідэі. Пра беларускі нацыяналізм сказана вобмаль. А ў тым, што ёсць, часам, апрача гучных назоваў, няма аніякай сур'ёзнай інфармацыі. Паказальная ў гэтым плане кніга Валера Булгакава "Гісторыя беларускага нацыяналізму", дзе гаворыцца пра што хочаш, толькі не пра беларускі нацыяналізм. Шэраг аўтараў (Валянцін Акудовіч, Пётра Рудкоўскі, Алесь Смалянчук, Сяргей Дубавец, інш.), што гуртуюцца вакол часопіса "ARCHE", дзе галоўным рэдактарам той самы Валер Булгакаў, наперабой пішуць і пішуць пра беларусаў ды пра беларускую нацыю. Яны нават увялі для абазначэння свайго гуртка асобны тэрмін –

“Беларуская інтэлектуальная прастора”! Але зноўтакі – як мала там беларускага духу і як далёка гэтыя маладыя, і не зусім маладыя, “інтэлектуалы” ад разумення існасці беларускага нацыяналізму. Больш сур’ёзнымі ўяўляюцца аўтары сталага пакалення, такія, як Уладзімір Конан, Мікола Крукоўскі, Анатоль Грыцкевіч, Эдуард Дубянецкі, Адам Мальдзіс, Янка Трацяк, іншыя. Аднак ні адзін з гэтых навукоўцаў не прысвяціў беларускаму нацыяналізму адмысловай кнігі ці манаграфіі. Зразумела, за савецкім часам такая тэма была пад забаронай, а дваццацігадовы шлях сучаснай беларускай паліталогіі – адносна невялікі тэрмін, каб вылучыць такую тэматыку ў асобны навуковы раздзел, асабліва таму, што да гэтай пары тэрмін “нацыяналізм” часта змешваецца з тэрмінам “фашызм”.

За 90-я гады мінулага стагоддзя і першыя гады XXI ст. траплялiся мне і іншыя аматары напісаць што эпахальнае, на іх пагляд, пра беларускі нацыяналізм – надта ж моднай стала гэтая тэма на постсавецкай прасторы. Але ўсе тыя творы не надта сур’ёзныя, каб прымяркоўваць іх да тэкстаў сапраўдных мысляроў кшталту Энтані Сміта ці Самуэля Хантынгтона.

Вось такая карціна сучаснага поля даследаванняў беларускай нацыянальнай ідэі паўстала перада мной у першую дэкаду XXI стагоддзя. Як кажуць, не густа. І надумаўся я прааналізаваць усе аспекты беларускага нацыяналізму. Як у гістарычным ракурсе, у часе, так і ў прасторы, г. зн. – ува ўсіх яго праявах: у палітычны сферы, у культурнай прасторы, у філасофскім дыскурсе, іншых аспектах. Аднак выявілася, што гэтае заданне не для аднаго чалавека, а для цэлага інстытута. Нават некалькіх спецыялізаваных інстытутаў. Дык я задумаў напісаць кнігу пра беларускі нацыяналізм гэтак. Па-першае, давялося істотна звузіць кола разгляданых праблем. Прыкладам, выкінуў я вельмі цікавы эканамічны раздзел. Да лепшых часоў пакінутыя цікавыя задумкі пра беларускую музыку і тэатр. Па-другое, відаць, наагул нельга

даць поўнай, дасканалай тэорыі ці канцэпцыі беларускага нацыяналізму. І таму ў гэтай кнізе прапанаваныя толькі першыя абрысы, контуры беларускай нацыянальнай ідэі. Гэта пралегамены, уступныя замалёўкі будучай тэорыі беларускага нацыяналізму.

Колькі слоў пра правапіс. Як лёгка заўважыць, я карыстаюся звычайнай афіцыйнай граматыкай беларускай мовы, што ведамая сярод адраджэнцаў пад здзеклівай мянушкай "наркамаўка". У свой час, яшчэ ў 70–80-я гады XX ст., пад уплывам прачытаных употай забароненых кніг беларускіх нацдэмаў, я пісаў свае дзённікі, якія захаваліся да гэтай пары, іншыя паперы – лацінкай. Потым захапленне лацінкай адышло, але затое я пазнаёміўся з тарашкевіцай. Гэта здарылася ў перыяд стварэння БНФ і нацыянальна-дэмакратычнай партыі, што датуецца 1989–1990 гадамі і цягнулася яшчэ колькі гадоў. У гэты перыяд не толькі я, але і ўсе, хто прыйшоў ствараць новую нацыянальна-дэмакратычную Беларусь, карысталіся вылучна тарашкевіцай. Усе дакументы, праграма і статут НДПБ пісаліся гэтым правапісам. Мода захавалася дагэтуль і стала прыкметай пэўнага кола адраджэнцаў, што лічаць сябе "сапраўднымі" беларусамі. Асабіста да мяне прасвятленне прыйшло паступова. Усё вельмі проста: у свой час я вучыўся ў Васілевіцкай беларускай школе, гуляў у цуркі з суседнімі хлапцамі з Дзядка, і паўсюль у нас гучала добрая дыялектная беларуская мова, што, як я потым даведаўся, адносіцца да цэнтральных беларускіх гаворак. Дык вось, барані Божа, каб дзе можна было пачуць у нас "клюб" ці "плян" пры вымаўленні такіх ведамых слоў, як "клуб", "план". Ужываючы ж гэтак званую тарашкевіцу, я нечакана адчуў сябе здраднікам перад сваёй сапраўднай матчынай васілевіцкай мовай. Я вярнуўся да мовы, якая ведамая не толькі як "наркамаўка", – але і як мова Янкі Купалы і Якуба Коласа, мова нашай магутнай літаратуры, мова маіх бацькоў. Ведама, мяккія знакі – гэта мілагучна. І я трохі зайздрошчу тым, хто так піша.

Лічу, што тэрмінова патрэбна рэформа беларускага правапісу і выкарыстанне ўсімі правапісу адзінага. А паралельнае існаванне трох, як мінімум, правапісаў, што назіраецца цяпер, лічу справай ненармальнай.

Адзін ведамы палітычны дзеяч, азнаёміўшыся з першым варыянтам маёй кнігі адзначыў, што ў мяне спалучаюцца розныя стылі – некаторыя раздзелы напісаныя як навуковыя артыкулы, а некаторыя – як эсэ ці мемуарыстыка, і ён параіў зрабіць альбо некалькі кніг, альбо прывесці тэкст да адзінства. Я выбраў другі варыянт і ў некаторай ступені наблізіў навуковыя тэксты да публіцыстычных, зняўшы большасць спасылак і спрасціўшы выкладанне паасобных ідэй. Аднак потым падумаў: а навошта? Калі некаму будзе нецікава ці цяжка чытаць навуковыя тэксты, то іх можна ў першым чытанні прапусціць і выбраць сабе тое, што больш даспадобы.

Таму адразу папярэджу: першы раздзел і большасць пятага – гэта раздзелы амаль цалкам навуковыя, прысвечаныя разгляду такіх паняткаў, як этнас, нацыя, нацыяналізм, а таксама – існасці і ўзаемадзеянню асноўных сусветных ідэалогій, іх носьбітаў – палітычных партыяў. Чытаючы другі, гістарычны раздзел, можа, нехта ўпікне аўтара за лішняе акцэнтаванне асабістай ролі ў палітычных працэсах. Але без гэтых, можна сказаць, мемуарных, замалёвак, цяжка абысціся пры выкладанні некаторых падзей найноўшай гісторыі, бо я быў беспасярэднім удзельнікам тых падзей.

У канцы кнігі дадзены спіс выкарыстанай літаратуры. Артыкулы аўтара да тэмы кнігі вынесены ў асобны спіс.

Аўтар выказвае шчырую падзяку інаку Мікалаю, Анатолю Вярцінскаму, Міколу Крукоўскаму, Лявону Баршчэўскаму, Юрасю Пацюпу, Леаніду Качанку, Міколу Захаранку, Аляксею Марачкіну, Уладзіміру Васюку, Віктару Дудкевічу, Алесю Бокачу, Фёдару Асіпенку.

## PRO ET CONTRA
### МАЛЕНЬКІ ФОРУМ

### I. Contra

*Краткое изложение программы Национально-демократической партии Белоруссии, которое дал ее сопредседатель Астапенко в беседе с корреспондентом "СБ", по нашему мнению, явно свидетельствует о национализме, стремлении к отчуждению белорусов от других народов республики и СНГ. Вакуум в экономике, культуре с иными государствами Содружества обернется гибелью для Белоруссии. Мы бы посоветовали "однопартийцам" Астапенко не мутить воду, а помочь правительству РБ вывести наше государство из кризиса.*

Ветераны труда, рабочие Глушкевич, Ярошевич, Кречковский, г. Минск, 1991 г. (З ліста да аўтара пасля публікацыі ў "Советской Белоруссии" артыкула "Паслухайце "нацыяналіста", 1991 г.)

*Спасать нужно не нацию, а весь белорусский народ, и не от русского языка, а от диктатуры белорусских расистов, которые придя к власти, путём насилия навязывают всем русскоязычным белорусам древний белорусский язык...*

Г. Викторов, г. Калинковичи, 1991 г.

*Не могу не отреагировать на интервью А. В. Астапенко, одного из председателей НДПБ, изложенного в статье "Белорус – это звучит гордо". Это интервью от начала до конца националистическое, оскорбительное для советского белорусского народа.*

Тамсама.

*Вожак радикального крыла белорусских нацдемов Анатолий Астапенко, возвратясь со сборища своих единомышленников из Росси, Украины, Литвы, Эстонии, Польши и Румынии дал интервью...*

*...Согласно биологическим законам, у особей с врождённой злобностью происходит самоотравление организма, и мозги сдвигаются набекрень* (маецца на ўвазе аўтар, – А. А.).

Проф. Иван Кучеров, "Мозги набекрень" ("Мы и время", 1993, № 13).

*Что же предлагает народу его новоиспеченный отец – Анатолий Остапенко? Очевидно, что позиция БНФ для него на сегоняшний день излишне либеральна. Противостоять левым силам он не собирается... Его задача, как он сам поясняет, «остановить деградацию общества политическими средствами»... Далее Анатолий Остапенко обещает, что каждый из нас, благодаря его партии, ощутит свое национальное величие времен Великого княжества Литовского».*

Газета Андрея Климова "Новая национальная идея в исполнении мэтров из «Народной газеты»" (Рэакцыя на інтэрв'ю з нагоды рэгістрацыі ў 1994 г. БНП.)

*Аўтар артыкула* – (гаворка ідзе пра мой артыкул аб мове царквы, які ў 1998 г. быў надрукаваны ў газеце "Наша слова") – *не бачыць ці не хоча бачыць, што за магутнай праслаўленай ім царкоўна-славянскай мовай стаіць, і трымае яе на павадку, яшчэ магутнейшая русіфікацыйная імперыялістычная палітыка Масквы.*

Раіса Жук-Грышкевіч, Канада, "Дзеля чаго Астапенка хваліць царкоўна-славянскую мову?" ("Наша слова", 1998, 30 верасня).

*Да, есть у нас определенный контингент граждан, где-то около 7% населения р-ки, резко отличающихся по мировоззрению и культурно-языковой ориентации от остальных 90% граждан. К помянутому контингенту принадлежит и Анатоль Астапенка... Он случайно забрел в православие – а оно на Белой Руси 1000 лет было русским, как на земле всея Руси. Ему надо в униятство. Там те же*

*самые каноны, те самые обряды. Только все на его мове...*

Муза Тарасевіч, г. Віцебск. 1998 г. (З ліста).

*Автор пытается обосновать собственную теорию национализма и его связи с национальной идеей, причем эта теория противоречит общепринятым представлениям науки и общества об этих понятиях.*

І. Л. Коган, 2002 г. (З адмоўнага водгука на маю манаграфію «Нацыянальная ідэя ў сучасным свеце»)

## II. Pro, або Не ўсё так дрэнна

*У самыя змрочныя часы ў нашага народа не знікла вера ў сваё духоўнае адраджэнне, у сваю будучыню. У яго асяроддзі заўсёды знаходзіліся людзі, якія былі яго сцяганосцамі і якія ўскладалі на сябе найбольшы цяжар барацьбы за лепшую долю Радзімы. У шэрагу гэтых людзей і аўтар гэтай кнігі – навуковец, кандыдат фізіка-матэматычных навук Анатоль Астапенка.*

Мікола Ермаловіч (З прадмовы да кнігі “Паслухайце нацыяналіста”, 1999 г.)

*З цікавасцю прачытаў кнігу Анатоля Астапенкі “Паслухайце нацыяналіста”. Цікавасць гэтая і чытацкая пашана да аўтарскага тэксту абумоўлена шчырасцю аўтарскіх перакананняў нацыянальнага і рэлігійнага характару, якія ён умее персанальна адстойваць.*

Янка Брыль, 14 лістапада 2001 г.

*Кніга Анатоля Астапенкі “Паслухайце нацыяналіста” напісана чалавекам, які любіць Беларусь і, у ліку нешматлікіх пакуль інтэлектуалаў-палітыкаў, шукае шляхі выхаду з таго шматвяковага прыніжэння і летаргічнага забыцця, у якім знаходзілася беларуская нацыянальная ідэя.*

Вольга Іпатава, 2001 г.

*Мы пераможам!*

Паэт Славамір Адамовіч, 15 лістапада 2001 г.
(З кнігі водгукаў на кнігу "Паслухайце нацыяналіста")

*Кніга А. Астапенкі "Игде зродилися иускормлены суть по Бозе" вельмі карысная, бо яна з'яўляецца і адной з першых распрацовак нашай найнавейшай гісторыі. Асабліва тыя з яе падзей, якія ва ўсіх у нас на памяці, але сэнс якіх не ўсім яшчэ ясны і зразумелы. Безумоўна пазітыўную ацэнку павінна атрымаць і агульная канцэпцыя аўтара адносна таго, што менавіта нацыянальная ідэя павінна ляжаць у аснове ўсёй сістэмы сацыяльных ідэалаў беларускага грамадства як самы глыбінны ідэйны падмурак духоўнага жыцця беларускага народа, асабліва на сучасным этапе яго гістарычнага развіцця.*

*Выклікаюць вялікі інтарэс у чытача і цікавыя спробы аўтара стасаваць да фактычнага матэрыялу прыёмы чыста лагічнага аналізу з ужываннем схем-каардынатаў і дыяграм, як, напрыклад, пры разглядзе сістэмы палітычных партый на Беларусі. Тут аўтару несумненна добра дапамагае і яго першапачатковая адукацыя прафесіянальнага фізіка, дазваляючы яму з лёгкасцю разбірацца ў тым, што для лірыка-гуманітарніка часам аказваецца ўвогуле, як кажуць, не па зубах.*

Мікола Крукоўскі, доктар філасофскіх і кандыдат філалагічных навук, прафесар, 2008 г.

# УВОДЗІНЫ

...як уваскрасіць Беларусь?
сумовіцца па-беларуску...
...як уваскрасіць чалавецтва?
Б о г а ч а л а в е к а –
пусціць у сэрцы...
*Зніч*

Нацыя, нацыяналізм, нацыянальная ідэя... Пэўна што не знайсці чалавека, абыякавага да гэтых слоў. І мне за ўсё жыццё не раз даводзілася ўступаць у спрэчкі вакол нацыянальных праблем, наконт лёсу нашай гаротнай беларускай мовы і беларусаў наагул.

Адно з першых маіх адкрыццяў сягае студэнцкіх гадоў. Тады я вучыўся на 5-м курсе фізічнага факультэта БДУ, быў на вяршыні творчых шуканняў у навуцы – у тэарэтычнай фізіцы, збіраўся ў аспірантуру. Нішто, здавалася б, не магло змяніць майго жыццёвага выбару.

Але адзін выпадак нечакана перамяніў мяне. Дакладней, спачатку нічога асаблівага не адбылося, прынамсі, я гэтага не заўважыў. Перамены адчуў ці, можна сказаць, усведаміў, значна пазней. А было гэта так. У нашым інтэрнаце, што на Кастрычніцкай вуліцы, пасяліліся студэнткі-практыканткі з Польшчы, з Беластоцкага універсітэта – там яны вывучалі беларускую філалогію. Дзяўчаты як дзяўчаты і, можа, у мяне ад таго знаёмства нічога значнага і не засталося б, каб не адна акалічнасць – гэтыя студэнткі гаварылі вылучна на беларускай мове! Мне, выхадцу з сельскай мясцовасці, дзе ўсе таксама гаварылі, хай сабе і не на літаратурнай мове, але на добрым усходне-палескім дыялекце, было справай гонару адказваць тым дзяўчатам таксама па-беларуску. Аднак жа, да майго вялікага сораму, беларускай размовы я не падтрымаў. Выйшла вельмі нацягнута, мова была перасыпаная русізмамі – поўны правал...

І нечакана паўстала пытанне: чаму я, беларус, так

дрэнна гавару на сваёй роднай мове? І не толькі я. Фактычна – усе насельнікі таго самага інтэрната на Кастрычніцкай. Больш за тое, чаму не чуваць мовы тытульнай нацыі на вуліцах горада?

Відаць, менавіта тады ўва мне і стаў нараджацца нацыяналіст. Імкненне выправіць сітуацыю з мовай, потым – сітуацыю з нулявымі ведамі з гісторыі Беларусі, потым... потым яшчэ шмат з чым беларускім і прывяло мяне да таго, што маю. Да напісання гэтых радкоў.

Адкрыццё Беларусі – гэта адкрыццё, прыраўнальнае да адкрыцця Атлантыды. У мяне асабіста захапленне Беларуссю, яе гісторыяй, культурай заняло такое самае месца, якое мела захапленне матэматыкай у 10-м класе, тэорыяй адноснасці Эйнштэйна ў студэнцкія гады.

Гэтае захапленне можна прыраўнаць да шчырага кахання, якое здараецца раз і назаўсёды.

Дык што ж такое Беларусь? У чым сіла беларускай нацыянальнай ідэі, калі яна можа перавярнуць жыццё?

Для мяне гэтыя пытанні стаяць даўно. Праз дзесяцігоддзі маё жыццё непарыўна звязана з усім колам праблем беларускай ідэі. Напісана мноства артыкулаў і выдадзена тры кнігі з гэтай тэматыкі. Напісана нават доктарская дысертацыя пра нацыянальную ідэю... І вось, як вынік шуканняў – гэтая новая кніга пра беларускую нацыянальную ідэю, беларускі нацыяналізм і наагул пра нас, беларусаў.

...У 1999 годзе меўся адбыцца чарговы Кангрэс дэмакратычных сілаў. У той час я займаў пасаду старшыні Беларускай нацыянальнай партыі, якая вось-вось мусіла быць закрытая Мін'юстам. На Кангрэсе мне як лідэру дзейснай палітычнай партыі і сябру аргкамітэта па правядзенні Кангрэса (дарэчы, старшынём аргкамітэта быў знакаміты генерал Юры Захаранка) вылучылі 10 хвілін на выступ.

Я даволі доўга думаў тады, як сфармуляваць у некалькіх словах існасць нацыянальнай ідэі. І прый-

шоў да вельмі простай формулы: ***Нацыянальная ідэя – гэта праект рэалізацыі нацыі.*** Выступ меў поспех, а гэтая фармулёўка потым стала галоўным аксіялагічным прынцыпам маёй манаграфіі "Нацыянальная ідэя ў сучасным свеце".

Праз многія гады праблема нацыяналізму і нацыі займала мяне ўсур'ёз. Дык невыпадкова, што ў праграме Беларускай нацыянальнай партыі, над якой мне давялося працаваць, упершыню ў паліталагічным сэнсе з'явілася азначэнне нацыяналізму ў станоўчым ракурсе. Разам з тым, як вядома, у нашай краіне, Беларусі, гэтае слова трывала мае адмоўны сэнс, нават у асяроддзі дэмакратаў. Прыкладам, на Кангрэсе дэмсіл 2006 года ў выступе генерала Фралова гучала досыць рэзкая крытыка нацыяналізму. Дарма што за апошні час з'явіўся шэраг твораў – і маіх, і іншых аўтараў (У. Роўды, У. Конана, М. Крукоўскага), дзе даецца новае, сучаснае разуменне нацыяналізму і звязаных з ім паняткаў, сцвярджаецца станоўчае, не звязанае з камуністычнай традыцыяй бачанне ўсяго нацыянальнага.

Але на посткамуністычнай прасторы рэспублік былога Савецкага Саюза да гэтай пары не з'явілася грунтоўных твораў пра такія з'явы, як нацыяналізм і нацыя. Не існуе адпаведных раздзелаў у філасофскай і паліталагічнай навуках. Складваецца ўраджанне, што пасля адыходу з жыцця вядомых рускіх рэлігійных філосафаў канца XIX – першай паловы XX ст. (І. Ільіна, М. Бярдзяева, У. Салаўёва, К. Лявонцьева, іншых), знікла і праблема. Ці зніклі нацыі, ператварыўшыся ў адзіную інтэрнацыянальную сукупнасць людзей?

Але ж заходняя навука на працягу XX ст. ў гэтым кірунку імкліва развівалася. І развіццё гэтае сведчыць пра адваротнае. Нацыі ёсць, яны фармуюцца, мацнеюць, змяняюцца... І навука пра нацыі ды нацыяналізм ёсць. І напісаны шэраг (тысячы!) тэарэтычных твораў на гэтую тэму. Існуюць цэлыя школы, выдадзена шмат кніг. І – што галоўнае – у гэтых творах ёсць патрэба, бо праблема нацыянальных да-

чыненняў стала ў наш час ці не найважнейшай. Менавіта яна вызначае шляхі людства на сучасным этапе. Я б сказаў, што праблема нацыяў і нацыяналізму, якая развязваецца на сумежжы многіх навук і вымагае розных метадалагічных падыходаў, выйшла на праблему нумар адзін. Яна чынна ўплывае на палітыку ўсіх краін свету і вызначае наш лёс у XXI стагоддзі. Таму зразумела, што найлепшыя творы чалавечай думкі мінулага стагоддзя прысвечаны менавіта гэтым праблемам. Досыць успомніць творы Энтані Сміта, Освальда Шпенглера, Льва Гумілёва, Самуэля Хантынгтона, Ганса Кона, Эрыка Хобсбаума, Бенедыкта Андэрсена і многіх іншых. У існасці, модная з'ява пад назвай "глабалізм" – гэта тая самая праблема нацыяналізму, толькі "наадварот" – яго адмаўлення ці ігнаравання, што ў кожным разе вымагае ўвагі да яго і дэталёвага вывучэння.

Пасля развалу Савецкага Саюза па ўсёй прасторы былой камуністычнай імперыі пачаўся бум нацыянальнага адраджэння. У звязку з гэтым загаварылі пра новыя, альбо "забытыя старыя" паняткі, з якімі лучылася азначэнне "нацыянальны". А найперш загаварылі пра нацыянальную ідэю. Адбываліся шматлікія навуковыя і практычныя канферэнцыі на гэтую тэму – як на дзяржаўным роўні, так і недзяржаўным. Найгрунтоўнейшай, як мне падаецца, была канферэнцыя ў Горадне, што праходзіла 18–19 красавіка 1999 года, якая так і называлася: "Беларуская нацыянальная ідэя".

Праўда, за ўвесь перыяд дэмакратызацыі ў грамадска-палітычным, дый у навуковым, жыцці назіралася і дагэтуль назіраецца сарамлівае замоўчванне панятку "нацыяналізм" альбо, яшчэ горш, – выстаўленне яго ў адмоўным свеце. Аднак ёсць з'ява, ведамая на постсавецкай прасторы як "нацыянальная ідэя". А ў заходняй навуцы для абазначэння ідэнтычнага панятка ўжываецца, з тымі ці іншымі адценнямі, слова "нацыяналізм". Прынамсі, мне не траплялся творы заходнееўрапейскія ці амерыканскія, дзе б ішлося пра

нацыянальную ідэю. Толькі пра нацыяналізм. Дык вось, напісаўшы ў 2002 годзе кнігу, фактычна, пра нацыяналізм, я, следам за “пасавецкай” традыцыяй, назваў яе “Нацыянальная ідэя ў сучасным свеце”.

Цяпер, думаю, застаўся апошні крок да высновы: **“нацыянальная ідэя” і “нацыяналізм” – гэта сінонімы.** І там (на Усходзе), дзе выкарыстоўваюць першы тэрмін, і там (на Захадзе), дзе карыстаюцца толькі другім тэрмінам, гаворка ідзе пра тое самае кола пытанняў. Па-мойму, тэрмін “нацыяналізм” карэктнейшы, бо як інакш назваць навуку аб нацыі? Нацыянальнай ідэяй? Ідэя ёсць ідэя. Гэта толькі намер здзейсніць нешта, але ніяк не навука. А той сэнс, які пачалі ў нас укладаць у панятак “нацыянальная ідэя”, ляжыць зусім не ў плашчыні функцыянавання слова “ідэя”. Належным падставовым паняткам – у чым я цяпер цалкам перакананы – можа быць толькі слова “нацыяналізм”.

Заўжды так выходзіць, што ўсе бліскучыя адкрыцці нехта робіць да нас. І таму, вынайдзены мной тэзіс аб тоеснасці паняццяў “нацыянальная ідэя” і “нацыяналізм”, як выявілася, быў адкрыты задоўга да мяне. Гэты факт зусім нядаўна, на маю радасць (ці зайздрасць?), я ўсвядоміў чытаючы артыкул В. Гадлеўскага “Патрэба нацыянальнай ідэі”, напісаны яшчэ ў 1939 годзе, дзе ёсць фраза: “Мы адзначылі вялікую сілу нацыянальнай ідэі, або г. зв. нацыяналізму”.

Сказанага, я думаю, досыць, каб зразумець, чаму ў гэтай кнізе я не буду рабіць адрозненняў паміж нацыянальнай ідэяй і нацыяналізмам. Хоць у розных кантэкстах, звязаных і з гісторыяй напісання пэўных тэкстаў, і проста з станам падсвядомасці ў пэўны момант, я буду выкарыстоўваць і тэрмін “нацыянальная ідэя”, і тэрмін “нацыяналізм”. Але іх заўсёды без сумневу можна будзе памяняць, сэнс не зменіцца.

Гэты крок у бок тэрміналагічнага ўнармавання не такі ўжо і малы. Нават значны. Ён, фактычна, ёсць мостам між заходняй навукай і ўсходняй. Перакладнікам артыкулаў “савецкай папуляцыі”, якія напіса-

ныя ў Еўропе ці ў Амерыцы, можна смела замяняць ненавісны “нацыяналізм” на “нацыянальную ідэю”. Сэнс усё роўна не зменіцца – затое цэнзура можа “спаць спакойна”. І, наадварот, калі мы выйдзем на сусветны ровень, а не будзем туляцца ў акопах апазіцыйнай ці афіцыйнай “вакаўскай” навукі – мы можам памяняць нашу “нацыянальную ідэю” на агульнавядомы “нацыяналізм”.

Важнай рысай усякага даследавання і, зразумела, даследавання на ўзятую тэму – ёсць стаўленне да метадалогіі. Метадалогіі навукі, скажам скарочана, навукі аб нацыі, якая ляжыць на стыку цэлага шэрагу навук: паліталогіі, этналогіі, філасофіі, сацыялогіі ды геапалітыкі, у закончаным, нават у адзіным, акрэсленым выглядзе – проста не існуе. Але ёсць шэраг падыходаў – ад сістэмнага ці гістарычнага аналізу – да фармалізаваных навуковых структур накшталт сацыядынамікі Вайдліха, пабудаванай на перадавых пазіцыях сучаснай матэматыкі, якія мне б хацелася выкарыстоўваць. Аднак цвёрда заяўляю: я буду імкнуцца да максімальна зразумелай мовы і ў гэтым буду ісці следам за фізікам-тэарэтыкам Стывенам Хокінгам, які паказаў, што цалкам мажліва выкладанне ў кнізе тэорыі часу і прасторы без адзінай формулы.

Напісаць сапраўдную кнігу пра беларускі нацыяналізм ***можа толькі беларускі нацыяналіст.*** І таму ні польскі даследнік Радзік, ні нямецкі Зам у поўнай ступені не змогуць адлюстраваць існасці праблемы, хоць бы таму ўжо, што ім ніколі напоўніцу не зразумець існасці беларускай душы. Для гэтага трэба нарадзіцца беларусам. І таму крыўдна ў досыць небагатым полі твораў беларускай нацыянальнай тэматыкі бачыць у якасці базавых тэксты, напісаныя не ў Беларусі і не беларусамі.

*У кожнай сучаснай дзяржаве* ***кожны нармальны грамадзянін ад пачатку нацыяналіст.*** *Быць нацыяналістам – гэта нармальны стан чалавека. Чалавека без свайго нацыянальнага пачатку на Зямлі*

*проста не існуе. Кожны нараджаецца альбо эстонцам, альбо рускім, альбо кітайцам... Я нарадзіўся беларусам. І змяніць гэтага я не дам рады. Але калі гэта так, калі Госпад даў мне жыццё ў гэтай нацыі, тады значыць так трэба, і ў гэтым маім* ***нацыянальным існаванні і ёсць Найвышні сэнс.*** *І калі я ўсвядоміў свой кон і магу нешта зрабіць для свае нацыі, то я мушу ісці гэтым нялёгкім шляхам. А быць беларусам даўнімае існаванне беларускамоўным асяродку, веданне гісторыі свайго народу, традыцыяў, багатай народнай спадчыны.*

***Беларускасць – абліччa беларуса.*** Дыскурс беларускасці – наяўнасць беларускай мовы, нацыянальная сведамасць і любасць да Бацькаўшчыны. Але калі беларускасці няма, калі яе заступае "рюскасць" і мат – а гэта нармальны стан сучаснага беларускага грамадства – то ўсякі вынятак з гэтай "нармальнасці", тыя адзінкавыя носьбіты беларускасці набываюць асаблівы статус. ***Для такіх людзей беларускасць становіцца прафесіяй.*** Прафесія – "беларус" – парадаксальнае спалучэнне слоў. Але гэтая прафесія ў наш час пільна патрэбная. Толькі прафесіяналы беларускасці могуць адбараніць, адбудаваць і завяршыць так зацягнутае канструяванне беларускае нацыі.

Наступны крок у будаванні кнігі аб Беларусі – скіраванасць беларускага нацыяналізму. Трэба вызначыцца: на каго мы павінны глядзець, з каго браць прыклад, у каго вучыцца. Можа, будзем вучыцца ў суседзяў з Усходу, у расейцаў, ці ў тых, хто даўно ведае, што такое нацыяналізм, французаў якіх? На гэты конт я цвёрда перакананы: беларуская нацыянальная ідэя, ці беларускі нацыяналізм, мусяць канструявацца без заляцанняў "направа" ці "налева", г. зн. без "усходняга" і "заходняга" вектароў. Толькі на гэтай зямельцы, з гэтымі, "тутэйшымі", людзьмі я магу ўсведаміць сябе беларусам і сфармуляваць сваю Ідэю – Беларускую Нацыянальную Ідэю. Тут варта спамянуць радкі Ларысы Геніюш:

*Нам не страшны сібірскі больш холад,*
*Нам не страшны маскаль альбо лях.*
*Чужы серп не патрэбен, ні молат –*
*Мы разгорнем крывіцкі наш сцяг!*

Вось існасць беларускай нацыянальнай ідэі!

Яна не сумяшчаецца з ідэалогіяй "старэйшага брата", не мае нічога супольнага з рыторыкай "славянскага адзінства". Што да апошняга, дык, можа, дзе ў філалагічна-моўнай праблематыцы і мае сэнс гаварыць пра адзіны корань славянскіх моў, але ні ў якім разе не нацый! Нацыі могуць быць вельмі адрознымі і нават варожымі, дарма што мовы ў іх блізкія.

Перш чым сфармуляваць сваё крэда і метадалогію, якой буду кіравацца, мушу сказаць колькі слоў пра сваіх папярэднікаў і тых, хто цяпер побач са мной імкнецца выказацца пра нашу Ідэю.

Першае: мне вельмі хочацца адзначыць тых з нашых продкаў, хто праз стагоддзі сведчыў пра існаванне такога этнасу як беларусы, хто ўпершыню ўбачыў у беларусах нацыю, ці хто паслядоўна, адзін за другім, рабілі крокі да фармавання такой нацыі, а значыць, і беларускага нацыяналізму.

Гэта постаці мінулага:

*Рагвалод – Рагнеда – Усяслаў Чарадзей – Ефрасіння Полацкая.*

*Міндоўг – Віцень – Гедымін – Альгерд – Вітаўт.*

*Мікола Гусоўскі – Францішак Скарына – Сымон Будны – Васіль Цяпінскі.*

*Афанасі Філіповіч – Радзівілы – Сапегі – Канстанцін, Фёдар і Васіль Астрожскія.*

*Дунін-Марцінкевіч – Кастусь Каліноўскі – Францішак Багушэвіч.*

*Янка Купала – Якуб Колас – Максім Багдановіч.*

*Вацлаў Ластоўскі – Доўнар-Запольскі – Вацлаў Іваноўскі – Браніслаў Тарашкевіч.*

*Іван і Антон Луцкевічы – Алесь Гарун – Цішка Гартны.*

*Адам Станкевіч – Ян Пазняк – Вінцэнт Гадлеўскі – Ігнат Канчэўскі.*

*Кузьма Чорны – Ларыса Геніюш – Наталля Арсеннева – Іван Мележ – Уладзімір Караткевіч – Янка Брыль – Міхась Стральцоў – Васіль Быкаў – Ніл Гілевіч – Рыгор Барадулін.*

*Лявон Баразна – Мікола Равенскі – Забэйда-Суміцкі – Аляксей Марачкін – Алесь Шатэрнік.*

*Уладзімір Конан – Мікалай Крукоўскі – Міхась Ткачоў – Зянон Пазняк.*

Зразумела, гэта толькі павярхоўны і няпоўны спіс.

Але я ні ў якім разе не залічу да творцаў ці паслядоўнікаў Беларускай нацыянальнай ідэі (БНІ) "новых беларусаў" навукова-літаратурнага абшару сучаснай Беларусі, творцаў гэтак званай "Беларускай інтэлектуальнай прасторы (БІП)", якія маюць сваю падкантрольную прэсу накшталт часопіса "ARCHE" і газеты "Наша Ніва" – не блытаць з славутай аднайменнай газетай пачатку XX стагоддзя. Пра дзейнасць ідэолагаў БІП – "філёзафаў" Валянціна Акудовіча, Валера Булгакава, Пётры Рудкоўскага і іншых гаворка асобная, а зараз я адзначу толькі тое, што фактычна іх дзейнасць чыніць вялікую шкоду нацыянальнаму беларускаму руху. Яны "пасуцца" на нашай ніве і, могучы фінансава трымаць у сваіх руках СМІ, маючы нават установу ўласнае адукацыі – "Беларускі калегіум", ёсць крыніцай антыбеларушчыны і заганнага пагляду на многія рэчы ў беларускай прасторы, на гістарычнай, літаратурнай, філасофскай і культуралагічнай дзяльніцах.

Цяпер што да ***крэда.*** Я падтрымліваю тых людзей, якія лічаць, што ***сіла ў праўдзе.*** А праўда – ***у сумленні. Сумленне і адкрытасць*** будзе маім галоўным метадам пры даследаванні беларускага нацыяналізму.

І вось цяпер я гатовы сфармуляваць выходныя пастулаты кнігі пра Беларусь.

1. ***Гэтая кніга не для дэмакратаў.*** Дэмакратыя не найлепшы сябра нацыяналізму. Іншы раз гэта нават спосаб знішчыць нацыянальную ідэю. Такім парадкам мой **першы пастулат:**

***Дэмакратыя і нацыянальная ідэя несумяшчальныя.*** Там, дзе пачынаецца дэмагогія дэмакратаў – там заўсёды страчваецца нацыянальная ідэя. Яскравым прыкладам можа быць эвалюцыя нашай апазіцыі. Чым больш праектаў яна рэалізоўвала пад ўважлівым вокам амерыканскай дэмакратыі, тым менш гучала ў іх асяроддзі беларуская мова. І найсвяцейшае для Беларусі ў цяперашні час – нацыянальная беларуская ідэя – стала зусім занядбанай. *Культ цяльца атрымаў буйную перамогу.*

Трэба, аднак, шчыра прызнацца: аўтар гэтай кнігі ў 1990 гады, асабліва ў пачатку іх, быў самашчырым дэмакратам. Браў чынны ўдзел ува ўсіх найважнейшых палітычных падзеях тых часоў, якія заўжды праходзілі пад лозунгам дэмакратыі, быў сустаршынём Нацыянальна-дэмакратычнай партыі Беларусі і старшынём Беларускай нацыянальнай партыі. Усё гэта зразумела: эйфарыя ад заняпаду збрыдлай камуністычнай сістэмы палівалася салодзенькім соусам ліберальнай дэмакратыі, суправаджалася змаганнем за правы чалавека і рознага кшталту "свабоды".

Аднак тое, што выйшла з гэтага "найлепшага набытку Захаду", было зусім не тым, чаго чакалі. У нас знікла камуністычная наменклатура, але з'явіўся зусім новы клас людзей, гэтак званыя "новыя беларусы", якім пляваць і на камуністычныя ідэалы і на беларускамоўную інтэлігенцыю – абы былі "баксы" і шасцісотыя "Мерседэсы".

Дэмакратыя – гэта ўлада народа. Былыя наменклатурныя работнікі даволі хутка ўцямілі, што "ўладай народа" можна вельмі добра маніпуляваць. Маючы ў сваіх руках СМІ і шмат чаго яшчэ вельмі патрэбнага, можна скіраваць гэтую народную ўладу на сама пільныя мэты пэўнай кучкі людзей, якія маюць "доступ да карыта". Менавіта такім "дэмакратычным спосабам" праводзіўся рэферэндум 1995 года, вынікі якога закрэслілі шлях беларускаму нацыянальнаму адраджэнню і адкрылі шырокую дарогу для дыктатуры.

2. ***Гэтая кніга не для тых, хто адкінуў Бога.***

Атэістам нацыянальную ідэю па-сапраўднаму ніколі не зразумець. І таму **пастулат другі:**

***Беларуская нацыянальная ідэя мае свае карані і абгрунтаванне ў хрысціянстве.*** Яна ёсць адно з выражэнняў хрысціянскіх каштоўнасцяў, сфармуляваных у Новым Запавеце.

Кожны народ мае нацыянальны інстынкт, які дадзены яму ад Бога. У беларусаў гэты інстынкт праяўляецца ў неўміручасці народных традыцыяў, фальклору, асаблівасцях характару беларусаў, унікальнасці беларускай мовы. Сапраўдны нацыяналізм не супярэчыць сусветнасці, ён ёсць аснова сусветнасці. І шлях да сусветнага пракладваецца толькі праз нацыянальнае. Касмапалітызм – пазіцыя тых людзей, што бачаць сябе па-за нацыяй – насамрэч мажлівы толькі ў індывідуальным развіцці кожнай нацыі. А чым ёсць хрысціянства? Хрысціянства – гэта любасць, якая пашыраецца на ўсіх людзей, збліжае іх; яно ўлучае ўсю паўнату сусветнай любасці. Найкаштоўнейшае ў хрысціянстве тое, што яно сцвярджае індывідуальнасць асобы. А нацыяналізм – гэта ідывідуальнасць цэлага народа і любасць да гэтай індывідуальнасці. Такім парадкам, калі мы звяртаемся да нацыяналізму, то яго існасць багаслаўляецца менавіта хрысціянствам – існасць як любасць да індывідуальнасці найвышэйшага роўню. Як і звычайная любасць да бацькоў, да сям'і, да сяброў, ***нацыяналізм ёсць пэўнай ступенню раскрыцця сусветнае любасці.*** Нацыяналізм – гэта асаблівы дар, дадзены Богам цэламу народу, і ён – гэты дар – укладзены ў кожнага чалавека свайго народа і таму сцвярджаецца хрысціянствам – вось у чым рэлігійная існасць нацыяналізму.

З сказанага вынікае і наш абавязак як індывідуальнасці, непарыўна звязанай з сваім народам. Кожны чалавек мусіць выявіць асабісты Божы Дар: быць асаблівай праявай Божай Праўды. У гэтым і палягае рэлігійнае апраўданне нацыяналізму.

Яшчэ раз падкрэслю і тое, што ***нацыяналізм ёсць пэўнай ступенню раскрыцця агульнай, сусветнай***

***Любасці.*** Як толькі мы адкінем хоць якую ступень Любасці – мы адразу адчуем непаўнавартасць жыцця. Таму ***нацыяналізм ужо ад нараджэння натуральна ўласцівы кожнаму чалавеку.*** Іншая рэч, што ў пэўных гістарычных абставінах пад уплывам розных грамадскіх табу гэтыя ўласцівасці могуць не раскрывацца ці нават уціскацца. Але гэта ўжо пытанні іншага кшталту.

3. ***Гэтая кніга для тых, хто любіць Беларусь.*** Гэта **пастулат трэці.** Я буду гаварыць пра Беларусь і пра беларускую нацыю.

Пад беларускай нацыяй я разумею такую супольнасць людзей, якая насяляе краіну – Беларусь, якая назаўжды злучыла свой кон з конам гэтай краіны, якая мае сваю адметную мову – беларускую, прыгожыя народныя традыцыі і цудоўную гісторыю. У мяне шмат прэтэнзіяў да гэтай краіны – занядбаны стан роднай мовы, нізкі ровень духовасці, нястача дэмакратычных грамадскіх інстытутаў, аўтарытарны стыль кіравання краінай і шмат чаго яшчэ.

Але я ведаю адно: ***раз я нарадзіўся тут, то гэта значыць так пастанавіў Бог згодна з сваёй найвышняй задумай.*** Ён мяне паставіў сюды як свайго салдата, і ***тут я павінен пражыць сваё жыццё, тут яго і скончыць.***

Я адмоўна стаўлюся да тых, хто, шукаючы гэтак званага "лепшага жыцця", уцякае за мяжу і будуе сваё новае жыццё ці на кульце залатога цяльца, ці на нейкіх іншых хімерных заходніх каштоўнасцях. Яны нават любяць Беларусь, але... завочна. Няўжо цяжка зразумець няўмольную логіку: каб я быў патрэбен Амерыцы ці Нямеччыне, то ***я б з'явіўся на свет менавіта там!*** Але я нарадзіўся ***тут!***

І вельмі брудную справу робяць тыя бацькі, што выпраўляюць сваіх дзетак вучыцца за мяжу, ці пакаёўкай ці пасудамыйкай, заразом робіцца ўсё, каб замацавацца там назаўжды. Больш таго, у абдымкі заходняй дэмакратыі накіроўваюцца нават цэлыя плыні маладых людзей, скажам, па вядомай "праграме Каліноў-

скага”. А гэтая дэмакратыя можа скончыцца для іх “дэман-кратыяй”. Большая частка гэтых людзей страціцца і для бацькоў, і для Бацькаўшчыны, і для нацыі.

У гэтай кнізе я паставіў, відавочна, цяжкае да выканання заданне: паказаць існасць ці, хутчэй, акрэсліць контуры беларускай нацыі (і этнасу) і паказаць абрысы беларускага нацыяналізму. Для гэтага, на мой пагляд, трэба выявіць прыкметы беларускасці як у прасторы – гэта значыць у найразнастайнейшых сферах чалавечай дзейнасці, так і ў часе – праз усю гісторыі беларускага народа, беларускага этнаса, беларускай нацыі.

Аднак нельга абняць неабдымнае. Чым больш я працаваў над рукапісам, тым больш пераконваўся, што не да падняцця развязаць такое фундаментальнае заданне аднаму. Таму накіды, зробленыя, скажам, у гістарычнай частцы, ці ў філасофскай, ці ў іншай якой, трэба разглядаць толькі як абрысы канцэпцыі, і то суб’ектыўныя.

Прытачу прыклад. Разглядаючы беларускае нацыянальнае адраджэнне 90-х гадоў XX стагоддзя я даволі абегла чапаю дзейнасць Беларускага народнага Фронту. Але затое вельмі грунтоўна разбіраю шлях Нацыянальна-дэмакратычнай партыі Беларусі. Рэч у тым, што пра БНФ напісана шмат і новае сказаць цяжка, дый не патрэбна для асвятлення прапанаванага кола праблем. Мяне будзе цікавіць толькі тое, што зроблена БНФ для развіцця беларускай нацыі і беларускага нацыяналізму. З іншага боку, нашай грамадскасці амаль што нічога не ведама пра нацдэмаў пачатку 1990-х гадоў ці пра Беларускую нацыянальную партыю. А менавіта ў гэтых асяродках крышталізаваліся абрысы беларускай нацыянальнай ідэі. Ёсць і яшчэ вельмі важкая прычына маёй увагі да НДПБ і БНП – мне давялося быць беспасярэднім удзельнікам палітычных працэсаў, звязаных з гэтымі партыямі: я спрычыніўся да стварэння гэтых партыяў і быў старшынём як у першай, так і ў другой.

# Раздзел I
# НАРОД, НАРОДНАСЦЬ, НАЦЫЯ, А ТАКСАМА НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭЯ І НАЦЫЯНАЛІЗМ

Польскае слова *naród* па-беларуску – *нацыя*. А слова *народ* – па-польску *lud*, хоць ёсць як варыянт і *naród*. Зрэшты, і ў беларускай мове ёсць слова *люд*, а на пачатку XX ст. яно ўжывалася нават часцей, чым тэрмін *народ*. Тым часам у лацінскай мове, наадварот, слова *пасіо* адпавядае нашаму панятку *народ*. Як бачым, тыя самыя тэрміны ў розных мовах маюць розныя значэнні, набываюць крыху адрозныя адценні. Гэтая акалічнасць, відаць, стала адной з прычын блытаніны і браку адзінства ў інтэрпрэтацыі памянёных тэрмінаў, да якіх мы маем не раз яшчэ звяртацца.

Калі зазірнуць у падручнікі і нават у энцыклапедычныя слоўнікі, то мы не ўбачым адзінства ў азначэннях такіх паняткаў, як *народ*, *этнас*, *раса*, *нацыя*. Таму мне б хацелася неяк сістэматызаваць сучасныя азначэнні гэтых паняткаў, а таксама даць азначэнне нацыяналізму ў самых розных аспектах і канцэпцыях.

Для далейшай размовы наконт памянёнае праблемы трэба перадусім пазначыць, як гэтыя панятк і разумее сам аўтар. У сваёй папярэдняй кнізе "Нацыянальная ідэя ў сучасным свеце" я падрабязна разглядаў гэтыя тэрміны. Аднак кніга хутка разышлася (наклад быў усяго 200 асобнікаў), даўно стала рарытэтам і таму, я лічу, будзе дамэтна выкласці мае асноўныя пагляды на гэтыя з'явы ў новай кнізе.

## 1. Народ, народнасць, раса, этнас

Даўно адзначаны той факт, што такія тэрміны як нацыянальная ідэя (НІ), нацыя і нацыяналізм – прадметы нашай цікаўнасці – узніклі зусім нядаўна, у канцы XVIII – пачатку XIX ст. (звычайна іх суадносяць з часамі французскай буржуазнай рэвалюцыі 1789–1794 гг.). Так, слова *нацыяналіст* упершыню

ўжыта абатам Баруэлем у 1798 г., каб падкрэсліць злоўжыванні якабінцаў падчас рэвалюцыі.

Але ў аснове ўсякіх размоваў пра нацыянальную ідэю знаходзяцца такія катэгорыі, як *народ*, *народнасць* і *этнас*, якія даўно выкарыстоўваюцца і ў жыцці, і ў навуцы, і ў літаратуры. Дык, перш за ўсё, патлумачым гэтыя паняткі.

**Пра народ**. Узнікненне паняткa *народ* сягае ў старажытную гісторыю, ведама яно некалькі тысячагоддзяў. Так, ужо ў першай кнізе "Быццё" Святога Пісьма Бог звяртаецца да Якава наступнымі словамі: "И сказал ему Бог! Я Бог Всемогущий: плодитесь и умножайтесь; народ и множество народов будет от тебя" (Быт. 35: 11). У Старым Запавеце, пісаным яшчэ на старагабрэйскай мове, панятак *народ* адлюстроўваецца двума словамі: *'am* і *goy*. Першае значыць народ ізраільскі, богаабраны; другі – паганскі народ. Пасля прыйсця Хрыстова і паўсюднага шырання хрысціянства біблійнае значэнне слова *народ* страціла свой выточны сэнс, бо кожнае паганскае племя ці краіна, якія прынялі хрысціянства, станавіліся блізкімі да Хрыста, а значыць і да Бога.

Цяпер слова *народ* звычайна ўжываецца ў вельмі шырокім значэнні. Гэта і ўсякая група людзей, і сукупнасць жыхароў краіны. Згодна з БСЭ: "Народ – гэта ўсё насельніцтва дзяржавы. Гэта і нацыянальная і этнічная супольнасці людзей, якія гістарычна займаюць нейкую вызначаную тэрыторыю".

Освальд Шпэнглер трапна адзначаў, што "народ" – гэта проста першаформа, у якой людзі выступаюць як гістарычныя чыннікі, і падкрэсліваў адназначны сэнс слова "народ" як сілу, што чыніць гісторыю.

Марксісцкі падыход да катэгорый *народ*, як і да іншых паняткаў такога плану, характарызаваўся гэтак званым "класавым падыходам". "Ужываючы слова «народ», – адзначаў У. І. Ленін, – Маркс не затушоўваў гэтым словам рознасці класаў, аб'ядноўваў пэўныя элементы, здольныя давесці да канца рэвалюцыю".

Неяк мне трапілася цікавая кніга "Фарміраванне

і развіццё беларускай сацыялістычнай нацыі", надрукаваная ў Мінску ў 1958 г. Цікавая яна тым, што там гаворка ідзе, між іншага пра новы, "савецкі" народ. Ідэолагі навуковага камунізму ўвялі тэрмін "савецкі народ", каб абазначыць новую гістарычную супольнасць людзей, якая насяляла СССР. Штучнасць такога падыходу стала відавочнай з надыходам новага мыслення ў часы перабудовы, а развал СССР у 1991 г. стаў і развалам раней магутнай тэорыі марксізму-ленінізму, і перадусім – навуковага камунізму.

З народам неяк трохі разабраліся. Але побач стаіць, ці хутчэй – імкнецца вылучыцца даволі блізкае да слова *народ* – слова *народнасць*.

Звычайна гэты тэрмін лічыцца больш дакладным, чым народ, і ён таксама характарызуе нейкую сукупнасць людзей. У пятым томе "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" за 1999 г. ён вызначаецца так: "Народнасць – моўная, тэрытарыяльная, эканамічная і культурная супольнасць людзей пераважна рабаўладальніцкай і феадальных эпох. Утварэнне народнасці непасрэдна папярэднічала перыяду ўзнікнення нацый. Гэта "пранацыя" мінулага. У Кіеўскай Русі, напрыклад, насельніцтва складала народнасць пад назвай "старажытнаруская народнасць". У часы ВКЛ продкі сучасных беларусаў складалі народнасць, якая мела некалькі назваў – гэта: *русіны* і *ліцвіны* (у часы Ф. Скарыны і значна пазней, яшчэ пры Адаме Міцкевічы і нават на пач. XX ст.), мелі таксама саманазву *тутэйшыя* (XIX–XX стст.). І толькі ў сярэдзіне XVII ст., у час г. зв. Польска-Расійскай вайны з'явілася на Магілёўшчыне асобнае войска з адмысловай назвай "полк беларускі". Узначальваў гэтае войска Канстанцін Паклонскі. Мікола Ермаловіч менавіта з гэтай постаццю беларускай мінуўшчыны звязвае пачатак афіцыйнай назвы як народнасці ў ВКЛ, а краю, што яны насяляюць – Беларусь.

Д. А. Хамякоў, публіцыст і філосаф канца XIX ст., аўтар знакамітай кнігі "Православие, самодержавие, народность", фактычна, ставіў знак роўнасці паміж

народнасцю і нацыяй, хоць паміж імі, як мы паспрабуем паказаць, існуе прынцыповая розніца. У народнасці Хамякоў бачыў два бакі – станоўчы і адмоўны. З аднаго боку, народнасць – гэта сукупнасць людзей, дзе асоба чалавека мае змогу праявіцца, але з другога боку народнасць замінае чалавеку праяўляць сябе аднаасобна. Д. А. Хамякоў адмаўляе касмапалітычны пагляд на народнасць як на перашкоду гармоніі асобы; ён лічыць, што людства імкнецца не да ўціскання, а ўмацавання пачаткаў народнасці: "*Чым вышэй стаіць істота на лесвіцы развіцця, тым індывідульнасць больш падкрэсліваецца, паступова пераходзячы ад адкрытага, найвышэйшага раздзялення якой-небудзь пратаплазмы ці абстрактнай малекулы да тых усё больш і больш асабістых вонкавых і псіхічных асаблівасцей, якія даходзяць да найвышэйшай ступені ў чалавеку і ў чалавецтве і, нарэшце, развязваюцца ў той найвышэйшай трансцэндэнтнай індывідуальнасці*".

Разуменне Хамяковым народнасці вельмі блізкае да сучаснага панятка нацыі, якое ў наш час цалкам выціснула свой прататып. Але перш чым сфармуляваць існасць сучасных уяўленняў аб тэрміне *нацыя*, трэба разгледзець блізкі, але больш дакладны тэрмін *этнас*.

**Этнас.** Этнас – гэта супольнасць людзей аб'яднаных агульнасцю мовы, культуры, традыцый, адзіным менталітэтам і агульнасцю паходжання. Прыведзенае азначэнне з'яўляецца агульнапрынятым, і ў адрозненне ад больш шырокіх паняткаў – *народ* і *нацыя*, – іншых трактовак не мае.

Этнас – галоўны складнік такой супольнасці людзей, як нацыя. Аднак панятак нацыі не абмяжоўваецца толькі наяўнасцю адной этнічнай групы, бо ў нацыю (мы будзем гаварыць пра гэта ніжэй) можа ўваходзіць некалькі этнасаў.

Яшчэ адна важная асаблівасць этнасу: этнічныя супольнасці не абавязкова маюць адзіную тэрыторыю бытавання. Іх бытнасць не абмяжоўваецца адзінай дзяржавай.

З другога боку, у адной дзяржаве можа суіснаваць некалькі этнасаў. Найбольш характэрнымі прадстаўнікамі такіх краін ёсць супердзяржавы: ЗША, Расія, Кітай, іншыя імперыі мінулага. Ува ўсіх гэтых краінах у пэўныя перыяды выяўлялася адна супольная рыса: наяўнасць этнічных канфліктаў унутры асобна ўзятай дзяржавы. І гэтыя канфлікты заўсёды былі дэстабілізоўным чыннікам, выклікалі і выклікаюць напружанасць у грамадстве. Яны былі адной з найгалоўнейшых прычын распаду імперый: Брытанскай, Расійскай, Аўстра-Венгерскай, іншых.

Раней лічылася, што этнічная прыналежнасць, этнас як з'ява, звязаны з дагістарычнымі ступенямі развіцця, з прымітыўнай сацыяльнай арганізацыяй. Таму меркавалася, што з развіццём прагрэсу, з узыходжаннем людства на вышэйшыя роўні цывілізацыі ўсе этнічныя праблемы і дачыненні знікнуць. Аднак жыццё паказала, што гэта зусім не так. Наадварот, апошнія значныя палітычныя працэсы ў свеце праходзяць менавіта пад знакам этнічных канфліктаў. О. Хейслер у кнізе "Ethnic conflict in the wold today" піша: "*Можна зразумець палітычныя, эканамічныя і культурныя правы этнічнай салідарнасці, калі адмовіцца ад простай ідэі развіцця, згодна з якой – чым сучасней становіцца грамадства, тым менш відавочней і менш важнай павінна быць этнічнасць у гэтым грамадстве. Бо ў многіх выпадках дзейнасць у імя якой-колечы групы, здаецца, становіць сабой разумную рэакцыю (нават мэтную стратэгію з боку асобных людзей і груп) на абставіны, што складваюцца ў сучасных грамадствах*".

Утварэннне этнасаў звязана з працэсам, які можна назваць ***этнічнай мабілізацыяй*** – імкненнем групы людзей да захавання нацыянальнага "Я", выказваннем сваёй *этнічнай прыналежнасці.*

Працэсы этнічнай мабілізацыі пачынаюцца ў двух выпадках:

а) калі ў рознаэтнічнай супольнасці людзей большасць хоча сцвердзіць сваё панаванне над меншымі этнасамі;

б) калі занядбаныя народы, этнасы, нацыі пачынаюць патрабаваць доступу да дзяржаўнай улады.

Абодва варыянты могуць прывесці да этнічных канфліктаў. Такія канфлікты ведамыя праз усю гісторыю людства. Аднак адназначнага іх трактавання да гэтага часу няма.

Паводле разліку Т. Гара цяпер у свеце 233 этнічныя групы, што церпяць дыскрымінацыю ад іншых груп, а значыць – трываюць у стане этнічнага канфлікту.

Характэрна, што аўтаномія этнічнай групы – чаго раней было досыць для ўсчынання канфлікту – у наш час можа ўжо быць і недастатковай. Патрэбна ўлічваць цэлы комплекс аспектаў: эканамічных, юрыдычных, псіхалагічных, і, перадусім, сацыяльных ды культурных. Найвялікшую ўвагу пачалі прыцягваць этнічныя канфлікты з канца 80-х – пачатку 90-х гадоў XX ст., якія працягваюць эвалюцыянаваць у бок павелічэння ў нашыя часы (2001 г.). Гэта звязана з працэсам развалу СССР, Югаславіі і скасаваннем Варшаўскага дагавору ўва Усходняй Еўропе, што прывяло да значнага ўзросту нацыянальнай сведамасці і неадольнага імкнення захаваць сваю нацыянальную ідэнтычнасць. Падзеі 1999 г. ў Сербіі прайшлі пад знакам менавіта такіх працэсаў, сербска-албанскі канфлікт быў прыпынены, на жаль, толькі гвалтоўным спосабам, прыцягненнем войскаў НАТА да ваенных дзеянняў супраць урада Мілошавіча.

Якія ж на цяперашні момант ёсць яшчэ спосабы ўрэгулявання этнічных канфліктаў? Можна шмат разважаць на гэтую тэму і многія прапановы прыняць за аснову, але, на жаль, няма агульнага рэцэпту, каб навучыцца тушыць гэтыя канфлікты.

К. П. Барышкалец, прыкладам, вылучае восем макрапалітычных формаў урэгулявання этнічных канфліктаў:

- генацыд;
- гвалтоўнае перасяленне народаў;
- падзел тэрыторыі;
- інтэграцыя (асіміляцыя);

· гегеманістычны кантроль (арбітраж) – удзел трэцяга боку;

· кантанізацыя і (ці) федэралізацыя;

· падзел прадстаўнічай і выканаўчай уладаў на падставе этнічных квотаў.

Прыведзеныя формы рэгулявання этнічных канфліктаў могуць ужыццяўляцца як гвалтоўным спосабам, так і негвалтоўным, а першыя дзве формы могуць чыніцца толькі з дапамогай гвалту.

Фактар гвалту найяскравей праяўляецца ў перыферыйных, больш адсталых краінах. І, наадварот, чым цывілізаваней краіна, тым меншы ровень этнічнага гвалтавання. Відавочна, шлях пагрэсу, шлях эвалюцыі цывілізаванага людства – гэта шлях негвалтоўны. Махатма Гандзі казаў, што негвалтоўнасць – наймагутнейшая сіла, якая ёсць у людзей. Яна мацнейшая за наймагутнейшую прыладу разбурэння, якую стварала калі чалавечая вынаходлівасць.

Прыклад Чэхаславакіі 1968 г. яскрава прадэманстраваў мажлівасці негвалтоўнай змены рэжыму ў краіне і мірнага “разводу” двух этнасаў – славакаў і чэхаў, у выніку якога ўтрываліся дзве незалежныя краіны: Чэхія і Славакія.

Працэс этнічнай мабілізацыі для беларусаў пачаўся ў канцы XIX – пачатку XX ст. Ён адбываўся амаль што без гвалту (прынамсі з боку беларускага насельніцтва). Амаль адначасна ў культурным і палітычным жыцці Паўночна-Заходняга краю Расіі ўзнікаюць творы на беларускай мове, вядуцца глыбокія даследаванні гісторыі і этнічнай спадчыны народа. Менавіта дзякуючы працэсу этнічнай мабілізацыі з далёкай Расіі едзе ў Беларусь Максім Багдановіч і робіцца там нацыянальным геніем, класікам беларускай паэзіі. Гэты феномен, аднак, будзе разглядацца трохі ніжэй у трэцім раздзеле, прысвечаным літаратуры і мастацтву Беларусі.

Беларусь зараз становіць сабой краіну, дзе дамінуе беларускі этнас ды ідзе працэс фармавання беларускай нацыі. Пры ўсім тым працэс гэты суправаджа-

еціца працэсам існавання беларускай нацыянальнай ідэі, які бачыцца нам толькі негвалтоўным.

Ніжэй мы будзем разглядаць пытанне аб нацыях, з'яўленне якіх уяўляецца нам як якасны крок людства ў будучыню. І крок гэты чыніцца менавіта этнічнымі супольнасцямі.

Мажлівы і адваротны працэс: прадстаўнікі пэўных нацыяў могуць утвараць этнічную групу. Такія працэсы могуць адбывацца паўсюль, але найбольш пашыраныя яны ў ЗША і ў Канадзе. Імігранты з краін Еўропы, сустракаючы ў гэтых краінах сваіх землякоў, задзіночваюцца і ўтвараюць сапраўдную этнічную групу, хоць яны і не становяць асобнай нацыянальнай супольнасці.

Характэрна, што гэтыя новыя этнічныя групы, утвораныя на той тэрыторыі, на якой імігранты ніколі раней не жылі, ужо адрозніваюцца ад аналагічных этнічных (нацыянальных) утварэнняў у сябе на Бацькаўшчыне. О. Шпенглер адзначае, што не англічане і немцы эмігравалі ў Амерыку, а людзі ў якасці англічан і немцаў, дзе іх унукі ператварыліся ў янкі. Ён успамінае ведамы факт: індзейская зямля зрабіла на іх беспасярэдні ўплыў, і імігранты з пакалення ў пакаленне робяцца ўсё больш падобнымі да знішчанага насельнітва ("Заняпад Еўропы").

**Раса**. Пад расай звычайна разумеецца такая група людзей, што мае пэўныя фізічныя і антрапалагічныя адрозненні ад іншых груп. Такімі адрозненнямі можа быць колер скуры, рысы твару і асаблівасці іншых частак чалавечага цела. Аднак сучаснымі вучонымі даецца больш ёмкае азначэнне расы, якое абымае групы этнасаў, паядненых не толькі фізічнымі рысамі, але і супольнасцю гісторыі, традыцый, адзіным светаглядам, тэрытарыяльнай блізкасцю, адзінай прамовай. Таму можна гаварыць аб расе ўсходніх славян, што ў VIII–X стагоддзях утваралі Кіеўскую Русь. Паўночныя плямёны – крывічы паступова рассяляліся сярод балцкага этнасу, асімілявалі мясцовае насельніцтва, і ў выніку, выходзячы з нашага азначэння, можна гава-

рыць аб утварэнні новай расы, характэрнай прыкметай якой стала асаблівая будова цела: светлыя валасы, блакітныя вочы, высокі рост і іншыя. Менавіта такія асаблівасці ўласцівыя сучасным беларусам і літоўцам. Як і ў выпадку з індзейцамі Паўночнай Амерыкі, мы назіраем змену асаблівасцяў цела (эмігрантаў з Еўропы і іншых краін свету) пад уздзеяннем мясцовасці, ці, як падкрэслівае О. Шпэнглер, – ландшафта.

О. Шпэнглер у сваім славутым "Заняпадзе Еўропы" пад расай разумее "плямёны, роды, будучыя пакаленні, сем'і – усе гэтыя назвы для крыві, якая праз зачацце цыркулюе ў больш-менш вузкім ці шырокім прасторавым ландшафце". Такое разуменне расы – больш шырокае за агульнапрынятае, згодна з якім раса – гэта сукупнасць людзей, што гістарычна жывуць на пэўнай тэрыторыі (ці, як у О. Шпэнглера – ландшафце, – *А. А.*) і якая характарызуецца яшчэ "сукупнасцю спадчынных прыкмет у будове цела".

Заўважым, што паўднёвыя славяне (цяпер украінцы) маюць некаторыя адрозненні ў будове цела ад паўночных (беларусаў) – прыкладам, чорныя валасы і вочы, хоць мовы гэтых этнічных груп вельмі блізкія і істотна аддаленыя ад літоўскай, якая адносіцца да іншай групы. У беларусаў, як і ў літоўцаў, высокі рост, светлыя валасы, блакітныя вочы і іншыя супольныя рысы фізічнага кшталту (зразумела, гэта не датычыць кожнага ўкраінца, беларуса ці літоўца). Гэта значыць, што мова не мае скразной залежнасці ад расы – у рамках адной расы могуць існаваць народы, што гавораць на розных мовах (баскі – іспанцы, літоўцы – беларусы і г. д.).

Такім чынам, мы звязалі з этнасам таксама паняцце і расы. І следам за І. Д. Роузам этнасу можна даць наступнае азначэнне:

**Этнас** – *гэта група людзей, якія аб'ядноўваюцца паводле супольнага расавага, рэлігійнага альбо нацыянальнага паходжання.*

Назіраецца таксама заканамернасць: калі этнічная група мае адносна нізкі статус у сваім грамад-

стве, то прадстаўнікі вышэйшых класаў утаесамляюць сябе з іх жа сацыяльным класам, а не з сваёй этнічнай групай. Такія працэсы былі характэрныя для эмігрантаў у ЗША. Працэс культурызацыі – звычайная з'ява ў жыцці этнічных груп ЗША. Аналагічныя працэсы ішлі ў ВКЛ у XVI–XVII стст., калі беларуская шляхта адмаўлялася ад свайго, "простага", народа і цалкам дабравольна пераходзіла на польскую мову – мову іншага этнасу.

Ніжэй мы пакажам, як ад уразумення і ўсведамлення сябе ў этнасе можна прыйсці да панятка нацыі. Зрэшты, як гэта відаць з вышэйсказанага, этнас можа ўтварацца і праз нацыі.

## 2. Нацыя

*Пасля найвышэйшай каштоўнасці і бясконцага дабра – Бога, менавіта Нацыя ёсць найважнейшае дабро Чалавека. Удзелам у жыцці свайго народа чалавек вырашае сваё жыццё ва ўсяленскасці, Боскасці і ўдзельнічае ў жыцці чалавецтва як сукупнасці народаў.*

**Народ і нацыя.** Словам *народ* часта абазначаюць асноўную (тытульную) нацыю дзяржавы. І найбольш аптымальнай можа быць наступная парадыгма. Нацыя ўтварае народ толькі на той тэрыторыі, дзе яна дамінуе перад іншымі нацыянальнымі групамі, якія завуцца ў гэтым выпадку этнасамі. Так, у дзяржаве Беларусь жыве толькі адзін народ – беларускі. Беларусь не мае такіх народаў, як польскі, украінскі і, нават, рускі. У Беларусі гэта звычайныя этнічныя групы, а ўтвараюць народ яны, адпаведна, у Польшчы, Украіне і Расіі. Калі б было інакш, то мы мелі б некалькі народаў польскіх, некалькі народаў украінскіх, некалькі рускіх. Такое азначэнне народа ўносіць яснасць у гэтае пытанне, заблытанае "інтэрнацыяналістамі". Разгледжаная парадыгма – гэта толькі адна з мажлівых мадэлей, але яна ўжо выкарыстоўвалася на практыцы ў якасці праграмных прынцы-

паў некаторых палітычных партый – Украінскай нацыянальнай партыі (УНП), Беларускай нацыянальнай партыі (БНП) і іншых.

**Узнікненне нацыяў**. Нацыя – гэта адносна новы панятак, які ўзнік ці, дакладней, пачаў усведамляцца з XIX стагоддзя. Традыцыйна лічыцца, што пачатак нацыі і нацыяналізму як тэарэтычнага абгрунтавання нацыі бярэ адлік ад французскай рэвалюцыі 1789–1793 гг. А лепш назваць гэтую рэвалюцыю агульнаеўрапейскай, бо вынікі яе адбіліся на гістарычных шляхах усіх еўрапейскіх краін.


Э. Рэнан – першым даў сучаснае азначэнне нацыі

Адным з першых даследнікаў праблемы нацыі быў Эрнэст Рэнан. У сваім дакладзе, прачытаным у Сарбоне 11 сакавіка 1882 года, ён заклаў асновы навукі аб нацыі, упершыню вылучыўшы нацыю з папярэдніх сукупнасцяў чалавечага роду, такіх як народ і этнас. Э. Рэнан першым вывеў нацыю па-за абсягі этнічных рамак і пастуляваў яе як духоўны прынцып. Больш за тое, нацыя – гэта містычны, трансцэндэнтны прынцып духовага жыцця чалавека.

"*Нацыя – гэта вялікая салідарнасць, што ўсталёўваецца адчуваннем ахвяр, якія ўжо зроблены і якія мяркуецца зрабіць у будучым... нацыя – гэта штодзённы плебісцыт, як існаванне індывідуума – вечнае сцвярджэнне жыцця. Жаданне нацыі – адзіны законны крытэр, да якога трэба заўсёды вяртацца*"[1].

Э. Рэнан лічыў нацыі новай з'явай у гісторыі. Ні старажытны Егіпет, ні Кітай, ні асірыйская, ці пер-

[1] Renan Ernest, Qu'est-ce qu'une nation? Calman-Levy: Paris. 1882.

сідская імперыі не былі нацыямі-дзяржавамі. Грамадзяне ўсіх гэтых краін станавілі сабой толькі сукупнасці людзей, альбо народ, але ніяк не нацыю. Можна гаварыць аб патрыятызме грамадзян асобных гарадоў старажытнасці, такіх, як Спарта, Цір, Троя, але ніяк не пра нацыянальнасць гэтых грамадзян. Патрыятызм – не нацыянальнае пачуццё, гэта пачуццё адданасці сваёй Айчыне. Такое пачуццё набыло найбольшае развіццё ў Рымскай Імперыі ў тыя часы, калі там квітнела мастацтва, культура і навука. Аднак імперыя не станавіла сабой нацыі-дзяржавы ў сучасным сэнсе. Менавіта брак нацыянальных прынцыпаў, змешванне народаў і рэлігіяў, супярэчнасці паміж Захадам і Усходам сталі прычынай распаду Рымскай Імперыі.

Нацыі гістарычна складаліся з розных народаў, ці этнасаў. Продкі якога-кольвек сучаснага француза маглі быць і валійцамі і вестготамі, паходзіць ад розных іншых плямёнаў, і (ці) народнасцяў, як прыкладам, у выпадку французскага паэта Гіёма Апалінэра, продкі ягога паходзілі з беларускае шляхты, а беларускі паэт Карусь Каганец быў ягоным сваяком.

**Нацыя – не этнас!** Мы высветлілі, што адным з галоўных складнікаў нацыі, яе асновай, ёсць ***этнас***. Але нацыю могуць складаць і некалькі этнасаў, а ў гістарычнай рэтраспектыве множнасць этнасаў у складзе нацыі назіраецца заўжды.

Другая адзнака нацыі – ***дзяржаўнасць***, утварэнне нацыянальнай дзяржавы, якая ствараецца дзеля захавання тэрытарыяльных межаў адпаведных этнасаў, груп людзей, якіх яна задзіночвае дзеля іх арганізацыі, абароны і іншых супольных мэтаў.

Аднак аніводзін з гэтых момантаў: ані этнаграфічная прыналежнасць, ані дзяржаўнасць яшчэ не ўтвараюць нацыі, хоць аб'яднанні паводле такіх крытэраў існавалі праз усю гісторыю людства.

І тут мы падышлі да сфармулявання галоўных паказнікаў, якія адрозніваюць нацыю ад іншых па-

добных утварэнняў. Гэта ***вера*** і ***жаданне***. Вера ў тое, што калі я, скажам, беларус, то і бацька мой, і дзед мой былі беларусамі, і 600 гадоў таму мае продкі станавілі сабой жыхароў Беларусі, якая насіла тады назву Вялікае княства Літоўскае. Яшчэ важней жаданне. Жаданне быць чалавекам пэўнай нацыі. Характэрны прыклад: тытульная нацыя Швейцарыі ўтварылся з розных этнасаў, носьбіты якіх гаварылі на чатырох мовах: французскай, італьянскай, германскай і рэтараманскай. Усе гэтыя групы аб'ядналіся ў адзіным жаданні – быць швейцарцамі.

Антрапалагічныя, археалагічныя, лінгвістычныя і шэраг іншых доследаў паказваюць, што сучасныя беларусы маюць як славянскае, так і балцкае паходжанне, а некаторыя чыннікі, калі даць веры Івану Ласкову, сведчаць і пра наяўнасць угра-фінскіх элементаў у радаводзе беларусаў.

Анджэй Валіцкі, аналізуючы працэс стварэння польскай нацыі, вылучае некалькі канцэпцыяў[1]. Карысна прасачыць бачанне гэтага працэсу, бо ён паказальны і для многіх іншых нацыянальных утварэнняў.

Першае: яшчэ ў XVIII ст. узнікла ***палітычная*** канцэпцыя Гуга Калантая, стваральніка так званай Травенскай канстытуцыі, якая выступала за моўную і культурную аднастайнасць Польшчы, скасаванне статуса аўтаномнасці ВКЛ і скасаванне дзейнасці яго знакамітага статута.

Пасля падзелу Рэчы Паспалітай выявіліся, згодна з А. Валіцкім, тры канцэпцыі будучыні польскай нацыі: ***шматкультурная***, ***уніяцкая*** і ***федэрацыйная***.

Шматкультурная канцэпцыя – гэта хутчэй рамантычнае спадзяванне на мірнае суіснаванне розных этнасаў у адной дзяржаве, талерантнасць у дачыненнях паміж рознымі канфесіямі. Яўхім Лялевель марыў пра Польшчу, дзе няма адрозненняў паміж людзьмі, якія яе складаюць: палякамі, ліцвінамі (беларусамі), нем-

[1] Валіцкі А. Інтэлектуальныя эліты і зменлівыя лёсы "вымысленнай нацыі" ў Польшчы // Фрагменты, 1999, № 3–4. С. 153–182.

цамі, жмудзінамі, рускімі. Такая канцэпцыя была далёкая ад рэальнасці, і Рэч Паспалітая распалася, падпаўшы пад уладу мацнейшых суседзяў.

Менавіта адцэнтровыя сілы сталі прычынай развалу не толькі Рэчы Паспалітай, але і іншых шматэтнічных і шматканфесійных дзяржаў. Апошні і паказальны прыклад – гэта развал СССР і ўтварэнне ў 1991 годзе на яго аснове шэрагу незалежных дзяржаў.

Уніяцкая канцэпцыя польскай нацыі выражана ў маніфесце Кракаўскага паўстання 1848 г., якім кіраваў Эдвард Дамбоўскі. Ён пракламаваў ідэал інтэграванай і ўз'яднанай польскай нацыі пры ігнараванні беларускага і літоўскага этнасаў (улучаючы іх у адзіную польскую нацыю). Дарэчы, такое ўніяцкае мысленне дало плён: шмат беларусаў – спачатку шляхецкага стану, а тады і іншы люд – лічылі за свой абавязак альбо за гонар для сябе стаць палякамі. І гэта рабілася перадусім праз культуру (пераход на польскую мову) і рэлігію (пераход праваслаўных і ўніятаў у рыма-каталікі). Палітыка Расіі ў XIX стагоддзі была аналагічнай філасофіі Э. Дамбоўскага, толькі ў гэтым разе ў якасці адзінай нацыі, што злучае (а фактычна паглынае) іншыя больш дробныя нацыі, выступае руская нацыя. Так узнікла славутая тэорыя "старэйшага брата".

Найрацыянальнейшая, на нашу думку, канцэпцыя "федэральнай нацыі". Яна адлюстроўвала ідэі лідэраў польска-беларускага паўстання 1863 года. Адпаведны маніфест заклікаў да ўзброенага паўстання ўсе галоўныя нацыі былой Рэчы Паспалітай, у тым ліку і нацыі ВКЛ – беларусаў і літоўцаў (менавіта літоўцаў, а не ліцвінаў). Упершыню адзін з правадыроў паўстання Кастусь Каліноўскі праз газету "Мужыцкая праўда" звяртаўся да сялян не на традыцыйнай польскай мове, а на іх "простай", беларускай, мове. Тады ж і ўзнікла ідэя правоў нацыяў на самавызначэнне, якая для беларусаў стала рэальнасцю праз 128 гадоў, калі ў 1991 годзе Беларусь атрымала незалежнасць. Але федэральная нацыя ўсё ж імкнецца да

злучэння этнасаў у адзінай дзяржаве, хоць і на федэратыўнай аснове. Прыкладам, краінай з такой шматэтнічнай нацыяй з'яўляецца Швейцарыя. Аналагічны шлях утварэння амерыканскай нацыі.

І ўсё ж большасць нацыяў утварылася на аснове развіцця нейкага галоўнага, даміноўнага этнасу. Такія нацыі характарызуюцца адметнай нацыянальнай культурай, якая, сваім парадкам, мае за галоўны атрыбут сваю нацыянальнаю мову. І другі аспект, што вызначае нацыю – палітычны: нацыя канчаткова завяршае сваё фармаванне толькі тады, калі яна становіцца *нацыяй-дзяржавай*, калі большасць насельніцтва, што жадае быць той ці іншай нацыяй, замацоўвае гэтае права праз дзяржаўнасць.

У найбольш развітых краінах дзяржаўнасць папросту эквівалентная нацыянальнасці – дзяржава і нацыя становяцца сінонімамі. Больш за тое, за нацыяй часта захоўваецца своеасаблівы прыярытэт. Так ААН – Арганізацыя Аб'яднаных Нацыяў, а не дзяржаў.

Яшчэ адзін чыннік трэба адзначыць пры разглядзе прыроды нацыі. Гэта – **любасць** да ўласнае нацыі. Як і падсведамая, прыродная любасць да сваіх бацькоў, да дзяцей, якая бытуе недзе на інстынктыўным роўні, так і любасць, прыхільнасць да свае нацыі закладзена ці не ў спадчынным генетычным кодзе. А калі няма такога стаўлення да свае нацыі, мала таго, калі чалавек не любіць, зневажае сваю нацыю, то гэта ненармальна, гэта дэфармацыя нацыянальных пачуццяў, скажэнне чалавечай асобы.

XX стагоддзе стала стагоддзем фармавання вялікай колькасці новых нацыяў. За 100 гадоў 180 нацыяў сталі незалежнымі, аформіліся як нацыі-дзяржавы, і яшчэ 30 маюць мажлівасць стварыць сваю дзяржаву. І гэты працэс працягваецца. Гэты натуральны працэс ёсць новым кругам эвалюцыі, ён стварае спаборніцтва паміж нацыямі-дзяржавамі, выклікае эканамічнае супрацоўніцтва – і тым самым спрыяе ўдасканаленню кожнай нацыі, што, сваім парадкам, вядзе да ўдасканалення ўсяго людства.

Ёсць яшчэ адна важная акалічнасць у працэсе эвалюцыі нацыяў. Калі нацыя не паспела дасягнуць сваёй закончанасці і не здолела сфармавацца ў рамах дзяржавы, то яна можа знікнуць. Так было з прусамі, яцвягамі, з многімі іншымі этнічнымі групамі мінулага. З іншага боку, тыя нацыі, што дасягнулі вялікай духовае моцы і высокай культуры, могуць захоўвацца і развівацца надалей нават па скасаванні сваёй дзяржаўнасці, нават тады, калі іх дзяржава падпала пад уладу іншай, больш моцнай дзяржавы. Так было, прыкладам, з польскай нацыяй пасля трох падзелаў Рэчы Паспалітай, якая падпала на доўгі час пад уладу Расійскага імператара. Польская нацыя працягвала ў тыя часы існаваць і, нават, развівацца, пра што сведчыць з'яўленне вялікіх паэтаў XIX стагоддзя: Адама Міцкевіча і Уладзіслава Сыракомлі, пісьменнікаў Генрыха Сянкевіча і Баляслава Пруса, кампазітараў Фрыдэрыка Шапэна і Клеафаса Агінскага.

Разбіраючы праблему нацыі, нельга абмінуць яшчэ аднаго гледзішча на гэтае пытанне, што зусім нядаўна панавала ў ідэалагічнай платформе КПСС і вызначала курс развіцця ўсяго Савецкага Саюза. Ідэолагі марксізму-ленінізму лічылі, быццам буржуазныя нацыі неўзабаве ператворацца ў сацыялістычныя нацыі. Зразумела, гэта датычыла і Беларусі. У "эпахальнай" кнізе "Фарміраванне і развіццё беларускай сацыялістычнай нацыі", напісанай калектывам навукоўцаў АН БССР у 1958 годзе, гаварылася: "Фарміраванне сацыялістычных нацый у нашай краіне звязана з пэўным этапам грамадзянскага развіцця, яно абумоўлена *новымі заканамернасцямі сацыялістычнага ладу* (курсіў мой, – *А. А.*). Сацыялістычныя нацыі карэнным чынам адрозніваюцца ад буржуазных нацый. У аснове іх фарміравання ляжаць агульныя заканамернасці, уласцівыя ўсім сацыялістычным нацыям".

Аднак з развалам СССР, крахам дзяржаўнасці і камуністычнай ідэалогіі разваліўся і міф аб нейкіх

асаблівых “сацыялістычных нацыях” як новай прагрэсіўнай форме развіцця людзей. Некаторыя з нацыяў былога СССР скора зноў сталі “буржуазнымі”, як тыя ж прыбалтыйскія, а некаторыя, найбольш пацярпелыя ад жадання хутчэй увайсці ў камунізм, чаму нібыта спрыяла паспяховае выконванне дырэктывы КПСС аб ліквідацыі сваёй нацыянальнай мовы і поўнага ўваходжання ў сферу дзеяння іншай (рускай) культуры, – змарнавалі шмат часу і цяпер з вялікай цяжкасцю адбудоўваюць уласную нацыянальную ідэнтычнасць. Апошняе датычыць якраз беларускай нацыі.

**Мадэрнісцка-прымардыяльная дыхатамія.** Як я ўжо казаў, нацыя – панятак адносна новы і шматзначны. У заходнееўрапейскай традыцыі (англаамерыканскай) і ўсходнееўрапейскай (постсавецкая прастора), склаліся розныя падыходы да канцэпцыі нацыі. Асноўным пунктам разыходжання ў гэтых падыходах ёсць дачыненні нацыі і дзяржавы. У ўсходнееўрапейскай навуцы канцэпцыя нацыі не прывязваецца да дзяржавы. Еўрапейскі падыход вылучаецца большым акцэнтам на рэалізацыі менавіта нацыі-дзяржавы. Пасля развалу СССР і ўтварэння шэрагу новых краін ва Усходняй Еўропе адбыліся змены і ў канцэпцыі нацыяў гэтых краін, якая пачала набліжацца да заходнееўрапейскай і адкінула тэорыю “сацыялістычнай нацыі”.

Хоць самыя словы *нацыя*, *нацыяналізм* з’явіліся нядаўна, у сучасны момант склаліся два розныя падыходы да самога працэсу ўтварэння нацыяў.

Згодна з першай канцэпцыяй нацыі маюць свае вытокі ў самой прыродзе і ёсць вечнымі, яе прынята называць прымардыяльнай, г. зн. выточнай (ад ангельскага слова primordial). Другая канцэпцыя грунтуецца на тым, што нацыі – з’ява сучасная, яны ўзніклі зусім нядаўна (канец XVIII – пачатак XIX ст.). Такую канцэпцыю лагічна назваць *мадэрнісцкай*. Мадэрнісцкая тэорыя разглядае нацыю як сацыяльную лучнасць, якая не ўзнікае згодна з гістарычнай

канечнасцю, а хутчэй як маральны і ірацыянальны чыннік. Пачатак гэтаму падыходу даў, як ужо адзначалася, Эрнэст Рэнан. Прымардыяльная канцэпцыя грунтуецца на тым, што нацыі існавалі да сучаснасці. Аднак і пры такім падыходзе няма падстаў сцвярджаць, быццам нацыі – натуральная з'ява, пачатак якой сягае вытокаў людства. Яна можа ўзнікнуць і не ў нашы часы, але праз сукупнасць гістарычных выпадковасцяў, "збег акалічнасцяў". Нацыя, такім парадкам, можа ўзнікнуць чыста выпадкова.

Такі дваісты падыход да фармавання нацыяў прынята называць **прымардыяльна-мадэрнісцкай дыхатаміяй**. А раз аснова нацыі – этнас, то прымардыяльна-мадэрнісцкая дыхатамія істотная для мяне ў разуменні этнасу.

Вучоныя, якія лічаць нацыі сучаснай з'явай, аргументуюць гэта асаблівымі падзеямі ў гісторыі, якія становяцца вызначальнымі ў лёсе пэўнага народу. Такой падзеяй была, скажам, французская рэвалюцыя XVIII ст. Але такімі падзеямі могуць быць і быццам далёкія ад сацыяльных зрухаў. Як прыкладам – вынаходства друкарскага станка, утварэнне англіканскай царквы ў Англіі, індустрыяльная рэвалюцыя. Да апошняга чынніка прывязвае сваю канцэпцыю нацыяў Эрнэст Гелнэр. Аргументацыя чынніка друкарскага станка была прапанаваная Б. Андэрсанам[1] у 1983 г. Ён звязаў момант узнікнення нацыяў з заняпадам рэлігіі, з пільнай патрэбаю нечым запоўніць вакуум бездухоўнасці ў тыя часы. Вынайдзены друкарскі станок і запоўніў пустату безрэлігійнасці, даў *уяўную* рэальнасць, стварыў умовы для задавальнення галоўных псіхалагічных патрэбаў чалавека. Такім новым, секулярным грамадствам людзей і стала нацыя.

Можна па-рознаму ставіцца да ролі друкарскага станка ў фармаванні нацыяў, але відавочна, што калі ён і не замяніў рэлігіі, дык стварыў ёй вялікую канкурэнцыю. З нашага гледзішча фармаванне нацыяў

[1] Anderson B. Imagined Communities, London, Versa,1983.

звязана не з заняпадам рэлігіі, а з уступленнем людства ў новую эпоху, якая з аднаго боку характарызуецца індустрыялізацыяй, у тым ліку вынаходствам друкарскага станка, а з другога – надае новы імпульс менавіта рэлігійнаму светагляду, моц якога яскрава відаць у наш час.

Мадэрнісцкую тэорыю развівалі таксама Ганс Кон, Руперт Эмерсон, Лія Грынфельд, іншыя. Ува ўсіх гэтых даследваннях трэба адзначыць адну важную акалічнасць: усе яны побач з праблемай нацыяў аддаюць вялікую ўвагу нацыяналізму, які беспасярэдне звязаны з нацыяй, а на думку некаторых даследнікаў, як Гелнэр, нават стварае нацыю.

Прыхільнікі "вечнай", прымардыяльнай канцэпцыі нацыі сцвярджаюць, што нацыі вынікаюць з натуральнай сацыяльнай лучнасці людзей і не звязваюць нацыю беспасярэдне з нацыяналізмам. Прымардыяльная пазіцыя істотная ў дачыненні да суб'екта: ці ёсць ён сацыябіялагічным, ці толькі сацыяльным. Адзін з творцаў гэтай тэорыі П'ер Ван дэр Берг абірае сацыябіялагічную канцэпцыю і лічыць этнічнасць пашырэннем радства. Этнічныя групы ўзнікаюць як вынік пашырэння прынцыпаў генетычна абіральнай сямейнасці. Пашыраныя сем'і праз стан прамежкавых суперсямей перарастаюць у этнічныя супольнасці.

Развязанне прымардыяльна-мадэрнісцкай дыхатаміі – заданне няпростае, бо абодва падыходы маюць сваю моцную аргументацыю і кожны з іх слушны ў пэўных гістарычных прыкладах. Арыгінальны падыход прапанаваў Энтані Сміт. Яго асноўны пастулат – карані этнічнасці з'явіліся ўжо ў "перадсучасную" пару і грунтуюцца на міфах, помніках, сімвалах і на памерах *этніі* (ethnie), якія адрозніваюць іх ад іншых сацыяльных груп. І толькі на падставе таго, што этнія існуе ўжо ў перадсучасную пару, смітаўскі аналіз выяўляе ўздзеянне гэтага факта на фізіягноміку сучасных нацыяў і фармуе нацыяналізм, паводле якога нацыі ёсць сучаснымі, але іх этнічныя карані – перадсучасныя. Гэтыя аргументы абмяжоў-

ваюць спробы сучасных палітычных эліт спрасціць працэсы нацыянальнага фармавання.

Даследуючы працэс утварэння нацыяў у былой Югаславіі В. Ракіц прыходзіць да высновы, што і прымардыяльны і мадэрнісцкі падыходы не адпрэчваюць адзін аднаго, а правільнасць іх выбару – заданне будучай універсальнай тэорыі[1].

На нашую думку, таксама разгледжаная дыхатамія не складае істотна супрацiўных гледзішчаў на тую самую праблему. Абедзве канцэпцыі, і прымардыяльная і мадэрнісцкая, маюць права на існаванне. Яны датычаць аднача́снага праяўлення розных з'яў ці розных часоў праяўлення адной з'явы і ўзаемадапаўняюцца. Аднак, што да канкрэтна сучаснага азначэння нацыі, то яму больш уласцівыя і сучасныя падыходы да ўтварэння нацыяў, а гэта значыць – мадэрнісцкая канцэпцыя.

**Правы нацыі і правы чалавека.** Панятак "правы чалавека" даволі трывала ўвайшоў у наша жыццё і атрымаў разгорнутае і глыбокае тлумачэнне ўва Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, прынятай на сесіі Генеральнай Асамблеі ААН у 1948 годзе. Але, як піша Л. Ф. Яўменаў у кнізе "Международная идеология прав человека: проблемы – решения", панятак правоў чалавека разлядаецца яшчэ ў Дэкларацыі незалежнасці Злучаных штатаў Амерыкі 1787 г. і, больш за тое, вытокі гэтага панятку трэба шукаць у законах Хамурапі (XVII ст. да н. э.), Вялікай хартыі вольнасцяў (Англія, 1215 г.), Статуце Вялікага княства Літоўскага 1588 г. і многіх іншых дакументах мінулага.

Куды менш мы ведаем пра іншыя правы – правы нацыі. Гэта і зразумела: сам панятак нацыі да гэтага часу не мае акрэсленага азначэння і наагул узнік толькі ў XIX ст., пасля адзначанай вышэй публікацыі Эрнэста Рэнана. Прынцып жа правоў чалавека

[1] Racic Vojin. Nationalisties Papers, 1998. V. 26, № 4.

займае цэнтральнае месца ў адной з найбольш распаўсюджаных ідэалогіяў нашага часу – лібералізме. З гледзішча лібералаў правы чалавека маюць прыярытэт над правамі нацыі. Але нацыяналісты, як і прыхільнікі блізкіх да іх ідэалогій – кансерватары і хрысціянскія дэмакраты – ніколі не пагодзяцца з формулай лібералаў. Гэта выклікае сур'ёзны канфлікт паміж ліберальнай і нацыянальнай ідэяй.

Дадзеную супярэчнасць выявіў яшчэ ў канцы XIX ст. К. Лявонцьеў, які лічыў, што ліберальны прынцып прыярытэту правоў чалавека над правамі нацыі вядзе да змяшэння нацыяў, касмапалітызму, да бездухоўнага, мандыялісцкага грамадства. Лібералы, убачыўшы безумоўную моц нацыяналізму, спрабавалі і спрабуюць увесці нацыянальную ідэю ў сваю ідэалогію. Аднак пры гэтым узнікае няўхільны канфлікт паміж ліберальным прынцыпам прыярытэту правоў чалавека над правамі нацыі і "іншародным", чужым прынцыпам – нацыянальнай ідэяй, якая патрабуе адваротнага – прызнання безумоўнага прыярытэту інтарэсаў нацыі над інтарэсамі простых індывідуумаў. На шляху развязання такіх супярэчнасцяў нарадзілася нават новая ідэалогія – ліберальны нацыяналізм. Вядомым тэарэтыкам яго ёсць І. Тамір[1]. Аднак і І. Тамір, і іншыя даследнікі не даюць адназначнага развязання памянёнага канфлікту паміж нацыяналізмам і лібералізмам, а абмяжоўваюцца паяднаннем гэтых ідэалогіяў толькі дзеля найвышэйшае мэты – дабрабыту грамадзян і ўмацавання нацыі-дзяржавы.

Паказальная тут эвалюцыя станаўлення дэмакратыі і нацыянальнага адраджэння ў постсавецкай Беларусі. Ужо ў 1991 годзе ў Беларусі існавалі палітычныя партыі як ліберальнага кірунку, так і нацыянальна-дэмакратычнага. Да першага належала Аб'яднаная дэмакратычная партыя (з 1995 Аб'яднаная грамадзянская партыя – АГП), да другога – Беларускі народны фронт (БНФ), Нацыянальна-дэмак-

---

[1] Tamir Yael. Liberal Nationalism. Prinston, New Jersey, 1993.

ратычная партыя Беларусі (НДПБ) і Беларуская нацыянальная партыя (БНП). Апошняя ў якасці аднаго з галоўных праграмных прынцыпаў узяла ідэалогію нацыяналізму ў яе сучасным заходнім варыянце, якая ўдала спалучылася з асноўнымі хрысціянска-дэмакратычнымі прынцыпамі.

Маладыя партыі і грамадскія аб'яднанні ўжо на пачатку 1990-х гадоў пачалі шукаць шляхі мажлівага аб'яднання на прынцыпах супольнасці сваіх платформаў, галоўнымі з якіх лічыліся: дзяржаўная незалежнасць, рынкавая эканоміка і правы чалавека. Менавіта паводле апошняга пункта і выяўляліся найістотнейшыя разыходжанні паміж партыйнымі платформамі, якія звычайна вялі да безвыніковых спрэчак, а потым і да прыпынення ўсякіх аб'яднаўчых, "экуменічных" працэсаў.

Характэрны прыклад: увосень 1993 г. ў Беларусі стваралася Аб'яднанне дэмакратычных сілаў "Вясна-94". Былі прапанаваныя пытачаныя вышэй тры прынцыпы яднання. У выніку НДПБ адразу адмовілася ад перамоў у звязку з непрыняццем трэцяга пункта. Як пісала газета "Добры вечар" (12.10.93) партыя "цалкам ухваліла ідэю стварэння цэнтрысцкага блоку і палічыла гэта важным крокам у жыцці, але члены НДПБ не згодны з прыярытэтам правоў чалавека перад правамі нацыі". БНФ таксама ўстрымаўся ад падпісання пагаднення і выставіў прынцып парытэту правоў чалавека і правоў нацыі.

На нашую думку, панятак парытэту ў разгляданай праблеме вельмі надуманы і можа мець сэнс толькі ў незалежных краінах. Такой дзяржавай не можа лічыцца Рэспубліка Беларусь з яе кволымі парасткамі дэмакратыі і вельмі слабым нацыянальным патэнцыялам. Усякае абсалютызаванне ліберальных каштоўнасцяў, стаўка на прыярытэт правоў чалавека над правамі нацыі ўва ўмовах Беларусі канца XX ст. вядзе да вельмі простых і няўхільных вынікаў: поўнага вынішчэння беларускай нацыі, хуткага рассычэння яе ў нацыі рускай. А першы удар бярэ на сябе мова

як найменш абаронены аб'ект. І працэс гэты ў наш час усё набірае моцы. Небяспека яго відавочная: пры дасягненні нейкай крытычнай мяжы працэс выштурхнення беларускай мовы можа стаць незваротным. А знікне мова – знікне і нацыя. У варунках няспеласці беларускай нацыі, яе кволага абуджэння ад стагоддзяў забыцця памянёны працэс пакіне ад беларусаў толькі экзатычныя рысы ды паступова зліе мясцовыя гаворкі з усюдыіснай рускай мовай.

Сказанае вымагае вельмі ўважлівага стаўлення да праблемы правоў чалавека і правоў нацыі. Яна робіцца першараднай праблемай для ўсякай краіны, якая становіцца на шлях нацыянальнага адраджэння і будавання дзяржаўнай незалежнасці. Толькі ў выніку прадуманага дзяржаўнага падыходу можна знайсці кампраміс паміж канфліктнымі варыянтамі і захаваць тытульную нацыю дзяржавы, не парушаючы правоў чалавека.

## 3. Што такое нацыяналізм?

**Два супрацiўныя падыходы да разумення слова *нацыяналізм*.** Існуюць два розныя падыходы да ідэалогіі нацыяналізму. ***Першы*** грунтуецца на тым, што нацыяналізм – гэта з'ява адмоўная, якая вядзе да міжнацыянальных сутыкненняў, гэта слёзы, забойствы і смерць. Фактычна, робіцца знак роўнасці паміж нацыяналізмам і фашызмам. У "Раздзеле V" мы спецыяльна засяродзімся на разглядзе гэтай лучнасці.

***Другі падыход*** – грунтуецца на іншых уяўленнях пра нацыяналізм. Ягоныя прыхільнікі і большасць вучоных, даследнікаў гэтай ідэалогіі, а таксама аўтар гэтай кнігі лічаць, што нацыяналізм – станоўчая і прагрэсіўная з'ява. Нацыяналізм, на думку даследнікаў гэтага другога падыходу, – ёсць пэўнай стадыяй сусветнай любасці, гэта прагрэс і чарговы крок па дарозе да ўдасканалення чалавечай існасці. Адсюль вынікае мажлівасць развязання праз нацыяналізм нацыянальных супярэчнасцяў мірным спосабам на прынцыпах узаемапавагі і любові адной нацыі да другой.

Другі пункт гледжання на праблему сувязі хрысціянства і нацыяналізму грунтуецца на ўяўленнях аб нацыяналізме як станоўчай з'яве, на ўяўленнях аб ім як найлепшым набытку цывілізацыі. І шлях да Бога ляжыць якраз праз крышталізацыю нацыянальнага, праз развіццё асаблівага Божага Дару – нацыяналізму.

Першы падыход ляжаў у аснове афіцыйнай палітыкі і дзяржаўнай ідэалогіі Расійскай імперыі, потым, пасля бальшавіцкай рэвалюцыі 1917 г., ён быў з нязначнымі зменамі перанесены ў марксісцка-ленінскую ідэалогію СССР. Да канца 80-х – пачатку 90-х гадоў XX ст. па ўсёй тэрыторыі СССР і краін Усходняй Еўропы ўстойліва панавала адмоўнае стаўленне да нацыяналізму. Прыхільнікі «адмоўнага нацыяналізму» знаходзяць абгрунтаванне сваёй ідэалогіі як у камуністычнай ідэалогіі (мандыялісцкая тэорыя зліцця нацыяў), так і ў хрысціянстве.

Прыпынімся цяпер на довадах хрысціянскай скіраванасці, бо, на наш пагляд, якраз у хрысціянстве нацыяналізм знаходзіць сваё апраўданне і вытокі. Адно з пашыраных меркаванняў грунтуецца на апостальскім прынцыпе адзінства народаў у Хрысце: "Дзе няма ані Грэка ані Юдэя, ні абразання ні неабразаных, няма варвара, Скіфа, нявольніка, вольнага, але ўсё і ўва ўсім Хрыстос". Грунтуючыся на ўяўленнях аб нацыяналізме як з'яве адмоўнай, што нясе ў сабе ідэю выбітнасці пэўнае нацыі, многія царкоўныя дзеячы перасцерагаюць ад небяспепекі нацыяналізму. Яны лічаць, быццам Хрыстова еднасць можа быць прынесена ў ахвяру нацыянальнай ідэі. Прыкладам, у выступленні протаіерэя У. Вараб'ёва на Багаслоўскай канферэнцыі ў 1994 годзе ў Маскве прагучалі такія словы: "Спакуса нацыяналізму зноў і зноў зводзіць асобных людзей і цэлыя народы. Для яго характэрны нацыянальная гордасць, духоўная слепата і г. д."

Нягледзячы на такія катэгарычныя выказванні з боку артадоксаў праваслаўя ў наш час першы падыход імкліва страчвае сваіх прыхільнікаў, а другі падыход наадварот – заваёўвае ўсё больш трывалыя пазіцыі.

Разгледзім падрабязней абодва падыходы. Першы можна сфармуляваць так:

**Нацыяналізм – негатыўная з'ява, варыянт фашызму.** У азначэнні нацыяналізму як адмоўнай з'явы ляжыць сцверджанне: нацыяналізм – гэта палітыка, скіраваная на развіццё варожых дачыненняў паміж нацыямі, імкненне адной нацыі сцвердзіць перавагу над іншай нацыяй, асіміляваць ды заняволіць яе. Сучасныя апалагеты такой канцэпцыі звычайна падаюць фармулёўкі, узятыя з дарэвалюцыйных і савецкіх энцыклапедыяў, і спасылаюцца амаль заўсёды на тых самых расійскіх і савецкіх навукоўцаў. Так, яшчэ ў дарэвалюцыйнай энцыклапедыі Ф. А. Бракгауза і І. А. Эфрона, нацыяналізм апісаны як "знамя дурных страстей". Далей – болей, у Вялікай энцыклапедыі 1903 года (пад рэд. С. Н. Южакова, С.-Пецярбург) мы ўжо чытаем: "*Нацыяналізм... заключаецца ў пера-развіцці нацыянальнага адчування*", *пры якім людзі* "*пачынаюць пераацэньваць сваю нацыянальнасць, іншы раз і сваю нацыю і лічаць таму цалкам справядлівымі ўсялякія для яе перавагі ў параўнанні з іншымі нацыямі*" (падкрэсленне маё, – *А.А.*). Калі ўзяць гэтае азначэнне, то варта паставіць пытанне аб розніцы паміж ім і тэрмінам "шавінізм", які прапаведуе "вылучнасць сваёй нацыі і пагарду да іншых, распальванне нацыянальнай варожасці". Менавіта шавінізмам вылучаецца расійская палітыка XIX – пачатку XX стст. Гэтая з'ява складвалася ў рускай культуры паступова, праз доўгі гістарычны шлях, пачынаючы з часоў татара-мангольскага іга. Некалі магутныя татары, жывучы працяглы час сярод славян, мелі з імі самыя шчыльныя зносіны і найбольш з тымі, што гуртаваліся вакол Масквы. У выніку – татары асіміляваліся з гэтай усходняй часткай славянства і зніклі як дзяржава, даўшы, аднак, жыццё фактычна новай папуляцыі – рускай.

Успомнім, што станавіла сабой Расія ў канцы XIX ст. Гэта была магутная манархічная дзяржава,

у якой шавінізм быў дзяржаўнай палітыкай. Усякае іншадумства жорстка ўціскалася. З іншага боку, гэтая самая пара ведамая шырокім нацыянальна-вызваленчым рухам, развіццём нацыянальных культур, моў і асветы. Для афіцыйных улад усякае выступленне нярускіх народаў Расійскай Імперыі са сваіх нацыянальных пазіцыяў наносіла чарговы ўдар па ідэалагічнай схеме, быццам Расія – выратавальніца ўсіх суседніх "занядбаных" народаў, быццам рускія – гэта нацыя-гегемон. Каб апраўдаць вялікадзяржаўную шавіністычную палітыку, зняславіць нацыянальныя рухі, у слова "нацыяналізм" і быў укладзены адмоўны сэнс. З тых часоў склалася і стала накідвалася ўяўленне: "Усё нацыянальнае – дрэннае і архаічнае, усё рускае – добрае і прагрэсіўнае".

Характэрна, што тагачасныя ідэолагі і наагул тагачасны афіцыёз успрымалі імперыю як само сабой зразумелае, як "вялікую дзяржаву" і да яе карэннага люду ставіліся як да "вялікага народу", якому слова "нацыя" зусім без патрэбы. А да іншых народаў Расійскай імперыі – палякаў, беларусаў ці грузін – тэрмін "нацыя" стасаваўся толькі так, каб падкрэсліць іх непараўнальна меншую значнасць. Таму і ўсялякія спробы малых народаў адрадзіць сваю дзяржаўнасць жорстка ўціскаліся, барацьбітоў за незалежнасць, за права "людзьмі звацца" называлі нацыяналістамі, укладваючы найгоршы сэнс у гэтае слова.

І нездарма бальшавізм так лёгка прышчапіўся на тэрыторыі Расійскай імперыі. Тут яго ідэі знайшлі спрыяльны грунт, і перадусім яны закранулі нацыянальную праблему. Камуністы, паводзячыся ідэяй зліцця нацыяў і ўсталявання раю на зямлі, ува ўсякіх праявах нацыянальнага, нацыянальнай ідэі, нацыянальнасці ўбачылі найгоршага ворага сваёй утапічнай канцэпцыі. На працяглы час у савецкім грамадстве быў вынесены прысуд нацыянальнай ідэі і, зразумела, нацыяналізму. Для прыкладу, у Малой савецкай энцыклапедыі за 1938 г. канцэпцыя расійскіх дарэ-

валюцыйных ідэолагаў прымае ўжо такі выгляд: "*Нацыяналізм – палітыка эксплуататарскіх класаў, скіраваная да ўкараненне нацыянальнай варожасці і нацыянальных сутыкненняў, да найпростага нацкоўвання адной нацыі на другую*".

Вобраз ворага, неадменна маляваны камуністамі, тут фармулюецца вельмі проста, даслоўна так: "эксплуататарскія класы" і "нацыяналісты" – маўляў, тое самае. І гэты вобраз ворага за гады панавання камуністаў трывала засеў у сведамасці людзей.

Вобраз ворага атрымаў асабліва моцнае развіццё пасля ІІ сусветнай вайны, калі нацыяналістаў пачалі ўтаесамліваць з... фашыстамі, хоць апошнія былі носьбітамі зусім іншай ідэалогіі – ідэалогіі Нацыянал-сацыялістычнай партыі Германіі У звязку з гэтым прыточым фармулёўку азначэння фашызму з БелСЭ: гэта "адкрыта тэрарыстычная частка найбольш рэакцыйнай і агрэсіўнай імерыялістычнай буржуазіі... крайні шавінізм і расізм". Як бачым, тут адзначаецца блізкасць тэрмінаў фашызм і шавінізм. Больш за тое, я думаю, што гэтыя ідэалогіі, з грунту, аднолькавыя, яны адлюстроўваюць тую самую з`яву. Толькі першая – фашызм – мае найбольшае дачыненне да гітлераўскай Германіі і некаторых яе сатэлітаў, а другая – да Расійскай імперыі ды камуністычнага Савецкага Саюза. І нічога агульнага з гэтымі паняткамі слова "нацыяналізм" не мае. Наадварот, нацыяналізм – антыпод фашызму, гэта найлепшы з набыткаў цывілізацыі, бо ў яго аснове ляжыць любасць і павага паміж людзьмі. Такім парадкам, прыходзім да іншай, альтэрнатыўнай пазіцыі:

**Нацыяналізм – станоўчая з'ява, гэта прагрэс і будучыня чалавецтва.** Вышэй падаваліся пагляды афіцыйных колаў імперскай Расіі і іх савецкіх паслядоўнікаў. Аднак ужо ў другой палове XIX стагоддзя і пазней у Расіі ды па-за яе межамі з'явіліся навукоўцы, якія зусім інакш трактавалі існасць нацыяналізму.

Найгрунтоўней праблему нацыі і нацыяналізму даследаваў выдатны расійскі мысляр Мікалай Бярдзяеў. У кнізе «Судьба России», выдадзенай у 1918 годзе, ён пісаў[1]:



М. І. Бярдзяеў (1874–1948) – творца дактрыны нацыяналізму

"*Чалавек уваходзіць у чалавецтва праз нацыянальную індывідуальнасць, як нацыянальны чалавек, а не абстрактны чалавек, як рускі, француз, немец альбо ангелец. Чалавек не можа праскочыць праз цэлую ступень быцця, ад гэтага ён альбо б збяднеў, альбо б апусцеў. Нацыянальны чалавек – больш, а не менш чым проста чалавек...*". І далей: "*Нацыяналізм ёсць станоўчы набытак і каштоўнасць, як творчае сцверджанне, раскрыццё і развіццё індывідуальнага народнага быцця. Але ў гэтым індывідуальным вобразе раскрываецца ўсё чалавецтва*".

У гэтых радках сканцэнтравана ўся існасць нацыяналізму. Менавіта ў адасобленым вобразе раскрываецца ўсё чалавецтва. Багацце чалавецтва менавіта ў разнастайнасці і сталасці нацыяў, як і багацце асобнага народа ў каларытнасці, разнастайнасці яго індывідуумаў. Толькі пры ўмовах існавання раўнапраўных, творчых і сталых нацыяў мажлівы іх партнёрскія дачыненні, саюзы і аб'яднанні. Такім шляхам ужо ідзе ўся Заходняя Еўропа. І таму шлях да касмапалітызму – праз крышталізацыю асаблівасцяў. Іншымі словамі, сусветнае мае сэнс толькі праз індывідуальнае.

Выказаная праўда вельмі простая. Але здзіўляе ўпартае непрыняцце яе, якое працягваецца да наша-

[1] Бердяев Н.И. Судьба России. М., 1918.

га часу. А яшчэ ў 1857 годзе рэвалюцыйны дэмакрат Сігізмунд Серакоўскі вельмі вобразна сказаў: "Думка, што розныя нацыянальнасці граюць тую самую ролю ў развіцці людства, як розныя інструменты ў аркестры, – вялікая думка. Няўжо першая скрыпка надумаецца вымкнуць і заняволіць флейту, кларнет ці другую скрыпку, каб вылучна самой разыгрываць усе п'есы?" (Сераковский С. Заграничные известия // Современник, № 4, 1857).

У той жа кнізе М. Бярдзяева сказаны словы, якія павінны стаць класічнымі:

"*Нацыянальнасць не можа прэтэндаваць на выключнасць і універсальнасць, яна дапускае іншыя нацыянальнасці і ўступае з імі ў зносіны. Нацыянальнасць уваходзіць у іерархію ступеняў быцця і павінна займаць сваё вызначанае месца, яна іерархічна падпарадкаваная чалавецтву і космасу*".

### *А як азначаюць нацыяналізм нашы сучаснікі?*

Такім парадкам, пачатак эпохі нацыяналізму – час распаду еўрапейскіх манархіяў і ўсталяванне дэмакратычных інстытутаў улады, як у форме рэспублікі (Францыя), так і ў форме манархіяў, абмежаваных парламентам (Англія). Часцей за ўсё першым прыкладам рэалізацыі гэтае з'явы ў сусветнай гісторыі лічыцца Францыя ў перыяд рэвалюцыі 1789–1793 гг. Аднак, як вельмі дэталёва паказаў Лія Грынфельд, Англія яшчэ ў XVI ст. рэальна была першай краінай, дзе народ сфармаваўся ў нацыю. Больш за тое, ёсць навуковыя працы, у якіх сляды нацыяналізму знаходзяць яшчэ ў Сярэднявеччы. Прыкладам, гэта адзначана ў працы Е. Гейзінга "Нацыяналізм у Сярэднявеччы" (Беларускі гістарычны агляд. Т. 2, Мн., 1995).

Большасць навукоўцаў усё ж лічаць нацыяналізм ідэалогіяй новага часу, бо гэты панятак трывала замацаваўся ў XIX ст. А XX ст. называюць стагоддзем нацыяналізму.

Тэорыя нацыяналізму пачала інтэнсіўна развівацца яшчэ да II сусветнай вайны і ў цяперашні час мае

досыць вялікую бібліяграфію. Даследаванні ў гэтай галіне звязаны з імёнамі такіх ведамых навукоўцаў, як Энтані Сміт, Ганс Кон, Луі Снайдэр, Джона Хатчынсон, Карлтан Хайес, Бойд Шэйфер, Эрнст Гелнэр і іншыя.

Некаторыя даследнікі лічаць, што сярод іншых сусветных ідэалагічных дактрын, нацыяналізм цяпер займае даміноўнае становішча і адлюстроўвае наймацнейшыя палітычныя працэсы сучаснасці. Таму вывучэнне гэтай з'явы і звязаных з ёй панятkaў, такіх, як нацыя, нацыянальнасць, этнас і народ мае вылучнае значэнне.

Тэорыя нацыяналізму распрацоўвалася да нядаўняга часу толькі заходнімі навукоўцамі, хоць у канцы XIX – пачатку XX стст. вялікія дасягненні ў гэтай галіне зрабілі выдатныя рускія рэлігійныя філосафы Мікалай Бярдзяеў, Уладзімір Салаўёў, Іван Ільін, Канстанцін Лявонцьеў, Мікалай Кляпенін, іншыя. Аднак пасля 1917 г. усе гэтыя мысляры мусілі эміграваць і працягнулі свае даследаванні за мяжой. Савецкая ж навука, калі і ўспамінала нацыяналізм, то толькі ў адмоўным кантэксце: лічылася, што гэта ідэалогія капіталістычнага свету і нацыяналізм прыраўноўваўся да фашызму. Толькі па развале Савецкага Саюза і ўтварэнні на яго месцы шэрагу незалежных дзяржаў можна было аб'ектыўна вывучаць нацыянальныя працэсы ў грамадстве.

З'явіліся і адпаведныя навуковыя працы, як у Расіі, прыкладам, артыкул І. Е. Кудраўцава "Национальное "Я" и политический национализм" (Полис, 1997. № 2.), так і ў іншых рэспубліках, у тым ліку і ў Беларусі. Важнай падзеяй у жыцці Беларусі была першая навуковая міжнародная канферэнцыя "Беларуская нацыянальная ідэя", што праходзіла ў красавіку 1999 г. у Горадне.

Дагэтуль большасць гісторыкаў і філосафаў савецкіх часоў пільнуюцца традыцыйнай канцэпцыі нацыяналізму як ідэалогіі буржуазнага грамадства, як дактрыны, што заклікае да нацыянальнай варо-

жасці, яны ставяць яе побач з фашызмам. Такую тэндэнцыю савецкія ідэолагі перанялі яшчэ з дарэвалюцыйных часоў.

З другой паловы 80-х гадоў нашага стагоддзя пачалося пераасэнсаванне шмат якіх ідэалагічных дактрын. Па-новаму пачалі ставіцца да нацыянальнай ідэі, змяніўся і пагляд на нацыяналізм як адмоўную з'яву. Адкрыўся доступ да замежных выданняў, былі перакладзены першыя кнігі замежных навукоўцаў, дзе тыя праблемы сур'ёзна прааналізаваныя ў святле сучасных палітычных працэсаў і тэндэнцыяў. Разгледзім найбольш істотныя аспекты праблемы нацыяналізму, якія развіваліся на Захадзе ў XX ст.

Існуе вялікая колькасць азначэнняў нацыяналізму, дадзеных рознымі аўтарамі на падставе асабістых бачанняў гэтае дактрыны. Адзін з найстарэйшых даследнікаў дадзенай з'явы К. Хайес яшчэ ў 30-я гады XX ст. даў такое азначэнне: "*Нацыяналізм – гэта найвышэйшая адданасць людзей досыць шырокай нацыянальнасці і сведамае абгрунтаванне прыналежнасці да палітычнай нацыі супольнасцю мовы і нацыянальнай культуры*". Л. Снайдэр вылучае ў сваім азначэнні групавыя адчуванні людзей, адзінства мовы, традыцыяў і рэлігіі.

Для народаў, якія яшчэ толькі ступаюць на дарогу самавызначэння, нацыяналізм найперш увасабляе веру ў магчымасці свайго народа. Так, даследнікі азіяцкага і афрыканскага нацыяналізму Руперт Эмерсон і Рычард Кот сцвярджаюць, што нацыяналізм – гэта "вера часткі вялікай групы людзей у тое, што яны складаюць палітычную супольнасць, нацыю, якая мае права на незалежную дзяржаву, гатоўнасць гэтай групы праяўляць сваёй супольнасці пераважную і вылучную адданасць".

Сярод найшырэйшых азначэнняў трэба вылучыць фармулёўку Б. Шэйфера[1]. Ён адзначае дзесяць атрыбутаў нацыяналізму:

---

[1] Shafer B.C. Faces of nationalism. N.Y. Marcourt, Brace Lovanovich, 1972. XV, p. 491–513.

· *тэрыторыя, дзе жыве народ. Ён лічыць яе сваёй і працівіцца памяншэнню яе памераў;*

· *супольная культура народа (мова, літаратура, звычаі, традыцыі);*

· *паноўныя эканамічныя і грамадскія інстытуты, за якімі стаяць эканамічныя і сацыяльныя інтарэсы насельніцтва;*

· *незалежнасць дзяржавы ці жаданне стварыць яе;*

· *вера ў супольную гісторыю і паходжанне свайго народа;*

· *прыхільнасць да людзей сваёй нацыянальнасці;*

· *гонар за мінулыя ці сучасныя дасягненні і супольныя перажыванні, за перажытыя беды і трагічныя падзеі;*

· *абыякавасць ці варожасць у дачыненні да некаторых нацыяў, асабліва да былых прыгнятальнікаў;*

· *адданасць існасці, якая завецца нацыяй (Бацькаўшчынай, Айчынай) і становіць тэрыторыю, народ, культуру, спадчыну і г. д.;*

· *надзея, што краіне, нацыі і індывідам у ёй забяспечана поўная бяспека і шчаслівая будучыня.*

У прыточаным азначэнні, нягледзячы на даволі ёмістую фармулёўку, ёсць адна істотная загана ў восьмым пункце, які датычыць варожасці да іншых нацыяў. На нашую думку, гэта не заўсёды так. Больш за тое, сапраўдны нацыяналізм, узрошчаны на хрысціянскіх каштоўнасцях, хрысціянскай любові да бліжняга, не можа выклікаць варожых пачуццяў, як да іншых, суседніх, нацыяў, так і да народаў – былых прыгнятальнікаў, – бо адна з хрысціянскіх запаведзяў заклікае любіць і ворагаў сваіх. Ніжэй мы больш падрабязна спынімся на гэтым пытанні.

Тым не менш, ёсць сярод нацыянальных плыняў у некаторых народаў уласцівасць, адзначаная Б. Шэйферам у восьмым пункце. Менавіта гэтая варожасць да не сваіх, да суседзяў часта ёсць прычынай сур'ёзных канфліктаў паміж народамі. Яна можа выклікаць і скрайнюю форму нацыяналізму, як фашызм ці расізм. Аднак такія адмоўныя праявы даволі рэд-

кія і ўласцівыя перадусім не хрысціянскім народам. Сапраўдны ж, "чысты", нацыяналізм зазвычай антыпод фашызму, што і адзначаў Энтані Сміт у сваёй класічнай кнізе.

Сярод сучасных азначэнняў нацыяналізму трэба вылучыць цікавае і звязанае з гістарычнай рэтраспектывай азначэнне Г. Кона, які адносіць гэтую з'яву да стану грамадскай псіхалогіі. Кон разглядае гісторыю як паслядоўнасць змен у грамадскай псіхалогіі, у стаўленні чалавека да праяў індывідуальнага і грамадскага жыцця: мовы, тэрыторыі, традыцыяў, такіх адчуванняў, як адданасць Бацькаўшчыне і сям'і, якія адлюстроўваюць змены ў грамадскай псіхалогіі. Г. Кон робіць выснову, што нацыяналізм – гэта "стан розуму", гэта "ідэя, намаганне, якія запаўняюць мозг і сэрца новымі думкамі і новымі адчуваннямі і кіруюць чалавекам, каб перавесці яго свядомасць у справу арганізаванага дзеяння". Менавіта такі падыход стаў стрыжнем фармулёўкі азначэння нацыяналізму ў Брытанскай энцыклапедыі: "*Нацыяналізм азначаецца як стан розуму, у якім індывідуальныя адчуванні кожнага ў яго найвышэйшай, векавой адданасці да нацыі – дзяржавы.*"

Усе разгледжаныя вышэй азначэнні маюць аднолькавую загану: яны амаль не ўлічваюць рэлігійнага чынніку: уплыву хрысціянства на светагляд чалавека і нацыянальныя асаблівасці. Менавіта гэта адрознівае сучасных заходніх філосафаў ад славутых рускіх рэлігійных філосафаў канца XIX – першай паловы XX ст.

Акрамя вельмі пераканаўчай хрысціянскай канцэпцыі нацыяналізму М. Бярдзяева, пераказанай вышэй, мне б хацелася засяродзіць увагу на паглядах І. Ільіна – таксама прадстаўніка рускай эмігранцкай інтэлігенцыі. З'яўляючыся рэлігійным філосафам, І. Ільін нацыю і нацыяналізм бачыў цалкам у свеце Божага тварэння. Ён пісаў: "*Нацыяналізм ёсць упэўненае і моцнае адчуванне, што* ***мой народ таксама атрымаў дары Духа Святога****, што* ***ён прыняў іх сваёй і інстынктыўнай адчувальнасцю і творча***

***пераўтварыў іх па-свойму*** *... таму нацыяналізм праяўляецца перш за ўсё ў* ***інстынкце нацыянальнага самазахавання****, і гэты інстынкт ёсць стан* ***правільны і апраўданы...*** *ён* ***падпарадкаваны законам дабра і духа***" ("О русском национализме").



І. Ільін (1883–1954) – рэлігійны філосаф. Даў абгрунтаванне нацыяналізму ў хрысціянстве

Ільін вылучыў тры наступныя рысы нацыяналізму: **любасць** да гістарычнага мінулага і творчага дзеяння свайго народа, **веру** ў інстынктыўную і духовую сілу свайго народа і **волю** да таго, каб свой народ быў годным дзельнікам у сям'і народаў Зямлі.

Істотнае дапаўненне да думак памянёных філосафаў зрабіў М. Кляпенін у артыкуле "Мысли о религиозном смысле национализма", які быў надрукаваны ў Францыі ў часопісе "Путь" за 1927 год. Кляпенін звязаў нацыяналізм з найвышэйшай ступенню хрысціянскай любові: "*Як і любоў да бацькоў, сям'і і сваякоў,* ***нацыяналізм ёсць менавіта пэўная ступень раскрыцця ўсяленскай любові***".

На маю думку, найбольш аптымальны пагляд на нацыяналізм ляжыць у спалучэнні ідэй, выпрацаваных заходнімі аўтарамі і падыходаў рускіх рэлігійных філосафаў, якія ўзводзілі хрысціянскую любасць у ранг палітычнага прынцыпу. Выходзячы з гэтага, дамэтна ўлучыць у структуру нацыяналізму наступныя кампаненты:

· *любасць да свайго народа;*

· *любасць да свайго краю;*

· *гонар за гісторыю свайго народа;*

· *павага і адчуванне адметнасці і непаўторнасці сваёй мовы;*

· *любасць да сваёй Айчыны, ці патрыятызм;*

· *вера ў Божае прызначэнне свайго народа;*

· *боль за няўдачы свайго народа і радасць за яго поспехі.*

Як бачым, такі ведамы панятак, як патрыятызм у нашым азначэнні ёсць толькі складовай часткай шырокай, касмічнай з'явы – нацыяналізму.

Прыточаная карэляцыя паміж нацыяналізмам і патрыятызмам адзначалася і іншымі даследнікамі. Так, Е. Гейзінга прааналізаваў паняткі **patria** (айчына) і **natio** (народ) і зрабіў такую выснову: слова **natio** куды шырэй, чым **patria**, хоць яны абазначаюць і блізкія паняткі. У XI ст. у Францыі, прыкладам, слова **patria** абазначала графства ці іх групу і было эквівалентна слову **terra** (зямля). Слова ж **natio** не мела адміністрацыйнага значэння, а адносілася да сферы пачуццяў, што потым і перарасло ў тую з'яву, якую мы називаем нацыяналізмам.

Нацыяналізм знаходзіць сваё канкрэтнае ўвасабленне ў такім панятку, як нацыя, адпаведна і нацыя стварае сваю духовую ды ідэалагічную абалонку – нацыяналізм.

Адзначу, што мы гаворым пра нацыяналізм як духовую з'яву, аднак можна запярэчыць, маўляў, ёсць і іншыя праявы духовасці – культура, мова, эстэтыка і г. д. Што да гэтых паняткаў – адразу можна сказаць: яны не існуюць абстрактна. Культура, мова і ўсё іншае, што датычыць духовай сферы, заўсёды нацыянальныя. Нацыя абуджае ў чалавеку наймацнейшыя пачуцці і творчыя сілы, найбольшую гатоўнасць да вялікіх учынкаў. Наагул, чалавек заўсёды ўчынны і творчы толькі сярод уласнага народа, які яго лепш разумее і лепш выкарыстоўвае.

## Раздзел II
# ГІСТАРЫЧНЫЯ ПАДСТАВЫ ЎЗНІКНЕННЯ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ І БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛІЗМУ

…ёсць думка, што Збавіцель быў Яўрэем…
для многіх яна – яўная спакуса…
але ж чаму ніяк не зразумеем:
Хрыстос быў Свята-Русам!?

…так!..– большасьць прававерных Іудзеяў
“Распні, распні Яго!…–
лямантавала…
…а Русь Святая –
праз вякоў завеі –
Яго і прыняла і спавядала…

*Зьніч*

## 1. Мой пагляд на гісторыю беларускай нацыі

Беларуская нацыя складвалася не адно стагоддзе, і працэс яе фармавання не завершыўся да гэтай пары. Могуць запытацца, на якой падставе я лічу, што працэс утварэння нашай нацыі яшчэ не скончыўся. Гэта вынікае з усім ведамых і даўно набалелых праблем. Найперш даецца ў знакі занядбаны стан беларускай мовы і культуры. Але найбольшы сум выклікае ***неразуменне патрэбнасці беларускага нацыянальнага мыслення на дзяржаўным узроўні***. Што вядзе да ліквідацыі беларускамоўных школ, дзіцячых садкоў, наагул беларускамоўнай адукацыі.

Як і кожная нацыя, беларуская нацыя ёсць вынікам эвалюцыйнага пераходу беларускага этнасу ў якасна новы стан – нацыю. Таму рэтраспектыўна шлях фармавання нашай нацыі можна падаць наступным чынам:

1. Утварэнне этнасу; час: каля 1000 год таму (пачатак).

2. Развіццё і завяршэнне фармавання этнасу ў XV–XVI стст. з адметнымі беларускімі рысамі.

3. Пачатак утварэння нацыі (сярэдзіна – канец XIX ст.).

4. Фармаванне нацыі (XX – пачатак XXI ст.).

5. Завяршэнне фармавання беларускай нацыі і паўнавартае існаванне беларусаў як нацыі (магчыма пасля 20–30-х гг. XXI ст.).

Перш чым брацца за высвятленне ўсялякіх акалічнасцяў, звязаных з беларускай нацыяй і з беларускім нацыяналізмам, – трэба ад самага пачатку высветліць крэда, ***правілы аўтаравай гульні*** ў гэтым пытанні, бо, прынамсі, ёсць розныя прэцэдэнты.

Можна дзеіць і ў святле савецкае гістарыяграфіі, адлічваць пачатак беларусаў як нацыі ад Кастрычніцкай рэвалюцыі і пад тое выказаць глыбокую падзяку старэйшаму брату, маўляў, ён выцягнуў нас з цемры.

А можна лічыць днём незалежнасці Беларусі, і тым самым пачатак нашай гісторыі, 1944 год, год вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Тут і мадэрн і нават суперпостмадэрн.

А можна ўзяць за аснову мадэль найбольш ведамую і бяскрыўдную: беларусы – гэта адна з трох галін старажытнага ўсходнеславянскага племені, цэнтрам якога была Кіеўская Русь.

З апошнім можна было б пагадзіцца, але такой мадэлі не досыць. Бо ўвесь наступны пасля Кіева перыяд, што доўжыўся аж да акупацыі Рэчы Паспалітай Расіяй (блізу XVIII–XIX стагоддзяў!), паўночна-ўсходнія славяне, якія ўтварылі Масковію, а потым і Расійскую Імперыю, і заходнія славяне, што аб'ядналіся ў Вялікае княства Літоўскае, жылі сваім незалежным жыццём. І менавіта на гэты перыяд прыходзіцца пераважная частка нашай гісторыі, гэта час фармавання этнасу, розных працэсаў асіміляцыі, змяшэння крыві, у рэшце рэшт фармаванне нацыянальнага характару, ментальнасці і як вынік – нацыі.

Цяпер вернемся да фармулявання асноватворных прынцыпаў, на якіх будуць грунтавацца нашы погляды на беларускую гісторыю.

**Прынцып першы.** Ён датычыць гэтак званай праблемы "славянскага брацтва". Рызыкну сцвярджаць, што ***няма ніякага славянскага брацтва, як і няма***

*адзінага славянскага племя*. Ёсць група моў, якія паядноўваюцца ў групу славянскіх моў. Таксама, як існуе, прыкладам, група раманскіх моў, носьбіты якой народы розных краін – Італіі, Францыі, Румыніі і г. д., але ж ніхто не дадумаўся казаць пра нейкае "брацтва" гэтых краін і спекуляваць, такім спосабам, на мажлівых палітычных праектах, супольных для гэтых краін.

Аналіз гістарычнага лёсу паказвае на блізкасць беларускага этнасу да наступных этнасаў: літоўскага (балцкага) і ўкраінскага. Менавіта наша супольнае паходжанне і ўзаемныя ўплывы – найбольш відавочныя. Што тычыцца ўкраінцаў, то, на маю думку, працяглы час мы былі, фактычна, адным народам – прынамсі ў часы ВКЛ. У нас адныя і тыя ж нацыянальныя героі, старабеларуская (ў Украіне лічаць, што яна – стараўкраінская) мова, адны песні, казкі, паданні. Падзел этнасу пачаўся не так і даўно – недзе ўжо з часоў Рэчы Паспалітай. Украінцы лічаць, што Статут ВКЛ, напісаны "українською мовою". Мы лічым – "беларускай". Гэта значыць, што мова тады ў нас была адна (зразумела – розніца ў гутарцы насельніцтва ў розных мясцінах заўсёды ёсць, але, як цяпер прынята гаварыць, – на дыялектным узроўні). Але пазней сфармаваліся дзве розныя мовы і дзве нацыі – беларуская і ўкраінская.

Зусім іншая рэч – рускі этнас. Па-першае, не прагглядваецца буйнога цэнтра, накшталт Полацка ці Кіева, вакол якога гуртавалася б будучая руская нацыя. Прынамсі ў часы Кіеўскай Русі. Суздаль? Ноўгарад? Цвер? Трохі пазней (на 2–3 стст.) такім цэнтрам стала Масква. Але гэта ўжо пазней. І не "трохі", а значна пазней – калі палітычная мапа як Еўропы, так і Азіі істотна змяніла свае абрысы. І, пачынаючы з XV–XVI стст., Маскоўскае царства пачынае прэтэндаваць на ролю галоўнай славянскай усходняй дзяржавы і нават атрымоўвае саманазву Трэці Рым). І потым доўгі час (да канца XVIII ст.) дзве буйныя славянскія дзяржавы – ВКЛ і Масковія – спадкаемцы Кіеўскай Русі,

будуць аспрэчваць сваё лідэрства ва ўсіх галінах, пакуль ВКЛ не атрымае паразы ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай.

**Прынцып другі.** ***Беларусь – сэрца Еўропы.*** Беларуская культура гэта не нейкая, **пераходная, памежная культура** паміж Еўропай і Азіяй, паміж Польшчай і Расіяй – а цалкам самастойная культура, якая наадварот – *зрабіла і робіць уплыў на заходнія рэгіёны і ўсходнія, на поўдзень і на поўнач.* Правамоцнасць такой думкі пацвярджае дзейнасць тысяч этнічных беларусаў, якія ўвайшлі ў гісторыю іншых краін, сталі нацыянальнымі зоркамі Польшчы, Літвы, Францыі, Амерыкі і іншых. Прыкладам, наш суайчыннік Адам Міцкевіч стаў класікам польскай літаратуры, Фёдар Дастаеўскі – геній рускай літаратуры, Гіём Апалінэр – французскі паэт, а Ігнат Дамейка – нацыянальны герой Чылі. Цікава, што ў творчасці кожнага з гэтых людзей можна адчуць, убачыць Беларусь.

***Беларусы – арыйскі народ.*** З усіх славянскіх народаў (паводле іншай версіі і балцкіх) яны найбольш захавалі чысціню сваёй нацыі, што пацвярджаецца мовай, якая максімальна захавала старажытныя рысы і, як даводзіць С. Суднік, блізкая да санскрыту, яны ганарацца сваімі аўтэнтычнымі спевамі і танцамі, высокім інтэлектам і працаздольнасцю.

І нельга гуляць у вельмі небяспечную гульню, распачатую П. Севярынцам, які напісаў у кнізе "Нацыянальная ідэя" наступныя радкі: "...большасць "літоўскіх", "рускіх", "польскіх" ды "савецкіх" габрэяў – носьбіты ўзнёслае, светлае, адухоўленае беларускае ментальнасці". І гэта ў кнізе пра *беларускую* нацыянальную ідэю! І зусім ужо абразліва наш нацыянальны герой-хімік заканчвае раздзел: "Такі праўда, кожны з нас хоць крыху габрэй!" Можа, ужо Беларусі пара назвацца "Ізраіль № 2"? Я прапаную аўтару гэтай кнігі перакласці яе на іўрыт і назваць "Габрэйская нацыянальная ідэя на Беларусі". Не блытайце габрэяў з беларусамі, раві моладзі Севярынец!.. Так і хочацца сказаць: не блытайце божы дар з яеч-

няю! Лепш запытайце ў беларускіх бабак, кім быў Абрам на сяле і як ён спойваў іхніх гаспадароў. І тады зразумееце, што такое беларуская ментальнасць у габрэяў і чаму іх так не любяць часамі тыя самыя бабкі.

Маё крэда абсалютна іншае – *беларусы захавалі найстаражытнейшыя рысы і унікальны генатып.* І тут нечакана вымалёўваецца новы найвышэйшы сэнс, звязаны толькі з беларусамі. Маю на ўвазе тое, што мы маем нацыянальны сцяг у выглядзе трох палос – белай, чырвонай і зноў белай. І менавіта такія колеры аздабляюць вопратку найвышэйшых царкоўных чыноў, біскупаў, у беларускай праваслаўнай Царкве. А калі ўлічыць, што ў першыя стагоддзі пасля прыняцця хрысціянства існавала сімфонія дзяржавы і Царквы, г. зн., што яны існавалі як адзіны арганізм, то *гэтая бел-чырвона-белая гама з царкоўнага жыцця накладваецца на ўсё культурнае і грамадскае жыццё старажытнай Беларусі.* І няма больш такой краіны, як праваслаўнай, так і каталіцкай, дзе б царкоўныя і дзяржаўныя сімвалы супадалі! Толькі Беларусь мае такую ўнікальную гаму! Бел-чырвона-белы сцяг адзін з найунікальнейшых, найхарашэйшых і наканаваных Госпадам сімвалаў.

І ўспомнім яшчэ Хрыстову кроў на плашчаніцы. Тыя самыя колеры – белы, чырвоны і белы...

Сімвалы, сімвалы. Але ўжо паціху спее новая асацыяцыя – Ісус Хрыстос і Беларусь. Такая, недзе трансцэндэнтная, лучнасць натхняе мяне пабудаваць наступны ланцужок.

Гэты ланцужок прыводзіць, магчыма, да фантастычных высноў, але ўсё ж паслухайце...

...Наш Збаўца Ісус Хрыстос нарадзіўся ў Галілеі, той частцы Палесціны, дзе спакон вякоў жылі негабрэйскія плямёны – хананеяне. Хананеяне былі арыйцамі, прадстаўнікамі каўказскай, белай расы. Прыкладна 1300 гадоў да Н. Х. пачаліся безупынныя войны за права жыць на тэрыторыі Галілеі рознымі плямёнамі, і гэтую спрэчку распачалі прышлыя габ-

рэі. У 772 г. да Н. Х. асірыйскі цар Саргон цалкам разбіў Царства Ізраіля, пасля ён высяліў рэшту разбітых габрэйскіх плямёнаў, і ў Палесціне засталося толькі калена Юдава – ў Юдзеі. І Галілея стала найчысцейшай ад семітаў. Прарок Ісайя называе гэтую зямлю "Галілея паганская". У гэтыя самыя часы сюды прыйшлі народы з поўначы. У Бібліі пра гэтыя падзеі гаворыцца наступнае: "І было да мяне слова Госпада-ва: сын чалавечы! Звярні твар твой да Гога ў зямлі Магог, князю Рота, Мецеха і Фувала" (Іезекіль 38, 1–2). А даўно ведама меркаванне, што гэтыя людзі ("Гог з зямлі Магог") былі скіфы, яны прыйшлі з Поўначы і былі продкамі людзей з белай скурай, індаеўрапейцаў. У Галілеі імі быў заснаваны нават горад – Скіфопаль. Скіфы, як пішуць многія гісторыкі, былі продкамі народаў у Шумерах, усёй Малой Азіі і славянскіх плямёнаў – "русаў", якія пазней аб'ядналіся ў дзяржаву "Кіеўская Русь".

І таму пашыранае сярод праваслаўных вернікаў меркаванне, што Дзева Марыя мае сваё паходжанне не ад габрэйскіх плямёнаў, а ад нашчадкаў скіфаў, г. зн. ад старажытнарускай народнасці, мае шмат падстаў. Скіфопаль быў усяго за 20 міляў ад Назарэта. У гэтым рэгіёне гаварылі на арамейскай мове, выхоўваліся ў рэчышчы грэцкай культуры і арыйскіх народаў.

Такім парадкам, выходзячы з шматлікіх гістарычных фактаў, мы няўхільна прыходзім да высновы, што зямное паходжанне Ісуса Хрыста можа мець найбеспасярэднейшае дачыненне да нашых продкаў скіфаў-славян, а значыць, і да нас, беларусаў, бо "белыя русы" найбольш чыстае і старажытнае адгалінаванне плямёнаў, што складалі насельніцтва Кіеўскай Русі.

І галоўнае: ***наш бел-чырвона-белы сцяг сімвалізуе збаўчую ахвяру Хрыста, укрыжаванага на Галгофе***, гэта ягоная кроў на чыстым, беззаганным Божым стварэнні Шостага дня – чалавеку, створанага на вобраз і падобнасць.

Гэтыя паралелі не могуць быць выпадковымі, ***Беларусь мусіць быць абранніцай Божай***. Беларусь не

толькі геаграфічны цэнтр Еўропы, Беларусь – цэнтр хрысціянства. Як тут не ўспомніць праекты інака Мікалая (у свецкасці – Алега Бембеля) аб аб'яднанай хрысціянскай дзяржаве з цэнтрам у Беларусі.

Вось такая атрымалася нацыянальная гісторыя беларусаў з самых вытокаў, з пачатку новай гісторыі чалавецтва, што пачала свой адлік пасля з'яўлення месіі – Збавіцеля чалавецтва Іісуса Хрыста. Канечне, сапраўднае навуковае абгрунтаванне прапанаванай гіпотэзы тут адсутнічае, але ўсё наперадзе. На першым этапе станаўлення любой канцэпцыі вызначальную ролю адыгрывае вера.

**Прынцып трэці.** Гісторыя Беларусі павінна быць ***нацыянальнай.*** Гэта гісторыя беларускага этнасу, беларускага народа, беларускай расы і, нарэшце, беларускай нацыі. Беларусь мае бязмала тысячагадовую гісторыю. Бо пачатак яе – абвяшчэнне незалежнасці Полацка і Турава ў X–XI стст. І гэта вялікі гонар – ведаць, што ты належыш да народа, які сваю дзяржаўную незалежнасць датуе тысячагоддзем. *Мы былі тады, калі Масквы яшчэ не было...*

**ВКЛ было дзяржавай з выразным беларускім характарам, беларускай культурай і дзяржаўнай беларускай мовай.** ВКЛ існавала **больш за 5 стагоддзяў** (ад заснавання Наваградскай дзяржавы каля 1240 г. – да падзелу Рэчы Паспалітай у канцы XVIII ст.) і была адной з наймагутнейшых еўрапейскіх дзяржаў. Яе межы ў пэўныя часы ахоплівалі вялізную прастору – ад Балтыйскага да Чорнага мора. Беларусы засялялі тэрыторыю сучаснай Беларусі, Віленскага краю (цяпер Літва), Смаленскай і Бранскай абласцей да Мажайску, Цверы, Каломны (блізу Масквы), Беластоцкага ваяводства (цяпер Польшча) і часткі Чарнігаўскай вобласці (цяпер Украіна). Акрамя таго Калінінградскую вобласць засялялі ў асноўным беларусы...

***Вялікае княства Літоўскае было беларускай дзяржавай.*** Усе князі ВКЛ, пачынаючы ад першага князя Міндоўга, карысталіся беларускай мовай не толькі ў справаводстве, але і ў звычайнай гутарцы. Няма ніякіх

сведчанняў аб нейкай сувязі ці нейкім падабенстве іх роднай мовы з мовай жамойтаў і аўкштайтаў – базавым этнасам сучасных літоўцаў. Мова "Літвы" Сярэднявечча – беларуская, а ліцвін – гэта назва беларуса тых часоў. Усе асноўныя гістарычныя падзеі, навуковыя і літаратурныя здабыткі ВКЛ звязаны вылучна з беларусамі (і ў адпаведнай меры з украінцамі), але не з сучаснымі літоўцамі, ці, як іх яшчэ завуць, – з летувісамі. Гэта значыць, што ўся нахабна прысвоеная гісторыя сучасных літоўцаў належыць не суседняй краіне – Літве, а Беларусі. Сорам нам, што наш спрадвечны герб Пагоня – герб іншай суседняй краіны – Літвы і наша сталіца Вільня чамусьці (нават у нас!) завецца Вільнюсам. Сорам нам, што наша краіна, якая ў XIII–XVI стст. задавала тон сусветнай цывілізацыі і несла беларускую культуру далёка на Захад, у наш час без усялякіх на гэта падстаў страціла сваю гістарычную назву, якую "падабралі" ў сучаснай Літве, размешчанай насамрэч на паўднёвы захад ад тэрыторыі сапраўднай, летапіснай Літвы, што месцілася ў басейне сярэдняга цячэння Нёмана.

*Менавіта беларусы прынеслі хрысціянства сваім суседнім паганскім народам жамойтам і аукштайтам, прынеслі разам з ім еўрапейскую культуру і ў літаральным сэнсе "вывелі іх з лесу". Прынамсі, толькі ў канцы XIX ст. людству стала ведама пра існаванне літаратурнай літоўскай мовы і наагул пра існаванне літоўцаў і Літвы ў сучасным сэнсе – як неславянскай і небеларускай дзяржавы.*

І далёка не другарадная падзея – друкаванне першых кніг (Бібліі, катэхізісу і інш.) у ВКЛ на беларускай мове. Першы друкарскі станок, што працаваў на кірылічным алфавіце, быў створаны Ф. Скарынам больш чым на паўстагоддзі раней за станок першадрукара Масковіі Фёдарава. Зрэшты, і Фёдараў паходзіў з Беларусі і меў ад нараджэння прозвішча Федаровіч...

Ці яшчэ адзін штрых. Беларусы ў XVII ст. адбудавалі Маскву (пра гэта пісаў нават Лаўрэнцій Абэ-

цэдарскі) і засялілі яе сваімі найлепшымі сынамі, так што нашчадкамі іх ёсць сучасныя карэнныя масквічы. Гэта не выпадкова, бо ровень культуры, навукі і тэхнікі ў ВКЛ тых часоў на парадак перасягаў суседнюю Масковію.

Наагул, пералік унёску беларусаў у сусветную культуру можна працягваць бясконца, і я буду як мага старацца пра гэта казаць.

***Гісторыя Беларусі і яе тытульнай нацыі – беларусаў яшчэ не напісаная.*** Яна мусіць быць перапісана вылучна ў нацыянальным духу, без аглядкі на Маскву, Польшчу і Літву, і я б дадаў, ідучы за духам часу, – без аглядкі на Еўропу. Яна павінна быць перапісаная так, каб там не было месца такім выразам, як "ВКЛ – беларуска-літоўская дзяржава", а заменена – "***ВКЛ выключна беларуская дзяржава***". (З цягам часу слова "выключна" можна паступова апускаць). І руска-польскія войны Масковіі, пра якія так любяць апошнім часам гаварыць модныя гісторыкі, у значнай ступені не толькі войны з Польшчай, а і з Беларуссю, і, можа, з апошняй нават у большай ступені. І не трэба замоўчваць далікатны момант, звязаны з святкаваннем Расіяй 4 лістапада гэтак званага "Свята Замірэння", якое было прызначана на гэтую дату на знак вызвалення Рускай дзяржавы ад "палякаў" у 1612 годзе. Тыя "палякі" ў вялікай ступені былі ў сапраўднасці беларусамі! І калі я чацвёртага лістапада іду ў свой Свята-Пятра-Паўлаўскі храм, каб адзначыць дзень Казанскай Божай Маці, то заўсёды думаю пра тое, што нам трэба быць больш сумленнымі і шчырымі ў такіх пытаннях і не забывацца, што праваслаўная дзяржава ВКЛ тых часоў і праваслаўная маскоўская дзяржава суіснавалі ў не вельмі сяброўскіх дачыненнях. І свята адной дзяржавы – часта было трагедыяй для другой, і наадварот.

Нацыянальная гісторыя Беларусі патрэбная. Мы наноў павінны прайсці нашу тысячагадовую гісторыю, перапісаць падручнікі, манаграфіі, усю літаратуру з пазіцый нашай нацыянальнай ідэі.

І гэта цяжкі шлях, але ён патрэбен. Ён патрэбен таму, што Беларусь любіць Бог, і ён папусціў безліч розных няправых правадыроў, здраднікаў, сярэбралюбцаў і Юдаў. Ён даў нам цяжкі шлях выпрабаванняў, і мы павінны несці гэты крыж, мы павінны прайсці шлях каяты і толькі потым мы атрымаем "безумоўную асалоду" і станем добрай хрысціянскай краінай...

## 2. Старажытнасць беларускага этнасу

Час узнікнення беларускага этнасу мае бязмала тысячагадовы тэрмін. Ужо з часоў Кіеўскай Русі выяўляецца адметнасць жыхароў, што насялялі тэрыторыю сучаснай Беларусі. Як ведама, з XI–X стст. на аснове старажытных славянскіх плямёнаў крывічоў, драўлянаў і радзімічаў з'явіліся першыя дзяржаўныя ўтварэнні нашых продкаў, якія насілі назоў Полацкае і Тураўскае княствы. Прынята таксама лічыць, што гэтыя княствы ўваходзілі ў склад адзінай дзяржавы – Кіеўскай Русі.

Я пільнуюся тае думкі, што акрамя трох памянёных плямёнаў, продкамі беларусаў было таксама і племя літва, якое рассялялася на вялікім абшары тэрыторыі сучаснай Горадзеншчыны і Міншчыны. Дакладныя абсягі летапіснай Літвы даволі пераканаўча вызначыў М. Ермаловіч у сваёй кнізе "Па слядах аднаго міфа". Але, на ягоную думку, племя літва было балцкага паходжання. Паводле сведчання іншых, літва не балцкага і, нават, не угра-фінскага, – як гэта лічыў І. Ласкоў, – а славянскага паходжання. Так, чэшскі даследнік П. Шафарык сцвярджае, што слова "літва" – скажонае слова "лютва". Славянскае ж племя велеты-люцічы, як добра ведама гісторыкам, рассялялася таксама на тэрыторыях сучасных Горадзеншчыны і Віленшчыны.

Пазней, калі пачалося ўтварэнне Вялікага княства Літоўскага, літва змяшалася з іншымі славянскімі плямёнамі – крывічамі і дрыгавічамі, утварыўшы сучасных беларусаў. Сведчаннем, што люцічы-літва

былі народамі з мовай, блізкай да суседніх славянскіх народаў, ёсць тое, што іх мова стала дзяржаўнай мовай ВКЛ. Дык вось, нашыя продкі здолелі захаваць праз стагоддзі сваю мову, хоць і аддалі яе назву (літоўцы-ліцвіны) балцкаму племені жмудзі.

Існуе аднак і іншая думка пра этнагенез беларусаў – канцэпцыя балцкага паходжання. Чаму мы заўсёды так намагаемся падкрэсліць славянства беларусаў? Што значыць быць славянінам? А нічога не значыць. Адзінае, што можа быць бясспрэчным – гэта блізкасць моў, якія мы з гэтай прычыны гуртуем у адну сям'ю і называем яе сям'ёй славянскіх моў. У іншым, пачынаючы з расавых прыкмет, антрапалагічных і генетычных фактараў, размова пра адзінства непазбежна прыйдзе да тупіковага выніку. Якія славяне, скажам, балгары, што прыйшлі ў свой час на Балканы аднекуль з-пад Урала і засвоілі мясцовую славянскую гаворку? Падобная сітуацая магла здарыцца і на тэрыторыі Беларусі, дзе мясцовыя балцкія плямёны з нейкіх прычынаў, можа, палітычных ці ў выніку культурнай перавагі славянскамоўнага насельніцтва, перайшлі паступова на іншую мову – славянскую.

Ёсць аналагічны пагляд і на паходжанне рускай нацыі. Я. Халмагораў у сваім "Рускім нацыяналісце" наўпрост піша: "Хіба рускія – славяне? Не. Рускія не чэхі, не палякі і тым больш не харваты... Ім не патрэбны для асабістай самаацэнкі ніякія доказы таго, што яны этнічна бліжэй да славян, чым да шведаў..." Сапраўды, роля розных этнасаў, асабліва татар, у фармаванні рускага этнасу даўна вядомая.

Найпаслядоўней сцвярджае канцэпцыю балцкага паходжання беларусаў С. Санько. Ён прыходзіць да формулы: "Беларусы – славянскамоўныя балты". У артыкуле "Этнагенез беларусаў: навука і ідэалогія", надрукаваным у часопісе "ARCHE" (№ 11, 2006) С. Санько разам з А. Дзермантам пішуць: "Аўтахтаністцкая балцкая мадэль беларускага этнагензу паўстала не па прыхамаці таго ці іншага даследчыка і не з падачы спецслужбаў якой-кольвечы афарбоўкі, а з

логікі развіцця дзвюх асноўных канкурыруючых этнагенетычных парадыгмаў, пададзеных адменамі славянскай аўтахтанісцкай міграцыянісцкай мадэлі...” На думку аўтараў, аўтахтанісцкая балцкая мадэль беларускага этнагенезу дазваляе з’яднаць у адзінае цэлае ўвесь комплекс дадзеных з фізічнай антрапалогіі, этнагеномікі, лінгвістыкі, археалогіі, гісторыі, этнаграфіі, фалькларыстыкі і іншых. Аўтары адзначаюць, што параўнанне, гэтак званага “полімарфізму мітахендрыяльнай ДНК” беларусаў і літоўцаў сведчыць пра іх генетычную блізкасць. Акрамя таго аналіз групаў крыві АВО і MN сведчыць пра вельмі значную ступень падабенства, “якія амаль не адрозніваюцца ад прабацькоўскага і генетычна-антрапалагічнага тыпу”.

Гэтыя аргументы вельмі слушныя. І яны ў значнай меры пераклікаюцца з даследаваннямі Аляксея Мікуліча[1], які паказаў у сваіх творах, што тэрыторыя Беларусі была заселеная продкамі сучасных беларусаў яшчэ тысячу гадоў таму. Антрапалагічныя даследаванні паказваюць, што не было масавых міграцыяў, якія маглі б змяніць фізічны тып насельнікаў нашага краю. Увагу Мікуліча прыцягнулі праблемы гістарычнага і антрапаэкалагічнага аспектаў фармавання насельніцтва Беларусі. Высветлілася, што татальная папуляцыя беларускага сельскага насельніцтва становіць сабой ***самаўзнаўляльны*** арганізм, дзе абмен генамі адбываўся да апошняга часу пераважна паміж яго паслядоўнымі нашчадкамі. Генафонд Беларусі, натуральна, не абаронены ад пранікнення генаў з суседніх этнасаў. І ўсё ж высветлілася, што фенатыпы і генатыпы пры ўсёй стахастычнасці генетычных працэсаў захавалі сваю стабільнасць.

М. Доўнар-Запольскі пісаў: “Беларусы становяць найбольш чыстае славянскае племя, захаваўшы і

---

[1] Мікуліч А. І. Беларускі этнас: папуляцыйна-генетычны аспект эпахальнай стабільнасці // Беларуская нацыянальная ідэя. Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі. – Мн., 2000.; Мікуліч А. И. Наша генетическая память. – Мн., 1987, іншыя.

вонкавы выгляд славяніна і шмат адзнак яго псіхікі і быту"[1].

Многія гісторыкі і этнографы адносяць час фармавання беларускага этнасу да XIII–XVI стст. – часу фармавання этнічных адрозненняў рускіх, беларусаў і ўкраінцаў. Адак настаў час прыняць новую парадыгму што да старажытнасці беларускага этнасу. Шматлікія крыніцы з самых розных галінаў ведаў, такіх, як гісторыя, археалогія, мовазнаўства і этнаграфія дазваляюць зрабіць выснову аб самае малое тысячагадовым веку беларускага этнасу.

Довады тут наступныя.

**Довад першы – моўны.**

Адам Міцкевіч, а пазней Іван Шпілеўскі сцвярджалі, што беларуская мова найменш зменeная з усіх славянскіх моў. І ў гэтым ёсць вялікая доля праўды. У беларускай мове захавалася шмат рысаў, якія сягаюць індаеўрапейскага часу.

С. Суднік лічыць, што час узнікнення асаблівай лінгвістычнай фармацыі, на аснове якой потым утварылася беларуская мова, сягае ажно 2300 году да н. э. Спачатку яна існавала як форма крывіцка-дрыгавіцка-люціцкага кайнэ, а ў часы ВКЛ пашыраецца на ўсю тэрыторыю княства, дыялектныя асаблівасці паступова сціраюцца, утвараецца адзіная дзяржаўная мова ВКЛ, якую прынята лічыць старабеларускай ці проста беларускай мовай. У артыкуле "Беларуская мова – першааснова сучасных і зніклых славянскіх моў" (Беларуская нацыянальная ідэя. – Гродна, 1999.) С. Суднік піша: "Беларуская пісьмовая мова была адзінай паўнавартаснай пісьмовай мовай ВКЛ і ўсёй Усходняй Еўропы. Гэтае становішча і абумовіла той факт, што беларуская мова стала мовай міжнародных зносін. Наагул, міжнародных моў на той час было няшмат. лаціна, грэцкая, санскрыт, арабская, магольская, ханьская. І беларуская." У памянёным артыкуле ёсць шмат

[1] М.Доўнар-Запольскі. Асновы дзяржаўнасці Беларусі. Вільня, 1919.

цікавых выкладак, прысвечаных падабенству беларускай мовы і старажытнага санскрыту, які быў мовай старажытных індусаў. Частасць ужывання гуку [а] ў санскрыце – 66 %, беларускай мове – 68 % – мы маем амаль поўнае супадзенне. Адрыў па гэтым паказніку ад іншых моў вельмі вялікі, прыкладам, у нямецкай мове – 17 %, у рускай мове – 23 %.

Што да эвалюцыі беларускай мовы, у гістарычнай рэтраспектыве мы назіраем наступную карціну. Ужо ў XII ст. паміж мовамі жыхароў беларускіх зямель і рэшты Русі існавалі пэўныя адрозненні. Гэта, між іншым, адзначае нават "Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы", выдадзеная яшчэ за савецкім часам як падручнік для студэнтаў-філолагаў (1961). Калі "Слова аб палку Ігаравым", датаванае канцом XII ст. не прынята адносіць да помнікаў старабеларускага пісьменства ("Слова.." лічыцца помнікам проста "старарускага пісьменства"), то ўжо "Дагаворная грамата смаленскага князя Мсціслава Давыдавіча з Рыгай і Гоцкім берагам 1229 г.", "Грамата князя Гердзня 1264 г." і шэраг іншых напісаны на мове, якая мае шэраг беларускіх рыс.

**Довад другі – фальклорны.** Матэрыялы музычна-песеннага фальклору і вусна-паэтычнай творчасці беларусаў паказваюць на іх унікальнасць, якая праяўляецца ў аўтэнтычнасці спеваў, танцаў, народных гулянняў, традыцыяў, з каранямі ў сівой даўніне.

Безумоўна, грунтам, на якім заснавана большасць беларускіх традыцыяў, народнай спадчыны ёсць паганства. Цяпер цяжка вылучыць асаблівасці, спецыфіку менавіта беларускага культу. Хутчэй за ўсё, галоўныя святы і почат паганскіх багоў аднолькавыя для ўсіх усходніх славян. З прыняццем хрысціянства народныя святы не зніклі, а змяніліся. Шмат якія святы, як Вялікдзень, Каляды захавалі шэраг вонкавых дахрысціянскіх рысаў (скажам, калядаванне), але напоўніліся хрысціянскім зместам (на тыя ж Каляды святкуецца Раство Хрыстова і пяюцца калядныя песні, прысвечаныя нараджэнню Хрыста).

Аднак да гэтай пары ў Беларусі існуюць такія святы, на якія хрысціянства так і не здолела накласці свайго адбітка. Гэта, перадусім, Купалле. Хоць святкаванне Купалы як каталікамі (у ноч з 23 на 24 чэрвеня), так і праваслаўнымі (у ноч з 6 на 7 ліпеня) прывязана да Нараджэння Яна (Іаана) Хрышчэнніка (24. 06 – кат., 7. 07 – правасл.), гэтая ноч у нашай краіне і цяпер праходзіць зусім не па-хрысціянску. Сіла паганскага духу сярод беларусаў здзіўляе, але прыраўноўваючы сябе да іншых народаў – мы ўбачым у іншых аналагічную карціну, калі яшчэ не больш выразную. Скажам, у нашых суседзей літоўцаў, продкамі якіх былі жамойты.

**Довад трэці – археалагічны.** Курганныя матэрыялы сведчаць, што славянская міграцыя на землі балтаў не пасунула апошняй. З моманту іх кантакту пачалося фармаванне новых культур. Балцкія элеменеты Беларусі выяўляюцца ў гідраніміі, дыялекталогіі, палеантрапалогіі.

І **чацверты**, на які найбольш звяртае ўвагу Мікуліч, – **антрапалагічны аргумент**. Пачынаючы з неаліту (каля IV тысячагоддзя да Н. Х.) ужо сфармаваліся рэгіянальныя асаблівасці матэрыяльнай культуры. На пачатаку першага тысячагоддзя на тэрыторыі Беларусі адбылося змешванне прышлых славян з карэннымі балтамі. Заразом узбагаціўся генафонд абодвух народаў.

Матэрыялы палеантрапалагічных раскопак А. Мікуліча і І. Сілівон сведчаць, што праз 40 апошніх пакаленняў існуе безумоўная пераемнасць асноўных расавых асаблівасцяў. Гэта дазволіла таксама зрабіць наступную выснову: антрапалагічныя асаблівасці лакальных папуляцыяў *вызначаюцца генетычнай якасцю самога этнасу*. Паводле паказнікаў абагульненых біялагічных адлеглаcцяў можна шукаць сляды генетычнай памяці папуляцыяў у гістарычным аспекце. Генафонд беларусаў, літоўцаў і заходніх рускіх бліжэй за іншых да сярэднееўрапейскага, палякаў і ўкраінцаў – больш аддалены.

Выходзячы з канцэпцыі аб захаванні ў пакаленнях структурных кампанентаў папуляцыйнай сістэмы ад продкавай агульнасці (А. Любішчаў, Ю. Рычкоў), можна давесці значную стабільнасць генафонду ў параўнанні з мовай і культурай. Уся тэрыторыя Беларусі, паводле звестак аб генетычных сістэмах і рэпрадукцыйных памерах, была цалкам заселеная продкамі сучаснага насельніцтва каля 10 000 гадоў таму.

Такім парадкам, на падставе антрапалагічных дадзеных устаноўлена, што сучасныя ***беларусы – гэта беспасярэднія нашчадкі мясцовага старажытнага насельніцтва.*** Заразом фактычнае фармаванне этнасу адбывалася не меней чым праз 200 пакаленняў, "што дазваляе прасачыць яго **пачатак да палееўрапеоіднай расавай супольнасці**".[1]

## 3. Канцэпцыі беларускай гісторыі

***Канцэпцыя Лаўрэна Абэцэдарскага.*** Найбольш ведамая і дагэтуль яшчэ пашыраная афіцыёзная версія беларусай гісторыі, асновы якой заклаў у савецкія часы прафесар Абэцэдарскі і ягоная школа. Менавіта на ягонай метадалагічнай базе амаль паўстагоддзя выхоўваліся, знаёміліся з айчыннай гісторыяй беларускія грамадзяне. Гістарыяграфія Абэцэдарскага грунтавалася на тэорыі старажытнарускай народнасці, якая засталася нам у спадчыну ад расійскай навукі дарэвалюцыйных часоў. А кропку ў гэтым працэсе паставіла праца Іосіфа Сталіна "Марксізм і пытанні мовазнаўства" (1950) і тэзісы ЦК КПСС "Аб святкаванні 300-годдзя ўз'яднання Украіны з Расіяй" ад 10.01.1954 года.

Існасць афіцыйнай канцэпцыі ў тым, што быццам бы некалі існавала адзіная старжытнаруская народнасць, крыніца, з якой выцеклі "тры рэчкі"

---

[1] Мікуліч А.І. Беларускі этнас: папуляцыйна-генетычны аспект эпахальнай стабільнасці // Беларуская нацыянальная ідэя. Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі. Мн., 2000. С. 44.

“рускіх” народаў – рускага, украінскага і беларускага. Тэорыя “старжытнарускай народнасці”, безумоўна, мела б у сабе рацыянальнае зерне, калі б гэты “трыумвірат” “рускіх” народаў захоўваў роўнасць, незалежнасць адзін ад другога і сапраўды меў славутыя кроўныя повязі. Аднак акрамя змешаных шлюбаў (якія ўва ўсім свеце рэч пашыраная, незалежна ад адзінакроўнасці) ніякай такой брацкай любасці на справе не заўважаецца. Мала таго, на гэтым грунце ўзнікла канцэпцыя “старэйшага брата”. Яна паставіла ў няроўныя ўмовы існаванне беларусаў і ўкраінцаў з аднаго боку і рускіх – з другога. І тая гісторыя, якой мне і мноству беларускіх дзяцей так доўга тлумілі галаву, дала катастрафічныя вынікі – савецкія беларусы выхоўваліся манкуртамі, людзьмі без памяці, без ведання сваёй сапраўднай гісторыі, выхоўваліся ў рэчышчы іншай гісторыі і культуры – рускай, і ўрэшце – рускай сведамасці. Не нашмат змянілася становішча і ў цяперашні час.

Праз шэсць гадоў нацыянальнага беларускага адраджэння (1990–1996) і станоўчай змены вектараў беларускай прысутнасці ў свеце і адпаведна ў гістарычнай навуцы, сітуацыя пасля сумна ведамага рэферэндума 1995 г. хутка вярнулася да ранейшага савецкага, “бяспамятнага” часу. Прыкладам, выдавалася тады грунтоўная шасцітомавая энцыклапедыя “Гісторыя Беларусі”. Але, пачынаючы з трэцяга тома, з вокладак раптам знікае нацыянальны герб “Пагоня”. Ну, няхай ён перастаў быць дзяржаўным, але ж ён наша гісторыя! Ужо гэты факт сведчыць аб імкненні афіцыйных асоб у Беларусі знішчыць гістарычную памяць беларусаў, сцерці, як сцерлі “пагоню” на вокладцы. І яшчэ, гэты факт – прыклад сапраўднага халуйства, якое і ёсць існай дзяржаўнай ідэалогіяй, а не тыя опусы, што пішуць для студэнтаў таварышы Яскевіч, Мельнік і іншыя “ідэолагі”.

***Канцэпцыя Сядова.*** Паводле Сядова, здаўна (больш за 2 тысячагоддзі таму) тэрыторыя Беларусі была за-

селеная балцкімі плямёнамі. Пасля VI ст. н. э. сюды прыйшлі славяне. Балты, якія жылі тут, не мелі нейкай адзінай дзяржаўнасці, жылі асобнымі групамі і ў выніку аказаліся ў атачэнні славян. Паступова яны прынялі і мову славян. Сядоў лічыў, што продкамі сучасных беларусаў ёсць і прышлыя носьбіты славянскай мовы, і мясцовае насельніцтва, што гаварыла на дыялектах балцкае моўнае групы. Паступова славянская гаворка выжыла балцкія дыялекты. І найактыўней гэты працэс адбіўся на лёсе балцкага (калі не славянскага) племені “літва”. Можна меркаваць, што літоўскія князі (Гедымін, Міндоўг, Ягайла і інш.) і іх атачэнне, цалкам перайшлі на беларускую мову таго часу, яна стала ім роднай. Менавіта гэты новы этнас і стаў асновай для фармавання будучых беларусаў.

Канцэпцыя Сядова была сустрэта варожа з боку афіцыйнай навукі і асабліва выступаў супраць яе Лаўрэн Абэцэдарскі.

Аднак прыход новых гісторыкаў у гістарычную навуку дазваляе атрымаць цалкам адрозную ад “савецкай” выснову аб паходжанні беларускага этнасу.

Вялікі ўнёсак у фармаванне гэтай канцэпцыі зрабілі гісторыкі Мітрафан Доўнар-Запольскі, Вацлаў Ластоўскі, Усевалад Ігнатоўскі на пачатку XX-га стагоддзя, а ў наш час – Мікола Ермаловіч, Генадзь Сагановіч і многія іншыя.

***Канцэпцыя Міколы Ермаловіча.*** Праходзячы прадмет “Гісторыя БССР” паводле падручніка Абэцэдарскага, здаецца, у восьмым ці дзевятым класе Васілевіцкай сярэдняй школы, я даведаўся, што мы, беларусы, былі ўвесь час паняволеным народам, – былі і пад вялікай Расіяй, і пад панскай Польшчай, і пад суседняй Літвой. Асабліва прыкрым было апошняе: маленькая Літва, а ў 60-х гадах XX стагоддзя яна была невялічкай рэспублікай з насельніцтвам каля 3-х мільёнаў чалавек, выходзіць, у даўныя часы заваявала суседніх славян-беларусаў і шмат гадоў, нават некалькі стагоддзяў панавала над нашымі продкамі, дыктава-

ла ім свае парадкі, прымушала выконваць свае законы і г. д. Дарэчы, сучасныя літоўскія гісторыкі не нашмат адышлі ад гэтага тэндэнцыйнага бачання гістарычных падзей, што адбываліся на тэрыторыі Беларусі, пачынаючы з XIII стагоддздзя. Міф аб заваёве літоўцамі беларускіх земляў і падпарадкаванні нашых продкаў з Полацкага і Тураўскага княстваў літоўскім князям пашыраны да нашага часу ў расійскай, польскай і, зразумела, літоўскай гістарыяграфіі.

Відаць, шмат каму не падабалася наша гісторыя паводле Абэцэдарскага. Але толькі адзін з нас здолеў аспрэчыць міф аб літоўскай заваёве. Гэта быў не універсітэцкі навуковец, не акадэмічны дактарант, а просты настаўнік гісторыі з Маладэчна – Мікалай Іванавіч Ермаловіч.

У 80-х гадах XX ст. сярод мінскіх інтэлектуалаў хадзіла рукапісная праца непрызнанага дэсідэнта-гісторыка М. Ермаловіча "Па слядах аднаго міфа". Гэтую працу перадрукоўвалі, пераплятвалі, множылі, і такім спосабам рэвалюцыйная (на той час) канцэпцыя нашай гісторыі стала ведамая многім. Аднак толькі з прыходам Гарбачоўскай перабудовы і наступу хвалі беларускага нацыянальнага адраджэння канца 1980-х – пачатку 1990-х гадоў можна было афіцыйна выдаць геніяльны твор Міколы Ермаловіча. У 1989 годзе выдавецтва "Навука і тэхніка" выпусціла невялічкую кнігу пад назвай "Па слядах аднаго міфа", аўтар – М. Ермаловіч.

"Часцей за ўсё тэндэнцыйна скажаецца пачатковая гісторыя той ці іншай дзяржавы. Так здарылася і з гісторыяй Вялікага княства Літоўскага, першыя старонкі якой непазнавальна зацемнены міфам аб літоўскім заваяванні Беларусі", – так пачынае сваю кнігу Ермаловіч.

Каб разабрацца з гэтым міфам, Мікалай Іванавіч спачатку задае законнае пытанне: "Дзе была летапісная Літва?" Рэч у тым, што шэраг летапісцаў, гісторыкаў і іншых аўтараў паказваюць, што бытнішча тагачаснай Літвы зусім не там, дзе яна ляжыць ця-




Карта летапіснай Літвы

пер. Прыкладам, у Сафійскім летапісе 1044 г. мы чытаем: "Ходи Ярослав на Литву, а на весну заложил Новогород и сделал и". Тацішчаў: "Сей Новгород по обстоятельству мнится литовский, который Всеслав Полоцкий хотел захватить, но князи Ярославовичи уведав, возмездно в его землю шли и перво Минск взяли, а потом на реке Немане в Литве, которая недалеко от Минска и Новгородка Литовского..."

Што ж за Літва такая, якая ляжыць недалёка ад Мінска і Навагрудка? Відавочна, што гэта не тая тэ-

рыторыя, дзе жывуць цяперашнія літоўцы – летувісы.

Выснова, да якой прыходзіць Ермаловіч, парадаксальная: тагачасная Літва была зусім не там, дзе межы сучаснай Літвы. Летапісная Літва сапраўды ляжала недалёка ад Мінска, гэта Верхняе Панямонне, Наваградчына, Карэліцкія землі, а ў якасці паўднёвых межаў летапісы называюць раку Шчару (раён Слоніма). Толькі з пачатку XIV ст. назва "Літва" з Верхняга Панямоння паступова пераходзіць на ўсход сучаснай Літвы і замацоўваецца там. "Але адначасова яна прадаўжала захоўвацца і на ранейшым месцы яшчэ цэлыя стагоддзі", – піша М. Ермаловіч. Ён прыводзіць факт з ужо зусім нядаўняй гісторыі: "дзекабрыст А. Бястужаў, жывучы ў 1821 г. на тэрыторыі сучаснага Валожынскага раёна даў у Пецярбурзе такі адрас: "Литва, д. Выгановичи, в 40 верстах от Минска".

Вось жа, *старажытная Літва* клінам урэзвалася паміж Полацкай, Турава-Пінскай і Наваградскай землямі і побач з імі *з'яўляецца адной з гістарычных абласцей Беларусі*.

Наступным важным вынікам працы Ермаловіча было даводжанне таго, што не літоўскія плямёны (жмудзь, аукштайты), каланізавалі славян, а наадварот, ішла экспансія крывіцка-дрыгавіцкіх плямёнаў ў глыб балцкіх земляў. "Прычым, утварэнне Вялікага княства Літоўскага не толькі не спыніла, а, наадварот, яшчэ больш паскорыла асіміляцыю балцкалітоўскага насельніцтва", – падкрэслівае гісторык.

Працягваючы ланцужок сваіх думак, Ермаловіч робіць яшчэ адну важную выснову аб славянскім (беларускім) характары Вялікага княства Літоўскага. У выніку славянскай каланізацыі ў ВКЛ даміноўнай культурай стала беларуская культура, а дзяржаўнай мовай стала беларуская мова.

Гэтая выснова аб беларускай існасці ВКЛ была замацаваная ў назве апошняй фундаментальнай кнігі Міколы Ермаловіча – "Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае". Безліч аргументаў падае Мікола Ермаловіч на карысць беларускай прыроды

ВКЛ. Панаванне беларушчыны ў ВКЛ было фактам на працягу ўсяго часу яго незалежнага існавання (1240–1569 гг.). М. Ермаловіч піша: "Зразумела, не так лёгка пераадолець традыцыйную канцэпцыю ўтварэння далейшай гісторыі ВКЛ, якая звыш чатырох стагоддзяў пануе ў гістарыяграфіі, дзякуючы таму, што яна найперш адпавядала інтарэсам Масквы... Гэтую застарэлую версію ў мэтах падтрымання нацыянальнага гонару працягваюць сучасныя летувісцкія даследчыкі. Каб упэўніцца ў гэтым, варта прачытаць толькі кнігу З. Кяўпа і інш. "Гісторыя Літвы да 1795 г."... У ёй, як і раней, шляхам замоўчвання важных гістарычных сведчанняў, як, напрыклад, аб заваяванні Міндоўгам і Войшалкам Літвы, прыпісвання ўсяго, што насіла назву Літва, і літоўскага да сучаснай тэрыторыі Летувы, ВКЛ паказваецца выключна як летувісцкая дзяржава.

Мікола Ермаловіч адкрыў шлях праўдзівага асвятлення гісторыі не толькі беларускаму народу, ён паказаў прыклад усяму свету, як можна аспрэчыць застарэлыя гістарычныя міфы і паказаць людзям праўдзівую гісторыю.

* * *

Канцэпцыя Ермаловіча і блізкія да яе працы іншых беларускіх гісторыкаў паступова заваёўваюць належнае месца ў сучасных уяўленнях аб паходжанні беларусаў. Аднак разам з тым менавіта ў наш час з'явіліся пагляды на гісторыю, якія прынцыпова розняцца – не стаўленнем да славутай "літоўскай заваёвы", а іншым – стаўленнем да рэлігіі ці, дакладней, ацэнай ролі асобных хрысціянскіх канфесіяў у фармаванні беларусаў як нацыі, а перадусім – у фармаванні нашага менталітэту. Асабліва выразна адчуваецца "ўніяцка-антыправаслаўны" ўхіл, найбольш актыўным прадстаўніком якога ёсць Уладзімір Арлоў.

***Пагляд на беларускую гісторыю Уладзіміра Арлова.*** Пісьменнік гістарычнага жанру Уладзімір

Арлоў добра ведамы сучаснаму пакаленню моладзі, што вырасла пасля эпахальнай даты найноўшай гісторыі Беларусі – разгону мітынгу на "Дзяды" 30 кастрычніка 1988 г. Арлоў атрымаў заслужаную ведамасць і ўсенародную любоў нацыянальна сведамых беларусаў пасля знакамітага эсэ "Незалежнасць – гэта...". Эсэ Арлова, напісанае недзе ў 1990 годзе, не страціла актуальнасці праз гады. Але, можа, гэта якраз і не дзіўна, бо Беларусь не змянілася. Усе былыя праблемы – занядбаны стан беларускай мовы, нястача ў нашага брата-беларуса элементарнага роўню нацыянальнай сведамасці, нястача свабоды на ўсіх роўнях, многія парушэнні правоў чалавека – усё, пра што так па-майстэрску напісаў Арлоў – засталося і сёння. А што да беларускай мовы, то рэгрэс навідавоку – яна знікае на вачах, і перш-наперш дзякуючы дзяржаўнай палітыцы, чаго не было нават у савецкія часы.

Аднак, аналізуючы творы Арлова, напісаныя пазней, усё мацней адчуваеш у іх яго прыхільнасць да уніяцтва. І, згодна з вядомым міфам, што так пашыраны сярод беларускіх адраджэнцкіх колаў з лёгкай рукі пэўных аўтараў, – беларусы маюць сваю нацыянальную веру – грэка-каталіцкую. А далей, згодна з гэтай прастадушнай байкай – "расійскія акупанты накінулі нам, беларусам, сваё праваслаўе і адабралі "нацыянальную веру".

Вось цудоўна выдадзеная кніга "Дзесяць вякоў беларускай гісторыі. (862–1918). Падзеі. Даты. Ілюстрацыі" (Вільня, 2002). Аўтары: Уладзімір Арлоў, Генадзь Сагановіч. Ува ўсіх артыкулах, напісаных Арловым, гістарычныя падзеі, звязаныя з праваслаўнымі дзеячамі ці датамі, усяляк зацямняюцца, замоўчваюцца. Гэта адчуваецца ўжо з самага пачатку – з разгляду хрышчэння Кіеўскай Русі. Кіеўскі князь Уладзімір, як ведама, хрысціў Кіеўскі люд у 988 годзе, гвалтам – падкрэслівае Арлоў. Можа, так і было – не так лёгка памяняць спрадвечную веру, бацькоўскую веру, якой на той час было паганства. Але вось

чытаем: “Паганская вера несла ў сабе шмат светлага, такога, ад чаго чалавеку нялёгка адмовіцца”. Што светлае: абрад ахвяравання людзей, ці групавыя сэксуальныя оргіі ў час летняга санцастою? Хрысціянства – гэта якасны зрух маральнасці чалавека, гэта новы ровень, прагрэс людства, Хрыстос – гэта Святло... Не думаю, што полацкія князі былі ніжэй маральным і разумовым роўнем за кіеўскіх. І, безумоўна, імкнуліся прыняць хутчэй новую, прагрэсіўную рэлігію. І прынялі яны яе ў форме візантыйскай, г. зн. праваслаўнай. Сведчанне таму – існаванне ўжо ў XI стагоддзі Полацкай епархіі. Дарэчы, хоць афіцыйнай датай падзелу хрысціянства на заходнюю і ўсходнюю часткі лічыцца 1054 г., Візантыя і Рым жылі асобным рэлігійным жыццём ужо некалькі стагоддзяў да гэтай лічбы. Але Арлоў не прымае гісторыі, якая яму не падабаецца, – “няма ніякіх доказаў, што Полацкая зямля прымала хрост ад Кіева”. На гэты пасаж адкажу вельмі проста: ад Кіева хрост Полацкая зямля і не павінна была прымаць – хрышчэнне і ў Кіеў і ў Полацк ішло ад Візантыі.

## 4. Фармаванне беларускай нацыі і беларускай дзяржаўнасці. Ад Полацкага і Тураўскага княстваў да Рэчы Паспалітай

### *Незалежныя Полацкае і Тураўскае княствы*

Нам ведамы два цэнтры, дзе гуртаваліся славянскія плямёны, што стварылі пазней беларускую дзяржаву. Гэта Тураў і Полацк.

Першае ўспамінанне аб Полацку адносіцца да 862 г. У Полацкім княстве жылі крывічы – найвялікшая група ўсходніх славян. Другім цэнтрам крывічоў быў Смаленск. Нават у канцы XIX ст. мова жыхароў Смаленшчыны, як сведчаць складзеныя акадэмічныя слоўнікі тых гадоў, была дыялектам беларускай.

Пачынаючы ўжо з апошняй чвэрці X ст., у Полацку, незалежна ад Кіева, княжыў Рагвалод, які, як лічыцца, паходзіў ад варагаў. Аднак ёсць і меркаван-

не, што Рагвалод быў славянінам.


Рагнеда

Уся дзейнасць Рагвалода сведчыць аб яго таленавітасці як дзяржаўнага дзеяча. Сапраўды, пры Рагвалодзе Полацкая зямля імкнулася не толькі да сваёй незалежнасці, а нават далучыла да сябе Тураў.

У 980 г. Полацк захапіў кіеўскі князь Уладзімір, які ведамы як чалавек, што ахрысціў Русь. Уладзімір забіў Рагвалода, а яго дачку Рагнеду ўзяў сабе за жонку. Гісторыя князёўны Рагнеды добра ведамая, і я не буду падрабязна яе тут пераказваць. Але для нашай тэмы трэба вылучыць некалькі важных момантаў з гэтай гісторыі. Хоць Рагнеда і была жонкай Уладзіміра і мела нават сына – Ізяслава, яна не скарылася, не стала рабыняй дыктатара. Яна нават наважылася забіць князя, калі той спаў. Гэта сведчыць аб вольналюбівым характары Рагнеды, любасці да сваёй сям'і і Бацькаўшчыны. І, уражаны смеласцю Рагнеды, яе сына, які заступіўся за маці з мячом у руцэ, Уладзімір адпускае змоўцаў дадому. Рагнеда вярнулася на Полаччыну, а пазней прыняла сан манашкі з імем Анастасія.

Другая выснова з гэтай гісторыі бачыцца ў тым, што ад самага пачатку нашы продкі былі шчырымі хрысціянамі і нават ішлі на манаскае старанне, як гэта зрабіла Рагнеда, а пазней Ефрасіння Полацкая. Я адумысна купую ўвагу на гэтых момантах, бо *хрысціянізацыя жыцця, хрысціянізацыя светагляду* нашых продкаў сведчыць аб імклівым прагрэсе і ўступленні ў цывілізаваны свет Полацкай і Тураўскай дзяржаў. Хрысціянства прынесла пісьменства, культуру і наагул змяніла паганскі свет усходніх славян і ліцвінаў, якія і ўтварылі беларускую нацыю.

І пад тое мы бачым, што нашы суседзі жамойты і аўкштайты, таксама будучыя насельнікі гаспадарства ВКЛ, вельмі доўга трымаліся паганскіх звычаяў,

што і адбілася адмоўна на іх культурным развіцці – яны не мелі свайго пісьменства аж да XIX ст. Адзінае, што ім падарыла гісторыя – яны перанялі нашу гістарычную назву "ліцвіны" і пераўтварыліся з жамойтаў і аўкштайтаў у сучасных літоўцаў.

Пасля забойства Рагвалода Полацк на дваццаць восем гадоў трапіў пад уладу Кіева. Наступныя пакаленні полацкіх князёў паказалі прыклады мужнасці і імкнення да дзяржаўнай незалежнасціі. Найбольш уражвае жыццёвы шлях Усяслава Чарадзея, унука сына Рагнеды Ізяслава. Пры Усяславе Чарадзеі Полацкае княства пашырыла свае межы далёка на захад па Дзвіне. Полацкімі даннікамі сталі лівы, земгалы і іншыя. Ён княжыў 57 гадоў, пабываўшы і ў порубе – палоне кіеўскага князя Ізяслава, потым стаўшы нечакана кіеўскім князем, а, урэшце, пад канец жыцця, ***у 1097 годзе, узаконіў незалежнасць Полаччыны.***

Тураў да X ст. быў ведамы як цэнтр самастойнага племявога звязу. Насялялі Тураў дрыгавічы, якіх некаторыя навукоўцы ўтаясамляюць з другавітамі. Паводле легенды, заснаваў Тураў князь Тур (можа, з скандынаўскай генеалогіяй) каля 980 г.

Кіеўская Русь, як ведама, была хрышчана князем Уладзімірам у 988 г. У гэтыя часы Тураў уваходзіў у склад Кіеўскай дзяржавы і лагічна змеркаваць, што хрысціянства прыйшло і на палескія землі. Прынамсі, ёсць падставы думаць, што ўжо на пачатку XI ст. у Тураве існавала праваслаўная біскупская кафедра. Звестка ў Кіеўскім Патэрыку рэдакцыі Іосіфа Трызны паведамляе: "*Третие богомолие епископию поставих в лето 6513 (1005 г.) и придах к ней городы с погосты в послушание и священие и благословение держати себе Туровской епископии: Пинск, Новгород, Городен, Берестье, Волковыск, Здитов, Неблетеск, Дубровица, Высочко, Случеск, Копысь, Ляхов, Городок, Смедяне ...*"

У 1148 г. Туравам пачаў кіраваць князь Юры Яраслававіч, які рабіў стаўку на незалежнасць Тураўш-

чыны ад Кіева. Ізяслаў спрабаваў вярнуць Тураў, падахвоціўшы сілы сямі рускіх княстваў, але дзесяцітыднёвая аблога не дала станоўчых вынікаў Кіеўскаму князю. У 1169 г. 18 дзён цягнулася яшчэ адна аблога Турава з боку валынскіх князёў на чале з Мсціславам Ізяслававічам, але князь Юры зноў вытрымаў яе. У 1162 г. Расціслаў і Юры Яраслававіч уклалі замірэнне, згодна з якім Тураўскае княства атрымала незалежнасць. Другая палова XII стагоддзя – гэта перыяд найбольшага росквіту Турава. І шмат у чым Тураўскае княства абавязана свяцьбіту Кірылу Тураўскаму, які жыў у той час. А сваім гераічным служэннем у Тураве ён падае прыклад і для нас.

### *Беларуская дзяржава ВКЛ*

ВКЛ утварылася ў XIII стагоддзі праз аб'яднанне славянскіх княстваў на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Балцкі этнас паступова славянізаваўся (прынамсі, пераймаў славянскую мову), прымаў хрысціянства, найперш праваслаўе, аднак былі выпадкі і каталіцтва. Насельніцтва цэнтральнай і заходняй частак ВКЛ ідэнтыфікавалася пад агульнай назвай "ліцвіны". Гэтаму спрыяла і назва базавага племені ВКЛ – "літва", якая перасунулася ўжо на суседнія землі. Фактычна, назвы "літва" і "ліцвін" у часы ВКЛ звязвалі не толькі з балцкімі плямёнамі жамойтаў і аўкштайтаў, якія жылі на поўначы княства. І ў будучай назве – "Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае" – этнас жамойтаў вылучаны асобна. Рускі ў гэтай назве пакрывае насельніцтва, якое гуртавалася вакол Кіева і складае сучасную Украіну. А літоўскае – гэта значыць, беларускае, у сучаснай назве аднаго і таго ж этнасу. Ліцвін і беларус з нашага гледзішча і з гледзішча многіх іншых сучасных даследнікаў – гэта сінонімы.

Яшчэ на пачатку XX ст. акадэмік Карскі сцвярджаў, што 80 % насельніцтва ВКЛ складаў беларускі этнас. Прадстаўнікі гэтага этнасу гаварылі на беларускай мове, якая ўжо ў XVI ст. значна рознілася ад

мовы Маскоўскай дзяржавы. А. Е. Тарас піша: "тая мова, якая цяпер завецца "літоўскай", на працягу ўсіх пяці стагоддзяў гісторыі ВКЛ ужывалася толькі невялікай часткай насельніцтва княства – паўночнымі плямёнамі жамойтаў і аўкштайтаў. У дадатак яны не мелі свайго пісьменства. Дакументаў Вялікага княства Літоўскага на дзяржаўнай мове незалежнай Летувы проста не існуе. Гэты гістарычны факт самым пераканаўчым чынам даказвае, што ліцвіны былі славянамі." (А. Е. Тарас. Войны Московской Руси с Великим княжеством Литовским и Речью Посполитой в XIV–XVII веках. Москва, Минск, 2006).

Падсумаваўшы ведамыя сёння факты аб паходжанні тэрмінаў "літва", "ліцвін", можна сцвярджаць наступнае: ёсць два варыянты паходжання Літвы:

1. Племя літва мела балцкае паходжанне. Гэтую канцэпцыю выставіў рускі даследнік В. Сядоў і грунтоўна развіў С. Санько. А згодна з М. Ермаловічам, племя літва рассялялася на захад ад Мінска ў міжрэччы Нёмана і Віліі, ад Стоўбцаў да Наваградка (прынамсі, тут княжыў першы князь літоўскі Міндоўг) потым – па Шчары, ад Слоніма да Нясвіжа, і потым па рацэ Уса зноў у кірунку Мінска (гл. мал. 1). Аднак мова літвы была славянская. Гэта магло здарыцца праз прыняцце хрысціянства ўсходняга абраду пасля хрышчэння Кіеўскай Русі і яе паўночных земляў, у склад якіх уваходзілі – Полацк, Наваградок, Копысь і іншыя землі, у тым ліку – тыя, дзе жыла літва. Яны прынялі хрысціянскую рэлігію і паступова перайшлі на славянскую мову. Прынамсі, усе пісьмовыя крыніцы, звязаныя з літвой і будучым Княствам Літоўскім, напісаныя вылучна беларускай мовай. Менавіта "літва" і "ліцвіны", яе насельнікі, і ёсць продкамі сучасных беларусаў.

2. Племя літва – славянскае племя. Такой думкі пільнаваўся чэшскі даследнік П. Шафарык, які лічыў, што яно ўспамінаецца ў летапісах як "лютва". Добра ведамыя тасама плямёны "велеты-люцічы", якія насялялі тэрыторыю сучаснай Гарадзеншчыны. Ёсць

падстава думаць, што гэтыя славянскія плямёны прыйшлі недзе з басейна Дуная, пра што сведчаць нават народныя песні, дзе нязменна гучыць "Дунай". Мова гэтых славян ёсць крыніцай фармавання сучаснай беларускай мовы. Цікавы яшчэ адзін момант, заўважаны многімі звычайнымі людзьмі: мова сучасных славакаў вельмі падобная да беларускай (не чэшская і не польская!). А менавіта адтуль ішлі на нашыя землі славянскія плямёны. І можа, бліжэйшыя родзічы беларусаў менавіта славакі, а не, скажам, рускія, як гэта ўбіваюць нам у галаву з дзяцінства.

Ёсць і трэці варыянт – угра-фінскага паходжання літвы. Гэтую тэорыю прапанаваў якуцкі даследнік, на жаль, ужо нябожчык, Іван Ласкоў. Аднак аргументаў на яе карысць нашмат менш, як да дзвюх першых, і таму мы абмяжуемся толькі імі.

Я не стану паўтараць больш шматлікіх довадаў на карысць славянскай прыроды літвы, ці зноў і зноў вяртацца да праблемы мовы ВКЛ альбо гутарковай мовы вялікіх князёў ВКЛ. Бо ёсць досыць шмат літаратуры на гэтую тэму, на жаль, праўда, толькі ў беларускім асяродку. На мой пагляд, найбольш грунтоўна раскрыў гэтую праблему Паўла Урбан у сваёй кнізе "Старажытныя ліцвіны. Мова, паходжаньне, этнічная прыналежнасьць" (Мінск, 2003). Ён прааналізаваў мноства крыніц, рукапісаў, хронікаў, летапісаў, як беларуска-літоўскіх, так і старжытнарускіх, польскіх, нямецкіх, шведскіх, іншых. П. Урбан піша: "Усе дадзеныя факты даюць, па-першае, падставы сцвярджаць, што ад даўнейшых часоў ***ліцвіны карысталіся славянскай мовай***". І далей: "Нездарма ж дзеля ахрышчэння ліцвінаў вялікі князь Гедымін запрашаў з Захаду ў Вялікае княства Літоўскае манахаў-прапаведнікаў, якія карысталіся "польскай" і "русінскай" мовамі. Шэраг мясцовых крыніц пацвярджаюць славянскасць літвы. Напрыклад, цвярскі летапіс паведамляе, што ліцвіны, або "літва", належалі да славян".

Для сцвярджэння беларускай нацыянальнай ідэі не мае вялікага значэння, які варыянт паходжання

літвы выбраць – першы ці другі. ***Важна тое, што мы скразныя нашчадкі і спадчыннікі той стражытнай літвы, што дала аснову ВКЛ***, увайшла ў назву наймагутнейшай еўрапейскай дзяржавы. ***Важна тое, што мы – беларусы – захавалі сваю беларускую мову, якая была дзяржаўнай у Вялікім княстве Літоўскім, мову, на якой гаварылі князі ВКЛ і наагул ўсё насельніцтва ВКЛ, за выключэннем невялікай часткі Княства, вядомай пад назвай жамойты і аўкштайты.*** П. Урабан на гэты конт піша: "...Жамойць у складзе ВКЛ была нібы "іншародным целам", а жамойты этнічна адчувалі сябе больш зблiжанымі з карэнным насельніцтвам Прусіі".

### *Князі Вялікага княства Літоўскага*

У маю задачу не ўваходзіць пераказ гісторыі ВКЛ, што, як лічыцца, пачынаецца з часоў князя Міндоўга (1246 г.) і канчаецца ўваходжаннем ВКЛ у склад Рэчы Паспалітай у 1569 г. За апошнія часы напісана нямала выдатных кніг, дзе даецца аб'ектыўны, вытрыманы ход палітычнага і грамадскага жыцця ВКЛ, ёсць цікаваыя звесткі аб вялікіх князях. Мне хацелася б толькі крануць тут момант, важны для фармулявання нацыянальнай ідэі, пытання аб этнічнай прыналежнасці князёў Вялікага Княства.

### *Аб этнічнай прыналежнасці князёў Вялікага княства Літоўскага*


Пячатка Міндоўга

Шмат звестак пра розныя бакі жыцця з мінулага нашага народа, у тым ліку і пра этнічнасныя асаблівасці жыхароў Княства, можна знайсці ў розных гісторыкаў.

Пра беларускае паходжанне князёў ВКЛ пераканаўча гаворыцца ў класічнай працы Міколы Ермаловіча

"Па слядах аднаго міфа". Гэтая ідэя дасканала развітая ў ягонай жа манаграфіі "Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае". Следам за Ермаловічам шэраг даследнікаў і літаратараў даводжанню беларускасці ВКЛ таксама прысвяцілі свае творы. І толькі, як той казаў, гультай можа ў гэтым засумнявацца. Пералічу некаторыя з ведамых мне твораў на гэтую тэму, напісаныя як на беларускай, так і рускай мовах: Насевіч В. Пачаткі Вялікага княства Літоўскага. (Мн., 1993); Сагановіч Генадзь. Нарыс гісторыі Беларусі. (Мн., 2001), Литвин И. Участвовали ли литовцы в Грюнвальдской битве, или Почему Витовт писал "по-руски", 2003. (http://ganba.narod.ru/library.html), Тарас А. Е. Войны Московской Руси с Великим княжеством Литовским и Речью Посполитой в XIV–XVII веках (Москва – Минск, 2006).


Міндоўг

Цікава, але такая каштоўнасць, як праўда – гэта рэч патрэбная Богу, і яна рана ці позна няўхільна з'яўляецца. Я гэта да таго, што праўдзівае адлюстраванне нашай гісторыі адбываецца не толькі ў Беларусі і вядзецца не толькі беларускімі аўтарамі, але і на расійскім гістарычным полі. Прыемна здзівіла кніга А. Бушкова "Россия, которой не было. Неизвестная Атлантида. Москва, 2001". Гэтай Атлантыдай для Бушкова была – "беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае". Праўда, яшчэ не цалкам беларуская, а "руская № 2", з якой бяруць сваё паходжанне беларусы і ўкраінцы, але, галоўнае, не літоўская ў сучасным сэнсе гэтага слова.

Нарэшце, вялікай падзеяй для нас быў выхад двухтамовай энцыклапедыі "Вялікае княства Літоўскае", першы том якой да перавыдання, быў бібліяграфічнай рэдкасцю.

З іншага боку, дзяржаўныя кнігарні Беларусі запалоненыя таўсценнай кнігай літоўскага гісторыка Э. Гудавічуса "Гісторыя Літвы". Там слова беларускі і Беларусь у дачыненні да гісторыі ВКЛ пры пільным жаданні вы не знойдзеце. А ўжо пра нелітоўскае паходжанне князёў ВКЛ там і намёка няма.

З сказанага вынікае, што для слушнага фармулявання нацыянальнай ідэі немалую ролю ў нашым гістарычным аглядзе будзе адыгрываць пытанне паходжання князёў ВКЛ. Хто яны? Да якога этнасу належалі, беларускага ці літоўскага, гаворачы сучаснымі тэрмінамі, альбо – ліцвінска-русінскага ці жамойцка-аукштайцкага, гаворачы ў катэгорыях XIII–XVI стст.?

Адказ на гэтае пытанне ў мяне будзе наступны. Калі літва была беларускім племем, то, зразумела, і яе князі былі нашымі, беларускімі продкамі, але ніяк не жамойтаў – цяперашніх літоўцаў. Гэта пацвярджаецца і моўным чыннікам, і ў пэўнай ступені – рэлігійным. З розных гістарычных крыніц можна даведацца, што мова князёў ВКЛ была русінская, а не жамойцкая, а веравызнанне спачатку праваслаўнае, а пазней і праваслаўнае, і каталіцкае, пачынаючы з Ягайлы, які памяняў сваю "веру бацькоў" на каталіцызм, каб здабыць польскую карону.

Ужо першы збіральнік літоўскіх земляў Наваградскі князь Міндоўг прыняў праваслаўе. Пра гэта сведчыць Густынскі летапіс (1246 год): "Миндовг принять веру христианскую от Востока со многими своими бояры ... Непомнозе же сын его Войшелк, пострижен во иночество". Тое, што Войшалк, сын Міндоўга, стаў манахам, сведчыць пра тое, што праваслаўе ў тыя часы ўжо займала ў ВКЛ моцныя пазіцыі. І сапраўды Войшалк увайшоў у склад брацііі Лаўрышаўскага манастыра, які быў заснаваны яшчэ ў 1225 г. Елісеем. Сам Елісей быў сынам князя Трайнаты і зай-

маў важную пасаду пры двары Міндоўга. Прападобны Елісей быў забіты ў 1259 г. і кананізаваны мітрапалітам Іосіфам Солтанам на саборы ў Вільні ў 1514 г. Мошчы Святога Елісея слылі ўчыненымі цудамі, але пасля таго як манастыр згарэў, недзе згубіліся. Нядаўна Лаўрашыўскі манастыр быў адноўлены, а 10–11 лістапада 2007 г. ў Наваградку адбыліся ўрачыстасці, прысвечаныя 750-годдзю прападобнага Елісея Лаўрышаўскага. У час гэтай падзеі ў горадзе адкрылі помнік Елісею Лаўрышаўскаму.

У 1248–1254 гг. адбылася вайна, у выніку якой Наваградак заваяваў Літву. Князем Літвы стаў Міндоўг, а Наваградка – яго сын Войшалк. У адрозненне ад свайго бацькі Міндоўга, які памяняў сваю веру на каталіцтва, Войшалк быў шчырым праваслаўным вернікам. Войшалк, як і Елісей, за заслугі перад праваслаўем быў кананізаваны як святы. “Нездарма ж яго партрэт быў змешчаны на вокладцы Лаўрышаўскага Евангелля” – піша М. Ермаловіч. Войшалк рыхтаваўся хрысціць усю Літву, для чаго збіраў манахаў у Палонінскім манастыры і наведаў нават Афонскі манастыр у Грэцыі. Улічваючы, што мовай праваслаўя была славянская (царкоўнаславянская) мова, можна меркаваць, што славянскай мовай была ўжытковая мова і Міндоўга, і Войшалка.

Наступнай значнай фігурай у гісторыі ВКЛ быў князь Гедымін, які перанёс сталіцу ВКЛ з Наваградка ў Вільню ў 1321 г. (паводле іншых меркаванняў – 1316 г.). У Вільні, як ведама, знаходзіцца сучасны сімвал цяперашніх літоўцаў – вежа Гедыміна. Сучасныя літоўцы не сумняюцца ў нацыянальнай адпаведнасці і гістарыч-


Гедымін

насці вежы Гедыміна як літоўскай святыні. Але гісторыя сведчыць пра іншае. Межы беларускіх земляў, якія аб'ядналіся пры князі Гедыміне, цягнуліся ад Дняпра на ўсходзе да Буга на захадзе, ад межаў Пскоўскага княства на поўначы да межаў Валынскага і Кіеўскага княстваў на поўдні. Менавіта беларускія землі вызначалі нутраную і вонкавую палітыку Вялікага княства Літоўскага. "Ужо тое, што ён (Гедымін) перанёс сталіцу ў Вільню, якая з'яўлялася пераважна крывіцкім горадам, яскрава падкрэслівае, чыімі інтарэсамі ён будзе кіравацца найперш у сваёй дзейнасці" (М. Ермаловіч) І далей: "Не можа быць і гаворкі ні аб ВКЛ як літоўскай дзяржаве (таксама ў сучасным значэнні гэтага слова), ні аб тым, што вялікія літоўскія князі былі выразнікамі інтарэсаў літоўскіх феадалаў, бо апошнія ўвесь час супраціўляліся ўтварэнню Вялікага княства Літоўскага і з'яўляліся ворагамі гэтага гістарычнага працэсу". Вось вам і "вежа Гедыміна" – дык гэта ж вежа ворага сучасных літоўцаў!

А што да мовы двара князя Гедыміна і яго самога – варта было б прытачыць звесткі з памянёнай кнігі П. Урбана "Старажытныя ліцвіны". Ён піша, што ў лісце да манахаў-францішканцаў Саксоніі ад 26 траўня 1323 г. Гедымін просіць прыслаць месіянераў, якія павінны абавязкова ведаць польскую, зэмгальскую і русінскую мовы. Такія ж патрабаванні былі і да іншых месіянераў. Пытанне аб зэмгалах, "адкуль яны ўзяліся", развязваецца проста – каля 100 000 засталіся жыць у ВКЛ пасля паразы ў Лівонскай вайне 1289–1290 гг. Польская мова, у тыя часы вельмі пашыраная, была ў мінулым вельмі блізкай да русінскай і іншых славянскіх моў. Застаецца русінская мова – на ёй гаварыла большасць насельніцтва ВКЛ. Кажучы па-сучаснаму – гэта была старабеларуская мова, ці проста – беларуская. Наконт жамойцкай мовы – мовы продкаў сучасных літоўцаў – ніякіх спамінаў няма. Наагул жамойцкія землі доўгі час не ўваходзілі ў склад ВКЛ.

Аб паходжанні роду Гедымінавічаў вельмі падрабязныя звесткі можна знайсці ў Міколы Ермаловіча. Абапіраючыся вылучна на летапісныя крыніцы, ён даводзіць, што ад полацкіх князёў Давіда і Маўкольда – сыноў князя Расціслава – пачынаецца дынастыя вялікіх князёў літоўскіх: "ад першага – Від і астатнія, ад другога – Міндоўг". Такім чынам, пачатак дынастыі літоўскіх князёў ад полацкай дынастыі. Гэтыя высновы цалкам рацыянальныя, калі ўспомніць той факт, што ўжо з XI–XII ст. адзіным значным дзяржаўным утварэннем на тэрыторыях сучаснай Беларусі і Літвы была Полацкая дзяржава. І менавіта яна дыктавала палітычную волю сваім суседзям.

А што да імёнаў Гедыміна і іншых князёў літоўскіх, дык яшчэ В. Юргевіч на аснове аналізу філалагічнага матэрыялу паказаў, што імя Гедымін славянскага паходжання. Нават у Цвярскім павеце ведама назва вёскі "Едиминово". Спробы ж тлумачыць імёны літоўскіх князёў (у тым ліку і Гедыміна) на аснове літоўскай мовы заўсёды прыводзілі да паразы. Так што, зрабіўшы з Гедыміна Гедымінаса, сучасныя літоўцы толькі паказалі сваю недасведчанасць, калі не нахабства.

Каб неяк узвысіць сваё мінулае і абгрунтаваць сваю адметнасць як "асаблівага" народа, сучасныя фантасты ад гісторыі з літоўскага боку любяць сцвярджаць, што ВКЛ ад самага пачатку і да прыняцця каталіцтва недзе ў XIII, ці нават XV, ст. – было паганскай дзяржавай. Таму, маўляў, не было і літоўскага пісьменства: ці патрэбна яно паклоннікам Перуна? Такое цвярджанне ёсць відавочнай хлуснёй, першыя і ўсе наступныя князі ВКЛ, як мы ўжо гаварылі, былі хрысціянамі і прытым праваслаўнымі. Як мы ўжо ведаем, Міндоўг напачатку прыняў праваслаўе, хоць потым, у 1252 г., з палітычных меркаванняў перайшоў у каталіцызм. Яго сын Войшалк быў шчырым праваслаўным вернікам, прыняў нават схіму. Войшалк перадаў свой пасад сыну Данілы Галіцкага – Шварну, таксама праваслаўнаму. Наступны князь Трайдзень

і яго чатыры браты паводле Галіцка-Валынскага летапіса былі хрысціянамі. Чаму ж у некаторых заходніх летапісах можна ўсё ж сустрэць згадку пра паганскасць літоўскіх князёў? М. Ермаловіч слушна тлумачыць гэта тым, што ў тыя часы “існавала завядзёнка называць бязбожнікамі, паганымі, язычнікамі ўсіх сваіх ворагаў незалежна ад веравызнання”.

Я б дадаў яшчэ адзін немалаважны аргумент. У 1054 г., як ведама, адбыўся “цывілізаваны развод” Усходняй і Заходняй цэркваў. Юрыдычна быў замацаваны факт незалежнага існавання каталіцкай Царквы з цэнтрам у Рыме і праваслаўнай – з цэнтрам у Канстанцінопалі. Некалькі стагоддзяў зацятага змагання за правільнае вызнанне Хрыстовай веры, сем Усяленскіх Сабораў, што праходзілі папярэдне перад гэтым у IV–XVIII стст. прывялі ўрэшце да дзвюх незалежных Цэркваў, кожная з якіх лічыла свайго нядаўнага апанента “ерэтыком”, навуку – “ерассю” – альбо “язычтвам”. Таму і адлюстраваўся гэты факт у летапісах таго часу.

Пры Вялікім князі літоўскім Вітаўце Жамойція некалькі разоў пераходзіла ад тэўтонаў да Вялікага княства. Так, прыкладам, ён мусіў чатыры разы (у 1384, 1390, 1398 і 1404 гг.) аддаваць Ордэну зямлю продкаў сучасных літоўцаў – Жамойцію. Кожны раз тэўтоны браліся за хрост жамойтаў, не спыняючыся і перад жорсткімі расправамі. Жамойты ўздымалі паўстанні, і ўрэшце Вітаўт, бароначы іх ад тэўтонаў, далучыў па частках іх землі да ВКЛ. Канчаткова зямля продкаў сучасных літоўцаў апынулася ў складзе ВКЛ у 1422 г. Каб падкрэсліць цяпер сваю бытнасць у складзе ВКЛ, яны выпрасілі ў Вітаўта аўтаномныя правы і асобнае ўспамінанне ў назве дзяржавы – Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае. Сучасныя лі-



Вітаўт

тоўцы называюць Вітаўта – “Вітаўтас”, але ні ў адным сярэднявечным дакуменце ён не ўспамінаецца пад такім імем. Аб мове гэтых дакументаў І. Ліцьвін піша наступнае: “Вядомыя дзве мовы, на якіх пісаў Вітаўт: старанямецкая і стараславянская. На стараславянскай мове – гэта “Грамата Вітаўта”, арыгінал якой знаходзіцца ў Цэнтральным дзяржаўным Гістарычным архіве Латвіі (ф.8, оп.3, сарs. “В”. №42). Грамата Вітаўта на старанямецкай мове знаходзіцца ў тым жа архіве (ф.673, оп.4, ящ.18, № 70). Цікавае ў гэтым дакуменце тое, што Вітаўт сам называе мову, на якой ён пісаў свой папярэдні ліст, – “руская”.

Мікола Ермаловіч звяртае ўвагу і на такі факт: у “Хроніцы Літоўскай і Жамойцкай” (1405 г.) гаворыцца пра Андрэя Літвіна, які раіў Вітаўту не ісці на згоду з непрыяцелем, крыкнуўшы “Не мири, Витавте, не мири”. Гэта дало падставу Вітаўту назваць яго Нямірам. Гэты факт яскрава сведчыць пра тое, што ні вялікі князь, ні яго набліжаныя не гаварылі на мове, падобнай да сучаснай літоўскай, а меркаваліся на славянскай (беларускай) мове.

### *Залаты век Беларусі.*<br>*Пачатак беларускай нацыі*

XVI ст. нездарма завуць Залатой парой (Залатым векам) Беларусі. У гэты час нашая краіна дасягнула найвялікшага росквіту. У гэты ж час з’явіліся найзначнейшыя помнікі беларускай культуры ў розных галінах: у літаратуры, у мастацтве, у архітэктуры і, нават, у музыцы. Ніжэй я спыняюся на дзейнасці толькі тых людзей, што зрабілі важны ўнёсак у фармаванне беларускай нацыянальнай ідэі. Я перакананы – без іх творчасці не было б і сучасных выдатных дасягненняў у беларускай культуры.

Ці можна гаварыць аб беларускай нацыі ў XVI ст.? Гэты час ведамы як Залатая пара ў гісторыі Беларусі, пазней, у XVII ст., ужо пачалася эпоха гэтак званага заняпаду. Менавіта ў XVI ст. склалася нацыя ў Англіі, трохі пазней, у XVII ст. (пасля рэвалю-

цыі 1789 г.), бярэ пачатак французскі нацыяналізм.

Ведама, што Залатая пара адзначаецца развіццём і росквітам беларускай мовы і літаратуры. Мы атрымалі ў гэты час "Апостал", "Псалтыр" Францішка Скарыны, "Катэхізіс" Сымона Буднага і шмат іншых выдатных твораў на старабеларускай мове. Пісалі ў той час і на лаціне (Мікола Гусоўскі "Песня пра зубра"), і па-польску (Сімеон Полацкі, вершы).

У адной дзяржаве – Вялікае княства Літоўскае – гаварылі на блізкіх гаворках (дыялектах). Але побач жылі, стыкаліся людзі, якія паслугаваліся і менш зразумелымі мовамі. Славянскія (беларускія) гаворкі існавалі па-суседству з балцкімі (жамойцкімі, аукштайцкімі). Слабыя камунікацыі таго часу, брак адзінай інфармацыйнай прасторы, характэрнай для нашага часу, дазвалялі гэтым мовам суіснаваць побач у значнай ступені незалежным жыццём.

Як мы ведаем, час фармавання нацыяў у часы ВКЛ яшчэ не настаў. Для беларускай нацыі ён прыйдзе толькі ў XIX ст. Што ж станавіла сабой у этнічна-нацыянальным сэнсе ВКЛ? У XVI ст. існавалі, безумоўна, этнічныя групы, што аб'ядноўваліся паводле моўнай, тэрытарыяльнай і канфесійнай адзнакі. Аднак ці толькі пра этнічныя групы мы можам гаварыць? Не малую ролю адыгрывалі тады і патрыятычныя пачуцці, што відаць з твораў Скарыны, які пісаў, што кожны чалавек "да таго месца ласку мае", дзе ён нарадзіўся. І хоць насельнікаў ВКЛ нельга назваць беларускай ці ліцвінскай нацыяй, але ў гэтым народзе ўжо было шмат прыкметаў будучай нацыі, і такія поліэтнічныя ўтварэнні можна назваць протанацыянальнымі.

Янка Запруднік у сваёй кнізе "Беларусь на гістарычных скрыжаваннях" (Мн., 1996) піша: "І вясковыя жыхары, і значная большасць месцічаў заставаліся праваслаўнымі. Прычына гэтага супраціву рэфармацыйным плыням ляжала ў спольшчанасці большай часткі магнатаў, так што адданасць веры продкаў была для большасці беларусаў справаю на-

цыянальнага выжывання". Гэты факт сведчыць, што адной з найважнейшых нацыянальных рысаў беларускай протанацыі была праваслаўная вера. У вялікай ступені менавіта хрысціянства, у праваслаўным яго варыянце, абумовіла асноўныя рысы будучай беларускай нацыі, яе менталітэт і светагляд.

Паставім пытанне цяпер наступным парадкам. Раз нацыі ў ВКЛ не было, але былі яе папярэднікі – протанацыі, то ў якой ступені яны характарызуюць будучую нацыю – беларускую, з аднаго боку, і літоўскую, з другога? Які быў іх шлях да нацыі? Якія вызначальныя якасныя пераходы перажыла протанцыя, перш чым ператварыцца ў нацыю?

Э. Сміт піша: "Меркаваць, што абмежаваная колькасць людзей, якія гавораць на падобных гаворках, вызнаюць тыя самыя звычаі і пакланяюцца тым самым багам, утвараюць этнічную супольнасць і таму павінны даць нараджэнне нацыяналізму ... значыцца губляць жыццёва важныя этапы этнагенезу і не засяроджвацца на шуканні чыннікаў, што спрыяюць ператварэнню неакрэсленай этнічнай катэгорыі ў этнічнае аб'яданне, а потым у этнічную супольнасць, не гаворачы ўжо пра нацыю".[1]

Ад Залатой пары да пачатку фармавання беларускай нацыі – перыяду нараджэння першых беларускіх пісьменнікаў і дзеячоў новай хвалі (Францішка Багушэвіча, Дуніна-Марцінкевіча, стваральнікаў газеты "Гоман") – пралягаюць цэлыя тры стагоддзі. Якія ж факты можна вылучыць на шляху беларускага этнасу да нацыі, каб выразна сфармуляваць ідэю беларускага нацыяналізму?

**Першы і мусовы аспект.** Пры стварэнні канцэпцыі нацыяналізму вельмі важны для ўсякай нацыі ***зварот да мінулага.*** Кожнае паўторнае адкрыццё мінулага аднаўляе ў памяці народа яго лепшых герояў, адкладвае ў падсведамасці нацыянальныя сімвалы, вучыць браць прыклады з тых ідэалагізаваных асобаў, якія адпавядаюць, хай і не зусім, іх сучаснаму

[1] Э. Смит. Национализм и модернизм. М., 2004. С.94

іміджу, але змушаюць браць з іх прыклад і рабіць так, як рабілі яны. Тут трэба не проста адзначыць "літоўскіх князёў Гедыміна і Вітаўта" ці "польскага караля Ягайлу" як гістарычных асобаў, а гаварыць пра іх як пра слаўных сыноў беларускага народа, ніколі не дазваляючы іншанайменняў: "літоўскі", "польскі", "рускі", інш. Не ўступаць у марную палеміку: як правільна пісаць – "Міндоўг" ці "Міндаўгас"? Пагатоў не высвятляць, якой народнасці ці, яшчэ горш, якой нацыі быў гэты Міндоўг. Ён быў безумоўна **беларус**, і толькі **беларус**! Трэба браць прыклад з сучасных літоўцаў. Там усё строга: і Міндоўг, і Скарына, і Адам Міцкевіч, і Кастусь Каліноўскі былі, ведама ж, – літоўцамі! Сучасны літоўскі нацыяналізм далёка перасягае сціплыя спробы канструявання беларускага нацыяналізму. Хоць пачыналі яны, як лёгка бачыць, з малога – усяго толькі дадалі канчатак "ас" да ўсяго, што можна было. І вось, мы ўжо маем не польскага паэта Міцкевіча, а літоўскага Міцкявічуса, не праваслаўнага князя Альгерда, а язычніка – Альгердаса і г.д.

І мы праглынулі гэтую нажыўку. І ездзім ужо не ў Вільню, а ў Вільнюс...

Пільна патрэбна ведаць і помніць для нас, беларусаў, найважнейшае: мы як нацыя (дакладней, протанацыя) *скла́ліся ў часы Вялікага княства Літоўскага*. Гэта была, як вельмі слушна сказаў Мікола Ермаловіч: ***Беларуская дзяржава "Вялікае княства Літоўскае"***.

Цэнтральнай фігурай Залатой пары справядліва лічыцца Францішак Скарына.

### *Францішак Скарына*

Скарына – пэўна што храналагічна першая магутная постаць на беларускім полі, у філасофіі якой мы бачым тыя прыкметы нацыяналізму, што сталі базавымі ў наш час.

Гэта, па-першае, **патрыятызм** Скарыны. У прадмове да кнігі "Юдзіф" Скарына піша:



*“...понеже звери, ходящие в пустыни, знають ямы своя; птици, летающие по воздуху, ведают гнезда свои; рибы, плывающие по морю и в реках, чуют виры своя; пчелы и тым подобная боронять ульев своих, – тако ж и люди, игде зродилися и ускормлены суть по бозе, к тому месту великую ласку имають.”*

І Скарына, маючы да сваёй Бацькаўшчыны “вялікую ласку”, спраўджваў свае думкі на практыцы. Ён не стаў працягваць сваёй асветніцкай і выдавецкай дзейнасці на Чужыне – у Чэхіі. А добра вывучыўшы друкарства, выдаўшы шэраг біблійных кніг у Празе, апрабаваўшы там друкарскі станок, пераехаў дадому – у Вялікае Княства і заснаваў у сталіцы Вільні друкарню. І ўсё далейшае жыццё Скарыны непарыўна знітавана з Бацькаўшчынай. Гэтай, блізкай сэрцу, краіне ён аддае свае найлепшыя сілы, выдае 23 кнігі з галоўнай Кнігі людства – Бібліі пад агульнай назвай: ”Библия руская выложена доктором Франциском из славного града Полоцька, Богу ко чти и людем посполитым к доброму навучению”.

Скарына падкрэслівае ў гэтай назве тое, што Біблія ім выдаецца не так, як было заведзена ў тыя часы, – на царкоўнаславянскай мове, а на “рускай”, г. зн. на той мове, якой карысталіся грамадзяне ВКЛ – русіны. А, як ведама, русіны – гэта адна з назваў беларусаў у тыя часы (XVI ст.). Мова Бібліі Скарыны, такім парадкам, – беларуская (ці, як любяць часам гаварыць “асцярожныя” даследнікі, – старабеларуская). Ён не ідзе наўслед традыцыі тых часоў – друкавання твораў на лацінскай ці царкоўнаславянскай мове – на прафетычных мовах, а ламае гэтую традыцыю на карысць роднай мовы: “*К пожитку посполитого доброг-*



Аляксей Марачкін.
"Пачатак.Ф.Скарына"

*што, найболей с тое причины иже мя милостивый Бог с того языка на свет пустил».*

Дарэчы, гэты факт прыхільнасці да роднай мовы і нават выкарыстання яе для друкавання галоўнай кнігі – Біблії, сведчыць пра тое, што Скарына мог быць толькі праваслаўнага веравызнання, ён не мог быць католікам, бо ў тыя часы католікі карысталіся вылучна лацінскай мовай, і друкаванне Біблії на любой іншай мове выглядала б тады як страшэнная ерась, за якую прыйшлося б адказваць вельмі строга. Аб праваслаўным характары Скарынавай Біблії сведчыць таксама і той факт, што выдзены ім Псалтыр паводле падбору – Праваслаўны Псалтыр (В. Дарута). Але галоўным довадам праваслаўнасці Скарыны ёсць тое, што Скарына выкарыстоўвае праваслаўны Сімвал Веры, апускае знакамітае філіокве аб зыходжанні Святога Духа. Адзіны аргумент на карысць версіі аб каталіцкім веравызнанні Скарыны – гэта ягонае імя – Францішак, але многія даследнікі вельмі пераканаўча тлумачаць гэты факт тым, што ён прыняў такое імя, каб мець магчымасць вучыцца ў каталіцкім універсітэце.

Скарына ўвайшоў у гісторыю культуры не толькі як перакладнік Біблії на родную мову, вялікую каштоўнасць маюць яго "Прадмовы" да біблійных кніг. У гэтых прадмовах адчуваецца ўплыў нацыянальнага, народнага жыцця – адчуваецца Беларусь.

Няшмат нам гісторыя пакінула людзей, якія б маглі, як Францішак Скарына на пачатку XVI ст.,

так шчыра выказацца аб сваёй мове, сваім народзе, сваёй Бацькаўшчыне. Яшчэ не настаў час фармавання нацыяў, дамінавалі вылучна рэлігійна-містычныя настроі і прыхільнасці, цывілізацыйны падзел ішоў перш за ўсё праз канфесіі. У асобе Скарыны мы бачым чалавека новага часу, ён з тых, што даюць пачатак цэлай эпосе, з тых, што ствараюць новую парадыгму жыцця.

Як піша даследнік гісторыі беларускай філасофіі А. Ляўковіч: "Яшчэ ў XVI ст. наш знакаміты асветнік Францыск Скарына гаварыў аб тым, што людзей аб'ядноўваюць не так рэлігійныя, як агульначалавечыя і нацыянальна-культурныя каштоўнасці. Ён першым прыйшоў да высновы, што сцверджанне агульначалавечых каштоўнасцяў звязана з абуджэннем нацыянальнай свядомасці і, наадварот, што чалавек па-сапраўднаму можа асэнсаваць сябе ў якасці прадстаўніка чалавецтва, калі ён асэнсуе сябе як прадстаўнік свайго народа. У беларускага кнігадрукара агульначалавечыя і нацыянальныя каштоўнасці гарманічна злучаюцца".

Я б не сцвярджаў так катэгарычна, што Скарына лічыў рэлігійныя, а дакладней, хрысціянскія каштоўнасці другаснымі побач з памянёнымі агульначалавечымі і нацыянальна-культурнымі каштоўнасцямі, але тое, што ён вылучаў нацыянальныя асаблівасці народа як асобную каштоўнасць, – гэта важны і вельмі прагрэсіўны крок у бок новага вітка развіцця чалавека – станаўлення яго як чалавека нацыянальнага.

Акрамя вышэйсказанага, важныя адзнакі нацыянальнага духу ў творчасці Францішка Скарыны праяўляюцца ў наступных момантах:

1) Ф.Скарына быў першым кнігадрукаром, які распачаў друкаванне не лацінкай, а родным кірылічным пісьмом. Не Масква і не Кіеў былі бацькаўшчынай першага друкаванага твора на роднай мове, а Беларусь. Менавіта тут, у Вільні (пасля папярэдняга пражскага перыяду), з'явіліся першыя кнігі, напісаныя беларускай мовай. Я наўмысна не вылучаю

Вільню як супольны, літоўска-беларускі, горад, бо такім ён стаў шмат пазней. У часы Скарыны ў XVI ст. Вільня была цэнтрам беларускай культуры і сталіцай беларускай дзяржавы ВКЛ;

2) Ф. Скарына быў, відаць, і першым нацыяналістам, ці, дакладней, калі так можна сказаць, – протанацыяналістам, бо нацыі на той момант яшчэ не ўтварыліся. Яго шлях – адукацыя ў еўрапейскіх універсітэтах, вяртанне на Бацькаўшчыну, праца першапраходца. Яго шлях – гэта шлях не эмігранта і шукальніка лёгкага бестурботнага выйсця, а самаахвярнае жыццё на карысць Літвы-Полаччыны і ў канцавым выніку – нашай Будучыні.

* * *

Вялікую ролю ў фармаванні беларускай нацыянальнай ідэі ў разгляданы перыяд (XV–XVI стст.) адыграў род князёў Астрожскіх, пра якіх я маю гаварыць ніжэй.

### *Князі Астрожскія і нацыянальная ідэя*

Тры постаці, тры князі Астрожскія: Фёдар, Канстанцін Іванавіч і Канстанцін (Васіль) Канстанцінавіч – гэта наша слаўная гісторыя, наш нацыянальны гонар, гэта трывалы падмурак нацыянальнай беларускай ідэі.

У Украіне гэтыя выдатныя людзі даўно шануюцца як нацыянальныя героі. Існуе нават меркаванне, што менавіта дзякуючы малітвам князёў Астрожскіх шматпакутная Украіна атрымала нарэшце свабоду. У Беларусі ж імя князёў Астрожскіх амаль не ведамае шырокаму колу людзей. У асяроддзі праваслаўнай Царквы, можа, і знойдуцца згадкі пра Святога Фёдара (Астрожскага) (год нараджэння неведамы – год смерці – 1438), зрэшты, іх не багата, кароценькая інфармацыя. Канстанцін Іванавіч Астрожскі (1460–1530) ведамы, перадусім, у асяроддзі беларускай апазіцыі і, найперш, у звязку з перамогай беларускага войска над маскоўцамі 8 верасня 1514 г.

А Канстанціна Канстанцінавіча Астрожскага (1527–1608) гісторыкі будуць ведаць як абаронцу праваслаўя і няўрымслівага змагара супраць уніі.

Гэтыя людзі – гонар і слава Беларусі, гэта нашая гісторыя, падмурак і аснова развіцця нашай краіны і, пэўна што, яе будучыні.

Але ў сведамасці беларускага народа няма таго месца гэтым людзям, якое маюць Мінін і Пажарскі для расійцаў, Багдан Хмяльніцкі для ўкраінцаў. Унёсак жа ў нацыянальную спадчыну Беларусі нашых слаўных князёў Астрожскіх такі ж, калі не большы, як расійскага Мініна ці ўкраінскага Багдана.

Усе тры асобы, пра якія ідзецца, маюць дачыненне да гісторыі як Беларусі, так і Украіны, бо ў часы іх дзейнасці (XV–XVI стст.) нашы дзяржавы існавалі як адзіная дзяржава, Вялікае княства Літоўскае. Аднак карані Астрожскіх знаходзяцца ўсё ж на беларускіх землях, і дзейнасць князёў больш датычыць менавіта Беларусі, а не Украіны. Пра дзейнасць князёў Астрожскіх і іх унёсак у беларускую духоўную спадчыну найбольш дэталёва і шчыра напісала Алена Яскевіч у кнізе “Падзвіжнікі і іх святыні”[1]. Працягваючы яе аналіз і грунтуючыся на іншых крыніцах, я б вылучыў асноўныя ўнёскі гэтых постацяў у развіццё менавіта беларускай нацыянальнай культуры.

Дзякуючы намаганням украінскіх навукоўцаў і палітыкаў князя Канстанціна Іванавіча Астрожскага ў Украіне лічаць усё ж нацыянальным героем менавіта беларускай гісторыі. Аднак помнік, які быў усталяваны ў Астрозе не так даўно, увекавечыў памяць трох Астрожскіх: Фёдара – у манаскай схіме, Канстанціна Іванавіча – з мячом, Канстанціна Канстанцінавіча – з Бібліяй.

Фёдар (Феадор – пасля пострыгу) Данілавіч Астрожскі быў старэйшым сынам у сям‘і роду князёў Астрожскіх. У 1436 г., пасля смерці бацькі, ён становіцца багатым землеўласнікам. Адначасна яму пе-

---

[1] А. Яскевіч. Падзвіжнікі і іх святыні. Мн., 2001.



К.І.Астрожскі

райшло ў спадчыну права апекі над усімі праваслаўнымі цэрквамі і манастырамі на сваіх землях. Князь Фёдар быў багатым магнатам, ведамым ваяром і аўтарытэтным дыпламатам. Сучаснікі называлі яго "мужам з усіх правадыроў Літвы і Русі, вялікай смеласці і велізарнага аўтарытэту". Але нечакана Госпад паклікаў яго да іншай дзейнасці. Ён адмовіўся ад княскай славы і прыняў мніства ў Кіева-Пячорскай лаўры з імем Феадосій. У старажытных царкоўных спевах праслаўляецца яго "пакорнае паслушэнства і маўчальніцтва", а таксама руплівасць на ніве добрых спраў і хрысціянскай любасці. Ужо з канца XV ст. ён стаў ушаноўвацца як святы. Нятленныя мошчы святаўлівага Фёдара і цяпер ляжаць у Дальных пячорах Кіева-Пячорскага манастыра побач з іншымі праведнікамі і цудатворцамі.

У 2002 г. Фёдар Астрожскі быў далучаны да ліку Беларускіх святых. На заказ беларускага праваслаўнага Брацтва Віленскіх Мучанікаў быў намаляваны абраз святаўлівага. 22 мая 2004 г. адбылося перанясенне абраза з часцінкамі мошчаў св. Фёдара Астрожскага з Свята-Пятра-Паўлаўскага сабора г. Мінска ў дамавую капліцу брацкага дома «Кінанія» (пас. Калодзішчы, Мінскі р-н). Цяпер гэта адзінае месца ў Беларусі, дзе на памяць святаўлівага створана дамавая царква, і тут мяркуюць пабудаваць на яго чэсць капліцу.

Манаскае стаРанне святаўлівага Фёдара Астрожскага не выпадковая падзея. Ён працягвае традыцыі манаства ў Беларусі, якія маюць тысячагадовую гісторыю і звязаныя з такімі імёнамі, як Ефрасіння По-

лацкая, Кірыла і Лаўрэнцій Тураўскія, Афанасі Філіповіч, іншыя. Здабыткі ўзнёслай духоўнасці, якія звязаныя з беларускімі праваслаўнымі традыцыямі, ніколі не перарываліся, яны існавалі паралельна з маскоўскім праваслаўем і існуюць у наш час. І прыклад Астрожскіх – гэта характэрная рыса беларускага менталітэту і беларускай місіі.

Канстанцін Іванавіч Астрожскі (1460–1530) быў праўнукам Фёдара Астрожскага. Меў вельмі высокую пасаду – найвышэйшы гетман Вялікага княства Літоўскага, кашталян Віленскі, ваявода Троцкі. К. І. Астрожскі паказаў сябе як выдатны дзеяч праваслаўнай асветы, заснаваў шмат праваслаўных храмаў, спрыяў іх развіццю. Аўтарытэт гетмана ў ВКЛ быў такі высокі, што польскі кароль, дарма што князь быў адданы праваслаўю, давяраў яму найважнейшыя дзяржаўныя справы, аб чым і сведчыць яго прызначэнне гетманам. У гісторыю князь К. І. Астрожскі ўвайшоў як выдатны ваяр. А перамога войска ВКЛ над маскоўскім войскам у бойцы пад Оршай 8 верасня 1514 г., якую слушна лічаць заслугай бліскучага камандавання К. І. Астрожскага, стала векапомнай падзеяй усёй беларускай гісторыі. На жаль, засяродзіўшыся толькі на гэтай бойцы, многія пісьменнікі і гісторыкі не надаюць належнай увагі іншай, не менш значнай для Беларусі, дзейнасці князя. Так, у кнізе “Дзесяць вякоў беларускай гісторыі” У. Арлова і Г. Сагановіча бітве пад Оршай прысвечаны цэлы артыкул. Пра іншую дзейнасць Канстанціна Астрожскага і пра іншых Астрожскіх там не сказана ні слова.

Маскоўскія гісторыкі традыцыйна асвятляюць падзеі XVI ст. як змаганне маскоўскага праваслаўнага царства з “лацінствам” Польшчы і Літвы. Аднак мала хто апісвае тыя войны як войны дзвюх праваслаўных дзяржаў – ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы. І нават пазней, калі ВКЛ увайшло ў склад Рэчы Паспалітай, львіная доля войскаў гэтай дзяржавы складалі выхадцы з тэрыторыі сучаснай Беларусі і Украіны – г. зн. былі ці праваслаўнымі, ці каталі-

камі ўсходняга абраду. Толькі тады, калі ідзецца пра князёў Астрожскіх, "тэндэнцыйнае мысленне" не дазваляе расійскім гісторыкам выкарыстоўваць традыцыйны "антылацінскі" падыход, і яны мусяць такі адзначыць факт існавання праваслаўя ў Беларусі.

Вось як піша М. І. Кастамараў у сваёй кнізе "Руская гісторыя ў жыццяпісах яе найгалоўнейшых дзеячоў" пра князя Канастанціна Іванавіча Астрожскага: "Праўнукам Фёдара Астрожскага, ведамага сваёй барацьбой за Русь супраць Польшчы, быў знакаміты Канстанцін Іванавіч, гетман літоўскі, надзейны слуга польскага караля, які быў у палоне ў Івана III, і потым адпомсціў за свой палон пабіццём маскоўскага войска пад Оршай. Варожасць да праваслаўнай Масквы і надзейная служба каралю-каталіку не перашкаджалі яму славіцца праваслаўнай набожнасцю. Ён шчодра будаваў і ўпрыгожваў праваслаўныя храмы, разам з тым адчыняў пры цэрквах школы для дзетак і, такім чынам, заклаў пачатак рускай асветы".

Модныя беларускія гісторыкі сучаснай папуляцыі накшталт пісьменніка У. Арлова, адмаўляючы імперскае мысленне ў трактоўцы нашай гісторыі, аўтаматычна адмаўляюць і праваслаўны чыннік у гісторыі нават Полацка-Тураўскага перыяду, не кажучы пра ВКЛ. Насамрэч не трэба адкідаць гэты чыннік беларускай гісторыі ні на карысць уніі, ні рыма-каталіцызму. На Усходзе Еўропы існавалі дзве праваслаўныя дзяржавы, два сталыя супернікі – ВКЛ і Маскоўская дзяржава. І ў нашай гісторыі перыядычна з'яўляюцца такія стараннікі і заступнікі праваслаўя, як князі Астрожскія.

Шмат якія сучаснікі К. І. Астрожскага адзначаюць ягоную непахісную вернасць праваслаўю. Ён не проста не прыняў ідэі уніі, якая была вельмі моднай у ягоныя часы, а стаў прыкладам адданасці веры продкаў для тых, хто яшчэ вагаўся ці станавіўся на шлях празелітызму. Вось адна з вызначальных рысаў беларускага патрыятызму: адданасць свайму народу, яго звычаям, яго спрадвечнай веры – праваслаўю.

К. І. Астрожскі рупіўся аб высокім статусе служэбнікаў праваслаўнай царквы, каб яны ні ў чым не папускалі каталіцкім святарам. Для такіх мэтаў з яго ініцыятывы быў скліканы Сабор Духавенства ў 1508–1509 гг.

Пасля аршанскай перамогі кароль Жыгімонт дазволіў князю Канстанціну Іванавічу Астрожскаму пабудаваць каменныя цэрквы ў Вільні – Троіцкую і Нікольскую.

У 1523 г. кароль Жыгімонт на просьбу Канстанціна Астрожскага даў дазвол ігумену Макарыю аднавіць Кіеўскі Міхайлаўскі Залатаверхі манастыр і заснаваў у ім манаскую грамаду. Дзякуючы намаганням К. І. Астрожскага было цвёрда вызначана юрыдычнае становішча Праваслаўнай Царквы ў ВКЛ, якое да яго было вельмі неакрэсленым. Князь Канстанцін Астрожскі спрыяў матэрыяльнаму забеспячэнню цэркваў, умацаванню рэлігійнага мыслення і падняццю дабрачыннасці праваслаўных хрысціян. Усяго за час дзейнасці Канстанціна Астрожскага Праваслаўная Царква ў ВКЛ атрымала больш за 20 грамат, якія пашыралі і сцвярджалі яе правы.

Канстанцін Іванавіч Астрожскі спрыяў адкрыццю ў Вільні ў 1524 г. друкарні, адкуль выйшлі кнігі Францішка Скарыны.

Князь К. І. Астрожскі скончыў свой зямны шлях у 1530 г. і быў пахаваны ў Кіева-Пячэрскім манастыры.

Трэці з выдатных князёў Астрожскіх пра якога цяпер належыць сказаць, – гэта сын К. І. Астрожскага – Канстанцін (у хрышчэнні Васіль) Канстанцінавіч Астрожскі. Заслугі гэтага чалавека перад Беларуссю і нават перад сусветнай гісторыяй такія значныя, што яго імя сапраўды магло б стаць нацыянальным сімвалам Беларусі. Аднак нягледзячы на яго царкоўныя заслугі, адрозна ад свайго прадзеда Феадора ён не кананізаваны Царквою. Ён не слаўны, як ягоны бацька, ваеннымі ўчынкамі. Але, на мой пагляд, гэтая постаць найвыдатнейшая ў гісторыі Беларусі XVI ст.

Нарадзіўся Канстанцін Канстанцінавіч у г. Тураве ў 1526 г. і правёў там свае дзіцячыя і юнацкія гады. Выхоўваўся ў адданасці праваслаўнай веры і атрымаў добрую дамовую адукацыю.

У звязку з асобай гэтага Астрожскага мне б хацелася адзначыць вельмі важны факт, што датычыць яго светагляду: К. К. Астрожскі быў адным з першых, хто наўпрост звязваў веру з нацыянальнымі асаблівасцямі. Пра гэты факт, прыкладам, сведчыць А. Яскевіч у кнізе "Падзвіжнікі...", дзе сказана, што князь быў "глыбока перакананым прыхільнікам праваслаўя, які разумеў непарыўную сувязь традыцыйнай хрысціянскай веры з этнічнай самабытнасцю ўсходніх славян". Яго вера была жывая, князь свята пільнаваўся пастоў, а на Вялікі Пост перад Пасхай адыходзіў у манастыр, дзе праводзіў дні і ночы ў малітвах і набажэнствах.

Дзейнасць К. К. Астрожскага на зломе XVI–XVII стст. была скіраваная на падняцце адукаванасці праваслаўнага беларускага люду, на асвету і адраджэнне найлепшых традыцыяў праваслаўнай культуры. Як піша Л. Ляўшун – праваслаўнае адраджэнне, пра якое так аддана рупіўся К. К. Астрожскі, павінна было адлюстраваць "тое нязлíўнае адзінства веры і кіраванага ёю розуму, якое было дасягнута Вялікімі каппадакійцамі".[1]

Захапленне еўрапейскай вучонасцю, што ішла ў часы Рэфармацыі з Захаду, не абышло і ВКЛ XVI ст. Кальвінізм трывала набіраў моцы на гэтых землях, і нам ёсць што ўспомніць з тых часоў імклівага пашырэння пратэстанцтва з яго нацыянальна-арыентаваным характарам і аблічам. Такія фігуры, як Радзівіл Чорны – гэта скарб нацыянальнай беларускай гісторыі. І нездарма сучасны паслядоўнік таго рамантычнага

---

[1] Благоверный князь Константин-Василий Острожский как зеркало религиозных поисков литвинов // Вестник белорусского экзархата. Благоверный князь Острожский. Альманах. Том 1. Мн., 1996.

кальвінізму XVI ст. Лявон Ліпень сцвярджае, што кальвінізм і ёсць нацыянальная вера беларусаў. Такі вывад зроблены не без падстаў. Кальвіністы і антытрынітарыі неслі асвету ў Беларусь, Сымон Будны выдаў у тыя часы знакаміты "Катэхізіс" на беларускай мове. Нёс сваю асветніцкую ношу Васіль Цяпінскі.

Контррэфармацыя, якую прынеслі каталікі-езуіты, спахапіўшыся пасля празмерных поспехаў пратэстантаў, была важкім унёскам у бурны працэс адукацыі, асветы і навуковага прагрэсу ў Беларусі XVI ст. Нездарма гэтае стагоддзе лічыцца Залатой парой беларускай культуры. Дзейнасць езуіцкіх школ і чынны наступ каталіцызму наагул не маглі застацца без увагі К. К. Астрожскага. Напачатку ідэю сумоўя праваслаўных з каталікамі ён актыўна падтрымаў. Яму падабалася тая вучонасць, што неслі каталікі, ці, як тады казалі, "лацінства", бо князя вельмі турбавалі занядбаны стан і неадукаванасць шырокіх мас беларускага сялянства.

Аднак тое сумоўе, што на самай справе неслі ідэолагі грэка-каталіцызму і якое атрымала потым назву "унія", аказалася механічным спалучэннем, арыфметычным складаннем праваслаўна-грэцкага вучэння з рыма-каталіцкім. І нядоўгае захапленне К. К. Астрожскага ідэяй уніі змянілася цвёрдым перакананнем у яе сутнасці і смяротнай пагрозы для Святога Праваслаўя. Замест уніі К. К. Астрожскі правёў вялікую працу па адраджэнні праваслаўных традыцый візантыйскага кірунку. Князь Канстанцін быў не толькі глыбокім вернікам, з'яўляючыся грамадскім і дзяржаўным дзеячом (ужо ў 32 гады ён быў ваяводам кіеўскім), ён паводзіў сябе і як прадбачлівы палітык. Ён бачыў, якую страшэнную пагрозу незалежнасці Бацькаўшчыны нясе Люблінская унія 1569 г., і ўжо на сейме выступаў супраць аб'яднання ВКЛ і Польшчы ў адну дзяржаву. Аднак найбольш непрымірымым і цвёрдым чалавекам паказаў сябе К. К. Астрожскі ў барацьбе паміж праваслаўнай і уніяцкай "партыямі" таго часу.

У 1596 г. на склiканым мiтрапалiтам Рагозай саборы праваслаўных епiскапаў у Брэсце адбылося абвяшчэнне аб'яднання Усходняй i Заходняй Цэркваў ВКЛ. У стварэннi унii не ўзяла ўдзелу вялiкая колькасць праваслаўнага духавенства, сярод якiх найбольш аўтарытэтнымi былi епiскапы Гедэон Балабан – епiскап Львова, i Мiхаiл Капысценскi – епiскап Пярэмышля. Гэтыя епiскапы разам з князем Канстанцiнам Астрожскiм i iншымi працiўнiкамi царкоўнага расколу прыехалi ў Брэст i правялi свой праваслаўны, антыунiяцкi Сабор. Духоўным натхнiцелем i арганiзатарам яго быў Канстанцiн (Васiль) Астрожскi. Такiм чынам, значная частка праваслаўных (Львоўская, Пярэмышльская епархii i iншыя) засталiся па-за царкоўнай унiяй.

На альтэрнатыўным праваслаўным Саборы 1596 г. былi апратэставаны ўсе пастановы унiятаў. I з таго моманту пачаўся працяглы перыяд бескампрамiснай барацьбы за чыстату праваслаўнай веры. Грунтоўны аналiз дакументаў i iншай лiтаратуры, прысвечанай гэтаму перыяду зроблены ў кнiзе Iвана Саверчанкi "Aurea mediocritas". У гэтай кнiзе прыведзены вельмi трапныя вынiковыя словы-рэзюме кiеўскага архiмандрыта Нiкiфара Тура: "Не дазволiм схiлiць нас да новай веры. Не вырачамся праваслаўя i набажэнства нашых продкаў. Не адступiмся ад правiлаў i дагматаў святой Усходняй Царквы. Не выйдзем за межы, якiя вызначылi нашыя бацькi. Не прымем паслушэнства папу рымскаму, застанемся вернымi патрыярху".[1]

Вялiкую ведамасць i сусветнае прызнанне атрымаў яшчэ адзiн бок дзейнасцi Астрожскага. У 1576 г. у г. Астрог (цяпер Украiна, Ровеская вобласць) князь Канстанцiн Канстанцiнавiч заснаваў знакамiтую славяна-грэка-лацiнскую Астрожскую Акадэмiю. Паводле традыцыяў сярэднявечнай Еўропы там навучалi сямi свабодным навукам i пяцi замежным мовам. У Акадэмii дзейнiчала мноства адукаваных людзей,

[1] Саверчанка I. В., Auera mediocritas. Мн., 1998. С. 107.

сярод якіх рускі першадрукар Іван Фёдараў, выдаўцы Васіль Суражскі і Цімафей Сматрыцкі і іншыя. У Астрогу друкавалася навуковая, вучэбная, богаслужэбная літаратура.

Сучасная Украіна шануе гісторыю Астрожскай Акадэміі і яе знакамітага заснавальніка. У праекце «Сем цудаў Украіны» невялікі гарадок Ровенскай вобласці – Астрог – прадстаўляюць адразу два «цуды» – Астрожскі замак і Нацыянальная акадэмія Украіны «Астрожская акадэмія». Цікава, што ў адроджанай Нацыянальнай акадэміі «Астрожская акадэмія» жывуць традыцыі XV–XVI стст.: студэнтаў тут завуць «спудзеямі», а пасвячэнне ў студэнты – «інаўгурацыяй». У акадэміі ў 2006 г. ўпершыню за 430 гадоў адбыўся выпуск багасловаў з вышэйшай свецкай адукацыяй.



Астрожская Біблія. Злева – арыгінал, справа – юбілейнае выданне 2006 г.

У кастрычніку 2006 г. Украіна святкавала 425-гадовы юбілей Астрожскай Бібліі. Да юбілею К. К. Астрожскага нашыя суседзі ўкраінцы зрабілі, як яны самі пішуць, "бясцэнны падарунак" – цудоўнае юбілейнае выданне Астрожскай Бібліі. Украінскае юбілейнае выданне Астрожскай Бібліі 2006 года цікавае тым, што гэта не проста перавыданне, а хутчэй навуковая праца архімандрыта Рафаіла (Рамана Турканяка), якую ён рабіў на працягу 31 года. Архі-

мандрыт Рафаіл правёў вялікую даследчую працу ў пошуках першакрыніц, на якія абапіраўся князь Канстанцін Астрожскі і вучоныя з акадэміі. Архімандрыт Рафаіл сцвярджае, што перавыданне Астрожскай Бібліі мае надзвычайнае значэнне. Па-першае, гэта першае навуковае выданне, якое наогул калі-небудзь было зроблена ў славянскім свеце. Па-другое, яно зроблена ў Украіне. "Прыйшоў час аднавіць гістарычную справядлівасть і паказаць, хто, што, калі, дзе і як браў. А таксама паказаць, што мы не былі невукамі. Ужо ў XVI ст. у нас былі людзі, якія змаглі падрыхтаваць і выдаць такую Біблію, якая стала мірадальнай на стагоддзі», – піша на сваім сайце архімандрыт Рафаіл. На сайце гаворыцца таксама, што быццам бы гістарычная справядлівасць – гэта залічыць Астрожскую Біблію да ўкраінскай спадчыны, ды ні слова не сказана, што найперш гэта беларуская святыня, а ўжо потым украінская. Заканчваецца тэкст сайта фразай: «Прийміте цю Біблію всіх слов'ян не яко річ земну, але як дар небесний», – напісаў Канстанцін Астрожскі ў 1581 г.". Аказваецца, К. К. Астрожскі ў 1581 г. ўжо ведаў сучасную ўкраінскую мову! І далей: "Дзякуючы самаадданай працы яшчэ аднаго ўкраінца сёння многія з нас змогуць па-сапраўднаму ацаніць гэты велічны падарунак с Нябёс". Трэба разумець, што першы ўкраінец быў Канстанцін-Васіль Астрожскі?

З пункту гледжання логікі і гістарычнай праўды Астрожскую Біблію трэба безумоўна лічыць спадчынай беларускай культуры і гісторыі. Па-першае, яна была надрукаваная ў 1581 г. беларусам Іванам Федаровічам (Фёдаравым). Па-другое, кіраўніцтва выданнем ажыццяўлялася князем Канстанцінам Астрожскім, які нарадзіўся ў беларускім горадзе Тураве, і большая частка яго жыцця прайшла на тэрыторыя Беларусі, і галоўнае – ён быў абаронцам праваслаўя Беларусі, заўсёды змагаўся за нацыянальна-духоўны складнік культуры і чысціню праваслаўя Вялікага княства Літоўскага.

І па-трэцяе, як падкрэслівае Алена Яскевіч, Астрожская Біблія – тэкст на царкоўнаславянскай мове старабеларускай рэдакцыі. У аснову гэтай Бібліі быў пакладзены грэцкі пераклад, выкананы Супрасльска-Заблудаўскім рэлігійна-асветніцкім гуртком. "Менавіта ў сценах Супрасльскай Лаўры выспявалі ідэі нацыянальнага духоўнага адраджэння, а пазней вынешваліся планы стварэння кананічна вытрыманага і дакладнага перакладу-зводу Бібліі" – слушна заўважае А. Яскевіч.

Астрожская Біблія стала першай поўнай Бібліяй на славянскай мове (у старабеларускай рэдакцыі!) – выдатная падзея таго часу! Над перакладам Святога Пісьма працавалі 72 перакладнікі. Агульны аб'ём Астрожскай Бібліі склаў 1256 старонак. Астрожская Біблія стала асновай для ўсіх славянскіх кніг Святога Пісьма, якія сёння ёсць у царкоўным карыстанні і ў свецкай практыцы.

Застаецца толькі сказаць, што незразумелае абыякавае стаўленне беларусаў да сваіх вялікіх продкаў Астрожскіх. Не толькі Украіна шануе іх. Як піша часопіс «Пшэглёнд Праваслаўны» («Праваслаўны агляд») (рэдактар Ганна Радзюкевіч) – род Астрожскіх ушанаваны і на Беласточчыне. Праваслаўнымі вернікамі Польшчы заснаваны Фонд імя князя Канстанціна Астрожскага, які штогод узнагароджвае прэміяй імя Астрожскага найбольш ведамых руплі́ўцаў на ніве духовага адраджэння.

Зробім высновы. Дзейнасць князёў Астрожскіх – гэта жывая практыка нацыянальнай ідэі ў Вялікім княстве Літоўскім. А для нас, найперш, падмурак. За некалькі стагоддзяў да сучаснай ідэі нацыяналізму, угрунтаванай у хрысціянстве, Астрожскія паказалі, як лучыцца патрыятызм, любасць да Бацькаўшчыны, Літвы-Беларусі, з верай. Яны не адрывалі гэтых паняткаў адно ад другога і тым самым на некалькі стагоддзяў апярэдзілі той пагляд на нацыянальную ідэю, якая існуе цяпер. Яны – піянеры, першаадкрывальнікі новага, сучаснага чалавека, што

спалучыў у сабе рысы шчырага хрысціяніна і нацыянальна-сведамага грамадзяніна.

### *Што адбывалася з беларускай нацыяй у часы канфедэрацыі ВКЛ і Польшчы (у Рэчы Паспалітай)?*

У 1569 г. была ўкладзена палітычная унія (звяз) ВКЛ з Польскім каралеўствам (Люблінская унія), а ў 1596 г., пасля шэрагу папярэдніх безвыніковых спроб, урэшце ўтварылася і рэлігійная унія – паяднанне праваслаўнай і каталіцкай канфесіяў у адзіную, як здавалася яе творцам, уніфікаваную канструкцыю, што атрымала назву "царкоўная унія", альбо "грэцка-каталіцкая вера".

**ВКЛ як частка Рэчы Паспалітай.** У гэты час быў страчаны вельмі важны складнік беларускага этнасу – адзінства рэлігійнай прасторы, была моцна падарваная вера продкаў – праваслаўе. Беларусы, маючы праваслаўны менталітэт, пачалі існаваць у прасторы каталіцкага свету. Паступова рэальнасцю станавілася і спалячванне беларускага насельніцтва ўва ўмовах супольнага жыцця ў новай дзяржаве – Рэчы Паспалітай. Унія, ці грэка-каталіцызм, мала далі практычнае карысці.

У чым істотнае адрозненне статусу беларусаў у ВКЛ і ў Рэчы Паспалітай?

1. ВКЛ: беларуская мова – дзяржаўная. У культуры, літаратуры, асвеце і іншых галінах грамадскага жыцця дамінуе беларускі чыннік. Праваслаўе мае высокі статус, яно пашырана ў асяроддзі найвышэйшых дзяржаўных асобаў, у тым ліку і вялікіх князёў.

2. Рэч Паспалітая: польская мова – дзяржаўная. Беларуская мова выціскаецца з ужытку і, як ведама, у 1696 г. зусім забаронена. Зразумела, і ў канцылярыі і ў літаратуры, і ў адукацыі пачынае ўладарыць польская мова і польская культура. Беларуская эліта пачынае імкліва спалячвацца. Контррэфармацыя прынесла новы ўздым каталіцкай экспансіі, а пашырэнне

езуіцкіх арганізацыяў прынесла з сабой спольшчаную культуру, асвету і адукацыю. Праваслаўе не толькі занядбанае, за яго вызнанне ў Рэчы Паспалітай можна было нават трапіць у турму, пра што, прыкладам, сведчыць жыццё Афанасія Філіповіча.

Такім парадкам, гэты сціслы спіс сведчыць аб зменах, якія былі відавочна не на карысць беларускаму этнасу і пагатоў не набыццю належнага патэнцыялу для стварэння нацыі, да якога вось-вось мела прыступіць Еўропа.

Яшчэ адзін негатыўны момант новай палітычнай сітуацыі адзначае Янка Запруднік: "На працягу стагоддзяў і ўрад, і насельніцтва Вялікага княства Літоўскага былі надзвычайна талерантныя да іншых рэгіёнаў, але калі масы беларусаў і ўкраінцаў не пайшлі за сваімі іерархамі ў унію з Рымам, каралеўскія ўлады разам з каталіцкімі і уніяцкімі дзеячамі здзейснілі шматлікія акты гвалту над праваслаўнымі". Пра хвалі сілавання іншаверцаў мы ведаем досыць шмат фактаў, а забойства ў 1623 г. праваслаўнымі Віцебска уніяцкага біскупа Язафата Кунцэвіча ўвайшло ў гісторыю як прыклад найвышэйшай рэлігійнай нецярпімасці. Для праваслаўных забіты біскуп застаўся ў памяці як "душахват", а для уніятаў стаў Святым, кананізаваным Рымам. І гэта у асяроддзі усё таго самага народа! Пра якое нацыянальнае адзінства, крэўнасць, адчуванне "свайго пляча" тут можна гаварыць! Значыць, нацыі не было, а тыя рэшткі этнічнай сведамасці не ішлі ў залік перад моцнай рэлігійнай фактурай.

Моцны наступ Рэфармацыі прывёў да таго, што большасць пратэстанцкіх груп (перш за ўсё кальвіністы) навярнуліся зноў у каталіцызм, яшчэ больш узмацніўшы і без таго бурны ўзрост Каталіцкай Царквы ў Беларусі. Дзейнасць праваслаўных брацтваў – галоўных абаронцаў веры ў XVI ст. і ў першых дзесяцігоддзях XVII ст. – на сярэдзіне XVI ст. затухае.

Яшчэ адзін працэс тых часоў нельга пакінуць па-за ўвагай. Гэта масавыя ўцёкі ў Украіну беларусаў,

перадусім сялянскага насельніцтва, якія не жадалі прымусовага пераходу ў уніяцкую царкву. Нашыя збеглыя продкі далучаліся да казацкіх аддзелаў і з гэтых казакаў спакваля ўтварылася знакамітая Запарожская Сеч. Беларуская кроў цячэ ў венах украінскіх казакаў.

Вось жа, сітуацыя, што складвалася ў XVII ст., адмоўна адбівалася на фармаванні беларускай нацыі. Пры гаворцы пра жыхароў Рэчы Паспалітай усё больш выкрастоўваўся палітычны тэрмін "польскі", каталіцызм паступова набываў статус "польскай веры" – назвы, якая пашырылася сярод простага люду. У асяроддзі ж праваслаўных дзеячоў устойліва захоўвалася назва "каталіцтва", або "лацінства".

Такая сітуацыя была на карысць Масковіі, суседа, які ўсё мацнеў і няўхільна ператвараўся ў Імперыю. Цары тлумачылі свае бесперапынныя захопніцкія войны з Рэччу Паспалітай (1604–1618, 1632–1634, 1548–1654, 1654–1667) патрэбаю вызвалення праваслаўных ад "лацінства". Менавіта "маскалі" ўпершыню ўвялі ў канцы XVII ст. для абазначэння праваслаўнага насельніцтва ўсходніх абласцей Рэчы Паспалітай назву "беларусы" ("беларусцы"), а тэрыторыю назвалі Беларусь. Самі ж беларусы толькі ў канцы XIX ст. пачалі ўжываць гэта слова як саманазву, замест тэрмінаў "ліцвіны", "русіны" альбо "тутэйшыя". Тая ж ліцвінская шляхта лічыла сваёй роднай мовай рускую (русінскую, старабеларускую). Масква ў дачыненні да сваіх заходніх суседзей выкарыстоўвала тэрміны "Літва", "літоўцы". (Пра жамойтаў, якія праз пэўны час прысвоілі сабе назву "літоўцы", рускія мала што і ведалі).

Але і гэтыя тэрміны мелі толькі мясцовае значэнне, для тэрыторыі ВКЛ. Тэрыторыя этнічнай Польшчы называлася Каронай, а жыхары – палякамі. На дзяржаўным роўні Рэчы Паспалітай, незалежна ад тэрытарыяльнай лакалізацыі, усе жыхары называліся палякамі і дзяржава – Польшчай. Таму і ўсе памянёныя войны Масковіі з Рэччу Паспалітай у

XVII ст. называюцца руска-польскімі. Успамінаючы ганебную для рускіх акупацыю Масквы польскім войскам у 1610–1612 гг., цяпер мала хто, як з рускага боку, так і з нашага, задумваецца над тым, што істотную, калі не большую, частку таго “польскага” войска складалі выхадцы з тэрыторыі ВКЛ, г. зн. беларусы.

### *Беларускі нацыяналізм XVIII стагоддзя*

Беларускі нацыяналізм XVIII – першай паловы XIX ст. відавочна ўзнікае як адказ на масавы ўздым еўрапейскіх нацыналізмаў, які распачаўся пасля славутай буржуазнай французскай рэвалюцыі 1789–1793 гг. і паразы напалеонаўскага абсалютызму. Гэты беларускі нацыяналізм яшчэ не меў, відаць, сваёй акрэсленай назвы і нейкай ідэалагічнай канцэпцыі. Яго было б лепш назваць мясцовым патрыятызмам, прынамсі, гэтае слова больш адпавядае сучасным уяўленням пра тагачасны нацыянальна-вызначальны чын. Але гэта неістотна. Менавіта той, ліцвінскі, нацыяналізм XVIII ст. і стаў пачаткам наступнай хвалі этнаграфічных падарожжаў, экспедыцыяў, штуршком да напісання першых гістарычных працаў, першых беларускіх вершаў, апавяданняў, пачаткам фармавання беларускай літаратурнай мовы.

Як і ў папярэдніх XVI–XVII стст., беларускія землі захоўвалі за сабой назву “Літва”, а жыхары называліся “ліцвінамі” ці “рускімі”. Мова, якой карысталіся грамадзяне гэтага літоўскага краю Кароны, была таксама не польскай, і пагатоў не была яна нікому не ведамай жмудскай мовай. Яна была той, якую цяпер называюць беларускай. Але ў той час яна мела шэраг назваў, сярод якіх нам ведамыя – літоўская (ліцвінская) альбо руская (русінская). Прытым пры выкарыстанні тэрміна “руская”, “рускі” падкрэслівалася ці мелася на ўвазе выразнае адмежаванне гэтага панятка ад назвы мовы суседняй Маскоўскай Дзяржавы, а пазней Расійскай Імперыі, дзе мясцовая мова называлася маскоўскай альбо расійскай.

Яскравай праявай літоўскага (беларускага) нацыяналізму ёсць асоба знакамітага Адама Міцкевіча. І галоўнае не тое, што ён нарадзіўся на этнічна беларускіх землях, на Навагрудчыне, а тое, што ён і лічыў сябе "ліцвінам", і апяваў сваю Радзіму Літву ў вершах, а не Польшчу. Знакаміты верш, дзе ёсць радкі "Litwo, ojczyzno moja, ty jesteś jak zdrowie", сведчыць, па-першае, аб тым, што А. Міцкевіч лічыў сваёй Айчынай не Польшчу, а менавіта Літву-Беларусь. Па-другое, тут выказваецца такая моцная любасць дла гэтай сваёй Айчыны, якую можна прыраўнаць да галоўнай каштоўнасці для чалавека – здароўем, "ты – як здароўе", – піша паэт.

Цікавыя прыклады гэтай самай любасці, прывязанасці да сваёй Айчыны, сваёй зямелькі ў нашых суайчыннікаў XVIII ст. прыводзіць Адам Мальдзіс у кнізе "Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя", выдадзенай у Мінску яшчэ ў 1982 годзе. Ён адзначае, што беларуская шляхта і наагул жыхары Беларусі "ніколі не пачуваліся этнічна адзінымі з палякамі – "караняжамі". Больш за тое, у XVIII ст. сепаратысцкія імкненні толькі ўзмацніліся, узрасло адчуванне адметнасці. Нават заможная шляхта, магнаты не хавалі сваёй непрыхільнасці да Польшчы. Так, Кароль Радзівіл казаў: "Я люблю Карону, пане каханку, але няма лепш, як наша Літва. У мяне і ў Кароне ёсць кавалак зямлі, але чорт бы там сядзеў"[1].

А. Мальдзіс адзначае, што ў XVIII ст. пачалі выразна акрэсліваццa патрыятычныя пачуцці жыхароў Беларусі[2]. "Праўда, пратрыятызм яшчэ не мае "ўласнага імя". Ён то "літоўскі", то "рускі". Але ўжо супрацьпастаўлены "польскаму", "кароннаму". Аналізуючы творы беларускіх мемуарыстаў, Мальдзіс адзначае іх нязменную супольную рысу – любасць да

---

[1] Rzewuski Henryk. Pamiątki Soplicy. Warshawa, 1978. С. 65.

[2] Мальдзіс Адам. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя. Мн., 1982. С. 92.

сваёй Бацькаўшчыны. Так, Лукаш Галамбёўскі, паляк з паходжання, пачаў сябе лічыць ліцвінам (дзяцінства яго прайшло на Пінскім Палессі). Звяртаючыся да сына, ён кажа: “Там ліцвіны, і ты ад ліцвіна паходзіш… Як мяне гэта цешыць, што ты маю родную старонку знайшоў такой самай, якой яна ў маіх успамінах, у маім сэрцы. Бо калі ты “кароняж”, то я ліцвін, да касцей ліцвін, да таго ж пінчук”.

Другі мемуарыст Г. Жавускі, які паходзіць з Валыні, юнацтва правёў у Літве – на Міншчыне. “Маё разумовае жыццё абудзілася ў Літве, і калі б хто не лічыў мяне ліцвінам, той бы мяне пакрыўдзіў”. Літва была для Жавускага вельмі прывабнай, скарбніцай старых традыцыяў, там менш адчувалася ўлада грошай. “У Літве была прастата звычаяў, клапатлівае захоўванне родных паданняў … Нейкае маральнае скіраванне грамадзкай думкі”. Фактычна, Жавускі абгрунтоўвае свой нацыяналізм, і ягонае жаданне лічыць сябе ліцвінам сугучнае сучаснаму панятку нацыяналізму, дзе адным з галоўных атрыбутаў ёсць жаданне належаць да гэтай нацыі.

Такім парадкам, ***фармаванне беларускага нацыяналізму ў XVIII ст. ёсць бясспрэчным фактам.*** Гэтае стагоддзе, у прыраўнанні з мінулымі XVI і XVII стст., дадае новых элементаў у панятак нацыі, скарынінская любасць да родных мясцінаў падымаецца на новы ровень сведамасці. Літва (у цяперашнім сэнсе – Беларусь) становіцца нацыянальнай дзяржавай, і тое, што ВКЛ уваходзіць у склад Рэчы Паспалітай, не замінае нацыяўтварэнню, а можа, наадварот, стымулюе фармаванне беларускай нацыі. На вялікі жаль, не вельмі становучую ролю адыграў факт пераходу назвы Літва да другой этнічнай супольнасці – жамойтаў, а новае найменне жыхароў ВКЛ – беларусы да гэтага часу не ўсімі і не заўсёды ўтаесамляецца з ранейшай “Літвой”.

І ўсё ж, няма аніякіх падстаў лічыць, як гэта робіць В. Акудовіч разам з В. Булгакавым, што беларуская нацыя пачала ўтварацца толькі ў Расійскай

імперыі" канца XIX ст. Да гэтага часу беларуская нацыя, пэўна ж, існавала і як гістарычная супольнасць людзей, і як народ, адметны сваімі старажытнымі традыцыямі ды звычаямі і, больш за тое, на гэты час сфармавалася беларуская мова ў сучасным сваім выглядзе, якая тады ўжо пачала свой цярністы шлях літаратурнага ўнармавання (які, на жаль, не скончыўся да нашай пары).

## 5. Беларусь у складзе Расійскай Імперыі. Мадэрнісцкі этап фармавання беларускай нацыі

Такім парадкам, мы падышлі да новай якаснай змены ў лёсе пакутніцы Беларусі, што звязаны ўжо з жыццём нашых продкаў у складзе новай дзяржавы – Расійскай Імперыі. Гэта – XIX ст. і пачатак XX ст. Настаў новы, мадэрнісцкі этап фармавання беларускай нацыі.

Як ведама, ува ўсім свеце ў гэты час узнікаюць нацыі і ствараюцца дактрыны нацыяналізму. Гэта час росквіту капіталізму, і таму ўзнікненне нацыяў і нацыяналізму часта разглядаюць праз прызму класавага змагання. Мы ж паспрабуем пайсці іншым шляхам.

Мадэрнісцкі этап фармавання беларускай нацыі я ўмоўна буду дзяліць на чатыры перыяды.

**Першы перыяд** нацыянальнага абуджэння і мадэрнісцкага фармавання нацыі прыпадае на XIX ст., дасягае кульмінацыі ў перыяд беларуска-польскага паўстання 1862–1863 гадоў і канчаецца з бальшавіцкім пераваротам 1917 г.:

a) Беларусь пасля падзелаў Рэчы Паспалітай (1772 г. – першая палова XIX ст.);

b) Пачатак русіфікацыі беларусаў і скасаванне уніі;

c) Беларуская літаратура, мастацтва і культура першай паловы XIX ст.;

d) Палітычнае жыццё Паўночна-Заходняга краю ў другой палове XIX ст.

### *Беларусь пасля падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г. – першая палова XIX ст.)*

Уваходжанне Беларусі ў склад Расійскай Імперыі мела як станоўчыя, так і адмоўныя вынікі для фармавання беларускай нацыі. Менавіта гэты час (умоўна – пасля французскай рэвалюцыі 1789 г.) лічыцца пунктам адліку новага надэтнічнага ўтварэння – нацыяў, і пачаткам новага нацыяналістычнага мыслення – нацыяналізму, які стаў праз зусім кароткі час, у XX ст. асноўным рухавіком сусветнай гісторыі.

Што прынёс Беларусі і перш за ўсё беларускаму этнасу гэты новы паварот лёсу – жыццё ў складзе новай дзяржавы, Расійскай Імперыі?

***Першае***: нарэшце **пачаў ужывацца тэрмін Беларусь** (у рускамоўным варыянце – "Белоруссия"). Так у Пецярбургу называлі занятую рускімі ў 1772 г. тэрыторыю Рэчы Паспалітай, што даўней належала Вялікаму княству Літоўскаму. Паралельна "на месцах" для абазначэння гэтай тэрыторыі працягваў ужывацца тэрмін "Літва" (прыкладам, гэта адлюстравана ў творах А. Міцкевіча).

***Другое:*** **прыпыняецца працэс паланізацыі краю.** Фактычна, беларуская эліта, якая несла адказнасць за адукацыю, культуру і навуку, была ў вялікай ступені спаланізаваная. Беларуская мова з **1696 г.** знікае не толькі з афіцыйнага ўжытку, але і з іншых сфер грамадскага жыцця – адукацыі, асветы, культуры і інш. Нават ува уніяцкіх набажэнствах Рэчы Паспалітай, дзе доўга захоўваўся ўсходні абрад і царкоўнаславянская мова, з'явілася рэальная пагроза поўнай паланізацыі. Але аб гэтым гаворка ніжэй (раздз. VII).

***Трэцяе***: пасля 243-гадовага панавання уніі да беларусаў **пачынае вяртацца праваслаўе**, якое было верай продкаў і існавала перад уніяцкім часам каля 400 гадоў. Да 1772 г. грэка-каталіцкая царква амаль вычарпала, калі можна так сказаць, сваю унікальную выратавальную функцыю ад лацінскай пагрозы і скаталічвання беларусаў у XVI–XVIII стст.

Цэнтрам асветы ў гэты час становіцца Полацкая

акадэмія, якая была на той час адзінай у свеце езуіцкай навучальнай установай. Можна пагадзіцца з І. Бабковым, які лічыць, што на базе беларускага этнасу каля сярэдзіны XIX ст. пачынае складвацца новая беларуская ідэнтычнасць.[1] Сапраўды, як мы ўжо бачылі з папярэдняга раздзелу, XVIII ст. мела праявы мясцовага нацыяналізму, які ўзрос на непрыняцці польскай культуры. Пасля 1772 г. уздзеянне польскай культуры няўхільна падае, і беларусы пачынаюць сябе бачыць без польскай цэзуры і наагул, калі можна так сказаць, без польскай аўры. Яны знаёмяцца з рускай культурай, нібыта блізкай ёй, звяртаюцца да здаецца роднага праваслаўя. Але гэта толькі здаецца. Руская культура, руская мова, рускае праваслаўе сталі за два стагоддзі непазнавальна іншымі. І на гэтым фоне, па-ранейшаму не прымаючы польскай культуры, беларусы пачынаюць разумець, што яны хоць і "рускія", але не такія, як рускія Расійскай Імперыі. Гэтае ўсведамленне ідзе як зверху, так і знізу. Інтэлігенцыя пачынае глядзець у народ, які, выходзіць, захаваў і мову, і звычаі, і наагул сваю адметную беларускую культуру. Сяляне пачынаюць таксама падымаць свой голас і сцвярджацца ў новых умовах.

Інтэлігенцыя заявіць аб беларусах праз такія імёны, як Ян Баршчэўскі, Рамуальд Падбярэзскі, Ян Чачот і Дунін-Марцінкевіч. Просты народ, сяляне дадуць першых беларускіх паэтаў мадэрнага перыяду – Паўлюка Багрыма, Вінцэся Каратынскага.

Руская адміністрацыя Паўночна-Заходняга краю таксама пачынае знаёміцца з насельніцтвам гэтай тэрыторыі і разумець, што тут жывуць не зусім рускія, тут гучыць не зусім руская мова і вера тут нейкая не такая... І пачынаецца працэс русіфікацыі краю. Школы, іншыя навучальныя ўстановы пераводзяцца на рускую мову навучання. Для уніяцкай царквы настаюць чорныя дні, ідзе чынны перавод уніяцкіх прыходаў у праваслаўныя. А з 1839 г. унія наагул скасоўваецца.

[1] І. Бабкоў. Генеалогія беларускай ідэі // ARCHE, № 3, 2005.

Русіфікацыя Беларусі – гэта ***чацвертая адметнасць*** грамадска-палітычнага жыцця Беларусі ў складзе Расійскай Імперыі. Пра гэта напісана досыць шмат, але мала хто звяртае ўвагу на галоўную змену ў статусе беларусаў, абумоўленую руска-беларускімі дачыненнямі ў першай палове XIX ст. Гэтая адметнасць – якасныя змены самога беларускага этнасу: пастутова пачынае ўтварацца мадэрная беларуская нацыя. Менавіта на ўсведамленні сваёй адметнасці, на разуменні сваёй асаблівай ідэнтычнасці – не польскай і не рускай, а... беларускай! – ідзе гэты працэс, і ён становіцца незваротным. І вельмі яскрава ён відаць з развіцця беларускай літаратуры і ўзнікнення першых мадэрных беларускіх пісьменнікаў. Беларусь увайшла ў склад Расійскай Імперыі амаль што спольшчанай – тэрыторыяй суцэльна польскага духу і сведамасці, без нацыянальнай эліты, але затое з вялікай масай "простага" народу – "тутэйшых". Праз некалькі дзесяцігоддзяў – пад сярэдзіну XIX ст. сталі назірацца і першыя істотныя рысы менавіта беларускай нацыянальнай адметнасці.

Адлік беларускай нацыі можна распачынаць і ад В. Дуніна-Марцінкевіча, і ад Ф. Багушэвіча – першых славутых беларускіх пісьменнікаў, якія засведчылі ў сваіх творах наяўнасць новай супольнасці чалевечага роду – беларусаў.

У раздзеле III мы пагаворым пра нашых пісьменнікаў падрабязней, а тут мне хацелася б закрануць яшчэ адну буйную палітычную падзею, што таксама паўплывала на лёс нашай нацыі. Гэта ведамыя ваенныя дзеянні 1862–1863 гг.

Паўстанне 1862–1863 гг. хоць і мела перадусім сацыяльна-эканамічны характар, і цяжка меркаваць, колькі там было нацыянальных рысаў, але відавочна, што менавіта з гэтых часоў беларускі народ звярнуў на сябе ўвагу як суб'ект гісторыі. Крызіс капіталізму ў Расіі, цяжкае становішча перыферыйных раёнаў, нацыянальны прыгнёт сталі прычынай выбуху вызвольнага руху ў Польшчы і Беларусі. Характэр-

на, што ўкраінскае сялянства не падтрымала гэтага паўстання. Галоўнай прычынай гэтага быў прапольскі і каталіцкі характар беларуска-польскага паўстання, што не пасавала да праваслаўнай большасці як Украіны, так і Беларусі. Хоць у Беларусі, як лічыцца, менавіта з гэтых часоў ўзнікла цікавасць да беларусаў як асобнай нацыі і пачала развівацца беларуская літаратура ды пісьменства.

Мне асабіста думаецца, што гэтае паўстанне для беларускага нацыянальнага адраджэння асаблівай ролі не адыграла. Нашмат большы стымул развіццю беларускай нацыі даў уздым навукі і культуры, які быў характэрны для Расійскай Імперыі XIX ст. з усталяваннем развітага капіталізму.

Найбольшую ўвагу стадыі развіцця капіталістычнага ладу таго перыяду надаваў даследнік нацыяў Том Нэйрн (гл. артыкул "Интернационализм и второе пришествие" ў кнізе "Нации и национализм". М., 2002). Нэйрн лічыць, што падставовым чыннікам развіцця нацыяналізму было нераўнамернае развіццё капіталістычнага грамадства. Ён вылучае мажлівасць развіцця ў гэтых умовах "па-свойму" і фармаванне ваяўнічага міжкласавага грамадства, што цалкам усведамляла асабістую ідэнтычнасць адносна панавання вонкавых сілаў. У такім рэчышчы можна разглядаць і з'яўленне Каліноўскага, пра якога пазней быў створаны цэлы міф.

### *Кастусь Каліноўскі: чалавек і герой*

*Некаму, можа, будзе балюча развітацца з легендамі, але і праўду няма сэнсу хаваць. Гэта ўжо гісторыя, а яна павінна быць праўдзівая, каб у прышласці не паўтараць памылак.*

Аляксандр Надсан. "Пра Боскае і людское"

Аглядваючыся на постаці нацыянальных дзеячоў нашага мінулага, зразумела, нельга прайсці міма асобы Кастуся Каліноўскага – кіраўніка беларуска-польскага паўстання 1863 г. супраць царызму. Тым

больш, што ў некаторых творах ён быў названы "заснавальнікам беларускага нацыяналізму" (напрыклад, у кнізе Янкі Запрудніка "Беларусь на гістарычных скрыжаваннях").

Літаратурная спадчына К. Каліноўскага невялікая – усяго толькі некалькі нумароў "Мужыцкай праўды" ды "Лісты з-пад шыбеніцы", аднак для другой паловы XIX ст. гэтыя творы, напісаныя на нікому невядомай "мужыцкай" мове, аказаліся з'явай вельмі незвычайнай, рэвалюцыйнай. Ніхто не будзе аспрэчваць таго факта, што менавіта пасля паўстання К. Каліноўскага ў сведамасці расійскай грамадскасці і нават усёй сусветнай супольнасці пачаў фармавацца погляд на Паўночна-Заходні край Расійскай Імперыі не як на частку імперыі, а як на тэрыторыю пражывання новага няведамага дагэтуль народа – беларусаў.

Гэта адзін бок феномена К. Каліноўскага. Другі бок, і ён быў не менш істотны, – гэта творчасць і дзейнасць К. Каліноўскага, якая непасрэдна мае дачыненне да беларускага нацыянальнага адраджэння і станаўлення беларускага нацыяналізму як з'явы мадэрнай гісторыі.

Вынікі пошукаў беларускай нацыянальнай ідэі ў творах К. Каліноўскага аказаліся супярэчлівымі. Стала зразумелым, што многае з таго, што гаворыцца пра К. Каліноўскага перабольшваецца, а некаторыя ягоныя выказванні, напрыклад, пра праваслаўе "як схізму", выклікаюць канкрэтнае непрыманне – прынамсі праваслаўнымі вернікамі.

Аднак маё выступленне з сваімі заўвагамі на форуме ў Сеціве выклікала шквал крытыкі і на змест артыкула, і на мяне асабіста. Не зразумелі маёй пазіцыі многія знакамітыя дзеячы беларускай культуры. Праўда, улетку 2008 г. падчас наведвання Жыровіцкага манастыра, мне трапіліся знакамітыя लісткі "Жыровіцкая абіцель", дзе зусім незалежна ад мяне у артыкуле "Дастаеўскі і Каліноўскі" да вельмі блізкіх думак і нават больш радыкальных, прыходзіць інак Мікалай (у свеце – ведамы беларускі

паэт Зніч). Але гэта зразумела – веруючы праваслаўны чалавек наўрад ці падтрымае таго, хто абражае яго веру, а гэты факт прысутнічае ў газетах Каліноўскага. Аднак на тым жа форуме быў голас у маю падтрымку ад аднаго ведамага чалавека каталіцкага веравызнання. І зусім нечаканай была вестка з далёкага Сінгапура, дзе часова працуе прыхаджанін таго ж храма, што наведваю і я, – Пятра-Паўлаўскага. Мой праваслаўны сябра выказаў самыя злосныя словы ў мой адрас за крытыку Каліноўскага.

Каб знайсці ўсё ж нейкую залатую сярэдзіну, трэба было б прааналізаваць усе бакі праблемы. Таму я спачатку разгледжу тыя выказванні ў творах Каліноўскага, якія пакладзены ў аснову думкі тых даследчыкаў, што залічаюць яго да дзеячоў не беларускага руху, а польскага.

Першым артыкулам, дзе была звернутая ўвага на гэтую праблему, стаў артыкул эміgranцкага гісторыка Юрыя Весялкоўскага “XIX стагоддзе на Беларусі і Кастусь Каліноўскі” , надрукаваны ў кнізе “Дух часу”[1]. Ён піша: “Каліноўскі не быў незалежным лідэрам паўстання на Літве і Беларусі, а толькі адным з польскіх памагатых, аб чым пішуць палякі. ...Яго Правінцыяльны Камітэт, як улада на Літве і Беларусі, у сваёй адозве ад 29 студзеня 1863 г. гаварыў наступнае: “Паўстанне на Літве выракуе аб уваскрошанні Польшчы і смерці ворагаў”.

Далей Ю. Весялкоўскі даволі аргументавана паказвае ролю Каліноўскага ў паўстанні 1863 г. як змагара за свабоду Польшчы, але ніяк не як змагара за вольную Беларусь, як гэта лічыцца ў нас цяпер, фактычна, амаль афіцыйна. “Шкада, што мы не маем газеты “Мужыцкая праўда” Каліноўскага – піша Весялкоўскі (у ягоным распараджэнні былі толькі асобныя вытрымкі з гэтых лісткоў і “Ліст з-пад шыбеніцы”).

У мяне была мажлівасць пазнаёміцца з гэтымі лісткамі, што я і зрабіў. Тэксты ўсіх нумароў “Му-

[1] Весялкоўскі Юры. Дух часу. Палемічна-крытычныя артыкулы. Беласток – Лёндан, 2005.

жыцкай праўды" у выглядзе фотакопій ёсць у кнізе "К. Калиновский. Из печатного и рукописного наследия". (Минск, 1988). Высветлілася, што Юры Весялкоўскі меў рацыю.

Дык што ж беларускага ў "Мужыцкай праўдзе" К. Каліноўскага?

***"Мужыцкая праўда" № 1.***

Адразу звяртае на сябе ўвагу зварот – "Дзецюкі!" Не "беларусы", не "ліцвіны", не "русіны", а "дзецюкі". Зразумела, "беларусы" як назва народа тады яшчэ не была распаўсюджана, аднак народ неяк зваўся.

І ў гэтым лістку і ў іншых праходзіць даміноўная лінія супраць "маскалёў", чыноўнікаў і паноў: "Маскалі, чыноўнікі і многа паноў будуць перапыняць пісьмо наша да вас, но найдуцца людзі ... што хочуць вашай свабоды..." Выказваецца недавер маскоўскай палітыцы. Што Масква не дасць вольнасці мужыку. Далей ідзе заклік узяцца за рукі, мужык, пакуль здольны трымаць касу і сякеру, будзе "ƀaranic swaho".

***"Мужыцкая праўда" № 2.***

Быў наш народ калісь вольны і багаты – піша Каліноўскі. Праўда, не ўдакладняе, калі гэтае шчасце надарылася нам. Паншчыны тады не было. Было лесу шмат. Пра гэты мужыцкі "рай" Каліноўскі дае наводку: людзей тады было мала, а "поля колькі хочаш", так што не трэба служыць паншчыны, кожны мог паставіць сабе хату і мець сваё поле. Але разгадка, дзе ж было месца і калі былі тыя слаўныя часы, дае наступны абзац лістка: "u susedsztwe z nami zyu Niemiec i Mascal". Не "маскаль" і "Польшча", а "Немец"! Значыць "мы" – гэта Польшча. Далей болей – "наш кароль", як можна зразумець тэкст, рабіў усё па справядлівасці, а "маскаль" увёў падаткі, паншчыну і чынш на зямлю. І заклік – ісці вайною на "маскаля".

***"Мужыцкая праўда" №3.***

У гэтым лістку Каліноўскі піша, быццам "народ паразумнеў": "ужо ведаем, што чалавек вольны, гэта калі мае кусок сваей зямлі, за катору ані чыншу і аброку не плаціць, ані паншчыны не служыць".

Канчае, як і ў іншых лістках – зваротам да рэлігійных пачуццяў мужыка: “Толька, дзецюкі, смела, бо з намі Бог і праўда, а калі мы з Богам, то з намі ваяваці трудна, бо боска моц вяліка, а народу многа”.

***“Мужыцкая праўда” № 4***

“Ронд маскоўскі, дзецюкі, не так робіць, як рабіці трэба, не думае, каб палегчыць народаві, а вымышляе адно спосабы, як абадраці і заўсім людзей зглуміці”.

“У нас, дзецюкі, адно учаць у школах, каб ты знаў чытаці па-маскоўску, а то для таго, каб цябе зусім перарабіці на маскаля. Суды маскоўскія – гэта воўчая яма, гдзе не разбіраюць, чы за табою праўда, чы не, а скубуць адно як могуць”. Змест гэтага лістка скіраваны супраць маскалёў і цара, якія яны дрэнныя і як дрэнна жыць мужыку.

Аднак канструкцыйных парад да развязання гэтай праблемы не даецца.

***“Мужыцкая праўда” №5***

Звяртаюць на сябе ўвагу наступныя развагі: “Помняць яшчэ нашыя дзяды ... што за іх часоў мужыкі рэкрута і не зналі. Было войска, то праўда, но войска польскае ўсё было зэ шляхты, а калі мужыкі часамі захацелі ісці на вайну, так зараз з іх знімалі мужыцтва да і паншчыну, давалі зямлю, а ўсю вёску рабілі шляхтаю. ...ронд Польскі даваў зямлю, даваў вольнасць, даваў шляхецтва, – а маскаль чы гэтак робіць?”

Сапраўды, прачытаўшы такія радкі, так і хочацца паперці ў Польшчу па зямлю ды шляхецтва... Але ці так бестурботна і шчасліва жыў мужык пад Польшчай? Ю. Весялкоўскі прыводзіць некалькі характэрных прыкладаў на гэты конт. Так, барон Жыгімонт Герберштэйн пасля сваіх падарожжаў праз Беларусь у 1517 і 1526 гг. пісаў: “Народ бедны і прыгнечаны рабствам”. Пётр Скарга пісаў: “Паны не толькі адбіраюць у гаротнага селяніна ўсё, што ім зроблена, але і забіваюць яго, калі пажадаюць”. Нават прагрэсіўная травеньская канстытуцыя 1791 г. не скасавала прыгоннага права ў Рэчы Паспалітай.

***“Мужыцкая праўда” №6***

Каліноўскі паходзіў з каталіцкай сям'і, але да ся-

лян, "мужыкоў", ён звяртаецца як да вызнаўцаў уніяцкай веры – "справядлівай уніяцкай веры". Ён піша, што мужыкоў перавярнулі да схізмы, на праваслаўе, што "ён сягодня, як той сабака, жыве без веры і, як сабака, здохне чартам на пекла". Вось, што значыць для Каліноўскага праваслаўе! Гэта значыць "аддаць у пекла на вечныя мэнкі, будуць чэрты душу рваці на кускі, а смала ў вантробах кіпеці будзе".

У 1863 г. большасць беларусаў вызнавала праваслаўе. Ведама, што на момант трох падзелаў Рэчы Паспалітай сітуацыя была іншай – многія беларусы, асабліва сялянскае насельніцтва, былі уніятамі. Але што станавіла сабой уніяцтва? Беларуская уніяцкая царква захоўвала ўсходні абрад у набажэнствах, г. зн. праваслаўны, але заразом сама была пад юрысдыкцыяй Рыма. Таму і не дзіўна, што пасля далучэння Беларусі да Расійскай Імперыі пераход ад уніяцтва да праваслаўя ў сваёй практычнай частцы адбыўся вельмі хутка. Ход служэння літургіі і іншых царкоўных набажэнстваў цалкам захаваўся пры гэтым пераходзе. А тое, што ў заканчэнні службы ўпамінаецца не папа Рымскі, а рускі патрыярх, для селяніна аніякага значэння не мела. Вось вам і схізма. Дык што ж, за гэта трэба яго "аддаць у пекла на вечныя мэнкі" і ён будзе "як сабака"?

Вось такія "парады" дае К. Каліноўскі беларускаму мужыку.

Дарэчы, у апошнія часы існавання Рэчы Паспалітай становішча уніяцкай, ці грэка-каталіцкай, царквы ў дзяржаве рабілася ўсё менш пэўным. Палякі, не дачакаўшыся "плаўнага пераходу" з праваслаўя ў каталіцызм праз унію 1596 г., убачылі, як уніяцкая Царква ператвараецца ў асобную канфесію, фактычна становіцца самастойнай, не хацелі з гэтым фактам пагадзіцца. Таму ў асяроддзі вернікаў-уніятаў вялася палітыка паланізацыі, і яшчэ ў 1717 г. з'явіліся дакументы аб скасаванні "рускай" веры, якой было не толькі праваслаўе, але і унія.

Дык за што ж Кастуся Каліноўскага так узнеслі нашчадкі? Проста ягоная фігура выгадна ўпісвалася

ў палітычныя гульні пэўных дзеячоў. Першае: ніхто не будзе адмаўляць ягонага ўдзелу ў змаганні з самадзяржаўем, і мы ведаем К. Каліноўскага як аднаго з лідэраў польскага паўстання 1863 г. на тэрыторыі Беларусі. Другое: гэта ўслаўленне Каліноўскім уніі, але гэты другі момант пачалі ўжо актыўна выкарыстоўваць пасля "раскруткі" Каліноўскага як рэвалюцыянера, тады, калі ён ужо *стаў* вядомым дзеячом.

Чаму я купую ўвагу на гэтых спрэчных момантах нашага ведамага рэвалюцыянера? Ды таму, што адной з мэтаў маёй кнігі ёсць высвятленне дзейнасці тых людзей, якія спрычыніліся да ўтварэння незалежнай беларускай дзяржавы, фармавання беларускай нацыі і беларускага нацыяналізму. У асобе К. Каліноўскага непасрэдна, як мы бачым, такіх момантаў выявіць не ўдалося. У яго народ беларускі – гэта толькі "дзецюкі" і "мужыкі". Ёсць яшчэ, праўда, "браты з-пад Варшавы".

Аднак ёсць у паўстанцкай дзейнасці К. Каліноўскага тое, што розніць яе ад чыста польскага паўстання. І тых жа "дзецюкоў" ён вылучае не толькі ад "маскалёў".

Калі спачатку я не імкнуўся падымаць тэму Каліноўскага, то пасля прыточанага аналізу ягонай "Мужыцкай праўды" задумаўся: калі ў асобе К. Каліноўскага не праглядваецца нацыянальны беларускі дзеяч, то адкуль узяўся цяперашні вобраз гэтага нацыянальнага не тое што дзеяча, а нават героя? Ягонае імя цяпер асацыюецца з вобразам магутнага волата, пачынальніка беларускага адраджэння. Нават больш – яго пачынаюць лічыць заснавальнікам беларускага нацыяналізму, менавіта гэта сцвярджае Янка Запруднік. У якасці доваду ён бярэ цытату з "Лістоў з-пад шыбеніцы", частку з якіх варта працытаваць і мне: "Нямаш, браткі, большага шчасця на гэтым свеце, як калі чалавек у галаве мае розум і навуку. Тагды ён толькі можа быць у радзе, жыці ў дастатках, і тагды толькі, памаліўшыся папраўдзе Богу, заслужыць Неба, бо, збагаціўшы розум, раза-

ўе сэрца і радню шчыра палюбіць". Ну што ж, парады мець розум і навуку слушныя.

Чытаем далей: "но як дзень з ноччу не ходзяць разам, так не ідзе разам навука праўдзіва з няволяй маскоўскай. Ды пакуль яна ў нас будзе, у нас нічога не будзе, не будзе праўды, багацтва, ніякай навукі". Вось у чым рэч! Навука для нас – мужыкоў – не можа ісці з "няволі маскоўскай". Што ж прапануе К. Каліноўскі ў якасці развязання гэтай "маскоўскай праблемы"? А вось што, цытую далей: "Для таго, Народзе, як толькі ты пачуеш, што браты твае з-пад Варшавы б'юцца за праўду і свабоду, тагды і ты не аставайся ззаду, но ўсхапіўшы за што можаш, за касу, сякеру, цэлай грамадой ідзі ваяваці за сваё чалавечае і народнае права, за сваю веру, за сваю зямлю родную". Дык вось, трэба брацца за пэўны гаспадарчы інструмент і ісці разам *з братамі з-пад Варшавы* ваяваць супраць маскалёў, узброеных, мяркую, трохі лепш. Ці можа, у "варшаўскіх братоў" стрэльбы альбо гарматы ёсць? І зажывем мы разам з польскім панам, зажывем... Толькі прычым тут Беларусь? Янка Запруднік робіць пасля цытавання гэтага месца зусім іншую выснову: "Лісты з-пад шыбеніцы Каліноўскага сталі палітычным крэда беларускага нацыяналізму" (стар. 71). Нейкі дзіўнаваты нацыяналізм выйшаў.

Згаданая кніга з'явілася ў 1993 г. Значыць, міф пра Каліноўскага ўжо існаваў і мацаваўся далей. А дзе яго вытокі?

Дай, думаю, пагляджу на думку людзей, што жылі бліжэй да тых падзей, а значыць, і больш ведалі, прынамсі, яшчэ не так папрацаваў "сапсаваны тэлефон". І вось кніга "Белорусское движение. Очерк истории национального и революционного движения белоруссов". Аўтар – беларускі гісторык і грамадскі дзеяч пачатку XX ст. Фёдар Фёдаравіч Турук. Кніга выйшла ў 1920-м г. Дарэмна я шукаў патрэбнага прозвішча ў гэтай кнізе. Пазіцыя Турука што да патрыятызму беларусаў сярэдзіны XIX ст. блізкая да

А. Н. Пыпіна (История русской этнографии. Т IV. Спб. 1892) які слушна піша: “Гэты патрыятызм быў “беларускі”, але сутнасць яго была польская. Ён быў беларускі па любові да тэрытарыяльнай радзімы, яе пейзажных і бытавых абставін, але ўсё жыццё беларускага народа разумелася з чыста польскага пункта бачання”. А адносна падзеі 1863 г. Ф. Туруком сказана менавіта столькі, колькі было ў гэтых падзеях сапраўднага сэнсу: “Падзеі 1863 г. закранаюць у значнай ступені народныя масы Беларусі, якіх польскія паўстанцы клічуць на барацьбу з рускім царызмам і да адстойвання царкоўнай уніі на іх роднай мове... абяцаючы ім у незалежнай Польшчы “роўнасць і братства сялян і шляхты”. Дарэчы, менавіта такім патрыётам Бацькаўшчыны быў і славуты наш зямляк, польскі маршал Юзэф Пілсудскі, сэрца якога пахавана ў Вільні.

Нічога не сказана пра асобу К. Каліноўскага і ў творах В. Ластоўскага, які быў ці не найгрунтоўнейшым даследнікам гісторыі, культуры і літаратуры Беларусі пач. XX ст. Хто ж можа праліць свет? Ну зразумела! Хто ж, калі не Максім Багдановіч, геній нашай літаратуры? Прагледзім змест двухтомавіка збору твораў нашага знакамітага паэта. Так, ёсць – у артыкуле “Белорусское возрождение” адносна цікавых для нас падзей М. Багдановіч піша: беларуская мова выкарыстоўвалася ў тыя часы ў чыста практычных мэтах: “Польскія паўстанцы 1863 г. у сваю чаргу (як адказ на дзяржаўныя расійскія выданні пра беларусаў, – *А.А.*) надрукавалі шэраг выданняў на беларускай мове. Такія “Мужыцкая праўда”, “Гутарка старога дзеда”. К. Каліноўскі выдаваў у Беластоку нават беларускую газетку “Hutarka”. Вось і ўсё! Максім Багдановіч вельмі грунтоўна ведаў беларускую гісторыю і напісаў нават шэраг арыгінальных артыкулаў. І калі ён абышоў маўчаннем дзейнасць Каліноўскага як нацыяналіста, то, відаць, і не было пра што гаварыць.

Вось яшчэ адзін твор – пачынальніка беларускага руху пачатку XX ст. Антона Луцкевіча. Гэта ягоныя

“Выбраныя творы” выдадзеныя “Кнігазборам” у 2006 годзе. Тут на с. 311 мяне чакаў сапраўдны сюрпрыз пад назвай: “Праўда аб “Мужыцкай праўдзе”! (артыкул прыкладна 1932 г.). Луцкевіч піша, маўляў, часта можна спатыкацца з заявай аб выданні К. Каліноўскім у час паўстання газеты “Мужыцкая праўда”. “Заява гэтая да нядаўніх часоў паўтаралася і беларускімі адраджэнцамі, якія стараючыся выкарыстаць для сваёй акцыі ўсё, што гаварыла аб ранейшых праявах беларускага руху, вельмі даверліва аднесліся да гэтае запраўды ж рэвалюцыйнае звесткі”. Луцкевіч раскрывае недасведчанаму чытачу праўду: “мы можам увачавідкі пераканацца, што газетай “Мужыцкая праўда” не была. Гэта быў папросту цыкль *адозваў...* – і нічога болей. Выходзілі яны неперыядычна і наогул з газетай не мелі нічога супольнага... змест жа адозваў меў на мэце падняць беларускае сялянства проці Масквы і здабыць ягоную прыхільнасць для “польскага ронду” (гэтак Каліноўскі збеларушчыў не вельмі ўдатна польскае слова “rząd” – урад).

Гераізацыя Каліноўскага была распачатая яшчэ беларускімі савецкімі гісторыкамі як гісторыя пра выдатнага рэвалюцыянера, кіраўніка польскага паўстання супраць царызму ў 1863 г. Ён стаў ахвярай рэжыму і быў павешаны на 26-м годзе жыцця. Але рэвалюцыянераў такога кшталту ў Расійскай Імперыі было нямала. Чаму ж так высока ўзнятая гэтая фігура? Разгадка простая – ён і ягоныя сааўтары “Мужыцкай праўды” выкарыстоўвалі ў сваіх адозвах беларускую мову, праўда, у лацінскім алфавіце. І хоць, як вышэй падкрэслівалася, гэта было зроблена дзеля практычнай мэты, можна нават сказаць, палітычнай, – таго было досыць, каб залічыць Каліноўскага да першых нацыяналістаў.

У часы нацыянальнага адраджэння 1990-х гадоў гераізацыя Каліноўскага атрымала новы імпульс. Асабліва спрыяў гэтаму яшчэ адзін міф – міф аб уніі як нацыянальнай веры. І тут прыйшліся дарэчы “уніяцкія заляцанні” да мужыкоў у “Мужыцкай праў-

дзе". Хоць, як пішуць тыя самыя савецкія гісторыкі, Каліноўскі быў атэістам.

Падсумоўваючы, можна сказаць, што зроблены аналіз ставіць пад сумнеў значнасць унёска Каліноўскага ў справу адраджэння беларускага народа. Трэба ўсе ж аддзяляць "мух ад катлет" – аддзяляць рэвалюцыйную дзейнасць Каліноўскага ад яго дзейнасці як прыхільніка беларускай нацыянальнай ідэі.

Аднак трэба ўлічваць і час. Нават тыя, на цяперашні час невялічкія нумары, хай сабе не газеты, а адозвы "Мужыцкая праўда" – гэта адзнака зараджэння новага народа, новай нацыі і новай эпохі. Для беларусаў настаў "момант ісціны", настаў час фармавання беларускай нацыі. За ім шлі Францішак Багушэвіч, Максім Багдановіч, ішлі беларусы...

Дзякуючы выхаду "Мужыцкай праўды" перад сусветнай грамадскасцю з'явілася нікому невядомая, новая мова – беларуская. Кастусь Каліноўскі ў сваіх лістках "Мужыцкая праўда" вылучыў асобную мову беларусаў.

У наш час постаць Кастуся Каліноўскага стала легендарнай. Пісьменнікі напісалі мноства мастацкіх твораў, дзе Каліноўскі выступае ўжо як нацыянальны герой, тое ж, калі не ў большай ступені, зроблена нашымі мастакамі і скульпатарамі. І неяк не ўпісваюцца ў кантэкст гераізацыі прыведзеныя вышэй крытычныя адзнакі дзейнасці Каліноўскага. Больш за тое, мяркую, што большасць уцаркоўленых праваслаўных беларусаў не залічаць яго да сваіх гістарычных герояў.

Як жа быць?

А сітуацыя між тым і простая і разам з тым складаная. Тут мы маем сітуацыю аналагічную той, што склалася на 240 гадоў раней (1623 г.) з Язафатам Кунцэвічам. Для праваслаўных беларусаў ён быў "душахватам", для уніятаў – героем, пакутнікам за веру. Мінула амаль 400 гадоў – у цяперашніх уніятаў Я. Кунцэвіч – святы, праваслаўнаму насельніцтву ён альбо невядомы, альбо "па старой памяці" непрыяцель.

І мы тут нічога ўжо не зробім. Мы не можам на ўсе 100% прымірыць дзве часткі аднаго беларускага народа, даць ім адных і тых жа герояў, адных і тых жа святых – для гэтага перш за ўсё трэба даць адну веру, адны стандарты, адзін лад жыцця. Таму прыведзеная вышэй крытыка ні ў якім разе не азначае, што аўтар імкнецца "скінуць з п'едэстала героя" Кастуся Каліноўскага. Наадварот, я бачу ў ім не мёртвую схему апантанага рэвалюцыянера і барацьбіта з "маскалямі", а жывога чалавека, які з юнацкім максімалізмам і запалам падняў масы простых беларускіх сялян на барацьбу з царызмам і адкрыў ім вочы на сваю годнасць. І я дарую яму "праваслаўную схізму".

І яшчэ. Як гаварылася вышэй, К. Каліноўскі шмат разоў звяртаецца да веры вясковых мужыкоў. Чаму Каліноўскі апеляваў да веры беларускага мужыка, якую ён лічыў уніяцкай? Успомнім, Каліноўскаму было ўсяго 25 гадоў, а ў гэтыя гады рамантычныя мроі часта дамінуюць над рэчаіснасцю. А менавіта такой і магла быць уніяцкая мара аб веры беларусаў на той час. Т. Нейрн у сваім фундаментальным творы пісаў, што шлях нацыянальнай ідэнтыфікацыі вымагае прыняцця праграмы рамантызму, які абвяшчае "сентыментальную культуру".

І сапраўды той рамантычнай рысай беларускага этнасу для Каліноўскага з'явілася народная рэлігія, хрысціянства ў форме уніі. І хоць большая частка беларускага вясковага насельніцтва ў другой палове XIX ст. ужо не вызнавала веры "мужыкоў" – грэкакаталіцызму, ці уніі, – Каліноўскі па-юнацку шчыра захапляецца гэтай таямнічай і, як ён лічыць, "беларускай верай". Адсюль і абразлівыя выказванні ў бок маскоўскага праваслаўя. Але да уніяцтва больш падрабязна я вярнуся пазней – у раздзеле VII.

### *Працэс нацыянальнай мабілізацыі беларусаў у другой палове XIX – пачатку XX стст.*

Другая палова XIX ст., на якой мы цяпер скупавалі ўвагу, адметная фармаваннем нацыяў і пашырэннем нацыяналізму сярод многіх народаў: Славеніі, Харва-

тыі, Эускадзі (краіны баскаў), Каталоніі. Вызначальная роля ў гэтых працэсах, як адзначаў Т. Нейрн, адводзілася повязі паміж інтэлектуальнымі элітамі, асобамі вольных прафесіяў і, нарэшце, уласна народам.

М. Хрох пайшоў далей і падзяліў працэс нацыянальнай мабілізацыі на тры этапы:

1) пачатковае фармуляванне нацыянальнай ідэі невялікім колам інтэлектуалаў, якія наноў адкрываюць нацыянальную культуру і мінулае;

2) вызначальны этап: ідзе працэс пашырэння нацыянальнай ідэі прапагандыстамі з ліку асоб вольных прафесіяў, якія потым надаюць палітычны характар культурнаму нацыяналізму;

3) апошняя стадыя: падтрыманне нацыяналізму народам вядзе да масавага руху.

Узнікненне беларускіх нацыянальных элітаў у Паўночна-Заходнім краі Расійскай Імперыі прыпадае на другую палову XIX ст. Гэты час нам даў таго, хто сказаў крылатыя словы: “Дык не пакідайце ж мовы нашай, каб не ўмёрлі” – Францішка Багушэвіча. Яшчэ раней друкуе свае творы Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. Потым піша вершы Цётка.

Паўстанне нацыянальнай эліты, хоць і не моцнай, прывяло нават да стварэння першых друкаваных перыядычных выданняў. У 1884 г. з’явілася першая беларуская газета – “Гоман”. Ужо ў першым нумары выдаўцы абвясцілі аб сваім намеры змагацца за федэрацыйную самастойнасць Беларусі. Потым – “Наша доля” (1906), і “Наша ніва” (1906–1914).

Газета “Наша ніва” адыграла вялікую ролю ў нацыянальным адраджэнні беларусаў. Яна мела вялікую папулярнасць сярод беларускага сялянства. Яна пісала: “Мы будзем імкнуцца заставіць зразумець усіх беларусаў, якія не ведаюць, хто яны, што яны беларусы, што яны павінны ведаць свае правы і дапамагаць нам у нашай працы”.

Урэшце ўзнікаюць і палітычныя структуры – спачатку партыя Беларуская Рэвалюцыйная Грамада (1902), потым Беларуская Сацыялістычная Грамада

(1903). У праграме Грамады ставіцца заданне аўтаноміі Беларусі ў рамках Расійскай Імперыі. Гэтым, фактычна, абвяшчаецца стварэнне беларускай нацыі-дзяржавы, што ёсць апошнім *вызначальным* момантам у стварэнні нацыі.

Гістарычна склалася так, што першай ідэалагічнай дактрынай у Беларусі была сацыял-дэмакратыя, якая ўвасаблялася ў Беларускай Сацыялістычнай Грамадзе (БСГ), ці проста Грамадзе. Гэтая партыя была створаная праз рэарганізацыю Беларускай Рэвалюцыйнай Грамады (існавала з 1903 г.).

БСГ паводзілася дзвюма вельмі важнымі канцэпцыямі. Першае, яна выступала за сацыялізм, вызнавала марксізм, хоць і не мела стычнасці з расійскай камуністычнай партыяй (РКП(б)). Другое – і гэты факт стаў вызначальным пры стварэнні БНР і БССР – вялікае месца ў праграме БСГ займала праблема ўжыццяўлення нацыянальнай ідэі. Упершыню за ўсю гісторыю Беларусі ў складзе Расійскай Імперыі была створана праграма, дзе выразна выказвалася ідэя аўтаноміі беларускіх земляў, аўтаноміі Беларусі ад Расіі. Хоць аўтаномія не давала поўнай незалежнасці (Беларусь паводле праграмы БСГ заставалася ў складзе Расійскай Імперыі) – гэтая ідэя была на той час вельмі радыкальнай. Нітуючы пачатак і канец XX ст., можна сказаць, што абвяшчэнне Рэспублікі Беларусь у 1991 г. ёсць завяршэннем і спраўджаннем ідэяў, сфармуляваных у праграме БСГ.

Пасля рэвалюцыі 1917 г. ў Беларусі існавалі дзве галоўныя палітычныя партыі: БСГ, якая ў 1918 г. была ператвораная ў БСДП (Беларускую сацыял-дэмакратычную партыю), і Камуністычная партыя Беларусі (КПБ).

Дзейнасць БСГ – БСДП непарыўна звязана з яе лідэрамі – Іванам і Антонам Луцкевічамі, Алесем Гаруном і іншымі. Галоўнае, што прынесла іх дзейнасць: праграма БСГ была зрэалізаваная на практыцы стварэннем 25 сакавіка Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР), што праіснавала, праўда, нядоў-

га. Аднак да гэтай пары існуе ўрад БНР у эміграцыі (цяперашні прэзідэнт Івонка Сурвіла).

Іншыя вынікі дала дзейнасць камуністаў (бальшавікоў). 1-га студзеня 1919 г. была ўтвораная БССР. Ёсць меркаванне, што штуршком для абвяшчэння БССР, было папярэдняе ўтварэнне БНР.

Трэба прызнаць, што ў 1920-я гады жыццё ў Беларусі пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі вызначалася шырокім нацыянальным уздымам, усеагульнай беларусізацыяй. Кіруючыся нашай класіфікацыяй ідэалогіяў (гл. раздзел V), можна сказаць, што дзейнасць грамадскіх і афіцыйных асобаў тае пары, дый наагул тагачасная афіцыйная ідэалогія ёсць выпадкам нацыянал-камунізму. Аднак ужо з 1929 г. пачалася новая эпоха, пачалося станаўленне культу асобы Сталіна, пачаліся жорсткія рэпрэсіі, пад якія трапілі не толькі іншадумцы (былыя сацыял-дэмакраты, нацдэмы), але і нацыянал-камуністы (Усевалад Ігнатоўскі, Цішка Гартны, іншыя).

Гэта становіцца зразумелым, калі ўсведаміць наступную схему фармавання нацыі-дзяржавы: кожная нацыя, якая суіснуе з даміноўнай нацыяй у адной дзяржаве, для дасягнення дзяржаўнай незалежнасці павінна прайсці шлях з трох фазаў:

– супольнае жыццё малой нацыі з вялікай у адной дзяржаве (беларусаў-тутэйшых з рускімі);

– дасягненне аўтаноміі ў рамках адной дзяржавы (фактычна, БССР у складзе СССР можна лічыць у нейкай ступені аўтаномнай рэспублікай, аднак гэтая аўтаномія вельмі ўмоўная, бо ў таталітарнай дзяржаве, якой быў СССР, ні пра якія свабоды не магло быць і гаворкі);

– змаганне за незалежнасць, і як вынік – здабыццё яе.

Беларусь, абыходзячы другую з адзначаных стадыяў, 25 сакавіка 1918 г. стала незалежнай дзяржавай – БНР, а яе наступніца БССР з 1 студзеня 1919 г. "раўнапраўнай" рэспублікай у складзе СССР. Насамрэч БССР не мела нават сапраўднай аўтаноміі. Адно

што можна адзначыць – пэўную культурную самастойнасць Беларусі.

## 6. Другі перыяд мадэрнісцкага фармавання беларускай нацыі (1914–1939)

### *Першы Усебеларускі з'езд і БНР*

Другі этап мадэрнісцкага фармавання беларускай нацыі пачаўся з уступлення Расіі ў Першую сусветныя вайну ў 1914 г. Беларусь у выніку ваенных дзеянняў з 1915 г. была падзеленая на дзве часткі: заходнюю – прыкладна 25 % тэрыторыі, акупаваную немцамі, і ўсходнюю Беларусь, якая заставалася ў складзе Расійскай Імперыі.

Цікава, што ў той частцы Беларусі, якая апынулася пад немцамі, пачаў чынна развівацца беларускі рух, адкрываліся беларускія школы і выдаваліся газеты і іншая друкаваная прадукцыя на беларускай мове. У Вільні ў 1916 г. замест зачыненай уладамі газеты "Наша ніва" пачынае друкавацца газета "Гоман", якая неўзабаве стала асяродкам беларускага культурнага жыцця.

Янка Запруднік звяртае ўвагу на паступовае ўзвышэнне беларускай мовы на акупаванай тэрыторыі і адзначае: "Па сутнасці, беларуская мова ў 1916 г. была прызнаная адной з афіцыйнах моваў раёна" ("Беларусь на гістарычных скрыжаваннях").

На ўсходзе Беларусі мажлівасці для беларускага руху ўзнікаюць толькі пасля лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. Ужо ў сакавіку 1917 г. ў Мінску быў створаны **Беларускі Нацыянальны Камітэт**, які неўзабаве рэарганізавалі ў **Вялікую Беларускую Раду.**

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. Вялікая Беларуская Рада і эсэраўскі Беларускі Абласны Камітэт склікалі **Першы Усебеларускі з'езд.** Ён адбыўся ў Мінску ў снежні 1917 г. На з'ездзе былі 1872 дэлегаты (1167 з правам вызначальнага голасу), якія заступалі мясцовыя органы ўлады і цэлы спектр вайсковых, палітычных і грамадскіх арганізацыяў таго часу,

у тым ліку і бальшавіцкія. З'езд абвясціў Беларусь дэмакратычнай рэспублікай, прыняў рэзалюцыю аб усталяванні "рэспубліканскага дэмакратычнага ладу ў межах Беларускай зямлі". Юры Туронак адзначае, што выказаўся не за аддзяленне, а супраць аддзялення Беларусі ад РСФСР.[1] Аднак, дарма што характар з'езду быў савецкі, у ноч на 18 снежня з'езд разагналі на падставе пастановы старшыні Савету Народных Камісараў Заходняй вобласці К. Ландэра. Гэтае дзеянне бальшавіцкіх уладаў паказала сапраўднае стаўленне бальшавікоў да беларускага нацыянальнага руху.

25 лютага 1918 г. нямецкая армія заняла г. Мінск і бытны там Народны Сакратарыят абвясціў сябе часовым урадам Беларусі. "Хаця берлінскі ўрад надалей афіцыйна не прызнаваў Беларусі, камандаванне акупацыйнай арміі, магчыма, на ўласную руку дазволіла Народнаму Сакратарыяту развіваць дзяржаўную дзейнасць" (Ю.Туронак).

Выканаўчы камітэт Рады Усебеларускага з'езда прымае 21 (8) лютага першую ўстаўную грамату: "1-я Уставная Грамота к народам Белоруссии", дзе выказана толькі пажаданне да беларускага народа "взять свою судьбу в собственные руки" і выкарыстаць права на поўнае самавызначэнне. У 2-ой устаўной грамаце да народаў Беларусі ад 9 сакавіка 1918 г., напісанай ужо на беларускай мове, выкладзены прынцыпы канстытуцыі Беларусі і акрэслена назва будучай дзяржавы – Беларуская Народная Рэспубліка (БНР). Аднак юрыдычны статус БНР заставаўся яшчэ ня вызначаным.

18 сакавіка Рада Усебеларускага з'езда абвяшчае сябе Радай БНР.

У ноч з 24-га на 25-га сакавіка Рада БНР прымае 3-ю ўстаўную грамату. У ёй сказана: "...Цяпер мы, Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, скідаем з роднага краю апошняе ярмо дзяржаўнай залежнасьці, якое гвалтам накінулі расійскія цары на наш вольны

---

[1] Ю. Туронак. Мадэрная гісторыя Беларусі. Вільня, 2006. С. 66.

і незалежны край. Ад гэтага часу **Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчаецца незалежнаю і вольнаю дзяржавай**". У грамаце акрэслены таксама межы БНР: "Магілёўшчына, беларускія часці Міншчыны, Гродзеншчына (з Гораднам, Беластокам), Віленшчына, Віцебшчына, Смаленшчына, Чарнігаўшчына і сумежныя часці суседніх губерняў, заселеных беларусамі".

Уся дзейнасць Рады БНР праходзіла ў акупаваным немцамі Мінску. Немцы спачатку не прызналі БНР і заявілі, што разглядаюць Беларусь як частку Расіі. Аднак немцы пастунова перадалі органам БНР ведамствы прамысловасці, гандлю, асветы і іншыя ўстановы, якімі кіраваў Народны Сакратарыят, хоць і пад кантролем немцаў. Заставаўся адзін крок да прызнання БНР, і, як піша Ю. Туронак, генерал Э. Фалькенгайн 27 мая прыняў заступнікаў БНР, заявіўшы, што іх "дзейнасць неўзабаве дасць Беларусі пазітыўныя рэзультаты", што ўспрымалася як "намінка на юрыдычнае прызнанне БНР".

Вось пералік тых канкрэтных вынікаў кіравання Рады БНР пасля 25 сакавіка 1918 г.: найперш была створана сетка пачатковых і сярэдніх школаў, у Мінску ствараўся Педагагічны інстытут, пачалося рыхтаванне да адкрыцця беларускага універсітэта, працаваў народны тэатр, Таварыства Драмы і Камедыі, выходзіла вялікая колькасць газет і часопісаў – 14 выданняў. І галоўнае – **беларуская мова ўпершыню стала дзяржаўнай.**

Пасля закладання пагаднення з Савецкай Расіяй 27 жніўня 1918 г. і вываду нямецкіх войскаў з Мінску Рада БНР пераехала спачатку ў Горадна, а вясной 1919 г. ад'ехала за мяжу. З гэтага часу яна дзеіць толькі на эміграцы.

### *Рада Беларускай Народнай Рэспублікі (Рада БНР) на эміграцыі*

З 1919 г. Рада БНР дзеіла на эміграцыі. У сакавіку 1943 г. паўнамоцтвы прэзідэнта і старшыні ўрада БНР атрымаў Мікола Абрамчык.

У першыя пасляваенныя гады Рада БНР дзеіла нелегальна. У сакавіку 1946 г. у Рэгензбургу (Зах. Нямеччына) М. Абрамчык правёў сход беларускіх дзеячоў, на якім выставіў свае паўнамоцтвы. Рада была папоўнена новымі сябрамі, быў выбраны ўрад БНР на чале з Абрамчыкам. 28 снежня 1947 г. на 2-й сесіі Рады БНР у Остэргофэне было афіцыйна абвешчана пра яе аднаўленне. Быў адзінагалосна прыняты статут Рады, у якім яе асноўным палітычным заданнем абвяшчалася "адбудова незалежнай беларускай дзяржаўнасці на ўсіх землях, якія ў 1917–1918 гг. належалі да беларускага этнаграфічнага абшару". Рада БНР была аб'яўлена адзіным законным прадстаўніцтвам беларускага народа. Абавязкі старшыні Рады выконваў прэзідэнт БНР.

У паваенны перыяд Рада БНР заявіла сябе на міжнароднай арэне: быў прыняты мемарандум, накіраваны ад імя Рады ў 1946 г. на мірную канфэрэнцыю ў Парыж. Яго падпісала і "ўпаўнаважанае прадстаўніцтва ўраду БНР", якое нібыта ў той час нелегальна дзеіла ў Беларусі і кіравала "змаганнем беларускага народу супраць расійска-бальшавіцкай акупацыі". Паводле некаторых звестак, трэцяя частка сяброў Рады БНР жыла ў БССР. Аднак наколькі рэальным было "прадстаўніцтва Рады БНР" і ці мела яно ўплыў на партызанскі рух невядома.

У 1951–1952 гг. амерыканскія спецслужбы перакінулі ў Беларусь шэраг сяброў Рады БНР, якіх, аднак, арыштавала дзяржбяспека. Чынныя захады на падтрыманне лучнасці з антысавецкім супраціvам у БССР Рада БНР рабіла да сярэдзіны 1950-х гг.

У цяперашні час старшынёй Рады БНР з'яўляецца Івонка Сурвіла.

## *БССР*

Камуністычная ідэя ў першыя гады існавання Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі несла новы імпульс. Асабліва гэта добра паказвае стаўленне да нацыянальнай ідэі. Ужо абвяшчэнне

самастойнай рэспублікі – БССР, хоць і ў складзе СССР, было новым, рэвалюцыйным крокам пасля развалу "турмы народаў" – Расійскай Імперыі.

Тое, што адбывалася ў 20-я гг. XX ст. у Беларусі, ёсць небывалым прыкладам вельмі паскоранага працэсу ўтварэння нацыі. Таго працэсу, якога бракавала нам ужо сто гадоў да гэтых падзей праз аб'ектыўныя ўмовы, выкліканыя мусовым суіснаваннем беларускага этнасу побач з больш развітым, дакладней, разам з этнасам-гаспадаром – рускім этнасам. Пасіянарны штуршок выклікаў бурнае развіццё беларускай нацыі па ўсім спектры культурнага, эканамічнага і ідэалагічнага жыцця ў БССР. Аналагічныя падзеі адбываліся ў нас яшчэ толькі адзін раз – на пачатку 90-х гг. XX ст. адразу ў час развалу СССР. Цікава, што на першым этапе нацыянальная ідэя гарманічна ўпісвалася ў будаўніцтва сацыялізму, не супярэчыла ёй, часам і дамінавала, асабліва ў нацыя-культурным будаўніцтве. Партыйнае кіраўніцтва БССР выяўляла нацыянал-бальшавіцкі характар. Ад цяперашніх камуністаў далёкія ідэалы тых нацыянальна-сведамых барацьбітоў-камуністаў, якія бачылі ў будучым чалавеку камуністычнага раю ўсебакова развітую і, перадусім, нацыянальна сведамую асобу. Досыць успомніць першых асобаў рэспублікі, такіх, як першы старшыня Саўнаркаму Жылуновіч (пісьменнік Цішка Гартны), камуніст Вацлаў Іваноўскі (аўтар "Кароткай гісторыі Беларусі").

**Другая хваля** нацыянальнага адраджэння: 1918–1929 гг. (БССР), 1921–1939 гг. (Заходняя Беларусь).

Гэты перыяд можна назваць перыядам найбольш плённага развіцця беларускай нацыі. За досыць кароткі перыяд у галіне беларусізацыі было зроблена больш, чым за ўсё мінулае стагоддзе. Масава і рэгулярна сталі з'яўляцца беларускія слоўнікі: прыкладам, у 1926 г. у Мінску выйшаў беларуска-расійскі слоўнік, складзены М. Байковым і С. Некрашэвічам; у 1924 г. у Коўне выйшаў расійска-беларускі слоўнік

В. Ластоўскага; надрукаваныя таксама галіновыя слоўнікі з фізікі, хіміі і іншых навук. Навукова-даследчае жыццё віравала ў асяроддзі першай беларускай навуковай установы – Інбелкульта, папярэдніка Акадэміі Навук. Расквітнела беларуская проза і паэзія. Сфармавалася нацыянальнае тэатральнае мастацтва і народная творчасць.

Ёсць усе падставы сцвярджаць, што менавіта да 1929 г. сфармавалася беларуская нацыя і адпаведна абазначыліся контуры беларускай нацыянальнай ідэі (БНІ). З'явіліся і першыя тэарэтычныя працы, прысвечаныя беларускай праблематыцы.

Сярод першых такіх творцаў, безумоўна, вылучаецца фігура Ігната Абдзіраловіча (псеўданім Ігната Канчэўскага), аўтара знакамітага эсэ "Адвечным шляхам". Трэба адзначыць і працы В. Гадлеўскага, А. Станкевіча, якія заклалі падваліны беларускага нацыяналізму і беларускай нацыянальнай ідэі.

Калі ў 1920–1940-я гг. ува Усходняй Беларусі ўсталяваўся камуністычны рэжым, то ў Заходняй панаваў капіталізм, які быў адносна лаяльным і нават дазваляў шматпартыйнасць. Найбольш буйной з беларускіх партыяў Заходняй Беларусі была БХДЗ (Беларуская хрысціянска-дэмакратычная Злучнасць), якой кіравалі Ян Пазняк і ксёндз Адам Станкевіч. БХДЗ аб'ядноўвала ў сваіх шэрагах некалькі тысяч чалавек. Гэта былі перадусім сяляне, а таксама збяднелая шляхта. Вялікі ўнёсак у развіццё нацыянальнай беларускай думкі зрабіў ідэолаг БХДЗ А. Станкевіч, які надрукаваў шэраг падставовых кніг аб хрысціянстве і беларускай нацыянальнай ідэі.

Акрамя БХДЗ у Заходняй Беларусі існавалі і іншыя партыі: БСДРП (Беларуская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя), БНФ (Беларускі народны фронт) і, нават, Беларуская нацыянал-сацыялістычная партыя.

У часы рэпрэсіяў галоўным звінавачваннем, што выстаўлялася да дзеячоў беларускай культуры, пісьменнікаў, паэтаў, мастакоў, навукоўцаў, творчай

інтэлігенцыі было звінавачванне ў “нацдэмаўшчыне”, г. зн. у прыхільнасці да ідэалаў дэмакратыі і нацыянальнай ідэі – даклададней, да ўсяго нацыянальнага. Гэтая “нацдэмаўшчына” ўзводзілася ў ранг нейкай страшнай ідэалогіі, варожай да сацыялістычных і камуністычных ідэй, наагул “да будаўніка камунізму”. Але насамрэч “нацдэм” – гэта быў толькі ярлык і ніякай тэорыі, канцэпцыі ці ідэалогіі нацдэмаўшчыны за ім не стаяла. Пад ярлык “нацдэма” маглі трапіць і былыя сацыял-дэмакраты з “Грамады” і хрысціянскія дэмакраты, што выехалі з Заходняй Беларусі ў Савецкую Беларусь, і нацыянал-камуністы, і, нават, звычайныя беларускамоўныя пісьменнікі і паэты.

Слабасць нацыянальнай сведамасці беларусаў у часы Расійскай Імперыі, негатоўнасць утварыць сваю незалежнную дзяражаву далі свае вынікі і ў даваеннай БССР, і ў Заходняй Беларусі. Мы не здолелі сфармуляваць і спраўдзіць свае нацыянальнае ідэі. Творы найбольш грунтоўных мысляроў гэтай эпохі В. Гадлеўскага, А. Станкевіча, В. Ластоўскага, Я. Лёсіка, Я. Самойлы не паспелі стаць усенародным набыткам – іх аўтары былі рэпрэсаваныя, а кнігі – забароненыя.

У звязку з гэтым гаварыць аб існаванні палітычнага нацыяналізму і тым больш ідэалогіі нацыяналізму ў даваеннай БССР заўчасна. Аднак нацыянальны рух 1920-х гадоў быў ужо асновай будучай нацыянальнай дзяржавы і канцэпцыі беларускага нацыяналізму, ужыццяўленню чаго перашкодзіў культ асобы, прыпыніўшы гэтыя працэсы да эпохі перабудовы, што пачалася пры канцы 1980-х гадоў.

За час панавання савецкай улады, фактычна, адзінай ідэалогіяй у БССР была дзяржаўная ідэалогія, якую несла камуністычная партыя – КПБ, філіял саюзнай КПСС. З іншых ідэалагічных канцэпцый можна адзначыць толькі ідэі, выкладзеныя ў праграмах даваенных партый Заходняй Беларусі – БХДЗ і БСДП. Трэба адзначыць, што ні ліберальныя, ні кансерватыўныя традыцыі не былі ведамыя беларусам, як у імперскай Расіі, так і ў Рэчы Паспалітай ды ў БССР.

*Вацлаў Ластоўскі*



Вацлаў Ластоўскі быў адным з першых, каго "ўзнагародзілі" тытулам "беларускі нацыяналіст", а ў страшныя 1930-я гэта было як кляйно і смяротны вырак. Гэтае кляйно ў дачыненні да яго праіснавала даволі працяглы час – яшчэ ў Беларускай савецкай энцыклапедыі за 1972 г. мы чытаем, што Ластоўскі ёсць адным з ідэолагаў беларускага нацыяналізму, яму ўласцівая "нацыяналістычная інтэрпрэтацыя гістарычных фактаў". Апрача таго, у савецкія часы творчасць Ластоўскага ўсяляк замоўчвалася, а кнігі ягоныя ляжалі ў сакрэтных сховішчах.

Помніцца, мне ўдалося недзе ў канцы 70-х гг. XX ст. праз аддзел Рэдкай кнігі бібліятэкі АН БССР імя Я. Коласа азнаёміцца з яго славутай "Гісторыяй беларускай (крыўскай) кнігі", надрукаванай у Коўне (цяпер Каунас) у 1926 годзе. Гэта была адна з тых кніг, пасля прачытання якой я пайшоў следам за аўтарам, фармуючы свой светагляд – таксама стаў нацыяналістам, як і аўтар кнігі – В. Ластоўскі.

Сапраўды можна казаць, што В. Ластоўскі ёсць адным з першых беларускіх нацыяналістаў. Толькі не ў адмоўным, а ў найлепшым сэнсе гэтага слова. І тое, што ён загінуў ад сталінскай кулі, ставіць яго ў шэраг нашых нацыянальных герояў. У Царкве ёсць такая традыцыя: людзей якія пацярпелі за веру, аддалі за яе жыццё – узводзяць у ранг Святых, якія завуцца Мучанікамі. Пэўна, што добра было б пашырыць гэтае царкоўнае правіла і на іншыя гераічныя ўчынкі нашых славутых папярэднікаў, якія пацярпелі за высакародныя ідэі, у першую чаргу за найбольш узнёслую ідэю – нацыянальную.

Яшчэ ў 1910 г. В. Ластоўскі ў 27 гадоў піша першую, але і цяпер актуальную кнігу "Кароткая гісторыя Беларусі". У гэтай кнізе аўтар разглядае бела-

рускую гісторыю не ў рэчышчы тагачаснай расійскай імперскай канцэпцыі, а як гісторыю самастойнай беларускай дзяржавы, тысячагадовую гісторыю – ад часоў Полацкага княства. Гісторыя ў Ластоўскага выкладзена амаль што так, як яна бачыцца і цяпер, у прыватнасці, так як разглядаецца ў гэтай кнізе. Ёсць, ведама, і архаічныя ўжо, недакладныя моманты. Прыкладам, аўтар яшчэ не здолеў адыйсці ад штампу: ВКЛ – літоўска-беларуская дзяржава. Але да сучанай канцэпцыі: "ВКЛ – беларуская дзяржава" трэба было яшчэ дажыць. А наагул "Кароткую гісторыю" ў пасляслоўі да гэтай кнігі добра разабраў прафесар Анатоль Грыцкевіч. Застаецца толькі далучыцца да ягоных заключных слоў: "Прайшло больш чым восемдзесят гадоў з таго часу, калі была апублікавана кніга Вацлава Юстынавіча Ластоўскага, але "Кароткая гісторыя Беларусі" не страціла сваёй каштоўнасці, зачароўвае чытача і сёння".

### ***Нацыяналістычныя арганізацыі Заходняй Беларусі***

#### *Беларуская нацыянал-сацыялістычная партыя (БНСП) і беларускі нацыянал-сацыялізм*

БНСП была утворана ў 1933 г. У яе кіраўнічае ядро ўваходзілі: Фабіян Акінчыц (старшыня), Уладзіслаў Казлоўскі (рэдактар і выдавец газэты партыйнага органа "Новы шлях"), Альбін Стэповіч, Павал Арцішэўскі, Лявон Дубейкаўскі, Канстанты Юхневіч, Алёйзы Пецюкевіч і Антон Сапко. Кіраўніцтва БНСП распрацоўвала ідэалогію, імкнулася пашырыць сетку партыйных арганізацыяў (моцныя пазіцыі ў БНСП былі на Стаўбцоўшчыне).

Ідэолагі нацыянал-сацыялізму выдавалі сваю газету "Новы шлях". Першы нумар выйшаў у Вільні 25 лістапада 1933 г. (усяго было 24 нумары) – да забароны ў 1937 г.

Напачатку партыя арыентавалася на гітлераўскую Германію, і з ёй звязвала свае палітычныя надзеі.

Галоўным ворагам сябры партыі бачылі "жыдоў і бальшавікоў", што кіруюць Савецкім Саюзам. У сваім артыкуле "Жыды ў Беларусі" Фабіян Акінчыц пісаў, маўляў, яны доўга прыгняталі еўрапейскія народы, аднак цяпер гэтыя народы паўстаюць услед за Нямеччынай, закладаючы пачатак "новай Еўропы". Яшчэ ў адным з артыкулаў ён пры дапамозе цытатаў з Талмуда спрабаваў паказаць, што габрэі варожа ставяцца да рэшты людзей. "Па нашаму глыбокаму перакананню, абапёртаму на абсервацыі жыдоўскага народу, гэты апошні імкнецца да сусветнага панавання, каторае ён спадзяецца дасягнуць шляхам разбурэння сучаснага грамадскага ладу з адначасным маральным аслабленнем усіх народаў", – пісаў С. Булат у "Новым шляху".

У звароце да чытачоў: "Наступіў час, калі частка беларускага грамадзянства, ідэалогія каторага не можа ўмясціцца ў рамкі існуючых беларускіх партыяў – павінна забраць голас. ... Той накірунак, да якога мы належым і каторы акрэсляем як нацыянал-сацыялістычны, павінен знайсці шырокае распаўсюджанне сярод беларускага грамадзянства і выкрасталізавацца ў сваім тэарэтычным угрунтаванні".

Іх ідэалогія – спалучэнне нацыянальнай ідэі з сацыялістычнай, гэта бачылася як галоўная ўмова для аб'яднання і незалежнасці беларускага народа.

Беларускія нацыянал-сацыялісты адмаўлялі бальшавіцкую ідэю дыктатуры пралетарыяту, як зусім не прыдатную беларускаму аграрнаму грамадству. Яны наагул адкідалі марксізм, лічылі, што кожная нацыя мае свае асаблівасці і гэта трэба ўлічваць пры пабудове сацыялізму.

Галоўныя пастулаты беларускага нацыянал-сацыялізму 30-х гг. XX ст. – гэта змаганне за незалежнасць Беларусі, за дабрабыт беларускага народа і ***адмаўленне інтэрнацыяналізму, як пагрозы існавання народаў з не досыць высокай нацыянальнай сведамасцю.***

Падаецца, што ў наш час такая пагроза набывае яшчэ большую актуальнасць.

Цікавыя пагляды нацыянал-сацыялістаў на эканамічныя праблемы: асновай эканамічнай эфектыўнасці яны лічылі працу і права кожнага беларуса на поўнае карыстанне вынікамі працы. Зямля ёсць уласнасцю нацыі, а нацыя надзяляе ёю тых грамадзянаў, якія на ёй працуюць у кааператывах ці індывідуальна.

Стаўленне да рэлігіі вызначалася паводле карыснасці ці шкоднасці для беларускай нацыі. Заклікалі бескампрамісна змагацца з "польска-каталіцкім і маскоўска-праваслаўным клерам". Такі падыход характэрны для палітыкаў, далёкіх ад рэлігіі, і сёння паўтараецца з абсалютнай дакладнасцю.

Праграма БНСП была прынятая ў 1936 г. і надрукаваная на старонках "Новага шляху". Гэта была сапраўды нацыянальная праграма – на першы план ставілася нацыянальнае выхаванне беларускага народа і змаганне з антыбеларускімі сіламі. Агаворвалася супраца з партыямі нацыянальна беларускага кірунку і падтрыманне ўсякае дзейнасці, гаспадарчых мерапрыемстваў, якія абавязкова маюць нацыянальны характар.

У 1937 г. БНСП была забароненая польскімі ўладамі. Фабіян Акінчыц разам са сваімі блізкімі прыхільнікамі ў 1938 г. выехаў у Германію. У 1940 г. БНСП на чале з У. Казлоўскім нелегальна дзеіла пад літоўскай уладай у Вільні.

Адразу пасля нападу Германіі на СССР, у ліпені 1941 г., Казлоўскі паспрабаваў легальна аднавіць дзейнасць партыі, аднак Альфрэд Розэнбэрг, галава акупаваных усходніх абласцей, забараніў яе, адказаўшы, што толькі Нямецкая Нацыянал-Сацыялістычная Рабочая Партыя мае права на існаванне. Такім парадкам, БНСП засталася ў падполлі. Акінчыц і сябры Партыі неўзабаве расчараваліся ў немцах, бо ўбачылі, што яны не нясуць абяцанай «новай Еўропы», а славян хочуць знішчыць і зрабіць рабамі. У той жа час астатнія беларускія нацыянальныя актыў не давяраў ім і лічыў людзьмі немцаў. Акінчыц таксама намагаўся дапамагаць вызваляць бела-

русаў з нямецкага палону, беспаспяхова прасіў Розэнбэрга, да якога меў дачыненне, вярнуць калгасную зямлю сялянам. Ваеннапалонных спрабаваў вербаваць у прапагандысты, якія потым адпраўляліся ў Беларусь і вялі антыкамуністычную прапаганду сярод насельніцтва (усяго былі адпраўленыя 4 выпускі, каля 70 чалавек). Так быў вызвалены з палону Міхась Ганько, будучы кіраўнік Саюза Беларускай Моладзі.

Але з смерцю Ф. Акінчыца і У. Казлоўскага ў 1943 г. БНСП спыніла сваё існаванне.

## 7. Трэці перыяд мадэрнісцкага этапа фармавання беларускай нацыі

### *Нацыянальнае адраджэнне ў часы Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг.*

Гаворка пра гісторыю нацыянальнага руху ў Беларусі будзе няпоўнай, калі не адзначыць хвалі нацыянальнага адраджэння ў часы нямецкай акупацыі. Афіцыйна амаль што ўсе нацыянальныя арганізацыі, узніклыя ў 1941–1944 гг. на тэрыторыі Беларусі, якія не падтрымлівалі камуністаў, лічацца калабаранцкімі. Але заразом забываецца іншы бок справы – вялікая частка нацыянальна сведамых беларусаў імкнулася да стварэння такой Беларусі, якая будзе незалежнай як ад фашысцкай Германіі, так і ад камуністычнага Савецкага Саюза. Хоць большасць гэтых людзей верылі ў сілы свайго народа і марылі аб яго лепшай будучыні, але нельга забывацца, што некаторыя сапраўды пайшлі на адкрытую здраду, сталі на бок Рэйху.

Другая сусветная вайна выклікала **трэцюю хвалю** беларускага адраджэння. Ужо ў 1941 г. ўзнікла Беларуская нацыянальная самапомач, пазней узнік Саюз беларускай моладзі (СБМ), з'явілася Беларуская незалежніцкая партыя (БНП) і паўстала Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква. У 1942 г. на тэрыторыі акупаванай Беларусі быў арганізаваны шырокі нацыянальны рух – Беларуская Цэнтральная Рада (БЦР) на чале з Радаславам Аст-

роўскім. З дапомогай БЦР была нават створаная свая нацыянальная армія – Беларуская Краёвая Абарона, колькасцю 23 тысячы чалавек. БЦР праводзіла вялікую асветніцкую і культурніцкую працу. Адкрываліся беларускія школы, народныя бібліятэкі, аднавілася праца Мінскага Беларускага тэатра. Беларускія кампазітары напісалі больш за 60 музычных твораў, сярод якіх балет кампазітара А. Туранкова "У лясным гушчары", аперэта М. Шчаглова на лібрэта Н. Арсенневай "З выраю"; выйшлі зборнікі вершаў Н. Арсенневай, Т. Лебеды, Л. Случаніна.

***Беларуская незалежніцкая партыя (БНП)***

Палітычная арганізацыя беларускіх нацыяналістаў (БНП), якая ў 1940–1950-х гг. нелегальна дзеіла ў Беларусі, была заснавана яшчэ ў канцы 1939 г. у Вільні (хоць існуе меркаванне, што пазней – у 1942 г. у Мінску). Яе ідэолаг а. Вінцэнт Гадлеўскі ў 1940 г. у Варшаве піша праграму і статут партыі – яны абнаўляліся ў 1942 г. пасля рэарганізацыі БНП. Згодна з статутам БНП мэтай партыі было "здабыццё і забяспечанне на будучыню Незалежнасці Беларусі" "праз баёвы зрыў народных масаў да збройнага змагання". Найвышэйшым органам БНП быў Цэнтральны Камітэт, што ствараўся супольным з'ездам акруговых кіраўнікоў партыі. Асноўнай партыйнай адзінкай БНП было звяно з кіраўніком звяна на чале. Існавалі таксама раённыя, акруговыя і краёвыя камітэты партыі. Раз на два гады збіраўся партыйны з'езд, а таксама партыйныя канферэнцыі. Друкаваным органам БНП быў "Бюлетэнь Беларускай Незалежніцкай Партыі", які выдаваўся ў 1942–1946 гг. (выйшла 6 нумароў).

У час нямецкай акупацыі сябры БНП ішлі ў грамадзянскую адміністрацыю, кіравалі вайсковымі і паліцыйнымі аддзеламі, узначальвалі нацыянальныя партызанскія атрады. Пад канец чэрвеня 1944 г. ЦК БНП рыхтаваў у Мінску антынямецкае паўстанне дзеля абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі, якое адклалі з прычыны імклівага наступу Чырвонай Арміі. Летам 1944 г. кіраўніцтва партыі выеха-

ла ў Германію, пакінуўшы ў Беларусі падпольныя і партызанскія групы.

У 1944–1945 гг. у Беларусь з Германіі перапраўляліся дэсантныя групы, складзеныя з сяброў БНП. Яны мусілі арганізоўваць антысавецкі супраціў у шэрагах Беларускага Краёвага Войска. Частку кіраўнікоў і актывістаў партыі, у тым ліку і старшыню ЦК БНП У. Родзьку, арыштавала савецкая дзяржбяспека. Аднак ацалелыя падпольныя структуры здолеў аб'яднаць генерал М. Вітушка, які кіраваў БНП у Беларусі. На эміграцыі быў утвораны Замежны сектар БНП на чале з Д. Касмовічам. Ён, праз сваіх кур'ераў, падтрымліваў лучнасць з партыяй на Бацькаўшчыне. 30 верасня 1946 г. у Заходняй Германіі адбылася ІІІ канферэнцыя БНП. На ёй адзначаўся "сталы рост БНП на Бацькаўшчыне", якая пашыралася ў падполлі і мела ўплыў на партызанскі рух. Паводле некаторых звестак, БНП актыўна змагалася супраць савецкай улады да канца 1956 г. Партыйныя структуры на эміграцыі ў 1955 г. уліліся ў Беларускі Вызвольны Фронт.

***Саюз беларускай моладзі (СБМ)***

Арганізацыя, заснаваная ў чэрвені 1943 г., дзеіла легальна, з дазволу нямецкіх акупантаў, на тэрыторыі генеральнага камісарыята "Беларусь". Займалася выхаваннем беларускай моладзі ў духу беларускага патрыятызму, любові да сваёй Бацькаўшчыны. Шэфам-правадніком Галоўнага Штаба СБМ быў Міхась Ганько. Галоўным друкаваным органам арганізацыі быў часопіс "Жыве Беларусь!". Да чэрвеня 1944 г. СБМ налічваў у сваіх шэрагах некалькі дзесяткаў тысяч маладых людзей. У 1944 г. невялікая частка сяброў СБМ эмігравала на Захад.

***Арганізацыя беларускіх нацыяналістаў (АБН)***

Створана яна ў 1940 г. у Варшаве як нелегальная арганізацыя. Летам 1941 г. перанесла сваю дзейнасць у Беларусь. Паводле пэўных звестак, у 1942 г. АБН налічвала 500 чалавек. На яе чале стаяў Цэнтральны Камітэт. Старшыня ЦК АБН – Ян Станкевіч. АБН

вяла перамовы з польскай падпольнай Арміяй Краёвай аб супрацы, “польска-беларускай федэрацыі” і нават аб стварэнні беларуска-польскіх партызанскіх аддзелаў. Аднак кантакты з польскім супрацівам не далі ніякага выніку. У 1943 г. АБН увайшла ў падпольнае Беларускае Нацыянальна-Дэмакратычнае Аб’яднаньне (БНДА), дзе яна была, бадай, галоўнай сілай. На жаль, пакуль невядома, чым займаліся АБН і БНДА, акрамя кантактаў з палякамі. Пасля гібелі ў снежні 1943 г. у Мінску Вацлава Іваноўскага і выезду ў Чэхію Яна Станкевіча, АБН-БНДА фактычна спыніла сваё існаванне. Многія сябры арганізацыі, якія працавалі ў грамадзянскай адміністрацыі і школьніцтве, летам 1944 г. падаліся на Захад. Апошнім сябрам арганізацыі, што засталіся на Бацькаўшчыне, нічога не заставалася, як далучыцца да Руху Супраціву, арганізаванага Беларускай Незалежніцкай Партыяй.

Кульмінацыяй дзейнасці БЦР, БНП, СБМ, АБН і іншых патрыятычных арганізацыяў стаў II Усебеларускі Кангрэс, што прайшоў у Мінску 27 чэрвеня 1944 г. Хоць кангрэс праходзіў у акупаваным Мінску, ён меў надзвычай вялікае прадстаўніцтва – дэлегаты былі ад усіх этнаграфічна беларускіх мясцін.

***Другі Усебеларускі Кангрэс***

Другі Усебеларускі Кангрэс адбываўся у цяжкіх умовах акупаванай Беларусі, але мэты Кангрэса былі шляхетныя, патрыятычныя. Асноўная мэта яго, як напісана ўва ўступе да матэрыялаў Кангрэса, выданых у 1954 г. Беларускай Цэнтральнай Радай у Мюнхене (матэрыялы сабраныя і апрацаваныя камісіяй пад рэдакцыяй прафесара Р. Астроўскага), – гэта ўзнаўленне дзяржаўнасці Беларусі, якую беларускі народ меў “ужо на пачатку свае



Радаслаў Астроўскі

гістарычнае эпохі, творачы ў IX ст. паасобныя самастойныя беларускія княствы: Полацкае, Смаленскае, Турава-Пінскае, Ноўгарад-Северскае, Менскае, Слуцкае ды іншае".

Уступ да "Матэрыялаў" змяшчае кароткую канцэпцыю гісторыі Беларусі да 1944 г. і асвятляе мэты II Усебеларускага Кангрэса. Аднак падыход Р. Астроўскага да нашай гісторыі грашыў тымі самымі хібамі беларускай дамінанты ў жыцці ВКЛ, як і ў іншых гісторыкаў таго часу, хоць "матэрыялы" Кангрэса пісаліся досыць адукаванымі і нацыянальна сведамымі людзьмі. Гэты падыход выяўляецца ўжо з трэцяга абзаца "Уступу": "Паасобныя княствы гэтых плямёнаў (маюцца на ўвазе крывічы, радзімічы і дрыговічы) аб'ядноўваюцца ў першую чаргу паміж сабою, *а пасля і з літоўскімі*, (курсіў мой, – *А. А.*) творачы задзіночаную беларуска-літоўскую дзяржаву пад назовам Вялікага Княства Літоўскага". Тут проціпастаўляюцца беларускія плямёны і літоўскія, чаго ні ў якім разе рабіць нельга. А трэба ўлучыць, як і пісаў Мікола Ермаловіч, "Літву", літоўскія плямёны ў склад беларускіх плямёнаў, нават зрабіць іх дамінантай пры фармаванні будучага адзінага беларускага этнасу, а потым і нацыі. І тады такія фразы як "беларуска-літоўская" дзяржава ніколі не прагучаць. Не было такой. А была – беларуская. Альбо "літоўская" паводле назвы, але паводле сэнсу і зместу гэтая "літоўская" на "ўсе сто" была "беларуская".

Аднак тады, у гады нягодаў і ваеннага тлуму, "Матэрыялы" і без гэтых паправак пісаліся досыць патрыятычна. Беларуская Цэнтральная Рада (БЦР) – арганізатар Кангрэса – зрабіла вялікую справу на выяўленне і аб'яднанне тых сілаў беларускага народу, што захавалі сваю адметнасць і моц, нягледзячы на гады савецкага сталінскага, а потым нямецкага тэрору ды гвалту над нацыямі. Упершыню, нарэшце, праз многія гады існавання бальшавіцкага рэжыму на беларускіх землях, і менавіта ў час нямецкай акупацыі можна было яшчэ раз заявіць пра існаванне

Беларусі не як часткі СССР, а як самастойнай, незалежнай дзяржавы. Аднак кіраўніцтва БЦР разумела, што распачынаць вайну за незалежнасць Беларусі на два франты – супраць бальшавікоў і немцаў – было б раўназначна самагубству. Вось як наіўна пішацца ў гэтых матэрыялах: "Бальшавікоў усе добра ведалі і з імі змагаліся, а што да немцаў – дык былі ўпэўнены, што Захад ім рукі звяжа". Сёння так і хочацца запярэчыць: "Паважаныя папярэднікі, сябры беларускага Кангрэса 1944 г. і сябры БЦР, а адкуль у вас пэўнасць, што калі "Захад" рукі звяжа бальшавікам, г. зн. заваюе Беларусь, то ён кінецца прызнаваць новую беларускую дзяржаву і адкрые зялёны шлях беларускаму нацыянальнаму адраджэнню. Гісторыя паказвае нам, што перадзел тэрыторыяў ніколі не спрыяў рамантычнаму нацыянальнаму абуджэнню, а дыктаваў суровыя і прагматычныя правілы гульні, ведамыя пад назовам "права моцнага". І пляваць ім будзе пасля перамогі на нашы нацыянальныя пачуцці і "права людзьмі звацца".

Здзіўляе вялікая лічба дэлегатаў на Кангрэсе – 1039 чалавек. І гэта ў часе вайны, пры ўсіх цяжкасцях пераездаў! Як не прыраўнаць да цяперашніх Кангрэсаў дэмакратычных сілаў, якіх было аж 7 і на якія ніколі не збіралася гэтулькі людзей. Вельмі прадстаўнічы быў Кангрэс і з боку геаграфіі прыбылых – ад прыфрантавой паласы да этнічна беларускіх тэрыторыяў, далучаных да іншых краёў: Беласточчыны, Віленшчыны і Дзвіншчыны.

Кангрэс асудзіў бальшавіцкі рэжым і ануляваў усе пастановы і законы, прынятыя савецкай уладай ды палякамі. У заключным слове прэзідэнт Кангрэса Яўхім Кіпель сказаў: "Сёняшнім сваім актам наш народ давёў усяму Свету, што ён не хоча ні маскоўскае, ні польскае апекі. Усе пастановы аб выхадзе з так званага Савецкага Саюза і аб ануляванні маскоўска-польскіх дамоваў аб Беларусі, прынятыя аднагалосна. А гэта вельмі важна! Сярод тысячы двухсот чалавек не знайшлося ні аднаго, які б хацеў зва-

роту бальшавікоў, які б хацеў панавання польскіх паноў на Беларусі. Бясспрэчна, гэта воля не толькі дэлегатаў — гэта воля ўсяго беларускага народа!"

Дэлегаты Кангрэсу мелі вельмі цвёрдыя намеры. Але ўзнікае пытанне: чаму ж ніхто з іх не здолеў рэальна ацаніць сваіх шанцаў у змаганні за незалежнасць Бацькаўшчыны. Яны ж былі на 100 адсоткаў нулявымі! Усе памянёныя падзеі праходзілі ў тыя часы, калі Савецкая Армія гнала нямецкіх акупантаў і неўзабаве вызваліла Мінск. Пра якую незалежную Беларусь у такіх умовах можна было гаварыць? Не дзіва, што амаль усе ўдзельнікі Кангрэса былі ці закатаваныя савецкім НКУС, ці скончылі сваё жыццё ў эміграцыі. А сярод іх – такія ведамыя людзі, як генерал К. Езавітаў ("загінуў на бальшавіцкай шыбеніцы ў 1947 г." – напісана ў "Матэрыялах Кангрэса..."), славутыя паэткі Ларыса Геніюш ды Наталля Арсеннева (абедзьве былі рэпрэсаваныя), ведамы ўрадовец Народнага Камісарыята Асветы БССР Аўген Калубовіч, які напісаў у эміграцыі слынную цяпер кнігу "Айцы Беларусі і іх лёс"; інжынер Іван Касяк — напісаў у эміграцыі кнігу "З гісторыі Беларускай аўтакефальнай царквы", дацэнт БДУ, аўтар шматлікіх падручнікаў і навуковых прац Яўхім Кіпель, шмат іншых знакамітых людзей, імёны якіх толькі цяпер вяртаюцца з забыцця.

Зразумела, шанцаў стварэння незалежнай беларускай дзяржавы ў умовах нямецкай акупацыі ў удзельнікаў Кангрэса не было ніякіх. Аднак значэнне гэтай падзеі вельмі вялікае. II Усебеларускі Кангрэс засведчыў усім, што ёсць на свеце такая дзяржава – **Беларуская Народная Рэспубліка.**

Значэнне Кангрэса не абмяжоўваецца тымі незабыўнымі падзеямі 1944 г. у акупаваным Мінску. Большая частка яго ўдзельнікаў, якія не трапілі ў рукі савецкіх спецслужбаў пасля прыходу Савецкай Арміі, эмігравала і прысвяціла ўсё сваё жыццё служэнню беларускай ідэі за мяжой.

## 8. Найноўшая гісторыя нацыяналізму ў Беларусі – пасля Вялікай Айчыннай вайны (1945 г.) да нашага часу. Чацверты перыяд мадэрнісцкага фармавання беларускай нацыі

Адразу пасля вайны на тэрыторыі Беларусі ўзнікла некалькі нелегальных арганізацыяў, перадусім моладзевых, якія мелі на мэце абвяшчэнне незалежнасці Беларусі, аддзяленне Беларусі ад СССР, нацыянальнае адраджэнне. Ніжэй прыточаны звесткі пра некаторыя з іх, узятыя з энцыклапедыі "Беларускі нацыяналізм".

*Саюз вызвалення Беларусі (СВБ)*

Падпольная моладзевая арганізацыя створаная з ініцыятывы Генадзя Казака ў Навагрудку ў 1946–1947 гг. Была падрыхтаваная праграма арганізацыі і прызначаныя ўпаўнаважаныя прадстаўнікі ў раёнах. Арганізацыйны аддзел узначаліў Міхась Кожыч ("Дубовы"), а фінансавы – Кастусь Рамановіч ("Сокал"). СВБ ставіў сабе на мэце аддзяленне Беларусі ад СССР і стварэнне самастойнай беларускай дзяржавы. Асноўным метадам змагання СВБ была антысавецкая агітацыя, але не адпрэчваўся і ўзброены супраціў.

У канцы траўня 1947 г. арыштавалі 18 сяброў СВБ, выдадзеных правакатарам. 30 жніўня 1947 г. Вайсковы трыбунал войскаў МВД Баранавіцкай вобласці прысудзіў удзельнікаў СВБ да зняволення на тэрмін ад 8 да 25 гадоў.

*Саюз змагання за незалежнасць Беларусі (СЗНБ)*

Падпольная арганізацыя ў Заходняй Беларусі ў 1946–1949 гг. Заснаваная ў 1946 г. з ініцыятывы камандзіра беларускага партызанскага аддзела Івана Раманчука ("Ястраб"). Дзеіла ў некаторых раёнах Заходняй Беларусі, у тым ліку: у Горадне, Нясвіжскім, Клецкім і Стаўбцоўскім раёнах. Праграма СЗНБ агадвала рыхтаванне патрыятычных сілаў, што ў разе вайны мусілі выступіць на абарону беларускага народу і незалежнасці Бацькаўшчыны. Арганізацыя меркавала сваімі структурамі абняць усю Беларусь і чакаць

адпаведнага часу, каб дзеіць. У адпаведнасці з праграмай СЗНБ мусілі быць распушчаныя калгасы, а зямля перадавалася сялянам. СЗНБ выпусціла і пашырыла антысавецкую ўлётку. На пачатку 1949 г. органы савецкай дзяржбяспекі арыштавалі кіраўніцтва арганізацыі. У траўні (або летам) 1949 г. чэкісты захапілі і паранілі ў баі кіраўніка СЗНБ Івана Раманчука. Ваенным трыбуналам войск МВД Беларускай ваеннай акругі ад 15–17 чэрвеня 1949 г. за "здраду Радзіме, ускосны тэрор і антысавецкую прапаганду" 17 сяброў СЗНБ засудзілі на розныя тэрміны зняволення.

### *Пасляваенны перыяд*

Вось жа, з 1920–1950-х гг. у выніку шматлікіх рэпрэсіўных акцыяў на момант гарбачоўскай перабудовы – а менавіта з гэтых часоў пачынаецца новы гістарычны працэс у СССР – Беларусь падышла амаль што знячоленай, не маючы моцнай нацыянальна сведамай інтэлігенцыі, не маючы ўсведамлення сябе як нацыі і дзяржавы. Дзве хвалі масавага тэрору – рэпрэсіі 1930-х гг. і пераслед "нацыяналістаў" пасля 1944 г. далі свае сумныя вынікі.

На доўгі час нацыянальнае адраджэнне Беларусі прыпынілася. Пачаўся працэс масавай русіфікацыі, працэс закрыцця беларускіх школ і дзіцячых садкоў. Асабліва чынна асіміляцыйныя працэсы ішлі ў 60-х гг. XX ст. у час рэформаў Н. С. Хрушчова з прыняццем курсу на будаванне камунізму на 80-ы год (праз 20 гадоў).

Аднак асобныя асяродкі незалежнага нацыянальнага беларускага культурнага жыцця перыядычна ўзнікалі. Яны існавалі насуперак магутнаму молаху таталітарнай савецкай сістэмы, насуперак сталінскім рэпрэсіям, насуперак жорсткай цэнзуры, насуперак гэтак званай хрушчоўскай адлізе і брэжнеўскай стагнацыі.

Сярод такіх асяродкаў я б вылучыў наступныя – Акадэмічны асяродак (70-я гг. XX ст.), семінар старабеларускай культуры і навуковыя экспедыцыі гру-

пы навукоўцаў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору разам з навукова-тэхнічнай інтэлігенцыяй (Інстытут фізікі, Інстытут ядзернай энергетыкі і інш.).

### *Акадэмічны асяродак*

Маральным лідэрам «Акадэмічнага асяродку», як і іншых нешматлікіх нацыянальных суполак тых гадоў, быў выдатны беларускі пісьменнік Уладзімір Караткевіч. Яго творчасцю захапляліся цэлыя пакаленні людзей, і тое, што яго творчасць не віталася ў афіцыйных колах, толькі надавала яму папулярнасці.

Калі ў 1972–1973 гг. КДБ займалася разгромам патрыятычнага руху ў Украіне, то прыператрусах і на допытах былі выяўленыя сляды повязяў з Беларуссю – у руках КДБ апынулася некалькі лістоў сяброў "Акадэмічнага асяродку" з ацэнай нацыянальнай палітыкі КПСС, а таксама з выкладам планаў каардынацыі супраціву гэтай палітыцы. КДБ шчыльна занялося "Акадэмічным асяродкам". Летам 1973 г. у Мінску, іншых гарадах Беларусі пачаліся допыты. Сярод удзельнікаў асяродку значыліся А. Каўрус, С. Місько, В. Рабкевіч, М. Чарняўскі, М. Прашковіч, іншыя менш ведамыя асобы.

Міхась Чарняўскі дачакаўся часоў адноснай дэмакратыі і цяпер добра ведамы ў палітычных і нацыянальна-адраджэнскіх колах. Гэта выдатны археолаг, знаўца і даследнік беларускай нацыянальнай культуры.

У Міколы Прашковіча лёс быў больш трагічны.

Нарадзіўся Прашковіч 4 траўня 1932 г., быў ведамы як літаратуразнавец, крытык, перакладнік, а таксама як адзін з чынных удзельнікаў нацыянальна-патрыятычнага руху Беларусі ў 1960-я – пачатку 1970-х гг. Мікола Прашковіч заўсёды імкнуўся аднавіць гістарычную праўду, раскрыць багацце культурна-гістарычнай і пісьмовай спадчыны беларускага народа, узняць яго нацыянальную самасведамасць на высокі ровень. Ён балюча перажываў за калані-

яльнае становішча Беларусі ў складзе Савецкага Саюза, асуджаў нацыянальную палітыку кампартыі, татальную русіфікацыю роднага краю, марыў пра сапраўднае нацыянальнае адраджэнне і незалежнасць нашай Бацькаўшчыны. У 1974 г. яго звінавацілі ў беларускім нацыяналізме і звольнілі з працы ў Акадэміі Навук. Стаў беспрацоўным, рабіў грузчыкам, карэктарам у часопісе "Родная прырода". У 1982 па стане здароўя пакінуў працу, а 2 лютага 1983 г. загінуў у час пажару на сваёй радзіме.

Сцяпана Місько, кандыдата філалагічных навук, старшага навуковага супрацоўніка таксама ў 1974 г. звольнілі з працы за нацыяналізм.

Мне давялося пазнаёміцца з ім тады – недзе ў другой палове 1970-х гг. – з беспрацоўным, але інтэлігентным і разумным чалавекам, з якога можна было б маляваць вобраз сапраўднага беларускага нацыяналіста.

У чым гэта выяўлялася?

Першае: Сцяпан Місько быў прадстаўніком старэйшага пакалення, што яшчэ заспела вайну. У юнацкія гады ён спрычыніўся да партызанскага змагання і быў нават узнагароджаны некалькімі ордэнамі і медалямі.

Другое: Сцяпан Місько ніколі не хваліўся гэтымі ўзнагародамі і не імкнуўся нешта за іх мецъ. Наадварот, ён кляў камуністаў і савецкую ўладу, адкрыта ганарыўся сваім дысідэнцтвам.

Трэцяе: ён гаварыў заўжды на беларускай мове, і той мове, якая спалучала простую сялянскую гаворку і ўсе каноны літаратурнай мовы. І галоўнае – ён, як навуковец, вызначаўся незалежнасцю мыслення, выразнай беларускай нацыянальнай арыентацыяй. Спалучэнне слоў "беларускі нацыяналіст" было для яго не пустым гукам і не брыдкім ярлыком, а найвышэйшай адзнакай чалавека.

Мне здаецца, што калі б нехта ствараў галерэю беларускіх нацыяналістаў, то Сцяпана Місько трэба было б паставіць на найпачэснейшае месца, калі не на першае.

У 1977 г., прабадзяўшыся некалькі гадоў ў сістэме савецкага беспрацоўя, Сцяпан Місько "прарваўся" на прыём да самога Пятра Машэрава, з якім яго звязвала партызанскае мінулае. Але, здаецца, з гэтага мерапрыемства нічога добрага не выйшла. У кожным разе, на працу ў Акадэмію навук ён так і не патрапіў.

У 1994 г., калі ствралася Беларуская нацыянальная партыя, Сцяпан адным з першых уступіў у яе шэрагі. Не малую ролю ў гэтым адыграла праграма партыі, прынамсі тое, што там чорным па беламу было напісана: "Мы нацыяналісты".

Вось такія людзі спрычыніліся да ўдзелу ў групоўцы, якая пазней атрымала назву "Акадэмічны асяродак". Ведама, ніякай арганізаванай групоўкі не было, былі проста людзі, якія імкнуліся сказаць нешта сапраўды праўдзівае і патрэбнае нашай нацыі, але, на жаль, непатрэбнае савецкай сістэме.

Не зважаючы на страшэнны ідэалагічны ўціск ды разгон "Акадэмічнага асяродку", яго ідэі ў розных праявах працягвалі шырыцца ў Акадэміі навук. Адным з найважнейшых аб'ектаў была старажытная культура Беларусі, якой і паводле планавай праграмы належала займацца акадэмічным інстытутам.

### *Семінар і этнаграфічныя экспедыцыі пры Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР*

У 1972 г. я паступіў у аспірантуру Інстытута фізікі АН БССР. У тыя гады гэты інстытут быў не толькі цэнтрам фізічнай навукі, але і значным цэнтрам інтэлектуальнай думкі Беларусі. Там, прыкладам, працаваў ведамы і цяпер гуру беларускіх ёгаў, што практыкуюць паводле сістэмы хатха-ёга, загаднік лабараторыі В. Верашчагін. Там працаваў ведамы фізік і апантаны аматар старажытнага беларускага іканапісу Юры Хадыка. Відаць, дзякуючы яму і трапіў я ў асяроддзе не так фізікаў, як людзей, што гадзінамі гаварылі пра скарб беларускага народу, захаваны ў

шматлікіх абразах, палотнах няведамых майстроў, у паўразбураных будынках цэркваў і касцёлаў, у велічных храмах і саборах.

Гэтым асяроддзем быў семінар, прысвечаны старажытнай беларускай культуры, створаны на пачатку 1970-х гг. пры Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Кіравала ім старшы навуковы супрацоўнік, чалавек улюбёны ў сваю справу Вольга Церашчатава. Другой яркай асобай, якая запомнілася мне, "зялёнаму" хлапчуку ў навуцы аб Беларусі, была Элеанора Вецер, ведамы навуковец у галіне старажытнай беларускай культуры. Ну, і само сабою, фізік і мастацтвазнаўца – Юры Хадыка.

Кожны год у часы адпачынку энтузіясты розных інстытутаў выязджалі ў этнаграфічныя экспедыцыі, дзе вывучалі і збіралі помнікі нашай старажытнай культуры: старажытныя абразы, карціны, скульптуры, іншыя творы няведамых беларускіх майстроў. Потым паводле вынікаў гэтых экспедыцыяў стварылі музей старажытнай беларускай культуры, што месціцца і цяпер у высотным будынку Нацыянальнай Акадэміі навук. На жаль, да экспедыцыяў я тады яшчэ "не дарос", але семінары любіў наведваць.



Аплакванне Хрыста, 1794, Пінскі р-н Брэсцкай вобл.
Музей старажытнай беларускай культуры.

Тыя акцыі, сціплыя на першы пагляд, што праводзілі ўдзельнікі этнаграфічных экспедыцыяў пры Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, сталіся вельмі моцным каталізатарам уздыму цікаўнасці да беларусістыкі ў усіх акадэмічных інстытутах. Найперш успомню Інстытут ядравай энергетыкі, дзе вельмі шмат гуртавалася адукаванай і інтэлектуальнай моладзі. Некаторыя з гэтых людзей, як, скажам, А. Ярашэвіч, потым назаўсёды прафесійна звязалі сваё жыццё з дзейнасцю на ніве старажытнай беларускай культуры. А Ю. Хадыка стаў слынным палітыкам і быў адным з заснавальнікаў Беларускага Народнага Фронту.

*Творчы асяродак «На Паддашку»*

Так звалася месца сходаў нацыянальна скіраванай, пераважна мастацкай інтэлігенцыі ў Мінску ў 1960-х – першай палове 1980-х гг.

Назоў "На Паддашку" насіла майстэрня мастака Яўгена Куліка, якая мясцілася пад самым дахам будынка на Ленінскім праспекце ў г. Мінску насупраць будынка КДБ. Тут збіралася апазіцыйна скіраваная беларуская інтэлігенцыя: мастакі Лявон Баразна, Віктар Маркавец і Алесь Марачкін, мастацтвазнаўцы Зянон Пазняк і Генадзь Сокалаў-Кубай, актор Алесь Лабанок, археолаг Міхась Чарняўскі, паэт Алесь Разанаў і іншыя патрыёты Беларусі, якіх цяпер я бы назваў нацыяналістамі.

Майстэрня, у існасці, была дыскусійным клубам. Тут абмяркоўвалася культурная і грамадска-палітычная сітуацыя ў краіне. Але тут таксама нараджаліся ідэі і праекты розных акцыяў, што ўжыццяўлялі сябры асяродку.

Неяк, ранняй вясной 1974 г. трапіў у тое гняздо нацыяналістаў і аўтар гэтых радкоў. Гэтая важная для мяне падзея адбылася дзякуючы актору Алесю Лабанку, які быў адным з першых маіх настаўнікаў навукі пра чароўную краіну Беларусь. Менавіта Лабанок даў мне першую навуку беларушчыны. Помню,

як з любасцю і пашанай ён паказваў мне рэдкія беларускія кнігі, нейкія кружэлкі з запісамі беларускіх спеваў і старажытнай беларускай музыкі. І вось у тую далёкую вясну 1974 г. мы з Алесем праходзілі па праспекце Леніна, недалёка ад месца, што завецца ў мінчукоў "Пад часамі", калі раптам ён запытаўся ў мяне, ці не хацеў бы я пазнаёміцца з сапраўднымі знаўцамі беларускай гісторыі і культуры. Відаць, бачачы маё захапленне беларусістыкай, ён падумаў, што я ўжо "даспеў" для далейшай адукацыі і наважыўся завесці мяне ў славутую майстэрню Куліка. Сігналам, што заходзіць дазваляецца, быў белы ручнік, які звешваўся з акна сапраўды на самым паддашку дома насупраць цэнтральнай кнігарні.

Цяпер цяжка ўспомніць усіх дзейных асобаў таго візіту, але запомніліся засяроджаныя твары Яўгена Куліка, Генадзя Сокалова-Кубая і асабліва Зянона Пазняка. Апошні, як мне потым расказаў Лабанок, усё ціхенька запытваўся пра мяне: "А што гэта за хлопец, які ўсё маўчыць? Ці не з КДБ ён?" Успамінаючы цяперашнюю сапраўдную манію лідэра БНФ падазраваць кожнага ў сексотстве, можна змеркаваць, што яна ў яго здаўна, яшчэ з савецкіх часоў.

Ува ўмовах таталітарнага рэжыму ўсякі занятак нацыянальнай культурай хуткаператвараўся ў форму змагання за беларускасць. У выніку паседжанняў пад "страхой" сталі рэальнасцю шэраг мастацкіх выстаў, прымеркаваных да юбілейных датаў беларускай культуры. Асаблівасцю гэтых выстаў была нацыянальная зарыентаванасць, адыход ад сацрэалізму. Тут нараджаўся нонканфармізм, які ў наш час так ярка прадстаўляе Аляксей Марачкін. Вялікім поспехам творчага асяродку "На паддашку" можна лічыць выставу да стагоддзя з дня нараджэння Алаізы Пашкевіч (Цёткі) у 1976 г. Мэтай гэтай культурніцкай акцыі было сцвердзіць, што «ёсць у нас, як і ў іншых, святыня». Творы экспанаваліся ў выстаўнай зале Саюзу мастакоў у Мінску і ў Жодзіна. У Жодзіна шэраг твораў былі сапсаваныя няведамымі людзьмі. Ёсць

меркаванне, што гэты злачынны акт быў учынены “з наводкі”, што за хуліганамі стаялі пэўныя сілы.

Значнай акцыяй мастакоў асяродку была выстава да юбілею Міколы Гусоўскага (1980 г.). Калі выстава да стагоддзя Цёткі была праігнараваная ўладай і, адпаведна, афіцыйнай прэсай, дык гэтая мела пэўны розгалас у СМІ. Адбылося гэта дзякуючы таму, што пастановай UNESCO юбілей Міколы Гусоўскага быў улучаны ў сусветны каляндар выдатных культурных падзей. У гэтых абставінах кіраўніцтву БССР нельга было ігнараваць такой знакамітай падзеі. Надумалі юбілей аўтара “Песьні пра зубра” адсвяткаваць не як юбілей беларускага асветніка, а як носьбіта духоўнай велічы “ўсходнеславянскіх народаў”. Экстрэмальныя абставіны прымусілі ўладу папусціцца.

Пасля гэтага асяродак “На паддашку” “перасяліўся” ў майстэрню Алеся Шатэрніка і Віктара Маркаўца, якая месцілася на вуліцы Дзімітрава.

У 1980-я гг. асяродак меў страты. Улады, занепакоеныя шыраннем цікавасці да беларускай культуры, распачалі чарговую хвалю рэпрэсіяў супраць патрыятычнай інтэлігенцыі. Былі звальненні з працы, узмацнілася цэнзура. Нягледзячы на гэта, асяродак працягваў культурніцка-асветніцкую дзейнасць. Наступнымі акцыямі былі: 100-гадовы юбілей Казіміра Малевіча, юбілейныя гадавіны Вацлава Ластоўскага і Язэпа Драздовіча.

Калі беларуская палітычная сітуацыя на пачатку 1990-х гг. пачала мяняцца, мастакі асяродку “На паддашку” ўтварылі ядро ведамай мастацкай суполкі “Пагоня”.

### *Іншыя акцыі беларускай інтэлігенцыі эпохі стагнацыі*

Дзякуючы дзейнасці акадэмічнай інтэлігенцыі, нацыянальна-сведамых мастакоў і літаратараў на пачатак 1980-х гг. літаральна ў паветры насіўся прывід перамен, прывід новай Беларусі, прывід нацыянальнай беларускай дзяржавы. Усё гэта не ўзнікла

проста так – улады ўсё больш сціскалі жалезнае кола над нашымі нацыянальнымі святынямі, гістарычнымі помнікамі, усё больш ганьбавалася беларуская мова. У гэтыя часы выходзяць выдатныя літаратурныя творы, створаныя Уладзімірам Караткевічам, а яго “Зямля пад белымі крыламі” стала своеасаблівым падручнікам нанова адкрытай краіны Беларусі. У 1985 г. у Лондане выходзіць падпольная кніга Алега Бембеля “Роднае слова і маральна-эстэтычны прагрэс”, дзе ў незвычайнай для тых часоў форме была звернутая ўвага на заняпад беларускае мовы.

У 1986 г. сярод сведамай беларускай інтэлігенцыі ўзнік цэлы рух за абарону беларускай мовы. Быў напісаны спецыяльны ліст – крык роспачы, дзе аргументавана паказвалася пільная патрэба ратавання беларускае мовы ад яе поўнага знікнення з сям’і жывых моў Зямлі. “Ліст дваццаці васьмі” ў абарону беларускай мовы, дзе ў шэрагу падпісантаў быў і аўтар гэтай кнігі, накіравалі ў ЦК КПСС, у Вярхоўны Савет СССР і яшчэ некуды. У 1987 г. быў напісаны яшчэ адзін ліст, дзе падпісалася яшчэ больш людзей. Вельмі добра помню, як нас, кожнага з падпісантаў, выклікалі тады ў галоўны будынак камуністаў па вуліцы Карла Маркса (цяпер рэзідэнцыя прэзідэнта) – у ЦК КПБ і цэлы дзень вялі гутарку, якая, зразумела, нічога не дала дый не магла даць у тыя апошнія савецкія часы. Дарэчы, гутарка была на самым высокім роўні з удзелам Першага Сакратара ЦК КПБ Яфрэма Сакалова і Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, будучага сацыял-дэмакрата, цяпер ужо нябожчыка, Г. С. Таразевіча.

### *Гарбачоўская перабудова і чацвертая хваля нацыянальнага адраджэння*

З надыходам гарбачоўскай перабудовы пачалася новая эпоха ў палітычных працэсах Беларусі. У 1991 г. Беларусь атрымлівае незалежнасць. Атрымлівае нечакана, зусім не гатовая да яе, але стаўшы, “як і ўсе” – як іншыя рэспублікі СССР – большасць

з якіх марылі аб самастойнасці і лічылі сваё бытаванне ў складзе Саюза акупацыяй (асабліва прыбалтыйскія краіны).

Галоўная рыса новага перыяду (90-я гады XX ст.) – заняпад аўтарытэту і ўсеабдымнасці камуністычнай партыі, заняпад таталітарнай сістэмы. Новы перыяд прынёс шматпартыйнасць і новыя (для былой БССР) палітычныя ідэалогіі.

Шматпартыйнасць разгарнулася ў Беларусі з пачатку 1990-х гг. На цяперашні момант у РБ ёсць фактычна ўсе асноўныя палітычныя плыні, што існуюць у краінах Заходняй і Усходняй Еўропы. У 1988 г. паўстаў Беларускі Народны Фронт, які паставіў сабе за мэту дэмакратызацыю грамадства і нацыянальнае адраджэнне. У 1990 г. быў прыняты Закон "Аб мовах", згодна з якім беларуская мова станавілася адзінай дзяржаўнай мовай. Пасля абвяшчэння Рэспублікі Беларусь была прынятая нацыянальная сімволіка – герб "Пагоня" і бел-чырвона-белы сцяг. Пачалася **чацвертая хваля** нацыянальнага адраджэння, якая доўжылася з 1988 па 1996 год – год рэферэндума, пасля якога вярнулася ў крыху змадыфікаваным выглядзе ранейшая савецкая сімволіка і быў прыняты закон аб дзвюх дзяржаўных мовах: беларускай і рускай, што адмоўна адбілася на пашырэнні ды развіцці беларускае мовы.

І ўсё ж за той сціслы прамежак часу было зроблена вельмі шмат. Адкрываліся беларускія класы і школы, няўхільна беларусізавалася вышэйшая школа, упершыню адкрыта друкаваліся творы нацыянал-дэмакратаў часоў культу асобы, тых, хто доўгі час насіў ярлык "ворага народа". Грамадзянам Беларусі нарэшце сталі даступныя творы Язэпа Лёсіка, Вацлава Ластоўскага, Ларысы Геніюш, Усевалада Ігнатоўскага... Можна было выдаць кнігу "Па слядах аднаго міфа" сучаснага гісторыка Міколы Ермаловіча, якая знаходзілася пад забаронай, а яе аўтар не меў уваходу ў акадэмічныя інстытуты.

Здавалася б, што абвяшчэнне незалежнасці Бела-

русі на фоне такога ўздыму нацыянальнага адраджэння дадасць не толькі больш мажлівасцяў для беларускага руху, але і зробіць працэс фармавання беларускай нацыі-дзяржавы незваротным.

Але ў 1991 г., годзе абвяшчэння незалежнасці шэрагу постсавецкіх рэспублік, Беларусь была, відавочна, адзінай краінай, не гатовай да дзяржаўнай незалежнасці. Калі ў жыхароў Прыбалтыкі ідэя сваёй дзяржавы жыла ў свядомасці найзанядбанейшага абывацеля, то для беларусаў яна была незразумелай і асацыявалася хутчэй з даўнымі, але не забытымі гулагаўскімі лагерамі.

З прыточанай вышэй канцэпцыі ўтварэння нацыі-дзяржавы вынікае, што кожная нацыя мусіць заваяваць свой суверэнітэт, а перад гэтым прайсці шлях аўтаноміі і ***вельмі захацець*** незалежнасці. Так было ўва ўсіх рэспубліках былога СССР, акрамя Беларусі. Працэс утварэння нацыяў-дзяржаў, які пачаўся для большасці народаў, як мы вышэй адзначалі, яшчэ ў XIX ст., дасягнуў кульмінацыі ў канцы XX ст. Ідэалогія нацыяналізму запанавала паўсюль. Але ў Беларусі гэтая ідэалогія не стала масавай. Носьбітамі яе была невялікая частка народа, якая і стварыла БНФ.

Напачатку, у 1988 г. ідэі дэмакратыі і нацыянальнага адраджэння крочылі побач. Брак таго і другога ў грамадстве, шматгадовая нястача свабоды слова і друку, варты ганьбы стан беларускай мовы і нацыянальнай культуры нечакана, пасля 30 кастрычніка 1988 г. — часу правядзення знакамітых "Дзядоў", скончыліся ўзнікненнем шырокага руху за дэмакратыю – Беларускага Народнага Фронту (БНФ).

### *Грамадска-палітычныя арганізацыі ў Беларусі падчас гарбачоўскай перабудовы*

Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі другой паловы 80-х – пачатку 90-х гг. XX ст. было вельмі бурным і разнастайным. Яно беспасярэдне фармавалася ў час гарбачоўскай перабудовы, дэмакратызацыі і нацыянальнага абуджэння апошніх гадоў існавання

СССР, з пачаткам станаўлення маладой незалежнай рэспублікі Беларусь, якая абвясціла сваю незалежнасць 27 ліпеня 1991 г. На гэты час уся Беларусь станавіла сабою стракатую палітру партыяў і арганізацыяў розных палітычных кірункаў, якія на сёння лучаць дзве галоўныя плыні: з аднаго боку, партыі і грамадскія арганізацыі, што падтрымліваюць палітыку ўрада і, з другога боку, апазіцыйныя партыі ды грамадскія арганізацыі, блізкія да гэтых партыяў, якія праводзяць незалежную ад дзяржавы палітыку.

Да пачатку бурных 1990-х гг. грамадска-палітычнае жыццё Беларусі ўжыццяўлялася пад кіроўнай роляй Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Пасля скасавання 6-га артыкула Канстытуцыі СССР (1990 г.) аўтарытэт КПСС-КПБ пачаў імкліва падаць, і палітычны абшар запоўніўся новымі незалежнымі палітычнымі аб'яднаннямі.

Прадвеснікам будучых нацыянальных рухаў, дэмакратычных партыяў і незалежных грамадзянскіх арганізацыяў было моладзевае культурніцкае і нацыянальна-адраджэнцкае згуртаванне "Майстроўня", якое дзеіла ў г. Мінску з сярэдзіны 80-х гг. XX ст. "Майстроўня" імкнулася адрадзіць беларускія традыцыі, звычаі, ладзіла народныя святы – "Купалле", "Каляды", іншыя. Найбольш ведамай акцыяй было "Гуканне вясны", арганізаванай нацыянальнасведамай моладдзю 20 красавіка 1986 г. каля мінскага Опернага тэатра і разагнанай органамі правапарадку. Аднак такая рэакцыя ўладаў прывяла да яшчэ большага росту незалежных культурніцкіх, музычных, літаратурных і іншых грамадскіх аб'яднанняў, якія атрымалі назву "нефармальных".

"Нефармальныя" арганізацыі аб'ядноўвалі ў 1988 г. больш за 46 тыс. чалавек. У Мінску налічвалася ў той час 566 аматарскіх аб'яднанняў і клубаў паводле інтарэсаў. У 1988 г. больш за 65 % мінскай моладзі лічыла сябе "нефармаламі". Існавалі музычныя суполкі ("металісты", "рокеры"), літаратурныя, іншыя аб'яднанні паводле інтарэсаў. Найбольш ве-

дамым літаратурным аб'яднаннем былі "Тутэйшыя". "Тутэйшыя" – незалежнае добраахвотнае таварыства маладых беларускіх літаратараў. Існавала ў 1987–1990 гг. Лідэрамі былі А. Бяляцкі, У. Арлоў, А. Сыс, С. Дубавец і інш. Шырокую ведамасць у Мінску ў 1985–1990 гг. мела моладзевае гістарычна-культурнае аб'яднанне "Талака". Старшынём быў Сяржук Вітушка, а ягонымі памочнікамі – будучыя ведамыя палітыкі Вінцук Вячорка і Віктар Івашкевіч. У Горадне вялікай папулярнасці дасягнуў гістарычна-культурны клуб "Паходня", якім кіраваў доктар гістарычных навук Міхась Ткачоў.

У Мінску ў тыя гады быў добра ведамы палітычны клуб "Мінская альтэрнатыва".

Ад 90-х гг. XX ст. праўны статус грамадскіх арганізацыяў вызначыла пастанова СМ БССР ад 03.10.1990 "Аб зацвярджэнні часовага палажэння аб парадку ўтварэння і дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў грамадзян у Рэспубліцы Беларусь".

З развіццём перабудовы "нефармальныя" арганізацыі таксама імкліва развіваліся, і ў выніку ўзнікла пільная патрэба іх аб'яднання.

19 кастрычніка 1988 г. у Доме кіно г. Мінска адбываецца ўстаноўчы сход беларускага гістарычна-асветнага таварыства памяці ахвяраў сталінізму "Мартыралог Беларусі", заснавальнікамі якога выступілі Саюз пісьменнікаў, Саюз кінематаграфістаў, Саюз мастакоў і рэдакцыя газеты "Літаратура і мастацтва". На гэтым сходзе таксама быў створаны аргкамітэт Беларускага Народнага Фронту (БНФ) "Адраджэньне", а рух акрэслены як грамадска-палітычны за дэмакратычнае рэфармаванне грамадства і адраджэнне беларускай нацыі, у якім могуць браць удзел як асобныя грамадзяне, так і грамадскія аб'яднанні. У склад аргкамітэта ўвайшлі ведамыя ў Беларусі людзі: пісьменнікі Васіль Быкаў і Уладзімір Арлоў, гісторыкі Міхась Ткачоў і Анатоль Грыцкевіч, навукоўцы Юрась Хадыка і Зянон Пазняк, іншыя. Аргкамітэт апублікаваў праграмную заяву, у якой акрэсліў скіраванасць руху

(дэмакратычныя рэформы, рэальны суверэнітэт Беларусі, нацыянальнае адраджэнне, правы чалавека).

30 кастрычніка 1988 г. з ініцыятывы "Мартыралогу Беларусі" і аргкамітэта БНФ на Маскоўскіх могілках у Мінску адбыўся мітынг-рэквіем, які разагнала міліцыя. Гэтая падзея стала, фактычна, пачаткам імклівага росту БНФ ды іншых грамадскіх нефармальных арганізацыяў.

У той дзень, упершыню за шмат гадоў сталінскага страху, брэжнеўскай стагнацыі і андропаўскай бязглуздай дысцыпліны, тысячы мінчукоў, хто пехатой, хто як (бо не хадзіла метро) з самай раніцы рухаліся да маскоўскіх могілак, што месцяцца ўва ўсходняй частцы Мінска, у мікрараёне "Усход", каб адзначыць там народнае свята продкаў "Дзяды".

Быў там і аўтар гэтых радкоў. Дзеі, якія пачаліся спачатку на Маскоўскіх могілках, а потым спантанна перараслі ў мітынг у Курапатах, не раз апісваліся ў розных варыянтах. Гэта быў сапраўды гістарычны дзень, можа, больш значны для нашай найноўшай гісторыі, чым знакамітыя Віскулі, дзе падпісваўся слынны акт аб спыненні дзейнасці СССР. Для многіх гэты дзень – пачатак адліку зусім новай сведамасці, новага статусу ў грамадстве ды і новага статусу самога грамадства. З таго часу і на многія гады пачаўся грамадскі падзел, стратыфікацыя беларускага грамадства паводле аднаго галоўнага крытэра – стаўлення да Беларускага Народнага Фронту "Адраджэньне". Многія людзі тады рабіліся прыхільнікамі альбо сябрамі БНФ і звязвалі сваё далейшае жыццё з ім ці блізкай да БНФ арганізацыяй альбо партыяй. Многія не прымалі і не прынялі ідэалаў, абвешчаных БНФ і станавіліся на другі бок "барыкадаў".

Пасля знакамітых "Дзядоў" пачаўся бурны працэс росту прыхільнікаў Беларускага Народнага Фронту. Аргкамітэт БНФ па вуліцы Фрунзэ, 5 (Дом літаратара) распачаў рэгістрацыю суполак БНФ, што імкліва ўтвараліся з таго натуральнага палітычнага каталізатара. З'явілася і ў мяне думка далучыцца да працы аргкамітэта БНФ.

Я тады працаваў навуковым супрацоўнікам у БДУ, і ў мяне ўзнікла ідэя стварыць суполку БНФ ува ўніверсітэце. Але на працы не так проста гэта было зрабіць – страх, ведама, быў вялікі. І разам з сваім сябрам Віктарам Навуменкам мы зрабілі арыгінальны ход – суполка ўзнікла сярод удзельнікаў Народнага хору народнай песні выкладнікаў і супрацоўнікаў БДУ, дзе мы абодва спявалі ў групе басоў-барытонаў.

Потым ужо была створаная суполка Маскоўскага раёна, да якога тэрытарыяльна адносіўся універсітэт, пачалося цікавае жыццё, напоўненае да берагоў яскравымі падзеямі. Гэта быў час, як сказаў бы Леў Гумілёў, пасіянарнага ўздыму, рэзкага ўзросту нацыянальнай сведамасці беларусаў і сцверджання ідэалаў дэмакратыі. (Не ведалі мы тады, чым неўзабаве абернецца для нас і для Беларусі гэтая самая дэмакратыя...)

Важнай наступнай падзеяй, якая адбылася дзякуючы ініцыятыве аргкамітэта БНФ, быў мітынг "У падтрымку перабудовы" на рэспубліканскім стадыёне "Дынама" г. Мінска, які прайшоў у лютым 1989 г. Мітынг сабраў каля 40 000 чалавек. Прынятая на мітынгу рэзалюцыя патрабавала скасаваць замацаваную ў Канстытуцыі кіраўнічую ролю камуністычнай партыі. Упершыню была публічна асуджаная камуністычная партыя, а тысячы партыйных функцыянераў, што прыйшлі на мітынг у стандартных для наменклатуры норкавых зімніх шапках, былі асвістаныя пад крыкі "Ганьба КПСС!".

Амаль што праз усе 90-я гг. XX ст. найбольш масавай і ўплывовай апазіцыйнай арганізацыяй у г. Мінску быў грамадскі рух за перабудову – Беларускі Народны Фронт "Адраджэньне". У 1999 г. БНФ раскалоўся на дзве арганізацыі з адной і той жа назвай. Хоць напачатку існавалі як рух БНФ, так і партыя БНФ, а пасля яго расколу і няўхільнага паніжэння рэйтынгу папулярнасці БНФ у абедзвюх сваіх структурах, фактычна, застаўся функцыянаваць не як дзве грамадскія арганізацыі, два рухі, а толькі як дзве партыі.

## 9. Грамадскія арганізацыі нацыянальнай скіраванасці ў 90-х гг. XX ст.

Апрача БНФ з пачатку 1990-х гг. у Мінску дзеіў шэраг грамадскіх арганізацыяў дэмакратычнай і нацыянальна-адраджэнцкай скіраванасці. Найбуйнейшай было Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны (ТБМ). ТБМ было створана як добраахвотная масавая грамадская арганізацыя дзеля культурна-асветніцкай дзейнасці ў галіне адраджэння беларускай мовы і беларускай нацыянальнай культуры ў Беларусі. Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны ўзнікла ў 1989 г. Сябрамі кіроўнага органа Рэспубліканскай рады ТБМ, у свой час былі прадстаўнікі беларускай эліты, ведамыя навукоўцы, пісьменнікі: Максім Танк, Барыс Сачанка, Васіль Быкаў, Янка Брыль, Зянон Пазняк, Юры Хадыка, Адам Мальдзіс, Артур Вольскі, Вячаслаў Адамчык. ТБМ паспяхова дзеіць да цяперашняга часу, мае сваю сталую газету “Наша слова”.

Важную ролю ў нацыянальным адраджэнні беларусаў адыгрывалі ў 1990-я гг. таксама ГА “Таварыства беларускай школы” (А. Лозка), ГА “Міжнародная асацыяцыя беларусістаў” (А. Мальдзіс).

Нацыянальна-культурнае адраджэнне чапіла не толькі беларусаў. Былі створаныя нацыянальна-культурныя аб’яднанні татараў-мусульман “Аль-Кітаб”, Саюз Палякаў на Беларусі, Беларускае аб’яднанне габрэйскіх асацыяцыяў і суполак, асацыяцыя ўкраінцаў на Беларусі “Ватра” ды іншыя.

Вялікую ведамасць у свеце атрымала Згуртаванне беларусаў свету “Бацькаўшчына”, дзейнасць якога купавалася найперш у Мінску. 8–10 ліпеня 1993 г. ЗБС “Бацькаўшчына” правяло ў Мінску “Першы з’езд беларусаў свету”. На ім было 486 дэлегатаў з замежжа: Англіі, Аргенціны, Аўстрыі, Аўстраліі, Бельгіі, Германіі, ЗША, Канады, Польшчы, Францыі, Чэхіі, Швейцарыі, Расіі, Украіны, Малдовы, Туркменіі, Казахстана, Кіргізіі, Узбекістана, Эстоніі, Літвы, Латвіі;

510 дэлегатаў з Беларусі і больш за 200 чалавек гасцей. Прэзідэнтам ЗБС "Бацькаўшчына" быў абраны акадэмік Радзім Гарэцкі, старшынём Рады – Ганна Сурмач. Другі, трэці і чацверты з'езды беларусаў свету праходзілі таксама ў Мінску ў 1997, 2001 і 2005 гадах адпаведна.

### *Рух за перабудову Беларускі Народны Фронт "Адраджэньне"*



Пра Беларускі Народны Фронт напісана шмат, таму я абмяжуюся мінімальнымі звесткамі і засяроджуся перадусім на тых падзеях, што датычаць цікавай мне тэмы – нацыяналізму, а таксама адлюстравання ўкладу дзеячоў БНФ у развіццё беларускай нацыянальнай ідэі.

На ўстаноўчы сойм БНФ з'ехалася недзе каля 400 дэлегатаў (я таксама браў у ім удзел). Адбыўся сойм 24–25 траўня 1989 г. у Вільні (Вільнюсе), бо правесці яго ў Мінску не дазволіў Прэзідыум ВС БССР.

Устаноўчы з'езд праходзіў ў старажытнай беларускай сталіцы, якая ў 1989 г. была ўжо сталіцай Літоўскай ССР і насіла назву Вільнюс, чамусьці прынятую і ў нас. Цікава зазначыць, што беларусаў там прынялі лепей, чым у сваёй сталіцы Мінску.

"Дэсант" беларусаў у Вільні той травеньскай ранiцай станавіў незвычайнае відовішча. Бел-чырвона-белыя сцягі і беларуская мова запаланілі Вільню, чаго не было з часоў Францішка Скарыны, і на гэтыя два дні яна стала беларускай, прынамсі, так адчувалі сябе там дэлегаты.

Тыя два дні назаўсёды застануцца ў маёй памяці. Такое адчуванне, што ты стаў удзельнікам найвялікшай падзеі ў гісторыі, сведкам пераломнага гістарычнага працэсу, які, можа, а многія шчыра верылі, што пэўна – паверне шлях Беларусі да новага жыцця. У тыя два дні сканцэнтраваліся падзеі не менш чым двух гадоў звычайнага жыцця, яны перасягаюць рэ-

альны час насычанасцю, сціслаcцю перажыванняў і фантастычным хараством людзей, думак і слоў.

У праграме Фронту, прынятай у Вільні, сказана: БНФ "Адраджэньне" – гэта шырокі грамадскі рух, які выступае за дэмакратычныя ідэалы, за моцную незалежную дзяржаву Беларусь, за сацыяльную рынкавую эканоміку, за нацыянальна-культурнае адраджэнне нашага народа... Упершыню за шмат гадоў апазіцыйны дэмакратычны і незалежніцкі рух у Беларусі аформіўся арганізацыйна. Упершыню ў постсавецкай Беларусі з'явілася палітычная сіла, якая пераняла традыцыю нацыянальна-вызвольнай і дэмакратычнай барацьбы славутых папярэднікаў – паўстанцаў супраць Расійскай Імперыі, адраджэнцаў пачатку нашага стагоддзя, стваральнікаў і абаронцаў БНР. БНФ стаў галоўнаю сілаю, якая процістаяла і процістаіць таталітарнай сістэме. БНФ пераадолеў палітычную манаполію камуністаў у Беларусі, вынес галоўны цяжар барацьбы з рэжымам і савецкай імперыяй. БНФ "Адраджэньне" паспрыяў далучэнню мільёнаў суайчыннікаў да палітычнага жыцця і да нацыянальна-культурнага адраджэння. БНФ першы сказаў народу праўду пра злачынную існасць і бесперспектыўнасць камуністычнага рэжыму, пра паняволенасць беларускага народа ў імперыі і пра патрэбу адваёўвання незалежнасці, пра змрочныя наступствы Чарнобыля.

Праграма БНФ вялікую ўвагу надавала нацыянальнаму беларускаму адраджэнню. Асабліва дэталёва адпрацаваны аддзел, прысвечаны культуры і асвеце. Аднак у "чыстым" выглядзе пытанне аб нацыянальнай ідэі і тым больш беларускім нацыяналізме ў праграме не ставіцца. Мабыць, у тыя часы гэта было і не патрэбна, БНФ задумваўся як шырокі грамадскі рух, і праграму прыстасоўвалі да таго, каб яна была блізкай і зразумелай кожнаму.

І ўсё ж галоўныя атрыбуты нацыянальнай ідэі, такія, як суверэнітэт краіны, стварэнне паўнавартаснай дзяржаўнасці, падвышэнне міжнароднага аўтарытэту

Беларусі ставіцца галоўнай мэтаю БНФ. "Мы лічым, што нацыя, нацыянальная супольнасць ёсць натуральным вынікам сацыяльнасці чалавечай прыроды. Яна валодае вечнымі правамі, рэалізацыя якіх залежыць не ад назапашанага ёю палітычнага, эканамічнага ці ваеннага патэнцыялу, а выключна ад яе ўласнае волі", – запісана ў праграме.

Ідэолагі БНФ вялікую ўвагу надавалі праўным аспектам беларускага грамадства. Што да ўмеркавання правоў нацыі і правоў асобы – пытанне развязвалася наступным спосабам: "Правы нацыі на самараскрыццё роўнавялікія адпаведным правам асобы. Але гэты праўны парытэт не стварае і не можа стварыць невырашальных канфліктаў, калі кіравацца прынцыпам падмяняльнасці, які патрабуе безумоўнай роўнасці грамадзянскіх правоў асобы любой нацыянальнасці і дае магчымасць задавальнення духоўных патрэбаў нацыянальнай меншасці праз права нацыянальна-культурнай аўтаноміі".

На маю думку, нельга на парытэтных правах захаваць нацыю, якая толькі пачала вызваляцца з гегемоніі і ўціску больш моцнай нацыі. Патрэбен закон аб абароне нацыі, яе правы мусяць дамінаваць. Зрэшты, падрабязней пра гэта сказана ў нашым асобным раздзеле "Правы нацыі і чалавека".

Далей БНФ выступае "За вольнае і нязмушанае развіццё беларускай мастацкай культуры, за пошук свайго ўласнага аблічча ў галіне навуковых доследаў і тэхналагічных распрацовак. За тое, каб нашыя нацыянальныя каштоўнасці і адроджаная гістарычная памяць былі духоўным асяродкам для выхавання новага пакалення...Мы за добразычлівыя, раўнапраўныя і ўзаемакарысныя адносіны з усімі блізкімі і далёкімі суседзямі Беларусі. Мы за падтрымку міжнародных арганізацыяў, дзейнасць якіх забяспечвае згоду і абарону правоў чалавека".

У цэлым праграма ў Фронта добрая, але крыху бяззубая і, відаць, гэта пазней пачало праяўляцца. Нацыянальная ідэя мусіць быць, і яна мусіць дамінаваць праз увесь тэкст.

БНФ на пачатку станавіў сабой аб'яднанне "нефармальных" суполак, арганізацыяў і грамадзянаў, якія выступалі перадусім за адраджэнне беларускай мовы і культуры. Пытанне выхаду Беларусі з складу СССР тады яшчэ ўголас не ўздымалася: з'езд ухваліў статут Руху, у якім сцвярджалася, што дзейнасць БНФ будзе адбывацца ў рамках Канстытуцыі БССР. На пасаду старшыні БНФ быў абраны Зянон Пазняк. Намеснікамі сталі Міхась Ткачоў, Юры Хадыка. У 1990 г. шэраг дэмакратычных кандыдатаў пры падтрыманні БНФ абіраюць у Вярхоўны Савет СССР, а ў 1990 г. БНФ бярэ ўдзел у выбарах у прадстаўнічыя органы ўлады БССР. Па ўсіх акругах Мінска выстаўляліся кандыдаты ад Фронту альбо дэмакратычна скіраваныя грамадзяне, якіх ён падтрымліваў. У большасці акруг Мінска прадстаўнікі БНФ выйшлі ў другі тур. 25.02.1990 г. на арганізаваны БНФ мітынг пратэсту супраць недэмакратычнага правядзення выбараў прыйшло каля 100 000 чалавек. Усяго пры падтрыманні Фронту ў Вярхоўны Савет прайшло 60 дэпутатаў. Пасля выбараў у Вярхоўным Савеце ўтвараецца фракцыя БНФ – 37 чалавек з 345 дэпутатаў.



Мітынг БНФ на Паўднёвым Захадзе ў час выбраў у Вярхоўны Савет 12 склікання (1990). Злева ўнізе ў акулярах Віктар Навуменка. Трымае мікрафон аўтар.

На II з’ездзе БНФ, які праходзіў у Мінску 23–24 сакавіка 1991 г. была прынятая праграмная заява “Свабода – Незалежнасць – Адраджэнне”, назва якой ужо адлюстроўвала існасць курсу, узятага БНФ на новы перыяд. Разам з найважнейшымі заданнямі таго перыяду – дэкамунізацыя краіны, пераход да рынкавых зносін, рэфармаванне сістэмы ўлады – БНФ ставіў як першыя заданні нацыянальнае і культурнае адраджэнне, беларусізацыю сістэмы адукацыі і пашырэнне беларускае мовы. Менавіта ў тыя часы, асабліва з прыходам на пасаду старшыні Вярхоўнага Савета беларускамоўнага прафесара Станіслава Шушкевіча, пачаўся найбуйнейшы праект фармавання беларускай нацыі, які можна прыраўнаць толькі да беларусізацыі ў БССР 20-х гг. XX ст. І немалую ролю адыгрывала ў гэтым працэсе фракцыя БНФ у Вярхоўным Савеце, як і ўвесь Народны Фронт.

***БНФ і палітычныя партыі.*** Пачынаючы з 1990 г., з разбурэннем камуністычнай сістэмы адчыніліся дзверы для фарміравання шматпартыйнай сістэмы ўва ўсіх рэспубліках былога СССР. І калі ў іншых рэспубліках гэты працэс імкліва развіваўся, і цяпер у кожнай з новых краін існуе багатая фарбамі палітычнае жыццё, то ў Беларусі атрымалася інакш.

Тое, што у нас цяпер няма шматпартыйнай сістэмы, я думаю, добра зразумела кожнаму. Але яна не існавала, фактычна, і ў 1990-я гг. У тым сэнсе, як гэта разумееца ў краінах заходняй дэмакратыі, дзе менавіта партыі вызначаюць унутраную і замежную палітыку дзяржавы. У нас партыі фармальна існавалі, але ж з якімі цяжкасцямі яны ўтвараліся, колькі бар’ераў ставілася перад маладымі партыямі, якія раптам вылузваліся з палітычнага шалупіння 1990-х!

На перашкодзе новым партыям станавіліся ўсе – і ўлады, і грамадства, і працоўныя калектывы і... БНФ. Зянон Пазняк лічыў, што ўсе партыі нацыянальна-дэмакратычнага кірунка мусяць уваходзіць

у БНФ як структурныя адзінкі ўсяго Фронту. Ідэя гэтая цалкам канструктыўная, зразумелая, але... нерэальная.



Зянон Пазняк

Довады на карысць апошняе ідэі такія: пры яе паспяховай рэалізацыі расце моц нацыянальна-дэмакратычных пазіцыяў у грамадстве, расце і мацнее ўся структура народнага руху, які з'ядноўвае БНФ, рэалізуецца цэнтралізаваная каардынацыя Фронтам усіх партыяў і структурных адзінак БНФ і, нарэшце, сам Зянон Пазняк становіцца як бы галоўным старшынём усіх гэтых партыяў і структур, што ўваходзяць у БНФ.

Нерэальнасць такога падыходу відавочная. Амаль такі самы падыход быў і ў зусім нядаўнай савецкай сістэме. Той ж таталітарны, недэмакратычны шлях, які паўтарае БНФ следам за сваімі папярэднікамі – камуністамі. Гэта, дарэчы і не дзіўна, бо вялікую колькасць сяброў БНФ складалі былыя камуністы. Але не для таго мы скідвалі “камуністычнае ярмо” і аддавалі свае сэрцы, думкі, і ўрэшце – жыцці новым дэмакратычным ідэалам, каб зноў пяяць пад чужую дудку – і не важна, што гэтая песня ўжо будзе гучаць на мілай сэрцу беларускай мове і пяяцца пра дэмакратыю.

У чэрвені 1990 г. адбылася Устаноўчая канферэнцыя першай беларускай партыі ў Беларусі пасля замацавання ў Канстытуцыі шматпартыйнай сістэмы і скасавання кіроўнай ролі камуністычнай партыі ў жыцці рэспублікі. Гэтай першай партыяй была Нацыянальна-дэмакратычная партыя Беларусі, у якой я стаў адным з трох сустаршыняў (старшынём) партыі. Мне і маім паплечнікам хацелася ўтварыць такую палітычную арганізацыю, дзе на першы план будуць высунуты ідэалы нацыянальнага адраджэння, дзе пытанні незалежнасці Беларусі, роднай мовы, гісторыі і культуры беларусаў будуць на першым плане, і заразам Беларусь будзе паступова станавіцца дэмакратычнай, еўрапейскай дзяржавай.

Услед за намі ў 1990–1991 гг. сталі запаўняцца іншыя нішы – сацыял-дэмакратыі (партыя БСДГ на чале з М. Ткачовым), ліберальнай дэмакратыі (АДП – А. Дабравольскі), хрысціянскай дэмакратыі (БХДЗ – П. Сілка), была створаная сялянская партыя на чале з Я. Лугіным.

Аднак ні адна з гэтых партыяў не кінулася ў абдымкі БНФ, як гэта задумваў Пазняк. Нават сябра Зянона Міхась Ткачоў, які фактычна быў "камандзіраваны" Фронтам узначаліць Беларускую сацыял-дэмакратычную грамаду, не падтрымаў аб'яднаўчых памкненняў Пазняка. Больш за тое, менавіта М. Ткачоў стаў ініцыятарам іншага працэсу – стварэння блока партыяў. Ён прапанаваў стварыць звяз, альбо блок, з партыяў дэмакратычнага кірунку пад назвай "Новая Беларусь", у які ўсе партыі ўваходзяць як раўнапраўныя партнёры. Ідэя гэтая мне спадабалася, і пры сустрэчы з Міхасём Ткачовым мы, узгадніўшы нашы пазіцыі, пачалі працу над новай структурай. Была восень-зіма 1991–1992 гг.

Зянон Пазняк вельмі хваравіта ўспрыняў гэтую навіну. Ён выступіў у друку, дзе ў вельмі рэзкіх словах выказаўся супраць свайго былога сябра Ткачова. Пачаўся моцны прэсінг на ўсе палітычныя партыі, якія падтрымалі ідэю "Новай Беларусі". Тут адыграў ролю яшчэ і той факт, што амаль усе лідэры і сябры маладых партыяў былі і сябрамі БНФ.

Гэты крок Пазняка хутка даў вынікі – блок "Новая Беларусь" распаўся. НДПБ выйшла з яго, а тыя сябры, што яшчэ стаялі на раздарожжы, таксама не падтрымалі ініцыятывы. Толькі старшыня Сялянскай партыі Яўген Лугін праявіў ваенны характар (ён быў падпалкоўнік у адстаўцы) і не паддаўся на атаку калег з БНФ. Не паддаваўся і я, але будучы толькі адным з старшыняў, цалком уплываць на палітычны курс партыі, зразумела, не мог. У выніку, у НДПБ узніклі унутраныя супярэчнасці, пачаліся ўзаемныя абвінавачванні, сваркі, якія на канец 1992 г. прывялі да расколу партыі. І ў 1993–1994 гг. існавалі

дзве незалежныя арганізаваныя структуры пад назвай НДПБ, якія добрую частку сваёй актыўнай дзейнасці прысвячалі беганню ў Мін'юст для высвятлення пытання – "хто з нас сапраўдная НДПБ?". Як ведама, наш шлях шуканняў праўды ў Мін'юсце паўтарылі пазней прадстаўнікі іншых партыяў, і самога БНФ. Каб развязаць тупіковую сітуацыю, мы пайшлі тады на цвёрды крок – спачатку быў створаны аргкамітэт, а потым прайшоў (у сакавіку 1994 г.) устаноўчы з'езд новай партыі – Беларускай нацыянальнай партыі, дзе я быў абраны старшынём.

Услед за НДПБ – з тае ж прычыны нязгоды з курсам Пазняка на ўзурпацыю ўлады – раскалолася Беларуская Хрысціянска-дэмакратычная злучнасць (БХДЗ). У выніку ўтварылася незалежная ад БНФ БХДЗ (П. Сілка) і "фронтаўская" Беларуская хрысціянска-дэмакратычная партыя (БХДП), якой кіравалі Юры Хадыка, Людміла Пеціна, а старшынём быў абраны прафесар Мікалай Крукоўскі.

Усе гэтыя падзеі адбываліся ў першай палове 90-х гг. мінулага стагоддзя. Так і не дабіўшыся аб'яднання партыяў у сваіх шэрагах, БНФ, тым не менш, колькасна і якасна рос. І да новых выбараў у Вярхоўны Савет 1995 г. фракцыя БНФ у беларускім парламенце (на працягу добрых пяці гадоў!) была найярчэйшай, найадукаванейшай і сама ўплывовай структурай Вярхоўнага Савета. З БНФ ды іншымі партыямі ў тыя часы лічыліся, да іх меркаванняў прыслухоўваліся на ўсіх дзяржаўных і грамадскіх роўнях. І галоўнае – палітыка беларусізацыі, ініцыяваная БНФ, пачала даваць адчувальны плён.

Каб не быць галаслоўным, прытачу прыклад з уласнага досведу. У тыя часы я працаваў выкладнікам інфарматыкі ў тэхналагічным інстытуце (БДТІ) (ад 1993 г. – універсітэце). З 1991 г. я выкладаў свой прадмет па-беларуску. І магу засведчыць, што мноства асістэнтаў, дацэнтаў і прафесараў перайшлі ў тыя гады на беларускамоўнае выкладанне розных тэхнічных і гуманітарных дысцыплін. Пры нашым

інстытуце існаваў нават грамадскі універсітэт беларускай мовы, гісторыі і культуры, рэктарам якога быў адданы беларускай справе чалавек – доктар тэхнічных навук Аляксей Андрэевіч Саламонаў.

Усё гэта адышло ў нябыт. Няма ўжо таго грамадскага універсітэта, амаль знікла выкладанне на беларускай мове і ў тэхналагічным, і ў іншых інстытутах ды універсітэтах. А мэта беларускіх патрыётаў была амаль дасягнутая, і на дзяржаўным роўні. Але адкат быў імклівы, і ровень беларусізацыі, відавочна, хутка перасягнуў па мінусе той вельмі нізкі ровень ужывання беларускай мовы, што быў "дасягнуты" на канец 1980-х гг. – пачатак перабудовы.

Тады, у 1990-я, усё выглядала інакш. БНФ уплываў фактычна на ўсю дзяржаўную палітыку ў сферы культуры і асветы. І не толькі ў гэтай сферы. Цяпер амаль што забыты праект Балтыйска-Чарнаморскага калектара, які гарантаваў энергетычную незалежнасць Беларусі ад Расіі. Праект абмяркоўваўся на найвышэйшых роўнях, праводзіліся навуковыя і практычныя канферэнцыі на гэтую тэму, іншыя мерапрыемствы, аднак рэальнасць аказалася цалком інакшай.

***Першыя страты БНФ.*** Разам з узрастаннем папулярнасці БНФ і замацаваннем поспехаў, яшчэ ў той "зорны" час пачаліся і страты. У 1992 г. перасталі выходзіць "Навіны БНФ" – першая франтаўская газета, створаная ў 1988 г. як выданне арганізацыйнага камітэта. Прычына была да банальнасці простая. Першы і нязменны рэдактар "Навінаў" Алесь Суша адмовіўся пісаць пад дыктоўку Зянона Пазняка, не захацеў ператвараць газету ў чыста партыйнае выданне. За што і быў звольнены. Правіла, што "на ўсякае месца заўсёды знойдзецца чалавек і пуставаць месца не будзе", тут дало асечку. Спроба Юры Хадыкі ачоліць газету не дала вынікаў – тая знікла.

У гэтыя ж часы з БНФ фактычна разарваў Валеры Сядоў, які быў у 1989–1992 гг. ведамым актывістам Фронту і такім чынным, што апынуўся ў турме – у

славутай Валадарцы. Арышт выклікалі падзеі 7 лістапада 1991 г., калі на святочным мітынгу на заклік Пазняка вялікі натоўп народу рушыў да помніка Леніну на плошчы Незалежнасці, каб ускласці праВадыру "дары" – калючы дрот, фуфайку і іншыя атрыбуты Гулагу. Зянон Пазняк нічым не дапамог свайму калегу па Фронце, хоць як дэпутат меў пэўныя мажлівасці. Фактычна ён адцураўся ад Валеры, дбаў больш пра сваю рэпутацыю, "мала што натварыў Сядоў..." Толькі ўмяшанне дыпламатаў ЗША выратавала тады Валеру Сядова ад турмы, а можа, і ад смерці, якой мог скончыцца няўдалы выхад з галадоўкі.

Непаразуменні паміж актывістамі БНФ і Зянонам Пазняком рэзка ўзмацніліся пасля паразы БНФ на выбарах у Вярхоўны Савет у 1995 г. Над Фронтам навісла пагроза расколу. Новыя рэаліі змусілі многіх з нас прыхаваць рамантыку беларусізацыі, культурнага і нацыянальнага адраджэння, а таксама дэмакратыі да лепшых часоў. Час ідэй знікаў, заступаючы месца жорсткаму прагматызму. У палітыку літаральна "біліся" новыя людзі, а хуткая эвалюцыя прэзідэнцкай формы кіравання да звычайнай дыктатуры канчаткова падзяліла грамадства на дзве часткі, адна – гэта прэзідэнт, людзі прэзідэнта і яго электарат, другая – усе тыя, хто не захацеў увайсці ў прэзідэнцкую "капэлу" і "застаўся спяваць у самадзейных калектывах" пад назвай палітычныя партыі апазіцыйнага кірунку, а таксама – у грамадскіх арганізацыях з таямнічай назвай NGO.

Нягледзячы на выказаныя заганы, усю першую палову 1990-х гг. БНФ заставаўся галоўным суб'ектам беларускай палітыкі. Выразна акрэсліліся мэты Руху БНФ на III з'ездзе (29–39 траўня 1993 г.), на якім акрамя замацавання нацыянальна-дэмакратычнай праграмы былі развітыя таксама канстытуцыйныя прынцыпы, прынцыпы замежнай палітыкі, і асаблівая ўвага была скіраваная на распрацоўванне геапалітычных прыярытэтаў рэспублікі Беларусь. БНФ быў галоўнай арганізацыяй у стварэнні кан-

цэпцыі Балтыйска-Чарнаморскага калектара, якая так і засталася на паперы да гэтай пары.

На тым самым з'ездзе 1993 г. на аснове Руху БНФ узнікла партыя Беларускі Народны Фронт (БНФ). Гэты крок выкліканы патрэбаю юрыдычнага замацавання БНФ у грамадска-палітычным жыцці Беларусі напярэдадні парламенцкіх выбараў.

***БНФ пасля 1996 года.*** Працэс фармавання палітычна структураванага грамадства скончыўся ў 1996 г. "Кішэнныя" партыі, як кпіў з нас Зянон Пазняк яшчэ ў 1991 г., сапраўды так і засталіся кішэннымі. Але, як нечакана сталася, не нашмат ад іх стаў розніцца і БНФ. Ведама, БНФ на той час станавіў сабой добрую, структураваную арганізацыю, якая абымала практычна ўсе раёны Беларусі. Але, з іншага боку, ён перастаў мець такі ўплыў на палітычныя працэсы, які быў характэрны для ранняга перыяду, звязанага з удзелам фронтаўцаў у працы Вярхоўнага Савета 12-га склікання.

Яшчэ адным важным момантам было спыненне беларусізацыі і пачатак новай фазы русіфікацыі, што пачалася пасля рэферэндумаў, ініцыяваных Лукашэнкам у 1995–1996 гг. І ў гэтых новых рэаліях БНФ застаўся абсалютна незапатрабаваным. Раптам выявілася, што тыя высакакласныя спецыялісты, навукоўцы, мастацкія і культурныя дзеячы, якімі так ганарыўся Фронт, – зусім не запатрабаваныя і непажаданыя ў той Беларусі, якая пачала адбудоўвацца пасля 1996 г.

Найпарадаксальнейшымі ў гэтай сумнай рэчаіснасці, і для БНФ і для ўсяе, ужо зарыентаванай на дэмакратыю, часткі Беларусі, былі паводзіны лідэраў БНФ, і перадусім Зянона Пазняка. Замест таго, каб зрабіць патрэбныя высновы, прааналізаваць прычыны паразы і распачаць сур'ёзную працу над выпраўленнем памылак – што вы думалі робіць Пазняк? Ён арганізуе маштабную акцыю прымання грамадзян Беларусі ў няісную краіну Беларуская Народная Рэспубліка (БНР) з выдаваннем грамадзянскіх пашпар-

тоў! Далібог, калі б гэта была нейкая піянерская гульня, накшталт "Зарніцы", то нічога, хай сабе. Але ж дарослыя дзядзькі і цёткі, дацэнты і прафесары запаўняюць бланкі ды анкеты і потым з замілаваннем прыціскаюць да сэрца "пашпарт грамадзяніна БНР", у той час як у краіне ўпэўнена набірае сілу дыктатура і недалёка арышты і зняволенні актывістаў БНФ. Дарэчы, менавіта такое стаўленне да гэтай шызоіднай ідэі Пазняка было ў мяне і ў той час, калі разгортвалася гэтая "акцыя". Тады я быў супакоены толькі тым, што не ўваходжу ў аніякія бээнэфаўскія кіраўнічыя органы – шараговы сябра! А вось як старшыня Беларускай нацыянальнай партыі магу і выказаць свае пагляды. Што, дарэчы, я і зрабіў у артыкуле "Навошта БНФ загубіў нацыянальную ідэю?", надрукаваным 1 красавіка 1996 г. у газеце Івана Каравайчыка "Здравый смысл".

Праглядаючы сёння змест тае нататкі, проста цешышся, як усё там дакладна сказана. Мае прагнозы цалкам спраўдзіліся, хоць я тады яшчэ не ведаў, што і БНФ раздзеліцца і З. Пазняк выедзе за мяжу. З адным я, праўда, не пагаджуся цяпер – з загалоўкам артыкула. Бо БНФ нацыянальную ідэю не загубіў, не ўсё рабілася так, як трэба, але ж у галоўным Фронт заставаўся верным сваім ідэалам. Зрэшты, калі перанесціся праз гады, у нашыя часы, дык у вялікай ступені тая крытыка для цяперашняга Фронту будзе не лішняй.

А тады, ужо з першых гадоў кіравання Аляксандра Рыгоравіча, пачаўся чынны наступ на БНФ і іншыя партыі дэмакратычнага кірунку. Не помню, з якога моманту, але цяпер усе гэтыя арганізацыі завуцца – апазіцыяй.

Пераломны час пераходу ад парламенцкай формы кіравання краінай да прэзідэнцкай завершыўся не толькі абраннем А. Р. Лукашэнкі на пасаду прэзідэнта, але і змяненнем Канстытуцыі РБ, якая дазволіла прэзідэнту атрымаць неабмежаваную ўладу і сканцэнтраваць у сваіх руках усе дзяржаўныя, зака-

надаўчыя і судовыя органы. На знак пратэсту людзі выходзілі на вуліцы гарадоў. Сама масавай акцыяй БНФ стаў “Чарнобыльскі шлях“, які праходзіў 26 красавіка 1996 г. на вуліцах Мінска і сабраў больш за 50 000 чалавек. Пачаліся рэпрэсіі. А лідэр БНФ Зянон Пазняк мусіў выехаць за мяжу.

Фронт застаўся “без галавы”. Наступіў працяглы і цяжкі крызіс БНФ, які завершыўся яго расколам на VI з’ездзе БНФ у верасні 1999 г. Узніклі дзве незалежныя палітычныя партыі, кожная з якіх (як некалі ў гісторыі з НДПБ) лічыла сябе сапраўдным Беларускім Народным Фронтам. Ні адна з іх упарта не хацела здаваць брэнда БНФ апаненту, а двум аднолькавым БНФ-ам Мін’юст не дазваляў існаваць. У выніку – адна партыя, тая, якую ўзначаліў Вінцук Вячорка, адбараніла юрыдычны статус і адпаведна назву БНФ, а другая, якая засталася вернай свайму куміру Зянону Пазняку, мусіла змяніць назву і стала Кансерватыўна-Хрысціянскай партыяй БНФ.

Пра БНФ напісана шмат і няма сэнсу паўтарацца яшчэ. Нас цікавіць толькі нацыянальная ідэя – як у практыцы, так і ў тэорыі. У гэтым пытанні БНФ выдатна паказаў сябе менавіта як практычная арганізацыя, і поспехі БНФ і яго прыхільнікаў у першай палове 1990-х гг. відавочныя. Яны выклікаюць вялікую павагу і нават захапленне – бо цяпер такога няма і блізка. Дайшло да таго, што чалавека, які гаварыў на беларускай мове, аўтаматычна ўважалі за “бээнэфаўца”.

### *Першая беларуская партыя. Стварэнне НДПБ*

Першай партыяй (калі не лічыць Камуністычную партыю Савецкага Саюза), створанай у нашай краіне пасля развалу СССР, была НДПБ – Нацыянальна-дэмакратычная партыя Беларусі. Устаноўчы з’езд яе адбыўся 23–24 чэрвеня 1990 г. – г. зн., яшчэ да абвяшчэння незалежнасці Беларусі. На той час існавала толькі адна “партыя” – Камуністычная партыя Беларусі (КПБ), філіял КПСС, аднак яе нельга



Устаноўчая канферэнцыя НДПБ.
У прэзідыуме сядзяць (злева направа) М. Цмыг, А. Емельянаў, В. Навуменка.

ўлічваць, бо КПСС была, фактычна, не партыяй, а моцнай дзяржаўнай структурай, што вызначала лёсы чалавечыя на прасторы Савецкага Саюза. Устаноўчыя з'езды наступных новых партыяў перабудоўчай хвалі адбыліся значна пазней – бліжэй да 1991 г. і пасля.

Стварэнне першай партыі ў Беларусі было сапраўдным выбухам, не абыякавай падзеяй, прыраўнальнай толькі да стварэння Беларускага Народнага Фронту, якое было на год раней – у траўні 1989 г. Але БНФ тады быў толькі "Рухам за перабудову", але ніяк не партыяй. Зразумела, што ўлады так узрушыліся фактам з'яўлення першай "самастойнай" партыі, што не ведалі, як рэагаваць на гэта. Мін'юсту трэба было зарэгістраваць яе. Але на падставе якіх параграфаў заканадаўства? Закон аб партыях у той час быў толькі на стадыі стварэння, ды і дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР была прынятая толькі 27 ліпеня 1990 г., а сам Саюз разваліўся яшчэ пазней. Высокія чыноўнікі працяглы час не ведалі, што з намі рабіць. І таму зразумела, чаму юрыдычная рэгістрацыя НДПБ адбылася на цэлы год пазней. Гэтая падзея адбылася 25 чэрвеня 1991 г.

Цікавы факт – у Беларускай энцыклапедыі пра НДПБ не сказана *ні слова*. Ёсць чамусьці тэкст пра

Нацыянальна-дэмакратычную партыю Польшчы, а пра сваю, беларускую партыю – ані слова! Упарта замоўчваюць гэта і партыйныя гісторыкі новай хвалі. Асабліва тыя, што заўсёды былі ворагамі ўсяго нацыянальнага і духовага – гэтак званыя лібералы, ідэолагі "чыста" дэмакратычнай партыі – "Аб'яднанай грамадзянскай партыі". Для прыкладу я спамяну не так даўно выдадзеную кнігу: "Политические партии. Беларусь и современный мир" (Мінск, 2005). Сумнае ўражанне выклікае памянёная кніга. Гэтулькі няпраўды напісана, нават няёмка за аўтараў, некаторыя з якіх мне знаёмыя. Усе веды пра НДПБ аўтараў памянёнай кнігі зводзяцца толькі да той акалічнасці, што для ўступлення ў партыю патрабавалася веданне беларускай мовы. І больш нічога!

Ні словам у кнізе не сказана і пра заступніцу НДПБ – Беларускую нацыянальную партыю (БНП), што існавала з 1994 да 1999 г. Нават у раздзеле "Другие партии" пішацца чамусьці пра "Правы рэванш", якога насамрэч не было, а была толькі ідэя паэта Славаміра Адамовіча з памянёнай назвай; пішацца пра Мінскую арганізацыю "Рускага нацыянальнага адзінства" – арганізацыя, якая наагул да Беларусі не мае дачынення; пішуць аўтары "опуса" нават пра нейкую партыю дурняў. (Прыём "затуманьвання" незразумелы толькі дурням!) А пра нацыянальна-адраджэнцкія партыі – маўчок, быццам іх і не існавала.

А такія партыі былі, і побач з Беларускім Народным Фронтам таксама рабілі сваю справу ў нацыянальным адраджэнні Беларусі. Была НДПБ (1990–1999), потым – Беларуская нацыянальная партыя (БНП) (1994–1999 гг.), партыя, што ўтварылася пасля расколу НДПБ у 1992 г. На нацыянальных пазіцыях стаяла Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада на чале з Міхасём Ткачовым, Беларуская сялянская партыя (Я. Лугін), Беларуская хрысціянска-дэмакратычная злучнасць (П. Сілка) і незарэгістраваная партыя Свабоды (С. Высоцкі).

Сваёй мэты – ліквідацыі беларускай нацыянальнай ідэі і ўціскання ўсяго нацыянальнага беларуска-

га адраджэння – лібералы розных масцей практычна дасягнулі. У гэтым ім дапамагала і дзяржаўная палітыка, у выніку якой пасля славутага рэферэндума 1995 г. адкрыліся ўсе шлюзы ўціску парасткаў беларускасці. На час напісання гэтых радкоў (восень 2006 г.) у Беларусі няма адзінага нацыянальна-адраджэнцкага руху. Няма ні НДПБ, ні БНП. Нават БНФ існуе ў двух розных, амаль варожых, формах – БНФ В. Вячоркі і КХП-БНФ З. Пазняка. "Пяцёркі" і "Дзесяткі" займаюцца імітацыяй палітычнай працы, скіраванай на псеўдазаданне – выбары новага прэзідэнта.

На пачатку ж 1990 г. сітуацыя выглядала зусім інакш. Нацыянальная ідэя, беларусізацыя, беларуская мова і беларуская адукацыя былі тады рэальнымі аб'ектамі грамадскага жыцця. Вакол гэтых каштоўнасцяў віравала жыццё, рабілася палітыка, ствараліся і працавалі партыі ды грамадскія арганізацыі. І НДПБ займала далёка не апошнюю пазіцыю ў гэтых працэсах, а ў многіх пытаннях, пра якія я раскажу пазней, была галоўнай.

Дык як жа ўсё гэта адбывалася? І чаму пра НДПБ – партыю, якая ўзяла на сябе ўвесь цяжар першапраходцы, – цяпер нават не спамінаюць ні ў афіцыйным друку, ні ў асяроддзі ліберальных дэмакратаў?

Другое пытанне, я думаю, чыста рытарычнае, і пасля знаёмства з дадзенай кнігай чытач знойдзе адказ сам. А вось пытанне першае, на мой пагляд, мае права на існаванне.

Ідэя стварэння партыі нацыянальна-дэмакратычнага кірунку ўзнікла яшчэ ў 1989 г. Дакладней, яна крышталізавалася ў маіх думках (можа, і яшчэ ў каго, але пра іншых не ведаю) у час Устаноўчага з'езду Беларускага Народнага Фронту 18 траўня 1989 г. у Вільні. А калі мы ехалі ад літоўцаў на легкавушцы назад у Мінск, гэтыя ідэі ўпершыню былі агучаныя там, у салоне машыны. Так, БНФ быў найпрагрэсіўнейшай, найрадыкальнейшай арганізацыяй у Беларусі, але ён аб'ядноўваў людзей вельмі розных паглядаў, часам процілеглых. У асяроддзі Фрон-

ту вылучаліся дзве галоўныя групы: адна злучала прыхільнікаў дэмакратыі і ліберальных каштоўнасцяў, другая ставіла на першы план нацыянальнае адраджэнне і незалежнасць сваёй рэспублікі. Мяне больш за ўсё цікавіў лёс Беларусі, шлях яе народа як нацыі, будучыня яе мовы і культуры. Гэтае кола праблемаў было прадметам цікавасці і невялікага кола нацыянальна сведамых супрацоўнікаў Беларускага тэхналагічнага інстытута, дзе я тады працаваў выкладнікам інфарматыкі. У выніку, прыкладна ў студзені 1990 г., быў створаны першы дакумент будучай партыі, які атрымаў назву "Дэкларацыя". У мяне захаваўся асобнік дакумента на рускай мове, з якім я паехаў пазней на канферэнцыю МАДА (Міжнароднай асацыяцыі дэмакратычных арганізацыяў) 2 лютага 1990 г. у Вільню. Мне ён падаецца цікавым і прывяду яго цалкам:

Декларация

*Национально-демократической Белорусской партии (НДПБ)*

*Белоруссия оказалась на грани полного упадка и быстрого исчезновения с мировой арены. Продолжительное господство КПСС во всех сферах нашей жизни привело к расколу нашего общества на две части: партийную мафию с одной стороны и бесправных граждан с другой стороны. В результате антидемократической политики командно-административной системы мы получили такое явление, как национальный нигилизм. И, как нигде в СССР, в Белоруссии пренебрежение ко всему национальному достигло опасной черты.*

*Поэтому мы, возрождая основные принципы Белорусской Социалистической Громады (БСГ) начала XX века, объединяемся в НДПБ с целью:*

*– содействовать образованию независимого демократического Белорусского государства;*

*– демократизации всех сфер жизни Белоруссии с целью осуществления принципов правового государ-*

*ства в соответствии со Всеобщей Декларацией прав человека;*

*– содействовать передаче земли мелким собственникам (фермерам, кооператорам и т.д.). передаче лесов, озер, недр в полную собственность белорусскому народу;*

*– за разгосударствление собственности на промышленные предприятия, развитие рыночных отношений и передачу предприятий в аренду, а также во владение производственным коллективам;*

*– возрождение народных белорусских обычаев, традиций, религиозных обрядов; приоритетного использования белорусского языка во всех областях жизни, расцвета белорусской культуры, возвращению белорусам исторической памяти и национального сознания.*

*НДПБ относится с уважением ко всем другим партиям и взглядам, стремится к защите своих интересов в честной и открытой борьбе.*

*Оргкомитет НДПБ*

Тэкст падпісалі: А. Астапенка, У. Кулажанка, М. Цмыг. Пазней Мікола Цмыг адышоў ад палітыкі, прафесар У. Кулажанка і цяпер ведамы як беларускі эканаміст і палітык.

МАДА – першая буйная акцыя на прасторы Савецкага Саюза ў часы гарбачоўскай перабудовы, якую ладзілі не камуністы, а дэмакраты і нацыяналісты. Беларусь (у той час БССР) у Вільні заступалі некалькі чалавек ад БНФ (Артур Вольскі, Юры Хадыка, Дыяна Мікульская і аўтар гэтых радкоў). На рэгістрацыі я падаў памянёную вышэй “Дэклярацыю” і быў зарэгістраваны ўжо як заступнік НДПБ.

Цікавая гэта была каферэнцыі, і не менш цікавы склад яе ўдзельнікаў. У лютым 1990 г. Савецкі Саюз трашчаў па швах, паўсюль ствараліся Народныя франты, іншыя арганізацыі дэмакратычнага кірунку. Дык на канферэнцыі былі: народныя франты, што ўзніклі практычна ўва ўсіх саюзных рэспубліках і, больш за тое, быў, прыкладам, Народны Фронт г. Варонежа,

Народны Фронт Татарстана і г. д. Былі, наагул, экзатычныя арганізацыі, накшталт асацыяцыі горскіх народаў Каўказа. Упершыню тады я пазнаёміўся з знакамітымі расійскімі дэмакратамі: масквічом Афанасьевым, пецярбургскай француженкай Салье. З'яўленне такой партыі, як НДПБ на віленскім форуме ўспрынялося ў той час вельмі натуральна.

Такім парадкам, фундамент будучай партыі быў закладзены. Ідэя стварэння партыі нацыянальна-дэмакрычнага кірунку пачала гучаць зімой і вясной 1990 г., штораз то часцей. Ідэю НДПБ падтрымаў мой найлепшы сябра Віктар Навуменка. Высветлілася, што вельмі падобныя думкі ў сакратара БНФ паэта Алеся Емельянава. У сваім 306-м пакоі Дома літаратара ў той час А. Емельянаў выконваў ролю каардынатара суполак БНФ, якія пасля ўстаноўчага з'езду імкліва множыліся. Частка людзей, што прыходзілі тады на Фрунзэ, 5, таксама падзялялі нашы пагляды – так што ўрэшце быў створаны сталы аргкамітэт і пачалася праца па стварэнні партыі нацыянальна-дэмакратычнага кірунку.

Акрамя работнікаў Дома літаратара да нашай дзейнасці спрыяльна ставіліся і супрацоўнікі, і кіраўніцтва тэхналагічнага універсітэта. Рэктар, Іван Міхайлавіч Жарскі, падтрымліваў працэс беларусізацыі. Тым, хто выкладаў на беларускай мове, нават дадаткова выплачвалі 10% ад зарплаты, сам прафесар І. Жарскі ўваходзіў у раду ТБМ. Хто б мог тады нават уявіць, што настане час і беларускамоўны выкладнік стане непажаданым і ў інстытутах, і ў універсітэтах Беларусі. Мала таго – усякі беларускамоўны чалавек ў нашай краіне скора стане аўтаматычна апазіцыянерам і ненавісным бээнэфаўцам.

24–25 чэрвеня 1990 г. у сценах БТІ адбылася ўстаноўчая канферэнцыя НДПБ – Нацыянальна-дэмакратычнай партыі Беларусі, першай партыі ў БССР (зразумела, не лічачы КПБ), паклаўшы пачатак стварэнню шматпартыйнай сістэмы.

На ўстаноўчую канферэнцыю партыі прыехалі заступнікі не толькі з розных куткоў Беларусі, але і з іншых рэспублік. Рэч у тым, што тады яшчэ не існавала незалежных савецкіх рэспублік, мы жылі ў адзіным "непадзельным" Савецкім Саюзе. З Масквы прыехаў заступнік расійскіх беларусаў Алесь Драянкоў (старшыня Беларускага Таварыства), былі заступнікі з Рыгі, Літву заступаў ведамы і цяпер дзеяч культурнага беларускага жыцця Хведар Нюнька. Цікавая акалічнасць – разам з Нюнькам прыехаў на канферэнцыю легендарны беларус Лявон Луцкевіч – сын знакамітага нацыянал-дэмакрата XX ст. Антона Луцкевіча, стваральніка Беларускай сацыялістычнай грамады – першай партыі ў Беларусі пачатку XX ст. Драянкоў і Нюнька спачатку ўвайшлі нават у кіраўніцтва партыі і некаторы час (да прыняцця Закона аб партыях) прыязджалі на паседжанні найвышэйшага кіраўнічага органа партыі – Вышняй Рады.

На канферэнцыі былі прынятыя "Статут" партыі і "Асноўныя праграмныя прынцыпы". Меркавалася, што разгорнутая праграма будзе прынятая пазней. Прынялі таксама тры ўхвалы ("Аб адносінах да палітычных партыяў, грамадскіх арганізацыяў ды рухаў", "Аб адносінах да КПСС-КПБ", "Аб нацыянальных адносінах на Беларусі") і два звароты: "Да Вярхоўнага Савета БССР" і "Да грамадзянаў Беларусі і Замежжа".

Не выклікала пярэчанняў прэамбула ў Статуце НДПБ: "НДПБ – самастойная незалежная грамадска-палітычная арганізацыя, якая аб'ядноўвае аднадумцаў, што змагаюцца за нацыянальнае Адраджэнне, дэмакратызацыю, палітычную, эканамічную і культурную самастойнасць нашага народа". Але аб пытанні сяброўства ў партыі разгарэліся спрэчкі. У выніку – пагадзіліся на фармулёўцы: "Сябрам НДПБ можа быць любы грамадзянін Беларусі ці іншай дзяржавы (*як бачым, яшчэ няма Закона аб партыях – не забаронена сяброўства іншаземных грамадзян – А.А.)* незалежна ад месца жыхарства, які валодае

беларускай мовай і ўсведамляе сябе беларусам...". Вось гэтае апошняе "ўсведамляе сябе беларусам" і выклікала вялікую спрэчку. Што значыць "усведамляе"? Дарэчы, шмат пазней, вывучаючы тэорыю нацыяў, я здзіўляўся нашай празорлівасці ў дачыненні да гэтага пункта, бо ў сучасным разуменні нацыі вялікую ролю адыгрывае менавіта "ўсведамленне", сведамая прыхільнасць індывіда да пэўнай групы грамадзян, што ўтвараюць яе. Аднак усведаміць сябе беларусам могуць і не карэнныя беларусы, душою палюбіўшы наш край і мову. І, відавочна, няма падстаў адмовіць ім зваться беларусамі, калі іх быццё цалкам злілося з Беларуссю. Аднак паводле гэтага крытэра можна зайсці і надта далёка, бо ў становішчы патрыёта Беларусі можа апынуцца і чарнаскуры выхадзец з Танзаніі. На маю думку, нельга ў такіх выпадках рабіць адназначных і канчатковых прысудаў, нельга ўсе мажлівая варыянты чалавечага існавання як Божага тварэння зводзіць у адзін жорсткі, "пракрустаў ложак".

Цікавы змест ухвал, прынятых на канферэнцыі. Вельмі паказальнай для атмасферы таго часу мне падаецца "ўражвальная" ўхвала "Аб адносінах да КПСС-КПБ". Цытую вытрымку:

*Праз усе гады сваёй кіруючай ролі КПСС-КПБ даказала сваю антыгуманную існасць...*

*...На яе рахунку мільёны чалавечых жыццяў. На яе рахунку забойства чалавечае душы!...*

Паводле Статута меркавалася абраць трох старшыняў (сустаршыняў) партыі і Вышнюю Раду. Але гэтага не адбылося, была толькі абраная часовая Каардынацыйная Рада (замест Вышняй Рады) з 9 чалавек, на якую і ўсклалі клопат абрання старшыняў. Паводле рашэння Каардынацыйнай Рады першымі часова абранымі (да наступнай канферэнцыі партыі) старшынямі НДПБ былі Алесь Емельянаў, Францішак Швайбовіч (адказны за моладзь) і Анатоль Астапенка. Абралі таксама старшыню Мінскай гарадской арганізацыі, майго блізкага сябра Віктара Навуменку.

Цяпер, мне здаецца, што нягледзячы на незарэгістраванасць партыі – цэлы год – дзейнасць наша была досыць такі прыкметнай з'явай у грамадстве.

Але такі склад кіраўніцтва партыі пратрымаўся нядоўга, неўзабаве разгарэўся скандал з Алесем Емельянавым.




Прэсканферэнцыя палітычных партыяў з нагоды здачы падпісных лістоў за адстаўку Вярхоўнага Савета ў 1992 годзе

*Алесь Емельянаў*

Высокі, прыгожы, з даўгімі льнянымі валасамі і летуценна-блакітнымі вачыма паэт Алесь Емельянаў ніяк не выглядаў на партыйнага функцыянера ў той ужо далёкі 1990 год, калі ствралася Нацыянальна-дэмакратычная партыя Беларусі. Да прыходу ў палітыку Алесь быў ведамы як паэт і сакратар Саюза пісьменнікаў, які меў знакамітае рабочае месца ў пакоі № 306 на вуліцы Фрунзе, 5. Гэты пакой добра ведалі ў 1989–1990 гг., бо там быў сапраўдны цэнтр нацыяналізму і дэмакратыі – там віравала жыццё, туды прыносілі заявы ў БНФ і там ствралася НДПБ.

Алесь Емельянаў быў не толькі паэтам. У яго выявіліся яскравыя арганізатарскія і, больш за тое, аратарскія здольнасці. Таму хоць на Устаноўчай канферэнцыі і не абіраўся старшыня партыі, звонку падавалася, што Алесь і ёсць лідэрам партыі. Толькі потым

былі абраныя тры старшыні (сустаршыні) партыі: А. Емельянаў, Ф. Швайбовіч і аўтар гэтых радкоў.

Неяк увосень 1991 г. нечакана мне патэлефанаваў "сам" Зянон Пазняк. Тады ён быў, як той казаў, на вяршыні свае славы і моцы – ачольваў БНФ і кіраваў вельмі ўплывовай на той час фракцыяй БНФ у Вярхоўным Савеце. Тады наша стычнасць з БНФ (як мая, так і ўсёй НДПБ) не была шчыльная, а сустрэчы насілі эпізадычны характар. Пазняк лічыў, што ўсе дэмакратычныя партыі, створаныя па-за Фронтам, "няправільныя", яны – паводле ягонага выразу – "кішэнныя" і павінны ўвайсці ў склад БНФ як у войску роты ўваходзяць у дывізію.

Пазняк паведаміў: адбылася надзвычайная падзея – Алесь Емельянаў у сваім інтэрв'ю газеце "Свободные новости" прызнаўся, што ў свой час быў пазаштатным супрацоўнікам КДБ. Артыкул у СН так і называўся: "Я был сексотом КГБ". А Алесь Емельянаў тады быў не толькі лідэрам НДПБ але і сябрам Сойма Фронту. Таму гэта была пляма і на ўвесь Беларускі Народны Фронт, які меў вялізарны аўтарытэт. Рэакцыя Пазняка была страшэнная. Але расправіцца з Емельянавым ён задумаў толькі праз НДПБ. Хоць пры размове з намі Зянон абяцаў вывесці Алеся з Сойма першым, але пасля нашай "экзекуцыі" над Емельянавым, Пазняк не прыняў па гэтым пытанні аніякіх захадаў. У гэтым і праявілася манера Зянона Пазняка "выходзіць чысценькім" з крытычных, часамі брудных, сітуацыяў. Аднак тады не ўсё было так відавочна, як сёння.

Успамінаю – мы былі ўсе ў шоку. І адрэагавалі на "прызнанні" вельмі станавіта. Алеся выкінулі з сустаршыняў і складу Вышняй Рады. На надзвычайнай канферэнцыі, дзе адбывалася гэтая "экзекуцыя", Емельянаў падаў заяву аб выхадзе з партыі наагул. У сваім заключным слове на канферэнцыі ён так патлумачыў свае паводзіны: "Я хацеў выціснуць з сябе раба. Дагэтуль я быў, як і ўсе, рабом савецкага рэжыму, я быў завербаваны спецслужбамі, як і мно-

гія ў тыя гады, бо над намі панавала жорсткая таталітарная сістэма, дзе сачэнне за кожным – норма. І я хачу пакаяцца ў гэтым, я хачу стаць свабодным, я хачу скінуць з сябе ланцугі гэтай сістэмы".

Прыраўнальна нядаўна, халоднай восенню 2005 г., Алесь Емельянаў памёр у роднай вёсцы ў поўнай адзіноце. Яго скачанелы труп знайшлі толькі на трэці дзень па смерці.

Я напісаў некалькі радкоў памяці А. Емельянава. Успомніў і пра памянёныя падзеі. Прывяду тэкст, якім канчаўся артыкул:

"Тады Алеся не зразумелі. Відавочна, на той момант не прыйшоў яшчэ той час, калі грамадства стане здольным прыняць пакаянне сваіх членаў і калі яно стане здольным бачыць у людзях не вонкавы бляск і паказны гераізм, а прыняць і ўбачыць нутраную сілу і веліч натуры.

Праз прызму 15-ці гадоў, што мінула з тых часоў, я зноў і зноў пракручваю ў думках стужку тых падзей і задаюся пытаннем, а ці зразумелі б мы Емельянава цяпер? Ці прынялі б мы цяпер ягоную ахвяру каяння? І сам сабе даю адказ: "Не!" Не зразумела б наша грамадства яго і цяпер, бо не відаць у нашай краіне тых духовых зрухаў, аб якіх мы марылі на пачатку 90-х гг. мінулага стагоддзя. Не прыйшоў яго час дагэтуль...

Мне думаецца, што Алесь Емельянаў пайшоў ад нас не цяпер, у 2005 г., а нашмат раней – у той памятны і заломлівы для яго 1991 год. Ён не здолеў вытрымаць таго адчужэння, што стала вынікам яго ўчынку. Ягоную ахвяру мог прыняць толькі Сам Хрыстос, але ён "прыйшоў да сваіх, і свае Яго не прынялі" (Ян, 1: 11).

Перакрочыўшы невядомую мяжу, ён у той час раптам пачаў імкліва аддаляцца ад рэчаіснасці. Емельянаў знік з палітыкі, знік і з паэзіі. Ён лічыў, можа, і трохі самаўпэўнена, але не без падстаў, што мы ўсе не дараслі яшчэ да ўсведамлення велічы і самаахвярнасці ягонага ўчынку. Але ж ці магло б быць інакш ў

тым асяроддзі хоць і новаспечаных нацыянал-дэмакратаў, але, у існасці, усё тых жа саўкоў?

І цяпер я спадзяюся, што яго ахвяра прынятая, і нарэшце здзейснілася сказанае: “Праўду кажу табе: сёння ж будзеш з’ Мною ў раі”. (Лука, 23: 43).

*Мікола Ермаловіч*



Мікола Ермаловіч, творы і дзейнасць якога цяпер сталі ўжо гісторыяй, атрымаў ведамасць толькі с пачаткам гарбачоўскай перабудовы, пасля таго, як стала мажлівай легалізацыя дэсідэнцкай і наагул рознай неадпаведнай савецкім стандартам дзейнасці. Гэты час настаў у СССР, як ведама, у канцы 80-х і пачатку 90-х гг. XX ст. і пракаціўся хваляй па ўсёй прасторы Савецкага Саюза, не прамінуўшы і Беларусі.

Аднак, да гэтага бурлівага часу нацыянальнага адраджэння і руху за свабоду ды правы чалавека найбольш непакорлівыя і сумленныя даследнікі-навукоўцы і літаратары працавалі ў падзем’і і друкавалі свае геніяльныя творы самвыдатам. За гэта шмат каго пераследавалі, кідалі ў псіхушкі і ў турмы ці звальнялі з працы і ставілі ў умовы існавання на мяжы выжывання, жыцця “бамжа” і выгнанца.

Такім непрызнаным навукоўцам быў і гісторык Мікола Ермаловіч, які першы зняпраўдзіў міф аб літоўскай заваёве беларускага насельніцтва ў часы ВКЛ. Не маючы доступу да афіцыйнай універсітэцкай кафедры, М. Ермаловіч працаваў простым настаўнікам і ўвесь вольны час прысвячаў свайму ўлюбёнаму занятку – даследаванню старажытнай беларускай гісторыі. Яго творы ў 70– 80-х гг. XX ст. “хадзілі па руках” у рукапісным выглядзе. Яны перадрукоўваліся, ксеракапіяваліся, пра іх ведалі ўсе

падпольныя беларускія “нацыяналісты” і дэсідэнты.

Не прамінула сустрэча з творчасцю Міколы Іванавіча і мяне. Беларушчына, як хобі, даўно захапляла мяне, фізіка-тэарэтыка з адукацыі і роду заняткаў. Вірус нацыяналізму пасяліўся ў маёй душы даўно, і ўсё, што было звязана з беларускай гісторыяй і культурай, не прамінала мяне. Добра, што побач з Інстытутам фізікі была бібліятэка АН БССР, дзе было шмат цікавага, асабліва ў аддзеле рэдкай кнігі, куды хоць і з цяжкасцю, але трапіць можна было. Таму не дзіва, што на пачатку 1980-х гг. у неафіцыйных акадэмічных колах, “знізу”, з’явілася самвыдатаўская кніжка – надрукаваны на машынцы твор “Па слядах старажытнага міфа”. Аўтарам гэтага твора, што выклікаў вялікі рэзананс і анафему з боку “артадоксаў”, быў Мікалай Іванавіч Ермаловіч.

Мне пашчасціла набыць экземпляр гэтай легендарнай кніжкі. Маючы выхад на ксеракс – што было таксама вельмі складаным – мы зрабілі некалькі экземпляраў і аздобілі іх, як зараз помню, прыгожым карычневым пераплётам. Гісторыя аднаго з гэтых асобнікаў мела цікавы працяг. У 1981 г. спаўнялася 50 гадоў другому знакамітаму і таксама малашанаванаму на Бацькаўшчыне пісьменніку – Уладзіміру Караткевічу. І вось мы – я і яшчэ адзін калега-фізік – набраўшыся адвагі, узялі і завіталі да яго проста ў кватэру па вуліцы Карла Маркса. У якасці падарунка ў нас быў той самы пераплецены асобнік кнігі М. Ермаловіча “Па слядах старажытнага міфа”. Падарунак быў вельмі дарэчы – Уладзімір Сямёнавіч шмат ведаў пра Міколу Ермаловіча, але гэтага твора не чытаў.

Мінула каля 10 гадоў пасля памянёнай сустрэчы. Мары патрыётаў Бацькаўшчыны сталі спраўджвацца: Беларусь атрымала незалежнасць, беларуская мова набыла статус дзяржаўнай мовы. Узнік Беларускі Народны Фронт, згуртаваўшы тысячы людзей вакол ідэй дэмакратыі і нацыянальнага адраджэння. Была створаная партыя НДПБ – Нацыянальна-дэмакратычная партыя Беларусі, пра якую я цяпер гавару.

На II канферэнцыі НДПБ, што адбылася 3 лістапада 1991 г., абралі новае кіраўніцтва партыі, былі абраныя тры старшыні: Анатоль Астапенка, Віктар Навуменка і Мікола Ермаловіч. М. Ермаловіч, які нядаўна ўступіў у партыю, быў яе гонарам і, калі так можна сказаць, "візітнай карткай НДПБ".

Зразумела, улічваючы век Міколы Ермаловіча і стан здароўя – і апошняе я лічу галоўным, бо Мікалай Іванавіч амаль нічога не бачыў – ён не браў удзелу ў звычайных, рабочых мерапрыемствах партыі. Аднак ён амаль ніколі не прапускаў паседжанняў Управы НДПБ. Негалосным правілам, якое ўваходзіла ў абавязкі сяброў Управы, было наступнае: трэба было правесці гісторыка ад корпуса тэхналагічнага інстытута па в. Свярдлова да чыгуначнага вакзала і пасадзіць яго на цягнік да Маладзечна, дзе ён тады жыў. Зрок у Міколы Ермаловіча быў такі слабы, што здалёк ён нікога не пазнаваў і трэба было пры сустрэчы заўсёды прадстаўляцца. Выглядала гэта прыкладна так: "Дзень добры спадар Мікола... – працягваю для паціскання руку і прадстаўляюся: Анатоль Астапенка". У адказ заўсёды радасна – "А, Анатоль, прывітанне, як жывяце?" І пачынаецца гутарка.

Але зблізку ён мог чытаць тэксты, дзякуючы магутным дыяптрыям сваіх акуляраў. У савецкія часы колькі гадоў запар у беларускім аддзеле "Ленінкі" можна было ўбачыць схіленую постаць чалавека, які на неймаверна блізкай адлегласці ад вачэй чытаў і чытаў з дапамогай тых моцных акуляраў кнігі, архіўныя дакументы, лісты і іншыя матэрыялы з нашай гісторыі. Гэта быў Мікола Ермаловіч. Так ён ствараў сапраўдную беларускую гісторыю.

Мікола Ермаловіч спрычыніўся і да распрацоўвання ідэалогіі нацыянальнай дэмакратыі, што патрэбна было нам, стваральнікам Нацыянальна-дэмакратычнай партыі, неадкладна зрабіць, каб напісаць разгорнутую праграму партыі. Так здарылася, што задаткі тэарэтыка-фізіка дапамаглі мне стаць тэарэтыкам і ў паліталогіі. У тыя гады я напісаў важныя

працы з нацыянальнай дэмакратыі: “Дзве тэзы аб нацыянальнай дэмакратыі”, ”Шляхі нацыянальнага адраджэння”, “НДПБ – тэорыя і практыка” і г. д. Немалую ролю ў стварэнні гэтых працаў, а пазней і кніг “Паслухайце нацыяналіста” і “Нацыянальная ідэя ў сучасным свеце” адыграў Мікола Ермаловіч.

Да маёй кнігі ён напісаў прадмову пад назвай “У шэрагу першых”, дзе акрамя адзнакі майго удзелу ў стварэнні НДПБ і перспектыў нацыянальнага адраджэння, ён даў у сціслай форме існасць нацыянал-дэмакратычнага руху ў Беларусі ў мінулым і сучаснасці. “У 20-я гг. нацыянал-дэмакраты былі галоўнай сілай у беларусізацыі ўсіх бакоў нашага жыцця: эканомікі, культуры, асветы. Можна ўявіць тую пачварную шкоду, якая была нанесена нашаму народу ў выніку сталінскага тэрору ў 30-я гг. Абвінавачанне ў нацдэмаўшчыне было самым страшэнным супроць тых, хто ў той ці іншай меры ўдзельнічаў у нацыянальнай адбудове Беларусі. А трагічным вынікам гэтага стала вынішчэнне беларускай інтэлігенцыі, што прывяло ў далейшым да заняпаду ўсёй нацыі”, – пісаў Ермаловіч у прадмове.

Пасля прыходу ў НДПБ Міколы Ермаловіча праца партыі стабілізавалася і паднялася на якасна новы ровень.

Першае: сталі рэгулярна праводзіцца міжпартыйныя семінары “Шляхі нацыянальнага адраджэння”. Ідэя такіх навукова-адукацыйных семінараў выходзіла ад мяне, і я стаў іх кіраўніком. Тэмы паседжанняў былі розныя: “Эканамічныя праблемы Беларусі”, “Адраджэнне нацыянальнай беларускай царквы”, “Нацыянал-дэмакратыя” і г. д. Бралі ўдзел ў гэтых семінарах ведамыя палітыкі, навукоўцы, духоўныя і культурныя дзеячы: прафесар-фізік Юры Хадыка, прафесар-эканаміст Уладзімір Кулажанка, эканаміст Злотнікаў, святары а. Ігар, а. Георгі, паэт Алег Бембель (цяпер інак Мікалай), старшыня сялянскай партыі Яўген Лугін, гісторык Алег Трусаў і многія іншыя. І неадменным ідэйным натхняльнікам нашых сустрэч быў Мікола Ермаловіч.

Кожны праведзены семінар абавязкова асвятляўся ў прэсе як значная грамадская падзея. Пад загалоўкам “Семінар, што працуе на адраджэнне” папулярная тады газета “Добры вечар” 28 лютага 1991 г. пісала: “У Мінску, у памяшканні БТІ С. М. Кірава пачаў працаваць дыскусійны семінар, арганізаваны Нацыянальна-дэмакратычнай партыяй Беларусі. Мэта семінара – шырокае знаёмства слухачоў з сапраўднай, а не скажонай гісторыяй рэспублікі, з яе культурай, літаратурай, навукай, а таксама з поглядам сучасных дэмакратаў на акадэмічныя, экалагічныя ды іншыя праблемы савецкага народа...” За першую палову 1991 г. ведамасць семінара значна вырасла, і тая ж газета “ДВ” за 11 траўня 1991 г. ужо дала такі загаловак: “Міжпартыйная школа дэмакратаў”.

Другое: пра партыю быў зняты тэлефільм, які паказваўся на БТ. Здымкі вяліся ў Мінску і ў Маладзечне. У Маладзечне НДПБ мела адну з наймацнейшых суполак, там жыў тады Ермаловіч, і таму пастанавілі зрабіць матэрыял “на прыродзе”. Сапраўды, у Маладзечне кіраўнік суполкі Лявон Шыман меў свой прыватны дом і дзялку, дзе была нават невялікая гаспадарка нутрыяў. У гэтых ягоных апартаментах і здымалі.

І, нарэшце, пра партыйную прэсу. Яшчэ на пачатку нашай дзейнасці ўзнікла ідэя стварэння газеты НДПБ. Алесь Емельянаў прапаноўваў назваць яе “Нацыянал-дэмакрат” і сам, як прафесійны літаратар, стаў рэдактарам. Былі сабраныя матэрыялы на першы нумар газеты. Аднак пасля выхаду Алеся з партыі, выданне газеты прыпынілася. Матэрыялы Емельянаў пакінуў нам, але яны так і засталіся ў рукапісе.

Затое ўзімку 1992 г. з’явілася іншая мажлівасць – друкаваць матэрыялы НДПБ. Першая газета Беларускага Народнага Фронту ”Навіны БНФ “Адраджэньне”, галоўным рэдактарам якой быў Алесь Суша, выдзеліла нам сталую старонку для матэрыялаў НДПБ. І ў студзені 1992 г. выйшаў другі нумар “Навінаў”, дзе адна старонка змяшчала матэрыялы нашых аўта-

раў. Мікола Ермаловіч у "Слове да чытача" напісаў:

*З нагоды адкрыцця старонкі нацыянальна-дэмакратычнае партыі Беларусі ў газеце "Навіны Адраджэньня" хацелася б па магчымасці падзяліцца нашымі планамі. Найперш мы будзем знаёміць з мэтамі і задачамі нашага руху. Сярод іх найбольш важнымі ёсць напаўненне сапраўдным зместам нашага дзяржаўнага суверынітэту, стварэнне спрыяльных умоў для развіцця беларускае культуры, асветы, беларусізацыі ўсіх сфераў дзяржаўнага, эканамічнага і грамадскага жыцця.*

*У сувязі з падпісаннем пагадненняў СНД беларускія нацыянальныя дэмакраты будуць звяртаць асаблівую ўвагу на тое, каб Рэспубліка была па-сапраўднаму самастойнай дзяржаваю і ніякім чынам не змагла зноў падпасці пад уладу таго ці іншага цэнтру, адначасова захоўваючы з усімі дзяржавамі Садружнасці шчыльныя эканамічныя сувязі.*

*М. Ермаловіч, сустаршыня НДПБ.*

Як відаць з прыточанага тэксту, і Мікола Ермаловіч, і ўсе мы моцна асцерагаліся ў той час, каб СНД не замяніла сабой СССР з яго аўтарытарызмам і іншымі савецкімі "каштоўнасцямі". Не думалі мы тады, што можа быць і свой беларускі аўтарытарызм, не горшы за савецкі. Здабыць незалежнасць краіны важна, але гэта далёка не ўсё, каб стаць праўнай і дэмакратычнай дзяржавай.

На нашай старонцы ў гэтым студзеньскім нумары "Навінаў БНФ" быў змешчаны артыкул М. Ермаловіча "Наша задача – узнавіць і працягнуць працу "нацдэмаў" 1920-х гг." і артыкул рэдакцыі: "Анатоль Астапенка: да нас прыйдуць усе астатнія" паводле майго выступу "Задачы нацыянальнай дэмакратыі" на 2-й канферэнцыі НДПБ.

У сваім артыкуле М. Ермаловіч выказаў думкі, вельмі блізкія да маіх, і якія можна пакласці ў аснову філасофіі беларускага нацыяналізму:

*Збліжэнне народаў не толькі значыць іх адміранне, але наадварот яшчэ больш іх крышталізуе. Як*

*слушна заўважалі ў 80-х гг. мінулага стагоддзя беларускія народнікі, без усведамлення свае адметнасці кожным народам, усё чалавецтва было б статкам.*

Навуковец упершыню выклаў сваю ведамую пазіцыю, пазней агучаную ў кнізе "Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае". Ён пісаў:

*Улічваючы, што асаблівую шкоду для праўдзівага бачання нашае гісторыі нанёс тэзіс пра бездзяржаўнасць Беларусі да 1919 г., г. зн. да абвяшчэння БССР, трэба асаблівую ўвагу звярнуць на факты, якія яскрава сьведчаць аб ранніх дзяржаўных утварэннях на нашай зямлі: Полацкім, Турава-Пінскім, Смаленскім і Новагародскім княствах. Асаблівая ўвага мусіць быць звернута на Вялікае княства Літоўскае, якое было створана не літоўскімі князямі, а нашым народам, і якое было працягам гісторыі папярэдніх дзяржаўных утварэнняў Беларусі. Гэтым толькі можна і вытлумачыць, чаму ў Вялікім княстве Літоўскім дамінавала беларуская культура, а беларуская мова была дзяржаўнай.* ***Гісторыя Вялікага княства Літоўскага мусіць трактавацца як час найвялікшага ўздыму дзяржаўнасці Беларусі ў мінулым.*** (Вылучэнне маё, – *А.А.*).

Вось як мусіць быць: "***Час найвялікшага ўздыму дзяржаўнасці!***" А згодна з сучаснымі "тэорыямі" незалежнасць Беларусі датуецца годам перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Які тут уздым нацыянальнай сведамасці і гонару "за слаўнае мінулае" можа быць. Нельга змешваць адно свята з другім. І калі людзям яшчэ зразумела тое, што мы перамаглі ў Айчыннай вайне, і таму 3 ліпеня адзначаем гэтае свята (хоць мы святкуем і 9-га траўня Перамогу, відаць, "лішні раз не зашкодзіць"). Але чаму пры гэтым другім свяце стаіць слова "незалежнасць", і як яно лучыцца з нашай гісторыяй – гэта мала хто растлумачыць, бо дзяржаўныя СМІ пра гэта проста маўчаць.

Мікола Ермаловіч лічыў, што хоць Беларусь і страціла сваю дзяржаўнасць ў часы Расійскай Імперыі, але памяць пра сваю дзяржаўнасць жыла ў сведа-

масці многіх беларусаў, такіх, як Кастусь Каліноўскі, гоманаўцы, нашаніўцы. Ён лічыў, што менавіта іх працаю і аджыло жаданне здабыць сваю дзяржаўнасць, якая толькі і магла даць росквіт матэрыяльных і духовых сілаў Беларусі.

Вялікую ўвагу Мікалай Іванавіч надаваў нашай роднай мове. Адзначаючы высокі ровень беларускай літаратурнай мовы, ён папярэджваў, што, калі з аднаго боку наша мова развівалася ўвышкі, то з другога – усё болей падразаліся карані ўнізе. У выніку яна была выкінута з ужытку большасці нашага насельніцтва. І гэтая татальная русіфікацыя чыніцца найперш праз школу, як сярэднюю, так і вышэйшую. А за адно з галоўных заданняў НДПБ Ермаловіч лічыў змаганне за аднаўленне беларускай нацыянальнай школы ўсіх роўняў.

Праблема занядбанага стану беларускай мовы была адна з першасных для НДПБ, і практычная дзейнасць у гэтым кірунку праводзілася праз Таварыства беларускай мовы (ТБМ). Многія сябры партыі былі чыннымі сябрамі ТБМ. Так, Віктар Навуменка ладны час узначальваў Раду ТБМ Маскоўскага раёна, Алесь Апрышка Раду Ленінскага раёна, прафесар Мікола Савіцкі – Гарадскую раду ТБМ г. Мінска. Мікола Міхноўскі быў сталым сакратаром Рэспубліканскай Рады ТБМ.

Жыццё Міколы Ермаловіча абарвалася на 79-м годзе ягонага пакутнага шляху ў 2000 г. Ён загінуў пад коламі машыны, калі вяртаўся дадому з чарговай сустрэчы з прыхільнікамі яго таленту. Некаторыя аматары "лёгкіх сенсацыяў" лічаць, што гэта быў не няшчасны выпадак, а забойства. Маўляў, КДБ знішчыла ідэолага беларускіх нацыяналістаў паводле такога ж сцэнару, як раней быў забіты мастак Лявон Баразна і рэпрэсавана мноства знакамітых людзей Беларусі.

Я так не лічу. Не органы спецслужбаў вінаватыя ў тым, што мы, людзі, часта чэрствыя і эгаістычныя. Што мы дбаем перадусім пра сябе, а ў нязручных для нас момантах робім выгляд, быццам чужыя

справы нас не датычаць. Я маю на ўвазе тое, што ў той заломлівы вечар Мікола Ермаловіч быў адзін, яго ніхто не суправаджаў. А ён жа амаль што нічога не бачыў, быў амаль сляпы. А сляпыя заўсёды маюць павадыроў. Чаму ж спадар Мікола астаўся ў адзіноце? Дзе ж тады былі ягоныя прыхільнікі, людзі, якім ён чытаў лекцыю, ці тыя, што яе заказвалі? Я добра ведаю, што такі выпадак, калі М. Ермаловіч ішоў без спадарожніка, далёка не адзіны. Не раз у час розных мітынгаў і шэсцяў, у якіх Мікола Ермаловіч заўсёды браў удзел, узнікала патрэба знайсці таго, хто б давёў яго на электрычку (у Маладзечанскія часы), ці пасадзіў на аўтобус (калі ён жыў у сваёй аднапакаёўцы ў Малінаўцы).

Мікола Ермаловіч – гэта гонар нашай нацыі і падмурак беларускага нацыяналізму XX ст. Я лічу, што мне вельмі пашанцавала быць паплечнікам і суразмоўцам чалавека такога магутнага таленту і бясконцай праўды.

Пакуль "наўчоныя мужы" спрачаюцца, быў ці не быў Мікола Ермаловіч навукоўцам-гісторыкам (ён жа не меў навуковых ступеняў!) – гістарычная навука ўпэўнена крочыць поруч з ягонымі гістарычнымі адкрыццямі, а новыя пакаленні маладых людзей з захапленнем чытаюць ягоныя кнігі і адкрываюць сабе нанова міф аб літоўскай заваёве.

*Віктар Навуменка*



Пасля II канферэнцыі НДПБ (1992 г.), як ужо гаварылася, партыя мела 3-х сустаршыняў: Міколу Ермаловіча, Віктара Навуменку і аўтара гэтых радкоў, Анатоля Астапенку. Пра М. Ермаловіча я ўжо сказаў колькі слоў. Пра сябе калі-кольвек напішу ў асобнай кнізе.

А зараз пра Віктара Навуменку. Вельмі цяжка пісаць пра чалавека, якога ўжо няма ў жыцці і тым больш, калі ён быў тваім найлепшым сябрам. Праў-

да, пазней быў і ворагам. Што да нашых асабістых дачыненняў, дык гэтаму, зразумела, не месца ў канцэптуальнай кнізе. Можа, у нейкім рамане ці ўспамінах, мемуарах. Але часта жыццё так шчыльна пераблытваецца з сферай абстракцыяў, ідэй, што міжволі прыходзіць думка – што насамрэч больш уплывае на наш лёс – ідэі ці наша стаўленне да іх, наша асабістае жыццё, наша сям'я і наагул блізкія людзі.

З Віктарам Навуменкам так і выйшла: "асабістае" і "грамадскае" ўвайшло паміж намі ў неразвязальны антаганізм, змаганне – і толькі з часам і я, і Віктар, пачалі разумець нікчэмнасць нашае ганарлівасці і нашае пыхі, усю "марнасць марнасцяў". Антуан дэ Сент Экзюперы некалі пісаў: "Няма большай раскошы, чым раскоша чалавечага сумоў'я". А гэтае чалавечае сумоў'е становіцца мажлівым толькі на прынцыпах бескарыслівай хрысціянскай любасці.

Віктар Навуменка быў мой зямляк. Абодва мы з славутых Васілевічаў (славутых, бо з Васілевічаў быў і генерал Юры Захаранка, беспадстаўна знішчаны рэжымам, і там сама вучыўся ў школе былы старшыня Канстытуцыйнага Суда Валеры Ціхіня, які прызнаў незаконнымі аж 18 дэкрэтаў прэзідэнта). Вучыліся мы з Віктарам, хоць і ў розныя гады, але ў адной школе, там, у ціхіх, родных Васілевічах прайшло нашае дзяцінства і юнацтва. Віктар – сын ад першай жонкі ведамага празаіка і навукоўца-філолага Івана Якаўлевіча Навуменкі, цяпер таксама ўжо нябожчыка.

Віктар, чалавек шматлікіх талентаў, паводле базавай адукацыі быў фізікам-эксперыментатарам, займаўся вадкімі крышталямі, якія вельмі модныя ў наш час у звязку з бурным уздымам кампутарных тэхналогіяў. Цікавіўся living рознымі мовамі, ягоная бібліятэка налічвала дзесяткі слоўнікаў розных моў, нават такіх, як кітайская ды японская. Але асаблівая любасць у яго была да музыкі. Ён граў на скрыпцы і гітары, але найбольш праявіў сябе як спявак. Быў салістам-басам у Народным хоры народнай песні супрацоўнікаў і выкладнікаў БДУ, а потым у ведамым

фальклорным калектыве “Тутэйшая шляхта”. Ён прышчапіў і мне любасць да спеваў, што засталася з' мной назаўжды.

Ёсць, сваім парадкам, і немалая мая заслуга ў выбары дарогі Віктарам Навуменкам і ў палітыцы, і ў беларушчыне. Разам мы стваралі першую суполку БНФ у тым самым хоры выкладнікаў БДУ, разам стваралі суполку ТБМ ва універсітэце, а потым Віктар узначаліў арганізацыю ТБМ Маскоўскага раёна. Разам сталі сустаршынямі НДПБ.

З 1994 г. і да закрыцця НДПБ у 1998 г. В. Навуменка быў старшынём партыі. Мой жа шлях пралягаў праз стварэнне новай партыі – Беларускай нацыянальнай партыі (БНП), аб якой гаворка пойдзе ніжэй.

Віктар Навуменка нечакана памёр ад раку ў расквіце творчых сіл у 2001 г. Яму было толькі 52 гады.

### *Канферэнцыі “Паняволеных народаў Савецкай імперыі”*

Адным з першых і вельмі цікавых кірункаў дзейнасці нацдэмаў канца XX ст. – сяброў Нацыянальна-дэмакратычнай партыі Беларусі – быў удзел у канферэнцыях, пра якія трэба сказаць асобна – гэта “Нарады (канферэнцыі) Кансультацыйнага Савета (КС) паняволеных народаў Савецкай Імперыі”. На гэтыя нарады збіраліся заступнікі розных партыяў і арганізацыяў нацыянальна-дэмакратычнага кірунку з тых рэспублік былога СССР і краін Усходняй Еўропы, якія той ці іншы час уваходзілі ў склад СССР ці былі ў простай залежнасці ад Савецкага Саюза (краіны сацыялістычнага лагеру Усходняй Еўропы).

Праблемы, якія стаялі перад гэтымі краінамі, былі аднолькавыя: як мага хутчэй дасягнуць дзяржаўнай незалежнасці, вызваліцца ад савецкай апекі, адрадзіць нацыянальную культуру і нацыянальную свядомасць народа.

У кожнай такой, калі можна так сказаць, пацярпелай краіне (рэспубліцы) пачынаючы, прыкладна, з 1987–1989 гг., пачалі ўтварацца Народныя фран-

ты, партыі і рухі нацыянальна-дэмакратычнага кірунку, мэтай якіх было зрабіць сваю Айчыну незалежнай, а свой народ – вольным.

Зразумела, заданні, якія стаялі перад кожнай з постсавецкіх рэспублік, былі вельмі падобныя. І таму нашы нарады тых часоў праходзілі ў шчырай сяброўскай атмасферы і ўзаемаразуменні. Менавіта там і было сапраўднае брацтва. Армянін сябраваў з малдаванінам, украінец з грузінам... У мяне таксама з'явіліся сябры, з якімі потым было вельмі прыемна сустрэцца на наступных нарадах. Асабліва блізка я сышоўся з сакратаром Польскай партыі Свабоды Войтэкам Стандо, старшынём партыі Адраджэння Грузіі ў яе гістарычных межах Аўтандзілам Кепчошвілі, сябрам Выканкама Рэспубліканскай партыі Украіны Іванам Дзем'янюком, іншымі.

Час узнікнення і росквіту нацыянальных партыяў – гэта час распаду СССР, гэта была пара памянёных міжрэспубліканскіх сустрэч-нарад. Перыяд той быў даволі кароткі: пачаўся недзе каля 1989–1990 гг., а скончыўся з утварэннем незалежных дзяржаў, усталяваннем межаў і наступленнем супольнага крызісу – прыблізна ў 1993 г. Пачынаючы з таго года, сустрэчы прыпыніліся. Хутчэй за ўсё прычынай былі фінансавыя цяжкасці. Хоць трэба ўлічваць і тое, што перад кожнай з новаўтвораных краін паўсталі свае ўласныя праблемы і развязваць іх яна магла толькі сама. Я думаю, прычыны знікнення "Кансультацыйных нарад" ды "Дэмакратыі і незалежнасці" комплексныя. Тут і шматлікія лакальныя войны – Грузія, Абхазія, Азербайджан, цяжкасці з візавым уездам (прыкладам, у Эстонію), іншыя.

Так ці інакш, нарады "Заняволеных народаў" сталі фактам гісторыі. Мне пашчасціла быць удзельнікам пяці з гэтых нарад – у Маарду (Эстонія), Тбілісі (Грузія), Бурштыне (Заходняя Украіна), Маскве і Мінску.

Пра некаторыя з памянёных падзей я і павяду гаворку ў гэтым раздзеле. Пра некаторыя нашы раз'езды я напісаў у якасці справаздачы нататкі, што

друкаваліся ў незалежнай прэсе. Прытачу гэтыя тэксты ў тым выглядзе, як яны былі напісаныя тады.

**1) Нарады ў Эстоніі і Грузіі.**

На пачатку 1991 г., з перапынкам працягласцю крыху больш за месяц, мне давялося браць удзел у дзвюх канферэнцыях (сойміках "Каардынацыйнай Рады нацыянальна-вызваленчых рухаў паняволеных народаў Савецкага Саюзу" нацыянальных партыяў з розных саюзных рэспублік. Першая нарада (9-я паводле ліку) адбывалася ў сядзібе Маарду, каля Таліна ў Эстоніі 19–20 студзеня 1991 г., другая – (10-я) – 23–24 лютага ў Тбілісі.

На абедзвюх нарадах была даволі шырокая геаграфія ўдзельнікаў, якія прыехалі з Расіі, Эстоніі, Латвіі, Літвы, Беларусі, Украіны, Малдовы, Крыма, Грузіі, Арменіі, Азербайджана, Узбекістана, Татарстана, а таксама з Польшчы. Эстонію заступалі 23 палітычныя арганізацыі, Грузію крыху менш. Галоўным кірункам дзейнасці кожнай з гэтых партыяў было змаганне за незалежнасць сваёй дзяржавы і пабудова вольнага ад камуністычнага рэжыму дэмакратычнага грамадства.

На нарадах, нягледзячы на стракаты моўны набор яе заступнікаў, уладарыла поўнае паразуменне, сяброўская атмасфера, паважлівае стаўленне адно да аднаго. Гэта, відавочна, мела адну прычыну, нашу супольную бяду: усе малыя дзяржавы, заступнікаў ад якіх абралі на нарады, у свой час былі акупаваныя Расійскай Імперыяй, ці потым Савецкім Саюзам, гвалтам улучаны ў СССР, "наш общий дом". Тая супольная трагедыя задзіночвала і эстонца, і армяніна, і беларуса, і грузіна – задзіночвала па-сапраўднаму, па-чалавечаму, а не з дапамогай накінутага цэнтрам нейкага рэферэндуму.

У Маарду ўдзельнікі амаль што аднагалосна прынялі 8 рэзалюцыяў: "Аб злачынствах СССР у Літве", "Аб акупацыйнай арміі", "Супраць захавання Савецкай імперыі" і г. д. Ад беларускай дэлегацыі, якую з'ўлялі Нацыянальна-дэмакратычная партыя Бела-

русі (НДПБ) і БНФ (радыкальнае крыло), была прапанавана і зацверджана рэзалюцыя “Аб Чарнобыльскай трагедыі”. У гэтай рэзалюцыі адзначана, што ўлады Беларусі працягваюць будаванне ў забруджаных раёнах, транжыраць міжнародную гуманітарную дапамогу. Дадам, гэтая рэзалюцыя (як і іншыя матэрыялы нарады) разглядалася пасля на паседжанні ў ААН і зрабіла моцнае ўражанне.

20 студзеня ў сядзібе Маарду ўдзельнікі нарады прынялі таксама камюніке, у замкальнай частцы якога сказана:

*Удзельнікі нарады выказваюць сваю цвёрдую адмову ад усякіх формаў гэтак званай саюзнай дамовы, якая ёсць спробай захавання Савецкай імперыі ў мадыфікаваным выглядзе, удзельнікі нарады выказваюць сваё падтрыманне на права ўсіх нацыяў адмаўляцца служыць у імперскіх узброеных сілах, каб імперскія сілы не мелі змогі выкарыстоўваць заступнікаў адных народаў для ўціску вызваленчага змагання другіх. Шлях да дэмакратыі, да сапраўднай волі і незалежнасці нацыі ідзе праз альтэрнатыўныя, незалежныя ад кантролю з боку савецкіх органаў рухі і прадстаўнічыя згуртаванні.*

Гаспадарамі 9-й нарады ў Эстоніі былі сябры партыі Нацыянальнай незалежнасці Эстоніі, якая дала прыклад сапраўднага прыёму з дзённымі паседжаннямі дэлегацыяў пад сваімі нацыянальнымі сцягамі (зразумела, у нас быў свой бел-чырвона-белы сцяг), і сяброўскім вячэрнім банкетам. Калі зблізку сутыкаешся з простымі эстонцамі, гэтым вельмі нешматлікім, сумленным народам, здзіўляешся яго нязломнай празе да волі, яго вытрымцы ў няроўным змаганні з савецкай імперыяй за свае правы. Не дзіва, што большасць не эстонцаў, тых людзей, якія здаўна жывуць на іх зямлі, падтрымліваюць імкненні эстонскага народа да незалежнасці. Супраць толькі тыя, хто з пагардай увесь час ставіўся да эстонскай мовы, да гісторыі Эстоніі – гэта тыя, хто і сапраўды

быў акупантам Эстоніі ў свой час, цяпер гэта – адстаўныя палкоўнікі Савецкай Арміі і КДБ, партыйная наменклатура і яшчэ – жменька бязнацыянальных суб'ектаў, што кормяцца з маскоўскага карыта. Яны і стварылі Інтэрфронт. Імперскі монстр, узгадаваны бясконцымі агрэсіямі, Афганістанам ды Чэхаславакіяй, ніяк не можа нават дапусціць думкі, што нейкая маленькая Эстонія, ці Літва ды Латвія маюць права на сваю незалежнасць.

Цяжкі шлях да волі. Калі я ад'язджаў, то заўважыў, што ў Таліне, у адрозненне ад Вільні, яшчэ ёсць вуліцы Леніна і Савецкая, а на плошчы Тоампеа стаяць барыкады[1]...

Зусім другую карціну становіць сабой сталіца Грузіі Тбілісі, дзе я апынуўся цёплым суботнім днём 23 лютага, у дзень Савецкай Арміі.

Ішоў шматлюдны мітынг на плошчы Руставелі, лунаді рознаколерныя нацыянальныя сцягі, у тым ліку і два беларускія. Сярод плакатаў на грузінскай мове вылучаўся на англійскай: "Red Army go home" – "Чырвоная Армія, вяртайся дахаты", і яшчэ здалёк было ясна, што гаворка тут ідзе не на карысць "вялікай і непераможнай", а супраць яе. На мітынгу за нас, беларусаў, адносна акупацыі Савецкай Арміяй Грузіі выказаўся Валеры Сядоў, што было станоўча ўспрынятая ўдзельнікамі.

Але мітынг на тым не скончыўся. Пасля заключнага слова лідэра Нацыянальна-дэмакратычнай партыі Грузіі Цэрэтэлі, натоўп па праспекце Руставелі скіраваў да будынка Вярхоўнага Савета Грузіі, дзе адбыўся другі мітынг. На гэты раз заступнікі розных партыяў апазіцыйнага блока выказалі свой недавер ураду Звіяда Гамсахурдзія і, на заканчэнне, пад ухваленне ўсіх бытных, быў урачыста спалены яго ны карыкатурна намаляваны партрэт. Высветлілася, што палітычная абстаноўка ў Грузіі моцна адрозніва-

[1] Талінская нарада адбывалася якраз пасля крывавай ночы 13 студзеня 1991 года ў Вільні. Эстонія рыхтавалася да сваёй чаргі.

ецца і ад Прыбалтыкі, і тым больш ад Беларусі. Грузія – адзіная рэспубліка, якая хоць і знаходзіцца яшчэ ў складзе СССР, але камуністычная партыя там ужо страціла ўладу і не становіць сабой аніякай сур'ёзнай палітычнай сілы. У будынках былога партыйнага кіраўніцтва (ЦК КПГ і г.д.) размешчаныя штабы розных грамадскіх рухаў і партыяў, а ў адным з іх праходзіла нашая канферэнцыя.

Усе ўдзельнікі адзначылі, што рэакцыя нарастае, а з боку Масквы працягваецца наступ на нацыянальна-вызваленчыя рухі ўсіх рэспублік. Сведамая дэзінфармацыя, масаванае абалваньванне простага чалавека можа прывесці да паспяховага правядзення рэферэндума "За захаванне СССР", што яшчэ больш замацуе пазіцыі КПСС і Міхаіла Гарбачова. З такой нагоды 10-я канферэнцыя прыняла рэзалюцыю "Аб рэферэндуме". Заслугоўвае ўвагі наступная вытрымка з гэтай рэзалюцыі:

*Канферэнцыя ўпэўнена, што правядзенне рэферэндума ў пытанні аб самавызначэнні народаў, якія выявілі сваю волю і беспаваротна вызначылі свой статус у ходзе нацыянальна-вызваленчага змагання да найвышэйшага роўню нацыянальных дзяржаў, абражае іх, ёсць амаральным і несумяшчальным з міжнародным правам.*

*Тым больш ува ўмовах акупацыі, калі ўвесь народ у адным пакаленні не мае права асуджаць на такую долю і нашчадкаў. Канферэнцыя лічыць, што рэферэндумы, якія праводзіць акупацыйная ўлада, ёсць небяспечным прэцэдэнтам, які кладзе пачатак узаконьванню ўлады таталітарнымі структурамі.*

Ад беларускай дэлегацыі (НДПБ, БНФ) у Тбілісі была прынята рэзалюцыя "Аб ацэне асіміляцыйных працэсаў у Савецкай Імперыі". У гэтай рэзалюцыі адлюстравалася наша сумная савецкая рэчаіснасць з заняпадам нацыянальных моў і культур. У прыватнасці, адзначана становішча з беларускай мовай, якая ўжо амаль цалкам выцеснена рускай. У заключнай частцы рэзалюцыі гаворыцца:

*Канферэнцыя лічыць, што толькі поўнае вызваленне нацыяў ад ярма імперыі, ад яе антыгуманнай ідэалогіі, псеўдакультуры і эканамічнага дыктату зможа быць падставай да вяртання страчанага гістарычнага досведу паняволеных народаў, да аднаўлення іх культурных традыцыяў і духовых каштоўнасцяў, да захавання і адраджэння гэтых народаў – будучы адначасна гарантам захавання ўсёй сусветнай культуры і выжывання ўсяго чалавецтва.*

Канферэнцыя ў Тбілісі праходзіла, фактычна, адзін дзень, 24 лютага. Адчувалася, што нашым гаспадарам было трошкі не да гасцей: перад блокам апазіцыйных ураду партыяў стаялі рэальныя неразвязальныя праблемы, у ліку якіх – вызваленне палітычных вязняў (сярод іх, дарэчы, было нямала ранейшых паплечнікаў Гамсахурдзія). Як бы там ні было, грузінская гасціннасць яшчэ не знікла і партыя “Незалежнасці Грузіі ў старых межах” вечарамі займалася не толькі палітыкай, і мы добра адчулі, што яшчэ не ўсе вінаграднікі высечаны, а аджыка яшчэ не ўся вычхалася.

Выляталі мы з Тбілісі – як і раней з Таліна, з усведамленнем таго, што мы, беларусы, не адзіныя ў сваім імкненні “людзьмі звацца” і што ў нас ёсць сябры ад Балтыкі да Каўказа.

*Талін – Тбілісі. Люты – сакавік 1991*

### 2) **Канферэнцыя паняволеных народаў у Бурштыне**

15–16 чэрвеня ў г. Бурштын (Івана-Франкоўская вобл.) адбылася чарговая канферэнцыя нацыянальна-дэмакратычных рухаў паняволеных народаў Савецкай імперыі. Адметная рыса гэтых канферэнцыяў – радыкалізм, нацыянальна-адраджэнцкая накіраванасць, імкненне да супольнай мэты – вызваленне народаў ад расійска-савецкай акупацыі.

З беларускіх рухаў Беларусі ў гэтых канферэнцыях бралі да гэтай пары ўдзел Нацыянальна-дэмакратычная партыя Беларусі (НДПБ) – 4 разы і радыкальнае крыло БНФ – 2 разы.

У Бурштын з'ехаліся заступнікі нацыянальна-дэмакратычных, рэспубліканскіх, іншых партыяў з васьмі рэспублік СССР: Эстоніі, Беларусі, Украіны, Малдовы, Грузіі, Арменіі, Азербайджана, Кыргызстана, Туркменістана, а таксама з Польшчы, Румыніі, упершыню ўзяў удзел Дэмакратычны Саюз (г. Масква) – усяго было з'яўлена 16 арганізацыяў.

Ад Беларусі былі заступнікі НДПБ. Даклад пра палітычнае становішча зрабіў аўтар гэтых радкоў (у той час я быў сябрам Вышняй Рады НДПБ). Быў зроблены аналіз страйкавага руху, які адбыўся ў нас у красавіку – траўні і зроблены акцэнт на яго вынік – узмацненне рэпрэсіяў на лідэраў страйкавага руху і БНФ. У прыватнасці, падрабязна расказана пра арышт Валерыя Сядова[1]. Заступнікам усіх партыяў былі раздадзеныя інфармацыйныя лісткі пра Сядова з ягоным фотаздымкам для друкавання гэтай інфармацыі ў саюзнай і замежнай прэсе.

У дакладах амаль усіх удзельнікаў гучала трывога за будучыню, адзначалася, што расце націск антыдэмакратычных сілаў, растуць рэпрэсіўныя меры ўздзеяння на змагароў за волю. Была прынята рэзалюцыя аб палітычных вязнях усіх рэгіёнаў СССР.

Увечары другога дня адбылося паседжанне Каардынацыйнай рады Варшава-90, на якім адбыўся прыём новых сяброў і, у прыватнасці, была прынята НДПБ (БНФ уступіў раней).

Ужо ўночы сабралася ініцыятыўная група для стварэння камісіі па нацыянальных пытаннях для дапамогі на міжнародным роўні тым нацыям, якія знаходзяцца ў бядзе. Быў створаны аргкамітэт, у які

[1] Валеры Сядоў – ведамы дзяяч БНФ канца 1980-х – пачатку 1990-х гадоў. У час мітынгу 7 лістапада 1991 года на пляцы Незалежнасці на заклік З. Пазняка натоўп людзей рушыў да помніка Леніну, каб ускласці да яго "дары" – гулагаўскія фуфайкі, кавалкі калючага дроту і г.д. Найбольш чынна праявіў сябе тады В.Сядоў. Пазней за гэта быў арыштаваны, правёў некалькі месяцаў у турме па вул. Валадарскага. Аб'явіў там галадоўку, пасля ў цяжкім стане быў дастаўлены ў 2-ю бальніцу г.Мінска.

ўвайшлі ад Беларусі я і сябра Вышняй Рады НДПБ, цяпер ужо нябожчык, Яўген Скарабагаты.

Атмасфера на канферэнцыі і па-за яе межамі была вельмі сяброўская, і збоку нават цяжка было паверыць, што ў Бурштыне сабраліся не даўныя сябры, а заступнікі розных дзяржаў свету.

І, нарэшце, хочацца адзначыць, што, як і ў Бурштыне, так і наагул па усёй Заходняй Украіне, нас прыемна ўразіла панаванне ўкраінскай мовы і поўная немень, як кажуць ва Украіне, – "маскальскай" (рускай).

*Бурштын, ліпень, 1991 г. Газеты "Навіны БНФ", "Пагоня".*

**3) Маскоўская нарада "Дэмакратыя і незалежнасць"**

Такую назву меў на пачатку 90-х гг. Каардынацыйны цэнтр нацыянальна-дэмакратычных партыяў і рухаў краін былога Савецкага Саюза і Усходняй Еўропы, рабочая нарада якога адбылася 14–15 сакавіка 1992 г. ў Маскве. Фактычна, гэта была новая назва папярэдніх "Нарад заняволеных народаў..."

Нарада ў Маскве была рабочай, але спектр удзельнікаў – досыць шырокі: Арменія (Аб'яднанне "Нацыянальнае самавызначэнне"), Грузія (Нацыянальна-дэмакратычная і Рэспубліканская партыі), Літва (Вярхоўны Савет), Польшча (Партыя Свабоды, Партыя Незалежнасці), Расія (Дэмакратычны Саюз), Узбекістан (Дэмакратычная партыя "ЭРК"), Украіна (Рэспубліканская партыя), Эстонія (Партыя эстонскай нацыянальнай свабоды). Беларусь з'яўлялі дзве арганізацыі – Нацыянальна-дэмакратычная партыя (Анатоль Астапенка) і Беларускі Народны Фронт (Валеры Буйвал).

Як у ўдзельніка нядаўнай кіеўскай канферэнцыі Дэмкангрэса[1], у мяне была мажлівасць прыраўнаць

[1] У газеце "ЛіМ" (студзень 1992 г.) пад назвай "Ці ёсць будучыня ў Дэмкангрэса" быў надрукаваны мой артыкул пра гэтую падзею.

адно аб'яднанне дэмакратаў з другім, і адразу скажу, што мае сімпатыі былі цалком на баку ўдзельнікаў маскоўскай сустрэчы. У Маскве не было ні гучных прамоў "найдэмакратычнейшых дэмакратаў у свеце" – расійскіх, ні бясконца цягучых разважанняў пра перспектыву (а насамрэч бесперпектыўнасць) СНД. Тут адразу было адзначана, што СНД – толькі форма цывілізаванага разбурэння Саюза, ці фактычнага "афіцыйнага разводу" дзяржаў новага ўтварэння. Гэта – справа найбліжэйшага часу. Можа, пачатак працэсу раз'яднання дасць афіцыйная заява Украіны аб выхадзе з СНД, пра што гаварылі не толькі ўсе ўкраінскія дэмакраты (РУХ, РП), але і афіцыйныя асобы.

У сваім дакладзе аб палітычным становішчы ў Беларусі я расказваў пра наш рэферэндум[1]. Асабліва зацікавіла слухачоў фармулёўка вынесенага на рэферэндум пытання. І сапраўды, цяжка прыдумаць больш заблытаную і цяжкую для ўспрыняцця канструкцыю сказа, што стаіць у падпісным лісце. Ініцыятыва беларускіх дэмакратаў была станоўча адзначана і ўхвалена.

Пры абмене інфармацыяй высветлілася, што працэсы, якія ідуць ува ўсіх з'яўленых у Маскве посткамуністычных краінах, вельмі падобныя. Гэта адлюстравалася ў камюніке канферэнцыі, дзе адзначаны некаторыя супольныя праблемы дадзенага перыяду: пераход ад аджылых савецкіх і сацыялістычных дзяржаўных і эканамічных структур да свабодна выбраных парламентам і да рыначнай эканомікі, распрацоўванне аптымальных законаў аб выбарах, падрыхтоўка і прыняцце канстытуцыяў дзяржаў, аптымізацыя працэсаў прыватызацыі і зямельнай рэформы з улікам асаблівасцяў кожнай з краін.

Улічваючы вялікую цікавасць удзельнікаў нарады да падзей у Беларусі, вырашана склікаць наступны форум 10–12 траўня ў Мінску. Мяркуецца пра-

[1] Рэферэндум аб захаванні СССР. Праходзіў у 1991 г.

весці пашыраную міжнародную канферэнцыю на тэму: “Шлях дэмакратычнай дзяржавы”

*Масква. Сакавік 1992 г. Газета “ЛІМ”.*

**4). Апошні з’езд “Дэмакратыі і незалежнасці” у Мінску**

Мінская сустрэча была апошняй. НДПБ і БНФ былі арганізатарамі. Нам удалося даволі танна зарганізаваць сустрэчу ў гатэлі “Юнацтва” ў прыгожым месцы на Мінскім моры. Але ўдзельнікаў, на жаль, было ўжо вельмі мала (чатыры дзяржавы – Польшча, Украіна, Арменія і Беларусь). Гэта можна зразумець: Грузія ўступіла ў ваенны перыяд, Прыбалтыка цалкам аддзялілася ад СССР, а пра Сярэднюю Азію і раней было цяжка гаварыць.

Эйфарыя папярэдніх сустрэч ужо знікла, і пасля гэтай, апошняй, нарады я ў тыя часы нічога не напісаў. Але цяпер, аглядваючыся назад праз 14 гадоў, некалькі слоў усё ж трэба сказаць.

Нарада адбылася 10–12 траўня 1992 г. Цяпер, калі ўгледзецца ў гэтую дату, можна зразумець, што мы збіраліся ў той час, калі *ўсё адбылося*, калі ўжо стала фактам гісторыі найвялікшая падзея ХХ ст. – крах камунізму ў СССР, распад яго на незалежныя дзяржавы і абвяшчэнне суверэнітэту шэрагу краін, якія больш за 70 гадоў утваралі Саюз.

Гэтая сустрэча падвяла рысу пад існаваннем адзінага постсавецкага руху за дэмакратыю і незалежнасць. Адгэтуль мы перасталі быць саюзнікамі ў нашых адзіных мэтах – змаганні за незалежнасць сваёй краіны і знішчэнні камунізму. Сапраўды, на 1992 г. усе савецкія рэспублікі атрымалі незалежнасць і пачалі будаваць свае маладыя краіны. У кожнай былі супольныя заданні, але ў кожнай – свой шлях, і таму нарады “Паняволеных народаў” сталі непатрэбнымі. Другое заданне – знішчэнне камуністычнага рэжыму – засталося супольным для ўсіх, але яно паступова набыло больш выразны і жорсткі тон асуджэння камунізму і ператварылася ў Міжнародны трыбунал “Суд

над камунізмам Нюрнберг-2". Гэты рух, ці Міжнародны Трубунал, набыў у 90-я гг. XX стагоддзя даволі значны рэзананс, але потым паступова стаў заціхаць. Можа, паўплывала тое, што самі камуністы некуды "зніклі", судзіць не было каго, а займацца асуджэннем камуністычнай ідэалогіі як самамэтай таксама заданне малаперспектыўнае, хоць і патрэбнае.

Але вернемся да травеньскіх падзей на Мінскім моры ў 1992 г. Аргкамітэт у складзе заступнікаў НДПБ і Валерыя Буйвала з БНФ выканаў заданне з вялікім запасам, бо як я ўжо сказаў, многія ўдзельнікі не прыехалі. Былі заказаныя для дэлегатаў і аргкамітэта найлепшыя нумары ў гатэлі, на паседжаннях былі журналісты розных дзяржаўных і недзяржаўных газет і радыё. Прыехала нават Беларуская тэлевізія, якую ў агромністым аўтобусе прывезла Л. Мельнікава – аўтар і рэдактар тагачасных палітычных праграм. Аднак з БТ выйшаў невялікі канфуз. Пасля таго як тэлевізіённікі развесілі сваю немалую паводле памераў і колькасці адзінак апаратуру, а гэта працягвалася не менш за гадзіну, высветлілася, што здымаць, фактычна, няма чаго. На паседжанні было, мо, чалавек 20–30, а БТ прызвычаілася да салідных з'ездаў і не чакала такога.

Сумаваў і знакаміты дысідэнт Савецкага Саюза Паруйр Айрыкян, якога ўжо ў перабудоўчы час пазбавілі савецкага грамадзянства і дэпартавалі ў Эфіопію. У руху "Дэмакратыя і незалежнасць" (ДН) ён быў прызнаным лідэрам, балатаваўся пазней на пост прэзідэнта Арменіі. У тым, што на нашу нараду сабралася мала дэлегатаў, Айрыкян падазраваў руку КДБ. Гэта ён выказваў фразай: "Няўжо Марына завербаваная?" Марына была сакратаркай ДН, жыла ў Маскве і праз яе ладзілася розныя месэджы і дасылаліся лісты.

Нягледзячы на выказаныя заганы Нарады, яна ўсё ж адбылася, пра што і паведамілі беларускія газеты. Ігар Грышан, тагачасны супрацоўнік "Советской Белоруссии" ў артыкуле "Дэмакраты раюцца" пісаў: "*Тры дні на мінулым тыдні ў турыстычным комп-*

*лексе "Юнацтва" пад Мінскам праходзіла рабочая сустрэча прадстаўнікоў міжнароднага каардынацыйнага цэнтра "Дэмакратыя і незалежнасць"...*

*..Ва ўмовах посттаталітарнага грамадства і пры існуючай небяспецы падмены дэмакратыі новымі аўтарытарнымі рэжымамі, гаворыцца ў прынятым камюніке, задачы каардынацыйнага цэнтра "Дэмакратыя і незалежнасць" застаюцца актуальнымі, і ён павінен актывізаваць сваю дзейнасць".*

Вялікі артыкул надрукаваў у "Нашым слове" А. Карлюкевіч. У ім было падрабязна расказана пра ход канферэнцыі, змест галоўных тэм нарады і прынятага камюніке: тэма рэферэндума за адстаўку Вярхоўнага Савета, актуальная на той час размова пра Чарнаморска-Балтыйскі Звяз і іншыя.

На Мінскай нарадзе была прынята пастанова аб рэалізацыі праекта "Міжнародны агляд", скіраванага на ўжыццяўленне грамадскага кантролю за працэсамі дэмакратызацыі ў дзяржавах былога СССР.

Хоць у гатэлі "Юнацтва" пастанавілі правесці наступную сустрэчу ў Маскве, усім было зразумела – соймікаў "ДН" больш не будзе. На тое і выйшла. І нарады "Занявольных народаў" у тыя тры пераходныя гады (1990–1992) сталі фактам гісторыі.

### *Не аддамо Вільню літоўцам?*

Як у дзяржаўнай, так і не дзяржаўнай прэсе пачатку 1990-х гадоў гучала тэма, цяпер амаль што забытая, а калі яна і ўспамінаецца, то толькі ў колах новага маладога пакалення гісторыкаў ці маладых змагароў за Свабоду і Незалежнасць.

Гэтая тэма – праблема Віленскага краю з яго сталіцаю Вільняй. Як ведама, у час II Сусветнай вайны, у 1939 г. Вільня і Віленскі край былі перададзены згодна з актам Молатава-Рыбентропа Літоўскай рэспублікі. Сталіца Вялікага княства Літоўскага была калыскаю трох культур: беларускай, польскай і літоўскай. Але дамінаваў менавіта беларускі складнік. Асабліва гэта датычыла эпохі Залатога веку – XVI ст. І хоць



Віленскія муры
Фрэскі Віленскіх мучанікаў

пазней, у часы канфедэрацыі ВКЛ і Рэчы Паспалітай, выходзіць на першы план польскі элемент, не трэба забывацца, што носьбітамі польскай культуры ў Вільні ў тыя часы былі этнічныя беларусы (Адам Міцкевіч, Станіслаў Манюшка, Ян Чачот, Ігнат Дамейка і многія іншыя). Пазней, у часы Расійскай Імперыі, у гэты стракаты культурны кангламерат Віленшчыны дадаўся расійскі складнік. Ведама яшчэ і тое, што ўласна літоўскі элемент у культуры (і мове!) гэтага краю быў вельмі нязначны (у Вільні да 1940 г. жыло толькі каля 1 % літоўцаў!). Аднак пасля сталінскага падарунка літоўцам у выглядзе найвыдатнейшага горада – Вільні, сітуацыя пачала імкліва мяняцца. Вільня вельмі хутка засяляецца літоўцамі з усёй этнічнай Літвы. У цяперашні час яны складаюць большую частку насельніцтва, а літоўская культура засланяе сабой усе іншыя. З таго часу культурнае жыццё ў Вільні пачало імкліва развівацца пад сцягам летувісаў, а беларускае стала памалу заціхаць. Хоць і цяпер у Вільні працуе Грамадска-культурнае Беларускае Таварыства на чале з старшынём Хвед-

рам Нюнькам, працуе беларуская радыёстанцыя, выходзіць газета "Рунь", беларускія дзеткі вучацца ў беларускай гімназіі, дзеяць іншыя культурныя беларускія установы, таварыствы, мастацкія калектывы.

На 2-й лістападаўскай канферэнцыі НДПБ 1991 г., пра якую ўжо казалася вышэй, акрамя перавыбараў кіраўніцтва прынялі шэраг цікавых дакументаў. Пра адзін з іх я і раскажу ў звязку з паднятай тэмай. Была прынятая заява пад назвай: "У сувязі з праблемай Віленскага краю". У заяве падкрэслівалася, што Брэсцкая ўгода 1919 г. адкрыла шлях да перадзелу беларускіх межаў без уліку інтарэсаў Беларусі. У ліпені 1920 г. адбылося падпісанне першае расійска-літоўскае дамовы, вынікам якой стала прызнанне за Літвою права на частку заходнебеларускіх земляў з Вільняю і Гораднам, якія знаходзіліся пад польскай акупацыяй. Беларуская нацыянальна-патрыятычная нарада, якая адбылася ў Празе ў 1921 г., у дачыненні да раздзелу тэрыторыі Беларусі вызначылася наступным парадкам:

*Па Віленскім пытанні нарада прызнала, што яно вырашанае Лігаю нацыяў без удзелу беларускага народа і нават без фармальнага азнаямлення з яго воляй. Нарада лічыць пастанову Лігі нацыяў часовай – да склікання вышняга заканадаўчага органа Беларусі, якому толькі і належыць права вызначаць паўночныя межы Беларусі.*

Трэба сказаць, усе гэтыя падзеі і стаўленне памянёных дзяржаў і прывялі да таго, што пераданне бальшавікамі Літве 10 кастрычніка 1939 г. адбылося без згоды мясцовага насельніцтва і стала прычынай інтэнсіўнай летувізацыі і стварэння прапагандысцкага стэрэатыпу не на карысць Беларусі. У заяве НДПБ сказана:

*З мэтаю ўтрымання Вільні і краю вось ужо больш за 50 гадоў тут праводзіцца палітыка летувізацыі. Гэта супярэчыць нават рашэнню Лігі нацыяў ад 1921 г., паводле якога дзеля забеспячэння нацыя-*

*нальных інтарэсаў у Літоўскай дзяржаве прадугледжваліся як балцкі, так і славянскі кантоны...*

*У час камуністычнай дыктатуры ўва ўсіх інфармацыйных і ідэалагічных структурах былога СССР пастулова была дасягнутая пралітоўская арыентацыя па віленскім пытанні. Гэтая тэндэнцыя цалкам уласцівая і беларускім камуністычным і некаторым посткамуністычным рухам. У выніку дамінавання такім парадкам арыентаванай інфармацыі застаецца няведамымі народу Беларусі аб'ектыўныя гістарычныя факты і іх навуковы палітычны аналіз. Працягваюць панаваць і прапагандуюцца палітычныя схемы, зручныя суседнім дзяржавам (Літве і Расіі). Такім парадкам на працягу 70 гадоў не раз здраджваюцца інтарэсы беларускага народа з-за палітычнае кан'юнктуры і дыпламатычных гульняў.*

Для развязання гэтых гістарычных памылак, якія не на карысць Беларусі, і ўлічваючы асаблівую ролю Вільні як культурнага і гістарычнага цэнтра славянскага і *пераважна беларускага насельніцтва*, а таксама паважаючы Хельсінскія пагадненні 1975 г. аб недапушчальнасці выкарыстання ваеннай сілы пры развязанні спрэчак аб дзяржаўных межах, НДПБ прапанавала наступнае:

*а) лічыць недапушчальнымі любыя праявы асіміляцыйнай палітыкі дзяржавамі, якія дэкларавалі вернасць дэмакратычным прынцыпам;*

*б) апублікаваць для дыскусіі ўсе дагаворы 1920–1940-х гадоў па вызначэнні дзяржаўных межаў паміж Беларуссю і Літвою і дэнансаваць іх як дагаворы, якія маюць захопніцкі характар у адносінах да Беларусі і прывялі да падзелу беларускіх земляў;*

*в) прыцягнуць увагу літоўскага ўрада да таго, што большасць жыхароў Віленскага краю з'яўляюцца аўтахтоннымі беларусамі, а не палякамі;*

*г) прызнаць, што ўтойванне і фальсіфікацыя сапраўднай гісторыі Літвы і Беларусі ёсць парушэннем права на атрыманне праўдзівай інфармацыі.*

І, нарэшце, дзве найрадыкальнейшыя прапановы НДПБ:

*д) трэба надаць Віленшчыне асобны статус дзяржаўнай аўтаноміі і ўтварыць самакіраванне на прынцыпах роўнага прадстаўніцтва "галоўных нацыяў: беларусаў, літоўцаў, палякаў і расійцаў". Тут маюцца на ўвазе Шальчынінкайскі, Свенцянскі, Віленскі і іншыя раёны з перавагаю славянскага насельніцтва;*

*ж) надаць Вільні статус вольнага горада і пераўтварыць яго ў Еўрапейскі цэнтр ("Залаты Мост" – паводле тэрміналогіі 1920 –1930-х гадоў) супрацы славянскага і балцкага народаў, вярнуць гораду гістарычную назву Вільня, якая была трансфармаваная ў Вільнюс у 1945 годзе.*

Чытаючы цяпер, праз 15 гадоў гэтую Заяву НДПБ, нават не верыцца, што пытанні і патрабаванні, выкладзеныя ў гэтай Заяве, маглі ўсур'ёз абмяркоўвацца ў афіцыйнай прэсе і, тым больш, былі хоць мінімальна развязаны. У 2006 годзе аб памянёных пытаннях гаварыць нават не прыйдзе нікому ў галаў. Вельмі далёка разышліся шляхі нашых краін, а палітычныя рэжымы, што склаліся ў Беларусі і Літве не дазваляюць нават дапусціць дыскусіі на тэму лёсу Віленскага краю. Аднак ідэі НДПБ застаюцца здабыткам той культуры, якая магла быць і, можа, будзе, хоць у рамантычных мроях аб мажлівасці іншай Беларусі, Беларусі з Вільняй, Беларусі як Залатога Моста паміж праваслаўнай і каталіцкай культурамі, паміж балтамі і славянамі, Захадам і Усходам.

### *Суд над камунізмам*

На гэтай дзейнасці НДПБ і асабіста маім удзеле ў акцыі пад назвай "Суд над камунізмам, альбо Нюрнберг-2" трэба засяродзіць асобную ўвагу, бо праблемы, паднятыя ў 90-х гг. XX ст. тымі коламі грамадзян краін Усходняй Еўропы, якія пацярпелі ад "камунізму" на ўласным абшары, вечныя, і развязанне іх рана ці позна, але будзе рэальнасцю.

Ідэя “Суда над камунізмам” бярэ свой пачатак ад звароту пад назвай “Мы заклікаем кожнага, каго трывожыць небяспека неабальшавізму, далучыцца да нас”, які быў надрукаваны ў газеце “Свабода” 1992 г. Сама ідэя такога суда сыходзіла ад Нацыянальна-дэмакратычнай партыі Беларусі, тэкст звароту таксама рыхтаваўся намі ў рэдакцыі НДПБ. Потым зварот быў падпісаны лідэрам апазіцыі ў Вярхоўным Савеце Зянонам Пазняком і кіраўнікамі галоўных дэмакратычных арганізацыяў. Пазней той зварот атрымаў шырокі міжнародны рэзананс і даў штуршок да стварэння Міжнародных Камітэтаў па судзе над камунізмам “Нюрнберг-2” у Расіі і ў Польшчы. Падзеі, якія адбываліся потым, адлюстраваны ў артыкулах – падаюцца ў храналагічнай паслядоўнасці. Яны паказваюць непаўторную атмасферу першай паловы 1990-х гадоў, калі ўздым дэмакратычных і нацыянальных рухаў ува Усходняй Еўропе і краінах, узніклых пасля развалу СССР, дасягнуў свайго піку.

У Дадатку 1 падаецца поўны тэкст знакамітага “Звароту”. Ён напісаны вельмі вытрымана, дакладна і ёсць дакументам цэлай эпохі. У той жа час быў напісаны і другі зварот, дзе тэма суда разглядаецца з хрысціянскіх пазіцыяў (Дадатак 2).

У студзені 1993 г. адбыўся першы міжнародны з’езд ініцыятараў суда ўва Уладзіміры, а ў траўні 1994 – другі – у Варшаве. Камуністы адрэагавалі на першы з’езд у газеце “Мы и время” арыгінальным артыкулам прафесара І. Кучарава “Мозги набекрень”, і гэта прымусіла мяне напісаць адказ – надрукаваны пазней у маёй кнізе “Паслухайце нацыяналіста”, які не страціў актуальнасці і цяпер, таму я змяшчаю яго ніжэй у абноўленым варыянце.

**“Ці можна судзіць камуністычную ідэалогію?” – адказ прафесару І. Кучараву на яго артыкул “Мозги набекрень”, змешчаны ў камуністычнай газеце “Мы и время”**

Кволыя парасткі дэмакратыі ў Беларусі пачалі імкліва затухаць з устанаўленнем аўтарытарнага

рэжыму А. Лукашэнкі. Духова спустошаны народ, пазбаўлены самастойнасці і свабоды, выхаваны ў грамадстве "развитого социализма", не прыняў шляху да дэмакратыі і дзяржаўнай незалежнасці. Настальгія па часах Брэжнева, а для старэйшага пакалення і Сталіна, стала кіроўным рычагом для большасці беларусаў, і яны падтрымалі таго, хто ім быў бліжэй. Лукашэнка быў сваім чалавекам: і мова "свая" – трасянка, і выхадзец, як і большасць з нас, – з вёскі, і змагар з карупцыяй, хоць яму і "мешают". Прэзідэнт паабяцаў людзям, што савецкі сацыялізм можна вярнуць, а магутную дзяржаву СССР – адрадзіць.

І народ як бы і забыўся пра сваю страшную мінуўшчыну, як бы і не было ў нас мільёнаў рэпрэсаваных у 1930–1940-я гг., не было штучна ўтворанага голаду ва Украіне, не было Курапатаў...

Назад у 60-я гады! Нам не патрэбен ні нацыянальны сцяг, ні матчына мова – нам патрэбна танная кілбаса ды гарэлка! І мала хто з такіх людзей задумваўся, што шляху назад ужо няма, як няма і "единого и нерушимого" Савецкага Саюза. Камуністы пакінулі знякроўленую, пазбаўленую рэсурсаў зямлю, пяскі і пустэльню на месцах былых балот Палесся, ну і яшчэ беларускі народ – людзей, што даўно забылі Бога і ягоныя запаветы. Будучыя пакаленні нам не даруюць такой спадчыны. І кожны з нас адказны перад нашымі дзецьмі і ўнукамі.

Гэты артыкул напісаны для аднаўлення працы на выкрыццё наступнасцяў камуністычнага рэжыму ў СССР, якая пачалася пасля ведамых падзей 1991 г., вялася і вядзецца ў большасці посткамуністычных краін, што сталі на шлях прагрэсу. Мы павінны асудзіць камуністычны рэжым і яго ідэалогію, паставіць крыж на ім назаўсёды. І трэба юрыдычна замацаваць у заканадаўствах розных краін немажлівасць аднаўлення камуністычнага рэжыму.

Спачатку хацелася б зазірнуць у нядаўную гісторыю антыкамуністычнага руху.

У 1992 годзе, у час крызісу камуністычнай партыі і станаўлення дэмакратыі, у Мінску быў створаны

аргкамітэт па судзе над камунізмам "Нюрнберг-2". У газеце "Свабода" за подпісамі лідэраў галоўных партыяў і іншых грамадскіх арганізацыяў быў надрукаваны зварот да грамадства з прызывам узяць удзел у арганізацыі суда над камунізмам і былі акрэслены асноўныя заданні такога суда. У якасці аднаго з галоўных заданняў будучага суда ў звароце прапаноўвалася прызнаць злачыннай камуністычную ідэалогію. І, калі прызнаць гэта як факт, то патрэбен і канкрэтны вынік гэтага прызнання – суд над злачынствам, імя якому – "камуністычная ідэалогія". Таму вельмі важна і юрыдычнае замацаванне ў заканадаўствах розных краін забароны прапаганды навукі аб дыктатуры пралетарыяту і класавай нянавісці – важнага складніка марксісцка-ленінскай тэорыі.

Зразумела, што карысць ад такога кроку была б вялікай, бо гістарычныя шляхі народаў, на жаль, мала грунтуюцца на памылках іх папярэднікаў. І мы маем перыядычны паўтор папярэдніх скрыўленняў чалавечай гісторыі. Але Бог стварыў чалавека не так ужо і безнадзейна грэшнай істотай. Ён даў яму свабоду выбару паміж Дабром і Злом. І надыдзе час, калі чалавек будучага будзе правільна карыстацца дадзенай яму свабодай.

Пастаўленая праблема, аднак, мае вельмі істотную цяжкасць. Яна ў тым, што патрэбен нейкі крытэр злачыннасці камунізму. І хто будзе суддзём?

Нездарма пасля маёй паездкі ў 1993 годзе ў Уладзімір на ўстаноўчы з'езд Міжнароднага камітэта суда над камунізмам "Нюрнберг-2" камуністычныя ідэолагі з вялікім абурэннем пачалі лямантаваць – як гэта можна судзіць (!) вялікае вучэнне Маркса–Леніна–Сталіна і крытыкаваць іх кармушку – камуністычны рэжым.

На 1993 год яны ўжо досыць акрыялі пасля, на жаль, несмяротнага ўдару 1991 г. Яны без кроплі слязы папалілі свае партбілеты і павыходзілі з КПСС, калі зразумелі, што ім нічога страшнага не пагражае. І, маючы магутную мафіёзную сетку "сваіх

людзей" на тэрыторыі ўсяго былога СССР, камуністы зразумелі, і не без падстаў, што можна добра жыць і без білетаў. Пад 90-я гг. XX ст. на вялізным абшары Зямлі – у Савецкім Саюзе была ўтворана новая папуляцыя людзей – "гомо советикус". Дык вось, гэты "гомо советикус" з сваім авангардам КПСС, відавочна, адна з сама унікальных, калі не найунікальнейшая з'ява за ўсю гісторыю людства. Вонкава будаўнікі камунізму выглядалі даволі прыстойна. І ідэалогія іх быццам бы высакародная і чыстая. А на XX з'ездзе КПСС быў нават прыняты эпахальны дакумент – "Маральны кодэкс будаўніка камунізму". За аснову, праўда, былі ўзяты галоўныя хрысціянскія ісціны, выкладзеныя ў Новым Запавеце, аднак яны выдаваліся камуністамі за свае.

Але не ў тым рэч, дзе ўзялі камуністы свае ідэі для свайго кодэкса. Уся жудасць, увесь цынізм у тым, што яны жылі і жывуць паводле адваротнай маралі. Ім удалося стварыць грамадства з антыхрысціяскімі наказамі, стварыць аазіс сатанізму на Зямлі. Усе дзесяць Божых наказаў былі не проста растаптаны, іх антытэзы сталі як бы паводжаннем у жыцці савецкага чалавека.

Вось прыклад. У наш быт трывала ўвайшла прымаўка: "Каб мы жылі ў радасці і шчасці – трэба красці, красці, красці". І кралі. Усе. Ад нізу да самага верху савецкай грамадскай лесвіцы. (Антытэза восьмага наказу – "Не крадзі"). З'явіўся і свой камуністычны праклён: "Каб ты жыў на адну зарплату!"

Глянем, аднак, на наказы па-парадку.

Першыя тры наказы датычаць зносінаў чалавека з Богам: 1. Я Госпад Бог твой. 2. Не ствары сабе куміра. 3. Не кажы імя Бога свайго намарна.

Тут камуністы дзеілі вельмі проста – яны наагул адпрэчылі Бога. І не проста адпрэчылі, а замацавалі гэта на практыцы. Яны пазабівалі вялікае мноства святароў, а ацалелых раскідалі па лагерах. Храмы панішчылі ці ператварылі ў стайні. Сотні каштоўных кніг і абразоў папалілі і вывезлі за мяжу. Сата-

на чыніў баль на тэрыторыі былой Расійскай Імперыі.

Наказ 4: помні, каб дзень суботні свяціў.

Як ведама, старазапаветны дзень субота ў хрысціян заменены нядзеляй. Таму гэты наказ значыць шанаванне нядзелі. А што было ў СССР? Да цяперашняе пары існавала і існуе практыка пераносу на выходныя працоўных дзён – каб "больш пагуляць у іншыя дні". У народнай творчасці гэта адлюстравана вершаваным спосабам: "Спасибо партии родной за доброту и ласку, что отобрала выходной и обос..ла Пасху".

Наказ 5: шануй бацьку і маці сваю, і будзе табе дабро, а ты доўга пражывеш на зямлі.

Яшчэ на пачатку свайго "пераможнага шляху" бальшавікі зламалі старажытны звычай шанавання бацькоў. Успомнім славутага Паўліка Марозава. Ён стаў героем і прыкладам для дзяцей за тое, што прадаў свайго бацьку! Дзеці здавалі сваіх бацькоў у ГПУ, а бацькі выракаліся сваіх дзяцей. А на момант канчатковага сфармавання папуляцыі "гомо советикус" – 1970–1990-я гг. нікога ўжо не дзівілі шматлікія паведамленні ў газетах і часопісах пра згвалтаванні бацькам сваёй дачкі ці пра забойства сынам маці за тое, што не дала грошай на бутэльку.

Наказ 6: не забі.

Паводле колькасці забітых камуністамі людзей гісторыя не ведае аналагаў. На іх рахунку каля 130 млн. забітых. Гэта адбывалася ў розных формах: рэпрэсіі, войны, голад і г. д. Найвялікшая каштоўнасць – чалавечае жыццё – ператварылася для бальшавікоў і іх спадкаемцаў-камуністаў у нішто. Стрэл у патыліцу для супрацоўнікаў НКУС стаў такой самай звыклай справай, як і прыманне ежы ці наведванне прыбіральні. Нават у наш час нашым беларускім "ваякам" нічога не каштавала збіць двух амерыканскіх спартоўцаў, якія пралятаў па Беларусі на паветраным шары. І гэта толькі з той нагоды – "каб чаго не выйшла"! Наша зямля ўсеяна касцьмі забітых і не пахаваных людзей. Усё больш і больш адкрываецца

на Беларусі і тэрыторыі ўсяго былога СССР такіх месцаў, як Курапаты. Але калі ў Расіі і іншых былых рэспубліках СССР адкрыта вядуць размову пра савецкія лагеры, шануюць і рэабілітуюць бязвінна забітых людзей, то беларускія камуністы – былыя і новыя – маюць нахабства адмаўляць факты рэпрэсіяў і змяшчаць у прэсе лжывыя артыкулы, быццам расстрэлы ў Курапатах справа не НКУС, а фашыстаў. З далёкіх ЗША, Польшчы, іншых краін едуць людзі ўва ўрочышча Курапаты, каб аддаць даніну памяці сваім загінулым сваякам і не тое што сваім, а "мабыць сваім". Яны ўсталёўваюць памятныя камяні, крыжы, кладуць кветкі. І толькі ўрад Беларусі нічым не шануе і не хоча шанаваць памяці тых, хто ляжыць непахаваным у лясным урочышчы – у цэнтры Беларусі, пад Мінскам. Да гэтай пары, акрамя крыжа, пастаўленага Беларускім Народным Фронтам, там няма нічога, што сведчыла б пра шанаванне беларусамі сваіх продкаў, сярод якіх нямала радні ў цяперашнім пакаленні. Усе праекты мемарыяльнага комплекса існуюць толькі на паперы, а ў лясным масіве Курапаты штогод збіраюцца на Раданіцу і Дзяды толькі заступнікі дэмакратычных арганізацыяў ды тыя, хто выжыў пасля рэпрэсіяў, іх радня.

Пакуль што марадзёры працягваюць руйнаваць магілы, а 120-ці тысячны міліцэйскі апарат абмінае гэтае месца, каб захаваць імпэт для змагання з мітынгоўцамі і найлепшай часткай беларускай моладзі.

Пра ўсе злачынствы камуністаў сказаць нельга, і не маё заданне рабіць гэта ў адным артыкуле. Ёсць пра тое шмат грунтоўных артыкулаў і кніг. А калі я не ўстрымаўся ад успамінання жаху Курапатаў, дык толькі таму, што на Дзяды-97 быў там і ўвачавідкі бачыў зруйнаваныя магілы і змог прыраўнаць цяперашні стан курапацкіх захаванняў да іх стану ў час першых Дзядоў-88, калі людзей разагнала міліцыя.

Зрэшты, пойдзем далей.

Наказ 7: не чыні пералюбы.

Аб амаральных якасцях савецкіх кіраўнікоў уся-

лякіх рангаў напісаны кнігі. Гэтая амаральнасць бярэ свой пачатак з бальшавіка N 1 – самога Леніна. Ёсць меркаванне, што і хваробу сваю ён атрымаў у парыжскіх бардэлях (паводле сцвярджэння Зянона Пазняка). Шмат напісана аб сэксуальных схільнасцях Лаўрэнція Берыі, апоры Сталіна ў ужыццяўленні мясарубкі Гулага. І наагул, апісанне загарадных "банек" партыйных работнікаў з іх абавязковымі "коньячком" і "девочками" трывала ўвайшло ў рэпертуар кінематографа і ў сусветную літаратуру.

Пра наказ 8 мы ўжо гаварылі.

Наказ 9: не ілжы на блізкага свайго.

Практыка выбівання патрэбных паказанняў у славутай арганізацыі жалезнага Фелікса дасягнула свайго апагея ўжо ў 1930-я гады. Для таго, каб была нейкая бачнасць справядлівасці арышту і наступнага асуджэння, патрэбны былі, згодна з законам, сведкі "антысавецкай" ці "шпіёнскай" дзейнасці падазраванага чалавека. І яны заўсёды знаходзіліся. "Ворагамі народа" ў часы культу асобы Сталіна стаў, фактычна, увесь савецкі народ. Не краіна, а адны ворагі. У наш час даносы на блізкіх прынялі форму "стукацтва". "Стукачы" існавалі, дый існуюць цяпер у кожнай арганізацыі. Вынік іх "працы" – ачышчэнне арганізацыі ад найбольш чынных, сумленных і разумных людзей і атачэнне начальства "нужными" людзьмі, здольнымі прадаць каго хочаш, але да часу патрэбнымі.

І, нарэшце, – наказ 10: не пажадай жонкі блізкага свайго, ні хаціны яго, ні нявольніка яго, ні нявольніцы яго, ані вала, ані жаднага статка ягонага і ўсенькага, што яму належыць.

З гэтым наказам бальшавікі пачалі змагацца з 1917 года. Пра жонак можна сказаць шмат, але я толькі ўспомню таго ж Берыю, які не прапускаў ні адной жонкі сваіх падначаленых. Рабаўніцтва ў маштабах дзяржавы, ужыццёўленае бальшавікамі, атрымала навуковую назву – "экспрапрыяцыя". Усё назбіранае людзьмі праз гады адбіралася без разбору.

Фабрыкі, заводы, дробныя прадпрыемствы – усё ішло падчыстую ў рукі неадукаванай масы ачмурэлай ад улады чэрні. Найпрацавіцейшыя і заможныя сяляне атрымалі назву "кулакі" і выкарыстоўвалі свой гаспадарскі досвед не ў сяле, а ў сібірскіх рудніках.

Рабаўніцтва простых людзей дзяржавай глыбока ўрасло ў камуністычную сістэму, стала амаль нормай. Яно працягваецца і ў наш час, прыняўшы форму шматлікіх падаткаў, сталага росту цэн і іншых завуаляваных формаў.

Вось што зрабілі камуністы з Божымі наказамі. Вось вам "Маральны кодэкс будаўніка камунізму" на справе.

Найагіднейшае, што пакінула ад сябе савецкая сістэма, – гэта здольнасць рабіць усё светлае, добрае – цёмным і дрэнным, а тое, што ўва ўсім свеце паважаецца і ёсць вялікай каштоўнасцю, для камуністаў – вялікае зло і праклён.

Ідэолагі камунізму выпрацавалі з гадамі адметны стыль у сваіх тэарэтычных "трудах". Гэты стыль выдатна адлюстраваны ў вялізнай масе опусаў, напісаных савецкімі пісьменнікамі і філосафамі, партыйнымі сакратарамі, іншымі савецкімі дзеячамі. Пачынаючы з Леніна, мы маем цэлую плеяду "класікаў" – Сталін, Брэжнеў, Гарбачоў...

* * *

Пасля таго, як адбыліся два ўстаноўчыя з'езды МАК па судзе над камунізмам "Нюрнберг-2" (пра іх гаварылася вышэй), я даў некалькі інтэрв'ю.

Дык вось на адно, зусім невялічкае інтэрв'ю ў "СБ", як гнеўную рэакцыю "трудового народа" газета "Мы и время" (№ 13, 1993 г.) змясціла знішчальны артыкул прафесара Івана Кучарава пад красамоўнай назвай "Мозги набекрень".

Як лёгка здагадацца, меліся на ўвазе мае мазгі. Артыкул наагул быў вытрыманы ў вельмі выдатным стылі эпохі Леніна–Сталіна–Брэжнева. Возьмем сам пачатак: "Вожак радикального крыла белорусских

наццемов Анатолий Астапенко, возвратясь со сборища своих единомышленников из Росси, Украины, Литвы, Эстонии, Польши и Румынии, дал интервью...". Перлы падкрэслены мною. Выяўляецца, лідэр партыі (на той час я быў старшынём РК НДПБ) для прафесара-камуніста І. Кучарава – гэта "вожак", а з'езд дэмакратаў МАК – "сборище". У існасці, такі жаргон ужо сам сабою абразлівы, але далей болей: "Согласно биологическим законам у особей с врождённой злобностью происходит самоотравление организма, а мозги сдвигаются набекрень." Чулі пра такія законы? Не? Я таксама. І думаю, ніхто на свеце. Відаць, прафесар "марксистско-ленинского учения" іх сам адкрыў. І як канкрэтны прыклад такой "особи" прафесар прапанаваў "вожака" Астапенку. Можна было б падаць і ў суд на спадара Кучарава за абразу. Але ягоны лёс склаўся так, што пытанне адпала само сабой. Праз некаторы час пасля гэтай публікацыі па прыездзе ў Вільню прафесар быў арыштаваны за спробу дзяржаўнага перавароту ў Літве. (І. Кучараў быў да 1991 г. у складзе ЦК КП Літвы і браў беспасярэдні ўдзел у падзеях крывавай ночы ў Вільні 13 студзеня 1991 года). Ён адседзеў за кратамі некалькі гадоў у Віленскай вязніцы. Выпусцілі праф. І. Кучарава з дапамогай мінскіх камуністаў. У час сядзення беларускія камуністы паспелі стварыць яму імідж ледзь не героя – душы нявінна забітых людзей, што ляжалі на яго сумленні, не лічацца – як заўсёды ў камуністаў. Але нечакана І. Кучараў памірае і цяпер ужо пра яго мала гавораць.

Дык вось, пра "Мозги набекрень". Больш за ўсё аўтара артыкула абурыла тое, што ў сваім інтэрв'ю "СБ" я выказаўся за канечнасць суда над камуністычнай ідэалогіяй. Сама пастаноўка пытання так узлавала прафесара, што ён, відаць, у выніку і выдаў перл аб "особи с врождённой злобностью". Прафесар бліскуча даводзіць, што ён дасканала авалодаў майстэрствам дэмагогіі і псеўданавуковай мудрагелістасці.

Спачатку даецца азначэнне ідэалогіі. Потым ужо ідзе марксісцкая тыпалогія ідэалогіяў: міфічная, рэлігійная і навуковая. Лёгка ўбачыць, што першыя два тыпы – гэта, фактычна, той самы тып. Ну, а навуковая ідэалогія, ведама, тая, якая грунтуецца на матэрыялізме, бо "марксизм-ленинизм единственно правильная идеология". Як у дзіцячых вучылках: "Что такое хорошо и что такое плохо?" Дык ведайце людзі – ідэалізм – гэта дрэнна, а матэрыялізм – добра. Калі не верыце, спытайце ў любога камуніста. У артыкуле І. Кучарава мы чытаем: "Камуністычная ідэалогія – частка грамадскай навуковай ідэалогіі". Бачыце, як жа можна гаварыць пра нейкі там "Суд над камуністычнай ідэалогіяй", калі яна найнавуковейшая, найпрагрэсіўнейшая. Праўда, у артыкуле, зусім у рэчышчы папярэдняй гаворкі, сказана, што вытокі сацыялізму "зыходзяць ад прапаведзей Іісуса Назарэцяніна (Хрыста)". Цікава, між іншага, чаму прафесар не пісаў, як прынята ўва ўсім свеце, імя Збаўцы – Іісус Хрыстос? Партыйныя "ориетировки" не дазволілі?

Што да паходжання сацыялізму ад хрысціянства, дык мы ўжо гаварылі і ведаем, што зрабілі камуністы з навукі Хрыста. Вылучым цяпер галоўнае, што сапраўды адрознівае камуністычную ідэалогію ад усякай іншай і збліжае яе з фашыстоўскай. Гэта навука аб класавай нянавісці (у фашыстаў расавай) і аб дыктататуры пралетарыята (у фашыстаў "белакурая бестыя", блакітная кроў). Вось тут і ёсць корань уседазволенасці, вытокі братазабойчай вайны, рэпрэсіяў. Разам з здзекам над Божымі запаведзямі гэта і прывяло да трыумфу сатанізму на значнай частцы зямнога шара.

Аўтар "Мазгоў", аднак, падводзіць чытача да справядлівага пытання: што значыць судзіць камуністычную ідэалогію? І сам "адказвае": "Судзіць аб'ектыўныя законы прыроды, грамадства, мыслення і духу, судзіць людскія веды, якія апісваюць гэтыя законы, судзіць людзей – носьбітаў ведаў..." і г. д. – адным

словам, нельга судзіць, як жа гэта так, дадам ад сябе, судзіць, прыкладам, закон Кулона?

Тут мы бачым тыповы прыём дэмагогіі. Які ж гэта закон прыроды – пастановы славутай сталінскай тройкі? Ці канібалізм у галоднай Украіне 1930-х гг.? І не чалавечыя веды ды аб'ектыўныя законы ператварылі мільёны людзей у манкуртаў, людзей без роду і племені, пад назвай "советский народ", у цэлыя народы стукачоў і баязлівых згоднікаў. Уся віна ў гэтым кладзецца толькі на бальшавікоў і наступныя пакаленні камуністаў.

Так выйшла, што ўся нашая гісторыя, пачынаючы з 1917 г., становіць сабой страшэнную навуку таго, да чаго прыводзіць адступленне ад Бога, ад Божых наказаў, паказвае ўсю пачварную сілу "князя мира сего" – Люцыфера, замяніўшага Хрыста ў жыцці многіх людзей, народаў, краін. Тое, што чынілася амаль усё XX стагоддзе ў СССР і краінах, залежных ад яго, не ёсць аб'ектыўнымі законамі прыроды. Трэба зразумець, што ж у нас адбылося, і зрабіць так, каб паўтарэння гэтаму ніколі не было. Трэба зразумець, што пабудова сацыялізму і камунізму ў Савецкім Саюзе, краінах Усходняй Еўропы, Азіі – гэта жудасная памылка нашага выбару паміж Дабром і Злом, гэта і ёсць злачыннае скрыўленне шляхоў гісторыі і вялікая навучка для будучых пакаленняў.

Каб не паўтаралася больш такая памылка, і патрэбен суд над камуністычнай ідэалогіяй, які б забараніў прапаганду яе назаўсёды. Суд менавіта над ідэалогіяй, бо яна ляжала ў аснове ўсіх камуністычных злачынстваў. Яна апраўдвала і абгрунтоўвала кожнае злачынства па ўсёй прасторы камуністычных краін. І гэта пачалося яшчэ ад Леніна, што адлюстравана ў ягоных крылатых выразах накшталт: "...Заахвочваць энергію і ўяву масавасці тэрору... Пашыраць ужыванне расстрэлу да ўсіх відаў дзейнасці бальшавікоў, с-р. і т.п. і т.д.", працягвалася і ў эпоху "развитого социализма" з яе БАМам – цяпер амаль што адмерлай чыгункай, працягвалася і ў часы Анд-

ропава з таннай гарэлкай па 4 р. 70 кап. і з беспардоннай міліцэйскай праверкай дакументаў у перапалоханых гледачоў кінафільма дзённага сеанса.

Сур'ёзная праблема вось у чым: для абгрунтавання ідэі суда над камуністычнай ідэалогіяй трэба разгледзець пытанне, паводле якіх крытэраў тую ці іншую ідэалогію трэба адносіць да злачыннай? Адным з такіх крытэраў мог бы быць крытэр таталітарнасці рэжыму. Гэты рэжым адказны за шматлікія фізічныя ахвяры, а таксама і духовыя. Духовая дэградацыя грамадства – адна з галоўных прыкмет савецкага грамадства. А духовая смерць шмат страшней за фізічную. Вынікам камуністычнага вар'яцтва ёсць не толькі скрыўленне гісторыі, але і ўтварэнне новай жахлівай, нялюдскай мутацыі чалавека. Гома саветыкус і ёсць прыкладам такой мутацыі. І яшчэ няведама, чым жа скончыцца гэты цяперашні мутацыйны перыяд. Ёсць вялікая небяспека вяртання назад – у настальгічны сацыялізм, але вяртанне на новым вітку дыялектычнай спіралі, і гэта можа прывесці людства нават да пагібелі.

Таму суд над камунізмам патрэбен. І суд над камуністычнай ідэалогіяй найперш. На гэтым судзе мы павінны даць патрэбную адзнаку гэтай ідэалогіі, акрэсліць яе назаўсёды як антычалавечую, канібальскую ідэалогію. Трэба каб пасля суда слова "камунізм", як і слова "фашызм", было аднолькава агідным для людзей. Мы не можам забараніць людзям верыць у тое ці гэтае. Але трэба, каб грамадства ведала, што прыхільнасць да камунізму – тое самае, што і прыхільнасць да сатанізму. У кожным грамадстве, прыкладам, ёсць невялікая колькасць сэксуальных маньякаў, але ж мы іх стараемся ізаляваць ад людзей.

Так і тут. Фашызм і камунізм, як анамальныя з'явы, будуць дзе-нідзе праяўляцца, аднак мы павінны ўмець лекаваць грамадства ад гэтых праяў.

*Суд над камунізмам "Нюрнберг-2", на мой пагляд, будзе скіраваны найперш на асуджэнне камуністычнай ідэалогіі. Фізічныя асобы, як і камуністычныя*

*структуры, з'явы часовыя. Яны могуць несці пакаранне і пытанне будзе закрытае. Ідэалогія ж – гэта з'ява надчасавая. Адным ударам яе не знішчыць. Спатрэбяцца многія гады, дзесяцігоддзі. А можа, і сотні гадоў, каб слова "камунізм" увайшло ў сведамасць людзей – больш за тое, іх ментальнасць, як амаральнае, агіднае слова, слова, за якім адчуваецца подых апраметнай.*

### *НДПБ аб'ядноўваецца і... распадаецца*

> Восем мільёнаў... гэта нямала...
> ... душы пакласці – за другі! –
> новая з л у ч н а с ц ь
> у свеце паўстала:
> Сілка – Астапенка – Лугін...
>
> *Зьніч*

Першая спроба аб'яднання партыяў дэмакратычнай накіраванасці ў звяз партыяў для каардынацыі і правядзення супольных акцыяў належыць Міхасю Ткачову – старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады, утворанай у сакавіку 1991 г. Ягоная прапанова ўтварэння блока дэмакратычных сіл "Новая Беларусь" узімку 1991–1992 гг. стала першай аб'яднаўчай акцыяй дэмакратаў, што потым працягваліся, фактычна, безвынікова, усе наступныя 15 гадоў і з'яўляюць АДС (Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы) у наш час.

У той час (канец 1991 г.) палітычны спектр беларускага бамонду зяўлялі толькі чатыры партыі: Аб'яднаная дэмакратычная партыя (АДП) (лідэр – Анатоль Жыватнюк, потым Аляксандр Дабравольскі), Беларуская сялянская партыя (БСП) (старшыня Яўген Лугін), Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада (БСДГ) (Міхась Ткачоў) і нашая НДПБ з трыма старшынямі. (Камуністычная партыя Беларусі была тады якраз зачыненая пасля знакамітага путчу). А галоўная палітычная структура ў 1991–1992 гг. – Беларускі Народны Фронт (БНФ), які не сфармаваўся яшчэ ў партыю, але на той час быў моцным палітычным утварэннем – "Рухам за перабудо-

ву”. Фактычна, БНФ імкнуўся дыктаваць усім маладым партыям “як ім жыць”, г. зн. як будаваць сваю палітыку. Зянон Пазняк канкрэтна сцвярджаў: усе партыі павінны стаць структурнымі ўтварэннямі Фронту. Усе мы павінны былі, паводле ягонай задумы, падпарадкоўвацца БНФ і свае дзеянні павінны былі ўзгадняць у Сойме ці Управе БНФ.

Аднак такая перспектыва падабалася далёка не ўсім. Наадварот, на тое і ўтварыліся новыя партыі, каб самім браць удзел у палітыцы, а не праз франтаўскія арганізацыі. Асабліва моцна аўра Пазняка ўплывала на Грамаду і НДПБ, у нейкім сэнсе “даччыныя” ўтварэнні. Тым больш гэта было – з іх гледзішча – натуральным з прычыны канцэнтрацыі дзейнасці НДПБ і БСДГ вакол ідэі нацыянальнага адраджэння Беларусі.

І калі М. Ткачоў выступіў з прапановай стварыць блок дэмакратычных сілаў “Новая Беларусь”, яго спачатку падтрымала Сялянская партыя, лідэр якой Яўген Лугін заўсёды меў незалежніцкія пагляды і станоўча ставіўся да ідэі аб’яднання дэмакратаў. Падтрымала напачатку “Новую Беларусь” і кіраўніцтва НДПБ у асобе Віктара Навуменкі і мяне. Але потым усё змянілася. Пасля рэзкай адмоўнай рэакцыі БНФ, крыклiва-помслівых выступаў Зянона Пазняка, мой калега-сустаршыня і некаторыя іншыя сябры партыі выступілі супраць блока “Новая Беларусь”. З гэтай пары пачаліся нашы разыходжанні з Віктарам, якія пазней прывялі да расколу партыі. А выхад НДПБ з блока стаў, фактычна, прычынай яго развалу, ці хутчэй – проста неўтварэння.

Але потым мы ўсё ж утварылі яшчэ адно міжпартыйнае аб’яднанне – кааліцыю **НХС – нацыяналы-хрысціяне-сяляне,** у складзе трох партыяў НДПБ, БХДЗ і БСП. Гэтая падзея адбылася ў красавіку 1992 г., пасля падпісання гэтымі партыямі дэкларацыі аб супрацы. У дэкларацыі выказаная глыбокая думка, што чалавечая існасць трымаецца на трох кітах: “на веры ў найвышэйшую справядлівасць, якая

спакон вякоў увасабляецца ў веры ў Бога; на вернасці свайму народу, якая выяўляецца ў шанаванні яго гісторыі, культуры і звычаяў, і на любасці да сваёй зямлі". Менавіта гэтыя тры каштоўнасці ёсць вызначальнымі для трох партыяў – БХДЗ, БНП і БСП, адпаведна іх пераліку.

Для Хрысціянска-дэмакратычнай злучнасці асноўнае – адраджэнне духовасці і веры ў ідэалы дабра і справядлівасці. Для Нацыянальна-дэмакратычнай партыі першаснае заданне – вярнуць беларусам гонар за сваю гісторыю і культуру і дамагчыся, каб кожны беларус усведаміў, што толькі ў нацыянальнай еднасці можна стаць упоравень з іншымі еўрапейскімі народамі. Сялянская партыя прыкладае ўсе намаганні, каб вольны чалавек у поўнай меры атрымліваў плён ад працы на ўласнай зямлі і дбаў пра яе росквіт, бо сапраўдныя гаспадары ніколі б не дапусцілі заняпаду сяла і спустошання зямлі. Кожны з удзельнікаў кааліцыі падтрымлівае мэты адзін аднаго, і гэта дае змогу паяднаць намаганні для выканання сваіх праграмаў і ўзгадняць свае дзеянні ў далейшым. Падпісалі дэкларацыю ад БХДЗ Пётр Сілка, ад НДПБ Анатоль Астапенка, ад БСП Яўген Лугін.

Пра наватвораную кааліцыю напісалі амаль што ўсе тагачасныя газеты, а ў газетах "Літаратура і мастацтва", "Выбар" былі надрукаваныя мае артыкулы пад гучнай назвай "Кааліцыя трох і шлях да выратавання беларускага народа". Алег Бембель – ён жа Зьніч – напісаў нават верш, які я паставіў эпіграфам – "Новая злучнасць у свеце паўстала: Сілка, Астапенка, Лугін..."

Ідэя нашай кааліцыі была вельмі добрая і, як нам здавалася, своечасовая. Сапраўды, тры нашы партыі – гэта ўвесь спектр грамадскага жыцця, мы ўвасаблялі і маральныя, і прагматычны мары, імкненні грамадзяніна Беларусі. БХДЗ, НДПБ і БСП – гэта тры партыі, тры кіты, на якіх трымаецца, у існасці, нацыя і дзяржава, бо і ў іх творчасці ўвасабляецца *хрысціянства, нацыянальная ідэя* і *зямля* ў шырокім

сэнсе слова. Таму, зразумела, што радкі ў Хамайдаўскім "Выбары" пра перспектывы кааліцыі пісаліся мною тады з вялікай верай і надзеяй:

*Кааліцыя трох партыяў НХС, што нядаўна была ўтворана, – не выпадковая з'ява і стала важным крокам да кансалідацыі дэмакратычных сілаў. НХС нясе адказнасць за лёс беларускага народа і абумоўлена жорсткай рэальнасцю, гаротным становішчам беларускага народа, якое праявілася як у матэрыяльнай сферы, так і ў інтэлектуальнай, якая адметная, што больш страшна, бездухоўнасцю і маральнай дэградацыяй. Акцэнт на духовы аспект праблемы зроблены невыпадкова. Матэрыяльнае становішча паправіць мажліва заўсёды, а скалечаную душу – можна ўжо і не выратаваць. З беларускай нацыяй здарылася якраз найгоршае: нашы набыткі ведамыя – нацыянальны нігілізм, антыхрыстава філасофія і адзіны, гэтак званы кілбасны інтарэс. Калі прыраўнаць нас з суседзямі – летувісамі ці ўкраінцамі, то гэтае прыраўнанне будзе не на нашу карысць. Нізкі ровень духоўнасці беспасярэдне звязаны і з такой з'явай у нашым асяроддзі, як нізкі ровень палітычнай культуры ці наагул апалітычнасць...*

У той складанай палітычнай сітуацыі, у якой апынулася маладая Рэспубліка Беларусь у 1992 г. пасля ліквідацыі камуністычнай партыі і яе шматлікіх структур, напярэдадні рэферэндума за адстаўку Вярхоўнага Савета – які так і не адбыўся – вялікая адказнасць ускладалася на палітычныя партыі. "Ім наканавана несці свой крыж у нялёгкай барацьбе з бальшавізмам, які яшчэ доўга будзе працінаць усе сферы нашага грамадства і нас саміх. Утварэнне кааліцыі НХС дасць магчымасць аб'яднаць намаганні кожнай з уваходзячых у яе партыяў у справе стварэння супольнай праграмы выхаду з крызісу" ("ЛІМ", 1992 г., 3 ліпеня).

Нашая супольная праграма НХС выглядала вельмі грунтоўнай і магла б стаць праграмай-арыенцірам для

ўсяго грамадства, стаць кансалідоўным чыннікам беларускага народа і даць базу выхаду з той цяжкай эканамічнай сітуацыі, што склалася ў Беларусі.

Аднак выйшла "як заўсёды". Замест аб'яднання адбылося раз'яднанне. Як заўсёды галоўнай сілай супраць новай кааліцыі, як і ў выпадку блока "Новая Беларусь", стаў БНФ. Апантанасць Зянона Пазняка часта служыла не на карысць нашай супольнай справе – стварэнню дэмакратычнай, незалежнай і беларускай дзяржавы. Цяпер можна толькі пацвердзіць мае тагачасныя думкі аб адмоўнай ролі Пазняка ў кансалідацыі дэмакратычных сілаў. Яму не ставала палітычнай культуры, каб зразумець патрэбнасць і прагрэсіўнасць працэсаў накшталт стварэння нашай кааліцыі НХС, яму трэба было быць трохі вышэй за свае амбіцыі і не пераацэньваць сваёй вылучнасці. Усё гэта прывяло толькі да тармажэння і ўрэшце да шэрагу расколаў у маладых партыях, што сваім парадкам яшчэ больш панізіла іх аўтарытэт, і без таго не надта высокі ў вачах грамадства.

Беларуская сялянская партыя ў цяжкім унутрыпартыйным змаганні ўтрымала свой статус незалежнай партыі сялян і фермераў, а яе лідэр Яўген Лугін яшчэ колькі гадоў (да 1998 г.) кіраваў партыяй, якая паступова слабела, пакуль не спыніла свайго існавання, не прайшоўшы перарэгістрацыі. Сам Яўген Міхайлавіч Лугін далучыўся да БНФ, ён браў удзел у шэрагу розных дэмакратычных праектаў і зусім нядаўна, у 72 гады спыніў свой зямны шлях, пакінуўшы пра сябе вельмі добрую памяць.

Беларуская хрысціянска-дэмакратычная злучнасць у 1993 г. распалася на дзве партыі: "прафронтаўскую" Беларускую хрысціянска-дэмакратычную партыю пад кіраўніцтвам прафесара Міколы Крукоўскага і партыю з ранейшай назвай – БХДЗ, якая адбараніла свой юрыдычны статус і адзінага старшыню Пятра Сілку, але стала значна слабейшай і, у выніку, таксама знікла ў 1999 г.

Нарэшце колькі слоў пра Нацыянальна-дэмакратычную партыю Беларусі. Яе шлях быў падобны да

шляху сяброўскіх партыяў кааліцыі, але яшчэ больш заблытаны. Спачатку было створана Радыкальнае крыло НДПБ (Устаноўчая канферэнцыя РК НДПБ адбылася 26 жніўня 1992 г.). Трэба адзначыць, што гоману гэтая падзея нарабіла. Вось толькі некаторыя загалоўкі з газет: "Цяпер – ляцець з адным крылом, радыкальным" ("Добры вечар", 1992, 8 кастрычніка), "Радыкальней за нацдэма можа быць толькі нацдэм" ("Рэспубліка", 1992, 2 кастрычніка), "Мы не шатаемся между правыми и левыми, мы – самые правые" ("7 дней", 1992, 2–8 ноября). І пра радыкальнасць – намі была прынятая абсалютна арыгінальная і смелая для тых часоў праграма Радыкальнага крыла НДПБ, дзе ўпершыню нацыяналізм быў абвешчаны як праграмны прынцып.

На 3-й канферэнцыі НДПБ, што адбылася 3 кастрычніка 1992 г. была прынятая гэтая праграма Радыкальнага крыла (канкуравала ажно тры варыянты праграмы!) і... адбыўся распад. З гэтага часу НДПБ пачала існаваць як бы ў дзвюх іпастасях, дзвюх непрымірымых структурах пад той самай назвай – Нацыянальна-дэмакратычная партыя Беларусі. Завязалася бясконцая цяганіна з Мін'юстам за стутус "сапраўднай" партыі, у выніку з РК НДПБ на ўстаноўчай канферэнцыі 9-га сакавіка 1994 г. была ўтворана новая партыя – Беларуская нацыянальная партыя, у якой я стаў старшынём. А старая Нацыянальна-дэмакратычная партыя Беларусі памяняла назву згодна з новым заканадаўствам: Нацыянальна-дэмакратычная партыя беларусаў (замест "Беларусі" выкарысталі "беларусаў", каб захаваць абрэвіятуру НДПБ). Абедзве партыі праіснавалі да канца 90-х гг. XX ст. і таксама зніклі. Але гэта ўжо іншая гісторыя.

### *Беларуская нацыянальная партыя (БНП)*

Стварэнне БНП было, на маю думку, вынікам, з аднаго боку, пасіянарнага працэсу развіцця маладой дэмакратыі ў Беларусі на пачатку 90-х гг. мінулага стагоддзя, і, з другога боку – што бліжэй да праўды, –

адной з першых ластавак пачатку перманентнага распаду палітычных партыяў, які паспяхова доўжыцца і да сёння.

Відавочна, пачаткам, першай фазай стварэння Беларускай нацыянальнай партыі былі непаразуменні ў НДПБ, якія ўзніклі яшчэ той далёкай зімой 1992 г., калі Міхась Ткачоў ствараў "Новую Беларусь". Схема простая як граблі: Зянон Пазняк не мог дапусціць утварэння ніякай іншай структуры па-за БНФ і не мог дапусціць узвышэння нікога, акрамя сябе, нават і сябра, якім быў для яго Ткачоў. Гледзячы цяпер на далейшую эвалюцыю палітычнага руху ў Беларусі, заняпад і таксама распад Беларускага Народнага Фронту, ператварэння дэмакратычных партыяў у марыянеткавы прыдатак спецслужбаў, я думаю, што не малая віна ў гэтым цяперашняга эмігранта Пазняка.

Супярэчнасці ў НДПБ, пра якія я гаварыў, узраслі яшчэ больш пасля ўтварэння гэтак званай "кааліцыі трох" – НДПБ, БХДЗ і БСП (аб гэтай кааліцыі таксама гаварылася ў раздзеле пра НДПБ). Урэшце, было створана Радыкальнае крыло РК НДПБ.

Устаноўчая канферэнцыя РК НДПБ адбылася 26 жніўня 1992 г. Была пранятая "Заява" аб стварэнні РК НДПБ і платформа "Крыла" пад назвай "Кірункі дзейнасці і прынцыпы Нацыянальна-дэмакратычнай партыі Беларусі (Радыкальнае крыло)". Найадважнейшай і найвыдатнейшай рэччу сталі прынцыпы, абвешчаныя ў гэтай платформе. Яны такія сціслыя і лаканічныя, што мае сэнс іх прывесці цалкам:

*Мы – нацыяналісты. Настаў час вярнуць гэтаму слову яго спрадвечны станоўчы сэнс. Нацыяналізм – гэта адданасць сваёй нацыі, нацыяналізм – гэта змаганне за яе волю і незалежнасць, за яе духоўную і фізічную моц, за яе права быць роўнай сярод роўных.*

*Нацыянальная ідэя з'яўляецца для нас першараднай, яна – самы галоўны з усіх чалавечых набыткаў у сферы грамадскага жыцця. Дэмакратычнае грамадства – гэта мэта, да якое павінен прыйсці*

*наш народ, і галоўным механізмам для яе дасягнення з'яўляецца менавіта нацыянальна ідэя.*

*Мы – бескампрамісныя антыкамуністы. Мы будзем дамагацца прыняцця заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб забароне ўсіх неакамуністычных парыяў і рухаў, якія з'яўляюцца нашчадкамі былой КПСС-КПБ, або грунтуюцца на злачыннай камуністычнай ідэалогіі, у аснове якой пакладзены культ гвалту.*

*Мы не хістаемся паміж правымі і левымі. Нацыянальна-дэмакратычная партыя – самая правая. Таму ні сацыял-дэмакратычны, ні цэнтрысцкі шлях не можа быць намі прыняты".*

На той час больш радыкальнай праграмы не існавала ні ў адной партыі.

У Радыкальнае крыло НДПБ (РК НДПБ) увайшлі: Анатоль Астапенка (старшыня і ідэолаг), Міхась Міньчык (намеснік), сябра БНФ Валеры Буйвал, пісьменнік Іван Шальманаў, мастацтвазнаўца прафесар Віктар Шматаў, іншыя.

Пасля 3-й канферэнцыі НДПБ 3 кастрычніка 1992 г., як пісалася вышэй у раздзеле пра НДПБ, была прынятая гэтая праграма Радыкальнага крыла і адбыўся раскол партыі. З таго часу і да ўстаноўчай канферэнцыі новай партыі – Беларускай нацыянальнай партыі (БНП) – у Беларусі існавалі дзве паралельныя структуры НДПБ, якія, як лёгка здагадацца, не вельмі сябравалі паміж сабой.

На пачатку 1994 г. на базе адной з структураў НДПБ – той, што стала спадкаемцай РК НДПБ, – быў утвораны аргкамітэт стварэння Беларускай нацыянальнай партыі, а 9 красавіка адбылася ўстаноўчая канферэнцыя гэтай партыі. Быў прыняты статут і першая ў Беларусі нацыяналістычная праграма.

Галоўным светаглядным крокам БНП, на мой пагляд, было цвярозае ўсведамленне *згубнасці* для беларускай нацыі *дэмакратычнага падыходу* ў нацыянальным пытанні. Нават з назвы партыі так моднае на той час слова "дэмакратычная" было знятае.

У прэамбуле праграмы на гэты конт было сказана: "БНП лічыць, што многія сучасныя партыі і рухі, якія абвяшчаюць сябе дэмакратычнымі, па-сутнасці псеўдадэмакратычныя і таму няздольныя павесці беларускі народ па шляху еўрапейскае дэмакратыі – дух бальшавізму яшчэ моцны ў гэтых арганізацыях. БНП мяркуе, што пра дэмакратыю, як найбліжэйшую мэту, гаварыць яшчэ рана".

БНП была першай партыяй, у якой нацыяналізм абвясцілі галоўным прынцыпам. У прынятай праграме былі развітыя прыточаныя вышэй пастулаты Радыкальнага крыла НДПБ, быў зроблены акцэнт на нацыяналізм як існасць самога чалавека – на "нацыяналізм як найлепшую духоўную якасць асобы чалавека". Быў зроблены ўпор на мусовасць аднаўлення гістарычнай памяці беларускага народа, на ідэю нацыянальнай велічы Беларусі. Упершыню нацыянальная ідэя была ўвязаная з хрысціянскімі каштоўнасцямі: "Нацыянальнае адраджэнне ёсць складовая частка духовага адраджэння. БНП за адраджэнне беларускае духоўнасці на прынцыпах патрыятызму, традыцыяналізму, хрысціянскае этыкі і маралі". І таму ў спектры палітычных партыяў БНП сябе вызначыла як партыя хрысціянска-дэмакратычнага кірунку.

Акрамя сяброў НДПБ у партыю прыйшлі новыя людзі – навукоўцы, выкладнікі ВНУ, творчая інтэлігенцыя. Асаблівасцю БНП было ўтварэнне навуковага аддзелу, які ўзначаліла Святлана Новікава – дырэктар Інстытута матэматыкі і кібернэтыкі, загадніца лабараторыі шматроўневых іерархічных сістэмаў. Старшынём стаў лідэр "адшчапенскай" часткі НДПБ Анатоль Астапенка – аўтар гэтай кнігі, намеснікамі старшыні абраныя – Аляксей Бураўкін, Міхась Міньчык і Мікола Курак.

Асноўнай ідэяй на якой мусіла грунтавацца дзейнасць БНП, была ідэя нацыянальная. Ідэолагі БНП абвясцілі сваё крэда празрыста і выразна: Беларуская нацыянальная ідэя мусіць быць асновай не толькі нацыянальнай партыі, а ўсякай партыі ў Беларусі, і

наагул усякай грамадзянскай арганізацыі і, больш за тое, яна мусіць стаць асновай дзяржаўнай палітыкі. Нездарма інтэрв'ю "Народнай газеце", якое я даў пасля рэгістрацыі партыі (20 верасня 1994 г.), атрымала назву "Мы нацыяналісты – партыя дзяржаўная". Тут падкрэслена тое, што я сказаў вышэй – нацыяналізм павінен стаць маральным і кіроўным прынцыпам дзяржавы. Вось нашае крэда з гэтага інтэрв'ю: "...мы – дзяржаўная партыя, бо адлюстроўваем ідэю нацыянальна-дзяржаўнай еднасці, якая патрэбна ўсім – і левым, і правым, і прэзідэнту, і ўраду. Таму мы не стаім у апазіцыі да ўлады, а, наадварот, прапануем супрацу: свой інтэлект, праграмы, ідэі і распрацоўкі".

Калі раней, да стварэння нацыянальнай партыі, я лічыў, што ідэалогія нацыяналізму – гэта рыса партыяў правага кірунку, то потым паступова перамяніў свой светагляд у бок цэнтрызму. Сапраўды – нацыянальная ідэя ў развітай самастойнай краіне – гэта не прэрагатыва "купкі нацыяналістаў", а рыса ўсяго грамадства. Таму, відавочна, нацыянальная ідэя павінна працінаць усе сферы грамадства, стаць светагляднай для ўсякага чалавека краіны. І партыя, якая ставіць беларускую нацыянальную ідэю сваім галоўным заданнем, мусіць быць ні справа, і ні злева, а хутчэй і там – і там. Таму яе можна было б назваць цэнтрысцкай.

Інтэрв'ю з адкрытым нацыяналістам, надрукаванае ў галоўнай дзяржаўнай "Народнай газеце" ў 1994 г., было дадзена у той час, калі мінуў ужо досыць працяглы тэрмін (каля 5–6 гадоў) ад усталявання прынцыпаў дэмакратыі і нацыянальна-адраджэнцкіх праектаў у Рэспубліцы Беларусь. Аднак, як паказала рэакцыя на інтэрв'ю, пяць гадоў без камуністаў гэта вельмі мала. Вось як хваравіта, пасаўковаму рэагавала адна з незалежных дэмакратычных тады газет – "Газета Андрэя Клімава": "Мы нічога не маем супраць адраджэння нацыянальнай ідэі, але згадзіцеся, загаловак "Мы нацыяналісты – партыя дзяржаўная" – больш чым прэтэнцыёзны...

Нацыяналізм жа, узведзены ў ранг дзяржаўнай палітыкі, ва ўсім свеце завецца не інакш як нацызм. Што ж прапануе беларускаму народу навaспечаны бацька – Анатоль Астапенка? Пазіцыя БНФ для яго на сённяшні дзень занадта ліберальна. ...Яго заданне, як ён сам тлумачыць, спыніць дэградацыю грамадства палітычнымі сродкамі.” А трохі далей аўтары літаральна смяюцца з майго пажадання беларускаму народу “ўсведаміць сваю нацыянальную веліч, як гэта было ў часы Вялікага княства Літоўскага”, як над нечым яўна недарэчным. Ці гэта проста невуцтва, брак элементарных гістарычных ведаў?

Яшчэ адзін цікавы праграмны пункт БНП, які да гэтай пары выклікае шмат пытанняў і не атрымаў адназначнай рэакцыі. Ён гучыць гэтак: “БНП стаіць за адбудову незалежнае, сабoрнае (г. зн. адзінае ў прасторы і часе) дзяржавы Беларусь. Безумоўна, на тэрыторыі Беларусі жывуць і будуць жыць расійцы, палякі, украінцы і людзі іншых нацыянальнасцяў, аднак яны не маюць у межах Беларусі сваіх этнічных тэрыторыяў і таму не складаюць асобных народаў, а толькі адпаведныя этнічныя групы сваіх этнасаў”. І сапраўды гэта так – толькі тытульная нацыя ўтаесамляецца з усім (тытульным) народам – у дадзеным выпадку беларускім, – астатнія – толькі этнічныя групы на тэрыторыі гэтага народа. Такі падыход, фактычна, існуе ў усякай развітай нацыянальнай дзяржаве. І калі ты жывеш на тэрыторыі пэўнай краіны і належыш да нацыі гэтай краіны, то ты – Дома. Астатнія нацыянальныя групоўкі, этнасы – толькі госці ў маім Доме. У сучаснай Беларусі, на жаль, быць беларусам нічога не значыць. Іншы, прышлы грамадзянін з-пад Саратава часам сядзіць на важнай пасадзе і смяецца з маёй беларускасці.

У жыцці і дзейнасці БНП таксама былі моманты “аб’яднаўчага свербу”. Так у 1996 г. ад Партыі Здаровага Сэнсу, якая ў той час праяўляла вялікую актыўнасць у грамадскім жыцці, зыходзіла ініцыятыва аб’яднацца партыям дэмакратычнага кірунку.

Гэтую ідэю падтрымалі мы – Беларуская нацыянальная партыя і БХДЗ. Аднак гэтая спроба таксама пацярпела паразу.




Аб'яднаўчы з'езд БНП, ПЗС і БХДЗ 1996 г.
Справа налева: А. Астапенка (БНП), П. Сілка (БХДЗ), І. Каравайчык (ПЗС).

### *Першы з'езд нацыяналістаў*

Праходзіў з'езд у Віцебску 26–27 лістапада 1994 г. У ім узялі ўдзел Беларуская нацыянальная партыя, Беларуская партыя свабоды, Правы рэванш, анархісты, сябры БНФ і журналісты. Ідэя гэтага з'езду, наколькі я помню, належала паэту Славаміру Адамовічу, які тады пазіцыянаваў сябе як лідэр ультраправай арганізацыі Правы Рэванш. Праўда, акрамя самога лідэра гэтага Рэваншу, ніякіх іншых сяброў гэтай арганізацыі мне нешта не траплялася.

Затое ідэю з'езда нацыяналістаў падтрымалі многія на той час чынныя грамадзяне рознага веку, розных партыяў. Перш за ўсё падтрымалі мы, Беларуская нацыянальная партыя. Другое – Партыя свабоды, якую ўзначальваў Сяржук Высоцкі. Ну і яшчэ заступнікі розных арганізацыяў накшталт анархістаў.

Лозунг з'езду: "Бацькаўшчыне і Нацыі!"

Прыкладна 50–60 чалавек сышло з цягніка "Мінск – Віцебск" раніцай 26 лістапада 1994 г. Да галерэі Пушкіна, дзе мусіў быў адбыцца з'езд нацыяналістаў, пацягнуліся пешшу, было яшчэ даволі рана, час быў – чаму б і не прайсціся. Захапляла яркае відовішча стракатай калоны людзей, што не

пабаяліся назваць сябе нацыяналістамі і прайсціся па вуліцах яшчэ соннага Віцебска. Віравалі бел-чырвона-белыя сцягі, настрой быў прыўзняты, калі не святочны. Незвычайнасць падзеі падкрэсліваў эскорт з некалькіх міліцэйскіх уазікаў, якія замыкалі калону. Зразумела, гэтае суправаджэнне нікім не заказвалася.


г. Віцебск 26/27 лістапада 1994 г.

МАНДАТ

удзельніка

Першага Зьезду Беларускіх Нацыяналістаў

№ 49

Прозьвішча АСТАПЕНКА

Імя АНАТОЛЬ

Бацькаўшчыне і Нацыі!

Мандат удзельніка I З'езда Беларускіх нацыяналістаў.

І нікога не здзівіла, што ў памяшканні галерэі Пушкіна, дзе планавалася сустрэча дэлегатаў, нібыта нехта "падклаў міну". Уваход у памяшканне быў заблакаваны, і мноства людзей стоўпіліся ля будынка. Гэты танны міліцэйскі прыём "мінавання" памяшкання з кожнай нагоды, абы не даць правесці мерапрымства, быў нам добра ведамы. У тыя часы гэты прыём быў вельмі пашыраны. Ужо пазней улады засвоілі больш цывілізаваны спосаб забароны мерапрыемстваў, прыкладам – "у звязку з пастановай дырэкцыі, адмовай чыноўнікаў вертыкалі" і г. д. Зразумела, што ходку "страшных нацыяналістаў" трэба было мінаваць і мінаваць...

Чакаючы сапёраў, мы ламалі галовы: "Што рабіць далей?" І... карыстаючыся момантам, чынна давалі інтэрв'ю шматлікім журналістам. Дарэчы, былі нават тэлевізійнікі – расійскі канал НТВ, якім я выказаў усё, што думаю пра беларускі нацыяналізм і акупацыю "маскалямі" нашай краіны ў XVIII–XIX стст.

Сябры Беларускай нацыянальнай партыі складалі немалую частку дэлегатаў з'езда. І таму мы надумалі стварыць сваю секцыю з'езда і правесці яе на кватэры аднаго з нашых сяброў – у Алеся Фраленкі, ведамага віцебскага дысідэнта. Так і зрабілі.

Да глыбокай ночы ўва ўтульным пакоі гаспадара

мы засядалі, зачытвалі свае запланаваныя да з'езда даклады, абмяркоўвалі іх – адны словам, з'езд адбываўся ў падполлі.

Там, дарэчы, я ўпершыню выступіў з дакладам пра хрысціянскі сэнс нацыянальнай ідэі, што пазней паслужыла штуршком для напісання кнігі "Паслухайце нацыяналіста". Павел Бука, сябра Вышняй Рады БНП і Управы, прачытаў даклад аб шырокіх мажлівасцях дзяржаўнага будавання на аснове сістэмнага аналізу і тэорыі шматроўневых іерархічных сістэм. Выступіў старшыня Віцебскай філіі БНП Алесь Мудрычэнка. Вельмі цікавы даклад зрабіў ветэран адраджэнцкага руху, сябра БНП, Сцяпан Місько, пра якога я ўжо гаварыў.

На другі дзень мы ўсё ж прайшлі ў залу галерэі Пушкіна, атрымалі мандаты, выступілі з прамовамі, прынялі адпаведныя рэзалюцыі аб важнасці і патрэбнасці пашырэння беларускага нацыяналізму, развіцці беларускай нацыянальнай ідэі.

Меркавалася, што з'езд, які адбыўся, будзе толькі пачаткам шырокага нацыянальнага руху ў Беларусі. Была прынята пастанова аб хуткім правядзенні другога з'зда нацыяналістаў, які б сабраў шырокія масы беларусаў: палітыкаў, літаратараў, мастакоў – усіх хто аддана працуе на адраджэнне Бацькаўшчыны. Але жыццё павярнулася да нас іншым бокам. Вельмі хутка ўсім стала не да з'ездаў.

Ніхто тады яшчэ не ведаў, што менш чым праз два гады, у 1996 г., адбудзецца знакавая падзея – А. Р. Лукашэнка атрымае неабмежаваную ўладу, і нацыянальна-дэмакратычны рух будзе паступова знішчацца, а на пачатак XXI ст. слова "нацыяналіст" стане такім самым страшным, як слова "нацдэм" у 30-я гады XX ст.

Славамір Адамовіч неўзабаве сядзе ў турму за верш "Убей президента", адсядзіць у віцебскай вязніцы 11 месяцаў, а потым з'едзе з Беларусі ў Нарвегію.

Сяржук Высоцкі да гэтай пары застаецца старшынём незарэгістраванай Партыі Свабоды і ўжыц-

цяўляе свае нацыянальныя праекты недзе ва Украіне, здаецца, у Кіеве.

Алесь Мудрычэнка прыняў ці то будызм, ці то ламаізм, жыў у ашрамах сібірскіх лам, а цяпер вольны жыхар горада Віцебска.

## 10. Заключныя заўвагі аб мадэрнісцкім этапе беларускай нацыі

БНФ з самага пачатку апынуўся на вяршыні палітычных працэсаў у Беларусі і задаваў пэўны тон у дзяржаўнай палітыцы Беларусі, карыстаючыся ў вялікай ступені разгубленасцю камуністаў і працэсам распаду СССР. Аднак з 1995 г., пацярпеўшы паразу на выбарах у Вярхоўны Савет, роля і аўтарытэт БНФ у грамадстве пачалі імкліва падаць. І цяпер абедзве партыі: БНФ Вячоркі і КХП Пазняка – ёсць шараговымі грамадскімі арганізацыямі, фактычна, без уплыву на палітычныя працэсы ў Беларусі.

Зніклі іншыя палітычныя партыі, што працавалі на нацыянальнае адраджэнне: Нацыянальна-дэмакратычная партыя Беларусі і Беларуская нацыянальная партыя. Знікла і мноства грамадскіх нацыянальных арганізацыяў накшталт Зубра, Правага рэваншу і г. д. Вялікія цяжкасці даводзіцца пераадольваць старэйшым аб'яднанням – Згуртаванню беларусаў свету "Бацькаўшчына" і Таварыству беларускай мовы.

Такім парадкам, пачынаючы з 1996 г. усе працэсы, звязаныя з чацвертай хваляй нацыянальнага адраджэння, пачалі паступова затухаць. Аднак новае XXI ст. спарадзіла новую з'яву – гэтак званы "лукашэнкаўскі нацыяналізм" і адметную беларускую субкультуру, якую я буду называць "Культура-2". Аб гэтай з'яве гаворка пойдзе ніжэй.

*Рэзюмэ. У цяперашні час працэс фармавання мадэрнай беларускай нацыі хутчэй не прыпыніўся, а прыняў новую незвычайную "дваістую" форму. Відавочны падзел аднаго народа на дзве розныя паводле*

*светагляду і мовы часткі паставіў новыя заданні і пытанні, якія да гэтай пары ніхто не адважваецца аб'ектыўна зразумець і, тым больш, паспрабаваць развязаць.*

# Раздзел III.
# ШУКАННІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ І ЯЕ ТВОРЦАМІ. ШТРЫХІ ДА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭІ Ў МАСТАЦТВЕ

Шчыміць мой смутак  
Надвячоркавы,  
Які развеяць  
Не бяруся...  
Правей –  
Магіла Чорнага,  
Лявей –  
Магіла Труса...

*Віктар Стрыжак*

Яшчэ за савецкім часам з лёгкай рукі журналіста і майго сябра – ужо нябожчыка – Сяргея Аладзьева ў маім блізкім акружэнні стала своеасаблівай традыцыяй на Радуніцу, ці з іншае нагоды, а то і проста так, наведваць адзін выдатны куток на Вайсковых могілках, выпіць там адну-другую шклянку віна, памаўчаць, а потым пагаварыць пра нашых папярэднікаў-пісьменнікаў мінулых гадоў. Гэты куток знайсці няцяжка – недалёка ад цэнтральнага ўвахода трэба звярнуць направа і праз метраў сто неўзабаве перад вамі будзе ўздымацца магільная пліта з бюстам выдатнага беларускага празаіка Кузьмы Чорнага, а ступіць трохі ўлева – і вы ўбачыце магілку "беларускага Ясеніна" – Паўлюка Труса... "Нашто мне смех тваіх вачэй..." – заўсёды ўспамінаюцца ягоныя радкі.

Калі вы знайшлі гэтае месца, то пастойце хвілінку каля Паўлюка Труса, і вы адчуеце сваю знітаванасць з вялікай беларускай літаратурай, таемную блізкасць з яе творцамі.

Гэты куток Вайсковых могілак нагадае вам пра Вечнасць. Вечная памяць тым, хто спачывае тут, узбагаціўшы сусветную культуру неацэнным скарбам – беларускай літаратурай. Я нездарма ўспамінаю гэты куток, менавіта тут можна адчуць і засведчыць люд-

ству: нашая літаратура, нашая беларуская літаратурная скарбніца ёсць, і гэта факт неаспрэчны.

## 1. Нацыянальная ідэя ў беларускай літаратуры праз стагоддзі

Я не збіраюся тут гаварыць пра беларускую літаратуру як крытык, рабіць нейкі агляд. Ёсць выдатныя падручнікі з гісторыі беларускай літаратуры, дзе можна знайсці розныя звесткі пра літаратуру, пісьменнікаў ад найдаўнейшых часоў да цяперашніх. Мяне цікавіць больш вузкі аспект нашай літаратуры. Ці ёсць у нас творы, у якіх адлюстроўваецца беларуская нацыянальная ідэя? Ці нясе беларуская літаратура, акрамя мовы і народнай вобразнасці, хоць якую нацыянальную ідэю?

Наагул, што такое беларуская літаратура? Пад гэтым тэрмінам, відавочна, разумеецца ўсякі мастацкі, публіцыстычны, фальклорны, навукова-папулярны твор, напісаны на беларускай мове і выдадзены ў выглядзе кнігі, аўдыёзапісу. За апошні час папяровыя носьбіты ўсё часцей замяняюцца на электронныя, з якімі мы можам азнаёміцца, маючы камп'ютар, а таксама маючы доступ да інтэрнэту. Але гаворка пра мажлівасці інтэрнэту пойдзе ніжэй, а цяпер я абмяжуюся кнігамі, брашурамі, часопісамі, газетамі.

Неяк нядаўна давялося мне наведаць старажытны беларускі горад Тураў. Наведаў Замчышча, прыклаўся да славутага крыжа на Барысаглебскіх могілках, пашукаў калодзеж Тура. І зайшоў у тураўскую кнігарню, што месціцца ў самым цэнтры, побач з універмагам. Зайшоў з тым самым пытаннем, пра якое тут ідзе гаворка: паглядзець на асартымент беларускамоўнай літаратуры. І не здзівіўся, што асартымент гэты надзвычай невялікі: у кнігарні, апрача дзвюх-трох дробных школьных беларускіх кніжачак, беларускамоўнай літаратуры не было зусім. Не здзівіўся, бо прывык да гэтай рысы нашага часу, бываючы ў розных канцах Беларусі.

Аднак нейкае мазахісцкае задавальненне ў гэтай кнігарні я ўсё ж атрымаў, бо ў паўпустым памяшканні каля аднаго прылаўка віравала мноства людзей... Там прадавалі гарэлку! Вось як каштоўнасці замяняюцца! Нават не на дабрабыт, а на аблудны сатанінскі свет ілюзій, які дае гарэліца. І гэта дзеецца не ў адумысных месцах продажу такой прадукцыі, а ў самым сэрцы культуры – сярод кніг. Сярод нікому не патрэбных кніг...

Пасля 1996 г. пачаўся, як ведама, актыўны наступ на ўсё беларускамоўнае. Беларуская кніга негалосна падпала пад грыф непажаданай, непатрэбнай і нават апазіцыйнай, "бээнэфаўскай" літаратуры. Той уздым, прагрэс у развіцці беларускай літаратуры, што адбыўся за ранейшыя 6–7 гадоў, раптам знік. Беларускамоўныя кнігі, часопісы і газеты сталі імкліва прападаць з прылаўкаў магазінаў, кіёскаў, з падпіскі. За вельмі кароткі час становішча змянілася ў горшы бок непазнавальна і на многа перасягнула занядбаны стан беларускай кнігі савецкага перыяду, які жахаў на пачатку 1990-х гг. У савецкія часы кожная кнігарня мела асобны, і часам немалы, беларускі аддзел. Цяпер такіх аддзелаў вы не ўбачыце. Месца яе – амаль што побач з замежнай літаратурай накшталт англійскай ці ўкраінскай. А ў сталіцы ў славутай "Акадэмкнізе" ўся беларуская друкаваная прадукцыя змяшчаецца, як у рэзервацыю, у аддзел краязнаўства.

Ды годзе аб сумным. Беларуская літаратура ёсць! Тысячы тамоў напісана беларускай мовай. Мы маем выдатных паэтаў, празаікаў, публіцыстаў, цікавых даследнікаў літаратуры, фалькларыстаў. Назапашаны скраб ужо ніколі не згіне. Чарговы ўсплёск заняпаду зменіцца новым уздымам, і літаратура на айчыннай мове рана ці позна стане даміноўным таварам на кніжным рынку, як гэта стала ўжо ў суседніх краінах, Літве, Латвіі, Украіне.

Аднак ці гэтая літаратура нацыянальная, не толькі моваю, але і духам, тым няўлоўным адценнем, якое завецца беларускай душой? Ясна, што сапраўдны творца будзе ўкладваць у свой твор сваю душу, і гэта

пэўна ж адаб'ецца на тэксце. І тэматыка, і прыхільнасці, і асоба аўтара, і тая ж мова, хоць яна можа быць і не беларуская, могуць шмат сказаць пра беларускую нацыянальную ідэю.

## 2. Нацыянальныя матывы ў першых беларускіх літаратурных помніках

Калі гаворка ідзе пра старажытную беларускую літаратуру, то зазвычай яна разглядаецца ў адзінстве трох культур: беларускай, рускай і ўкраінскай. Сапраўды, помнікі часоў Кіеўскай Русі амаль не нясуць нейкага этнічнага малюнка, і цяжка прыпісаць нейкі літаратурны помнік той ці іншай культуры і этнасу. Гэта зразумела – этнасы пачынаюць фармавацца прыкладна з XII ст., хоць, як мы ўжо адзначалі ў другім раздзеле, поўныя рысы беларускага этнасу маюць тысячагадовыя адзнакі.

Мэта нашага даследавання ў гэтым раздзеле – беларуская нацыянальная ідэя, этнічныя і нацыянальныя асаблівасці ў літаратурных помніках, ад іх першага ўспамінання да нашых дзён. Таму пра нейкую супольную ўсходнеславянскую літаратурную спадчыну гаварыць не буду – не мае гэта заданне. Мы маем беларускі этнас, які потым перарос у нацыю – вось у такім ракурсе і трэба мысліць, шукаць першакрыніцаў і аналізаваць літаратурныя помнікі.

Літаратурную спадчыну беларускага народа даследавалі шмат якія навукоўцы. Першым грунтоўным творам на гэтую тэму была "Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі: Спроба паясніцельнай кнігопісі ад канца X да пачатку XIX стагоддзя", напісаная В. Ластоўскім і выдадзеная ў Коўна ў 1926 г. У савецкія часы вывучэнне старажытнай літаратурнай спадчыны было адносна адкрытай галіной даследавання, бо тут немажліва, ці вельмі цяжка, было ўвесці нейкія падцэнзурныя рамкі і лёгка прывязаць да паноўнай камуністычнай ідэалогіі. Таму савецкія філолагі, даследнікі гэтай тэматыкі падрыхтавалі і выдалі шмат каштоўных працаў. Сярод іх творы М. Грынчыка,

У. Конана, Ю. Лабынцова, В. Чамярыцкага, А. Мальдзіса, М. Улашчыка, І. Саверчанкі і многіх іншых.

Беларуская літаратура вывучалася і за мяжой. Так, вялікую папулярнасць сярод беларускіх навукоўцаў набыла ў 80–90-я гг. XX ст. манаграфія з гісторыі беларускай літаратуры англійскага навукоўца Арнольда Макміліна, выдадзеная ў Лондане ў 1975 годзе. За брэжнеўскім часам яна ў рукапісным выглядзе "хадзіла па руках". Тады ж і пазней выйшлі унікальныя зборы помнікаў беларускага пісьменства: "Хрэстаматыя з старажытнай беларускай літаратуры" (1959), "Помнікі старажытнай беларускай пісьменнасці" (1975), "Гісторыя беларускай літаратуры: старажытны перыяд" (1985), "Беларускія летапісы і друкі" (2004), "Старажытная беларуская літаратура (XII–XVII стст.) (2007) і шмат іншых фундаментальных твораў.

Зазірнем цяпер праз прызму нацыянальнага бачання ў мінулыя часы. Здаецца, што можа быць нацыянальнага ў гэтых далёкіх творах мінулага, калі і этнасы, а тым больш нацыі былі яшчэ наперадзе? Але менавіта ў тыя часы, як мы ведаем, і складваўся беларускі этнас. Вывучаючы помнікі тых часоў, мы фармуем сучасную канцэпцыю нацыянальнай ідэі.

### 3. Старабеларуская літаратура

Даследнікі беларускай літаратуры лічаць, што яе гісторыя пачынаецца з XII ст. Гэта, напэўна, абумоўлена тым, што менавіта з XII ст. фармуецца старажытнабеларуская літаратура і пачынае выкарыстоўвацца адметная ад славянскай мовы беларуская мова (у айчыннай літаратуры выкарыстоўваецца тэрмін "старабеларуская" мова, аднак з ускладненнем самаго слова сэнс не змяняецца). Пачынаючы з XII ст., беларускае пісьменства, паводле Івана Саверчанкі[1], праходзіць паслядоўна тры этапы: Готыка (XII–XV стст.), Рэнесанс (XVI ст.) і Барока (XVII ст.).

Літаратуру таго перыяду прынята дзяліць на свец-

[1] Саверчанка Іван. Фенамен старабеларускай літаратуры // Старажытная беларуская літаратура (XII–XVII стст.). Мінск, 2007.

кую і рэлігійную. І колькасна і якасна яна досыць багатая, яе тэксты сталі тэмай для шматлікіх дысертацыяў, манаграфіяў, розных даследаванняў і твораў. Толькі павярхоўнае знаёмства з старажытнай беларускай літаратурай цалком адкідае міф аб яе нібыта слабасці. Наадварот, яна на парадак перасягае тагачасную літаратуру Маскоўскай Русі. Больш за тое, шэраг нашых пісьменнікаў, што апынуліся ў Масковіі, і там сталі выдатнымі асветнікамі, пісьменнікамі і навукоўцамі, прыкладам, Сімяон Полацкі, Іван Фёдараў (Федаровіч).

Зробім для пачатку сціслы агляд.

Найперш вылучаюцца гэтак званыя ***жыватьі святых***. Сярод твораў такога кшталту: "Аповесць жыцця і смерці святой дабраслаўнай і святаўлівай Еўфрасінні", "Слова пра манаха Марціна", "Памяць святога Кірылы, біскупа Тураўскага", "Жывот і змаганне пакутніка Язафата Кунцэвіча", "Аповесць пра пакуты і смерць айца Афанасія Філіповіча", іншыя творы.

Асобную галіну сярэднявечнай беларускай літаратуры складаюць ***хаджэнні***: "Хаджэнне ў Царград" Ігнація Смаляніна, "Перэгрынацыя, або Паломніцтва ў святую Зямлю" Мікалая Крыштофа Радзівіла, творы няведамых пісьменнікаў: "Падарожжа да выспы" (1782), "Перэгрынацыя, або Праўдзівае апісанне Зямлі Святой" (1722) і шмат якія іншыя цудоўныя творы.

У XV ст. Вялікае Княства становіцца магутнай дзяржавай Еўропы. У звязку з гэтым і ўзнікаюць творы, прысвечаныя значным палітычным падзеям, палітычным, дзяржаўным дзеячам. Сярод іх трэба вылучыць шэдэўр беларускай літаратуры "Пахвала вялікаму князю Вітаўту". Напісаны гэты твор каля 1430 г. Аўтар усхваляе вялікага князя літоўскага Вітаўта за яго выдатныя поспехі ў пашырэнні межаў ВКЛ, умацаванні ваеннай і палітычнай моцы княства. Увесь твор напоўнены патрыятызмам і любасцю да вялікага Вітаўта. "Няма зямлі ні на ўсходзе, ні на захадзе, адкуль не прыходзілі б пакланіцца гэта-

му слаўнаму гаспадару". Аўтар асабліва акцэнтуе ўвагу на прыхільнасці валадароў розных краін да Вітаўта: "Таксама вялікі князь маскоўскі ў вялікай любові з ім жыў. Служылі яму яшчэ і іншыя: вялікія князі нямецкія з усімі сваімі гарадамі... гаспадар зямлі балгарскай, ...вялікі князь цвярскі, вялікі князь разанскі... і Вялікі Ноўгарад, і Вялікі Пскоў ...не знойдзецца ў усім Памор'і ні горада, ні краю, якія б не слухаліся гэтага слаўнага гаспадара Вітаўта[1]".

Яшчэ адзін падобны твор прысвечаны князю Канстанціну Іванавічу Астрожскаму і бітве 1514 г.: "Пахвала князю Канстанціну Астрожскаму". Цікава, што, усхваляючы ваенныя ўчынкі князя Канстанціна Іванавіча, аўтар разглядае іх і ў рэчышчы абароны праваслаўнай царквы, якой верна служылі ўсе князі Астрожскія: "Божую Хрыстову царкву, многіх мужчын і жанчын абараніў ад здзеку маскоўскага". Гэтыя словы сведчаць, што праваслаўе дзвюх дзяржаў – ВКЛ і Масковіі – не было крытэрам іх збліжэння, і войны ў іх рэлігійным аспекце адбываліся за тую самую веру, а не як войны паміж "палякамі" і "рускімі".

На заканчэнне аўтар "Пахвалы" зычыць К. Астрожскаму геройства і ў вайне з іншаверцамі: "Пабіў сілу маскоўскую, а цяпер – каб граміў дужую рацць татарскую, праліваючы кроў іх басурманскую".

Асобным выдатным творам эпічнай літаратуры ёсць знакамітая "Баркулабаўская хроніка", напісаная ў пачатку XVII ст. У "Хроніцы" апісаны шэраг падзей, у асноўным ваеннага характару, што адбываліся ў XVI ст. у ВКЛ.

Ува ўсе часы беларускі народ быў схільны да паэзіі. Разглядваны перыяд надзвычай багаты паэтычнымі творамі найразнастайнейшых жанраў.

А пачынальнікам беларускай паэзіі ёсць найперш Кірыла Тураўскі, яго творчасць я разгледжу тут падрабязней.

---

[1] Старажытная беларуская літаратура (XII–XVII стст.). Мінск, 2007. С. 108.

## *Кірыла Тураўскі*



Дай, добры Божа, зару й сонца бачыць,
Тваёю ласкай захавай ад грэху,
К табе ўздыхае маё сэрца, плачыць –
Дай у тваёй сіле мне знайсці пацеху!

*З пераказу малітвы Кірылы Тураўскага*

Кірыла Тураўскі нарадзіўся, атрымаў выхаванне ў горадзе Тураў каля 1113 г. (згодна з вылічэннямі А. Мельнікава ў кнізе "Кірыл, епіскап Тураўскі" (Мінск, 1997). У гэтыя часы тут княжыў Святаполк – Міхаіл.

Кірыл меў добрую граматычную, дыялектычную і багаслоўскую адукацыю, валодаў грэцкай мовай. Але сваё жыццё ён прысвяціў манаскаму служэнню. Каля 1143 г. Кірыл пастаўлены ярэем, а ў 1144–1148 гг. стаў ігуменам Нікольскага манастыра ў г. Тураве. Прыкладна ў 1148 г. Кірыл "в столп вшед затворися", г. зн. становіцца стоўпнікам. У праваслаўі стоўпніцтва – найвышэйшы ўчынак служэння Госпаду. Стоўпніцтва ведама было ў Візантыі, а пасля Кірылы Тураўскага Старажытная Русь не мае больш аналагаў стоўпніцтва. Ужо адзін гэты факт сведчыць пра высокі ровень праваслаўнай культуры на нашых землях яшчэ ў XI ст.

Яшчэ большую павагу выклікае далейшае служэнне Кірылы, пастаўленне яго на біскупскую кафедру Турава. У гэты час Туравам пачаў кіраваць князь Юрый Яраслававіч, які рабіў стаўку на незалежнасць Тураўшчыны ад Кіева. У 1159 г. незалежнік-князь Юры змеркаваў, што тураўскую кафедру не павінен займаць ні стаўленік Кіева, ні стаўленік Канстанцінопаля, і таму на біскупскую кафедру ён запрасіў антыкіеўскага стоўпніка Кірыла. У гэтай гісторыі нас цікавіць найперш тое, што і князь Юры кіраваў незалежна ад Кіева, і біскуп Кірыл быў пастаўлены самастойна, з парушэннямі кананічнасці прызначэння біскупаў. Як піша А. Мельнікаў, "парушэнне гэтага правіла – быць можа, як вынік пераймання візан-

тыйскага цэзарапапізму – было настолькі частым, што ўвайшло ў звычай – хоць яно і магло "даць падставу тым, хто шукае падставы", для абвінавачванняў Тураўляніна ў некананічнасці яго архірэйства".

Вось жа, імкненне да незалежнасці беларускай Праваслаўнай царквы – аўтакефаліі – сягае да часоў Кірылы Тураўскага, і яго можна лічыць пачынальнікам шэрага незалежных архірэяў на нашых землях. Гэтае імкненне да незалежнасці царкоўнага жыцця ад Канстанцінопаля, а пазней і ад Масквы працінае жыццё беларускай Праваслаўнай царквы ад часоў Тураўскага і Полацкага княстваў і дасягае кульмінацыі ў часы ВКЛ у XV–XVI стст.

Кірыла Тураўскі праславіўся пры жыцці як выдатны аратар, за што быў празваны "другім Златавустам". Пасля яго засталася ладная літаратурная спадчына, большая частка якой згубленая. Нам ведамы казанні Кірылы, каноны, сціхіры і малітвы – усяго, згодна кнізе А. Мельнікава, – 68.

Можна лічыць Кірылу Тураўскага і пачынальнікам беларускай паэзіі. Прынамсі, так піша даследнік беларускай літаратуры А. В. Макмілін.[1] Менавіта рытмічныя пабудовы ў ягоных казаннях, прыхільнасць да рыфмаваных куплетаў надаюць паэтычны характар прамовам і іншым тэкстам Кірылы Тураўскага.

Да нас дайшла цудоўная малітва, напісаная Кірылам Тураўскім, ведамая як хрысціянская песня "Дай, добры Божа". Яе пераклаў айцец Я. Германовіч, і яе можна пачуць ўва ўсіх беларускіх храмах і прыходах – як у праваслаўных, так і ў каталіцкіх, у тым ліку і ў уніяцкіх.

* * *

З пашырэннем хрысціянства на беларускіх землях пачалі расці пераклады хрысціянскіх паэтаў на беларускую мову. Гэта творы такіх выдатных багасловаў, як Свяцьбіты Іаан Златавуст, Васіль Вялікі, Рыгор Багаслоў, Іаан Дамаскін, іншыя.

[1] Макмілін А.В. Гісторыя беларускай літаратуры. Лондан, 1975.

Але найбольшы след у беларускай паэзіі і літаратуры пакінула нам XVI ст., і па-над усімі гістарычнымі асобамі ўзвышаецца фігура **Францішка Скарыны.** Ён і першадрукар, і паэт, і філолаг, і філосаф, і мастак-графік, і інш. У II раздзеле я мусіў расказаць пра гэтую магутную фігуру, а цяпер дадам толькі некалькі слоў у звязку вось з чым. Іван Саверчанка падкрэслівае, што "Беларускі першадрукар выявіў сябе як бліскучы ***нацыянальны*** (падкрэслена мною, – *А. А.*) паэт". Я нездарма падкрэсліў слова "нацыянальны". Хоць панятак нацыі склаўся шмат пазней, да Скарыны гэтае слова можна з поўным правам аднесці, бо ён апярэджваў свой час і быў ужо тады носьбітам ідэі беларускай нацыі. Можа, і не выпадкова да гэтай пары няма адзінага меркавання аб прыналежнасці Скарыны да той ці іншай хрысціянскай канфесіі, бо ён станавіў сабою вобраз кожнага беларуса – і праваслаўнага, і каталіка і пратэстанта.

У сваіх знакамітых прадмовах Францішак Скарына змясціў шэраг цікавых вершаваных твораў. Ён пераклаў таксама творы паэтаў-гімнографаў – Іосіфа Песнапісца, Рамана Салодкапеўцы, Іаана Дамаскіна.

Адметнай з'явай у ВКЛ XVI ст. была лацінскамоўная паэзія, слынны прадстаўнік якой – **Мікола Гусоўскі.** Ягоная "Песня пра зубра" – выдатны твор лацінскамоўнай паэзіі не толькі ў Вялікім Княстве, але і ўва ўсёй Еўропе. У вобразе зубра так яскрава апісанага Гусоўскім, многія даследнікі бачаць сімвал Беларусі. Беларусь–ВКЛ у тыя часы была адной з наймагутнейшых дзяржаў Еўропы, і прыраўнанне да велічнага гаспадара пушчаў зубра цалком мажлівае. Патрыятызмам і любасцю аўтара да Бацькаўшчыны прасякнуты ўвесь твор Міколы Гусоўскага.

Паляванне на зубра – даводзіць Гусоўскі – гэта не проста шараговае паляванне, у гэтым чыне воіны вялікага князя практыкаваліся і кшталтаваліся для змагання з ворагамі краіны. І вынік заўсёды будзе плённы. На гэтай ноце праслаўлення сваёй Айчыны і нязмернай павагі да Вітаўта дакачвае аповед Гусоўскі:

Нават татарын, пакорліва ўнурышы голаў,
Лук свой зламаны яму аддаваў і тлумачыў,
Што спаганяўшы ясак каля вотчын літоўскіх,
Сам станавіўся пачварнай здабычай літвінаў.
Быў літасцівы да тых уладарцаў, якіх ён
Ставіў на Княства па выбары ўласным і нават
Грознай ардзе мог прыцыкнуць: знай меру татарын!
Як знакаміты багаццем і сілай Масковіі землі,
Усе ж і яны прымірэння прасілі з літвінам.
Турак з Таўрыды заўсёды цюкі падарункаў
Вітаўту слаў, прыхаваўшы свой клопат таемны...

(*Пераклад Я. Семяжона*)

Наагул вобраз Вітаўта ў Гусоўскага выйшаў вельмі яркі. Ён і дзяржаўны дзеяч, і выдатны палкаводзец і, акрамя ўсяго, набожны хрысціянін.

Паэзія Міколы Гусоўскага ілюструе прыклад патрыятычнага стаўлення аўтара да сваёй Бацькаўшчыны, любасці да Айчыны.

Аднак сапраўдны нацыяналістычны верш дайшоў да нас ужо з XVII ст. Яго напісаў паэт **Ян Казімір Пашкевіч.** Напісаны верш беларускай мовай таго часу і выразна даводзіць нам, што як у Польшчы "квітнее" лаціна (польская мова), так і ў Літве – "руская мова" (г. зн. беларуская – яшчэ раз бачым, што пра літоўскую мову няма і гаворкі):

Полька квітнець лаціною,
Літва квітнець русчызною.
Бяз тэй ў Польсцэ не прэбудзеш,
Бяз сей ў Літве блазнем будзеш.
Той лаціна язык даець.
Та без русі не вытрваець.
Ведь жэ юж, Русь, тва дойзрала.
Весялі ж ся ты, русіне,
Тва слава нігды не згіне!

Эпоха Рэнесансу прынесла ў Беларусь новыя формы літаратурных твораў. Гэта аўтабіягафічныя творы, мемуары, успаміны і г. д. Сярод іх "Гістарычныя запісы Ф. Еўлашэўскага, "Дыярыуш" П. Абуховіча, "Дыярыуш" С. Маскевіча, "Успаміны" Я. Цандроўскага. Асобнае месца займае ў гэтым спісе "Дыярыуш" Афанасія Філіповіча. Вартая ўвагі ягоная дзейнасць у абарону праваслаўя на землях ВКЛ XVII ст., якія

тады ўжо ўваходзілі ў склад Рэчы Паспалітай. Прыгледзімся да гэтай незвычайнай асобы ўважлівей.



**Афанасі Філіповіч.** Нарадзіўся ў 1597 г., загінуў у 1648 г. З 1627 г. – манах Святадухавага манастыра ў Вільні. У 1640 г. стаў айцом-настаяцелем праваслаўнага брацтва св. Сімяона ў г. Брэсце.

Найбольш ведамы сваім творам “Дыярыуш”. Некалькі слоў аб гэтым творы.

Дыярыуш (у перакладзе з лацінскай мовы – дзённік) – жанр старабеларускай літаратуры, у якім у храналагічнай паслядоўнасці перадаваліся падзеі грамадска-палітычнага ці прыватнага жыцця праз суб’ектыўнае ўспрыманне пэўнай асобы. А калі ўсё жыццё А. Філіповіч прысвяціў змаганню за правы і прывілеі Праваслаўнай царквы, дык грамадскае і асабістае ў яго “Дыярыушы” цесна пераплецена. Твор шматпланавы паводле кампазіцыі. Аўтар аб’яднаў падарожныя нататкі (“Гісторыя падарожжа ў Маскву”), тлумачальныя запісы, успаміны, дзённікі, аўтабіяграфічны нарыс аб перажытым, паведамленні, лісты, выкрывальніцкія прамовы, філасофскія трактаты багаслоўскага характару, вершы і песні, складзеныя ў турме. Твор стракаты паводле стылю – апавядальная манера змяняецца заклікавай публіцыстычнасцю, дакументальныя згадкі – містычнымі карцінамі і г. д. Аўтар выступае то прапаведнікам «разумнай мернасці» ў грамадстве, то ваяўнічым абаронцам «веры праўдзівай і царквы ўсходняй грэчаскай».

У «Дыярыушы» А. Філіповіча няма кніжнай рыторыкі, да чаго часта звяртаўся ў творах яго сучаснік М. Сматрыцкі. Аўтар абапіраўся на ўласныя назіранні, на факты рэчаіснасці. Апантаны да фанатызму, надзвычай уражлівы, А. Філіповіч часам “бачыў” тое, што выходзіць за рамкі рэальнага. Так, у адной з частак «Дыярыуша» ён апісвае «борзо страшнии видо-

ки на неби и земли», убачаныя ім не ў сне, а на яве і ўдзень. На небе — гнеўныя хмары з войскам, пастаўленым у строй, на зямлі — сем агнёў пякельных, прыгатаваных на сем смяротных грахоў. "З тых огнюв ...трох особ выразне видилем: нунциуша легата (пасла рымскага папы) в короне папежской. Жигмонта кроля и Сапегу гетмана, за преследоване церкви восточной барзо смутно седячих". Поруч з гэтым у "Дыярыушы" шмат дакладных апісанняў і ўспамінаў: "Мещане зась убогие з Люблина, Сокаля, Орши, Пинска, Белска, Кобриня, Берестя и з инших мест и местечек плачливе ляментуют, же юж не мают и людей, з ким бы церквей своих доходити могли!.. Ах, беда ж! Креста не принявши детки, а дарослые без шлюбов живут, а умерлых в полях, в огородах и в пивницах потаемне в ночи погребают!.. Над турецкую неволю, тут в панстве христианском православные люде болшую неволю терпят и мают! Бо оршане бедные за тое, што в братстве своем новую церков збудовали, двесте червоных золотых подканцлерому за печать давали..."

А. Філіповіч – чалавек аддany праваслаўнай веры і Бацькаўшчыне. Увесь ягоны шматпакутны жыццёвы шлях сведчыць пра ягоную апантаную любасць да Беларусі і непрыняцце чужой, польскай навалы, якая душыла родную веру.

Па-сапраўднаму ўсведаміць маштабы фігуры Філіповіча можна толькі ўлічыўшы палітычныя рэаліі, што мелі месца ў тыя часы. Дзейнасць змагара за праваслаўную веру прыпадае на часы з 1627 г. – прыняцце Афанасіем інацкага пострыгу па 1648 г. – час пакутніцкай смерці. Гэты час найгоршы для праваслаўя ў ВКЛ, бо пасля прыняцця уніі 1596 г. праваслаўе стала найнепажаданейшым, нялюбым у вышэйшых эшалонах улады і, зразумела, пры двары караля.

У 1640 г. Афанасі Філіповіч быў прызначаны ігуменам (кіраўнікам) Сімяонаўскага кляштара ў Брэсце. Аднойчы, знайшоўшы ў граматах, што "унія з Рымам была прынятая насуперак законам Усходняй Царквы і проклятая навекі", святаўлівы Афанасі стаў

адкрыта абвяшчаць гэта ў храме і іншых публічных месцах. У 1641 годзе ён выпраўляецца ў Варшаву на сойм, дзе збіраўся абараніць поўную свабоду набажэнстваў і абрадаў паводле ўставу Усходняй Царквы. Аднак гэтая спроба была дарэмнай. У 1643 годзе ён робіць зноў спробу ўплываць на сойм, на гэты раз прыехаўшы з абразам Купяціцкай Божай Маці, але ізноў спроба не ўдалася. Больш за тое, Афанасія Філіповіча адправілі на суд да Кіеўскага мітрапаліта Пятра Магілы. Аднак у Кіеве Афанасія апраўдалі. Тым не менш, у 1644 г. яго зноў арыштавалі, проста ў час манастырскага паслушання ў Брэсце. Яго адвезлі ў Варшаву, закавалі ў кайданы і трымалі ў вязніцы больш за год. У 1648 г. ён яшчэ раз арыштаваны. Калі суддзі запыталі яго: "Ты праклінаеш унію?" – "Так, – адказаў Афанасі, – бо яна і ёсць праклятая". Езуіты падаслалі да яго свайго чалавека, які спрабаваў пераканаць святаўлівага не згубіць сябе. Але пакутнік за праўду адказаў: "Няхай езуіты ведаюць, што як ім прыемна быць у красе свету гэтага, так і мне прыемна пайсці на смерць". У ноч 5 верасня 1648 г. у сасновым бары каля вёскі Гершановічы яго катавалі распаленым жалезам, прымушаючы адмовіцца ад слоў. Але ён адказаў катам: "Што я сказаў, тое і сказаў, і з тым паміраю". Потым гайдукі хацелі яго застрэліць, але забіць не змаглі. Тады яны скінулі Афанасія жывым у яму, у якой той перавярнуўся тварам уверх, да Госпада, і так сканаў.

Афанасі Філіповіч быў кананізаваны (прызнаны святым) 5 студзеня 1658 г.

Трэба сказаць, што вера і Айчына ў святога Афанасія ўтаясамляліся. Гэта пазней мы пачалі адрываць іх адно ад другога – і цяпер дайшло нават да таго, што трэба даводзіць іх глыбокую знітаванасць (гл. апошні раздзел кнігі). Але прыклад Афанасія Філіповіча – гэта найяскравейшы прыклад мужнасці, адданасці веры і Бацькаўшчыне, які захавала нам гісторыя праз вякі.

**Рэлігійная літаратура**. Пачынаючы з эпохі Рэфармацыі (XVI ст.) а потым і Контррэфармацыі на беларускіх землях акрамя спрадвечнай праваслаўнай веры шырыцца спачатку каталіцызм, потым пратэстанцтва і тады, у 1596 г. – унія. Адпаведна і літаратура ў XVI–XVII стст. развівалася ў чатырох гэтых кірунках.

**Праваслаўная літаратура**, пачынальнікам якой справядліва лічыцца Кірыла Тураўскі, пэўна што найбагацейшая і колькасцю аўтараў, і ахопам падзей, і разнастайнасцю жанраў. Вось толькі няпоўны спіс праваслаўных пісьменнікаў старажытнага перыяду: Клім Смаляціч, Ігнат Смалянін, Грыгоры Цамблак, Лаўрэнці Зізані, Афанасі Філіповіч, Лявон Карповіч, Сільвестр Косаў, Сімяон Полацкі і г. д.

**Каталіцкія аўтары** прадстаўленыя ў Беларусі праз лацінскамоўных пісьменнікаў (Мікола Гусоўскі, Ян Вісліцкі) і польскамоўных – Леў Сапега, Міхал Карыцкі.

Вельмі вялікі ўнёсак у развіццё пісьменства на беларускай мове зрабілі **пратэстанты**. Пратэстанцкае асветніцтва, якое прыйшло з Рэфармацыяй, дало вялікі штуршок для развіцця нацыянальных моў ува ўсёй Еўропе і тым ліку Вялікім княстве Літоўскім.

Найбольш значнай фігурай у літаратуры пратэстацкай плыні ёсць **Сымон Будны (1544–1593)**. Рэлігійныя пагляды Буднага некалькі разоў за жыццё мяняліся ад кальвінізму да антытрынітарызму і нарэшце – арыянства. Сымон Будны напісаў шэраг твораў на беларускай мове. Сярод іх знакаміты “Катэхізіс, або Навука старадаўняя хрысціянская для простых людзей” (1562 г.) і трактат “Апраўданне грэшнага чалавека перад Богам” (1562 г.). На польскай мове быў выдадзены багаслоўскі трактат “Аб асноўных артыкулах хрысціянскай веры”, які выклікаў вялікую дыскусію ўва ўсёй Еўропе.

Мова С. Буднага надзвычай багатая, насычаная метафарамі, параўнаннямі, трапнымі вобразамі. Ягоны “Катэхізіс” і цяпер чытаецца з захапленнем, вучыць Слову Божаму і асновам пратэстанцкага хрысціянства.

С. Будны паказаў сябе як антрапацэнтрыст. Ён пільнаваўся той думкі, што чалавек ёсць галоўнай каштоўнасцю на Зямлі і рэшта праяў жыцця жывой і нежывой прыроды мусяць падпарадкоўвацца гэтаму закону. Дарэчы, найбольш значнае адкрыццё сучаснасці – гэта антропны прынцып, які распрацаваў выдатны навуковец, фізік-тэарэтык, лаўрэат Нобелеўскай прэміі Стывен Хокінг. І вельмі прыемна адзначыць, што наш знакаміты навуковец XVI ст. Сымон Будны стаяў ля вытокаў сучасных уяўленняў аб будове сусвету.

Што да ўнёску Буднага ў развіццё нацыянальнай ідэі, то мне, акрамя выкарыстання ім беларускай мовы, не пашанцавала знайсці якіх нататкаў асветніка ў гэтым кірунку, чаго не скажаш, аналізуючы творчасць ягонага сучасніка Васіля Цяпінскага.




**Васіль Цяпінскі** (1540–1603). Па рэлігійнай лініі належаў да арыянства – адной з пратэстанцкіх канфесій, заснаванай на аднаўленні ерасі Арыя, што жыў яшчэ ў III ст.

З творчай спадчыны Цяпінскага да нас дайшла адно рукапісная "Прадмова да Евангелля", старонка "Катэхізіса, або Сумы навукі для дзетак" і няпоўны пераклад "Новага Запавету". Аднак і гэтая невялікая спадчына дае нам пэўнае ўяўленне аб асобе Цяпінскага як патрыёта сваёй Айчыны, чалавека, які адданы свайму народу. "*Я не італьянец, не немец, не доктар і не нейкі там пастаўлены поп, а звычайны русін, з народнага асяроддзя, які ўслугуе сваёй Русі*"(пераклад І. Саверчанкі). – з гонарам піша Цяпінскі ў "Прадмове".

Васіль Цяпінскі вялікую ўвагу аддаваў занядбанаму стану беларускай мовы. Родная мова для яго – Дар Божы, і тое, што беларусы не шануюць яе, лічыў вялікім грахом, за які будуць пакараны: "*Хто з богабаязлівых не спыніцца, гледзячы на гэткае Божае*

*пакаранне! Хто мусіць заплакаць ад нечуванага занядбання роднай мовы, нябачнай пагарды да яе сярод вялікіх князёў, значных паноў, нявінных дзетак, мужоў і жонак! Моцна пакараны вялікі беларускі народ, які быў некалі вельмі адукаваным.*" (Тамсама).

Як бачым, і 500 гадоў таму беларуская мова была ў занядбанні. Так што сучасны гаротны стан нашай мовы не адзнака толькі нашага часу, і тое, што яна пратрывала гэтыя пяць стагоддзяў і жыве, дае нам вялікую надзею на яе трываласць, жывучасць і няўхільнае адраджэнне.

Патрыятызм Цяпінскага можа быць прыкладам для ўсякага нашага сучасніка: "*Прашу пана Бога, каб даў моцы, калі Айчына дарэшты згіне, – з ёю разам згінуць. Але калі праз вашы высілкі яна будзе выратавана – з вамі і з ёю разам узняцца*". Менавіта так фармулюецца і намі адзін з найважнейшых бакоў усякага нацыяналізму: "*Гэта боль за няўдачы свайго народа і гордасць за яго поспехі*".

## 4. XVII–XVIII стагоддзі

Беларуская літаратура XVII–XVIII стст., эпохі, якую прынята называць часам заняпаду, не багатая на значныя творы. Калі праваслаўная і, збольшага, пратэстанцкая літаратуры Залатой пары вылучаюцца мноствам ведамых асветнікаў, творцаў, якія заклалі першыя камяні ў фундамент будучага беларускага нацыяналізму, то ў гэты час праваслаўе ў ВКЛ перажывае вельмі цяжкі перыяд. Колькасць праваслаўных прыходаў рэзка скарацілася, настаў час трыумфу уніі. На канец XVIII ст. колькасць уніяцкіх грамадаў складала каля 95% ад усёй колькасці хрысціянскіх грамадаў, хоць па сутнасці набажэнствы ў гэтых уніяцкіх цэрквах амаль не адрозніваліся ад праваслаўнай літургікі. Што ж каштоўнага засталося ад уніяцкага перыяду?

Факт застаецца фактам, але ў абшары уніяцкай літаратуры не праглядваецца значных мысляроў, якія б развівалі беларускую нацыянальную ідэю.

Асноўныя творы уніяцкіх дзеячоў XVII ст. Іпацiя Пацея ("Справядлівае апісанне ўчынка і справы сінодавай і Абарона здзейсненых згода і лучнасці, якія сталіся на сінодзе Берасцейскім у 1596 годзе"), Язафата Кунцэвіча ("Катехизм од слуги божего Иосафата сочетанный"), Язэпа Руцкага ("Падвойная віна Пятра Скаргі і Мялета Сматрыцкага пасля пераходу ў унію" – скрозь прысвечаны змаганню з "ерэтыкамі" (так яны называлі праваслаўных). Гэтая літаратура носіць назву "палемічнай" і добра прааналізаваная І. Саверчанкам у кнізе "Старажытная літаратура (XII–XVII стст.)". Праўда, у мове некаторых твораў гэтых дзеячоўназіраецца новая тэндэнцыя. Так, як адзначае І. Саверчанка, у творах І. Пацея ёсць выразная тэндэнцыя да замены царкоўнаславянскага сінтаксічнага і лексіка-марфалагічнага фонду на дыялектава-гутарковыя формы. Заўважым, што І. Пацей выступаў за захаванне царкоўнаславянскай мовы ў набажэнствах, але рупіўся аб стварэнні свецкіх літаратурных твораў на мове простага народа. Фактычна, гэта новы этап у развіцці беларускай літаратурнае мовы.

## 5. Літаратура мадэрнісцкага этапа фармавання беларускай нацыі

### *Частка 1. XIX стагоддзе*

Заграй, заграй, хлопча малы,
І ў скрыпачкі і ў цымбалы,
А я заграю ў дуду,
Бо ў Крошыне жыць не буду.

*Паўлюк Багрым*

Да першых твораў, напісаных ужо на мове, блізкай да сучаснай беларускай мовы, можна аднесці творы, якія ведамыя з першых дзесяцігоддзяў XIX ст.

У першай палове XIX ст. на тэрыторыі Украіны пашыралася парадыйная "Энеіда", на ўкраінскай мове. У Беларусі ў тыя самыя часы хадзіў па руках аналагічны беларускі ананімны твор "***Энеіда навы-***

*варат*". "Энеіда" на ўкраінскай мове напісана Іванам Катлярэўскім (1769–1838) у 1798 г., беларуская "Энеіда навыварат" – створана, як лічаць сучасныя даследнікі, у 1816–1826 або ў 1827–1828 гг. Вікенціем Равінскім (1765–1831) на смаленскай гаворцы.[1] Паэма доўгі час была ведама толькі ў рукапісах, а ўбачыла свет яна у часопісе "Маяк" у 1845 г. Слынны фальклярыст Я. Раманаў пісаў: «Ды вот жалко: нема ниякого ведома об тым, хто написав ету байку. Одны кажуць, што быттоле сочынив Марцинкевич, тэй, што быв за панами аканомам у Щаврах, у Сяньском уезди Могилевской губерни. Ён тыки, правда, хоть и аконом, а печатовав добрыя книжки и над народом не здекався. Але быв каталик, и Бог ведаеть, ти знав ён наших сочинителев".[2]

Ведама яшчэ адна ананімная паэма "***Тарас на Парнасе***".

У гэты час з'яўляюцца і знакамітыя вершы паэта-самародка **Паўлюка Багрыма**, пачатак адзінага ацалелага праз віхуру стагоддзяў верша якога ўзяты тут у якасці эпіграфа. Верш гэты прыпісваецца сялянскаму сыну Паўлюку Багрыму і напісаны ім, згодна з версіяй навукоўцаў, не пазней за 1828 г., калі аўтару было ўсяго 15 гадоў. Мабыць, і праўда так было, а можа, малады Паўлюк толькі чытаў чужыя вершы, але за іх ён быў пакараны рэкрутствам, і ўсю маладосць ды юнацтва правёў у маскоўскім войску. Сам ён наконт гэтых вершаў пісаў наступнае: "..выучивал разные стихи, переписываемые мною ў органисты при плебании Георгия Орловского, в числе коих переписывал и выучил стихи в простом польском языке под именем «Rozmowa chłopów". Стихи сии мною выучены около 5 лет..." Дарэчы, вось яшчэ адна назва беларускай мовы, акрамя часта згадваных "русіньскай" ці "ліцвінскай" – "простая польская мова".

---

[1] Кісялёў Г. Ад Чачота да Багушэвіча. Мінск, 1993. С. 351–354.

[2] Раманаў Е.Р. Спроба пяра // Пачынальнікі. Мінск, 1977.

Ды ці важна, хто пісаў першыя літаратурныя творы на беларускай мове! Важна тое, што пасля даволі цьмяных стагоддзяў нашага суіснавання з Каронай, пасля забароны мовы ў 1696 г., беларускае слова пачынае выходзіць з падзем'я, на ёй друкуюць літаратурныя творы. І яшчэ якасны зрух: беларуская мова ўжо мае выразныя рысы сучаснай беларускай мовы, яна просіцца на паперу, яна імкліва заваёўвае новы абшар – літаратурны.

Што ж стала стымулам гэтай новай з'явы ў жыцці беларусаў пачатку XIX ст.?

Мы назіраем якасна новы статус насельніцтва ВКЛ, якое пасля падзелу Рэчы Паспалітай апынулася ў складзе іншай дзяржавы – Расійскай Імперыі. Хоць рускія афіцыйныя асобы запэўнівалі ўвесь свет, што "отторгнутое возвратих", "вярнулася" да Імперыі не зусім рускае насельніцтва, якое гаварыла, як піша Паўлюк Багрым, на "простай польскай мове» і якое было не зусім праваслаўным, хоць ў большасці – і не каталікамі, а уніятамі.

У расійскай рэальнасці пачатку XIX ст. насельніцтва ВКЛ, якое зусім яшчэ нядаўна было насельніцтвам Рэчы Паспалітай і прызвычаілася да жыцця з Каронай, якое добра ведала польскую мову, бо на ёй вялося справаводства і на ёй вучыліся дзеці, пісалі творы пісьменнікі і паэты, – задумваецца: "а хто ж мы"? У Польшчы былі не зусім палякамі, нас лічылі "русінамі", "ліцьвінамі" – і вось цяпер з "сваімі", з рускімі. Дзе радасць яднання? Выйшла наадварот – адразу мы ўбачылі сваю адметнасць, выявілася, што ніякія мы не рускія, мы іншыя. Мова наша не руская, і не польская, яна асобная, яна... Вось тут і спатрэбіўся новы тэрмін для гэтай адметнай гаворкі – "беларуская" мова. І народнасць, якая засяляе гэты край, празваны рускімі Паўночна-Заходнім, носіць назву – "беларусы".

Так пачаўся мадэрны этап фармавання беларускай нацыі.

І пачаўся ён з фармавання мадэрнай беларускай літаратуры на беларускай мове.

Разам з памянёнымі творамі і пазней з'яўляецца шэраг новых тэкстаў, усё большай і большай літаратурнай вартасці. Хоць спачатку гэты працэс ідзе як бы ў рэчышчы польскай культуры, як нейкі фальклорны ўхіл.

Вось, прыкладам, **Ян Баршчэўскі** (1790–1851), аўтар знакамітага твора "Шляхціц Завальня". Напісаны ён на польскай мове, але мае шматлікія беларускамоўныя ўстаўкі і галоўнае – увесь прасякнуты беларускім духам, атмасферай чароўнай некранутай сівой беларушчыны. Баршчэўскі апісвае народ, сярод якога ён нарадзіўся і вырас: "Жыхары гэтага краю, а менавіта Полацкага, Невельскага і Себежскага паветаў, спрадвеку пераносячы пакуты, зусім перарадзіліся характарам, на іх тварах заўсёды нейкі сум і змрочная задумлівасць. У іх фантазіях блукаюць нядобрыя духі, якія, аднак, служаць злым панам, чараўнікам і ўсім іх непрыяцелям".

Вось вам і адзнакі менталітэту беларуса – задумлівасць, летуценнасць, рамантызм. Беларус – сам з сабою, Кантава "рэч у сабе". Ён ніколі не выкажа адразу свайго меркавання, падумае, "адмерае" і толькі тады абачліва скажа: "А мо і так. Але лепей каб не так." Ці філасофскае: "Няхай будзе як будзе. Як небудзь ды будзе. Яшчэ ніколі не было, каб ніяк не было".

Беларускі народ прыраўноўваецца Баршчэўскім да цудоўнай *пералёт-травы*. "Беларускі народ уявіў сабе нейкую лятучую траву, гонячыся за якой не адзін збіўся з дарогі і не вярнуўся да сваёй роднай хаты". Дальнавідна. Колькі нашых суайчыннікаў апынуліся далёка па-за межамі Айчыны! І многія з іх сталі выдатнымі дзеячамі іншых культур, народаў, нацыяў. Варта толькі ўспомніць: Фёдар Дастаеўскі, Адам Міцкевіч, Ігнат Дамейка, Тадэвуш Касцюшка і г. д. Пералік іх ведамы і складае цікавую галерэю. Але пра тое потым.

**Ян Чачот** (1796–1847). Выдаў у Вільні з 1839 па 1846 г. шэсць зборнікаў беларускіх народных песень. Пісаў вершы як на польскай мове, так і на беларус-

кай. Нарадзіўся Ян Чачот у сэрцы летапіснай Літвы – у Наваградскім павеце. Сваю родную мову называў "крывіцкім дыялектам". Але ён на яе глядзіць як бы збоку, з боку польскага: "Грунтоўны роздум над гэтай мовай, на якой на нашай памяці любілі гаварыць паміж сабой паны і аканомы з сялянамі, на якой пісалі ў нас некалі афіцыйныя акты, застанецца цалком якому-кольвек здольнаму, можа, селяніну, што праз навуку ўздымецца да глыбейшага разгляду дасканала ведамай яму мовы". Нават сабраныя ім песні друкуюцца ў перакладзе на польскую мову. Гэта значыць, што Ян Чачот яшчэ не ўсведамляў беларускай мовы ("крывіцкі дыялект") за самастойную і таму глядзеў на сабраны ім народны скарб як на фальклорны матэрыял, крыніцу ўзбагачэння польскай мовы.

**Адам Міцкевіч** (1798–1855). Гісторыкі беларускай літаратуры чамусьці сарамліва прапускаюць гэтую постаць пры разглядзе беларускай літаратуры першай паловы XIX ст. Прызнаюць, маўляў, Адам быў ліцвінам, нарадзіўся на тэрыторыі Беларусі (Навагрудак), што значную частку яго творчасці складаюць беларускія матывы і... і цалком аддаюць яго суседняй дзяржаве – Польшчы. Чаму ж вы, панове, не аддалі Міколу Гусоўскага Рыму – ён жа пісаў на лацінскай мове? Ці прыклад зусім сучасны: чаму вы, спадары рускамоўныя пісьменнікі з саюза пісьменнікаў спадара Чаргінца, лічыце сябе *беларускімі* творцамі, а не рускімі? Правільна, бо жывяце ў Рэспубліцы Беларусь. Дык вось і Адам Міцкевіч нарадзіўся, вучыўся ў універсітэце ў Вільні і пражыў не адзін год у Беларусі, хоць у тыя часы гэта была тэрыторыя былой Польшчы (Рэчы Паспалітай) у складзе Расійскай Імперыі.

У. Конан сцвярджае, што станаўленне беларускай (беларуска-ліцвінскай) нацыянальнай ідэалогіі пачалося ў XIX ст. І першым прадстаўніком гэтай ідэалогіі быў не хто іншы, як этнічны беларус і класік польскай літаратуры Адам Міцкевіч. Да такой высновы можна прыйсці, калі азнаёміцца з лекцыямі

Міцкевіча з гісторыі славянскіх літаратур, дзе, у прыватнасці, сказана: “На беларускай мове, якую называюць русінскай, гаворыць каля дзесяці мільёнаў чалавек. Гэта найбагацейшая і найчысьцейшая гаворка, яна ўзнікла даўно і цудоўна распрацаваная. У перыяд незалежнасці Літвы вялікія князі карысталіся ёю для свайго дыпламатычнага ліставання”.

Сам А. Міцкевіч называў сваю Айчыну Літвою. Успомнім знакамітае – “Litwo, ty jesteś jak zdrowie!” Навагрудчына, на якой нарадзіўся А. Міцкевіч, называлася ў тыя часы Літвою. Пра гэта сведчыць мноства крыніц, піша пра гэта і знакаміты М. Ермаловіч. У першай палове XIX ст. на Айчыне Міцкевіча – там, дзе гадаваўся юнак Адам, – мясцовыя сяляне гаварылі на мясцовай беларускай мове, шляхта – на польскай. Але ніяк не на літоўскай мове, бо арэал жамойтаў ляжаў значна вышэй. Толькі шмат пазней (пасля сталінскага падарунка ў 1939 годзе) суседняя да Навагрудчыны Віленшчына стала летувізавацца, а сама Вільня станавіцца літоўскамоўным горадам.

Міцкевіч з дзяцінства рос у атмасферы беларускіх народных казак, паданняў, легендаў, чуў і пяяў беларускія народныя песні. І ўвесь гэты народны скарб ён потым выкарыстоўваў у сваё творчасці. Тут і вершы “Свіцязь”, “Свіцязянка”, і паэмы “Дзяды”, “Пан Тадэвуш” і г. д.

Дарма што безліч фактаў сведчыць на карысць беларускасці А. Міцкевіча – у сучаснай Літве так не лічаць. На гэта, у прыватнасці, звяртае ўвагу А. Катлярчук у артыкуле “Нацыянальнае канструяваньне Міцкевіча” (ARCHE, №4, 2006). Аўтар артыкула прыточвае цікавыя звесткі з працы амерыканскага прафесара літоўскага паходжання Томаса Венцлавы аб рэцэпцыі творчасці Адама Міцкевіча літоўскім нацыянальна-вызвольным рухам.

У артыкуле Катлярчука шмат увагі і справядлівай крытыкі аддадзена Т. Венцлаве. Прыводзіцца наступнае выказванне прафесара: “Паэт, які выйшаў з шматэтнічнага і шматкультурнага Вялікага Кня-

ства і адлюстроўвае яго цэльнасць і адзінства, сёння можа стацца сімвалам міжэтнічнай згоды ды сяброўства паміж дзвюма незалежнымі сучаснымі дзяржавамі [Польшчай і Літвой]". "Беларусі ў праве на спадчыну паэта адмоўлена" – бядуе тамака А. Катлярчук. І падсумоўвае: "Заўважым, што акурат лекцыі такога аўтарытэтнага кшталту ствараюць вобраз беларускай культуры на Захадзе."

А як жа ты, браце, хацеў? Адкуль было ўзяцца іншаму вобразу "беларускай культуры" на Захадзе, калі ніхто яго не ствараў інакш! Бо ўсё скрозь савецкае і не нашмат лепшае ад яе сучаснае беларускае літаратуразнаўста безумоўна лічыць Міцкевіча толькі польскім паэтам, які чамусьці нарадзіўся ў Беларусі. І ніяк не тлумачыцца той факт, што ён лічыў сваёй Айчынай не Польшчу, а Літву. А тое, што тая Міцкевічава Літва ёсць нешта іншае як сучасная Беларусь, старанна замоўчваецца.

Дык нам патрэбныя свае Венцлавы! Патрэбны нармальныя праўдзівыя даследаванні творчасці Адама Міцкевіча ў святле праўды – у святле яго роднай Беларусі і унікальнай беларускай культуры. Нам трэба самім ствараць вобраз сапраўднай беларускай культуры, дзе пачэснае месца зойме Адам Міцкевіч, і з гэтым ісці на Захад. І мы пераможам! Бо праўда на нашым баку.

**Людвік Кандратовіч (Уладзіслаў Сыракомля)** (1823–1862) нарадзіўся ў фальварку Смольгава Бабруйскага павета. Бацька паводле прафесіі быў каморнікам. Паходзіў з апалячанай беларускай шляхты. Сам сябе Кандратовіч лічыў ліцвінам, але не этнічным літоўцам. І гэта ён адзначаў у нататках "Экскурсіі па Літве ў ваколіцах Вільні": "Па вуліцы бегалі дзяўчаты і дзеці, якія гаварылі на літоўскай мове, на жаль, незразумелай для нас".

Паэт, публіцыст і эсэіст, ён пісаў па-польску і пабеларуску. У артыкуле пра Дуніна-Марцінкевіча з "Gazety Warszawskiej" Сыракомля фармулюе класічную фразу пра беларускую мову: "Пекная гэта галі-

на славянскай мовы – той крывіцкі дыялект – і старая! Бо гэта мова нашага Літоўскага статута і заканадаўства за два стагоддзі – XVI і XVII. І пашыраная! Бо смела можна сказаць, што на ёй гаварылі тры чвэрці даўнай Літвы, народ, шляхта і паны.”

Хоць У. Сыракомля, як і А. Міцкевіч, усведамляе сябе ў польскай прасторы, піша перадусім папольску, ён звяртаецца ў сваіх вершах да простага народа, ліцвінскага. Прыкладам, у вершы “Прысвячэнне ліцвінам народных гутарак” ён піша:

> ...Хай пад страхою жабрацкай хаціны
> Верш прачытаюць браты-ліцвіны,
> Калі адчуюць брата ў паэце,
> Значыць, не марна я жыў на свеце.
>
> *Пераклад М. Лужаніна*

Усё ёсць – народ, мова яго, ды яшчэ якая, старажытная і прыгожая. І галоўнае, паэт любіць і гэтую мову і гэты край, які да таго ж яго родная старонка. Чаму ж Сыракомля не робіць гэтую мову мовай сваёй творчасці, піша на ёй толькі выпадкова і застаецца ў полі пальшчызны?

Але ўжо ёсць Дунін Марцінкевіч, які надрукаваў першыя творы на беларускай мове. Сыракомлю патрэбен быў усяго адзін крок, адно намаганне, каб усведаміць сябе беларусам, і адна пастанова прыняць у сэрца крывіцкую мову, як ён назваў беларускую мову, зрабіць яе сваёй асноўнай мовай і пісаць на ёй добрыя вершы.

А можа, яму для гэтага кроку проста не стала часу? “Лірнік вясковы” пражыў толькі няпоўных 39 гадоў.

Сярод пачынальнікаў беларускай літаратуры можна ўспомніць яшчэ колькі выдатных імёнаў: Вінцэся Каратынскага, Адама Плуга, Арцёма Вярыгу-Дарэўскага, Юльяна Бакшанскага, Альгерда Абуховіча, Янку Лучыну, інш. Творчасць іх прааналізавана нашымі літаратуразнаўцамі, сярод твораў якіх я б вылучыў цікавую папулярную кніжку Адама Мальдзіса “Падарожжа ў XIX стагоддзе”.

Але сапраўдным пачынальнікам мадэрнай беларускай літаратуры справядліва лічыцца **Вінцэнт Дунін-**

**Марцінкевіч** (1808–1884). Дунін-Марцінкевіч быў тыповым прадстаўніком беларускай шляхты, якая ўсведамляла сябе часткай культурнай эліты былой Рэчы Паспалітай, гаварыла на польскай мове і любіла бавіць свой час з простым народам. Пад уздзеяннем гэтага беларускага селяніна, відаць, і фармавалася няпольскае мысленне Вінцэнта і пачаткі беларускай сведамасці. Першы літаратурны твор В. Дуніна-Марцінкевіча – лібрэта камічнай оперы "Ідылія", хоць і напісаны на польскай мове, лічыцца, тым не менш, першай беларускай операй (Я. Янушкевіч. Прадмова да кнігі "Творы" В. Дуніна-Марцінкевіча). Паны ў "Ідыліі" гавораць папольску, сяляне – па-беларуску. У той час менавіта так і адбываліся кантакты паміж грамадзянамі Паўночна-Заходняга краю Расіі – Беларусі. Ніхто тады і не мог падумаць, што простая, "мужыцкая" мова здольная стаць мовай нацыі, мовай, на якой будзе створана выдатная беларуская літаратура. І тым больш цяжка было суаднесці яе мінулае з часамі Вялікага княства Літоўскага, дзе яна, хоць і ў не зусім пазнавальнай для XIX ст. форме, была дзяржаўнай мовай.

Трэба было зрабіць рэвалюцыйны крок. І вось за серыяй польскіх вершаў Дунін-Марцінкевіч піша на беларускай мове паэму "Гапон" (1855). Пісьменнік шырока выкарыстоўвае фальклор, беларускія песні, прыказкі, прымаўкі. "Гапон адыграў ролю маніфеста новай беларускай літаратуры" – піша літаратуразнаўца Алег Лойка.

Сучаснік паэта У. Сыракомля раіць яму працягваць пісаць творы на "мужыцкай" мове. Ні той, ні другі не лічылі беларускую мову роўнай з добра развітай мовай адукацыі тагачаснай Беларусі – польскай. Але нешта, як магніт, прыцягвае і Сыракомлю, і Дуніна-Марцінкевіча да фальклору, да песень, паданняў і казак і перадусім – да мовы народа. Гэты момант невытлумачальны – чаму, на роўным месцы, калі можна так сказаць, некаторыя людзі, не маючы за гэта ні матэрыяльнага ні маральнага набытку, ідуць

на незразумелыя для абываценя крокі і ствараюць цудоўныя творы – падмурак новай будучай культуры? Проста настае час, калі непрыкметныя перамены, а ў нашым выпадку – перамены ў развіцці нацыі – вымагаюць з'яўлення якасных прыкметаў гэтага новага грамадства, – і раптоўна (у зусім розных этнічных мясцінах) з'яўляюцца носьбіты новай нацыі, у якую ператвараецца "стары" этнас.

У сярэдзіне XIX ст. беларускі этнас пачынае ставіцца нацыяй. "Тутэйшыя", ліцвіны і русіны пачынаюць адчуваць сябе адметнай супольнасцю – не палякамі і не рускімі. І імя гэтай новай нацыі – беларусы. Пачынае ствараецца нацыянальная эліта, і першымі прадстаўнікамі яе трэба лічыць Адама Міцкевіча, Уладзіслава Сыракомлю ды Дуніна-Марцінкевіча. Іх унёсак у беларускую сведамасць і новую беларускую культуру расце ў тым парадку, як я пералічыў гэтыя слаўныя імёны. Аднак розніца паміж імі як прадстаўнікамі беларускай эліты XIX ст. не такая вялікая, як гэта часта ўяўляецца. Пасля іх з'явіцца амаль цалком ужо беларускамоўны Францішак Багушэвіч. Потым... потым – беларуская літаратура і беларуская нацыя.

Жыццё Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча ў адной яго-най асобе дэманструе фармаванне беларускай нацыі. Ад паноўнага польскага фону адрываецца і жыве самастойным жыццём Беларусь. Ад польскіх вершаў паэт пераходзіць да творчасці на беларускай мове.

З 1855 па 1858 гг. (за тры гады) выходзяць чатыры друкаваныя зборнікі "Гапон", "Вечарніцы" і "Апантаны", "Цікавішся? – Прачытай!" і "Беларускі Дудар". На 40 гадоў, да выдання ў 1891 г. "Дудкі беларускай" Ф. Багушэвіча, гэтыя творы былі амаль адзінымі беларускімі творамі ўва ўсім славянскім свеце. І трэба пагадзіцца з меркаваннем Я. Янушкевіча ў прадмове да выдання "Творы" В. Дуніна Марцінкевіча аб тым, што трэба "па праву лічыць Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча пачынальнікам новай беларускай літаратуры."

**Францішак Багушэвіч** (1840–1900). З'яўленне дудара беларускага Ф. Багушэвіча – заканамерны вынік працэсу фармавання беларускай нацыі ў XIX ст., які ўсё больш і больш набіраў абароты пасля з'яўлення літаратурных беларускамоўных твораў Сыракомлі, Дуніна-Марцінкевіча, пасля даследаванняў беларускіх этнографаў Шпілеўскага, Раманава, Сержпутоўскага і іншых даследнікаў і прыхільнікаў беларушчыны.

Пачынаючы з Ф. Багушэвіча як лавіна абрынуліся новыя беларускамоўныя творцы. Беларуская мова і беларуская нацыя сталі фактам гісторыі. Пачалася ўжо сапраўдная літаратурная праца, з'явіліся беларускія паэты, празаікі, публіцысты. І першы ў гэтым ланцугу – Францішак Багушэвіч.

Прадмову да зборніка Ф. Багушэвіча "Дудка беларуская" можна лічыць сапраўдным маніфестам, дэкларацыяй, якая абвяшчала з'яўленне на Зямлі новай мовы – беларускай мовы. "*Вам ахвяруючы працу сваю, мушу з вамі пагаварыць трохі аб нашай бацькавай спрадвечнай мове, каторую мы самі, да і не адны мы, а ўсе людзі цёмныя "мужыцкай" завуць. А завецца яна "беларускай*" – пішацца ў гэтай фенаменальнай, сцісла выкладзенай дэкларацыі.

"Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная, як і другім добрым людзям..." У гэтых радках адлюстравана не проста павага да роднай мовы, а наканаванасць яе для нас вышнімі сіламі, зададзенасць беларускай мовы ад Бога, як задаецца Ім мова і для кожнага народа. Мова не проста сродак зносін паміж людзьмі. Наша мова – святая. Так ніхто яшчэ да Ф. Багушэвіча не сказаў пра сваю мову. Малаймаверна, каб Ф. Багушэвіч быў знаёмы з творамі рускіх хрысціянскіх філосафаў канца XIX ст., але гэтыя словы сугучныя іх думкам, і абгрунтаванне нацыяў і нацыянальнай ідэі хрысціянствам, пра што мы будзем гаварыць ніжэй, фактычна, ужо закладзена беларускім дударом.

Ці быў Багушэвіч пачынальнікам беларускага нацыяналізму, як гэта сцвярджае В. Булгакаў у "Гісторыі беларускага нацыяналізму"?

Безумоўна, вялізная заслуга Багушэвіча ў тым, што ён першым надаў беларускай мове першаступеннае значэнне і ўвагу. "Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі" – цытуем мы яго ўжо колькі гадоў. Мова для Багушэвіча як кроў арганізма, і калі яна выйдзе, то скончыцца і жыццё. Такі радыкальны пагляд на нацыянальную мову яшчэ нікім да Ф. Багушэвіча не выказваўся. Гэты падыход уласцівы нацыяналістам і цяперашняга часу.

Другім важкім унёскам Багушэвіча ў фармаванне беларускай нацыянальнай ідэі было яе абгрунтаванне ў гісторыі беларускага народа і яго дзяржавы. "*...усе яе Беларусяй звалі, і недарма ж гэта! Не вялікая, не малая, не чырвоная, не чорная яна была, а б е л а я, чыстая: нікога не біла, не падбівала, толькі баранілася*".

Францішак Багушэвіч быў сучаснікам К. Каліноўскага, У. Сыракомлі і іншых дзеячоў таго часу. Але ў прыраўнанні з імі ён робіць істотны крок да разумення беларускай нацыянальнай ідэі. "*Яго захоплівае ідэя не толькі палітычнага і сацыяльнага вызвалення "простага" народу, але і нацыянальнага. Яго "праўда" – абшырнейшая, чым "праўда" Яські з-пад Вільні: яна абдымае і элемент сведама нацыянальны*", – піша Антон Луцкевіч.[1]

Сябра паэта Нагродскі адзначае, што беларуская старонка дзейнасці Багушэвіча вынікала з яго антыпатыі да Расіі. Багушэвіч быў гарачым прыхільнікам адбудовы Польшчы – у шырокіх межах, лятуцеў аб тым, што яна магла б астацца пад Расіяй, калі б ад "апошняе адарвалася Польшча". Апісваючы экспедыцыю на лодках у Коўна ў 1897 г. А. Луцкевіч пра змест дыскусіяў у час гэтай вандроўкі, піша: "Усе прамовы мелі чыста польскі нацыянальны характар, і удзел ў гэных прадпрыемствах Багушэвіча паказвае, што пры ўсёй сваёй беларускасці ён лічыў блізкімі сабе і справы польскія". Прыхільнасць да

---

[1] Луцкевіч А. Выбраныя творы. Мн., 2006. С. 86.

польскай нацыянальнай ідэі Багушэвіча адзначае і гісторык Яўген Міранoвіч.

Такім парадкам, гэтыя факты не даюць падставы лічыць Ф. Багушэвіча за сапраўднага, "паўнакроўнага" беларускага нацыяналіста. Аднак, калі ўлічыць той час і тое, што зрабіў Багушэвіч да падняцця сцяга беларускай нацыі з-пад гнёту суцэльнай польскай рэчаіснасці і русіфікацыі, то унікальнасць гэтай фігуры і памеры яе ўнёску ў развіццё беларускай культуры, мовы ды фармавання нацыянальнай сведамасці будуць неацэннымі.

Ф. Багушэвіч, нібы Іаан Хрышчэннік, падрыхтаваў глебу для прыходу запраўдна беларускага месіі – Максіма Багдановіча і цэлай плеяды ўжо "чыстых" нацыяналістаў пачатку XX ст.

## *Частка 2. XX стагоддзе*

### *Максім Багдановіч*



Толькі ў сэрцы трывожным пачую
За краіну радзімую жах, –
Ўспомню Вострую Браму святую
І ваякаў на грозных канях

*М. Багдановіч*

Яго няма – ляціць яго "Пагоня"

*М. Стральцоў*

Калі вы прачытаеце "Загадку Багдановіча", напісаную выдатным майстрам эсэ і навелы Міхасём Стральцовым, то зразумееце, што дадаць вам да ім сказанага ўжо няма чаго. І сапраўды – гэты твор гэтак геніяльны, як геніяльны і сам наш легендарны паэт, нашая зорка – Максім Багдановіч.

Я і не збіраюся рабіць чарговага аналізу творчасці класіка, маё заданне – вылучыць тыя мусовыя моманты ў жыцці і творчасці Максіма Багдановіча, якія могуць даць нам карціну нацыянальнага пачатку ў ягоных творах і жыцці, даць уяўленне аб маштабах

гэтай загадкавай і магутнай фігуры, вызначыць яго-ны ўнёсак у фармаванне беларускай нацыянальнай ідэі.

Багдановіч пражыў 25 гадоў і 5 з паловай месяцаў. Гэта вельмі мала для большасці людзей. Можна паспець, прыкладам, толькі скончыць інстытут, ажаніцца і пачаць, як кажуць, самастойнае жыццё... Багдановіч інстытута не канчаў і не завёў сям'і. Але ён зрабіў тое, што простаму чалавеку не зрабіць і за 100 гадоў. Як піша Міхась Стральцоў, "больш цэнтральнай фігуры, чым Багдановіч, у нас не было". Багдановіч – паэт, крытык, публіцыст, тэарэтык літаратуры. Гэта наш класік, гонар нашай літаратуры.

Гэта ўсё так. Аднак мне ўсё ж здаецца, што галоўным у асобе Максіма Багдановіча быў не літаратурны талент, а ягоная любасць да Беларусі, любасць-агапэ, суцэльная, бязмерная любасць, якая выпраменьвала творчую энергію ў розных кірунках, якая стварала вершы, гістарычныя эсэ, апавяданні, фальклорныя малюнкі...

Факт, які не мае тлумачэння: чаму Максім Багдановіч, пражыўшы ў Расіі большую частку свайго кароткага жыцця – да 20 гадоў, – становіцца не рускім паэтам ці празаікам, а беларускім, маючы аб краіне Беларусь толькі тэарэтычныя звесткі і вывучыўшы беларускую мову завочна, без кантакту з яе носьбітамі? І стаў ён не проста выдатным паэтам, а "цэнтральнай" беларускай фігурай. Чаму ж так выйшла? Можа, гэта гучыць неяк і пафасна, але я перакананы: яго паклікала Беларусь. Паклікала ў містычным, трансцэндэнтным сэнсе, паклікала менавіта *яго* з далёкага Яраслаўля.

На пачатку XX ст. нашая краіна цярпела вялізны пасіянарны ўздым, стваралася новая беларуская літаратура і культура, стваралася беларуская нацыя. У такія часы паводле вышняй Божай Задумы гуртуюцца найлепшыя нацыянальныя сілы, чыніцца мабілізацыйны працэс нацыі. Гэты працэс у кожнага народа абавязкова адбываецца. Часам ён называецца "фармаванне нацыі". Толькі ў большасці нацыяў

да пачатку XX ст. такі перыяд пераўтварэння этнасу ўжо скончыўся. Еўропа станавіла стракаты пейзаж як старэйшых, "культурных", нацыяў: французаў, англічанаў, немцаў, італьянцаў, так і маладзейшых: венграў, румынаў, чэхаў... Беларусам трэба было даганяць іншых. Выбару не было – ці знікнуць, рассыціўшыся ў рускай ці польскай нацыях, ці заявіць пра сябе тэрмінова. Часу не было. І толькі Божай Задумай, заступніцтвам нашай небнай заступніцы Ефрасінні Полацкай можна растлумачыць выбух нацыянальнага руху ў першай палове мінулага стагоддзя. Мабілізацыя чапіла ўсіх, але не ўсе "былі абраныя". Багдановіч быў абраны. Усё ягонае жыццё, як піша Стральцоў, – "гэта подзвіг. Напорлівае і роўнае гарэнне адной страсці. І кароткатэрміновае. Вось чаму яго жыццё нагадвае ўспышку метэора."

Багдановіч быў пакліканы Беларуссю. Яшчэ не вельмі добра ведаючы беларускую мову, ні разу (у сведамым жыцці) не пабываўшы ў краіне, якой ён прысвяціў жыццё, ён становіцца яе найлепшым паэтам, яе сцягам і сімвалам. І самае галоўнае – ён першы беларускі нацыяналіст у сучасным значэнні гэтага слова. Вось у чым, як піша Стральцоў, існасць Багадановіча-нацыяналіста: "Не, мусіць, і "кліч продкаў", і талент, і воля маюць значэнне тады, калі іх прыводзіць у рух якая-небудзь вялікая, па-грамадску значная ідэя. Для Багдановіча такой ідэяй была ідэя нацыянальнага і сацыяльнага разняволення роднага народа. А падказаў яе Багдановічу час.

*Слухайце час!* – гаворыць нам сваім прыкладам Багдановіч."

Стральцоў напісаў сваё эсэ "Загадка Багдановіча" ў 1967–1968 гг. У той час такое спалучэнне слоў як "нацыянальная ідэя" ці (не дай Бог!) – "нацыяналіст" – у прынцыпе не маглі гучаць у дзяржаўных выданнях. Таму і гучыць "разняволенне", нават стандартнае – "сацыяльнае разняволенне" народа. Становіцца зразумелай і галоўная думка, укладзеная ў урыўку (яна ідзе наперадзе і за ёй галоўны сэнс) – гэта выраз

“ідэя нацыянальнага...” Ці пераставіўшы словы – “нацыянальная ідэя”.

І яшчэ цікавы момант. Стральцоў звяртае нашу ўвагу на той гістарычны перыяд, у які прыйшоў Багдановіч. “Слухайце час!” І гэта быў час Максіма Багдановіча. Час патрабаваў яго. Не бацька паэта – ведамы этнограф Адам Багдановіч, не гісторык Паўночна-Заходняга краю М. Каяловіч патрэбны былі тады Беларусі, час чакаў і дачакаўся свайго нацыянальнага героя. Такім нацыянальным героем, геніем стаў сын Адама Багдановіча – Максім. І ён адчуў свой час і выканаў пастаўленае Створцам заданне за дадзены яму такі кароткі тэрмін.

Мы ведаем Максіма Багдановіча перш за ўсё як выдатнага, геніяльнага паэта. Такім ён увайшоў у нашу свядомасць з школьных гадоў. Пазней мы ўведалі Багдановіча як стваральніка знакамітай “Пагоні”, якая стала беларускім нацыянальным гімнам з некалькімі варыянтамі музыкі да гэтых слоў.

Але не паэзія, не літаратурная дзейнасць галоўнае ў асобе Максіма Багдановіча. Галоўнае – той няведамы, містычны зарад энергіі, які ён прынёс з расійскага правінцыйнага горада для таго, каб уваскрасіць Беларусь, выдумаць і даць жыццё беларускай нацыі – і, нарэшце, самому стаць беларусам. Такі чалавек завецца нацыяналістам. Такія людзі ёсць у кожнай нацыі, але іх адзінкі. І гэтыя адзінкі ствараюць новую фармацыю людзей – нацыю.

Тое, што Максім Багдановіч ведаў, як ствараць беларускую нацыю, ведаў, якія галоўныя прынцыпы знаходзяцца ў аснове беларускай нацыянальнай ідэі, можна ўбачыць у ягонай публіцыстычнай і літаратурна-крытычнай творчасці. Успомню некалькі такіх твораў: “Белорусское возрождение”, “Белорусы”, “Хто мы такія?”, “На белорусские темы”, “Голос из Белоруссии”.

“Агляніцеся: усё наша роднае, беларускае, марнуецца, нішчыцца, знікае, бо яго забіваюць, яго прыглушаюць, ім пагарджаюць, а чужое пануе, пашыра-

ецца, мае сабе пашану і павагу. І – хто ведае? – быць можа, пройдзе колькі часу, і не пазнаем мы ані нашага краю, ані нашых дзяцей. І будзе скрозь усё чужое, незвычайнае, а свайго роднага – нічога".

Гэта што? Ці не пра нашу зрусіфікаваную Беларусь пачатку XXI ст. сказана?

Не! Гэта сказаў М. Багдановіч у 1914 годзе ў артыкуле" Хто мы такія". Амаль 100 гадоў таму. На жаль, мала змянілася ў лёсе нашай Бацькаўшчыны за гэтыя сто гадоў, нягледзячы на двойчы абвешчаную незалежнасць Беларусі, на стварэнне за гэты час выдатнай беларускай літаратуры, мастацтва, культуры і навукі. Больш за тое, "роднага", "беларускага" мы ўжо не ўбачым у нашых спрадвечна беларускіх вёсках, там жыруе ўжо "чужое" – і мова, і звычаі, і культура.

Гістарычныя нататкі Багдановіча "Белорусское возрождение" можна лічыць першым творам з гісторыі Беларусі, напісаным з пазіцыі нацыянальна-сведамага чалавека, патрыёта сваёй Айчыны. Здзіўляе кантраст паміж вельмі высокім навуковым роўнем гэтага твора і дастаткова маладым векам аўтара гэтага эсэ. Тут ёсць глыбокія філасофскія разважанні, дасканалыя гістарычныя веды, аналітычныя прагнозы.

М. Багдановіч досыць пранікліва бачыць гістарычны шлях людства і агульны кірунак прагрэсу. Думкі па гэтым пытанні выкладзены ўжо ў першых радках: "галоўныя лініі апошняга (агульнаеўрапейскага прагрэсу – *А.А.*) азначыліся цвёрда і ясна: менавіта яны вядуць у бок усё большага і большага павелічэння драблення культур і літаратур у прыватнасці. Каб у гэтым пераканацца, дастаткова беглага агляду ланцуга найбольш знакамітых і выпуклых фактаў з гісторыі еўрапейскіх культур". У гэтых радках, фактычна, апісана з'ява масавага ўтварэння нацый у XVIII–XIX стст., пра што мы не раз казалі ў гэтай кнізе.

Цікава, што далей па тэксце гэтага артыкула М. Багдановіч вылучае некалькі хваляў утварэння найбольш значных еўрапейскіх культур і народаў. Так,

першая хваля народаў, што сфармаваліся на аснове моцных еўрапейскіх культур, гэта – італьянскі, французскі, англійскі, гішпанскі. Другая хваля адпавядае пазнейшаму ўтварэнню больш дробных культур, такіх як галандская, фінская, эстонская, латышская і г. д. Сапраўды, найбуйнейшыя еўрапейскія нацыі пачалі ўтварацца ад часоў Французскай рэвалюцыі канца XVIII ст., і менавіта ўспомненыя Багдановічам нацыі адпавядаюць гэтаму працэсу. Пазнейшая хваля нацыяўтварэння звязана з працэсамі распаду Еўрапейскіх імперыяў: Аўстра-Венгерскай і Расійскай. Багдановіч гаворыць пра гэтыя нацыі, як ужо гатовы факт, але ж Расійская Імперыя ў 1914 г. (час напісання артыкула) яшчэ існавала! Тым не менш, ён абвяшчае пра ўтварэнне ("адслаенне ад рускай") украінскай і "нарэшце" беларускай нацыі! Праўда, ён ужывае тэрмін не "нацыі", а "нацыянальна-культурныя адзінкі", але ў кантэксце гэта значыць тое самае.

Яшчэ адзін цікавы момант: Багдановіч, спасылаючыся на прафесара Карскага сцвярджае, што беларуская народнасць ужо на канец XVIII ст. сфармавалася ў сваіх галоўных рысах і гэтым яна апярэдзіла нават велікарускую народнасць. Гэтыя думкі вельмі слушныя і знаходзяцца ў поўнай процілегласці тэзісам В. Булгакава пра ўзнікненне беларусаў як нацыі толькі ў часы Расійскай імперыі канца XIX ст. Зрэшты, падрабязней пра гэта пазней.

Багдановіч адзначае вялікую ролю культурнага развіцця Беларусі ў часы Залатой пары і лічыць гэты факт адным з найважнейшых бакоў "паступальнага руху беларускай нацыянальнасці" . Аднак, разам з гэтым, іншы фактар, на яго думку, мае не меншае значэнне – збліжэнне з Заходняй Еўропай, эканамічныя звязкі ВКЛ. "*Менавіта з гэтага часу ў выпрацоўцы беларускай культуры ўдзельнічае не толькі шэрая вёска, але і гандлёвы горад, арганізаваны на асновах магдэбургскага права*". Здзіўляе празорства паэта, здольнасць да рацыянальна-лагічнага мыслення і сістэмнага падыходу пры разглядзе праблемы

нацыі. Можна смела сказаць, што вывады Багдановіча апярэдзілі сучаснасць не менш чым на паўвека, бо менавіта ў спалучэнні культурніцкіх і эканамічных складнікаў, згодна з сучаснымі тэорыямі, будуецца любая нацыя.

### *Янка Купала*

Янка Купала (Луцэвіч Іван Дамінікавіч), нарадзіўся 25 чэрвеня 1882 г. у сям'і беззямельнага арандатара у засценку Лазараўшчына Ігуменскага павета Мінскай губерні (цяпер тэрыторыя Уздзенскага раёна). Продкі Я. Купалы належалі да беларускай шляхты, а потым, з 1869 г., – да мяшчанскага роду.

Ужо восенню 1908 г. Я. Купала трапіў у цэнтр беларускай культуры, у Вільню, дзе працаваў бібліятэкарам прыватнай бібліятэкі "Веды" Б. Даніловіча і супрацоўнічаў з беларускай газетай "Наша ніва". Віленскі перыяд жыцця і дзейнасці Я. Купалы (1908–1909) скончыўся тым, што неспрыяльныя ўмовы, якія склаліся для яго ў рэдакцыі «Нашай нівы», прымусілі яго пакінуць гэтае месца работы. Я. Купала прагнуў вучыцца далей і на пачатку снежня 1909 г. паехаў з рэкамендацыйным лістом У. Самойлы ў Пецярбург да Б. Эпімах-Шыпілы.

Па сканчэнні навучання ў Пецярбургу (1913) Я. Купала вярнуўся ў Вільню і пачаў працаваць сакратаром у "Беларускім выдавецкім таварыстве", потым перайшоў у рэдакцыю газеты "Наша ніва".

У 1919 г., па абвяшчэнні БССР, Я. Купала пераехаў на сталае жыхарства ў Мінск. Тут ён працаваў загаднікам бібліятэкі пры Беларускай хатцы, рэдагаваў часопісы "Рунь" (1920) і "Вольны сцяг" (1920–1922) у 20-я гады XX ст. – часы бурнага ўздыму беларускай справы, росквіту беларускай літаратуры і пісьменства.

І цэнтральнай постаццю тых часоў, якая рупліва трывала стаяла на ніве беларускага адраджэння, быў Янка Купала. Вось пералік асноўных жыццёвых яго крокаў у тыя гады. З пачатку 1921 г. Я. Купала пра-

цаваў намеснікам загадніка літаратурна-выдавецкага аддзела Народнага камісарыята асветы БССР, уваходзіў у склад Акадэмічнай камісіі Акадэмічнага цэнтра Наркамасветы БССР па ўкладанні і апрацаванні беларускай тэрміналогіі. Быў у навукова-літаратурнай (а пасля навукова-рэдакцыйнай) калегіі Наркамасветы БССР, якая разглядала прадстаўленыя да друку творы (пазней яна стала называцца камісіяй, а яе старшынём прызначылі Я. Купалу). У 1921 г. адбыўся інцыдэнт з уладамі: на паэта наклалі хатні арышт і сканфіскавалі рукапісы. Я. Купала быў сярод ініцыятараў стварэння Беларускага драматычнага тэатра (1920), Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1921), Інстытута беларускай культуры (1922). Браў удзел у Акадэмічнай канферэнцыі рэформы беларускага правапісу і азбукі (1926). Разам з Я. Коласам, Ц. Гартным, А. Гурло, М. Чаротам, іншымі пісьменнікамі быў адным з ініцыятараў стварэння літаратурнага аб'яднання беларускіх пісьменнікаў "Полымя", актыўна спрычыніўся да работы гэтага аб'яднання (1927—1932).

Але неўзабаве надышлі змрочныя гады сталінскай дыктатуры. Ужо ўлетку 1930 г. у друку з'явіўся артыкул Л. Бэндэ "Шлях паэта", у якім паэт абвяшчаўся "ідэолагам буржуазнага нацыянал-адраджанізму". 27 лістапада 1930 г. Я. Купала зрабіў спробу самагубства. Аднак яго жыццё ўдалося выратаваць. У снежні 1930 г. у "Звяздзе" быў апублікаваны гэтак званы пакаянны ліст Я. Купалы, напісаны фактычна пад дыктоўку Л. Бэндэ, дзе паэт мусіў прызнавацца ў "памылках" і "шкодных паглядах", абяцаў "парваць" з "кулацкім нацыяналістычным адраджанізмам" і "аддаць усе свае сілы сацыялістычнаму будаўніцтву".

У 1937 г. Я. Купала зноў апынуўся ў спісе чарговых ахвяраў рэпрэсіяў сярод тых нешматлікіх пісьменнікаў, хто яшчэ заставаўся на свабодзе. Аднак расправу над паэтам удалося адцягнуць яшчэ на пяць гадоў. Ён быў нават выбраны ў склад новага бюро секцыі паэзіі ССП БССР (1937), у склад прэзі-

дыума Праўлення ССП СССР (1939), дэпутатам Мінскага гарадскога Савета. У 1939 г. разам з брыгадай беларускіх пісьменнікаў браў удзел у рабоце Народнага сходу Заходняй Беларусі, які прыняў Дэкларацыю аб улучэнні Заходняй Беларусі ў склад БССР.

18 чэрвеня 1942 г. Я. Купала прыехаў у Маскву, а 28 чэрвеня ў гасцініцы "Масква" ён трагічна загінуў: упаў у лесвічны пралёт з 10-га паверха. Існуюць тры версіі гібелі паэта: няшчасны выпадак, самагубства, забойства. Афіцыйна доўгі час падтрымлівалася першая версія. У эмігранцкім беларускім друку смерць паэта звязвалася з самагубствам. Публікацыі канца 1980-х г. (Б. Сачанка, інш., у якіх прымяркоўваюцца факты, аналізуюцца сведчанні вочнікаў і меркаванні блізкіх людзей, даюць падставу лічыць, што Я. Купалу забілі агенты дзяржбяспекі. Матэрыялы камісіі, што займалася высвятленнем абставінаў яго гібелі, да гэтага часу засакрэчаныя, таму дакументальнага пацверджання пакуль што ніводная з версіяў не мае. 1 ліпеня 1942 г. пасля крэмацыі Я. Купалу пахавалі ў Маскве. У 1962 г. урна з прахам Купалы перавезена ў Мінск і пахавана на Вайсковых могілках.

Янка Купала справядліва лічыцца стаўпом беларускай літаратуры, стваральнікам літаратурных нормаў і традыцыяў на сучаснай беларускай мове. Гэта сапраўдны патрыярх нашай літаратуры. Гэта геній і беларускай паэзіі, і прозы, і публіцыстыкі.

Вялікі ўнёсак зрабіў Янка Купала і ў распрацоўванне ідэалогіі ***беларускай нацыянальнай ідэі***. Хоць менавіта такое спалучэнне слоў у яго творах не сустракаецца, у многіх творах Купалы мы бачым шчырага беларуса-патрыёта, стваральніка вобразаў, на якіх прарастае беларуская нацыянальная сведамасць і фармуецца ўрэшце беларуская нацыя ды беларуская дзяржава.

На гэтую тэму грунтоўна праанадізаваў публіцыстыку Янкі Купалы Эдуард Дубянецкі. Яго ўвагу прыцягнулі Купалавы творы, напісаныя і апублікаваныя

праз не адно дзесяцігоддзе, з 1910 па 1920 гг., а менавіта: “Ці маем мы права выракацца роднай мовы” (1910), “Чаму плача песня наша? (1913), “А ўсё ж такі мы жывём!..” (1914), “Вера і нацыянальнасць” (1914), “Больш самачыннасці” (1919), “Адбудова Беларусі” (1919), “Незалежнасць” (1919), “Незалежная дзяржава і яе народы” (1919), “Моладзь ідзе!” (1919), “Справа беларускага нацыянальнага гімна” (1920), інш.

Адным з асноўных складнікаў нацыянальнай ідэі ў Янкі Купалы ёсць “***Вольная, незалежная беларуская дзяржава***”. У артыкуле “Незалежнасць” ён піша, што толькі “адна поўная дзяржаўная незалежнасць можа даць і праўдзівую свабоду, і багатае існаванне, і добрую славу нашаму народу”.

Яшчэ адным вельмі істотным “элементам” нацыянальнай ідэі можна лічыць усведамленне непаўторнасці сваёй Бацькаўшчыны, а таксама самабытнасць, унікальнасць беларускай культуры і мовы.

У ведамым артыкуле “Ці маем мы права выракацца роднай мовы” класік беларускай літаратуры адзначаў, што “*самы важны і не праломны закон жыцця – гэта людская мова, праз каторую чалавек стаў найвышэй ад усякага стварэння пад сонцам*”. Далей Купала сцвярджаў, што кожны народ у свеце адрозніваецца адзін ад аднаго найперш яго “адвечнай уласнай мовай, той мовай, якую вякі ўсвянцілі і ўкаранілі ў ім, на якой ён і яго продкі, з самага пачатку свайго паяўлення на зямлі, узраслі і ўзгадаваліся”.

Акрамя таго, Купала вызначаў яшчэ і такі адмысловы складнік нацыянальнай ідэі, як агульнабеларуская ***нацыянальная еднасць***. Не раз у паэтавых публіцыстычных творах сустракаюцца такія паказальныя словы і словазлучэнні, як “братэрства”, “братцы”, “супольная і згодная праца”, “наш народ, як адзін” і да т. п.

На думку Купалы, у нацыянальнай ідэі заўсёды даволі выразна і яскрава выяўляюцца спецыфічны “вольны народны дух”, асаблівасці культуры і мовы народа, адметныя рысы яго гістарычнага шляху,

ментальнасці (складу розуму, спосабу мыслення). Больш за тое, можна нават сцвярджаць, што менавіта асаблівасці гістарычнага і этнакультурнага развіцця, нацыянальнага характару народа робяць найбольшы ўплыў на нутраное "выспяванне" і, нарэшце, фармуляванне нацыянальнай ідэі. Для таго, каб лепш зразумець гэта, трэба ўважлівей спыніцца, у чым жа бачыў Купала унікальнасць гістарычнага шляху і ментальнасці беларускага народа?

Беларусь, на думку Янкі Купалы, нярэдка падпадала пад эканамічную і палітычную залежнасць ад усялякіх чужынцаў, і таму, каб далей выйсці з падобнага заняпаду, наш народ павінен нарэшце ***стаць сапраўдным гаспадаром*** свайго краю. Толькі ў такім разе беларускі народ зможа дабіцца для сябе "лепшай і святлейшай долі".

Паэт лічыў, што ўсе мы, жыхары Беларусі, як сапраўдныя гаспадары сваёй зямлі, павінны праяўляць "больш самачыннасці, больш смеласці к будаванню свайго новага незалежнага жыцця", а таксама заўсёды "сеяць на роднай зямельцы здаровыя зярняты праўды, брацтва і свабоды" ("Больш самачыннасці" і "А ўсё ж такі мы жывём!.."). У справе паднящця свайго нацыянальнага багацця, развіцця культуры і паглыблення нацыянальнай самасведамасці беларусы за некалькі гадоў зрабілі тое, што "ў палякаў і расійцаў рабілася чуць не цэлымі сталеццямі". Гаворачы пра гэта, Купала мае на ўвазе найперш відавочныя поспехі ў выданні беларускіх кніг, часопісаў, газет, у стварэнні і дзейнасці беларускіх выдавецкіх суполак, кнігарняў, разнастайных таварыстваў, палітычных аб'яднанняў, суполак, у арганізацыі шматлікіх выстаў, вечарын, канцэртаў і да т.п. ( "А ўсё ж такі мы жывём!").

Найбольш тыповымі рысамі беларускага нацыянальнага характару Купала лічыў гуманнасць, талерантнасць, лагоднасць, дэмакратызм. У сваім артыкуле "Незалежная дзяржава і яе народы" ён задаваў, відаць, рытарычнае пытанне: "Ці ж знойдзецца

на свеце болей дэмакратычны па сваёй прыродзе і болей ужыўчывы народ, як народ беларускі?”

Улічваючы ўсё сказанае, можна з некаторай доляй умоўнасці сцвярджаць, што беларуская нацыянальная ідэя ў публіцыстыцы Купалы сваім зместам і глыбінннай існасцю прыблізна адпавядае такім асноўным ідэалам грамадзянскай супольнасці і добра ведамага ў нашы часы гэтак званага адкрытага грамадства, як дэмакратызм, гуманізм, грамадска-палітычны і культурны плюралізм, дзяржаўная незалежнасць, грамадзянская згода і сацыяльная салідарнасць, талерантнасць да “іншадумцаў” і “іншаверцаў”, свабоднае развіццё нацыянальных культур, моў і г. д.

Янка Купала – гэта наш сапраўдны прарок, бо многія яго ідэі, меркаванні альбо ўжо зрэалізаваліся ў Беларусі, альбо яшчэ чакаюць часу свайго практычнага ўвасаблення ў найбліжэйшай перспектыве. І ад таго, ці збудуцца ў рэчаіснасці запаветы вялікага Купалы, будзе залежаць толькі ад усіх нас, ад нашай сілы волі і нашых супольных намаганняў. Таму і цяпер, як і амаль стагоддзе таму, перад намі стаяць гэткія ж задачы, развязваць якія трэба абавязкова і неадкладна, бо ў адваротным выпадку зноў пад пагрозай знікнення апынецца не толькі самабытная беларуская культура і мова, але і ўвесь наш народ як унікальная этнічная супольнасць у свеце.

### *Ларыса Геніюш*



[illegible]

Адзін мой знаёмы паэт неяк сказаў, што мы, сведамыя беларусы, трапляемся ў амаль бястварнай, шэрай і абыякавай масе беларускага насельніцтва як нейкія ўкрапванні, і няведама якім спосабам. Сапраўды, аднаму Госпаду ведама, чаму не толькі ў нашых вёсках, але і гарадах зрэдку з’яўлюцца людзі, якія раптам пачынаюць сябе адчу-

ваць беларусамі, адчуваць сябе нацыянальна і пасля гэтага пераварoту ў сведамасці жывуць ужо інакш. Яшчэ радчэйшы выпадак, калі “беларускасць” дадзена чалавеку ад нараджэння.

Такой была і Ларыса Геніюш. У сваёй “Споведзі” яна піша: “*Я нарадзілася такой, ад пялюшак ужо прасякнутая ўсім, што наша, з болем і прагай змагання за волю і нашую зямлю для нас*”.

Ларыса Геніюш (дзявочае прозвішча Міклашэвіч) нарадзілася 27 ліпеня 1910 г. у маёнтку Жлобаўцы каля вёскі Воўпа Гарадзенскага пав. Гарадзенскай губерні (цяпер Горадзенскі р-н). Адышла да Госпада 7 красавіка 1983 г. у мястэчку Зэльва Горадзенскай вобл.

Ларыса Геніюш выдатная беларуская паэтка, нацыянальны сімвал незалежнай Беларусі. Паходзіла яна з шматдзетнай сям’і землеўласніка. Скончыла Ваўкавыскую гімназію (1928). Узяла шлюб з Янкам Геніюшам, які быў у той час студэнтам медыцыны ў Празе. З 1937 па 1948 гг. Ларыса Геніюш жыла з мужам у Празе. Там яна наладзіла кантакты з нацыянальна-дэмакратычнай беларускай эміграцыяй, брала ўдзел у працы Урада Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) на эміграцыі ў якасці сакратара.

Як і многія беларусы, трапіўшы ў выніку вайны ў краіны Усходняй Еўропы, Ларыса Геніюш таксама была арыштаваная разам з мужам у горадзе Вімпэрку (Чэхія). 12 жніўня іх перадалі савецкім уладам, потым яны апынуліся ў савецкіх турмах Вены і Львова, а з канца 1948 г. – у турме ў Мінску, дзе Ларысу Геніюш дапытваў ведамы сваёй жорсткасцю міністр Дзяржбяспекі БССР Лаўрэнцій Цанава. Савецкія ўлады беспаспяхова патрабавалі ад Л. Геніюш перадаць ім архівы БНР. У лютым 1949 г. Вярхоўны Суд БССР прысудзіў Л. Геніюш да 25 гадоў зняволення ў лагерах. Разам з ёю і на такі самы тэрмін быў асуджаны Янка Геніюш. Пакаранне яна адбывала ў лагерах Інты і Абезі (Комі АССР) і ў Мардоўскай АССР, дзе мела вялікі аўтарытэт сярод палітзняволеных.

У 1956 г. Ларыса Геніюш разам з мужам была часткова рэабілітаваныя, тэрмін пакарання зменшаны да 8 гадоў, якія ўжо мінулі з моманту прысуду. Пасля вызвалення пасялілася на мужавай айчыне ў Зельве. Пасля вызвалення і да апошніх дзён свайго жыцця Ларыса Геніюш засталася перакананай антыкамуністкай, нязломнай беларускай патрыёткай, вернай ідэалам БНР, і прынцыпова адмаўлялася прымаць савецкае грамадзянства. Ларыса Геніюш усё жыццё была шчырай верніцай, і ў Зельве яна таксама брала чынны ўдзел у жыцці царкоўнай грамады мястэчка, хоць гэта быў час, калі царква знаходзілася пад шалёным прэсінгам з боку савецкіх уладаў.

Дом Геніюшаў у Зельве заўсёды быў прыцягальным асяродкам для патрыятычнай творчай моладзі Беларусі. Нягледзячы на нагляд КДБ, тут бывалі частымі гасцямі паэты і пісьменнікі, мастакі, навукоўцы. Ларыса Геніюш была сімвалам незалежнасці Беларусі і беларускай нацыі. Яе словы шмат значылі для людзей, якія не прымалі таталітарнага рэжыму. У спадарыні Ларысы шукалі парады і маральнай падтрымкі, вакол яе аб’ядналіся многія былыя палітвязні Беларусі.

Яшчэ ў гімназіі Ларыса пачала пісаць вершы, а друкавалася з 1939 г. у беларускіх перыядычных выданнях “Раніца”, “Беларускі работнік”, “Новы шлях” і інш. У 1942 г. у Празе выйшаў першы зборнік яе паэзіі “Ад родных ніў”. Пісала вершы і ў зняволенні.

Пасля вызвалення Ларысы Геніюш яшчэ дзесяць гадоў яе творчасць была пад забаронай. У 1967 г. надрукаваны першы ў савецкай Беларусі зборнік “Невадам з Нёмана”. Але па-ранейшаму Л. Геніюш дазвалялі выступаць толькі як дзіцячай пісьменніцы (надрукаваныя 2 кніжкі вершаў для дзяцей). Ужо пасля развалу СССР пасмяротна выдалі найбольш поўныя і найбольш значныя зборнікі яе твораў.

Акрамя вершаў Ларыса Геніюш пакінула пасля сябе унікальную кнігу ўспамінаў “Споведзь” (выдадзе-

на ў 1993 г.), якую падрыхтаваў да выдання яе блізкі сябра археолаг Міхась Чарняўскі. А ў 2005 г. Міхась Скобла ўклаў эпісталярную спадчыну Ларысы Геніюш у выглядзе ёмістай кнігі, выдадзенай пад назвай "Каб вы ведалі: з эпісталярнай спадчыны (1945–1983)".

Гэтыя творы немажліва чытаць без адчування глыбокай павагі перад паэткай. Яна захапляе сваёй сапраўднасцю, цэльнасцю і глыбіннай сумленнасцю. Вось, прыкладам, яна піша ў лісце да М. Прашковіча: "*Бацькаўшчына – гэта акрэсленае паняцце, самой прыродай яно нейк пасвенчанае, а таму для мяне ніколі не можа быць Бацькаўшчынай нейкі эрзац, толькі адна яна, родная...*" Такое пранізлівае азначэнне Айчыны вы не ўбачыце нідзе.

Сучасным кар'ерыстам і графаманам у літаратуры, якія надта вольна сябе пачуваюць на службе ў сістэме прэзідэнта і з лёгкасцю мяняюць свае погляды, перабягаюць з аднаго пісьменніцкага саюза ў другі, варта было мець хоць адну мільённую таго багацця душэўнай шчырасці Ларысы Геніюш – і я мяркую, яны б памяняліся радыкальна.

"*Інтарэсы майго народу – мая святасць, я крывёю магала заплаціць за яго лепшае заўтра, але я хачу, каб усе тут мелі чыстыя сэрцы й рукі*" "*Я прыехала адтуль, гдзе народу вельмі цяжка, і ў імя яго дабра я буду толькі працаваць і жыць*", – піша ў "Споведзі" пра першыя часы пасля прыезду ў Прагу да мужа. Паэтка сцвярджае сваё жыццёвае крэда: чалавек, дзе б ён не быў, у якія б абставіны не трапіў, – заўсёды павінен захоўваць сваю годнасць, "чыстыя сэрцы й рукі". І гэтая яе жыццёвая філасофія не змяніцца праз увесь век. І тады, у вязніцах НКУС, у Мінскіх турмах, у лагерах на Інце – жыццё яе сапраўды Святасць.

Любасць да Бацькаўшчыны, да беларускага народа, да Беларусі – галоўны сэнс жыцця Ларысы Геніюш. У Бібліі ёсць вельмі яскравы сюжэт пра любоў Аўраама да Бога. Каб спраўдзіць, ці сапраўды Аўра-

ам здольны да самаахвярнай любові, каб спраўдзіць, ці не ёсць яго адданасць да Яго толькі на словах, Бог загадвае прынесці ў ахвяру Яму свайго адзінага сына. І Аўраам робіць гэта. Ён прыводзіць свайго ўжо дарослага сына да ахвярніка і збіраецца ўчыніць крывавую ахвяру. У апошні момант Госпад спыняе яго, бо Аўраам сапраўды быў чысты сэрцам у сваёй любасці і выканаў запавет Госпадаў.

Такой самаахвярнай любасцю да Беларусі была і любасць Ларысы Геніюш. Вось як яна звяртаецца да свайго сына ў "Споведзі": "*Я ўмела выйсці з любой бяды, бо кожнаму змагла лагічна даказаць сваю праўду. Я не магла ратавацца толькі ад саветаў, бо тут была адна толькі магчымасьць: прадаць сумленне, чорнае назваць белым, адрачыся ад Хрыста і ўпасці на твар перад Сталіным. Не, не, не!!! Даруй, малы пакінуты юнак, даруй мой сын.... Хачу, каб некалі ты зразумеў мяне, сын, –* ***Бацькаўшчына і яе інтарэсы важней за цябе, за мяне, за нашага тату...***" (курсіў мой – *А.А.*).

На магіле паэткі пастаўлены помнік коштам ахвяраванняў з краю і замежжа. Традыцыйна ў дзень нараджэння Ларысы Геніюш ля яе магілы прадстаўнікі дэмакратычнага беларускага грамадзтва ладзяць памятныя акцыі. І кожны год у дзень смерці паэткі ў Свята-Пятра-Паўлаўскім саборы па ёй служыцца паніхіда.

Да гэтага часу Ларыса Геніюш не зрэабілітаваная.

### *Уладзімір Караткевіч*



Уладзімір Караткевіч – фігура знакавая для тых, хто жыў у часы стагнацыі, брэжнеўскага застою, смачнага "Агдаму" і хто хацеў хоць трошкі дакрануцца да таямнічай беларушчыны, беларускага слова і культуры, гэтае імя цэнтральнае, нацыянальны сімвал той, цяпер для нас рамантычнай, эпохі 70-х – 80-х гг. XX ст.

Хоць Караткевіч у вязніцах не сядзеў, ён, фактычна, быў савецкім дысідэнтам. Ягоныя выдатныя, высокамастацкія, але "несавецкія" творы, калі і друкаваліся, то з вялікім "рыпеннем", то падпольна. Прыкладам, цудоўная, светлая, прасякнутая любасцю да Беларусі кніга "Зямля пад белымі крыламі" пабачыла свет спачатку ў Украіне на ўкраінскай мове і толькі потым вельмі абмежаваным накладам была выдадзена і ў Беларусі на беларускай мове. Дастаць яе можна было толькі праз вялікі блат – таксама прыкмета таго часу. Мне гэта ўдалося, і да гэтай пары "Зямля пад белымі крыламі" займае пачэснае месца ў маёй бібліятэцы.

1982 год. Караткевічу спаўнялася 50 гадоў. Мы разам з Віктарам Сіўчыкам, звычайныя супрацоўнікі-фізікі з Акадэміі навук, адначасна – прыхільнікі творчасці Уладзіміра Сямёнавіча надумалі павіншаваць юбіляра з днём народзінаў. Мы знайшлі адрас – ён жыў на вуліцы Карла Маркса – і пазванілі ў дзверы. Нас сустрэў сябра Караткевіча Рыгор Барадулін і запрасіў у кватэру. Гаспадар вельмі ўсцешыўся, што яго прыйшлі павіншаваць фізікі, бо меў даўную прыхільнасць да нас. Расказаў, што неяк у Payтэбелі назіраў за "наскальнай дыскусіяй" паміж фізікамі і лірыкамі, якія на вялікай вышыні абменьваліся надпісамі на амаль вертыкальнай скале сярод мора. Яны па чарзе пісалі: "Фізікі!", апаненты яшчэ вышэй –"Лірыкі", тыя яшчэ вышэй – "Фізікі!" і г. д. У якасці падарунка мы прынеслі добра пераплецены самвыдатаўскі экземпляр кнігі Міколы Ермаловіча "Па слядах аднаго міфа", і гэта было вельмі дарэчы: Валодзя не меў Ермаловічавых твораў, але шмат чуў пра іх. (А дзе іх у тыя застойныя савецкія часы было набыць!). Дарэчы, імем "Валодзя" паважна называлі У. Краткевіча тады не толькі блізкія людзі, а ўсе сведамыя беларусы, прыхільнікі беларушчыны 70–80-х гг. XX ст.

Уладзімір Караткевіч ведаў і любіў гісторыю свайго народа і разумеў яе як працэс, што дазваляе звя-

зацць у адзінае цэлае мінулае і будучае, дзе кожнаму народу адведзена сваё месца і свая роля. У творчасці пісьменніка менавіта гістарычны аспект найважнейшы: дзейнасць Францішка Скарыны, Кастуся Каліноўскага, Максіма Багдановіча і іншых гістарычных асобаў натхняла яго на стварэнне выдатных твораў. Караткевіч – майстра гістарычнага жанру, вялікі майстра мастацкага пераасэнсавання гісторыі. Разам з тым Уладзімір Караткевіч – шматпланавы пісьменнік, у якім бліскуча спалучаўся талент паэта, празаіка і драматурга.

Караткевіч стаў найпапулярнейшым і чытомым беларускім пісьменнікам яшчэ пры жыцці. Аднак дзяржава да канца трымала яго пад прыцэлам КДБ і ніколі ён не меў ад яе ласкі. Сёння, праз гады, Уладзімір Караткевіч застаецца сімвалам Беларусі, яе нацыянальным геніем. Яго нават называюць Рыцарам Беларусі, рамантычным Рыцарам чалавечнасці.

### *Нацыянальны скарб Беларусі – Васіль Быкаў*



Слова пакідае зорны след,
Бо яго святарыць
Бог паклікаў.
Сёння ведае вяльможны свет:
Беларусь дзяржавіць
Там, дзе Быкаў.

*Рыгор Барадулін*

Я не стаў шукаць у творах Васіля Быкава нейкіх выказванняў пра беларускую нацыянальную ідэю ці аналітычнага твора пра беларускі нацыяналізм. Гэта не трэба. Бо яго жыццё і творчасць само ёсць часткай гэтай нацыянальнай ідэі. Без Быкава няма паўнаты Беларусі, без яго творчасці няма найлепшай і адметнай часткі беларускай мастацкай літаратуры. Яго геніяльнасць і веліч асобы самі сабою падмурак усёй беларускай культуры. Імя Быкава часта сімвалізуе саму Бела-

русь. І калі б знікла ўся беларуская літаратура і застаўся толькі Быкаў, то гэтага было б даволі, каб засведчыць у сусветнай скарбніцы нашу літаратуру.

Быкаў – апошні беларус, якому надалі званне Народнага пісьменніка. І гэта сімвалічна. Беларусь цяпер на раздарожжы.

Лепш, чым блізкі сябра, пра чалавека ніхто не скажа. Таму, калі мне трапіліся словы Рыгора Барадуліна пра Васіля Быкава, я не здзівіўся іх трапнасці і глыбіні: "Яго (Быкава) натуральная культура – глыбінная. Ён увабраў у сябе ўвесь сусвет. І – меў свой сусвет. Які пакуль яшчэ недаацэнены і неспазнаны. Таму яшчэ доўга будуць пісацца даследаванні па Быкаву. І тут няма сакрэту, бо па ім, па Васілю, можна будзе зразумець таямніцу беларускай душы".

А яна асаблівая. Яна не паддаецца ціскам. Гвалту.

Васіль Быкаў быў узорам беларускага інтэлігента. Таго інтэлігента, якога так намагаліся знішчыць нашыя суседзі... І злева, і справа.

Менталітэт беларуса. Мне здаецца, паводле рысаў Быкава можна вывучаць характар беларуса, як піша Барадулін – "таямніцу беларускай душы". Ён да бясконцасці справядлівы, не церпіць ілжы, не можа пераносіць цынізму і хамства на ўсякім роўні, у тым ліку і на дзяржаўным. Ён і апынуўся за мяжой, нягледзячы на немалады век, бо не мог крывіць душой, не мог глядзець на грамадства, дзе ўладарыць хлусня, халуйства і жывёльны страх.

Быкаў – гэта Майстар, Мастак, якому дадзена ад Бога тое, што няведама звычайнаму чалавеку. Гэта – глыба, і нездарма на яго магіле ў якасці помніка стаіць сапраўды глыба з мармуру, якую прывезлі яго сябры з Швецыі.

Чым быў Быкаў для Беларусі, яскрава засведчылі ягоныя хаўтуры. На ягоным пахаванні 22 чэрвеня 2003 г., калі труну з целам вялікага пісьменніка вынеслі з будынка Дома літаратара, за труной пацягнуўся бясконцы ланцуг людзей, за труной ішла

ўся Беларусь. Такой колькасці народу не было нават пры пахаванні Генадзя Карпенкі, які ў 90-х гг. XX ст. быў нацыянальным лідэрам і галоўным прэтэндэнтам на пасаду прэзідэнта Беларусі.

Пасля Быкава, здаецца, у нас не было пісьменнікаў. Таму час падвесці рысу. А зрэшты, яшчэ некалькі слоў...

### *...аб сучасных літаратарах-крытыках і нацыяналізме*

Вельмі любяць разважаць на тэму нацыяналізму сучасныя *літаратары* гэтак званай Беларускай інтэлектуальнай прасторы. Праўда, некаторыя з іх лічацца і філосафамі, як прыкладам, В. Акудовіч. Таму іх творчасць будзе разгледжана ў наступным раздзеле.

Ніжэй я хацеў бы звярнуць увагу на артыкул Валера Булгакава "Пра клясычны і неклясычны нацыяналізм", надрукаваны ў часопісе "ARCHE" (2002, №3).

Аўтар гэтага артыкула з самага пачатку выносіць на абмеркаванне пэўныя творы ведамых ды няведамых літаратараў, прэтэндуе на аналіз з пункту гледжання сучаснай беларускай думкі такіх паняткаў, як "нацыя", "нацыяналізм" і г. д.

В. Булгакаў сведама ці нясведама абмяжоўваецца адно творамі літаратараў на тэму нацыяналізму (аддаючы аднак увагу кнізе польскага навукоўца Рышарда Радзіка). І тут адразу ўзнікае наступная дылема: ці трэба аналізаваць мастацкія якасці разгляданага твора, ці вылучыць той навуковы, праблематычна-пазнавальны сэнс аналізаваных паняткаў. Аднак аўтар яўна блытаецца ў мэтах свайго задання. То ён аналізуе якасці бліскучага *чыста літаратурнага* твора – эсэ У. Арлова "Незалежнасць – гэта...", то спрабуе знайсці вызначэнне філасофска-паліталагічных катэгорыяў нацыі і нацыяналізму ў літаратараў С. Дубаўца ці А. Лукашука. І выяўляецца, што ў В. Булгакава толькі паляк Р. Радзік здольны нешта сказаць пра беларускі нацыналізм навукова. А дзе ж нашыя навукоўцы? Такое ўражанне, што яны аўтару артыкула "Пра кля-

сычны ...” проста няведамы. А такія імёны ёсць. І ў гістарычнай перспектыве і ў сучаснасці. Гэта цэлая плеяда ведамых людзей мінулага: ад Ф. Скарыны, М. Сматрыцкага, князёў Астрожскіх да К. Каліноўскага, В. Ластоўскага, А. Станкевіча, У. Гадлеўскага і многіх іншых. Гэта і нашыя сучаснікі: палітыкі З. Пазняк, Ю. Хадыка; філосафы У. Конан, М. Крукоўскі, літаратуразнаўца А. Мальдзіс; гісторыкі М. Ермаловіч, Г. Сагановіч; палітолагі У. Роўда, В. Чарноў, інш. Найбольш поўна былі прадстаўленыя нашыя даследнікі ў разгляданай галіне ведаў на канферэнцыі “Беларуская нацыянальная ідэя”, што праходзіла ў 1999 гозе ў Горадне. У 2000 г. была надрукавана аднайменная кніга матэрыялаў гэтага форума.

Аўтар памянёнага артыкула пра нацыяналізм “клясычны і неклясычны” абмяжоўваецца, як я ўжо адзначыў, творамі некаторых літаратараў і звязвае іх з праблемай беларускага нацыяналізму. Бясспрэчна, літаратар можа браць за аб’ект літаратурнага апрацавання ўсякія з’явы, як у прыродзе, так і ў грамадстве. У тым ліку і такую філасофскую катэгорыю, як “нацыяналізм”. Іншая рэч, як яна, гэтая з’ява, адэкватная свайму навуковаму адпаведніку. Дык вось ***усе*** разгледжаныя В. Булгакавым літаратары даволі далёкія ад праблем нацыналізму і даволі цьмяна ўяўляюць яго існасць. Літаратурныя мроі – гэта ніякае не адлюстраване самой існасці таго ж нацыяналізму.

Бяруцца, прыкладам, “практыкаванні” С. Дубаўца з кнігі “Русская книга” і з “Практыкаванняў” цытуецца ў Дубаўца: “заняпад беларускай ідэі ёсць, і ён непераадолены...”. Цалкам галаслоўная фраза. Мы толькі пачалі фармуляваць гэтую нацыянальную ідэю, працаваць над ёй, а тут ужо – заняпад. Ці вось: “...беларускасць – гэта творчасць...” А “польскасць”, “французскасць” – гэта ўжо не творчасць? Ну, бавіцца Дубавец у сваіх літаратурных практыкаваннях, але пры чым жа тут беларускі нацыяналізм?

Пра расійскую “пятую калону”: “Кто-то назвал Беларусь “страной отставников”. Это правда.” А чаму

ж Прыбалтака не стала краінай адстаўнікоў, дзе іх таксама шмат? Няма тут "праўды" ў Дубаўца. Чаму мы павінны вінаваціць у слабасці сваіх нацыянальных пачуццяў абавязкова ці прышлых рускіх, ці асоб "каўказскай нацыянальнасці", ці яшчэ каго (дарэчы, няслаба прыклалі руку да знішчэння беларускасці многія польскія дзеячы). Вінаваціць трэба толькі саміх сябе. І сваю ментальнасць. Бо дзякуючы нашай славутай гасціннасці мы лёгка прыжыліся з іншаземцамі і далі ім тут мажлівасць жыраваць і смяяцца з нас.

Ёсць і станоўчыя высновы ў В. Булгакава. Хоць і не смела, але, у існасці, слушна крытыкуецца дзейнасць у Беларусі калабарацыяніста Янкі Філістовіча, якому прысвяціў сваю кнігу "Вяртанне нацыяналіста" А. Лукашук. З грунту, гэтага малодога чалавека проста шкада. Замежныя дзядзькі выслалі яго ў 1951 г. на верную пагібель у Савецкую Беларусь, і гэта з іх боку подласць, а для яго – трагедыя. Але назваць яго нацыянальным дзеячом, нацыяналістам, як гэта робіць А. Лукашук, абсалютна не выпадае.

## 6. Штрыхі да нацыянальнай ідэі ў мастацтве

Гаворачы аб нацыянальнай ідэі ў мастацтве (жывапісе, скульптуры, інш.), а таксама ў музыцы, трэба вылучыць два асноўныя моманты:

1. Ступень наяўнасці нацыянальнага элемента ў творах майстра.

2. Асоба майстра, яго прывязанасць і любасць да свайго народа.

Даследаваннем творчасці беларускіх мастакоў ад даўнага часу займалася спачатку Расійская акадэмія навук (з XVIII ст.), потым Беларускі дзяржаўны музей (з 1923 г.) і Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт) (1921–1929), а з 1929 г. – Акадэмія Навук БССР (1929–1991), Акадэмія Навук Рэспублікі Беларусь (з 1991 г.).

Як і ў іншых сферах беларусістыкі, нас будуць цікавіць не ўсе набыткі беларускага мастацтва, а тыя,

што маюць дачыненне да беларускай нацыянальнай ідэі. Дзе знаходзіцца тая мяжа, што вылучае адметныя творы беларускага мастацтва ад твораў мастацтва сумежных культур – расійскай, польскай, украінскай і літоўскай? Яна не заўсёды лёгка вызначаецца, але гэта ўжо справа часу і майстэрства. Ёсць спецыялісты, што прафесійна робяць гэтую працу, і наша заданне знайсці творы, якія маюць нацыянальную аснову, і паказаць іх адметнасць.

Яшчэ ў XVI ст. у Вільні існавалі цэхі маляроў, пазней утвараюцца аналагічныя майстэрні ў Горадне, з 1800 г. – у Мінску.

1773 г. – экспедыцыяй І. І. Ляпёхіна збіраюцца матэрыялы з гісторыі і культуры Усходняй Беларусі. У сярэдзіне XIX ст. у Беларусі існуюць два асноўныя цэнтры культурнага жыцця – Вільня і Віцебск. У другой палове XIX ст. у Беларусі адкрываецца Віленскі і Магілёўскі музеі царкоўных старажытнасцяў, Віцебскае царкоўна-археалагічнае сховішча старажытнасцяў. Цэлая плеяда выдатных навукоўцаў вывучаюць беларускую культурную і народную спадчыну, фальклор, музыку, песні, народнае мастацтва: П. Бацюшкаў, А. Сапуноў, З. Струкаў, Е. Раманаў, А. Семянтоўскі, Я. Арлоўскі, А. Сержпутоўскі, П. Шэйн і іншыя.

Пасля рэвалюцыі ў 20-х гг. XX ст. вялізную працу па вывучэнні і развіцці беларускага мастацтва правёў Інстытут беларускай культуры (Інбелькульт). Значная роля ў гэтай працы належала Міколу Шчакаціхіну.

**Мікола Шчакаціхін** (1896–1940) першы паставіў пытанне аб беларускіх малярскіх школах: віцебскай, магілёўскай, слуцка-палескай. У 1928 г. выйшла яго унікальная кніга: “Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва”. У гэтай кнізе ўпершыню было пастаўлена пытане аб вывучэнні старажытнага беларускага мастацтва як самабытнага арганізма, які ўлучае не толькі рысы старадаўнай культуры Кіеўскай і Маскоўскай Русі, а таксама візантыйскія і заходнееўрапейскія рысы.

Ён засяроджваў увагу не толькі на ўплывах, але і на цалком нацыянальных элементах у старадаўнай мастацкай творчасці Беларусі. Складанасць сітуацыі была ў тым, што расейскія даследнікі часоў Расійскай Імперыі мала ці зусім не разглядалі беларускае мастацтва і культуру як асобную адзінку, а трактавалі яго цалком у рэчышчы культуры расійскай. Польскія ж даследнікі, сваім парадкам, разглядалі нашу культуру вылучна як польскую, разумеючы пад Беларуссю частку Польшчы – "Kresy wschodnie". Шчакаціхін бачыць сваё заданне ў тым, што трэба "разблытаць гэтую заблытанасць, убачыць сярод перакрыжных уплываў і ўзаемадзеянняў асноўную лінію развіцця, і з-пад цяжару чужаземных элементаў выявіць тое асноўнае ядро, да якога ўжо ў болей сціслым, не толькі тэрытарыяльным, але і ў нацыянальным сэнсе можна дапасаваць тэрмін "беларускае мастацтва", – такім павінна стаць канчатковае заданне гістарычнага вывучэння беларускіх мастацкіх помнікаў.

І Шчакаціхін пастаўленнае заданне развязвае бліскуча. Яго справядліва можна лічыць пачынальнікам беларускага мастацтвазнаўства – цэлай навукі, якая на сёняшні час ператварылася ў значную галіну беларускай культуры наагул.

Цікава, што вось гэтыя 20-я гады XX ст., на якія прыпадае дзейнасць Шчакаціхіна, відаць, неслі нейкую асаблівую пасіянарную сілу, бо далі людству як і выдатных людзей, так і мноства геніяльных твораў, якія складаюць аснову беларускай нацыянальнай культуры.

### *Нацыянальная ідэя ў творчасці беларускіх мастакоў XX стагоддзя*

**Лявон Баразна** (1928–1972) – чалавек, асоба і творчасць якога цэльныя. Абодва гэтыя бакі аднаго чалавека ёсць увасабленнем беларускасці на найглыбіннейшым роўні. Як піша Зянон Пазняк у ўступным слове да каталога выставы Лявона Баразны ў 1972 годзе: "Галоўнае, што характарызавала Л. Баразну, – гэта гарачая любоў да Бацькаўшчыны і няўрымслі-

вая дзейнасць дзеля росквіту выяўленчага мастацтва роднай Беларусі".

Лявон Баразна працаваў у галіне станковага жывапісу і станковай графікі, але асноўная ягоная праца – беларускі сцэнічны касцюм. Яму належаць распрацоўкі касцюмаў для Горадзенскага ансамбля песні і танца «Нёман», Смаргонскага ансамбля песні і танца імя Агінскага, Навагрудскага ансамбля песні і танца «Свіцязь», для фальклорных, харавых і танцавальных ансамбляў Ліды, Слоніма, Паставаў, шэрагу мястэчак і вёсак.

Л. Баразна шмат вандраваў па Беларусі, збіраў узоры народнай творчасці і прыкладнога мастацтва. Мастак гаварыў: "Вандраванне па зямлі свайго народа, вывучэнне жыцця і быту на працягу амаль сямі гадоў дало цвёрдую веру і мэту майго быцця". Мастак захапіўся прыкладным беларускім мастацтвам, і плёнам яго вандровак стала выданне альбомаў малюнкаў "Беларускі народны арнамент Палесся" (1957), "Беларускае народнае адзенне" (1958), Арнамент Горадзеншчыны" (1960). Мастак стварыў і распрацаваў сцэнічныя касцюмы для мастацкіх калектываў і быў нават узнагароджаны Міністэрствам культуры.

Дзейнасць Баразны прыйшлася на 1950–1970 гг. – эпоху росквіту сацыялістычнага рэалізму, змагання з іншадумцамі, строгай таталітарнай падпарадкаванасці ўсіх структур грамадства "ідэалогіі дзяржавы". Хоць «сацыялістычны рэалізм» дэкляраваўся як «мастацтва сацыялістычнае паводле зместу і нацыянальнае паводле формы», любая праява нацыянальнага духу трактавалася камуністычнай уладай у Беларусі як з'ява ідэалагічна не вытрыманая і нават палітычна небяспечная. Русіфікацыя ішла поўным ходам і была скіраваная не толькі супраць беларускай мовы, але і супраць народнага мастацтва. У прыватнасці, у галіне распрацоўкі сцэнічных касцюмаў для беларускіх фальклорных ансамбляў рабіўся арыенцір на расійскія ўзоры касцюмаў.

Л. Баразна стаў заснавальнікам школы беларус-

кага сцэнічнага касцюма. Яго падыход грунтаваўся на нацыянальных традыцыях і на аўтэнтычным народным мастацтве. Ягоныя пагляды паўплывалі на фармаванне светагляду цэлага пакалення мастакоў і мастацтвазнаўцаў. Менавіта яго дзейнасць прывяла да стварэння ў Беларусі мастацкага кірунку – "этнаграфізму".

Займаючыся нейтральнай, індыферэнтнай да палітыкі этнаграфіяй, Баразна займаўся ў існасці палітыкай. Камуністычная ўлада лічыла, што цікавасць да этнаграфіі пяройдзе ў цікавасць да нацыянальнай гісторыі – а гэта, сваім парадкам, будзе мець палітычныя наступствы: ад усведамлення сваіх нацыянальных каранёў і ўсталявання культурнай аўтаноміі недалёка і да палітычнага "сепаратызму" – да развалу СССР. Прадчуванне было слушным. Так, прыкладам, у рэспубліках Балтыі агульнанацыянальныя спеўныя святы, традыцыю якіх не здолела перарваць савецкая акупацыя, плаўна перайшлі ў "спеўныя рэвалюцыі". Нездарма ў Беларусі так і не было створанае "спеўнае поле" накшталт тых, што былі ў нашых балтыйскіх суседзяў. Хоць гаворка пра гэта ішла, і, нібыта, ідэя велізарнай "канцэртнай залі" пад адкрытым небам, здольнай змясціць дзесяткі тысяч чалавек – артыстаў і гледачоў – ужо пачала ўвасабляцца ў праекце. Аднак гэты праект улады палічылі неактуальным.

Баразна ведамы як даследнік традыцыйнай культуры Беларусі. Ён аўтар альбомаў "Беларускае народнае адзенне", "Арнаменты паўднёвай Беларусі", "Тканіны Горадзеншчыны". Як мастацтвазнаўца ён даследаваў мастацкую творчасць беларускага першадрукара Францішка Скарыны. Ягоны альбом "Гравюры Францыска Скарыны" і сёння ёсць адным з стрыжнёвых твораў навуковай Скарыніяны.

Лявон Баразна быў удзельнікам гуртка навуковай і мастацкай інтэлігенцыі "На Паддашку", сябрамі якой збіраліся самвыдатаўскія і забароненыя выданні, рыхтаваліся выставы, арганізоўваліся шу-

канні-экспедыцыі. Сябра гэтага аб'яднання Барыс Мельнікаў успамінае: "Чалавек ён быў адкрыты, як сапраўдны мастак, неабаронены, гаварыў усё, што думаў... Мы яму часта казалі, што побач заўсёды сексоты, але ён, відаць, гэтым пагарджаў, не стрымліваў, можа, гэта адбілася на ягоным лёсе... Ён у сваім асяроддзі прапагандаваў аддзяленне Беларусі ад Савецкага Саюза, гэта была ягоная ідэя, ён з ёю падымаўся і клаўся спаць..."

У канцы 1960 – пачатку 1970-х у Беларусі пачынае стыхійна фармавацца рух у абарону гістарычна-архітэктурнай спадчыны. Гэты рух не быў масавым, ён аб'ядноўваў адносна малалікую творчую і навуковую інтэлігенцыю, а таксама моладзь, якая гарнулася да беларушчыны. Аднак сам факт такога кшталту грамадскай ініцыятывы выклікаў занепакоенасць улады. Абаронцаў старажытных бажніцаў і замкаў цкавалі ў прэсе, пазбывалі мажлівасці публічна выказаць свае думкі. У школах і ВНУ была ўзмоцненая "антырэлігійная прапаганда" і, зразумела, "змаганне з нацыяналізмам".

У 1969 г. Баразна і Зянон Пазняк сталі ініцыятарамі руху грамадскасці ў абарону вуліцы Няміга – старажытнай мінскай вуліцы. Запланаванае знішчэнне Нямігі ўлады тлумачылі канечнаю патрэбаю развязання транспартнай праблемы. Артыкул Лявона Баразны і Зянона Пазняка, у якім яны выказалі свае пагляды на праблему захавання культурнай спадчыны ўвогуле і старажытнай мінскай вуліцы ў прыватнасці, быў змешчаны ў газеце "Правда". Узнікла надзея, што верх возьме здаровы розум, што гэты куток старажытнага Мінску будзе захаваны. Аднак камуністычная ідэалогія і савецкая рэчаіснасць перамаглі – вуліцу Няміга знішчылі.

У 1972 г. Баразна рыхтаваў публічную акцыю пратэсту супраць разбурэння Нямігі, а 15 жніўня таго ж года яго забілі. Следчыя органы трактавалі гэтае забойства як звычайны крымінал, але пэўныя акалічнасці даюць падставы падазраваць у здзяйсненні злачынства савецкія спецслужбы.

У 1975 г. сябры Баразны наладзілі ў Мінску ягоную персанальную выставу, якая мела вялікі грамадскі рэзананс, а запісы ў кнізе водгукаў адлюстравалі настроі ў беларускім грамадстве.

Для нас, беларускіх адраджэнцаў наступнага пакалення, Лявон Баразна сімвалізуе беларускую нацыянальную ідэю ў мастацтве, як яго сучаснік Уладзімір Караткевіч – у літаратуры.

**Марачкін Аляксей (Алесь Мара)**



Год нараджэння – 1940. У гэтай асобе спалучаецца і вытанчаны нацыяналізм яго светагляду, і любасць да Бацькаўшчыны, і неабыякавасць да лёсу беларусаў.

Творчасць гэтага сапраўды нацыянальнага беларускага мастака звязана з развіццём нонканфармізму ў Беларусі, пабудавана ў значнай ступені на беларускім матэрыяле. Падсумоўвае яго творчасць альбом “Аўтаманаграфія”, выдадзены ў 2002 г. У гэтым альбоме адлюстраваны ўвесь жыццёвы і творчы шлях мастака. Рэпрадукцыі з ягоных твораў чаргуюцца з фотаздымкамі савецкіх і постсавецкіх часоў. І побач з імі вершы, кароткія пісьмовыя замалёўкі і думкі творцы.

За якую тэму ні бярэцца А. Марачкін – усюды на першым плане Беларусь. Вось ранняя: “Касмічная пачвара над маёй вёскай” (1975), “Чаканне” (1979), “Дарога” (1979) – пранікліваая паэзія вечнай беларускай вёскі, вясковых занядбаных дарог і ціхіх рачулак. Вось выдатная серыя карцін, прысвечаных нашым найлепшым людзям мінулага, створаная ў 80-я гг. XX-га ст. – “Пачатак, Францішак Скарына” (1978), “Вітаўт Вялікі” (1980), “Рагнеда” (1982), “Іван Луцкевіч” (1981), “Еўфрасіння Полацкая” (1986), “Кірыла Тураўскі” (1987), трыпціх “Размова аб вечнасці. Скарына і Парацэльс” (1989–1990).

Марачкін пазнаецца адразу. Яго ні з кім не зблытаеш. Некалі ў часы майго бурнага ўваходжання ў чароўны свет беларускасці на выставах я пазнаёміўся і з творчасцю Аляксея Марачкіна. Яго палатно "Абуджэнне" (1977) адразу ўвайшло ў сведамасць сваёй незвычайнасцю і нейкай касмічнай стваральнай сілай. І цяпер – праз гады – пазнаёміўшыся і з самім аўтарам гэтага палатна, я па-ранейшаму захапляюся гэтай карцінай і дзякую Богу за тое, што Беларусь не абмінае геніяльнасць.

У канцы 1980-х – пачатку 1990-х гг. узнікае Беларускі Народны Фронт, і Аляксей Марачкін становіцца адным з найактыўнейшых яго дзеячоў. Ён уваходзіць у склад аргкамітэта БНФ, а на знакамітым Віленскім Устаноўчым з'ездзе БНФ у 1989 г. абіраецца ў склад сойму БНФ і застаецца там дагэтуль.

Жыццё і творчасць Аляксея Марачкіна – гэта суцэльнае служэнне Беларусі, гэта беларуская нацыянальная ідэя ў жывапісе, гэта нацыяналізм у грамадскім і палітычным служэнні Бацькаўшчыне.

У альбоме "Аўтаманаграфія", акрамя мноства унікальных фотаздымкаў і рэпрадукцыяў твораў мастака, ёсць шэраг думак мастака, якія даюць уяўленне аб ягоным светапоглядзе. "Як цяжка нашаму люду вызваліцца з бальшавіцка-савецкага павуціння, якое аблытала нас з ног да галавы. Як цяжка скінуць путы несвабоды, якія сталіся часткай нашага цела..." – піша мастак.

А вось пра беларускую нацыянальную ідэю: "Ды ўсё ж ідэя **Беларушчыны,** за якую змагаліся і змагаюцца волаты Адраджэння, ніколі не згасне ў нашых сэрцах. Нас яднае і лучыць вера ў тое, што мы самі не зломкі навесці парадак у нашым Доме. Імя якому – **Беларусь**". Вось такімі ўзнёслымі словамі фармулюе беларускую нацыянальную ідэю мастак Аляксей Марачкін.

Аляксей Марачкін быў ініцыятарам стварэння і першым старшынём мастацкай суполкі "Пагоня", пра якую трэба сказаць некалькі слоў асобна.

*Суполка "Пагоня"*

Творчая суполка "Пагоня" ўзнікла на пачатку 1990 г. Ад першага дня існавання ёй кіраваў Аляксей Марачкін, потым старшынём стаў Мікола Купава. У творах мастакоў "Пагоні" адкрыта гучыць беларуская нацыянальная ідэя. Беларусь, беларусы, гісторыя Беларусі і яе асобы – усё гэта тэматыка "нефармальных" мастакоў, што наважыліся стварыць аб'яднанне па-за традыцыйным Беларускім саюзам мастакоў. У суполку ўвайшлі найлепшыя беларускія творцы: маляры Аляксей Марачкін, Віктар Маркавец, Кастусь Харашэвіч, Мікалай Назарчук, Усевалад Свентахоўскі, графікі Яўген Кулік, Мікола Купава, Пятро Драчоў, плакатыст Уладзімір Крукоўскі, скульптар Алесь Шатэрнік, мастацтвазнаўцы Генадзь Сокалаў-Кубай і Міхась Раманюк. Фактычна, ядро суполкі складалі мастакі, што раней гуртаваліся ў майстэрні Яўгена Куліка, ведамай пад назвай "На паддашку".

Выставы "Пагоні" ўжо ад самага пачатку збіралі мноства аматараў беларускага мастацтва, людзей, неабыякавых да лёсу Бацькаўшчыны, адданых беларускай справе. Чынны ўдзел у суполцы ўзялі як ведамыя мастакі, так і творцы з маладзейшага пакалення В. Сташчанюк, У. Сулкоўскі, Э. Агуновіч, А. Лапіцкая, Р. Сітніца, Г. Скрыпнічэнка, В. Шматаў, Я. Батальёнак, У. Камароў, Л. Талбузін, У. Хадаровіч, С. Цімохаў.

"Мы ўжо з 1990 г. працуем у рэчышчы выяўленчага мастацтва, наш самы галоўны арыенцір – гэта беларушчына, гэта адстойванне свабоды творчасці, гэта наш нонканфармізм. Мы лічым сябе свабоднымі мастакамі, непадуладнымі афіцыёзу, асабліва ў сённяшні час", – так характарызуе сваё стварэнне, суполку "Пагоня", А. Марачкін.

Ідэі нацыянальнага адраджэння, узнятыя яшчэ на пачатку XX ст. Вацлавам Ластоўскім, Міколам Шчакаціхіным, братамі Антонам і Іванам Луцкевічамі, Максімам Багдановічам і Янкам Купалам, знайшлі

сваё ўцелясненне ў творах многіх беларускіх мастакоў. Але асаблівае месца ў развіцці беларускай нацыянальнай ідэі мастацкімі сродкамі займае творчасць Язэпа Драздовіча, Пятра Сергіевіча, Міхася Сеўрука, а таксама трагічна загінулага Лявона Баразны. Іх традыцыі, іх светагляд і ляглі ў аснову мыслення і творчасці мастакоў "Пагоні".

Мастакі "Пагоні" характарызуюцца смеласцю выкарыстоўваных выяўленчых сродкаў, камбінацыйнасцю стыляў, зваротам да найноўшых мастацкіх кірункаў. Мастакі працуюць у шырокім дыяпазоне – ад рэалізму, рамантызму да сімвалізму, сюррэалізму і нонканфармізму. Філасофія нонканфармізму ўласцівая, відаць, не толькі заснавальніку "Пагоні" Аляксею Марачкіну, але і многім іншым мастакам, якія актыўна выказваюць сваю грамадзянскую пазіцыю. Зварот да гістарычнай тэматыкі, да народных традыцыяў шмат у чым спрыяў развіццю новага мастацкага кірунку "этна-арту".

Шуканнем новых спосабаў мастацкага выяўлення займаюцца маладыя сябры суполкі В. Баранаў, П. Багаданаў, Ю. Хілько, С. Цімохаў і іншыя. Маладыя майстры нясуць сваю індывідуальнасць у беларускае мастацтва і разам з тым яны захоўваюць і множаць традыцыі сваіх славутых папярэднікаў, існасць якіх у беларускай народнай душы, роднай мове, гісторыі.

Пра кожнага з мастакоў "Пагоні" можна гаварыць гадзінамі. Я абмяжуюся толькі некалькімі асобамі.

**Яўген Кулік** (1937–2002) быў выдатным графікам. Усё жыццё Я. Кулік стаяў у авангардзе беларускага нацыянальнага руху і ў 1988–1889 гг. менавіта ён стаў побач з Зянонам Пазняком у стварэнні "Руху за перабудову" Беларускага Народнага Фронту.

З ягонага творчага набытку варта ўспомніць унікальныя графічныя нізкі "Помнікі дойлідства Гарадзеншчыны", "Замкі Беларусі", "Паўстаньне 1863 года ў Беларусі". У гэтых творах Я. Кулік распачаў

цэлую плынь у беларускім мастацтве. Менавіта ад ягоных твораў бярэ пачатак гістарызм паваеннае пары.

Яшчэ ў 70–80-я гг. XX ст. мастак аформіў дзесяткі кніжак. Ён адзін з першых выкарыстаў прынцып калажу для ілюстравання кніг, дзе скарыстаў фота, друкарскія шрыфты і ўласныя малюнкі. Першымі кнігамі, якія ён аздабляў, былі “Чарнічка” Артура Вольскага, збор Багдановічавай паэзіі “Маладзік”, падручнік “Беларуская мова”. Але найлепшымі ягонымі працамі стала афармленне твораў “Слова аб палку Ігаравым”, “Мушка-зелянушка і Камарык – насаты тварык” М. Багдановіча, “Ад гоману бароў” А. Александровіча, “Сонечны клубочак” В. Зуёнка.

Разам з сваім сябрам Уладзімірам Крукоўскім Я. Кулік распрацаваў эталон дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь. 19 верасня 1991 г. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь зацвердзіў у якасці афіцыйнай дзяржаўнай сімволікі бел-чырвона-белы сцяг і герб “Пагоня”, які выканалі нашы славутыя мастакі. На жаль, з 1996 г. краіна вярнулася да трохі мадыфікаванай савецкай сімволікі, але думаецца, што гістарычная праўда будзе ўсё ж мацней за кан’юнктурныя памылкі сучаснікаў.

Я. Кулік – аўтар ілюстрацыяў да “Слова пра паход Ігараў”, а таксама слынных ілюстрацый да кнігі “Песня пра зубра” Міколы Гусоўскага. Менавіта на форзацы кнігі ў 1980 г. ўпершыню ў паваеннай гісторыі Беларусі цалкам легальна вялікім накладам з’явілася выява “Пагоні”.

Праз усё жыццё Яўген Кулік пранёс любасць да Беларусі, да яе гісторыі, культуры, традыцыяў. Менавіта вакол яго асобы гуртаваліся нацыяналістычныя, адраджэнцкія сілы беларусаў праз многія гады. І ў савецкія часы, і ў цяперашні час мастак выразна акрэсліваў сваю грамадзянскую пазіцыю. Уладзімір Арлоў успамінае, што “ў 1980 годзе рэспубліканскі камітэт дзяржбяспекі шукаў аўтара растыражаванай

на Захадзе паштоўкі да 1000-годдзя Беларусі. Гэбісты доўгі час не ведалі, што пракляты нацыяналіст, за якога яны атрымалі не адну прачуханку, засеў не дзе-небудзь у лясах ці сутарэннях, а ўсяго толькі на іншым баку праспекта, на паддашку, акурат насупроць іхняга жоўтага дома".

У савецкі час яго майстэрня "На паддашку" была не толькі месцам творчых шуканняў мастакоў, але і цэнтрам нацыянальнай думкі. Фактычна, гэта было месца беларускіх дэсідэнтаў брэжнеўскай, а пасля і гарбачоўскай эпохі.

Творчасць Яўгена Куліка – гэта служэнне беларускай нацыянальнай ідэі сродкамі мастацтва. Жыццё Яўгена Куліка – служэнне беларускай нацыянальнай ідэі кожным днём, кожнай хвілінай.


Аўтапартрэт

**Алесь Пушкін** (нар. у 1965 г.). Кола інтарэсаў А.Пушкіна – размалёўванне і аздабленне інтэр'ераў хрысціянскіх пабудоў, перформансы, станковае малярства, сцэнаграфія, касцюм, плакат.

З Алесем Пушкіным мне пашчасціла пазнаёміцца падчас падарожжа ў Вільню на Дні беларускай і літоўскай культуры ў 2007 г. Ён адразу ўразіў мяне адкрытасцю ў размовах, яснасцю сваёй жыццёвай пазіцыі і... праваслаўным фундаменталізмам. Гэта быў чалавек просты, вельмі цікавы і разам з тым адчувалася, што за ўсёй ягонай шчырасцю хаваецца нейкая таямніца, ведамая толькі яму, і ён, можа, адкрыў бы вам яе, але не мае пэўнасці, што вы зразумееце яго.

Мастацтвазнаўца Яўген Шунейка піша, што Алесь Пушкін "абраў сабе цярністы шлях адкрыцця ў мастацтве праўды, якую не так лёгка казаць, за якую трэба пакутаваць. Але гэтая праўда звязана з сумленнем, з пачуццём адказнасці інтэлігента за свой

народ, за родную нашу зямельку-пакутніцу. А яна вартая найвялікшых ахвяраванняў.”

Можа, гэтая прага праўды прывяла мастака да адкрыцця ў Беларусі новага віду мастацтва – перформанса. Гэтая дзейнасць пачалася 25 сакавіка 1989 г., калі ён арганізаваў першы перформанс, які прысвяціў святкаванню 71-х угодкаў БНР. Гэтым самым, як піша сам А. Пушкін, ён распачаў сац-арт у беларускім мастацтве. Тады ж быў напісаны і маніфест сац-арту. Першыя выставы і перформансы адбываліся ў сценах Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута.

Перформансы Пушкіна ўражваюць сваёй адвагаю і смагласцю: у творы пад назвай “Фенікс Беларусі” ён сам сябе падпальвае, у перформансе “Язафат Кунцэвіч” – плыве ў чоўне па зімовай зледзянелай Дзвіне, у перформансе “З мінуўшчыны” вылівае на палатно 300 грамаў уласнай крыві...

Многія акцыі Алеся Пушкіна канчаюцца арыштамі, “сядзеннямі на сутках”, звальненнямі з працы і іншымі непрыемнымі рэчамі.

У сакавіку 1993 года А. Пушкін адкрывае першую прыватную Галерэю сучаснага мастацтва ў Віцебску “У Пушкіна”. Упершыню ў постсавецкім перыядзе мастацтва ў горадзе Віцебску з’явілася і аформілася як з’ява–галерэя сучаснага постмадэрнізму ў жывапісе маладых Беларускіх мастакоў. За 1993–1995 гг. было праведзена восем значных выстаў жывапісу, графікі, скульптуры, сучаснай фатаграфіі.

Мне давялося пабываць у галерэі “У Пушкіна”, але не ў якасці прыхільніка постмадэрнізму, а дэлегатам Першага з’езда беларускіх нацыяналістаў, які адбываўся тут 25–27 лістапада 1995 г. Аб з’ездзе я ўжо расказваў вышэй, аднак тут хацелася б адзначыць – факт правядзення з’езда стаў адной з нагод хуткага закрыцця самабытнай, цікавай з’явы ў мастацтве – галерэі “У Пушкіна”. У выніку галерэя была зачынена пад матывам “парушэнне статута і нямэтавае выкарыстанне памяшкання”.

Алесь Пушкін – мастак, які жывіцца неўміручым духам нацыянальнай культуры. Яму можна верыць, бо мастак яшчэ ніколі не зманіў, не пайшоў шляхам кампрамісаў, не здрадзіў свайму сумленню. Больш за тое, часам узнікае нават пытанне, ці не занадта Пушкін ускладняе сабе жыццё, ствараючы свае незвычайныя перформансы, ідучы часта на адкрыты канфлікт з уладамі. На гэта мастак сам адказвае так: "Гэта не трэба разумець як мазахізм. Маўляў, нехта сцябае сябе плёткай, а вось Пушкін з мянтамі валтузіцца, кроў сабе пускае і ходзіць па Віцебску босым у васьміградусны мароз. Не. Я — праваслаўны артадокс. І гэта ляжыць у аснове таго, што я не шкадую сябе. Бо сказана ў Бібліі: "Пакутамі амыюся і пакутамі абялюся". Мне больш паверацць, калі я буду ісці босым па снезе і лягу сам, а не пакладу манекен ці падсцялю саломкі там, дзе трэба паваліцца".

# РАЗДЗЕЛ IV. ФІЛАСОФСКІЯ НАРАТЫВЫ БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛІЗМУ

У мае заданні не ўваходзіць разгляд развіцця філасофскай думкі Беларусі. На гэтую тэму напісаны грунтоўныя манаграфіі, артыкулы і дысертацыі. Даволі ўспомніць кнігі С. Падокшына, У. Конана, іншых філасафаў. Мне б хацелася знайсці ў спадчыне мінулага тыя думкі, а можа, і дзеянні, якія беспасярэдне датычаць беларускай нацыянальнай ідэі ці хоць бы нейкіх папярэдніх крокаў да беларускасці, да Беларусі.

Найперш цікавасць, безумоўна, выклікаюць нашы знакамітыя асветнікі, філосафы, першадрукары, пачынаючы з XVI ст. – Залатой пары Беларусі. Аднак найбуйнейшыя фігуры перадрнацыянальнага перыяду Беларусі (Ф. Скарына, С. Будны, М. Гусоўскі, В. Цяпінскі, інш.) я ўжо разгледзеў у ранейшых раздзелах, таму адразу перайду да пытанняў, звязаных з фармаваннем беларускай нацыянальнай ідэі і беларускага нацыяналізму ў мадэрны перыяд фармавання беларускай нацыі, ад другой паловы XIX–XX стст.).

Ёсць яшчэ адно пытанне, якое, мне здаецца, не вартае сур'ёзнай увагі. Але яно ёсць: *"Беларуская філасофія ці філасофія Беларусі?"*

Менавіта так іншым разам ставіцца пытанне. Масцітыя мужы філасофскага алімпу яшчэ ў савецкія часы "разабраліся" з гэтай праблемай. Яны вучылі нас, што не існуе нацыянальнай філасофіі і ёсць толькі савецкая філасофія. Ведама, савецкая філасофія ў часы СССР – гэта з афіцыйнага кампартыйнага гледзішча – "найдасканалейшая думка ўсіх часоў і народаў". Але тыя часы мінулі, і нацыянальныя культуры, нацыянальныя пагляды сталі не часткай савецкай сістэмы, а самастойным быццём кожнага народа былога СССР. І колькі існуе народ, столькі сама існуе ягоная нацыянальная філасофія.

Існаванне нацыянальнай філасофіі як безумоўнага наратыву нацыі прызнавалі шмат якія мысляры.

У Беларусі гэта найперш Мікалай Крукоўскі, які, узяўшы за аснову праблему ідэалу, фактычна прысвяціў шуканню гэтай беларускай філасофіі кнігу "Бляск і трагедыя ідэалу".

Беларуская філасофія акумулюе тыя асаблівасці беларускага народа, якія фармаваліся вякамі. Яна грунтуецца на народных традыцыях, гістарычнай памяці і на ўсёй сукупнасці дыялектаў беларускай мовы. Яна грунтуецца на нацыянальнай сведамасці і ментальнасці беларусаў, на тых рысах беларусаў, што розняць іх ад рускіх, ці англічан.

## 1. Філосафы першага перыяду мадэрнага фармавання беларускай нацыі (першая палова XX стагоддзя)

Засяродзім нашу ўвагу на тых мыслярах, якія зрабілі найбольшы ўнёсак у развіццё беларускага нацыяналізму. Гэта Ігнат Абдзіраловіч, Вінцэнт Гадлеўскі і Адам Станкевіч. Я б сказаў, што яны заклалі падваліны беларускай нацыянальнай ідэі і нацыяналізму.

**Ігнат Абдзіраловіч**

Ігнат Абдзіраловіч – гэта постаць, якая заўсёды ўспамінаецца, калі гаворка ідзе пра той пасіянарны перыяд нацыянальнага адраджэння, што пачаўся пасля грамадзянскай вайны ў Беларусі і скончыўся з усталяваннем сталінскага тэрору.

Ігнат Абдзіраловіч – гэта псеўданім, сапраўднае імя творцы эсэ "Адвечным шляхам" – Ігнат Канчэўскі. Біяграфічныя звесткі пра яго, на жаль, даволі сціплыя. Ведама, што Канчэўскі нарадзіўся ў траўні 1896 г. у сям'і сакратара акруговага вайсковага суда. Вучыўся ў Віленскай рэальнай вучэльні, пасля заканчэння якой паступіў у Пецярбургскі тэхналагічны універсітэт.

Ігнат Канчэўскі з дзяцінства цікавіўся літаратурай, філасофіяй. Не быў ён абыякавым і да нацыя-

нальна-дэмакратычнага руху, што набіраў сілу ў той час. Увосень 1917 г. Ігнат Канчэўскі паступіў на вышэйшыя кааператыўныя курсы пры Народным універсітэце імя А. Шаняўскага ў Маскве. Як і многія маладыя людзі, ён захапляўся ўсходняй філасофіяй і стварыў у Вільні беларускі гурток ёгі.

Але адна падзея вылучыла юнака Ігната ад мноства ягоных аднагодкаў.

У 1921 г. у Вільні невялікім накладам быў выдадзены твор Ігната Абдзіраловіча "Адвечным шляхам". Гэты твор стаўся арыенцірам для мадэрнай беларускай філасофіі, якая пачала нараджацца ў Беларусі. Потым каля шасцідзесяці гадоў ён праляжаў у сховішчах спецфондаў. Толькі ў 1988 г. адбылася перапублікацыя тэксту: спачатку ў часопісе "Неман" у перакладзе на расійскую мову, а пасля – у газеце "Супольнасць" (№№ 4–5, 1988) і ў зборніку "Вобраз-90" у 1990 г.

Аўтару твора "Адвечным шляхам" на момант напісання было 25 гадоў! Вершы і артыкулы Ігната Канчэўскага друкаваліся ў газетах "Наш сцяг", "Наша думка", "Беларускія ведамасці", "Наша будучыня". Як і выдатныя нашы паэты Максім Багдановіч і Паўлюк Трус, іх сучаснік Ігнат Канчэўскі захварэў на сухоты і памёр у Вільні 21 красавіка 1923 г. на дваццаць сёмым леце жыцця.

Я не зусім падзяляю дыфірамбаў С. Дубаўца і некаторых іншых што да геніяльнасці гэтага твора, калі разглядаць яго як твор філасофскі. У 25 гадоў можна напісаць геніяльны верш, але не філасофскі трактат. Калі гаварыць пра твор Канчэўскага як чыста філасофскае даследаванне, дык у поўным сэнсе слова ён такім не ёсць. Аднак эсэ "Адвечным шляхам" – гэта нешта іншае, большае, чым філасофія, гэта сапраўднае паэтычнае адкрыццё, юнацкі парыў любасці да Беларусі, плач па ёй і – чыстата, сумленне, вернасць...

*Нашы часы – часы агульнай заблутанасці, часы паўстання праменных, быццам, ідэалаў й іх канечнага зьніканьня праз нядаўгі час... Тое, што раней здавалася чыстым і сьветлым, штодзенна аплята-*

*ецца жыцьцёвым брудам і пылам. Так зьнікаюць праменныя ідэалы, пакідаючы роспач і безнадзейнасьць. У такія часы адзінокая чалавечая душа шукае, пераглядаючы ўсё тое, што здавалася каштоўным, сьвятым і жаданым.*

З такой прадмовы пачынаецца твор. І нечакана прыходзіць паралель пра неймаверную сугучнасць гэтых думак юнака з далёкага 1921 года XX ст. і 75-гадовага філосафа пачатку XXI ст. Міколы Крукоўскага ў кнізе “Бляск і трагедыя ідэалаў”. Што гэта – 70 гадоў як дваццаць? Як у слыннай песні? Не ведаю, але некаторыя рэчы з вельмі грунтоўнага твора Крукоўскага пераклікаюцца з думкамі Ігната Канчэўскага.

Не шмат твораў прысвечана артыкулу Ігната Абдзіраловіча. Цікава выказваецца, як заўсёды, У. Конан. Аднак спробы напісаць дысертацыю ці абмеркаваць твор “Адвечным шляхам” з гледзішча навукі часам выглядаюць даволі павярхоўнымі. Вось, прыкладам, лекцыі Тацяны Сліњка “Праблема беларускай ідэнтычнасці ў тэксце Ігната Абдзіраловіча “Адвечным шляхам”. Творчага напору аўтаркі ў гэтых лекцыях яўна над меру. Гэта пачынаецца ўжо з разгляду назвы твора Канчэўскага. Даследніца знаходзіць патаемны сэнс у яго назве. Яна піша: “Шлях” можа разглядацца як адзін з архетыпаў, што злучае мінуласць і будучыню, мае позірк, звернуты наперад, да праменных ідэалаў. Менавіта шлях, а не ідэя, бо ідэя, здзяйсняючыся, увасабляецца ў застылыя формы, мярцвее і заканчвае існаванне; шлях жа сягае ў бясконцасць. “Адвечны”, піша даследніца, значыць тут нешта такое, што паходзіць з сівой даўніны, але існуе і цяпер – г.зн. нешта нязменнае, заўсёднае.

Такім парадкам, выводзіцца “нейкі заўсёды існы беларускі шлях, ад якога немажліва ўхіліцца, і які мусіць спраўдзіцца”. Я пэўны, што Ігнат і не здагадваўся, што ён піша пра “існы беларускі шлях”, ад якога нельга ўхіліцца.

Тацяна Сліњка не крытыкуе аўтара, прымае напісанае як досыць абгрунтаваную рэч і мае сваім за-

даннем зрабіць гэтую каштоўнасць яшчэ больш значнай. Але, на жаль, не ўсё ў маладога творцы было бясспрэчным і слушным. Вось, прыкладам, яго пагляд на памежнасць беларускай культуры.

“Пытанне ідэнтычнасці, пошуку (вяртання) свайго шляху, натуральна, было надзвычай актуальным. Да гэтага пытання звярталіся ў той час многія аўтары (Вацлаў Ластоўскі, Дрыгвіч, Янка Купала, Тадэвуш Урублеўскі, Альбін Стаповіч, Усевалад Ігнатоўскі ды інш.), аднак толькі Абдзіраловіч надаў яму метафізічнае вымярэнне. Толькі ў Абдзіраловіча анталагічны статус Беларусі супадае з статусам мяжы паміж Захадам і Усходам, якая адначасна іх падзяляе і аб’ядноўвае, аднак, пры гэтым, не ёсць ні тым, ні іншым. Мяжа, якая зазвычай акрэслівае, фармуе нацыю, у дадзеным выпадку стаецца ейнай існаснай адзнакай, ейнай ідэнтычнасцю”, – піша Т. Слінька.

Анталагічны статус Беларусі, на маю думку, зусім неабавязкова фармуляваць як статус мяжы паміж Захадам і Усходам. Бо мы тым самым адразу ставім сябе ў стан падпарадкавання (мы Захад ці Усход?), адразаем сябе ў тэрытарыяльным сэнсе і вылучаем “Вялікую Русь” – Усход і цывілізаваны Захад – Еўропу. І не застаецца месца нам як самастойнай дзяржаве з самастойнай беларускай культурай і нацыянальнай адметнасцю. У часы ВКЛ такое пытанне, я думаю, не ставілася. Дык трэба ставіць пытанне аб Беларусі не як тэрыторыі паміж Еўропай і Расіяй, а як самастойнай дзяржаве, якая шмат стагоддзяў (Полацкае княства, ВКЛ, Беларусь-ВКЛ у федэрацыі Рэч Паспалітая) была і палітычным, і культурным утварэннем, вартасці якога добра ведамыя і займаюць пачэснае месца ў сусветным сукеццы культур.

Наша мэта – выявіць яго асаблівасці, ідэнтычнасць, і гэта амаль не звязана з геаграфічным размяшчэннем. Кліматычныя асаблівасці – блізкія да суседніх Польшчы ці Літвы, а наяўнасць суседзяў – гэта робіць уплыў перадусім на эканамічныя паказальнікі і прамысловасць. Нашая, беларуская, ідэнтычнасць буду-

ецца на традыцыях, гістарычнай памяці, мове, характары, ментальнасці. Брак кожнага з памянёных каштоўнасцяў адгукаецца і на паўнаце гэтай ідэнтычнасці. Але няма народа, які б меў усё гэта на 100 адсоткаў. У нас жа скаліся такія абставіны, што да гэтай пары наша ідэнтычнасць працягвае фармавацца, удасканальвацца, і існуюць розныя пагляды на яе.

"Не знайшоў сваёй праўды вялікі Адам і загінуў на чужыне з болем у сэрцы. Можна спрачацца пра пераканаўчасць аргументаў, аднак сама назва тэксту "Адвечным шляхам" адсылае да ідэі пра вяртанне да страчанага, але існага шляху, і такім чынам аўтар пакідае па-за тэкстам пытанне пра наяўнасць беларускай ідэнтычнасці..." – піша Т. Слінька. А мне падаецца, што "адвечным шляхам" – гэта якраз наяўнасць гэтай самай ідэнтычнасці, вечная наяўнасць на гэтай зямлі, што завецца беларускай, адметнай супольнасці людзей, якая мае назву беларусы.

**Гадлеўскі Вінцэнт**



Скупыя энцыклапедычныя радкі: Гадлеўскі Вінцэнт нарадзіўся 16 лістапада 1888 г. у м. Поразава Ваўкавыскага павета, памёр 24 снежня 1942 г. Рымска-каталіцкі святар, кіраўнік і ідэолаг Беларускага нацыяналістычнага руху ў 1930–1940-я гг., арганізатар Беларускага нацыянальнага супраціву фашыстоўскім акупантам. Скончыў Віленскую каталіцкую дуовую семінарыю і Пецярбургскую каталіцкую духоўную акадэмію. Удзельнік Першага Усебеларускага кангрэсу, сябра Рады БНР. Адзін з заснавальнікаў і лідэраў Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі. Не раз сядзеў у турме пры польскіх уладах за беларускую патрыятычную дзейнасць. У 1936 г. выйшаў з БХД і заснаваў нацыяналістычную арганізацыю "Беларускі Фронт", выдаваў радыкальную газету "Беларускі фронт", на балонках якой распрацоўваў ідэалогію беларускага нацыяналізму.

Як бачым, Гадлеўскі зрабіў нямала для развіцця беларускага нацыянальнага руху. Аднак галоўнае тут не сказана. Галоўнае – гэта ягоная творчая спадчына, якая толькі цяпер стала вывучацца. Зусім нядаўна з'явілася праца "Ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі: філасофскае абгрунтаванне беларускай ідэі" прафесара Уладзіміра Конана ў часопісе "Наша вера" (№ 1(39)/2007), а таксама і ягоная кніга, прысвечаная Гадлеўскаму.

Следам за У. Конанам я б хацеў вылучыць тыя характэрныя моманты ў ягонай творчасці, якія адрозніваюць В. Гадлеўскага ад многіх іншых дзеячоў нацыянальнага адраджэння. Паспрабую глянуць на гэтага незвычайнага чалавека не як на "аднаго з заснавальнікаў", "ініцыятараў", а вылучыць тое жыватворчае зерне, з якога вырастае беларуская нацыянальная ідэя. І гэта можна ўбачыць, калі пачытаць творы святара, прысвечаныя беларускай нацыянальнай ідэі і беларускаму нацыяналізму.

Вінцэнт Гадлеўскі далучыўся да беларускага руху напярэдадні Першай сусветнай вайны. Побач з душпастырскай дзейнасцю малады святар праводзіў і беларускую патрыятычную працу сярод вернікаў. У снежні 1917 г. Вінцэнт Гадлеўскі браў удзел у Першым Усебеларускім з'ездзе. У 1918 г. уваходзіў у склад Рады БНР і браў удзел у абвяшчэнні дзяржаўнай незалежнасці Беларусі. Быў адным з заснавальнікаў і ідэолагаў партыі Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя.

У міжваенны час Вінцэнт Гадлеўскі жыў у Заходняй Беларусі, якая згодна з Рыжскай дамовай перайшла да Польшчы. Быў пробашчам у мястэчку Жодзішкі ў цяперашнім Смаргонскім раёне. За беларускую патрыятычную дзейнасць не раз арыштоўваўся польскімі ўладамі, два гады правёў у варшаўскай турме.

Гадлеўскі друкаваўся шмат і плённа. Ён пераклаў на беларускую мову "Новы запавет", які ў 1939 г. выйшаў у Вільні. Пасля выхаду з БХД у 1936 г. Вінцэнт Гадлеўскі распачаў выданне газеты "Беларускі фронт". Ён быў перакананы, што дасягнуць здзяйснення ідэалаў беларускага народа можна толькі

зрабіўшы стаўку на свае ўласныя сілы, унікаючы вонкавых уплываў. Публіцыстыка "Беларускага фронту" вельмі актуальная і сёння. У гады Другой сусветнай вайны Вінцэнт Гадлеўскі арганізаваў беларускі нацыянальны антынацысцкі рух Супраціву і здолеў улучыць у яго патрыятычную моладзь. На той час Вінцэнт Гадлеўскі з'яўляўся самым аўтарытэтным беларускім дзеячом.

Можна сцвярджаць, што Гадлеўскі ёсць заснавальнікам беларускага нацыяналізму. На беларускай навуковай і пісьменніцкай прасторы ён першым сфармуляваў існасць беларускай нацыянальнай ідэі. Ён першым увёў панятак "нацыяналізм" у арсенал навукова-практычнага карыстання ў беларусазнаўстве і наагул нашай навуковай і палітычнай прасторы. Усе галоўныя рысы нацыяналізму, якія толькі цяпер мы бярэм за аснову азначэння гэтага панятку, выкладзены ім досыць грунтоўна. Вось артыкул "Патрэба нацыянальнай ідэі". Каб не лічба – "год напісання – 1939" можна было б падумаць, што ён напісаны ў наш час. Вельмі слушныя развагі ў гэтай працы Гадлеўскага пра існасць нацыянальнай ідэі:

*Нацыянальная ідэя лучыць усіх сяброў нацыі: і тых, што жывуць за граніцамі, і тых, што раздзелены часам.*

Вось ён – ***прынцып саборнасці,*** аб якім пісаў яшчэ хрысціянскі філосаф С. Булгакаў, і які быў вылучаны мной як адзіны метадалагічны прынцып хрысціянства і нацыяналізму ў кнізе "Паслухайце нацыяналіста" (Вільня, 2000).

В. Гадлеўскі першым паставіў знак тоеснасці паміж паняткамі "нацыянальная ідэя" і "нацыяналізм". Ён сцвярджаў, што нацыянальная ідэя (нацыяналізм) "прабуджае да вялікіх чынаў тых людзей, якія ў іншых умовах вялі б бескарыснае жыццё. Пад уплывам нацыянальнай ідэі прабуджаецца ў іх ахвота да працы, да ахвярнасці, а часам нават да геройства!" І таму ніякая "філязафічная ідэя ня можа прабудзіць у чалавеку столькі жыццёвых сілаў, колькі прабуджае добра зразумелая нацыянальная ідэя!"

Вінцэнт Гадлеўскі дае таксама ***тыпалогію нацыяналізму***, якая вельмі блізкая да сучасных класіфікацыяў. Ён вылучае нацыяналізм, што ўласцівы народу, якому пагражае асіміляцыя з боку мацнейшых народаў, і называе яго ***абаронным*** нацыяналізмам. У сучаснай літаратуры такі нацыяналізм завецца ***ірэдэнтысцкім***. Другім тыпам нацыяналізму ёсць дзейнасць тых людзей, якія імкнуцца развіваць асвету, культуру, мову свайго народа, Гадлеўскі называе яго ***творчым***. У цяперашняй тэрміналогіі гэты тып носіць назву – ***культурны*** нацыяналізм. Праўда, у духу свайго часу Гадлеўскі выкарыстоўвае тэрмін "нацыяналізм ***імперыялістычны***". Гэта можа быць у выпадку "...калі адзін народ хоча падпарадкаваць сабе іншы народ". Аднак для такога варыянта даўно існуе такі панятак як ***шавінізм***.

Бліскучыя думкі і высновы Гадлеўскага на шмат гадоў апярэдзілі час. Часам не верыцца, што яго артыкулы пісаліся яшчэ ў перадваенны перыяд. Прыкладам, што да гэтак званай "славянскай салідарнасці" ці "славянскай ідэі", пра якую любяць у нас паразважаць прарасійскія палітыкі, В. Гадлеўскі выказваецца негатыўна і піша, што яе (г. зн. славянскай салідарнасці) няма і быць не можа. Ну проста "ў яблычка", прыкладам, наступная фраза: "Гутаркі аб славянскай ідэі пачынаюцца толькі ў часе небяспекі, а ў часе супакою яны заціхаюць зусім". Як тут не ўспомніць славутага Слабадана Мілошавіча, які імкнуўся ўліцца ў славянскі Саюз Беларусі і Расіі ў час страшэнных бамбаванняў НАТО ў 90-х гг. XX ст.

Гадлеўскі паказаў сябе не толькі як тэарэтык нацыянальнай ідэі, ён быў і ўмелым практыкам. Прытым паставіў сабе канкрэтную мэту: здабыццё незалежнасці Беларусі. І, што цікава, меў для гэтага вельмі выразны план. Летам 1940 г. Гадлеўскі пераехаў з Вільні ў акупаваную немцамі Варшаву. Там, у Варшаве, Гадлеўскі і пачынае арганізоўваць беларускія структуры, у тым ліку нелегальныя. Да гэтай дзейнасці ён далучае шмат моладзі, частку складалі

беларусы, якія служылі ў польскім войску ды трапілі ў нямецкі палон, беларускія дзеячы, якія жылі ў Нямеччыне і ў Польшчы. Ягоная кіпучая дзейнасць таго часу сёння выклікае захапленне. Дзякуючы Гадлеўскаму, меней чым за год у нацыянальны рух улілася вялікая колькасць людзей.

У час Другой сусветнай вайны Гадлеўскі стаў кіраўніком Беларускага нацыянальнага супраціву, заснаваў падпольныя нацыяналістычныя арганізацыі “Беларуская Незалежніцкая Партыя”, “Беларускі Цэнтральны (Народны) Фронт”, ініцыяваў стварэнне нацыянальнага партызанскага руху. 24 снежня 1942 г. яго арыштавалі супрацоўнікі СД і ў той жа вечар расстралялі ў урочышчы Благоўшчына ў Трасцянцы пад Мінскам.

23 снежня 2006 г. у мінскім касцёле св. Сымона і Алены адбыліся першыя Навуковыя чытанні, прысвечаныя светлай памяці ксяндза Вінцэнта Гадлеўскага. На чытаннях выступілі розныя людзі – ксёндз-магістр Уладзіслаў Завальнюк, паэт Рыгор Барадулін, філосаф Уладзімір Конан, гісторык Леанід Лыч, іншыя ведамыя навукоўцы, літаратары і грамадскія дзеячы. Можа, гэтая падзея стане пачаткам вяртання Беларусі яе слаўнага сына, першапраходцы і стваральніка беларускай нацыянальнай ідэі, патрыёта Бацькаўшчыны.

**Станкевіч Адам**

Высока ў буру
і ў непагоду
Ты родны крыж і сцяг
трымаў
Між беларускага
народу
Святую праўду
засяваў
*Верш на магіле А. Станкевіча*

Адам Станкевіч сучаснік Вінцэнта Гадлеўскага. Гэтыя дзве постаці раўнаважкія і паводле ўнёску ў развіццё беларускай думкі, і паводле маштабу

практычнай працы сярод беларускага народа. Абодва ксяндзы, абодва хрысціянскія і грамадскія дзеячы, абодва зрабілі неацэнны ўнёсак у падмурак беларускага нацыяналізму.

У артыкуле "Хрысціянства і беларускі народ" А. Станкевіч разважае аб сінтэтычнай сіле хрысціянства – як ён піша "творачага народнасць". На закід аб тым, што хрысціянства ў нас ёсць хутчэй сілай падзелу і дэнацыяналізацыі народа, ён дае такі адказ: гэта так, калі "*разважаць у нас хрысціянства паддзельнае, палітычнае - расійскае і польскае, і зусім беспадстаўны, калі разважаць хрысціянства ў самай яго існасці*". Іншымі словамі, ён раздзяляе хрысціянства палітычнае, тое, што служыць пэўным палітычным мэтам асобных дзяржаў, і хрысціянства тое, якое існуе з апостальскіх часоў, якое прыйшло да нас праз Хрыста і прынесла нам Святло Праўды.

Менавіта на такіх пазіцыях стаялі рускія рэлігійныя філосафы канца XIX – першай паловы XX стст., якія сфармулявалі існасць нацыяналізму і абгрунтавалі яго ў хрысціянстве (І. Ільін, М. Бярдзяеў і г. д., пра якіх не раз гаварылася ў гэтай кнізе).

Адам Станкевіч – першы з беларускіх мысляроў самастойна, не абапіраючыся на думкі памянёных філосафаў, прыходзіць да такой самай думкі аб хрысціянскіх каранях нацыяў, нацыяналізму і найперш – беларускага народа.

Усю гісторыю беларускага народа ў артыкуле Станкевіч разглядае праз прызму хрысціянства: "Хрысціянства магутна спрычынілася да паўстання беларускай нацыянальнасці, скрапляла і аберагала яе, падтрымлівае і абяргае нашу нацыянальнасць і сяння". Не дзелячы хрысціянства паводле гістарычна-багаслоўскай прыкметы (праваслаўе, каталіцызм, пратэстантызм), Станкевіч вылучае галоўную сілу гэтай веры, незалежную ад канкрэтызацыі Сімвала Веры – гэта маральная, духовая сіла "апёртая на адвечным фундаменце Божага права". І гэты фундамент, сваім парадкам, служыць апорай правоў чалавека, правоў на самабытнае існаванне ўсіх народаў.

Станкевіч на працягу кнігі выкарыстоўвае слова "народ" і слова "нацыя", фактычна, для абазначэння аднаго панятку. Але гэта не мяняе сэнсу ягоных высноў. На той час толькі рабіліся першыя крокі для зразумення мадэрнага ўтварэння пад назвай "нацыя". Неакрэсленасць гэтых паняткаў, блытаніна з азначэннямі – адзнака не толькі пачатку XX ст. – і ў наш час можна сустрэць тэксты, дзе не робіцца патрэбнае размежаванне.

Разглядаючы пытанне аб дзейніках, якія ўплывалі на працэс утварэння беларускай нацыі (народа), Станкевіч ставіць пытанне аб найбольш важнай прыкмеце нацыі. І дае наступны адказ. Нацыя – гэта не раса, як супольнасць паходжання, бо ўвесь час ідзе змешванне народаў, і ў беларускай расе ёсць дамешка крыві маскоўцаў, украінцаў, палякаў, літоўцаў. Гэта не мова, бо "*язык можа астацца, а нацыя можа згінуць*". У пацверджанне гэтай тэзы ён прыточвае прыклады лацінаамерыканскіх народаў, што карыстаюцца іспанскай мовай, швейцарцаў, што маюць некалькі родных моў, і г. д. Гэта не тэрыторыя, бо на адной тэрыторыі могуць жыць розныя народы. Гэта не звычаі і абрады (у аўтара – абычаі), бо яны мяняюцца. Не ёсць прыкметай нацыі і рэлігія – "*гэта зусім ясна*".

Што ж трэба для таго, каб азначыць народ? Апрача памянёных чыннікаў, ні адзін з якіх не ёсць галоўным, патрэбна "супольная сведамасць і супольная воля як дзейнік, завяршаючы паняцце народа". Пачуццё супольнасці – гэта як бы завяршэнне творчага сацыяльнага ўхілу чалавека. І каб гэтае пачуццё стварылася, піша Станкевіч, патрэбна існаванне нейкіх дзейнікаў. І вось такімі дзейнікамі ёсць мова, лучнасць этнаграфічная (раса), інш. У стварэнні беларускай нацыі вялікую ролю адыграла ***хрысціянства***. Яно не толькі спрычынілася да паўставання беларускай нацыянальнасці, але і "*іграла ў гэтым кірунку выдатную, а можа і галоўную ролю*", – падкрэслівае Станкевіч.

Які ж набыткі беларускаму народу прынесла хрысціянства? Перш за ўсё гэта ***пісьменнасць***, якая дала розным плямёнам, што насяляюць нашы землі, мажлівасць сумоўя, мажлівасць спрычыніцца да набыткаў тагачаснай сусветнай цывілізацыі – грэкалацінскай антычнай культуры, твораў хрысціянскіх мысляроў – "*А ўсё гэта пабуджала творчы інстынкт народу і развівала яго нацыянальную асаблівасць, прычыняючы гэтым да большага зліцця гэных нашых плямён у вадно цэлае нацыянальнае*".

Ксёндз Адам Станкевіч быў актыўным дзеячом Каталіцкай Царквы, але, выдатна разумеючы гістарычную місію праваслаўя для беларускага народу, ён цалкам аб'ектыўна пісаў:

*За часаў у беларускай дзяржаве літоўскай дынастыі, калі ў нас ужо панавала праваслаўе, беларускі народ, баронячыся ад наступу на Беларусь лацінізму і полёнізму, бараніў не толькі сваю рэлігію, але так жа і нацыянальнасць, ажыўляючы і паглыбляючы ў масах яе супольнасць і адзінства.*

Не менш значную ролю ў яднанні народа адыгрывала хрысціянства і пазней, у часы уніі:

*Узноў жа, за часаў уніі, калі культурныя і багатыя класы пакінулі народ, пераходзячы ў лацінізм і польскасць, і калі гэтыя апошнія штораз больш насядалі на народ, ён, баронячы сваю уніяцкую веру, свой усходні абрад, бараніў і цэментаваў далей і беларускую сваю нацыянальнасць.*

У апошні перыяд нашай гісторыі, час існавання Беларусі ў складзе Расійскай Імперыі, таксама вызначальную ролю грала хрысціянства. Але А. Станкевіч адмоўна ставіцца да расійскага праваслаўя, слушна лічыць яго палітычнай зброяй таго часу. І, на яго думку, толькі каталіцкая вера стала сапраўдным выратавальным арыенцірам для беларусаў: "*Лацінскае каталіцтва тады ў Беларусі падтрымлівала і зберагала да лепшых часаў беларускую нацыянальную ідэю*".

Можа, у той пераходны перыяд, пасля падзелу Рэчы Паспалітай і асабліва пасля скасавання уніі ў

1839 г. расійскае праваслаўе і сапраўды было не зусім родным беларускаму народу. Але гэта зразумела – 243 гады ў нас уладарыла унія, і тыя традыцыі праваслаўя, што існавалі да 1596 г., былі забытыя. Але вельмі борзда народ адаптаваўся да новай формы сваёй спрадвечнай веры, і яна зноў стал яму блізкай. А сведчаннем ёсць наш час, калі большасць беларусаў праваслаўныя, а каталіцкі складнік, як і раней, становіць сабой пераканаўчую меншасць.

Цікавыя думкі выказвае А. Станкевіч што да прыняцця уніі ў ВКЛ. Ён піша:

*Берасцейская унія трымалася і развівалася на беларускіх землях, як увідзім пазней, 243 гады. За гэты так вялікі час яна настолькі зраслася з беларускай душой, што, ужо смела можна сказаць, сталася сапраўды народнай беларускай верай. ... Каб яны гэтага не зрабілі (не прынялі унію – А.А.), то ў будучыне як для беларускай цэрквы, так і для беларускай нацыі было б яшчэ горш. ... Вось жа праз унію Беларусь, праўда, шмат страціла, але, трэба прызнаць, здабыла значна больш – праз унію яна захавала веру айцоў сваіх на працягу 243 г. і прынамсі ў сваей аснове захавала так жа і сваю нацыю.*

З гэтым цяжка не пагадзіцца, бо праваслаўе пасля 1596 г. імкліва страчвала свае пазіцыі, і неафіцкі шлях прыняцця каталіцызму ў маштабах дзяржавы значыў імклівае скаталічванне насельніцтва і разам з тым спалячванне. Праз два стагоддзі аб існаванні беларусаў ужо б забыліся. Унія выступіла шчытом народа. Праўда, мы пазней **(Раздзел VII)** будзем гаварыць, што ў апошні перыяд XVIII ст. перад падзелам Рэчы Паспалітай быў наступ пальшчызны, пачалося спалячванне уніяцкай службы, уніяцкіх святароў і пераход іх на польскую мову ў літругічным жыцці. Так што вынік мог быць, зноў-такі, сумны – на карысць поўнага спалячвання беларусаў. І выходзіць, што расійская экспансія канца XVIII ст. паслужыла на карысць беларускаму этнасу і ў канцавым выніку стымулам фармавання беларускай нацыі.

Уладзімір Конан прысвяціў жыццю і дзейнасці ксяндза Адама Станкевіча першую ў савецкай і постсавецкай літаратуры кнігу “Ксёндз Адам Станкевіч і каталіцкае адраджэнне ў Беларусі”. У кнізе праведзена вялікая праца на вывучэнне спадчыны Станкевіча, раскрываецца ўся паўната хрысціянскіх і нацыянальных каштоўнасцяў. І хочацца закончыць наш кароценькі аповед пра ўнёсак у беларускую нацыянальную ідэю А. Станкевіча словамі, з якіх пачынаецца кніга У. Конана: “Адам Станкевіч належыць да тых слаўных рыцараў рэлігійнага і нацыянальнага адраджэння Беларусі, якія апошнімі вяртаюцца ў нашу культурную традыцыю”.

## 2. Філосафы сучнасці (пасля 90-х гг. XX ст.)

Сучасная філасофская думка развівалася на постсавецкай прасторы, і нельга чакаць векапомных твораў, істотна новых падыходаў да праблемы беларускай нацыі і нацыяналізму. Аднак некаторыя грунтоўныя творы ёсць і, найперш, я б адзначыў творчасць У. Конана, М. Крукоўскага, С. Падокшына, У. Роўды, іншых.

Разам з памянёнымі аўтарамі я наўмысна не стаўлю творцаў гэтак званай “Беларускай інтэлектуальнай прасторы (БІП)”, бо, як я паспрабую паказаць ніжэй, іх дзейнасць мае мала супольнага з канструкцыйнай працай на карысць развіцця беларускага нацыяналізму і беларускай нацыі, хоць і працуюць яны на беларускім полі. Толькі ці на карысць Беларусі іх творчасць? Я маю на ўвазе шэраг аўтараў, што гуртуюцца вакол часопіса “ARCHE” і газеты “Наша ніва” – галоўнага рэдактара “ARCHE“ Валеркі Булгакава, “філёзафа” Валянціна Акудовіча, манаха Пётры Рудкоўскага і шэрагу іншых аўтараў.

Тут будзе разгледжана некалькі кніг памянёных аўтараў і дадзена ацэна якасці гэтых твораў.

### *Частка 1. Аўтары “ARCHE”*

Найперш мне б хацелася прааналізаваць некаторыя творы літаратара (ці філосафа?) Валянціна Акудовіча.

**Валянцін Акудовіч**

Свае пагляды Акудовіч яскрава выклаў у эсэ "Вялікая здрада" і пасля ў кнізе "Код адсутнасці".

У "суплёце эсэ" "Вялікая здрада" (Дзеяслоў. № 10–12, 2004) адлюстравана мода апошняга часу на экзатычнасць і арыгінальнасць стылю выкладання думак і разам з тым неглыбокі аналіз філасофскай існасці праблемы нацыяналізму і нацыі.

З самага пачатку свайго эсэ В. Акудовіч ідзе ў лабавую атаку на рэлігію. Ён сцвярджае: "Нацыянальны чалавек паўстаў з крызы рэлігійнага чалавека і, шырэй, з крызы цывілізацыі рэлігійнага тыпу". Аднак адкуль узялася гэтая "рэлігійная крыза"? Уся цывілізацыя людства напоўнена шуканнямі Бога, і яны адлюстраваны ў стварэнні народамі сваіх рэлігійных канцэпцыяў. Языцкая вера продкаў замянілася сістэмамі монатэізму. У нас гэта хрысціянства, якому споўнілася 2000 гадоў, і ўвесь гэты час у гісторыі напоўнены змаганнем за сцверджанне хрысціянскіх каштоўнасцяў, якія ўвайшлі ў наш быт, лад нашага жыцця... І ўсялякія адхіленні ад хрысціянства прыводзілі да страшных скрыўленняў гісторыі людства накшталт фашызму і камунізму. У арабаў – мусульманства, якое трохі маладзейшае, але таксама валодае лёсам мільёнаў людзей. У індусаў – будызм і індуізм і г. д. **Ніхто**, адзначу, і **ніколі** не можа адрынуць Бога. Толькі князь гэтага свету – сатана.

Можна меркаваць з усяго, што В. Акудовіч атэіст. Сапраўды, ён спрытна адмятае ідэю Бога, заміж якой, згодна з ягоным разуменнем, была "пакліканая ідэалагема Нацыі".

Э. Рэнан першым вывеў нацыю за межы этнічных рамак і пастуляваў яе як духовы прынцып. Больш за тое, нацыя – гэта містычны, трансцэндэнтны прынцып духовага жыцця чалавека. "Нацыя – гэта вялікая салідарнасць, якую ўсталёўваюць пачуццём ахвяраў, што ўжо зроблены і што мяркуюцца здзейсніць у будучыні... нацыя – гэта штодзённы плебісцыт, як існаванне індывідуума – вечнае сцверджанне жыц-

цыя. Жаданне нацыі – адзіны законны крытэр, да якога трэба заўсёды вяртацца".[1]

Існасць ідэі нацыі ў тым, што этнічныя супольнасці праз пэўны перыяд пераходзяць у якасна новую стадыю свайго існавання – нацыянальную. Падрабязна гэты пераход разгледжаны мной у кнізе "Паслухайце нацыяналіста"[2], дзе я назваў гэтую стадыю нацыятэізмам. Гэта якасна новы крок у бясконцым імкненні чалавека да Бога. Эвалюцыя людства ў нацыі набывае новы вітох, які набліжае яго да канцавой мэты – Сусветнай Царквы, як гэта даводзіць таксама Канстанцін Лявонцьеў. Нацыя – гэта супольнасць, у аснове якой ляжыць любасць да свайго народа, вытокі якой ляжаць у хрысціянстве (ці іншай рэлігіі, але яны абавязкова ёсць). Добра сказаў Бярдзяеў: "Пасля найвышэйшай каштоўнасці і бясконцага дабра – Бога, менавіта Нацыя ёсць найважнейшае дабро Чалавека. Удзелам у жыцці свайго народа чалавек вырашае сваё жыццё ва ўсяленскасці, Боскасці і ўдзельнічае ў жыцці людства як сукупнасці народаў".

Спрэчныя выказванні – соль філасофіі В. Акудовіча. Нельга прайсці паўз ягоныя выказванні пра дачыненні Бога і чалавека. У раздзеле "Рэлігійнае і нацыянальнае" ён пастулюе сваё крэда: "Ёсць Бог і ёсць адзін, сам-насам, чалавек. І больш нікога і нічога няма, прынамсі, усё астатняе неістотнае... Бог і чалавек звязаныя між сабою верай чалавека ў Бога і любоўю (хоць гэта часам і выклікае сумнеў) Бога да чалавека".

Мне шчыра шкада чалавека, які напісаў такія радкі, які жыве з такімі жахлівымі думкамі. Бог і чалавек не "сам-насам", яны адно цэлае і толькі любасць Бога да чалавека – адзіная сапраўдная каштоўнасць для нас. Паводле Акудовіча, рэлігійны тып цывілізацыі такі прымітыўны, што ў "дачыненьнях паміж Богам і чалавекам дзве змацаваныя накрыж трэскі маюць ад-

[1] Renan Ernest, Qu'est-ce qu'une nation? Calman-Levy: Paris, 1882.

[2] Астапенка Анатоль. Паслухайце нацыяналіста, Vilnius, 2000.

нолькавую каштоўнасць з крыжам Ефрасінні Полацкай. А, верагодна, трэскі – нават і большую". Яму, відаць, не зразумець, што славуты крыж Ефрасінні Полацкай быў створаны толькі з вялікай ласкі Божай і толькі любасцю да нашага Збаўцы...

Пра ўзнікненне беларускай нацыі.

Агульная тэорыя ўзнікнення нацыяў гаворыць пра тое, што нацыі пачалі ўтварацца недзе ў канцы XVIII ст., і большасць нацыяў утварылася ў XIX ст. Завяршаецца гэты працэс з узнікненнем нацыі-дзяржавы. Для беларускай нацыі ён ішоў з спазненнем, і асноўныя рысы сфармаваліся толькі ў XIX ст. Хоць шэраг этнічна беларускіх рысаў можна лёгка ўбачыць яшчэ ў ВКЛ.

Што станавіла сабой у этнічна-нацыянальным сэнсе ВКЛ? Яшчэ ў XVI ст. існавалі этнічныя групы, што аб'ядноўваліся паводле моўнай, тэрытарыяльнай і канфесійнай адзнакі. Аднак ці толькі пра этнічныя групы мы можам гаварыць? Немалую ролю адыгрывалі тады і патрыятычныя пачуцці, што відаць з твораў Ф. Скарыны які пісаў, што кожны чалавек "да таго места ласку мае", дзе ён нарадзіўся. І хоць нельга назваць насельнікаў ВКЛ беларускай ці ліцвінскай нацыяй, але ў гэтым народзе ўжо ўтрымліваліся многія прыкметы будучай нацыі, і такія поліэтнічныя ўтварэнні можна назваць пранацыяй.

Янка Запруднік у сваёй кнізе "Беларусь на гістарычных скрыжаваннях" (Мінск, 1996) піша: "І вясковыя жыхары, і значная большасць месцічаў заставаліся праваслаўнымі. Прычына гэтага супраціву рэфармацыйным плыням ляжала ў спольшчанасці большай часткі магнатаў, так што адданасць веры продкаў была для большасці беларусаў справаю нацыянальнага выжывання"[1].

В. Акудовіч, цытуючы гэтую фразу, адразу вылучае апошнія словы пра "нацынальнае выжыванне" і

---

[1] Запруднік Янка. Беларусь на гістарычных скрыжаваннях. Мінск, 1996.

робіць наскок на амерыканскага даследніка, бо як жа так – “нацыя” яшчэ ж не ўтварылася, таму якое можа быць “выжыванне” няіснага. Забаронены прыём. Бо ясна, што ў гэтай фразе мае на ўвазе Запруднік. Ён кажа пра нацыянальныя прыкметы той пранацыі беларусаў, якой мы ганарымся і цяпер. І тое ж праваслаўе доўгі час было моцнай зброяй выжывання беларусаў, якія ніяк не хацелі “зліваццa” з палякамі ў Рэчы Паспалітай і прымаць каталіцызм. Якраз менавіта вера і была моцным стрыжнем захавання беларускага этнасу спачатку ў ВКЛ, а потым і ў Рэчы Паспалітай. І унія з’явілася з гэтай жа прычыны. Менавіта імкненне да захавання сваёй веры продкаў – найбольш істотны складнік такой супольнасці людзей, што завецца нацыяй.

Не маюць падставы выказванні Акудовіча пра старабеларускую мову. Ён піша: “А вось любоў Скарыны, Буднага, Цяпінскага... да старабеларускай – рускай, славянскай, русінскай, ліцвінскай – як па-рознаму называлі мовы, хаця і пазбаўленая патрыятычных эмоцыяў, не мае (і не можа мець) эсхаталагічнага пафасу...” Ну, пра любасць да мовы свайго народа нічога надта і не скажаш – любіць сваю мову гэта ж натуральна. Але звярну ўвагу на іншае. Памянёныя асветнікі не проста любілі старабеларускую мову – яны былі яе стваральнікамі. Як і ў гісторыі ўсякага народа ёсць людзі, якія ствараюць літаратурную мову, так было і ў нас. І тое, што ў аснове мовы Ф. Скарыны ляжыць тая ж царкоўнаславянская мова, не павінна нас дзівіць – на той час гэта была адзіная мова, якая ўжывалася ў літаратурных творах. І вялікая заслуга нашых вялікіх кнігадрукароў у тым, што ім удалося наблізіць царкоўнаславянскую мову да мовы народа. І якраз менавіта “патрыятычныя эмоцыі” насуперак В. Акудовічу ўласцівыя творам і Скарыны, і Буднага.

Увесь Акудовічаў трактат насычаны, мякка кажучы, недакладнасцямі. Прыкладам ён піша: “Але як толькі мовай Улады робіцца польская, дык ста-

рабеларуская *адразу заняпала* (курсіў мой – *А.А.*), бо яна была каштоўнай не сама праз сябе...” Першае: далёка не адразу беларуская мова была выведзена з ужытку (ці як піша Акудовіч – “заняпала”). Ведама, што толькі ў 1696 годзе быў прыняты знаны каралеўскі ўказ аб забароне “пісару” карыстацца ў справаводстве беларускай мовай. Ад Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 г. – гэта роўна 100 гадоў, а не “адразу заняпала”. Другое: няпраўда, што старабеларуская мова не каштоўная сама праз сябе. Без яе не было б і цяперашняй. Гэта тое самае, як сказаць, што лацінская, ці старажытнагрэцкая мовы не ёсць каштоўнымі самі праз сябе, бо няма іх жывых носьбітаў. Кожная мова, нават мёртвая, ёсць вялікі скарб нашай сусветнай культуры.

Але разам з аўтарам эсэ вернемся да тэмы нацыі. Далей ідзе сцверджанне: “Імя альтэрнатывы рэлігійнаму – Нацыя”. Гэты тэзіс усяляк прасоўваецца ў эсэ. Праўда, растлумачыць, чаму з’явілася “Нацыя”, у Акудовіча ніяк не выходзіць, пра што ён і сам піша: “Феномен нацыі і пасёння застаецца толькі названым, але не вытлумачаным”.

Феномен нацыі добра растлумачаны многімі аўтарамі. І ў кантэксце рэлігійным таксама. Нідзе ён не разглядаецца як альтэрнатыва рэлігіі. Наадварот, з’яўленне нацыяў ёсць мусовы элемент рэлігійнага быцця. Грунтоўна даследаваў гэтую лучнасць у кантэксце хрысціянства Іван Ільін. У артыкуле “Аб нацыянальным хрысціянстве” ён піша: “Нацыянальнае пачуццё не толькі не супярэчыць хрысціянству, але і атрымоўвае ў яго вышэйшы сэнс і абгрунтаванне; таму што яно стварае яднанне людзей у *духу* і *любві* і прымацоўвае сэрцы да вышэйшага на зямлі і дарам *Святога Духа...*” І яшчэ: “рэлігійнае пачуццё і нацыянальнае пачуццё не адрываюцца адно ад другога, але зліваюцца і ўтвараюць нейкае жыццёвае творчае адзінства, з якога і ў улонні якога вырастае нацыянальная культура”. Нават цяжка ўявіць сабе існаванне такой нацыі, дзе не было б Бога. Такіх у

зямным быцці няма.

У Акудовіча асабістае адмоўнае стаўленне да рэлігіі, фактычна, пераўтвараецца ў адзіны довад супраць ролі рэлігіі ў станаўленні нацыі. Ён піша: "Аднак факт застаецца фактам: нашая Нацыя сфармавалася і паўстала не толькі насуперак суседнім дзяржавам, але і без беспасярэднага ўдзелу Рэлігіі. (Ну, а што насуперак Рэлігіі, то гэта натуральна – такім ёсць шлях кожнай Нацыі)". Сказана даволі прасталінейна. Толькі я не ведаю аніводнай нацыі, якая ўтварылася б "насуперак Рэлігіі". Наадварот, на прыкладзе ўсякай нацыі мы бачым яе перыяд найвышэйшага росквіту толькі ў цесным звязку з рэлігіяй. І нездарма прэзідэнт ЗША бярэ прысягу абавязкова на Бібліі. Гэтым цэментуецца тоеснасць служэння нацыі і Богу. Але не! Чакайма. Усё ж была дзяржава – не нацыя, а кангламерат, звяз нацыяў, якая адкінула ідэю Бога і растаптала хрысціянскія каштоўнасці. Гэтай дзяржавай быў СССР, але мы ведаем, з якім грукатам ён разваліўся! І з развалам Саюза пачалося рэлігійнае адраджэнне і падкрэслю – пачаўся апошні этап утварэння нацыяў-дзяржаў. Якраз гэты прыклад яскрава сведчыць пра непарыўную лучнасць рэлігійнай і нацыянальнай парадыгмаў нашага быцця.

В. Акудовіч прэтэндуе на "новы" пагляд у пытанні развіцця беларускага этнасу і беларускай нацыі. Адным махам малюецца, ведама, з ягонага гледзішча, "арыгінальны" падыход да гэтай праблемы. Цытую: "Якраз як да нацыянальнага выспяваньня (і нацыянальнай мовы), то асабіста мне падаецца куды больш істотным не перыяд ВКЛ з яго "залатым" шаснаццатым стагоддзем, а вось гэтая пара "татальнага мораку" XVIII–XIX стст. Больш за тое, я схільны лічыць (хай сабе пакуль толькі ў фармаце версіі), што не ў часы ВКЛ, а менавіта ў гэтую "нічыйную" пару і сфармаваліся беларусы як этнас – маючы на ўвазе ўжо ўласна беларускі этнас". Трэба адзначыць, што сучасная версія незалежнасці Беларусі, што датуецца 1944 г., мае больш логікі, чым гэты навука-

падобны тэкст. У памянёныя Акудовічам часы, г. зн. часы існавання Беларусі ў складзе Расійскай Імперыі (XIX ст.) фармаваўся ўжо не этнас, а нацыя. Усе прыкметы этнасу сягаюць як Залатой пары (XVI ст.) так і ранейшых часоў Полацкага і Тураўскага княстваў. Пра гэта сведчаць як моўныя помнікі, так і іншыя прыкметы этнасу: народныя традыцыі, звычаі, рэлігійныя вераванні і г. д.

Аўтар увесь час працягвае тэзіс, быццам беларуская нацыя аформілася "толькі ў дыскурсе Расійскай Імперыі", і што Расія была "калыскаю нацыяў". Дзіўна выглядае: дык што, мы, можа, павінны яшчэ падзякаваць Расіі за дадзеную ёй "калыску" і мажлівасць нацыянальнага развіцця? Насамрэч было наадварот – брак умоў нацыянальнага развіцця ладны час быў тормазам для фармавання нацыяў у Расійскай "калысцы". Менавіта гэты фактар стаў вырочным, што ў XIX ст., у эпоху фармавання нацыяў у ўсім свеце толькі этнасы народаў, што ўваходзілі ў склад Расійскай Імперыі, затрымаліся ў сваім развіцці. Аднак гэтыя ж аб'ектыўныя і няўхільныя працэсы пераўтварэння этнасаў у нацыі сталі адным з вызначальных фактараў заняпаду Расійскай Імперыі. І хоць яны (гэтыя працэсы) працягваліся яшчэ цэлае XX стагоддзе ў новай імперыі – савецкай, урэшце, у наш час свет папоўніўся цэлым шэрагам паўнавартасных нацыяў, сярод якіх набывае сваю моц і беларуская.

**Валер Булгакаў**

Яшчэ большае здзіўленне і нават абурэнне выклікае кніга галоўнага рэдактара часопіса "ARCHE" Валеры Булгакава "Гісторыя беларускага нацыяналізму".

"А был ли мальчик?" – узнікае заканамернае горкаўскае пытанне пасля азнаямлення з кнігай Валера Булгакава "История белорусского национализма". Такое ўражанне, што куды ні глянь, у якія часы ні зазірні, а беларускага нацыяналізму і беларускага нацыянальнага руху, згодна з Булгакавым альбо няма зусім, альбо ён непаўнавартасны, нейкі "мужыцкі"

ці "прарасійска-прапольскі". Вось у ўкраінцаў нацыянальная ідэя ёсць, у палякаў дык наагул паводле найвышэйшых разрадаў, а ў беларусаў нічога вартага, каб прапанаваць Вечнасці, і не назіраецца.

Але пачну спачатку. Памянёная кніга выклікала ў мяне, з аднаго боку, вялікую цікавасць, бо гэта і мая тэматыка, а з другога боку, выклікала вялікае здзіўленне. Дакладней, *тры здзіўленні*. Першыя два кідаюцца ў вочы адразу: кніга пра беларускі нацыяналізм напісаная на расійскай мове[1] і другое – кошт кнігі, які надзвычай малы для такога аб'ёму і якасці выдання. Трэцяе здзіўленне прыходзіць ужо пасля чытання кнігі. Рэч у тым, што *змест кнігі не адпавядае яе назве*. Пра гісторыю беларускага нацыяналізму, як гэта было заяўлена ў назве, у самой кнізе *амаль нічога не гаворыцца*.

Аўтар адразу імкнецца ўразіць чытача арыгінальнасцю сваіх думак і, гаворачы тэрміналогіяй, якую вельмі любіць аўтар, прапануе сваю *наратыву* беларускага нацыяналізму. Слова "наратыва" чытач будзе бачыць амаль на кожнай старонцы. Згодна з булгакаўскай наратывай, яшчэ з першых старонак мы можам даведацца, што першым беларускім нацыяналістам быў... манархіст, імперскі гістарыёграф і праваслаўны рэакцыянер Міхаіл Каяловіч, "*чый унёсак у "беларускую нацыянальную ідэю" быў такім жа, калі не большым чым Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча*". Вось што напісана пра М. Каяловіча ў "Энциклопедии имперской традиции русской мысли" М. Смоліна: "*Прафесар М. О. Каяловіч першым у навуковай рускай літарараатуры даследаваў гісторыю рускай самасвядомасці... не быў зараджаны тады ўжо набіраўшым сілу мястэчкавым сепаратызмам, цвёрда стоячы за праваслаўе, рускае адзінства*".

Кніга М. Каяловіча "История русского самосознания" – гэта настольная кніга ўсякага расійскага нацы-

---

[1] Ужо пасля напісання гэтага тэксту выявілася, што існуе і беларускамоўны варыянт кнігі Булгакава. Але гэты факт не здымае, а ставіць новыя пытанні.

яналіста, але ніяк не беларускага. Можа, аўтар "Гісторыі беларускага нацыяналізму" хацеў нагадаць, што Каяловіч быў з паходжання беларус, і некаторыя ягоныя творы датычаць Беларусі – "Літоўская царкоўная унія", "Чытанні па гісторыі Заходняй Расіі". Але ўсе гэтыя творы закліканыя да фармавання ідэалогіі Вялікай Расіі, дзе Беларусі адводзіцца роля правінцыі – "Паўночна-Заходняга краю".

Кніга В. Булгакава складаецца з "Предисловия", "Введения" (с. 14–48), трох раздзелаў асноўнага зместу, "Заключения" (с. 270–311) і "Послесловия" (с. 311–331). Цікавы падзел, праўда? А калі ўлічыць, што першы раздзел датычыць агульных разважанняў пра канцэпцыю нацыяў і нацыяналізмаў, а трэці раздзел "Ф. Богушевич и миф белорусского возрождения" прысвечаны разгляду творчасці аднаго з пачынальнікаў беларускай літаратуры XIX ст. Францішка Багушэвіча (як сам аўтар прызнаецца, гэты раздзел узяты з яго кандыдацкай дысертацыі з філалогіі), то на ўсю гісторыю беларускага нацыяналізму застаецца, фактычна, толькі другі раздзел "Первые националисты" (с. 109–190). У гэтыя восемдзесят старонак, ведама, можна ўкласці нейкія тэзісы, але чытач і ў гэтых радках мала што возьме з заяўленай тэмы – гісторыі беларускага нацыяналізму.

Нездарма на вокладцы кнігі аўтар змясціў не надта прыемныя, на першы пагляд, словы з лекцыяў Ю. Барысевіча пра сябе: "*Сяргей Дубавец і рэдактар «ARCHE» Валерка Булгакаў... спрабуюць стварыць новы канон нацыянальнай літаратуры – з гэтай прычыны выкрэсліваюць з гісторыі пісьменнікаў ледзь не цэлымі пакаленнямі...*"

Я дадам – В. Булгакаў выкрасліў з гісторыі не толькі пісьменнікаў, але і навукоўцаў, гісторыкаў, рэлігійных дзеячоў, палітыкаў – мноства выдатных постацяў беларускай гісторыі, культуры і думкі. Ягоную гісторыю сапраўды можна змясціць на васьмідзесяці старонках. І таму зразумелай становіцца вялікая колькасць дадатковых раздзелаў – у выніку кніга атрымалася на ўсе 330 старонак!

Але заглянем у гэтую звышкароткую гісторыю Булгакава.

Ягоная дамадэрная гісторыя Беларусі пачынаецца не з часоў Полацкага і Тураўскага княстваў. І не з Вялікага княства Літоўскага. А з расійскага перыяду нашай гісторыі, які сягае ўжо пачатку XIX ст. Так што пра часы Залатой пары беларускай культуры і пра сапраўдных першых нацыяналістаў: першадрукара беларускага слова Францішка Скарыну, лацінскамоўнага патрыёта Беларусі Міколу Гусоўскага, праваслаўнага дзеяча, кананізаванага Царквой Афанасія Філіповіча і уніяцкага мітрапаліта Язафата Кунцэвіча і многіх іншых – у кнізе пра беларускі нацыяналізм мы не пачуем нічога.

Затое мы даведаемся, што на пачатак XIX ст. нашая беларуская зямля і нашая беларуская мова былі ў вельмі гаротным стане. Як вынікае з шматлікіх цытат кнігі, нашу мову ганьбілі ўсе, хто не ленаваўся. І палякі, і рускія: "...варварская мова... сумесь больш ці менш шчыльная польскіх выразаў і слоў з рускімі" (с.109., цыт. паводле Языкава Дз.). На с. 122 аўтар піша: "...для яго (Адама Міцкевіча) беларуская мова была гаворкай польскай". Для Булгакава А. Рыпінскі цікавы не тым, што быў адным з першых рупліўцаў беларускамоўнага пісьменства, а сваім стаўленнем да беларусаў: "Беларусы Рыпінскага – убогія мужыкі, што любяць Польшчу". А Яну Чачоту беларусы "ўяўляліся напалову дзікім, выпалым з культурнага прагрэсу племем" (с. 121).

У замкненні да кнігі аўтар працягвае ганьбаваць беларускі народ (свой родны народ!) з новым уздымам, выкарыстоўваючы ўжо іншых дзеячоў нашай гісторыі. Так, Яну Станкевічу аўтар прыпісвае думкі аб нястачы ў беларускага этнасу жыццёвай энергіі і браку гаспадарчых рэсурсаў, якіх ледзь стае для простага ўзнаўлення насельніцтва, а не тое што для якой культурніцкай дзейнасці. Ці згадваецца польскі даследнік Радзік, які пра мову гаворыць як пра "пазбаўленую прыгажосці ці то мову, ці пераходны дыялект

паміж польскай і рускай мовамі", а таксама падкрэслівае "разумовае ўбоства беларусаў". І як апафеоз цытуецца выказванне Эмы Еліньскі "Абстрактныя паняцці наагул не маюць доступу да іх розуму" (с. 289).

Складваецца такое ўражанне, што аўтар "Гісторыі..." атрымлівае нейкую мазахісцкую асалоду, цытуючы на кожным кроку тэксты аб занядбаным беларускім народзе і іх бяздарнай мове. Чаму аўтар "Гісторыі..." не цытуе цудоўныя выказванні пра нашу мову шэрагу ведамых людзей таго ж часу? "*Цудоўнае гэта адгалінаванне славянскай мовы – крывіцкі дыялект!*" – гаварыў У. Сыракомля. Ці вось: "*Знаёмства з Беларуссю падобна адкрыццю Новага Свету*" (І. С. Аксакаў). Вось гэта і ёсць штрыхі да беларускай нацыянальнай ідэі. А вось і больш праграмны тэкст з кнігі Доўнара-Запольскага "Асновы дзяржаўнасці Беларусі", выдадзенай у 1919 годзе, дзе ўжо выразна фармулюецца крэда беларускага нацыяналізму:

"*Беларусы – гэта, бадай, адзіны народ (мо толькі апрача палякаў), які з прадвечных часоў жыве ў сваёй старонцы, ніскуль сюды не прыходзіў, дык і не набраўся чужыцкіх элементаў... беларусы становяць найбольш чыстае славянскае племя, захаваўшае і зверхні выгляд славянскі і шмат адзнак яго псіхікі і быту*".

Вось яна – кароткая гісторыя беларускага нацыяналізму! Гаворачы пра нацыяналізм сваёй нацыі, усякі, які паважае сябе, нацыяналіст будзе гаварыць пра сваю нацыю *толькі ў станоўчым* вымярэнні, будзе вылучаць найвыдатнейшыя рысы сваёй нацыі і намкнецца забыць ці хоць неяк абмежаваць, адмоўныя выказванні аб сваім народзе. У Булгакава мы бачым якраз адваротнае. Зразумела, навуковы тэкст павінен імкнуцца да максімальнай аб'ектыўнасці, але ў нашым разе назіраецца нейкая гіпербалізацыя, выпукленне негатыву.

Нават прыраўноўваючы гістарычныя шляхі родных нацыяў – беларусаў і ўкраінцаў, Валер Булгакаў значна перабольшвае спазненне фармавання беларус-

кай нацыі што да ўкраінскай і дае лічбу адставання: "прыкладна 60–80 гг.". Будзіцелем украінскага народа прынята лічыць Івана Катлярэўскага (1769–1838), які напісаў выдатную паэму "Энеіда" на ўкраінскай мове ў 1798 г. Аналагічны твор, беларуская "Энеіда навыварат" была напісаная, згодна з Доўнарам-Запольскім, у 1790-х гг. і "*ёсць падставы думаць, што беларуская Энеіда з'явілася або самастойна, або нават раней за ўкраінскую*".[1] Аднак цэнтральнай фігурай новай украінскай літаратуры ёсць, безумоўна, "Геній і Прарок" Тараса Шаўчэнкі (1814–1861), чый знакаміты "Кабзар" выйшаў у 1840 годзе. Але што мы маем у нас, у беларусаў, на гэты час?

Дык у гэтыя ж 40-я гг. XIX ст. Дунін-Марцінкевіч піша спачатку беларускае лібрэта "Ідылія" (выйшла з друку ў 1846 г.), многія вершы, а з 1855 па 1858 г. (за тры гады) выходзяць аж чатыры друкаваныя зборнікі "Гапон", "Вечарніцы і Апантаны", "Цікавішся? – Прачытай!" і "Беларускі Дудар".

Незразумелым і нелагічным ёсць адмежаванне Булгакава ад падставовай фігуры новай беларускай літаратуры XIX ст. В. Дуніна-Марцінкевіча. Таму, відаць, і паўстае гэтае "адставанне", якога насамрэч няма! Можа, колькасна ўкраінская літаратура перасягае беларускую, але ж гэта і зразумела, бо сама Украіна перасягае Беларусь тэрытарыяльна і насельніцтвам. Аднак працэсы нацыянальнага адраджэння і фармавання нацыі ў нас цалком аналагічныя. Іншая рэч – цяперашні занядбаны стан нашай мовы і культуры наагул, але гэта ўжо, як той казаў, другая гісторыя.

Ды годзе пра сумнае. Што ж мы маем у пазітыве кнігі "Гісторыя беларускага нацыяналізму"? Трэба адзначыць найперш грунтоўнае даследаванне творчасці Багушэвіча, што само праз сябе мае самастойную каштоўнасць і можа быць выкарыстана гісторыкамі беларускай літаратуры. Апрача таго, аўтар дае надзею чытачу на перспектывы беларускага нацыя-

[1] М. В. Доўнар-Запольскі. Гісторыя Беларусі. Мінск, 1998.

налізму. Ён слушна сцвярджае, што нават поўнае знішчэнне беларускай мовы не значыць краху беларускага нацыяналізму. Трэба пагадзіцца з сцверджаннем, што нацыянальная ідэнтыфікацыя пасля 1995 г. змясцілася з прац тэарэтыкаў у сферу практычнай дзейнасці. Не адмаўляе аўтар "Гісторыі..." і перспектыў адраджэння беларускай мовы. Ён падкрэслівае, што пры дэмакратычным кіраванні ў Беларусі ў культурных расістаў і моўных прыгнятальнікаў будзе мала шанцаў захаваць за беларускай мовай цяперашні яе сацыяльны і функцыянальны статус.

Усё ж эксперыменты эксперыментамі, а да такой вялікай і шляхетнай працы, як беларуская нацыянальная ідэя, мінулае і будучыня беларускай нацыі, трэба ставіцца паважна і адказна. Нельга адрываць прымардыяльнага складніка беларускага нацыяналізму ад мадэрнага канструявання нацыі, што яшчэ не завяршылася і ў наш час. Відавочна адно – законы развіцця грамадскай супольнасці аб'ектыўныя, і шлях кожнага народа ідзе праз стварэнне нацыі. Не абміне гэты працэс і нас. Але і мы не мусім стаяць у баку ад працэсу гэтай творчасці, і мы павінны быць удзельнікамі гэтага касмічнага працэсу нацыятварэння. Інакш заміж гісторыі беларускага нацыяналізму, калі выкарыстаць адну з "каштоўных" знаходак Валера Булгакава што да беларускай мовы, можа выйсці нейкі "сікавы бурбулік"...

**Пётра Рудкоўскі**

Трэці разгляданы аўтар – манах-філосаф Пётра Рудкоўскі, кніга – "Паўстанне Беларусі". Значная частка кнігі ("Частка першая. Сінявокая Беларусь з чыровона-зялёным тварам") аддадзеная зусім непатрэбнаму занятку – аналізу кніг-падручнікаў, прысвечаных ідэалогіі беларускай дзяржавы (У. А. Мельнік "Государственная идеология Республики Беларусь: Концептуальные основы". Мінск, 2004; Я. Яскевіч. «Основы идеологии белорусского государства: Мировоззренческие ценности и стратегические приорите-

ты». Мінск, 2003; Н. Канашэвіч «Политика. Идеология. Менталитет: Курс лекций». Магілёў. 2003). Усе гэтыя творы напісаныя на заказ, прысвечаныя абгрунтаванню слушнасці сучаснага палітычнага курсу ўрада Беларусі і маюць мала супольнага і з філасофскай беларускай думкай, і з беларускай паліталогіяй. Таму мне шкада часу патрачанага на "ідэалогію" маладым і перспектыўным манахам-філосафам.

Большую цікавасць мае другі раздзел кнігі "Відарысы новай Беларусі". Адразу відаць, што аўтар "Паўстання" ў свой час быў пад вялікім уплывам Зянона Пазняка. Ён, праўда, адважваецца крытыкаваць "патрыярха", але неяк няўпэўнена, па-дзіцячаму. А часам крытыка і неабгрунтаваная.

Так Пётра Рудкоўскі спрабуе дыскутаваць наконт тэзы "ВКЛ – Беларуская дзяржава". Гэтая тэза, як я не раз тут пісаў, зусім і не пазнякоўская. Так лічыў, найперш, Мікола Ермаловіч, так лічаць і многія іншыя гісторыкі. Рудкоўскі ж піша: "*Калі ВКЛ было жмудска-ліцвінска-рускай дзяржавай, то на якой падстве яго называць «Беларускай дзяржавай?»*". Сапраўды, калі пагадзіцца з першай часткай гэтага выказвання, то Рудкоўскі мае рацыю. Але навошта манах-філосаф паўтарае зацяганы міф аб поліэтнічнасці ВКЛ? Трэба заўсёды выходзіць з фактаў, а не меркаванняў. А факты такія: няма ніякіх пісьмовых сведчанняў пра бытнасць «жмудскага» элемента ў грамадска-палітычным жыцці ВКЛ, літоўская мова не была дзяржаўнай мовай Княства. Фактычна, няма і літаратурных помнікаў, напісаных гэтай мовай. З таго часу нам засталася ў спадчыну толькі беларуская мова, якая тады звалася "русінскай", альбо «ліцвінскай». Ведама, ёсць людзі (найперш цяперашнія літоўцы), якім не выгадная такая праўда, якія бароняць тэзу аб тоеснасці тагачаснага тэрміну (XV–XVI стст.) "ліцвін" і сучаснага слова "літовец". А тады, прыняўшы такія фантазіі за веру ды яшчэ ўбіўшы з дзяцінства ў галаў гэта кожнаму літоўскаму дзіцяці, лёгка прыйсці да ідэі магутнай Літоўскай імперыі,

прычым і ў часе (ад XII–XIII ст. і дасюль) і ў прасторы (ад Балтыйскага і да Чорнага мора).

Але ж мы – беларусы і хіба варта нам паўтараць такую лухту? Аспрэчваць тэзу аб тым, што ВКЛ не беларуская дзяржава, а нейкая там жмудзінска-літоўска-руская ці яшчэ нейкая, гэта значыць здраджваць сваёй Бацькаўшчыне, здрадзіць свайму народу, яго славутаму мінуламу і перспектыўнай будучыні.

І няма тут ніякага "парадоксу Зянона", і нельга разводзіць зусім пустыя – а можа, нават, і абразлівыя разважанні пра нейкую выдуманую пазнякоўскую "Беларускую імперыю", пра якую Пазняк ніколі не казаў. Ці стварыць, прыкладам, праблему існавання "пераходнасці" паміж "ліцвінам" і "беларусам". Што гэта яшчэ за неандэрталец такі пераходны? Насамрэч *гэтыя два тэрміны існуюць для абазначэння аднаго этнасу*, але імі карысталіся ў розныя часы. А спасылка П. Рудкоўскага на В. Булгакава, які, маўляў, паказаў нешта на прыкладзе Ф. Багушэвіча, наагул не вартая абмеркавання, *бо Булгакаў не паказаў нічога!* Ён толькі выконваў нечы загад на дыскрэдытацыю беларускай думкі. Але пра ягоную творчасць гаварылася вышэй.

*Насамрэч ліцвін ёсць ліцвін*. Гэта жыхар ВКЛ, які гаворыць на беларускай мове, карыстаецца дакументамі, напісанымі на беларускай мове, спявае беларускія песні і жыве згодна з традыцыямі і звычаямі продкаў – г. зн. робіць усё тое, што і цяперашні беларус. А пра жмудзінаў я не магу нічога такога сказаць, не ведаю... Нічога не нясе "выснова" Пётры Рудкоўскага пра тое, быццам "ліцвін" – гэта "протабеларус", "проталітовец", "протаўкраінец". Можа, яшчэ і "пратарускі"? Бо "ліцвін" і "русін" існавалі тады недзе паралельна, і апошні тэрмін таксама значыў жыхара ВКЛ. Лухта ўсё гэта. Ідучы шляхам такой логікі можна сказаць яшчэ прасцей – чалавек, ці нават Адам – вось сапраўдны "протабеларус".

Яшчэ адзін момант хацелася б патлумачыць. Рудкоўскі піша: "*канцылярская мова нідзе, бадай, у*

*гістарычных дакументах не называецца беларускай*". А якой называецца? "Старабеларускай"? Ліцвінскай"? Таму, хто быў зацікаўлены прынізіць ролю нашай мовы ў напісанні дакументаў ВКЛ, і трэба было называць мову дакументаў інакш, у розных варыянтах, але толькі не беларускай. *І калі мы не сустракаем тэкстаў, дзе адзначана іх беларускасць, **то нашае заданне зрабіць гэта***, а не плакацца "вось той назваў гэтак, а гэты назваў інакш"...

А з крытыкай П. Рудкоўскага пазнякоўскага бачання такой з'явы як Расійскае праваслаўе я мушу пагадзіцца. Калі паслухаць Зянона, дык выходзіць, што праваслаўныя – гэта наагул не хрысціяне, а нейкія расійскія агенты. "*Супрацьпастаўленне хрысціянства хрысціянству – гэта не хрысціянскі занятак*" – піша Пётра Рудкоўскі, і гэта вельмі слушна.

Ёсць у кнізе шэраг цікавых разважанняў пра Беларусь. Але разам з тым, чытаючы Рудкоўскага, мяне ўвесь час не пакідала адчуванне нейкай "дзіцячасці", наіўнасці ў думках аўтара. Прыкладам, ён любіць цытаваць няведамых, маладых аўтараў, што ў прынцыпе не забараняецца, але ж, на жаль, цытаваныя аўтары мала чаго істотнага выказваюць у разглядаpopulated праблемах, бо не маюць на тое ні адукацыі, ні ведаў. Вось, прыкладам, на с. 96 ідзе абмеркаванне ліберальнага нацыяналізму. Аднак існасць канфлікту паміж нацыянальнай і ліберальнай ідэалогіямі ў кнізе Пётры Рудкоўскага чамусьці выкладаюць не спецыялісты-навукоўцы, а сацыёлаг А. Манаеў і журналіст Ю. Дракахруст – і не ў сур'ёзных выданнях, а ў самвыдатаўскай газеце "Согласие" за 1990 г. Самае цікавае, што з цытаты гэтых аўтараў ніяк не вынікаюць тыя глабальныя высновы, да якіх прыходзіць Рудкоўскі, прыкладам, яны, самі таго не ведаючы, развівалі думкі Ісаі Берліна.

Пётра Рудкоўскі, выходзячы з сваіх назіранняў, прыйшоў да разумення таго, "*наконт чаго ўдалося паразумецца беларускім мысьлярам і інтэлектуалам*". Гэта, выяўляецца, – "памежны характар бела-

рускай тоеснасці". Ну, я, прыкладам, заўсёды падкрэсліваў сваю нязгоду з гэтым тэзісам, і мая пазіцыя ў гэтай кнізе выкладаецца не раз. Можа, я і іншыя іншадумцы яшчэ не дараслі да таго, каб называцца "беларускім мысляром і інтэлектуалам"? Затое ў Рудкоўскага мы сустракаемся з "глыбакадумнымі" выказваннямі нейкай "мысляркі" Вольгі Шпарага: "Сітуацыя памежжа... набліжае нас да ілюзіі схавання на сваім баку". Дзякуй Богу, існуе не толькі ілюзорны свет беларускіх мысляроў накшталт В. Шпарагі, але і свет беларускай навукі, культуры, філасофіі, які ёсць рэальным фактам, як і рэальны беларускі народ і беларуская нацыянальная ідэя.

Дакончваючы гаворку пра сучасных філосафаў "інтэлектуальнай прасторы", мушу, аднак, станоўча вылучыць П. Рудкоўскага і пагадзіцца з многімі ягонымі ідэямі. Гэта датычыць, прыкладам, панятку "сабораасці", аб якой пойдзе гаворка ў Раздзеле VI.

### *Частка 2. Філосафы класічнага фармату*

**Уладзімір Конан**

Уладзімір Міхайлавіч Конан – філосаф, які ўсе свае навуковыя ступені (кандыдата, доктара філасофскіх навук) здабыў яшчэ ў савецкія часы, але ў поўнай меры яго талент і здольнасці раскрыліся ўжо пасля заняпаду камуністычнага рэжыму і абвяшчэння незалежнасці Беларусі. Ён напісаў шэраг кніг, прысвечаных праблемам эстэтыкі: "Развіццё эстэтычнай думкі Беларусі (1917–1934)" (Мінск, 1968), "Демократическая эстетика Белоруссии (1905–1917)" (Мінск, 1971), творчасці знакамітых беларускіх дзеячоў "Адам Бабарэка" (Мінск, 1976), "Боская і людская мудрасць (Францішак Скарына: жыццё, творчасць, светапогляд)" (Мінск, 1990), артыкулы да праблемаў нацыянальнага адраджэння і нацыянальнай культуры.

У. Конан стаяў ля вытокаў Беларускага Народнага Фронту, браў удзел у яго Установчым з'ездзе ў 1988 г. Быў абраны ў склад Сойма БНФ. На гэтым з'здзе з ягоных вуснаў прагучаў першы ў найноў-

шай гісторыі Беларусі навуковы, але ўжо не марксісцка-ленінскі даклад, прысвечаны беларускаму адраджэнню. Менавіта ў гэтым выступе акрэсліліся і першыя контуры беларускай нацыянальнай ідэі.

Я дагэтуль успамінаю той віленскі даклад і таму, што, як удзельнік з'езда, чуў яго беспасярэдне і таму, што выказаныя там Конанам думкі былі незвычайнымі і моцна мяне ўразілі.

З пачатку 90-х гг. XX ст., пасля адкрыцця Навукова-асветніцкіга цэнтра імя Францішка Скарыны, У. Конан становіцца загаднікам аддзела і да самага яго закрыцця аддана працуе на карысць беларускай культуры і навукі разам з Адамам Мальдзісам, дырэктарам цэнтра. Іх тандэм складаў аснову таго выдатнага асяродку, дзе вывучаліся многія аспекты беларускасці ў 90-я гг. XX ст. і першыя гады XXI ст.

Сфармуляваная Уладзімірам Конанам парадыгма нацыянальнай ідэі цяпер стала класічнай і цытуецца многімі аўтарамі нават без спасылак на яе творцу. А гэта ўжо прыкмета агульнага прызнання.

Гучыць знакамітая фармулёўка гэтак:

"*Нацыянальная ідэя – духоўна-творчы аналаг гістарычнага быцця народа ў трох вымярэннях – мінуўшчыне, сучаснасці і будучыні. Кожны этнас, які выявіў свае творчыя магчымасці і сфарамаваўся ў нацыю, увасабляе сабой пэўную ідэю альбо, кажучы моваю тэалогіі, пэўную задуму Творцы, рэалізаваную ў гістарычных дзеях і самабытнай культуры*"[1].

Нягледзячы на прастату і разам з тым універсалізм гэтай фармулёўкі, У. Конан лічыць, што фундаментальнага даследавання нацыянальнай ідэі ні ў адной з існых канцэпцыяў яшчэ не адбылося. Дзеля гэтага трэба прааналізаваць увесь комплекс праблемаў пэўнага народа, вывучыць і сінтэзаваць усе творчыя праявы народа.

---

[1] Конан У. М. Беларуская нацыянальная ідэя: традыцыі, сучасныя праблемы, прагнозы // Беларуская нацыянальная ідэя. Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі. 18–19 красавіка 1999 г. Гродна. Мінск, 2006. С. 6–10.

Аналізуючы гістарычны аспект беларускай ідэі, У. Конан паслядоўна вылучае нашых выдатных дзяржаўных дзеячоў і асветнікаў, такіх як князь Усяслаў Чарадзей, Францішак Скарына, Леў Сапега і г. д. Асобным радком ідзе станаўленне нацыянальнай ідэалогіі ў XIX ст., і гэты працэс філосаф звязвае з постаццю этнічнага беларуса Адама Міцкевіча. Наступная фігура – Францішак Багушэвіч, які сфармуляваў ідэю самабытнасці беларускага народа як дзяржаўнай нацыі, самаідэнтыфікацыя якой выявілася ў роднай мове, нічым не меншай і не горшай за іншыя еўрапейскія мовы.

У. Конан звяртае ўвагу на постаць Ігната Абдзіраловіча (Канчэўскага), які ўпершыню сфармуляваваў беларускую нацыянальную ідэю як філасофскую парадыгму ў эсэ «Адвечным шляхам».

«*Беларусь ад X веку і да гэтай пары фактычна з'яўляецца полем змагання двох накірункаў еўрапейскай, пеўне арыйскай культуры – заходняга і ўсходняга. Граніца абодвух уплываў, падзяляючы славянства на два станы, праходзіць праз Беларусь*».

Вось жа, выходзячы з умоў памежнага становішча Беларусі Абдзіраловіч і фармулюе нацыянальную беларускую ідэю.

Наступная фігура, якую вылучае Конан – сучаснік І. Канчэўскага Суліма (Уладзімір Самойла). У сваім эсэ "Гэтым пераможаш!" ён прапанаваў развязваць праблему нацыянальнай ідэі праз "хрысціянскі актывізм". Зместам нацыянальнай ідэі паняволеных народаў ёсць свабода, творчая энергія і воля да жыцця.

Апошняй фігурай у гэтым ланцужку творцаў беларускай нацыянальнай ідэі ў Конана ідзе лідэр каталіцкага адраджэння Адам Станкевіч. Пэўна, на момант напісання артыкула (1999) У. Конану былі яшчэ няведамыя творы В. Гадлеўскага. Пазней ён напіша цэлую кнігу, прысвечаную гэтаму унікальнаму мысляру.

Уладзімір Конан паслядоўна праводзіць ідэю, што беларуская нацыя не "*нейкі хімерны этнас-мяшан-*

*ка на ўзор Галілеі*" часоў Хрыста, а гістарычна сфармаваная нацыя з сваёй багатай спадчынай і будучыняй. Дадзеная Конанам парадыгма любой нацыі, якая патрабуе разгляду яе ў трох вымярэннях: мінуўшчыне, сучаснасці і будучыні, па-новаму адкрывае нам Беларусь. У. Конан падкрэслівае, што дзяржаўная гісторыя Беларусі мае сваю спецыфіку, але тыпалагічна яна "паўтарыла (з спазненнем на некалькі стагоддзяў) гістарычныя этапы заходнееўрапейскага рэгіёну". Спачатку Беларусь, як і еўрапейскія краіны, успрыняла ў свой час антычную культуру, але шляхам прыняцця хрысціянства ад Візантыі, дзе сфармавалася "еўра-азіяцкая «рэпрыза» грэка-рымскай культуры". Пазней Вялікае княства Літоўскае аб'яднала вялікую колькасць суседніх плямёнаў і "далучылася да цэнтральна-еўрапейскага макрарэгіёну хрысціянскай цывілізацыі".

Абсалютна слушнае сцверджанне філосафа аб тым, што ВКЛ было не спецыфічна нацыянальным, а міжэтнічным дзяржаўным утварэннем. Наагул этнічныя дачыненні ў Сярэдневеччы гралі другасную ролю ў прыраўнанні з рэлігійнымі стасункамі і міждзяржаўнымі. Нават канфедэратыўная Рэч Паспалітая не была польскай нацыянальнай дзяржавай. "*Яе гістарычная місія заключалася ў тым, каб выгадаваць у міжэтнічнай творчасці беларускую, літоўскую, польскую, украінскую нацыі*".

Што да сучаснасці і будучыні Беларусі, то яны застаюцца шматвектарнымі, "пакуль падзеі праграмуюцца, а дзеячы робяць свой выбар". Ідэальны варыянт будучыні для Беларусі У. Конан бачыць у нейтральнай дзяржаве на памежжы Усходняй і Заходняй Еўропы. І з гэтай думкай цяжка не згадзіцца.

**Мікола Крукоўскі**

Мікалай Ігнатавіч Крукоўскі аўтар некалькіх манаграфіяў, прысвечаных праблемам эстэтыкі, культуралогіі, станаўленню нацыянальнай сведамасці беларусаў: "Логика красоты" (Мінск, 1965), "Кибер-

нетика и законы красоты" (Мінск, 1974), "Бляск і трагедыя ідэалу" (Мінск, 2004), іншыя.

У сваёй апошняй грунтоўнай кнізе "Бляск і трагедыя ідэалу" М. Крукоўскі задае вузлавое пытанне: *ці існуе беларуская філасофія, а не філасофія ў Беларусі*, як лічылі дыпламаваныя савецкія філосафы Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў савецкія часы. Факт існавання беларускай філасофіі ён прыраўноўвае да факта існавання беларускай нацыянальнай сведамасці. І калі прыняць факт існавання нацыянальнай сведамасці – а інакш і нельга, бо без сведамасці няма і нацыі, – то мы мусім прызнаць наяўнасць беларускай філасофіі. "Нацыянальная філасофія заўсёды існавала і існуе, хоць бы ў зародкавым пакуль што выглядзе. І тады ўзнікае задача яе прафесійнага развіцця і дасканалення..." – слушна сцвярджае Крукоўскі.

Вельмі простыя і лагічныя схемы Крукоўскага працінаюць увесь твор філосафа.

"Бляск і трагедыя ідэалу" – гэта выніковая, фундаментальная праца прафесара Крукоўскага, якая падсумоўвае ягоныя пагляды на ідэалы сучаснага беларускага грамадства. Праз прызму ідэалаў фармулюецца аўтарам і беларуская нацыянальная ідэя. Ён піша: "...менавіта ў нацыянальнай ідэі, як у своеасаблівым аптычным фокусе або цэнтры мас, аб'ядноўваюцца і *абстрактна-духовыя ідэалы*, і *пачуццёва-акустычная матэрыяльнасць мовы* як выразніка народнай душы, што ў цэлым уплывае і на мастацкую, і на матэрыяльную культуру народа, з'ядноўваючы ўсё гэта ў адзіную сістэму нацыянальнай культуры ўвогуле".

Філосаф Крукоўскі прапануе разумець нацыянальную ідэю як *адзінства ідэальнага і рэальнага*. І ў гэтым праяўляецца дыялектычнае разуменне праўды як адзінства процілегласцяў. Нацыянальная беларуская ідэя разумеецца ім як увасабленне духу і сведамасці народа, здзейсненае ў беларускай незалежнай дзяржаве (рэальная частка цэлага) і "мараль-

най ідэі, выражанае на роднай мове і адухоўленае хрысціянскай царквой" (ідэальны складнік). "Падобна таму, як сукупнасць біялагічных індывідаў утварае сабой від **Homo sapiens**, так і больш канкрэтная сукупнасць асобаў утварае грамадскую супольнасць нацыяў, аб'яднаную нацыянальнай сведамасцю, гэтай саборнай душы народа, тым што і было тут названа вышэй беларускай ідэяй", – піша філосаф. Мне б хацелася вылучыць думку аб ***беларускай нацыянальнай ідэі*** як ***саборнай душы народу***. Менавіта ***саборнасць*** вылучана і мною (гл. Раздзел VI) як найважнейшы прынцып пры канструяванні беларускай нацыі і фармаванні беларускага нацыяналізму.

Прынцып саборнасці разглядаецца М. Крукоўскім у звязку з больш агульным сістэмным падыходам, які займае важнае месца ў ягонай філасофіі. Ніжэй будзе разгледжана мадэль эвалюцыі чалавечага грамадства праз прызму нацыі і завяршэння гэтага працэсу ў пабудове нацыянальнай дзяржавы. Блізкі падыход прапануе і М. Крукоўскі. Толькі ў яго іерархіі каштоўнасных катэгорыяў першасным выступае ***ідэал***. На падставе сістэмнага падыходу будуецца іерархічная сістэма ідэалаў. Ідучы зверху ўніз, згодна з канцэпцыяй філосафа, вяршыняй такой іерархічнай сістэмы ідэалаў ёсць ***ідэя Бога*** як абсалютнага каштоўнасна-духовага арыенціра. "Ідэя Бога мае універсальны характар, і ў ёй, як у вяршыні піраміды, канцэнтруюцца як законы прыроды, так і ўсе ідэалы і духоўныя каштоўнасці чалавецтва..." Наступнай ідэяй (згодна з нашай канцэпцыяй я б сказаў – роўнем – *А. А.*), у Крукоўскага выступае космас і прырода як жывое, канкрэтнае ўвасабленне Бога. Стаючы на пантэістычных пазіцыях, ён разглядае прыроду як жывое, матэрыяльнае цела Бога.

***Ідэя людства і чалавека*** выступае ў Крукоўскага наступным роўнем у іерархіі ідэалаў. Але чалавек разглядаецца не толькі як матэрыяльна-біялагічны індывід, але і як "духоўная, надзеленая Боскім розумам істота – асабістасць".

Далей сістэма ідэалаў разгортваецца наступным парадкам: першую пазіцыю займае ***нацыянальная беларуская ідэя*** (аўтар выкарыстоўвае такі парадак слоў):

*Менавіта нацыянальная ідэя, калі развіць далей тую думку вялікага Гегеля, узвёўшы яе аж да апостала Паўла, якраз і матэрыялізуе ў сабе самастойнасць і незалежнасць беларускага грамадства, утвараючы сабой шматпавярховую піраміду, у аснове якой ляжыць нацыянальная культура, улучаючы і культуру матэрыяльную.*

Ніжэйшым роўнем ідэалаў ёсць "***класавая салідарнасць.*** Як чалавек, выгадаваны ў сістэме марксісцка-ленінскай філасофіі, прынамсі, выкладнік гэтага курсу ў савецкія часы, Мікалай Ігнатавіч, зразумела, не абыходзіцца без панятку класаў у гэтай іерархіі. У нашай іерархічнай сістэме стратыфікацыі **(раздзел VI)** праводзіцца адпаведны аналіз без спасылак на класы і класавую салідарнасць. Тым не менш, мажлівы і такі будаўнічы матэрыял грамадства, хоць ён ужо і архаічны.

А ўрэшце даецца месца ідэалу пад назвай ***прафесійная годнасць***, потым ідзе ***сямейны дабрабыт*** і замыкае іерархію ***асабіста-маральная годнасць індывідуальнай асобы.***

Сама істотнае ў разгледжанай іерархіі тое, што ў аснове ўсіх грамадскіх ідэалаў у Крукоўскага ляжыць нацыянальная беларуская ідэя. Менавіта ад яе выпраменьваюцца ўсе астатнія каштоўнасці.

**Уладзімір Роўда**

Адным з найбольш ведамых беларускіх даследнікаў, які аналізуе беларускую нацыянальную ідэю з пункту гледжання паліталогіі, ёсць Уладзімір Роўда.

У. Роўда прысвяціў тэме нацыяналізму шэраг артыкулаў, у якіх былі паднятыя праблемы паходжання нацыяналізму, існасці нацыянальнай ідэі, тыпалогія нацыяналізмаў і ўмеркаванне гэтых дыскурасаў з беларускай праблематыкай. Роўда паслядоўнік ве-

дамых сучасных даследнікаў нацыяналізму, такіх як Эрнст Гелнер, Томас Нэйрн ды Энтані Сміт.

З існых тыпалогіяў нацыяналізмаў Роўда аддае перавагу падзелу яго на дзве асноўныя адмены: этнакультурную і грамадзянскую (палітычную).

Грамадзянскі нацыяналізм узнік у Францыі, і яго існасць у тым, што ўсе грамадзяне ў гэтай краіне, незалежна ад этнічнага паходжання – французы, але каб набыць грамадзянскія правы, трэба быць да пэўнай ступені асіміляваным у французскую культуру. Так сфармаваўся грамадзянскі нацыяналізм, які ў пэўнай меры дазваляе ўнікнуць дыскрымінацыі, збалансаваць правы нацыянальнай большасці і меншасцяў. Роўда прыхільнік пашыранага сярод лібералаў гледзішча, згодна з якім менавіта грамадзянскі нацыяналізм ёсць найаптымальнейшым варыянтам нацыянальнай ідэі ў цывілізаваных дэмакратычных краінах свету.

Этнакультурны нацыяналізм ёсць характарыстыкай нацыяналізму Нямеччыны, Італіі, некаторых краінаў Сярэдняй Еўропы. Этнакультурны нацыяналізм, калі ён не эвалюцыянуе ў больш памяркоўную палітычную форму, як сцвярджае Роўда ў артыкуле "Аб грамадзянскай нацыянальнай ідэі і этнакультурным нацыяналізме", – "нецярпіма ставіцца да правоў чалавека і нацыянальных меншасцяў і цяжка сумяшчальны з дэмакратыяй".

Што да апошняга сцверджання, хацелася б выказаць наступную заўвагу. Няўжо сапраўды "нецярпімасць да правоў чалавека"? Але ж гэта не так. У Германіі якраз вельмі паважліва ставяцца да правоў чалавека. А ўзнікненне фашызму, на які робіць намёк аўтар, адбылося ў Германіі не ў часы, калі складвалася нямецкая нацыя, а калі яна ўжо склалася, калі нямецкая культура добра заявіла аб сабе. А ўзнікненне фашысцкай ідэалогіі – гэта шуканне выхаду з эканамічнага крызісу пачатку 20-х гг. XX ст., у якім апынулася Германія, гэтыя шуканні прывялі рамантычны паводле прыроды нямецкі народ да канцэпцыі элітнай крыві і культу лідэра. Як піша ў сваёй знака-

мітай кнізе “Нацыяналізм у XX стагоддзі” Энтані Сміт, “фашызм і нацызм становяць альтэрнатыву і выклік нацыяналістычнаму і сусветнаму бачанню развіцця, а не з’яўляюцца працягам яго”. Няма ніякіх падстаў сцвярджаць, што этнакультурны нацыяналізм прыводзіць да “чыстай этнакратыі”, якраз менавіта ён ядро, аснова ўсякай нацыянальнай дзяржавы.

Аднак жа, як і палітолаг У. Роўда, я стаю на пазіцыі несумяшчальнасці этна-культурнага і некаторых іншых адменаў нацыяналізму, аб чым я пішу і ў гэтай кнізе.

Аддаючы перавагу грамадзянскаму нацыяналізму як больш прымальнаму ўва ўмовах Беларусі, У. Роўда ў артыкуле “Аб грамадзянскай нацыянальнай ідэі” сцвярджае: “Грамадзянская нацыянальная ідэя дазваляе пазбегнуць “гэтых адхіленняў ад нормы развіцця нацыі”. Што гэта за нормы? У нас ужо ёсць партыя – АГП, якая па шляху чыстай дэмакратыі хутка загоніць Беларусь у Расію.

Этна-нацыянальная ідэя мусіць быць. Іншая рэч, як яе сцвярджаць. Менавіта беларусы, якія каранямі ўраслі ў сваю зямельку, у якіх калі не мова, дык традыцыі, звычаі шануюцца з пакалення ў пакаленне, этнічны кампанент нацыяналізму ўспрымаюць з большым разуменнем, чым абстрактны грамадзянскі.

Вось яшчэ некаторыя высновы “ідэалогіі грамадзянскай нацыянальнай ідэі” і яе крытыка:

*Дадзеная ідэалогія разглядае нацыянальную супольнасць як больш адкрытую і плюралістычную... нацыяналістычныя звязкі не парываюцца нават у выпадку крайніх рознагалоссяў...*

Станавіта запярэчу, якраз адкрытае грамадства для вельмі слабой беларускай нацыі ёсць яе далакопам. А такі пункт: “грамадзянская нацыянальная ідэя прызнае права чалавека на выбар мовы і культуры” – адразу ставіць крыж на беларускай мове. Гэта, дарэчы, і зроблена на славутым рэферэндуме 1995 г.

Прыведзеныя прыклады можна працягваць і далей, аднак можна сказаць адно: у ўсіх сферах гра-

мадска-палітычнага і культурнага жыцця Беларусі мы так і не знойдзем важкіх аргументаў для пацвярджання тэзы аб прыхільнасці беларусаў да грамадзянскага нацыяналізму.

* * *

Асобна ад усіх разгледжаных філосафаў стаяць ідэі Зянона Пазняка.

**Падыход Зянона Пазняка да праблемы нацыянальнай ідэі.**

Зянон Пазняк палітык. І вялікі палітык. Але ў сваёй дзейнасці ён часта мусіў фармуляваць сваё стаўленне да розных праблем беларускага адраджэння, грунтуючыся на ўласным светаглядзе і ўласнай філасофіі. Часта ягоныя выказванні літаральна шакавалі публіку. І нават бывалыя палітыкі станавіліся ў тупік перад некаторымі яго заявамі, а часта і патрабаваннямі. Якія ж філасофскія праўды хаваліся за гэтымі Зянонавымі заявамі і думкамі? Апошнім часам, жывучы на чужыне, ён напісаў шэраг твораў як публіцыстычнага, так і лірычнага жанраў, дзе выказаў свае ідэі па шмат якіх праблемах беларускага адраджэння і беларускай палітыкі. На жаль, шмат з выказанага ў гэтых творах, на маю думку, не можа быць прынятым як арыенцір у нацыянальным адраджэнні беларусаў і палітычнай будучыні Беларусі. Таму ніжэй я спынюся на некаторых тэзах Зянона Пазняка, узятых з ягоных нядаўных твораў.

У свой час Васіль Быкаў назваў Пазняка *беларускім прарокам.* І можа, пра яго сказана, што прарокаў не прызнаюць на сваёй Айчыне, дык таму ён апынуўся на чужыне. Хто яго ведае... Але і з Варшавы Зянон піша нам інструкцыі ды трактаты пра тое, як нам трэба жыць і як будаваць сваю дзяржаву.

Ягоная любасць да Беларусі вялізная, паводле глыбіні і чысціні яе можна прыраўнаць толькі да любасці Ларысы Геніюш, пра якую я пісаў вышэй. Сведчаць пра тое і Зянонавы вершы, публіцыстыка, а найболей справы. У першай палове 1990-х гг. з

іменем Пазняка асацыяваўся не толькі Беларускі Народны Фронт, але і ўсё звязанае з словамі "беларус", "беларуская мова", "беларуская культура". Можа, і занадта шмат мы звязвалі з імненем Пазняка. І калі ён ад'ехаў у Амерыку, мы засталіся як сіроты, прынамсі, так нам спачатку здавалася. Нам – гэта тым, хто таксама кінуўся ў тую завіруху перабудовы, знішчэння камуністычнай сістэмы, яе сімвалаў і традыцыяў, усталявання свайго бел-чыровонабелага сцяга і герба Пагоні.

Паказаўшы сябе ў 1988–1996 гг. выдатным палітыкам, бліскучым аратарам, стаўшы нават нацыянальным сімвалам Беларусі, Зянон Пазняк, тым часам, заставаўся вельмі бездапаможным і павярхоўным мысляром ды філосафам.

Вось, прыкладам, артыкул Пазняка "Нацыянальныя каштоўнасці", напісаны яшчэ ў 2001 г. у Варшаве. Нельга абысці маўчаннем Пазняковы праекты, выкладзеныя ў гэтым трактаце. Першае: вельмі наіўна гучыць прапанова стварыць альтэрнатыву А. Лукашэнку праз аднаўленне "законнага беларускага ўрада" нават на той час, калі яшчэ былі юрыдычна не скасаваныя правамоцтвы Вярхоўнага Савета XIII склікання. "Згодна з Канстытуцыяй Старшыня Вярхоўнага Савета Сымон Шарэцкі ў кожны момант можа афіцыйна ўзяць на сябе функцыі прэзідэнта Рэспублікі Беларусь", – піша Пазняк. І далей ідуць фантазіі на тэму, якім спосабам гэты пазнякоўскі "законны ўрад" на чале з С. Шарэцкім "стане легальнай апорай" для міжнароднай супольнасці ў яе падтрымцы правоў чалавека. Якім жа спосабам "стане легальнай апорай"? Якая можа быць легальнасць у групы людзей, што жывуць за мяжой, калі яны нават назавуць сябе ўрадам? Адказаў на гэтыя пытанні лідэр беларускага адраджэння даць не здольны. Ён проста сцвярджае: "сітуацыя рэзка зменіцца на карысць Беларусі".

Нешта падобнае мы ўжо праходзілі, яшчэ перад ад'ездам З. Пазняка з Беларусі. Тады БНФ пад ягоным кіраўніцтвам заўзята займаўся прыёмам гра-

мадзян Беларусі ў "грамадзяне" БНР – Беларускай Народнай Рэспублікі, урад якой дагэтуль існуе ў эміграцыі. Няўжо не было перад беларускай апазіцыяй, перад БНФ ніякіх больш важкіх заданняў у перыяд станаўлення рэжыму Лукашэнкі, як размяркоўваць партфелі ў утапічнай краіне БНР? Таму і зазнаў БНФ моцную паразу на выбарах у 1995 г., таму і прагаласаваў народ Беларусі за знакаміты рэферэндум, і пазбылася Беларусь сваёй нацыянальнай сімволікі і мовы. Бо дэмакратам з БНФ было не да таго. Дзяліліся пасады ў БНР!

А наконт С. Шарэцкага – дык ён даўно на бестэрміновым адпачынку ў Амерыцы, так што стварайце "законны ўрад" без яго.

Слабасць З. Пазняка, як стратэгічнага мысляра, адчуваецца праз увесь разгляданы артыкул. Прыкладам, у рэлігійных пытаннях. Ён піша: "Псіхалагічнаму адзінству і талеранцыі беларусаў паспрыялі самы падзеі: пратэстантызм і знішчэнне пратэстантызму, унія і потым знішчэнне уніі рускімі... паланізацыя тутэйшага каталіцызму". Ведама, што памянёныя падзеі былі не толькі ў Беларусі, а па ўсёй Еўропе, дык пры чым тут "талеранцыя беларусаў"? А наконт паланізацыі каталіцызму, дык усё было якраз наадварот – каталіцызм ішоў з самага пачатку з боку Польшчы і адпачатку быў спаланізаваны. А пазьней у Беларусі ён якраз і пачаў беларусізавацца. І гэта добра відаць з творчасці такіх ведамых беларускіх католікаў-адраджэнцаў як Адам Станкевіч, Вінцэнт Гадлеўскі, іншых, у тым ліку і Зянонавага дзеда – Яна Пазняка.

Пазнякоўскія фантазіі сягаюць і Святога Пісьма. У Евангеллі ад Яна такі пачатак: "Напачатку было Слова, і Слова было ў Бога, і Слова было Бог". Ясна сказана: "Слова – было Бог". У Пазняка разуменне Слова зусім прыземленае – ён яго разумее як складнік мовы (як і ў граматыцы). А раз так, то і высновы робяцца высокаўзнёслыя: "Мова аб'ядноўвае і мацуе, вядзе за сабой..." (бо яна складаецца з слоў, а Слова –

Бог!). Гэта так, але евангельскія радкі пра Слова – іншае, і нельга блытаць такую высокую галіну чалавечай дзейнасці як Вера і яе грунт – Святое Пісьмо з філалогіяй і яе аб'ектам вывучэння – мовай.

А вось яшчэ ўзор Пазнякоўскага імкнення да гіпербалізацыі і змешвання розных паняткаў, нават іх зводжання пад адну страху. У інтэрв'ю вечаровай праграме радыё "Свабода" ён кажа:

*Рэч у тым, што нацыянальнасць і дэмакратыя – гэта сінонімы. Нацыянальная ідэя, нацыянальная дзяржава – гэта супольная справа. Яна можа ўзнікнуць толькі як справа грамадства. Нацыі заўсёды ўтвараліся як супольная справа, як дэмакратычная. Так было ў усёй Еўропе. Потым маглі быць дыктатуры, розныя адступы. Але і дэмакратыя, і нацыянальная ідэя, і нацыянальны палітычны рух – яны неад'емныя пaняткі.*

Гістарычна ідэі дэмакратыі і нацыянальна-вызвольны рух і сапраўды часта былі спадарожнікамі і ўзнікалі амаль адначасна. Так было ў час знакамітай французскай рэвалюцыі 1789 г., так было і пасля бальшавіцкай рэвалюцыі 1917 г., так было і ў нас у Беларусі пасля знакамітай гарбачоўскай перабудовы. Аднак гэтыя два панятк – дэмакратыя і нацыянальная ідэя ніколі не былі сінонімамі. Кожны з тэрмінаў значыў абсалютна розную сістэму грамадскіх ідэалаў. Але і не гэта галоўная Зянонава памылка. Пасля крушэння манархіяў і фармавання нацыянальных дзяржаў паміж прынцыпамі дэмакратыі і нацыянальным адраджэннем заўсёды паўставалі супярэчнасці. А ў развітых, самастойных дзяржавах дэмакратычныя і ліберальныя прынцыпы заўсёды канфліктуюць з нацыяналізмам. Гэта і зразумела – мэты іх супраціўныя. Вынік дэмакратыі – свабодная, праўная краіна, дзе нацыянальныя дачыненні зведзены да мінімальнага роўню і выяўляюцца толькі ў культурный сферы. Прыкладам можа служыць ЗША.

Вынік іншага гістарычнага працэсу: спачатку дамінуе прынцып нацыянальнай мабілізацыі і праз нацыянальны касенсус ідзе працэс утварэння нацыяў-

дзяржаў, а ўжо потым усталёўваюцца сучасныя дэмакратычныя дачыненні. Гэта шэраг краін Еўропы: Францыя, Германія, Англія і г. д.

Васіль Быкаў неяк сказаў, што Пазняк – гэта *драматычнае сутыкненне беларускай мары і беларускай рэальнасці.* Дык драма ў тым, што мара не здольная адолець рэальнасць, а Пазняк жыве так, нібы пра тое не ведае.

Развіваючы гэтую думку Быкава, я б сказаў, што мара пазнякоўскай Беларусі – гэта каталіцкая дзяржава, дзе пануе вылучна беларуская мова, дзе співаюць вылучна беларускія песні, дзе цякуць беларускія рэкі і растуць беларускія грыбы... І тое, што ў гэтай здуманай Беларусі няма месца праваслаўнай большасці цяперашняга насельніцтва і рускамоўнаму электарату – абсалютна не кранае і не датычыць Пазняковай мары. Я магу зразумець нелюбоў Зянона да праваслаўнага духавенства, але як можна ігнараваць тысячы, сотні тысяч простых людзей, вясковых сялян, што кожную нядзельку цягнуцца ў праваслаўныя цэркаўкі, і гэта іх спрадвечнае жыццё, якое з нядаўнага часу стала, нарэшце, адкрытым для кожнага.

### *Частка 3. Іншыя спробы*

Занадта глабальны падыход да Беларускай нацыянальнай ідэі, хоць і заснаваны на моднай цяпер *ідэі самаарганізацыі*, прапануе Зміцер Абразцоў. Мне падаецца, што неадменная апеляцыя да панятку самаарганізацыі будзе халастым ходам, калі не напоўніць яе рэальным зместам.

Сваю кнігу, прысвечаную гэтай праблеме, ён называе: “Нацыянальная ідэя: Навошта, што, дзеля чаго”. Больш за тое, выяўляецца, што ўжо ў загалоўку і адлюстравана існасць беларускай нацыянальнай ідэі. Ён піша: «Падаецца, што менавіта адказ на пытанні “чаму і дзеля чаго мы жывем”, “чаму жывем на гэтай беларускай зямлі разам” і “як жыць разам, каб жыць”, можа разглядацца як **сутнасць Беларускай нацыянальнай ідэі**».

Паспрабуем адказаць на гэтыя пытанні. Першае пытанне (тут хутчэй два розныя) кожны развязвае сабе сам. Чаму мы жывем менавіта на беларускай зямлі? Адказ па-за межамі нашай дасведчанасці, бо "я нарадзіўся тут"! І ўсё! Ёсць яшчэ слова "разам", г. зн. у грамадстве – такім парадкам ідзе ход гісторыі на Зямлі, нам прыходзіцца жыць разам, чалавек сацыяльная істота. І тут нічога нельга змяніць. Усе спробы самотнага жыцця па-за грамадствам (успомнім "Уолдэн, ці Жыццё ў лесе" Г. Тора, "Рабінзона Круза" Д. Дэфо ці "Маўглі" Р. Кіплінга) ёсць толькі эксперыменты ці няшчасныя выпадкі. Апошняму пытанню "як жыць разам, каб жыць" прысвечаны ўсе палітычныя праекты, існуюць цэлыя філасофскія сістэмы аб тым, як лепш нам суіснаваць. Яшчэ не было таго, хто падняў бы пытанне "як жыць разам, каб памерці".

Далей ідзе ўсё ж больш дакладнае – на пагляд аўтара – сфармуляванне беларускай нацыянальнай ідэі: "Таму і акрэсліць Беларускую нацыянальную ідэю можна як канцэпцыю неабходнасці самаарганізацыі беларускай нацыі ў незалежнай прававой дэмакратычнай дзяржаве для супольнага жыццезабеспячэння і бясконцага працягу жыцця дзеля рэалізацыі Боскага прызначэння на Зямлі і ў Сусьвеце!".

Першае: у гэтым цверджанні зусім не адлюстравана беларуская рэальнасць, так можна сказаць пра ідэю ўсякай нацыі. Другое: словы "неабходнасць" і "самаарганізацыя", якія ёсць вузлавымі ў азначэнні аўтара, не супярэчаць адно адному, самараганізацыя на тое і ёсць, каб над ёю не ўладарыла мусовасць.

І трэцяе – галоўнае ў разгляданай тэорыі – гэта ўзятая з сінергетыкі ідэя самараганізацыі, на якую ўвесь час спасылаецца аўтар. Тэрмін сінергетыка, упершыню ўведзены Г. Хакенам для азначэння навукі, якая вывучае агульную тэорыю калектыўных прасторавых, часавых і функцыянальных макраструктур. Разгляданая сістэма ёсць адкрытай, і ўсе галоўныя канцэпцыі сінергетыкі для фізічных сістэм

добра вывучаныя. Пабудавана дасканалая матэматычная тэорыя, якая добра апісвае такую складаную фізічную сістэму, як лазер. Тарнаванне ідэй сінергетыкі для чалавечага грамадства вывучаецца ў рамках новай навукі – сацыядынамікі.

Складанасць выкарыстання ідэй гэтай навукі ў тым, што *на роўне соцыуму*, у адрозненне ад фізікі і хіміі, *не існуе раўнання руху* на мікрароўні, бо асобныя індывіды не падпарадкоўваюцца вызначанымі (матэматычнымі) паводзінамі (не фармалізуюцца). *Асноўны алгарытм сінергетыкі не спрацоўвае ў сацыяльных сістэмах*. Аднак для сацыяльных сістэмаў могуць выкарыстоўвацца ідэі агульнай тэорыі сістэмаў (АТС), дзе здольнасць сістэм да захавання індывідуальнасці і здольнасці да дынамічнай адаптацыі ўнутры зменлівага акружэння наўпрост звязваюцца з тэлеалагічнымі канцэпцыямі і халістызмам. У АТС тэлеалагічныя сістэмныя прыкметы могуць разглядацца як эмержэнтныя прыкметы і такім парадкам могуць растлумачыць існаванне ўзаемазвязаных іерархічных сацыяльных сістэм. Некаторыя ідэі шматроўневай іерархічнай тэорыі сістэмаў разглядаюцца намі ніжэй **(раздзел VI)**.

Такім парадкам, у разгляданым творы З. Абразцова, апрача дэклараваных заганаў беларускага грамадства, накшталт нястачы "духовага апірышча", нястачы дастатковай адукацыі і г. д., а таксама пажаданняў "самаарганізавацца", на жаль, *няма* канкрэтных механізмаў дасягнення пастаўленых мэтаў, як і для абстрактнай нацыі-дзяржавы, так і канкрэтна – для Беларусі.

*Другі прыклад*. Трактат ведамага дзеяча беларускага адраджэнцкага руху, былога сябра сойма БНФ прафесара Алеся Астроўскага "Адэкватная схема нашай рэчаіснасці", а таксама артыкулы па тэме, змешчаныя ў памянёнай ужо кнізе "Беларуская нацыянальная ідэя" (Мінск, 2000).

Возьмем адзін з артыкулаў, дзе выкладзены ягоны "светаглядны комплекс". Называецца ён "Рэлі-

гія актыўнага дабра"[1] і прысвечаны выкладанню, як сведчыць назва, рэлігійнай канцэпцыі аўтара.

Вось выходныя пастулаты А. Астроўскага: "Сусвет існуе аб'ектыўна. Самаразвіццё – сутнасць існавання Сусвету... Бога як нечага абасобленага ад сусвету не існуе. Можна пагадзіцца і нават прыняць, што Сусвет – гэта і ёсць Бог".

І якая тут рэлігійная думка? Нават Абсалют індуізму шмат глыбейшы за такую "рэлігію". Фактычна, мы маем справу з тым самым матэрыялізмам. І ў найлепшым разе рэлігія Астроўскага – эклектычны субстрат пантэізму з дуалізмам ("Блага – Дабро"). Высновы аўтара "Рэлігіі актыўнага дабра" зводзяцца перадусім да прыстасавання хрысціянскіх ці агульнарэлігійных каштоўнасцяў да звычайнага матэрыялізму і агульнапрынятых этычных нормаў, што, зноў-такі, у свой час сфармаваліся на падставе хрысціянскай маралі. Прыкладам, у дзевятым раздзеле мы чытаем: "Замагільнага жыцця" не існуе. Усё апісанае там – плод фантазіі... Пасля смерці чалавека яго цела будзе жыць у яго непасрэдных нашчадках, а яго дух – ва ўсім тым, што ён зрабіў для нашчадкаў, блізкіх і сяброў". У гэтых словах няма нічога, апрача самага тыповага матэрыялістычнага светаўспрыняцця. У рэлігіі Астроўскага ёсць і свае запаведзі накшталт такіх:

– "ствара́й Дабро, змагайся з Благам і не аглядвайся на іншых" (нібыта ёсць такія, што будуць заклікаць – "ствара́й Блага (!)", – *А.А.*);

– "будзь свабодным і шчаслівым" – (амаль як у Кузьмы Пруткова "хочаш быць шчаслівым – будзь ім!" – *А.А.*);

– "на пытанне "ці веруеш?" – адказвай "веру"... у перамогу Дабра і Справядлівасці".

І гэтак далей.

---

[1] Гл. артыкул "Зь Беларусі ў свет", змешчаны ў зборніку матэрыялаў "Беларуская нацыянальная ідэя". Гродна, 1999. С. 236–248.

Аднак прыклад А. Астроўскага – гэта толькі прыклад бяскрыўднага эксперыментавання з духовымі імператывамі, і за рамкі самарэалізацыі ўнутры сябе ягоныя дыскурсы не выходзяць.

Зусім іншае разуменне нацыяналізму можна ўбачыць у сучасных маладзёвых актывістаў, якія імкнуцца да актыўных дзеянняў на палітычным небасхіле, не заўсёды размеючы дзеля чаго і навошта змагацца.

Так, у "даведніку" пра "беларускі нацыяналізм" мы знаходзім і такое азначэнне:

***Беларускі нацыяналізм*** *– гэта вызвольны, аб'ядначы грамадска-палітычны рух, які на аснове яднання ў суцэльны фронт усіх паборнікаў дзяржаўнай самастойнасці мабілізуе найшырэйшыя народныя масы да барацьбы за волю народа і чалавека, за нацыянальную, палітычную ды сацыяльную справядлівасць, за аднаўленне на беларускіх этнічных землях Беларускай Незалежнай Нацыянальнай Дзяржавы – адзінага гаранта існавання і працвітання нацыі.*

Тут панятак "нацыяналізм" ад светагляднага, ідэалагічнага прынцыпу звужваецца да працэсу – "руху" за "волю народа і чалавека" і за "аднаўлененне дзяржаўнасці." Гэтыя голыя словы мала нясуць сэнсавай нагрузкі, а аднаўленне дзяржаўнасці наагул фармальна лішні праект, бо беларускую дзяржаву аднаўляць не трэба – яна ёсць. Трэба другое: напоўніць яе нацыянальным зместам, а вось праектам гэтага якраз і павінен займаецца беларускі нацыяналізм.

Трэба ў гэтым звязку заўважыць, што захапленне актыўным змаганнем не заўсёды ёсць змаганнем за нацыянальныя інтарэсы беларусаў. Чытаючы памянёны "даведнік", можна ўбачыць, што большасць тых "нацыяналістаў", што прыточваюць аўтары ў прыклад, насамрэч часцей за ўсё ёсць антыкамуністамі ці проста не згоднымі з рэжымам людзьмі. І агулам залічаць іх усіх да нацыяналістаў мы не маем ніякага права.

### 3. Фармулёўка беларускага нацыяналізму

Амаль усе палітыкі і навукоўцы, што спрабавалі займацца пастаўленай праблемай, паказваюць ці вельмі павярхоўнае разуменне праблемы, ці прапануюць проста памылковыя падыходы.

Вышэй, у літаратурным і філасофскім раздзелах, мы азнаёміліся з некаторымі сучаснымі падыходамі да беларускай нацыянальнай ідэі ў тэарэтычным плане. Відавочна, што тэорыя беларускага нацыяналізму яшчэ робіць толькі першыя крокі.

У практычным плане рэалізацыя беларускага нацыяналізму ў культурна развітую нацыю выглядае яшчэ больш праблематычнай. Апрача атрыбута дзяржаўнай незалежнасці, які нам нечакана і незаслужана падарыла гістарычная авантура пачатку 1990-х гг., нам, беларусам, амаль няма чым пахваліцца ў сэнсе практычнага ўцеляснення здаровай нацыянальнай ідэі ў жыццё Беларусі і жыццё нацыі.

***Якой павінна быць фармулёўка беларускага нацыналізму?***

Мне падаецца, што немажліва знайсці універсальнае формулы Беларускай нацыянальнай ідэі. Ніжэй прапануюцца толькі некаторыя простыя падыходы да праблемы, якія, на мой пагляд, відавочныя і не патрабуюць нейкіх празмерных высілкаў.

У першым раздзеле быў дадзены агляд сучасных уяўленняў аб нацыяналізме ў свеце і дадзеная універсальная фармулёўка, якой пільнуеццца аўтар гэтай кнігі. У аснове гэтага ўяўлення ляжыць простая праўда:

*Нацыяналізм – гэта любасць, найперш любасць да свайго народу, сваёй Бацькаўшчыны і вера ў яе лепшую будучыню. Гэтая любасць не любасць-эрас, з пачуццёвымі, фізічнымі адносінамі паміж аб'ектамі, – і не любасць-філія паміж сябрамі. Гэта любасць-агапэ – Божая любасць, асветленая хрысціянствам.*

***Некаторыя папярэднія заўвагі.*** Трэба канстатаваць відавочны факт: апазіцыйны рух на дадзеным этапе фактычна зайшоў у тупік і мала здольны да сапраўднага змагання за дэмакратыю, правы чалавека і наагул за вывад Беларусі з глыбокага крызісу. Таму патрэбны кардынальна новы падыход да гэтай праблемы пры складзенай сітуацыі.

Першае: мы павінны выразна ведаць: "*Чаго мы хочам?*".

Другое (калі ўжо ведаем адказ на першае пытанне): мы павінны даць адказ на сакрамэнтальнае пытанне "*Што рабіць?*"

Здаецца, большасць грамадзянаў Беларусі будуць салідарнымі ў першым пытанні – усе мы хочам лепшага жыцця. Праўда, гэтае "лепшае жыццё" людзі разумеюць па-рознаму. Большасці, зразумела, трэба мець больш грошай пры мінімуме высілкаў. Ёсць такія, што скажуць: годнае жыццё – гэта не толькі грошы, гэта культура, родная мова, гэта Айчына-Беларусь. Ёсць і вялікая трэцяя група людзей, якая дакладна не ведае таго, чаго яна хоча, але не супраць і першага, і другога падыходаў.

Таму развязанне другога пытання будзе залежаць ад таго кантынгенту грамадзян, з якім мы маем справу. Мы павінны падысці да адказу на пытанне "Што рабіць?" гнутка, і падаць яго не адназначным спосабам, а так, каб нашыя прапановы былі блізкія і зразумелыя максімальна большаму колу грамадзянаў Беларусі. Мы, прыкладам, мусім (прынамсі, на першым этапе) *адкінуць* збрыдлыя большасці нашых грамадзянаў "*культурніцкія*" *захады за агульнае панаванне беларускай мовы.* Да абсурду даходзяць некаторыя сцверджанні дзеячоў з ТБМ, прынамсі такое: будзе мова – будзе і дэмакратыя. Заўсёды хочацца адказаць на гэтую тэзу наступнае: – "Не будзе, спадарове, гэта так проста. Шлях да цывілізаванага грамадства доўгі і складаны".

Перш за ўсё нам трэба вызначыць прыярытэты, забіць трывалыя па́лі ў гэтае няўстойлівае, зменлі-

вае грамадства, даць такую ідэю, якая б здаволіла ўсіх. Прынята называць такую кіроўную ідэю ў грамадстве нацыянальнай. Якой жа павінна быць *беларуская* нацыянальная ідэя?

Трэба заўважыць тое, што наагул само спалучэнне слоў – беларуская нацыянальная ідэя – незразумелае "сярэдняму" жыхару нашай краіны. Таму мы павінны беларускую нацыянальную ідэю фармуляваць як бы ў двух вымярэннях:

А – для дасведчаных грамадзянаў;

Б – для большасці "электарату".

*Фармулёўка беларускай нацыянальнай ідэі для групы А*

Найперш мы павінны цвёрда ўсведаміць, што беларуская нацыянальная ідэя – гэта праект рэалізацыі нацыі і нацыянальнай дзяржавы.

Галоўныя атрыбуты беларускай нацыянальнай ідэі (далей – БНІ):

1. БНІ – імкненне грамадзяніна Беларусі ўсведаміць сябе ў сваёй нацыі і сваёй нацыянальнай дзяржаве;

2. БНІ ёсць выразнік акрэсленага тыпу культуры, уласцівага беларускаму этнасу, і ўлучае эканоміку, вытворчасць, адукацыю, рэлігію, мастацтва, літаратуру, іншыя складнікі ўсёй сведамай і мэтнай дзейнасці грамадзянаў.

Канкрэтызуем гэтую пазіцыю па асноўных галінах культуры:

а) *Нацыянальная эканоміка.* Некаторыя эканамісты (прыкладам, Л. Злотнікаў) лічаць, што не існуе нацыянальнай эканомікі. Гэта не зусім слушнае меркаванне. Менавіта ўпор на нацынальныя каштоўнасці і дазволіў пасляваеннай Нямеччыне хутка выйсці з крызісу. Людвіг Эрхард, творца пасляваеннай нямецкай эканомікі, назваў новую эканамічную праграму "нямецкім цудам". ФРГ, дзякуючы прадуманай і нацыянальна прыстасаванай эканамічнай праграме, за невялікі тэрмін (1947–1953 гг.) выйшла з стану поўнага разбурэння і стала перадавой еўрапейскай краінай.

Кожная перадавая дзяржава дасягнула сваіх поспехаў якраз дзякуючы сваім нацыянальным асаблівасцям у эканамічнай галіне. Прыкладам, тая ж Японія мае фірму "Sony", ведамую ўсяму свету. І ў сваёй галіне гэтая фірма амаль не мае сабе роўных.

Апрача тэхналагічных нацыянальных асаблівасцяў, пры стварэнні эканамічных праектаў вялікую ролю маюць таксама тэрытарыяльныя і геапалітычныя асаблівасці размяшчэння краіны. Сюды ўваходзяць як прыродныя багацці, нетры, лясы і азёры, так і размяшчэнне краіны. Прыкладам, шэраг еўрапейскіх краін маюць значны даход ад транзіту таварапатокаў праз тэрыторыю (Швейцарыя, Чэхія, Аўстрыя, інш.). Беларусь таксама мае ўсе гэтыя атрыбуты.

б) *Нацыянальная адукацыя. Навучанне павінна праводзіцца на мове тытульнай нацыі дзяржавы* Але гэта – толькі ў ідэале, пераход на беларускую мову мае быць паступовым, гнуткім, нават "неадчувальным". Для таго, каб унікнуць дыскрымінацыі нацыянальных меншыняў, на тэрыторыі іх пражыцця побач з звычайнымі навучальнымі ўстановамі адкрываюцца школы з роднай мовай меншыняў.

в) *Рэлігія.* У развітых нацыях-дзяржавах Царква няўхільна нясе на сабе нацыянальны адбітак. Як у каталіцкіх Касцёлах, так і ў праваслаўнай Царкве набажэнствы дзе-як мага праводзяцца на нацыянальных мовах альбо ў комплексе з прафетычнымі мовамі (накшталт царкоўнаславянскай).

3. Няма дзяржавы, што не мела б сваёй *нацыянальнай сімволікі*: нацыянальнага сцяга, герба і гімна. Беларусы таксама маюць сваю прадвечную нацыяналную сімволіку. Гэта бел-чырвона-белы сцяг, герб Пагоня, і некалькі нацыянальных гімнаў, сярод якіх найулюбёнейшым ёсць "Магутны Божа", напісаны знакамітым кампазітарам Міколам Равенскім на словы выдатнай паэткі Наталлі Арсенневай. "Магутны Божа" ёсць неафіцыйным гімнам усіх беларусаў свету.

БНІ дасягне сваёй сапраўднай моцы толькі тады, калі наша сімволіка дойдзе да кожнага грамадзяніна, стане афіцыйнай.

4. БНІ павінна быць накіравана на *кансалідацыю грамадства*. Толькі нацыянальная ідэя здольная паяднаць розныя, часам няўзгодныя групы насельніцтва, якія жывуць супольна, у адной дзяржаве.

5. Беларуская нацыянальная ідэя павінна знаходзіць свае *карані ў мінулым*. Гэта ўся нашая вялікая гістарычная спадчына, якая пачынаецца з помнікаў матэрыяльнай культуры, гэта летапісы і хронікі, гэта народныя традыцыі, паданні, фальклор, інш. На гістарычным матэрыяле БНІ мацуецца, набірае сілу.

Не дзіва, што многія народы, этнасы і нацыі дзеля паўнаты самасцверджання апелююць да гіпербалізаваных падзей, часта ўзвялічаных і нават выдуманых постацяў мінулага. І героі мінулага ідэалізуюцца, іх адмоўныя рысы паступова сціраюцца дзеля таго, каб зрабіць чысты станоўчы прыклад для сучаснікаў і будучых пакаленняў.

Яскравы прыклад – гістарыяграфія ў сучаснай Літве, дзе ўсе набыткі мінулага ВКЛ разглядаюцца як спадчына сучасных этнаграфічных літоўцаў, хоць добра ведама, што 80–90 % жыхароў княства складалі русіны – продкі сучасных беларусаў і ўкраінцаў.

6. *Мэтай БНІ ёсць утварэнне незалежнай беларускай нацыі-дзяржавы*. Паўната беларускай нацыі будзе дасягнута ў той момант, калі ўсе грамадзяне краіны, улучаючы тых, хто і не ўваходзіць у склад тытульнай нацыі, здольныя аб'яднацца, каб супольна жыць у адзінай, суверэннай дзяржаве. БНІ мае ў гэтым ролю "пуцяводнай зоркі".

7. *БНІ ляжыць у аснове вонкавай і нутраной палітыкі Беларусі*. Нацыянальныя інтарэсы краіны – першасныя пры ўкладанні міжнародных дамоў, пры ўтварэнні міждзяржаўных эканамічных і палітычных звязаў і г. д. Ігнараванне сваёй нацыянальнай ідэі можа прывесці да паглынання больш моцнай дзяржавай свайго меншага "хаўрусніка". Так, прыкладам, склаўся шлях ВКЛ пасля пакладання ў 1569 г. Люблінскай уніі з Каралеўствам Польскім і царкоў-

най Брэсцкай уніі ў 1596 г. Тады вызначальнымі сталі прыватныя інтарэсы заможнай шляхты ды крывадушнасць і фанатызм часткі праваслаўнага духавенства. Так можа і цяпер скласціся лёс Беларусі пасля мажлівага паглынання яе Расіяй у выніку неабдуманай вонкавяй палітыкі.

8. *Нацыянальная ідэя набывае пэўную закончанасць, калі яна фамулюецца як ідэалагічная платформа нацыі.* Гэтая тэарэтычная канцэпцыя носіць назву "нацыяналізм". Нацыянальная ідэя няўхільна вядзе да нацыяналізму – праграмы дзеянняў для падтрымання гэтай ідэі і дасягнення яе мэтаў. Салідарнасць, пра якую мараць нацыяналісты, засноўваецца на валоданні ўсім этнічным багаццем у часе і прасторы, набыткамі мінулых пакаленняў, якія нясуць у сабе росквіт нацыянальнага генія. Фактычна, нацыналізм ёсць рэалізацыяй нацыянальнай ідэі ў тэарэтычнай плашчыні, нацыя – рэалізацыя нацыянальнай ідэі ў практычнай плашчыні.

*Вымярэнне групы Б (фармулёўка БНІ для электарату)*

Перш чым сфамуляваць БНІ ў практычным яе сэнсе, г. зн. у той форме, у якой яна будзе блізкай і зразумелай кожнаму грамадзяніну Беларусі, трэба падзяліць наша грамадства на некалькі ўмоўных груп:

1) інтэлігенцыя (службоўцы) і работнікі;

2) гарадскія жыхары і вяскоўцы;

3) прыхільнікі дэмакратыі, незалежнасці Беларусі і праціўнікі гэтых каштоўнасцяў, тыя, хто дагэтуль марыць аб вяртанні зніклага Савецкага Саюза ці хутчэйшага саюза з Расіяй;

4) вялікая група "абыякавых" – "балота", шэрая маса, тыя, хто, на першы пагляд, нічога не хоча і нікуды не імкнецца. З гэтай групай трэба працаваць найболей, бо яна і дасць патрэбны працэнт переваргі дэмакратам;

5) ёсць мноства іншых груп: аб'яднанняў паводле інтарэсаў, працоўных калектываў, нацыяналістаў і

шавіністаў, прыхільнікаў і праціўнікаў беларушчыны і г. д. Усе гэтыя групы нейк перасякаюцца з ранейшымі і могуць уваходзіць у іх.

Кожная з груп 1–4 можа таксама падзяляцца паводле прыкметаў групы 5.

Трэба дабіцца таго, каб платформа рэалізацыі БНІ, сфармуляваная вышэй у дачыненні да групы А, стала блізкай і зразумелай групе Б – усім жыхарам Беларусі.

1. Першае і найважнейшае заданне, аднолькава патрэбнае для ўсіх груп насельніцтва, – гэта ўсведамленне мусовасці існавання Беларусі як незалежнай дзяржавы. Калі для большасці сяброў апазіцыйных партыяў і няўрадавых арганізацыяў, сведамай інтэлігенцыі, гэтая праўда не патрабуе даводжання, то для простага люду, работніка і селяніна, наагул тых, хто жыве мінулым, незалежнасць – не відавочная каштоўнасць. Прыточым шэраг моцных аргументаў.

А) Ідэя "свайго дома". Беларусы – хатні, гаспадарлівы, прывязаны да свайго кута народ. І трэба, зрабіўшы ўпор на гэтыя якасці, паслядоўна правесці ў жыццё лозунгі: "Беларусь – наш дом", "Беларус – стань гаспадаром сваёй зямлі!". Слова *гаспадар* тут трэба ўсведамляць не толькі ў сэнсе гаспадар ворнай зямлі на сяле, а ў шырокім сэнсе – гаспадар усёй беларускай зямлі: палёў, лясоў, рэк, азёраў і г. д.

Б) Беларус не любіць ваяваць. І тым больш ваяваць на іншай тэрыторыі і за іншыя інтарэсы. Трэба паслядоўна даводзіць, што шчыльны, палітычны зваз з Расіяй, а тым больш зліццё з ёй – гэта небяспечны крок для нас. Гэта і каўказцы на рынку, і чачэнскія войны, і служба нашых сыноў у гарачых пунктах, і няўхільныя цынкавыя труны.

В) Трэцяе важнае пытанне гэтай групы – аб саюзе з Расіяй. Трэба паслядоўна праводзіць палітыку дружбістасці да Расіі і найлепшых пачуццяў да рускіх, але падкрэсліваць нашую дружбістасць і да ўсіх іншых народаў: палякаў, літоўцаў і г. д. На першы план гэтага сяброўства і любасці трэба ставіць

любасць да свайго народа, да сваёй краіны, да свайго дому – Беларусі. Мы не супраць Расіі і за сяброўства з ёй, але ставімся да яе толькі як да добрага суседа. Не павінна быць застарэлага стаўлення да рускага народа як да "старэйшага брата", толькі раўнапраўныя дачыненні.

2. Другое заданне, што стаіць перад грамадзянамі Беларусі – выхаванне пачуцця сваёй годнасці, самакаштоўнасці свайго "Я". Мы не толькі не горшыя за іншыя народы, мы – лепшыя. У нас працавіты адукаваны народ, у нас вельмі высокі працэнт адукаваных людзей у Еўропе. Нашыя навукоўцы, інжынеры, пісьменнікі, мастакі ведамыя ўсяму свету. У беларусаў славутае мінулае, старажытная гісторыя, мы складалі ядро адной з наймацнейшых дзяржаў Еўропы – Вялікага княства Літоўскага. Мы павінны выкарчаваць ярлык непаўнавартай нацыі, што не мае мінулага, гісторыі. Трэба развіваць той тып нацыяналізму, які носіць у палітаталогіі назву "прэстыжны". Можа, недзе патрэбна і міфалагізаваць сваё мінулае.

3. Трэцяе заданне – фармаванне, "усталяванне" народнага правадыра. Трэба даць народу новага, ці на новым падмурку паставіць старога, кіраўніка дзяржавы. Гістарычна склалася так, што беларускі народ прызвычаіўся жыць за спінай "бацькі". Некалі быў цар. Былі шуканні "добрага цара". Потым быў "Бацька ўсіх народаў" – Сталін. Яго баяліся, але і цанілі "цвёрдую руку". Потым – Хрушчоў, Брэжнеў, Андропаў... Шэраг гэтых імёнаў для ўсіх савецкіх грамадзян адзіны, але для беларусаў ён яшчэ дапаўняецца легендарным Машэравым. Не зусім правільным будзе меркаванне, што гарантам суверэннасці Беларусі будзе не прэзідэнт, а моцная грамадзянская і палітычная супольнасць. Якраз гэтую "моцную супольнасць" і зробіць моцнай прэзідэнт, правадыр, якому паверыць народ. Не так проста нашаму народу змяніць векавую традыцыю падпарадкоўвацца "галоўнаму начальніку" – цару, генсеку ці прэзідэнту. Гэтая традыцыя перарасла ў беларускую

якасць і стала адной з рыс нашай ментальнасці.

Таму да абрання новага прэзідэнта трэба ставіцца вельмі адказна. Ён, як і сучасны прэзідэнт, павінен быць сваім для народа, ён павінен гаварыць тое, што народ хоча чуць, ён за сяброўства з Расіяй, але і за добрыя дачыненні з Еўропай і ЗША. Але ён павінен быць "сваім" для ўсіх нас. Новы Рух за дэмакратыю і Беларусь павінен быць не ў апазіцыі да абіранага прэзідэнта – а ў шчыльнай лучнасці з ім. Але для таго, каб не паўтарылася цяперашняя сітуацыя з неабмежаванымі правамі прэзідэнта, трэба ў новым заканадаўстве абавязкова замацаваць шэраг патрэбных законаў для абмежаванняў ягоных мажлівасцяў.

4. Стварэнне (канструяванне) беларускага нацыяналізму. Аналіз сучаснага становішча беларускага этнасу ў свеце прыводзіць да наступных асноў канструявання беларускай нацыі. Мы падзелім гэтыя асновы на дзве групы: першую назавем "*група НЕ*". Гэта ідэі, якія нельга лічыць першаснымі, засяроджваць на іх максімальную ўвагу, хоць яны і маюць дачыненне да фармавання беларускай нацыі і нацыяналізму. А на другім этапе яны, можа, будуць і галоўнымі. Але толькі пасля здзяйснення першага этапу, ці ў спалучэнні з ім. Другая група аб'ядноўвае ідэі, якія павінны быць першаснымі, узяць на сябе ўвесь цяжар стваральнай працы. Назавем гэтую групу "*група ТАК*".

*Група НЕ.*

У беларусаў супраць многіх развітых народаў, прыкладам, этнасаў прыбалтыйскіх, не склалася досыць выражанага нацыянальнага аблічча, якое часта прынята звязваць з сваёй роднай мовай. Тут няма патрэбы заглыбляцца ў прычыны гэтай з'явы. Будзем выходзіць з таго, што ёсць. Будзем грунтавацца толькі на рэальным стане рэчаў.

1. Перадусім адзначым наступнае. Відавочным стаў факт: *беларуская мова не можа быць асновай для беларускай нацыянальнай ідэі.* Нацыю давядзецца ствараць на іншых каштоўнасцях. Мова "прыйдзе" пазней, і яна *няўхільна прыйдзе*, але ўжо пасля таго

як у грамадстве складзецца “сведамы” беларус. Гэты сведамы беларус САМ захоча гаварыць на роднай мове. Дарэчы, мноства, калі не большасць, сведамых беларускамоўных грамадзян загаварылі па-беларуску ў сталым ці досыць дарослым веку – менавіта праз усведамленне сябе беларусам, адзінкай адметнай грамадзянскай супольнасці асобага этнасу.

Якія ж фактары трэба вылучыць, каб канструяванне беларускай нацыі і, адапаведна, беларускага нацыяналізму стала рэальнасцю? І які механізм можна ўзяць за аснову?

Гісторыя ведае розныя варыянты станаўлення нацыяналізму. Прыкладам, германскі нацыяналізм заснаваны на моўным аб’яднанні людзей. У свой час менавіта нямецкая мова аб’яднала мноства разнародных нямецкіх земляў, якія мелі адзін супольны аб’ект – адзіную мову. *Аднак для беларусаў, з прычынаў, памянёных вышэй, гэты варыянт, на жаль, малаймаверны.*

2. Не падыдзе для беларусаў і рэлігійная мадэль яднання нацыі. Ведама, што паляк асацыюецца з каталіцызмам, расіец – з праваслаўем. Англіканская царква стала царквой англічанаў – іх і толькі іх рэлігіяй. Менавіта гэтая акалічнасць стала вырочным чыннікам у пераўтварэнні ангельскага этнасу ў англійскую нацыю, што адбылося яшчэ ў XV–XVI стст.

У Беларусі назіраецца вельмі стракатая палітра рэлігійных канфесіяў, і на шляху шуканняў адзінай нацыянальнай веры для “сярэдняга” беларуса нас чакае крах. Таму гэтую галіну трэба аднесці да найінтымнейшых бакоў ментальнасці беларуса ці жыхара Беларусі, і можа, гэта і добра.

3. Гістарычныя міфы вельмі важныя для беларусаў. Але яны “дойдуць” да народа толькі на другім этапе. Рэч у тым, што за гады атэістычнага, сатанінскага бальшавізму ў беларусаў склаўся менталітэт занядбанага народа, накшталт крылатага: “Мы не людзі – мы палешукі”. Свайго славутага гістарычнага мінулага яны не ведаюць, а калі нехта і даводзіць

да іх сапраўдныя гістарычныя факты, то яны іх проста не ўспрымаюць: “Можа, яно і так, але ж...”.

*Група ТАК.*

1. Больш прымальная для беларусаў французская мадэль нацыяналізму – *канструяванне нацыі вакол ідэі дзяржаўнасці*. Сапраўды – суіснаванне жыхароў Беларусі, усяго беларускага грамадства на кампактнай тэрыторыі з даволі нядрэннымі прыроднымі ўмовамі, з выдатным геапалітычным станам, з высокім інтэлектуальнам і навукова-тэхнічным патэнцыялам – гэта амаль ідэальная мадэль для развітай сучаснай дзяржавы еўрапейскага кшталту. Гэта даўно ўжо зразумелі беларускія прадпрымальнікі, якія адны з першых будуць бараніць наш суверэнітэт. Мадэль Беларусі як нейтральнай незалежнай дзяржавы, што ляжыць паміж зонай дзяржаў НАТА і Расійскай Федэрацыяй, – цяпер вельмі рэальны варыянт. Нашая вонкавая палітыка павінна будавацца на ўсталяванні блізкіх кантактаў, эканамічных і інвестыцыйных дачыненняў з краінамі Заходняй Еўропы і, зразумела, ЗША – з аднаго боку, і сяброўскіх адносін з Расіяй на аснове раўнапраўных партнёрскіх сувязяў – з другога боку.

2. Некалькі заданняў трэба развязаць насамперш. Трэба выпрацаваць некалькі неадкладных дамоў, правілаў, якімі мы будзем карыстацца ў працы.

Перадусім гэта датычыць унармавання граматыкі беларускай мовы. У дадзены момант існуе некалькі варыянтаў граматакі, сярод якіх вылучаюцца тры галоўныя: тарашкевіца, наркамаўка і нейкі сярэдні варыянт (называны “дзеясловіца”, – ён выкарыстоўваецца ў часопісе “Дзеяслоў”). Такі стан рэчаў вядзе да блытаніны, непаразуменняў, урэшце, да непісьменнасці.

Яшчэ на пачатку 1990-х гг. вялася дыскусія наконт правядзення навуковай канферэнцыі аб беларускім правапісе і выпрацоўванні адзіных нормаў беларускай граматыкі. Але гэта не было зроблена. І не трэба чакаць ад Акадэміі навук крокаў у гэтым кірунку. Такую канферэнцыю можна правесці праз Інтэрнэт.

Інтэрнэт і тэлекамунікацыі даюць неабмежаваныя мажлівасці шырокага разгортвання працы на станаўленне беларускай нацыі і нацыяналізму. І калі пачнецца паспяховае напаўненне зместам азначанай намі “групы ТАК”, яна няўхільна пацягне і першую “групу НЕ”, якая, безумоўна, стане кампанентам ТАК беларускай нацыі.

3. Адна з найгалоўнейшых памылак БНФ – гэта непрадуманая рэлігійная палітыка. І нават не палітыка, а стаўленне да таго, што праз больш як семдзесят гадоў руйнавалася камуна-бальшавікамі – рэлігійных пачуццяў, дачыненняў нашых грамадзян з Богам.

Прытачу прыклад з недалёкага мінулага. 30 кастрычніка 1988 г. аргкамітэт БНФ пад кіраўніцтвам каталіка Зянона Пазняка пастанавіў публічна адзначыць дзень успамінння продкаў, які ў каталікаў адзначаюць 2 лістапада і які носіць назву “Дзяды”. На той час я, як многія іншыя, узяў удзел у “Дзядах”, мяркуючы, што бяру ўдзел у акцыі на адраджэнне народных традыцыяў, што мы ўрэшце пачынаем святкаваць сапраўдныя народныя святы і, зразумела, пачынаем масавы пратэст камуністычнай сістэме. Але апошняе толькі і было сапраўды дзейсным. Праз тры гады камуністычная партыя была распушчаная. А вось з рэлігіяй атрымалася інакш. Высветлілася, што большасць беларусаў – праваслаўныя. І ні пра якія “Дзяды” ні яны, ні іх дзяды і бабкі і блізка не ведаюць. Адно што сапраўды ўвосень у апошнюю суботу кастрычніка святкуецца гэтак званая “бацькоўская субота”, нейкі аналаг каталіцкіх “Дзядоў”. Але такіх субот у праваслаўных пяць за год. А найбольш успамінаюць продкаў на Радуніцу, што ў другі аўторак пасля Пасхі.

Вось з тых часоў і пачаліся непаразуменні БНФ з праваслаўнай большасцю Беларусі. Даволі хутка ў асяроддзі вернікаў склаўся адмоўны імідж Фронту. А выступы Зянона супраць Расіі (Расійскай акупацыі) яшчэ больш адапхнулі тысячы вернікаў ад БНФ, бо менталітэт іх быў непарыўна інтэграваны ў рус-

кую культуру і праваслаўную рэлігію менавіта Маскоўскага гатунка.

4. Ідэя дзяржаўнасці яшчэ *не самадастатковая* для канструявання беларускай нацыі. Яна толькі ўмова станаўлення, прагрэсу нацыі. *Саму нацыю трэба перадусім стварыць*. І *гэты механізм* трэба, відаць, *пачынаць з нуля*. Такі варыянт нацыяналізму ведамы як фінскі. Фінскую нацыю стварылі нацыянальныя ідэолагі ў канцы XIX ст. праз стварэнне фінскага міфа, які, сваім парадкам, праз адукацыю і асвету быў прынесены ў народ, і які паклаў пачатак нацыі.

На нашу думку, беларускую нацыю можна ствараць таксама з нуля. Але не рамантызаваць нацыю праз нейкага нацыянальнага генія, а ствараць яе праз шыранне легенды аб практычнасці нацыянальнага існавання, выгодах быць беларусам, наагул прыярытэтнасці беларускай ідэнтычнасці ў Беларусі што да іншых этнасаў, у прыватнасці, рускага.

*Пачатак XXI ст. заспеў беларусаў можа ў найспрыяльнейшы момант для стварэння сваёй ідэнтычнасці, стварэння сваёй нацыі і нацыяналізму.*

Канец XVIII–XIX стст. звязаны з пачаткам індустрыяльнай рэвалюцыі, якая прывяла да пераўтварэння многіх этнасаў у нацыі-дзяржавы. Гэты працэс працягваецца і цяпер. Але ў дадзены гістарычны момант сусветная гісторыя ўвайшла ў новую паласу, новую адметную эпоху, якая спачатку і не была заўважаная.

Гэтая эпоха носіць назву інфармацыйнай рэвалюцыі і пачалася зусім нядаўна – з пачатку 90-х гг. XX ст. Так, тады, калі ў нас пачыналася нацыянальнае адраджэнне і станаўленне кволай беларускай дзяржаўнасці, у свеце разгарэлася інфармацыйная рэвалюцыя, якая рэзка мяняе дачыненні паміж людзьмі, мяняе менталітэт людзей і шмат што іншае. Дзякуючы сусветнай кампутарнай сетцы ўся земная куля імгненна пераўтварылася ў адзіную сістэму, законы якой розняцца ад ранейшых і вынікаюць з агульнай тэорыі

сістэм. Цяперашнюю эпоху звязваюць з працэсамі глабалізацыі, сусветная супольнасць дзяржаў нават атрымала назву "сеткавыя грамадствы", што пераводзіць нашае існаванне ў свеце на якасна новы ровень.

Разам з развіццём філасофіі глабалізацыі не меньшы размах атрымаў і іншы працэс – адваротны. Існасць яго ў тым, што як ніколі ў людзей з'явілася імкненне да шукання тоеснасці. "Самасць", сваё "Я" набывае цяпер першаступеннае значэнне. І сусветная кампутарная сетка, Інтэрнэт – найлепшы сродак да здзяйснення беларускай ідэнтычнасці на справе. Тое, што рабілі некалі фіны "ўручную", пачынаючы сваю нацыю "з нуля" – хадзілі ў народ, вялі праз маладзенькіх настаўніц адукацыю сяла, і праз многія іншыя акцыі, цяпер можна ажыццявіць зусім іншым спосабам, практычна не выходзячы з дому. Усе гэтыя заданні паспяхова выканае Інтэрнэт. Больш за тое, да адраджэння беларускай нацыі можа спрычыніцца амаль кожны. Кампутарызацыя, тэлекамунікацыі прасочваюцца зараз у кожны дом, у кожны горад, а неўзабаве прыйдуць і ў кожную вёску.

*І ўсё гэта дае нам выдатны шанец стварэння сваёй нацыі. Але каб гэты працэс не пайшоў "самацёкам", яго трэба цэнтралізаваць, распрацаваць шэраг заданняў і праектаў, што будуць працаваць на стварэнне беларускай нацыі праз глабальную інтэрнэтаўскую сетку, іншыя кампаненты інфармацыйнай эпохі.*

### 4. Сфармуляванне беларускай нацыі і беларускага нацыяналізму ў святле постмадэрнізму

Нацыянальная дзяржава заўсёды мае адну вызначальную рысу – яна імкнецца падтрымаць нацыянальныя пачуцці сваіх сяброў – грамадзян краіны. Адчуванне сваіх старажытных каранёў, прымардыяльнасці – важнае пачуццё, на падставе якога фармуецца нацыяналізм. Вялікае значэнне ў падтрыманні гэтага патрэбнага для кожнага чалавека пачуцця мае дзяржава. Гірц, прыкладам, прыходзіць

да першаснасці дзяржавы ў “фактычным сілкаванні вераў і пачуцця прымардыяльнасці.”

Але сказанае не датычыць Беларусі. Беларускі шлях, відаць, найунікальнейшы і вымагае асобнага вывучэння. Гэта звязана з тым, што ў Беларусі на найвышэйшым роўні праводзіцца лінія на знішчэнне нацыянальнай памяці, дэвальвацыі нацыянальнай культуры, замены яе масавай, антынацыянальнай культурай.

Ідэя слабасці беларускай нацыянальнай ідэі і адпаведна слабасці беларускай нацыі як гістарычнага ўтварэння (і гэта ў народа з амаль што тысячагадовай гісторыяй!) даводзіцца на дзяржаўным роўні. Дайшло да таго, што ў беларусаў з’явілася суперновая гісторыя, згодна з якой сваю незалежнасць і разам сваю самастойнасць, ідэнтычнасць, беларусы атрымалі не з часоў незалежнага Полацкага княства (X ст.), не ў часы беларускай дзяржавы ВКЛ, не ў 1918 г., калі была абвешчана БНР, і нават не тады, калі быў абвешчаны суверэнітэт Беларусі Вярхоўным Саветам у 1991 г., а ў 1944 г. пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

З вялікага рахунку, апошні час у Беларусі, фактычна, ідзе моцны працэс утварэння новай нацыі, дзякуючы курсу, узятаму прэзідэнтам Беларусі А. Р. Лукашэнкам. Гэты курс у светлую будучыню тэарэтычна падмацаваны гэтак званай “ідэалогіяй беларускай дзяржавы”. Цікава, што гэты новы вобраз Беларусі не мае ні гістарычных перадумоў, ні культурных, ні тым больш нейкіх тэарэтычна-інтэлектуальных падстаў. Усё было заменена ідэалогіяй сытага страўніка, рускамоўнага сурагату мовы для памеркавання паміж людзьмі, ды славутых лозунгаў накшталт “стабільнасці”.

Нездарма галоўная апора прэзідэнта – пенсіянеры, бедныя і занядбаныя страты грамадства – далёка не найадукаванейшыя людзі. Нездарма ўсе крымінальныя элементы так заўзімаюцца за “Бацьку”. І, наадварот, творчыя, адукаваныя і таленавітыя

людзі – гэта найнепрыемнейшыя і непажаданыя персоны. Найяскравейшы прыклад: ігнараванне на дзяржаўным роўні нацыянальнай трагедыі – смерці эпахальных пісьменнікаў Васіля Быкава і Янкі Брыля.

І на аснове гэтых новых "творчых прынцыпаў" будуецца новая беларуская нацыя і ідэалогія беларускай дзяржавы па ўсім спектры нашага жыцця.

Прымардыяльныя каштоўнасці для беларускага грамадзяніна набываюць усё меншы сэнс, а часам робяцца адмоўнымі.

Э. Сміт пісаў: "Часта выходзіць, што інструментальныя і сацыяльныя канструкцыянісцкія мадэлі, якія ствараліся для тлумачэння "палітыкі ідэнтычнасці" і грамадзянскага нацыяналізму ў заможных, стабільных краінах Захаду, не падыходзяць для ацэньвання таго, што Лайокл Білінг назваў "гарачымі" нацыяналізмамі Усходняй Еўропы былога Савецкага Саюза, Азіі і Афрыкі".

З нашага гледзішча канструяванне культурнай прымардыяльнасці для беларусаў мае большае значэнне, чым для многіх іншых нацыяў. Для Расіі гэтае пытанне не стаіць – з дзяцінства рускі чалавек выхоўваецца ў рэчышчы рускай культуры. Сярэдні ж беларус выхоўваецца ў рэчышчы не сваёй беларускай культуры, а культуры іншай дзяржавы – рускай. Далей – болей. З дзяцінства яму – гэтаму сярэдняму беларусу – убіваюць у галаву, што ён хоць і не зусім рускі, але таксама належыць да культуры высокай – нават самай багатай ў прыраўнанні з культурамі іншых нацыяў.

Беларус адразу пастаўлены ў сітуацыю прыраўнання сваёй культуры і Расійскай культуры, і апошняя адназначна мае вялікую перавагу – прынамсі, так выяўлена гэтая дылема: у рускіх Пушкін, Талстой і г. д., а ў беларусаў такога рангу людзей, маўляў, няма. А гэтую ж дылему можна падаць зусім інакш. Больш за тое, у рускіх няма вялікага пісьменніка Васіля Быкава, няма выдатнага майстра гістарычнага рамана Уладзіміра Караткевіча, няма геніі-

яльнага майстры апавядання Міхася Стральцова... І гэта толькі за нейкіх сто гадоў існавання новай беларускай культуры, што пачалася пасля з'яўлення літаратурнай беларускай мовы Янкі Купалы і Якуба Коласа. Дык у якой літаратуры перспектыў больш?

Тую тэндэнцыйную гісторыю, якую распачала яшчэ цэлая плеяда царскіх расійскіх гісторыкаў, а потым паспяхова "развілі" савецкія гісторыкі на чале з беларускім "навукоўцам" Л. Абэцэдарскім, паспяхова завяршаюць цяперашнія "ідэолагі". І цяпер выходзіць, што беларускай нацыі, і нават народнасці, не было амаль да нашых часоў, і толькі дзякуючы нашаму ўсенароднаабранаму прэзідэнту і перамозе ў Айчыннай вайне яна ўтварылася і з кожным годам квітнее ўсё больш.

Фактычна, у Беларусі ўтварылася сітуацыя, якая не мае аналагаў у сусветнай гісторыі.

Ужо 10 гадоў (пасля славутага рэферэндума і дзяржаўнага перавароту, у выніку якога, відавочна, пажыццёва быў абраны Аляксандр Лукашэнка) у нашай краіне ідзе паралельнае кшталтаванне дзвюх культур – адной на базе рускай мовы, другой – на базе беларускай, і падобна да таго, што адпаведна ідзе паралельнае канструяванне двух нацыяў, прычым на аснове аднаго і таго ж беларускага этнасу з некаторымі дадаткамі іншых этнасаў.

**Культура новага часу (*культура-2*).** Пачатак яе датуецца 1996-м годам – годам трыумфальнага ўваходжання ў палітыку прэзідэнта А. Г. Лукашэнкі, мае афіцыйную дзяржаўную ідэалогію, якая можа быць прынятая за аснову нацыянальнай. Каб адрозніць яе ад традыцыйнай культуры і традыцыйнага нацыяналізму, узнікае патрэба ўвядзення новага тэрміна і для азначэння гэтай новай нацыянальнай ідэі. Зрэшты, пакінем тую працу прыхільнікам *культуры-2*. Была ж "савецкая беларуская нацыя", нешта такое можа быць і ў гэтым выпадку. Успомню, прыкладам, што ў апошні час нават з'явіўся тэрмін "лукашэнкаўскі нацыяналізм".

Частка грамадства, якая прымае гэтую ідэалогію, добра арганізаваная, і цалкам рэальна, што яна можаператварыцца ў асобную нацыю, адной з галоўных рысаў якой ёсць ***расійская мова***, а дакладней, трасянка на грунце расійскай мовы, бо ёй уласціва беларускае вымаўленне, і з паходжання гэтыя людзі – беларусы, перадусім выхадцы з сяла.

***У гістарыяграфіі*** гэтай беларускай *нацыі-2* (я пакіну за традыцыйнымі беларусамі тэрмін проста "беларуская нацыя") пануе ідэя "старэйшага брата", савецкая сімволіка, мастацкая літаратура для іх існуе толькі расійская, з выняткам, можа, беларускіх класікаў Купалы і Коласа, хоць большасць памянёнага электарату і іх наўрад ці чытала. А калі тыя і былі прачытаная, прыкладам, у школе, то ў перакладзе на расійскую мову. Быкаў і Караткевіч для гэтай нацыі-2 забароненыя пісьменнікі-нацыяналісты.

***Музыка*** нацыі-2 – расійская папса, іншая субкультура. Яны добра арыентуюцца ў расійскай музычнай прасторы і ведаюць нават біяграфіі расійскіх спевакоў.

***Рэлігія*** – перадусім яны не вераць у Бога, атэісты. Для іх таксама характэрна захапленне рознымі ўсходнімі рэлігіямі, гадалкамі і экстрасенсамі. Традыцыі яны шануюць даволі актыўна. Прыкладам, на Радуніцу схадзіць на могілкі і напіцца там гарэлкі для іх вельмі важны рытуал.

Носьбіты гэтай *нацыянальнай ідэі-2* – электарат Лукашэнкі: сяляне, пенсіянеры, людзі пераважна малаадукаваныя, кар'ерысты і наагул – "саўкі".

Гэты электарат ці нацыянальная супольнасць, якая будзе вызнаваць усе памянёныя каштоўнасці, імаверна, не адмовіцца ад назвы "беларуская нацыя" (у нашым разглядзе – "нацыя-2"). І яны будуць носьбітамі іміджа, які цяпер маюць: "*беларусы – гэта такая нацыя, што, маючы сваю мову, не карыстаецца ёй, якая не мае сваёй гісторыі і сімволікі і якая імкнецца зліцца з Расіяй*".

**Культура традыцыйная** (будзем яе абазначаць як "*культура-1*", ці як беларуская Культура – з вялікай

літары). Існуе перадусім сярод апанентаў рэжыму Лукашэнкі. Пашырана перадусім сярод інтэлігенцыі, нацыянальных элітаў. Мае недзяржаўную прэсу, замежнае радыё (“Свабода”, “Радыё Рацыя”), не мае сваёй тэлевізіі, за выняткам нядаўна адкрытага на тэрыторыі Польшчы беларускамоўнага канала “Belsat”.

Брак сродкаў масавай інфармацыі ў *культуры-1* кампенсуецца вялікай разнастайнасцю інтэрнэт-сайтаў, дзе, фактычна, і ідзе працэс развіцця гэтай культуры. Пасля рэформы і прыняцця адзінага правапісу і граматыкі літаратурнай беларускай мовы можа быць цалкам сфармулявана ідэя носьбітаў гэтай нацыі. Немажлівасць атрымання беларускамоўнай адукацыі можа быць таксама кампенсавана з дапамогай сродкаў Інтэрнэта. У гэтай групы людзей вялікая перавага ў гістарычных каранях. Прымардыяльная культура гэтых людзей грунтуецца на гісторыі, напісанай Міколам Ермаловічам, Генадзем Сагановічам, Анатолем Грыцкевічам, іншымі гісторыкамі. Літаратура гэтай культуры вельмі багатая і сягая часоў “Слова аб палку Ігаравым”, развівалася Ф. Скарынам і С. Будным, атрымала нацыянальную афарбоўку праз Ф. Багушэвіча, М. Багдановіча і Янку Купалу і дасягнула свайго росквіту ў XX ст. Музыка *культуры-1* багатая і разнастайная – ад класічнай (М. Равенскі, М. Куліковіч, М. Забэйда-Суміцкі) да беларускага року (“NRM”, “Крама”, “Bonda”, “Новае неба”...) і самабытных фальклорных гуртоў “Ліцвіны”, “Неруш”, “Свята”, “Крупіцкія музыкі”, “Тутэйшая шляхта” і г. д.).

Людзі, якія вызнаюць беларускую Культуру, да гэтай пары не ўсведамляюць сябе як нешта іншае ад *культуры-2*. Аднак з цягам часу розніца паміж імі будзе станавіцца ўсё глыбейшай. Таму можна і нават трэба, увесці асобную назву для гэтай нацыі. Калі пакінуць за *нацыяй-2* назву “беларуская” (трэба разумець і тое, што многія з носьбітаў гэтай псеўданацыі шчыра лічаць сябе беларусамі), то, можа, і настаў момант увесці асобную назву заміж старой, і ў пэўным сэнсе “заплямленай” назвы – “беларусы”? У якасці варыянта можа быць: “вялікалітоўская” ці

“ліцвінская” нацыя. У гэтых варыянтах адсочваецца пераемнасць з назвай насельніцтва ВКЛ.

Прыняццё новай назвы нацыянальнасці дасць, сваім парадкам, моцны штуршок у выхаванні сведамасці грамадзян. І з другога боку, гэты крок будзе моцным ударам па сучаснай манаполіі літоўцаў у гісторыі і ўтаесамленне іх з насельніцтвам ВКЛ, якое, як ведама (ведама нам, беларусам, а не сучасным літоўцам), было ў сваёй большасці не літоўскім, а на 5/6 – беларускім, ці, у нашым варыянце, вялікалітоўскім (ліцвінскім). Сучасныя літоўцы ў гэтым разе могуць прэтэндаваць прыкладна толькі на тую 1/6 частку тэрыторыі ВКЛ, дзе жылі жмудзь і аукштайты.

Зразумела, выкладзены праект выглядае фантастычна, але як варыянт мае права на існаванне. Чаму б і не?

### *Мадэрнісцкі і постмадэрнісцікі падыход да фармавання беларускай нацыі*

Трэба адзначыць, што ў цяперашні час вельмі цяжка даць адназначнае фармуляванне нацыянальнай ідэнтычнасці тых людзей, якія лічаць сябе беларусамі. Стракаты набор і культурніцкіх прыкметаў, і палітычных, і гістарычных не даюць мажлівасці даць сціслае азначэнне беларускай нацыі. Але ж рэаліі вымагаюць лічыцца з яшчэ нядаўным фактам запісу ў пашпарце – “беларус”, і што яшчэ больш важкае – усвядамленнем вялікай колькасці (каля 10 млн.) людзей у Беларусі і за яе межамі сваёй нацыянальнасці як беларускай.

Пры разглядзе гэтага пытання шмат якія аўтары звяртаюцца да нядаўных найменняў беларусаў – “ліцвіны”, “русіны”, “тутэйшыя” і нават зусім няведамым самому народу назовам “крывічы”. А чаму і не дадаць для паўнаты і назву К. Каліноўскага – “дзецюкі”?

І пачынаецца, на мой пагляд, марная дыскусія аб сапраўдным назове беларусаў. У артыкуле з красамоўнай назвай “Харызма тутэйшасці” А. Насута, прыкладам, аналізуючы ланцужок: “ліцвін – тутэй-

шы – беларус” вылучае “тутэйшасць” як больш “беларускую” (“харызма тутэйшасці”). Існуюць і адзнакі такога кшталту: *«У “тутэйшым”, выходзячы з дадзенага гарызонту досьведу, “памёр” ужо ліцвін, але яшчэ “не нарадзіўся” “беларус”»* (В. Булгакаў).

Насамрэч, усе гэтыя развагі пра найбольш беларускую назву беларусаў не маюць цяпер аніякага сэнсу. Усе памянёныя назвы беларусаў адносяцца да гісторыі і не больш за тое. Да саміх беларусаў яны не маюць ніякага дачынення. Прыводзіцца, прыкладам, цытата Яўхіма Карскага што да назвы “беларус”:

*У наш час просты люд у Беларусі не ведае гэтага назову. На пытанне: хто ты? Просты чалавек адказвае – рускі, а калі ён каталік, то называе сябе каталіком, або палякам; часам сваю радзіму называе Літвой, а то і проста скажа, што ён “тутэйшы” (tutejszy) – мясцовы, канечне процістаўляючы сябе таму, хто гаворыць па-вялікаруску як прыхадню ў заходнім краі.*

Усё гэта так – на пачатку XX ст. так яно і было, назвы “беларус” амаль не існавала. Дарэчы, і цяпер да каталікоў-беларусаў сярод “простага люду” стаўленне тое самае: “каталік”, значыцца, паляк, ці “пшэк”. Аўтар сам не раз назіраў пры размовах такія выказванні ў асяродку жыхароў аднаго з мінскіх мікрараёнаў.

Аднак за мінулыя сто гадоў назва “беларус” прыжылася і стала назвай нацыі вялікай колькасці людзей, якія ўжо ніяк не назавуць сябе “тутэйшымі” і тым больш “ліцвінамі”. Нідзе. Нават у Палессі, дзе ўсе ж існуе назва “паляшук”, але не як прыкмета нацыянальнасці, а як адзнака жыхара Палескага краю. Палешукі, нават і заходнія, з іх адметнай паляшуцкай гаворкай, адносяць сябе да нацыі – беларускай. Цікава, што амаль тыя самыя палешукі, якія гавораць на той самай гаворцы, але жывуць праз мяжу – у суседняй краіне, вызнаюць сябе ўкраінцамі. Нічога дзіўнага тут няма. Спрацоўвае ўжо палітычны чыннік. Ідэнтыфікацыя паводле палітычнай прыкметы – грамадзянства

(у дадзеным разе ўкраінскага) і яна выходзіць мацнейшая, чым этнічны, дакладней, моўны чыннік.

Аднак "тутэйшыя" як саманазва пэўнай катэгорыі людзей усе ж ёсць і ў наш час. Але не ў Беларусі. У частцы Літвы, якую мы прывыклі называць як Віленскі край, мясцовыя жыхары завуцца "тутэйшыя". Яны гавораць на цудоўным дыялекце беларускай мовы, пішуцца палякамі для афіцыйнай справаздачы і – што цікава – зусім не лічаць сябе беларусамі, а сваю мову беларускай. Шукаючы сваёй "нацыянальнасці" яны вызнаюць сябе, прыкладам, "гудамі". Чаму так выходзіць? Ды таму, што беларускі патрыятызм далёкі ад гэтых людзей, як і ад саміх беларусаў у Беларусі. Яны – жыхары Віленскага краю, іншай краіны і нічога не ведаюць аб сваіх беларускіх каранях. І, другое: дыялект – гэта зусім не тое самае, што літаратурная мова і ў самой Беларусі. Дадаць да гэтага дыялекту замік кірылічнага алфавіту лацінку, дадаць крыху польскіх слоў і – мы атрымаем "новую мову", якую можна назваць, прыкладам, гудзінскай.

Дарэчы, на пачатку 1990-х гг. на Палессі на базе заходнепалескага дыялекту таксама ішоў актыўны працэс ўтварэння новай нацыі, якую яе творцы (найбольш ведамы – М. Шэляговіч) назвалі "яцьвяжскай (этвязь)". Аднак гэты праект пацярпеў поўную паразу, бо як высветлілася, апрача моўнага выразніка ён не меў больш адметных рысаў і нейкіх новых рыс нацыі, адрознай ад беларускай ці ўкраінскай.

Менавіта на гэтых прыкладах можна пераканацца ў дзейнасці мадэрнісцкага прынцыпа пабудовы нацыі, сфармуляванага яшчэ Эрнэстам Рэнанам і ўсебакова развітага пазней Энтані Смітам.

## 5. Пра талерантнасць і менталітэт беларусаў[1]

...Апошнім часам стала вельмі модным разважаць аб гэтак званай талерантнасці беларусаў. На мой

[1] Прыточаны ніжэй артыкул быў напісаны яшчэ ў 1994 годзе і надрукаваны ў часопісе "Маладосць" (№ 9, 1994) пад

пагляд, талерантнасць, або проста цярпімасць, многім уяўляецца як нейкая адметная нацыянальная рыса беларусаў, як адна з найлепшых рысаў беларускага характару. Гэта, прыкладам, не раз падкрэсліваў у сваіх артыкулах прафесар Юры Хадыка. А 25–26 чэрвеня 1993 г. у канферэнцзале Мінскага гатэля "Юбілейны" нават прайшла міжнародная канферэнцыя "Талерантнасць і грамадскія адносіны".

На канферэнцыі, якая сабрала навукоўцаў з Чэхіі, Польшчы, Украіны, Прыбалтыкі, Беларусі, Венгрыі і іншых краін, высвятляліся розныя аспекты талерантнасці. Памятаецца, да чаго толькі "не чаплялі" гэтую славутую, скажам так, талерантнасць вучоныя мужы! Сярод тэм, якія абмяркоўваліся на каферэнцыі, былі: "Талерантнасць у працэсе захавання стабільнасці ў дэмакратычных грамадствах", "Роля адукацыйных і культурных інстытутаў у забеспячэнні талерантнасці", "Параўнанне ўнутранага і міжнароднага заканадаўства ў сферы талерантнасці" і гэтак далей.

Ведама, што не абышла талерантнасць і беларускую тэму. На канферэнцыі з адпаведнымі дакладамі выступілі ведамыя беларускія навукоўцы С. Падокшын, У. Конан, А. Мальдзіс, іншыя. Вось назвы некаторых дакладаў: "Традыцыі беларускай талерантнасці", "Сіла ці слабасць? Талерантнасць і фармаванне беларускай нацыянальнай сведамасці" і г. д.

Праслухаўшы названыя і іншыя даклады, прааналізаваўшы як іх змест, так і наагул усю гісторыю пытання, асабіста я нечакана прыйшоў да высновы, што ўвесь спектр гэтай тэматыкі, у існасці, не што іншае, як псеўданавуковасць, што шэраг цверджанняў аб спрадвечнай талерантнасці беларусаў не мае пад сабой аніякай падставы. Наагул, я б сказаў, што ўзнікненне пагляду аб талерантнасці беларусаў як нейкай асаблівай нацыянальнай рысе ёсць стварэннем чарговага міфа аб беларусах. Такіх міфаў было шмат у нашай гісторыі.

---

назвай "*Талерантнасці беларусаў: міф ці рэальнасць*". Але за мінулы час ён не страціў актуальнасці, здаецца, Беларусь застыла, нечага чакае... Таму паслухаем подых 1990-х гг.

У звязку з гэтым мушу нагадаць некаторыя гістарычныя факты, аналізуючы якія, можна ўбачыць, як у гісторыі нашага народа з даўных часоў мацаваліся міфы. Часам гэтыя міфы разрасталіся да такіх маштабаў, што за імі ўжо не відаць было праўды. Відавочна, адказнасць за скажэнне гістарычнай праўды кладзецца на навукоўцаў-гісторыкаў.

Трэба шчыра прызнаць: канцэпцыя гісторыі беларускага народа, якую мы атрымалі ў спадчыну ад расійскіх і бальшавіцкіх гісторыкаў, адметная тым, што яна наскрозь прасякнутая лжывасцю і суб'ектывісцкай інтэрпрэтацыяй гістарычных фактаў. Як ведама, найбольш спрыяльным грунтам для нараджэння міфаў гісторыі была эпоха панавання камуністычнай ідэалогіі. Тут варта хоць бы нагадаць цяпер сумна ведамую "абэцэдаршчыну" – калі гісторыя Беларусі пісалася фактычна на заказ ЦК КПСС.

Трэба прызнаць, выкрыццё міфаў беларускай гісторыі толькі пачынаецца. Нагадаю, што нядаўна, дзякуючы грунтоўным працам Міколы Ермаловіча, быў перагледжаны даўны міф пра тое, як літоўцы нібы заваёўвалі старажытную Беларусь і потым шмат гадоў панавалі на нашых землях.

Другі міф, якога да сённяшняга часу пільнуецца пэўнае кола людзей, – гэта міф, быццам унія – нацыянальная рэлігія беларусаў.

Агульнаведама, што яшчэ ў XVI ст. у выніку дзеянняў пэўных палітычных колаў у Вялікім княстве Літоўскім большая частка насельніцтва праваслаўнага веравызнання была прымусова пераведзена ў адмену каталіцызму пад назввай "грэцка-каталіцкая вера", ці проста – унія.

Цяпер шмат хто гэты факт спрабуе падаць як спраўджанне векавой мары беларусаў пра стварэнне сваёй нацыянальнай рэлігіі. Гэта, на мой пагляд, не зусім так. (Ніжэй, у сёмым раздзеле кнігі, мы падрабязна спынімся на уніяцкім міфе).

Трэці міф, пра які хочацца нагадаць – гэта міф аб талерантнасці беларусаў. Узнікненне яго шчыльна

звязана з агульнай міфалагізацыяй нашай гісторыі, а як гэта рабілася, давайце паразважаем.

Як ведама, існуюць тры галоўныя крыніцы стварэння міфаў беларускай гісторыі. Першая – гэта шавіністычная гісторыя Беларусі, за якую цалкам адказныя расійскія гісторыкі XIX–XX стст., пачынаючы ад Н. Карамзіна, С. Салаўёва і сканчаючы ведамым творцам літоўскага міфа В. Пашутам. Гэтыя гісторыкі "стварылі" канцэпцыю гэтак званых вызваленчых войнаў Івана Грознага, яны падалі вялікім героем А. Суворава (можа, за тое, што ён задушыў паўстанне Т. Касцюшкі, сапраўднага беларускага патрыёта!).

Факт анексіі Расіяй беларускіх земляў у канцы XVIII ст. гэтыя гісторыкі назвалі здзяйсненнем векавых імкненняў беларускага народа "воссоединиться с братским русским народом". Насамрэч жа Беларусь трапіла ў каланіяльнае ярмо Расіі.

Такім парадкам, была створана цэльная лжэгісторыя, у праўдзівасці якой нас упарта пераконвалі яшчэ з школьных гадоў. Выйшла, што Расія нас выратавала ад панавання палякаў, а бальшавіцкая рэвалюцыя 1917 г. "выцягнула" цёмных беларусаў з жабрацтва і невуцтва.

У мяне захавалася кніга "Фарміраванне і развіццё беларускай сацыялістычнай нацыі", выдадзеная ў 1958 г. Калі выходзіць з яе зместу, то выяўляецца, што вось якой нацыяй сталі беларусы дзякуючы камуністам, і ўсю гэтую, з дазволу сказаць, бязглуздзіцу мы сапраўды цярпелі. Сапраўды, у такім сэнсе беларусы – "талерантная" нацыя.

Але, без сумневу, не беларусы, не нацыя вінаватыя ў тым, што адбылося. Мы проста былі, ды і цяпер ёсць паняволенай нацыяй, як і шэраг іншых нацыяў савецкай камуністычнай імперыі. Такімі ж з волі лёсу "талерантнымі" былі і літоўцы, і грузіны, і мардва...

Другая крыніца здзеку з беларускай гісторыі – польская гістарыяграфія, якая адлюстроўвае пэўную палітычную тактыку Польшчы да Беларусі. Яна таксама ўнесла пэўны "ўклад" у стварэнне свайго,

польскага, варыянту міфа аб беларусах. Асабліва выніковым быў час пасля 20-х гг. XX ст., калі частка беларускіх зямляў апынулася пад Польшчай, а самі беларусы пасля шматгадовага суіснавання з "вялікай" Расіяй нібы забыліся аб каранях сваёй старажытнай нацыі, нібы згубілі нацыянальную свядамасць, як кажуць, сталі нейкімі "тутэйшымі".

За невялікі гістарычны перыяд на спрадвечных беларускіх землях раптам з'явіўся ледзь не мільён палякаў! А тым часам лёгка бачыць – і цяпер пра гэта шмат пішуць, што большасць гэтых палякаў – беларусы-католікі. Мы зноў сутыкаемся з дзіўнай абыякавасцю да сваёй нацыянальнасці шырокіх масаў беларусаў, з лёгкасцю да здрады свайму народу ў імя лепшага "кавалка каўбасы", які кідаў заможны польскі "брат". Гэтыя флюгерныя паводзіны беларусаў пэўны шэраг людзей выдаваў за нешта асаблівае, за нейкую адметную нацыянальную рысу, схаваную потым за навуковападобным словам – "талерантнасць". Вынікам з'явілася тое, што некаторыя пазнейшыя даследнікі, нават і не без падстаў, пісалі: "беларусы з лёгкасцю паддаваліся ўплывам рускіх, палякаў і ўкраінцаў" (W. Mondalski. Polesie. Warszawa, 1927).

Дакончваючы гістарычны агляд дачыненняў беларусаў з суседзямі, нельга абысці і Літвы. Літоўцы, гледзячы на такую шчодрую раздачу пірага гісторыі з боку беларусаў, таксама адхапілі свой кавалак, так, што выйшла: дзяржава ВКЛ – літоўская, славутыя літоўскія князі – балты, а значыць, і літоўцы з паходжання. Яны пераймалі ў расійскіх гісторыкаў і паспяхова выкарысталі ўжо памянёны міф аб заваёве Беларусі літоўцамі. Адзначу, што для кожнага жыхара цяперашняй Літвы, той міф – самая што ні ёсць гераічная гісторыя. У той час, калі нашы дзеці дагэтуль вывучаюць гісторыю ў школах і інстытутах (нават на гістфаку) паводле Абэцэдарскага – літоўскія дзеці растуць і выхоўваюцца ў нацыянальных традыцыях, яны вераць у тое, што маюць вялікую

гісторыю і ганарацца ёю. І ніхто ў Літве не паверыць, калі скажаце, што літоўская гісторыя "пазычана" ў суседняй дзяржавы – Беларусі. Гэтая гістарычная няпраўда адыгрывае вельмі адмоўную ролю для большасці беларусаў і, відавочна, зрабіла свой унёсак у тэорыю "талерантнасці" нашага народа.

Як бачым, усе тры крыніцы фармавання гісторыі беларусаў спрыялі стварэнню лжывай канцэпцыі нашага мінулага і пры маўклівай згодзе з гэтай канцэпцыяй насельніцтва Беларусі далі нагоду залічыць беларусаў да "цярплівай, талерантнай" нацыі. Прычым далей – больш: уяўленні аб талерантнасці беларусаў цяпер губляюцца ў глыбіні вякоў і быццам бы там знаходзяцца неабвержныя доказы міфічнай талерантнасці.

А ці так гэта? Паглядзім на з'яву талерантнасці больш уважліва і крытычна, чым падаецца афіцыйна.

Зазірнем у самую сівую летапісную старажытнасць. Першае: я хачу звярнуць увагу на папулярнае пытанне аб паходжанні беларусаў. Гэтае пытанне, як мы ўбачым, мае беспасярэдняе дачыненне да тэмы нашага даследу.

На маю думку, продкамі беларусаў было племя літва, якое рассялялася на вялікім абшары тэрыторыі сучаснай Горадзеншчыны і Міншчыны. Я абапіраюся на наступныя звесткі. Дакладныя межы летапіснай Літвы даволі пераканаўча вызначыў М. Ермаловіч у сваёй кнізе "Па слядах аднаго міфа". Але на яго думку, племя літва было балцкага паходжання. Паводле ж сведчання іншых, літва не балцкага і нават не угра-фінскага, як лічыў Іван Ласкоў, а славянскага паходжання. Так, чэшскі даследнік П. Шафарык сцвярджаў, што слова "літва" – скажонае слова "лютва". Славянскае ж племя велеты-люцічы добра ведама гісторыкам, і рассялялася яно таксама на тэрыторыях сучасных Горадзеншчыны і Віленшчыны.

Пазней, калі пачалося ўтварэнне Вялікага княства Літоўскага, літва асімілявалася з іншымі славянскімі плямёнамі – крывічамі і дрыгавічамі, ут-

варыўшы сучасных беларусаў. Сведчаннем таго, што люцічы-літва былі народам з мовай, блізкай да суседніх славянскіх народаў, ёсць тое, што іх мова стала дзяржаўнай мовай ВКЛ (цяпер яна завецца старабеларускай). Дык вось, нашыя продкі здолелі захаваць праз стагоддзі сваю мову, хоць і аддалі яе назву (літоўцы-ліцвіны) балцкаму племені жмудзі (у вялікай ступені праз недасведчанасць гісторыкаў, пра што гаварылася раней).

Урэшце падыходзім беспасярэдне да тэмы гаворкі – высвятлення асаблівасцяў характару нашых продкаў. Першае: адна з назваў памянёнага намі племя – *лютва* ("люты") сведчыць аб далёка не рахманых паводзінах нашых продкаў і ёсць сведчаннем даволі "тугога" нораву старажытных беларусаў. Другая назва – *вялеты* паходзіць хутчэй за ўсё ад старaславянскага слова "вялікі", што само праз сябе ёсць характарыстыкай народа.

Такім парадкам, шматлікія гістарычныя і тапанімічныя крыніцы сведчаць аб пераважанні старaславянскага, а потым і проста беларускага элемента на нашых землях. Дарэчы, бытнасць балцкай мовы і тым больш цяперашняй летувіскай мовы на тэрыторыі ВКЛ наагул не згадваецца ў летапісах ці іншых крыніцах аж да XVI ст.

Пашукаем цяпер вытокі талерантнасці ў наступным гістарычным перыядзе – у часы старажытнарускай дзяржавы. Сапраўды, Кіеўская Русь аб'ядноўвала шэраг славянскіх княстваў на вялікім абшары і на першы пагляд была цэльнай дзяржавай, дзе мірна суіснавалі Полацкае і Кіеўскае, Суздальскае і Наўгародскае, іншыя княствы. Але насамрэч гэта было не зусім так. Добра ведама, што пачынаючы ўжо з апошняй чвэрці X стагоддзя ў Полацку незалежна ад Кіева княжыў Рагвалод, і нядаўна сведамыя беларусы святкавалі тысячагоддзе сваёй дзяржаўнасці. Дзейнасць Рагвалода сведчыць аб яго таленавітасці як дзяржаўнага дзеяча і зусім не аб нейкай "талерантнасці".

Менавіта з часоў Кіеўскай Русі мы бачым з боку палачан якраз праявы неталерантнасці да чужой улады (кіеўскіх князёў), а наадварот – нецярпення і няўзгоднасці. Сапраўды, пры Рагвалодзе Полацкая зямля імкнулася не толькі да сваёй незалежнасці, а нават далучыла да сябе Тураў. І хоць пазней (у 980 г.) Рагвалод быў забіты, а Полацк на 28 гадоў трапіў пад уладу Кіева, наступныя пакаленні полацкіх князёў паказалі прыклады мужнасці і імкнення да дзяржаўнай незалежнасці. Найбольш уражвае жыццёвы шлях Усяслава Чарадзея, які княжыў 57 гадоў, пабываўшы і ў порубе – палоне кіеўскага князя Ізяслава, потым стаўшы нечакана кіеўскім князем, а ўрэшце, у канцы жыцця, у 1097 г., ён узаконіў незалежнасць Полаччыны. Захапляюць рысы нашых далёкіх продкаў – гордасць і непакора Рагнеды, нежаданне Усяслававічаў жыць у "згодзе", а насамрэч – паводле загадаў кіеўскіх князёў... І іх паводзіны, і іх характары вельмі і вельмі далёкія ад талерантнасці.

Пашукаем, скажам так, сляды талерантнасці ў часах Вялікага княства Літоўскага ці карацей – ВКЛ. Менавіта гэты час у гісторыі беларусаў некаторыя навукоўцы звязваюць з узнікненнем нашай талерантнасці.

Пачну з татар. Першае: яны хоць і рабілі свае спусташальныя набегі на Літву, але ніколі не змаглі дамагчыся ад яе залежнасці і ніколі не бралі з нас даніны, як гэта яны рабілі ў Масковіі, дзе непадзельна гаспадарылі некалькі стагоддзяў. Гэтыя факты сведчаць пра тое самае спрадвечнае імкненне нашых продкаў да незалежнасці, што ўспаміналася раней, сведчаць, што яны маглі, і мы можам, даваць адпор нашым ворагам.

Наступны перыяд – XV і XVI стст. Залатая пара нашай дзяржавы, час росквіту культуры, навукі, рамёстваў і ваеннай моцы. Успомнім, для прыкладу, перамогу аб'яднанага войска ВКЛ і Польшчы над крыжакамі ў бітве пад Грунвальдам. Паводле Кастуся Тарасава, Вялікае княства Літоўскае выставіла

40 харугваў, пераважная большасць якіх была з беларускіх гарадоў. З жмудскіх харугваў ведамыя толькі медніцкая, троцкая і ковенская. Была, дарэчы, там і татарская конніца (каля 5000 чалавек), але яна служыла ў нашых князёў.

Вынікі Грунвальдскай бітвы і многіх іншых падзей вайсковай гісторыі тых часоў сведчаць, што нашы воі былі моцныя і дужыя людзі і мелі зусім не талерантныя характары і паводзіны. Яны маглі абараніць сваю Айчыну і праз некалькі стагоддзяў станавілі наймагутнейшую дзяржаву ў Еўропе.

Нарэшце галоўны аргумент тэорыі талерантнасці, вытокі якога шукаюць у ВКЛ. Звычайна кажуць, быццам у ВКЛ суіснавала мірна шмат народаў: гэта, маўляў, і ёсць прыклад талерантнасці. Але прабачце, гісторыя мае шмат прыкладаў таго, калі аб'ядноўваліся розныя землі, розныя народы ў адну, больш моцную, дзяржаву з той ці іншай патрэбы – у гэтым разе аб'ядноўваліся розныя народы, каб лепш бараніцца ад супольнага ворага – крыжакоў ды маскоўцаў. І талерантнасць тут ні пры чым. Такіх шматнацыянальных дзяржаў было нямала – і Рымская імперыя, і Візантыйская, і іншыя ўтварэнні ад старажытнасці да нашых часоў.

Звернем таксама ўвагу і на тое, што ў Сярэднявеччы грамадства дзялілася не паводле нацыянальнай прыкметы. Галоўная лінія падзелу – веравызнанне, якое і было галоўнай характарыстыкай як асобнага чалавека, так і ўсяго грамадства. Менавіта веравызнанне мела найбеспасярэднейшы ўплыў на вонкавую і нутраную палітыку дзяржавы.

У ВКЛ да XVI ст. суіснавалі розныя хрысціянскія канфесіі – праваслаўная, каталіцкая, кальвінісцкая... Жылі ў нас мусульмане – татары, ужо трывала аселі на той час габрэі і пабудавалі сабе сінагогі.

Менавіта гэты факт суіснавання мноства рэлігійных канфесіяў у ВКЛ часцей за ўсё прыцягваецца для абгрунтавання міфа аб талерантнасці беларусаў. Але заўважце наступнае: XVI ст. – гэта эпоха Рэнесансу ў

Еўропе, гэта ўздым Рэфармацыі, перыяд ламання старых стэрэатыпаў і стварэння новых ідэяў і канцэпцыяў. І ў Беларусі, і ў Францыі і ў іншых еўрапейскіх дзяржавах тады суіснавалі розныя рэлігійныя плыні. Такое становішча шмат дзе захавалася да нашых дзён. Так, у Германіі цяпер – 48 % католікаў і 46 % пратэстантаў. Тое ж, прыкладна, у Швейцарыі, Аўстрыі.... Але ніхто не называе немцаў ці швейцарцаў "талерантным" народам. Талерантныя людзі ёсць у кожнай з названых нацыяў. І гэта, хутчэй, рыса тэмпераменту. Шматканфесійнасць у ВКЛ сведчыць не аб нейкай «прыцягнутай за вушы», талерантнасці тамтэйшых жыхароў, а аб тым, што ВКЛ было нармальнай развітай еўрапейскай дзяржавай.

Зусім іншае становішча, чым у ВКЛ, было ў Маскоўскай дзяржаве. Татары не толькі бралі даніну з раздробленых рускіх княстваў. Яны ў значнай ступені асіміляваліся з мясцовым славянскім насельніцтвам. Вынікі гэтага можна і цяпер бачыць у рысах рускіх. І не толькі ў рысах: татары ўнеслі сваю ментальнасць, свой лад жыцця, які характарызуецца, як і ў усіх усходніх краінах, жорсткай іерархіяй грамадства, неабмежаванай уладай аднаго чалавека – манарха (хана, султана і да т. п.). Спалучэнне гэтай усходняй ментальнасці з праваслаўнай рэлігіяй, адзінай рэлігійнай канфесіяй у Масковіі тых часоў, дало, у выніку, адметную ад еўрапейскага тыпу дзяржаву ўсходняга ўзору, у якой дачыненні будуюцца на прынцыпах, далёкіх ад дэмакратыі, у якой не церпяць іншадумства і ніякай іншай, апрача праваслаўя, веры.

Не так проста было, між іншым, з верацярпімасцю і ў ВКЛ. Пашырэнне уніі і кальвінізму на тэрыторыі Літвы і Белай Русі ў XVI ст. Дало, як процівагу, жыццё каталіцкаму езуіцкаму ордэну, што праславіўся сваімі чорнымі справамі, якія нават атрымалі назву "езуіцкія". Аб якой талерантнасці ў рэлігійных дачыненнях у ВКЛ можна гаварыць, калі ўвядзенне уніі ў XVI ст. ішло праз жорсткую гвалтоўную палітыку з боку католікаў і асабліва езуітаў. Існавала нават спе-

цыяльная інструкцыя езуіта, паводле якой рабіўся зварот праваслаўных у унію і каталіцызм. Як тут не нагадаць сумна ведамых з тых часоў езуіта Андрэя Баболю і арцыбіскупа Язафата Кунцэвіча, якія гвалтам уводзілі унію сярод праваслаўнага беларускага люду і за што абодва былі забіты простымі людзьмі? Кунцэвіча нават празвалі “душахватам”.

Прафесар Доўнар-Запольскі ў кнізе “Асновы дзяржаўнасці Беларусі” пісаў: “Унія аказалася пагібельнай як для Польшчы, так і Літоўскай Русі”. І нездарма XVII і XVIII стст. (эпоха уніі) прайшлі для беларусаў пад знакам усеагульнай дэградацыі, заняпаду культуры, навук і рэлігійнай, падкрэслю, нецярпімасці. Паноўная ў Рэчы Паспалітай дзяржаўная рэлігія – каталіцызм – і яе адгалінаванне на Усходніх Крэсах – грэка-каталіцызм (унія) – жорстка праследавалі праваслаўных. Жыхару Белай Русі (Літвы), які захоўваў веру продкаў – праваслаўе, жылося не лепш – нельга было разлічваць ні на добрую пасаду, ні на навучанне дзетак на роднай мове.

У гарадах уніяты не дапускалі праваслаўных да гарадскіх пасад, у вёсках сілай прымушалі святароў прымаць унію, а ў разе адмовы аддавалі цэрквы габрэям у арэнду.

Валынскі пасол Лаўрэнцій Дрэвінскі на Варшаўскім сойме ў 1620 г. гаварыў: “Ужо ў вялікіх гарадах цэрквы запячатаныя, маёнткі царкоўныя разрабаваныя, у манастырах няма манахаў – там трымаюць скаціну. Манахаў праваслаўных ловяць на дарогах, б’юць і садзяць у турму”.[1]

Трэба адзначыць, што такія традыцыі нецярпімасці да іншаверцаў былі традыцыйнымі для дзяржаў каталіцкага свету і ў тым ліку Польшчы. Уладзіслаў Серчык[2] сцвярджае, што Рэч Паспалітая была краем неталерантным, і для ўтварэння адзінай дзяржавы з ВКЛ у 1575 г. быў прыняты акт Варшаўскай

---

[1] Мартос А. Беларусь в исторической государственной и церковной жизни. Мн., 1990.

[2] Unia Brzeska. Przegląd kresowy, 1/91.

канфедэрацыі, паводле якога людзям розных веравызнанняў гарантаваліся б незалежныя вызнанні веры, адрознай ад каталіцкай. Аднак ужо праз месяц пасля прыняцця Варшаўскай канфедэрацыі яна была апратэставана прымасам Якубам Уханскім, а з духавенства яе падпісалі толькі два біскупы. Супраць талеранцыі выступіў нават ведамы палеміст у спрэчках паміж праваслаўнымі і каталікамі Пётр Скарга.

Пазней польскія ўлады спрабавалі ўлагодзіць канфесійныя пытанні. У прыватнасці, кароль Уладзіслаў IV заклікаў да згоды і прызнаў фармальна праваслаўе, хацеў нават утварыць праваслаўную патрыярхію. Але зноў-такі нічога не выйшла, бо такая акцыя была не да густу Рыму. Урэшце, адбылося паўстанне Багдана Хмяльніцкага, мэта якога ўжо не проста змаганне за правы праваслаўнага насельніцтва, а ліквідацыя уніі, што было адлюстравана ў Перэяслаўскім прашэнні 1649 г.: “Няволя, якую церпіць наш народ рускі (а на той час “рускі” – было назвай усяго ўсходне-славянскага насельніцтва Рэчы Паспалітай – беларускіх і ўкраінскіх зямель (заўвага аўтара – *А.А.*)) – горш за турэцкую праз унію, і яе трэба знесці”, і яшчэ: “Уніі каб не было, толькі рымскі і грэцкі закон”.

Такія пажаданні з цягам часу былі ўсё больш анахранічныя, і праваслаўе рабілася прарасійскім, а каталіцызм (у тым ліку і грэка-каталіцызм) рабіўся прапольскім. Апошнія гады існавання уніі прайшлі пад знакам адыходу ад усходніх абрадаў, увядзення «пальшчызны» нават у літургію. Таму нядзіўна, што некалькі мільёнаў беларусаў-уніятаў пасля 1839 г. прынялі каталіцызм і назаўсёды былі “страчаны” для беларускай нацыі.

Выходзячы з гэтага, становіцца зразумела, як недарэчна гучыць заява дэкана грэка-католікаў Беларусі П. Кузьмічова (ЛіМ N 2, 1992 г. “Пра талерантнасць беларусаў”), што “расійскія улады... забаранілі уніяцкую царкву, якая перашкаджала рабіць беларусаў талерантнымі, бо гістарычна выступала супраць прыгнёту насельніцтва”. Я мушу

сказаць, што наадварот – прыгнёт праваслаўных ішоў некалькі стагоддзяў, і ініцыятыва кладзецца толькі на грэка-католікаў (“чыстыя” каталікі рымскага абраду заўсёды выглядаюць шмат прыстойней).

Далей паважаны дэкан змешвае зноў дзве розныя рэчы: “пакуль беларусы размаўлялі па-беларуску, забараніць уніяцкую царкву было немагчыма”. Выходзіць, што беларусы кінулі ні з таго ні з гэтага сваю мову, а таму ўладам прыйшлося закрываць уніяцкія цэрквы. А тое, што на пачатку XX ст., калі аб уніі ўжо ніхто і не ўспамінаў, пачалася сапраўдная хваля беларускага адраджэння, калі просты народ незалежна ад таго, ці хадзіў ён у праваслаўную царкву, ці каталіцкі касцёл, пагалоўна гаварыў на сваёй старажытнай беларускай мове – ці не сведчыць гэта пра спробу стварэння камусьці выгаднага міфа аб станоўчай ролі уніі ў гісторыі беларусаў. Праўда ж зусім іншая. Усе тыя міжусобныя войны сярод беларусаў, зусім не талерантныя паводзіны часткі духавенства і іншых шляхетных здраднікаў цалкам кладуцца на унію.

Выгадна ж гэта было толькі Рыму дзеля ажыццяўлення спрадвечнай мары католікаў панавання над усім светам.

Цікава, што і праваслаўныя і каталіцкія сучасныя даследнікі сыходзяцца ў ацэне адмоўнай ролі уніі ў гісторыі.

Экуменізм магчлівы толькі пры наяўнасці той жа талерантнасці і паразумення паміж людзьмі, чаго бракавала нашым продкам праз многія стагоддзі. І хочацца закончыць разгляд уніяцкай праблемы цытатай з ужо памянёнага артыкула М. Серчыка: *Імкненне да еднасці хрысціянскага свету вымагае адказнасці, таксама як і палітычнае імкненне да інтэграцыі еўрапейскай... Калі гісторыя ёсць настаўніца жыцця, прыслухаемся ўважліва да голасу мінулага, каб больш не паўтараць ужо раз зробленых памылак.*

Ніжэй я адумысна яшчэ вярнуся да уніяцкай праблемы.

На заканчанне зазірнем і ў нашу гістарычную эпоху, пачатак XXI ст. Можа, славутая талерантнасць стала рысай беларусаў зусім нядаўна?

Сапраўды, сёння на нашай тэрыторыі вонкі не відаць ніякіх нацыянальных канфліктаў, як, прыкладам, на Каўказе ці дзе ў Сербіі. Усё ціха, усё "прыстойненька". Усе гавораць па-расійску (з выняткам асобных мясцін, дзе гучыць паўпольская мова). Многія галасуюць – успомнім рэферэндум 1990 г. – за Саюз ССР, ці за СНД і ўваходжанне "в единую рублёвую зону", ці за гэтак званы Саюз Беларусі з Расіяй... А між іншага, тая ж Расія з намі жыць супольна не вельмі імкнецца, пра што сведчаць бясконцыя непаразуменні пры аб'яднанні нашых грашовых сістэм ці нахабныя паводзіны расійскага ўрада пры штучным утварэнні нафтавай праблемы. У той жа час амаль усе былыя рэспублікі СССР ідуць сваімі шляхамі і робяць сваю будучыню не зважаючы на "старэйшага брата".

Дык што ж гэта за народ – беларусы? Чаму мы так імкнемся пазбавіцца дзяржаўнай незалежнасці? Прарасійскія настроі ёсць і ў нашых камуністаў (у адрозненне, скажам, ад грузінскіх), і нават у большай часткі насельніцтва. Можа, такое становішча і завецца беларускай талерантнасцю? Дык жа не! Ніякая гэта не цярпімасць беларускай нацыі да іншых нацыяў. Гэта завецца нацыянальным нігілізмам, пагардай да сваёй нацыі, мовы і гісторыі. Вось такія рысы сапраўды адлюстроўваюць існасць сучаснага беларускага грамадзяніна. Варта задумацца, што хаваецца пад выдуманай талерантнасцю. А хаваецца нікчэмнасць і душэўная пустэча, жабрацкая псіхалогія і палітычны сервілізм. Ведама, гэтаму прычынай больш як 70-гадовае панаванне камуністычнай ідэалогіі. За гэты час мы, відаць, многа сваіх адметных нацыянальных рыс страцілі, і нам нібы ў насмешку прыляпілі ярлык "талерантнага народа".

Гаварыць жа аб талерантнасці выпадае, перш за ўсё, толькі з псіхалагічнага ці этычнага боку. Хут-

чэй за ўсё яна характарыстыка пэўнага чалавека, а ў больш агульным сэнсе – характарыстыка ступені развіцця грамадства. Чым больш высокі ровень цывілізаванасці грамадства тым больш уласцівая яму цярпімасць да іншадумцаў, імкненне да еднасці і любові сярод людзей. А такія катэгорыі характарызуюць большасць развітых краін Еўропы і Амерыкі. Менш за ўсе традыцыі талерантнасці ўласцівыя посткамуністычным краінам, у тым ліку і Беларусі.

Скончу на больш аптымістычнай ноце. Калі мы ўсё ж гаворым пра талерантнасць у Беларусі, то гэта значыць, што традыцыі Вялікага княства Літоўскага, як еўрапейскай дзяржавы, жывуць, і нам застаецца аднавіць ВКЛ у форме незалежнай, нацыянальнай і дэмакратычнай дзяржавы Беларусь. Будзем спадзявацца, што ў III-м тысячагоддзі мы будзем "людзьмі звацца"!

## 6. Пра беларускую ідэнтычнасць

Пра нацыянальную ідэнтычнасць беларусаў, так ці інакш, я разважаю на працягу ўсёй кнігі. Але хацелася б зрабіць некалькі заўваг асобна, у звязку з з'яўленнем вялікай колькасці публікацыяў на гэтую тэму.

Вось, прыкладам, пазіцыя Г. Міненкова, які прысвяціў праблеме ідэнтычнасці кнігу "Проблема религиозно-культурной идентичности в русской мысли XIX–XX веков". (Мінск, 2003). Што да беларускай ідэнтычнасці ў артыкуле "Еўрапейская ідэнтычнасць як гарызонт беларускага ўяўлення", ён піша:

*Беларусь заўсёды імкнулася ў еўрапейскую прастору і пачынала сваю гісторыю як еўрапейская культура, але пры гэтым пастаянна, з прычыны самых розных гістарычных абставін, аказвалася вырванай з гэтай прасторы.*

На мой пагляд, гэта голая фраза. Беларусь ніколі, нікуды не імкнулася. А, калі можна так выразіцца, "імкнулася" толькі быць сабой, беларусы вялікія да-

маседы. Наадварот, мала якая краіна так была сама сабой, як Беларусь. У нас стагоддзямі існавала сваё праваслаўе, якое ў цяжкіх умовах процістаяння Маскоўскаму праваслаўю захоўвала сваю аўтакефалію (XIV–XVI стст.). Мала якая краіна так упарта не рабілася неафітскай у сэнсе непрыняцця каталіцызму ў маштабах краіны. Як нейкі кампраміс была прынятая унія, але не каталіцызм. Так яшчэ было толькі ў Украіне. У *Еўропе* так не рабілася. Пратэстанты, прыкладам, лёгка ўзгадаваліся ў сэрцы каталіцызму – Германіі, Францыі, і імгненна запаланілі ўсю Еўропу. Некаторыя краіны нават цалком ці бальшынёй насельніцтва сталі пратэстанцкімі (Швецыя, палова той жа Германіі, іншыя.). Беларусы ж упарта захоўвалі веру продкаў – праваслаўе, часова, праўда, (243 гады) у форме уніі, якая, аднак, цалкам захавала ўсходні абрад.

І далей у Міненкова: "Ідучы за Акудовічам, а таксама В. Булгакавым, можна сказаць, што *асэнсаванне беларускай ідэнтычнасці і яе межаў патрабуе сёння новага тыпу мыслення*. Зразумела, гэты тып мыслення павінен улучацца ў кантэкст еўрапейскай ідэнтычнасці..."

Гэты "новы тып мыслення" паводле Акудовіча і Булгакава я ўжо часткова аналізаваў. Ён, апрача даволі сумнеўнай трактоўкі беларускасці і скажэння нашай гісторыі і літаратуры, не нясе станоўчага, новага дыскурсу. І яшчэ, што такое "еўрапейская ідэнтычнасць", пра якую любіць гаварыць А. Міненкоў? На нашую думку, гэта амаль тое самае, што і славянскае братцва, ці "славянская ідэнтычнасць". Можна проста сказаць – касмапалітызм. Трэба замяніць усе навамодныя слоўцы адным ведамым тэрмінам "касмапалітызм" і не выдумваць новых слоў накшталт "еўрапейскай ідэнтычнасці". Ніжэй аўтар так і піша: "беларускі вопыт разглядаецца як частка больш шырокага, радавога вопыту". І зусім на мяжы ганьбавання беларускай культуры: "Менавіта таму, згодзімся з Бабковым, "як цэльная і поўная, бела-

руская культура можа *адбыцца* – у сённяшніх умовах – толькі як *культура памежжа*, як культура нутраной размежаванасці, сустрэчы і пераходу адметных (рознанакіраваных, канфліктных) культурных частак". Наша культура, выходзіць, "можа адбыцца!", г. зн. яе яшчэ няма. І адбыцца яна можа толькі як культура памежжа. Цяжка пагадзіцца з гэтай тэзай. Наша культура – старажытная Каложа і Мірскі замак, Віленскае барока і "Літоўскі сшытак", Статут ВКЛ і Літоўскія метрыкі, Скарына і Будны, Васіль Быкаў і Уладзімір Караткевіч. А вы кажаце памежжа!

Праблеме беларускай ідэнтычнасці апошнім часам прысвечана шмат артыкулаў. У прыватнасці, шэраг цікавых думак можна знайсці ў артыкуле І. Бабкова "Генеалогія беларускай ідэі" (ARCHE. № 3, 2005).

Згодна з Бабковым, "працэс фармавання беларускай ідэнтычнасці ўвайшоў у сваю мадэрную фазу пры канцы XVIII ст. і, як лічаць некаторыя даследнікі, дасюль з яе не выйшаў". Трэба да гэтага адзначыць, што ў мадэрную эпоху фармавання нацыяў (XIX–XX стст.) ідэнтыфікацыя жыхароў спачатку Паўночна-Заходняга краю Расійскай Імперыі, потым БССР і нарэшце Рэспублікі Беларусі з назвай "беларус" у кожны з гэтых перыядаў была далёка не аднолькавай. Раней я кранаўся пытанняў варыятыўнасці назваў сучасных беларусаў – "тутэйшыя", "ліцвіны", "русіны" і г. д. Паставім цяпер пытанне больш канкрэтна: а калі, у якія часы слова "беларус" стала ідэнтыфікатарам грамадзяніна і, больш за тое, – асобы чалавека. Відавочна, гэта адбылося толькі пасля ўтварэння БССР, менавіта савецкія часы сталі каталізатарам нашай самасведамасці, уразумення сябе ў нацыі пад назвай "беларуская нацыя". І той перыяд, асабліва 20-я гг. XX ст., стаў для 10 млн. чалавек рэспублікі БССР часам неймавернага культурнага і нацыянальнага ўздыму. Менавіта ў савецкія часы была створаная цудоўная беларуская літаратура, звязаная з сусветна ведамымі імёнамі – класікамі Ян-

кам Купалам, Якубам Коласам, Кузьмой Чорным і нашымі сучаснікамі Васілём Быкавым, Уладзімірам Караткевічам і Янкам Брылём.

У артыкуле “Генеалогія беларускай ідэі” І. Бабкоў задае пытанне: “Чаму, нягледзячы на больш чым два стагоддзі інтэнсіўнай работы мадэрнасці, скіраванай на выпрацоўку сучаснага культурнага гамагеннага нацыянальнага грамадства, мы дасюль знаходзім сябе “сярод рознасцяў”?

Разважаючы аб еўрапейскай ідэнтычнасці, Бабкоў зусім анулюе асобны шлях *савецкіх* нацыяў і хутчэй трэба гаварыць аб *савецкай мадэрнасці беларусаў* (як, дарэчы, украінцаў і наварасійцаў), *а не еўрапейскай*. І развязваючы пытанне аб беларускай мадэрнай ідэнтычнасці мы вымушаны ісці да еўрапейскай ідэнтычнасці няўхільна праз савецкую беларускую ідэнтычнасць. А гэтая беларуская ідэнтычнасць фармавалася праз дзесяткі гадоў, і не лёгкіх гадоў, часу, напоўненага пасіянарным нацыянальным уздымам, жудаснымі сталінскімі гулагамі, рэпрэсіямі і войнамі.

Бабкоў піша, што ў дачыненні да беларускага нацыягенезу паўстаюць пэўнага кшталту мадэлі: самыя заўважныя з іх – мадэль затрыманай альбо нясконччанай мадэрнасці... – альбо тэорыя вясковай нацыі, што трактуе вяскоўцаў як адзіных аўтэнтычных прадстаўнікоў беларускага этнасу і таму выкідае з поля беларускасці ўсе формы і праявы урабаністычнай цывілізацыі.

Што да апошняга варыянта так званай “вясковай” нацыі, усякія разважанні мелі б сэнс самае малое дзесяць, а то і дваццаць гадоў таму, калі сапраўды існавала беларуская вёска. Цяпер жа засталіся толькі асобныя выспы той самабытнай беларускасці, што існавала ў часы Шпілеўскага і Сержпутоўскага, і то толькі ў форме аўтэнтычных спеваў ці ганчарных вырабаў. Ды і гэтыя рэлікты існуюць у вялікай ступені ў мадэрным выглядзе. Сучасная ж вёска даўно не ёсць носьбітам беларускай ідэнтычнасці, ды і на-

агул амаль не мае ніякіх атрыбутаў нацыянальнай культуры – мовы, традыцыяў і г. д. Аднак прымардыяльны складнік беларускай нацыі існуе на іншым, больш высокім роўні – на роўні нацыянальных эліт, і ёсць важкім складнікам нашай ідэнтычнасці.

І наконт першага варыянта – "няскончанага нацыяўтварэння". Трэба тут заўважыць, што працэс нацыяўтварэння скончыўся яшчэ за савецкім часам. А тое, што нацыі мяняюцца з часам, то гэты працэс у рознай ступені закране ўсе нацыі без вынятка. Пачынаючы з 1991 г. нам засталося сфармаваць нашую беларускую ідэнтычнасць у кантэксце мадэрнага спектру нацыяў-дзяржаў. І гэты працэс паспяхова ішоў да знакавага 1996 г. і з ведамай прычыны быў прыпынены. Ува Украіне ў стартавай сітуацыі, амаль ідэнтычнай беларускай, на 2008 г. мы бачым выразна сфарамуляваную ўкраінскую нацыянальную ідэю, якой абсалютна не замінае падзел на праваслаўных, уніятаў, католікаў і пратэстантаў.

На дадзены момант ёсць два шляхі фармавання новай беларускай ідэнтычнасці – на базе беларускіх нацыянальных каштоўнасцяў, у асноўным прымардыяльнага кшталту *(культура-1)* і на новай мадэрнай аснове лукашэнкаўскага нацыяналізму *(культура-2)*. (Аб гэтым ужо вышэй гаварылася.)

Варта ўспомніць тут і пагляды польскага сацыёлага Рышарда Радзіка, які зводзіць беларускую ідэнтычнасць да "вясковай" і "праваслаўнай", ставячы паміж гэтымі паняткамі знак тоеснасці. Апрача таго, да гэтых характарыстык беларускага этнасу прывязваецца таксама яшчэ адзін ярлык – "адсталай" нацыі. Наконт такой "глыбокай" высновы мне б хацелася выказаць нязгоду. Няпраўда, што нястача сваёй дзяржаўнасці стала прычынай беларускай адсталасці і нават нейкай заганнасці нацыі. Такой адсталасцю, як ведама, была прасякнута ўся Расійская Імперыя. І калі надышоў час нацыянальнага ўздыму, то мы яго ўспрынялі годна і дасягнулі за кароткі час выдатных вынікаў.

Цяпер наконт "праваслаўнасці" беларусаў. Хацелася б запытацца ў спадара Радзіка, як разумець фразу: "Праваслаўе ж у гэтым раёне (канфесійны фактар) дзейнічае ў унісон з дзяржавай, зрастаецца і супадае з ёй і таму два стагоддзі беларускага нацыягенезу былі часам нацыягенезу насуперак (!) нацыяўтваральным фактам". Чаму ж тады для рускай нацыі – таксама праваслаўнай, – гэтыя два стагоддзі не шкодзілі нацыяўтварэнню, а наадварот менавіта ў XIX ст. была сфармулявана руская нацыянальная ідэя, а яе творцы – рэлігійныя філосафы наагул заклалі асновы тэорыі нацыяналізму і звязалі яе з хрысціянствам у найвышэйшым, касмічным сэнсе? Ці шкодзіць, прыкладам, праваслаўная ідэнтычнасць грузінам, сербам? Пра якую тут карэктнасць Радзіка можна гаварыць і сцвярджаць пасля, як Бабкоў, што ён карэктна апісвае беларускае грамадства з выняткам другой часткі беларускага грамадства – беларуска-польскай шляхты?

Падсумоўваючы, можна сказаць, што ўсе празаходне арыентаваныя аўтары (Бабкоў, Радзік, Латышонак, Рудкоўскі і г. д.) салідарныя ў сваім непрыманні беларусаў як праваслаўнага народа, і прычынай да няздольнасці беларусаў да нацынальнай ідэнтыфікацыі яны бачаць прыналежнасць да пэўнага "заганнага" цывілізацыйнага кола (прыкладам, еўразійска-праваслаўнага).

# РАЗДЗЕЛ V.
# ПАЛІТЫЧНЫ АСПЕКТ НАЦЫЯНАЛІЗМУ (СУЧАСНАСЦЬ І ПЕРСПЕКТЫВЫ)

## 1. Дзяржаўнасць і нацыяналізм Ідэя нацыі-дзяржавы

Ідэя нацыі-дзяржавы, як найвышэйшай ступені фармавання нацыі, як завяршэнне мадэрніцкага шляху нацыі, падрабязна аналізуецца Э. Смітам у кнігах "Нацыяналізм у XX стагоддзі", "Национализм и модернизм", шэрагам іншых тэарэтыкаў, пачынаючы з Макса Вебера, Карла Дойча, Энтані Гідэнса і Эрыка Хобсбаума.

У аснове ідэі нацыі-дзяржавы ляжыць думка аб тым, што сучасныя дзяржавы ёсць крыніцай і каркасам сучасных нацый і нацыяналізму. Такім чынам, стварэнне нацыі разглядаецца не як вынік пераўтварэння гістарычнай супольнасці, а як пабудова яе ў сучасны перыяд шляхам стварэнняя нацыянальнай дзяржавы. Менавіта гэта і ёсць палітычны мадэрнізм.

Яскравым прыкладам сучаснага мадэрнісцкага падыходу да пабудовы нацыі можа служыць прыклад пабудовы нацыянальнай беларускай дзяржавы пасля 1996 г. У аснову быў пакладзены падыход антыгістарычны і валюнтарысцкі. Калі фактычна для ўсіх еўрапейскіх нацыяў гісторыя, культура, мова і іншыя кампаненты этнасу былі даміноўнымі ў пабудове нацыі, то беларускі этнас стаў выключэннем. Быў цалкам ігнараваны стандартны шлях пераўтварэння ў нацыю, бо на дзяржаўным роўні былі адкінутыя гісторыка-культурныя аспекты нацыі, сярод якіх цэнтральнае месца займалі старажытныя сімвалы – бел-чырвона-белы сцяг і герб "Пагоня". Традыцыйным нацыяналістам нічога іншага не засталося, як завяршаць працэс нацыяўтварэння беларусаў у падполлі (ствараць, як раней мы тэрміналагічна вызначыліся, *нацыю-1*). Менавіта "прыхільнасць індывідаў да сукупнасці сімвалаў і вераванняў, што надае

асаблівае значэнне адчуванню супольнасці ў прадстаўнікоў палітычнага парадку" Э. Гідэнс лічыў галоўнай псіхалагічнай асаблівасцю нацыяналістаў.

Гістарычная памяць – моцная і выдатная рыса сусветных нацый, якія адбыліся. Што мы маем у адваротным выпадку? Чалавек без памяці добра апісаны Чынгізам Айтматавым і завецца "манкуртам". І калі з такіх людзей складзецца цэлае грамадства, то гэта страшна. У такой нацыі няма святынь, у яе няма маральнасці. З ёй можна рабіць усё што заўгодна.

Падобна на тое, што такая нацыя *(нацыя-2)* і ствараецца ў Беларусі пасля 1996 г. – пачатку эры кіравання Лукашэнкі. Тое, што не паспелі зрабіць з мовай і гістарычнай памяццю беларусаў савецкія камуністы, паспяхова завяршаецца новым рэжымам. На грунце культывацыі страху рэжымам Лукашэнкі лепіцца нацыя рабоў. Найбольш адчувальны ўдар быў нанесены па тым атрыбуце нацыі, які вельмі цяжка вярнуць, – па мове. Калі прасачыць тэндэнцыю выціснення беларускай мовы, то можна прагназаваць, што прыкладна праз 10–20 гг. яна цалкам знікне з ужытку і будзе мёртвая, як латынь. Адпаведна і знікне беларускамоўная літаратура. Беларуская культура *(культура-2)* будзе ўяўляць эклектычную помесь некаторых тэрытарыяльных помнікаў мінуўшчыны, сучаснай папсы, "лукашэнкаўскага рэалізму" (цяперашні аналаг з сацыялістычнага рэалізму).

Культурны нацыяналізм беларусаў церпіць у наш час поўную паразу пад націскам ***палітычнага нацыяналізму мадэлі Лукашэнкі*** **(культура-2)**. Звычайна бывае наадварот: культурны нацыяналізм вымушае палітыкаў прымаць неабходныя захады адносна захавання культурных і духоўных каштоўнасцяў і як найбольш эфектыўны спосаб – утварэнне тэрытарыяльна замкнутай дзяржавы і фармулёўка палітычнага мадэрнізму. Так было ў выпадку нашых суседзяў – Польшчы, а пазней – Літвы, Латвіі і Эстоніі. Энтані Сміт падкрэслівае важную акалічнасць, звязаную з абмежаванасцю мадэрнізму, – гэта "няздольнасць

мадэрнізму зразумець, што пераўтварэнне сучаснасці ў зმененай форме аднаўляе сацыяльныя і культурныя ўзаемаадносіны мінулых эпох."[1] Нельга ігнараваць мінулае, бо панятак нацыі ахоплівае не толькі адну ідэю палітычнага суграмадства ці сродка дзяржаўнай улады. Панятак нацыі таксама звязаны з асаблівым культурным грамадствам – "народам", што жыве на сваёй Бацькаўшчыне гістарычным грамадствам і духоўным адзінствам.

Ці магчыма канструяваць нацыі без гістарычнага фактара і з ігнараваннем культурнага нацыяналізму эліты народа? Прынамсі такім шляхам пайшла Рэспубліка Беларусь пасля 1996 г. Цяпер магчымым сцэнарам канструявання беларускай нацыі можа быць шлях паводле наступных зыходных пастулатаў:

1. Мова народа – расійская (беларуская мова не патрэбная, яна адмірае).

2. Сімволіка – посткамуністычная (сцяг, герб і гімн – мадыфікаваныя атрыбуты БССР).

3. Гістарычны аспект узнікнення беларускай нацыі. Тут магчымы тры варыянты.

а) Да эпохі Лукашэнкі існавала савецкая парадыгма гістарычнага шляху беларускай нацыі, якая выглядала прыкладна так: "Да 1917 г. не існавала самастойнай дзяржавы Беларусь, пачатак дзяржаўнасці звязаны з абвяшчэннем БССР у 1919 г. Гэта змагло адбыцца дзякуючы кастрычніцкай рэвалюцыі. Бальшавікі вызвалілі беларускі народ ад прыгнёту памешчыкаў і далі яму ўсе патрэбныя варункі жыцця. Таксама сцвярджаецца, што Расія ёсць "старэйшы брат" Беларусі. Такім чынам, згодна з савецкай ідэалогіяй і гістарыяграфіяй, беларуская нацыя бярэ пачатак з 1917 г. Такім чынам, беларуская нацыя – гэта мадэрнае ўтварэнне, накшталт амерыканскай нацыі ці бразільскай.

б) Папярэдняя парадыгма пасля 1996 г. мяняецца ў бок яшчэ большай мадэрнізацыі наступным

[1] Э. Сміт. Национализм и модернизм. М., 2004. С. 147.

чынам: Беларуская дзяржава бярэ свой пачатак з моманту вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (гэтым днём лічыцца 3 ліпеня 1944 г.). Таму Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь святкуецца 3 ліпеня – у дзень вызвалення Беларусі.

в) І яшчэ адна парадыгма – замежнапалітычная. Найбольш распаўсюджаная парадыгма, на якой заснаваная расійская шавіністычная палітыка і найноўшая ідэя Саюза Беларусі і Расіі, фармулюецца наступным чынам:

*Беларусы – гэта адна з галін усяго славянства. А разам з рускімі і ўкраінцамі беларусы ўтвараюць адзіны славянскі народ – усходняе славянства. Да апошняга кангламерату магчыма далучэнне сербаў. Яны таксама "харошыя" славяне.* І пра згаданае "далучэнне" ўжо было заяўлена. Менавіта з такой прапановай звяртаўся да Лукашэнкі ў 1997 ці 1998 г. дыктатар Мілошавіч пасля прыняцця супраць Сербіі сілавых захадаў войскамі НАТА.

На падставе вось гэтых пастулатаў 1–3 ляжыць канструяванне новай беларускай нацыі эпохі Лукашэнкі. Магчымы нават захады больш маштабнага кшталту. Іосіф Сталін быў бацькам усіх народаў. Аляксандр Лукашэнка не замахваецца на такія вышыні, але можа быць "бацькам" часткі народаў, а канкрэтна – славянскіх народаў. А магчыма нават "бацькам" новай нацыі – славянскай. Падрыхтоўка ў гэтым кірунку ўжо даўно вядзецца на славутых "Славянскіх базарах". І гэтыя апошнія прагнозы не такія ўжо і фантастычныя.

Такім чынам, рэальным на сённяшні час з'яўляецца тое, што з 1996 г. ідзе працэс стварэння новай беларускай нацыі, якая якасна розніцца ад традыцыйнай беларускай нацыі, працэс стварэння якой амаль завяршыўся пасля абвяшчэння незалежнасці 27 ліпеня 1991 г. Гэта значыць, што гістарычная, заснаваная на прымардыяльнай канцэпцыі беларуская нацыя можа саступіць месца постмадэрнісцкай канцэпцыі самага нечаканага і радыкальнага кірунку, замешанай на праг-

матычна-утылітарнай расійскай субкультуры.

Аднак, калі знішчыць культуру і мову народа, што складвалася вякамі, то чым запоўніцца культурны вакуум, які непазбежна ўтворыцца ў выніку? Мяркую, што шлях тут апрабаваны, асабліва ў кабінетах спецслужб. Галоўнае – змясціць кожнага чалавека ў адпаведнае інфармацыйнае асяроддзе, у "басейн", дзе ён жыве цэлымі суткамі і ніколі адтуль не выходзіць. Такім "басейнам" ёсць найперш СМІ, і ў першую чаргу – тэлебачанне. Людзі, якія з'яўляюцца жыхарамі сучаснай Беларусі, цалкам уцягнутыя ў культуру іншай дзяржавы – Расіі. Яны чуюць паўсюдна выключна расійскую мову, ведаюць усіх расійскіх спевакоў і спартсменаў, і, як гэта не парадаксальна, ведаюць расійскіх алігархаў і палітыкаў больш, чым сваіх. Пра сваіх палітыкаў яны ведаюць толькі тое, што гэтыя палітыкі "ніяк не могуць падзяліць амерыканскія грошы". Моладзь уцягнутая ў арбіту расійскай папсы, і тыя нешматлікія нацыянальныя калектывы, накшталт "N.R.M." ці "Крамы" знаходзяцца за межамі асноўнай сферы ўплыву.

Культура, узгадаваная стагоддзямі, замяняецца на субкультуру, бездухоўнасць. Таму расце злачыннасць, наркаманія, алкагалізм.

*Вось такі атрымліваецца партрэт новай беларускай нацыі-2.*

Перспектыва суіснавання разам з гэтай масавай папуляцыяй абноўленай беларускай нацыі, выхаванай на традыцыях, беларускай мове, хрысціянскіх каштоўнасцях – ніжэй за сярэднюю.

У свой час *сербы і харваты*, падзяліўшыся з аднаго і таго ж этнасу паводле рэлігійных прыкметаў, сфармаваліся як асобныя нацыі. Больш за тое, з таго ж фактычна этнасу цяпер фармуецца новая нацыя – баснякі (баснійскія мусульмане). У сербаў праваслаўе выконвае этнаўтваральную ролю, а інстытут Царквы выконвае таксама і палітычную ролю. Для сербаў, якія працяглы час жылі ў дзвюх імперыях – Аўстрыйскай (паноўнае каталіцкае веравызнанне) і Асманскай (дзяр-

жаўная рэлігія іслам), асновай ідэнтычнасці стала праваслаўная рэлігія (не мова і не традыцыі!). Харватам, якія жылі ў Сярэднявеччы ў Аўстрыйскай імперыі, каталіцкае веравызнанне таксама было важным, але не настолькі, каб стаць этнацэнтрычным фактарам. Ідэолагі харвацкага руху доўгі час не ўлучалі канфесійную прыналежнасць у лік галоўных характарыстык нацыі. Аднак пазней, пасля фармавання сербскай нацыі на падставе галоўнага чынніка – праваслаўнай рэлігіі, – і харваты пачалі вылучаць каталіцкую веру як галоўную прыкмету нацыянальнасці. Дарэчы, беларусы, якія жывуць на Беласточчыне ў Польшчы, каб захаваць сваю нацыянальную ідэнтычнасць, вымушаны ўсяляк бараніць сваё праваслаўнае веравызнанне, бо толькі гэтая прыкмета здольная абараніць іх ад поўнай асіміляцыі з палякамі.

У Беларусі на дадзены момант беларусы-католікі і беларусы-праваслаўныя мала маюць шансаў паўтарыць прыклад сербаў і харватаў і развіцца ў самастойныя нацыі. Гэта звязана ў першую чаргу толькі з тым, што ў XX–XXI стст. роля канфесійнага фактара стала істотна іншай, чым ў Сярэднявеччы. Яна перастала быць вызначальнай у працэсе фармавання нацыі, і хутчэй наш шлях – шлях нямецкай нацыі, якая фактычна падзелена на дзве раўназначныя канфесіі – католікаў і пратэстантаў (лютэран).

Беларусы-католікі і беларусы-праваслаўныя – гэта адзін народ і адна нацыя. Нацыянальны падзел паводле канфесійнай прыкметы тут ужо амаль немагчымы. Хоць у свой час – а гэта здаралася даволі часта – у час фармавання нацыянальнай сведамасці шмат беларусаў-католікаў назаўжды сталі палякамі. І цяпер мы маем значную частку Віленскага краю і г. Вільню, дзе большасць палякаў з'яўляюцца этнічнымі беларусамі. Тое самае адбылося і на Беласточчыне, дзе мноства беларусаў-католікаў нават не памятаюць аб сваім беларускім паходжанні. Гэтыя людзі, фактычна, страчаныя для беларускай нацыі.

Дарэчы, тое ж атрымалася, але раней, з Смален-

шчынай і Браншчынай. Жыхары гэтых зямель цалкам абруселі і ўжо не маюць гістарычнай памяці пра сваё беларускае мінулае.

Для беларусаў існуе іншы варыянт нацыянальнага падзелу і дзялення беларускай нацыі на два самастойныя – у першую чаргу палітычныя – утварэнні. І вызначальным фактарам тут з'яўляецца мова. Адна нацыя на базе беларускай мовы, другая – расійскай. І тут для гэтай другой расійскамоўнай нацыі ўзнікае зусім не фантастычная з'ява лукашэнкаўскага нацыяналізму. Аднак для гэтай расійскамоўнай беларускай *нацыі-2* існуе іншая пагроза – рана ці позна можа ўзнікнуць пытанне аб раўназначнасці нацыянальнай ідэнтычнасці гэтай новай *нацыі*-2 і даўно існай самай звычайнай – расійскай нацыі. Толькі ў рамках розных дзяржаў могуць існаваць дзве аднамоўныя нацыі. Як толькі палітычны лёс такой расійскамоўнай беларускай дзяржавы зменіцца на карысць здачы суверэнітэту Расіі – беларусы знікнуць спачатку як нацыя, а потым і як этнас.

**Заключныя заўвагі адносна Лукашэнкаўскага нацыяналізму**

Паводле Бройі, нацыяналістычная ідэя – гэта палітычная дактрына, якая грунтуецца на трох кітах:

а) існуе нацыя, якая валодае яскрава выражаным асаблівым характарам;

б) інтарэсы і каштоўнасці гэтай нацыі маюць прыярытэт перад інтарэсамі і каштоўнасцямі іншых нацый;

в) нацыя павінна быць незалежнай наколькі гэта магчыма. Для гэтага звычайна неабходныя дасягненні па меншай меры палітычнага суверэнітэту.

З пункту гледжання афіцыйнай ідэалогіі нічога не перашкаджае, каб у рамках азначэння Бройі сканструяваць беларускую нацыю без культурна-нацыянальнага кампанента. Моўны аргумент лёгка адхіляецца прыкладам Лацінскай Амерыкі, што мае шэраг нацый, дзе гавораць толькі на іспанскай мове, ці англамоўных нацый на чале з амерыканцамі.

Існуюць двухмоўныя і трохмоўныя нацыі. Напрык-

лад, швейцарцы. Аднак італамоўны швейцарац не складае канкурэнцыі франкамоўнаму, бо яны выраслі на адпаведных культурах і захоўваюць гэтыя культуры праз школы, асвету і адукацыю.

На прыкладзе Беларусі назіраецца дзіўная рэч: беларусы добраахвотна аддаюць сваю ідэнтычнасць на карысць іншай культуры – расійскай. І швейцарскага варыянта можа ў нас не быць. І найвялікшая каштоўнасць – самабытны беларускамоўны варыянт беларускай нацыі – можа знікнуць, бо ў яго не будзе неабходнай падпіткі – школ, асветы ды іншых атрыбутаў культуры.

## 2. Сучасныя ідэалогіі і іх носьбіты – палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі. Дачыненні да нацыянальнай ідэі

### *Лібералізм і нацыяналізм*

Лічыцца, што гісторыя нацыяналізму і лібералізму пачалася адначасова – абедзве дактрыны бяруць пачатак ад часоў французскай буржуазнай рэвалюцыі 1789–1793 гг. Вынікам гэтай падзеі было тое, што французы сталі адным з першых народаў у Еўропе, які паказаў сябе як нацыю. Французы (Лія Грынфельд лічыць, праўда, што раней усвядомілі сябе нацыяй англічане) усвядомілі сваю нацыянальную адметнасць, сваю нацыянальную мову і вялікую гісторыю. Гэтае ўсведамленне стала грунтам фармавання нацыянальнай ідэі, а праект яе рэалізацыі прывёў да тэарэтычнага абгрунтавання нацыянальнай ідэі – да ідэалогіі нацыяналізму.

Якабінцы зразумелі, што ў барацьбе з тыраніяй нацыяналізм мае вялікую перавагу і з'яўляецца асновай дэмакратычнага кіравання. Французы абвясцілі свабоду найвялікшай каштоўнасцю і гэтым заклалі падмурак лібералізму. Аднак па часе тая ж Англія яшчэ раней сфармулявала ліберальныя прынцыпы ў знакамітым «Білі аб правах» 1689 г.

Крах Напалеонаўскай імперыі ў 1815 г. беспася-

рэдне звязаны з абуджэннем нацыянальных пачуццяў у французаў. Калі Луі XVIII прапанавалі трон ягоных продкаў Бурбонаў, то публічнае паведамленне аб перасячэнні ім мяжы было такога зместу: "Яшчэ адзін француз вяртаецца ў Францыю". І гэтая патрыятычная акалічнасць стала вызначальнай у лёсе наступных манархаў: усе яны ў першую чаргу былі прадстаўнікамі сваёй дзяржавы, а ўжо потым уладарамі.

З самага пачатку нацыяналізм заявіў аб сабе як сіла, процілеглая касмапалітызму, і асабліва яскрава гэта адчулася ў перыяд супраціўлення Напалеону Банапарту. У той час менавіта нацыяналізм стаў той вырашальнай сілай, што дапамагла канчаткова звергнуць Напалеона. І гэтая падзея стала першай у сусветнай гісторыі, калі ўвачавідкі была паказана сіла нацыяналізму. Далейшыя гістарычныя падзеі яшчэ больш выявілі сілу нацыяналізму, а XX ст. аказалася прасякнутым ім наскрозь.

Першая сусветная вайна (1914–1918) упершыню ў гісторыі аказалася вайной, выкліканай не рэлігійнымі ці тэрытарыяльнымі супярэчнасцямі, а менавіта нацыянальнымі. Апошнія еўрапейскія войны (Сербія, Чачня) носяць ужо яскрава выражаны нацыянальны характар.

У XX ст. нацыяналізм канчаткова сцвердзіў сябе як дактрына. Прычым у адрозненне ад лібералізму, сацыялізму і іншых вядомых дактрын, якія маюць адну важную супольную рысу – права выбару, права распараджацца сваёй свабодай на сваё жаданне, – нацыяналізм не мае такой магчымасці, ён нясе ў сабе жорсткую залежнасць ад сваёй нацыі, і гэтую залежнасць чалавек не можа мяняць на сваё жаданне. У гэтым і ёсць сутнасць нацыянальнага монатэізму, аб якім гаварылася вышэй.

Цяпер аб лібералізме гэтай эпохі. Лібералізм на пачатку XIX ст., як у Англіі, так і ў Францыі, з самага пачатку ставіў на першы план эканамічныя законы – і менавіта законы свабоднага рынку. На першым этапе ён не супярэчыў нацыяналізму і на-

ват дапаўняў яго. Лібералы ставілі на першы план асобу чалавека, яго індывідуальнасць. І тое, што гэтая індывідуальнасць вызначаецца такой адметнасцю як нацыя, на першы погляд не супярэчыць лібералізму, што і было характэрнай рысай еўрапейскай палітыкі да рэвалюцыі 1848 г. Наогул у большасці краін Еўропы да 1848 г. уздым нацыянальнай ідэалогіі быў звязаны з лібералізмам. Пасля рэвалюцыі 1848 г. лібералы ўбачылі ў нацыяналізме сімптомы нарастаючай напружанасці ў сувязі з масавай індустрыялізацыяй і дэмакратызацыяй грамадства.

Менавіта апошнія фактары (уздым тэхнакратыі) прывялі да вызвалення чалавека ад руціннай працы, далі адносную свабоду для духоўнага развіцця, што ў сваю чаргу прывяло да фармавання новай якасці асобы чалавека – нацыянальнай сведамасці і неабходнасці жыцця чалавека ў нацыі.

У сваёй выдатнай кнізе "Нацыяналізм у XX стагоддзі", надрукаванай на беларускай мове ў Мінску ў 1994 г., Энтані Сміт пісаў: «Аптымістычныя прагнозы лібералаў аб тым, што урбанізацыя, індустрыялізацыя звядуць да мінімуму прывабнасць нацыяналізму, паказалі сябе памылковымі».

Супярэчнасці паміж ліберальным і нацыяналістычным светаўспрыманнем яскрава прадэманстравала дзейнасць такога ведамага ранняга нацыяналіста XIX ст., як Джузеппе Мадзіні. Мадзіні быў італьянскім патрыётам і імкнуўся да аб'яднання ўсіх італьянскіх зямель пад адзіным урадам. Ён верыў у нацыянальнае самавызначэнне як крыніцу ўсіх палітычных праблем. Для яго любая форма індывідуальнага самасцвярджэння, што з'яўляецца стрыжнем лібералізму, была раўназначнай здрадзе нацыі. Яго галоўная праца «Абавязкі чалавека» ўжо загалоўкам дэманструе выклік ліберальнаму прынцыпу – прынцыпу індывідуальных правоў асобы. Аднак Мадзіні з іншага боку быў касмапалітам, у гэтым ён быў разам з лібераламі, якія верылі, што будуць працаваць не для асобных людзей, а для ўсяго чалавецтва. Мэтай

лібералӑў, якую падтрымліваў Мадзіні, была садружнасць дэмакратычных дзяржаў, што мірна супрацоўнічаюць у рамках універсальнага свабоднага рынку. Канцэпцыя сусветнага парадку Мадзіні – гэта свет асобных нацыяў, якія мірна супрацоўнічаюць паміж сабой для дасягнення універсальнага дабрабыту чалавецтва. У сваёй праграме ён апеляваў да лібералізму сусветнага парадку. Аднак блізкасць ідэалогій Мадзіні і лібералізму была даволі павярхоўнай. Сутнасць у тым, што Мадзіні быў зацікаўлены ў свабодзе нацыянальных калектываў, а не асобных індывідуумаў, што ёсць аснова лібералізму. Лібералы таксама імкнуліся да мірнага і прагрэсіўнага парадку, але не праз асобныя грамадскія групы, не праз нацыі. Гэтая вера ў прагрэс развіцця праз індывідуальную свабоду была чужароднай для Мадзіні.

І таму ён прыклаў шмат намаганняў, каб аб'яднаць італьянскія рэгіёны. Ён лічыў, што нацыянальнае яднанне з'яўляецца першасным, і прэтэнзіі індывідуума павінны культываваць свае асабістыя ўнёскі для прагрэсу ўсяго чалавецтва. Адна з першасных задач урада – захоўваць і развіваць нацыянальны характар і нацыянальныя традыцыі.

Адносна эканамічнага індывідуалізму, у прыватнасці, ідэі свабоднага рынку, Мадзіні быў цалкам абыякавы, і гэта ставіць яго на бок, процілеглы лібералам. Ён бачыў, што канкурэнтная эканоміка спрыяе індывідуальнаму эгаізму, падрыхтоўвае да сутыкненняў брата з братам, а гэта разбурае нацыю, падзяляе яе на розныя варожыя класы.

Прыклад Мадзіні яскрава паказвае непазбежнасць антаганізму паміж лібераламі і нацыяналістамі і сведчыць пра невырашальнасць гэтага канфлікту.

Лібералы, кіруючыся рацыянальным мысленнем, лёгка прымаюць нацыянальную ідэю і нацыяналізм, але гэтым яны ўводзяць радыкальна іншы, чужы элемент у сваю ідэалогію.

З другога боку, нацыяналісты могуць прымаць і прымаюць ліберальныя ідэі для ўнутранага прагрэсу

эканомікі, але інтарэсы нацыі пры гэтым маюць безумоўны прыярытэт перад інтарэсамі простых індывідаў.

Рускі мысляр XIX ст. Канстанцін Лявонцьеў вельмі балюча адчуваў усю згубнасць ідэі лібералізму для народаў, што сталі на шлях незалежнасці і фармавання сваіх нацыяў-дзяржаў. У другой палове XIX ст. лібералізм стаў вельмі модцай ідэалогіяй для шмат якіх краін Еўропы: Германіі, Аўстрыі, Італіі, Расіі і іншых. *... усе гэтыя нацыі, усе гэтыя дзяржавы, усе гэтыя грамадствы зрабілі за 30 гадоў (да 1870-х гг.* – А. А.*) вялізны крок на шляху эгалітарнага лібералізму, дэмакратызацыі раўнапраўнасці; на шляху нутранага змешвання класаў, улад, звычаяў, законаў і г.д. ... Усе грамадствы Захаду за гэтыя 30 гадоў больш сталі падобнымі адно на адно, чым былі раней*[1]. К. Лявонцьеў бачыў для сябе ў гэтым працэсе жахлівую карціну – пераход да дзяржавы касмапалітычнай, спачатку еўрапейскай, а потым і сусветнай. У сувязі з гэтым К. Лявонцьеў быў і супраць панславізму. Ён падзяляе ідэю праваслаўна-культурнага русізму – як нацыянальна рускую ідэю і ідэю панславізму, як наследаванне еўрапейскаму эгалітарызму, толькі ўжо на грунце славянскага адзінства. К. Лявонцьеў неаднаразова падкрэслівае, што Еўропа – гэта якраз прыклад «неподражания». Захоўваючы рускі нацыянальны ідэал Данілеўскага[2], ён выступае супраць палітычнага ўсеславянства: *Я нападаю на ідэал усеславянскага аб'яднання, калі б то ні было і ў што б там ні было; я лічу гэты апошні ідэал (чыста палітычны) для першага (для ідэалу самабытнасці духоўна-культурнай) вельмі небяспечным ужо толькі па тым, што большасць адукаваных не рускіх славян занадта прывыкла да еўрапейскіх форм свабоды і роўнасці альбо надта аддана ім, не гаворачы ўжо аб іншавер'і славян аўстрыйскіх.*

---

[1] Леонтьев К. Племенная политика как орудие всемирной революции.// Избранное, М., 1993.

[2] Данилевский К. Россия и Европа, М., 1994.

Перасцярога К. Лявонцьева адносна шкоднасці панславізму актуальная і цяпер – праз 100 гадоў пасля ягоных публікацый. Постсавецкая прастора быццам бы па-новаму пачала натуральны гістарычны шлях, перапынены рэвалюцыяй 1917 г., і тыя праблемы, што існавалі тады, зайгралі новымі фарбамі на мяжы XX і XXI стст. Узнік неалібералізм, адзін з варыянтаў якога дапускае калектывізм (Ф. Хайек), этатызм і нацыяналізм. Сучасны неалібералізм дапускае элементы ўмяшання дзяржавы ў справы эканомікі, што супярэчыць класічнаму лібералізму, але не замінае сучасным яго прыхільнікам дасягаць вялізных матэрыяльных прыбыткаў. Як і раней, неалібералы любяць паддобрывацца да нацыяналістаў, але відавочныя супярэчнасці паміж імі вымушаюць ліберала ў камбінаваць іншыя альянсы, найбольш распаўсюджаны з якіх ліберал-кансерватызм. Як ведама, нацыянальная ідэя ўлучаецца ў кансерватыўную ідэалогію, і з пункту гледжання нацыяналістаў ліберальны кансерватызм такая ж немагчымая камбінацыя, як і ліберальны нацыяналізм. Ніжэй мы разгледзім гэтую праблему больш падрабязна.

Сучасныя расійскія ідэолагі ўсё менш падтрымліваюць канцэпцыю ўсеславянскага брацтва, якая дасталася нам ад імперскай Расіі і камуністычнага СССР. Так, П. Кандэль спробы аднаўлення "славянскага праваслаўнага саюза" называе "нереалистическими мечтаниями" і лічыць, што калі такі саюз і будзе ажыццёўлены, ён будзе нявыгадны[1].

Такім чынам, мы ўвайшлі ў XXI ст., развітаўшыся (у большай частцы свету) з камуністычнай ідэяй і маючы некалькі «выжыўшых» перыпетыяў гісторыі ідэалогій, сярод якіх мы зараз вылучылі дзве не вельмі спалучальныя ідэалогіі – лібералізм і нацыяналізм.

Сучаснаму чалавеку галоўны прынцып лібералізму – ідэя свабоды – вельмі блізкі. Шэраг краін усіх

[1] Кандель П. О национализме «с человеческим лицом // Pro et Contra, том 3, № 3, 1988. С. 133.

кантынентаў свету будуюць сваё заканадаўства на падставе ліберальных каштоўнасцей, грунтуючыся на прынцыпах правоў чалавека, усялякіх свабод (сумлення, веравызнання, друку....) ды іншымі.

З другога боку, мы бачым амаль экспаненцыйны рост новых нацыяў, нацыянальнай сведамасці людзей, утварэння новых дзяржаў і этнасаў. Нацыі не хочуць асіміляцыі, а наадварот множацца і мацнеюць.

Камуністычны рэжым утрымліваў шэраг этнасаў у эмбрыённым стане і, здавалася б, ужо мала засталося для таго, каб зліць якога-небудзь эстонца, украінца, ці ўзбека ў адзіную сацыялістычную нацыю. Гледзячы на вялікія поспехі СССР (на самай справе большасцю паказушныя ці неапраўданыя – як, напрыклад, засваенне космасу), шэраг краін, асабліва трэцяга свету, пачалі таксама будаваць сацыялізм, паставіўшы нацыянальныя праблемы на задні план.

Але заганная камуністычная ідэя лопнула, і з летаргічнага сну вярнуліся многія народы. На тэрыторыі былога Савецкага Саюза і Югаславіі пачаўся парад суверэнітэтаў, нацыянальная ідэя выйшла наперад.

У сувязі з гэтым паўстае пытанне: ці магчымы, усё-такі, нейкі альянс паміж лібераламі і нацыяналістамі? Ці магчымы ліберальны нацыяналізм?

І. Тамір (Yael Tamir) у сваёй фундаментальнай кнізе "Liberal nationalism" спрабуе развязаць гэтае пытанне становўча: "Ліберальная традыцыя, з яе стаўленнем да асабістай свабоды, і нацыянальная традыцыя, з яе акцэнтам на прыналежнасць, лаяльнасць і салідарнасць, могуць сапраўды сумяшчацца". І на самой справе, гэта было б ідэальна: нацыяналісты па-сапраўднаму ацэньваюць свабоду асобы і асабістых правоў, а лібералы асэнсоўваюць і прызнаюць важнасць культурных каштоўнасцей, нацыянальнай сведамасці і маральных установак, якія вынікаюць з іх.

Але, нават калі так і будзе, пэўная напружанасць паміж ліберальным і нацыянальным светапоглядам усё роўна будзе, таму што няма ніякіх падстаў, каб ацаніць ступень важнасці таго ці іншага падыходу, і

заўсёды знойдуцца такія, якія будуць больш за лібералаў, і другія, што больш за нацыяналістаў.

Мая пазіцыя наконт ліберальнага нацыяналізму наступная. Жаданне І. Тамір – правільнае і разумнае імкненне, ідэальнае рашэнне праблемы. Але такое гарманічнае спалучэнне лібералізму з нацыяналізмам магчыма толькі ў высакаразвітым грамадстве (напрыклад, у Англіі, радзіме І. Тамір), дзе большасць грамадзян маральныя, культурныя людзі. На этапах жа развалу імперый, у постсавецкіх і посткаланіяльных краінах, у краінах, дзе пануе ірэдэнтысцкі нацыяналізм, ніякай гармоніі паміж лібераламі і нацыяналістамі да пэўнай пары быць не можа. Спачатку трэба пабудаваць нацыянальную еўрапейскага тыпу дзяржаву. А гэта магчыма толькі пры дапамозе маральна якаснай эліты і прыярытэту нацыянальнай ідэі. У адваротным выпадку разгул свабод можа прывесці да здушэння нацыянальнай ідэі, разбурэння асобы. На постсавецкай і посткаланіяльнай прасторы кожная нацыя павінна прайсці шлях Францыі ці Італіі – і тады ліберальны нацыяналізм стане рэальнасцю.

### *Кансерватызм, лібералізм і нацыяналізм*

Каб больш глыбока разумець сувязь, што існуе паміж кансерватызмам і нацыяналізмам, вернемся ў часы напалеонаўскай Францыі. У барацьбе супраць Напалеона нацыяналізм абапіраўся на вялікую нацыянальную спадчыну і выказаў жаданне захаваць гэтую спадчыну. Гэтым самым ён уступіў у шчыльныя зносіны з кансерватызмам. Наагул, тэндэнцыі кансерватызму з цягам часу станавіліся усё больш празрыстымі і зводзіліся да таго, каб улучыць у сябе нацыяналізм як галоўны складнік сваёй ідэалогіі. Фармуляванне нацыянальнай ідэі стала афіцыйным афармленнем кансерватыўных партый. Аднак не заўсёды такі альянс паміж кансерватызмам і нацыяналізмам меў месца. Гэта выклікана тым, што нацыяналізм звяртаецца да пачуццяў людзей, да іх імкненняў і жаданняў, а кола такіх людзей можа ўлучаць не толькі кансерватараў.

*Нацыяналіст дзеля аб'яднання свайго народа ва унітарную нацыю-дзяржаву можа ахвяраваць і традыцыйнымі каштоўнасцямі.*

Менавіта такія матывы былі ўласцівы аб'яднальнікам беларускіх зямель у Вялікім княстве Літоўскім (ВКЛ), шэрагу вялікіх літоўскіх князёў, пачынаючы з Гедыміна, Віценя і Вітаўта, якія прымалі хрысціянства, сведама вызываючы гнеў паганскага насельніцтва. Тое самае было і пры аб'яднанні Прусіі ў XIX ст. Менавіта прускія нацыяналісты ўбачылі нядзольнасць сваёй арміі процістаяць французам, і яны без вагання адкінулі традыцыйную армейскую структуру і іншыя інстытуты.

Хоць філасофія кансерватызму падтрымлівае нацыянальную ідэю і вылучае на першы план стварэнне і захаванне нацыі-дзяржавы, самі кансерватары не любяць, каб іх змешвалі з нацыяналістамі, і выступаюць, магчыма, з-за традыцыйнай боязі адмоўнага адцення, супраць нацыяналізму наогул. Так, Роберт Нісбэт у сваёй класічнай кнізе «Кансерватызм» (Мінск-Вільня, 2000) піша аб тым, што для кансерватараў нацыянальная дзяржава – вялікая каштоўнасць, што для іх светапогляду важна права нацыі на выжыванне, але тут жа дадае, што ўсе гэтыя прынцыпы яны падтрымліваюць «нягледзячы на ціск індывідуалізму і нацыяналізму».

Кансерватызм характарызуецца дзвюма галоўнымі рысамі: 1) традыцыяналізмам – прыхільнасцю да традыцый, мовы, нацыянальнай ідэі, рэлігіі, маральнасці, дзяржаўных сімвалаў і 2) прынцыпам свабоднай рынкавай эканомікі. Па другім пункце кансерватары не маюць разыходжанняў з лібераламі. Аднак пункт гледжання кансерватараў на асобу розніцца ад пункту гледжання лібералаў. На думку кансерватараў, асобу павінна ахоўваць дзяржава, Царква і сям'я. У сувязі з гэтым кансерватары надаюць вялікую ўвагу ўмацаванню дзяржаўнай улады.

Як і нацыяналісты, кансерватары вельмі паважаюць дзяржаўныя сімвалы: сцяг, герб і г.д. Для ліберо-

ралаў жа гэтыя атрыбуты не патрэбныя, хоць "дзеля прыліку" і яны могуць выйсці на дэманстрацыю з нацыянальнымі сцягамі.

А вось у стаўленні да эканомікі абедзве ідэалогіі знаходзяць амаль поўнае адзінства – і тыя і другія лічаць, што эканоміка павінна будавацца на прынцыпах канкурэнцыі, прыватнай уласнасці і свабоднага рынку. У стаўленні да свабоднага рынку розніца паміж абедзвюма ідэалогіямі тычыцца толькі ідэалагічнага абгрунтавання яго выбару. Так, лібералы, напрыклад, лічаць, што рынкавае спаборніцтва вядзе да развіцця і ўзвышэння асобы. Кансерватары знаходзяць абгрунтаванне свабоды рынкавых зносін у натуральных законах прыроды: "Спроба пераразмеркаваць прыбытак дзеля дасягнення эканамічнай роўнасці супярэчыць прыродзе"[1].

Кансерватызм, культывуючы традыцыяналізм, у вялікай ступені носіць рэлігійную афарбоўку. Таму хрысціянска-дэмакратычная ідэалогія шмат у чым супадае з кансерватыўнай. Аднак і тут ёсць разыходжанні. Кансерватызм, следам за лібералізмам, прапаведуе прыватную ўласнасць і канкурэнцыю, і таму з'яўляецца эгалітарнай канцэпцыяй. Хрысціянскія дэмакраты ж надаюць вялікую ўвагу сацыяльным праблемам, нясуць у грамадства хрысціянскую мараль і прынцып роўнасці ўсіх людзей перад Богам.

Такім чынам, кансерватыўная ідэалогія, маючы ў эканоміцы часткова агульную (хоць і з рознымі трактоўкамі) платформу з ліберальнай ідэалогіяй – не мае з лібералізмам нічога адзінага ў цэлым. І гэтыя супярэчнасці маюць тую ж прыроду, што і ў выпадку з нацыяналізмам: абыякавасць лібералізму да нацыянальнай ідэі, мовы, сімвалаў і іншых атрыбутаў, што характарызуюць нацыю.

Тым не менш ёсць палітыкі, якія адносяць сябе да ліберальных кансерватараў. Да такіх людзей звы-

---

[1] Штайнер Юрг. Еўрапейскія дэмакратыі. Мн., 1996.

чайна адносяць расійскага эканаміста, палітыка і філосафа Пятра Струве, дзейнасць якога пачалася крыху пазней за ўжо згаданага намі К. Лявонцьева і прыпадае на канец XIX–пачатак XX стст. У гэты час у Расіі была даволі вялікая колькасць філосафаў, што падтрымлівалі ідэі лібералізму: М. Бярдзяеў, І. Ільін, С. Булгакаў, Е. Трубяцкі і іншыя. Характэрна, што большасць з іх цвёрда стаяла на пазіцыях нацыяналізму і больш за тое яны былі тэарэтыкамі і творцамі канцэпцыі нацыяналізму (М. Бярдзяеў, І. Ільін). Апрача таго, расійскія філосафы таго перыяду ўсё ж абапіраліся на класічны лібералізм і бралі ў яго толькі адзін бок – той, што тычыўся эканомікі і свабоды асобы.

Аднак апошні тэзіс, які тычыцца свабоды асобы, уступае ў супярэчнасць з ідэяй дзяржаўнасці, якую высока ставіў П. Струве. Гэтая супярэчнасць была, дарэчы, яму зразумелая, і ён знаходзіць спосаб пазбегнуць гэтага канфлікту праз нацыянальны дух і нацыяналізм. Струве бачыць Расію як краіну з моцнай дзяржаўнай уладай, бачыць яе манархічнай краінай, шчыльна звязанай з нацыянальнай ідэяй і праваслаўем.

Дзяржаўнасць – гэта інстытут містычны, яна ў меншай меры патрэбна індывідуальнасці, і разам з тым яна без гэтага інстытута не можа існаваць. Каб неяк прымірыць асобу і дзяржаву, П. Струве надзяляе першую рэлігійным і нацыянальным зместам. Ён піша: *Асоба не ёсць складачнае месца. Асоба як рэлігійная ідэя азначае ўвасабленне каштоўнаснага зместу, адзначанае своеасаблівасцю, ці адзінствам, энергіяй, ці напружанасцю... Такі індывідуалізм пераадольвае містыцызм дзяржаўнасці і нацыянальнасці не простым яго адмаўленнем. Урэшце найвышэйшай формай адносін да свету ёсць спалучэнне ў адным мастацкім, рэлігійным, заўсёды асабістым і адзіным, заўсёды аб'ектыўным і абавязковым, змесце найвялікшай здольнасці перажываць, узнавіць у сабе свет, з поўнай свабодай адносін да*

*ўсяго ў гэтым свеце*[1]. Надаючы асобе такія рысы, як рэлігійнасць і нацыянальны дух, П. Струве, фактычна, становіцца на пазіцыі антыліберылізму, бо для апошняга свабода асобы вышэй за ўсё. Ніколі ліберал не скажа такім чынам, як Струве: *Ніхто не здольны лепш, чым рэлігійны індывідуаліст, зразумець, што гонару і велічы дзяржавы можна ахвяраваць жыццём сваім і іншых людзей; ніхто не здольны яскравей адчуць неадольную сілу нацыянальнай ідэі і зразумець, што хоць палякам у Познані «разумней» і практычней станавіцца немцамі, яны, любячы сваю нацыянальнасць, павінны за яе змагацца.*

Падагульняючы, можна сказаць, што погляды П. Струве нельга назваць паслядоўнымі ліберальна-кансерватыўнымі і тым больш ліберальна-нацыяналістычнымі. Хутчэй тут, як гэта адзначыў С. Л. Франк[2], ягоны кансерватызм уключае ў сябе лібералізм.

Пазіцыя П. Струве адносна неабходнасці моцнай дзяржаўнай улады непазбежна аддаляе яго ад лібералізму, хоць сам ён так, хутчэй за ўсё, не лічыў. Больш за тое, у некаторых апошніх артыкулах П. Струве (напрыклад, «На разные темы») гучаць шавіністычныя матывы і аддаляюць яго ад класічнага нацыяналізму. У шэрагу сваіх артыкулах ён выступае як прыхільнік гегемоніі ў Расіі расійскага народа: "Я дапускаю, што можна быць у Варшаве ці ў Гельсінгфорсе ўдзельнікам мясцовага культурнага жыцця, не ведаючы рускай мовы, але без гэтых ведаў нельга быць такім удзельнікам ні ў Кіеве, ні ў Магілёве, ні ў Тыфлісе, ні ў Ташкенце... з адной "маларускай", ці "беларускай" культурай ён, як культурны чалавек, пражыць не зможа... Гегемонія рускай культуры ў Расіі ёсць вынік усяго гістарычнага развіцця нашай краіны...".

Сучасныя гістарычныя працэсы паказалі неабгрунтаванасць канцэпцыі "русского гегемона" П. Струве.

---

[1] Струве П. Б. Отрывки о государстве // Patriotica: Политика, культура, религия, социализм. М., 1997.

[2] Франк С. Л. Умственный склад, личность и воззрения П.Б.Струве // Струве П.Б. Patriotica. М., 1997. С. 485.

Нягледзячы на ягоную перасцярогу аб тым, што "создание высшей и средней школы на малорусском языке было бы искусственным и ничем не оправданной растратой сил", сучасная Украіна ўпэўнена крочыць па шляху ўмацавання нацыянальнай дзяржаўнасці, маючы пераважную большасць школ усіх узроўняў на ўкраінскай мове.

Французская рэвалюцыя, якая парадзіла як лібералізм, так і нацыяналізм, адкінула інстытут аўтарытарызму і абвясціла народ (нацыю) найвышэйшай сутнасцю. Тым самым яна абмежавала магчымасці асобы чалавека. Адсюль ідзе разуменне свабоды ў рэчышчы Русо: *сапраўдная свабода вымагае абсалютнай адмовы індывіда ад самаго сябе, ад усяго, што ён мае, у тым ліку і ад сваіх правоў, на карысць таталітарнага рэжыму*. Гэты погляд, уласцівы ранняму нацыяналізму, часам непрымальны кансерватарамі, і, як лічыць Р. Нісбет, лібералізм у гэтым ракурсе, па-сутнасці, траянскі конь таталітарызму.

Адкінуўшы індывідуальныя адметнасці індывідумаў, у тым ліку нацынальныя асаблівасці і традыцыі, лібералы спрыяюць стварэнню грамадства "масавага тыпу", тым самым пракладваючы шлях да таталітарызму. Італьянскі фашызм, на думку Крыстафера Даўсана, ёсць прадукт лібералізму.

С. Г. Грыгор'еў, ідучы следам за Оўкшокам, сцвярджае, што ягоны кансерватызм намнога чалавечнейшы за сучасны расійскі лібералізм, таму што бачыць у чалавеку годнасць і станоўчы патэнцыял, а не матэрыял для збудавання лепшага капіталістычнага будучага[1].

У аснове лібералізму ляжыць тэорыя спантаннага парадку, ці самарэгуляцыі, якая з'яўляецца крыніцай рацыяналізму і накіравана супраць кансерватызму і нацыяналізму. Як мы ўжо казалі вышэй, нацыянальная ідэя, нацыяналізм – гэта трансцэндэнтныя паняцці і ляжаць па іншы бок рацыянальнага мыс-

---

[1] Григорьев С.Т. Преодаление заданности // Полис. 199, № 3.

лення. Нацыі і нацыяналізм не могуць быць прадуктамі сінергетычных працэсаў. Таму трыумф нацыяналізму ў XX ст. сведчыць аб тым, што нельга механічна пераносіць ідэі самаарганізацыі, стахастычнасці і сінергетыкі на чалавечую супольнасць. Гэты не зусім абгрунтаваны для дадзенай праблемы шлях абралі, напрыклад, некаторыя аўтары[1] ў памянёнай намі кнізе "Беларуская нацыянальная ідэя".

Сучасны кансерватызм ахоплівае вялікі спектр палітычных партый, якія розняцца сваім стаўленнем да ідывідуалізму і аўтарытарызму. Прыхільнікі моцнай улады ў еўрапейскіх краінах носяць назву Новыя правыя радыкалы і аб'ядноўваюць у сваіх шэрагах найбольш радыкальных палітыкаў. Больш падрабязна мы разгледзім дзейнасць НПР у раздзеле «Нацыяналізм і фашызм».

Памяркоўнае крыло сучасных кансерватараў аддае перавагу правам асобы і ў гэтым кірунку сутыкаецца з хрысціянствам, дзе паводле асноўных пастулатаў: а) чалавек ёсць найвышэйшае тварэнне Бога і б) чалавеку дадзена свабода – права выбару паміж дабром і злом. Шэрагам кансерватараў выкарыстоўваецца ў сувязі з гэтым назва "хрысціянскія дэмакраты". Такія партыі ёсць, напрыклад, у Германіі і Галандыі.

Такім чынам, лібералізм і кансерватызм ужо па сваёй сутнасці супярэчаць адно аднаму. Ліберальны кансерватызм, які меў часам рацыю (прынамсі, пасля Французскай рэвалюцыі 1789 г. ці ў Расіі часоў П. Струве) непазбежна вядзе да краху гэтай камбінаванай ідэі і да зусім адрознай трактоўкі сучасных палітычных падзей і прагнозаў на будучыню.

Нацыяналізм і кансерватызм маюць шмат чаго супольнага – у абедзвюх ідэалогіях асаблівае, уважлівае стаўленне да традыцый, мовы, нацыянальных сімвалаў. Нацыяналізм і кансерватызм маюць нават

---

[1] Жыбуртовіч А., Жыбуртовіч В. Самаарганізацыя – галоўная ідэя развіцця нацыяў // Беларуская нацыянальная ідэя. Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі. Горадна, 1999, Мн., 2000.

супольных творцаў, такіх як Бёрк, Кедуры і іншыя. Розніца паміж нацыяналізмам і кансерватызмам у змене акцэнтаў. Напрыклад, для кансерватараў вялікае значэнне мае сям'я, для нацыяналістаў жа сям'я – рэальнасць ніжэйшага плану ў параўнанні з нацыяй. Гэта адлюстравана ў нашай эвалюцыйнай схеме, якая разглядаецца ніжэй, у раздзеле VI. Кансерватары шануюць інстытут Царквы – нацыяналізм жа часта выступае як замена рэлігіі, а ў выпадку пратэстанцтва ён узяў на сябе функцыю спадкаемцы Руху за тысячагадовае Валадарства Божае.

### *Нацыяналізм і фашызм*

Большасць даследнікаў лічаць нацыяналізм адносна новай з'явай, пачатак якой паклала французская рэвалюцыя 1789 г. На працягу наступнага XIX ст. нацыяналізм фармаваўся, удасканальваўся, пакуль не выкрышталізаваліся яго адметныя рысы. Фашызм жа з'явіўся больш чым на 100 гадоў пазней за згаданыя падзеі.

Цяпер цяжка сказаць, калі ўпершыню з'явілася неадэкватная канцэпцыя блізкасці і нават тоеснасці нацыяналізму і фашызму. Магчыма, гэта стала вынікам Другой сусветнай вайны, дзе фашысцкая ідэалогія, што мела ў Германіі назву нацыянал-сацыялізму, пацярпела крах пасля 1945 г. і стала забароненай. Блізкасць па гучанні слоў нацыст і нацыяналіст таксама адыграла не апошнюю ролю ў дыскрэдытацыі нацыяналізму. І таму ў сведамасці многіх людзей і нават народаў склалася ўстойлівае ўяўленне, што нацыяналізм ставіць сваю нацыю вышэй за іншыя нацыі, імкнецца падмяць пад сябе і знішчыць шляхам гвалту і вайны. У сапраўднасці такой ідэалагемай быў адметны толькі фашызм і расізм, ды яшчэ блізкі да іх шавінізм.

У афіцыйнай фармулёўцы БелСЭ сказана, што фашызм гэта “адкрыта тэрарыстычная частка найбольш рэакцыйнай і агрэсіўнай імперыялістычнай буржуазіі... крайні шавінізм і расізм”. Як бачым,

нават з гэтай савецкай фармулеўкі відаць блізкасць тэрмінаў фашызм і шавінізм. Больш за тое – гэтыя ідэалогіі, па сутнаці, аднолькавыя, яны адлюстроўваюць адну і тую ж з`яву. Толькі першая – фашызм – адносіцца найбольш да гітлераўскай Германіі і некаторых яе сатэлітаў, а другая – да Расійскай Імперыі ды камуністычнага Савецкага Саюзу. І нічога супольнага з гэтымі паняццямі слова “нацыяналізм” не мае. Наадварот, нацыяналізм – антыпод фашызму.

І ўсё ж, як адзначалася вышэй, існавала і іншая парадыгма: «нацыяналізм – гэта амаль тое, што і фашызм». Як ніякая іншая, яна прыйшлася даспадобы касмапалітам усіх масцей. Абапіраючыся на сусветны ліберальны капіталізм, а таксама камуністычныя партыі, на Захадзе паспяхова культываваліся ідэі касмапалітызму – прынамсі да 80-х гг.ў XX ст. Ва Усходняй Еўропе і СССР гаспадарыла камуністычная тэорыя, згодна з якой нацыі павінны былі знікнуць у эпоху камунізму. Мандыялісцкая тэорыя зліцця нацый ліберальнага Захаду пачала нават ажыццяўляцца на практыцы, але на Усходзе. Так, у Беларусі ў 60–70-я гг. XX ст. некаторыя старшыні калгасаў шчыра бралі сацзабавязанні да пэўнага тэрміну перавесці навучанне і справаводства на рускую мову. Беларускія школы ліквідаваліся ці пераўтвараліся ў русскія. Асабліва моцная хваля барацьбы з усім нацыянальным прыпала на 1961 г., калі былі ліквідаваны амаль усе беларускія школы ў гарадах і мястэчках. Толькі з 1990-х гг., пасля развалу СССР, пачаўся перагляд стаўлення да нацыянальных праблем.

Зразумела, што пры такіх неспрыяльных умовах не магло быць і гаворкі аб навуковым вывучэнні такой з’явы, як нацыяналізм. І на шмат гадоў – ад часоў рускіх філосафаў пачатку XX ст. да 1990-х гг. – даследаванне праблем нацыяналізму фактычна звялося да нуля. На Захадзе і ў ЗША ў вывучэнні нацыяналізму не было такога вялікага перапынку, як у былым СССР. У шэрагу гэтых краін касмапалітызм мірна суіснаваў побач з нацыяналізмам, а масавае самавыз-

начэнне нацый і з'яўленне новых дзяржаў у канцы XX ст. вызначыла паразу касмапалітызму і паклала канец тэорыі зліцця нацый.

Камуністычная ідэалогія – марксізм-ленінізм, што панавала ў СССР амаль усё XX ст., не на голым месцы вызначыла нацыяналізм як адмоўную з'яву, як імкненне адной нацыі навязаць свае парадкі іншай. Яшчэ ў эпоху росквіту рэлігійна-філасофскай думкі ў Расійскай Імперыі ідэолагі імперскай палітыкі (шавінізму) распрацавалі тэорыю гегемона рускага народа і ўвялі ў афіцыйны ўжытак слова "нацыяналізм" і "нацыянальны рух" для абазначэння тых нацыянальна-вызволенчых рухаў, што ўзніклі на тэрыторыі вялізнай дзяржавы. Да такіх актаў належыць і беларуска-польскае паўстанне 1863–1864 гг., каўказскія вызваленчыя рухі і іншыя. Хоць мы і гаварылі вышэй, але яшчэ раз падкрэслім: стаўленне да нацыяналізму як да крайне радыкальнай і антыгуманнай ідэалогіі ўзнікла не адразу і не ў апошні час – яно мае векавую гісторыю і таму так трывала трымаецца і ў наш час.

Аднак нельга і адмаўляць тое, што некаторыя формы нацыяналізму пры пэўных умовах могуць перайсці ў іншую якасць, якая нагадвае фашызм і, нават, пераходзіць у яго. Гісторыі вядомыя такія выпадкі.

Нацыяналізм, які перасягнуў межы, вызначаныя ў фармулёўцы Б. Штэйнера (прыведзенай у першым раздзеле) толькі ў адным пункце: "Нацыяналізм – гэта... абыякавасць ці варожасць у адносінах да некаторых нацый, асабліва да былых прыгнятальнікаў" у выпадку замены гэтага пункта фразай: "Нацыяналізм – гэта варожасць і пагарда да іншых нацый" – становіцца фашызмам. Такі нацыяналізм называюць таксама ***крайнім, альбо негатыўным нацыяналізмам***.

Класік тэорыі нацыяналізму М. Бярдзяеў бачыў небяспеку такой формы нацыяналізму. У ягоных творах разглядаецца варыянт крайняга нацыяналізму, які атрымаў назву "месіянскі нацыяналізм", ці про-

ста месіянізм. М. Бярдзяеў вызначае месіянізм як з'яву з вытокамі ў рэлігіі, якую можна зразумець толькі містычна.

Першым прыкладам месіянізму – яшчэ задоўга да надыходу эпохі нацыяналізму – быў месіянізм габрэйскага народа. На працягу многіх стагоддзяў да прышэсця Хрыста габрэі былі богаабраным народам, які асэнсоўваў сваю выключнасць і не дапускаў іншых народаў да сябе. Хрысціянства паклала канец габрэйскаму месіянізму і дала штуршок новаму мысленню, паводле якога любы народ можа стаць народам-месіяй, калі асэнсуе сваё хрысціянскае прызначэнне. На мяжы XIX і XX стст., у час, калі яшчэ і не адчуваліся будучыя фашысцкія "эксперыменты", Бярдзяеў празарліва вылучыў асаблівасці германскага месіянізму. Ён пісаў, што германскі народ усведамляе сябе "не носьбітам Хрыстовага Духу, а носьбітам найвышэйшай і адзінай духоўнай культуры. Германская раса – абраная найвышэйшая раса"[1]. Менавіта гэтыя тэзісы, разам з антыхрысціянствам Фрыдрыха Ніцшэ, і сталі базавым звяном будучага нямецкага нацыянал-сацыялізму.

У пытаннях узаемаадносін паміж месіянізмам і "чыстым" нацыяналізмам М. Бярдзяеў прытрымліваўся такой думкі: першы (месіянізм) належыць да *асаблівага, духовага* парадку. "Месіянізм суадносіцца з нацыянальным, як другое нараджэнне містыкаў суадносіцца з першым прыродным нараджэннем" ("Судьба России"). У творах М. Бярдзяева гучыць вялікая вера ў месіянізм расійскага народа, і гэты месіянізм ён лічыць станоўчым нацыяналізмам, "безумным духовно-творческим порывом".

Менавіта паняткі "месіянскі нацыяналізм", "адмоўны, негатыўны нацыяналізм" у іх дачыненнях да фашызму як ідэалогіі і палітычнай практыкі павінны браць на ўзбраенне навукоўцы, даследнікі сучасных палітычных працэсаў.

---

[1] Бердяев Н. Судьба России. М., 1918. С. 104.

Італьянскі фашызм і нямецкі нацыянал-сацыялізм 20–40-х гг. XX ст. пераўтварылі Італію і Германію ў таталітарныя дзяржавы. У сувязі з гэтым дзяржаўную ідэалогію такіх краін можна назваць "таталітарным нацыяналізмам", у процілегласць традыцыйнаму дэмакратычнаму нацыяналізму, ці інакш – "вольнасцёваму нацыяналізму[1]". Італьянскі і германскі фашызм, ці "таталітарны нацыяналізм", уздзейнічалі і на іншыя краіны: Нарвегію, Данію, Галандыю, і нават на краіны Усходняй Еўропы (напрыклад, Румынію). Але распаўсюджванне фашызму, як рэакцыю на гэта, выклікала развіццё дэмакратычнага нацыяналізму: польскага, румынскага (Зялёная гвардыя), іспанскага (Palanga), эстонскага (Рух Ваўсаў).

Найбольш важным вынікам сучаснага аналізу суадносін паміж нацыяналізмам і фашызмам ёсць тое, што нацыяналізм і фашызм, а таксама яго найбліжэйшы родзіч – нацызм, – гэта антыподы. Адзіны для абедзвюх ідэалогій панятак «нацыя» не збліжае іх, а разводзіць іх да бясконцасці, ставіць іх па іншыя бакі барыкад.

Патлумачым сказанае, абапіраючыся на гістарычныя факты. Узнікненне фашызму адносіцца да 1920-х гг. і звязана з фігурамі Беніта Мусаліні ў Італіі і Адольфа Гітлера ў Германіі, дзе ён насіў назву "нацыянал-сацыялізм". Мусаліні сцвярджаў: "У аснове фашызму ляжыць канцэпцыя Дзяржавы, фашызм лічыць Дзяржаву абсалютнай, у параўнанні з ёй усе індывідуумы або групы адносныя... Фашысцкая дзяржава – гэта форма, нутраны закон і дысцыпліна ўсёй асобы. Яна працінае волю і інтэлект..."[2]. (Фашызм – гэта культ гвалту. У першай палове XX ст. ён узвёў тэорыю звышчалавека ў ранг дзяржаўнай палітыкі. Чалавек сілы ўладарыць над слабымі і ў гэтай барацьбе творыць гісторыю. Фашызм узяў сабе ў са-

---

[1] Popel L. Nationalizm wolnościowy//Mysl narodowa Polska, № 2(6), 1991.

[2] Mussolini B. The political and Social Doctrine of Fashizm. Hagarth Press. London, 1936.

юзнікі не марксісцкі, папулісцкі варыянт сацыялізму, які абапіраўся на збяднелыя слаі рабочых і сялян, выступаў супраць ліберальнага капіталізму.

Фашызм – гэта нават не ідэалогія, а спосаб дзеяння і спосаб самасцвярджэння ў навакольным свеце, пры якім асабістае "Я" становіцца ў шэраг такіх асоб, якія адзіныя ў сваёй перавазе над іншымі групамі, нацыямі і расамі, ставяць сябе вышэй за іх і нават дапускаюць атаясамліваць сябе, хоць і не цяпер, а ў будучым, з Вышэйшай істотай – з Богам.

Для немцаў Трэцяга Рэйха такой групай звышлюдзей стала арыйская раса. Немцы аб'явілі сябе арыйцамі і ўзялі дэвіз: "Deutschland über alles".

Як і нацыяналізм, фашызм аддае вялікую ўвагу нацыі. Аднак бачанне нацыі ў іх вельмі рознае. Нацыяналісты лічаць, што нацыя ёсць супольнасць людзей, паядн аных салідарнасцю і павагай да сваіх сяброў. Фашысты трактуюць нацыю зусім інакш. Для іх нацыя – гэта "цытадэль улады", "апірышча і зброя для гуртавання волі і сілы чалавека". Нацыя становіцца, па сутнасці, інструментам ажыццяўлення гвалту. У сувязі з сказаным становяцца зразумелымі і вядомыя звышвысокія патрабаванні нацыстаў да чысціні нацыі.

Чаму ж у Германіі натуральнае стаўленне да нацыі, уласцівае ўсім цывілізаваным народам і разгледжанае намі ў пачатку артыкула ў кантэксце нацыяналізму, прыняло такі пачварны характар у часы Трэцяга Рэйха? Адказ трэба шукаць у гістарычным дыскурсе, і нашмат раней за разгляданыя падзеі – у першай палове XIX ст. У тыя часы Германія ўяўляла хаатычны набор рознакаліберных княстваў і значна адставала ад перадавых еўрапейскіх краін (Францыі, Англіі) як у культурным сэнсе, так і ў сацыяльна-эканамічным. Усё гэта нарадзіла пэўны комплекс няпаўнавартасці ў маштабах нацыі. Няма культурнай перавагі, але ёсць затое перавага ў нацыянальнай чысціні. Высілкамі Фрыдрыха Людвіга Яна (1810) і пазней Вольфанга Менцэля сфармаваліся расавыя ўяўленні аб чысціні

нямецкай нацыі, якія дазволілі адкінуць аўтарытэт высокай французскай культуры. Да другой паловы XIX ст. адносяцца ўжо і першыя захады ўслаўлення ваеннай моцы нямецкага народа (Арндт, Трайчке). Далейшы шлях фармавання фашысцкай ідэалогіі (пасля эканамічнага крызісу 1873 г.) звязаны з такімі імёнамі, як Габіно, Альварт і нават славутым кампазітарам Рыхардам Вагнерам (Die Walkure).

Яшчэ да прыходу Адольфа Гітлера да ўлады ў Германіі была дасканала ўзрыхлена глеба для выспявання ідэалогіі "новага месіянства" немцаў як арыйскай нацыі. У 1928 г. выйшла кніга Германа Вірта "Паходжанне чалавецтва", дзе аўтар даказваў, што ў вытоках чалавецтва стаяць дзве расы: нардычная – духоўная раса Поўначы і гандванічная – ахопленая ніжэйшымі інстынктамі раса Поўдня. На выставе 1933 г. "Ahnenerbe" (спадчына продкаў) у Мюнхене Вірт дэманстраваў старажытныя рунічныя і протарунічныя пісьмёны. Гэтая выстава мела вялізны поспех у выклікаючай да гэтага часу жах арганізацыі пад назвай СС, якая і паставіла сваёй задачай абарону нардычнай расы (нямецкай нацыі) у генетычным, духоўным і містычным плане.

У сувязі з сказаным становіцца зразумелым, што прыход у 30-я гг. XX ст. да ўлады А. Гітлера і абвяшчэнне нацызму дзяржаўнай ідэалогіяй, было не выпадковым – да гэтага часу ўжо сфармаваліся яе асноўныя ідэі ў выглядзе ўяўленняў аб найвышэйшай арыйскай расе – немцах, аб "блакітнай крыві" і іншых "адметнасцях" нямецкай нацыі.

Але ў адрозненне ад суседняй Францыі, дзе ўтварылася нацыя высокай культуры, што дала пачатак дэмакратычным традыцыям, – у Германіі ўзнік аўтарытарны рэжым, культ улады, які вымагаў высокай дысцыпліны і парадку дзеля захавання чысціні нацыі. Такім чынам, нацыяналізм у Германіі ўжо на стадыі свайго фармавання набываў адметныя формы, якія ўсё больш розніліся ад агульнаеўрапейскіх норм, якія прадугледжвалі прынцыпы роўнасці нацый і любові

індывідуума да сваёй нацыі. Гэтая крайняя, гранічна негатыўная форма нацыяналізму атрымала назву фашызм і ў адносінах да свайго прабацькі – нацыяналізму – стаіць ужо на палярна процілеглых пазіцыях.

У цытаванай вышэй кнізе Энтані Сміта цэлы раздзел прысвечаны параўнальнаму аналізу нацыяналізму і фашызму, дзе пераканаўча паказана заганнасць фашызму і яго процілегласць нацыяналізму.

Аднак адна вельмі істотная акалічнасць не разгледжана Э. Смітам. Яна тычыцца асуджэння фашызму, які адбыўся на судовым працэсе ў 1946 г. у горадзе Нюрнбергу. Асуджэнне ідэалогіі фашызму вельмі важны крок, бо гэта спроба паставіць заслону перад будучымі неафашысцкімі ідэямі, тэорыямі і арганізацыямі, якія ажыццяўляюць такія ідэі. Гэта перасцярога ўсім будучым пакаленням людзей.

*Нацыя* і *нацыяналізм як яе ідэалогія* ўзніклі натуральным чынам, у выніку эвалюцыі чалавецтва, створаны яны паводле Найвышэйшай Божай задумы і маюць сваё абгрунтаванне ў хрысціянстве. Што тычыцца *фашызму*, то ён узнік зусім не па законах эвалюцыі, не ў выніку ўдасканалення сусвету. Ён узнік у часы еўрапейскага крызісу 20-х гг. XX ст. як мутант, як рэакцыя часткі людзей з хваравітай псіхікай і самалюбівым характарам, каб сцвердзіцца ў жыцці. Гэта скрыўленне чалавечага шляху, скрыўленне гісторыі, і пра гэта нельга забываць.

Нюрнбергскі працэс да гэтага часу памятны людзям усёй зямлі, і сучасныя прыхільнікі Гітлера – Мусаліні баяцца адкрыта выказваць свае намеры і прапагандаваць неафашызм. Аднак такія арганізацыі неафашысцкага кшталту ўсё ж існуюць у некаторых краінах – як Заходняй Еўропы, так і Усходняй, у тым ліку ў рэспубліках былога СССР. Такі рух у сучаснай палітыцы называюць па-рознаму. Юрг Штайнер, напрыклад, адносіць яго да трансфармаванага кансерватызму[1] і называе гэтую плынь Новымі пра-

---

[1] Штайнер Юрг. Еўрапейскія дэмакратыі. Мн., 1996.

вымі радыкаламі (НПР). Месцамі НПР набываюць значную сілу, як гэта адбылося ў 1999 г. ў Аўстрыі, калі да ўлады прыйшоў лідэр НПР Ёрг Хайдэр.

Пры разглядзе крайніх нацыяналістычных рухаў і неафашыстаў трэба, аднак, быць уважлівымі і асцярожнымі, каб не змяшаць разам з імі і тыя партыі, якія не з'яўляюцца фашыстоўскімі, не стаяць на пазіцыях культу сілы, хоць па некаторых прыкметах іх у свой час чамусьці аднеслі да фашысцкіх. Да такой партыі адносіцца, напрыклад, Нацыянальны Фронт у Францыі, які ўзначальвае Жан-Мары Ле Пэн. Адной з вызначальных рыс Нацыянальнага Фронту з'яўляецца тое, што ён падтрымаў ксенафобію і гэтым самым значна наблізіўся да канцэпцыі негатыўнага нацыяналізму, які яшчэ не з'яўляецца фашызмам, але ўяўляе ўжо нешта пераходнае. Перасцярога партыі Ле Пэна ад наплыву ў Францыю іншаземцаў мае падставы, яна блізкая да думак многіх простых французаў, і таму не дзіўна, што ў 1993 г. на выбарах у французскі парламент партыя набрала 12 % галасоў.

Было б не поўным, калі б у сувязі з разгляданай праблемай мы не кранулі і постсавецкі абшар. У Расіі, ды і па-за яе межамі (у прыватнасці, Беларусі) ужо колькі гадоў узрушвае грамадства адмысловая партыя – "Рускае нацыянальнае адзінства" (РНА) (Расійская абрэвіятура – РНЕ). Пад прыкрыццём тыпова шавіністычных лозунгаў, выстаўляючы сябе адзінымі абаронцамі Расіі і рускай нацыі, гэтая партыя сваімі дзеяннямі паказала сябе як тыповая арганізацыя гранічна негатыўнага нацыяналізму. Тут і габрэйскія пагромы і крывавыя сутыкненні з іншымі нацыянальна арыентаванымі арганізацыямі (напрыклад, бойкі з сябрамі БНФ у Беларусі). А сімволіка "байцоў" з РНА, выкананая ў выглядзе свастыкі "ў кручэнні", – гэта ўжо заяўка на сапраўдны неафашызм. Характэрна, выяву гэтай сімволікі ідэолагі РНА знаходзяць у далёкай мінуўшчыне, у так званых "славянскіх ведах". Тое самае было ў свой час і ў Германіі, калі пры станаўленні нацызму яго тэарэ-

тыкі знаходзілі карані фашызму і яго сімволіку ў рунічных пісьмёнах дахрысціянскай эпохі.

На дзіва падобныя да нацысцкіх "нардычных" фантазіяў пошукі старажытных вытокаў сваёй ідэалогіі ў тэарэтыкаў РНА: "Галоўным сімвалам РНА з'яўляецца Зорка Багародзіцы са змешчанай унутры яе свастыкай у кручэнні. Гэта сімвал, найбольш адпаведны Рускаму Нацыянальнаму Архетыпу" – пішацца ў партыйнай газеце РНА "Русский порядок" (№ 6–7, 1994 г.) .

Такім чынам, гранічна негатыўны нацыяналізм разам з ідэалогіяй сусветнага панавання асобнай, арыйскай расы – гэта і ёсць **поўны фашызм.** Імкненне да сусветнага панавання, нацыянальны імперыялізм – істотныя рысы фашызму любой нацыянальнай афарбоўкі. Таму сёння ўяўляецца вельмі небяспечным фармаванне **масавага імперскага сіндрому** не толькі РНА, але і іншымі, колькасна больш моцнымі і ўплывовымі партыямі – КПРФ, ЛДПР і іншымі.

Лідэр адной з самых уплывовых партый Расіі – КПРФ – Г. Зюганаў адкрыта аб'вясціў аб адраджэнні старой формулы Д. Хамякова "Праваслаўе. Самадзяржаўе. Народнасць". На яго думку, у гэтай формуле заключана паслядоўнае станаўленне трох галоўных пачаткаў імперскай дзяржаўнасці: рымскае права, хрысціянскае адзінства і народнае адзінства ў Русі-Расіі. Даводзіцца толькі здзіўляцца, наколькі моцна перафарбаваліся сучасныя расійскія камуністы, што і ў Хрыста паверылі, марачы аб былой імперыі.

Імперская хвароба яшчэ ў большай ступені прысутнічае ў ідэалогаў Ліберальна-дэмакратычнай партыі Расіі (ЛДПР), якую рэгулярна агучвае Уладзімір Жырыноўскі. У сваёй кнізе "Последний бросок на Юг" У. Жырыноўскі не толькі аб'ядноўвае ўсіх славян пад агульнай страхой рускага народа, а прасоўвае межы Расіі аж да Індыйскага акіяна. "Зрабіць яшчэ рывок, невялікі рывок на поўдзень, каб туды спусціліся шырокакалейныя рускія чыгункі і цягнікі – Масква – Дэлі, Масква – Кабул, Масква – пабярэжжа Індыйскага акіяна, Масква – Тэгеран...".

Што гэта, як не адкрыты заклік да новай імперскай каланізацыі, генацыду. Менавіта такі "рывок" збіраўся рабіць і Адольф Гітлер, каб вызваліць савецкія народы ад камунізму, а астатнія – ад дэмакратычнага "загнівання". Такім чынам, славянафільства непазбежна прыводзіць да вялікадзяржаўнага шавінізму, які, фактычна, з'яўляецца ўсходнім варыянтам фашызму. А яшчэ сто гадоў назад У.Салаўёў папярэджваў, што будучыня славянафільства – дэградацыя і выраджэнне ("Славянофильство и его вырождение"). Ён сканструяваў нават формулу, якую А. Янаў назваў лесвіцай Салаўёва: пакланенне народнай дабрадзейнасці – пакланенне народнай сіле – пакланенне народнаму дзікунству. Гэта тры ўніз зыходзячыя ступені псеўдапатрыятызму. Гэта шлях антыэвалюцыі, шлях у нікуды.

Падагульняючы, трэба сказаць наступнае: фашызм абапіраецца не на эвалюцыйную тэорыю развіцця грамадства, крышталізацыю векавых традыцый народа, умацавання нацыянальнай сведамасці, як гэта робіць нацыяналізм. Фашызм робіць нацыю падпарадкаванай містычным ідэям накшталт "чысціні" і тым самым прыніжае нацыю. У гэтым яго карэннае адрозненне ад нацыяналізму, які накіраваны на развіццё нацыі, на выяўленне найлепшых адметных рыс кожнага самага маленькага народа. Можна сказаць, што нацыяналізм – гэта прынцып дэмакратыі (роўнасці), размеркаваны сярод нацый, а фашызм – аўтарытарызм сярод нацый па аналогіі з суб'ектамі ў асяроддзі асобнай нацыі-дзяржавы.

Такім чынам, нацыяналізм і фашызм – гэта не тоесныя і нават не роднасныя, а, па-сутнасці, процілеглыя з'явы і паняткі. Нашы высновы вельмі блізкія да высноў ведамага філосафа і палітолага XX ст. Э. Сміта, які пісаў: "...фашызм і нацызм уяўляюць з сябе альтэрнатыву і выклік нацыяналістычнаму еўрапейскаму і сусветнаму бачанню развіцця, а не працяг яго".

Уступаючы ў трэцяе тысячагоддзе пасля Нараджэння Хрыстовага, трэба выразна ўсведамляць рэ-

альнасць існавання істотна розных з’яў, звязаных з паняццем нацыі.

Па-першае, гэта класічны, чысты нацыяналізм, пра які мы вялі гаворку з самага пачатку. З ім звязаны такія высокія пачуцці, як патрыятызм, хрысціянская любоў да свайго народа і наогул прагрэс і будучыня народаў.

Па-другое, існуюць і крайнія, негатыўныя формы нацыяналізму, якія звязаны з неапраўданымі вераваннямі ў абранасць ці выключнасць сваёй нацыі. Гэта мы бачым на прыкладзе “богаабранага” габрэйскага народа і славянафілаў часоў расійскага імперыялізму. Гэтыя формы нацыяналізму яшчэ не ўяўляюць феномен фашызму, але пры пэўных умовах могуць перайсці ў яго.

Па-трэцяе, XX ст. дало нам і прыклад альтэрнатывы нацыяналізму, яго антыподу ў сэнсе стаўлення да нацыі. Гэтым паняткам з’яўляецца фашызм – самая крайняя форма нацыяналізму, калі любоў да сваёй нацыі пераходзіць у стаўленне да яе як да апірышча гвалту, бессэнсоўную, крывавую “чыстку” свайго народа – як гэта было ў фашысцкай Германіі і ў СССР сталінскіх часоў, калі ролю арыйскай нацыі ўзялі на сябе камуністы.

Апошнія палітычныя падзеі (найперш ваенныя дзеянні ў Чачні і Сербіі), наўпрост звязаны з разгледжанымі пытаннямі, яны закранаюць самым беспасярэднім чынам нацыянальныя праблемы. Ад правільнага падыходу да праблем суіснавання розных нацый, пытанняў самавызначэння народаў залежыць будучыня гэтых народаў і будучыня чалавецтва наогул.

Сказанае пацвярджае важнасць паліталагічнага аналізу канкрэтных праяў фашызму ў свеце і яго суадносін з нацыяналізмам. Гісторыя павінна ўсё ж нечаму навучыць нас.

### *Нацыяналізм і камуністычная ідэалогія*

Нацыяналізм заўсёды быў ворагам камуністычнай ідэалогіі, а камуністычныя дзеячы ў сваю чаргу пры-

пісвалі нацыяналізму буржуазную прапаганду і змагаліся з ім як з прадуктам капіталізму. І сапраўды, – сцвярджалі прыхільнікі навуковага камунізму, – панятак "нацыя" ўжываецца ў адносінах як да класа пралетарыяў, так і да класа капіталістаў, але ж капіталізм мусіць згінуць, людзі стануць роўнымі, і тады настане адзінства сярод людзей, якія не будуць дзяліцца на нацыі. Настане шчаслівае камуністычнае грамадства, дзе ўсе людзі радасна адпачываюць і творча бавяць час. Савецкі Саюз яшчэ да Другой сусветнай вайны цаной вялізных ахвяр, цаной тысяч загінуўшых у гулагаўскіх лагерах грамадзян даў урок усяму свету, як будаваць камунізм. Дзякуючы надзвычайнай сакрэтнасці, камуністычнае кіраўніцтва здолела прадэманстраваць вонкавы эфект поспехаў, цалкам схаваўшы свае злачынныя дзеянні супраць свайго ж народа.

Вынікам такой палітыкі стала адносна вялікая папулярнасць сацыялістычных і камуністычных ідэй у шэрагу краін, галоўным чынам трэцяга свету. Пасля Другой сусветнай вайны ў гэтых краінах пачаўся шырокі антыкаланіяльны рух, які спалучаў нацыянальныя пачуцці многіх народаў з марксісцкай ідэалогіяй. Энтані Сміт увёў нават тэрмін – "марксісцкі нацыяналізм".

Што ж знайшлося супольнага паміж нацыяналізмам і марксізмам-ленінізмам? На гэтае пытанне ёсць, як лёгка ўбачыць, станоўчы адказ. Абедзве ідэалогіі засцерагаюць ад адчужэння чалавека, характэрнага для капіталістычных краін. Нацыяналісты змагаюцца за лепшую будучыню сваёй дзяржавы, дабрабыт свайго народа для іх – першасная задача. Камуністы таксама, галоўнай мэтай маюць лепшую, ідэальную будучыню свайго грамадства. На гэтай платформе – адзінства ў мэтах супрацьдзеяння рацыянальнаму, мандыялістычнаму грамадству, характэрнаму для многіх краін Захаду, і будуецца марксісцкі нацыяналізм. Найбольшае распаўсюджанне марксісцкі нацыяналізм атрымаў у краінах трэцяга свету: на Кубе, у Анголе, В'етнаме, Мазамбіку. Працэсы, якія ад-

быліся ў гэтых краінах, нагадвалі раннія нацыяналістычныя рухі часоў французскай рэвалюцыі 1789 г. З той толькі розніцай, што папярэднікам сучасных будаўнікоў нацыянальных дзяржаў не быў вядомы марксізм. У далейшым будзем называць гэты варыянт сучаснага нацыяналізму "левым".

Вялікую ролю ў распаўсюджанні левага нацыяналізму ў краінах трэцяга свету пасля Другой сусветнай вайны, а таксама ў краінах Усходняй Еўропы, адыграла перамога СССР у вайне супраць фашызму, і як вынік перамогі – зацвярджэнне статусу звышдзяржавы. Калі краіны Усходняй Еўропы былі вымушаны прыняць савецкую мадэль пабудовы камунізму, то ў Азіі і Афрыцы марксісцкі нацыяналізм прыйшоў знутры, знайшоўшы сабе спрыяльную глебу ў аморфным, збяднелым і адсталым народзе, для якога прымітыўная і папулісцкая рыторыка камуністаў была як бальзам. Марксізм прываблівае іх абяцаннямі сацыяльнага і палітычнага развіцця. Сапраўды, вонкава Савецкі Саюз выглядаў у пэўныя часы даволі прыстойна. Гэта была дзяржава, якая мела моцны ваенны патэнцыял, мела першынство ў свеце ў асваенні космасу, была вядучай у навуцы і многіх іншых сферах быцця. Савецкі марксізм разглядаўся, як піша Р. Лоўентал[1], "не як шлях да пераадольвання чалавечага самаадчужэння праз свядомую рэвалюцыйную працу, а як метадалогія выхаду са стану палітычнай і вайсковай залежнасці і дасягнення сапраўднага парытэту з Захадам".

Прыхільнікам савецкага камунізму не быў вядомы другі бок медаля савецкай сістэмы: мала хто ведаў, якая цана была заплочана за тую ваенную моц і прэстыж СССР у свеце. Людзі яшчэ не ведалі аб ГУЛАГах, аб мільёнах рэпрэсаваных, забітых і закатаваных у гэтай жа вонкава квітнеючай савецкай сістэме.

З распадам СССР і Югаславіі ўзнік новы від нацыяналізму – посткамуністычны, які розніцца ад нацыяналізму папярэдняга перыяду. Ён характарызуецца

[1] Lawental R. The Points of the Compose// Political Change in Underdevoloped Countries, John Wiley, N.Y., 1962, p. 335–347.

тым, што краіна, якая нядаўна яшчэ была камуністычнай, прымае палітычны курс і ідэалогію, здольныя забяспечыць нацыянальныя інтарэсы гэтай краіны. У гэтых краінах нацыю мабілізуе так званы мабілізацыйны агент – нацыянальная эліта. Сучасны нацыяналізм ёсць прадукт мадэрнізацыі, усеагульнай адукацыі, а таксама сведамага маніпулявання масамі праз гэтую эліту.

І падкрэслім самую вызначальную рысу нацыяналізму ў посткамуністычных краінах: ***нацыяналізм*** у гэтых краінах часта выступае як ***сінонім дэцэнтралізацыі і дэмакратыі.*** Але як і ў часы французскай рэвалюцыі, нацыяналізм і дэмакратыя ходзяць побач толькі спачатку, калі яшчэ жыве ці пачынае канаць манархія. Пасля іх шляхі разыходзяцца, прычым настолькі, што яны становяцца несумяшчальнымі.

### ***Сацыял-дэмакратыя і нацыянальная ідэя***

#### *Суадносіны нацыянальнага і сацыялістычнага ў мінулым*

Сацыялістычная ідэя і ідэя дэмакратыі па логіцы творцаў сацыял-дэмакратыі, павінны спалучаюцца ў аналізаванай тут сацыял-дэмакратычнай ідэалалогіі. Паасобку яны існуюць з вельмі даўніх часоў. Сацыялістычныя ідэі мы бачым ужо ў вучэннях старажытных грэкаў: Арыстафана (“Заканадоўца”), Платона (“Дзяржава”) і далей – у першых хрысціян, у Яна Гуса і табарытаў у XV ст., у анабатыстаў эпохі Рэфармацыі... Але найбольшую закончанасць яны атрымалі ў вучэнні Маркса. У XX ст. упершыню ў гісторыі чалавецтва ідэалагічная канцэпцыя сацыялістычнага шляху развіцця чалавецтва ў варыянце марксізму-ленінізму рэалізавалася на практыцы і ўцялеснілася ў шэрагу краін, самай галоўнай з якіх быў Савецкі Саюз.

Крах сацыялістычнай сістэмы ў канцы XX ст. паказаў усю згубнасць і заганнасць асноўных ідэй марксізму-ленінізму – жахлівыя вынікі дыктатуры пралетарыяту і класавай варожасці, бесперспектыўнасць дзяржаўнай планавай гаспадаркі і памылко-

вай “дзяржаўнай ідэалогіі”. Аднак тая мадэль сацыялізму, рэалізаваная ў СССР і некаторых іншых краінах, зусім не азначае, што адвечныя мары чалавецтва аб лепшым жыцці ў грамадстве ўсеагульнай гармоніі і справядлівасці канчаткова зніклі і трэба пакласці крыж на ідэю сацыялізму наогул. Гэтыя мары былі і будуць стаяць на першым плане любых народаў і любых часоў. Трэба толькі навучыцца адкідваць тыя скрыўленні, нездаровыя адгалінаванні, якія далі жыццё і бальшавізму, і фашызму, ад цалкам здаровай сацыял-дэмакратычнай ідэі.

У сувязі з сказаным трэба адзначыць адну вельмі важную акалічнасць. Сацыялістычная ідэя пастулюе гарманічна развітую асобу. Адной з самых важных якасцей гэтай развітай асобы з’яўляецца яе духоўны свет – і, найперш, здольнасць да любові: любові да сваёй сям’і (моцная, здаровая сям’я), любові да бацькоў і дзяцей (у адпаведнасці з хрысціянскімі запаведзямі), любові да сваёй краіны (патрыятызм) і, нарэшце, любові да сваёй нацыі як найвышэйшай ступені любові. Больш за тое, першая плынь сацыялістаў бачыла ў нацыянальным феномене галоўную сілу сацыялізму. У кнізе “Хрысціянскі сацыялізм” С. Булгакаў пісаў: “Нацыянальны месіянізм... ёсць, перш за ўсё, чыста фармальная катэгорыя, у якую непазбежна адліваецца нацыянальная самасведамасць, любоў да свайго народа і вера ў яго”[1]. І далей ён піша, што ўсё гэта можна бачыць у асаблівай, “апакалепсічнай”, рускай рэвалюцыйнасці, дзякуючы якой мы зробім сацыяльную рэвалюцыю наперад Еўропы. Так бачылі сацыялістычную ідэю першыя рускія сацыялісты. Вера ў свой народ, сваю нацыю і вера ў сацыялістычны парадак стаялі ў іх побач. Цікава, што і першапачатковы марксізм-ленінізм вялікую ўвагу надаваў нацыянальнаму пытанню[2].

---

[1] Булгаков С. Христианский социализм. Новосибирск, 1994. С. 189.

[2] Сталин И.В. Марксизм и национально-колониальный вопрос. М., 1937.

Аднак хоць рускія сацыялісты і надавалі вялікую ўвагу праблеме нацыі, гэтае пытанне не было галоўным у праграмах сацыялістычных рухаў Расіі. Галоўнай была, зразумела, ідэя сацыялізму ды камунізму, якія і сталі рухавікамі бальшавіцкай рэвалюцыі ў Расійскай Імперыі.

*Нацыянальная ідэя ў праграме першай беларускай сацыялістычнай партыі – БСГ*

Інакш адбываліся справы ў сацыялістычным асяродку ў Беларусі – на той час Паўночна-Заходнім краі Расійскай Імперыі. Першай партыяй сацыялістычнага кірунку тут была Беларуская Сацыялістычная Грамада, якая ўзнікла яшчэ ў 1903 г. У 1905 г. БСГ стала галоўнай арганізацыйнай сілай рэвалюцыйнага пад'ёму ў Беларусі. Прычым у Беларусі ў часы першай рускай рэвалюцыі дзейнасць рэвалюцыйных арганізацый вялася ў двух кірунках: па агульным рэвалюцыйным шляху дзяржаўна-рускага характару і нацыянальна-рэвалюцыйным шляху беларускага характару. Галоўнай сілай, што адказвала за другі кірунак, была Беларуская Сацыялістычная Грамада. БСГ стала кіроўным цэнтрам нацыянальна-рэвалюцыйнай барацьбы ў Беларусі, пачынаючы з 1905 г. У сакавіку, дзякуючы вымогам БСГ, адбыўся Першы сялянскі з'езд, які выказаўся за тэрытарыяльную аўтаномію Беларусі з сеймам у Вільні. БСГ стаяла таксама ля вытокаў беларускай выдавецкай дзейнасці: з 1906 г. пачала выходзіць першая беларуская газета "Наша Доля", якая потым была перайменавана на "Нашу ніву". Такім чынам, першая сацыялістычная партыя ў Беларусі – БСГ была выразна нацыянальнага зместу. Гэта было адлюстравана і ў праграме БСГ, дзе адным з галоўных праграмных палажэнняў было патрабаванне аўтаноміі Беларусі ў складзе Расійскай Імперыі. Безумоўна, у першую чаргу ***трэба лічыць БСГ першай нацыянальнай беларускай партыяй, а ўжо потым сацыялістычнай партыяй.***

Узнікае пытанне: а ці трэба акцэнтаваць увагу на неабходнасць нацыянальнай ідэі і ўсіх вынікаючых з яе праграмных дзеянняў пры разглядзе ўнутранай і замежнай палітыкі Беларусі? Ці такім шляхам будуюцца аналагічныя дзяржаўныя планы ў перадавых заходніх дзяржавах, дзе сацыял-дэмакратычныя партыі дамінуюць ў дзяржаўнай палітыцы?

У сваім грунтоўным артыкуле ”Нацыянальнае пытанне і сацыял-дэмакратыя” Отто Баўэр пісаў: “Толькі сацыялізм азначае сапраўдную дэмакратыю, толькі сацыялізм... і стварае глебу для сапраўднай народнай улады, бо ўвесь народ аб’ядноўваецца ў культурную абшчыну”. Ён верыў, што аўтаномія нацыянальнага культурнага аб’яднання ў сацыялістычным грамадстве азначае “ўзрастаючую дыферэнцыяцыю духоўнай культуры нацый, нягледзячы на ўраўнаванне матэрыяльнага зместу нацыянальных культур”. На момант напісання Отта Баўэрам гэтых радкоў – у 1924 г. – у маладой дзяржаве СССР так яно і было. Кожная з саюзных рэспублік культурна дыферэнцыявалася ад астатняга Саюза і пачала заўзята будаваць сваю нацыянальную культуру. У Беларусі гэта быў перыяд нацыянальнага адраджэння, перыяд росквіту літаратуры, мовы, беларускай гісторыі (вядомы таксама як перыяд Інбелкульту), які працягваўся да 1929 г. Усталяванне культу асобы ў СССР ў 30–50-х гг. мінулага стагоддзя паклала канец нацыянальнаму развіццю ўва ўсіх саюзных рэспубліках, і сумныя вынікі гэтай палітыкі “развітага сацыялізму” мы бачым цяпер.

Палітыка зліцця моў і, як вынік, зліцця нацый, распачатая яшчэ М. С. Хрушчовым, прывяла да сапраўднага камуністычнага шабашу, які лопнуў пасля 1990 г. як бурбалка, а нацыі, адарваўшыся ад свайго “старэйшага брата” – Расіі, пачалі новы нацыянальны пад’ём. Калі выкрасліць час фармавання дзяржавы, час НЭПу, то ў асноўны перыяд панавання камуністаў у СССР (1929–1988) мы перажылі сапраўдны генацыд народаў і нацыянальнага прыгнё-

ту. У Беларусі змагароў за нацыянальную культуру нездарма празвалі “нацыянальнымі дэмакратамі (нацдэмамі)”, аб’яднаўшы ў адно і прыхільнікаў дэмакратыі, і нацыянальных адраджэнцаў.

Ідэі, развітыя сацыялістычнымі (БСГ і інш.) арганізацымі Беларусі (да 1917 г. і пасля), былі прадоўжаныя на дзяржаўным роўні камуністамі (1921–1929) у кірунку нацыянальнага развіцця і былі амаль цалкам знішчаныя ў таталітарнай дзяржаве развітага сацыялізму – СССР. На гэтым абшары Зямлі вучэнне Баўэра не знайшло пацверджання. Нацыянальнае развіццё і нацыянальная аўтаномія аказаліся толькі існуючымі на паперы ды ў безлічы лозунгаў камуністычнай эпохі.

Пасля Другой сусветнай вайны сацыял-дэмакратычныя партыі сталі дзяржаўнымі ў шэрагу краін Заходняй Еўропы, і шлях іх развіцця стаў вызначацца сацыял-дэмакратычнымі прынцыпамі.

*Беларуская сацыял-дэмакратыя і нацыянальная ідэя*

Пасля ўсталявання шматпартыйнасці ў Беларусі пасля 1991 г. з’явілася магчымасць аднавіць ідэі сацыял-дэмакратыі, што несла на пачатку XX ст. Беларуская Сацыялістычная Грамада – БСГ. Як і заўсёды пры крушэнні таталітарных і манархічных рэжымаў, на першы план у партыйным і палітычным будаўніцтве ў наваствораннай Беларускай Рэспубліцы выступілі дзве асноўныя задачы: нацыянальнае адраджэнне беларускага грамадства і ўсталяванне дэмакратыі.


Міхась Ткачоў

Нацыянальны характар БСГ стаў адным з важных фактараў пры фармаванні партый новага пакалення, партый, якія пачалі ўтварацца пасля ўзнікнення шматпарыйнай сістэмы (1990)

і абвяшчэння незалежнасці Беларусі ў 1991 г. Першая партыя ў Беларусі пасля гарбачоўскай перабудовы абвясціла сябе як партыя нацыянальна-дэмакратычнага зместу. Гэта была НДПБ – Нацыянальна-дэмакратычная партыя Беларусі (установчы з'езд адбыўся ў чэрвені 1990 г.), пра якую ўжо гаварылася вышэй, у раздзеле II. І ў праграме НДПБ, і ў яе мэтах было адзначана, што яна ёсць пераемніца БСГ. Аднак НДПБ, хоць і з'яўлялася прадаўжальніцай традыцый першай беларускай сацыялістычнай партыі, адкінула ўсю сацыялістычную рыторыку сваёй папярэдніцы, пакінуўшы толькі нацыянальна-дэмакратычны змест БСГ. Стваральнікі НДПБ не ўлічылі альбо не палічылі істотным адну акалічнасць: ніша сацыял-дэмакратычнага накірунку ў палітычным спектры Беларусі аставалася незапоўненай. І вось у 1991 г. гэтая ніша запоўнілася: была створана новая партыя – Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада (БСДГ). Узначаліў партыю вядомы гісторык Міхась Ткачоў. Пры жыцці Ткачова Грамада яшчэ захоўвала некаторыя рысы даўняй БСГ, і нацыянальны аспект у палітыцы партыі граў не апошнюю ролю. Аднак далейшы лёс Грамады зусім не быў падобны да яе знакамітай папярэдніцы пачатку XX ст. Яна не стала вызначальнай палітычнай сілай і не адыграла такой значнай ролі ў жыцці беларускай дзяржавы, як у свой час адыграла БСГ у стварэнні Беларускай Народнай Рэспублікі. БСДГ узору 1990-х гг. напаткаў лёс многіх іншых постсавецкіх партый. Яна то аб'ядноўвалася з іншымі партыям, то дзялілася... і на 2007 г. сацыял-дэмакратычны бок палітычнага спектру ўяўляў кактэйль не меньш як з пяці партый, якія адносілі сябе да сацыял-дэмакратычнага кірунку.

Што ж засталося ад БСГ ў сучасных беларускіх сацыял-дэмакратаў?

Лёс БСДГ пасля заўчаснай смерці ў 2003 г. Ткачова напаткаў і раскол, і аб'яднанне з Партыяй Народнай Згоды, і шмат іншых палітычных прыгод. Адна з спадкаемцаў партыі Ткачова цяпер называ-

ецца Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада) БСДП (Г). Чытаючы праграму БСДП (Г) дзіву даешся, як маглі такія архаічныя выдумкі камуністаў, як "дэмакратычны сацыялізм" заняць вядучае месца ў праграме вядучай палітычнай партыі:

*Дэмакратычнаму сацыялізму ўласцівы павага да гуманістычных традыцыяў народаў свету, цярпімасць, стаўленне да чалавека як да мэты, імкненне да сацыяльнай справядлівасці, прававой дзяржавы, да ўсталявання паміж людзьмі салідарных дачыненняў.*

*Сацыял-дэмакраты карыстаюцца крытычным метадам падыходу да грамадска-палітычных падзей.*

*Беларускія дэмакратычныя сацыялісты пацвердзілі адданасць ідэям сусветнай сацыял-дэмакратыі сваёй барацьбой за эканамічнае, сацыяльнае і палітычнае вызваленне людзей працы.*

І ні слова пра Беларусь і яе незайздросны лёс нацыянальнага забыцця і татальнай русіфікацыі.

Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада) (БСДП (Г)) узяла адкрыта левы ўхіл і супрацоўніцтва з апальнай Партыяй камуністаў Беларускай (старшыня С. Калякін). БСДП (Г) разам з жаночай партыяй-марыянеткай "Надзея" і камуністамі – ПКБ у 2006 г. утварылі блок "Саюз левых партый". Гэтыя партыя аб'ядналіся ў першую чаргу з мэтай больш цеснага супрацоўніцтва з Расійскімі палітычнымі коламі левага кірунку і не без разліку на фінансаванне іх праекту з боку Расіі. Нездарма гаворыцца, што "дармовы сыр толькі ў пастцы". Ведама, што адным з найгалоўнейшых прыярытэтаў замежнай палітыкі Расіі з'яўляецца аднаўленне сваіх ранейшых межаў і ў першую чаргу паглынанне Беларусі. Дорага можа абысціся супрацоўніцтва Саюзу левых партый з расійскімі камуністамі і сацыял-дэмакратамі. Лёгка здагадацца, што ні аб якой нацыянальнай ідэі не можа і ісці гаворка ў рамках згаданага "Саюзу". Ні ў адным яго дакуменце не згадваюцца нацыянальныя інтарэсы Беларусі, беларуская нацыянальня ідэя і нават беларуская нацыя. Яе быццам і няма. А рыто-

рыка наконт незалежнасці Беларусі лёгка можа быць куплена ў абмен на нейкую агульную расійска-беларускую дэмакратыю альбо будучага Саюзу Беларусі і Расіі, альбо пасля ўваходжання Беларусі ў Расію на правах нейкай "асаблівай" вобласці...

Найбольш паслядоўна, у плане абароны нацыянальных каштоўнасцей, праводзіла ідэі сваёй папярэдніцы аднаўленая ў 1998 г. БСДГ (апошняя стала вынікам аб'яднання часткі Грамады з Беларускай нацыянальнай партыяй). У праграме новай БСДГ ужо адкрыта сказана:

*Нацыянальная ідэя – найгалоўнейшы з усіх чалавечых набыткаў у сферы грамадскага жыцця. Дэмакратычнае грамадства – гэта тая мэта, да якой павінен прыйсці наш народ, і галоўным механізмам для дасягнення яе ёсць менавіта нацыянальная ідэя.*

У той момант, калі захопленыя пабудовай ліберальнай эканомікі, а насамрэч капіталізму, новыя беларускія дэмакраты амаль зруйнавалі самабытнасць сваёй дзяржавы, змяшаўшы яе альбо з заходнім "адкрытым грамадствам", альбо з "вялікай Руссю" – БСДГ заявіла, што мы за: "Дзяржаву, арыентаваную на нацыянальныя беларускія інтарэсы. Нацыянальная палітыка павінна быць стрыжнем усёй унутранай палітыкі Беларусі".

І гэта сапраўды так. Апошні праграмны тэзіс Грамады ляжыць у аснове палітыкі ўсіх развітых краін Еўропы.

БСДГ бадай адзіная партыя, якая паставіла пытанне нацыянальнага адраджэння ў галаву вугла перадвыбарчай платформы на выбарах у Палату прадстаўнікоў. Вось вытрымка з яе:

*...Мы бачым Беларусь:*

· ***Дзяржавай незалежнай, нейтральнай і заможнай****, дзе ўладарыць закон і права, а грамадскае жыццё падпарадкавана дэмакратычным прынцыпам.*

· ***Дзяржавай****, дзе галоўнымі каштоўнасцямі з'яўляюцца* ***свабода, справядлівасць і салідарнасць****. Яны з'яўляюцца нашымі крытэрыямі пры ацэнцы палі-*

*тычнай рэчаіснасці і адначасова мусяць быць арыенцірам у дзейнасці кожнага грамадзяніна.*

· ***Дзяржавай**, у якой сацыяльная палітыка заўсёды накіравана на **сацыяльную абарону грамадзян**. Яна павінна стварыць умовы жыцця, годныя чалавека. Ахова здароўя, гуманізацыя працы, барацьба з беспрацоўем, справядлівае размеркаванне прыбыткаў – цэнтральная задача нашай сацыяльнай палітыкі.*

***Канцэпцыя дзяржаўнасці** Беларусі мусіць грунтавацца на паяднанні **сацыяльнага, нацыянальнага і дзяржаўнага элементаў**. Нацыянальнае адраджэнне любых этнічных груп у Беларусі немагчымае без адраджэння беларускага этнасу.*

Мяркую, што прынцыпы, выкладзеныя ў гэтай платформе, маглі б заняць дастойнае месца ў палітычнай арыентацыі нашай краіны.

### *Хрысціянская дэмакратыя*

Хрысціянская дэмакратыя ўпершыню зарадзілася ў каталіцкіх краінах. У энцыкліцы “Rerum Novarum” (1891) папа Леў XIII (1878–1903) крытыкуе лібералізм, сацыялізм і звяртае ўвагу на каталіцкія прафсаюзы як эфектыўную форму самакіравання. У перыяд кіравання Льва XIII Царква стварае мадэль сацыяльна-эканамічных адносінаў, узяўшы за аснову тэорыю Фамы Аквінскага. Адпраўным пунктам гэтай мадэлі было абгрунтаванне прыватнай уласнасці як адпаведнай устаноўленаму Богам “натуральнаму праву”. Характэрна, што сам тэрмін “хрысціянская дэмакратыя” ў гэтай канцэпцыі і наступных энцыкліках папы разумеўся як абсалютна недатычны палітычных ідэяў, азначаў толькі дабрачынную дзейнасць для народа. Аднак нягледзячы на такія першапачатковыя ўстаноўкі Ватыкана, хрысціянская дэмакратыя пачала хутка развівацца менавіта як хрысціянска-дэмакратычны рух (Бельгія, Францыя, Герамнія, Італія).

Ідэі, выкладзеная ў “Rerum Novarum” і іншых энцыкліках папы Пія XIII сталі асновай ідэалогіі сучаснай хрысціянскай дэмакратыі. У канцы XIX ст. у

Францыі шэраг сацыяльна актыўных каталіцкіх арганізацый аб'ядналіся і стварылі першую Хрысціянска-дэмакратычную партыю (1897). Яшчэ раней, у 1852 г., была створана так званая Партыя Цэнтра ў Германіі, якая стаяла на пазіцыях хрысціянскай дэмакратыі. Традыцыі Цэнтра ў Нямеччыне працягваюць сучасныя партыі – Хрысціянска-дэмакратычны Саюз (ХДС) і Хрысціянска-сацыяльны Саюз (ХСС).

У Беларусі першая партыя хрысціянска-дэмакратычнага кірунку была створана досыць даўно. Гэтая падзея адбылася ў траўні 1917 г., калі ў Мінску намаганнямі групы каталіцкіх ксяндзоў была створана партыя Беларуская хрысціянска-дэмакратычная злучнасць. У праграме партыі была адзначана неабходнасць увядзення беларускай мовы ў касцёльнае набажэнства, а ў плане больш шырокіх палітычных патрабаванняў была прынятая рэзалюцыя аб шырокай аўтаноміі Беларусі ў складзе Расійскай Імперыі. З 1919 г. БХДЗ дзейнічае ў Вільні і знаходзіць там новы імпульс развіцця дзякуючы намаганням выдатнага беларускага рэлігійнага і нацыянальнага дзеяча ксяндза Адама Станкевіча.

Вось галоўныя задачы, што ставіліся тады перад хрысціянскай дэмакратыяй:

а) праца галоўным чынам ў асяроддзі сялян;

б) пашырэнне сваіх уплываў на праваслаўнае насельніцтва;

в) важнасць нацыянальных спраў.

Пункт "а" фактычна азначаў толькі канстатацыю каштоўнаснай арыентацыі сялянства заходніх абласцей Беларусі на Касцёл.

Пункт "б" адлюстроўваў спрадвечную мару Касцёла на панаванне ў усім свеце і мала прыдатны для канструктыўных палітычных спраў.

А вось трэці пункт, які вылучаў неабходнасць нацыянальнага адраджэння беларусаў у якасці адной з галоўных задач хрысціянскай дэмакратыі – гэта самая адметная рыса менавіта беларускіх хадэкаў. У гэтай асаблівасці адлюстравана таксама розніца бе-

ларускіх хрысціянскіх дэмакратаў ад заходніх, дзе пытанні нацыянальнага адраджэння ніколі не стаялі.

У артыкулах А. Станкевіча мы знаходзім абгрунтаванне неабходнасці кіравання хрысціянствам беларускага нацыянальнага руху. Ён піша: *Якая ж у гэтым сучасным беларускім нацыянальным руху роль хрысціянства? Вось жа вобак з іншымі кірункамі й дзейнікамі гэтага руху развіваецца й дзеіць так жа й кірунак хрысціянскі й імкнецца да таго ж агульнабеларускага нацыянальнага ідэалу. А нават можна сказаць, што гэты хрысціянскі кірунак у сучасным беларускім нацыянальным жыцьці часта й перавышае кірункі іншыя. Нехрысціянскія кірункі ў беларускім жыцці часта ломяцца, рвуцца, паўстаюць і ўпадаюць, а то й сусім заміраюць, не пакідаючы па сабе паважнага следу, не творачы традыцыі й мала або і сусім не прычыняючыся да большай кансалідацыі й умацавання беларускай нацыянальнасці. Хрысціянскі кірунак, як паказвае гісторыя і сучаснасць, працуе звычайна стала, больш вытрывала, цягла.*

Нацыянальная ідэя і хрысціянства ў Адама Станкевіча звязваюцца ў вельмі шчыльнуют повязь. Мы сустракаем у яго думкі, вельмі блізкія да галоўных, вуглавых ідэй, выкладзеных у творах знакамітых рускіх хрысціянскіх філосафаў М. Бярдзяева, У. Салаўёва, І. Ільіна і інш. Аднак ягоная канцэпцыя адметная сваім беларускім зместам. Беларускі ксёндз рупіцца за доступ хрысціянскага светапогляду да беларускага народа: *Беларускае сучаснае хрысціянства мае такім чынам вялікае гістарычнае заданне – асвабадзіць хрысціянства, даць яму натуральны доступ да беларускага народа, асвабадзіць душу беларуса ад фікцыі хрысціянскай: ад "польскай" і "рускай" веры, мае заданне абараніць душу беларускага народа і абараніць цэласць і адзінства беларускай нацыі". Хрысціянства дае народам маральную магчымасць развівацца нацыянальна і будаваць іх нацыянальную самастойнасць, а з другога боку, ганячы ўсякі нязда-*

*ровы эгаізм, яно ганіць скрайні нацыяналізм і гэтым самым аблягчае народам іх узаемнае супрацоўніцтва.*

Вельмі слушна сказана: “польская” і “руская” веры – гэта фікцыі хрысціянскія. Ёсць адзіная беларуская нацыя, якая асвечана хрысціянствам. Хрыстос любіць Беларусь, любіць аднолькава і католікаў і праваслаўных.

Вось такія ідэі былі падмуркам беларускай хрысціянскай дэмакратыі 20-х гг. XX ст., што дзейнічала ў Заходняй Беларусі. Праграмныя палажэнні БХДЗ – гэта фактычна ідэі нацыянальнай партыі, і ў некаторай ступені яны былі паўтораныя БНП у 1994 г.

У 1926 г. БХДЗ на ўстаноўчым з’ездзе была перайменавана ў Беларускую хрысціянскую дэмакратыю. Галоўнай мэтай БХД стала абвяшчэнне незалежнасці беларускага народа. Ідэалогія БХД абапіралася на хрысьціянскую сутнасць беларускага народнага характару: *Беларускі народ – гэта хрысціянскі народ, і Хрыстус сярод нашага народа меў, мае і будзе мець шмат сваіх вызнаўцаў, якія пойдуць за сваім Божым Вучыцелем у агонь і ваду. Рэлігійнасць беларускага народа глыбокая, вольная ад прымешкі палітыкі.*

Як адзначае Э. Мазько, менавіта на гэтым сцверджанні будавалася дзейнасць партыі, яе характар, яе стаўленне да любых праяваў рэлігійна-грамадзянскага і сацыяльна-палітычнага жыцця. Хрысціянская вера, хрысціянская этыка для БХД – найвышэйшы ідэал, які мае асоба і грамадзянства.

У 1936 г. БХД пераўтварылася ў Беларускае Народнае Аб’яднанне (БНА). Зняўшы з назвы партыі слова “хрысціянская”, ідэолагі партыі імкнуліся выйсці на шырокія народныя масы, пазбавіцца ад апекі Касцёлу, пашырыць свой уплыў на тыя слаі грамадства, якія вызнавалі праваслаўе альбо наогул былі атэістамі. Заставаліся, аднак, ранейшыя прынцыпы Касцёлу, такія, як прынцып карпаратыўнасці, ідэя салідарнасці розных слаёў грамадства і галоўнае – развіццё нацыянальнай беларускай культуры.

Дзейнасць Беларускай хрысціянскай дэмакратыі

даваеннага перыяду адбывалася ў Заходняй Беларусі і звязана з імёнамі выдатных дзеячоў беларускага нацыянальнагу руху, такіх, як Фабіян Абранатовіч, Адам Станкевіч, Вінцэнт Гадлеўскі, Кастусь Стаповіч, Браніслаў Туронак, Ян Пазняк і іншых.

Новы этап развіцця беларускай хрысціянскай дэмакратыі звязаны з уступленнем Беларусі ў новую посткамуністычную эпоху, што пачалася з канца 80-х – пачатку 90-х гадоў XX ст.

1 чэрвеня 1991 г. адбылася ўстаноўчая канферэнцыя Беларускай хрысціянска-дэмакратычнай злучнасці (БХДЗ) (Пятро Сілка, Міхась Арэшкаў, Людміла Пеціна, Фелікс Янушкевіч, Ірына Багдановіч). Актывісты БХДЗ даволі цьмяна ўяўлялі сабе сутнасць хрысціянкай дэмакратыі як сваіх беларускіх папярэднікаў 1930-х гг., так і заходніх хрысціянска-дэмакратычных партый, якія ў шэрагу краін былі вядучымі палітычнымі чыннікамі. Аднак галоўная задача таго перыяду – умацаванне і развіццё незалежнай беларускай дзяржавы на дэмакратычных прынцыпах – перад партыяй стаяла даволі ясна. Мэтай БХДЗ стала *духоўна-маральнае, палітычнае і эканамічнае адраджэнне Беларусі як прававой, дэмакратычныай, самастойнай і суверэннай краіны*. Але гэтая мэта стаяла фактычна перад усімі дэмакратычнымі партыямі таго часу. БХДЗ упершыню за змрочныя гады бязбожнай савецкай улады загаварыла мовай хрысціянства: *Хрысціянска-Дэмакратычны Саюз Беларусі выступае за ўсталяванне асноўных каштоўнасцей хрысціянскай культуры: братэрскай любві, міласэрнасці, свабоды і адзінства ўсіх людзей.*

Новыя рэаліі ўздыму нацыянальнай сведамасці, дэмакратычных мрояў аб свабодзе і правах чалавека і, нарэшце, бурны рост рэлігійных канфесій самых розных кірункаў – у тым ліку галоўных хрысціянскіх цэркваў у Беларусі – сталі глебай да стварэння ў БХДЗ свайго погляду на сутнасць хрысціянскай дэмакратыі. Квінтэсенцыя гэтага адлюстравалася ў слове "Злучнасць", што стаяла ў назве партыі. Яно азнача-

ла злучнасць, яднанне асноўных хрысціянскіх канфесій, дзейных у Беларусі – праваслаўнай, каталіцкай, пратэстанцкай і новай, але моднай у пачатку 1990-х – уніяцкай канфесіі. Таму колькасць абраных сустаршыняў БХДЗ раўнялася дакладна лічбе 4: праваслаўная – М. Арэшкаў, каталіцкая – Ф. Янушкевіч, пратэстанцкая – Э. Сабіла, уніяцкая – Л. Пеціна). Сустаршынём-каардынатарам стаў Пятро Сілка.

Трэба адзначыць, што хоць сустаршыні быццам бы і прадстаўлялі розныя канфесіі, на самай справе ніякіх зносін з сапраўдным царкоўным інстытутам сваёй канфесіі не мелі (адно пастар Эрнст Сабіла меў сваю ўласную маленькую беларускамоўную суполку, якая месцілася ў яго ўласнай кватэры на Паўднёвым Захадзе г. Мінска). У гэтым было самае істотнае адрозненне новых хрысціянскіх дэмакратаў ад іх папярэднікаў часоў Станкевіча і Гадлеўскага, якія выраслі з нетраў самага Касцёла. У гэтым аказалася і іх слабасць, а пазней і не прыдатнасць да жыцця ў новых палітычных рэаліях.

З важных дасягненняў БХДЗ стаў выпуск у лютым 1991 г. газеты "Беларуская крыніца", якую рэдакцыя абвясціла адноўленай газетай сваіх папярэднікаў-хадэкаў, што выдавалася ў 30-я гг. XX ст. у Заходняй Беларусі. Выдаўцом газеты стаў Пётр Сілка, а нязменным рэдактарам – вядомы журналіст Алесь Траяноўскі, які на працягу ўсяго часу існавання "Беларускай крыніцы" сумленна выконваў сваю працу на грамадскіх пачатках. Мець сваю газету было ў той час вялікай справай. Толькі дзве партыі на пачатку 1990-х мелі свае партыйныя газеты – БНФ і БХДЗ.

Як і НДПБ, партыя беларускіх хадэкаў БХДЗ таксама перажыла раскол. І, фактычна, з той жа прычыны – нежаданне зліцця з БНФ у адзіную структуру, нежаданне хадзіць пад "Зянонам". У выніку з'явілася яшчэ адна хрысціянска-дэмакратычная партыя – "франтаўская", якую ўзначалілі Юры Хадыка (ён жа намеснік старшыні БНФ), Людміла Пеціна, Фэлікс Янушкевіч. А старшынём быў абраны доктар

філасофскіх навук, прафесар Мікалай Крукоўскі. Гэты крок быў вымушаны, але драбленне партый ужо стала рэальнасцю, пачалася агонія беларускай хрысціянскай дэмакратыі...

Да перарэгістрацыі 1998 г. афіцыйна існавалі наступныя хрысціянска-дэмакратычныя партыі: БХДЗ (Беларуская хрысціянска-дэмакратычная злучнасць), ХДВ (Хрысціянска-дэмакратычны выбар (ХДВ), Беларуская хрысціянска-дэмакратычная партыя (БХДП). Усе гэтыя партыя зніклі, як знік і ўвесь рамантычны парыў тых добрых 1990-х гг. беларускага адраджэння...

Новае пакаленне маладых нацыянальна свядомых людзей (Павел Севярынец, Віталь Рымашэўскі і інш), што прышлі ў палітыку ўжо ў новым стагоддзі, паспрабавала па-новаму пераасэнсаваць хрысціянскую дэмакратыю як палітычны прынцып. Як іх папярэднікі пачатку 90-х гг. XX ст., лідэры хрысціянскай дэмакратыі канца XX ст. першай дэкады XXI ст. імкнуліся сабраць у свае шэрагі прадстаўнікоў розных канфесій, але галоўнай задачай яны паставілі практычную працу па рэалізацыі хрысціянскіх прынцыпаў у нашым посткамуністычным, бязбожным грамадстве.

Быў створаны аргкамітэт новай партыі – Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД), які на працягу некалькіх гадоў, прынамсі, да напісання гэтых радкоў, дзейнічаў фактычна як партыя. Дзяржаўная рэгістрацыя, хоць і была неабходнай для легітымнасці арганізацыі, але лічылася актам другасным і нават не дасягальным ва ўмовах рэжыму прэзідэнта А. Р. Лукашэнкі.

Ва ўводзінах да праграмы БХД сказана:

*Сёння, на пачатку III тысячагоддзя ад Нараджэння Хрыста, Беларусь востра патрабуе палітычнай сілы, дзейнасць якой заснаваная на падмурку хрысціянскіх каштоўнасцяў, дэмакратычных прынцыпаў і беларускага патрыятызму. Такой новай сілай павінна стаць партыя Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя (БХД)...*

*Партыя Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя (БХД) ажыццяўляе дактрыну сучаснай хрысціянскай дэмакратыі ў Беларусі. Яна адстойвае правы і свабоды чалавека, стаіць на пазіцыі негвалтоўнага вырашэння грамадскіх праблемаў, адраджэння нацыянальнай свядомасці, змагаецца за незалежнасць Беларускай дзяржавы. Хрысціянская дэмакратыя для нас – гэта прыўнясенне хрысціянскіх маральных каштоўнасцяў у палітыку на ўсіх яе ўзроўнях.*

Унесці хрысціянскую мараль у палітыку, пабудаваць палітычныя зносіны паміж рознымі людскімі супольнасцямі і, урэшце, краінамі на аснове хрысціянскіх каштоўнасцей – гэта ўзнёслая, высакародная задача. Але як далёка яшчэ нам да гэтага! На фоне росту злачыннасці, наркаманіі, п'янства, катастрафічнага падзення духоўнасці ў грамадстве і адчужанасці ад Бога гэты прынцып выглядае як далёкая ўтопія.

Тым не менш у 2007–2008 гг. аргкамітэт БХД здолеў правесці некалькі цікавых акцый, што мелі несумненную важнасць для беларускага грамадства. Так, у 2007 г. лідэры Аргкамітэта па стварэнні партыі "Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя" звярнуліся да ўладаў з адкрытым зваротам супраць рэкламы магіі, акультызму, "майстроў Таро" ў беларускіх сродках масавай інфармацыі. Зварот быў накіраваны Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка, у Міністэрства гандлю Рэспублікі Беларусь, у Камітэт дзяржаўнай бяспекі РБ, у Міністэрства адукацыі, Міністэрства інфармацыі, Белтэлерадыёкампанію і рэдакцыю газеты "СБ-Беларусь Сегодня", распаўсюджаны ў сродках масавай інфармацыі. Гэтая дзейнасць хрысціянскіх дэмакратаў нечакана дала плён. 17 чэрвеня 2008 г. на паседжанні Палаты прадстаўнікоў былі ўнесеныя папраўкі ў закон аб рэкламе, згодна з якімі дзяржавай забаранялася рэклама акультызму ў СМІ.

На фоне псеўдадзейнасці большасці сучасных апазіцыйных партый сціплыя крокі аргкамітэту БХД

выглядаюць даволі прыстойна. Падаецца, што яны абралі правільны кірунак дзейнасці і разам з актывам ды клірам розных хрысціянскіх канфесій іх праца прынясе карысць грамадству. Аднак гаварыць пра хрысціянскую дэмакратыю ў Беларусі як рэальную палітычную сілу, здольную ўздзейнічаць на палітыку дзяржавы і выбарны працэс, можна будзе вельмі і вельмі не хутка.

## 3. Сучасныя палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі Беларусі

### *Станаўленне палітычных партый Беларусі ў 90-х гг. XX ст. (Храналогія падзей)*

Як гаварылася ў II раздзеле, нацыянальна-дэмакрытычны рух у выніку гарбачоўскай перабудовы завяршыўся стварэннем у Беларусі руху за перабудову “Беларускі Народны Фронт”, а потым і партыі БНФ, а таксама блізкіх да БНФ партый НДПБ і БНП. З другога боку, пачаў імкліва развівацца і “чыста” дэмакратычны рух у выглядзе стварэння розных партый ліберальна-дэмакратычнага кшталту.

13 кастрычніка 1990 г. у Мінску адбылася Аб’яднаўчая канферэнцыя дэмакратычных палітычных партый Мінска і Мінскай вобласці. На канферэнцыі была прынятая Дэкларацыя мэтаў і прынцыпаў. Быў зацверджаны аргкамітэт па падрыхтоўцы і правядзенні Устаноўчага з’езда. Актыўны ўдзел у распрацоўцы дакументаў бралі: В. А. Акулаў, В. А. Афанасьеў, П. І. Голасаў, В. І. Карбалевіч, М. К. Пліска і іншыя.

Устаноўчы з’езд Аб’яднанай дэмакратычнай партыі Беларусі (АДПБ) прайшоў у г. Мінску ў Палацы шахмат і шашак 3–4 лістапада 1990 г. У яго працы ўзялі ўдзел 127 дэлегатаў, якія прадстаўлялі 1410 чалавек, а таксама народныя дэпутаты СССР і БССР. Сустаршынямі АДПБ сталі шэсць чалавек: А. Т. Жыватнюк, С. Г. Гусак, В. А. Афанасьеў, Э. Г. Райко, Н. П. Турчанаў і Г. І. Самойленка. Інстытут

сустаршынства захаваўся да II з'езда АДПБ, на якім быў абраны ўжо адзіны старшыня партыі – былы дэпутат Вярхоўнага Савета СССР А. О. Дабравольскі. Ён займаў гэтую пасаду да Аб'яднаўчага з'езда дзвюх партый, што адбыўся ў кастрычніку 1995 г.

Услед за НДПБ і АДПБ на працягу 1990–1991 гг. у г. Мінску адбыліся ўстаноўчыя з'езды іншых партый: 13 кастрычніка 1990 г. – устаноўчая канферэнцыя Сацыял-дэмакратычнай партыі Беларусі (СДПБ) (старшыня Леў Крывіцкі). Гэтая партыя так і не дайшла да стадыі дзяржаўнай рэгістрацыі); 23 лютага 1991 г. – устаноўчы з'езд Беларускай сялянскай партыі (БСП) (старшыня Яўген Лугін); 2–3 сакавіка 1991 г. – устаноўчы з'езд Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады (БСДГ) (старшыня Міхась Ткачоў); 1 чэрвеня 1991 г. – устаноўчая канферэнцыя Беларускай хрысціянска-дэмакратычнай злучнасці (БХДЗ) (сустаршыні Пятро Сілка, Міхась Арэшкаў, Людміла Пеціна, Фелікс Янушкевіч, Ірына Багдановіч).

На працягу 1991 г. Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь былі зарэгістраваныя наступныя партыі: Аб'яднаная дэмакратычная партыя Беларусі (19 сакавіка), Беларуская сялянская партыя (11 красавіка), Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада (22 траўня), Нацыянальна-дэмакратычная партыя Беларусі (25 чэрвеня), Беларуская хрысціянска-дэмакратычная злучнасць (16 снежня).

19 жніўня 1991 г. у СССР адбыўся дзяржаўны пераварот (путч). Дзяржаўны камітэт па надзвычайным становішчы (ДКНС) аб'явіў аб пераходзе ў яго рукі ўсёй улады ў краіне. Дэмакратычныя арганізацыі Беларусі адразу рэзка адрэагавалі на путч. У гэты ж дзень у Мінску адбылася сумесная нарада кіраўніцтва БНФ, НДПБ, АДПБ, БСДГ, БСП, Мінскага стачкома з асуджэннем дзяржаўнага перавароту ў СССР, непадтрымцы ДКНС і падтрымцы расійскіх дэмакратаў. На плошчы Леніна ў Мінску 20 жніўня 1991 г. адбыўся мітынг у падтрымку дэмакратыч-

ных сіл, супраць антыканстытуцыйных дзеянняў ДКНС. 21 жніўня путч быў ліквідаваны.

Гэтая падзея канчаткова палажыла канец КПБ-КПСС. У адпаведнасці з загадам № 48 ад 26 жніўня 1991 г. дзейнасць КПБ–КПСС на тэрыторыі Беларусі была прыпыненая, рашэнне аб рэгістрацыі КПБ адменена, а пасведчанне аб рэгістрацыіануляванае. 7 снежня 1991 г. на ўстаноўчым з'ездзе ў Мінску была створаная новая камуністычная партыя – Партыя камуністаў Беларуская (ПКБ). Зарэгістраваная ПКБ была 3 лютага 1992 г. (Сустаршынямі сталі В. Сямёнаў, А. Лашкевіч і В. Чыкін). 3 лютага 1993 г. Вярхоўны Савет адмяніў сваё ранейшае рашэнне аб прыпыненні дзейнасці КПБ. Пасля гэтага частка былой кампартыі адрадзіла КПБ. 29–30 траўня 1993 г. адбыўся аб'яднаўчы з'езд абедзвюх камуністычных партый. Наваствораная партыя атрымала назву ўжо зарэгістраванай – КПБ.

На пачатку 1990-х гг., апрача як у БСДГ, сацыял-дэмакратычныя тэндэнцыі ўзніклі і ў Камуністычнай партыі Беларусі. Былі зроблены спробы павярнуць камуністычныя прынцыпы на сацыял-дэмакратычны шлях. Але пасля некалькіх няўдалых спробаў стварыць сацыял-дэмакратычны рух у КПБ група партыйных інтэлігентаў (Леанід Лойка, Уладзімір Бажанаў, Аляксей Кароль), а таксама група дэпутатаў Вярхоўнага Савета Беларусі (Аляксандр Лукашэнка, Васіль Даўгалёў, Віктар Ганчар, Генадзь Карпенка), вырашылі заснаваць новую партыю – Партыю народнай згоды (ПНЗ). (Лукашэнка ў снежні 1991 г. адышоў ад працы Аргкамітэта.). У красавіку 1992 г. на ўстаноўчым з'ездзе ПНЗ яе старшынём быў абраны Г. Карпенка.

13 чэрвеня 1992 г. была створана Аб'яднаная аграрна-дэмакратычная партыя (пасля II з'езда ў снежні 1993 г. – Аграрная партыя).

Увосень 1993 г. у Доме літаратара ў г. Мінску з ініцыятывы АДПБ і БСП было ўтворана Аб'яднанне дэмакратычных сіл "Вясна-94", якое падтрымалі

БСДГ, Канфедэрацыя працы і Аб'яднанне прадпрымальнікаў Беларусі. Аднак гэтае аб'яднанне, як і многія ранейшыя і пазнейшыя спробы кансалідацыі дэмакратычных сіл, доўга не праіснавала.

У 1993 г. напярэдадні парламенцкіх выбараў на аснове руху "Беларускі Народны Фронт" была створана партыя БНФ. Пазней, у 1999 г. адбыўся раскол БНФ на дзве незалежныя палітычныя структуры: партыю БНФ (старшыня Вінцук Вячорка) і Кансерватыўна-хрысціянскую партыю (КХП)-БНФ (старшыня Зянон Пазняк).

Напярэдадні выбараў 1995 г. рух па стварэнні партый значна актывізаваўся. У чэрвені 1993 г. з'явілася Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці. (Старшынём партыі быў абраны старшыня Беларускага таварыства інвалідаў па зроку Анатоль Нятылкін).

12 сакавіка 1994 г. была ўтворана Рэспубліканская партыя, 26 чэрвеня 1994 г. – Партыя ўсебеларускага адзінства і згоды (ПУАЗ), 28 ліпеня 1994 г. – Беларуская сацыялістычная партыя, 6 лістапада 1994 г. – Беларуская сацыяльна-спартыўная партыя. 28 красавіка 1994 г. была зарэгістраваная жаночая партыя "Надзея" (старшыня Валянціна Палявікова).

У 1994–1998 гг. актыўна дзейнічала яшчэ адна партыя ліберальнага кірунку – Партыя здаровага сэнсу, якой кіраваў прадпрымальнік Іван Каравайчык. Партыя мела газету "Здравый смысл".

У канцы 1995 г. была зарэгістраваная Грамадзянская партыя, якая стаяла на ліберальных пазіцыях, а ў яе склад увайшлі вядомыя прамыслоўцы і прадпрымальнікі (сярод іх прэзідэнт канцэрна "Амкадор" В. Шлындзікаў, вядомы навуковец і палітык Г. Карпенка), дзеячы культуры і навукі (напрыклад, драматург А. Дудараў). Аднак даволі хутка пачаліся перамовы кіраўніцтва Грамадзянскай партыі з АДПБ і 1 кастрычніка 1995 г. адбыўся іх аб'яднаўчы з'езд. Новая партыя атрымала назву Аб'яднаная грамадзянская партыя (АГП). Старшынём быў абраны экс-

старшыня Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь Станіслаў Багданкевіч, намеснікамі сталі А. Дабравольскі, В. Шлындзікаў і А. Лябедзька.

Адначасова ішоў працэс кансалідацыі партый сацыял-дэмакратычнага кірунку. Дзве партыі – БСДГ і ПНЗ – паступова збліжаліся. У 1995 г. быў створаны Сацыял-дэмакратычны Саюз (СДС). Да аб'яднаўчага працэсу падключылася група беспартыйных дзеячоў, у прыватнасці, Старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі XII склікання Мечыслаў Грыб.

29 чэрвеня 1996 г. адбыліся нечарговыя з'езды БСДГ і ПНЗ, якія прынялі рашэнне аб зліцці ў адну Беларускую сацыял-дэмакратычную партыю (Народную Грамаду) (БСДП НГ). У той жа дзень прайшоў Устаноўчы з'езд Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (БСДП НГ). Старшынём быў абраны былы вайсковец Мікола Статкевіч.

9 ліпеня 1995 г. была зарэгістраваная адна з найбуйнейшых ліберальна-дэмакратычных партый на чале з Сяргеем Гайдукевічам. У 2001 і 2005 гг. С. Гайдукевіч двойчы балатаваўся на пасаду прэзідэнта РБ, набіраючы ўсяго некалькі працэнтаў галасоў. У 2004 г. быў абраны ў Палату прадстаўнікоў.

Адбыліся змены пасля 1996 г. і на камуністычным флангу. У 1996 г. адбыўся падзел КПБ на дзве незалежныя камуністычныя партыі: Камуністычную партыю Беларускую (старшыня Сяргей Калякін) і Камуністычную партыю Беларусі (старшыня Таццяна Голубева). У 2006 г. была спроба аб'яднаць гэтыя партыі, але яна плёну не дала.

Колькасны склад і дзейнасць партый на працягу 1990-х гг. рэгуляваліся заканадаўствам. Так, 5 кастрычніка 1994 г. быў прыняты закон "Аб палітычных партыях", які ўсталяваў ніжні бар'ер для сяброўства ў партыі роўным 500 чалавекам. Колькасць партый працягвала павялічвацца, і на пачатак 1997 г. колькасць партый, зарэгістраваных Мін'юстам, дасягнула 35.




**Палітра партый, прадстаўленых у Беларусі ў сярэдзіне 90-х гадоў ХХ ст.**

*Тлумачэнне да малюнка.* На малюнку у плоскасці асей X – Y, дзе X – вось фактара свабоды эканомікі, а Y – вось фактара свабоды асобы, фігуры 1–11, адлюстроўваюцца асноўныя палітычныя ідэалогіі, што існуюць у Беларусі.

Вялікія значэнні X азначаюць вялікае і ўзрастальнае значэнне свабоды эканомікі. Рынкавая эканоміка займае самую правую пазіцыю на схеме (супадае з сучасным азначэннем правай ідэалогіі). Крайнія значэнні X (злева ад перасячэння восей) адпавядаюць эканоміцы цалкам кантраляванай дзяржавай.

Вось Y адпавядае ступені абмежаванасці свабоды асобы. Вялікія значэнні Y (верх восі Y) – аўтарытарны рэжым. Вялікія адмоўныя значэнні Y (ніжняя частка восі Y) – індывідуалізм, прыярытэт асобы чалавека над дзяржавай і іншымі грамадскімі групамі і класамі.

Фігуры, пранумараваныя лічбамі 1–11, адпавядаюць асноўным палітычным ідэалогіям сучаснасці.

***Фігура 1.*** Дамінантай тут з'яўляецца нацыянальная ідэя (нацыяналізм). Галоўная арганізацыя, што спавядала гэтую ідэалогію, – Беларускі Народны Фронт, а таксама Нацыянальна-дэмакратычная партыя Беларусі (НДПБ) (з 1995 г. у назве партыі слова "Беларусі" было заменена на слова "беларусаў"). Але адкрыта аб'явіла нацыяналізм асновай сваёй праграмы толькі Беларуская нацыянальная партыя (БНП), якая дзейнічала ў 1994–1999 гг.

Партыя КХП – партыя БНФ абазначана прамавугольнікам у правым верхнім куце на стыку ***фігур 1, 3 і 4.*** Сучасны статус яе больш блізкі да класічнага нацыяналізму, а абвешчаная ў 1999 г. КХП праграма дзеянняў, што вылучыла галоўнай задачай стварэнне так званага "нацыянальна-вызвольнага руху", робіць яе падобнай да шэрагу партый, што паўставалі ў часы рэвалюцыйных пераўтварэнняў за нацыянальную свабоду пачатку нашага стагоддзя.

Авал нацыяналізму 1 мае агульныя пункты сутыкнення з іншымі ідэалогіямі (апрача лібералізму і камунізму) – ***сегменты 8, 10.***

***Фігура 2*** – камуністычная ідэалогія. У Беларусі яе прадстаўляюць дзве партыі – КПБ і ПКБ. Блізка да іх стаіць таксама Патрыятычная партыя. ***Фігуры 1 і 2*** не перасякаюцца, што азначае адсутнасць нацыянал-камунізму ў Беларусі.

***Фігура 4*** прадстаўляе хрысціянска-дэмакратычную ідэалогію. Як ужо адзначалася, у цяперашні момант афіцыйна ніводная з партый не спавядае гэтай ідэалогіі. Аднак ёсць асобныя носьбіты хрысціянска-дэмакратычнай ідэі, як сярод людзей, так і грамадскіх арганізацый. Да перарэгістрацыі 1998 г. афіцыйна існавалі наступныя хрысціянска-дэмакратычныя партыі: БХДЗ (Беларуская хрысціянска-дэмакратычная злучнасць), ХДВ (Хрысціянска-дэмакратычны выбар (ХДВ), Беларуская хрысціянска-дэмакратычная партыя (БХДП).

***Фігура 5*** – лібералізм. Галоўныя носьбіты ідэалогіі: Аб'яднаная Грамадзянская партыя (АГП) і Ліберальна-дэмакратычная партыя (ЛДП).

***Фігуры 6-I і 6-II*** – сацыял-дэмакратыя. На мал. 1 ***фігура 6***, што адпавядае сацыял-дэмакратыі, падзелена на дзве фігуры ***6-I і 6-II***, якія займаюць празнае становішча на малюнку. Гэта абумоўлена некаторымі прынцыповымі разыходжаннямі паміж вядучымі партыямі абедзвюх галін сацыял-дэмакратыі – Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады (БСДГ) і Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі "Народная Грамада" (БСДП НГ).

БСДП "НГ" пасля аб'яднання з Партыяй Народнай Згоды ў 1995 г. падкрэсліла сваю левацэнтрысцкую платформу, працягвала традыцыі марксісцкай сацыял-дэмакратыі пачатку XX ст. (напрыклад, удзельнічае ў святкаванні 1 Мая).

БСДГ утварылася пасля расколу Грамады, створанай у 1991 г. М. Ткачовым. У 1997 г., не падтрымаўшая аб'яданне з БНЗ, частка былой БСДГ, што не далучылася па БСДП НГ, разам з Беларускай нацыянальнай партыяй стварылі аргкамітэт па аднаўленні партыі, і пасля аб'яднання з БНП на ўстаноўчым з'ездзе 15 лютага 1998 г. Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада (БСДГ) была адноўлена. Старшынём быў абраны экс-старшыня Вярхоўнага Савета Станіслаў Шушкевіч, а Анатоль Астапенка і Алег Трусаў сталі намеснікамі.

У праграме БСДГ, прынятай на II з'едзе ў 1999 г., адзначана, што БСДГ – партыя правацэнтрысцкага кшталту. Яна не прытрымліваецца ўсталяванага сярод сацыял-дэмакратычных партый прынцыпу дзяржаўнага рэгулявання эканомікай, выступае за шматукладую эканоміку і ў першую чаргу – рынычную.

На прыведзенай схеме змешчаны асноўныя палітычныя партыі і ідэалагічныя платформы, што існавалі ў 2000 г. і ў асноўным захаваліся да цяперашняга часу. Больш дробныя партыі прымыкаюць да асноўных. Так, напрыклад, Патрыятычная партыя па сваім характару бліжэй за ўсё падыходзіць да ідэалогіі камунізму і адносіцца да ***фігуры 2***, Рэспубліканская партыя Працы і Справядлівасці – гэта сацыял-дэмакратыя I (***фігура 6-I***) і г. д.

***Змены ў партыйным жыцці РБ пасля перарэгістрацыі 1999 г.***

26 студзеня 1999 г. быў выдадзены Дэкрэт прэзідэнта РБ № 2 «О некоторых мерах по упорядочиванию деятельности политических партий, профессиональных и общественных объединений». Дэкрэт усталяваў мінімальную колькасць сяброў партыі, роўную 1000 чалавекам. У выніку перарэгістрацыі 1999 г. колькасць палітычных партый значна скарацілася, і на 1 студзеня 2001 г. іх стала 18.

Шэраг партый, якія не набралі патрэбнай колькасці людзей для перарэгістрацыі, спынілі сваё існаванне. Некаторыя партыі зліліся з іншымі альбо структурна пераўтварыліся. Так, Беларуская нацыянальная партыя стала асновай для аднаўлення Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады (БСДГ). Пазней у БСДГ уліліся лідэры і шэраг сяброў ліквідаваных Мін'юстам партый – БХДЗ, Хрысціянска-дэмакратычны выбар і Беларускай Рэспубліканскай партыі.

На 2000 г. па характары сваёй дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь партыі можна было падзяліць на тры групы:

1) Партыі, якія падтрымлівалі палітыку прэзідэнта і ўрада. Да іх належалі: Беларуская камуністычная партыя (старшыня В. Чыкін), Беларуская патрыятычная партыя (старшыня Л. Баранкевіч), Сацыял-дэмакратычная партыя Народнай Згоды (лідэр – Л. Сечка), Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці (старшынём быў (цяпер ужо нябожчык) А. Нятылкін) і некаторыя іншыя больш дробныя партыі.

2) Партыі, апазіцыйныя прэзідэнту і ўраду: партыя БНФ (старшыня В. Вячорка), КХП – партыя БНФ (З. Пазьняк і выканаўца абавязкаў старшыні Ю. Беленькі), Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада (БСДГ) (старшыня С. Шушкевіч), сацыял-дэмакратычная партыя Народная грамада (у 2000 г. старшынём быў Мікола Статкевіч; 24 чэрвеня 2005 г. была перарэгістравана як Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада), 24 ліпеня таго ж года

на X нечарговым з'ездзе яе новым лідэрам абраны Аляксандр Казулін, якога падчас "адсідкі" ў калоніі "Віцьба-3" у жніўні 2008 г. пераабралі, і цяпер лідэрам партыі з'яўляецца Анатоль Ляўковіч.

Цэнтральнае месца ў апазіцыйным спектры займае Аб'ядная грамадзянская партыя (нязменны старшыня А. Лябедзька). Апрача згаданых партый трэба адзначыць Беларускую партыю жанчын "Надзея" (у 2000 г. – старшыня В. Палявікова, пазней – М. Матусевіч, В. Яськова), Беларуская партыя працы (старшыня А. Бухвостаў), Партыя камуністаў беларуская (ПКБ) (старшыня С. Калякін).

3) Партыі, якія "хісталіся", не далучыліся ці выйшлі з блока апазіцыйных партый: Ліберальна-дэмакратычная партыя (ЛДП) (старшыня С. Гайдукевіч) і яшчэ некалькі дробных партый. Адзначым, што ЛДП на працягу 1998–1999 гг. уваходзіла ў Кансультацыйны Савет (КС) апазіцыйных партый. Аднак пазней, прыняўшая рашэнне аб удзеле ў выбарах у Палату прадстаўнікоў (насуперак рашэнню КС аб байкоце выбараў), выйшла з КС.

За парушэнне заканадаўства ў 2005 г. Міністэрствам юстыцыі была ліквідаваная Беларуская партыя працы.

Асноўная прэтэнзія Мін'юста да палітычных партый зводзілася да неадпаведнасці юрыдычнага адрасу наяўнаму заканадаўству. У 2005 г. з гэтай прычыны ў Мінску былі знятыя з уліку і рэгістрацыі 292 арганізацыйныя структуры розных палітычных партый.

На стан 1 сакавіка 2007 г. у рэспубліцы зарэгістравана 17 палітычных партый. Зарэгістравана і пастаўлена на ўлік 1120 аргструктур палітычных партый (60 абласных, 424 раённыя і гарадскія, 636 першасных).

### *Суадносіны ідэалогій і палітычных партый у Беларусі*

У Беларусі ***камуністычная ідэалогія*** прадстаўлена дзвюма партыямі КПБ (падтрымлівае прэзідэнта) і ПКБ (трэцяя група). Сегмент 10 з схемы 2 папя-

рэдняга раздзела на беларускім ідэалагічным грунце адсутнічае – нацыянал-камуністаў няма.

***Сацыял-дэамакратычная ідэалогія*** – найбольш папулярная ў Беларусі. Адпаведных партый у Беларусі 3 (партыі, у назве якіх ёсць словы сацыял-дэмакратычная). Гэта БСДПНЗ (Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя народнай згоды); БСДГ (Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада) і БСДП (Г) (Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада). Нягледзячы на блізкасць назваў, усе гэтыя партыі маюць розныя погляды на беларускую палітыку. Першая з іх прытрымліваецца афіцыйнага, прэзідэнцкага курсу, і дзейнасць партыі не выходзіць за рамкі «згоды з урадам», БСДГ з'яўляецца правацэнтрысцкай партыяй (с.-д. II на схемах 1 і 2), а БСДП (Г) – партыя левацэнтрысцкага кірунку, утвораная ў выніку аб'яднання БСДГ 1991 г. (М. Ткачоў) і Партыі народнай згоды (с.-д. I на схемах 1, 2).

Апрача гэтых партый да сацыял-дэмакратычнага накірунку належаць Беларуская партыя жанчын «Надзея», Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці.

***Ідэалогія нацыяналізму.***

У вялікай ступені яна стаіць у аснове праграм абодвух БНФ, ёй нададзена значнае месца ў БСДГ. Цалкам на пазіцыях нацыяналізму стаяла, не падаўшая заяву на перарэгістрацыю 1999 г. у Міністэрства юстыцыі Беларуская нацыянальная партыя (БНП), якая ўвяла прынцып нацыяналізму ў ранг галоўнага праграмнага прынцыпу. У праграме БПН запісана: "Нацыяналізм – найлепшая духовая якасць асобы чалавека. Надышоў час вярнуць гэтаму слову яго спрадвечны станоўчы сэнс. Нацыяналізм – гэта аддансць сваёй нацыі, нацыяналізм – гэта змаганне нацыі за яе волю і незалежнасць, за яе духоўную і фізічную моц, за права нацыі быць роўнай сярод роўных".

***Ідэалогія лібералізму*** – аснова праграмы Аб'яднанай грамадзянскай партыі (АГП). Вызнаецца лібералізм таксама Ліберальна-дэмакратычнай партыяй

(ЛДП). Характэрна, што ў сацыяльным складзе абедзвюх партый дамінуюць прадстаўнікі бізнесу, прадпрымальнікі.

*Хрысціянска-дэмакратычная ідэалогія.*

Ніводная з партый, якія прайшлі перарэгістрацыю ў 1999 г., на пачатак 2000 г. не носіць назвы такога кшталту. Але трохі раней (да перарэгістрацыі) існавала тры партыі хрысціянска-дэмакратычнага кірунку: Беларуская хрысціянска-дэмакратычная злучнасць (БХДЗ), Хрысціянска-дэмакратычны выбар (ХДВ) і Беларуская хрысціянска-дэмакратычная партыя (БХДП). (Апошняя ўтварылася ў свой час у выніку расколу БХДЗ – першай партыі такога кірунку). Усе гэтыя партыі мелі малы аўтарытэт у грамадстве, былі маларікімі і заканамерна зніклі. Аднак з 2004 г. існуе аргкамітэт па стварэнні Беларускай хрысціянскай дэмакратыі (БХД).

Сярод іншых партый ідэі хрысціянскай дэмакратыі прысутнічаюць у праграмах БНФ, КХП – партыі БНФ, БНП, а таксама БСДГ.

Чаму ж атрымалася так, што найбольш уплывовыя на Захадзе ідэі хрысціянскай дэмакратыі амаль не ўспрымаюцца ў Беларусі? Адказ просты. Па-першае, гэта слабасць шматпартыйнай сістэмы наогул. Па-другое, за гады панавання камуністычнага рэжыму і манаполіі камуністычнай ідэалогіі быў выхаваны грамадзянін з атэістычным светапоглядам. Для шырокіх мас людзей хрысціянства ў палітычным жыцці не ўспрымаецца, як не ўспрымаецца рэлігія наогул.

Тым не менш, вялікі колькасны рост царкоўных прыходаў усіх канфесій падае надзею на лепшую будучыню хрысціянскай дэмакратыі ў Беларусі.

*Ідэалогія кансерватызму.*

У Беларусі адсутнічаюць партыі, якія б насілі такую назву, няма і партый, якія б суцэльна кіраваліся ідэалогіяй кансерватызму. Адносна Кансерватыўна-хрысціянскай партыі (КХП) трэба сказаць найперш тое, што галоўны прынцып гэтай партыі грунтуецца не на каштоўнасцях хрысціянскай дэмакратыі і не

на класічным ці мадэрным кансерватызме, а на глабальным панятку – «нацыянальна-вызвольны рух».

У прынцыпе, адсутнасць кансерватызму ў Беларусі зразумелая з'ява. Гэта абумоўлена разрывам векавых традыцый, адсутнасцю нацыянальнай свядамасці беларусаў і іншых неабходных кампанентаў, уласцівых кансерватызму.

Ёсць аднак сярод беларускіх тэарэтыкаў і такія, што спрабуюць "сканструяваць" беларускі ліберальны кансерватызм. У раздзеле III-3, прысвечаным гэтай тэме, мы адзначалі, што такая ідэалогія наогул супярэчлівая. Паглядзім цяпер, як выглядае гэтая праблема ў беларускім кантэксце.

Нягледзячы на адсутнасць аргументаваных падстаў, адзін з ідэолагаў Аб'яднанай грамадзянскай партыі М. Пліска пераконвае ў наяўнасці ў Беларусі ідэалогіі ліберальнага кансерватызму, носьбітам якой, на ягоную думку, і з'яўляецца АГП. Каб паказаць, што ліберальны кансерватызм мае гістарычныя карані, М. Пліска беспадстаўна сцвярджае, што ў Заходняй Беларусі даваеннага перыяду існаваў досыць уплывовы ліберальна-кансерватыўны кірунак, які быў звязаны з дзейнасцю партыі Беларуская хрысціянская дэмакратыя – Беларускае народнае аб'яднанне (БХД – БНА). Гэтая партыя была створана на V з'ездзе БХДЗ, але зусім не для таго, каб падкрэсліць свецкі характар партыі (як сцвярджае М. Пліска), а каб акцэнтаваць увагу на нацыянальнай скіраванасці партыі (дадатак БНА). Ва ўсім свеце партыі, што маюць у сваёй назве словы "хрысціянска-дэмакратычная" паводле свайго палітычнага прызначэння ніколі не залежалі і не залежаць ад інстытуту Царквы. Такая назва толькі падкрэслівае тое, што носьбіты хрысціянска-дэмакратычнай ідэалогіі вызнаюць хрысціянскія каштоўнасці, роўна як і прынцыпы дэмакратыі. Аднак падтрымліваць і здзяйсняць хрысціянскія ідэі і мараль могуць прадстаўнікі іншых партый. У сучаснай Рэспубліцы Беларусь гэта БНФ, БНП, БСДГ. Аўтар згаданага артыкула прыпісвае

партыі БХД – БНА чамусьці і ліберальную, і кансерватыўную ідэалогію, аб чым, аднак, не ўспамінаецца ні ў адным дакуменце гэтай партыі. Далей Пліска ўжо смела выходзіць на выдуманую ім сцежку і лёгка аперуе такімі тэкстамі: “традыцыя лібералізму і кансерватызму працягвала існаваць у пэўных колах эміграцыі”, а ў наш час ідзе працэс “адраджэння лібералізму і кансерватызму”.

Такім прыёмам дасягаецца ўяўленне аб тым, што быццам бы лібералізм і кансерватызм маюць даўную традыцыю ў Беларусі, і справа толькі за іх адраджэннем. Вышэй жа мы паказалі, што менавіта традыцыі лібералізму і кансерватызму амаль адсутнічалі ў Беларусі ажно да з’яўлення шматпартыйнай сістэмы ў 1990-х гг. У даваеннай Беларусі лібералізм і кансерватызм адсутнічалі як ва Усходняй Беларусі, так і Заходняй. У тыя часы існавала толькі адна ідэалогія: марксізм-ленінізм, якая была фактычна дзяржаўнай, а ўсе іншадумцы залічваліся да нацыянал-дэмакратаў (нацдэмаў). Погляды нацыянал-дэмакратаў былі блізкія да сучасных ідэалогій наступнага кірунку: хрысціянскай дэмакратыі, сацыял-дэмакратыі і нацыяналізму.

Чаму ж у 90-я гг. XX ст. не з’явілася моцнай хрысціянскай дэмакратыі? А тыя кволыя парасткі хадэкаў, увасобленыя ў партыях Беларуская хрысціянска-дэмакратычная злучнаць ці Хрысціянска-дэмакратычны выбар, хутка пайшлі ў нябыт. БХД так і існуе як аргкамітэт, не здзейсніўшы нават спробы правесці ўстаноўчы з’езд. Некаторыя тлумачаць гэта тым, што Беларусь з’ўляецца шматканфесійнай краінай, і гэта перашкаджае стварэнню моцнай хрысціянска-дэмакратычнай партыі. Такі погляд цалкам памылковы з наступных дзвюх прычын.

**Па-першае,** і ў 1930-я гг. Заходняя Беларусь была шматканфесійнай, але Ян Пазняк і Адам Станкевіч кіравалі моцнай хрысціянска-дэмаратычнай партыяй, якая мела сваю салідную газету “Беларуская крыніца”. Апрача таго, у наш час не існуе аднаканфесій-

ных краін. Напрыклад, у Германіі некалькі канфесій, і пры гэтым няма перавагі якой-небудь адной, католікаў і пратэстантаў (лютэран) прыкладна пароўну. Тым не менш творца "нямецкага цуда" Людвіх Эрхард быў хрысціянскім дэмакратам, а адпаведная партыя была ў той час ва ўладзе. У Польшчы, якая лічыцца каталіцкай дзяржавай, жыве каля мільёна праваслаўных, якія маюць аўтакефалію.

**Па-другое,** у Беларусі ў наш час любая партыя, заснаваная на пэўных ідэалагічных прынцыпах, будзе слабай. У грамадстве бярэ цяпер верх прагматызм. І не дзіўна, што найбольшую моц у Рэспубліцы Беларусь мае "партыя ўлады".

### *Грамадскія арганізацыі ў Беларусі*

На працягу амаль усіх 90-х гг. XX ст. найбольш масавай і ўплывовай апазіцыйнай арганізацыяй у Беларусі быў грамадскі рух за перабудову – Беларускі Народны Фронт "Адраджэнне". У 1999 г. БНФ раскалоўся на дзве мала сяброўскія арганізацыі з адной і той жа назвай. Хоць напачатку існавалі рух БНФ і партыя БНФ, дык пасля яго расколу, непазбежнага зніжэння рэйтынгу папулярнасці БНФ у абедзвюх сваіх структурах фактычна засталіся функцыянаваць не як дзве грамадскія арганізацыі, два Рухі, а дзве партыі.

З іншага, "левага" боку, грамадскай арганізацыяй, што аб'яднала "дэмакратычных" камуністаў і прасавецкі скіраваных грамадзян пачатку 1990-х гг., стаў "Рух за сацыяльны прагрэс і справядлівасць".

Апрача БНФ з пачатку 1990-х гг. у Беларусі дзейнічаўі шэраг грамадскіх арганізацый дэмакратычнай і нацыянальна-адраджэнцкай скіраванасці. Найбольш буйным было Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны (ТБМ). Яно было створана як добраахвотная масавая грамадская арганізацыя з мэтай культурна-асветніцкай дзейнасці ў галіне адраджэння беларускай мовы і беларускай нацыянальнай культуры ў Беларусі. Таварыства беларускай

мовы імя Ф. Скарыны ўтварылася ў 1989 г. Сябрамі кіроўнага органа – Рэспубліканскай рады ТБМ – у свой час з’яўляліся прадстаўнікі беларускай эліты, вядучыя навукоўцы, пісьменнікі: Максім Танк, Барыс Сачанка, Васіль Быкаў, Янка Брыль, Зянон Пазняк, Юрый Хадыка, Адам Мальдзіс, Артур Вольскі, Вячаслаў Адамчык. ТБМ паспяхова дзейнічае да цяперашняга часу, мае сваю сталую газету “Наша слова”.

Дзейнічалі ў Беларусі таксама ГА “Таварыства беларускай школы” (А. Лозка), ГА “Міжнародная асацыяцыя беларусістаў” (Адам Мальдзіс).

Нацыянальна-культурнае адраджэнне закранула не толькі беларусаў. Былі створаныя нацыянальна-культурныя аб’яднанні татараў-мусульман “Аль-Кітаб”, Саюз палякаў у Беларусі, Беларускае аб’яднанне габрэйскіх асацыяцый і суполак, асацыяцыя ўкраінцаў у Беларусі “Ватра” і іншыя.

Вялікую ведамасць у свеце атрымала Згуртаванне беларусаў свету “Бацькаўшчына”, дзейнасць якога галоўным чынам сканцэнтравана ў Мінску. 8–10 ліпеня 1993 г. ЗБС “Бацькаўшчына” правяло ў г. Мінску Першы з’езд беларусаў свету. На ім прысутнічалі 486 дэлегатаў з замежжа: Англіі, Аргенціны, Аўстрыі, Аўстраліі, Бельгіі, Германіі, ЗША, Канады, Польшчы, Францыі, Чэхіі, Швейцарыі, Расіі, Украіны, Малдовы, Туркменіі, Казахстана, Кіргізіі, Узбекістана, Эстоніі, Літвы, Латвіі; 510 дэлегатаў з Беларусі і больш за 200 чалавек гасцей. Прэзідэнтам ЗБС “Бацькаўшчына” быў абраны акадэмік Радзім Гарэцкі, старшынёй Рады – Ганна Сурмач. II, III і IV з’езды беларусаў свету праходзілі таксама ў Мінску ў 1997, 2001 і 2005 гг. На з’ездзе ў 2005 годзе старшынём Рады быў абраны вядомы мастак Аляксей Марачкін.

У цяперашні час у Беларусі дзейчае шэраг фондаў, многія з якіх пачыналі сваю дзейнасць яшчэ ў савецкія часы. Гэта Фонд міра Беларусі, Беларускі фонд культуры, Беларускі камітэт абароны міру, Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замеж-

нымі краінамі, Беларускае таварыства па культурных сувязях з суайчыннікамі за мяжой. Шэраг грамадскіх арганізацый існуюць для развіцця дружбы між народамі. Гэта таварыствы “Беларусь – Канада”, “Беларусь – Польшча, “Беларусь – Фінляндыя” і іншыя.

Вялікі блок грамадскіх арганізацый, якія дзейнічаюць у Беларусі, складаюць аб’яднанні паводле прафесійных інтарэсаў. Гэта, па-першае, грамадскія аб’яднанні тыпу акадэмій: Міжнародная акадэмія тэхнічнай адукацыі, Міжнародная акадэмія інфармацыйных тэхналогій, Міжнародная акадэмія сацыяльных навук, Міжнародная акадэмія навук Еўразіі, Беларуская акадэмія палітычных навук і г.д.

Мінск з’яўляецца цэнтрам дзейнасці арганізацый творчага кірунку – ГА “Беларускі саюз мастакоў”, ГА “Беларускі саюз дызайнераў”, ГА “Беларускі саюз журналістаў”, ГА “Беларускі саюз кінематаграфістаў”, ГА “Саюз беларускіх пісьменнікаў” і іншыя. У 2005 г. было ўтворана яшчэ адно аб’яднанне пісьменнікаў – “Саюз пісьменнікаў Беларусі”.

Шэраг арганізацый займаюцца дзіцячымі і юнацкімі праблемамі: Беларускі Рэспубліканскі Саюз Моладзі (БРСМ), Саюз скаўтаў Беларусі, Дабрачынны фонд “Юныя таленты”, таварыства “Дзеці ў бядзе”, грамадскае аб’яднанне “Маладая грамада”, Рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне “Задзіночанне беларускіх студэнтаў”, Рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне “Ленінскі камуністычны саюз моладзі”, Рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне “Беларуская асацыяцыя маладых палітыкаў” і інш.

Шэраг арганізацый сваю дзейнасць засяроджвае на дапамозе ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, ахвярам рэпрэсій, Чарнобыльскай катастрофы. З 1991 г. дзейнічае ГА ветэранаў, якую ўзначальвае А. М. Новікаў. Праблемы, звязаныя з увекавечваннем памяці ахвяр гітлераўскіх канцлагероў, вырашае Міжнароднае ГА “Трасцянец”.

Вялікая колькасць арганізацый у Рэспубліцы Беларусь сваю дзейнасць канцэнтруе на ахове наваколь-

нага асяроддзя і іншых пытаннях экалагічнага кірунку. Сярод іх: грамадскае аб'яднанне (ГА) "Мінскі экалагічны савет", Беларускі камітэт "Дзеці Чарнобыля", ГА "Беларускі сацыяльна-экалагічны саюз "Чарнобыль". ГА "Чыстая вада", Міжнароднае грамадскае аб'яднанне "Экапраект".

Грамадскія недзяржаўныя арганізацыі Беларусі ўтвараюць трэці сектар – НГО (NGO). База даных грамадскіх аб'яднанняў БРГА "Аб'яднаны шлях" складе 2816 грамадскіх аб'яднанняў, саюзаў, асацыяцый і арганізацыйных структур.

У 1997 г. была ўтворана Асамблея дэмакратычных няўрадавых арганізацый Беларусі ў 1997 г. Першы кангрэс Нацыянальнай Асамблеі праходзіў у Мінску 22 лютага 1997 г. У ім брала ўдзел больш за 250 арганізацыяў. Асноўнымі прынцыпамі арганізацыі былі: незалежнасць Беларусі, рынкава-дэмакратычныя рэформы, правы чалавека, інтэграцыя ў еўрапейскія структуры. Кіраўнікамі Асамблеі былі В. Вячорка, А. Бяляцкі і іншыя. Колькасць арганізацый, якія ўваходзілі ў Асамблею, дасягала 700.

На стан 1 сакавіка 2007 г. у рэспубліцы зарэгістравана 2248 грамадскіх аб'яднанняў (231 міжнароднае, 724 рэспубліканскія і 1293 мясцовыя), 17 саюзаў (асацыяцый) грамадскіх аб'яднанняў, а таксама 56 фондаў (3 міжнародныя, 3 рэспубліканскія і 50 мясцовых). Зарэгістравана і пастаўлена на ўлік 22 021 аргструктур прафсаюзаў (108 абласных, 774 раённых і гарадскіх, 21 080 першасных, 59 аб'яднаных) і 11 917 аргструктур іншых грамадскіх аб'яднанняў (530 абласных, 3784 раённых і гарадскіх, 7603 іншых).

Спектр зарэгістраваных грамдскіх аб'яднанняў даволі разнастайны і ахоплівае розныя галіны дзейнасці і розныя сацыяльныя групы насельніцтва. Сярод агульнай колькасці грамадскіх аб'яднанняў больш за ўсё ствараецца арганізацый асветніцкай, фізкультурна-спартыўнай і дабрачыннай скіраванасці.

Усяго ў Рэспубліцы Беларусь зарэгістравана 517 фізкультурна-спартыўных, 351 дабрачыннае, 312

асветніцкіх, культурніцкіх, выхаваўчых, 162 маладзёжныя, у тым ліку 23 дзіцячыя, 140 грамадскіх аб'яднанняў інвалідаў вайны і працы, ветэранаў, 111 навукова-тэхнічных, 98 аб'ядноўваючых нацыянальныя меншасці, 69 аб'ядноўваючых прыхільнікаў прыроды, помнікаў гісторыі і культуры, 41 творчае 38 жаночых і 409 іншых грамдскіх аб'яднанняў.

Агульная карціна падзелу грамадскіх арганізацый па сферах дзейнасці можа быць прадстаўлена на наступнай дыяграме:




Падзел грамадскіх арганізацый па сферах дзейнасці.
(з матэрыялаў сайту www.ngo.by)

## *Лірычнае адступленне. Правыя і левыя ў Беларусі*

Левая, правая – где сторона?
Улица, улица – ты, брат, пьяна!
*(З старадаўняй песні)*

Сітуацыя з сучасным палітычным спектрам беларускіх партый нечым нагадвае гэтую песню. Толькі бакамі вуліцы становяцца партыі, а вуліцай – наша Беларусь. Сапраўды: якая з палітычных партый

можа сябе назваць левай, а якая правай (у класічным сэнсе гэтага слова)? АГП, здаецца, правая – ліберальныя каштоўнасці, прыватная ўласнаць і г.д. КПБ Сяргея Калякіна – партыя камуністычная і паводле канонаў належыць да левага боку. Але вось цікава: і АГП і КПБ падтрымліваюць платформу Аб'яданых дэмакратычных сіл (АДС). Аказваецца, мэты АДС падыходзяць як для камуністаў, так і для ліберлалаў ды іншых апазіцыйных партый (БНФ, АГП, БСДП (Г), БСДГ і г.д.).

Такім чынам, відавочным у цяперашняй палітычнай сітуацыі становіцца вывад аб тым, што ўсе ідэйныя ўстаноўкі, праграмныя палажэнні і г.д. адыходзяць на задні план у параўнанні з наяўным у Беларусі палітычным кліматам. Розніца паміж "правымі" і "левымі" часова (а чаму часова?) сціраецца – іх аб'ядноўваюць каштоўнасці больш важныя, чым пабудова камунізму ці капіталізму. Сапраўды, хто можа пярэчыць, скажам, супраць такога лозунга праграмы АДС – "Дастойнае жыццё кожнаму!" Гэтага ж хочуць, па-сутнасці, і будаўнікі камунізму, і сацыял-дэмакраты, і лібералы, і хрысціянскія дэмакраты. Больш за тое, у праграме развіцця кожнай развітай еўрапейская дзяржавы, я мяркую, існуе гэты пункт.

У сітуацыі, што склалася, насамрэч няма нічога надзвычайнага. Гэта вынікае з простага аналізу сучаснай эвалюцыі класічных палітычных партый, як любяць да гэтага часу гаварыць – "левага", "правага" і "цэнтрысцкага" бакоў палітычнай палітры.

Гістарычна склалася так, што партыі, якія выступалі за радыкальныя палітычныя змены, называліся "левымі", а тыя, што выступалі за захаванне наяўнага становішча, – "правымі". Адбылося гэта ўпершыню ў часы французскай рэвалюцыі XVIII ст. вось такім чынам. У 1789 г., калі праходзіў чарговы сход Французскай Нацыянальнай асамблеі, тыя дэпутаты, якія выступалі за змены, селі па левы бок ад старшыні, а тыя, што абараняли status qwo, селі па правы бок. Паступова Старшыня сходу пачаў звяр-

тацца да іх як да “правых” ці “левых”. Так і “прыклеілася”, як гэта часта бывае, гэтыя назвы да палітыкаў і адпаведных ідэалогій на доўгі час.

Партыі сацыял-дэмакратычнага і камуністычнага кірунку пачатку XX ст., якія змагаліся за рашучую змену рэжыму і нават за рэвалюцыю, атрымалі назву «левых». Кансерватары, якія выступаюць за захаванне традыцый, мовы і культуры і не імкнуцца да радыкальных зменаў у наяўным грамадстве, належаць да правага крыла партый. Лібералы ж абыякава ставяцца да традыцыяналізму, але, тым не менш, таксама лічацца правымі, гэта абумоўлена тым, што яны стаяць за свабодную, рынкавую эканоміку, адмаўляюць дзяржаўнае кіраванне эканамічнымі працэсамі, а іх апошні тэзіс (дзяржаўнае кіраванне) – стрыжань сацыялістычнай (левай) ідэалогіі. А раз антыпод «левага», значыць – «правы».

У наш час розніца паміж левымі і правымі ідэолагамі істотна змянілася. Сацыял-дэмакраты пачалі выступаць за шматукладную эканоміку і, фактычна, пачалі дзейнічаць з левага флангу. Лібералы наадварот: пачалі ўводзіць элементы дзяржаўнага кіравання ў эканоміцы, а гэта ўжо ўхіл у левы бок. З другога боку, партыі, якія выступаюць за істотныя змены рэжыму, у наш час не сацыялістычнага накірунку, а наадварот іх апаненты: ліберальныя, нацыянальныя і іншыя партыі, – тыя, што лічацца правымі.

Юрг Штайнер, аналізуючы гэтую акалічнасць у сваёй кнізе “Еўрапейскія дэмакратыі”, заклікае пазбягаць паняткаў левыя і правыя, бо яны “занадта цьмяныя”. У сённяшняй Еўропе палітычнае жыццё стала настолькі складаным, што для вызначэння адрозненняў трэба мець на многа больш вымярэнняў, чым адно (“правы” – “левы”).

Пасля распаду СССР утварылася шмат партый ліберальнага, нацыянальна-дэмакратычнага, сацыял-дэмакратычнага кірункаў, што процістаялі камуністычным партыям рэспублік былога СССР, і тое, што яны выступалі за змены рэжыму, таксама ставіць іх

на правы фланг. Хоць, ідучы за логікай першапачатковага з'яўлення разгляданай тэрміналогіі, усе згаданыя партыі можна было б залічыць да «левых» (бо яны за змены), а задубелую ў сваім развіцці кампартыю – да «правай».

Аналагічныя высновы робіць і Конрад В. Гізберт-Студніцкі[1], аналізуючы эвалюцыю стаўлення грамадства да рэлігіі. Ён адзначае, што працяглы час стаўленне да рэлігіі і аддзялення Царквы ад дзяржавы складалі адно з прынцыповых адрозненяў паміж "правымі" і "левымі". Каталіцкая Царква (асабліва ў Польшчы) традыцыйна была звязана з правымі (гэта адпавядае кансерватыўнай ідэалогіі). Сацыялісты (г. зн. "левыя" ) заўсюды былі заўзятымі змагарамі з рэлігіяй. Але цяпер у заходніх грамадствах пануе прынцып рэлігійнай талерантнасці, а прысутнасць рэлігіі ў школе перастала быць палітычнай праблемай. Англіканская ці Прасветарыянская Цэрквы становяцца, у сваю чаргу, саюзнікамі левых. Кардынал Манінг дзейнічае як абаронца правоў рабочых і сацыяльных рэформаў. Такім чынам, як піша К. Гізберт-Студніцкі, "з'яўляюцца новыя лініі падзелу і знікаюць традыцыйныя адрозненні паміж "лявіцай" і "правіцай", што робіць дакладнае вызначэнне левай ідэалогіі і правай ***немажлівым***.

Такім чынам, сучасная класіфікацыя ідэалогій не зводзіцца да лінейнага прынцыпу мінулага XIX ст. Неабходна ўлічваць розныя фактары: характар эканомікі, характар рэжыму, стаўленне да нацыянальнай ідэі і іншыя. Больш падрабязна прааналізаваныя гэтыя з'явы ў маёй манаграфіі "Нацыянальная ідэя ў сучасным свеце", што нядаўна ўбачыла свет у выдавецтве "Беларускі кнігазбор".

Так у Еўропе. А можа, у нас, у Беларусі, інакш? Можа, тыя левыя, пра якіх гаварылася яшчэ ў тыя рамантычныя часы першых французскіх рэвалюцыянераў і не менш фанатычныя бальшавікі першых гадоў

---

[1] Гізберт-Студніцкі Конрад В., Dzis. 2004, № 4.

савецкай улады, і цяпер “жывей за ўсіх жывых”?

У Беларусі палітычныя стасункі складваліся наступным чынам. На момант славутай перабудовы ў нас існавала толькі адна палітычныя партыя – камуністычная. Традыцыйна яе можна было б аднесці да разраду “левых”. І на Захадзе так яно і было – такія партыі лічыліся левымі. Але ў Савецкім Саюзе камуністычная партыя даўно злілася з дзяржавай і сам панятак “партыя” стаў насіць іншы сэнс, сэнс неабмежаванай улады, наменклатурных магазінаў, санаторыяў, лечкамісій і іншага “блату”.

Што ж адбылося пасля ліквідацыі камуністычных партый у постсавецкіх краінах? Ці ўтварылася шматпартыйнасць, пра якую шмат гаварылася ў канцы 1980-х і пачатку 1990-х гг.? Адказ адназначны – не! І не магло так быць інакш пасля цэлай эпохі панавання КПСС, калі выраслі новыя пакаленні, сфармавалася новая ментальнасць і, як любілі гаварыць у канцы мінулага стагоддзя, вырас новы чалавек – “гома саветыкус”. Былая партыйная наменклатура не магла так проста знікнуць і не знікла. У яе руках засталася дзяржаўная маёмасць, старыя сувязі, старыя струкутуры. Яна злілася з невялікай колькасцю алігархаў, адкінула ўжо непатрэбныя і нават шкодныя старыя камуністычныя лозунгі пра будаўніцтва камунізму і “са шчырым сэрцам і адкрытай душой” загаварыла пра дэмакратыю. Колішнія партыйныя дзеячы былі абраныя на пасаду прэзідэнтаў. У Расіі і ў Украіне прэзідэнтамі сталі Ельцын і Кучма – партыйныя дзеячы вышэйшага эшалону, у Беларусі абралі прэзідэнтам партыйнага дзеяча трохі ніжэйшага кшталту – дырэктара саўгаса.

Так было з аднаго флангу – з боку былой кампартыі. Другі бок – гэта вялізная маса цалкам люмпенізаванага люду, так званага рабочага класу і сялянства. Ці ўяўляла тады і ўяўляе цяпер гэтая маса, электарат, ці, як любіць гаварыць А. Лукашэнка, “мой народ”, – якую-небудзь палітычную сілу? Менавіта палітычна скіраваную, адукаваную сілу? Вось тут і

хаваецца ўвесь сакрэт слабасці палітычных высілкаў нашай апазіцыі. Усе посткамуністычныя партыі паўсталі не як неабходнасць палітычнага моманту. Гэтыя партыі не ёсць выразнікі інтарэсаў пэўных слаёў грамадства, як гэта адбывалася і адбываецца ва ўсім цывілізаваным свеце. Класічных пралетарыяў мінулага, якія ўтварылі моцную "левую" камуністычную партыю, даўно няма і блізка. Постсавецкі рабочы клас ёсць аморфная маса людзей, якая цалкам не структурызаваная, не здольная ні на якую палітычную акцыю. На гэтую тэму ў Украіне ў чэрвені 2000 г. праводзіўся нават семінар "Левыя і правыя ва Украіне", дзе Ю. Шухевіч трапна сказаў, што мы маем "адзін вялікі натоўп з аднаго боку, а з другога – тая невялічкая праслойка, якая цудоўна абыходзіцца без палітычных партый, ёй хапае кланаў. У іх ёсць спецыяльныя арганізацыйныя структуры, якім не патрэбны аніякія палітычныя партыі, бо, як паказалі вынікі рэферэндуму, выбары ў нас непатрэбныя наагул".

Яшчэ ў большай ступені ўкраінская сітуацыя паўтараецца ў Беларусі. Пра гэта сведчаць усе нашы выбары, пачынаючы з славутага рэферэндуму 1996 г. Сапраўды, доля партыйных удзельнікаў ва ўсіх галінах выбараў вельмі малая, а працэнт абраных блізкі да нуля – ён падпадае пад працэнт памылкі доследу. Слова "партыя" стала накшталт слова "апазіцыя", і ісці на выбары лепш не ад якой-небудзь партыі, а трэба рэгістравацца так званым незалежным кандыдатам. Заўважым, слова "партыя" само па сабе нясе больш інфармацыі, чым "левая партыя" альбо "правая партыя". Людзей мала цікавіць сама ідэалогія партыі. Чалавек належыць да партыі – і гэтым ужо ўсё сказана! Значыць, ён "не за Лукашэнку", значыць, ён у апазіцыі, а калі ён яшчэ размаўляе пабеларуску, то ён "фронтавец".

На фоне такога незайздроснага становішча палітычных партый у Беларусі не выклікае аніякага здзіўлення магчымасць аб'яднання ці стварэння блока, кааліцыі і г.д. партый, якія ў іншых умовах, у

нармальных еўрапейскіх грамадствах былі б непрымірымымі ворагамі, бо многія з іх стаяць па розныя бакі палітычнай палітры і нясуць – зноў-такі ў цывілізаваных капіталістычных краінах – процілеглыя погляды на магчымыя шляхі развіцця чалавецтва. Вось і створаныя ў нас некалькі такіх блокаў – народная кааліцыя "Пяць плюс", "Еўрапейская кааліцыя", група "Рэспубліка"... На гэтым новым сістэмным роўні мы маем ужо справу не з партыямі, а з групамі партый, грамадскіх аб'яднанняў, а таксама фізічных асоб. З'явіўся новы структурны падзел грамадства. На гэтым роўні палітычнай сістэмы мы ўжо пазбавіліся панятку "партыя" і аперуем больш новым і, здавалася б, важкім паняткам "кааліцыя", "аб'яднанне" . Самае цікавае, што і тут мэты новаўтвораных сістэм (кааліцый) адны і тыя ж: пабудова прававой дзяржавы, дэмакратыя, свабода, рынкавая эканоміка і г. д. Кожная кааліцыя абяцае зрабіць Беларусь заможнай, незалежнай і еўрапейскай дзяржавай. Кожная кааліцыя адстойвае празрыстыя і дэмакратычныя выбары і змагаецца супраць цяперашняга аўтарытарнага рэжыму. Не дзіва, што новы палітычны падзел змяніўся для знадворнага назіральніка зусім нязначна. Не ўнёс ён больш яснасці і ў народныя масы. У сведамасці электарату ўсе гэтыя "пяцёркі" толькі больш заблыталі разуменне становішча, так і не далі адказу на пытанне "за каго галасаваць?" І "калі не ён, дык хто?".

Як дзейныя партыі, так і іх цяперашнія ці будучыя кааліцыі альбо аб'яднанні, на жаль, не маюць за сабой апоры ў масах, яны навязваюцца народу "зверху", большай часткай стварающца, каб засвяціць нейкага новага лідэра. Яны існуюць самі па сабе – народ сам па сабе. Толькі пры стварэнні, узгадаванні высокай палітычнай культуры народа, нашага электарату, магчымыя дзейсныя палітычныя ўтварэнні, магчымыя партыі еўрапейскага кшталту.

Такім чынам, і новы падзел палітычнага спектру не ўнёс нічога новага як ў палітычную сведамасць

мас, так і ў ідэалагічную канцэпцыю маладой беларускай дзяржавы. Тым больш не ўнёс ён нічога новага ў разуменне нейкіх там “левых” і “правых” плыняў палітычнага спектру. Іх даўно няма і не будзе. А тая тэрміналагічная спадчына, што засталася ад камуністычнай эпохі, павінна стаць прадметам абмеркавання толькі гісторыкаў.

У гэтай сувязі ўзнікае заканамернае пытанне: калі няма левых і правых, то на якіх прынцыпах будуць будавацца і развівацца новыя палітычныя структуры, калі яны ўсё-такі стануць сапраўднымі партыямі – г. зн. аб’яднаннем людзей, якія гуртуюць найбольш палітычна актыўных людзей пэўных пластоў грамадства?

Я думаю, адкрываць Амерыку патрэбы няма. Беларусь павінна быць незалежнай і квітнеючай краінай. Мой дэвіз – “Стань гаспадаром!”. І наша краіна, на маю думку, павінна быць краінай гаспадароў. “Наш дом – Беларусь”. Такі лозунг цяпер часта гучыць. Ён азначае працяг першага: раз мы жывем у краіне пад назвай Беларусь, то яна мусіць быць нашым супольным домам, дзе гаспадаром буду і я, і мой сусед. У майго дома – Беларусі павінна быць і свая гаспадарка, якая завецца эканомікай, і свае традыцыі і звычаі, якія называюцца беларускай культурай, і свая мова, якая завецца беларускай. Усё гэта аб’ядноўваецца адным словам – нацыянальная ідэя. Тым цэментуючым рэчывам для ўсяго нашага пярэстага грамадства з’яўляецца толькі адно, замешанае на беларускіх нацыянальных каштоўнасцях, на памяці нашых славутых продкаў, на працы нашых рабочых і інжынераў, на творах нашых выдатных навукоўцаў, пісьменнікаў, музыкаў і артыстаў.

Ажыццяўленне беларускай нацыянальнай ідэі, развіццё беларускага нацыналізму да такой ступені, пакуль ён не стане рысай менаталітэту – вось што павіна быць у аснове любой палітычнай партыі ў Беларусі, і тады знікне назаўсёды штучны падзел на “белых” і “чырвоных”, на “правых” і “левых”.

### *Лёс нацыянальнай ідэі ў цяперашняй беларускай палітыцы*

Пасля закрыцця НДПБ і БНП на працягу дзесяці гадоў толькі дзве партыі БНФ (БНФ Баршчэўскага і КХП-БНФ Пазняка) засталіся на пазіцыях нацыянальнай дэмакратыі, так шырока разгорнутай у 90-х гг. XX ст. Першая партыя працягвала палітычную барацьбу, згодна з Праграмай і Статутам БНФ, прынятым яшчэ на з'ездзе ў 1993 г. Яна працягвала і працягвае курс "старога" Фронту на нацыянальнае адраджэнне. Другая частка, КХП БНФ, на чале з нязменным старшынём Зянонам Пазняком, які кіруе партыяй "завочна", з-за мяжы, і з кіраўніком партыі ў Беларусі намеснікам старшыні Юрасём Беленькім, стала паступова досыць маргінальнай структурай, якая амаль не ўдзельнічае ў палітычных працэсах. Канчатковы выхад КХП БНФ з палітычнага жыцця адбыўся пасля скандалу з паслом Георгам Вікам, якога пазнякоўцы абвінавацілі ў службе на германскую выведку і выйшлі з складу Кансультацыйнага Савета. Яны сталі ў пазіцыю перманентнага байкоту выбараў і наагул няўдзелу ў палітычным жыцці Беларусі, абмежавалі сваю дзейнасць некаторымі культурнымі мерапрыемствамі, сярод якіх галоўнымі былі паходы ў Курапаты. А калі партыя заканчвае сваю палітычную дзейнасць, то яна перастае быць партыяй, і ў цяперашні час КХП-БНФ уяўляе з сябе фактычна гурток нацыянальна сведамых людзей, мэтай якога ёсць крытыка "акупацыйнага расійскага рэжыму" і штогадовае ўшанаванне памяці ахвяраў сталінскага рэжыму ва ўрочышчы Курапаты, Лошыцы і правядзенне падобных акцый у іншых гарадах.

Са сказанага вынікае, што рэальнай палітычнай сілай з'яўляецца толькі першая з памянутых партый – партыя "простага" БНФ, якую ад самага пачатку ўзначальваў Вінцук Вячорка, а пасля апошняга восеньскага з'езда 2007 г. старшынём стаў адзін з самых сталых сяброў БНФ, былы дэпутат Вярхоўнага Савета, намеснік старшыні БНФ яшчэ часоў

Зянона Пазняка – навуковец і літаратар Лявон Баршчэўскі.

Чым жа было адметным жыццё і дзейнасць БНФ пад кіраўніцтвам В. Вячоркі на працягу ўсяго тэрміну ягонага кіраўніцтва (а гэта каля 8 гадоў!)? Поўны адказ на гэтае пытанне могуць даць толькі людзі, што паварыліся ў кухні самога Фронту, якія яго бачылі знутры.

Але многае было бачна і не ўзброеным вокам. Нутраныя супярэчнасці працягвалі трэсці БНФ, даводзіцца нават здзіўляцца, што БНФ зноў ацалеў, выслізнуў з чарговай афёры ці скандалу ўнутры актыву. Факт застаецца фактам – БНФ па-ранейшаму існуе, а на Варвашэні, 8 (цяпер пр. Машэрава) віруе жыццё, ладзяцца семінары, сустрэчы, вечарыны і прэзентацыі.

***Страты БНФ у новай іпастасі.***

Чарговыя страты БНФ былі значнымі. У 2003 г. з БНФ выходзіць адзін з самых актыўных дзеячоў Вячаслаў Сіўчык. Зноў канфлікт, і Фронт пакідае сталы фронтавец, старшыня Магілёўскай абласной арганізацыі БНФ Анатоль Фёдараў. Літаральна за ім – сябра сойма, прафесар Алесь Астроўскі і г. д.

Другой адметнасцю дзейнасці БНФ у гэтым дзесяцігоддзі быў дзейсны ўдзел у стварэнні новай палітычнай канструкцыі, кангламерату партый дэмакратычнага кірунку, які сфармаваўся пасля апошняй перарэгістрацыі партый у 1999 г. і які дзейнічае да сённяшняга дня пад рознымі назвамі – КРДС, Кансультацыйная Рада, “Пяцёрка плюс”, Аб’яднаныя дэмакратычныя сілы (АДС). БНФ ужо не меў таго лідэрства, не з’яўляўся кіроўнай сілай грамадства, як гэта было ў першай палове 1990-х гг. БНФ стаў шараговай партыяй, адной з ліку чатырох–пяці партый, якія з’яўляюцца найбольш значнымі з таго спісу, што быў перарэгістраваны Мін’юстам. Не больш за тое. Раскалоўшыся, Фронт аслабеў, а некаторыя партыі наадварот за гэты час выраслі якасна і колькасна настолькі, што зраўняліся паводле ўсіх асноўных параметраў з БНФ, калі не перасягнулі яго.

Гэтымі партыямі былі найперш Аб'яднаная грамадзянская партыя (АГП), абедзве ці нават тры сацыял-дэмакратычныя партыі і далучаная да дэмакратаў партыя камуністаў (КПБ) на чале з С. Калякіным.

***БНФ і КРДС – АДС.***

Старая ідэя згуртавання дэмакратычных партый, пра што марыў яшчэ Міхась Ткачоў, знайшла свой працяг у новых умовах, пачынаючы з 1999 г. Гэты крок быў неабходным для ўзмацнення агульнага патэнцыялу сіл, здольных супрацьстаяць узрастанню дыктатуры. Была створана Каардынацыйная Рада дэмакратычных сілаў, куды ўваходзілі ў розныя часы ад сямі да дзевяці партый і грамадскіх арганізацый дэмакратычнага кірунку. У 2000 г. да КРДС далучылася партыя апальных камуністаў (КПБ) Сяргея Калякіна, якія вырашылі, што яны насамрэч таксама дэмакраты, бо і ліберальная, і дэмакратычная ідэі не супярэчаць у наш час камуністычнай.

З таго часу мінула восем гадоў. БНФ прызвычаіўся да сваёй новай функцыі сумеснай палітычнай працы з сваімі яшчэ нядаўна лютымі ворагамі – "камунякамі". Калякін пачаў паціху вывучаць беларускую мову, а Вячорка чытаць орган камуністаў, апазіцыйную газету «Товарищ».

Такім чынам, галоўным набыткам ці хутчэй "адбыткам" стагоддзя стала тое, што з лідэра апошняй дэкады XX ст. БНФ у першай дэкадзе XXI ст. ператварыўся ў непрыкметную, шараговую арганізацыю (за выключэннем прыкметна адмоўнага іміджу ў грамадстве), стаў у адзін шэраг з ліберaламі, сацыялдэмакратамі і камуністамі.

Гэты несуцяшальны вынік выглядае яшчэ больш сумным на фоне адной вельмі важнай акалічнасці. Пасля рэферэндумаў 1995–1996 гг. беларуская мова страціла свой статус адзінай дзяржаўнай мовы, а беларуская нацыянальная сімволіка аказалася наагул забароненай. І наступу агрэсіўнай русіфікацыі БНФ ужо не здолеў даць належны адпор, як у мінулыя часы. Не хапала і сіл, і таго ўзроўню пасіянарнага

ўздыму, які быў вызначальнай рысай яшчэ некалькі гадоў таму. Калі першыя спробы аб'яднання дэмакратычных сілаў, якія пачаліся з "Новай Беларусі" М. Ткачова, праходзілі пад знакам першынства беларускай нацыянальнай ідэі, то пасля 2000 г. усе аб'яднанні – КРДС, Кансультацыйны Савет, "Пяцёрка плюс", і, нарэшце, цяперашняя АДС забыліся цалкам, што такое нацыянальная ідэя і навошта яна патрэбна Беларусі. Фактычна, АДС ёсць аб'яднанне манкуртаў, бо для большасці з аб'ектаў АДС Бацькаўшчына, мова і наша гісторыя ёсць пусты гук. Неразуменне лідэрамі партый, што ўваходзяць у АДС, першаступеннай важнасці нацыянальнай ідэі для будучыні Беларусі – вядзе да краху наагул тых набыткаў часу дэмакратызацыі Беларусі, што яшчэ засталіся. У гонках за "амерыканскім рублём", жадання як мага болей падабацца эмісарам розных замежных дэмакратычных цэнтраў, накшталт Амерыканскага дэмакратычнага інстытута, што прадстаўляў седзячы ў суседняй Вільні славуты Олсан, палітычныя лідэры амаль выкраслілі з свайго лексікону і палітычнага жыцця ўсё звязанае з нацыянальнай ідэяй.

Сапраўды, у Еўропе не разумеюць неабходнасці беларускага нацыянальнага адраджэння, не разумеюць нацыянальнай ідэі, а слова нацыяналізм іх палохае. Таму грошы, якія ідуць з іх фондаў, прызначаюцца, як правіла, на развіццё так званай "беларускай дэмакратыі" (у двукоссі таму, што ні яны, ні мы не ведаем, што гэта такое) на падрыхтоўку і правядзенне так званых "выбараў" і на развіццё розных заходніх каштоўнасцей накшталт правоў чалавека, розных свабод і г. д. І амаль нідзе, ні ў адным праекце вы не ўбачыце ні намёка на нацыянальную ідэю, нацыянальнае адраджэнне ці ратаванне беларускай мовы, развіццё нашай культуры і асветы.

Як беспасярэдні ўдзельнік многіх палітычных працэсаў апошняга дзесяцігоддзя, у прыватнасці, паседжанняў КРДС, КС, "Пяцёркі плюс" і АДС, з упэўненасцю магу сказаць, што апазіцыя выкінула панятак

нацыянальнай ідэі з свайго рацыёну. Ні адзін з праектаў Кангрэса дэмакратычных сіл, што праходзілі пачынаючы з 1999 г. і да самага апошняга 2007 г. не праходзіў пад знакам беларускай нацыянальнай ідэі. Мовай паседжанняў Палітрады і іншых структур аб'яднаных дэмакратаў усё больш робіцца расійская мова, што раней было рэдкім выключэннем.

БНФ сёння з'яўляецца адной з важкіх структур АДС. Трэба засведчыць, што ў цэлым ён застаўся верным курсу, які некалі ўзяў Зянон Пазняк. Цікава, што сам Зянон не хоча нічога ні слухаць, ні ведаць пра сваіх былых калег з "іншага" Фронту. Тым не менш, гэта адзіная арганізацыя, дзе не перайшлі на расійскую мову, на якой пастаянна ідзе розная культурніцкая праца, і што вельмі важна – праз БНФ актыўна ідзе працэс выхавання новага пакалення свядомых беларусаў. Толькі тут робіцца нешта для развіцця беларускай нацыі. Толькі ў БНФ не забытая нацыянальная ідэя.

Аднак на фоне палітычных цяжкавагаў, такіх, як АГП, БСДП (Г), КПБ, голасу БНФ амаль не чуваць. Таму, відаць, і не даходзяць крыкі паміраючай беларускай нацыі да заходніх дэмакратаў. Можа, тады, калі аб'явіць Беларусь зонай бяды, дык нехта і адгукнецца?

Я не бачу сэнсу ў "выбарах" любых роўняў, як у нас паводле аналогіі з Захадам завецца цынічны працэс прызначэння чыноўнікаў на вышэйшыя дзяржаўныя пасады і ў органы заканадаўства. Я бачу адзіную галоўную задачу для апазіцыйных структур у гуртаванні сіл для здзяйснення беларускай нацыянальнай ідэі. І тады Беларусь атрымае і свабодныя выбары, і дэмакратыю, і ўсе іншыя, такія прывабныя для некаторых, заходнія каштоўнасці. А інакш Беларусь знікне як адметная нацыянальная краіна, стаўшы ці губерняй Расіі ці васалам нейкай заходняй краіны, напрыклад, пратэктаратам ЗША. Адзіная рэальная палітычная структура, якая яшчэ нешта здольная зрабіць для далейшага развіцця пра-

екта пад назвай “беларуская нацыянальная ідэя”, – гэта БНФ. На гэтым шляху трэба працаваць разам з нешматлікімі блізкімі арганізацыямі – партыямі БСДП (Г), БСДГ, грамадскімі аб’яднаннямі – Саюзам беларускіх пісьменнікаў, ТБМ, ТБШ, Інстытутам нацыянальнай памяці і інш.

***БНФ і Мілінкевіч.*** Перад апошнімі прэзідэнцкімі выбарамі апазіцыя распачала спробу выявіць такога кандыдата ў прэзідэнты, асоба якога задаволіла б усе арганізацыі, партыі, што ўваходзяць у АДС. Гэтай асобай стаў Аляксандр Мілінкевіч. Ён стала карыстаўся беларускай мовай, думкамі і ўсімі папярэднімі дзеяннямі быў вельмі блізкім да праграмы і акцый БНФ, хоць не з’яўляўся сябрам ні Фронту, ні іншай палітычнай партыі. І хоць было відавочна, што у прэзідэнты ні ён, ні хто-небудзь іншы і блізка не пройдуць, апазіцыя падтрымала Мілю, як пазней ласкава яго сталі называць прыхільнікі. Беларускаму прагрэсіўнаму грамадству як паветра патрэбен быў новы чалавек – лідэр нацыі, патрэбен быў новы штуршок, каб не патухлі канчаткова беларускае адраджэнне і наогул тыя высакародныя справы, што былі распачатыя ў 1990-х гг.

Мілінкевіч задавальняў многіх. Інтэлігент, свядомы беларус, асабіста для мяне і калега-фізік, Мілінкевіч падаваў надзею на той чаканы новы віток і новую якасць пабудовы беларускага грамадства і вяртанне ідэй 1990-х, і ў канцавым выпадку вяртанне, дакладней, абуджэнне ўсіх аспектаў беларускай нацыянальнай ідэі.

Пасля выбараў А. Мілінкевіч не знік з палітыкі, як гэта атрымалася з яго папярэднікам Ганчарыкам, працягнуў палітычную барацьбу ў новых умовах і нават стварыў сваю арганізацыю – “Рух за Свабоду”. У гэты “Рух” увайшлі прыхільнікі Мілінкевіча з розных партый і найбольш з БНФ (магчыма, убачыўшы ў Мілінкевічы сапраўднага бэнэфаўца, а не чарговага партыйнага бюракрата). Былі вялікія надзеі на тое, што зрушыцца, урэшце, занядбаная беларуская справа.

Аднак нічога істотна новага мы не ўбачылі з абвяшчэннем стварэння шырокай грамадскай структуры “Руху за Свабоду”. Праўда, Мілінкевіч перманентна знаходзіўся за мяжой, усё там аб нечым дамаўляўся, перагаворваў... мо таму і не праявіў сябе за мінулы час “Рух за Свабоду”. Усё часцей паўстае пытанне: ці не з’яўляецца мілінкевічаўскі Рух чарговым блефам, чарговымі “рагамі і капытамі”? Надта ж добра схаваўся “Рух за Свабоду” ад грамадства, калі ўсё-такі ён існуе як канкрэтная рэальнасць і сіла.

Адно, што ведамае людзям, – гэта дзейнасць А. Мілінкевіча і І. Кулеш паводле праграмы Каліноўскага, якая дае магчымасць уладкаваць найлепшую беларускую моладзь на вучобу і працу за мяжу. А на мой погляд, гэта не найлепшая справа адпраўляюць сваё дзіця за мяжу на вучобу альбо на працу пакаёўкай ці мыйшчыкам посуду. Часта гэтая дзейнасць заканчваецца шэрагам высілкаў, каб юнаку ці маладзіцы не вярнуцца на Радзіму і замацавацца там назаўжды. І не ведаюць палітычныя немаўляты, што тая заходняя дэмакратыя можа скончыцца для іх “дэман-кратыяй”. Большая частка гэтых людзей будзе страчана і для бацькоў, і для Радзімы, і для нацыі...

Мне здаецца, што Аляксандр Мілінкевіч і не надта вінаваты ў тым, што ў яго не атрымалася стаць цэнтральнай фігурай у праекце беларускай нацыянальнай ідэі. Ва ўмовах нашай таталітарнай сістэмы і дыктатуры вельмі цяжка гаварыць пра ініцыятыву, якая б існавала незалежна ад магутнай “вертыкалі”. Магчыма, тут патрэбен іншы чалавек, як, напрыклад, Аляксандр Казулін, якому ўдалося добра ўзбударажыць нашае грамадства. Але, па-першае, А. Казулін адсядзеў больш за два гады ў турме і не ўдзельнічаў фактычна ў палітычным працэсе, а па-другое, яму не хапае такога ўзроўню нацыянальнай сведамасці, які абавязкова павінен быць у нацыянальнага лідэра.

Адцягнуўшы ад БНФ частку людзей у “Рух за Свабоду”, Мілінкевіч нічога канструктыўна новага не ўнёс у раскладку дзейных палітычных сіл. Адно

толькі – БНФ зноў панёс страты. Праўда, на гэты раз, здаецца, не значныя.

Таму можна зрабіць наступную выснову. У сённяшні час БНФ застаецца адзінай палітычнай арганізацыяй, дзе яшчэ засталася праўда. А праўда ў тых ідэалах, з якіх пачынаўся БНФ у канцы 1980-х, і перадусім – у беларускай нацыянальнай ідэі.

І апошняе.

Праз пастаянную крытыку ў бок БНФ і іншых партый, мне, магчыма, не досыць поўна ўдалося вылучыць тыя галоўныя моманты, што тычацца ролі БНФ у гісторыі. Таму я выкладу заключныя думкі ніжэй.

1. БНФ быў галоўным каталізатарам і чыннікам усіх падзей, якія распачаліся пасля гарбачоўскай перабудовы ў Беларусі. БНФ быў магільшчыкам манаполіі камуністаў на неабмежаваную ўладу. Дзякуючы БНФ быў адкрыты пачатак новым палітычным працэсам у Беларусі, якія прывялі да стварэння новай дзяржавы – Рэспублікі Беларусь.

2. Менавіта БНФ павярнуў беларускага грамадзяніна тварам да яго іншай, сапраўднай іпастасі, дадзенай Богам, – да асэнсавання таго, што ён не толькі савецкі чалавек, а часцінка нацыі, імя якой – беларусы. І хоць працэс станаўлення беларускай нацыі быў на няпэўны час прыпынены, тыя якасныя зрухі беларускага адраджэння 90-х гг. XX ст. з'яўляюцца ўжо набыткам вечнасці і падмуркам жыцця новых пакаленняў.

Намаганнямі БНФ і роднасных партый, а таксама дзякуючы працы людзей, узрослых на глебе ідэй БНФ – палітычных дзеячоў, дзеячоў навукі і культуры, за мінулыя 20 гадоў было ўсё ж такі шмат зроблена для канструявання беларускай нацыянальнай ідэі на сучасным этапе развіцця нашай нацыі. І гэта адкрывае нашай краіне шлях у будучыню як нацыянальнай дзяржавы, як раўнапраўнай краіны ў сусветным кветніку народаў.

***Што засталося ў астатку і што рабіць?***

Назіраючы за так званай "палітычнай дзейнасцю" сучасных палітычных партый, я некаторы час думаў, што прычыны нашай паразы аб'ектыўныя: маўляў, няма ў нашых партый магчымасцей разварнуцца, зменіцца палітычная сітуацыя – і рана ці позна дэмакратыя ў Беларусі ўсталюецца. Па звычцы ўсю імпатэнцыю палітычнага жыцця, як і большасць дэмакратаў, я звальваў на дыктатуру. Думалася, што вось будзе іншы ўрад, новы прэзідэнт – і ўсё зменіцца, будзе, як і ў іншых заходніх краінах, – свабода, грошы і дэмакратыя... Сам выступаў на кангрэсах дэмсіл спачатку як старшыня БНП, а потым і як намеснік старшыні БСДГ.

Але ж прайшлі гады і нічога не змянілася. І самае сумнае – з гэтай апазіцыяй нічога і не можа змяніцца. Яшчэ ў 1999 г. я быў адным з удзельнікаў тых нарад Кансультацыйнай Рады дэмсіл, што адбываліся пры місіі АБСЕ ў будынку нямецкага цэнтра на пр. Праўды ў апартаментах пасла Георга Віка. Менавіта там былі сфармуляваныя славутыя чатыры ўмовы справядлівых і празрыстых выбараў. Яны былі сфармуляваныя ў дакументах Кангрэса дэмакратычных сілаў у 2005 г.:

*КДС патрабуе выканання чатырох крытэраў, замацаваных у Дэкларацыі Санкт-Пецярбургскай сесіі ПА АБСЕ (1999 г.), Дэкларацыі Стамбульскага саміта глаў дзяржаў і ў дакуменце Парламенцкай "Тройкі" (2000 г.) у якасці асноватворных прынцыпаў дэмакратычных выбараў і асноўных умоў працэсу дэмакратызацыі ў Беларусі:*

*– прызрыстасць выбарчага працэсу;*

*– доступ апанентаў улады да дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі;*

*– недыскрымінацыя апанентаў;*

*– пашырэнне значных функцый і паўнамоцтваў парламенцкага органа.*

Прайшло каля 10 гадоў пасля з'яўлення на свет гэтых кароткіх формул, і столькі ж часу ідзе іміта-

цыя змагання за здзяйсненне гэтых прынцыпаў пры правядзенні выбараў у закандаўчыя органы ды і іншыя структуры ўлады. Зноў і зноў напярэдадні выбраў ідзе працэс, мала падобны на тое, што завецца здаровым сэнсам і што адпавядае нармальнай чалавечай логіцы і розуму. Апазіцыя на працягу згаданых 10 гадоў высоўвае свае чатыры ўмовы перад беларускім урадам і прэзідэнтам як умову правядзення выбараў. Бязглуздасць сітуацыі заключаецца ў тым, што ўсе – і апазіцыя, і прэзідэнт з сваёй камандай – добра ведаюць: ніводная з гэтых умоў не будзе прынятая. Аргументы лідэраў розных партый, што кожны раз бяруць удзел у гэтых псеўдавыбрах, проста смешныя – яны, маўляў, працуюць з насельніцтвам, выкарыстоўваюць прадвыбарны перыяд для агітацыі і данясення нейкай там праўды да электарату. Ніхто іх ніколі не слухае, а калі і слухае, дык толькі той, хто і так думае ў патрэбным рэчышчы. Народ даўно ўжо мае сваё меркаванне пра большасць дзеячоў апазіцыі, а калі не мае, то і не збіраецца яго мець ці мяняць на карысць якога-небудзь "бээнэфаўца". Другі бок – афіцыйны. Беларускія ўлады добра ведаюць, што бяззубая апазіцыя не вораг ім, а сябра, бо ўрэшце яны возьмуць удзел у выбарах без усялякіх саступак на "празрыстасць", а тым больш пры нейкім чарговым "кроку да Еўропы" накшталт вызвалення некаторых палітычных вязняў. А калі палітычныя партыі возьмуць удзел у выбрах, то значыць, у нас "выбары адпавядаюць самым лепшым нормам дэмакратыі". Як сказаў Аляксандр Лукашэнка пасля выбараў у Палату прадстаўнікоў 2008 г., – у нас "беспрецедентно прозрачные выборы".

А насамрэч усе ведаюць, што ніякіх выбраў у нас даўно няма. Пішуцца, ці як цяпер больш правільна кажуць, малююцца "дэмакратычныя" пратаколы, размяркоўваюцца "галасы" па кандыдатах, падганяюцца патрэбныя лічбы – вось і ўсе выбры. Па размаху цынізму сучасныя выбары ў Беларусі не маюць аналагаў. Гэта нават не фарс, а нейкае нахабнае і

подлае дзеянне. Нават у Савецкім Саюзе выбары былі выбарамі, хоць былі безальтэрнатыўнымі. Там за кожны голас змагаліся, хадзілі ўгаворвалі тых, хто чамусьці не прыйшоў на ўчастак. І нікому тады ў галаву не прыходзіла, што можна не шукаць гэтага дысідэнта, а намаляваць за яго патрэбны бюлетэнь.

Сучасная апазіцыя, гэта апора лігітымнасці нашага рэжыму. Урад ніколі не пойдзе на закрыццё большасці палітычных партый, што б яны не ўтварылі. Новых не трэба, бо няведама, што з іх выйдзе, але старых, праверанных часам, не аддадзім – вось пазіцыя Мін'юста. Ураду як паветра патрэбна гэтая гульня ў палітыку. Яму патрэбна гэтая гульня, як кошцы, што гуляе з мышкай, і, як сытая кошка, ён не будзе есць гэтую мышку, а часам нават будзе выпускаць з кіпцюроў, каб пакайфаваць, назіраючы за пакутамі няшчаснай.

Чаму ж большасць апазіцыйных партый працягвае сваю бязглуздую "дзейнасць", з года ў год працягваючы тыя самыя завучаныя дзеянні, ад якіх толку нуль? А таму, што яе лідэры ўжо няздольныя рабіць нешта іншае, апрача той працы, якую яны завуць палітыкай. Яны атрымліваюць за яе грошы, жывуць за яе кошт. Гэта ўжо не палітыкі, а палітбізнесмены. Іх добра ведаюць на Захадзе, могуць і кінуць ім нейкую костку. Іншых ведаюць ў Расіі, там таксама можна зарабіць на хлеб.

Яны лёс Беларусі не вызначаюць.

А хто, можна задаць заканамернае пытанне, вызначае нашу будучыню? Якія сілы кіруюць намі, нашым прагрэсам? Я думаю, што толькі адна, пра якую менш за ўсё думаюць нашыя палітыкі. Гэтая сіла заўсёды вызначала гісторыю чалавецтва, праўда заўсёда за ёй. Гэтая сіла – наш усемагутны і бясконца любячы Гасподзь. Толькі той пераможа, хто жыве з імем Хрыста і здольны аддаць жыццё за Хрыста.

Госпадзі! "Не мая воля, а Твая няхай будзе." (Лк. 22, 42).

# Раздзел VI.
# БЕЛАРУСКАЯ НАЦЫЯ Ў СВЕЦЕ МАДЭРНЫХ КАНЦЭПЦЫЙ: СІСТЭМНЫ ПАДЫХОД, ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ГРАМАДСТВА, HOMO INFORMATICUS

## 1. Этнасы і нацыі праз прызму эвалюцыі

Глыбока і шматбакова даследаваў праблему этнасу гісторык, географ і этнограф Леў Гумілёў (глядзіце, напрыклад, ягоныя цудоўныя кнігі "Конец и вновь начало", "Этногенез и биосфера земли"). Дзеля таго, каб пазбегнуць неадназначнасцей у трактоўцы тэрмінаў, Л. Гумілёў з самага пачатку фармулюе свой падыход[1]: "Народ, народнасць, нацыя, племя, радавы саюз – усе гэтыя паняткі абазначаюцца ў этналогіі тэрмінам этнас. Умовіцца аб значэнні любога тэрміна лёгка, але гэта мала што дае, хіба толькі зыходную пазіцыю для даследавання".

На нашую думку, нельга пагадзіцца з такім падыходам у пытаннях эвалюцыі чалавецтва, бо азначэнне разгляданых тэрмінаў істотна не толькі для зыходнай пазіцыі, як гэта лічыць Леў Гумілёў, а і канцавых вынікаў. Зводзіць усе пытанні – род, племя, народ, этнас, нацыя да аднаго – этнасу, як гэта робіць Л. Гумілёў, было б мэтазгодным пры разглядзе мінулых гістарычных падзей, але не прымальна пры прагназаванні будучыні ў палітычнай філасофіі.

У адрозненне ад Л. Гумілёва, сучасны нямецкі філосаф Курт Хюбнер ("Нация: от забвения к возрождению". М., 2001) прытрымліваецца зусім іншай пазіцыі ў разгляданай намі праблеме. Усе катэгорыі людскіх супольнасцей К. Хюбнер зводзіць да адной – нацыі. Нацыю ён, фактычна, атаясамлівае з паняткамі народ і этнас і экстрапалюе іх існаванне на ўсю гісторыю чалавецтва. Гэтая пазіцыя з нашага пункту

[1] Гумилев Л.Н. Конец и вновь начало. М., 2001. С. 17.

гледжання таксама не рацыянальная, аднабаковая. Яна не дае магчымасці прасачыць пакрокава за эвалюцыйным ланцужком: род → племя → этнас → нацыя, якi мы разглядалi ў п. 1.1–1.2.

Падсумуем цяпер асноўныя нашыя вынiкi, высветлiм адметнасцi кожнага з тэрмiнаў i суаднясем iх з гiстарычным працэсам.

Вернемся найперш да панятка "**народ**". Гэты панятак выкарыстоўваецца для абазначэння пэўных чалавечых калектываў ад дагiстарычных часоў i да нашага часу, мае самы шырокi сэнс. Гэта i звычайная, любая група людзей, гэта i этнiчная супольнасць, гэта i нацыя.

**Радавы саюз, племя.**

Мае сэнс перадусiм пры разглядзе аддаленых гiстарычных падзей. Групы людзей аб'ядноўвалiся ў плямёны ў дакласавы, дафеадальны перыяд. Гэтыя часы адносна рэлiгiйных вераванняў вядомыя як язычнiцкiя, гэта эпоха полiтэiзму. Як ужо сказана – радавыя саюзы i плямёны ўзнiкалi на пачатку чалавечай цывiлiзацыi, на пачатку гiстарычнага перыяду чалавецтва. Аднак i ў наш час у некаторых раёнах зямнога шару можна знайсцi аб'яднаннi людзей, якiя вызначаюцца племяннымi суадносiнамi, тоеснымi тым, што былi ў старажытнасцi. Характэрна i тое, што сярод сучасных плямёнаў пануюць язычнiцкiя звычаi, полiтэiзм.

**Этнас i нацыя.**

У Еўропе этнасы гiстарычна ўзнiклi шляхам пераўтварэння плямёнаў, iх развiцця ў кiрунку паступовага асэнсавання племенем сваёй адметнасцi i наагул фармавання ўсяго комплексу этнiчных прыкмет.

Калi радавыя саюзы i потым плямёны – пераважна бiялагiчныя ўтварэннi, то этнас ужо нясе шэраг рыс сацыяльнага i духоўнага плану. Этнас аб'ядноўвае людзей аднаго менталiтэту i завяршае сваё фармаванне ў прыняцці пэўнага веравызнання. Так, сербы i харваты – фактычна адзiн i той жа народ. Яны гавораць на адной i той жа мове, i маглi быць адным

і тым жа этнасам. Аднак яны разышліся. Таму што прынялі розныя версіі хрысціянства: сербы – праваслаўе, харваты – каталіцызм. І гэты падзел даў свету ўжо дзве асобныя нацыі – сербскую і харвацкую.

Блізкім да разгледжанай сітуацыі быў перыяд фармавання французскага этнасу. У свой час, у XVI ст. усё насельніцтва Францыі раскалолася на "папістаў" (католікаў) і "гугенотаў" (пратэстантаў). Гасконцы і народ Навары прынялі кальвінізм. Парыж, Латарынгія і цэнтр Францыі засталіся каталіцкімі. І калі б у гугенотаў засталася свая тэрыторыя, то адбылося б як у папярэднім выпадку сербаў і харватаў. Узнік бы асобны этнас, скажам, гасконскі, які б быў незалежны ад французскага, а потым, у эпоху фармавання нацый, магла б узнікнуць і асобная нацыя-дзяржава – "Гасконь".

Прыведзеныя разважанні даюць падставу падзяліць гістарычны шлях чалавецтва на некалькі характэрных стадый: 1. Радавы саюз, племя – язычніцтва; 2. Этнас – монатэізм (этнічны); 3. Нацыя-дзяржава – монатэізм (нацыянальны).

Другая стадыя мае характэрную асаблівасць: рэлігійная прыналежнасць дамінуе над этнічнай. Другімі словамі – ход гісторыі вызначаўся ў эпоху этнасаў большай часткай рэлігійнымі спрэчкамі. Часта адзін і той жа этнас раздзіраўся на часткі, унутрана канфліктаваў з-за спавядання ягонымі членамі розных веравызнанняў. У эпоху нацый-дзяржаў наадварот дамінoўным фактарам стала нацыянальная прыналежнасць, рэлігійныя стасункі адыходзяць на другі план. Такая падпарадкаванасць рэлігіі нацыі прывяла нават да наступнай з'явы: нацыянальнасць стала ў некаторых выпадках сведчыць і аб веравызнанні яе носьбіта. Напрыклад, устойліва трымалася такое меркаванне: рускі – значыць праваслаўны, паляк – католік, што адмоўна адбілася пры самасцвярджэнні беларускага этнасу.

Праілюструем сказанае наступнай схемай.




Схема 1

На схеме: t – фактар часу. $t_1$ – час утварэння этнасаў (у Еўропе пачатак ад Нараджэння Хрыстовага), $t_2$ – час утварэння нацый (умоўна 1789 г.), $t_3$ – наш час.

P(t) – фактар прагрэсу цывілізацыі.

a – крывая ўзроўню этнічнасці.

b – крывая ўзроўню рэлігійнасці.

I стадыя. (I ст.) – час старажытнай гісторыі, стадыя, якая мае адзінства дзвюх характарыстык. У этнасацыяльнай сферы – падзел грамадства на радавыя саюзы, плямёны, полісы (абазначана тонкімі рыскамі). У духоўнай сферы – політэізм, розныя паганскія сонмы багоў: грэчаскі, рымскі, славянскі і г. д. (абазначана штрыхаванымі рыскамі)

II стадыя характарызуецца дзвюма вызначальнымі рысамі:

1) пераход ад політэізму (язычніцтва) да манатэізму (у Еўропе гэта пераход да хрысціянства, які доўжыўся ўсё першае тысячагоддзе нашай эры, а месцамі і пазней);

2) у этнасацыяльнай сферы гэта пераўтварэнне племянной структуры грамадства ў этнічную. Гэта

працэс этнагенезу. Вынік – фармаванне развітай сістэмы этнасаў. Рускі этнас, напрыклад, утварыўся ад зліцця славян, уграў, цюрак і аланаў. Беларусы – гэта сумесь балтаў, славян і уграў.

Адзначым вельмі важную рысу другой стадыі. З прыняццем Еўропай хрысціянства ход гісторыі вызначаўся галоўным чынам рэлігійнай прыналежнасцю жыхароў адпаведнай краіны. Напрыклад, крыжаносцы аб'ядноўвалі католікаў розных краін, і іх паходы былі рэлігійным актам. У дзяржаўнай палітыцы як каталіцкіх краін (Францыя, Свяшчэнная Рымская імперыя і інш.), так і праваслаўных (Візантыя, Старажытная Русь) вялікую ролю адыгрывала духавенства: папа ў католікаў і патрыярх у праваслаўных. Вядомы нават тэрмін, які характарызуе эпоху I тысячагоддзя – сімфонія Царквы і дзяржавы.

На схеме 1 у другой стадыі рэлігійнасць як фактар гістарычнага працэсу стаіць вышэй за этнічную прыналежнасць

III стадыя. Умоўна бярэ пачатак з канца XVIII–пачатку XIX ст. і вызначаецца ўтварэннем нацый. У сацыяльнай сферы прыход капіталізму і эпохі індустрыялізацыі. Рэлігійныя прыхільнасці ранейшыя – монатэізм, але ў вялікай разнастайнасці сваіх форм (у хрысціянстве, напрыклад, бурны рост цэркваў пратэстанцкага кірунку). Працэс драблення хрысціянскіх канфесій прывёў да зніжэння ўплыву фактару рэлігійнасці на гістарычны працэс. Пачынае дамінаваць нацыянальная сфера. Таму на схеме 1 крывая рэлігійнасці (b) праходзіць ужо ніжэй за крывую нацыі (этнасу) – (a).

## 2. Тэорыя стадый развіцця грамадства праз прызму нацыі

Сучасныя веды аб чалавеку і грамадстве даюць нам падставу лічыць, што гісторыя ёсць паступовае пашырэнне і паглыбленне чалавечай сутнасці. Зазірнем у тыя дагістарычныя часы, калі толькі ўтвараліся пер-

шыя аб'яднанні людзей, першыя племянныя саюзы. У адрозненне ад жывёлы са статка сабе падобных, чалавек у сваім племені атрымаў вельмі важны атрыбут – сваё імя. Спачатку гэта была адзіная, але істотная якасць, якая азначала адметнасць, індывідуальнасць асобы з нейкай групы ці племені. Трохі пазней у людзей з'яўляецца рэлігія. Першыя прымітыўныя вераванні атрымалі назву татэмізму і былі выкліканы звычайнай рэакцыяй на невядомыя, магутныя сілы прыроды. З гэтых часоў заўважаецца другая фаза расчаплення раней адзінай супольнасці першабытных людзей (старажытнага грамадства) — расчапленне асобных плямёнаў па тым сонме багоў, у якія кожнае з іх верыла, г. зн. – па рэлігіі. Такім чынам, яшчэ са старажытнасці людзі пачалі адрозніваюцца не толькі сваімі ўласнымі імёнамі, але і веравызнаннем.

Прычым усе народы свету прайшлі шлях ад веры ў многіх багоў – політэізму (паганства), да веры ў адзінага Бога – монатэізму (хрысціянства, іслам, іудаізм, індуізм паводле вучэння Рамакрышны – Вівекананды і г. д.).

З другога боку, эвалюцыя чалавецтва прывяла да ўтварэння кастаў, класаў і іншых грамадскіх груп. Касты, напрыклад, характарызуюцца ўжо жорсткай іерархіяй паміж рознымі пластамі грамадства, якая вызначае амаль усе суадносіны паміж людзьмі. Такім шляхам ішоў і Старажытны Егіпет, і Індыя, і Еўропа – увесь свет.

І толькі многа пазней, як мы ўжо і падкрэслівалі, утвараюцца нацыі па прыкмеце супольнасці людзей па мове, тэрыторыі, гісторыі, традыцыях і звычаях. Пры гэтым нацыянальныя асаблівасці сталі істотна ўплываць на ўзаемаадносіны людзей толькі з канца XVIII ст. і асабліва выразна праявіліся ў XIX ст. і ў наш час.

Аднак праявы нацыяналізму можна бачыць і ў больш раннія часы, хоць гэтая з'ява і не сфармавалася тады ў сучасным выглядзе. Напрыклад, у Ся-

рэднявеччы мы бачым праяву палітычнага нацыяналізму як рэакцыю на імперскую палітыку Гогенштаўфенаў (1137–1254 гг.)

Працэс фармавання нацый і росту нацыянальных рухаў найбольш актыўна ішоў на працягу ўсяго XIX ст. Гэта адзначалася многімі мыслярамі таго часу. Так, М. А. Славінскі пісаў[1], што векавыя намаганні нямецкіх ордэнаў не змаглі дэнацыяналізаваць эстаў і латышоў, а "намаганні польскай дзяржаўнасці разбіліся аб трываласць літоўскіх і беларускіх народных элементаў". Славінскі падкрэслівае, што *На працягу XIX ст., асабліва другой яго паловы, разам з ростам палітычнай свабоды расце і свабода нацыянальная; разам з умацаваннем правоў і гарантый свабоднай асобы ўмацоўваюцца правы і гарантыі свабоднай нацыянальнасці*. Такім чынам, робіцца выснова, што будучыня – за свабодным творчым развіццём чалавека ў нацыі.

XX ст. яшчэ больш крышталізуе нацыі. На пачатку XX ст. мы бачым распад Аўстра-Венгерскай Імперыі і ўтварэнне новых незалежных дзяржаў — Чэхіі, Аўстрыі і іншых. Потым – распад Расійскай Імперыі ў 1917 г. На працягу ўсяго XX ст. працэс утварэння новых нацыянальных дзяржаў працягваўся і ў наш час дасягнуў кульмінацыі: у выніку развалу СССР утварылася 15 новых дзяржаў — па ліку саюзных рэспублік, і, імаверна, працэс гэты будзе працягвацца. Акрамя згаданых пераўтварэнняў, цяпер усё больш сур'ёзныя размовы вядуцца вакол праблемы Фландрыі ў Бельгіі, баскаў у Іспаніі і нават абмяркоўваецца магчымасць падзелу Канады на англамоўную і франкамоўную.

Ігар Шафарэвіч у артыкуле "Обособление или сближение?"[2] са здзіўленнем піша: "Зусім нечакана XX стагоддзе аказалася стагоддзем нечувана абвостранага

---

[1] Славинский Н.А. Русская интеллигенция и национальный вопрос // Вехи, М., 1909.

[2] Шафаревич Игорь. Обособление или сближение? // Из-под глыб, YMCA-PRESS, Париж, 1974.

нацыяналізму", – і працягвае: "Разбурэнне вялікіх імперый ува ўсе часы працякала паралельна абвастрэнню нацыянальнага адчування асобных уваходзячых у іх нацый, абасабленню этнічных груп, імкненню іх вылучыцца як самастойныя нацыі".

Каб выратаваць ідэю "бяскрыўднасці" рускай нацыі, адгарадзіць яе ад ярлыка шавінізму, аўтар "Обособлений" робіць прыём, які на пачатку распаду СССР і краху сацыялістычнага лагера быў бы і дзейсным. Сутнасць яго логікі ў тым, што ён абвінавачвае ў антынацыянальнай палітыцы... сацыялізм: *Нацыянальнае жыццё многіх народаў цяпер з'яўляецца ахвярай менавіта той сілы – сацыялістычнай ідэалогіі.*

Праблема "малога" народа, існуючага ў асяроддзі "вялікага" народа, пастаўленая яшчэ Агюстам Кашэнам, даследнікам французскай рэвалюцыі, існуе і цяпер ва ўсім свеце. Існуе праблема баскаў у Іспаніі, фламандцаў у Бельгіі і шмат іншых.

Усе гэтыя прыклады прыводзяць да лагічнай высновы: такая з'ява, як нацыя і яе ідэалагічная аснова – нацыяналізм, ёсць з'явы пэўнай ступені прагрэсу чалавечага грамадства, яго эвалюцыі. Нацыяналізм – з'ява сучасная, з'ява духоўнага плану. Гэта істотна якасны крок у бесконцым руху чалавека да Бога. Важнасць падзелу чалавечага грамадства на народы стала, фактычна, зразумелай толькі цяпер, хоць пра гэта сказана яшчэ ў Святым Пісьме: *І напоўніліся ўсе Духам Святым і пачалі гаварыць на іншых мовах, як Дух даваў ім вяшчаць...І ўсе здзіўляліся і дзівавалі, кажучы паміж сабою: гэтыя, што гавораць, ці не ўсе Галілеяне? Як жа мы чуем кожны сваю мову, у якой нарадзіліся, Парфяне і Мідзяне і Еламіты, і жыхары Месапатаміі, Юдэі, Кападокіі, Понта і Асіі, Фрыгіі і Памфіліі, Егіпта і частак Лівіі, што мяжуюцца з Кірынеяй, і прышлыя з Рыма, юдэі і празеліты, крэцяне і аравіцяне, – чуем іх, як гавораць нашымі мовамі пра вялікія дзеі Божыя* (Дзеі 2: 4, 7–11).

У гэтым урыўку Евангелля гаворыцца аб тым, што пра «дзеі Божыя», альбо Божы Промысел, можна га-

варыць рознымі мовамі, і гэта азначае, што розныя народы (этнасы, нацыі) аднолькава важныя для Бога. І з другога боку Ён (Бог) прымае чалавека не як безаблічную істоту, а як адзінку этнасу, ці нацыі. Гэтыя разважанні даюць магчымасць разгледзець гісторыю чалавецтва праз прызму крытэра рэлігіі з аднаго боку, і праз прызму нацыі (племені, этнасу) з другога.

Найбольш распаўсюджанай класіфікацыяй перыяду гісторыі, якая прынятая ў марксісцка-ленінскай філасофіі, з'яўляецца наступны падзел грамадскіх ладаў: першабытна-абшчынны, рабаўладальніцкі, феадальны, капіталістычны, сацыялістычны і, нарэшце, камуністычны. Аднак час паказаў не поўную слушнасць такога падзелу, асабліва ў яго апошніх трох стадыях: капіталізм (I) $\rightarrow$ сацыялізм (II) $\rightarrow$ камунізм (III). Праблематычны пераход I $\rightarrow$ II, а эвалюцыя II у III ці наагул магчыма, бо сама стадыя камунізму недасягальная і ёсць, фактычна, існаванне чалавека з Богам і ў Богу, і вядома з Бібліі як Рай (Эдэм).

Існуюць іншыя класіфікацыі гістарычных перыядаў, звязаныя з імёнамі О. Шпенглера, А. Тойнбі, П. Сарокіна, Л. Гумілёва і іншымі.

Не ставячы задачай аналізаваць усе наяўныя падыходы, абмяжуемся толькі некаторымі.

Леў Гумілёў, напрыклад, не адмаўляючы класіфікацыі, прынятай савецкай філасофскай навукай, разглядае перыядызацыю гісторыі чалавецтва праз этнагенез чалавечых супольнасцей. Кожны этнас, згодна Гумілёву, пасля пасіянарнага штуршка праходзіць наступныя фазы развіцця: пад'ём, акматычную фазу (пік развіцця), надлом (пераход да наступнага выраджэння этнасу), інерцыйная фаза, абскурацыя і, нарэшце, мемарыяльная фаза (гібель этнасу ці яго пераўтварэнне (зліццё) у новы этнас).

Іншы падыход быў прапанаваны савецкім даследнікам С. А. Токаравым. У адрозненне ад Л. Гумілёва, ён не абмяжоўваецца існаваннем у гісторыі толькі этнасаў. Ён вылучае чатыры гістарычныя фармацыі: племя (абшчынна-радавы лад), дэмас (рабаўла-

дальніцкі лад), народнасць (феадалізм) і нацыю (капіталізм і сацыялізм).

Наш падыход блізкі да поглядаў Токарава, але адрозніваецца тым, што мы спрашчаем папярэднюю схему і вылучаем, на наш погляд, больш істотныя гістарычныя калектывы людзей – племя, этнас і нацыю. Другой рысай нашага падыходу з'яўляецца неабходная адпаведнасць паміж адзначанымі супольнасцямі людзей і пэўнай рэлігіяй.

На нашую думку, эвалюцыя чалавецтва – гэта не проста этнагенез, бясконцы кругаварот этнічных адзінак без мэты і новай якасці, і не толькі тэхналагічны прагрэс. Як гаварылася вышэй, этнасы не толькі змяняюцца ці пераходзяць адзін у аднаго, а пераўтвараюцца ў новую якасць – нацыі. Гэты працэс, пачатак якога мы ўмоўна датавалі канцом XVIII ст., у наш час не толькі працягваецца, але і вызначае ход гісторыі. Грунтуючыся на гэтых развагах, а таксама на папярэдніх выніках аб неабходнасці ўліку крытэра рэлігіі пры аналізе эвалюцыі чалавецтва, гісторыю чалавецтва, на наш погляд, можна падзяліць на тры вялікія перыяды, якія вызначаюцца дзвюма галоўнымі рысамі – стаўленнем да рэлігіі і сацыяльна-біялагічнай структурай грамадства ў выглядзе плямён, этнасаў і нацый. Мы прапануем наступны ланцужок стадый эвалюцыі чалавецтва:




Схема 2

Дзейснасць гэтай схемы можна прасачыць на працягу гісторыі розных народаў свету. Так, Еўропа прайшла шлях першай стадыі (політэізму) у форме антычных Старажытнай Грэцыі і Рымскай Імперыі. І хоць да Нараджэння Хрыстовага ў антычным свеце існаваў народ – габрэі, якія прызнавалі толькі аднаго Бога – Іегову, яны складалі выключэнні, былі богаабраным народам. Прыход хрысціянства паклаў пачатак новай

эпохі – монатэізму з пункту гледжання рэлігіі, і эпохі поўнага перакройвання карты Еўропы з пункту гледжання палітычнай гісторыі. Еўропа пакрылася густой сеткай хрысціянскіх краін, і ўвесь механізм іх утварэння праходзіў перадусім пад знакам сцвярджэння хрысціянскай веры, у выніку чаго язычаскія плямёны і этнасы альбо зніклі, альбо сталі хрысціянскімі.

Другая стадыя прывяла, як і першая, да стварэння вялізных імперый, якія ўтрымлівалі ў сабе мноства этнасаў, падпарадкаваных нейкаму аднаму мацнейшаму. Сярод іх: Брытанская Імперыя з калоніямі ў Амерыцы, Аўстраліі, Індыі, Іспанскі і Партугальскі арэалы, падзяліўшыя Паўднёвую Амерыку, Расійская Імперыя і г.д.

Канец другой стадыі палітычнай гісторыі Еўропы пачаўся каля двухсот гадоў таму і прывёў да распаду фактычна ўсіх імперый. Новая рыса постімперскай эпохі – утварэнне шэрагу нацыянальных дзяржаў, якія складаюцца не проста з хрысціянскіх супольнасцей, як гэты было раней, а з нацыянальна свядомых грамадзян, спавядаючых хрысціянства. Гэтая эпоха ёсць трэцяя стадыя эвалюцыі чалавечага грамадства.

Трэцяя стадыя – нацыянальны монатэізм. Гэта стадыя, у якой мы з вамі цяпер жывем. Гэтая стадыя, дарэчы, хоць і вырасла з другой стадыі, мае шмат агульных рыс з першай. Такой рысай з'яўляецца нацыянальная адметнасць народа. Менавіта ў эпоху політэізму існавала адрозненне паміж рознымі плямёнамі па прыкмеце свайго сонму багоў, і гэта з'яўляецца ў нейкім сэнсе нацыянальнай прыкметай.

Узаемаадносіны, якія існуюць паміж першай і трэцяй стадыямі, мы праілюструем на прыкладзе беларусаў. Праз язычніцтва прайшлі ўсе народы, і беларусы не з'яўляюцца выключэннем. Наадварот, не кожны народ можа пахваліцца такой багатай народнай спадчынай, якую маюць беларусы. Сведчанне таму – унікальнае, шматтомавае акадэмічнае выданне "Народная творчасць", якое выходзіць ужо каля 15-ці гадоў. Водгукі паганскіх вераванняў захаваліся

ў беларусаў да нашых дзён, а такія святы, як Купалле і Каляды, адзначаюцца па ўсёй Беларусі штогод.

Больш за тое, некаторыя рамантычна скіраваныя аматары беларушчыны лічаць язычніцкія традыцыі ледзь не адзіным нацыянальным багаццем. У некаторай ступені гэта так, але не трэба забываць, што пра само існаванне такіх багоў, як Пярун ці Ярыла, беларусы даўно забыліся і ў сведамасці многіх пакаленняў Бог вызначаецца трыадзінствам Айца, Сына і Святога Духа – беларускі народ ужо 1000 гадоў хрысціянскі. І менавіта ў хрысціянстве знаходзіць сваё ўвасабленне сэнс існавання нацыі, пра што мы будзем і далей весці гаворку.

Цікава адзначыць яшчэ і такую з'яву. Як мы ўжо казалі, у Беларусі, ды і іншых посткамуністычных краінах, у нацыянальных рухах існуе вялікае імкненне да адраджэння язычніцкіх звычаяў. Ствараюцца з гэтай мэтай розныя таварыствы і аб'яднанні, ідзе працэс вяртання народу яго традыцый. На наш пагляд, такая з'ява зусім натуральная і зразумелая, бо, калі гаварыць на мове дыялектыкі, трэцяя стадыя нашай класіфікацыі — павінна вынікаць з першай як дыялектычны віток развіцця (адмаўленне адмаўлення па Гегелю). Па-другое, пасля амаль 80-гадовага панавання камуністычнага рэжыму ў краінах былога СССР, атэістычнага рэжыму, які прыпыніў натуральную эвалюцыю, ідзе працэс пазнання Бога, калі так можна мовіць, з нуля, гэта значыць, як і ў дзіцяці — самых першых уяўленняў. А гэтыя ўяўленні і пакінулі нам народныя традыцыі і звычаі.

Падводзячы вынік нашым разважанням, карысна звярнуць увагу на магчымасць сістэмнага апісання каштоўнасцей чалавечага жыцця, якія ўкладваюцца ў многаўзроўневую іерархічную сістэму.

Умоўна эвалюцыю чалавечай сутнасці можна праілюстраваць на схеме, дзе вылучаюцца чатыры ўзроўні эвалюцыі чалавека.

Найвышэйшы ровень – Бог. Гэта азначае, што найвышэйшай каштоўнасцю для чалавека з'яўляецца Бог

і больш ніхто і нішто. Чалавек імкнецца да Бога як да найвышэйшай ступені дабра, справядлівасці і дасканаласці.

Ровень 1 азначае існаванне чалавека ў нацыях, якія створаныя Богам па Яго Вышэйшай Задуме і з'яўляюцца найбольш вялікай каштоўнасцю і найлепшым набыткам эвалюцыі чалавецтва. Чалавек імкнецца да Бога праз развіццё і дабрабыт свайго народа, сваёй нацыі, а не як абстрактная касмапалітычная істота.

Ровень 2 – гэта ровень сям'і. Кожная нацыя складаецца з сукупнасці сям'яў, і без сям'і не існуе чалавек. Па працягласці ў часе другі ровень мае больш старажытную гісторыю, але ён саступае першаму па сваёй значнасці ў касмічным маштабе.

Ніжэй за ўсе роўні – ровень трэці, найменш трывалы з усіх. Ён увасабляе вытворчыя адносіны паміж людзьмі, якія ўласцівы яшчэ першым прымітыўным формам чалавечых супольнасцяў і вядомы раней за часы неаліту.

Сама па сабе ідэя, што чалавек імкнецца да пазнання Бога, да ступені поўнага зліцця з ім, выказвалася ў розных формах у многіх філасофскіх і рэлігійных канцэпцыях, напрыклад, у вучэннях вялікіх індыйскіх гуру Рамакрышны і Вівекананды. Мэту эвалюцыі чалавека – найвышэйшую Божую сутнасць абазначаў пунктам "Амега" Тэйяр дэ Шардэн у кнізе "Феномен человека". Аднак тое, што гэты пераход павінен адбывацца праз нацыянальную крышталізацыю, з'яўляецца новым разуменнем сутнасці эвалюцыі.

Калі мы дасягнем яднання ўсіх роўняў у адно цэлае, атрымаем гармонію і ўзаемасувязь паміж імі, то гэта і ёсць усяленскасць, сабornасць, адзінаіснасць Чалавецтва і Царквы.

У прыведзенай схеме ёсць адзін недахоп: побач з рэальнымі, фізічнымі паняткамі "сям'я" і "нацыя" мы паставілі побач як найвышэйшы ўзровень такі трансцэндэнтны панятак як Бог. Аднак гэтую схему нельга ўспрымаць літаральна, яна адлюстроўвае хутчэй сам працэс, эвалюцыю – імкненне чалавека да

Абсалюту. Схема можа стаць больш празрыстай і аднароднай, калі на месца нулявога роўню – Бога – паставіць больш лагічна і паняційна блізкую катэгорыю – Усяленскую Царкву. Менавіта так уяўляў сабе суадносіны паміж рознымі ўзроўнямі любові Уладзімір Салаўёў (артыкул “Россия и вселенская Церковь” у кнізе “О христианском единстве” (М., 1994. С. 238). Аднак такі падыход не змяняе сутнасці іерархічных ступяней любові.

Улічваючы апошнія думкі, схему эвалюцыі чалавечай сутнасці, што прапанавана намі вышэй, можна мадыфікаваць і намаляваць у наступным выглядзе:




Схема 3

Найвышэйшы ровень
Ровень 1
Ровень 2
Ровень 3

Падсумоўваючы, можна сказаць наступнае. Трэці ровень (найніжэйшы) у нашай схеме эвалюцыі – амаль жывёльны – калектыўная праца людзей, “вымушаная” любоў, звязаная з інстынктыўным імкненнем да выжывання. Другая ступень – калектыўная еднасць – сям'я, ёсць яшчэ жывёльная, прыродная любоў, але ўжо адметная ад неразумнага свету і праслаўленая паэтамі любоў да аб'екта процілеглага полу, а таксама любоў да дзяцей і бацькоў. Больш шырокі панятак любові, што выходзіць за рамкі прыроднага, больш абстрактны панятак мы бачым у любові да свайго народа, нацыі. Гэтая любоў, як ужо гаварылася вышэй, атрымала назву нацыяналізм і яна звязана з апошняй, неабходнай ступенню ў канцавым шляху чалавека да Бога.

Апошняя (нулявая) ступень любові – любоў да Бога – ужо цалкам выходзіць за рамкі прыроднага, гэта трансцэндэнтнае, рэлігійнае яднанне чалавека. Такім яднаннем і з'яўляецца Усяленская Царква. Сутнасць любві становіцца цалкам маральнай і любоў на нулявым роўні ёсць акт падпарадкавання сваёй волі, волі ўсяленскай.

## 3. Сабарнасць у хрысціянстве і сабарнасць нацыі

Калі прыняць нашае вызначэнне нацыяналізму, прыходзім і да важнай уласцівасці нацыяналізму – яго сабарнасці. Панятак сабарнасці ўласцівы кожнай нацыі і яе ідэалагічнай абалонцы – нацыяналізму, – для кожнай нацыянальнай дзяржавы. У дачыненні да нацыі сабарнасць якраз азначае адзінства нацыі ў прасторы і часе, яна азначае зніттаванасць кожнага прадстаўніка свайго народа з іншымі людзьмі сваёй нацыі па ўсім свеце, а таксама нябачнае ніттаванне часоў, якое вызначаецца памяццю продкаў. Беларусы таксама займаюць належнае ім месца ў Божым тварэнні народаў. Першы з'езд беларусаў свету, які адбыўся ў ліпені 1993 г., яскрава пацвердзіў тэзіс аб сабарнасці беларускай нацыі. Цікава ў сувязі з гэтым адзначыць і тое, што беларусы адчуваюць сябе сапраўды беларусамі, жывучы за мяжой ці выязджаючы за мяжу. Жыхары ж самой Беларусі ў меншай ступені ўсведамляюць сваю нацыянальную адметнасць, што з'яўляецца вынікам шматгадовай ідэалагічнай апрацоўкі, скіраванай на "зліццё" нацый, праз ліквідацыю беларускай нацыі.

Сабарнасць у перакладзе з грэчаскага слова **ekklesia** азначае "збор" (збіранне). Царква азначае тое самае і абазначаецца тым жа грэчаскім словам. Аднак гэтыя словы-сінонімы ўвайшлі ў царкоўную практыку як самастойныя тэрміны.

Гістарычна склалася так, што сабарнасць звычайна атаясамліваецца з Рускай Праваслаўнай Царквой. І класічнае азначэнне сабарнасці, звязанае з фармаваннем і абгрунтаваннем рускага праваслаўя, гучыць

такім чынам: сабарнасць – гэта паўната і ўсяленскасць Царквы. Менавіта гэтымі якасцямі валодае Праваслаўная Царква, якая аб'ядноўвае ўсіх людзей у адзін арганізм, у адно цела – збор. І гэтае цела завецца Царквою, на чале якой стаіць Ісус Хрыстос.

Але як могуць аб'яднацца людзі ў адзінае цела, калі кожны чалавек ёсць асобны фізічны арганізм? Зразумела, адзіным фізічным арганізмам сукупнасць розных людзей не можа быць. Але яднанне ў маральным плане магчыма. І толькі ў такім сэнсе мы ўяўляем сабе ўсяленскасць. І той маральнай катэгорыяй, што аб'ядноўвае людзей, з'яўляецца ***любоў***. На ступені асэнсавання сябе ў любові чалавек здольны перамагчы ў сабе інстынкт эгаізму, выйсці за межы індывідуальнага "Я" і тым самым стаць сапраўдным падабенствам Богу, бо Бог ёсць любоў.

Прыведзеныя разважанні, схема эвалюцыі *тэарэтычна* адлюстроўваюць сутнасць саборнасці. Сем Усяленскіх Сабораў былі *практычнай* рэалізацыяй прынцыпу саборнасці ў хрысціянстве. З тых часоў усякія адхіленні ад правіл, выпрацаваных на Саборах, трактаваліся як адхіленне ад прынцыпаў саборнасці Царквы.

Каб завяршыць агульную карціну дзеяння прынцыпу саборнасці, трэба адзначыць і іншыя яе аспекты. Саборнасць мае не толькі царкоўнае, альбо ўсяленскае значэнне, што разгледжана намі вышэй. Яна азначае таксама яднанне людзей у прасторы і часе. Гэта агульнафіласофскі прынцып. З пункту гледжання такіх навук, як сінэргетыка, кібернетыка саборнасць – антыэнтрапійны прынцып. Збіранне духовых і матэрыяльных сіл – адзіны спосаб процістаяць распаду, цеплавой смерці Сусвету, закону павелічэння энтрапіі[1].

Трэба адзначыць яшчэ адзін аспект панятку "саборнасць", які набірае ўсё большую папулярнасць у палітыцы, хоць яшчэ і не многім вядомы. Пад тэрмі-

---

[1] Фролов А.С. Проблема соборности в русской культуре // Русская цивилизация и соборность. М.,1998. С. 152.

нам “***сабornасць***” у палітыцы выкарыстоўваюць метад паразумення паміж плынямі розных ідэалагічных кірункаў.

Гэты панятак не толькі царкоўны тэрмін, у сапраўднасці саборнасць з’яўляецца вядомым старажытным, аб’яднаўчым прынцыпам дзяржаўнага будаўніцтва. Этымалогія слова “саборнасць” вядзецца ад дзеяслова “збіраць” і азначае збіранне найлепшых сіл грамадства для рашэння жыццёва важных задач. Саборнасць з’яўляецца першаснай формай выражэння грамадскай волі. Фактычна саборнасць – гэта антыпод партыйнасці. Улічваючы наш невялікі досвед у партыйным будаўніцтве, малую аўтарытэтнасць партый у грамадстве, менавіта саборнае вырашэнне спрэчных пытанняў набывае ў нашых умовах адметны сэнс.

У парламенцкай практыцы Кангрэса ЗША ёсць выпадкі, калі прымаліся рэзалюцыі саборным шляхам, без партыйнага дзялення, простай перавагай галасоў. Яны нават атрымалі сваю назву “bi partisan resolution”.

Сям’я, сельскі сход, рымскі сенат, славянскае веча, сейм у Рэчы Паспалітай першапачаткова дзейнічалі на прынцыпах згоды і аднадумства. Апошняе не патрабуе адзіных думак у ўсіх удзельнікаў, але можа з’явіцца ў выніку ўсеагульнага пераканання ў аптымальнасці прынятых рашэнняў. Згода з’яўляецца высакаякасным праяўленнем супольнай волі, асаблівым атрыбутам саборнасці.

Трэба адзначыць, што катэгорыя саборнасці – вынаходніцтва не толькі праваслаўнай філасофіі. Так, сучасны каталіцкі філосаф Пётра Рудкоўскі, аналізуючы катэгорыю тоеснасці адносна беларускага дыскурсу піша: “Катэгорыю тоеснасці трэба закінуць на карысць катэгорыі *саборнасці*. Гэта катэгорыя, ... запазычана з спецыфічнага кантэксту: яна выпрацавана расійскімі праваслаўнымі мыслярамі і абазначае быццё-сабраным, быццё-скліканым Богам.”

Саборнасць – гэта панятак, што наўпрост вынікае з хрысціянскага погляду на існасць чалавечага гра-

мадства, яна ставіць індывідульнасць чалавека апошнім крытэрам існасці. Няма вышэйшай каштоўнасці як чалавек. Вельмі слушна падкрэслівае гэтую асаблівасць сабарнасці П. Рудкоўскі: "Сабарнасць здымае імператыў быць падобным да іншых (ці то ў аспекце мовы, ці рэлігіі, ці ідэалагічнай лаяльнасці), кожны мае права *быць згодна з сваёй уласнай вольнасцю*. Сутнасцю сабарнасці ёсць плерома разнастайнасці. Няма аб'аднаўчай інстанцыі, ёсць толькі Дух даверу і ўзаемапавагі"[1].

Менавіта Дух даверу і павагі ўладарыў на памянёных вышэй сходах, паседжаннях Усяленскіх Сабораў, амерыканскага сената, і вынікі такога форуму заўсёды на некалькі парадкаў якасней, мацней і сумленней, чым вынікі, атрыманыя так званым дэмакратычным шляхам. Асабліва яскрава "дзейнічае" дэмакратычная сістэма выбараў у сучаснай Беларусі, дзе думка не адзінкавых асоб, а многіх яркіх ідывідуумаў жорстка падаўляецца аж да турэмнага зняволення.

На веры ў Бога, ва Усяленскую Справядлівасць грунтуецца ўведзены Рудкоўскім прынцып ***этычнай асіметрыі*: *прэзумпцыя добрае волі заўжды павінна быць мацнейшая за прэзумпцыю злой волі***. Гэты прынцып ляжыць у аснове сабарнага мыслення. І трэба пагадзіцца з аўтарам, што "акцэптацыя сабарнага характару беларускай супольнасці і прыняцце прынцыпу этычнай асіметрыі здольныя здзейсніць радыкальную змену атмасферы ўнутры беларускага грамадства. Вызваленне сваёй ментальнасці ад субстанцыяльна-эсэнцыяльнай тоеснасці дазволіць скіраваць энергію на дыялог і ўзаемапазнаванне, а не на вайну і дабіванне прадстаўніка іншае культурнай ці палітычнай опцыі". Менавіта шчырага дыялогу не хапае нашаму беларускаму грамадству, часта падзеленаму на далёка не сяброўскія страты. Дыялогу, як дыспуту на роўных умовах, а не на клаўнадзе рэдкіх перадач БТ, дзе быццам бы вядзецца дыялог.

---

[5] Рудкоўскі П. Ад ідэнтычнасьці да саборнасьці // ARCHE. № 1–2, 2006.

## 4. Сістэмны аналіз і мадэляванне ў палітычных працэсах

### *1. Агульныя заўвагі*

Найноўшыя метады апісання палітычных працэсаў дазваляюць спадзявацца на якасны скачок у нашым разуменні законаў развіцця грамадства. Усё больш рэальным і значным падаецца ссоўванне вектара матэматычнага мадэлявання з галіны натуральных навук у галіну грамадскіх. Паказальнымі з'яўляюцца поспехі ў галіне мадэлявання эканомікі, дзе добра зарэкамендавалі сябе тэорыі спажывання і попыту, метад міжгаліновага балансу, тэорыя вытворчых функцый, тэорыя прыняцця рашэнняў і іншыя сучасныя распрацоўкі. Аднак выкарыстанне гэтых метадаў, заснаваных на матэматычным мадэляванні, для сацыяльна-палітычных працэсаў застаецца яшчэ ў пачатковай стадыі.

На трох кітах трымаецца будучыня палітычных і сацыяльных навук: на агульнай тэорыі сістэм, матэматычным мадэляванні і інфармацыйных тэхналогіях. Прызнаным спецыялістам у галіне мадэлявання ў эканоміцы з'яўляецца Г. Сайман, які абгрунтаваў канцэпцыю абмежаванай рацыянальнасці і прадэманстраваў магчымасці ўжывання парадыгмы рацыянальнага вылучэння з дапамогай метаду мадэлявання. Аксіёмы рацыянальных паводзін знаходзяць сваё ўжыванне і ў сацыяльнай сферы.

Найбольш уражлівым метадам даследавання ў XX ст. з'явілася агульная тэорыя сістэм і сістэмны аналіз. Дзякуючы прадстаўленню эканомікі дзяржавы як сістэмы, што ўключае ўсе галіны гаспадаркі з усімі яе галінамі, змешчанымі у глыбокай узаемасувязі, В. Лявонцьеў здолеў апісаць і эканамічныя працэсы. І не проста апісаць. Дзякуючы распрацоўкам Лявонцьева стала магчымым вывесці з крызісу шэраг перадавых краін, у тым ліку ЗША, Германію і Японію.

Пачаткам палітычнага мадэлявання можна лічыць кнігу Л. Рычардсана "Матэматычная псіхалогія вайны", надрукаваную ў 1919 г. З тых часоў мадэляван-

не прайшло шмат этапаў свайго развіцця і ўдасканальвання.

Далейшае развіццё было адметнае з'яўленнем вялікага ліку прыкладных палітычных даследаванняў, звязаных з ужываннем метаду мадэлявання. У сувязі з гэтым працягвалася развіццё і тэарэтычных наратываў, якія спрыялі пашырэнню ўяўленняў аб метадзе мадэлявання. Распрацоўка асноў ужывання мадэлявання ў сацыяльных навуках адбывалася ў рамках сістэмнага падыходу ў работах Р. Акофа, І. Блаўберга, Э. Мірскага, У. Садоўскага, Е. Марозава і іншых.

### *2. Магчымасці сістэмнага падыходу ў палітычных працэсах*

Адной з галоўных умоў існавання сістэмы з'яўляецца яе стабільнасць. У адрозненне ад сістэм фізічнага міру сацыяльна-эканамічныя сістэмы праяўляюць вялікую нестабільнасць. Аднак і ў гэтых сферах аказалася магчымым знайсці некаторыя заканамернасці. Высілкі перадавых навукоўцаў у галіне гісторыі, філасофіі, этналогіі прывялі да ўзнікнення тэорыі жыццёвага цыкла цывілізацыі О. Шпенглера[1], тэорыі нараджэння і смерці этнасаў Л. Гумілёва[2], і сістэмнага апісання нацыі як найвышэйшага роўню ў статуце дзяржавы[3].

Неабходна ўсведаміць, што квазікласічныя чарагаванні гістарычных падзей наглядаюцца ва ўсіх галінах дзейнасці грамадства. Пры гэтым заўсёды трэба ўлічваць уздзеянне аднаскіраваных працэсаў, такіх як дэмаграфічны выбух, інфармацыйная рэвалюцыя, якія аказваюць уздзеянне на цыклічныя працэсы. Таму спіралевідная эвалюцыя, якой прытрымліваецца М. Крукоўскі[4] (тэорыя «сінусоіднага» развіцця грамадства) і аўтар гэтага даследавання, прадстаўляецца досыць пераканаўчай.

---

[1] Шпенглер О. Закат Европы. Т.1, 2. Мн., 1999.

[2] Гумилев Л. Этногенез и биосфера земли. М., 2001.

[3] Астапенка А. Нацыянальная ідэя ў сучасным свеце. Мн., 2003.

[4] Крукоўскі М.І. Бляск і трагедыя ідэалу. Мн., 2004.

Іншым чыннікам, які трэба ўлічваць пры даследаванні сацыяльна-эканамічных сістэм, з'яўляюцца фазавыя пераходы, якія прыводзяць да такой з'явы, як катастрофы. Тэорыя катастрофаў – найбольш перспектыўны кірунак у вывучэнні такіх з'яў, як рэвалюцыі і іншыя прыцыповыя змяненні ў сацыяльна-эканамічным жыцці. Узнікнавенне нацыі, на наша меркаванне – гэта не што інакшае, як фазавы пераход у развіцці этнасу, яго колькаснае апісанне цалкам рэальна ў тэорыі катастрофаў.

### *3. Колькасныя метады і матэматычнае мадэляванне ў палітычных з'явах*

Да нядаўнага часу гаварыць аб колькасным апісанні грамадскіх з'яў лічылася немагчымым з-за складанасцей, якія стаяць перад такімі задачамі. Аднак услед за эканамічнымі задачамі наступіла чарга спачатку сацыялогіі, а затым і паліталогіі. Колькасныя мадэлі могуць, у прынцыпе, апісаць істотныя ўласцівасці дынамічных паводзін складанай сацыяльнай сістэмы.

У агульных рысах колькасны падыход можа быць сфармуляваны наступным чынам. Сацыяльная сістэма і яе эвалюцыя могуць быць характарызаваныя некалькімі асноўнымі рэлевантнымі параметрамі, з аднога боку. Разам з тым, кожны з гэтых параметраў з'яўляецца вынікам вялікай колькасці мікраўздзеянняў з боку індывідаў. Індывіды генеруюць стан сістэмы і зацягнутыя ў гэтую сістэму. Гэты цыклічны стан вызначае структуру сістэмы ў дынаміцы. На практыцы колькасць гэтых параметраў і сукупнасць індывідаў могуць быць дакладна вызначаныя толькі для некаторай часткі грамадства, некаторага сектара або страты. У. Вайдліх у сваёй "Сацыядынаміцы" сцвярджае, што з дапамогай адной мадэлі ўсю разнастайнасць існуючых сцэнараў рэальна даследваць з дапамогай вар'іравання наборамі параметраў трэндаў і пачатковых умоў[1].

[1] Вайдлих У. Социодинамика. М., 2004.

Можна пагадзіцца з яго сцверджаннем, што некаторыя найбольш важныя паняткі, што вынікаюць з агульных нелінейных мадэляў, могуць адлюстроўваць важныя якасныя характарыстыкі сацыяльна-палітычнай сістэмы. Высока ацэньваючы вынікі Вайдліха, разам з тым, варта адзначыць, што ён разглядае толькі два магчымыя падыходы да апісання вонкавага міру – рэдукцыянізм і халізм. Прычым для сацыяльна-палітычнай сістэмы найбольш дапушчальны менавіта халістычны падыход, заснаваны на разглядзе сацыяльна-палітычнай сістэмы як цэласнай сістэмы, якая не дапускае дэкампазіцыі структуры. Аднак ёсць магчымасць разгляду шматузроўневых іерархічных сістэм з пазіцый стратыфікацыі і дэкампазіцыі ў рамках АЭД сімвалаў і разгляду цэласнасці сістэмы разам з яе ўласцівасцю эмержэнтнасці на кожным роўні.

Гэты трэці падыход шырока развіваецца ў працах С. Новікавай[1] і можа быць выкарыстаны для сацыяльна-палітычных сістэм.

Ніжэй прапанаваная шматузроўневая мадэль дзяржавы, дзе найвышэйшы ровень адпавядае роўню нацыі і можа служыць базавым пры апісанні любой дзяржавы, якая дасягнула гэтага роўню.

### *4. Дзяржава і нацыі ў іерархічных каардынатах*

Галоўнымі адзінкамі ў сучасным стане свету з'яўляюцца ***нацыі***. Вядучыя нацыі сёння маюць юрыдычную канструкцыю дзяржаў, звязаную з дапамогай сістэмы найвышэйшага роўню – Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН). У той жа час значная частка нацый застаецца па-за ААН і не можа вырашаць свае праблемы з дапамогай наяўных законаў. Больш за тое, нават дзяржавы ў ААН маюць вялікія цяжкасці ў міжнародных дачыненнях, выкліканых слабасцю наяўных азначэнняў нацыі.

---

[1] Novikava S. et al. (1997). The Statute of Hierarchical Mathematics and Its Cybernetical Maintenance. Preprints of Eleventh International Conference Modelling and Scintific Computing. P.149. Washington, D.C., USA.

Мэта гэтай працы – сканструяваць дакладнае азначэнне нацыі і ўжыць яго да вонкавых зносінаў паміж нацыямі і іх нутраных канструкцый.

У сваёй папярэдняй кнізе “Нацыянальная ідэя ў сучасным свеце” я прапанаваў разглядаць нацыю як найвышэйшы ровень сяміроўневага статута дзяржавы. Аднак аказалася магчымым пабудаваць мадэль так, што страты вытворчасці і ведаў уключаюцца ў страту аднога роўню – нацыянальнага.

Каб ажыццявіць гэтую праграму ў адпаведнасці з мэтамі новай дэфініцыі, мы павінны ў яе ўключыць:

· апісанне гісторыі нацый;

· яе ўласную канструкцыю на ўсіх вядомых роўнях: натуральным (фізічным, хімічным, біялагічным), дэмаграфічным (чалавек і сям’я), і нацыянальным (тэхніка і веды); тэхнічная страта звязаная з прамысловасцю з дапамогай яе арганізацыі: сервісу, транспарту, гандлю і фінансавай сістэмы; страта ведаў уключае мову, мастацтва, навуку, праектныя і навучальныя інстытуты; галіны дзяржаўнай улады – заканадаўчай, выканаўчай і судовай, прыналежным да ўзроўняў ведаў;

· апісанне нацыі як адзінкі з сваімі ўзаемадзеяннямі ў сваім асяроддзі (з іншымі нацыямі – сістэмамі свайго ўласнага роўню) – сістэмы найвышэйшага роўню – саюзаў нацый (сярод іх – Еўрасаюз, СНД, Злучаныя Штаты і многія іншыя);

· мэта нацыі (або нацыянальная ідэя) – звязаць гісторыю, нутраны лад, замежную палітыку, і дачыненні з нутранымі роўнямі для любых пэўных нацый; фактычна, нацыянальная ідэя вызначае светапогляд нацыі.

Разам з памянёнымі ўмовамі, азначэнне канструявання нацыі павінна не супярэчыць наяўным азначэнням і тым азначэнням, якія развіваюцца з дапамогай кібернетычных дасягненняў – новых тэхналогій і сетак. Гэтая рэкламацыя вельмі важная, таму што азначэнне нацыі павінна быць крыніцай распрацоўкі сетак нацый. Без такіх сетак немагчыма рэалізаваць

эфектыўную інтэграцыю (глабалізацыю) у свеце.

Асноўны закон іерархічнай прасторы-часу – гэта апісанне на аснове наступнага сцверджання: усе страты ўзнікаюць з ніжняй страты шляхам множання і злучэння, стварэння больш вышэйшай страты і яе змены з дапамогай актыўнасці вышэйшай страты.

Гэта ёсць асноўны закон іерархічнай матэматыкі – АЭД тэорыі, якую колькі гадоў развівае ў Беларусі беларускі матэматык С. І. Новікава.

Механізм кіравання (энергія) рэалізуецца сродкамі асноўных кірункаў кібернетыкі. Гэта праектаванне, кантраляванне і навучанне – стадыі працэсу кіравання. Стадыя праектавання ёсць акт злучнасці, а стадыя навучання ёсць акт множання (працэс кантралявання звязвае абедзве гэтыя стадыі). З гэтага пункту гледжання іерархічная матэматыка – гэта тэорыя кіравання. Дзякуючы гэтаму працэс навучання патрабуе свайго дакладнага азначэння, які ўлічвае сваю сувязь з усім матэматычным статутам.

Агульны вобраз дзяржавы паказаны на схеме 4. Ён утрымоўвае ўсе вядомыя роўні: натуральны (фізічны, хімічны, біялагічны), дэмаграфічны (сям'я і род) і нацыянальны (вытворчасць і веды). У маіх ранніх работах страты вытворчасці і ведаў вызначаліся як індывідуальныя роўні. Аднак пры больш дакладным разглядзе можна заключыць, што яны з'яўляюцца пластамі аднога роўню – нацыянальнага. У такім разуменні страта ведаў выклікае працэс новых знакавых канструкцый. А страта вытворчасці рэалізуе множанне існасцяў, пабудаваных з дапамогай страты ведаў. У гэтым разуменні азначэнне страты вытворчасці і ведаў як розных бакоў аднога роўню шмат у чым абумоўленае матэматычнымі пачаткамі тэорыі іерархічных шматроўневых сістэм.

Прапанаваная мадэль дзяржавы, што ўлучае ровень нацыі як найвышэйшы ровень сучаснага стану дзяржавы, дазваляе карэктна апісаць будучыню нацыянальных дзяржаў, вызначыць месца кожнай дзяржавы ў ААН.




Схема 4. Абагульнены вобраз дзяржавы ў іерархічнай прасторы

## 5. Сістэмны падыход ў кантэксце палітычнага мадэлявання і Беларусь у інфармацыйную эпоху

Як я ўжо адзначаў, вялікую ролю ў палітычных працэсах Беларусі мог бы выконваць сістэмны падыход, які, на жаль, запатрабаваны ў нас далёка не ў поўнай меры.

На сусветным роўні шырокае выкарыстанне сістэмнага аналізу і сістэмнага падыходу даўно стала нор-

май. На аснове сістэмнага падыходу створаныя і актыўна выкарыстоўваюцца змястоўныя мадэлі, найперш гэта мадэлі крызісу, рэвалюцый, катастроф. Не меней распрацаваным падыходам да вывучэння палітычнага працэсу падаецца тэорыя рацыянальнага вылучэння, на аснове якой шырока ўжываецца метад мадэлявання. У першую чаргу маюцца на ўвазе гульнявыя мадэлі канфлікту і працэсу прыняцця развязанняў. Варта згадаць у кантэксце і мадэль вылучэнняў Даунса для вызначэння паводзін кандыдатаў у дэпутаты на выбарах.

Варта падкрэсліць, што свайму з'яўленню палітычнае мадэляванне абавязанае розным навукам. З матэматыкі былі ўзяты асноўныя прыёмы матэматычнага мадэлявання, лінейнае і нелінейнае праграмаванне, геаметрычны метад мадэлявання, тэорыя графаў, сеткавае мадэляванне, дынамічнае мадэляванне. У фізіцы і хіміі даўно ўжываюцца мадэлі сістэмы – мадэлі хаосу, катастроф, эвалюцыі. З псіхалогіі прыйшлі асноўныя мадэлі канфлікту. З эканамічнай навукі – эканаметрычныя метады, мадэлі тэорыі гульняў, тэорыя прыняцця развязанняў. З інфарматыкі – асноўныя прыёмы апрацоўкі матэматычных мадэляў палітычных сістэм з дапамогай найноўшых інфармацыйных тэхналогій.

Вельмі цікавым і перспектыўным уяўляецца метад аналізу іерархій, распрацаваны амерыканскім навукоўцам Т. Сааці. Метад аналізу іерархій, распрацаваны Т. Сааці – гэта адзін з найбольш папулярных метадаў вылучэння найлепшай альтэрнатывы з мноства прапанаваных. Аналіз праблемы заснаваны на экспертным мадэляванні ведаў у форме адзнак важкасці адной альтэрнатывы ў дачыненні да іншай.

Развіццё метаду аналізу іерархій Сааці ў галіне камп'ютэрнага мадэлявання прывяло да стварэння цэлай галіны ў інфармацыйных сістэмах – сістэм падтрымкі прыняцця развязанняў (СППР). У развязанні задачаў кіравання вытворчасцю, напрыклад, шырока ўжываюцца такія СППР як AssistantChoice.

Сферы яе ўжывання – падрыхтоўка і перападрыхтоўка кадраў у галіне эканомікі і кіраванні, развязанні шэрагу практычных і тэарэтычных задачаў (напрыклад, пры вылучэнні рацыянальных схемаў арганізацыі валютных аўкцыёнаў, фондавых і гандлёва-сыравінных бірж, конкурсных таргоў і г. д.). Вельмі апраўданым з'яўляецца пашырэнне сферы ўжывання СППР ад эканомікі да паліталогіі. Методыка палітычнага мадэлявання, распрацаваная Сааці, можа выкарыстоўвацца, напрыклад, у ходзе палітычных перамоў. З дапамогай метаду мадэлявання праводзяцца даследаванні грамадска-палітычнай сітуацыі і фармулююцца стратэгіі палітычных паводзін.

Першы чыннік, што стымулюе мадэляванне палітычнага працэсу, складаецца ў тым, што вялікая частка падзей у палітычным жыцці з'яўляецца чаканай, таму іх з'яўленне можна прадказаць. Матэматычныя мадэлі якраз і дапамагаюць выразіць падобныя нефармальныя прагнозы. Па-другое, фармальная мадэль дапамагае ўдасканаліць вольныя фармулёўкі дапушчэнняў нефармальнай мадэлі і даць дакладны і здольны да праверкі прагноз. Перавагай фармальных мадэляў з'яўляецца таксама іх здольнасць аперавань з існасцямі больш высокага роўню складанасці.

Перавагай мадэлявання з'яўляецца таксама тое, што яно дазваляе розным навуковым дысцыплінам абменьвацца сваімі даследчымі сродкамі. Нарэшце, мадэлі карысныя тым, што здольныя ўбачыць глыбінную аднастайнасць з'яў, якія могуць быць не дасягнутыя іншымі сродкамі.

Метад мадэлявання стварае ўсё больш значным, і даследнікі знаходзяць яго досыць эфектыўным для вывучэння палітычных працэсаў. Першым чынам, метад ужываецца для даследавання і суправаджэння працэсу прыняцця развязанняў. Мадэляванне дазваляе вызначаць механізмы развіцця палітычнага працэсу, дапамагае арыентавацца ў электаральным працэсе, а таксама знаходзіць сувязі між элементамі

працэсу, недаступныя іншым метадам вывучэння палітычнага працэсу.

Асабліва прывабным выглядае выкарыстанне сістэмнага падыходу на аснове АЭД-сімвалаў С. Новікавай. У злучэнні з матэматычным мадэляваннем ён дазваляе па-новаму падысці да ўсялякіх палітычных працэсаў, сфармуляваць статут дзяржавы і вызначыць нацыю ў якасці найвышэйшага роўню ў іерархіі асноўных страт грамадства. Разгледжаныя падыходы выглядаюць яшчэ больш эфектыўнымі з пункту гледжання іх узаемасувязі з сучаснымі камп'ютэрнымі тэхналогіямі. Аргументы натуралізму і фізікалізму пра абмежаванасць ужывання колькасных метадаў яшчэ больш страчваюць сваё значэнне з прычыны таго, што самыя **палітычныя** працэсы ў наш час становяцца **інфармацыйнымі** працэсамі з усімі вынікаючымі з гэтага законамі і высновамі. А ўкараненне глабальнай сеткі **Internet** у грамадскія дачыненні паміж дзяржавамі і ўнутры саміх дзяржаў узносіць магчымасць сістэмнага апісання на яшчэ больш высокі ровень.

## 6. Інфармацыйнае грамадства і Homo Informaticus

Разгледжаныя вышэй працэсы імклівага развіцця інфармацыйных тэхналогій, сістэмнага аналізу і матэматычнага мадэлявання прыводзяць да фармавання новай парадыгмы грамадскіх працэсаў і пераўтварэння самога грамадства і нават трансфармацыі самой існасці чалавека. Калі зыходзіць з “хвалевай” канцэпцыі Э. Тофлера, то інфармацыйная рэвалюцыя супадае з “трэцяй хваляй” развіцця чалавецтва, якая замяніла індустрыяльную рэвалюцыю, вяршыня, “грэбень другой хвалі” якой прыходзіўся на сярэдзіну XVIII – пачатак XIX ст. У сваю чаргу апошняя ўзнікла як вынік замены “Першай хвалі” – сельскагаспадарчай рэвалюцыі, якая працягваецца ўжо тысячагоддзі.

У сувязі з гэтым не можа не здзіўляць тэмп паскарэння змены эпохаў і змены самой існасці чалавека. Апошняе змяненне – узнікненне новага тыпу чалавека – Homo Informaticus – адбывалася на вачах аднаго пакалення. Людзі 50–60-гадовага веку вымушаны былі працаваць, суіснаваць, у рэшце рэшт, жыць з людзьмі зусім інакшага тыпу, інакшых вартасцяў, інакшага светапогляду і г. д. Узнікла новая праблема, зусім адрозная ад адвечнай праблемы бацькоў і дзяцей, што ўзнікае заўсёды пры змене пакаленняў. Змянілася парадыгма сэнсу жыцця, грамадзянскіх узораў і мэтаў грамадства. Капітал і праца саступілі месца інфармацыі і яе квінтэсенцыі – веданню. У інфармацыйную эпоху большасць людзей сталі займацца ўжо не вытворчасцю матэрыяльных выгодаў, як у папярэдняе тысячагоддзе, а перапрацоўкай, захаваннем і выкарыстаннем інфармацыі. Узніклая цывілізацыя прывяла да новага тыпу стандартаў, скіравала грамадства за межы прагі да збірання грошай і прагі да ўлады.

Асновай фармавання інфармацыйнага грамадства стала развіццё вылічальнай тэхнікі – у першую чаргу асабовых кампутараў, а таксама камунікацыйных магчымасцяў, якія дала свету сусветная глабальная сетка – Інтэрнэт. Абмен інфармацыяй ужо не звязаны з існаваннем дзяржаўных межаў і іншых бар'ераў, у тым ліку моўных. Цяпер самая маленькая і эканамічней слабая краіна можа ў вельмі сціслыя тэрміны стаць значнай інфармацыйна-індустрыяльнай краінай. Прыкладам можа служыць шэраг краін Паўднёва-Заходняй Азіі (Паўднёвая Карэя, Тайвань і інш.), якія з'яўляюцца цяпер магутнымі пастаўшчыкамі кампутарнай тэхнікі і іншых сучасных тэхналогій для ўсяго свету. Ствараецца магчымасць паўнавартасна працаваць праз электронныя магістралі, навучальныя ўстановы і выкладчыкі становяцца дасягальнымі ўсім студэнтам, а велізарны патэнцыял навукі, літаратуры і мастацтва становіцца дасягальным для ўсіх ахвотых. Новая парадыгма

складаецца ў тым, што амаль кожны чалавек інфармацыйнага грамадства становіцца інфармацыйным чалавекам нават калі ён гэтага не жадае!

Чалавек інфармацыйны літаральна раствораны ў інфармацыйным асяроддзі, што азначае змену асяроддзя жыхарства сучаснага чалавека. Што ж прыўносіць гэтае новае асяроддзе жыхарства чалавека? Найбольш відавочна наступнае: разам з звышдаступнасцю інфармацыі ідзе працэс аддалення аднаго індывіда ад другога фізічна. Яны становяцца непатрэбныя адзін аднаму, рэальныя зносіны ўсё больш замяняюцца віртуальнымі зносінамі, захопліваючы нават такія інтымныя сферы як сфера сэксу.

Такім чынам, новае асяроддзе жыхарства чалавека ў інфармацыйным грамадстве фармуе наступныя прынцыпы:

· *працоўныя месцы з прадпрыемстваў пераносяцца ў дом. Дом становіцца цэнтральнай адзінкай будучага грамадства;*

· *грамадства будуецца па тыпу глабальнай сеткі, а не іерархіі арганізацый, дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў;*

· *грамадства будуецца па прынцыпе дэцэнтралізацыі і дэкампазіцыі. Тым самым асноўныя прынцыпы тэорыі сістэм у поўнай меры становяцца рэальным механізмам прагрэсу.*

Усё сказанае аб асяроддзі жыхарства інфармацыйнага чалавека непазбежна прыводзіць і да змены самой існасці чалавека. Змяняюцца сацыяыльна-культурныя ўзоры, мэты чалавека. Узнікаюць новыя і страчваюць сваю прывабнасць старыя вартасці. Калі зусім нядаўна само слова “навука” выклікала ў здольнага маладога чалавека пачуццё дрыжыкаў і глыбокую пашану, дык цяпер гэтага няма. Навука з прыярытэтнага, элітнага занятку ператвараецца ў занятак руцінны, пазбаўлены ранейшага арэалу рамантыкі і прывабнасці. Значна больш цікавай галінай аплікацыі інтэлекту і здольнасцей з’яўляецца вобласць кампутэрных тэхналогій, дзе ёсць бяскон-

цыя магчымасці, якія лёгка дасягаюцца кожным. Вектар інтарэсаў у навуцы за нейкія 20–30 гг. істотна змяніўся. Калі раней праблемы такіх фундаментальных навук, як фізіка элементарных часцінак і тэорыя рэлятыўнасці былі самымі перадавымі і атаясамліваліся з самымі выдатнымі людзьмі XX ст., такімі, як Альберт Эйнштэйн і Нільс Бор, то цяпер прыярытэты дужа змяніліся. Для сучаснага маладога чалавека галоўным аўтарытэтам будзе ўжо Біл Гейтс, а не Эйнштэйн, а самым дзіўным адкрыццём будзе не "адзіная тэорыя поля", а самы танны мікрапрацэсар у выглядзе вельмі дробнага крышталю.

Змяненне вектару ў навуковых кірунках выклікала поўную структурную перабудову ў акадэмічных інстытутах і ў сферы адукацыі. Гэта ў сваю чаргу замацавала станаўленне новага тыпу человека – Homo Informaticus. Ранейшае "Я", якое яшчэ існуе ў людзях старэйшага пакалення, паступовa трансфармуецца ў новае "Я" інфармацыйнай эпохі. Усе нюансы характару, псіхалогіі, імкненняў, вартасцяў гэтага новага чалавека яшчэ трэба вывучыць, але зразумела адно: мы маем справу з новай з'явай, з новым інфармацыйным чалавекам, які засяляе інфармацыйнае асяроддзе.

Цікавым з'яўляецца і суіснаванне разам з новым чалавекам інфармацыйнага грамадства прадстаўнікоў старой фармацыі. Некаторыя з іх да канца сваіх дзён не прынялі новую субкультуру і новую шкалу вартасцяў. Яны спынілі актыўныя дзеянні і ціха "дажываюць" свой век. Іншыя ж прынялі правілы новай гульні і наклалі матрыцу інфармацыйнага грамадства на сваю старую ідэалагічную схему і ўяўленні, упісаліся ў новую парадыгму, спрабуючы, і часта з поспехам, зрабіць і свой унёсак, свой вартасны вопыт.

Такім чынам, інфармацыйнае грамадства паклала пачатак фармаванню новага, інфармацыйнага чалавека. Нашае "Я" трансфармавалася ў новую існасць з істотным адрозненнем ад чалавека індустрыяльнага грамадства.

Гэтыя агульныя разважанні аб новых шляхах быцця чалавецтва ў сучасным свеце тычацца, фактычна, кожнага чалавека і маюць дачыненне да кожнай краіны. Аднак Беларусь з пэўных прычынаў стаіць воддаль ад агульнай плыні і нават дыстанцыюецца ад самых блізкіх суседзяў, такіх, як Літва ці Польшча. Ні ў адной нашай суседцы-краіне мы не ўбачым такой колькасці помнікаў славутаму Леніну-Ульянаву, не ўбачым як у кожным беларускім гарадку ці мястэчку такой колькасці вуліц Камсамольскай, Савецкай, Дзяржынскага ды Чапаева. Здаецца, Савецкі Саюз, хоць бы вонкава, утрымаў свае пазіцыі на гэтай зямлі. Але наступ інфармацыйнай эпохі зрабіў гэтыя атрыбуты савецкасці нават не архаізмамамі, а нейкім асаблівым атрыбутам нацыі. І тыя прадстаўнікі старай фармацыі, што выраслі на гэтых камуністычных сымблях не толькі мірна адыходзяць, а пакідаюць за сабой спадчыну той эпохі, каб новыя пакаленні не забывалі аб тых гадах. І тады гэтыя візуальныя сведкі стануць каштоўным матэрыялам, які будзе ілюстраваць памылкі гісторыі і яе часам нялюдскія скрыўленні, на іх мы будзем вучыцца не паўтараць гэтых памылак і будаваць новае жыццё.

# РАЗДЗЕЛ VII. ХРЫСЦІЯНСКІ ШЛЯХ БЕЛАРУСІ

…Святую прагу Існага
спатоль
змірэнна мудрым,
ціхім паслушаннем…
і ўкрыеш сэрца жарснае
адхланнем…
і вымаліш ратунак,
Анатоль…

*Зьніч*

## 1. Абгрунтаванне нацыяналізму ў хрысціянстве

Яшчэ Іаган Готфрыд Гердэр гаварыў, што нацыянальная разнастайнасць – частка Божай задумы і ставіць абмежаванага дзікуна вышэй за адукаванага касмапаліта.

Думкі Гердэра знайшлі дастойны працяг у працах рускіх рэлігійных філосафаў канца XIX– першай паловы XX стст. (М. Бярдзяеў, У. Салаўёў, К. Лявонцьеў, І. Ільін, М. Кляпенін і іншыя). Яны выпрацавалі канцэпцыю філасофскага абгрунтавання нацыянальнай ідэі і нацыяналізму ў хрысціянстве.

Сутнасць гэтай канцэпцыі ў тым, што кожны народ мае нацыянальны інстынкт, які дадзены яму ад прыроды, а дакладней, ад Бога. І. Ільін пісаў, што “нацыянальная асаблівасць па-свойму ўяўляе Дух Божы і праслаўляе Госпада... таму думка патушыць гэтую разнастайнасць (што спрабавалі зрабіць бальшавікі – *А.А.*) можа нарадзіцца толькі ў духоўна мёртвай, хворай душы”. Менавіта такая задумка ёсць спараджэнне душы злой і зайздроснай – усё роўна, ці імкнецца гэтая хімера вайной падмяць пад сябе ўсе народы (нямецкі нацыянал-сацыялізм), ці растварыць усе нацыянальныя культуры ў бясколернасці і адсутнасці разнастайнасці (мандыялізм, савецкі камунізм). Адзначу, што і першае і другое не ўласціва беларускай ментальнасці. Беларускі народ, хоць і не

меў працяглы час як нацыя нейкай вызначальнай назвы (русіны-ліцвіны-тутэйшыя-беларусы), тым не менш меў свой твар: імкненне да незалежнасці, да захавання сваіх традыцый, сваёй рэлігіі і іншых атрыбутаў таго, што мы азначылі як нацыяналізм. У сувязі з тым вельмі дарэчы прывесці трапныя словы не ўсім ведамага цяпер хрысціянскага філосафа М. А. Кляпеніна[1]:

*Нацыяналізм – гэта дар, які дадзены цэламу народу і таму звязвае яго, нягледзячы на індывідуальныя адрозненні людзей, у адзінае цэлае. Як для асобнага чалавека правільны хрысціянскі шлях зводзіцца да развіцця свайго дару, так і для народа – да развіцця агульнага, усенароднага дару. Цэлы народ больш складаная з'ява чым асобны чалавек. Таму і яго дар больш складаны, і служыць гэтаму дару цяжэй. Але сутнасць служэння застаецца аднолькава апраўданай.*

З сутнасці сказанага вынікае: сапраўдны нацыяналізм не супярэчыць усяленскасці. Наадварот, шлях да ўсяленскага кладзецца толькі праз нацыянальнае. Касмапалітызм – пазіцыя тых людзей, што лічаць сябе па-за нацыяй, – на самай справе магчымы толькі ў індывідуальным развіцці кожнай нацыі. А што ёсць хрысціянства? Хрысціянства – гэта любасць, якая пашыраецца да ўсіх людзей, збліжае іх; яно ўключае ўсю паўнату ўсяленскай любові. Самае каштоўнае ў хрысціянстве тое, што яно сцвярджае індывідуальнасць асобы. А нацыяналізм – гэта індывідуальнасць цэлага народа і любасць да гэтай індывідуальнасці. Такім чынам, калі мы звяртаемся да нацыяналізму, то яго сутнасць благаслаўляецца менавіта рэлігіяй – сутнасць як любасць да індывідуальнасці вышэйшага роўню (паводле маёй класіфікацыі). Як і звычайная любоў да бацькоў, да сям'і, да сяброў, нацыяналізм ёсць пэўная ступень раскрыцця ўсяленскай любові. Нацыяналізм – асаблівы дар, дадзены Богам цэламу народу, і ён – гэты дар – укладзены ў кожнага чала-

[1] Клепенин Н.А. Мысли о религиозном смысле национализма // Путь, Париж, 1927.

века свайго народа і таму сцвярджаецца хрысціянствам – вось у чым рэлігійная сутнасць нацыяналізму.

Са сказанага вынікае, што індывідуальнасць непарыўна звязана з сваім народам. Кожны чалавек можа выявіць асабісты Божы Дар і быць асаблівай праявай Божай Праўды. У гэтым і заключаецца рэлігійнае апраўданне нацыяналізму.

Яшчэ раз падкрэсім і тое, што нацыяналізм ёсць пэўная ступень (першы ровень) раскрыцця агульнай, усяленскай любові. Як толькі мы адкінем любую з іерархічных ступеняў любові, мы адразу адчуем непаўнацэннасць жыцця. Таму нацыяналізм ужо ад нараджэння натуральна ўласцівы кожнаму чалавеку. Іншая справа, што ў пэўных гістарычных абставінах пад уздзеяннем розных грамадскіх табу гэтыя ўласцівасці могуць не раскрывацца ці нават падаўляцца. Але гэта ўжо пытанні іншага кшталту.

Што тычыцца беларусаў, то яны таксама не пазбавіліся гэтага унікальнага Божага Дару – паўнаты ўсяленскай любві, якой ганарыцца і грузін, і літовец.

Амаль тысяча гадоў фармаваўся беларускі народ як адметная супольнасць людзей з сваёй тэрыторыяй, мовай, гісторыяй і іншымі атрыбутамі нацыі. Трэба імкнуцца абудзіць беларуса, вызваць у яго Божы Дар нацыяналізму.

Развіццё дару нацыянальнага пачуцця магчымае толькі ва ўсведамленні непазбежнасці сінтэзу рэлігійнага з нацыянальным, усведамленні нацыяналізму як дзяржаўнай палітыкі, нацыяналізму як падставы да ўсяленскай творчай ініцыятывы, эканамічных рэформ і развіцця культуры. Галоўным у станаўленні беларусаў як нацыі, як адметнай супольнасці людзей з'яўляецца не адраджэнне мовы, нацыянальнай сведамасці ды гістарычнай памяці. Галоўнае – гэта абуджэнне Божага Дару, які мы і завем нацыяналізмам.

У сучаснай заходнееўрапейскай думцы, а таксама ў канцэпцыях нацыяналізму трэціх краін выкладзе-

ная вышэй канцэпцыя нацыяналізму, галоўным чынам праваслаўных аўтараў, знайшла свой працяг. Заходнееўрапейская канцэпцыя звязана ў вялікай ступені з крызісам каталіцызму ў эпоху Асветніцтва. Рацыяналізм Асветніцтва падарваў устоі каталіцызму і прывёў да ўзнікнення пратэстанцтва, якое па-новаму паставіла нацыянальную праблему. На думку Б. Андэрсана менавіта заняпад артадаксальных плыняў хрысціянства – каталіцызму і праваслаўя – з'явіўся прычынай узнікнення нацыяналізму[1]. Нацыянальная ідэя і нацыяналізм запоўнілі пустку, якая ўтварылася ў сістэме ідэалаў еўрапейца ў сувязі з заняпадам рэлігіі.

Лідэ Гандзі, падкрэсліваючы гэтыя думкі Андэрсана, ідзе далей, ён гаворыць аб *тэлеалагічнай* непазбежнасці сучаснай нацыянальнай дзяржавы. Апошняя выснова, фактычна, супадае з канцэпцыяй Г. Гегеля адносна наратывы "Розуму", "Мадэрнасці" і "Гісторыі", знаходзіць сваю ўласную "мэту" – канчатковую ісціну сваёй значнасці ў кансалідаванай форме нацыянальнай дзяржавы[2].

Такім чынам, ***нацыянальная ідэя і нацыяналізм маюць глыбокую сувязь з хрысціянствам і знаходзяць у ім глыбокае апраўданне.***

### 2. Як з'явілася хрысціянства ў Беларусі?

Хрысціянства ў Беларусі, як і ў іншых народаў, прыйшло на змену язычніцтву. Таму трэба сказаць некалькі слоў і пра паганскія вераванні старажытных беларусаў.

Наагул, у беларусаў рэлігійнасць спакон вякоў трывала з'яўляецца адной з фундаментальных рысаў нацыянальнага характару. Містыка і паганскія звычаі да гэтага часу шырока распаўсюджаны сярод белару-

[1] Anderson B. Communities i Reflectins of the Origin and Spread of Mationalism, London, 2nd, Verso, 1991.

[2] Hegel G.W.F. Lectures on the Phylosophy of Wold History. Introduction, Cembridge, 1975.

саў. Больш за тое, падтрымка многіх язычніцкіх традыцый на дзяржаўным роўні выклікае самую сур'ёзную трывогу і патрабуе неадкладных дзеянняў не толькі з боку хрысціянскіх цэркваў усіх канфесій, але і адукаванай інтэлігенцыі, дзяржаўных і палітычных дзеячоў.

Ёсць шэраг прыхільнікаў язычаскага шляху Беларусі, якія ўсур'ёз спрабуюць адрадзіць паганскія звычаі, лічаць іх "верай бацькоў". Ствараюцца нават грамадскія аб'яднанні (асабліва актыўна гэта ішло на пачатку савецкай перабудовы). Ёсць прыхільнікі паганства і сярод даследнікаў народных традыцый, свят, абрадаў. Напрыклад, гэта вядомы фалькларыст, зусім нядаўна адышоўшы да Госпада, былы прэзідэнт міжнароднай асацыяцыі фалькларыстаў Васіль Ліцвінка. Асаблівым радком хацелася б вылучыць Антаніну Хатэнка, прыгожую жанчыну, паэтку і апантаную язычніцу. Яе паэзія і публіцыстыка прасякнутая любасцю да Беларусі, да таго духовага скарбу беларусаў, які захаваўся ў яго старажытных звычаях, паданнях, абрадах, песнях і танцах.

Прыхільнікі адраджэння язычніцтва ў Беларусі грунтуюцца найперш на атавізмах язычніцкага часу, што выяўляецца ў нас у святкаванні Каляд і Купалля. Прычым апошняе з некаторага часу (фактычна, пасля крушэння камунізму), адзначаецца нават на дзяржаўным роўні. Цікава, што гэтае свята адзначаюць двойчы – у ноч з 24-га на 25-е чэрвеня па хрысціянскім каталіцкім календары і ў ноч з 6-га на 7-е ліпеня па праваслаўным календары.

Гэтыя і многія іншыя асаблівасці язычніцтва, дарэчы, уласцівы і іншым славянскім народам – украінцам, сербам, палякам, ды і неславянскім, такім, як нашы найбліжэйшыя суседзі літоўцы. Таму шукаць нацыянальная асаблівасці ў язычніцтве – пусты занятак. Многа больш нацыянальных асаблівасцей сфармавалася ў народаў, якія прынялі хрысціянства і пасвойму ўспрынялі яго містычную сутнасць. Фактычна, хрысціянства і стала асноўнай прычынай, каталіза-

тарам утварэння з першых племянных супольнасцяў, такіх, як крывічы і дрыгавічы, утварэння спачатку этнічных супольнасцяў, а потым і нацый, у выпадку крывічоў – беларускай.

Ёсць меркаванне, што хрысціянства ўпершыню прыйшло на землі ўсходніх славян, г. зн. і ў Беларусь яшчэ ў час падарожжа па гэтых землях апостала Андрэя Першазванага. А гэта, як ведама, датуецца І-м ст. н. э. Згаданае меркаванне грунтуецца на творы Нестара Пячорскага "Аповесць мінулых гадоў", дзе напісана: *Калі Андрэй вучыўся ў Сінопе і наведаў Корсунь, ён дазнаўся, што недалёка ад Корсуня вусце Дняпра і захацеў скіравацца ў Рым, і паплыў... уверх па Дняпры. І здарылася так, што ён прыйшоў і спыніўся пад гарамі на беразе. І зранку ўстаў і сказаў вучням, якія былі з ім: "Ці бачыце гэтыя горы? На гэтых гарах заззяе ласка Божая, будзе горад вялікі, і паставіць Бог шмат цэркваў". І, узышоўшы на гэтыя горы, благаславіў іх, і паставіў крыж, і памаліўся Богу, і сышоў з гэтай гары, дзе надалей будзе Кіеў, і пайшоў вышэй па Дняпры. І прыйшоў да славенаў, дзе Ноўгарад стаіць...* Вось такі цікавы аповед пакінула нам гісторыя. Тут нестыкоўкі даволі істотныя. Але калі не засяроджвацца на яўна нерацыянальным шляху ап. Андрэя ў Рым праз Кіеў, Беларусь і Ноўгарад, то прадказанне аб тым, што Бог паставіць у Кіеве шмат цэркваў і, трэба меркаваць, не толькі ва Украіне, але і ў Беларусі, – цалкам збылося.

Аднак гісторыя любіць, хоць бы і ўскосныя, але факты, а не паданні ды меркаванні.

На жаль, акрамя гэтага летапісу іншых сведчанняў пра падарожжа ап. Андрэя ў нашы землі не знойдзена. Нагадаю яшчэ і пра тое, што згаданыя падзеі адбываліся значна раней за тыя часы, калі славянскія плямёны заявілі аб сабе наагул.

Праўда, сведчанні аб прысутнасці ап. Андрэя на тэрыторыі нашай часткі Еўропы захаваліся ў самой Царкве. Напрыклад, лічыцца, што ён пабываў нават на Валааме, дзе існуе вельмі старажытная манаская

абіцель. А гэты край ляжыць значна паўночней Кіева і Полацка, якія б ляжалі (каб ужо існавалі) на шляху апостала з Крыму.


Роўнаапостальная княгіня Вольга

Першым дакладным фактам аб існаванні хрысціянства ва ўсходніх славянскіх землях з'яўляецца прыняцце хрысціянства ўдавой кіеўскага князя Алега княгіняй Вольгай у 955 г. Гэта адбылося пасля наведвання ёй Царграда (Канстанцінопаля), а гэта значыць, што Вольга была праваслаўнай. Дзейнасць Вольгі як хрысціянкі сярод паганскага насельніцтва аказалася надзвычай прадуктыўнай. Яна актыўна распаўсюджвала хрысціянскую веру, будавала храмы і нездарма атрымала тытул – "роўнаапостальная".

Паводле летапіснага сведчання Вольга заснавала Віцебск і з яе ініцыятывы ў гэтым горадзе былі пабудаваны два праваслаўныя храмы.

Наступнай важнай падзеяй у царкоўнай гісторыі Беларусі было прыняцце хрысціянства ў дзяржаўным маштабе. Гэта адбылося пры ўнуку княгіні Вольгі – князі Уладзіміры, які таксама шануецца Праваслаўнай Царквой як "роўнаапостальны". Тое, што з усіх прапанаваных варыянтаў мадэрных на той час рэлігій (быў нават варыянт ісламу), Уладзімір выбраў праваслаўны варыянт – бясспрэчны і добра вядомы факт. Тым не менш, мала дасведчанымі ў пытаннях царкоўнай гісторыі людзьмі часта распаўсюджваецца думка, што, калі Кіеўская Русь прымала хрысціянства яшчэ да царкоўнага падзелу, які датуецца 1054 г., то, маўляў, і хрысціянства было адзіным, не каталіцкім і не праваслаўным.

Гэта глыбока памылковая думка. Падзел у хрысціянскім свеце насамрэч адбыўся значна раней згада-

ных падзей і сягае часоў Сямі Усяленскіх Сабораў (праходзілі з 325 па 787 г.). Яшчэ на III (431 г.) і на IV (451 г.) быў сфармуляваны Нікея-Царградскі Сімвал Веры і было прынятае рашэнне аб забароне ўносіць любыя змены ў Сімвал. Галоўным вынікам гэтых ключавых для багаслоўя і хрысціянства наагул Сабораў была фармулёўка восьмага складніка Сімвала Веры аб сыходжанні Святога Духа. Сутнасць яго – на якой пагадзіліся ўсе Святыя Айцы – у тым, што Царква трымаецца выказвання самога Спасіцеля – "Святы Дух сыходзіць ад Айца".

Але ў каталіцкім свеце ў Сімвале Веры ў гэтым складніку зроблены дадатак, філіёквэ (filioque), сутнасць якога ў тым, што Святы Дух сыходзіць не толькі ад Айца, але і ад Сына. Такі дадатак быў зроблены яшчэ на мясцовым Таледскім Саборы (589 г.), потым у VII–VIII стст. быў распаўсюджаны сярод франскіх епіскапаў, яго прытрымліваўся і Карл Вялікі (на саборы ў Айвене 809 г.). Канчаткова ён быў зацверджаны ў 1014 г. папам Бенедыктам VIII.

Другім разыходжаннем заходняй і ўсходняй цэркваў сталі асаблівасці багаслужэння. Яшчэ з VII ст. у заходніх цэрквах пачалі выкарыстоўвацца літургіі на базе лацінскай мовы. З VIII ст. па IX ст. у заходніх цэрквах была ўведзена еўхарыстыя на апрасноках, што ніколі не прымалася ў праваслаўных цэрквах. Наступныя разыходжанні тычыліся шматлікіх абрадавых адступленняў. Сярод іх непрымальны для праваслаўных пост у суботу, цэлебат святароў, усталяванне тайных каталіцкіх месаў. Але вяршыняй усіх адступленняў стала неймавернае наваўтварэнне – вярхоўны іерарх католікаў папа быў зроблены галавой і вярхоўным суддзём усёй Усяленскай Царквы. Гэта адвяргала ўсе царкоўныя парадкі, усталяваныя апосталамі і айцамі.

Ужо ў 861 г. у Канстацінопалі пры імператары Міхаіле адбыўся Сабор, на які папа Мікалай II не прыехаў. А прапановы папы, агучаныя ягонымі пасланцамі на Саборы, не былі прынятыя. Спрэчкі пачалі

разрастацца і настолькі ўзмацніліся, што ў 862 г. папа сабраў свой Сабор у Рыме, дзе былі асуджаныя дзеянні Канстанцінопаля. Гэтыя спрэчкі ў вярхах працягваліся на працягу ўсяго IX ст. Фактычна, абедзве Царквы – заходняя і ўсходняя – жылі цалкам самастойным жыццём, а зносіны насілі хутчэй характар фармальны, ставячы за мэту чарговую спробу прымірэння, якога ўжо даўно не было і не магло быць. Аднак канчатковы, афіцыйны падзел Цэркваў адбыўся, як ведама, у XI ст. (1054 г.).


Князь Уладзімір

Сказанага, я думаю, дастаткова, каб зразумець, што Уладзімір ахрысціў Кіеўскую Русь менавіта па ўсходнім, праваслаўным абрадзе. У 988 г. адбылося масавае хрышчэнне кіеўлян, і літаральна адразу ў Кіеве пачалася масавая пабудова праваслаўных храмаў.

У Полацку правіў тады Ізяслаў, сын Уладзімера і полацкай князёўны, дачкі Рагвалода, Рагнеды. У часы кіравання гэтага князя і прыняла хрост уся Беларуская зямля. Выканалі гэта святары, якіх прыслаў св. Уладзімір. Сведчыць аб гэтым сучасны Уладзіміру мітрапаліт кіеўскі Іларыён, а таксама крыху пазнейшы мніх Якуб, які ў сваей пахвале Уладзіміру не раз кажа, што ён “хрысціў усю рускую зямлю ад канца да канца... усю зямлю рускую і ўсе гарады ўбраў святымі цэрквамі...”

Рускай зямлёй, як ведама, называлі ўсе тыя ўсходне-славянскія землі, дзе былі князі з племя варажскага Русь. А з гэтага ж племя былі і князі беларускія полацкія, у часы якіх хрысцілася Беларусь.

Уладзімір хрысціў Кіеў, як ведама, не самым мірным спосабам. Спрацоўваў вядомы прынцып: “Хто не са мной, той супроць мяне”. Ведама таксама, што

следам за хрышчэннем Кіева адбылося хрышчэнне Ноўгарада. Пры гэтам ваяводы Уладзіміра Пуцята і Дабрыня хрысцілі Ноўгарад мячом і агнём. Гэта дае падставы лічыць, што падобным чынам адбылося і хрышчэнне Полацка.

Аднак ведамых нам летапісаў аб хрышчэнні полацкім князем Ізяславам Полацка гісторыя не захавала. На падставе тагачасных і пазнейшых летапісаў вынікае, што гвалтоўнага хрышчэння Полацкага княства не было.

У Полацку напрыканцы праўлення кіеўскага князя Уладзіміра правіў сын Ізяслава Брачыслаў, ведамы сваёй смелай і незалежнай палітыкай. У Брачыслава былі больш трывалыя сувязі з краінамі Скандынавіі, чым з Кіеўскай Руссю. І на яго баку супроць Яраслава Мудрага біліся нармандскія дружыны. Апошняе відавочна тлумачылася тым, што полацкія князі свой радавод лічылі не адгалінаваннем Рурыкавічаў, а самастойным дрэвам Рагвалодавічаў. Пра што і летапіс паведамляе: *Адгэтуль уздымаюць меч Рагвалодавы ўнукі супроць унукаў Яраслава.*

З амбіцыямі кіеўскага ўладара Уладзіміра полацкія князі лічыліся мала. Тым не менш, полацкія князі прынялі праваслаўны варыянт хрысціянства, як і кіяўляне. З боку княжацкай улады не было перашкод для натуральнага пранікнення хрысціянства ва ўсе сферы тагачаснага грамадства.

Тое, што палачане прынялі хрост ад Кіева, пацвярджае ў сваёй працы “Хрысціянства і беларускі народ” ксёндз Адам Станкевіч: *З летапісу відаць, што Уладзімір не толькі пасылаў усюды епіскапаў і свяшчэннікаў, каб хрысціць народ, але і сам асабіста часта ездзіў з епіскапамі дзеля падтрымання Евангельскай праўды. Пасля ахрышчэння ўсіх рускіх зямель, як кажа летапісец, Уладзімір яшчэ жыў 25 гадоў. А значыць – меў яшчэ дастаткова часу, каб усе гэтыя землі сапраўды прывесці да Хрыста. Такім чынам, няма сумніву, што яшчэ пры Уладзіміры ў Полацку сцвердзілася хрысціянства, а беларускі князь Ізяслаў, якога*

*летапісцы хваляць за "благочестие", быў галоўным дзеячом у гэтай святой справе. У гэтым жа часе сцвердзілася хрысціянства і па ўсей беларускай зямлі.*

Прыкладна ў гэты час, трэба меркаваць, хрысціянства пранікае і на іншыя землі Кіеўскай Русі і, безумоўна, у беларускія гарады Полацк і Тураў. Прынамсі, у скандынаўскай "Сазе пра хрышчэнне" гаворыцца, што святы Торнвальд-Вандроўнік, які быў сведкам хрышчэння Русі, спыняўся ў манастыры Святога Іаана, які знаходзіўся паблізу Полацка.

Вырашальны аргумент за праваслаўны характар беларускага хрысціянства мы знаходзім там, дзе, па логіцы, яго магло і не быць. Гаворка ідзе аб знакамітай кнізе ксяндза Адама Станкевіча *Хрысціянства і беларускі народ". Ён піша: "Сярод беларускага народа, як і сярод іншых усходніх славян (расійцаў і ўкраінцаў), хрысціянства пашыралася ў мове славянскай, у якой пісаліся кніжкі, вялася прасвета і адпраўлялася набажэнства.... Служба Божая ў славянскай мове завецца славянскім абрадам, або грэкаславянскім, дзеля таго, што Кірыл і Мяфод, укладаючы яго, за ўзор сабе мелі абрад грэцкі, ад якога ён мала розніцца.*

І вось што далей ён піша: *Спатыкаем также ў гэтым часе на беларускіх землях і абрад лацінскі, але дужа рэдка...* І гэта сказана самым выдатным дзеячом хрысціянскага і нацыянальнага адраджэння Беларусі першай паловы XX ст., вядомым каталіцкім святаром, адным з стваральнікаў Беларускай хрысціянкай дэмакратыі А. Станкевічам.

Ведама, што ў Полацку епіскапская кафедра была заснаваная вельмі рана – у 992 г. Летапіс першым з полацкіх епіскапаў згадвае пра Міна, пасвечанага ў 1105 г. Гэта і першы кананізаваны Царквой Беларусі святы. Але гэта не значыць, што раней за Міну епіскапаў у нас не было. У "Книге Степенной" у апісанні жыцця св. Еўфрасінні гаворыцца, што ў часы полацкага князя Барыса, роднага дзядзькі Еўфрасінні, які памёр у 1128 г., полацкі епіскап Ілля саступіў ёй для манастыра паселішча Сяльцо, блізка Полацка, што

належала епіскапу, і саступаючы яго сказаў, што ў гэтым Сяльцы "братия наша лежат, прежде нас бывшии епископы". Адгэтуль можна зрабіць высновы, што ў епіскапа Іллі быў не адзін папярэднік Міна, але было іх аж некалькі. "Полацак і Тураў", – кажа праф. Галубінскі, – "належаць да тых гарадоў, у якіх дужа праўдападобна, што заснаванне там епархіяў адбылося за часоў Уладзіміра Святога". Гэты ж Галубінскі заснаванне Полацкай епархіі адносіць да 992 г.

Полацкія князі добра разумелі ролю Царквы ў дзяржаўным будаўніцтве. Аб гэтым сведчыць пабудова ў Полацку, каб падкрэсліць роўнасць з Кіевам і Вялікім Ноўгарадам, храма Св. Сафіі. Супольнасць уладных і царкоўных інтарэсаў вылілася ў спробу стварэння краёвай полацкай дзяржаўнай арганізацыі.

Што гэтая ідэя не была толькі тэорыяй, а практычным духоўным яднаннем народа, сведчыць доўгая і паспяховая абарона Полацкам і іншымі нашымі княствамі незалежнасці ад Кіева. Імкненне ж да царкоўнае асобнасці можна бачыць хоць бы з факту, што, калі кіеўскі князь Яраслаў у 1051 г., без згоды Канстанцінопальскага патрыярха заміж грэка, як было да тае пары, паставіў на мітрапалічы пасад у Кіеве мясцовага чалавека, полацкі епіскап не згадзіўся на новы парадак і пакінуў пасад.

Праяву мясцовага сепаратызму можна заўважыць і ў тым, што князь Расціслаў, які дамогся аддзялення ягонага княства ад Пераяслаўскае епархіі ў 1137 г. устанавіў асобную епархію ў Смаленску.

Урэшце, яшчэ адзін і далёка не апошні прыклад цягі да незалежнасці ад Кіева мы бачым з факце, што калі ў 1147 г. іншы кіеўскі князь, Ізяслаў, паставіў на мітрапалічы пасад Кляменя (Клімента) Смаляціча, полацкі, смаленскі і ноўгарадскі епіскапы на гэта не згадзіліся, а тураўскі епіскап даў згоду толькі пад пагрозай зняволення.

Імкненне Полацкага княства стварыць паўночнаславянскую імперыю не збылося, бо княжы род, што правіў у ім, заняпаў і, заміж таго, каб пашыраць

дзяржаўныя межы, стаў ледзь здольны да іхняе абароны ад нападаў нямецкіх рыцараў, што аселі ў Прыбалтыцы.

Другім цэнтрам, дзе гуртаваліся славянскія плямёны, што стварылі пазней беларускую дзяржаву, быў Тураў.

Тураў да X ст. быў вядомы як цэнтр самастойнага племяннога саюза. Насялялі Тураў дрыгавічы, якіх некаторыя даследнікі атаясамліваюць з другавітамі. Паводле легенды, заснаваў Тураў князь Тур (магчыма, з скандынаўскай геніялогіяй) каля 980 г. У гэтыя часы Тураў уваходзіў у склад Кіеўскай дзяржавы, і лагічна заключыць, што хрысціянства прыйшло і на палескія землі. Прынамсі, ёсць падставы меркаваць, што ўжо на пачатку XI ст. у Тураве існавала праваслаўная епіскапская кафедра. Пра гэта сведчаць, напрыклад, звесткі ў Кіеўскім Патэрыку рэдакцыі Іосіфа Трызны, дзе паведамляецца: "Третие богомолие епископию поставих в лето 6513 (1005 г.) и придах к ней городы с погосты в послушание и священие и благословение держати себе Туровской епископии: Пинск, Новгород, Городен, Берестье, Волковыск, Здитов, Неблетеск, Дубровица, Высочко, Случеск, Копысь, Ляхов, Городок, Смедяне ..." Такім чынам, епіскапская кафедра ў Тураве была з 1005 г.

У гэтым жа дакуменце згадваюцца Спаскі і Багародзіцкі храмы, якія першымі былі пабудаваныя ў горадзе.

У 1148 г. Туравам пачаў кіраваць князь Юры Яраслававіч, які рабіў стаўку на незалежнасць Тураўшчыны ад Кіева. Ізяслаў спрабаваў вярнуць Тураў, падключыўшы сілы сямі рускіх княстваў, але 10-тыднёвая аблога не дала станоўчых вынікаў кіеўскаму князю. У 1169 г. адбылася яшчэ адна аблога Турава на працягу 18 дзён з боку валынскіх князёў на чале з Мсціславам Ізяслававічам, але князь Юры зноў вытрымаў яе. У 1162 г. быў заключаны мір паміж Расціславам і Юрыем Яраслававічам, згодна з якім Тураўскае княства атрымала незалежнасць.

У XI–XII стст. згодна з крыніцамі, у Тураве існавала 75 праваслаўных храмаў. Тут жыў і прапаведаваў знакаміты "Златауст, паче усих на Руси воссиявших" – свяціцель Кірыла Тураўскі. У 1015 г. ў Тураве князь Святаполк, каб заняць вялікакняскі пасад, забівае трох сваіх братоў – Барыса, Глеба і Святаслава. Барыс і Глеб, якія прынялі мучаніцкую смерць і былі шчырымі хрысціянамі, былі кананізаваныя Праваслаўнай Царквой, яны сталі святымі. Могілкі ў Тураве, дзе пахаваныя Барыс і Глеб, існуюць да цяперашняга часу і завуцца "Барысаглебскімі". Калі ў 1927 г. падчас звычайнага пахавання знайшлі каменны саркафаг, то тураўцы былі ўпэўнены, што гэта саркафаг Барыса і Глеба.

У XII ст. жонка Святаполка Варвара заснавала першы у Беларусі жаночы Варварынскі манастыр. У гэты ж час там ужо існаваў мужчынскі манастыр. На Замкавай гары быў пабудаваны велічны 6-слупавы і 3-апсідны сабор, рэшткі якога захаваліся да нашых дзён. Па благаславенні мітрапаліта Філарэта на месцы храма былі ўзведзены дах, падмурак закансерваваны, а раз у год у дзень Святога Кірылы Тураўскага 11 траўня гэты падмурак з дахам становіцца дзейным храмам, і там служыцца ўрачыстая архіерэйская літургія з удзелам уладыкі і вялікай колькасці царкоўных іерархаў.



Урачыстая літургія на месцы храма XII ст. у Тураве 11 траўня 2008 года.

У XI–XII стст. уся Беларуская зямля была пакрыта хрысціянскімі святынямі, манастырамі, з якіх пачаўся распаўсюджвацца дух ісіхазма, а ў нашу памяць увайшлі многія святыя – тыя адданыя хрысціянству і Беларусі людзі, што пасвячалі сябе служэнню цалкам і гэтым праславіліся на ўсе вякі. Першымі беларускімі святымі былі: Кірыла Тураўскі, Параска, беларуская святая князёўна Ефрасіння Полацкая.

Св. Ефрасіння (у свеце Прадслава) была праўнучкай раўнаапостальнага князя Уладзімера, унучкай полацкага князя Усяслава Брачыслававіча († 1101) і дачкой малодшага з сыноў апошняга, Юрыя-Святаслава.

Яшчэ з маленства яна выказвала вялікую прыхільнасць і любасць да хрысціянскага жыцця, схільнасць да навукі. Але бацькі разлічвалі аддаць Ефрасінню замуж. І калі яна аб гэтым даведалася, то тайком пакінула бацькоўскі дом, пайшла ў манастыр і зрабілася манахіняй пад імем Ефрасіння. Прабыўшы некаторы час у гэтым манастыры, яна выпрасіла ў полацкага епіскапа Іллі, каб ён дазволіў ей жыць адной у мураванай келлі, прыбудаванай пры кафедральным саборы. Тут святая вяла вельмі суровы лад жыцця, доўгія гадзіны знаходзячыся ў малітве, пасце і паслушанні. Паслушанне Ефрасінні складалася ў перапісванні святых кніг і вышыўцы рызаў. Ефрасіння распаўсюджвала сярод беларусаў грамату, вучыла чытаць і пісаць беларускіх дзетак.

Але яна шукала больш адпаведнай дзейнасці для служэння Богу. І неўзабаве з дазволу полацкага епіскапа яна перасяляецца ў Сяльцо пад Полацкам. Гэтае Сяльцо, якое было ўласнасцю кафедральнай царквы, епіскап падарыў Ефрасінні, каб яна там заклала жаночы манастыр, які назвала Спасаўскім. Манастыр хутка развіваўся і павялічваўся. У гэтым манастыры неўзабаве апынуліся сваячніцы св. Ефрасінні: родная яе сястра Гордзіслава (у манастве Аўдоцця), стрыечная сястра Звеніслава (у манастве Пракседа) і яшчэ дзве сваячніцы.



Хутка святая збудавала тут на месцы старой драўлянай царквы мураваную ў гонар Спаса. Паставіўшы на ногі свой жаночы манастыр, св. Ефрасіння непадалёк збудавала другі, мужчынскі, з мураванай царквой у гонар Маці Божай.

У сталым узросце яна вырашыла наведаць Ерусалім, Гроб Гасподні. Пабыўшы тут некаторы час, св. Ефрасіння занемагла і, прахварэўшы 24 дні, памерла 23 траўня 1173 г., там і была пахаваная.

Такім чынам, Полацкае і Тураўскае княствы, прыняўшы ў IX ст. хрысціянства ў праваслаўным варыянце, сталі на шлях перадавых хрысціянскіх дзяржаў Еўропы. З самага пачатку хрысціянства насіла тут адметны характар, фармаваліся свае беларускія традыцыі і духоўная глыбіня. З часам гэта адаб'ецца на стварэнні помнікаў самабытнай беларускай архітэктуры, літаратуры і музыкі. Менавіта ў Беларусі і Украіне ўзнікнуць праваслаўныя брацтвы, аналагаў якім не мае ніводная краіна.

Гісторыя добра папрацуе над хрысціянскім шляхам Беларусі. Тут будуць мірна і не зусім мірна суіснаваць праваслаўныя і каталікі. Тут узнікне і новая канфесія – грэка-каталіцызм (унія), які каля двух стагоддзяў будзе пераўзыходзіць колькасна і адну і другую з папярэдніх па часе канфесій – праваслаўную і каталіцкую.

Што ж уяўляла з сябе унія? Была гэта нейкая асаблівая канфесія ці разнавіднасць каталіцызму? А можа, яна нейкі унікальны варыянт хрысціянства і ўвасабляе сабой сапраўдную нацыянальную рэлігію?

На гэтыя пытанні я паспрабую адказаць ніжэй.

## 3. Гістарычны шлях уніі ў Беларусі

Засцерагаю Вас,
браты-Каталікі –
дзесятая часцінка Беларусі
восем дзесятых, пэўна ж, не прымусіць
за Вамі йсці да Рыму напрасткі...
...я запрашаю Вас, браты-Каталікі,
да шчырага сумоўя з Праваслаўнай
Краінай сіняй – вольнай і Дзяржаўнай
і ЗЛУЧНАСЦЬ наша будзе – на вякі!
*(Зьніч)*

На пачатку 90-х гг. XX ст. беларускае грамадства было ўцягнута ў незвычайную для доўгіх гадоў ваяўнічага атэізму дыскусію пра нацыянальную рэлігію беларусаў. З'явіўся шэраг публікацый, як масцітых гісторыкаў, так і апантаных фанатыкаў ідэі, аб тым, што "нацвера" беларусаў – гэта уніяцтва, альбо грэка-каталіцызм.

Варта разгледзець шлях уніі ў гістарычным дыскурсе і абазначыць яе сапраўдную значнасць, незаангажаваную палітычнымі інтарэсамі поўных колаў людзей.

### *Азначэнне уніі*

Пра гісторыю царкоўнай уніі напісана шмат. Навукоўцы, грамадскія дзеячы, палітыкі і багасловы па-рознаму ставяцца да уніяцкай праблемы. Прычым гэтае стаўленне бывае самым розным, часам вагаючыся да супрацьлегласці. Характэрна, што уніяцкае пытанне перыядычна ўсплывае на працягу амаль тысячы гадоў, пачынаючы з падзелу ў 1054 г. хрысціянскай Царквы на Заходнюю і Усходнюю.

Апошні ўсплёск цікавасці да уніі прыпаў на пачатак працэсу дэмакратызацыі краін Усходняй Еўропы і развалу СССР. Гэты перыяд пачаўся ў 1990-х гг. і доўжыцца да цяперашняга часу. Адраджэнне уніяцтва, ці, як яшчэ кажуць, грэка-каталіцызму, цесна звязана з працэсамі нацыянальнага адраджэння як у Беларусі, так і ў некаторых іншых краінах. "Ад-

пачкаванне" ад адзінага некалі Савецкага Саюза шэрагу новых самастойных краін суправаджалася фармаваннем новага, асаблівага стаўлення да найбольш шматлікай нацыі былога СССР – рускіх і краіны іх даміноўнай прысутнасці – Расіі. На самым пачатку так званай перабудовы ў многіх саюзных рэспубліках сталі адкрыта гаварыць аб акупацыі Расіяй у розныя гады Закаўказзя, Прыбалтыкі і іншых тэрыторый, у тым ліку Беларусі. У шматлікіх мастацкіх і публіцыстычных творах былі асуджаны таталітарныя рэжымы Гітлера, Сталіна, Пінaчэта і іншыя. Адказнасць за жудасныя камуністычныя рэжымы, усталяваныя ў краінах сацыялізму, была ўскладзена на асноўных віноўнікаў – камуністаў і іх ідэалогію. Аднак у СССР віна за часы культу асобы і страшэнных рэпрэсій была ўскладзена не проста на камуністаў, а і на нацыю-гегемона – расійскую нацыю. І мала каго турбавала тое, што сама расійская нацыя таксама моцна пацярпела ад камуністычнага рэжыму. Справа тут у тым, што нярускія нацыі пацярпелі ўдвая – акрамя ганенняў за дэмакратыю ім прыйшлося перанесці ганенні і за нацыяналізм – адстойванне сваёй нацыянальнай годнасці.

Гэтая акалічнасць – асаблівае стаўленне да рускіх як да акупантаў – знайшла свой адбітак і ў рэлігійнай сферы. А менавіта ў тым, што на праваслаўе – галоўнае веравызнанне рускіх – у нейкай ступені ўпаў цень адмоўнага стаўлення да іх з боку некаторых іншых нацыянальнасцей. Асабліва прыкметным быў гэты працэс у Заходняй Украіне. Неяк ігнараваўся той факт, што праваслаўе пацярпела не менш за іншыя канфесіі і толькі пачало ажываць пасля бальшавіцкага генацыду.

У Беларусі да пачатку 90-х гг. XX ст. рэлігійная сітуацыя характарызавалася вялікай канфесійнай разнастайнасцю. Тут жылі як праваслаўныя, так і каталікі, а таксама раслі шматлікія пратэстанцкія абшчыны. Найбольшай з усіх канфесій была праваслаўная. Характэрнай рысай гэтага перыяду з'яўля-

ецца тое, што нацыянальнае адраджэнне аказалася ў пэўнай ступені адарваным ад адраджэння праваслаўя, у адрозненне ад каталіцызму, дзе такія-сякія зрухі былі. Тут адыграла сваю ролю і тое, што Царква імкнецца заўсёды быць збоку ад палітыкі, і тое, што – і я лічу гэта галоўным – некаторыя лідэры беларускага адраджэння, найперш каталікі, у сваіх антырускіх і антыправаслаўных выступленнях адкрыта звінавацілі Праваслаўную Царкву ў "русіфікацыі беларусаў і ў гнездаванні кадэбістаў". Каталікам было прасцей, у іх адрас было няшмат нараканняў, а здольнасць Касцёла да прыстасавання дзеля ажыццяўлення сваіх векавых імкненняў панавання над усім светам адыграла таксама немалаважную ролю.

Аднак большасць беларусаў з'яўляецца калі не стопрацэнтнымі праваслаўнымі, то каранямі, традыцыямі і асабліва **ментальнасцю** – праваслаўнымі. Вось чаму палітыка Беларускага Народнага Фронту ў адносінах да рэлігіі не атрымала шырокай падтрымкі ў масах. І вось тут прыйшла на дапамогу амаль забытая ідэя уніі.

Ідэя простая і прывабная: не праваслаўе, не каталіцызм – беларускія рэлігіі, а грэка-каталіцызм, альбо інакш унія, якая існавала ў XVI–XVIII стст., – вось сапраўдная беларуская вера. У газетах, часопісах і іншым друку пачалі з'яўляцца артыкулы, прысвечаныя "нацыянальнай веры", пачалі ўзнікаць уніяцкія прыходы. Пачаўся уніяцкі бум, які перакінуўся на Беларусь з Украіны. І гэтая праблема, праблема рэлігійнага аб'яднання, экуменізму будзе існаваць заўсёды, пакуль існуюць незалежныя хрысціянскія плыні – каталіцызм і праваслаўе.

Літаратура, якая ёсць на цяперашні час па уніі, самая розная. Выразна прасочваюцца дзве плыні: літаратура, скіраваная на падтрымку уніяцтва як "нацыянальнай беларускай рэлігіі", і публікацыі супраць уніі. Аўтары першага кірунку як правіла каталікі ці людзі атэістычнага выхавання, што прынялі ідэю уніі тэарэтычна. Другая плынь адлюстроўвае погляд на

унію як на гістарычную памылку, як факт здрады праваслаўю найвышэйшых царкоўных іерархаў, як дэстабілізуючую сілу ў грамадстве. Прыхільнікі гэтай плыні ёсць не толькі сярод праваслаўных, але іх нямала і сярод католікаў і пратэстантаў.

Зразумела, цяжкая задача ў такіх варунках даць аб'ектыўнае даследаванне уніяцкай праблемы, якое б задаволіла і адзін, і другі бок. Хутчэй за ўсё, што гэта немагчыма, калі, зразумела, не скаціцца на папулісцкія пазіцыі. Аднак ёсць факты і гістарычныя дакументы, а не толькі суб'ектыўныя прыхільнасці да "прыгожай ідэі", да рамантычнага запалу і летуценняў. І да фактаў нельга не прыслухацца. А яны сведчаць далёка не на карысць уніі. Дастаткова прыгадаць кнігу дакументаў аб уніі "Унія ў матэрыялах і дакументах" (Мн., 1998).

Перш чым пачаць аналіз пастаўленага ў загалоўку пытання, дадзім агульны панятак сутнасці уніі і яе месца ў сучасным экуменістычным руху. Само слова унія ў перакладзе з латыні (unio) азначае аб'яднанне. У рэлігіі пад уніяй многія разумеюць аб'яднанне дзвюх хрысціянскіх канфесій – праваслаўя і каталіцызму – у нейкую новую канфесію, якая б задаволіла і праваслаўных, і католікаў, і несла рысы і той веры, і той. Аднак у сапраўднасці унія – гэта асаблівая структура ў каталіцызме, якая захоўвае праваслаўную абраднасць і носіць таксама назву – грэка-каталіцызм. Менавіта такая унія была здзейснена на Царкоўным саборы ў Брэсце ў 1596 г.

Трэба падкрэсліць наступную акалічнасць, што унія – гэта не нейкая асаблівая рэлігійная канфесія, як уяўляецца многім, а асаблівая плынь у каталіцызме – і больш правільна выкарыстоўваць тэрмін грэка-каталіцызм. Уяўленне аб уніі як асаблівай веры праяўляецца нават у навукоўцаў – даследнікаў уніяцкай праблемы. Так, у артыкуле С. Марозавай "Гістарычная рэлігійная альтэрнатыва Беларусі", ужо пачынаючы з назвы артыкула праводзіцца думка аб уніі як адметнай і ад праваслаўя, і ад каталіцызму

веры (“новай веры”). У сувязі з такой неадназначнасцю трактавання тэрміна “унія” разгледзім спачатку сутнасць грэка-каталіцызму, як у гістарычным, так і эклезіялагічным плане.

Як ведама, з 1054 г. хрысціянства падзялілася на дзве плыні: усходнюю – з цэнтрам у Канстанцінопалі, і заходнюю – з цэнтрам у Рыме. Традыцыйна Заходнюю Царкву называюць – каталіцызмам, а Усходнюю – праваслаўем. Паходжанне гэтых слоў наступнае. Каталіцызм (па-грэцку katolikas – кафалічнасць) азначае ўсяленскасць, саборнасць, і гістарычна гэтая назва замацавалася за Заходняй Царквой. Праваслаўе – азначае па-славянску: “права” – правільна, “слаўе” – славіць (правільна – славіць), тым самым падкрэсліваецца выключнасць, адзінкавасць Царквы. У англійскай мове праваслаўны – гэта артадаксальны (orthodox). Гэтая назва падкрэслівае старажытнасць, класічнасць і нязменнасць Праваслаўнай Царквы ад апостальскіх часоў да нашага часу. Асноваю, стрыжнем Праваслаўнай Царквы з’яўляецца Сімвал Веры, які быў сфармуляваны на сямі Усяленскіх Саборах у I тысячагоддзі пасля Нараджэння Хрыстовага. Панятак саборнасці – гэта адзін з галоўных пастулатаў Сімвала Веры, і таму Праваслаўную Царкву можна таксама называць кафалічнай, ці каталіцкай.

Такім чынам, назвы каталіцызм і праваслаўе нясуць фактычна адзін і той жа сэнс. І вызнаюць амаль адзін і той жа Сімвал Веры. Тут не выпадкова падкрэслена слова “амаль”, бо яно, як мы ўбачым ніжэй, вельмі істотнае. Гаворка ідзе пра восьмы складнік Сімвала Веры. У праваслаўным тэксце ён гучыць так: “*І ў Духа Святога, Госпада жыватворчага, што ад Айца зыходзіць*”. У каталікаў жа тут ёсць невялікая папраўка: “*...што ад Айца і Сына зыходзіць*”. Вось і ўсё! Толькі невялікі дадатак, так званы філіоквэ (filioque – лац.) – “*і Сына*”. Астатнія дзесяць складнікаў і ў праваслаўных, і ў каталікаў аднолькавыя. Аднак гэтая маленькая папраўка да Сімвала Веры, зробленая Заходняй Царквой, і стала прычынай

расколу хрысціянства на дзве Царквы – прынамсі, у эклезіялогіі. З пункту гледжання праваслаўнага багаслоўя дагмат аб зыходжанні Духа Святога не толькі ад Айца, але і Сына прыніжае годнасць Святога Духа і выстаўляе, па сутнасці, католікаў духаборцамі.

Неабходна дадаць, што дагмат аб філіоквэ з'яўляецца галоўным стрыжнем непаразумення паміж праваслаўнымі і католікамі да нашага часу.

Другім важным адрозненнем паміж Усходняй і Заходняй Цэрквамі з'яўляецца тэзіс аб бязгрэшнасці рымскага папы і наданне католікамі яму тытула намесніка Хрыста на Зямлі. Увядзенне гэтага пастулату ў практыку рымскага Касцёла прывяло да дадатковых наваўвядзенняў і ў практычную, абрадавую, частку іх веравызнання. Адным з вынікаў неабмежаванай улады рымскага папы з'явілася знішчэнне самастойнасці нацыянальных Цэркваў. Гэтая з'ява захавалася да нашага часу: усе каталіцкія структуры ва ўсіх краінах маюць аднаго вярхоўнага кіраўніка, аўтарытэта – папу рымскага. Іншымі словамі, Касцёлу не ўласціва аўтакефалія – незалежнасць царкоўных арганізацый краіны ад Царквы іншых краін.

У праваслаўнай Царкве гэта не так. На чале яе знаходзіцца толькі адзін вярхоўны ўладар – Ісус Хрыстос. Толькі яму падпарадкоўваюцца ўсе праваслаўныя арганізацыі. Незалежных, аўтакефальных Цэркваў у цяперашні час пятнаццаць.

Ёсць яшчэ некалькі менш істотных адрозненняў каталіцызму ад праваслаўя. Гэта сістэма індульгенцый (адпушчэння грахоў), уласцівая толькі Касцёлу, асаблівасці каталіцкага абраду Еўхарыстыі (прычасце на апрэсноках – бясквасным хлебе) і іншыя.

Такім чынам, дзве старажытныя хрысціянскія канфесіі на працягу стагоддзяў існавалі побач адна з адной, кожная з якіх захавала свой твар да нашага часу. Прычым не толькі з памятнага 1054 г. пачалося гэтае незалежнае існаванне, а шмат раней. Заходняя Царква з цэнтрам у Рыме і Усходняя Царква з цэнтрам у Канстанцінопалі пачалі сваё суперніцтва за лідэрства яшчэ ў эпоху Усяленскіх Сабораў (з IV ст.).

З цягам часу ў кожнай з хрысціянскіх Цэркваў склаліся свае традыцыі, свае абрады і свой парадак богаслужэння. І таму галоўнай праблемай ва ўсіх спробах аб'яднання, "прымірэння" католікаў з праваслаўнымі з'явіўся менавіта абрадавы бок. Эклезіялагічныя тэарэтычныя праблемы былі мала зразумелымі простаму народу, і іх можна было неяк уладкаваць. Але вось абрадавы, літургічны бок праблемы было вырашыць не так проста, калі не сказаць – немагчыма.

Аб'яднаўчы уніяцкі рух пачаўся, як гаварылася вышэй, з самога моманту раздзялення Цэркваў. Але немагчымасць прыняцця тым ці іншым бокам абрадавых традыцый, уласцівых набажэнству кожнай з Цэркваў, прывяла да наступнага кампрамісу: унія была ўведзена як палітычнае дзеянне. На Брэсцкім Саборы 1596 г. – у адрозненне ад шматлікіх ранейшых няўдалых спроб – быў урэшце падпісаны акт уніі. Фармулёўка уніі папярэдне была распрацавана і падпісана ў 1595 г. у Рыме епіскапамі Кірылам Цярлецкім і Ігнаціем Пацеем. Прычым імі было падпісана чыста каталіцкае вызнанне веры (прыняты дадатак філіоквэ і прызнана верхавенства рымскага папы). За праваслаўнымі, якія далучаліся да уніі, засталася магчымасць праводзіць набажэнства па ўсходнім абрадзе. Аднак, як паказала гісторыя, з часам гэты абрад усё больш набліжаўся да чыста каталіцкага, і ў наш час абрад цяперашніх уніятаў мала падобны на праваслаўны.

Прыняцце Брэсцкай уніі было вялікай перамогай каталіцызму над праваслаўем пасля шасці стагоддзяў безупыннай барацьбы паміж імі. І ў гонар гэтай падзеі, на радасцях папа рымскі Клімент III нават выпусціў памятны медаль, на адным баку якога быў ён сам, і на другім баку таксама ён, а перад ім укленчаны "русін" (цяпер – беларус) і надпіс – "Ruthenis receptis" – "На прыняццё русінаў". (прат. С. Гардун. "Брэсцкая унія як царкоўна-гістарычная трагедыя беларускага народа", Материалы научно-богословской конференции, Брест, 1996).

Нягледзячы на наяўнасць гэтага сумнага факта ў нашай гісторыі, апошнім часам настойліва прапагандаваўся тэзіс аб вялікім унёску уніі ў беларускую культуру і ўяўленне аб уніі як захавальніцы беларускай мовы. Мякка кажучы, праўда не зусім такая, і ніжэй мы разглядзім асноўныя аспекты праблемы.

***Царкоўная унія ў Беларусі і нацыянальная культура***

Ці з'яўляецца унія носьбітам нацыянальнай культуры? А менавіта гэтае меркаванне часта распаўсюджваецца ў розных выданнях, гучыць на розных канферэнцыях і сустрэчах. Таму неабходнасць дэталёвага высвятлення гэтага пытання – задача надзённая і неабходная. Яно цесна звязана з палітыкай і ў не малой ступені абумоўлена палітычнай пазіцыяй кожнага ўдзельніка дыскусіі на гэтую тэму.

Канкрэтызуючы назву загалоўка гэтага раздзела, сфармулюем прадмет нашай дыскусіі ў форме наступнага пытання: "Наколькі можна лічыць правільным сцверджанне аб тым, што уніяцкая вера для беларусаў ёсць нацыянальная вера?» І яшчэ: "Ці было уніяцтва лагічным вынікам эвалюцыі хрысціянства (яго праваслаўнай і каталіцкай плыняў) на беларускіх землях і ці стала яно з цягам часу новай рэлігіяй беларусаў, іх нацыянальнай верай?" Для ўкраінцаў з Галіччыны унія сапраўды цяпер найбольш блізкая вера, і яна нясе шмат нацыянальных асаблівасцей. Для беларусаў гэта не так. І меркаванне аб тым, што унія – гэта нацыянальная вера беларусаў, з'яўляецца чарговым міфам гісторыі.

Міф аб заваёве Беларусі этнічнымі літоўцамі (жмуддзю) і аб поўнай адсутнасці ў беларусаў дзяржаўнасці ствараўся на працягу ўсяго XIX ст. расійскімі гісторыкамі (Тацішчаў, Салаўёў, Пашута і інш.), у XX ст. – савецкімі гісторыкамі (беларускімі, рускімі і асабліва літоўскімі) і быў бліскуча разбіты Міколам Ермаловічам.

Цяпер аб новаяўленым міфе. Міф аб уніі як нацыянальнай веры беларусаў створаны галоўным чы-

нам у каталіцкім асяроддзі. Прычым як польскіх навукоўцаў, так і беларускіх, і украінскіх.

Супрацьстаянне экспансіі Рускай Праваслаўнай Царквы на Заходнія землі ў XIX ст. прыняло ў выніку выгляд не зусім натуральны. Гэтае супраціўленне ў некаторых месцах набыло нават характар поўнага адмаўлення праваслаўя і прыняцце не ўласцівай ментальнасці беларусаў чужой веры – каталіцызму, у які часта пераходзілі і беларусы-уніяты. Вось чаму ў Беларусі і з'явілася вялікая колькасць палякаў, якія паступова ўтварыліся з беларусаў-католікаў.

Калі праваслаўнае XVI ст. лічыцца Залатой парой для беларускага народа, часам росквіту як нашае культуры, так і навукі і рамёстваў, то ўжо з XVII ст. (з прыходу уніі) пачынаецца заняпад беларускай культуры. Менавіта пасля уніі 1596 г., пачынаецца агульны крызіс у ВКЛ. З гэтых часоў пачынаецца польскі ўплыў ва ўсіх сферах жыцця. Кожны здадзены Праваслаўнай Царквой фарпост, кожны прыход ці царква, здадзеныя на карысць уніі, вялі да ўзмацнення пальшчызны ў беларускім асяроддзі. Ды і не магло гэта быць інакш, бо падпарадкаванне праваслаўных абшчын чужой уладзе папы рымскага дзейнічала толькі на карысць каталіцызму і ўзмацняла яго ўплыў на нашых землях. Унія была сапраўдным мастом да апалячвання беларусаў. В. Пакуцэвіч у кнізе "Берасцайская унія" піша: "з пачаткам XIX ст. без ніякага прымусу афіцыйных маскоўскіх уладаў польская мова стала пануючай у Каталіцкай Царкве абодвух абрадаў" (г. зн. каталіцкай і уніяцкай канфесій – аўт.). Але і не толькі мова казанняў мянялася, мяняўся таксама абрадавы бок службы. І калі ва Украіне уніяцтва захавала першапачатковыя ўсходнія асаблівасці, характэрныя для Праваслаўнай Царквы, то ў Беларусі яно эвалюцыянавала ў заходнім кірунку і амаль злілося з каталіцкім Касцёлам.

Вось як слушна напісаў пра становішча з беларускай мовай у ВКЛ падчас росквіту уніі айцец Сергій Гардун: *Роўна праз 100 гадоў пасля заключэння Брэс-*

*цкай уніі, у 1696–1697 гадах, беларуская мова была выкінутая з афіцыйнага ўжытку і заменена польскай. Вось вынік стогадовага панавання уніі! Пропаведзі, справаводства, выкладанне ў царкоўных школах – усё гэта вялося уніятамі па-польску. Беларуская мова перастала існаваць як мова літаратурная* (Прат. С. Гардун . "Брэсцкая унія", стар. 28).

І а. Гардун, і іншыя даследнікі адзначаюць, што за перыяд панавання уніі (1596–1839 гг.) уніяты не пераклалі на беларускую мову ніводнага богаслужэбнага чыну і ніводнай кнігі. За гэты час не адбылося ніводнага богаслужэння на беларускай мове. Ці гэтым трэба ганарыцца паборнікам сучаснай уніі?

Я б дадаў больш: калі гаварыць пра ўнёсак уніі ў развіццё культуры беларускага народа, то яно было толькі адмоўным. Унія была хутчэй антынацыянальнай рэлігіяй. І сапраўды, усяго крок заставаўся, каб з беларусаў зрабіць палякаў. Пасля 1839 г. да каталіцызму адышло 2 млн. беларусаў, якіх потым аўтаматычна запісвалі палякамі. І ў наш час на тэрыторыі сучаснай Польшчы стаіць аналагічная праблема: беларусы Беласточчыны захоўваюць сваю этнічную ідэнтычнасць дзякуючы толькі аднаму чынніку – праваслаўнаму веравызнанню. Тыя ж беларусы – а іх некалькі соцень тысяч, – якія прынялі каталіцызм, ужо фактычна не адрозніваюцца ад палякаў. Яны размаўляюць па-польску, лічаць сябе палякамі і нават у пашпарце запісваюцца палякамі. Большасць з іх не вызнаюць сябе беларусамі і хаваюць сваё беларускае паходжанне, каб выглядаць цалкам "польскімі панамі". Аб гэтай набалелай праблеме гаварылася на II з'ездзе беларусаў Балтыі ў Вільні, які праходзіў 25–26 ліпеня 1998 г. Каардынатар Беларускага Дэмакратычнага Аб'яднання (БДА) беларусаў у Польшчы Пятро Юшчук адзначыў, што калі не надаць праблеме беларусаў-католікаў Беласточчыны дастатковай увагі, то мы хутка страцім гэтых беларусаў назаўсёды.

Але трэба адзначыць і наступнае. Нягледзячы на ўсё вышэйсказанае, на ўсю супярэчлівую гісторыю

уніяцтва, былі часы, калі менавіта уніяты, магчыма, неспадзявана для саміх сябе, аказваліся абаронцамі беларускага народа, яго традыцый і мовы. І гэта было, між іншага, тады, калі існаванне уніі ставілася пад пагрозу знішчэння, а на беларускіх землях ва ўсю моц насаджалася так званая русіфікацыя. Гэта адбывалася эпізадычна ў XIX ст. і таксама ў XX ст. І хоць масавага характару ў гэтыя часы уніяцтва не набыло, тыя станоўчыя праявы грэка-каталіцызму ў Беларусі нельга не спамянуць.

Таму да пытання аб беларускім уніяцтве трэба падысці з гістарычных пазіцый.

*Пяць перыядаў гісторыі уніяцтва ў Беларусі*

Усю гісторыю уніяцтва можна падзяліць на пяць наступных перыядаў:

1. Узнікненне уніі ў ВКЛ. Спробы прыняцця уніі да 1596 г.

2. ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай і росквіт уніі (ад 1596 г. да трох падзелаў Рэчы Паспалітай у канцы XVIII ст.).

3. Беларусь у складзе Расіі (ад канца XVIII ст. да бальшавіцкага перавароту 1917 г.).

4. Савецкі перыяд – БССР у мірны і ваенны час (1917–1991 гг.)

5. Распад СССР і новая хваля адраджэння уніі (ад 1991 г. да нашага часу).

*Першы перыяд.*

Агульная характарыстыка перыяду: фармаванне беларускай нацыі, мовы і культуры.

У рэлігійнай сферы можна вызначыць наступныя рысы.

1. Пераважная большасць насельніцтва Вялікага княства Літоўскага – праваслаўнага веравызнання.

На беларускіх землях праваслаўе з'явілася ў 988 г. З 992 г. існуе Полацкая епархія. З гэтых часоў праваслаўе, ці хрысціянства ўсходняга абраду, стала паноўнай рэлігіяй на беларускіх землях, якія ўваходзілі спачатку ў склад Полацага і Турава-Пінскага

richstваў, а потым у склад Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ), – і было так на працягу 600 гадоў аж да Брэсцкай уніі (1596 г.).

2. 1097 г. – пры Усяславе Чарадзеі Полацкая дзяржава становіцца незалежнай (упершыню юрыдычна). Праваслаўная Царква тасама імкнецца стварыць сваю незалежную мітраполію, якая ўсталёўваецца за часы панавання Віценя (1293–1315 гг.). Мітраполія адкрываецца ў Наваградку ў 1291 г. на чале з мітрапалітам Феафілам.

3. У часы панавання Альгерда ў Наваградку незалежную мітраполію ўзначаліў мітрапаліт Раман (1354 г.). У Маскве незалежна кіруе мітрапаліт Алексій.

4. У часы праўлення Вітаўта (1392–1430 гг.) упершыню без узгаднення з Канстанцінопалем высвечаны ў мітрапаліты Рыгор Цамблак.

5. З 1458 г. існуюць дзве незалежныя мітраполіі – у Кіеве (Рыгор Баўгарын) і ў Маскве.

З'яўленне каталіцызму ў праваслаўным (часткова паганскім) асяроддзі ВКЛ прывяло паступова да расколу грамадства і аслаблення магутнай Еўрапейскай дзяржавы ВКЛ, што стала прычынай уступлення яго ў канфедэрацыю з Польшчай (Рэч Паспалітую). Саюз ВКЛ з Польшчай (унія), адлік якога вядзецца з 1569 г., не прынёс жаданага шчасця нікому: ні нам – беларусам, ні палякам. Прысутнасць ва унітарнай дзяржаве некалькіх і, у шмат якіх адносінах антаганізуючых рэлігійных канфесій, галоўнымі з якіх былі праваслаўе і каталіцызм (пазней яшчэ і унія), стала адным з фактараў, які прывёў да трох падзелаў Рэчы Паспалітай. У выніку гэтых падзелаў беларускія землі былі цалкам улучаны ў склад Расійскай Імперыі.

Калі ж з'явілася ў ВКЛ унія?

Спробы прыняцця уніі вядомыя намнога раней, чым ракавы 1596 г. Адзначаны цэлы шэраг спроб Рыма схіліць да сябе праваслаўных. Вось некалькі прыкладаў, узятых з кнігі "Исторические известия о возникшей в Польше унии. Вильна. 1866":

“В 1204 г. папа Иннокентий II прислал посла своего к Роману Мстиславовичу и оговаривал его к принятии римской веры, обещая учинить королем Галицким...”

“В 1247 г. князь Даниил Романович Киевский, ища себе помощи противу татарской силы... через ходатайство папы Иннокентия IV покорился ему...”

“В 1252 г. папа Иннокентий IV Александра Ярославовича (Невского) хотел привлечь”, але той “иного учения не принял”.

1385 год. Крэўская унія. Гэтая падзея лічыцца пачаткам гісторыі каталіцызму ў Беларусі. Прычынай стаў шлюб вялікага князя літоўскага Ягайлы з каралевай польскай Ядвігай і прыняцце ім каталіцызму, каб завалодаць польскай каронай. Стаўшы каралём польскім, ён ахрысціў у каталіцызм паганцаў і распачаў акцыю па ўцягненні ў каталіцызм праваслаўных.

У 1439 г. адбылася Фларэнційская унія. Прычынай яе з’яўляліся, як і ў папярэдніх выпадках, палітычныя інтрыгі. У гэтым выпадку грэцкі імператар Іаан Палеолаг, шукаючы дапамогі ад нашэсця турак, звярнуўся да папы рымскага, які не адмовіўся, але паставіў умову – прыняць унію. 15 месяцаў працягвалася спрэчка аб зыходжанні Святога Духа, якая закончылася на карысць каталікаў.

Акрамя станоўчага вырашэння гэтага пытання, для прыняцця уніі неабходна было прызнаць верхавенства папы рымскага. Некаторая святары выканалі ўсе пастаўленыя ўмовы. Сярод такіх быў вядомы Ізыдор, якога жыхары Кіева выгналі з горада, як толькі даведаліся аб уніі. І апошні прытулак ён знайшоў сабе аж у Рыме.

У канцы XVI ст. узрастае націск на Беларусь з двух бакоў – каталіцкай Польшчы і праваслаўнай Масквы. І ўрэшце рэшт на Брэсцкім Саборы ў 1596 г. утвараецца унія...

Такія падзеі адбываліся ў рэлігійным жыцці Полацкага княства, а затым і ў Вялікім княстве Літоў-

скім да 1596 г. Што тычыцца становішча ў культуры, навуцы і іншых сферах жыцця нашых продкаў гэтага перыяду, то яно вызначаецца высокім еўрапейскім роўнем, і добра ўсім ведамае XVI ст. лічыцца нават Залатой парой Беларусі. Мы маем выдатныя поспехі паўсюдна – і ў культуры і пісменніцтве (напрыклад, сусветна ведамая Біблія, напісаная ўпершыню славянскай мовай Францыскам Скарынам, выдатныя помнікі дзяржаўнага заканадаўства "Статут Вялікага княства Літоўскага", "Літоўскія метрыкі" і г. д.), у дойлідстве (не буду пералічаць, нагадаю хоць б кнігу М. Ткачова "Замкі Беларусі"), у літаратуры (паэзія Сімяона Полацкага і "Дыярыуш" ігумена праваслаўнага манастыра Афанасія Філіповіча), у мастацтве (гл. альбом "Беларускі іканапіс") і мноства іншых выдатных твораў ва ўсіх галінах дзейнасці. І стваралася гэта ўсё ў той час, калі даміноўнай рэлігіяй у дзяржаве была праваслаўная рэлігія.

Пра вызначальную ролю праваслаўя ў развіцці беларускай нацыянальнасці пісаў і вядомы дзеяч і навуковец у галіне беларусазнаўства ў першай палове XX ст. каталіцкі ксёндз Адам Станкевіч: *Праз увесь беларуска-літоўскі перыяд (XIII–XVI ст.) беларускай гісторыі паноўнай верай у Беларусі было праваслаўе, якое служыла апорай у гэтым часе беларускай нацыянальнай культуры* (Кс. Адам Станкевіч. Хрысціянства і беларускі народ. Вільня, 1940).

Як бачым, нават канфесійная прыналежнасць не пашкодзіла ксяндзу Станкевічу быць аб'ектыўным – і гэта ўласцівасць сапраўднага навукоўца. Чамусьці цяперашнія прыхільнікі уніі не цытуюць ягоных слоў: *Народ наш сваёй бацькоўскай верай лічыў праваслаўе, ён у барацьбе з уніяй загартаваў, умацаваў і паглыбіў сваю беларускую нацыянальнасць... Народ інстынктыўна чуў, што яму унія нясе паланізацыю і чужое яму лацінства.*

*Другі перыяд (1596 г. – канец XVII ст.)*

Гэты перыяд найбольш цікавы для нас. Як жа інакш – росквіт уніі, прызнанне уніі і Рымам, і мяс-

цовым духавенствам Рэчы Паспалітай. Калі ўжо гаварыць аб уніі як “нацыянальнай веры”, то ў першую чаргу трэба абапірацца на гэтыя часы двухсотгадовага панавання уніі на ўсходніх крэсах Рэчы Паспалітай.

Галоўныя рысы перыяду: па-першае, ВКЛ з 1569 г. аказалася ў складзе Рэчы Паспалітай. Гэты час увайшоў у гісторыю Беларусі вялікімі зменамі ва ўсіх сферах жыцця. Галоўныя рысы перыяду:

– у дзяржаўным будаўніцтве: Беларусь пачала траціць незалежнасць, якая і была фактычна страчана да канца XVII ст.;

– у культуры: гэты перыяд пасля Залатой пары Беларусі XVI ст. вядомы пад назвай “перыяд заняпаду”;

– у рэлігіі: вера продкаў – праваслаўе – пачынае страчваць сваю кіроўную ролю ў грамадскім, палітычным і рэлігійным жыцці. Ідзе актыўны пераход беларускіх вернікаў пад засіллем лацінства – каталіцызму Польшчы – у грэка-каталіцызм, ці унію, якая пасля галоўным чынам прымусовага ўвядзення, стала верай амаль 80 % беларусаў.

На працягу ўсяго XVII ст. унія пракладвала сабе шлях у жорсткай барацьбе з праваслаўем і к канцу XVIII ст. гвалтам далучыла да сябе большасць простага праваслаўнага беларускага народа. Разам з тым паступова вынішчалася ўсякая беларускасць. Менавіта ў гэтыя часы выйшаў вядомы ўказ караля аб забароне беларускай мовы ў афіцыйным ўжытку. Далучэнне Украіны да Расійскай дзяржавы ў 1654–1655 гг. мела адмоўнае значэнне для беларусаў. Колькасць праваслаўнага насельніцтва ў засталых землях Рэчы Паспалітай рэзка паменшылася, павялічыўся польскі ўціск. І многія больш слабыя духам пачалі здраджваць сваёй веры, пачалі пераходзіць у унію. Другія, больш моцныя, не здрадзілі і, ратуючыся ад ганенняў, перасяліліся ў Расію. Сярод апошніх быў, напрыклад, Сімеон Полацкі. І не дзіва, што ў рэшце рэшт унія перамагла і запанавала па

ўсёй тэрыторыі Беларусі. Надышлі самыя змрочныя часы ў гісторыі нашае Бацькаўшчыны – часы акаталічвання і апалячвання беларусаў, здрады векавым традыцыям, заняпаду культуры.

Прадметам нашай цікаўнасці з'яўляецца становішча з нацыянальнай культурай і яе сувязь з дзейнымі ў Беларусі канфесіямі. Першая адметнасць гэтага перыяду, агульная тэндэнцыя развіцця – гэта сінтэз праваслаўна арыетаванай культуры з заходнімі каталіцкімі традыцыямі. Калі на пачатку працэсу пераводу праваслаўных у унію – першага кроку да акаталічвання беларусаў – мы бачым моцнае супраціўленне чужой рэлігіі (успомнім напрыклад, выпадак з Язафатам Кунцэвічам, забітым даведзеным да адчаю народам), то на канцы XVIII ст. справа была амаль зробленая – праваслаўе ледзь трымалася ў адзінкавых прыходах.

Аналіз розных помнікаў гісторыі і культуры гэтага перыяду паказвае на іх паступовы заняпад у сэнсе значнасці для сусветнай культуры і на паступовае сціранне нацыянальнай адметнасці, чым так славілася ВКЛ часоў залатой пары. Час уніі – гэта хутчэй час знішчэння беларускай культуры, заняпаду беларускай мовы і наагул гэта цяжкія часы для беларусаў як нацыі: набірала моц тэндэнцыя апалячвання нашага народа.

Аднак, як бы там ні было, але больш як 200-гадовае панаванне уніі на беларускіх землях павінна было зрабіць свой унёсак у розныя сферы жыцця. Разгледзім некалькі канкрэтных прыкладаў.

Возьмем найбольш вядомую галіну культуры, што хоць неяк захавалася да нашага часу – архітэктуру. Так, напрыклад, у культавым будаўніцтве мастацтвазнаўцы падкрэсліваюць наступную рысу ў развіцці дойлідства ў Беларусі XVII–XVIII стст. Гэта накладванне на класічную форму праваслаўнага храма элементаў заходняй архітэктуры. Часцей за ўсё гэта барока. Узнікае і свой адметны стыль – віленскае барока. Гэта што да знадворнага выгляду храма. Унутры

храмаў інтэр'ер заставаўся ранейшым (праваслаўным). Да такіх помнікаў адносяцца Багаяўленская царква ў Полацку, Нікольская царква ў Магілёве і г. д.

Многія праваслаўныя храмы перабудоўваліся ці разбураліся наагул, каб на іх месцы ўзвесці новы храм, але ўжо з заходнімі традыцыямі. Напрыклад, Сафійскі сабор у Полацку быў перабудаваны ў XVIII ст. уніятамі (прыбудова апсіды з правага боку).

Уніяты, выконваючы цалкам устаноўкі каталіцкага культу, выносілі з храмаў іконы, іканастасы. Заміж старажытных ікон ставіліся італьянскія палатняныя і нават папяровыя. Такое стаўленне да іканапісу вяло да яго вульгарызацыі і наагул да яго знішчэння як культавага мастацтва. І ў галіне іканапісу уніяцтва не дало свайго новага стылю, аказалася не здольным стварыць свае мастацкія творы. І. Рэкуц, напрыклад, падкрэслівае, "што ў створаных помніках культавага мастацтва уніяцтва з непазбежнасцю ўхілялася то ў бок каталіцызму, то ў бок праваслаўя. Тыя ж рэдкія творы культуры, якія з пэўнымі агаворкамі можна было б аднесці да помнікаў т. з. "уніяцкага мастацтва", адрозніваюцца яскрава выражаным эклектызмам, змяшаннем стыляў"[1].

Агульная рыса уніяцкай культуры на пачатак XIX ст. – гэта збліжэнне з каталіцкім культавым мастацтвам да поўнага зліцця з ім. Вызначальную ролю адыграў на гэтым шляху Замойскі уніяцкі сабор 1720 г. На саборы разглядалася пытанне аб збліжэнні Уніяцкай Царквы з лацінскай. Шэраг дагматаў і абрадаў грэка-каталіцкай Царквы былі заменены на каталіцкія. Да іх ліку, акрамя традыцыйных (зыходжанне Святога Духа не толькі ад Айца, але і Сына), былі таксама ўведзены наступныя: увядзенне ў літургію еўхарыстыі на праснаках (бязквасным хлебе), свята ў гонар Цела Хрыстовага і ў гонар Язафата Кунцэ-

---

[1] Рекуц И.// У зб. "Памяти преподобномученика Афанасия игумена Брестского". Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі. Брэст, 1996.

віча (праклятага праваслаўнымі), а таксама шэраг пастаноў чыста каталіцкай імшы: памінанне падчас літургіі рымскага папы, апрананне уніяцкага святара ў вопратку каталіцкага строю і іншае. Такім чынам тое, за што так змагаліся першыя уніяты – усходні абрад – паступова нівелявалася і знішчалася.

Замойскі сабор, са слоў протаіерэя К. Знаско, давёў унію да такога стану, пры якім пераход у лацінства станавіўся неадчувальным, ён быў прадвеснікам поўнага зліцця ў недалёкім будучым уніі з лацінствам (каталіцызмам)[1].

Да сярэдзіны XVIII ст. становішча уніятаў у Рэчы Паспалітай стала нагадваць становішча праваслаўных гадамі ста раней. Каталіцкая шляхта і духавенства паступова змяняюць палітыку да уніі як саюзніка. Яны пачынаюць ставіцца да уніі як да халопскай веры, веры ніжэйшай за каталіцтва, "непаўнавартаснага" каталіцтва. Існаваў нават план сістэматычнага пераводу уніятаў у каталіцызм, складзены архіепіскапам львоўскім Серакоўскім у 1752 г.

Сказанае прымушае засумнявацца ў ісціне выказванняў абаронцаў уніі гэтага перыяду. Так, Валянцін Грыцкевіч, нічым не абгрунтоўваючы свае думкі, піша: *Грэка-каталіцкая Царква знаходзілася пад апекай не Польскай дзяржавы, а Рыма. Рымская курыя ў сваіх афіцыйных заявах забяспечвала грэка-католікам поўную непарушнасць іхніх абрадаў і звычаяў...*[2] Відавочна, што гэта было не зусім так. І Касцёл польскі знаходзіўся пад юрысдыкцыяй Рыма, і унія, і таму палітыка дзяржаўная была скіраваная на падтрымку каталіцызму – як звычайнага рымскага, так і грэцкага – уніі. Хіба што толькі апошняя – унія была папялушкай у першай – каталіцызму.

І далей спадар В. Грыцкевіч не зусім мае рацыю, калі піша: *З амбонаў грэка-каталіцкіх (уніяцкіх) цэркваў гучала беларускае слова ў тыя часы, калі ў рыма-каталіцкіх касцёлах чулася лацінская і*

---

[1] Зноско К. Исторический очерк церковной унии. М., 1993.

[2] Грыцкевіч В. // Міф аб уніі, Выбар, № 3, 1993.

*польская мовы, а ў грэка-праваслаўных цэрквах – царкоўнаславянская – усе далёкія ад беларускай мовы.* Гэты тэкст адлюстроўвае не праўду, не ісціну, а хучэй нейкае рамантычнае жаданне, настальгію па магчымым, але не адбыўшымся і не існаваўшым. Каб так было, як піша аўтар, г. зн. гучала беларускае слова на літургіях і іншых набажэнствах, то непазбежна захаваліся б беларускамоўныя царкоўныя кнігі ад даволі не малога – 200-гадовага перыяду панавання уніі, як гэта адзначаў а. Сергій Гардун. Такіх кніг няма і блізка. Сапраўдная сітуацыя для уніятаў была абсалютна іншай і не на карысць беларускай мовы – мова багаслужэння з часам мянялася ад царкоўнаславянскай да польскай. Звычайнае набажэнства ва уніяцкіх храмах, у разгляданы перыяд вялося на царкоўнаславянскай мове, а пропаведзі напачатку вяліся на мове народа, а потым усё больш на польскай. Леанід Лыч вырашае праблему з адсутнасцю беларускамоўных рэлігійных кніг вельмі проста: іх знішчылі! Ён піша: *...Але дзякуючы той скрупулёзнасці, з якой на загад найсвяцейшага Сінода будуць знішчаны ўсе (!) рэлігійныя кнігі ва уніяцкіх цэрквах, цяжка сказаць (падкрэслена мною – А.А.), у якой ступені яны былі забяспечаны літаратурай, неабходнай для вядзення літургіі... гісторыкі не валодаюць дакладнымі звесткамі былі, ці не былі ва уніяцкіх храмах на беларускай мове патрэбныя кнігі* (Мова і рэлігія, ЛІМ, 9.08.1991). За сваю больш чым 200-гадовую гісторыю уніятам няма чаго паказаць – няма ніводнай кнігі, ці хоць якога рукапісу. Высноўва можа быць толькі адна: такіх кніг (папросту) не было! І навошта яны былі патрэбныя, калі набажэнства ва уніяцкіх храмах вялося на царкоўна-славянскай мове! У сваіх далейшых разважаннях прафесар Л. Лыч вырашае пакінуць у спакоі гэтую не існуючую беларускамоўную літургію і выкідвае ўжо бяспройгрышную карту: *Нямалаважнае значэнне тут яшчэ мае тое на якой мове святары звяртаюцца да вернікаў у час службы...* І адказвае: *Няма сумнен-*

*няў: пераважна выкарыстоўвалася беларуская мова ва ўсіх яе мясцовых дыялектах.* Тут я, безумоўна, павінен згадзіцца. Гэта цалкам лагічна. Але лагічным будзе сказаць і наступнае: святары праваслаўных храмаў гэтага перыяду (ды і касцёла) таксама звярталіся да сваіх прыхаджан на іх штодзённай мове – на мясцовым дыялекце. Інакш бы іх не зразумелі. Аніяк святар праваслаўнага храма ў Рэчы Паспалітай не мог звяртацца да сваёй паствы на маскоўскай гаворцы. Прынамсі, да канца XVIII ст. гэта было так. І падстаў да нейкай адметнасці грэка-каталіцкай Царквы ў моўных пытаннях ў часы Рэчы Паспалітай XVI–XVIII стст. абсалютна няма.

*Перыяд трэці. Беларусь у складзе Расійскай Імперыі (канец XVIII ст. – 1917 г.).*

Гэта складаны перыяд для Беларускага народа – як для яго самасцвярджэння, так і будучыні. З аднаго боку, Беларусь цалкам страціла самастойнасць. Пры “паляках” (у складзе Рэчы Паспалітай) юрыдычная незалежнасць была, бо дзейнічаў статут ВКЛ 1588 г. З другога боку, менавіта ў гэты перыяд пачала фармавацца беларуская нацыя ў сучасным выглядзе і з’явіліся літаратурныя помнікі на мове, якую і назвалі беларускай. У гэты ж перыяд і ўкараняюцца ва ўжытак тэрміны *Белая Русь, беларусіны, беларусцы, беларусы...*

Паглядзім цяпер, што мяняецца ў гэтыя часы для беларусаў у рэлігійных і культурных адносінах – прадмеце нашага інтарэсу. Як мы ўжо высветлілі, у другі перыяд нашай перыядызацыі гісторыі Беларусі не было якой-небудзь важкай адметнасці ў царкоўных набажэнствах ні ў уніяцкіх прыходах, ні ў іншых. З адыходам беларускіх зямель да Расіі роля царкоўных інстытутаў – сярод якіх уніяцкая Царква была самай значнай – карэнным чынам змянілася.

Па-першае, Праваслаўная Царква пасля становішча папялушкі ў Рэчы Паспалітай атрымала магутную дзяржаўную падтрымку з боку Масквы і адразу пачала імкліва расці як колькасна, так і якасна.

Менавіта тады Праваслаўная Царква сутыкнулася з працэсам, які пазней атрымаў назву – “русіфікацыя”. Напачатку, праўда, гэты працэс быў хутчэй аб’ектыўным, чым прымусовым, ён быў выкліканы значным наплывам духавенства з Расіі, бо сваіх навучальных духоўных устаноў у Беларусі не было.

Па-другое, Уніяцкая Царква, апынуўшыся ў новых умовах стала, сапраўды, своеасаблівай захавальніцай папярэдне існаваўшай культуры, традыцый і звычаяў, уласцівых беларускаму народу да падзелу Рэчы Папалітай. Але падкрэслю істотную акалічнасць: гэта было абумоўлена толькі тым, што Уніяцкая Царква была самай масавай царкоўнай арганізацыяй на крэсах Рэчы Папалітай. Становішча ж з культурай у “Северо-Западном” краі на пачатку XIX ст. было наступнае. Агульная карціна: паўсюднае ўжыванне польскай мовы, знікненне беларускай мовы з афіцыйнага ўжытку – яна існуе цяпер толькі ў асяроддзі сялянства ды яшчэ ў самых ніжэйшых слаях насельніцтва. Унія становіцца носьбіткай “мужыцкай веры”, бо вярхі ўжо даўно акаталічыліся, а праваслаўных прыходаў засталося настолькі мала, што гаварыць аб іх значнасці ў царкоўным жыцці не выпадала.

Перад распадам Рэчы Паспалітай (канец XVIII ст.) польская мова была мовай кіраўніцтва, мовай многіх уніяцкіх ксяндзоў, можна нават сказаць іх хатняй мовай. Працэс паланізацыі зайшоў ужо вельмі далёка, і да поўнага апалячвання і акаталічвання беларусаў на гэты момант застаўся адзін крок: “Калі ў 1795 г. гістарычны лёс зліў гэты край з Расіяй – у ім усё, што несла пячатку цывілізацыі, было ўжо чыста польскае”[1]. Аднак царкоўнаславянская і беларуская (народная) мовы, працягвалі ўжывацца ва уніяцкіх касцёлах, хоць і ў вельмі скажоным, “апольшчаным” выглядзе. Працэс наступу польскай мовы ва уніяцкіх храмах працягваўся да 1839 г. і быў настолькі моцным, што яна пачала на Беларусі паў-

[1] Дзяржаўны архіў Расійскай федерацыі, г. Масква, Ф.109, вып 2, стр. 713, арк 4.

сюдна замяняць царкоўнаславянскую мову набажэнства. Іосіф Сямашка ў сваёй знакамітай "Запісцы" 1827 г. пісаў, што уніяцкае духавенства ва ўсім стала падобным да каталіцкага – у адзенні, абрадах, мове. Нават у кнізе уніяцкага епіскапа Кіпрыяновіча "Жыццё Язэпа Сямашкі" гаворыцца: *З цягам часу не толькі выняткóвыя асобы, пераважна адукаваныя, але і цэлыя парафіі і акругі забылі свае родныя штодзённыя малітвы і карысталіся малітвамі на польскай мове.* І далей: *На ўсёй тэрыторыі Літоўскай епархіі ўсё духавенства (уніяцкае) гутарыла на польскай мове і зусім не ведала мовы рускай (беларускай).*

У многіх артыкулах, прысвечаных таму перыяду, сустракаюцца супярэчнасці. З аднаго боку, адзначаецца польскі чыннік у жыцці уніі. З другога боку, падкрэсліваецца ўсё большае значэнне беларускай мовы ў богаслужэннях. Што ж пераважала на самай справе? Адказ, мне падаецца, больш правільны наступны. Даміноўным быў, канечне, першы фактар (польскі), бо ўся, так бы мовіць царкоўная абрадавая і моўная палітыка ішла зверху – ад уніяцкага духавенства, а яно паўсюдна было апалячана. Гэта адзначае ў сваіх артыкулах і даследчыца уніяцкага пытання гэтага перыяду С. Марозава: "Мовай навучання ў большасці ўстаноў Уніяцкай Царквы ў першай чвэрці XIX ст. стала польская"[1].

Зразумела, такі працэс на заходніх землях Расіі наўрад ці быў даспадобы царскаму ўраду, і было вырашана далучыць уніятаў (абрад жа іх "па першай задуме" 1596 г. быў усходнім, праваслаўным) да Рускай Праваслаўнай Царквы, што і было зроблена ў 1839 г. З гэтага моманту пачаўся працэс абароны ад паланізацыі Царквы, якая з уніяцкай была ператворана ў праваслаўную. Гэта было не цяжка зрабіць, і хутка ўтварыліся семінарыі і іншыя навучальныя ўстановы для навучання будучых святароў царкоўнаславянскай мове і катэхізісу. Была ўведзена такса-

[1] Марозава С. Моўная палітыка і практыка уніяцкай царквы // З гісторыі уніяцтва ў Беларусі, Мн., 1996.

ма і руская мова, якая была больш зразумелая простаму народу, чым польская. Аднак павальны пераход уніяцкіх прыходаў у праваслаўныя суправаджаўся таксама і іншым працэсам – пераўтварэннем уніяцкіх цэркваў у касцёлы. За паўгода – з 1794 г. (пасля другога паздзелу Рэчы Паспалітай) з уніяцтва перайшло ў праваслаўе 1,5 млн. беларусаў. А пасля 1839 г. гэты працэс пайшоў яшчэ больш актыўна. Паказальна вось што: наколькі цяжка ўводзілася унія – цэлыя два стагоддзі (XVII і XVIII стст.), і наколькі хутка перамагло праваслаўе.

Але ў тых мясцінах, дзе працэс паланізацыі зайшоў вельмі далёка, многія уніяты прынялі каталіцтва. Усяго, дзякуючы уніі, каля 2 млн. беларусаў перайшлі ў каталіцтва, апалячыліся і былі назаўсёды страчанымі для беларускай нацыі.

Вось адкуль у Заходняй Беларусі столькі палякаў! Яны "ўтвараліся" ў два заходы: першы – гэта названы намі перыяд, другі – перыяд пасля далучэння заходніх абласцей Беларусі да Польшчы пасля Рыжскай дамовы 1921 г.

Адносна часоў пасля 1839 г. цікавыя звесткі прыводзяцца ў артыкуле В. Грыгор'евай і іншых. *Уніяцтва ў Беларусі; ад Полацкага сабора 1839 г. да нашых дзён*[1]. Яна прыводзіць наступны факт: у 1840 г. Святы Сінод загадаў духавенству чытаць казанні на простай мове. Высветлілася, "што уніяцкія святары лепш ведаюць польскую мову, чым беларускую" (с. 123. "З гісторыі уніяцтва..."). Вось вам і "нацвера" беларусаў, як цяпер любяць гаварыць! Прывяду яшчэ вытрымку з таго ж артыкула В. Грыгор'евай: *20 студзеня 1855 г. Віцебскі, Смаленскі Магілёўскі генерал-губернатар Ігнацьеў пісаў, што былыя уніяцкія святары пры пераходзе ў праваслаўе "не змянілі ранейшых звычаяў сваіх, з польскай мовай захавалі яны ўсе ўяўленні былых настаўнікаў... Большая частка сялян не толькі не ведае ніводнай ма-*

[1] Уніяцтва ў Беларусі; ад Полацкага сабора 1839 г. да нашых дзён // З гісторыі уніяцтва ў Беларусі. Мн., 1996.

*літвы, але нават на пытанне: якой яны веры, і пры далейшем тлумачэнні дадае: раней польскай былі, а цяпер, здаецца, рускай.* Такое ўражанне: сам тэрмін "унія" быў мала вядомы простаму народу. Характэрна яшчэ і тое, што ў пытаннях рэлігіі ў беларусаў к XIX ст. склаўся спрошчаны падыход: "вера польская" – унія і каталіцызм, а "вера руская" – праваслаўе. І такое ўяўленне, дарэчы, засталося да нашага часу! Католік – значыць паляк, праваслаўны – рускі.

Пасля 1839 г. працэс пераводу уніяцкіх прыходаў у праваслаўныя пайшоў вельмі шпарка. Але, як часта бывае, гэты працэс выклікаў таксама і рэакцыю адмаўлення праваслаўя, якое "прадстаўлялася" ў расійскім варыянце. Менавіта з сярэдзіны XIX ст. стала складвацца (упершыню!) новая і даволі дзіўная сітуацыя: вера бацькоў – праваслаўе – у сваім новым, «маскоўскім» выглядзе стала для беларусаў Паўночна-Заходняга краю ў многіх адносінах не «свойскай» верай, не "мужыцкай" верай, а *як і каталіцызм – «панскай» верай.* Бо яна таксама ішла ад паноў, але ўжо не польскай, а расійскай арыентацыі. *Менавіта ў гэтыя часы (сярэдзіна XIX–пачатак XX стст.) грэка-каталіцызм быў найбольш блізкай рэлігіяй да народа.* Гэта быў своеасаблівы "пераходны перыяд" – праваслаўе яшчэ не было прынятае ў сваёй новай форме, але і унія імкліва страчвала свае пазіцыі на карысць "добра забытага" старога – праваслаўя. Мноства уніяцкіх цэркваў становяцца праваслаўнымі. Калі на 1864 г. колькасць праваслаўнага насельніцтва была 2 млн. 502 тыс. чалавек, то к 1897 г. вырасла да 5 млн. 114 тыс. ч. (Канфесіі на Беларусі, Мн., 1998). Але і для каталіцкіх прыходаў гэтыя часы былі "ўлоўнымі". Колькасць католікаў павялічылася ў той жа перыяд з 1 млн. 333 тыс. ч. да 1 млн. 947 тысяч. Пераход у каталіцызм пачаўся яшчэ больш актыўна пасля 1905 г. з прыняццем "дэкрэта аб верацярпімасці". Да Касцёла многіх сялян прыцягвала ягоная большая абрадавая, вонкавая праставата. За часы уніі многія настолькі прывыклі да спраш-

чоных абрадаў набажэнства, да мяккіх пастоў, якія ўсё больш укараняліся з практыкі Касцёла, што праваслаўны (усходні!) абрад не надта прываблівaў іх. І яны станавіліся каталікамі.

*Чацверты перыяд. Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. – канец 80-х гг. XX ст.*

Рэвалюцыя 1917 г. і грамадзянская вайна выклікалі вялізную палітычную актыўнасць народных мас, што ў выніку прывяло да цалкам новай рэлігійнай сітуацыі ў Расійскай імперыі, якая пазней стала СССР. У чым праявіліся гэтыя глабальныя змены?

Перш за ўсё ў рэлігійнай сферы пачаў дзейнічаць моцны палітычны фактар. Напрыклад, вядомыя лідэры беларускай сацыял-дэмакратыі Іван і Антон Луцкевічы вялі вялікую працу па аднаўленні уніі. Больш за тое, цэлая партыя – БХДЗ (Беларуская хрысціянска-дэмакратычная злучнасць) ставіла сваёй мэтай аб'яднанне каталікаў з праваслаўнымі ў унію. Аднак і гэтыя новыя крокі па адраджэнні уніяцтва былі асуджаны на правал. Пачаўся агульны наступ на рэлігію без разбору канфесій. І галоўны ўдар прыняло на сябе праваслаўе. Па-сутнасці, новай усеабдымнай рэлігіяй стаў атэізм. Ён спарадзіў новыя абрады і традыцыі – традыцыі бездухоўнасці і маральнай дэградацыі. І кароткі перыяд уніяцкага адраджэння ў БССР першай паловы 1920-х гадоў (дэкан Я. Белагаловы, экзарх Л. Фёдараў) хутка скончыўся поўным скасаваннем уніяцкіх прыходаў па ўсёй тэрыторыі ўсходняй Беларусі.

На беларускіх землях, што адышлі да Польшчы пасля Рыжскай дамовы 1921 г., уніяцкія абшчыны наадварот пачалі аднаўляцца, і к 1932 г. іх лік дасягнуў 32. Перыяд з 1921 г. да 1939 г., магчыма, найбольш значны ў гісторыі беларускага уніяцтва XX ст. У гэты перыяд ёсць што адзначыць у плане дасягненняў уніяцтва. Так, ведамая дзейнасць уніяцкага цэнтра ў Альбертыне, што пад Слонімам. З 1932 г. яго ўзначальваў Антон Неманцовіч, які выпускаў беларускі часопіс "Да злучэння". Ведама дзей-

насць айца Льва Гарошкі ў Стоўбцах. Ім быў напісаны шэраг артыкулаў філасофска-рэлігійнага плану, а таксама кнігі "Навука і рэлігія", "Душа" і іншыя.

Апошнія спробы ажыўлення уніяцкай дзейнасці ў Беларусі скончыліся падчас Другой сусветнай вайны ў 1942 г. у сувязі з арыштам А. Неманцовіча. Леў Гарошка працягваў сваю дзейнасць ужо за мяжой, у эміграцыі.

Аднак не уніяцкі рух дамінаваў у справе беларусізацыі царкоўных арганізацый Заходняй Беларусі. Шмат зменаў адбылося ў Праваслаўнай Царкве "крэсаў". З Царквы, якая дамінавала ў царскай Расіі, займала пануючую ролю, у Рэчы Паспалітай II праваслаўе стала пераследванай рэлігіяй. Праваслаўе ў Заходняй Беларусі было верай вялікай колькасці беларусаў, хоць агульная колькасць праваслаўных беларусаў значна зменшылася (у 1911 г. у Гродзенскай губерні праваслаўных было каля 741 тыс., а ў 1920 г. ужо толькі 325 тысяч). Справа беларусізацыі Царквы (і адпаведна ўкраінізацыі на ўкраінскіх землях Польшчы) надзённа гучала як для беларусаў, так і для украінцаў. І, калі да рэвалюцыі ўсім ходам ішла русіфікацыя Царквы, дык "пры паляках" Праваслаўная Царква сутыкнулася з дзяржаўнай палітыкай паланізацыі. І для палягчэння апошняй задачы ў Польшчы была прынята аўтакефалія. Прынята гвалтоўна, насуперак кананічнаму праву і без якіх-небудзь саборных актаў. Аднак яна здзейсніла факт непасрэднага падпарадкавання царкоўных арганізацый дзяржаве. Тым самым аўтакефалія давала неабмежаваныя магчымасці для правядзення дзяржаўнай палітыкі ў царкоўным жыцці. Каб нейтралізаваць працэс русіфікацыі, што ішоў папярэдне, было дазволена ўжыванне беларускай мовы ў набажэнствах. Але ўвядзенне беларускай мовы з'явілася нетрывалым дзейнікам, бо несла пагрозу для польскай культуры. У 1924 г. міністральны дарадчык Мар'ян Бароўскі правёў дзве канферэнцыі ў Любліне і Беластоку адносна рэлігійнай палітыкі. Ён сцвярджаў,

што *альбо праваслаўе на тэрыторыі люблінскага ваяводства паланізуецца, прынамсі стане паланафільскім, альбо мусіць згінуць*[1].

Тым не менш, на хвалі беларусізацыі Царквы ў 1925 г. узнік першы беларускі праваслаўны часопіс "Праваслаўны беларус". У 1928 г. з ініяцыятывай стварэння беларускага прыходу ў Вільні выступіў Радаслаў Астроўскі. Дагэтуль там у Пятніцкай царкве вёў пропаведзі па-беларуску айцец А. Коўш. Шэраг дзяржаўных цыркуляраў рэгуляваў навучанне і прапаведванне ў беларускай мове. Аднак націск з боку дзяржавы даў свае вынікі. У 1935 г. адбыліся ўжо першыя праваслаўныя багаслужэнні на польскай мове ў Беластоку і ў Горадне.

Такім чынам, Праваслаўная Царква польскіх "крэсаў" Беларусі к 1939 г. стала інструментам дзяржаўнай палітыкі і часта выкарыстоўвалася як прылада паланізацыі. У № 3/80 штомесячніка "Novum" пісалі: *палітыка паланізацыі Праваслаўнай Царквы рэалізоўвалася паслядоўна і выніковa". Да 1933 г. толькі на Холмшчыне і Падляшшы 137 цэркваў былі ператвораны ў каталіцкія касцёлы, спаленыя, альбо разбураныя – 39, разабраныя – 55, замкнутыя і апячатаныя – 104*[2].

У даваеннай Польшчы ў адрозненне ад Касцёла, дзе працэс паланізацыі беларусаў-прыхаджан дасягнуў амаль 100 %, Праваслаўная Царква ўсё ж здолела захаваць этнічную адметнасць беларусаў. Гэта асабліва яскрава заўважылася пасля вайны. Стаў неабвержным факт: толькі Праваслаўная Царква з'явілася сімвалам беларушчыны на Беласточчыне. Ні школы, ні дзяржаўныя ўстановы не сталі асяродкамі захавання беларускай меншасці ў Польшчы. Імі стала Праваслаўная Царква! Магчыма, такая сітуацыя звязана з асаблівасцю Польшчы як каталіцкай дзяржавы. Маг-

---

[1] Давідзюк М. Справа беларусізацыі праваслаўнай царквы ў святле палітыкі польскіх дзяржаўных улад 1919–1939. Беларускі каляндар, Беласток, 1990.

[2] Hajduk M. Unia Brzeska, Białystok, 1996.

чыма, прыклад Касцёла як галоўнага інстытута польскай нацыі, які нават вышэй за дзяржаўныя структуры, быў для беларускай меншасці прыкладам узаемаадносін паміж нацыяй і Царквой... Магчыма. Але факт застаецца фактам: не унія стала для беларусаў Польшчы беларускай рэлігіяй, а праваслаўе.

*Пяты перыяд. Пачатак 1990-х гг. – наш час.*

З канца 1980-х гг. на ўсёй тэрыторыі магутнай таталітарнай дзяржавы СССР пачаўся рух у кірунку развіцця дэмакратыі, свабоды, збліжэння з Захадам і так званым "вольным светам" наагул. Гэты рух, як ведама, закончыўся развалам Савецкага Саюза і ўзнікненнем шэрагу незалежных дзяржаў, у тым ліку і Рэспублікі Беларусь. Зразумела, што прыняцце незалежнасці вымагала адпаведнай крытыкі імперскай палітыкі СССР – як спадкаемцы галоўнай імперскай дзяржавы XX ст. – Расіі. Амаль для ўсіх рэспублік гэтая палітыка была, па сутнасці, акупацыйнай, а далучэнне да Расіі (пасля рэвалюцыі) называлася не інакш, як анексіяй гэтай рэспублікі у склад імперыі. Так было і ў XVIII , і ў XIX, і ў XX стст. пасля Другой сусветнай вайны.

Разам з палітычнымі пераўтварэннямі пачаўся актыўны працэс рэлігійнага адраджэння. У Беларусі, якой уласціва шматканфесійнасць, гэты працэс пайшоў у некалькіх кірунках. Найперш – аднаўленне праваслаўя, якое з паноўнай веры на момант рэвалюцыі 1917 г., ператварылася ў ледзь тлеючы вугольчык з невялічкім лікам прыходаў. Там, дзе былі храмы, засталіся руіны, а дзе не руіны, дык склады ці нават стайні. З 360 тысяч праваслаўных святароў у 1917 г. да 1919 г. засталося толькі 40 тысяч. І гэта на пачатак страшэннага бальшавіцкага генацыду рэлігіі!

Рэшта храмаў і іншых рэлігійных святынь, што засталіся да нашых часоў, уяўлялі на пачатак 1990-х гг. сумную карціну. З дня аб'яшчэння Рэспублікі Беларусь 27 ліпеня 1991 г. пачалася рэстаўрацыя многіх занядбалых храмаў як праваслаўных, так каталіцкіх і пратэстанцкіх. Пачалі таксама ўтварацца

новыя прыходы, адчыняцца вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя рэлігійныя ўстановы, стала з'яўляцца рэлігійная літаратура і г.д.

І тут зноў усплыла уніяцкая ідэя. Хоць саміх вернікаў – уніятаў у Беларусі, у адрозненне ад Украіны, не засталося зусім. Аднак сама уніяцкая ідэя жыла ў асяроддзі адукаваных грамадзян і навукоўцаў Беларусі. І калі ў Заходняй Украіне пачаўся рух за адраджэнне грэка-каталіцызму, які здолеў захавацца там, нягледзячы на ўсе рэлігійныя пераследы (асабліва на Галіччыне), то ён (уніяцкі рух) перакінуўся і на Беларусь. Дапамагла і гістарычная памяць, і новая хваля літаратурных эксперыментаў на уніяцкія варыяцыі.

Чаму ж новаспечаныя прыхільнікі уніі так упарта ўчапіліся ў ідэю – "унія – гэта нацыянальная рэлігія беларусаў?" Для фанатычных прыхільнікаў гэтай ідэі нічога не значылі самыя неабвержныя факты з мінулага нашага грамадства і рэлігійнага жыцця, якія зусім не падцвярджалі гэтага тэзіса. "ЛІМ" яшчэ ў 1991 г. пачаў друкаваць шэраг матэрыялаў на тэму уніі і змясціў ужо згаданы намі вялікі артыкул Л. Лыча "Мова і рэлігія" (аж у пяці нумарах), прысвечаны доказу моднага ў той час меркаваня аб уніі як нацыянальнай рэлігіі беларусаў. Некаторыя іншыя газеты адраджэнцкай хвалі, такія, як "Свабода" ды "Навіны БНФ", таксама хорам спявалі пахвальбу уніі і ганьбілі праваслаўе. У гэтым хоры амаль не чуліся нешматлікія галасы ў абарону святога праваслаўя. Цудоўны артыкул айца С. Гардуна "Якая Царква была нацыянальнай" (ЛІМ, 14.02.92), ды мой "Ёсць такая Царква" (ЛІМ, 14.02.92) былі нямногімі публікацыямі на гэтую тэму, якія амаль не былі пачутыя. А мне да таго ж як лідэру палітычнай партыі (НДПБ), прыйшлося знесці шмат папрокаў і нажыць ворагаў. У той час, калі ўвагу ўсёй грамадскасці прыкоўвала самая магутная апазіцыйная палітычная сіла БНФ з яе лідэрам-католікам Зянонам Пазняком і намеснікам старшыні, прыхільнікам уніі Юрасём Хадыкам, выступаць супраць ідэі адраджэн-

ня уніі было вельмі цяжка. Гэта выклікала нараканні і падазронасць.

Услед за сталымі людзьмі за працу па адраджэнні беларускай нацыі і ўсталяванні дэмакратыі з вялікім запалам узялася наша моладзь. Былі і шэсці пад бел-чырвона-белымі сцягамі, і мітынгі, і сутычкі з міліцыянтамі. Зразумела, што паўстала і праблема з рэлігійным адраджэннем. Вось тут і спатрэбілася ідэя уніі, якая быццам бы і з'яўляецца нацыянальнай беларускай рэлігіяй. Дзякуючы такой моладзі, і ў першую чаргу Сяржуку Вітушку, неўзабаве ўзнік няблага аформлены часопіс «Унія», які выйшаў каля чатырох разоў.

У беларускіх уніятаў было з каго браць прыклад. Ва Украіне выйшла з падполля Украінская грэка-каталіцкая Царква (УГКП), якая з 1946 г. была пад забаронай. Ва Украіне савецкая перабудова і рух за незалежнасць вельмі моцна адбіліся на рэлігійным жыцці. У першую чаргу хваля пераўтварэнняў закранула Заходнюю Украіну. На 1990 г. там налічвалася 1,8 млн. уніятаў, колькасць якіх пачала імкліва расці за кошт пераходу ў унію праваслаўных. Гэта адбывалася як шляхам пераходу ў грэка-каталіцызм уніяцкіх святароў, якія аказаліся не здольнымі процістаяць хвалі палітычнага авантурызму, так і шляхам адкрыцця новых прыходаў і наварочвання да уніі дзейных праваслаўных цэркваў. Часта захоп храмаў заканчваўся крывавымі сутычкамі, былі ахвяры. Сітуацыя ў царкоўным жыцці гэтага перыяду там цалкам адлюстроўвала палітычныя перамены. І уніяцкі рух у вялікай ступені накіроўваўся палітычнымі патрэбамі пэўных асоб. Так, напрыклад, львоўскі часопіс “Вера бацьків” вылучаў як адну з найгалоўнейшых задач не хрысціянскую веру, а тое, што ён дапаможа “протиставитися неосталінистам та їхнім підспівачам». Рух за адраджэнне праваслаўя на Галіччыне лічыўся за “здраду на карысць маскалёў”, а тыя, хто за “вільну Україну”, павінны быць толькі грэка-католікамі. Такія спрошчаныя падыходы да рэлігійных пытанняў былі характэрны для

Заходняй Украіны пачатку 1990-х гг., але з прыняццем дзяржаўнай незалежнасці пачаўся больш сур'ёзны, хоць і вельмі складаны, рух за адраджэнне праваслаўя, і ў тым ліку за яго аўтакефалію.

Такая сітуацыя ва Украіне ў часы распаду СССР не выклікае вялікага здзіўлення. Бо уніяцтва там ніколі не знікала, а Галіцыя адзіная са славянскіх тэрыторый захавала яго і ў часы Аўстра-Венгрыі. І для многіх з іх грэка-каталіцызм сапраўды стаў верай бацькоў. А тое, што прыхільнікі уніі хацелі сляпа перанесці украінскую мадэль на ўмовы Беларусі, дзе мала хто мог наагул сказаць, што такое унія, – гэта не прынесла аніякае карысці для нашага рэлігійнага адраджэння. Унесла толькі элементы напружанасці ў грамадства і не спрыяла павелічэнню колькасці вернікаў ні ў адной з хрысціянскіх канфесій.

Такім чынам, у пачатку 1990-х гг. у Беларусі ў асяроддзі адраджэнцаў стала правілам "добрага тону" быць прыхільнікам уніі. Дайшло да таго, што Язэп Палубятка, аўтар артыкула ў "ЛІМе" пад назвай "Ці варта адраджаць уніяцтва?", быў вымушаны ледзь не прасіць прабачэння за свае погляды. Ён піша: "Шмат хто з адраджэнцаў, прачытаўшы назву артыкула, незадаволена хмыкне; зацятыя прыхільнікі беларускасці выкажуцца пра аўтара гэтых радкоў больш абразліва. Не мною прыдумана – кожнаму сваё. Я ведаю: выказваць сумненне наконт рэлігіі і беларускасці зараз усё роўна, што стаяць у спёку босымі нагамі ў прысаку: знізу будзе пячы агонь, зверху пражыць сонца". Выдатна сказана і амаль няма чаго дадаць.

Дык у чым прычына гэтай з'явы? Міф аб уніі аказаўся намнога прывабнейшы, чым капанне ў гістарычнай праўдзе і адстойванне праваслаўя, якое не мела аўтарытэту дзякуючы адпаведнай прапагандзе з прычын, адзначаных вышэй. Гэта, канечне, тычылася ў асноўным нецаркоўных людзей, бо для веруючых, тых, хто ходзіць у храмы, – іншай рэлігіі, чым існая, і што ўвайшла ў сэрцы без аніякае палітыкі, не магло быць. У народзе трывала ўсведамлялася толькі праваслаўе, ды ў меншай ступені каталіцызм.

Прычына “рэваншу” уніяцтва простая. Міф аб уніі, як нельга лепш падыйшоў да новай палітычнай сітуацыі. Гэта і станаўленне незалежнай беларускай дзяржавы і прыняцце ў 1990 г. Закона аб мовах, і іншыя крокі маладой беларускай дэмакратыі.

Схема пралінейная, “як граблі”: у Расіі мова дзяржаўная – руская, у Польшчы – польская, у Беларусі, адпаведна – беларуская. Прычым, беларуская мова нясе ў сабе рысы і польскай і рускай моў. Далей. У Польшчы галоўнае веравызнанне – каталіцызм, у Расіі – праваслаўе. А якое ў Беларусі? Па логіцы гэтых ланцужкоў пра мову так і напрошваецца: у Беларусі павінна быць таксама асобная нацыянальная рэлігія, і гэтай рэлігіяй павінна быць уніяцтва, ці грэка-каталіцызм (нібы каталіцызм, але з усходнім абрадам). Тое, што праваслаўных аўтакефальных краін акрамя Расіі больш за дзесятак, каталіцкіх дзяржаў яшчэ больш, неяк не ўплывала на жаданне мець сваю, адметную рэлігію.

Жаданне нацыянальнай адметнасці і ў рэлігійнай сферы набыло ў нас нейкі нездаровы характар спрашчэння і рэлігійнага фанатызму. Чым не формула: нацыянальная беларуская рэлігія – гэта праваслаўе плюс каталіцызм, падзяліць усё гэта папалам і атрымаем унію. Праўда, тое ж самае, ды яшчэ з большым правам, маглі б сказаць і ўкраінцы.

Між іншага, чалавецтва не раз аддавала перавагу казцы, а не рэаліям. Прыклад таму – ідэя камунізму, ідэя ўсеагульнай роўнасці і ўсеагульнага дабрабыту. І на працягу большай часткі XX ст. мы кіраваліся гэтымі “ўзвышанымі” ідэаламі, але дасягнулі толькі адмоўных вынікаў. Чалавеку ўласціва імкненне да прыгожанькай ілжы, а не да непрыемнай праўды.

Другой прычынай таго, што нават адукаваныя людзі, вядомыя навукоўцы трапілі ў палон уніяцкай ілюзіі, з’яўляецца іх канфесійная прыналежнасць. З аднаго боку, гэта асобы каталіцкага веравызнання, а з другога, выйшлі яны з атэістычнага асяроддзя, але каранямі, якія цягнуцца да каталіцкіх традыцый.

Аднак, нягледзячы на пэўную агітацыю і моду, у Беларусі рух па адраджэнні уніі не набыў вялікага размаху. І, мне здаецца, не набудзе. Бо не толькі з боку найвялікшай праваслаўнай канфесіі ён не мае падтрымкі. У наш час і Ватыкан глядзіць на унію як на непатрэбную форму рэлігійнага руху. Царкоўныя іерархі не стаяць з боку ад цяперашніх змен у асяроддзі вернікаў, якія, як я ўжо адзначаў, выкліканы вонкавымі цывільнымі сіламі і звязаны з палітычнымі пераўтварэннямі. Паміж Рыма-каталіцкай Царквой і Праваслаўнымі Цэрквамі ўжо не адзін год вядуцца размовы аб кантактах і паразуменні. Такія кантакты, скіраваныя на знаходжанне еднасці паміж Касцёлам і Праваслаўнай Царквой носяць назву экуменічных. Уніяцтва разглядаецца як метад яднання ў мінулым. На сумесных паседжаннях Каардынацыйнага камітэта змешанай камісіі па багаслоўскім дыялогу паміж Памеснымі Праваслаўнымі Цэрквамі і Рыма-каталіцкай Царквой, неаднаразова разглядалася уніяцкае пытанне, і вынікі былі зусім не на карысць уніі. Так, на паседжанні гэтага камітэта, што праходзіў у чэрвені 1991 г. у Арыцы (пад Рымам) адзначалася, што “ініцыятыва па аднаўленні зносін паміж Царквой Усходу і Царквой Захаду прывяло да парушэння адзінства Усходняй Царквы, пры гэтым не без умяшання не царкоўных сіл. Так нарадзіліся Усходнія Каталіцкія Цэрквы. Адсюль узнікла сітуацыя, якая стала крыніцай канфлікту і пакут перш за ўсё для праваслаўных, але таксама і для католікаў”. Камісія вынесла вердыкт: “Форма “місіянерскага апосталату”, якая завецца уніяцтвам, не можа больш дапускацца як метад і мадэль з прычыны новага тыпу ўзаемаўспрымання католікамі і праваслаўнымі надалей у іх адносінах да тайны Царквы”.

Як з боку Каталіцкай, так і Праваслаўнай Царквы стаўленне да уніі ў наш час не ёсць сур’ёзным. Бесперспектыўнасць грэка-каталіцызму даказана шматгадовай гісторыяй. Тым не менш, і ў наш час праблема паразумення паміж Касцёлам і Царквой не знікла.

Але гэтая праблема носіць ужо іншую назву – "экуменізм". Дарэчы, слова "экуменізм", якое з'явілася ў 1910 г., як і слова "кафалічнасць", азначае сабornасць – тэрмін, пра які мы гаварылі на пачатку нашай размовы. Дэвіз экуменізма ўзяты з Гефсіманскай малітвы Збавіцеля: "Няхай будуць усе адно" (Іаан, 17:21). Экуменічныя кантакты – гэта адна з галоўных рыс ўзаемаадносін паміж католікамі, праваслаўнымі і пратэстантамі ў наш бурлівы час. Адной з апошніх выніковых падзей экуменічнага руху было Баламандскае пагадненне 1993 г. (Ліван). У пагадненні сказана, што ранейшыя уніі з'яўляюцца "састарэлымі метадамі яднання" і не могуць быць прыкладамі на будучае. У эклезіялагічнай частцы Баламандскага пагаднення быў зроблены ўпор на яго новы погляд на праблему дыялогу паміж Цэрквамі: *... Царква Каталіцкая і Царква Праваслаўная ўзаемна прызнаюць адна адну ў якасці Цэркваў-Сясцёр ... экуменічныя намаганні Цэркваў-Сясцёр Усходу і Захаду, заснаваныя на дыялогу і на малітве, скіраваны да зносін дасканалых і ўсеагульных, якія не могуць быць ні паглынаннем, ні змяшэннем, а сустрэчай у ісціне і любві*. Падыход, заснаваны на метадах уніі, звязаны, па-сутнасці, з празелетызмам, цалкам адкідваецца ў пагадненні: "... не можа быць і гаворкі пра пажаданасць пераварочвання асоб з адной Царквы ў іншую з мэтай забеспячэння іх збаўлення".

Нягледзячы на даволі бяскрыўдныя фармулёўкі экуменічных пастулатаў, артадоксы праваслаўя варожа ставяцца да многіх палажэнняў як Баламандскага пагаднення, так і іншых. Аргументы вылучаюцца даволі гучныя – тыпу такога: "Няма сродка паміж ісцінай і ілжой". Пад "ісцінай" маецца на ўвазе праваслаўны пункт гледжання, а пад "ілжой" – каталіцкі. На маю ж думку, такім чынам пагадненне паміж Цэрквамі-Сёстрамі не знойдзеш. Дыялог павінен быць, і гэта цяпер зразумела ўсім разумным людзям.

Падсумоўваючы, з усёй упэўненасцю можна сказаць, што адраджэнне грэка-каталіцызму ў Рэспублі-

цы Беларусь у наш час абсалютна непатрэбная задача, гэта архіў гісторыі, вяртання да якога больш не можа быць. Аднак сумоўе, экуменічны дыялог паміж рознымі рэлігійнымі канфесіямі, безумоўна, павінен быць.

А адносна пытання аб нацыянальнай беларускай рэлігіі можна сказаць наступнае. Такой рэлігіяй можа стаць любая, існуючая ў нас. Гістарычна такой рэлігіяй, безумоўна, з'яўляецца праваслаўе. Аднак, для таго каб яно набыло нацыянальныя рысы, неабходна яго напоўніць нацыянальным зместам, як гэта зроблена ў іншых Цэрквах, напрыклад, у Расіі, Украіне, Грэцыі... Тое самае можна сказаць і аб каталіцызме (другой па велічыні канфесіі ў Беларусі), і аб беларускіх пратэстантах.

Але як увесці, прывіць нацыянальны змест Царкве? Як дасягнуць такога стану, калі на святое Праваслаўе не будзе нараканняў з боку адраджэнцкіх колаў, і яно сапраўды стане нацыянальным, як гэта было ў часы Скарыны?

Шлях, мне падаецца, павінен быць такім. Асноўных патрабаванняў павінна быць мінімум два.

Па-першае – моцная нацыянальная палітыка дзяржавы. Гэта аднаўленне Закона аб мовах 1990 г., дзе беларуская мова будзе прынятая як адзіная дзяржаўная мова ў Беларусі. Гэта самастойная замежная палітыка Беларусі з арыенцірам на развітыя дзяржавы Захаду, а не толькі на Расію. Незалежнасць Беларусі не на паперы, а ў дзеянні.

Па-другое – прыняцце аўтакефаліі Праваслаўнай Царквы ў Беларусі, але не "кустарным", некананічным шляхам, а праз скліканне Усяленскага Сабору прадстаўнікоў усіх аўтакефальных Праваслаўных Цэркваў. Прычым, гэтая другая ўмова мае сэнс – ды і наагул магчымая – толькі пасля здзяйснення першага патрабавання.

*Заключныя заўвагі*

Асноўны вывад гэтага раздзелу – у пацвярджэнні ключавой парадыгмы: унія – гэта пераходны этап

пераводу праваслаўных у каталікі. Гэта "схаваны" празелітызм, вытанчаны прыём каталіцкай місіі на Усходзе.

Беларусы – нашчадкі магутных Полацкага і Тураўскага княстваў. Беларусы складалі аснову Вялікага княства Літоўскага, пяць шостых усяго насельніцтва ВКЛ было славянскім (беларускім і ўкраінскім у сучасным разуменні). Праваслаўе ў ВКЛ несла ў сабе нацыянальныя рысы (напрыклад, скарынаўская Біблія была выдадзеная на старабеларускай мове). Як мы вышэй адзначалі, у нас была незалежная мітраполія. У тыя часы Праваслаўная Царква была самастойнай.

Каталіцкая прысутнасць у Беларусі заўважаецца даўно – разам з прыняццем хрысціянства, якое афіцыйна, як ведама, было прынятае ў візантыйскім варыянце. Аднак месіянеры з Нямеччыны, Польшчы няўхільна павялічвалі каталіцкі ўплыў, што асабліва стала відавочным пасля Крэўскай уніі. Масавы пераход у каталіцызм пачаўся з канца XVI ст. Праваслаўныя пачалі прымаць каталіцызм і унію. Вось тады і з'явілася ў Беларусі вялікая колькасць католікаў.

Але ператварэнне праваслаўных у католікаў было не самым трагічным ў тыя часы. Больш за тое, нехта можа сказаць: "Што ж тут благога? Можа, уніяцтва (каталіцызм) і правільней, можа, быць католікам-беларусам і лепей?"

Дык вось, не толькі мянялася вера беларусаў у тыя і пазнейшыя часы. Мянялася і нацыя. Так, беларусы станавіліся палякамі! Спрыяла гэтаму і тое, што пашпартнай сістэмы тады яшчэ не было. На землях Беларусі, якія ўваходзілі ў Рэч Паспалітую, на дзяржаўным роўні выкарыстоўвалася толькі польская мова. І нічога не перашкаджала ўчарашняму беларусу-католіку сёння стаць палякам. І гэты працэс актыўна пайшоў ужо ў яўнай, дакументальна пацверджанай форме ў канцы XIX–пачатку XX стст. Вось адкуль узялася ў Беларусі столькі палякаў! *Этнічных палякаў сярод гэтых цяперашніх калі не двух*

*мільёнаў палякаў з усяго насельніцтва Беларусі вельмі мала.* Калі пачынаўся перапіс, многім у розных прычын было выгадна запісацца палякам.

Працэс паланізацыі беларусаў ідзе бяскроўна, але далёка не бяскрыўдна. Ён працягвае аслабляць беларускую нацыю, якая за апошнія 100 гадоў колькасна не вырасла, а зменшылася. Успомнім, што ў XVI ст. ВКЛ было і па тэрыторыі і па насельніцтву вялізнай дзяржавай, большай за Маскоўскае Царства. І русінаў (беларусаў) было ў ВКЛ больш, чым “маскалёў” у Масковіі.

З іншага боку, у Беларусі ёсць небяспека пераходу беларусаў у “рускія”. Гэты працэс, менш небяспечны, чымсці першы – апалячванне беларусаў, але ён таксама мае месца. Русіфікацыя, канечне, ускосна звязана з прыналежнасцю беларусаў да праваслаўя, але ў многа большай ступені яна абумоўлена татальнай прапагандай імперскай, савецкай сістэмы, вынішчэннем беларускай мовы і наагул “шкурніцкай” палітыкай высокіх дзяржаўных чыноў. Руская Праваслаўная Царква сёння ёсць у Беларусі, а заўтра яна можа і не быць, заступіўшы месца незалежнай беларускай мітраполіі. Гэта абумоўлена тым, што праваслаўю ўласціва здольнасць да аўтакефаліі, і ў Беларусі яна, рана ці позна, здзейсніцца.

Пэўную небяспеку для станаўлення нацыянальнай беларускай культуры ўяўляе пратэстанцтва. Гэтая інтэрнацыянальная рэлігія найбольш небяспечная менавіта для нас – бо распаўсюджваецца ва ўмовах нізкай нацыянальнай сведамасці і лёгка паглынае маладыя душы. Яна вядзе да мондыялісцкага чалавека без нацыі і да духоўнага вынішчэння. Тым не менш, у Беларусі існуюць пратэстанцкія Цэрквы, дзе шануюць беларускую культуру і мову, акрамя таго, менавіта пратэстантамі быў зроблены першы пераклад Новага Запавета на беларускую мову.

Аднак вернемся да праваслаўя. Хацелася б адзначыць наступны факт. Праваслаўе – гэта не проста нейкі “апарат русіфікацыі”. Гэта найбагацейшая скарбніца духоўнасці, якая адкрытая не толькі

рускім, але і ўкраінцам, румынам, грэкам, і іншым народам, сярод якіх яно займае галоўнае становішча. Больш за тое, праваслаўе ўсё больш распаўсюджваецца ў развітых краінах свету, такіх як Англія, Францыя, ЗША, дзе духоўная культура традыцыйна ўзрастала на каталіцка-пратэстанцкіх традыцыях.

На наш погляд, захаваць у цяперашніх умовах беларускую нацыю здольна ў першую чаргу адноўленая вера продкаў – праваслаўе. Аднак і каталіцкая, і пратэстанцкія канфесіі маюць магутны ўплыў у сучаснай Беларусі, таму іх беларусізацыя павінна таксама займаць належнае месца. Больш за тое, як паказвае апошні дослед, часта менавіта яны даюць праваслаўным прыклад сапраўднага развязання беларускай праблемы ў Царкве.

Выкладзены погляд на беларускі шлях уніі быў мной развіты і канцэптуальна распрацаваны даволі даўно – недзе напрыканцы 90-х гг. XX ст. Тады уніяцкая праблема была даволі актуальнай. Перачытваючы тэкст, я ў цэлым не перамяніў сваіх поглядаў і таму пакінуў яго такім, як ён быў тады. Аднак адна акалічнасць усё ж вымагае ад мяне прасіць прабачэння ў прыхільнікаў уніі за сваю празмерную ўпэўненасць у канцэпцыі заганнасці ідэі уніі. Бо унія ў Беларусі мінулага (ад 1696 г. па 1839 г.) існавала больш за два стагоддзі і пакінула велізарны след у жыцці нашага народа, яго культуры, яго мастацтве і свядомасці.

Таму:

## 4. У абарону уніі

> Я не вельмі люблю словы “нацыянальная рэлігія”, рэлігія адна для ўсіх. Што да Грэка-Каталіцтва, то тут як Бог хоча, галоўнае, каб грэка-каталікі былі добрымі хрысціянамі, паказвалі сваім спосабам жыцця, дарэчы, як і іншыя канфесіі. Галоўнае, каб у нас была згода, каб мы зразумелі, што мы ўсе Дзеці Божыя.
>
> (З выказванняў ведамага уніяцкага святара а. Аляксандра Надсана. Пра Боскае і людское. Мінск. 2008.)

Як чытач мог пераканацца, сімпатыі аўтара не на баку уніятаў. Аднак тая акалічнасць, што ідэя уніі мае пэўную колькасць прыхільнікаў, галоўным чынам сярод нацыянальна свядамых беларусаў, вымагае больш паважлівага стаўлення да гэтай з'явы, і таму я наважыўся паспрабаваць зразумець іх выбар.

Акрамя таго, немагчыма, каб 243 гады афіцыйнага панавання грэка-каталіцтва ў нашай краіне не пакінулі адчувальнага ўздзеяння на ўвесь дзяржаўны арганізм, на культуру, звычаі, навуку, літаратуру і мастацтва, свядамасць, у рэшце рэшт, менталітэт беларусаў. Ацаніць ступень уплыву уніі на беларусаў і Беларусь — гэта задача не простая. Але ацаніць не так, як гэта робіцца ў сяброўскім хоры вынаходнікаў уніі як "нацыянальнай веры" беларусаў, у безлічы выданняў пракаталіцкай арыентацыі, у творах У. Арлова, С. Тарасава, Л. Лыча, С. Марозавай і іншых.

Што цікава — усе прыхільнікі "нацыянальнай рэлігіі" — уніі, як правіла, альбо атэісты, альбо "фармальна" веруючыя, г. зн. лічаць сябе вернікамі, але абсалютна не ўвацаркоўленыя людзі, яны не разумеюць сутнасці і духоўнага прызначэння рэлігіі ўвогуле. Для іх уніяцкая ідэя хутчэй мода, адзнака арыгінальнасці. Для сапраўды веруючых людзей грэкакаталіцызм — гэта выбар сэрца, і нацыянальныя пачуцці не граюць для іх вызначальнай ролі. І яскравым прыкладам ёсць жыццё і творчасць уніяцкага святара айца А. Надсана, якога я цытую ў якасці эпіграфа да гэтага артыкула.

Мяне будзе цікавіць цяпер толькі той станоўчы ўнёсак уніі ў тыя гады, калі яна ці не трыумфальна увайшла ў жыццё беларусаў пасля знакамітага Брэсцкага сабору 1596 г.

XVII–XVIII стст. — гады уніяцкага дамінавання ў сферах жыцця ВКЛ часоў Рэчы Паспалітай. Гэтыя ж стагоддзі ўвайшлі ў гісторыю як гады заняпаду. Пасля Залатога XVI стагоддзя гэты перыяд на дзіва мала пакінуў адметных помнікаў культуры ў галіне літаратуры і ў галінах мастацтва, архітэктуры, музыкі.

Існуе ўстойлівая думка, што помнікі былі, але іх знішчылі на працягу XIX–XX стст. у гады русіфікацыі, у жорсткай барацьбе з уніяй. Найбольш падрабязна пра згаданыя падзеі апавядае вядомы абаронца уніяцкай канцэпцыі гісторык Леанід Лыч. У ягоных артыкулах (артыкулы ў газеце "ЛіМ", кнізе "История имперских отношений") не без поспеху фармуецца ідэя уніі як нацыянальнай рэлігіі: "З мэтай узмацнення сваіх адрозненняў ад праваслаўя маскоўскага кшталту і ад Рымска-каталіцкай Царквы, уніяцтва цалкам лагічна прыйшло да ідэі замены царкоўнаславянской і лацінскай моў у богаслужэнні на мясцовую (старабеларускую) мову. Яна была не толькі роднай для большасці насельніцтва, але і дзяржаўным на ўсёй тэрыторыі ВКЛ." Гісторык павінен быў даць хоць адзін факт у пацвярджэнне гэтага тэзісу. Але яго няма і не магло быць. Бо ў аснове ідэі уніі было захаванне ўсходняга абраду, а гэта значыць абавязковае богаслужэнне на царкоўнаславянскай мове. Адхіленне да гэтага правіла было б вялікай ерассю. І такіх адхілленняў не было. Не захавалася ніводнай богаслужбовай кнігі на беларускай мове таму, што іх і не было!

Але Л. Лыч з зайздроснай упэўненасцю піша: "Рускія епіскапы і святары пакінулі ганебны след у гісторыі як знішчальнікі каштоўнасцей беларускай культуры... масавы маштаб гэтае варварства набыло пасля 1839 г. У першую чаргу гаворка тычыцца спальвання кніг. Між тым, акрамя службоўнікаў, на беларускай мове друкаваліся арыгінальныя тэалагічныя і мастацкія творы, у тым ліку вершаваныя творы. Усё гэта, за рэдкім выключэннем, незваротна загінула ў агні".

Вось гэты "гістарычны факт" і перадрукоўваецца з адной крыніцы ў другую, пераплывае ад аднаго аўтара да другога, фармуючы пэўны вобраз ворага – рускага святара і няшчаснай пакутніцы уніі. А дзе ж праўда?

Праўда зусім іншая – менавіта унія стала шчытом, заслонай ад акаталічвання беларускага народа.

Яшчэ няведама, ці захавалася б беларуская нацыя, каб увесь народ, гледзячы на свайго прашчура князя Ягайлу, таксама прыняў "лацінскую веру".

На *гэтую акалічнасць* мне і хацелася б звярнуць увагу чытачоў.

Трэба адзначыць, што на момант прыняцця уніі Брэсцкім саборам яшчэ жывыя былі ідэі рэфармацыі і контррэфармацыі, адметнасцю якіх было выкарыстанне нацыянальных моў. У ВКЛ у XVI ст. статус беларускай мовы падняўся на неймаверную вышыню. Толькі слабое валоданне беларускай мовай прымушала прапаведнікаў карыстацца польскай мовай. Калі б было інакш, контррэфармацыйная прапаганда езуітаў і іх асветная дзейнасць адбывалася б не на польскай мове, а на беларускай. Аб гэтым сведчыць, у прыватнасці, выдадзены ў Вільні езуітамі кірылічным шрыфтам каталіцкі "Катэхізм".

У выніку Люблінскай уніі беларуская эліта вельмі хутка прыняла польскую культуру і пачала актыўна акаталічвацца. Аднак самым адметным было тое, што падобнай трансфармацыі не адбылося з асноўнай масай насельніцтва ВКЛ, з простым народам.

Тэарэтычна найлепшым крокам у дзяржаўным будаўніцтве новай дзяржавы Рэчы Паспалітай было б пэўнае акаталічванне ўсёй дзяржавы, і не істотна – ці ў выніку добраахвотнага пераходу праваслаўных у каталікі, ці прымусова. Такі крок садзейнічаў бы ідэйнай кансалідацыі насельніцтва, у прыватнасці, прадухіліў бы адчужэнне эліты ад ніжэйшых слаёў грамадства.

Але атрымалася інакш. Выявілася моц і духоўная глыбіня праваслаўя як сапраўднай веры. Традыцыі ісіхазма і наагул сам панятак "веры бацькоў" былі настолькі моцнымі, што беларусы не прынялі каталіцызму, ці, як тады казалі, не прынялі лацінства.

Праваслаўная Царква ў ВКЛ адчувала непажаданую магчымасць лацінізацыі. Гэтая пагроза стала рэальнасцю ў XVII–XVIII стст., бо іерархі Праваслаўнай Царквы страцілі ранейшых магутных апеку-

ноў, такіх, як князі Астрожскія, і магла разлічваць ужо толькі на ўласныя сілы, якія былі недастатковыя для супрацьстаяння каталіцкаму духавенству. Імаверна, пад яго ўплывам з часам і грамадская эліта далучылася б да прапаганды лацінізацыі. Аднак такую магчымасць своечасова прадухіліла царкоўная унія, заключаная ў Брэсце ў 1596 г. стараннямі значнай колькасці праваслаўных іерархаў ВКЛ. Вось у гэтым і заключаецца другі бок медаля уніяцкай праблемы, разгледжанай намі ў папярэднім раздзеле. Калі не засяроджвацца на няіснай моўнай праблеме, паднятай у сувязі з прыняццем уніі, і выкінуць надуманы тэзіс аб уніі як нацыянальнай веры беларусаў, то выразна выступае станоўчы бок уніі *як абаронцы веры продкаў* – праваслаўнай веры – ад наступу лацінства і, *тым самым, захавання самабытнасці беларусаў як нацыі*.

Колькасць паслядоўнікаў новай веры спачатку была нязначнай, але паступова яна павялічвалася. Паварот да уніі ў настроях шляхты адбыўся пасля 1630-х гг. Асабліва спрыялі ўмацаванню Уніяцкай Царквы рэформы мітрапаліта Язэпа Руцкага. А на мяжы XVII–XVIII стст. яна стала самай масавай і пачала выконваць ролю традыцыйнага царкоўнага інстытута.

І таму зразумела, што да часу новага палітычнага павароту падзей – падзелаў Рэчы Паспалітай, ужо добра была бачная "закаранеласць" народа ва уніяцкай веры. Аднак, на мой погляд, самым важным у гэтай сітуацыі было тое, што унія, па-сутнасці, захавала амаль нязменным усходні абрад у богаслужэннях, г.зн. яго праваслаўную аснову. Тым самым яна захавала аснову нацыі – старажытную веру і разам з ёй мову народа, якая, як сведчаць, філолагі, утрымала галоўныя рысы нават крывіцкіх гаворак.

Такім чынам, унія сталася важным фактарам захавання царкоўнай праваслаўнай абраднасці, што гарантавалася не толькі Брэсцкім пагадненнем, але і пазнейшымі папскімі буламі, якія забаранялі пе-

раводзіць уніяцкіх вернікаў у лацінскі абрад без папярэдняга дазволу апостальскай сталіцы. С. Марозава, ведамая сваёй прыхільнасцю да ідэі уніі, адзначае, што рыма-каталіцкае духавенства не магло не лічыцца з папскімі загадамі, і спробы перацягвання уніятаў у лацінскі абрад часта выклікалі скаргі уніяцкіх іерархаў. У выніку часта справы даходзілі да судовых працэсаў. Такім чынам, нягледзячы на розныя непаслядоўнасці, Уніяцкая Царква была да падзелаў Рэчы Паспалітай важным бар'ерам, які стрымліваў масавую лацінізацыю сялянства і мяшчанства.

Адам Станкевіч піша: *І так царкоўная унія ў першай палавіне перыяду заняпаду, у перыяд польскі, была злучвом беларускай нацыянальнасці. Праўда, тое, чаго так беларусы ў сваім часе баяліся, – польскасць і лацінства насядала моцна на унію, але яна спачатку з гэтым усім баролася з добрым вынікам. Пасля ж пачала здавацца. Унія ўжо ў XVIII ст. была сільна спаланізаваная і злацінізаваная. Але і цяпер Уніяцкая Царква прынцыпова не пераставала быць гэнай апорай і сродкам яднання беларускай нацыянальнасці.*

Такім чынам, факт збліжэння уніі з Касцёлам і яе моцная паланізацыя ў канцы XVIII ст., безумоўна, мелі месца. Але наколькі небяспечны быў гэты працэс і наколькі рэальнай была магчымасць поўнага зліцця уніі з Касцёлам?

Насамрэч унія адчайна супраціўлялася наступу рыма-каталіцызму і ўсяляк імкнулася захоўваць сваю грэчаскую аснову ў абрадах. Прычым супраціў гэтаму працэсу ішоў і з боку Касцёла. І не толькі ў першыя гады існавання уніі, а і значна пазней. Напрыклад, у 1755 г. папам рымскім была прынятая энцыкліка "Allatae sunt", у якой адзначалася, што Рым не мае намеру нанесці шкоду грэка-каталіцкаму абраду. Л. Вульф адзначае, што *уніятаў нельга было проста зацягнуць у лацінскі абрад, і дэзарынтацыя уніята на рымска-каталіцкай імшы адзначалася нават праз два стагоддзі.*

У выніку да падзелаў Рэчы Паспалітай прагрэс у бок поўнай лацінізацыі насельніцтва быў даволі сціплы. Ю. Туронак адзначае, што на пачатку 80-х гадоў XVIII ст. агульная колькасць католікаў лацінскага абраду ў Беларусі складала 430–440 тысяч, г.зн. каля 15 % ад колькасці ўсіх жыхароў, прычым 84 % каталіцкага насельніцтва канцэнтравалася ў паўночна-заходніх раёнах, і толькі 16 % на астатніх абшарах Беларусі. У той час каля 70 % усіх жыхароў лічыліся уніятамі і 6 % праваслаўнымі.

З мэтай апраўдання факту ўключэння беларускай тэрыторыі ў склад Расійскай Імперыі афіцыйная руская гістарыяграфія распрацавала канцэпцыю, згодна з якой апалячваннем і акаталічваннем беларусаў займалася ў Рэчы Паспалітай не толькі Каталіцкая Царква, але і Уніяцкая. Але гэты тэзіс быў аспрэчаны нават у асяроддзі самой рускай акадэмічнай навукі. Так, вядомы навуковец А. Кіркор у сваёй "Живописной России» выказаў процілеглы пункт гледжання. Ён лічыў, што Уніяцкая Царква *аслабляла каталіцкую агрэсію, захоўвала беларускую мову і культуру*.

І з гэтым трэба пагадзіцца. Роля уніі, як захавальніцы беларускай асновы нашага народа, нягледзячы на двухсотгадовае панаванне пальшчызны ў Рэчы Паспалітай, а пазней і на землях, далучаных да Расійскай Імперыі, безумоўна, высокая.

Пасля далучэння Беларусі да Расійскай Імперыі адбылася трансфармацыя канфесійнай структуры яе жыхароў. Вырашальную ролю ў гэты перыяд адыграў распад Уніяцкай Царквы.

Больш чым за два стагоддзі існавання унія так і не замацавалася ў каталіцкай Польшчы як цалкам незалежная, самастойная структура. Як піша Лары Вульф, *у канцы XVIII ст. знойдзецца багата сведчанняў не пра абсалютную самаадданасць уніятаў сваёй Царкве на манер ранніх хрысціянскіх пакутнікаў, а хутчэй пра глыбокі крызіс ідэнтычнасці, што адлюстроўвала "раз'яднанне ў уніі*. (Уніяцкая царква і падзелы Польшчы: самазахаваньне канфесіі

ў век асвечанага абсалютызму // ARCHE. 7, 8 – 2008. С. 699).

Калі уніяты аказаліся пад уладай Расійскай Імперыі, дык раптам даведаліся, што яны, па сутнасці, каталікі, хоць і ўсходняга абраду. І гэты факт нанёс моцны удар па іх самасведамасці, што раней не мела праблем з ідэнтычнасцю.

У XVII ст. уніяты былі абароненыя папскімі загадамі і асабліва дзякуючы дэкларацыі "Прапаганда веры". Але ўжо праз некаторы час гэтая роўнасць была ліквідавана, і уніяцкія епіскапы аказаліся духоўнымі асобамі другога гатунку ў параўнанні з каталіцкімі. Імаверна гэта і прывяло да таго, што унія паступова стала набываць статус "мужыцкай веры", веры ў нечым ніжэйшай за каталіцкую. Цікава, што ў Галіччыне імператрыца Тэрэза пасля падзелу Польшчы ў 1774 г. афіцыйна загадала каталіцкаму духавенству прывіваць дух любві і павагі да уніятаў. Гэтыя крокі прывялі да далёка ідучых вынікаў. Менавіта ў Галіцыі склаліся моцныя уніяцкія традыцыі, якія захаваліся некранутымі да нашага часу. Можна сказаць, што менавіта там украінскія уніяты маюць толькі такую ідэнтыфікацыю і ніякую іншую. Не праваслаўную і не каталіцкую, што мае месца ва ўсіх іншых рэгіёнах былой Рэчы Паспалітай – як ва Украіне, так і ў Беларусі.

Знакаміты праваслаўны святар Георгі Каніскі шмат гадоў самаадданна працаваў на ніве служэння Хрысту ў Магілёўскай епархіі і добра ведаў стан сваёй паствы. Ён даводзіў, што уніяты захоўвалі грэка-рускую веру ў сваіх сэрцах і вельмі часта патаемна наведвалі праваслаўныя храмы. Аднак, як адзначае А. Станкевіч, беларусы сутыкнуліся ўжо з новым праваслаўем, якога не было ў мінулым: *Трэба памятаваць, што цяпер ужо было не тое праваслаўе, што існавала ў Беларусі ад раздзелу цэркваў (1054) аж да Берасцейскай царкоўнай уніі, – тады праваслаўе было вольным і незалежным, а гэтым самым і беларускім. Беларускім фактычна было праваслаўе, якое*

*не прыстала да уніі – і якое ўсцяж заставалася ў Беларусі, хоць у нязначным ліку, існаваць вобак уніі.*

З пункту гледжання фармавання нацыянальнай сведамасці беларусаў распад уніі меў выключнае значэнне: па-першае, ён датычыў большай часткі народа, па-другое, працягваўся некалькі дзесяцігоддзяў. Вось тут, на гэтым новым фоне сумеснага быцця ў новай дзяржаве – Расійскай Імперыі – і выявілася, што насельніцтва далучаных заходніх зямель Рэчы Паспалітай – не польскае і не рускае. А якое? Адказ не адразу, але быў знойдзены.

Так была адкрытая новая нацыя – беларусы.

І аб тым, што унія даволі хутка замянілася праваслаўем, не трэба шкадаваць. Унія была той саломінкай, што не дала загінуць і нацыі, і бацькоўскай праваслаўнай веры.

## 5. Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква

(З гісторыі Праваслаўнай Царквы ў Беларусі)

**Аўтакефалія** азначае самастойнасць Праваслаўнай Царквы як інстытута. "Аўта" – азначае "сам", "кефале" – "галава". Сутнасць аўтакефаліі закладзена ў 34-м апостальскім правіле: "Епіскапы кожнага народа павінны ведаць першага сярод іх, і прызнаваць яго як галаву і нічога не рабіць без яго... Але і першы, каб нічога не рабіў без іншых епіскапаў". У любым выпадку, галоўнай умовай аўтакефаліі лічыцца прызнанне яе Канстанцінопальскім патрыярхам. Другой важнай умовай лічыцца прызнанне незалежнасці новай Царквы той Царквой, ад якой яна аддзялілася. Гэта шлях кананічнага прызнання аўтакефаліі. Аднак на практыцы большасць праваслаўных цэркваў з вялікімі цяжкасцямі і не адразу здабывалі сабе аўтакефалію. Так, напрыклад, Румынская Царква чакала прызнання аўтакефаліі 30 гадоў, Эладская Царква – 27 гадоў, а Руская Царква – аж 141 год (з 1448 да 1589 гг.).

У свеце існуе 15 кананічна прызнаных аўтакефальных Праваслаўных Цэркваў. Ёсць таксама шэраг Цэркваў, якія не прайшлі ўсёй працэдуры кананічнага прызнання, але вядуць сваю дзейнасць самастойна і дабіваюцца кананічнасці. Сярод такіх – Украінская Аўтакефальная Праваслаўная Царква Кіеўскага патрыярхату, Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква (у замежжы) і іншыя.

Не трэба бачыць у няпростым працэсе пераводу якой-небудзь Царквы на рэйкі аўтакефаліі нейкія страшэнныя вынікі ці схізму, як гэта даводзіцца часта чуць. Нават пры ўсталяванні дзяржаўнай незалежнасці далёка не адразу ўсталёўвалася царкоўная незалежнасць. Мне не вельмі падабаецца тая непрыхаваная варожасць і валтузня, якая распальваецца паміж дзвюма Праваслаўнымі Цэрквамі Украіны – Маскоўскага патрыярхату і Кіеўскага. Усё вырашыць час.

Цікава, што ў межах адной дзяржавы можа быць некалькі аўтакефальных Цэркваў (у СССР была Руская і Грузінскай Цэрквы). Апрача таго, адна і тая ж нацыя можа з нейкіх абставінаў утварыць некалькі аўтакефальных Цэркваў. Прыкладам з'яўляюцца грэкі, што маюць тры аўтакефаліі: Канстанцінопальскую, Эладскую і Кіпрскую Цэрквы.

У 1924 г. была прызнаная аўтакефалія Праваслаўнай Царквы ў Польшчы. Нам цікава ў гэтым факце не толькі тое, што Польская Царква вельмі хутка дабілася аўтакефаліі (да 1917 г. Праваслаўная Царква польскіх і заходне-беларускіх тэрыторый уваходзіла ў склад Расійскай Праваслаўнай Царквы). Цікавым з'яўляецца сам тэкст дакумента кананічнага права, які быў прыняты ў сувязі з гэтай падзеяй. Ён называецца "патрыяршы і сінадальна-кананічны томас (акт) аб прызнанні Праваслаўнай Царквы ў Польшчы Царквой аўтакефальнай". Там, у прыватнасці, сказана: *Прыняць, што правы, якія тычацца царкоўных справаў, а асабліва справаў парафіяў, павінны адпавядаць палітычным і адміністрацыйным пераменам, а з іншага боку, перад патрабаваннямі*

*кананічнага абавязку, што накладзены на Найсвяцейшы Усяленскі Прастол, дбаць аб Праваслаўных Цэрквах, якія знаходзяцца ў патрэбе, разгледзеўшы таксама факт, з якім згодна і гісторыя (бо ж напісана, што першае аддзяленне Нашага Прастолу Кіеўскай мітраполіі і залежных ад яе праваслаўных мітраполіяў Літвы і Польшчы, а роўным чынам далучэнне іх да Святой Маскоўскай Царквы адбылося не паводле ўстаноўленых кананічных правілаў).*

Гэты томас прызнаны ўсімі усходнімі патрыярхамі аўтакефальных Цэркваў і стаў законам Усяленскай Царквы. Таму наступныя радкі заслугоўваюць самай пільнай увагі:

*Томас афіцыйна не прызнае правамоцнасць далучэння ў 1686 годзе да Маскоўскай Царквы Кіеўскай мітраполіі і, як сказана, залежных ад яе праваслаўных мітраполіяў Літвы і Польшчы, а ў цяперашні час падобным чынам можа быць прызнана паўнапраўная аўтакефалія Праваслаўных Цэркваў Украіны, Беларусі і краінаў Балтыі.*

У гісторыі Беларускай Праваслаўнай Царквы былі перыяды залежнасці яе ад Канстанцінопаля, існавалі часы яе поўнай незалежнасці, аўтакефальнага існавання, а апошнія два стагоддзі яна ўваходзіць у склад Маскоўскага Патрыярхату і цяпер з'яўляецца Экзархатам Рускай Праваслаўнай Царквы.

Пачаткам барацьбы за незалежнасць сваёй Царквы беларускі народ можа лічыць узнікненне Вялікага княства Літоўскага, галоўным складнікам якога былі беларускія землі. Гэта, як ведама, адносіцца да 1240 г., калі Міндоўг заснаваў у Навагрудку новую дзяржаву – ВКЛ. У гэты ж год Кіеў – сталіца Кіеўскіх мітрапалітаў – быў амаль дашчэнту спалены татара-манголамі. Царкоўнае жыццё на чале з мітрапалітамі перамясцілася ў іншыя месцы – на поўнач (Уладзіміра-Суздальскія землі) і на паўночны захад (ВКЛ). З гэтых часоў і пачынаецца незалежнае існаванне двух галоўных плыняў праваслаўнага хрысціянства на ўсходзе.

Час усталявання Літоўскай (беларускай) мітраполіі

дакладна невядомы, але паводле некаторых крыніц гэта 1291 г., калі быў пастаўлены асобны мітрапаліт, імя якога засталося невядомым. Спіс беларускіх мітрапалітаў пачынаецца з 1315 г. Першым мітрапалітам у ВКЛ быў грэк Тэафіл. Мітрапаліт Тэагност (1328–1353) перанёс кафедру ў Маскву. Мітрапаліты Тэагност і затым Аляксей (1353–1378), знаходзячыся ў Маскве, вялі сваю дзейнасць на карысць Масквы, што зусім не здавальняла праваслаўных іерархаў ВКЛ.

Ды і Канстанцінопалю нявыгадна было мець на ўсходзе дзве мітраполіі – у Масковіі і ў Вялікім княстве Літоўскім. Таму патрыяршы прастол імкнуўся развіваць на ўсходзе толькі адну мітраполію, якая б кіравала царкоўным жыццём дзвюх дзяржаў. Канстанцінопальскі сабор у 1353 г. асобнай пастановай прыняў рашэнне аб тым, што Руская мітраполія не павінна дзяліцца, а мітрапаліты на Русь павінны прызначацца з грэкаў.

Вялікі князь ВКЛ Альгерд не падпарадкаваўся гэтаму рашэнню і паставіў на Кіеўскі мітрапалічы пасад з дапамогай Тырнаўскага патрыярхату ў Балгарыі асобнага літоўскага мітрапаліта Хведарыта – нягледзячы на супраціў Канстанцінопаля.

Аднак гэтая спроба не ўдалася, і вялікі князь Альгерд дабіўся ад Канстанцінопальскага патрыярха прызначэння асобнага мітрапаліта. Ім стаў мітрапаліт Раман (1354–1362), рэзідэнцыя якога размяшчалася ў Навагрудку. Для Масквы быў таксама прызначаны мітрапаліт – Аляксей. Паміж абодзвума мірапалітамі пачалася барацьба за Кіеўскую мітраполію і тытул "кіеўскі". Пасля смерці мітрапаліта Рамана з ініцыятывы Альгерда ў 1375 г. у Канстанцінопалі адбылася інтранізацыя мітрапаліта Літоўскага Кіпрыяна. Але пасля смерці Альгерда Кіпрыян пераехаў у Маскву, дзе быў дабра прыняты. І да 1406 г. быў адзіным галавою Царквы "ўсяе Русі".

Праваслаўная Царква ў Вялікім княстве Літоўскім зноў апынулася пад варожым кіраўніцтвам і перад старой праблемай – прызначэння свайго мітрапаліта.

**Першая аўтакефалія.** Такім чынам, з 1390 па 1406 г. ВКЛ было без свайго мітрапаліта. У 1408 г. Канстанцінопальскі патрыярх прыслаў грэка Фоцця з тытулам мірапаліта "Кіеўскага і ўсяе Русі" і даручыў яму аб'яднаць усе епархіі ВКЛ. Але, мабыць, такое становішча не зусім задавальняла Вялікага князя Вітаўта, бо прызначаныя Канстанцінопалем мітрапаліты імкнуліся кіраваць усёй усходняй праваслаўнай тэрыторыяй – і Маскоўскай Руссю, і Руссю Літоўскай (ВКЛ). Гэтая задача часта аказвалася невырашальнай і прыводзіла, як пры Альгердзе, да безуладдзя. І таму ў 1415 г. Вітаўт склікаў у Навагрудку свой Праваслаўны Сабор, на якім быў абраны пляменнік мітрапаліта Кіпрыяна балгарын Рыгор Цамблак. Канстанцінопальскі патрыярх спачатку быў незадаволены такім зваротам падзей, сабор быў скліканы не кананічным чынам, але потым быў вымушаны пагадзіцца. З Кіева ў Навагрудак была перанесена мітрапалічая кафедра.

Сабор 1415 г. быў першым саборным голасам нашай Беларускай Праваслаўнай Царквы, на якім была ўсталявана свая мітраполія. Значнасць Сабору ў тым, што зыходзячы з канонаў праваслаўя і доследу іншых Цэркваў, на ім былі сфармуляваны ***прававыя асновы аўтакефаліі.***

У пастанове Сабору сказана:

*Яко же прежде нас крещении Болгаре и нам сродницы створиша своими епископы поставльша собе пръвесвятителя. Такоже и Сербского языка епископи рассудише, яко по правилам есть и по апостальскому уставу створиша собе епископы пръвосветителя даже до днесь есть, посьпешествуюшу Богу, пръвосвятитель в Сербской земле, имея многи епископы под собою. Таже не толика есть Серьбская земля, елика есть Русская... И что глаголем о Болгарех, или о Сербех? От святых апостол тако уставлено бысть. Равно на всех епископех православных благодать действует Святаго Духа: ибо апостоли от Господа поставлены быша, они же иных поста-*

*виши, и паки они других и тако благодать Святаго Духа даже и до нас смиренных дойде: и имамы власть яко апостольстiи ученицы многими испытаньми и в прошеньи и сходитися и поставляти своему отечеству пастыря достойна...*

Рыгор Цамблак у сапраўднасці ачоліў не аспрэчаную Масквой Кіеўскую мітраполію, якая набыла статус Літоўскай з пасадам спачатку ў Навагрудку, а потым у Вільні.

Цамблак дбайна правіў Літоўскай мітраполіяй, праводзячы палітыку, незалежную ні ад Масквы, ні ад Канстанцінопаля, пакуль вялікі князь Вітаўт не паслаў яго ў 1418 г. на унійны Сабор у Канстанцы, каб здабыць падтрыманне на сваю каранацыю. Дэлегацыя, якую ачольваў мітрапаліт Грыгорый, заявіла, што "прыбылі на загад іхняга князя ", але падпарадкоўвацца князю не жадаюць" і ніякіх дамоў не падпісала.

Пасля смерці Цамблака ў 1420 г. Літоўская мітраполія засталася зноў без мітрапаліта. Праваслаўныя Царква ў ВКЛ падпала пад уладу Маскоўскага мітрапаліта Фоція, і такое становішча цягнулася каля 10 гадоў. Цвёрды абаронца праваслаўя, вялікі князь Свідрыгайла, пасля смерці Фоція ў 1931 г. дамогся ад Канстанцінопаля пастаўлення на мітрапалічы пасад ВКЛ смаленскага епіскапа Герасіма (1433 г.). Аднак пасля смерці Вітаўта ягоны заступнік вялікі князь Свідрыгайла западозрыў Герасіма ў сувязях з Масковіяй, і ён быў у 1435 г. пакараны спаленнем. І зноў аж 21 год (да 1458 г.) літоўская кафедра была не занятая.

Наступныя падзеі разварочваліся ўжо ў сувязі з ідэяй уніі. Звычайна унія згадваецца з царкоўным жыццём Украіны – Беларусі ў XV–XVI стст., і лічыцца, што ў ВКЛ выспела гэтая ідэя, якая потым і ажыццявілася. Але факты сведчаць пра іншае. У XV ст. прыхільнасць да уніі выказаў Маскоўскі патрыярх Ізыдор, які падпісаў уніяцкія дакументы ў Фларэнцыі ў 1439 г. Аднак у Маскве "падпісанта" не прынялі, і ён быў вымушаны ўцякаць адтуль у

Літву. У 1448 г. заміж яго быў абраны на мітрапаліта разанскі епіскап Іона, які, аднак, не паехаў па благаславенне да Канстанцінопальскага патрыярха. Як піша гісторык Царквы Н. М. Нікольскі, на саборы 1448 г. "аказаліся законнікі" – епіскап Пафнуці і баярын Васіль Кутузаў, якія заявілі, што без дазволу патрыярха нельга абіраць мітрапаліта. Але князь Васіль II паглядзеў на іх заяву "як на крамолу", закаваў абодвух у кайданы, а Іона быў абраны па "волі вялікага спадара, вялікага князя Васіля Васільевіча". Як бачым, у рускай палітыцы традыцыі непавагі да закону маюць вялікія традыцыі, што прынесла рускім не мала сумных і трагічных хвілін – сярод якіх найбольш трагічным стала так званая Кастрычніцкая рэвалюцыя, адкінуўшая Расію больш як на 70 гадоў у стан бязбожнага нялюдскага камунізму.

Максім Грэк праз 75 гадоў пасля гэтых падзей адзначаў, што ўсталяваны парадак у Маскоўскай дзяржаве "незаконны і зроблены па гордасці".

Нягледзячы на ўсю "незаконннасць", Іона стаў маскоўскім мітрапалітам, і з гэтага часу была ўстаноўлена некананічная аўтакефалія. Непрызнаная аўтакефалія Маскоўскай Царквы працягвалася аж да 1589 г., калі ўрэшце Канстацінопаль даў такі "дабро" Маскоўскай Аўтакефальнай Царкве.

Мітрапаліт Іона імкнуўся пашырыць сваю ўладу і на тэрыторыю Вялікага княства Літоўскага. Ён напісаў пасланне "літоўска-галіцкаму" людству, аднак гэта вынікаў не дало.

Тым часам у Беларусі падзеі разгортваліся наступным чынам. Пасля 21-гадовага царкоўнага безуладдзя, у 1458 г. Канстанцінопальскі патрыярх праслаў у Навагрудак мітрапаліта-уніята Рыгора Баўгарына (бо сам патрыярх падпаў пад гэтую крамолу). Р. Булгарын атрымаў тытул "Кіеўскі, Літоўскі і ўсяе Русі". Але яго місія па навяртанню ВКЛ ва унію не дала вынікаў, Рыгор Баўгарын вярнуўся ў праваслаўе і ў 1473 г. быў зацверджаны праваслаўным Канстанцінопальскім патрыярхам Дзіянісам.

У адказ на прызначэнне Рыгора Баўгарына мітрапалітам у ВКЛ маскоўскі мітрапаліт Іона склікаў Сабор епіскапаў, якія засталіся пад яго ўладай, і пасля гэтага і замацавалася афіцыйная назва ягонай мітраполіі – "Маскоўская Царква".

І з гэтага ж часу на Літве (Беларусі) і Украіне паўтара стагоддзя дзейнічала незалежная Літоўская, а ў сёняшнім значэнні – Беларуская Праваслаўная Царква. Мітрапалічая кафедра ВКЛ бесперапынна дзейнічала ў Вільні з 1473 г. аж да 1596 г. Кафедру за гэты час змяніла 15 мітрапалітаў, якія праводзілі незалежную ад Масквы праваслаўную палітыку. Хоць у каналічным сэнсе яна і не атрымала статус аўтакефаліі, але яна была цалкам незалежнай – аўтаномнай.

Як відаць з прыведзенай ніжэй кароткай храналогіі падзей, вельмі цярністы быў шлях Беларускай Праваслаўнай Царквы ў тыя гады. Пасля смерці мітрапаліта Рыгора ў 1473 г. вялікі князь Казімір Ягайлавіч прызначыў на мітрапалічы пасад смаленскага епіскапа Місаіла (Пясіруча), але Канстанцінопаль не зацвердзіў яго, і больш за тое – на ягонае месца паставіў манаха Спірыдона, празванага Сатаной.

Спрэчка паміж вялікім князем ВКЛ і Канстанцінопалем была вырашана ўрэшце праз наступны кампраміс – кандыдата на мітрапаліта павінен быў выбіраць краёвы Сабор, а зацвярджаць – Канстанцінопальскі патрыярхат.

Так былі выбраны: епіскап Сямён (1480–1488), Іона (1488–1494), Макар (1494–1497), Язэп І (Баўгарынавіч (1497–1501), Іона ІІ (1503–1507).

Наступны мітрапаліт смаленскі епіскап Язэп ІІ паходзіў з магнацкага роду Солтанаў і меў багатыя зямельныя надзелы, атрыманыя за заслугі ад князя, і вёў актыўную незалежніцкую палітыку, кіраваў у 1507–1522 гг.). У 1509 г. пры вялікім князі Жыгімонце ІІ (Старым) мітрапаліт Язэп ІІ склікаў у Вільні сабор, на якім былі вызначаны асновы царкоўнага жыцця і кіравання Праваслаўнай Царквой у ВКЛ.

Пастановы сабору ў 15 пунктах ухвалілі кананіч-

ны, незалежны ад свецкага патранату кантроль над выбарам кандыдатаў на духоўніцкія пасады, умацавалі царкоўную дысцыпліну і акрэслілі праўныя асаблівасці абароны царкоўных інтарэсаў.

Такім чынам, сабор змацаваў яшчэ адну адзнаку аўтакефаліі Праваслаўнай Царквы ў ВКЛ – статус яе асобнага існавання.

Пры Язэпе II была замацаваная яшчэ адна краёвая асаблівасць Праваслаўнай Царквы ў ВКЛ – асаблівасць удзелу ў кіраўніцтве ніжэйшых, але як паказала гісторыя, вельмі моцных структур – праваслаўных брацтваў. Гэтая старонка гісторыі беларускага і ўкраінскага праваслаўя патрабуе спецыяльнага разгляду і зусім няведама Маскоўскай Царкве.

Пасля Язэпа II Праваслаўную Царкву ў ВКЛ ачольвалі Полацкі епіскап Язэп III (1522–1534), Луцкі і Астрожскі епіскап Макар II (1534–1555).

З кожным годам становішча Праваслаўнай Царквы працягвала пагаршацца ў сувязі з зменай палітычнай сітуацыі на карысць каталіцкай прысутнасці, якая замацавалася ў 1569 г. заключэннем ВКЛ і Польшчай Люблінскай уніі. Апошнія праваслаўныя мітрапаліты ВКЛ Сільвестар (1556–1567) і Іона III (1568–1576) мала што ўнеслі для папраўкі цяжкага становішча Царквы.

Пасля Брэсцкага сабору 1596 г. праваслаўю ў ВКЛ быў нанесены найбольш моцны ўдар. Прыйшоў час уніі, колькасць праваслаўных прыходаў стала рэзка скарачацца, але не знікла зусім дзякуючы дзейнасці праваслаўных брацтваў. Іерархія Праваслаўнай Царквы аднавілася толькі ў 1620 г., калі Канстанцінопальскі патрыярх Тэафон благаславіў на прастол Кіеўскі мітрапаліта Іова Барэцкага, віленскага архімандрыта Мялеція Сматрыцкага – епіскапам Галіцкім, Ісайю Каніскага – епіскапам Смаленскім, а ў Турава-Пінскую епархію быў пастаўлены грэк Аўрам.

Аднак гэты епіскапат не быў прызнаны каралеўскай уладай, пакуль не памёр кароль Жыгімонт IV і каралём стаў Уладзіслаў II. Пры новым каралі пра-

васлаўным вярталася большасць правоў і дазвалялася ўзнавіць царкоўную іерархію. У выніку з згоды Кастанцінопальскага патрыярхату мітрапалітам быў пастаўлены Пётра Магіла.

З 1620 г. па 1795 г. у Беларусі дзейнічала толькі адна епархія – Магілёўская. Астатнія прыходы – Віленскія, Навагрудскія, Пінскія ўваходзілі ў склад мітраполіі Кіеўскай епархіі.

Такім чынам, пасля размежавання ў 1458 г., Маскоўская Праваслаўная Царква і Беларуска-Украінская Праваслаўная Царква, што існавала ў Вялікім княстве Літоўскім жылі цалкам самастойным жыццём.

Гістарычна ад заснавання і на працягу стагоддзяў Беларуская Царква знаходзілася ў кананічнай юрысдыкцыі Усяленскага Канстанцінопальскага патрыярха. Аднак гэта не перашкаджала развіваць ёй свой царкоўны строй і сваю сістэму кіравання. Падобны тып царкоўнай залежнасці азначаў стан **фактычнай аўтакефаліі**. Улада Канстанцінопаля абмяжоўвалася актамі вышэйшага кананічнага парадку. Канстанцінопаль у адрозненне ад Масквы быў для Беларусі натуральным духоўным і царкоўна-рэлігійным цэнтрам. Беларуска-Украінская Царква мела поўнае самаўпраўленне. Гэты факт пацвярджаецца і вонкавай атрыбутыкай: Канстцінопальскія патрыярхі пасылалі кіеўскім мітрапалітам граматы з алавянымі пячаткамі як для аўтакефальных архіепіскапаў усходу.

Толькі ў 1686 г., паводле Андрусаўскага міру, Кіеўская мітраполія была падпарадкавана Маскоўскаму патрыярхату. Аднак Магілёўская епархія яшчэ доўгі час карысталася вонкавай аўтаноміяй, хоць фармальна і падпарадкоўвалася Маскве. Кіеўская ж мітраполія развалілася на дзве: Маскоўскую і патрыяршую Канстанцінопальскую. “Вечны мір” паміж Расіяй і Польшчай, падпісаны ў 1686 г., замацаваў перанос цэнтра праваслаўя з Кіева ў Маскву. І праз некаторы час Кіеўская мітраполія была зведзена да статусу епархіі маскоўскага патрыярхату.

У 1791 г. Пінская Кангрэгацыя (Сабор) ухваліла аўтакефалію Праваслаўнай Царквы ў Рэчы Паспалітай абодвух народаў. Пасля трох падзелаў Рэчы Паспалітай Беларускую Царкву перавялі пад юрысдыкцыю Расійскага Праваслаўнага Сінода.

**Нацыянальныя рысы праваслаўнай культуры праз стагоддзі.** У Беларусі – спачатку ў Полацкім і Тураўскім княствах, а потым у Вялікім княстве Літоўскім (ВКЛ), праваслаўная культура здаўна развівалася ў адметных нацыянальных рысах. Да нашых часоў дайшлі некаторыя шэдэўры культуры той эпохі. Гэта помнікі летапісання, старажытныя іконы і фрэскі (Спаса-Еўфрасіннеўскі храм ў Полацку), непаўторная архітэктура (Каложская царква ў Горадне) і г. д. Гэта і выдатная школа рыторыкі, якую ўзначальваў архіепіскап Кірыла Тураўскі, пазней прылічаны да ліку святых.

Вядомы грамадскі і царкоўны дзеяч, удзельнік 2-га Усебеларускага кангрэсу 1943 г. Іван Касяк сцвярджае, што Праваслаўная Царква была ў той час нацыянальнай беларускай Царквой[1]. Культура, рэлігійная стваральнасць і традыцыі дэмакратыі былі асноўнымі рысамі беларускай праваслаўнай культуры, што моцна адрознівала яе ад праваслаўнай культуры Масковіі, дзе дамінавалі ўсходне-дэспатычныя традыцыі Залатой Арды[2]. Адкрытасць Беларусі да заходнееўрапейскай культуры прывяла да ўсталявання ў ВКЛ святарства высокай узнёсласці, культуры і адукацыі, што мела нават уплыў на сумежныя з ВКЛ землі – Пскоўшчыну, Цвершчыну, Ноўгарадчыну. *Пра беларускія ўплывы сведчаць маскоўскія летапісы* – Траецкі і Серпіёнаўскі. А маскоўскі мітрапаліт Кіпрыян заклікаў нават да арыентацыі на “заходнерускую” царкоўную арганізацыю і прыводзіў як прыклад Полацкую і Тураўскую епархіі.

---

[1] Касяк І. Гісторыя праваслаўнай аўтакефальнай Царквы. Нью-Йорк. 1954.

[2] Візантыя і Беларусь // Царкоўны пасланец, № 2, 2/46/56, 1998.

**Канцэпцыя трэцяга Рыма.** Канцэпцыя "трэцяга Рыма", якая магла ў свой час замацавацца за польскім Кракавам, пазней магла суаднесціся з балгарскім Тырнавам, а потым і з Цвярскім княствам (хроніка "Манасіі"). Аднак найбольш магчымасцей заняць месца "трэцяга Рыма" было за ВКЛ, бо яно мела больш правоў лічыць сябе пераемнікам Візантыі.

Чаму ж Беларусь не стала трэцім Рымам? Адказ на гэтае пытанне нам бачыцца ў адметнасці і высокім роўні тагачаснай культуры і навукі ў ВКЛ, што зусім не стасавалася з гінучай Візантыйскай імперыяй. Зусім іншае Масква, якая пачала вызваляцца з-пад улады татараў толькі ў XIV ст. і шукала нейкае падмацаванне для сцверджання сваёй выключнасці, што і выкарыстаў манах Філафей у сваёй канцэпцыі "Масква – трэці Рым".

У 1772–1795 гг. Адбыліся тры падзелы Рэчы Паспалітай, у выніку якіх Беларусь апынулася ў Расійскай Імперыі. Пачаўся новы перыяд у жыцці Праваслаўнай Царквы ў Беларусі.

У выніку паланізацыі ў канцы XVIII ст. на тэрыторыі ВКЛ пражывала ўсяго 6,5 % праваслаўных, 39 % уніятаў, 38 % – католікаў.

Становішча з Праваслаўнай Царквой у Беларусі рэзка змянілася пасля трох падзелаў Рэчы Паспалітай. На працягу XIX ст. Праваслаўная Царква не толькі хутка аднавіла сваю дзейнасць, вярнуўшы сабе былую моц "залатой пары" XVI ст., але і ўвабрала набыткі іншай культуры – рускай. Галоўнай рысай расійскага варыянту праваслаўя з'яўляецца яго надзвычай важнае становішча ў дзяржаве. У Расійскай Імперыі праваслаўе становіцца ўжо дзяржаўнай рэлігіяй, і гэта кладзе адбітак і на ўсю Беларусь, якая становіцца ў XIX ст. Паўночна-Заходнім краем Расіі.

Адметнасцю расійскага праваслаўя на мяжы XIX–XX стст. было і тое, што яно становіцца нацыянальнай рэлігіяй, прыкметай нацыянальнай тоеснасці. Калі ў часы ВКЛ яно (праваслаўе) было адметнай рысай тагачаснага беларускага і ўкраінскага народаў,

то прыняцце і наступная экспансія расійскага варыянту праваслаўя ў Беларусі грала вялізную ролю для выхавання выключна рускага менталітэту. З'явілася тэорыя трыадзінага руска-беларуска-ўкраінскага народа з прыярытэтам "старэйшага брата" – рускага. Гэтая ідэалогія атрымала назву панславізму і актыўна развівалася артадоксамі расійскай культуры. Аднак многія прагрэсіўныя рускія мысляры таго часу не ўхвалялі гэтай дактрыны ўжо тады. Такім філосафам быў, напрыклад, Канстанцін Лявонцьеў, які называў тэндэнцыю да панславізму племяннай палітыкай, лічыў, што гэтая палітыка вядзе да эгалітарнага ўсёзмяшчэння і ўсярэднення нацый і, нарэшце, іх знішчэння на карысць адной паноўнай[1]. К. Лявонцьеў, а таксама выдатныя рэлігійныя рускія філосафы – М. Бярдзяеў, У. Салаўёў і іншыя празарліва ўбачылі наступленне новай эпохі – крушэння імперый, утварэння нацыянальных дзяржаў і ўзнікненне новай ідэалогіі – нацыяналізму. Менавіта працэс нацыянальнага адраджэння многіх народаў стаў дамінантай XIX ст. і расквітнеў у XX ст.

Шавіністычная палітыка царскай Расіі дасягнула кульмінацыі перад Першай сусветнай вайной. Здавалася, заставаўся адзін крок да поўнай асіміляцыі беларусаў рускімі. Аднак гэтага не здарылася. Больш за тое, пачалося беларускае нацыянальнае адраджэнне, чаго не назіралася ў часы Рэчы Паспалітай. Некаторыя бачаць прычыну гэтага ў процістаянні расійскай экспансіі каталіцкага насельніцтва Беларусі. У некаторай ступені гэта так, але нацыянальны рух ахопліваў усё насельніцтва Беларусі незалежна ад веравызнання. Мне бачыцца першаступеннай прычынай нацыянальна-вызваленчага руху ў Беларусі змена гістарычнай эпохі, што пачалася з часоў буржуазнай рэвалюцыі ў Францыі (1789–1793). І гэты працэс паспяхова завяршаецца ў наш час. Гэтая эпоха была на-

[1] Леонтьев К. Племенная политика как орудие всемирной революции // Избранное, М. 1993. С. 60.

званая намі эпохай нацыянальнага монатэізму, часам фармавання нацый і ўтварэння незалежных нацыйдзяржаў. Асноўная характарыстыка народаў даіндустрыяльнай эпохі – падзел народаў па веравызнаннях, саступае цяпер іншай – падзелу чалавецтва на нацыі. Тэорыя касмапалітызму церпіць ў XX ст. поўны крах. Чалавецтва набывае новыя рысы – нацыю, а сярод ідэалагічных дактрын выходзіць на першае месца нацыяналізм, апярэдзіўшы нават "дзецішча" Французскай рэвалюцыі – лібералізм.

Працэс нацыянальнай самаідэнтыфікацыі беларусаў, які пачаўся ў другой палове XIX ст. і пачатку XX ст. ішоў як сярод каталіцкага насельніцтва – Францішак Багушэвіч, Ядвігін Ш., Янка Купала, так і сярод праваслаўнага – Максім Багдановіч, Якуб Колас і іншыя. Пачала фармавацца беларуская нацыя. Настаў і час па-новаму вызначыць месца Праваслаўнай Царквы ў працэсе фармавання беларускай нацыі.

**Аднаўленне аўтакефаліі Беларускай Праваслаўнай Царквы.** Пасля Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г. на парадку дня паўстала пытанне аб аднаўленні аўтакефаліі Праваслаўнай Царквы.

У ліпені 1922 г. у Мінску быў скліканы епархіяльны з'езд з мэтай стварыць самастойную Праваслаўную мітраполію, незалежную ад Масквы. І 22 ліпеня ў кафедральным саборы г. Мінска быў абвешчаны акт стварэння аўтакефальнай Беларускай мітраполіі. Першым мітрапалітам стаў епіскап Мелхіседэк (Раеўскі). Згодна з пасланнем II Сабору БПЦ, які адбыўся ў жніўні 1927 г., аўтакефалія БПЦ з'яўлялася "кананічна заканамернай і гістарычна неабходнай". Акт аўтакефаліі быў абгрунтаваны, у прынцыпе, ён устанавіў душу найстарэйшага царкоўнага заканадаўства і практыкі згодна з 34-м Апостальскім Правілам: " Епіскапам усякага народа належыцца ведаць першага спаміж сябе і прызнаваць яго як галаву, і не тварыць без яго-най развагі нічога, што перавышала б іхнюю ўладу".

Аднак зусім хутка – з прыходам да ўлады Сталіна, пасля 1929 г., для рэлігійнага жыцця ў БССР

насталі не лепшыя часы, і пра развіццё аўтакефаліі ўжо не магло быць і гаворкі.

Незалежная Царква ў Беларусі – вынік духоўных намаганняў мітрапаліта Мельхіседэка – праіснавала дзесяць гадоў. У ліпені 1937 г. усе святары Беларускай Аўтакефальнай Царквы былі арыштаваныя па сфабрыкаванай бальшавіцкімі спецслужбамі справе. А 1 лістапада 1937 г. епіскапы Філарэт, Апанас, а таксама Антон Кіркевіч, Сцяфан Кульчыцкі, Міхал Рубановіч, Павел Вяршынскі, Сяргей Садоўскі, Якаў Бараноўскі, Уладзімір Лобач і шмат іншых дзеячоў БАПЦ былі расстраляны.

**Аднаўленне аўтакефаліі БПЦ у часы нямецкай акупацыі.** У часы нямецкай акупацыі – з 30 жніўня па 2 верасня 1942 г. – прайшоў Усебеларускі Сабор, які аднавіў Аўтакефальную Беларускую Праваслаўную Царкву. Быў прыняты статут і іншыя дакументы. У звароце да іншых аўтакефальных Цэркваў сказана: "Мы, ерархі Праваслаўнай Беларускай Царквы, зварочваемся да Вашага Свяцейшаства і просім пачуць сваім, поўным любові сэрцам патрэбы нашае Царквы, прыняць іх блізка да свайго сэрца і падаць руку помачы ў справе ўладжання царкоўнага жыцця на падставах аўтакефаліі..." Прыняты Статут быў складзены на падставе канонаў і традыцыяў святой Усяленскай Усходняй Праваслаўнай Царквы. Пасля Сабору савецкія партызаны пачалі знішчаць удзельнікаў Сабору. Загінула мноства святароў, сярод якіх святары В. Мурашка, М. Скабей, А. Каліноўскі, протаіерэй І. Кушнер і многія іншыя. Характэрна, што знішчаліся іерэі і протаіерэі Аўтакефальнай Царквы, а не рускай.

Пасля вызвалення БССР ад немцаў большая частка святароў БАПЦ былі арыштаваны і расстраляны, частка выехала за мяжу. Некаторыя знайшлі іншае вырашэнне праблемы – яны ўтварылі так званую Праваслаўную Вандроўную Царкву (ПВЦ).

Частка іерархаў БАПЦ, якія выехалі за мяжу, – мітрапаліт Панцялейман і іншыя епіскапы БАПЦ у

1946 г. далучыліся да Рускай Праваслаўный Царквы замежжа. У сувязі з гэтым нацыянальна свядомыя праваслаўныя беларусы замежжа былі вымушаныя зноў аднаўляць аўтакефалію.

**БАПЦ у эміграцыі.** У 1944 г. епіскапат БАПЦ у поўным складзе выехаў за мяжу. Напрыканцы 1945 г. беларускія епіскапы пачалі весці перамовы з РЗПЦ (Расейскай Замежнай Праваслаўнай Царквой) аб далучэнні да яе. 10 лютага 1946 г. Сабор епіскапаў РЗПЦ разгледзеў заяву епіскапаў з Беларусі, якія праслілі прыняць іх з духавенствам і вернікамі ў поўнае брацкае і малітоўнае злучэнне. Сабор з радасцю задаволіў іх просьбу, а епіскапа Сцяпана ўключыў у архіерэйскі сінод у якасці прадстаўніка ад Беларусі. Такім чынам, усе набыткі створанай падчас нямецкай акупацыі БАПЦ былі страчаныя. Прыхільнікі незалежнай Праваслаўнай Беларускай Царквы пайшлі іншым шляхам. 5 чэрвеня 1948 г. беларускі незалежніцкі актыў разам з прадстаўнікамі Украінскай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы і Радай БНР у Канстанцы (Нямеччына) склікалі з’езд для аднаўлення аўтакефаліі Беларускай Праваслаўнай Царквы ў замежжы. З прычыны таго, што кожная аўтакефальная Царква не можа існаваць без епіскапа, на чале адноўленай БАПЦ у замежжы быў часова пастаўлены епіскап УАПЦ Сергій (Ахатэнка). На з’ездзе ў прамове еп. Сергія было падкрэслена, што ўсе закіды наконт таго, што кананічнасць патрабуе дзяржавы, неабгрунтаваныя. Наадварот, Царква ніколі не была звязаная з дзяржаўнасцю і не павінна падлягаць ды звязвацца з палітычнымі ўстановамі, якія становяць сабой дзяржаву.

Вызначальнай умовай кананічнага прызнання аўтакефаліі Царквы з’яўляецца прызнанне яе матчынай Царквой. Цікавым быў варыянт рашэння гэтай праблемы, прапанаваны на Падсаборы ў Канстанцы. Справа ў тым, што Руская Праваслаўная Царква, якая сама знаходзілася пад пільным вокам НКУС, не магла прымаць нейкіх самастойных рашэнняў ні

па знешне-царкоўных пытаннях, ні па сваім нутраным жыцці. Але з беларускай Царквой склалася дваістая сітуацыя. З аднаго боку, частка Беларусі ўваходзіла ў склад БССР, і яе праваслаўныя вернікі – як "абнаўленцы", так і тыя, што ўваходзілі ў склад БАПЦ, абвешчанай у 1927 г., але ліквідаванай праз 10 гадоў – адносіліся да Рускай Праваслаўнай Царквы. Другая частка беларусаў, што пражывала на тэрыторыі Польшчы, пасля абвяшчэння Польскай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы ў 1924 г. належалі да ПАПЦ да 1940 г. і ва ўмовах эміграцыі лічылі сябе паўнапраўнымі членамі гэтай Царквы.

Гэта дало падставу Падсабору прыняць пастанову, вытрымкі з якой наступныя:

*1. Асноўваючыся на ідэі мітрапаліта Рыгора Цамблака і іншых высокіх беларускіх іерархаў у справе незалежнасці Беларускай Праваслаўнай Царквы, завершанай мітрапалітам Мінскім Мелхіседэкам 23 ліпеня 1922 г. абвяшчэннем Аўтакефаліі Беларускай Праваслаўнай Царквы, Падсабор прызнае правільнай пастанову Усебеларускага Праваслаўнага Сабору ў Мінску ў 1942 г., які ўстанавіў Беларускую Праваслаўную Аўтакефальную Царкву.*

*2. Падсабор сцвярджае кананічнасць БАПЦ, якая атрымала дазвол на выдзяленне і прызнанне ад матчынай Польскай Праваслаўнай Аўтакефальнай Царквы, дадзенай Блажэннейшым Дзянісам, мітрапалітам Варшаўскім усёй Польшчы, галавою гэтай Царквы на рукі мітрапаліта Пінскага Аляксандра ў 1944 г. Падсабор падтрымоўвае пастанову мітрапаліта Пінскага Аляксандра трываць на шляху аўтакефальнасці Беларускай Царквы і на чужыне-эміграцыі і з жалем успамінае прадчасную смерць мітрапаліта Аляксандра.*

*3. Падсабор пастанаўляе працягваць дзейнасць БАПЦ на чужыне-эміграцыі і змагацца за яе ў краі, пад часовым кіраўніцтвам Сяргея, епіскапа Украінскай Аўтакефальнай Царквы. ...*

*5. Падсабор заклікае ўсіх праваслаўных белару-*

*саў аб'яднацца каля адзінай Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы і гэтым ушанаваць памяць і заслугу сваіх найлепшых дзядоў і прадзедаў, што змагаліся за Аўтакефалію Беларускай Праваслаўнай Царквы, пацярпелі мукі ды панеслі мучаніцкую смерць, але здабылі аўтакефалію.*

Хутка епіскап Сергій высвяціў некалькі беларусаў-святароў, а ў снежні 1949 г. быў хіратанізаваны епіскап-беларус Васіль.

У 1950 г. айцы БАПЦ з Германіі выехалі ў Аўстралію і ЗША. У 1972 г. у Гайленд-Парку Нью Джэрсі быў скліканы II сабор БАПЦ, на якім БАПЦ была ператорана ў мітраполію. Першым мітрапалітам быў абраны архіепіскап Андрэй. Мітраполія БАПЦ была падзелена на дзве епархіі: паўночна-амерыканскую з мітрапалітам Андрэем на чале і аўстралійскую (архіепіскап Мікалай). У выніку непаразуменняў сярод духавенства БАПЦ у замежжы ў 90-х гг. XX ст. у Канадзе і ЗША дзейнічалі дзве незалежныя структуры БАПЦ. Адну з іх узначаліў мітрапаліт Ізяслаў, другую – мітрапаліт Мікалай, які ў 1992 г. наведаў Беларусь.

**Спробы аднаўлення БАПЦ у Беларусі пасля Вялікай Айчыннай вайны.** Інфармацыя аб стварэнні ці наагул нейкай канструктыўнай дзейнасці па стварэнні аўтакефальнай Царквы ў Беларусі ў 50–70-х гг. XX ст. вельмі абмежаваная. Дакладна ведама толькі тое, што ўсе спробы стварэння незалежных царкоўных інстытутаў Праваслаўных Цэркваў у Беларусі цярпелі паразу і былі непрымальнымі як з боку афіцыйнай Праваслаўнай Царквы, так і дзяржаўных улад. Гэта становіцца зразумелым, калі ўлічыць, наколькі цяжкім заўсёды быў шлях да незалежнасці Царквы, нават калі яна падмацоўваецца дзяржаўнай незалежнасцю.

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны царкоўнае жыццё ў Беларусі не пачало адраджацца, нягледзячы на вядомую падтрымку Сталіным Праваслаўнай Царквы ў канцы фашысцкай навалы. Наадварот, аднавіліся рэпрэсіі супраць святароў і

асабліва тых, хто спрычыніўся да стварэння БАПЦ у 1942 г. Спачатку (1944–1950-я гг.) спецслужбы вялі актыўныя разборкі з тымі святарамі, што не выехалі ці не схацелі выехаць за мяжу і працягвалі сваё пастырства на Радзіме. Цяпер многія з іх, прыняўшых пакутніцкую смерць у часы сталінскага генацыду, увайшлі ў спіс навамучанікаў Зямлі Беларускай, а некаторыя кананізаваны.

Усяго ў гэты спіс ўваходзяць 23 імені. Сярод найбольш шанаваных святароў – архімандрыт Серафім (Шахмудзь), які з'яўляўся насельнікам Свята-Успенскага Жыровіцкага манастыра. У час вайны, выконваючы абавязкі місіянера ва Усходняй Беларусі, адкрыў шмат праваслаўных храмаў. Арыштаваны ў верасні 1944 г. Прыгавораны да пяці гадоў заключэння ў папраўча-працоўным лагеры. Па-мучаніцку памёр у турме. Кананізаваны ў 2005 г. Дзень памяці 6 верасня.

Зразумела, пра якую аўтакефалію можна было гаварыць у тыя жорсткія пасляваенныя часы, калі наагул само праваслаўе было ў Беларусі паўпадпольным інстытутам. Далёка не трэба хадзіць па прыклады – вядомы паэт-манах Мікалай прыняў хрышчэнне падпольна, на кватэры, а ішоў жа тады і не 1949-ты, а 1985 г.

Царква, як і ўсе афіцыйныя і не афіцыйныя ўстановы, знаходзілася ў СССР пад пільным вокам ГПУ-НКУС-КДБ і цалкам кантралявалася імі.

Дык што ж, пасля Вялікай Айчыннай вайны ніякага самастойнага царкоўнага жыцця не было? Мяркую, так. Прынамсі, пра існаванне якіх-кольвек паслядоўнікаў БАПЦ гатунку 1942 г. гаварыць не даводзіцца. Але пры пошуках матэрыялаў па гэтай тэме мне трапілася брашура цяперашніх "аўтакефалістаў – "Кароткі нарыс па гісторыі Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы на Бацькаўшчыне". Тут чытаем: "З 1945 г. па 1974 г. у шэрагах БАПЦ на Бацькаўшчыне налічвалася каля 35 святароў..." Што гэта за святары і што гэта за БАПЦ, пра якую пішуць аўтары?

Бо БАПЦ, як ведама, эмігравала ў Нямеччыну, а тут у Беларусі не прыпыняўся пераслед не толькі за іншадумства – саджалі нават за некалькі скрадзеных каласкоў. Далейшае прачытванне гэтага "трактата" некалькі праясніла сказанае, дакладней, фантазіі аўтара: "У 1967 г. мітрапаліт Антоній здзейсніў хіратанію айца Макара Харанекі ў епіскапы для кіравання БАПЦ з правам звацца епіскапам Полацкім і Навагрудскім на месца памерлага ўладыкі Аляксандра Караткевіча. А ў 1973 г. мітрапаліт Антоній высвеціў у святары Пятра Гушчу".

Ну, нарэшце ўсё высветлілася. На гарызонце занядбанай беларускай аўтакефаліі з'явілася добра ведамая, а дакладней – сумна ведамая фігура Пятра Гушчы. Спачатку гэты "праваслаўны дзеяч" засвяціўся як апора антырускага, "аўтакефальнага" праваслаўя ў асяроддзі наіўных беларускіх патрыётаў пачатку 1990-х гг., а потым трапіў на некалькі гадоў за краты – і не за нейкую там палітыку, а за крымінальнае злачынства – распусту з непаўналетнімі.

З пачаткам гарбачоўскай адлігі пачаўся бурны рост усіх рэлігійных канфесій, што дзейнічалі, ці пачалі дзейнічаць у Беларусі. Вось тут і настаў "зорны час" Пятра Гушчы, які ў 1991 г. становіцца "епіскапам" (чамусьці гэтае асвячэнне адбывалася ажно ў Саратаве). Зразумела, у Беларусі гэтага "епіскапа" не прызнаў ніхто, акрамя некаторых не зусім кампетэнтных палітычных дзеячоў з асяроддзя БНФ. Надта ж хацелася мець сваю аўтакефальную царкву. (Але ж не такім чынам...)

А Гушча, між тым, едзе ў Амерыку, каб там дабіцца прызнання ў БАПЦ у замежжы. Сябе ён ужо бачыць як галава ўсёй "БАПЦ у Бацькаўшчыне". Аднак ні мітрапаліт Ізяслаў, ні мітрапаліт Мікалай не прызналі новаспечанага епіскапа-авантурыста. Тады Гушча звяртаецца да так званага "Амерыканскага Сусветнага патрыярхату", на чале якога стаяў "патрыярх" Юры Рыжы, які і "благаслаўляе" Пятра Гушчу на святарства ў Беларусі.

Каб не мая асабістая сустрэча з П.Гушчам на адным з мітынгаў БНФ на пачатку 1990-х гг., дык і сапраўды не выключалася імавернасць паверыць у “савецкую прапаганду” аб жудасных ганеннях на святара “аўтакефальнай беларускай царквы” П. Гушчу. Не трэба было быць вялікім псіхолагам, каб зразумець, каго мае гонар слухаць беларускі народ у абліччы святара. Час быў такі, шмат людзей вылучылася тады, і толькі адзінкі былі сапраўды шчырымі і сапраўднымі.

Таму я не здзівіўся, калі прачытаў у газеце “Царкоўны пасланец” (орган БАПЦ у ЗША, № 2/43/53, 1997 г.) наступнае:

*...Асцярога.*

*Да ведама Кансісторыі БАПЦ узноў дайшлі звесткі, што пастаўлены неправаслаўнымі і недухознымі людзьмі ўжо на быццам “праваслаўнага епіскапа” Пётра Гушча, з ягонымі супольнікамі і памочнікамі, не прастае красці добрае імя Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы і зманваць ім у сэктанцкае павуцінне жадных роднае Праваслаўнае Царквы беларускіх вернікаў.*

*Кансісторыя БАПЦ яшчэ раз заяўляе, што вышэй названы Пётра Гушча, як і ягоныя зверхнікі ды супрацоўнікі, ніякае лучнасці і нічога супольнага з Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквой, ані права карыстацца Ейным імём не маюць...*

Застаецца незразумелым, як жа такія цьмяныя асобы, як П. Гушча здабываюць сабе стан святара і нават епіскапа. Развязанне мы бачым зноў жа ў “Царкоўным пасланцы” (№ 1/45/545, 1997 г. ): *ні названы вышэй Пётра Гушча, ані ягоны зверхнік з ЗША Эмігідыюш (Юры) Рыжы не ёсць праваслаўнымі святарамі, ці епіскапамі, абы нават праваслаўнымі верхнікамі ды ніякага дачыненьня да БАПЦ не маюць і ніколі не мелі.*

Вось якая “аўтакефалія” спрабуе “засвяціцца” ў Беларусі.

Заміж зніклага некуды П. Гушчы перыядычна ўзнікаюць і яго паслядоўнікі. З’яўляюцца самыя

розныя людзі, іншым разам шчырыя прыхільнікі і праваслаўя, і беларушчыны. Так, у 1996–1998 г. у г. Ліда дзейнічаў прыход Святога Панцялеймона. На пачатку 2000-х гг. пэўны час прыцягваў увагу журналістаў і ўсіх цікаўных айцец Іаан, які вёў набажэнствы ў незалежным прыходзе ў п. Пагранічны, што непадалёк ад райцэнтра Свіслач. Цяпер ён знаходзіцца, здаецца, у ЗША.

Яшчэ нядаўна ў Доме Літаратара на Фрунзэ 5, да таго, як яго адабралі ў пісьменнікаў, у холе каля авальнай залы на другім паверсе можна было ўбачыць чалавека ў расе і з крыжам – адным словам, святара. Гэта Генадзь Казлоўскі – незалежны іерэй, без свайго прыхода і паствы, рукапакладзены ў свой час Аўтакефальнай Украінскай Праваслаўнай Царквой. Я асабіста добра ведаю гэтага чалавека яшчэ з часоў стварэння Брацтва Трох Віленскіх мучанікаў у 1992 г. Сваю мару служыць у Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царкве а. Генадзь часткова ажыццявіў – стаў святаром. Але другая частка ягонай мары – служыць у незалежным прыходзе – так і не здзейснілася. Некаторы час ён спрабаваў навярнуць у беларускае праваслаўе пісьменнікаў – маўляў, свядомыя беларусы, пішуць, недурныя... Нічагусенькі з гэтай місіі ў яго не выйшла – не схацелі пісьменнікі маліцца і чытаць Дабравесце.

Зразумела, у многіх вернікаў, асабліва нацыянальна-беларускай арыентацыі, існуе жаданне мець сваю, незалежную ад Маскоўскага патрыярхату Аўтакефальную Беларускую Царкву. І яна абавязкова будзе. Але ж не такім чынам, як у згаданых “донкіхотаў”.

Сёння на некаторых беларускіх імпрэзах можна пачуць і пабачыць нешта падобнае на набажэнства, што здзяйсняюць аматары-аўтакефалісты. Але гэтыя акцыі маюць мала супольнага з сапраўдным праваслаўным набажэнствам, у чым лёгка пераканацца любому мінімальна ўцаркаўлёнаму чалавеку.

Вынік нашага дыскурсу – несуцяшальны: любыя спробы стварэння незалежнай Праваслаўнай Царквы

– з любой ступенню незалежнасці – аўтаномнай, альбо аўтакефальнай – не маюць і не могуць мець поспеху ў царкоўным жыцці Беларусі. Для гэтага павінны стварыцца неабходныя ўмовы – незалежная дзяржаўная палітыка, свабода слова і веравызнанняў, і галоўнае – дастатковая колькасць такіх грамадзян Беларусі, якія задавальняюць наступным дзвюм умовам. Па-першае, яны павінны быць веруючымі людзьмі, на дастаткова высокім узроўні ўцаркаўлення. Па-другое, яны павінны быць нацыянальна сведамымі людзьмі. І па-трэцяе – гэта наяўнасць незалежнай дзяржаўнай палітыкі ў галіне Праваслаўнай Царквы.

Такім чынам, шэраг падстаў, і ў першую чаргу палітычная сітуацыя, дазваляюць упэўнена сказаць, што любыя спробы стварэння аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы ці нават аўтаноміі ў Беларусі не маюць ніякіх шанцаў на поспех у наш час. Як грамадскі інстытут, уяўляючы з сябе важную, істотную частку грамадства, Царква павінна саспець, падрыхтавацца да аўтаномнага, незалежнага існавання ад гістарычнага свайго кораня – матчынай Царквы, у выпадку Беларусі – ад Маскоўскага патрыярхату. Аўтакефалія – гэта не прыхамаць некалькіх людзей, а сур'ёзная, у першую чаргу, адміністратыўная рэканструкцыя царкоўнага інстытута. Прыклад польскай аўтакефаліі паказвае, што калі існуе дзяржаўная неабходнасць, то ўсе пытанні, у тым ліку і царкоўныя, падпарадкоўваюцца гэтай неабходнасці. Жыццё прымусіла ў 1924 г. царкоўныя арганізацыі Праваслаўнай Царквы ў Польшчы пакінуць падпарадкаванне Маскве і ўтварыць сваю незалежную мітраполію.

Аналагічныя працэсы ідуць і ва Украіне. Але тут яшчэ далёка да яснасці, бо на цяперашні час там не зусім мірна суіснуюць дзве структуры Праваслаўнай Царквы – кананічнага Маскоўскага патрыярхату і не кананічнага – Кіеўскага. На маю думку, самым правільным крокам ў вырашэнні іх спрэчкі было б прызнанне Маскоўскім патрыярхатам права на існаванне іншай царкоўнай структурнай адзінкі – Кіеў-

скага патрыярхату. І калі Маці-Царква – Руская Праваслаўная Царква – прызнае яе, дык кананічнасць будзе зацверджана. Ад гэтага кроку выйграюць абодва бакі.

## 6. Царква і дзяржава

Спакон вякоў Царква і дзяржава былі галоўным стрыжнем, што вызначаў жыццё кожнага грамадзяніна краіны. І чым мацней былі гэтыя сувязі, тым мацней уздзейнічала дзяржава на фармаванне нацыянальнай адметнасці Царквы.

Уздзеянне Царквы на дзяржаву адбывалася яшчэ з часоў Візантыі. Аднак, ужо ў Кіеўскай Русі, адносіны Царквы і дзяржавы набылі надзвычай гарманічную форму, што атрымала назву – **сімфонія Царквы і дзяржавы.** Царква ўздзейнічала на жыццё ўсяго грамадства, яе парадамі карысталіся князі і баяры, царкоўны суд распаўсюджваўся і на сямейныя справы. Аднак у Кіеўскі перыяд Царква была вызваленая ад дзяржавы. Царкоўная іерархія заўсёды лічыла сябе прадстаўніцай "вышэйшага цэлага" – Усяленскай Царквы. З часоў Івана Грознага пачынаецца новая якасць Рускай Праваслаўнай Царквы: завяршылася фармаванне маскоўскага самадзяржаўя. З гэтага часу пачалося памазанне цароў на царства. Да XVI ст. сфармавалася адметная Руская Праваслаўная Царква ў Масковіі, якая мела як візантыйскія рысы, так і азіяцкія, татарскія. Самадзяржаўе, якое там усталявалася, было з'явай толькі Маскоўскай Русі. Зусім іншыя традыцыі праваслаўе мела ў ВКЛ. Яно ў значнай ступені ўвабрала еўрапейскія традыцыі і зусім не мела азіяцкіх элементаў. Гэтая культура дала шмат знакамітых у сусветным маштабе людзей – навукоўцаў, асветнікаў, літаратараў, якія мелі немалы ўплыў і на культуру суседняй дзяржавы Маскоўскай Русі. Нагадаем хоць бы нашага славутага Сімяона Полацкага, які быў заўважнай фігурай не толькі ў ВКЛ, але і ў Маскве XVII ст.

Праваслаўе ў ВКЛ займала вельмі важную ролю ў жыцці дзяржавы да 1596 г., мела вялікую самастойнасць, незалежнасць як ад Масквы, так і Канстанцінопаля. Праваслаўная Царква ў ВКЛ была фактычна аўтакефальнай, хоць і не прызнанай кананічна. Вытрываўшы перыяд заняпаду (XVII–XVIII стст.) праваслаўе на беларускіх землях пасля трох падзелаў Рэчы Паспалітай трансфармавалася пад уздзеяннем расійскай мадэлі праваслаўя.

Пасля рэформ Пятра I, на канец XVIII ст., праваслаўе ў самой Расіі траціць сваю саборнасць (выбранасць іерархаў агульным зборам веруючых) і былую сімфонію Царквы і дзяржавы. Перадумовай гэтага стаў створаны ў 1721 г. Пятром I Свяцейшы Урадавы Сінод, які меў уладу над усёй Царквой і нават над патрыярхам.

Становішча мяняецца ў 1917 г. з адкрыццём Паместнага Сабора РПЦ, які аднавіў саборнасць, аднавіў патрыяршаства. Аднак, неўзабаве настала эпоха ганенняў на Царкву, жудаснай антырэлігійнай прапаганды. Царквой фактычна кіравалі паслядоўна – ГПУ, НКУС, КДБ... Пасля распаду СССР Праваслаўная Царква пачала паўсюдна імкліва адраджацца.

У канцы 1980-х гг. у Беларусі пачало актыўна адраджацца рэлігійнае жыццё. Праваслаўная Царква, як самая шматлікая і традыцыйна вядучая царкоўная структура, развіла сваю дзейнасць па ўсім спектры царкоўных праблем, і вынікі гэтага відавочныя. Але прадметам нашай цікаўнасці з'яўляюцца справы беларускага нацыянальнага жыцця. Як жа ў гэтай галіне праявіла сябе БПЦ?

На Праваслаўную Царкву Беларусі (БПЦ) часта наракаюць за вельмі кволую працу па нацыянальным выхаванні насельніцтва, недахоп беларусізацыі, слабае ўкараненне беларускай мовы ў богаслужэнні і г. д. На гэта знаходзяцца апраўдальныя адказы як аб'ектыўнага характару, так і звязаныя з нутранай палітыкай Праваслаўнай Царквы.

Аднак не адразу ўсталявалася палітыка, мякка кажучы, слабага спрыяння беларусізацыі, а часам і

процістаяння патрыятычным памкненням сведаных вернікаў. У пачатку 1990-х гг. шэраг праваслаўных святароў узаемадзенічалі з Беларускім Народным Фронтам, НДПБ, БХДЗ. Прадстаўнікі БПЦ сталі нават дэпутатамі Вярхоўнага Савета 12-га склікання. Дзякуючы намаганням іерэя (цяпер архімандрыд) Аляксея Шынкевіча была адкрыта дзвюхмоўная газета "Царкоўнае слова", дзе вялікая частка матэрыялаў друкавалася на беларускай мове. Газета існуе і цяпер, але, на жаль, цяпер там беларускамоўных матэрыялаў амаль не засталося.

У 1992 г. было заснавана Беларускае Праваслаўная Брацтва Трох Віленскіх Мучанікаў, мэтай якога было спрыянне беларускаму культурнаму жыццю ў лоне Праваслаўнай Царквы, гуртаванне беларускамоўных вернікаў вакол царкоўнага жыцця. Пры Брацтве было адкрыта выдавецтва, якое да сённяшняга дня застаецца адзіным у Беларусі царкоўным выдавецтвам кніг і іншай друкаванай прадукцыі на беларускай мове. З 1994 г. штогод выпускаецца Беларускі Праваслаўны Каляндар, выходзіць часопіс "Праваслаўе".

Другім кірункам дзейнасці Брацтва з'яўляецца пераклады на беларускую мову літургіі, трэбаў і іншых богаслужэбных тэкстаў і ўкараненне іх у царкоўную практыку. У гэтым кірунку літаратурная дзейнасць удала спалучаецца з музычнай, дзе вялікую ролю адыгрывае царкоўны хор, сабраўшы аматараў старажытных беларускіх царкоўных спеваў.

Пачынаючы з 1996 г., беларускія акцыі і наагул беларускае жыццё ў асяроддзі Праваслаўнай Царквы пачало паступова зніжацца. Аднак, у параўнанні з агульным наступам на беларушчыну па краіне, БПЦ здолела ўтрымаць заваяваныя пазіцыі і нават дасягнуць некаторых поспехаў. Так, з 2002 г. у Свята-Пятра-Паўлаўскім саборы кожную суботу служыцца беларускамоўная літургія, а яшчэ раней (з верасня 1997 г.) кожную сераду служыцца акафіст "Тром Віленскім Мучанікам" на беларускай мове.

Укараненне беларускай мовы ў богаслужэнні аказваецца не такой лёгка вырашальнай задачай, як можа здацца на першы погляд. Ніжэй мы разгледзім гэтую праблему больш падрабязна.

## 7. Сучасны стан праваслаўя ў Беларусі

Напярэдадні бальшавіцкага перавароту 1917 г. у Беларусі існавала 5 епархій, якія ўваходзілі ў склад РПЦ. Бальшавіцкі ўрад на пачатку свайго кіравання вырашыў надаць беларускай Праваслаўнай Царкве больш самастойнасці. І ў 1922 г. была ўтворана Беларуская Праваслаўная мітраполія на чале з епіскапам мінскім Мелхіседэкам. Агульны працэс нацыянальнага адраджэння ў Беларусі, аднак, не паспеў закрануць у поўнай меры Царкву, бо яшчэ пры жыцці Леніна пачалася страшэнная барацьба з рэлігіяй, і праваслаўе, як самая распаўсюджаная канфесія, першым прыняло на сябе ўвесь цяжар бальшавіцкага тэрору. Да 1988 г. вялося безупыннае змаганне з рэлігіяй. Толькі пасля XIX Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі быў узяты курс на дэмакратызацыю рэлігійнага жыцця. І праз усе 90-ыя гг. XX ст. прайшоў імклівы колькасны і якасны рост усіх рэлігійных канфесій. У 1990 г. быў утвораны Беларускі Экзархат РПЦ – Беларуская Праваслаўная Царква (БПЦ). БПЦ кіруецца Сінодам на чале з мітрапалітам Мінскім і Слуцкім, Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі Філарэтам. Па колькасці вернікаў БПЦ з'яўляецца самай буйнай з усіх іншых канфесій. На 1996 г. БПЦ налічвала 964 рэлігійных аб'яднанняў (у 1986 г. было ўсяго 369). За праваслаўнымі па колькасці абшчын ідуць далей пратэстанты – 604, католікі – 389. Характэрна, што колькасць праваслаўных абшчын размеркавана прыкладна аднолькава па абласцях Беларусі (за выключэннем Брэсцкай вобласці, дзе іх больш, чым у астатніх – 282 абшчыны). Католікі канцэнтруюцца найбольш у Гарадзенскай вобласці (163 абшчыны), пратэстанты – у Брэсцкай вобласці (209 абшчын). Колькасць усіх прыходаў працягвае расці, але лідзіруюць пратэстанцкія цэрквы.

Па розных ацэнках, колькасць праваслаўнага насельніцтва ў Беларусі складае ад 60 % да 80 % ад усяго насельніцтва. Неадпаведнасць колькаснага складу праваслаўнага насельніцтва колькасці праваслаўных абшчын (апошніх значна меней па разліку на душу насельніцтва, чым у пратэстантаў ці католікаў) тлумачыцца тым, што многія грамадзяне Беларусі толькі лічаць сябе праваслаўнымі (некаторыя былі толькі ахрышчаныя пры нараджэнні, іншыя проста падтрымліваюць традыцыі роднай вёскі і г. д.). Большасць такіх вернікаў зусім не наведваюць храмы ці бываюць зрэдку. У католікоў, а яшчэ ў большай ступені ў пратэстантаў кантакт з сваёй Царквой значна лепшы. Па колькасці пратэстанцкіх абшчын, напрыклад, з вялікай ступенню верагоднасці можна меркаваць і аб колькасці вернікаў.

Да гэтага часу ў Беларусі існуе старадаўняя "парадыгма": праваслаўны – гэта рускі, католік – паляк. Аднак гэтая формула ў наш час істотна пераўтварылася, захоўваючы сваю першапачатковую значнасць недзе на паўсур'ёзным роўні. Большасць беларусаў-католікаў і беларусаў-праваслаўных, асабліва сярод сярэдніх і ніжэйшых слаёў насельніцтва, мала зважаюць на сваю канфесійную прыналежнасць. І тых, і другіх аб'ядноўвае тое, чаго не было яшчэ 100 гадоў назад – нацыянальнасць. Прычым ментальнасць усярэдненага беларуса, несумненна, мае праваслаўнае аблічча. Розніца паміж палякам-католікам і беларусам-католікам значна большая, чым паміж апошнім і праваслаўным беларусам.

Да 1989 г. у Беларусі быў усяго адзін праваслаўны манастыр – Жыровіцкі мужчынскі манастыр. У 1997 г. было ўжо 5 мужчынскіх і 8 жаночых манастыроў, дзе насельнікамі былі 81 манах і 135 манашак. На пачатак 2008 г. колькасць праваслаўных абшчын ужо дасягнула 1437, зарэгістравана 12 рэлігійных аб'яднанняў, 5 духоўных навучальных устаноў, 27 манастыроў. Пры БПЦ існуе 13 праваслаўных брацтваў і 9 сястрычастваў, якія складаюцца з

прыхаджан і вядуць вялікую працу па распаўсюджанні духоўнасці.

У сучасны час у храмах як Беларускай Праваслаўнай Царквы, што належыць да юрысдыкцыі Маскоўскага патрыярхату, так і абедзвюх замежных БАПЦ, а таксама ў аўтакефальнай Польскай Праваслаўнай Царкве на Беласточчыне карыстаюцца ў набажэнствах царкоўнаславянскай мовай. Пропаведзі звычайна чытаюцца на мове большасці прыхаджан. Так, у Беларусі гэта звычайна расійская мова, за выключэннем прыходаў, аб якіх гаварылася вышэй, дзе з ініцыятывы саміх святароў уведзена ў ужытак беларуская мова. На эміграцыі карыстаюцца звычайна беларускай ці англійскай мовамі.

Наагул, самая адметная рыса для большасці Праваслаўных Цэркваў (рускай, беларускай, украінскай, балгарскай, сербскай і іншых) у тым, што амаль усё набажэнства вядзецца на **царкоўнаславянскай мове**.

***

Падагульнючы, трэба сказаць наступнае: найбольш правільным шляхам царкоўнага развіцця ў Беларусі з'яўляецца паступовая беларусізацыя Царквы шляхам утварэння беларускіх праваслаўных брацтваў па ўсёй краіне, утварэння беларускамоўных асветніцкіх рэлігійных цэнтраў, далучэння да царкоўнага жыцця як мага больш беларускамоўных прыхаджан, сведамай інтэлігенцыі, увядзення прадметаў і курсаў накшталт “Закона Божага”, “Асноў праваслаўнай культуры” ў навучальных установах.

Якое ж месца будзе займаць Праваслаўная Царква ў Беларусі ў III-м тысячагоддзі? На наш погляд, павінны здзейсніцца наступныя прагнозы.

1. Праваслаўная Царква павінна стаць нацыянальнай. Беларусь, у рэшце рэшт, сфармуецца ў нацыянальную дзяржаву, зойме дастойнае месца ў сусветным сузор'і нацый-дзяржаў, будзе праводзіць самастойную палітычную і эканамічную дзейнасць. Беларуская Праваслаўная Царква паступова выйдзе з юрысдык-

цыі Масквы і атрымае аўтакефалію, замацаваную ***кананічнасцю.***

2. Пераўтварэнне Беларусі ў сталую еўрапейскую нацыю-дзяржаву можа прывесці да адраджэння былой сімфоніі Царквы і дзяржавы, але ўжо на новым роўні. Гэта будзе якасна новы віток эвалюцыі Царквы.

3. Беларусь можа стаць "канфесійнай Швейцарыяй". Менавіта тут перакрыжоўваюцца пратэстанцкая Поўнач, каталіцкі Захад і праслаўны Усход. Па выразу А. Бембеля, яна можа стаць месцам Паліфанічнай Злучнасці, сэрцам хрысціянскай садружнасці (Бембель А. Уводзіны ў метагісторыю Беларусі//Культура, № 43, 1992). Больш за тое, ёсць спадзяванне, што будычыня Беларусі – гэта ўваходжанне яе ў сусветнае царкоўнае жыццё цэнтрам экуменічнага руху.

## 8. Мова і Царква

Мовай Славянскай Гасподзь
аб'яднаў
люд і абшар Праваслаўны...
блудных сыноў – праз стагоддзі – гукаў
музыкай Слова ў Храмах...

*Зьніч*

Гэты раздзел – вынік дыскусій пра мову Царквы, што адбываліся на старонках газет "Царкоўнае слова", "Наша слова" і іншых у 90-я гг. XX ст. Мая пазіцыя – спроба аб'ектыўнага аналізу праблемы – сутыкнулася з неразуменнем абодвух бакоў: артадоксаў Вялікадзяржаўя, расійскіх шавіністаў – з аднаго боку, і прыхільнікаў беларускага Адраджэння – з другога боку. Таму я вырашыў напісаць абагульняючы артыкул на гэтую тэму і перадаць ход нашай размовы на старонках газет у той паслядоўнасці, з якой яна вялася.

*1. На якой мове трэба гаварыць святару*

Упершыню я сустрэў прозвішча Валянціны Дышыневіч на старонках «ЛІМа» ў 1993 г. ("ЛіМ", 1993, № 14), дзе аўтарка артыкула ўступіла ў спрэч-

ку з "самім" Зянонам Пазняком, які ў той час якраз знаходзіўся на вяршыні сваёй славы[1].

Палеміка тычылася артыкула Зянона Пазняка "Брэйгелеўскі шлях" ("Звязда", 20 студзеня 1993 г.), дзе лідэр БНФ выказаў сваю думку і, па сутнасці, пазіцыю Фронту ў адносінах да Праваслаўнай Царквы. Гэтая пазіцыя такая: Беларуская Праваслаўная Царква вядзе палітыку русіфікацыі, мітрапаліт Філарэт і шмат іншых святароў – агенты КДБ і гэтак далей...

Публікацыі, скіраваныя на знявагу Хрыстовай Царквы, сустракаюцца ў прэсе даволі часта. Так, у жніўні 1996 г. ("ЛіМ", 20.08.96) быў надрукаваны артыкул В. Дышыневіч пад назвай: "На якой мове моляцца ў праваслаўнай царкве". Гэта быў яе адказ на чарговы напад на Царкву, змешчаны ў тым жа нумары (артыкул І. Антанюка "На дадзенай Богам мове!"). Зноў адзіны голас у абарону Праваслаўнай Царквы. Нават рэдакцыя газеты "ЛіМ" не засталася ў баку і "ўсыпала" аўтарцы сваю порцыю.

І я падумаў, што трэба ўсё ж несці да людзей максімальна поўную, аб'ектыўную праўду, а не дылетанскія развагі далёкіх ад веры людзей. Я, зразумела, не прэтэндую на роль гэтага абʻектыўнага асветніка, але ўсё ж маю права выказаць сваё меркаванне аб мове Царквы і аб гаротным шляху праваслаўя ў Беларусі наагул.

Вось пералік галоўных "прэтэнзій" апанентаў беларускага праваслаўя:

1. Набажэнства ў Царкве вядзецца на расійскай мове, а трэба, каб было на беларускай.

2. Царква праводзіць шавіністычную палітыку Масквы.

3. Многія святары былі (а магчыма, і з'яўляюцца цяпер) агентамі КДБ.

4. Праваслаўе не зʻяўляецца рэлігіяй беларусаў. Беларуская нацыянальная рэлігія – уніяцтва.

---

[1] Валянціна Дышыневіч, святлая ёй памяць, памерла ў 2005 г. у поўнай адзіноце і амаль забытая вучоным светам. Але ў гадавіну яе смерці ў Пятра-Паўлаўскім саборы па ёй служылася паніхіда.

Усе згаданыя пункты мала адпавядаюць рэчаіснасці, і гэта лёгка ўбачыць, калі, зразумела, захацець. Але некаторым колам грамадства, палітыкам важна зрабіць з гэтай хлусні нейкую псеўдапраўду, спасылаючыся на аднабока скантруяваную гісторыю ды легенду аб уніі, упрыгожаную нацыянальнай ідэяй. Добрую порцыю цынізму ў касцёр, што расклалі пад праваслаўем "сапраўдныя беларусы", падлілі і так званыя "праваслаўныя атэісты" – людзі, далёкія ад веры, але ўспомніўшыя аб праваслаўі, таму што цяпер гэта выгадна.

Такім чынам, пачну з першага пастаўленага пытання – пытання аб мове Царквы. Адразу скажу, што я не толькі падтрымліваю спадарыню Дышыневіч, а выступаю таксама і супраць асобнага меркавання рэдакцыі "ЛіМа". Галоўны тэзіс апанентаў Валянціны Дышыневіч у тым, што "да Бога трэба звяртацца на той мове, якую Ён даў людзям. Беларусам Ён даў беларускую мову і толькі на ёй мы абавязаны звяртацца да Яго" (І. Антанюк, "ЛіМ", 20.09.96). Сапраўды, Бог даў беларусам беларускую мову. Але рэчаіснасць для беларусаў аказалася зусім не такой, як для палякаў, літоўцаў ці якой іншай нацыі. Беларусы адцураліся сваёй мовы. І сапраўдная мова беларуса – гэта ці трасянка, набліжаная да расійскай мовы, ці проста расійская мова. А беларуская, па сутнасці, стала элітнай мовай вузкага кола інтэлігенцыі.

Дык вось, святары звяртаюцца ў сваіх казаннях менавіта на мове народа, на той мове, на якой размаўляе фактычна сто адсоткаў прыхаджан – на расійскай мове. Я ўпэўнены, што калі б раптам святар, скажам, у Кафедральным саборы, правёў усю службу на беларускай мове, то яго б не зразумелі, а прыхаджане разбегліся б. Тым не менш, трэба адзначыць, што паступовае ўвядзенне беларускай мовы ў набажэнства мае месца ў Свята-Пятра-Паўлаўскім храме, дзе яго настаяцелем айцом Георгіем Латушкам на кожнай літургіі чытаецца Евангелле спачатку на царкоўнаславянскай, а затым на беларускай мове.

Практыка ўкаранення беларушчыны ў царкоўны абрад працягваецца ўжо некалькі гадоў. У цяперашні час шэраг трэбаў, напрыклад, хрысціны, вянчанне, паніхіда на жаданне вернікаў праводзяцца на беларускай мове. Калі пачалася гэтая практыка, і прыхаджане пачулі падчас літургіі "Ойча наш " на беларускай мове, то яны перапалохаліся, вырашыўшы, што палякі захапілі храм!

Сумная праўда ў тым, што тэзіс І. Антанюка, быццам "сярод прыхаджан беларусаў – пераважная большасць" з'яўляецца падманным. Па пашпарце, магчыма, гэта і так, але па нацыянальных прыкметах і ў першую чаргу па мове – зусім не так. Нацыянальна свядомых беларусаў і ў Царкве, і наагул у Беларусі вельмі мала, і нездарма існуе ў нас крыўдная пагалоска, што беларусы ў Беларусі – нацыянальная меншасць. Мы маем у сталіцы дзяржавы толькі адзінкавыя беларускія школы (нават палякі нядаўна адкрылі польскую школу ў Горадні!). Беларускія класы катастрафічна скарачаюцца, з беларускіх рэспубліканскіх газет засталася толькі адна – "Звязда". Дык што ж у такіх змрочных абставінах можна сказаць пра Царкву! Яна сама толькі пачала ачуньваць пасля бальшавіцкага генацыду. На ўвесь Мінск усяго з дзесятак праваслаўных храмаў. І, зноў жа, амаль на 2 млн. чалавек! Як можна параўноўваць, як робіць "ЛіМ", гэты кволенькі працэс царкоўнага адраджэння са школай? На Мінск мы маем некалькі соцень школ, і галоўная мэта кожнай з іх – выхаванне дзяцей, якое ідзе далёка не ў беларускім кірунку. Вось дзе сапраўдная бяда.

Галоўная мэта Царквы – выратаванне душы чалавека. Царква – гэта, па-сутнасці, бальніца, дзе лечаць нашы душы. І, прабачце, усё роўна, на якой мове будзе гаворыць хірург, які робіць аперацыю. Хоць, асабіста мне, было б прыемна, каб хірург быў таксама сведамым беларусам і размаўляў са мной па-беларуску.

Такім чынам, я магу з упэўненасцю сказаць, што

стаўленне Царквы да беларускай мовы (хоць яна і аддзелена ад дзяржавы) нічым не горшае, чым стаўленне дзяржавы да беларускай мовы, не гаворачы аб установах, чый непасрэдны абавязак – адукацыя і выхаванне нацыянальна свядомых беларусаў. Рэдакцыя "ЛіМа" піша: "памятаем: Царква і школа ствараюць нацыю". Гэта не зусім так у дачыненнні да Царквы. Галоўная задача Царквы не ў выхаванні ці ў адукацыі чалавека. Яна, паўтаруся, лечыць душы з дапамогай лекара – святара.

У гаротным становішчы беларускай мовы вінаваты ў першую чаргу наш урад на чале з прэзідэнтам, палітыка якога адкрыта скіравана на русіфікацыю насельніцтва. Ды што там русіфікацыя. Яна ўжо даўно адбылася! Наша задача цяпер стаіць не проста ў адраджэнні беларускай мовы, а яе ўваскрэсенні. Гэтую задачу пакуль яшчэ можна рашыць, як паказаў досвед Ізраіля, Чэхіі і некаторых іншых краін, дзе мелі месца аналагічныя працэсы моўнага генацыду. Але патрэбна моцная дзяржаўная палітыка. Перад двума лукашэнкаўскімі рэферэндумамі мы яшчэ мелі рэальны шанц стварыць нацыянальную беларускую дзяржаву з сваёй мовай, гісторыяй і традыцыямі. Цяпер зрабіць гэта вельмі складана, калі наагул магчыма.

Анак вярнуся да галоўнай тэмы – мовы Праваслаўнай Царквы. Паглядзім найперш, што ўяўляе з сябе служба ў храме. Набажэнства звычайна працягваецца каля 3–х гадзін увечары (усяночная) і амаль столькі ж раніцай (літургія). Самая адметная рыса для большасці Праваслаўных Цэркваў (рускай, беларускай, украінскай, балгарскай, сербскай і іншых) у тым, што амаль усё набажэнства вядзецца на ***царкоўнаславянскай мове*** (за выняткам пропаведзей, якія звычайна прыстасаваны да мовы прыхаджан). Такая традыцыя ўсталявалася з вельмі даўных часоў – з часоў хрышчэння Кіеўскай Русі князем Уладзімірам.

Царкоўнаславянская мова – гэта не гістарычны архаізм, які даўно трэба памяняць на жывую мову народа. Гэтая мова, як ніякая іншая, здольная слу-

жыць Царкве. Гэта – мова Царквы. Царкоўнаславянская мова – спадчына роўнаапостальных Кірыла і Мяфодзія, яна сведка першага тысячагоддзя хрысціянства, тых часоў, калі яно яшчэ не было падзелена на Усходнюю і Заходнюю плыні. За больш чым 1000-гадовае выкарыстанне царкоўнаславянскай мовы ў набажэнстве ўвесь працэс вельмі ўдасканаліўся. Трапары, кандакі, ірмасы, сціхіры і іншыя формы царкоўнага спеўнага абыходу ўяўляюць з сябе цэльную гарманічную форму і, фактычна, не падлягаюць перакладу на іншыя мовы, у тым ліку на расійскую і на беларускую. Хоць гісторыі вядомыя такія спробы. Так, у 1620 г. у Кіеве выйшла "Кніга аб веры", дзе былі прыведзены пераклады шэрагу малітваў, у тым ліку і "Отче наш". Аднак ні адна з гэтых спроб не дала плёну.

Ёсць яшчэ адзін аспект праблемы – рэлігійны. Гэта – святасць царкоўнай мовы. Айцец Аляксандр Пачопка ў артыкуле з зборніка "Праваслаўе ў славянскіх культурных традыцыях" піша: "Царкоўнаславянскія словы, будучы святымі, асвячаюць нашу родную мову. Яшчэ чарнарызец Храбр, гаворачы пра святога Кірыла, указваў, што славянскія пісьмёны больш святыя, бо стварыў іх святы муж. Пакуль мы жывем малітвамі святых, не загінуць наша Вера, Айчына, Мова, Слова Божае. Дух Святы кіруе нас да вечнага Царства Нябеснага".

Тэма нашай гаворкі ўвесь час вядзецца вакол праблемы пераходу БПЦ на служэнне на беларускай мове. Дазвольце запытаць у прыхільнікаў такога пераходу наступнае: чаму да гэтага часу ў самой Расіі мова набажэнства не стала расійскай, а вядзецца па традыцыі на той жа царкоўнаславянскай мове? Часткова я ўжо адказаў на гэтае пытанне. Дапоўню думкамі вядомых рэлігійных багасловаў. Вось што піша святар Канстанцін Буфееў: "Калі мы пачнем бязлітасна насаджаць новыя формы, (расійскую мову ў набажэнства – *А.А.*), а разам з тым і новы дух, то здарыцца страшэнная рэч. Царква перастане быць

святой і благадатнай, згубіць пераемнасць Святога Пісання, якое толькі і робіць яе бязгрэшнай" (Сети "обновлённого православия". М., 1995).

Важнай праблемай Царквы з'яўляецца пытанне аб мове набажэнстваў. Мова – галоўны атрыбут нацыі, і таму пытанне аб мове ў Царкве вельмі важнае. Яно набыло ў апошні час вялікую актуальнасць як у сувязі з нацыянальным адраджэннем у многіх постсавецкіх рэспубліках ды іншых краін свету, так і ў сувязі з ростам цікаўнасці да хрысціянства і іншых рэлігій свету.

Існуюць два галоўныя кірункі развіцця моў чалавецтва. Адзін з іх, найбольш распаўсюджаны, складаецца з развіцця народных моў, якія атрымалі з часам назву нацыянальных. Як правіла, існуе ўзаемная адпаведнасць паміж нацыяй і мовай, на якой размаўляюць суб'екты гэтай нацыі. Гісторыя нацыянальных моў мае такі ж працяглы час, як і гісторыя чалавецтва.

Рэлігія стала крыніцай фармавання асаблівай формы зносін чалавека з Богам, крыніцай утварэння культавых моў. Функцыі культавых, ці прафетычных, моў нясе зусім невялікая колькасць моў. Галоўныя з іх: ведыйская, санскрыт, старажытнаяўрэйская, арамейская, латынь, грэцкая, авестыйская, палі і царкоўнаславянская мовы. Гэтыя мовы спецыяльна ствараліся як сродак зносін чалавека з Богам. На думку некаторых навукоўцаў, культавыя мовы ствараліся не чалавекам, а былі прадыктаваныя яму Богам.

У пытанні паходжання царкоўнаславянскай мовы – мовы Праваслаўнай Царквы – шэраг багасловаў таксама схіляюцца да думак аб трансцэндэнтнасці яе паходжання. Архімандрыд Сафроній (Сахараў) у кнізе "Видеть Бога как он есть" піша: "Калі б пры здзяйсненні Літургіі выкарыстоўвалі мову штодзённасці, то яна нараджала б у душах і думках прысутных рэакцыі ніжэйшага плану – нашага фізічнага існавання". Больш за тое, а. Сафроній надае цар-

коўнай мове надзвычайны статус: “Словы Літургії і наагул малітваў не ёсць толькі людскія, але і зададзеныя Небам. Царкоўная мова адносіцца да сферы Божага быцця; яна павінна выражаць Адкрыццё Духа і ім народжаныя разумныя ўяўленні”[1] Прафетычнымі мовамі могуць стаць і мовы, якія сфармаваліся як нацыянальныя. Прынамсі, так здарылася з наступнымі мовамі: вэньян, старажытнагрэцкай, лацінскай і арабскай.

Разгледжаныя дзве групы моў – культавыя і нацыянальныя – знаходзяцца звычайна ў непарыўнай сувязі. Аднак гэтая сувязь бывае часам далёка не адназначнай. Вядомы факт, што часта прыхаджане не разумеюць мовы богаслужэння. Да такой з’явы існуе дваістае стаўленне. Згодна з адным з падыходаў, лічыцца, што трэба мяняць культавую мову на зразумелую народу мову, падцвярджаецца гэтая выснова словамі апостала Паўла: “Дбайце пра тое, каб прарочыць, але не забараняйце гаварыць і мовамі” (Кар., 14: 39).

Прыхільнікі артадаксальнага падыходу лічаць, што культавая мова павінна заставацца нязменнай. Галоўны аргумент – гэта святасць мовы, гэта здольнасць мовы ўвесці часовую і смяротную чалавечую істоту ў свет Найвышэйшага плану, Боскасці.

Некаторыя рэлігійныя канфесіі маюць абыякавае стаўленне да мовы богаслужэння. Гэта ўласціва найперш амаль усім пратэстанцкім Цэрквам. Назіраецца такая заканамернасць: чым старыжытней канфесія, чым яна больш нясе рыс артадаксальнасці, тым у большай ступені яна захоўвае нязменнай мову свайго богаслужэння. У Каталіцкім Касцёле зусім нядаўна (пасля Другога Ватыканскага Сабору 1962–1965 гг.) замiж традыцыйнай лаціны было дазволена ўжыванне нацыянальных моў.

Праваслаўная Царква не выпадкова па-грэчаску завецца “артадаксальнай”. Яна больш кансерватыў-

---

[1] Архимандрид Сафроний (Сахаров). Видеть Бога как он есть”. England, Birmongham, 1985. С. 30.

ная за Касцёл, і славянскі праваслаўны свет да нашага часу стала карыстаецца царкоўнаславянскай мовай. Дыскусіі аб магчымасці пераходу на беларускую мову ў праваслаўных набажэнствах вядуцца даўно, і адказ на гэтае пытанне не адназначны.

Пытанне аб прымірэнні розных поглядаў да праблемы культава-нацыянальнага суіснавання вельмі актуальнае. Мае рацыю К. Б. Мячкоўская, якая падкрэслівае: "Практыка, якая выкарыстоўвае веравызнанне як рычаг у нацыянальна-моўнай альбо іншай палітыцы, такая ж заганная, як і практыка, для якой нацыянальна-моўныя праблемы – толькі аргументы ў моўнай прапагандзе"[1].

Апошняе стагоддзе адзначана знакам секулярызацыі Царквы, і згаданае вышэй паслабленне каталіцызму адносна моўнай традыцыі тлумачыцца менавіта імкненнем да самазахавання. Вось тут і ўзнікае пытанне аб далейшым развіцці хрысціянства, аб мове богаслужэння ў будучым.

У ракурсе апошняга пытання трэба адзначыць і яшчэ адну моўную катэгорыю, якая адрозніваецца ад згаданых дзвюх – культавай і нацыянальнай – і звычайна не вылучаецца ў асобную. Гэта мовы вузка-прафесійнага кшталту. Да іх, напрыклад, належыць мова формул – мова матэматыкі; ёсць мовы праграмавання – сродак зносін чалавека з электронна-вылічальнымі машынамі (кампутарамі).

Сярод гэтага, трэцяга класу моў таксама існуюць дзве розныя групы моў. Першая – уяўляе з сябе пэўны код і звычайна зводзіцца да звычайных моў. Напрыклад, мова глуханямых, мова матэматыкі і іншыя. Другая група – мовы як сродак зносін чалавека не з чалавекам, а з іншымі аб'ектамі-існасцямі, што могуць быць зразумелымі толькі гэтаму аб'екту і для яго ствараюцца. Сюды трэба аднесці ў першую чаргу ўсё інфармацыйна-тэхнічнае поле сучасных кампутарных тэхналогій.

[1] Мечковская К. Б. Язык и религия. М., 1998.

Вузкаспецыялізаваны характар зносін паміж чалавекам і кампутарам за апошні час пачаў значна змяняцца ў бок спрашчэння. Традыцыйныя мовы праграмавання, магчыма, ужо ў недалёкім будучым зменяцца на звычайныя, нацыянальныя мовы (ЭВМ пятага пакалення). Адзначым таксама, што працэс спрашчэння моўных зносін ахоплівае і іншыя галіны чалавечай дзейнасці.

Вяртаючыся да нашай тэмы, можна задацца пытаннем: ці не мае аналагічнай тэндэнцыі і развіццё моў набажэнства? Калі зыходзіць з прыведзеных вышэй працэсаў (у галіне кампутарных тэхналогій, напрыклад), то напрошваецца думка аб змене характару моўнага асяроддзя богаслужэнняў – магчыма, і ў гэтай галіне надыдзе час нацыянальных моў, што і здарылася ў каталіцкай канфесіі.

На нашую думку, аднак, нельга адназначна мяняць цяперашнюю мову, у прыватнасці, царкоўнаславянскую праваслаўнага богаслужэння на больш зразумелыя мовы. І гэта аргументавана даказана ў пісаннях Святых Айцоў і багасловаў.

Рашэнне гэтага пытання бачыцца ў наступным.

1. Апошняе дзесяцігоддзе прайшло пад знакам масавага прытока людзей у храмы, значнага павелічэння колькасці вернікаў. Гэты працэс выявіў наступную акалічнасць: большасць грамадзян вельмі недасведчаная ў пытаннях рэлігіі і царкоўнага жыцця. Гэты прабел можна ліквідаваць шляхам змены сістэмы адукацыі. Адна з мер – увядзенне "Закона Божага" як прадмета ў агульнаадукацыйных школах. У тых месцах, дзе жыве большасць праваслаўнага насельніцтва, можна ўвесці элементы (факультатыў) царкоўнаславянскай мовы.

2. Не закранаючы традыцыйнага працэсу богаслужэння, у праваслаўных храмах можна ўводзіць паралельна служэнне на беларускай мове, як гэта зроблена, напрыклад, ў Мінскім Свята-Пятра-Паўлаўскім саборы. Неабходнасць такой формы царкоўнага жыцця вынікае з патрэб нацыянальна свядо-

мых беларускамоўных грамадзян. Магчыма, такія крокі будуць і часовымі – з цягам увацаркаўлення веруючыя змогуць параўнаць (ужо сведама!) тую ці іншую службу са служэннем на царкоўнаславянскай мове і не выключаецца, што яны зменяць свой погляд на карысць тысячагадовай традыцыі.

Падагульняючы, хацелася б сказаць наступнае. Няма падстаў лічыць, што праваслаўнае царкоўнаславянскае богаслужэнне павінна змяніцца на служэнне на нацыянальных мовах. Нельга механічна пераносіць працэс нацыянальнага адраджэння на змену формы царкоўных служб. Больш важным, на нашую думку, з'яўляецца змена вонкавай царкоўнай арганізацыі. Для Беларусі немалаважным з'яўляецца пытанне аб аўтакефаліі Праваслаўнай Царквы, і гэтае пытанне непарыўна звязана з пытаннем аб дзяржаўным суверэнітэце. Аднак аўтакефалія зусім не азначае пераход на беларускую мову богаслужэння. Для уніятаў, якія прываблiваюць пэўнае кола грамадзян беларускамоўнымі службамі, традыцыйнай мовай богаслужэння лічыцца таксама царкоўнаславянская мова. Дзейную беларускамоўную практыку самі уніяцкія святары тлумачаць тым, што вернікі "не атрымалі ў дзяцінстве традыцыйнага выхавання і таму незнаёмыя з царкоўнаславянскай богаслужэбнай практыкай".

Найбольш правільным шляхам царкоўнага развіцця ў Беларусі я лічу паступовую беларусізацыю Царквы шляхам утварэння беларускіх праваслаўных брацтваў па ўсёй краіне, стварэння беларускамоўных асветніцкіх рэлігійных цэнтраў, далучэння да царкоўнага жыцця як мага больш беларускамоўных прыхаджан, сведамай інтэлігенцыі, увядзення прадметаў і курсаў накшталт "Закона Божага" ў навучальных установах... Але падкрэслю галоўнае – плён з усяго гэтага будзе толькі тады, калі на працэс беларусізацыі адгукнецца само насельніцтва. Шлях да Беларускай Нацыянальнай Царквы адзін – праз стварэнне і развіццё не проста незалежнай Беларус-

кай Рэспубліке, а ***незалежнай нацыянальнай Беларускай дзяржавы***. Краіны, якая жыве на падставе беларускай нацыянальнай ідэі, а не на субстраце культуры суседняй краіны.

А пакуль мы чуем толькі рускамоўнае БТ, рускамоўнае радыё і чытаем 99 % рускамоўных газет. Мы стварылі новы саюз з Расіяй, “какого ещё свет не видывал”, аб‘ядноўваемся з Расіяй у адну дзяржаву і ўпарта закрываем беларускія класы, каб потым дачушка нацыянальна нясведамага бацькі заяўляла мне на лекцыі: “Давайте читать по-русски, ведь у нас двуязычие. А я в школе от белорусского была освобождена...”

Вось такія рэаліі. І аўтарам лістоў тыпу ”На дадзенай Богам мове” хацелася б нагадаць наступнае. Калі на “дадзенай”, дык давайце сапраўды апраўдаем нашае Божае прызначэнне і зробім так, каб беларуская мова стала мовай беларускага народа. І калі ён загаворыць на ёй, то можаце не сумнявацца, што праваслаўныя святары ды і святары іншых канфесій без усялякіх высілкаў будуць звяртацца да людзей на дадзенай ім беларускай мове.

### 2. *Быць ці не быць беларускамоўнаму набажэнству?*

Пасля рэферэндума аб статусе беларускай і рускай моў у Беларусі і ўвядзення расійскай мовы ў якасці дзяржаўнай пачаўся імклівы працэс выцяснення беларускай мовы з ужытку практычна ва ўсіх сферах жыцця. Усё, што было зроблена па адраджэнні мовы за кароценькі прамежак часу дзеяння “Закона аб мовах”, было страчана. З 1996 г. ідзе працэс закрыцця беларускіх школ і класаў, перавод справаводства толькі на расійскую мову.

Страціла паступова актуальнасць і пытанне аб беларусізацыі Царквы. Не так па-рабскі паслухмяна паставілася да вынікаў рэферэндуму сама Царква. Дакладней – Праваслаўная Царква, бо я вяду гаворку тут аб ёй. Па-першае, на мой погляд, Праваслаўнай Царкве ў Беларусі, якая толькі пачала ўставаць на ногі пасля бальшавіцкага генацыду, абсалютна не

заслужана дастаецца ад пэўных колаў нацыянальна сведамых, але не падрыхтаваных духоўна грамадзян. Беручы на сябе смеласць быць суддзямі ў такіх далікатных пытаннях, як вера і Царква, і безапеляцыйна сцвярджаючы, што Царква ўсяляк працівіцца беларускаму адраджэнню, што яна праводзіць палітыку Масквы, гэтыя людзі праяўляюць часта простую недасведчанасць, бо на самай справе ўсё зусім не так. Многія не ведаюць таго, што шэраг святароў ужываюць беларускую мову ў сваёй практыцы, вядзецца праца па перакладзе Бібліі, набажэнства і трэбаў на беларускую мову. У Жыровіцкай духоўнай семінарыі багаслоўе і шэраг іншых прадметаў вядзецца на беларускай мове.

Вышэй я выказаў думку аб важнасці царкоўнаславянскай мовы ў праваслаўным богаслужэнні. Больш за тысячу гадоў служыцца літургія на мове Кірылы і Мефодзія – царкоўнаславянскай мове. І, зразумела, за гэты вялікі час богаслужэнне вырасла і выкрышталізавалася ў аб'ёмную, закончаную сістэму, якая спалучае і багаслоўе, і навуку, і паэзію, і шмат іншага. Сотні тоўстых тамоў займае апісанне ўсёночнага трывання, літургіі, гадзін, шматлікіх акафістаў, канонаў і іншых відаў богаслужэння. Сотні кніг прысвечаны тлумачэнню Святога Пісання, апісанню Жыцій Святых і іх вучэнняў. І ўся гэтая праца рабілася, ды і робіцца цяпер на царкоўнаславянскай мове. Таму, зразумела, адначасна перайсці на богаслужэнне з царкоўнаславянскай мовы на іншую мову проста немагчыма.

Аднак усё гэта не азначае, што мы павінны сядзець склаўшы рукі і нічога не рабіць у кірунку беларусізацыі Царквы. Складанасць праблемы яшчэ і ў тым, што гісторыя не данесла да нас ні беларускай літургіі, ні ўсяночнай, ні беларускіх трэбаў. Мы ведаем толькі некалькі беларускіх калядных і велікодных кантаў XVI–XVIII стст., якія аднолькава былі папулярнымі ў Беларусі як сярод праваслаўных, так і сярод католікаў і уніятаў.

Часам, гаворачы аб беларускамоўных спевах у Царкве, прыводзіцца прыклад уніі як Царквы, дзе яны адбываліся (гл. артыкул С. Марозавай "Моўная палітыка і практыка Уніяцкай Царквы ў Беларусі" Зб. "З гісторыі уніяцтва ў Беларусі", Мн. 1996, стар. 110.). Але ні ў названым артыкуле, ні ў іншых няма аніводнага пацверджанне гэтаму сцверджанню. У большасці ж крыніц сцвярджаецца, што набажэнства уніяты праводзілі на царкоўнаславянскай мове. І толькі ў апошнія гады існавання уніі, перад раздзелам Рэчы Паспалітай, набажэнства ў Уніяцкай Царкве значна адыходзіць ад традыцыйнага, але не на карысць беларускай мовы, а польскай.

Такая няпростая сітуацыя з беларускай мовай у Праваслаўнай Царкве вымагае вельмі сур'ёзнага падыходу да перакладу царкоўных тэкстаў. На гэтую працу патрэбен не адзін год.

Трэба адзначыць і наступную акалічнасць: свецкія ўлады выглядаюць значна горш, чым царкоўныя. Яны прадстаўляюць краіну, быццам бы і незалежную ад Расіі, але ўпарта не жадаюць беларусізацыі, размаўляюць выключна па-расійску, а ўсялякія беларускамоўныя адзінкі выглядаюць смешнымі донкіхотамі на іх прагматычна-здрадніцкім прарасійскім фоне.

У "Царкоўным слове" (№ 5,1997 г.) на гэтую тэму быў змешчаны мой артыкул "На дадзенай Богам мове". І вось неўзабаве ў дванаццатым нумары той жа газеты быў змешчаны "разгромны" артыкул нейкай І. Кірылюк пад назвай "Действительно ли существует проблема языка в церкви?" І хоць я ў сваім артыкуле пісаў аб складанасцях пераходу на беларускую мову ў Царкве, гаварыў аб непадрыхтаванасці нашых прыхаджан адразу ўспрыняць Святое Пісьмо на роднай мове, І. Кірылюк звінавачціла мяне ва ўсіх магчымых грахах і няпраўдах. Выказваючы, фактычна, прарасійскую, шавіністычную пазіцыю такіх адыёзных арганізацый, як Славянскі Сабор "Белая Русь" ці Ліберальна-дэмакратычнай партыі Жырыноўскага, на трох старонаках газеты аўтарка жыруе

на сваёй нянавісці да ўсяго беларускага і асабіста да Астапенкі, называючы мяне “под овечьей одеждой поборника “царкоўнай мовы”. Па “канцэпцыі” спадарыні Кірылюк “...проблема языка, искусственно разжигаемая, существует не в реальной церковной жизни, а лишь на страницах прессы... Но нашлась заботливая рука, которая постаралась, чтобы грязная ложь о православии ... была перенесена со страниц “Свабоды” и “ЛіМа” и вылита на головы читателей “ЦС”. Прыхільніца дзяржаўнага статуса двухмоўя ў Беларусі піша: “Примером того, как мирно и беспроблемно уживаются белорусско и русскоязычие в нашей Церкви является повседневная жизнь храмов соседей – Свято-Духова и Свято-Петро-Павловского соборов”. Недасведчаны чытач можа падумаць, што і сапраўды адзін з гэтых храмаў беларускамоўны, а другі рускамоўны. На жаль, гэта не так. У абодвух храмах набажэнства вядзецца аднолькава – на царкоўнаславянскай мове, а пропавядзі – на расійскай. Адно што: у храме на Нямізе пастурова ўводзіцца богаслужэнне на роднай мове (раз у месяц літургія і кожны тыдзень акафіст), а ў Кафедральным саборы – па-беларуску чытае пропаведзі а. Сергій Гардун. Аб гэтым я пісаў у сваім артыкуле ў “ЦС”.

Далей І. Кірылюк адкрыта раскрывае сваю непрызнасць да ўсяго беларускага, да ўсяго нацыянальнага: “Внутри церковной ограды есть только одна национальность – христианин”. Не дапускаючы нават думкі аб аўтакефаліі нашай Царквы, яна піша: “Не является само по себе возбуждение подобной дискуссии (аб мове і аўтакефаліі – *А.А.*), которую провоцирует автор (г.зн. – я), используя “ЦС”, средством разделения, выявления церковных людей, которые будут “кричать об автокефалии”. І. Кірылюк, магчыма, не ведае, што беларуская мова была дзяржаўнай у нашай старажытнай беларускай дзяржаве – Вялікім княстве Літоўскім, на ёй выдавалася і Святое Пісьмо – Біблія Францыска Скарыны. Хацелася б нагадаць у сувязі з гэтым словы з Дзеянняў Святых Апоста-

лаў: “Ці ж не ўсе, што гавораць, Галілеяне? Як жа мы чуем ад іх кожны сваю мову? Мы ж родам з Тарфіі, Лідзіі..., але ўсе мы чуем, як яны гавораць *нашымі мовамі* пра вялікія цуды Божыя” (Дзеі 2: 7–11).

Пра неабходнасць выкарыстання роднай мовы ў богаслужэнні гаварыў падчас літургіі ў дамавым храме “Усіх беларускіх святых” 1 сакавіка 1992 г. мітрапаліт БАПЦ а. Мікалай. Ён казаў: “Наша беларуская мова – мова святая, і ёй належыць святое месца ў Праваслаўнай Царкве”.

І, нарэшце, апошняе, пра што хацелася б сказаць. Гэта – тыя станоўчыя змены, што адбываюцца ў царкоўным богаслужэнні. Так, з верасня 1997 г. у Свята-Петра-Паўлаўскім саборы на беларускай мове служаць малебен “За беларускі народ” і акафіст Тром Віленскім Мучанікам, а з 2002 г. – літургію. Пераклад літургіі на беларускую мову з царкоўнаславянскай мовы зрабіў вядомы дзеяч у галіне беларусізацыі Царквы протаіерэй Свята-Духавага храма г. Мінска а. Сергій Гардун.

Ва ўсім гэтым застаецца дзіўным адзін факт. Незразумела наступнае: дзе нашы адраджэнцы? Дзе сведамая праваслаўная інтэлігенцыя? Згаданы акафіст і малебен праходзяць у паўпустым храме. Прысутнічаюць на гэтай службе ўсё тыя ж бабкі ды некалькі маладых людзей.

Таму трэба пачынаць з другога канца, пачынаць з нас саміх. Бо атрымліваецца, што размоў пра Царкву шмат, а вось каб прыйсці ў храм, справіць службу, свае духоўныя патрэбы на роднай мове – дык ахвотнікаў мала. Навошта ж наагул ставіць пытанне аб беларускамоўным набажэнстве, калі самі спадары сведамыя беларусы яго ігнаруюць?

### 3. *Мова, Царква і палітыка*

Крытыка выказаных поглядаў на мову Праваслаўнай Царквы вядзецца часам людзьмі, якія стаяць на дыяметральна процілеглых пазіцыях. Аналізуючы іх, я прыйшоў да далёка не новай высновы: царкоўная дзейнасць і ўсялякая наагул палеміка на гэтую тэму

наўпрост звязаны з палітыкай. І як бы не адхрышчваліся ад палітыкі аўтары шматлікіх артыкулаў – іх палітычная пазіцыя відвочна.

А можа, існуе магчымасць, калі не пазбегнуць палітыкі, дык хоць неяк зменшыць яе ўціск? Як выказаць сваю думку максімальна аб'ектыўна і далікатна, не закрануўшы балючых струн свайго апанента?

Мабыць, менавіта ў гэтым і ёсць найвялікшая цяжкасць любых дыскусій. І як тут не згадаць "метадаў" прапаганды Святога Пісьма, якія практыкуюць баптысты і іншыя пратэстанцкія канфесіі. Вось прыклад такой "народнай агітацыі" з назіранняў аўтара на вуліцах Мінска. Думаю, і Вам знаёмая постаць жанчыны з Бібліяй у руцэ, якая едзе з Вамі ў адным тралейбусе, гучна дэкламуе біблейскія тэксты і самым агрэсіўным, гучным голасам заклікае верыць у Хрыста. А едуць у транспартным сродку розныя людзі – і атэісты, і веруючыя, і проста тыя, якія спяшаюцца на працу і рыхтуюцца да шматлікіх будзённых спраў. Канечне, такая агітацыя мала каго закране, калі не выкліча абурэння. І ў мяне ад такой "прапаганды" рэлігійны энтузіязм не павялічваўся.

Вось і прыведзены вышэй артыкул І. Кірылюк з'яўляецца ўвесь прасякнуты духам катэгарычнасці, што нават адзначана ва ўступным слове рэдакцыі: "автор, к сожалению, как обычно случается у нас, духовно немощных, претендует на исключительную правильность своих суждений". Ужо ў першых радках артыкула ставіцца пад сумненне само існаванне праблемы мовы ў Царкве: "У них (прыхаджан храмаў – *А.А.*) такой вопрос вызывает удивление и недоумение..." Але ж праблема ёсць, існуе цэлае кола людзей, якія лічаць неабходным увядзенне беларускай мовы ў набажэнства. Так, спадар А. Жукоўскі ў артыкуле пад назвай "Бог чуе нас па-беларуску" ("Наша слова", 13 траўня 1998 г.) выказваецца за адназначнае вырашэнне гэтага пытання: беларусы павінны звяртацца да Бога на роднай мове.

Праблема мовы ў Царкве, безумоўна, ёсць. Зразумела, прыхільнікаў беларушчыны няшмат сярод прыхаджан, але ж іх – гэтых прыхільнікаў – няшмат і ў маштабах усяго нашага дэнацыяналізаванага грамадства. Аднак яны ёсць. І за іх трэба змагацца. Царква павінна змагацца за кожную з чалавечых душ, рабіць усё магчымае для задавальнення нацыянальных патрэб кожнага сведамага беларуса. І калі гэта патрабуе дадатковых намаганняў, калі трэба пайсці на пэўную ломку стэрэатыпаў – у нашым выпадку пераходу ў богаслужэнні на беларускую мову, то гэтага не варта пазбягаць, а ісці да яго насустрач з адкрытым сэрцам.

І. Кірылюк сама нагадвае аб тым, што ў РБ і руская, і беларуская мовы з'яўляюцца дзяржаўнымі. Але ў нас няма ніводнага праваслаўнага храма, дзе б служэнне вялося цалкам на беларускай мове. Дзе ж маё і многіх іншых канстытуцыйнае права на беларускамоўную літургію, ці хоць бы пропаведзь?

Зусім дзіўнай выглядае логіка апаненткі па гэтым пытанні. Яна робіць абсалютна незразумелыя з пазіцыі здаровага сэнсу вывады: "У свеце дадзенага артыкула Канстытуцыі РБ, сама па сабе пастаноўка праблемы аб пераходзе Царквы на тую ці іншую мову... неправамерная і сведчыць пра таталітарны падыход". Прабачце, але ж відавочна якраз адваротнае – менавіта таталітарны падыход і ўяўляе сабай аднамоўе!

Неразуменне сутнасці нацыянальнай ідэі, сведамае запалохванне чытача ўсім нацыянальным сустракаецца ў згадваным артыкуле на кожным кроку. Напрыклад, аўтар піша (пра мяне): "верник – кому и чему – национальной идее или истине?", не разумеючы таго, што нацыянальная ідэя – складнік, істотная частка рэлігійнага жыцця. І зусім не "бессмыслица" спалучэнне слоў "праваслаўны нацыяналіст". Бо нацыяналіст – у святле нашага разумення – можа быць і праваслаўным, і каталікам, і атэістам. Аднак сваё апраўданне нацыяналізм знаходзіць толькі ў хрысціянстве, пра што і пісалі

знакамітыя рэлігійныя філосафы М. Бярдзяеў, Н. Кляпенін, І. Ільін і іншыя.

Аднак не ва ўсіх адраджэнцаў знаходзяць падтрымку мае думкі. Атрымліваецца, што не задавальняюць найбольш нецярплівых з нашых сведамых беларусаў мае аргументы адносна цяжкасцей пераходу ад служэння ў Царкве на царкоўнаславянскай мове на беларускую. Як прыклад станоўчага вырашэння праблемы беларускамоўнага набажэнства, часта прыводзяць прыклад імшы па-беларуску ў некаторых касцёлах.

На гэты конт можна сказаць наступнае. З вялікай нацяжкай можна назваць беларускую мову ў Касцёле, беларускай. Бо звычайна святары – наколькі мне даводзілася чуць – праводзяць імшу з такім моцным польскім акцэнтам, што гэтую мову хутчэй можна назваць польскай з беларускай лексікай. Хоць зусім нядаўна, улетку 2008 г., я выпадкова трапіў у касцёл у Відзунах, дзе атрымаў вялікую асалоду ад цудоўнага беларускамоўнага набажэнства.

Падкрэслю ў сувязі з гэтым і такую думку. Імкненне да пераходу ў касцёлах на беларускую мову выклікана зусім не любасцю ксяндзоў да беларусаў. А абумоўлена чыста палітычнай кан'юнктурай – імкненнем дагадзіць самым "нецярплівым адраджэнцам", задаволіць іх амбіцыі і як галоўны вынік – зацягнуць у Касцёл. І для іх не важна, што за вернік прыйшоў... Для іх галоўнае не вера і не тое, як уяўляе сабе чалавек Бога і наколькі ён аддана служыць Хрысту, а істотны толькі факт прыналежнасці да Касцёла. У гэтым праяўляецца адвечная прага католікаў да экспансіі, да ўцягнення ў сваё лона "ўсіх і ўся". У праваслаўі не так. Праваслаўе – глыбінная вера, ёй ужо два тысячагоддзі, і яна ўвабрала вялізны пласт рэлігійнай культуры розных народаў і розных часоў. І стаць праваслаўным, толькі пераступіўшы парог храма, яшчэ далёка не дастаткова. Гэта доўгі працэс, які вымагае ад чалавека вялікага цярпення і працы. Таму і пераклады Святога Пісьма, што вя-

дуцца пастаянна – не простая праца. Напрыклад, цяпер існуе два пераклады на беларускую мову "Новага Запавету" – канадскі і наш, зроблены Васілём Сёмухам. Але ніводзін з іх нельга назваць дастатко-ва дасканалым. Цяпер вядзецца новы, трэці пераклад Біблейскай камісіяй, якая, выкарыстоўваючы вопыт папярэднікаў, імкнецца пазбегнуць іх памылак.

Як мы адзначылі – палітычны фактар – важны элемент у працы Касцёла. Але было б няшчырым абысці палітычны фактар у Праваслаўнай Царкве. Ёсць такія святары, што шчыра вераць ідэолагам вялікадзяржаўнага праваслаўя і рух за нацыянальнае адраджэнне ў Царкве лічаць непатрэбным. Але гэта таксама вынік шматгадовага ідэалагічнага прэсінгу Масквы. Адным словам, у Царкве, як і ў грамадстве, адлюстраваны розныя палітычныя плыні.

Не трэба думаць, што ўзніклая рэлігійная сітуацыя ў нашай пакутнай Беларусі нейкая асаблівая. Палітычны фактар прысутнічае і прысутнічаў усюды і заўсёды. Так, у суседняй нам Украіне ёсць аж тры розныя царкоўныя арганізацыі, кожная з якіх праваслаўная. Гэта: Украінская Праваслаўная Царква Маскоўскага Патрыярхату, Украінская Праваслаўная Царква Кіеўскага Патрыярхату, Замежная Аўтакефальная Украінская Праваслаўная Царква. Паміж імі ідзе безупынная барацьба, і пакуль не відаць аніякага прасвету. Вось дзе праблема!

Безумоўна, царкоўная нестабільнасць і непаразуменне – вынік агульнага палітычнага крызісу. У краін з больш-менш стабільнай сітуацыяй у грамадстве нармалізуецца і царкоўнае жыццё. Напрыклад, у Германіі прыкладна палова католікаў і палова пратэстантаў, але паміж імі назіраецца вялікая талерантнасць. Ведама, што ў гісторыі не заўсёды было так. Бывала вельмі змрочна і нават трагічна. Узгадаем, напрыклад, знакамітую Варфаламееўскую ноч...

## 9. Сацыяльна-палітычная канцэпцыя нацыі ў хрысціянстве

На працягу ўсёй гісторыі чалавецтва нацыянальныя, этнічныя, племянныя і іншыя чалавечыя супольнасці былі звязаны з рэлігійнымі вераваннямі. Звычайна пэўны народ вызнаваў і пэўную рэлігію – прынамсі, гэта добра відаць на прыкладзе язычніцкіх народаў: у кожнага народа свой почат багоў.

Але надыход хрысціянскай эры паклаў пачатак новай Царквы, якая па сваёй прыродзе мае ўсяленскі, наднацыянальны характар. У хрысціян «няма розніцы паміж іудзеем і элінам» (Рым. 10:12). Тым не менш, гэта не азначае, што хрысціяне адмаўляюць нацыянальнасць. Наадварот, Царква злучае ўсяленскасць з кожнай асобнай нацыяй.

Праваслаўны падыход да нацыі грунтоўна выкладзены ў “Асновах сацыяльнай канцэпцыі Рускай Праваслаўнай Царквы”, якая была прынята на Юбілейным Архіерэйскім Саборы Рускай Праваслаўнай Царквы ў 2000 г. У “Асновах” падкрэсліваецца, што ўсяленскі характар Царквы зусім не азначае адмовы ад нацыянальнай самабытнасці. *Хрысціянскі патрыятызм адначасова праяўляецца ў стаўленні да нацыі як этнічнай супольнасці і як супольнасці грамадзян дзяржавы. Праваслаўны хрысціянін заклікаНЫ любіць як сваю Айчыну, якая мае тэрытарыяльнае вымярэнне, так і сваіх братоў па крыві, што жывуць па ўсім свеце.*

Царква павінна таксама дбаць аб развіцці нацыі, павышэнні яе аўтарытэту: *Хрысціянін заклікаНЫ захоўваць нацыянальную культуру, народную самасведамасць*[1]. Праваслаўная палітыка надае вялікую ўвагу нацыі, таму што яна ў адказе перад Богам і перад Усяленскай Царквой. *Нацыянальнае – гэта цалкам неабходная частка праваслаўнага светагляду*, – адзначае таксама палітолаг В. Г. Махнач[2].

---

[1] Основы социальной концепции Русской Православной Церкви. М., Изд. Московской Патриархии, 2000. С.45.

[2] Махнач В. Л. Параметры христианской политики // Зо-

Увага Праваслаўнай Царквы да нацыі выяўляецца і ў тым, што яна не цэнтралізаваная: кожная дзяржава можа мець сваю незалежную мітраполію, сваю аўтакефальную Царкву. Цяпер у свеце 15 кананічных аўтакефальных Цэркваў. Усе гэтыя аўтакефальныя Цэрквы маюць кананічнае зацвярджэнне – прызнаны ўсімі Пamеснымі Праваслаўнымі Цэрквамі і зацверджаны Канстанцінопалем. Аднак ёсць аўтакефальныя Цэрквы, якія не маюць кананічнага пацверджання сваёй аўтакефаліі, напрыклад, Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква (БАПЦ).

Сацыяльна-палітычная канцэпцыя Каталіцкага Касцёла выкладзена паслядоўна ў працах як свецкіх аўтараў[1], так і ў энцыкліках рымскіх пап.

Пазіцыя Рыма-каталіцкага Касцёла наступная: Касцёл ёсць цэнтралізаваная, іерархічная, сусветная арганізацыя. За ёй вырашальная роля ў міжнародным праве, якая палягае на найвышэйшай уладзе папы[2]. Галоўная форма дактрынальных папскіх дакументаў – энцыклікі, якія пішуцца для духавенства і вернікаў, а таксама для ўсіх людзей добрай волі. Пачаткам сучаснай грамадскай дактрыны Касцёла ёсць энцыкліка папы Леона XIII ад 1891 г. «Rerum novarum» («Новая гаворка»). Упершыню ў гэтым дакуменце было ўведзена паслабленне для папскай улады, адступленне ад тэзы аб поўнай залежнасці свецкай улады ад касцёльнай іерархіі (да гэтага лічылася, што грамадства ёсць свецкі працяг Касцёла). У пантыфікатах Яна XXIII і Паўла VI былі ўлічаны працэсы ўтварэння новых нацый-дзяржаў і прыняты тэзіс аб аўтаноміі і ўзаемнай незалежнасці Касцёла і грамадства, адносіны паміж імі трактуюцца на прынцыпах супрацоўніцтва.

---

лотой лев: Издание русской консервативной мысли. Пушкино, 1998, № 3–4. С.45–50.

[1] Гл., напрыклад, Grzybowsky K., Sobolewska B. Doktryna polityczna i spoeeczna papiestwa (1766–1968). Warszawa, 1971.

[2] Czaja J. Prawnomiędzynarodowy status Watykanu. Warszawa, 1983.

Ян Павел II надаў папярэднім дакументам сваю, арыгінальную трактоўку. Папа надаў Каталіцкаму Касцёлу і яго дактрыне маральнасці статус адзінай сілы, якая ў стане праз свае дзеянні прыдаць сакральны сэнс жыццю людзей і ўсёй іх дзейнасці. У грамадскіх справах Ян Павел II канцэнтруе ўвагу на праблемах сітуацыі чалавека ў сучасным свеце. Папа рэвалюцыянізуе тэалогію праз замену тэацэнтрызму антрапацэнтрызмам. Прымаючы ісціну, што Бог сам паказаў на сваю адзіную, сапраўдную Царкву, праз удзел у яе таінствах чалавек можа спадзявацца авалодаць блажэнным жыццём ужо тут, на Зямлі.

Важным крокам для каталіцкай думкі стала ідэя паразумення паміж людзьмі розных канфесій, што атрымала назву «ідэя хрысціянскай садружнасці». Царква і дзяржава з'яўляюцца інстытутамі, прадпісанымі Богам для дабрабыту чалавека. Суадносіны паміж імі – шчыльнае супрацоўніцтва. Функцыя Царквы – вучыць ісціне і кіраваць таінствамі. Функцыя дзяржавы – устанавіць парадак і справядлівасць у грамадстве. Па пытаннях веры і маралі дзяржава звяртаецца да аўтарытэту Касцёла і дапамагае яму ў барацьбе з грахом. Царква, у сваю чаргу, павінна звяртацца да аўтарытэту дзяржавы і вучыць людзей, якія не хочуць падпарадкавацца ці выступаюць супраць устаноўленых законаў. Такая ідэалогія сучаснай Каталіцкай Царквы вельмі блізкая да дактрыны Праваслаўнай Царквы Візантыі, дзе ўпершыню была ажыццёўлена ідэя сімфоніі Царквы і дзяржавы.

Нацыянальная ідэя ў каталіцкай дактрыне займае належнае месца. Яна не стаіць востра сярод развітых капіталістычных нацыянальных дзяржаў, такіх як Італія ці Францыя, але ў посткаланіяльных і постсавецкіх дзяржавах, а таксама сярод этнасаў, якія не акрэслілі яшчэ сваю нацыянальную ідэю, не стварылі сваю нацыю, гэтая ідэя вельмі актуальная.

Яшчэ не так даўно вельмі імкліва развівалася нацыянальная думка ў каталіцкім асяродку Заходняй Беларусі (1921–1940). Узгадаем выдатных дзеячоў

беларускага адраджэння таго перыяду. Гэта ксёндз Кастусь Стэповіч (псеўданім Казімір Сваяк), ксёндз Адам Станкевіч, Вінцэнт Гадлеўскі, Уладзіслаў Талочка і іншыя.

Найбольш выразна сфармуляваў нацыянальную ідэю і панятак нацыі Адам Станкевіч. У кнізе "Хрысціянства і беларускі народ" ён пісаў: *Галоўныя прынцыпы хрысціянскай навукі – гэта прызнаваць асаблівасць чалавека як першага і адзінага асяродку ў культуры.* Далей А. Станкевіч засяроджваецца на праблеме нацыі ў хрысціянстве, якую ён бачыць як дылему іх адзінства: *...Кожная нацыянальнасць у святле Хрыстовай навукі ёсць матэрыялам не для нішчэння яго, але для тварэння з яго культурных вартасцяў* (Станкевіч Адам. Хрысціянства і беларускі народ. Вільня, 1940).

Пытанне аб мове Касцёла, як і для Праваслаўнай Царквы, з'яўляецца надзённым. Доўгі час набажэнствы вяліся выключна на лацінскай мове. Як мы ўжо гаварылі, толькі на II Ватыканскім Саборы было прынята рашэнне (Аджорнамэнтэ – асучасванне) аб дазволе праводзіць імшу на родных мовах. У Польшчы пераход на польскую мову не выклікаў ніякіх цяжкасцей і паспрыяў аўтарытэту Касцёла. У Беларусі, якая не мае да гэтага часу вызначанай нацыянальнай ідэі на дзяржаўным роўні, імша праводзіцца на дзіўным спляценні беларускай, польскай і рускай моў, кожная з якіх дамінуе ў залежнасці ад рэгіёна, нацыянальнага складу вернікаў і палітычных прыхільнасцяў зацікаўленых асоб.

Трэцяя асноўная плынь хрысціянства – пратэстанцтва. Не існуе сацыяльна-палітычнай канцэпцыі нацыі і дзяржавы, адзінай для ўсіх шматлікіх форм пратэстанцтва, як прыведзеныя вышэй канцэпцыі Праваслаўнай і Каталіцкай Цэркваў. Аднак некаторыя пратэстанцкія адгалінаванні (прасвітарыяне, квакеры і яшчэ некалькі менш значных) маюць характар рэлігійна-палітычны. Некаторыя даследнікі, напрыклад, М. Вебер, лічаць, што дактрына і этыка

пратэстантызму мелі значны ўплыў на развіццё капіталізму. Гэта было звязана з палітычным характарам рэфармацыі ў XVI ст., а таксама з тэндэнцыямі да арганізацыйных і дактрынальных падзелаў унутры самаго пратэстантызму, у выніку якога паўстала некалькі соцень незалежных пратэстанцкіх груповак, кожная з якіх мела асобную назву.

Важным быў той факт, што пратэстанты адкінулі каталіцкі тэзіс аб бязгрэшнасці папы рымскага, бо яны прызнавалі толькі аўтарытэт Бібліі. Гэта дало магчымасць пазбавіцца ад мноства штучных правілаў, складаных абрадаў і тым самым наблізіць хрысціянства да простага народа. Спрашчэнне абрадаў і рацыяналізм хутка зрабілі пратэстанцтва самай масавай рэлігійнай канфесіяй у шэрагу краін свету. Гэта, у сваю чаргу, дало штуршок да развіцця свецкага нацыянальнага руху. Э. Сміт адзначае падабенства паміж рэфармізмам і раннім нацыяналізмам[1], які ўзнік у першы перыяд фармавання нацый (пасля 1789 г.). Пратэстанты «пайшлі ў народ», яны ўзнялі свецкую адукацыю на небывалы да эпохі капіталізму ровень. Утварыўся адукаваны сярэдні пласт гараджан. Нацыянальныя эліты пашырыліся да сярэдняга і нават ніжэйшага класу. Свецкая адукацыя ў сваю чаргу забяспечыла нацыі здольнасць да самаўдасканалення і рухомасці.

Пратэстанты першымі за ўсіх хрысціян увялі служэнне на родных мовах і распрацавалі сістэму нацыянальнай адукацыі. Не дзіва, што за кароткі час розныя адгалінаванні пратэстанцтва распаўсюдзіліся па ўсёй Зямлі, а ў некаторых краінах (Швецыя, Эстонія, Данія, ЗША і г. д.) сталі даміноўнымі веравызнаннямі. Дзякуючы пратэстантам і апостальскія Цэрквы – каталіцкая і праваслаўная – распачалі сваю сістэму нацыянальнай адукацыі. У католікаў у свой час набыў вялікую ведамасць ордэн езуітаў, які ства-

[1] Сміт Энтані. Нацыяналізм у XX стагоддзі. Мн., 1995. С. 45.

рыў сур'ёзную канкурэнцыю пратэстантам сваёй разгорнутай сістэмай адукацыі і асветы.

Як бачым, усе хрысціянскія канфесіі – каталіцызм, праваслаўе і пратэстанцтва – прыхільна ставяцца да нацыянальнай ідэі, нацыі і нацыяналізму. Больш за тое, іх сувязь непадзельная, і будучыня чалавецтва – ва ўсё большай інтэграцыі ідэалогіі хрысціянства з нацыянальнай ідэяй, ідэяй нацыі і нацыяналізму.

## 10. Хрысціянскі нацыяналізм. Праваслаўны нацыяналізм

*Хрысціянскі нацыяналізм ёсць* ***захапленнем*** *сузірання свайго народа ў плане Божым, у дарах Яго Боскай Ласкі, у шляхах Яго Царства.*

*Гэта ёсць* ***удзячнасць*** *Богу за гэтыя дары, але гэта і* ***жалоба*** *аб сваім народзе, калі народ не на вышыні гэтых дароў*, – так азначае Іван Ільін існасць хрысціянскага нацыяналізму ("Основы христианской культуры". СПб., 2004, с. 59.) Ён вылучае (курсівам у тэксце) тры галоўныя складнікі хрысціянскага нацыяалізму: ***захапленне, удзячнасць і жалоба*** ў дачыненні да свайго народа.

У гэтых трох словах выказана існасць асобнай формы нацыяналізму – хрысціянскага, якая не сустракаецца ў іншых нацыяналізмах. ***Захапленне*** ("восторг" – руск.) – гэта такое шчырае адчуванне любасці да свайго народа, якое не патрабуе падзякі ці нейкага зваротнага дабра. Яно ўласціва толькі хрысціянству. Гэта – агапэ-любасць, найвышэйшая форма любасці – "незямная".

***Удзячнасць*** свайму народу выходзіць толькі з таго, што ты належыш да гэтага народа, што Госпад даў табе змогу служыць гэтаму народу.

І, нарэшце, ***жалоба*** за няўдачы і беды свайго народа. *Я не маю права пакінуць гэты народ у цяжкую яго хвіліну, я буду з ім заўжды, што б ні здарылася* – вось пазіцыя сапраўднага хрысціяніна і пат-

рыёта. Але хрысціянская жалоба не ёсць пасіўным плачам, яна вымагае актыўнай пазіцыі, поўнага гуртавання сіл, калі трэба – самаахвярнасці.

Хрысціянскі нацыяналізм – гэта найвышэйшая форма нацыяналізму, гэта хутчэй містычны шлях да Бога і сваёй нацыі ў іх адзінстве ды гармоніі.

На практыцы хрысціянскі нацыяналізм, як і само хрысціянства, падзяляецца паводле канфесійнай прыкметы. У Расіі дастаткова ведамы, прыкладам, праваслаўны нацыяналізм.

Шэраг расійскіх філосафаў (Бярдзяеў, Кляпенін, Ільін, Салаўёў, Лявонцьеў, інш.) прысвяцілі шмат якія свае творы разгляду праблемы нацыяналізму як пэўнай ступені хрысціянскай любасці. Усе ўспомненыя аўтары былі паводле веравызнання праваслаўнымі, і ў вялікай ступені пад хрысціянствам яны разумелі праваслаўны тып веры. Нідзе ў каталіцкім ці пратэстанцкім асяроддзі не сустракаецца (прынамсі, аўтар не сустракаў) такога грунтоўнага аналізу нацыяналізму ў кантэксце хрысціянства, як у праваслаўных рэлігійных філосафаў канца XIX – першай паловы XX стст.

Узніклі і тэрміны: *праваслаўны нацыяналізм* і нават – *праваслаўная цывілізацыя.* І ўвесь спектр праблем, звязаных з гэтымі паняткамі, узнік у асяроддзі рускага праваслаўя, рускай Праваслаўнай Царквы і расійскага грамадства яшчэ ў канцы XIX ст. і набывалі напаўненне праз усё XX ст. Палітычна актыўныя праваслаўныя ў Расіі – гэта, зазвычай, рускія нацыяналісты.

Найбольш выразна ідэю праваслаўнага нацыяналізму яшчэ ў канцы XIX ст. сфармуляваў Д. А. Хамякоў у сваёй знакамітай кнізе “Православие, самодержавие, народность”. Напісаны грунтоўныя працы такімі мыслярамі, як М. Я. Данілеўскі, П. Б. Струве, рускімі манархістамі – Л. А. Ціхаміравым, І. Л. Саланевічам і сучасным беларускім манархістам Валерыем Ерчаком.

За савецкім часам усе гэтыя працы былі пад заба-

ронай на шмат гадоў, а праваслаўны нацыяналізм пайшоў у падполле.

На пачатку 90-х гг. XX ст. праваслаўны нацыяналізм расквітнеў з новай сілай. Спачатку была скандальная "Памяць" Дзмітрыя Васільева, "Чорная сотня" А. Штыльмарка, потым знакамітае "Рускае нацыянальнае адзінства (РНЕ)" А. Баркашова, "Саюз праваслаўных грамадзян (СПГ)" і брацтва "Радaнеж" з газетай і радыёстанцыяй.

Для большасці нацыяналістычных арганізацыяў Расіі ў 90-х гг. XX ст. праваслаўе было хутчэй прыкметай нацыянальнай ідэнтычнасці, а не самастойнай хрысціянскай каштоўнасцю. Нават камуністы на чале з Г. Зюганавым дапусцілі праваслаўе ў сваю сведамасць і ўпершыню за шматгадовае панаванне КПСС пачалі станоўча ставіцца да праваслаўных вернікаў.

Якія ж рысы характэрныя для сучаснага расійскага праваслаўнага нацыяналізму?

***Першае.*** Расійскі праваслаўны нацыяналізм грунтуецца на ідэі аднаўлення праваслаўнай манархіі, хоць канкрэтнага шляху ніхто з тэарэтыкаў не прапаноўвае.

***Другое.*** Праваслаўны нацыяналізм выступае за пашырэнне тэрыторыі Расіі. Гэтую ідэю падтрымліваюць многія, а ў нашумелым артыкуле А. Салжаніцына "Как нам обустроить Россию?" прапанаваны нават план расійскай экспансіі.

Вось характэрнае выказванне А. Салжаніцына: "Беларусь, безумоўна, павінна быць далучана, а Украіна – хутчэй за ўсё, уся ці большай часткай, таму што беларусы і ўкраінцы часцей за ўсё разглядаюцца як частка адзінага рускага народа (ёсць цікавы варыянт, узніклы ў асяроддзі СНД, – праводзіць мяжу не па этнічнай, а па канфесійнай большасці)".

Ідэалогія праваслаўнага нацыяналізму ў Расіі ідзе вельмі далёка. Ягоныя прыхільнікі здольныя нават перакрэсліць сучасную тэорыі паходжання этнасаў і нацыяў, не гаворачы аб традыцыйным нацыяналізме Захаду. Вось, прыкладам, далёка не адзіны пагляд на

рускую нацыю: *Заўсёды лічылася, што рускі чалавек – гэта праваслаўны чалавек. Яго нацыянальнасць, паходжанне адыходзілі на другі план. Ён мог быць немцам, татарынам, ханты – але ён належаў да рускага народа, бо быў праваслаўным...* (Намеснік Валаамскага манастыра архімандрыд Панкрацій (Жэрдзеў)".

Як бачым з гэтай цытаты, для артадаксальнага рускага праваслаўя рэлігійны бок, прыналежнасць да праваслаўнай веры, выходзяць на самы пярэдні план, зусім пакідаючы па-за ўвагай прыкметы нацыі, нават да поўнага іх паглынання ці ігнаравання (фактычна, да сцверджання кшталту: праваслаўны немец – ёсць рускім!).

Рускія праваслаўныя нацыяналісты, фармулюючы парадыгму тоеснасці "праваслаўны = рускі", не звяртаюць увагі на іншыя праваслаўныя народы, паводзяць сябе так, быццам бы тых і няма. Няма ні сербаў, ні ўкраінцаў, ні праваслаўных грузін... Тым больш беларусаў. Аднак такое замоўчванне не здымае праблемы. Бо ёсць і сербскі нацыяналізм, і ўкраінскі нацыяналізм.

Праваслаўны даследнік нацыяналізму А. Верхоўскі вылучае дзве плыні гэтага руху: памяркоўную і радыкальную: "памяркоўная большасць актывістаў праваслаўна-нацыяналістычнага руху ўсё больш зацяняе сваю рэлігійна-палітычную праграму-максімум, імкнецца разам з Патрыярхіяй браць удзел у "вялікай палітыцы". У той жа час радыкальная меншасць усё больш паслядоўна і разгорнута з'яўляе і палітычную, і рэлігійную альтэрнатыву мэйнстрыму, улучаючы нават Патрыярхію".

Удзел у "вялікай палітыцы" праваслаўных нацыяналістаў у апошні час набывае выразныя рысы змагання з лібералізмам заходняга стандарту і, больш за тое, яны ўсутыч зблізіліся з антыглабалісцкімі рухамі. Праваслаўны антыглабалізм упершыню нарадзіўся ў Расіі як рух супраць таварных штрых-кодаў і літаральна за два гады абняў усю Праваслаўную Царкву.

## 11. Хрысціянскі нацыяналізм у Беларусі

Вышэй мы гаварылі пра хрысціянскі нацыяналізм як пра найвышэйшую, містычную форму нацыяналізму. Беларусам у пэўнай ступені ўласцівая такая якасць як пакора – асноўная хрысціянская рыса. Беларусам па-за мяжой сведамасці ўласціва любасць да блізкага, у яго няма ворагаў, ён аднолькава любіць усіх. Яшчэ нядаўна – а дзе засталося і цяпер – у беларускіх вёсках было прынята вітацца з усімі мінакамі, незалежна ад ступені знаёмства і нават з зусім незнаёмымі людзьмі.

Беларус не любіць вайны, яму неўласціва слова "забіваць". "Не забі" – такая запаведзь блізкая нашаму народу і шануецца ў вяках. Гэтая і іншыя хрысціянскія запаведзі адлюстраваныя ў нашым слаўным помніку заканадаўства, нашага права, нашай гісторыі і культуры – "Статуце Вялікага княства Літоўскага". Хрысціянскія каштоўнасці заўжды стаялі ў аснове ўсякіх дзяржаўных, палітычных, гаспадарчых і іншых праблем. Нават калі слова "хрысціянскі" стала забароненым у часы сталінізму і пазней у час "хрушчоўскай адлігі", мы захоўвалі хрысціянскае стаўленне да сваіх блізкіх, да ўсяго народа.

Можа, беларусы нават "занадта" хрысціянскі народ, бо іншы раз мы вельмі ж лёгка "падстаўляем сваю другую шчаку", аддаём сваю вопратку, ці ежу. Бо як растлумачыць тое, што мы аддалі сваю гісторыю літоўцам, часткі сваёй тэрыторыі тым жа літоўцам, а таксама рускім, латышам і палякам? Зусім нядаўна мы адмовіліся ад свайго галоўнага гістарычнага сімвала герба "Пагоня".

Цяпер настаў час заглянуць трохі ўглыб нашага дыскурсу. Ці існуе падзел хрысціянскага нацыяналізму паводле канфесійных прыкметаў? Пэўна ж існуе.

Добра ведамыя наратывы каталіцкага нацыяналізму ў прасторы як тэарэтычнай, так і ў практычным жыцці. Жыццё пры Касцёле ў Беларусі ў многіх аспектах вызначаецца беларускім характарам. Гучыць

беларуская мова падчас імшы. Шырока святкуюцца народныя святы. Прыкладам, у вёсцы Мосар кожны год адзначаецца ў ноч з 23 на 24 чэрвеня свята Святога Яна Хрышчэнніка. Яно арганічна спалучаецца з паганскім святам Купаллем, але, дзякуючы разумнаму кіраўніцтву касцёла, ад гэтага языцкага свята амаль не засталося ўласна языцкага. І ў Мосары ў гэтую ноч уладарыць цвярозасць і цнота.

Заканамерна ўзнікае пытанне аб дачыненні праваслаўнага нацыяналізму, сфармуляванага рускімі філосафамі і палітыкамі, да іншых праваслаўных народаў і найперш да Беларусі.

Ведама, што ад 60 % да 80 % вернікаў у Беларусі адносяць сябе да праваслаўя. Але от наколькі шчыльна гэтыя людзі ўтаясамляюць сябе з беларускай нацыяй, альбо беларускім этнасам? Гэтыя пытанні вельмі складаныя і заблытаныя з шэрагу прычынаў, сярод якіх асноўная – *палітычная.*

Прыналежнасць афіцыйнай Беларускай праваслаўнай Царквы (БПЦ) да Маскоўскага патрыярхату няўхільна накладвае пэўныя абмежаванні на нацыянальнае жыццё ў лоне Царквы. Спрыяе гэтаму таксама і вельмі слабая нацыянальная сведамасць вернікаў, наагул, беларускіх грамадзян. Рэлігійнае жыццё амаль цалком ідзе ў сферы расійскага ўплыву, расійскай культуры, расійскіх праваслаўных мерапрыемстваў, святаў, урачыстасцяў.

4 лістапада руская Праваслаўная Царква святкуе дзень Казанскай іконы Божай Маці. Святкуе гэтае свята ўся Расія, там гэты дзень – дзяржаўнае свята і, на думку ініцыятараў, павінен замяніць дзень 7-га лістапада, ведамы ў Расіі як “Дзень згоды і прымірэння”. Святкуецца гэты дзень і ў нас, як сярэдняе царкоўнае свята, па ўсёй тэрыторыі Беларусі, асабліва там, дзе ёсць храмы, асвечаныя на чэсць абраза Казанскай Божай Маці. У гэты дзень у праваслаўных храмах Беларусі, у казаннях можна пачуць, на першы пагляд, слушную інфармацыю, што “Казанская” дапамагла Расіі пазбыцца захопу Масквы палякамі

ў 1612 г. Так, добра. Але ж гэтая перамога над "палякамі" шчыра святкуецца і ў нас, беларускія вернікі без кроплі сумневу моляцца за гэтую падзею. Я ўжо пісаў, што значную частку гэтых акупантаў-"палякаў" у Маскве ў 1612 г. складалі беларусы. Дык што ж выходзіць? Мы святкуем перамогу над самімі сабой? Ці радуемся разам з рускімі, што яны нас тады вытурылі з сваёй сталіцы?

Брак дастатковай нацыянальнай сведамасці і гістарычных ведаў – прычына гэтай яўна ненармальнай, бязглуздай сітуацыі. І на афіцыйным роўні чыноўнікі, ідэолагі Беларускай Праваслаўнай Царквы павінны станоўча развязаць сітуацыю з святкаваннем 4 лістапада, іншых святаў і падзей, трактоўка якіх у нас і ў Расіі не супадае, ці нават супярэчлівая.

Наступны блок пытанняў звязаны з святкаваннем беларускіх святых. У нас існуе звод Святых – Сабор беларускіх Святых, які ствараўся цягам многіх гадоў. Спіс іх святых наступны: Вялебны Генадзі Магілеўскі, Свяцьбіт Лаўрэнці, епіскап Тураўскі, Свяцьбіт Сімяон, епіскап Полацкі (1289), Свяцьбіт Георгі (Каніскі), архіепіскап Магілеўскі, Дабраверны вялікі князь Расціслаў-Міхаіл, Праведная Сафія, княгіня Слуцкая, Свяцьбіт Гаўрыіл (Гарадкоў), архіепіскап Разанскі, Святыя Мучанікі Антоні, Іаан і Яўстафі Віленскія, Мучанік немаўля Гаўрыіл Беластоцкі (1690), Свяцьбіт Кірыла, епіскап Тураўскі, Святы мучанік Макары, мітрапаліт Кіеўскі, Святаўлівы мучанік Макары, ігумен Пінскі, Святы праведны Іаан Кармянскі, Вялебная Ефрасіння, ігуменя Полацкая (1173), Свяцьбіт Дыянісі, епіскап Полацкі (1182), Святы мучанік архідыякан Нікіфар, Свяцьбіт Міна, епіскап Полацкі (1116), Дабраверны Кн. Барыс Тураўскі, Святы мучанік Мітрафан, архіепіскап Астраханскі, Вялебны Марцін, пустэльнік Тураўскі (1150), Праведная панна Іўліанія, князёўна Альшанская (1550), Святаўлівы мучанік Афанасі, ігумен Брэсцкі (1648), Вялебны Фёдар, князь Астрожскі, у манастве Феадосі, Святаўлівы мучанік Серафім (Шахмуць), архімандрыт

Жыровіцкі, Святы мучанік Іаан (Помер), архіепіскап Рыжскі і Латвійскі, Вялебная Харыціна, князёўна Літоўская, Наўгародская старанніца. Дабр. Еўпраксія Пскоўская, Святы мучанік Паўлін, Архіепіскап Магілеўскі, Вялебны Елісей Лаўрышаўскі (1250), Свяцьбіт Іасаф (Жэвахаў), епіскап Магілеўскі.

Некаторыя з гэтых людзей добра ведамыя нашай грамадскасці, але большасць імёнаў, я думаю, нічога не кажа нашаму абывацелю. А гэта ж тыя ж нацыянальныя героі. Нават больш. Сітуацыю можна выправіць толькі праз вынясенне гэтых імёнаў на дзяржаўны ровень.

З іншага боку, мы ганарымся такімі людзьмі, якія ўсё сваё жыццё прысвяцілі служэнню беларускаму народу, пакутавалі за Беларусь і былі шчырымі праваслаўнымі вернікамі. Гэта, найперш, нашая славутая паэтка Ларыса Геніюш. Думаю, што настаў час паставіць пытанне аб кананізацыі нашай Ларысы.

Шмат зрабіў для беларусаў легендарны і ведамы ўсяму свету асветнік Францішак Скарына. І галоўнае – ім зроблена першая славянская друкаваная Біблія! Не трэба спрачацца і надалей высвятляць, хто Скарына быў паводле канфесійнай прыналежнасці. Прынамсі, нідзе не напісана, што ён не быў праваслаўным. А тое, што чалавекам-вернікам быў, хрысціянінам, дык гэта дакладна. Ягонае імя, безумоўна, мусіць быць у почце беларускіх праваслаўных святых.

Няма да гэтага часу ў спісе Святых Канстанціна (Васіля) Астрожскага, хоць пытанне ставіцца даўно і ў Украіне, і ў нас.

Ёсць і іншыя выдатныя людзі, якія могуць быць кананізаваныя Беларускай праваслаўнай Царквой.

Важным і праз стагоддзі, балючым ёсць пытанне аўтакефаліі Праваслаўнай Царквы. У Беларусі цяпер існуе, фактычна, адзін інстытут Праваслаўнай Царквы – гэта афіцыйная царкоўная арганізацыя: экзархат Рускай Праваслаўнай Царквы Беларуская Праваслаўная Царква.

За мяжой (галоўным чынам у Канадзе і ЗША) існуе Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква.

Яна з'яўляецца некананічнай, бо не прайшла адпаведных працэдур для атрымання аўтакефаліі. Тым не менш, вернікі-эмігранты беларускага паходжання маюць мажлівасць маліцца ў сваёй Праваслаўнай Царкве, на сваёй мове.

Як я ўжо адзначаў: дзейны інстытут Праваслаўнай Царквы ў Беларусі – БПЦ, ёсць часткай Рускай Праваслаўнай Царквы Маскоўскага патрыярхату, і хочацца каму ці не хочацца, а дзейнасць БПЦ ляжыць у рэчышчы дзейнасці РПЦ. А РПЦ, сваім парадкам, бытуе ў суседняй з Беларуссю дзяржаве – Расіі, і хоць фармальна Царква аддзеленая ад дзяржавы, яна не можа быць цалкам аддзеленай ад вонкавай і нутраной палітыкі, бо дзяржава адзіны арганізм. І няўхільна палітыка Расіі праз інстытут сваёй Царквы – праз РПЦ – так ці інакш трапляе ў Беларусь, бо не можа не трапляць праз філіял РПЦ – Беларускую Праваслаўную Царкву.

Гэта прыводзіць да памянёнага святкавання Расійскага свята 4-га лістапада ў улонні беларускай Царквы. А часта прыводзіць нават да канкрэтнай адзнакі сучасных палітычных падзей непасрэдна з амвонаў праваслаўных храмаў. Прыкладам, я быў сведкам, як у Свята-Пятра-Паўлаўскім саборы г. Мінска святар заўзята прапаведваў і заклікаў саборна маліцца за нашых братоў-сербаў, якія ваявалі ў ведамых войнах за Косава і іншыя тэрыторыі.

Такое становішча не павінна нас здзіўляць. Хоць Беларусь і незалежная дзяржава, уся структура нашай Праваслаўная Царквы падпарадкавана вонкаваму чынніку – Маскве. Толькі незалежнасць нашых царкоўных інстытутаў ад Трэцяга Рыму можа стаць сапраўдным крытэрам незалежнасці. А гэта мажліва толькі пры абвяшчэнні аўтакефаліі. Заўважу, пры распадзе імперыяў першым крокам, што рабілі царкоўныя іерархі, быў крок здабыцця аўтакефаліі Праваслаўнай Царквы. Так было, прыкладам, пасля абвяшчэння самастойнай Польскай дзяржавы пасля збурэння Расійскай Імперыі. Даволі хутка там з'явілася Аўтакефальная Польская Праваслаўная Царква.

Пра сучасны стан пытання аўтакефаліі Беларускай Праваслаўнай Царквы мы ўжо гаварылі вышэй. На маю думку, аўтакефалія рана ці позна здейсніцца. Гэта непазбежны гістарычны працэс.

## 12. Зьніч і праваслаўная манархія ў Беларусі

...ёсць дзікі Захад...
і Усход – пакутна сонны...
і сэрцайка – Сьвятая Беларусь...
сагнутае глабалам утрапёным,
племя Хрысціянскае –
паўстаць сябе прымусь!..

*Зьніч*

Алег Бембель (літаратурны псеўданім – Зьніч, царкоўнае імя – інак Мікалай) быў адным з заснавальнікаў Праваслаўнага Брацтва Трох Віленскіх Мучанікаў. А на пачатку 1990-х гг. – актывістам Беларускай хрысціянска-дэмакратычнай злучнасці. Філосаф, музыка, паэт і манах... Сын ведамага скульптара Андрэя Бембеля.

Ужо 12 гадоў ён нясе паслушанне ў Жыровіцкім манастыры, спачатку як паслушнік, потым прыняў іначаскі пастрыг пад імем Мікалай.

За ўвесь час свайго манастырскага жыцця адзінец Мікалай нясе паслушанне рэдактара літаратурна-мастацкага лістка “Жыровіцкая абіцель”, які змяшчае матэрыялы на трох мовах: беларускай, англійскай і рускай. Гэта ягонае “стварэнне” прапануецца ўсім наведнікам манастыра і ведама далёка за яго межамі, і ў Беларусі, і шырэй.




Яшчэ ў савецкія гады Алег Бембель набыў ведамасць як аўтар дысідэнцкага твора пра занядбаны стан нашай мовы «Роднае слова і маральна-эстэтычны прагрэс», які ўбачыў свет у Лондане ў 1985 г. За гэты ўчынак Бембель быў “узнагароджаны“ выключэннем з кампар-

тыі і выгнаннем з Акадэміі навук, дзе працаваў у якасці малодшага супрацоўніка.

Вершы паэта Зьніча вызначаюцца хрысціянскай скіраванасцю і любасцю да Беларусі. З поўным правам можна сказаць, што праваслаўны нацыяналізм – аснова філасофіі Зьніча, якой працятая ўся ягоная творчасць:

*...з жуды бязвер'я і бязслаўя,*
*народ, паўстаць сябе прымусь...*
*у таямніцы Праваслаўя –*
*Жыве Святая Бела-Русь!*

На прыкладзе А. Бембеля можна сцвярджаць, што праваслаўны нацыяналізм зусім не прэрэгатыва расійскага праваслаўя. Ён мае ўсе падставы для развіцця на беларускай зямлі, на абшарах праваслаўных беларускіх вёсак і гарадоў.

Аднак у асяроддзі беларускіх інтэлектуалаў далёка не кожны прымае, а пагатоў разумее, філасофію Зьніча. Вось, прыкладам, як своеасабліва рэагуе крытык Дз. Серабракоў на думкі Бембеля: "Патрабаванне праваслаўнага фундаменталіста Алега Бембеля монанацыянальнасьці і нават монаканфесійнасці ў сутыкненні з тэкстамі, якія спасылаюцца на заходнія мультыкультуралісцкія, трэш-культурныя мадэлі, стварае ілюзію ўнутранага дыялогу ў зборніку артыкулаў, дынамікі і развіцця беларускай думкі". (Пра скон марксізму і іншыя філасофскія байкі. Анталёгія сучаснага беларускага мысьленьня. // Дзеяслоў. 2003. 26.08.2006).

"Патрабаванне монанацыянальнасці і монаканфесійнасці"! Гэта пра таго, хто, адрозна ад нецярплівага аўтара гэтай кнігі, заўсёды быў зычлівым хрысціянінам і роўна, з любасцю ставіўся да прадстаўнікоў усіх канфесіяў, а сярод яго сяброў былі як беларускія нацыяналісты, так і рускія манархісты.

Якіх толькі ярлыкоў ні вешаюць на інака Мікалая. Да яго, у Жыровічы ледзь не кожную нядзелю цягнуцца наведнікі. А ўлетку выстройваецца цэлая чарга. Нацыяналісты каталіцка-уніяцкага кшталту не могуць зразумець яго праваслаўнай нутраной

існасці, шчырыя праваслаўныя людзі не могуць зразумець яго шчырай любасці да Беларусі і прыняць яго чыстую літаратурную беларускую гаворку. За 10 гадоў жыцця ў манастыры ён ні разу не перайшоў на рускую мову. Благачынны і манастырскія браты доўга не маглі прызвычаіцца да яго беларускай мовы, ставіліся з падазронасцю, але потым звыкліся.

Беларуская нацыянальная ідэя для Алега Бембеля – гэта Царства Ісуса Хрыста. Гэта Валадарства Божае на беларускай зямлі. Гэта праваслаўная Беларусь.

Бембель – беларускі нацыяналіст. Бембель таксама праваслаўны манархіст. Але не рускі, а беларускі манархіст. Яго манархія – гэта аб'яднанне праваслаўных дзяржаў з цэнтрам у Беларусі. Апошняе вынаходніцтва свету глабалізацыі – *дэмакратыя* – для яго сугучна слову "дэман-кратыя". Шмат вершаў Алега пабудаваны менавіта на такім прачытванні слова "дэмакратыя".

> ***...Баганосны шлях пасеклі...***
> ***ў грамадстве – махлярства...***
> ***дэма(н)кратыя – у пекле...***
> ***а на небе – Царства...***

Манархічныя "замашкі" А. Бембеля былі ведамыя не толькі ў цяперашні, манастырскі час яго жыццёвага шляху. Яшчэ будучы сябрам Цэнтральнай Рады партыі БХДЗ (Беларуская хрысціянска-дэмакратычная злучнасць) у 1992 г. ён выступіў на паседжанні Рады з праграмным дакументам, дзе беларускім хрысціянскім дэмакратам – сваім калегам з партыі – у якасці кансалідоўнай сілы грамадства прапаноўвалася ідэя праваслаўнай манархіі з цэнтрам у Мінску.

"Высяляюць Бембеля з дома Бембеля" – такі даў загаловак журналіст і паэт Віктар Стрыжак да гэтага фота, надрукаванага ў газеце "Добры вечар" за 1994 г. Аўтар працягвае руку дапамогі паэту. У гэты ж час гэты будынак, дзе месціцца музей скульптуры і дзе месца жыхарства паэта, напоўнены міліцыян-



тамі, якія гвалтам высяляюць Алега Бембеля з бацькавага дома.

У гэтым будынку праходзілі паседжанні Радаў БХДС, кааліцыяў партыяў – НХС, іншыя імпрэзы дэмакратаў, ці, як кажа А. Бембель, – "дэман-кратаў". Тут упершыню, у сябе дома, Алег атрымаў вымову за публічнае выступленне з праграмай беларускай праваслаўнай манархіі. Не зразумелі будучага манаха-манархіста калегі-дэмакраты з Беларускай хрысціянска-дэмакратычнай злучнасці, і доўга скардзіўся потым на крамольныя заклікі Бемеля старшыня партыі Пятро Сілка. Не разумеюць, дарэчы, манархічную пазіцыю брата-інака Мікалая і ў Жыровіцкім манастыры, але і не бачаць у ягоных думках асаблівай пагрозы для прытулу, бо не высоўваюць асаблівых прэтэнзіяў.

Таму думаецца, што з новага дому, з Жыровіцкага прытулу, манаха Мікалая ўжо ніхто акрамя Бога не высяліць.

## 13. Беларускі шлях.
## Як фармуляваць хрысціянскі нацыяналізм?

Дык хто ж мы, беларусы? У чым існасць нашага менталітэту, нашых прыхільнасцяў, урэшце – беларускага сэрца? У праваслаўным асяродку, каталіцкіх касцёлах, баптысцкіх малітоўных сходах, ці можа там дзе гучаць беларускамоўныя уніяцкія малітвы?

Я доўга думаў над гэтым пытаннем. Сам я выбраў пакутніцкі шлях праваслаўнага послуху. Яшчэ студэнтам я адкрыў для сябе шчымлівую і ўзнёслую духоўнасць Дастаеўскага, цвёрда адкінуў атэізм, і

пабадзяўшыся – у якасці сузіральніка – на службах розных канфесіяў, у 42 гады прыняў хрышчэнне ў праваслаўным храме Аляксандра Неўскага, што стаіць на вайсковых могілках г. Мінска.

Чаму мой шлях пакутніцкі? Бо для нацыяналіста, якім я ўсё больш станавіўся з гадамі, (а можа, і быў з дзяцінства – вельмі ж любіў свае родныя Васілевічы), праваслаўны стыль жыцця ў Беларусі не вельмі зручны. Як і ў свецкім жыцці, у праваслаўным асяродку пераважае руская мова, але галоўнае – расейскі вектар культурнага, грамадскага і хрысціянска-царкоўнага жыцця. 90-я гады XX ст., асабліва іх першая палавіна, прайшлі пад моцным знакам беларускага адраджэння. Антыкамунізм гэтых гадоў аўтаматычна спалучаўся з антысаветчынай, а потым і з адмаўленнем усяго рускага ў многіх рэспубліках былога Саюза. Гэтыя антырускія настроі ў асяроддзі нацыянальна-сведамых людзей пачалі звязвацца і з адмаўленнем праваслаўя, якое лічылі верай рускага народа – акупанта. Таму мноства сведамых беларусаў пацягнулася за католікамі, а калі пачалі ўтварацца уніяцкія суполкі – уступаць туды.

Асабліва паспрыяў гэтаму працэсу наш славуты католік Зянон Пазняк. Сапраўды, тысячы людзей пайшлі 30 кастрычніка 1988 г. на святкаванне каталіцкіх Дзядоў на маскоўскія могілкі і пасля ў урочышча Курапаты. Праўда, мала хто тады ведаў, што Дзяды тыя былі каталіцкімі Дзядамі, а дзень памяці продкаў для праваслаўных зусім іншы. Але на той час справа была, ведама, не ў гэтым. Мы сабраліся, каб сказаць "не" таталітарнаму савецкаму рэжыму, засведчыць пачатак заняпаду камуністычнага ладу, а слова "Дзяды" было толькі заслонай і падсведамым сімвалам пратэсту. Быў там і аўтар гэтых радкоў. Я помню той новы, незвычайны, узнёслы настрой, што ўладарыў у шматтысячным натоўпе, помню вадамёты і раз'юшаных міліцыянтаў з "чаромхай" і дубінкамі, якія луналі сярод мірных дэманстрантаў.

Падзеі 30 кастрычніка засведчылі хуткі канец камуністычнага рэжыму ў Беларусі, паклалі пачатак імклівага развіцця нацыянальна-дэмакратычнага руху і стварэння Беларускага Народнага Фронту.

Аднак само свята "Дзяды" былі тады толькі нагодай, нейкім падсведамым сімвалам і нават проста словам, што прымусіла людзей тады зысціся разам на Маскоўскіх могілках і потым у ўрочышчы Курапаты. Пазней я разабраўся, высветліў, што за Дзяды мы тады святкавалі. Для гэтага трэба было атрымаць нейкую першасную грамату і вызначыцца з сваімі рэлігійнымі паглядамі. Тады былі каталіцкія Задушыны, якія і цяпер адзначаюцца пэўнай колькасцю беларускіх каталікаў.

Цяпер, стаўшы не толькі нацыянальна сведамым чалавекам, але праваслаўным вернікам, стаўшы на шлях уцаркаўлення – я ўспамінаю продкаў кожную Радуніцу ў другі аўторак па праваслаўным Вялікадні і яшчэ ў пяць бацькоўскіх субот, сярод якіх адна сапраўды ў народзе называецца "дзяды" і дзень яе прыпадае на суботу пасля дня памяці Андрэя Салунскага.

Мне здаецца, што ў Беларусі нельга сфармуляваць адзіную формулу хрысціянскага нацыяналізму. Я выбраў шлях праваслаўны. Але мой добры знаёмы, ужо нябожчык, Анатоль Баркоўскі, прыняў хрышчэнне ў Касцёле, і ў сталым веку. А былы сябра Нацыянальна-дэмакратычнай партыі Беларусі Анісім Ролік пераканаlittleны пратэстант, пяцідзесятнік. І іх выбар – гэта іх права. Ёсць усё ж супольнае ў усіх нас – мы хрысціяне.

### 14. Беларусь на разломе цывілізацый?

Мне не падабаюцца гамоны пра Беларусь як памежную тэрыторыю між Захадам і Усходам. Маё крэда – спачатку Беларусь, а потым усе астатнія краіны. Тэрыторыя ўсякай краіны ляжыць паміж тэрыторыямі нейкіх іншых краін. Але чамусьці ніхто з ідэолагаў ці палітыкаў гэтых краін на гэтую акаліч-

насць не звяртае асаблівай увагі. У нас жа цэлыя трактаты пішуць – пачынаючы з Ігната Абдзіраловіча і канчаючы сучаснымі філосафамі, якія ўжо на Абдзіраловічы малююць дысертацыі.

Нашы ж "мысляры" то абсмоктваюць тэму "Беларусь паміж Расіяй і Захадам" (геаграфічны аспект), то "Беларусь паміж каталіцкім і праваслаўным светам" (рэлігійны аспект), то любяць паразважаць аб культуры Беларусі як сінтэзе ўсходняй і заходняй культур (культурніцкі аспект).

Альбо сядаюць на аб'езджанага коніка: "Беларусь у Еўропу ці не?". А калі "не", то куды? У Азію? Ці ў Расею? Абавязкова трэба некуды "ўпіхнуць" Беларусь. Нават ствараюцца цэлыя "палітычныя аб'яднанні" пад назвай, прыкладам, "Еўрапейская кааліцыя". Адзінае, што можа быць рэальнае для гэтага пустазелля кааліцыяў – хіба што Еўропа скіне якую сотку-другую баксаў з барскага пляча на гарбату і патрыманы "сітраен".

Я заўсёды стаяў на пазіцыі самастойнасці Беларусі і пытанням памежнасці надаю звычайна другасны характар. І тое, што, скажам, у беларускай культурнай страце ёсць рысы еўрапейскай (польскай) ці расійскай культур, ніяк не павінна зацяняць галоўнае: найперш – беларуская культура, а ўжо потым усякая іншая: еўрапейская, балцкая, угрa-фінская і яшчэ якая. Толькі такім спосабам можна сфармуляваць нашу нацыянальную ідэю.

Аднак, калі глядзець на гэтыя пытанні шырэй, глабальна – з пазіцыяў сучаснага падзелу свету на некалькі вядучых цывілізацыяў, то справа робіцца больш сур'ёзнай. Калі сусветнымі палітычнымі працэсамі кіруе фактар Хантынгтонаўскага "сутыкнення цывілізацыяў", то трэба ўрэшце выбіраць сваё месца пад сонцам паводле прынцыпу – "Хто не з намі, той супраць нас."

С. Ю. Хантынгтон увёў для памежных краін тэрмін "рассечаныя". І сапраўды, на сучаснай схеме сусветных цывілізацыяў Беларусь ляжыць паміж дзвюх

цывілізацыяў: заходняй (Еўропа) і праваслаўнай (Расія). Дзе месца Беларусі ў гэтым падзеле? І другое пытанне: ці сапраўды Беларусь "рассечаная" краіна?

Праблема гэтая даволі даўная. У існасці, яна стаяла ўжо ў часы Вялікага княства Літоўскага – яшчэ да часу ўзнікнення нацыяў. Тады, як ведама, супярэчнасці паміж каталіцкім і праваслаўным насельніцтвам спрабавалі развязаць праз утварэнне уніі на Берасцейкім саборы 1596 г. Але, як паказала гісторыя, унія – гэта тупіковы шлях, і той эксперымент праз некалькі стагоддзяў вярнуў Беларусь у ранейшы стан падзелу на праваслаўных і католікаў. Цяпер мы маем суадносіны паміж праваслаўнымі і католікамі недзе тры ці чатыры да аднаго (60–80 % праваслаўных і прыблізна 15–20 % католікаў). Гэтыя лічбы трэба яшчэ павялічыць да 100% пэўнай колькасцю пратэстантаў (можа, каля 5 %–10 %) і атэістаў (5 %–10 %).

У дадзеныя лічбы вядучых канфесіяў (праваслаўнай і каталіцкай) мы ўлучылі людзей як уцаркоўленных, так і тых, што маюць мінімальныя прыкметы прыналежнасці да пэўнай канфесіі: рыхтуюцца і святкуюць галоўныя святы (Пасху), хаваюць сваіх нябожчыкаў і ўспамінаюць продкаў (прыкладам, на Радуніцу) паводле пэўнага абраду, шануюць таксама некаторыя іншыя традыцыйныя народныя звычаі. "Чыстых" атэістаў, выяўляецца, не так і шмат, недзе каля 5–10 %,

У артыкуле "Беларускі нацыяналізм і сутыкненне цывілізацыяў" аўтар (А. Латышонак) спрабуе знайсці адказ на пытанне аб месцы Беларусі ў сучасным свеце, падзеленым на цывілізацыі праз увядзенне новай парадыгмы – гэтак званай "трыхатаміі" як судзеяння трох раўназначных хрысціянскіх канфесіяў: праваслаўнай, каталіцкай і пратэстанцкай. Быццам бы гэтая трыхатамія і ёсць тым дзейнікам, што ўплывае на лёс беларускай нацыі і наагул нашай дзяржавы. Але ж у нас у такім разе ёсць і юдэі, і мусульмане і, нарэшце, бахаі... дый ці мала хто... Ведама, уплыў гэтых канфесіяў на грамадскае жыццё

мала адчувальны. Але ці сапраўды так уплывае на нашае жыццё факт буйнога росту колькасці пратэстанцкіх суполак. Бо яны як былі, так і ёсць маргінальнымі ўтварэннямі на тле традыцыйных канфесіяў, наагул, на тле нашых традыцыяў.

Апрача таго, А. Латышонак у сваім артыкуле даволі адвольна трактуе шэраг падзей нашай найноўшай гісторыі. Прыкладам, ён піша, што ў Беларусі пасля абвяшчэння незалежнасці высокія дзяржаўныя пасады занялі католікі: спікерам стаў Станіслаў Шушкевіч, прэм'ер-міністрам – Вячаслаў Кебіч, старшынём нацбанка – Станіслаў Багаданкевіч і ўзначаліў апазіцыю Зянон Пазняк. “Усе чацвёра – католікі”, – паведамляе нам аўтар. І далей болей, – ставіцца пытанне: “Як сталася, што меншасць, якая стала ўзведвала ўсціск, так пасьпяхова здолела пераняць палітычную ўладу?”... “Беларускія палітолагі і сацыёлагі не далі адказу на гэтае пытанне”, – падсумоўвае Латышонак.

І не дадуць! Бо сярод чатырох успомненых асоб, каталікам ёсць толькі Зянон Пазняк. С. Шушкевіч паводле бацькоў напалову праваслаўны, напалову католік, а паводле светагляду – прыхільнік сайенталогіі, пра што любіць сам пагаварыць. В. Кебіч – гэта жывы манумент камуністычнай наменклатуры, а С. Багданкевіч ведамы ліберал, былы старшыня Аб'яднанай дэмакратычнай партыі. Усе трое – савецкія людзі, былыя партыйныя функцыянеры і ў рэлігійным плане, хутчэй за ўсё, бязверцы, атэісты. Ніякай каталіцкай меншасці яны не складаюць, а з'яўляюць тую ж камуністычна-адміністратыўную праслойку, што добра пачувалася і ў савецкія часы. Пасля 1991 г. усе вузлавыя дзяржаўныя пасады ў савецкай дзяржаве па-ранейшаму ўтрымвала савецкая наменклатура – адно толькі, што яны пусцілі ў свае шэрагі інтэлектуала-прафесара Станіслава Станіслававіча Шушкевіча. Але гэта было часовае засмямненне пасля нечаканага развалу Савецкага Саюза і абвяшчэння дзяржаўнай незалежнасці. Яны хут-

ка акрыялі і ў 1993 г. з лёгкасцю сапхнулі прафесара з пасады старшыні Вярхоўнага Савета.

Можа, там, у Беластоку, трэба мець лепшыя акуляры, каб нармалёва бачыць палітычныя перыпетыі ў Беларусі пачатку 1990-х гг. Але хацелася б параіць аўтару не пісаць надалей недарэчнасцяў накшталт таго, што напісана ў разгляданым артыкуле: "У 1993 г. праваслаўная большасць узяла рэванш". Якая праваслаўная большасць?! Які рэванш?!

А было так: у 1994 г. пры беспасярэднім удзеле расійскіх спецслужбаў камуністычна-наменклатурная кіраўнічая мафія разыграла карту А. Р. Лукашэнкі. Тая паказала сябе, як ніякая іншая, адпаведнай той сітуацыі, што склалася. Фігура Лукашэнкі здаволіла спадзяванні даволі шырокіх, але ў сацыяльным статусе найніжэйшых слаёў грамадства, асабліва работнікаў, сялянства і пенсіянераў, а гэта – большасць насельніцтва рэспублікі. Але даны вынік не мае ніякага дачынення да фразы Латышонка – "праваслаўная большасць узяла рэванш".

Цяпер наконт пратэстанцтва ў Беларусі як трэцяга складніка "трыхатаміі". Адразу скажу, што такую "трыхатамію", як у нас, маюць і Украіна, і Расія, і тая ж Польшча, дзе жыве наш аўтар – Ю. Латышонак. Безумоўна, застаецца актуальным пытанне аб значным росце пратэстанцкіх Цэркваў у Беларусі. Гэты факт, безумоўна, ёсць, але ён знаходзіць простае тлумачэнне. Пратэстанты лёгка праточваюцца ў тыя слаі грамадства, дзе рэлігійныя традыцыі аслабленыя альбо іх няма зусім. І разам з тым расце патрэба ў духовасці, як гэта сталася на постсавецкай прасторы. Вось тут і сталі запатрабаваныя пратэстанты. На стартавы момант найноўшай беларускай гісторыі – пачатак 1990-х гг. – Беларусь станавіла сабой бездухоўную масу савецкіх людзей, далёкіх ад Бога, якая цьмяна ўяўляла сабе існасць і праваслаўя і каталіцызму. І прынясце многімі хрысціянства ў форме баптызму, пяцідзесятніцтва, шэрагу цэркваў Поўнага Евангелля, іншых пратэстанцкіх кірункаў –

адказ на страчаныя традыцыі нашага царкоўнага жыцця. На мой пагляд, традыцыйныя веры перажываюць толькі часовую паразу. Будучыня ўсё ж за імі.

Думаю, мала рацыі маюць спадзяванні Латышонка на "трывалую аснову" праваслаўна-каталіцка-пратэстанцкай трыхатаміі для беларускага нацыяналізму. Дый сам аўтар у сваім артыкуле адзначае, што «"беларускія пратэстанты" не супрацоўнічаюць з беларускім нацыянальным рухам». І дадам: больш за тое, сучасны пратэстанцкі трыумф у Беларусі ёсць частка агульнага руху глабалізацыі, які ідзе насуперак нацыянальным рухам; ён падмяняе нацыянальную ідэю спадзяваннямі на хуткае ўсталяванне Царства Божага на Зямлі. Эклесіялагічныя настроі, што дамінуюць у пратэстанцкім асяроддзі, асабліва ў Цэрквах адвентыстаў сёмага дня і пяцідзесятнікаў не маюць нічога супольнага з нацыянальнай ідэяй.

Калі ж некаторыя з пратэстанцкіх актывістаў, нават пастыры, супрацуюць з прадстаўнікамі апазіцыі, то толькі таму, што лічаць сябе пакрыўджанымі з боку афіцыйных уладаў. Я пагаджаюся з іх тэзісамі пра нястачу свабоды веравызнання ў Беларусі. Але ж мы жывем у грамадстве, дзе гаварыць наагул пра нейкую свабоду цяжка. Нашая дзяржава пабудаваная на прынцыпах халуйства, падлізніцтва, яна трымаецца на мадыфікацыі сталінскага страху, што трывала жыве ў тысячах нашых грамадзян – вось у чым трагедыя! Але нашы пратэстанты далёкія як ад гэтых праблем і, тым больш, – ад нацыянальных беларускіх праблем.

І апошняе, што трэба адзначыць у рэчышчы гэтай палемікі. Паводле статыстыкі, у 2000 г. у Беларусі існавалі 1144 праваслаўныя прыходы, 405 каталіцкіх (+12 уніяцкіх) і 899 пратэстанцкіх суполак. Гэтая паважная колькасць пратэстантаў, здаецца, павінна ўражваць (адных пяцідзесятніцкіх цэркваў – 448, больш, чым усіх каталіцкіх!). Але ўгледзімся пільней у тыя лічбы. Няўжо яны адлюстроўваюць і колькасную велічыню вернікаў? Пачасту гэта не так. Часця-

ком пратэстанцкія суполкі збіраюць такую колькасць вернікаў, што іх можна пералічыць на пальцах. Дый не трэба пратэстанту надта вялікіх намаганняў рабіць для таго ж уцаркаўлення. Захацеў стаць пастырам – зрабі сабе суполку, а для гэтага шмат людзей не трэба. Як сказана ў Евангеллі: *Дзе сабраліся двое на імя Маё, там і Царква Хрыстова*. Часта так даслоўна і робіцца.

Зусім іншая карціна ў праваслаўных вернікаў. Звычайна на некалькі суседніх вёсак (3–4, а то і больш) існуе толькі адзін прыход, толькі адзін храм у выглядзе невялікай цэркаўкі. І туды цягнецца на святы мноства вернікаў, каб, прыкладам, асвяціць Пасху, адпець сваяка ці з іншых патрэбаў. Сфера дзеяння такіх прыходаў можа дасягаць некалькіх тысяч грамадзян. Тое самае назіраецца і ў сферы дзеяння Каталіцкага Касцёла.

Вось што, у сапраўднасці, хаваецца за прыточанымі лічбамі: неадпаведнасць суадносінаў колькасці парафіяў і сапраўднай колькасці вернікаў у пратэстанцкіх парафіях – з аднаго боку, і праваслаўных і каталіцкіх – з другога. І становіцца зразумелым, што ніякай трыхатаміі ў Беларусі няма. Дый дыхатаміі няма. У тым сэнсе, што паміж сучаснымі беларускімі каталікамі і праваслаўнымі фактычна не існуе супярэчнасцяў і нават дыскусіяў на тэму “чыя вера лепшая”. У многіх мястэчках і гарадах можна ўбачыць згоднае суіснаванне касцёла і праваслаўнага храма, і гэтая адзнака сама за сябе шмат чаго можа сказаць.

Аднак тыя вонкавыя адзнакі рэлігійнай талерантнасці, можа, сведчаць і аб другім баку медаля: нашае грамадства дагэтуль даволі слаба рэлігійна структураванае, і гэты чыннік далёка не на першым месцы ў азначэнні рухавіка нашай дзяржавы.

Вось такія, выяўляецца, вынікі беглага аналізу нататак Латышонка аб “сутыкненні цывілізацыяў”. На нашу думку, ніякіх прыкметаў успомненай з’явы “сутыкнення” ў Беларусі не назіраецца. Аднак праблема, пастаўленая Хантынгтонам, усё ж застаецца.

Бо ёсць (ці, мабыць, ёсць) праваслаўная цывілізацыя і ёсць заходняя цывілізацыя, якую можна акрэсліць геаграфічна абсягамі Еўразвязу. Праўда, з абсягамі праваслаўнай цывілізацыі ўзнікае цяжкасць. Трэба ўсё ж разабрацца, што разумець пад праваслаўнай цывілізацыяй. У Хантынгтона сказана: "Некаторыя навукоўцы вылучаюць асобную праваслаўную цывілізацыю з цэнтрам у Расіі, адрозную ад заходняга хрысціянства з прычыны сваіх візантыйскіх каранёў, двухсотгадовага татарскага прыгнёту, бюракратычнага дэспатызму і абмежаванага ўплыву на яе Адраджэння, Рэфармацыі, Асветы, іншых значных падзей, якія мелі адбыцца на Захадзе".

А. Латышонак пасля гэтага азначэння хуценька выводзіць: "Абсалютна зразумела, што Беларусь не падпадае пад гэтае азначэнне". Паспешлівая выснова. Зразумела, у нас 200 гадоў татарскага панавання не было, была Рэфармацыя і Асвета. Аднак была і яшчэ адна акалічнасць: Беларусь у старажытныя часы (Полацка-Тураўскі перыяд) і пазней у часы ВКЛ – была праваслаўнай дзяржавай. І ў тыя часы, калі татары здымалі даніну з Маскоўскага Царства, і праваслаўе на гэтай частцы Русі было важным чыннікам грамадскага жыцця, то ў другой частцы, якая потым стане Беларуссю (адным з назоваў якой таксама былі "Русь": "Белая Русь", "Чырвоная Русь", "Чорная Русь"), – гэты ж праваслаўны чыннік меў не меншае, а можа і большае значэнне, чым там, – у Маскавіі. І толькі пасля 1596 г. вялікая частка праваслаўнага насельніцтва стала вызнаваць замiж праваслаўя грэка-каталіцызм.

Аднак гэтая новая уніяцкая вера была зусім не падобная (прынамсі, спачатку) да каталіцызму, бо ўсе абрады, усё літургічнае кола – і гадавое, і тыднёвае і дзённае – засталося ўсходняга абраду, г. зн. было праваслаўным. Гэты чыннік становіцца вызначальным у фармаванні ментальнасці, а пазней этнічнай самаідэнтыфікацыі і, нарэшце, фармаванні беларускай нацыі. Вось дзе трэба шукаць карані пры-

належнасці да пэўнай цывілізацыі. І, нягледзячы на вялікі ўдзел католікаў у пазнейшыя часы, і кшталтаванне уніі ў этнічна беларускім рэчышчы, шалі для беларусаў схіляюцца ў бок праваслаўнай культуры, праваслаўнага менталітэту. Важна яшчэ разумець, што нашая праваслаўная культура і ментальнасць – гэта не тое самае, што маскоўска-рускае праваслаўе.

Відавочна, азначэнне праваслаўнай цывілізацыі, дадзенае Хантынгтонам, патрабуе сур'ёзнага дапрацоўвання. Пісалася славутая кніга на золку мадэрнай гісторыі постсавецкіх краін: на пачатку 1990-х гг. Тады палітычная сітуацыя выразна рознілася ад цяперашняй. Масква традыцыйна асацыявалася з цэнтрам камуністычнай сістэмы, а таксама – з цэнтрам праваслаўя – Трэцім Рымам, хоць і з перарванымі традыцыямі. Цяпер, аднак, акрамя Масквы, мы маем досыць вялікую дзяржаву – незалежную праваслаўную Украіну з 50 млн. насельніцтва, якая не вельмі хоча прызнаваць "Трэцяга Рыма"; мы маем адметную праваслаўную краіну – Грузію з 2000-гадовымі хрысціянскімі традыцыямі, мы маем, нарэшце, Сербію і шэраг іншых краін, якія геаграфічна, а дзе і палітычна ёсць удзельнікамі памянёнай вышэй "Заходняй цывілізацыі". І гэтыя краіны становяць прыклад даволі чыстых праваслаўных краін, бо адрозніваюцца ад праваслаўна-мусульманскай Расіі сапраўднай рэлігійнай аднароднасцю.

Ход думак Латышонка ў разгляданым артыкуле даволі празрысты, але здзіўляе не логікай, а наадварот – алагічнасцю. Беручы за аснову Хантынгтонаўскае азначэнне Беларусі як рассечанай краіны, ён спрабуе яшчэ больш рассячы яе (і адначасова "пагадзіць"), уводзячы праз пратэстанцтва памянёную трыхатамію.

На нашу думку, не на мапу Хантынгтона трэба арыентавацца, каб потым залічыць Беларусь да "рассечанай" краіны. Арыентавацца трэба на рэальнасць, на становішча беларускага грамадства, на нашы тра-

дыцыі, на стан нашай краіны наагул. І толькі потым можна азірнуцца на існыя канцэпцыі падзелу сучаснага свету, на сферы пэўнага прыцягнення, рэлігійных прыярытэтаў, сацыяльных праектаў і, нарэшце, на прыналежнасць да пэўнай цывілізацыі. І вось тут, на гэтым шляху, мы няўхільна ўбачым марнасць спробаў рассячы Беларусь. Бо Заходняя і Усходняя Беларусь у нашай краіне – толькі геаграфічныя найменні і не больш за тое.

Менталітэт, традыцыі, мова, культура і іншыя атрыбуты ўласцівыя ўсякаму народу і ў канцавым выніку – пэўнай цывілізацыі. У нашым выпадку – Беларусі – яны на дзіва вельмі гамагенныя, шмат у чым блізкія і маналітныя. І факт бытнасці ў Заходняй Беларусі больш высокай колькасці католікаў, чым у Усходняй, амаль не ўплывае на розніцу ў іх спосабе жыцця ці на істотную розніцу ў менталітэтах заходнікаў і ўсходнікаў. Возьмем, прыкладам, селяніна заходняй і селяніна ўсходняй вёсак – абодва вельмі падобныя адзін да аднаго, вельмі блізкія мовою і традыцыямі, што і было падставай, каб яшчэ гадоў 100 таму акрэсліць гэтых людзей як “беларусы”. І смутак В. Шалкевіча “яна праваслаўная – я каталік” для нас, беларусаў толькі лёгкая канстатацыя факта. Аніякай “рассечанасці” ў нас не назіраецца. Калі ўжо падымаць гэтую праблему, то трэба брацца за Украіну, дзе пагаварыць будзе пра што. Але гэта не наша заданне.

І ў звязку з данымі развагамі некалькі слоў пра беларускі менталітэт. У XXI ст. рэлігійны складнік менталітэту становіцца нязначным. Гэта вынік нашага атэістычнага мінулага. Менталітэт сучаснага беларуса дагэтуль хутчэй савецкі. Ён ужо страціў рысы ваяўнічага атэізму, але ўсе іншыя атрыбуты “гомо савецікуса” засталіся. Сярод іх – нежаданне браць на сябе адказнасць, страх і ліслівасць перад начальствам, бессэнсоўнае п’янства і інфантылізм. Псіхалогія асноўнай масы беларусаў выявілася на дзіва ўстойлівай праз мінулыя амаль 20 гадоў дзяр-

жаўнай незалежнасці. Адно што раней "рухавіком" жыццёвай філасофіі быў страх і "прагінанне" перад раённым начальствам, цяпер – страх і яшчэ большае "прагінанне" перад вертыкаллю.

Яшчэ адзін аспект беларускага менталітэту і "беларускай цывілізацыі". Гэта тое, што датычыць гэтак званай "самасці", а таксама крытэраў самаідэнтыфікацыі беларуса як грамадзяніна пэўнай нацыі. Відавочна, што галоўным вектарам, крыніцай фармавання сведамасці шараговага беларуса ёсць вектар Расійскі. Мы жывем у сферы расійскага арэалу, амаль так, як і ў савецкія часы, арыентуемся на расійскую тэлевізію, ведаем расійскіх палітыкаў, артыстаў, спевакоў лепш, чым сваіх беларускіх. Мы карыстаемся рускай мовай фактычна на ўсіх роўнях, мы вывучаем у школе не беларускую гісторыю, а рускую і ведаем рускіх маскоўскіх цароў лепей, чым выдатных князёў, дзяржаўных і грамадскіх дзеячоў беларускай дзяржавы – Вялікага княства Літоўскага. Разважаць у такіх умовах пра пераарыентацыю вектара нашых інтарэсаў з Расіі на Еўразвяз – гэта толькі пустая гаварня, фантастычны праект і не больш. Калі цяпер заплюшчыць вочы на дрымучую савецкасць беларусаў, то паводле памянёных і шмат якіх іншых прыкметаў, можна было б аднесці Беларусь да праваслаўнай цывілізацыі – пры ўмове, што такая сфармавалася ў Расіі, і цэнтрам гэтай цывілізацыі ёсць Масква.

У манаграфіі А. С. Панарына "Православная цивилизация в глобальном мире" вельмі грунтоўна даследаваны асаблівасці і глыбіні ўздзеяння праваслаўнай культуры на людства, што дае ў выніку магчымасць разважаць аб існаванні адметнага тыпу цывілізацыі – праваслаўнай. "*Унікальнасць праваслаўнай цывілізацыі ў праваслаўным свеце складаецца ў тым, што яна мае ў сваім генезісе ад пачатку тоеснае Захаду, але здраджанае і ўціснутае ім грэцкае ядро. Гэтая акалічнасць і робіць праваслаўную цывілізацыю носьбітам іманентнай крытыкі заход-*

*няга глабальнага праекту,"*[1] – вельмі слушна зазначае Панарын.

Але тут узнікае сур'ёзная праблема ў рэчышчы дыскурсу Хантынгтона наконт Расіі як носьбіта праваслаўнай цывілізацыі. А ці сапраўды Расіі да падняцця статус галоўнага, калі не адзінага, прэтэндэнта на статус творцы праваслаўнай цывілізацыі? Расія, якую мы маем цяпер, – гэта прадукт Савецкага Саюза, дзе даўно знішчаны праваслаўныя традыцыі і дзе народ безнадзейна адарваны ад царкоўнага жыцця. Акрамя таго, яшчэ адна важная акалічнасць, Расія – гэта не Беларусь – там бытнасць мусульманскага інгрыдыенту, г. зн. мусульманскай цывілізацыі, у значнай ступені большая, чым у нас ці ў Украіне і ў многіх іншых праваслаўных краінах. Расія – вось сапраўдная разарваная краіна.

Калі ўжо падымаць пытанне аб сутыкненні цывілізацыяў, то трэба перш за ўсё ўлічваць рэальную пагрозу хрысціянскаму свету ад мусульманскіх краін. Агрэсіўны адказ мусульманскага фундаменталізму экспансіі заходніх каштоўнасцей і найперш лібералізму на Усход дый наагул па ўсім свеце – гэта адказ не на экспансію хрысціянства, а на культ ліберальнай дэмакратыі, якую пэўныя ідэолагі, накшталт Фукуямы, узводзяць да вяршыні прагрэсу і канца чалавечай гісторыі.

Таму менавіта на рэлігійным грунце трэба шукаць шлях развязання мусульманска-еўрапейскага канфлікту. Бездухоўнасць Захаду, слынная амерыканская ліберальная дэмакратыя ўсё больш не задавальняюць жыхароў краін самой Еўропы. Пашыраецца антыглабалісцкі рух, і Еўропа ўсё больш супрацьстаіць мадэрнізацыі "а ля Амерыка". Для Беларусі, іншых праваслаўных краін гэтае пытанне (супрацьстаянне ліберальнай дэмакратыі) і ёсць мажлівы трэці адказ, пра які піша А. С. Панарын: "Трэці адказ

---

[1] Панарин А. С. Православная цивилизация в глобальном мире. М., 2002. С. 440.

Усходу – Праваслаўе (другі адказ – мусульманства, – *А.А.*) – можа стаць сама пераканаўчым. Праваслаўны альтэрнатыўны праект... зусім не ёсць адмаўленнем еўрапейскай рацыянальнасці". На нашу думку, для Беларусі гэты трэці адказ можна было б пашырыць да агульнахрысціянскага праекту, таго праекту, дзе супраць націску лібералізму будуць аб'яднаныя і каталіцкія, і праваслаўныя, і іншыя хрысціянскія Цэрквы.

З іншага боку, толькі ў адзінстве хрысціянскага свету будзе поспех і ў адказе на другі істотны чыннік сучаснай гісторыі – мусульманскі фундаменталізм. На маю думку, сутыкненне цывілізацыяў, якое ўжо цяпер істотны чыннік сусветных палітычных працэсаў, рэальна існуе як вынік процістаяння хрысціянскага і мусульманскага светаглядаў і менталітэтаў. Гарачыя пункты сучаснасці ў тых рэгіёнах, дзе гэтая праблема не развязана – гэта Афганістан, Палестына, і, на жаль, унутры "рассечаных" краін, найперш Расіі з яе Чачнёй, і спадкаемцаў развалу Югаславіі – Сербіі, Косава, іншых.

Месца Беларусі ў канцэпцыі сучасных сусветных цывілізацыяў – гэта не заходняя і не праваслаўная цывілізацыя, гэта звяз хрысціянскіх дзяржаў – гэта хрысціянская цывілізацыя, пабудаваная на хрысціянскіх каштоўнасцях, аднолькавых для ўсіх канфесіяў, гэта фундаментальныя хрысціянскія праўды, аказаныя нам Ісусам Хрыстом у Нагорнай казані. Урэшце няўхільны аналагічны шлях і для Расіі, пра што марылі яшчэ рускія праваслаўныя філосафы канца XIX ст.: Уладзімір Салаўёў і Вячаслаў Іванаў. І каталіцкі, праваслаўны і пратэстанцкі свет Еўропы ўжо ўсведамілі мусовасць міжканфесійнага дыялогу, пра што сведчаць шматлікія сустрэчы і форумы, прысвечаныя розным праблемам сучаснасці: змаганню з спідам, абортамі, алкагалізмам, іншымі заганнымі з'явамі. Папа Іаан Павел II у лісце 1988 г. з нагоды 1000-годдзя Хрышчэння Кіеўскай Русі вывеў формулу Другога Ватыканскага сабору: "У Еўропы хрысці-

янская існасць; яе карані прасякнутыя хрысціянскім духам. Дзве формы вялікай традыцыі, заходняя і ўсходняя, дзве формы культуры дапаўняюць адна адну як два лёгкія адзінага арганізму".

## 15. Хрысціянства і ненасілле

У апошнім параграфе хрысціянскага раздзелу я толькі закрану вельмі важную тэму, звязаную з тэорыяй ненасілля, карані якой знаходзяцца ў хрысціянстве.

Хрысціянская дактрына мае самае непасрэднае дачыненне да палітычнай канцэпцыі пад назвай **ненасілле**, якая ўсё больш і больш заваёўвае прызнанне.

Тэорыя ненасілля за апошні час ператварылася ў магутны сродак палітычнай барацьбы. Узнікла паслядоўная тэорыя ненасільнай барацьбы, а рэалізацыя ідэй ненасілля на практыцы дала незвычайныя вынікі. Вялікі ўнёсак у развіццё метадаў і тэорыі ненасілля зрабіў даследнік палітычнай філасофіі, гісторыі і сацыялогіі ненасілля Джын Шарп. На ягоных працах, а таксама Махандуса (Махатмы) Гандзі, Марціна Лютэра Кінга, Дамініка Барбе і іншых, на мой погляд, будзе грунтавацца будучая палітычная тэорыя.

Ніжэй мы разгледзім асноўныя пастулаты гэтай дактрыны і магчымыя яе наступствы ў дачыненні да беларускай сітуацыі.

*Вытокі філасофіі ненасілля*

Вытокі філасофіі ***ненасілля*** трэба шукаць у хрысціянстве. Каля 2000 гадоў таму назад у сваёй знакамітай Нагорнай пропаведзі Ісус Хрыстос выказаў ісціны, якія да гэтага часу прыцягваюць увагу ўсяго чалавецтва, на якіх вучацца простаму, але разам з тым і складанаму вучэнню аб хрысціянскай любові людзі, мільёны людзей, цэлыя краіны. Вось Ісус гаворыць: *Вы чулі, што сказана продкам: "не забівай, а хто б'е падпадае суду". А я кажу вам, што кожны, хто гневаецца на брата свайго марна, падпадае суду: хто ж скажа брату свайму "пусты чалавек", падпадае сінед-*

*рыёну: а хто скажа "неразумны", падпадае геене вогненнай* (Мф. 5,21-22). Тут гаворка ідзе аб вялікай адказнасці чалавека перад чалавецтвам, а таксама аб тым, што цяпер мы называем «прэзумпцыяй невіноўнасці». Гэта сцверджанне не толькі хрысціянства, многія народы свету дайшлі да гэтых ісцін. Але вось трохі далей, у гэтым жа пятым раздзеле Евангелля паводле Матфея, мы чытаем наступнае: *Вы чулі, што сказана: «Вока за вока, і зуб за зуб». А я скажу вам не працівіцца злому. Калі хто цябе ўдарыць па правай шчацэ тваёй, падстаў яму і другую* (Мф. 5, 38-39). Вось яна – платформа хрысціянскага ненасілля. Тут яшчэ не зразумела, чаму мы павінны не працівіцца злому, чаму мы павінны падстаўляць для біцця яшчэ адну шчаку. Так не прынята ў жывёльным свеце і не было прынята сярод людзей язычніцкай эпохі. Толькі праз два тысячагоддзі людзі пачнуць пераконвацца ў глыбіні і вялікай праўдзе сказанага. *Вы чулі, што сказана: «Любі блізкага твайго і ненавідзь ворага твайго». А я кажу вам: любеце ворагаў вашых, дабраслаўляйце кляцьбітоў вашых, рабіце дабро ненавісьнікам вашым і малецеся за крыўдзіцеляў вашых і ганіцелеў вашых»... «Бо калі вы будзеце любіць тых, што любяць вас, якая вам узнагарода? Ці ж не тое самае робяць і мытнікі? І калі вы вітаеце братоў вашых толькі, што асаблівага вы робіце? Ці ж не тое самае робяць і мытнікі?... Дык вось, будзьце дасканалыя, як дасканалы Айцец ваш Нябесны.* (Мф. 5, 44–48).

У гэтай частцы Нагорнай пропаведзі Ісус Хрыстос упершыню за ўсю гісторыю чалавецтва заклікае да цалкам новага спосабу вырашэння спрэчных пытанняў – не праз вайну, не праз гвалт, не праз фізічнае дзеянне, накіраванае супраць непрыемнага чалавека, групы людзей, супраць цэлай краіны. Спрэчку прапануецца вырашыць праз любасць. Усе мы тварэнні Божыя, усіх нас Ён аднолькава любіць, і Яму вырашаць наш лёс. Разуменне гэтага і ёсць тая **дасканаласць**, пра якую сказана ў Евангеллі паводле Матфея.

**Галоўныя пастулаты філасофіі ненасілля: любоў як палітычны прынцып, непраціўленне злу насіллем, любасць да сваіх ворагаў.**

*1) Любоў як палітычны прынцып*

Толькі праз 2000 гадоў пасля Нагорнай пропаведзі Хрыста адкрыта заявіў пра любоў як палітычны прынцып Махандус (Махатма) Гандзі. Ён падышоў да закона любові такім чынам: *Я высвятліў, што жыццё існуе сярод разбурэння, і таму павінен існаваць закон больш высокі, чым закон разбурэння. Толькі пры такім законе грамадства будзе пабудавана правільна і разумна, і жыццё будзе каштаваць таго, каб пражыць яго. І калі гэта закон жыцця, то мы павінны выкарыстоўваць яго ў штодзённым жыцці. Дзе б ні ўзнікала спрэчка, дзе б вам ні супрацьстаяў апанент, заваёўвайце яго любасцю. Стыхійна я выпрацаваў гэта ў сваім жыцці. Але гэта не азначае, што ўсе мае праблемы вырашаны. Галоўнае, што я адкрыў: закон любові дзейнічае так, як ніколі не дзейнічаў закон разбурэння.*

Махатма Гандзі быў першым чалавекам, які здолеў выкарыстаць адкрыты ім закон любові (хутчэй пераадкрыты следам за хрысціянствам) на практыцы. Гандзі быў кіраўніком нацыянальна-вызвольнай барацьбы індыйскага народа супрацьанглійскіх каланізатараў. Ягоны спосаб адстойвання сваіх правоў атрымаў назву Сацьяграха – “упартасць у ісціне”. Сэнс Сацьяграхі – грамадзянскае непадпарадкаванне і ненасільнае несупрацоўніцтва. Пачынаючы з 1915 г. Гандзі становіцца лідэрам індыйскага народа ў нацыянальна-вызвольнай барацьбе, становіцца нацыянальным героем, і ўсё гэта праз ажыццяўленне прынцыпаў Сацьяграхі. У ягоны перыяд дзейнасці з’явіліся такія спосабы барацьбы, як “хартал” (прыпыненне працы), “бандх” (закрыццё прадпрыемстваў) “гхерао” (акружэнне шчыльным чалавечым кальцом чыноўнікаў, каб яны не здолелі патрапіць да месца працы), байкот англійскіх тавараў і г.д. Ён увёў у практыку кангрэсістаў вытворчасць “кхадзі” – даматканага па-

латна, якое на ручных ткацкіх станках пралі амаль усе сябры ІНК (Індыйскага нацыянальнага кангрэсу), каб не карыстацца англійскімі таварамі.

У выніку Індыя дасягнула незалежнасці. Махатма Гандзі разумеў, што немагчыма зрабіць зразумелымі ідэі ненасілля для кожнага індуса, але можна паставіць народ перад фактам здзяйснення ідэй ненасілля. Ён гаварыў: "*Я не сцвярджаю, зыходзячы з гэтага, што ненасіллем абавязкова прасякнуліся усе трыста мільёнаў чалавек, але я сцвярджаю, што яно пранікла глыбей, чым любая іншая ідэя і пры гэтым за неверагодна кароткія тэрміны. Мы не былі ўсе аднолькавымі прыхільнікамі ненасілля; і для пераважнай большасці ненасілле было пытаннем палітыкі. Але тым не менш я хачу, каб вы зразумелі, што краіна зрабіла фенаменальны крок наперад пад абаронай ідэі ненасілля*".

***2) Непраціўленне злу насіллем***

Вялікі рускі мысляр і пісьменнік Леў Талстой надаваў надзвычай вялікае значэнне гэтаму хрысціянскаму прынцыпу. Ён узвёў гэты прынцып ў прынцып эвалюцыі грамадства. Евангельская запаведзь "не працівіцца злому" стала па Талстому законам грамадскага жыцця. Л. Н. Талстой стварыў сваё рэлігійна-філасофскае вучэнне, у якім галоўнае месца займаюць ідэі любові і непраціўленню злу насіллем. Філасофія непраціўлення Льва Талстога ў цэлым вызначаецца як «філасофія духоўнага быцця», ажыццяўленне духоўных ісцін у жыцці. Галоўнае месца сярод духоўных ісцін у вучэнні Талстога заняла катэгорыя любові. Канцэпцыя любові – гэта духоўная вось усяго вучэння Л. Н. Талстога. У сваім трактаце "У чым мая вера" ён гаворыць: "Закон чалавечага жыцця ёсць закон любві, які дае найвышэйшае дабро як асобнаму чалавеку, *так і ўсяму чалавецтву*". З аднаго боку, любасць – гэта таінства, дар, найвышэйшае дабро жыцця, што дае чалавеку ўсеабдымную радасць, з другога боку – гэта "універсальна-антрапалагічны закон духоўнага жыцця".

Аднак, ідучы ў сваім вучэнні ад хрысціянства, Леў Талстой адкінуў самае галоўнае ў хрысціянстве, тое, без чаго не мае сэнсу вучэнне аб любові – вучэнне аб уратавальнай ахвяры Хрыста, вучэнне аб Ісціне, якая ёсць чалавекабог Ісус Хрыстос. Без гэтага ўсякае вучэнне аб Любві становіцца няпоўным, пазбаўленым свайго горняга містычнага сэнсу. Таму, відаць, і не стаў рух паслядоўнікаў Талстога – талстоўцаў – па-сапраўднаму ўладарыць масамі, таму і засталася філасофія Талстога ўсяго толькі яго філасофіяй.

Тым не менш многія думкі вялікага пісьменніка слушныя і ўяўляюць аснову філасофіі непраціўлення злу насіллем.

Такім чынам, хрысціянскі прынцып «непраціўлення злу насіллем», уяўляе з сябе аснову філасофіі ненасілля.

Аднак аднаго «непраціўлення» мала. Філасофія ненасілля прапануе нешта большае. Яна сцвярджае актыўную пазіцыю і дзеянні, якія грунтуюцца на вяршынстве духоўна-маральнай улады над уладай палітычнай. Ненасілле абапіраецца на дзеянні большай матывацыі паводзін, чым страх, боязь перад фізічным пакараннем ці эканамічнымі санкцыямі. Ненасілле абапіраецца на *сілу духа*, *гераізм* асобы. Ненасілле звяртаецца да сумлення чалавека і яго розуму.

***3) Любасць да сваіх ворагаў***

Гэты цэнтральны Евангельскі пастулат, які дадзены нам праз Хрыста, найбольш цяжка ўкладваецца ў нашую сведамасць. Ён супярэчыць як нашай логіцы, так і маралі, на якой узрос увесь свет. Сапраўды, як можна любіць таго, хто здзекуецца з цябе, прыносіць табе боль, гора? Ці не ёсць у гэтым сцвярджанні проста пакора, падаўленне волі, падпарадкаванне раба свайму гаспадару? І можа, мае рацыю Фрыдрых Ніцшэ, які сцвярджаў, што прызыў Ісуса любіць ворагаў сваіх, гэта не што іншае, як прыкмета слабасці чалавека, баязлівасці, прыніжанасці. Не і яшчэ раз не! Наадварот, любасць да ўсіх, уключаючы ворагаў – гэта абсалютная ўмова нашага існаван-

ня, гэта шлях да развязання любых наяўных у свеце праблем, гэта ідэалістычны прынцып чалавецтва, да якога патрэбна заўсёды імкнуцца.

Марцін Лютэр Кінг у артыкуле «Любіце ворагаў вашых» вылучыў тры галоўныя моманты, што ўключае ў сябе гэты прынцып.

а) Перш за ўсё гэты прынцып азначае здольнасць чалавека да даравання. У нашым сэрцы не знойдзецца і кроплі любові да ворагаў, калі мы не навучымся дараваць зноў і зноў тым, хто прыносіць нам пакуты і няшчасці. «Не сем разоў, а семдзесят разоў па сем», – адказаў Ісус Пятру на ягонае пытанне аб тым, колькі разоў можна дараваць свайму крыўдзіцелю. У гэтым і ёсць бясконцая дабрата і любасць Бога да чалавека.

Істотным з'яўляецца разуменне таго, што дараваць павінен заўсёды той, хто пацярпеў, той хто пакутуе, пераносіць боль і няшчасці, той, хто прыніжаны і абражаны.

Усёдараванне – гэта не замена зла дабром і забыццё ўсяго дрэннага, што было зроблена. Проста мы верым у тое, што зробленае зло не ёсць перашкода для нас, каб устанавіць новыя, добрыя адносіны.

Усёдараванне – гэта каталізатар, што стварае атмасферу, неабходную для здзяйснення новых крокаў, пачатку новага жыцця. Словы "*Я дарую Вам, але ніколі не забудуся, што Вы зрабілі*", не ў стане растлумачыць сапраўдную прыроду ўсёдаравання. Так, чалавек не можа нешта выкінуць з галавы, бо тое, што здарылася, не сціраецца цалкам з памяці. Але, калі мы даруем, мы забываемся ў тым сэнсе, што зло ўжо больш не з'яўляецца псіхалагічным прыпынам на шляху ўсталяваня новых ўзаемаадносін. Альбо мы ніколі не зможам сказаць: "*Я дарую Вам, але цяпер не жадаю вас ведаць*". Дараванне азначае прымірэнне. Без гэтага ні адзін чалавек не ў стане палюбіць ворагаў.

б) Па-другое, мы павінны зразумець, што зло, якое творыцца бліжнім нашым – ворагам, прычына нашых

пакут, ніколі не адлюстроўвае ўсёй сутнасці гэтага чалавека. Элементы дабра можна знайсці ў характарах найзлейшых нашых ворагаў. Іншая справа, што князь міра гэтага – сатана – пільна сочыць за намі і вельмі часта атрымліваецца, што мы нечакана робім зусім адваротнае нашым жаданням і перакананням. Пра гэта казаў яшчэ апостал Павел: "*Добрага, якога хачу, не раблю, а злое, якога не хачу, раблю*".

Гэта азначае, што нават у горшых з нас ёсць часцінка дабра, і ў найлепшых з нас ёсць часцінка зла. Калі мы зразумеем гэта, адчуем, тады мы станем менш схільнымі ненавідзець нашых ворагаў. Калі мы будзем глядзець углыбіню праблемы, шукаць прычыну зробленага ў прыступе зла, тады мы будзем знаходзіць у нашым бліжнім – нашым ворагу часцінкі дабра і разумець, што заганнасць і скіраванаць яго дзеянняў на зло не дае нам поўнай карціны аб гэтым чалавеку. Мы пачынаем бачыць яго ў новым святле. Мы пачынаем разумець, што яго нянавісць з'яўляецца вынікам страху, гардыні, няведання і адсутнасці ўзаемаразумення. Але, нягледзячы на ўсё гэтае, мы ведаем, што душа кожнага чалавека нясе ў глыбіні пячатку Божую. І мы пачынаем любіць нашых ворагаў, разумець, што яны яшчэ не сапсаваныя цалкам і ўсёзбаўленчая любасць Госпада нашага можа крануцца і іх.

Па-трэцяе, мы павінны шукаць не паразы ці прыніжэння нашага ворага, а ягонага сяброўства і паразумення. Бываюць дні, калі мы здольныя прынізіць злейшага з нашых ворагаў. Непазбежна прыходзіць час, калі яго слабасці праяўляюцца, і мы атрымліваем магчымасць скончыць з ім. Але мы не павінны гэтага рабіць. Кожнае сказанае слова і кожны зроблены крок павінны быць пачаткам усталявання падмурка ўзаемаразумення, вызваляць тыя вялізныя запасы дабра, што былі схаваныя за мурамі нянавісці.

Магчымасці ненасільных дзеянняў для развязання палітычных працэсаў у нас у Беларусі патрабуюць самага шчыльнага разгляду і падрабязнай распра-

цоўкі. У **дадатку III**, што знаходзіцца ў канцы кнігі, дадзены больш поўны аналіз сучаснай тэорыі і практыкі ненасілля. Аднак гэтая тэма ўжо выходзіць за рамкі нашай кнігі і будзе разгледжана пазней асобна.

### *Негвалтоўныя метады рэалізацыі беларускай нацыянальнай ідэі*

Ажыццяўленне нацыянальнай ідэі – дасягненне незалежнасці знутры і самасцвярджэнне нацыі – у наш час магчымы шляхам ненасільнага дзеяння. Якімі ж метадамі можна ненасільна працістаяць дзейнаму аўтарытарнаму рэжыму? Найбольшую ўвагу можна аддаць наступным ненасільным акцыям і грамадскім рухам:

1. *Праца сярод насельніцтва* – рабочых, сялян, інтэлігенцыі і іншых сацыяльных груп. Напрыклад, у 1991 г. у Мінску выйшла на вуліцы каля 100 000 чалавек, была прыпынена праца вялікіх заводаў і прадпрыемстваў і гэта дало магчымасць уздзейнічаць на ўрад. Сацыяльнае супрацьстаянне – магутная зброя ненасільнай барацьбы.

2. Стварэнне вялікай сеткі *няўрадавых арганізацый і прадпрыемстваў*. Трэба максімальна змяншаць сацыяльную і эканамічную залежнасць людзей ад дзяржавы. Многія з нашых рабочых і служачых да гэтага часу чыста па-саўковаму ставяцца да месца сваёй працы. Імі кіруе страх быць звольненымі, нягледзячы на жабрацкую зарплату. Прычым назіраецца адваротная парадаксальная залежнасць: чым менш чалавек атрымлівае, тым больш ён абараняе рэжым, і чым больш заможна ён жыве, тым больш ён схільны да крытыкі рэжыму. Магчымасць самастойнага стварэння сямейнага бюджэту, максімальна магчымая незалежнасць чалавека ад дзяржавы – вось шлях перамогі над сіндромам савецкага страху.

3. Важным пытаннем з'яўляецца праблема *паразумення* паміж рознымі дэмакратычнымі арганізацыямі і партыямі, а таксама *каардынацыя дзеянняў* паміж імі і ўсёй апазіцыяй. Неабходнасць негвалтоў-

нага характару супрацьстаяння рэжыму прызнаецца цяпер усімі. Але шлях шматпартыйнасці часта становіцца тормазам прарэсу, а не здабыткам дэмакратыі.

Мала ведамым метадам паразумення паміж плынямі розных ідэалагічных кірункаў з'яўляецца метад, пра які мы вышэй ужо гаварылі, гэта метад, вядомы ў палітыцы пад тэрмінам "*саборнасць*".

Саборнае прыняцце рашэнняў, як ніколі, важнае менавіта ва ўмовах шматпартыйнасці і дзялення грамадства па шматлікіх інтарэсах. Успомнім, што ў гісторыі Беларусі саборнае вырашэнне гістарычна важных пытанняў мае старажытную традыцыю. Гэтая традыцыя нам ведамая пад назвай ***Пагоня***, якая яшчэ ў XIII стагоддзі збірала ўсё баяздольнае насельніцтва ВКЛ для сумеснай абароны ад ворагаў. Гэта быў саборны акт.

4. *Метад несупрацоўніцтва.* Несупрацоўніцтва з аўтарытарным рэжымам толькі на першы погляд мала значыць для ўрада. На самай справе гэта псіхалагічна тонкі, выматваючы метад. Адмова супрацоўніцтва з урадам высокаадукаваных людзей, навукоўцаў, эканамістаў аслабляе рэжым і вымушае дыктатара рабіць крокі да адступлення. У апазіцыйнай прэсе пастаянна расце колькасць выдатных, незалежных журналістаў, пакідаючы ўрадавым сродкам масавай інфарамацыі ўсё менш інтэлектуалаў.

5. *Рэлігійны фактар.* Для народаў Еўропы хрысціянства заўсёды было важным сродкам уздзеяння на масы. Ведама, што ў Польшчы ў цяжкія 1980-я гг. палітычнай барацьбы з савецкім рэжымам менавіта Каталіцкі Касцёл з'явіўся стрыжнем кансалідацыі грамадства на шляху да незалежнасці. Касцёл арганічна спалучыўся з польскай нацыянальнай ідэяй, стаўшы разам з ёй фундаментам дзяржаўнага суверэнітэту. Гэты працэс быў раўназначны рэвалюцыі, але адбыўся мірным, негвалтоўным чынам, у вялікай ступені дзякуючы менавіта Касцёлу і тым хрысціянскім ідэалам, якія ён нёс.

Беларусь ляжыць на мяжы падзелу каталіцкага і

праваслаўнага свету. І таму яе становішча больш складанае, чым у суседняй, аднаканфесійнай Польшчы. Акрамя гэтага, традыцыі атэізму даволі моцна ўкараніліся ў жыцці беларусаў. Цяпер інтэнсіўна ідзе працэс вяртання хрысціянскіх каштоўнасцяў, але гаварыць аб тым, што рэлігія ў Беларусі здольная аказваць уплыў на палітычныя працэсы, яшчэ рана. Праблематычна чакаць ад хрысціянскіх канфесій у найбліжэйшы час эфектыўнасці ў негвалтоўнай барацьбе за рэалізацыю нацыянальнай ідэі, хоць менавіта Царква была асноўнай апорай у барацьбе за незалежнасць у многіх дзяржавах. Абумоўлена гэта як слабасцю рэлігійных традыцый, так і прыцягненнем праваслаўя да Масквы, а Касцёла – да Варшавы. Аднак нельга абмінуць той факт, што за гады рэлігійнага пад'ёму нямала зроблена для беларусізацыі ўсіх беларускіх хрысціянскіх канфесій, асабліва каталіцызму. Хрысціянства ў Беларусі як палітычны фактар яшчэ праявіць сябе, бо беларусам уласцівыя нутраная рэлігійнасць і павага да старадаўных народных традыцый, што спрыяльна ўздзейнічае на вяртанне Бога беларускаму народу.

Акрамя традыцыйных канфесій, важным вектарам рэлігійнага жыцця ў Беларусі з'яляюцца шматлікія пратэстанцкія ўтварэнні. Імклівы рост пратэстанцкіх суполак з аднаго боку засмучае прадстаўнікоў традыцыйных у Беларусі канфесій – праваслаўнай і каталіцкай. З другога боку – гэтаму працэсу не трэба надаваць надзвычайнай увагі. Магчыма, ён будзе надаваць узаемадачыненню каталіцызм-праваслаўе нейкі новы станоўчы імпульс, будзе з'яўляцца полем прымірэнне і адначова аб'яднання пазіцый для сумеснага дыялогу.

# ЗАМКАЛЬНЫЯ РАЗВАГІ

Нацыянальная ідэя – гэта словы і дзеянні мадэрнай гісторыі. Яшчэ гадоў сто таму, а то і меней, не існавала ніякай такой "ідэі". А слова "нацыяналізм", відаць, стала набываць сваю папулярнасць і ведамасць толькі пасля Другой сусветнай вайны і стала асацыявацца з нейкай адменаю фашызму, а другім разам і ўтаесамляцца.

Нацыяналізм як факт паліталагічнага дыскурсу ўвайшоў у навуку праз даследаванні заходніх навукоўцаў, гісторыкаў, палітыкаў і журналістаў. У навуковы абшар СССР гэты дыскурс не ўпісваўся з прычынаў антаганізму яго з камуністычнай ідэалогіяй, сацыялістычным ладам і савецкім народам, які ўжо амаль пабудаваў камунізм. А камунізм не агадваў падзелу чалавечага грамадства на нацыі.

Аднак гісторыя паставіла ўсё чыста на патрэбныя месцы. Нацыі не толькі не зніклі, яны пачалі імкліва множыцца, нацыянальныя дачыненні ў XX–XXI стст. сталі галоўным рухавіком большасці сусветных палітычных падзей. Мапа Зямлі ператварылася ў "дробназярністую" мазаіку нацыянальных дзяржаў, чаго не было за ўсю папярэднюю гісторыю існавання людства.

І адной з гэтых каморак, нацыяў-дзяржаў стала Беларусь. Без гэтай маленькай, але вельмі важнай для Створцы каморкі, не будзе поўнай карціны гэтага выдатнага пано зямной кулі. Усе кампаненты-каморкі сусветнай мазаікі гарманічна спалучаюцца, і менавіта ў гэтай гармоніі і ёсць сэнс найлепшага Божага стварэння – чалавека.

Дык што ж за "карона" стварэння той чалавек, які засяляе невялікі кавалачак Зямлі ў самым цэнтры Еўропы? І што за дзяржава, якую ўтварылі гэтыя беларусы? І стварылася незалежная дзяржава Беларусь, як бачыцца многім сучасным аналітыкам, не сваёй воляй, а паводле збегу абставінаў, выкліканых распадам Савецкага Саюза.

Сапраўды, наша дзяржава – Беларусь утварылася

не воляй народа, але і невыпадкова. Божай воляй яна ўтварылася, была створана, як мусовы этап імкнення людства да Праўды, якая можа быць толькі ў Хрысце. Божай воляй робіцца на гэтым свеце ўсё. І ў тым, што зусім нядаўна, праз XX ст. усе сусветныя імперыі распаліся на карысць нацыяў-дзяржаў, мне бачыцца Божае Празорства. Такі закон развіцця зададзены Стварцам.

Ёсць меркаванне, быццам Беларусь атрымала незалежнасць "на дармаўшчынку", без патрэбных намаганняў, супраць большасці нацыяў, якія крывёю здабывалі сваю свабоду і незалежнасць, беларусы ж "палец аб палец" не стукнулі, каб дабіцца слыннага суверэнітэту. Сабраліся Ельцын, Краўчук і Шушкевіч у Віскулях, схадзілі ў лазню – і Саюза няма. У выніку правалу путча 1991 г. атрымала паразу апошняя спроба рэстаўрацыі сацыялістычнага рэжыму і пачаўся "парад суверэнітэтаў". І нібыта Беларусь мусіла прыняць сваю дэкларацыю аб суверэнітэце – не аставацца ж ад іншых рэспублік.

Насамрэч гэта не так. Беларусі даўно наканавана быць дзяржавай. Яна была ёй ужо праз тысячу гадоў. Чамусьці пачатак Усходняга славянства традыцыйна ведамы толькі пад назвай "Кіеўская Русь". А было ж і Полацкае, і Тураўскія княствы, і, як вынікае з крыніц, існавалі яны фактычна асобна ад Кіева, бывалі з ім у стане неадменнага супаравання. Высвятляецца таксама, што Маскоўскае княства, якое дало пачатак будучай Расійскай Імперыі, наагул мае малое дачыненне да таго ж Кіева, і зразумела імкненне сучасных украінцаў лічыць першых кіеўскіх князёў Ігара, Святаслава, Уладзіміра і г. д. першымі ўладарамі старажытнай Украіны (але не Расіі). І становіцца зразумелым, што наша беларуская гісторыя пачалася паралельна з украінскай і мае тысячагадовую гісторыю. Больш за тое, у тыя часы, калі Украіна апынулася пад уладай татара-манголаў, а Кіеў быў ушчэнт разбураны, Беларусь засталася "Белай Руссю", не кранутай азіяцкай навалай.

І беларуская дзяржава – Вялікае княства Літоўскае становіцца ў XIII – XVI стст. наймагутнейшай дзяржавай з высокай культурай і традыцыямі.

Ад гэтай зямлі – цэнтра Еўропы – як у геаграфічным сэнсе, так і ў сэнсе сталага магутнага мазгавога выпраменьвання – ідзе вялікая містычная сіла і асвячальная ласка. Беларусь – цэнтр хрысціянства. Тут сыходзяцца ўсходні і заходні імпульсы хрысціянства, яны мірна суіснуюць вякамі, і думаецца, што менавіта тут мусіць спраўдзіцца спрадвечная мара людства – час хрысціянскага яднання, вяртання ўсіх хрысціянскіх варыяцыяў у першасную форму, дадзеную Хрыстом – Сусветную Царкву, у якой гучыць сімфонія лучнасці з дзяржавай, грамадствам і народам.

Не! Мы заслужылі сваю незалежнасць даўно, нашмат гадоў раней за Расію і шмат якія іншыя паважаныя народы і дзяржавы, што ўтварыліся з распадам СССР. Таму і не трэба было на гэтым факце ў 1991-м годзе акцэнтаваць увагі. Незалежнасць – гэта наша гістарычная спадчына, якая не залежыць ад палітычнага прызнання ці непрызнання тых або іншых краін і арганізацыяў накшталт ААН.

Беларусь – краіна, якая мае багатую на падзеі і працяглую ў часе тысячагадовую гісторыю. Адлік яе ідзе ад набыцця незалежнасці ў XI ст. Полацкім і Тураўскім княствамі, якія і ўтварылі аснову будучае вялізнай дзяржавы ВКЛ. Пачатак жа гісторыі магутнай суседкі – Расіі – можна аднесці толькі да часоў Маскоўскага царства, а гэта XIII–XIV стст.

Беларусы першымі з усходніх славян навучыліся друкаваць кнігі кірыліцай і доўгі час задавалі высокі культурны і навуковы ровень на вялікай прасторы Еўропы.

Беларусы ў XVII ст. адбудавалі Маскву, а ў XIX–XX стст. засялілі і акультурылі Пецярбург.

Беларусы за кароткі тэрмін – каля 100 гадоў – стварылі багатую нацыянальную літаратуру на сучаснай беларускай мове і значна ўзбагацілі рускую

літаратуру (Ф. Дастаеўскі), польскую (А. Міцкевіч), іншыя культуры.

Беларусы былі каралямі Польшчы ў мінулым (прыкладам, Ягайла) і кіравалі той жа Польшчай у XX ст. (Пілсудскі). Беларус І. Дамейка быў нацыянальным героем Чылі, а Т. Касцюшка – ЗША.

Геаграфія Беларусі за гэтыя 1000 гадоў мянялася значна, яе межы дасягалі Балтыйскага і Чорнага мораў у XV–XVI стст., і на цяперашні час яна выглядае як сярэдняя еўрапейская дзяржава з геаграфічным цэнтрам Еўропы. Бытнасць Беларусі адчувальная і цяпер у гаворках Смаленшчыны (Расійскай Федэрацыі), у аўры і культуры Віленскага краю і Вільні, у беларускіх вёсках Беласточчыны.

Беларусы выдатныя музыкі і кампазітары, далі свету такіх людзей, як Глінка, Стравінскі, Куліковіч, Равенскі, а таксама “Песняроў”. Яны выдатныя матэматыкі, бо творца неэўклідавай геаметрыі Лабачэўскі быў беларусам.

Пералік нашых нацыянальных герояў, творцаў і дзеячоў можа доўжыцца бясконца.

І перадусім – яны носьбіты беларускай нацыянальнай ідэі і беларускага нацыяналізму. Кожны з іх зрабіў свой унёсак у гэтыя каштоўнасці, і цяпер мы можам з гонарам казаць: беларуская нацыянальная ідэя ёсць! І неістотна, якой дарогай пойдзе далей Беларусь – дарогай сумнеўнай дэмакратыі ці, наадварот, жорсткага аўтарытарызму. А хутчэй за ўсё яна сапраўды стане цэнтрам хрысціянскага сумоўя, бо Бог жыве на Беларусі і ў Беларусі...

Ну, добра. Беларусь мае тысячагадовую гісторыю і, больш за тое, тысячагадовую дзяржаўнасць. Мы маем мноства выдатных дзеячоў культуры, навукі, мастацтва. Мы маем сваю старажытную, арыгінальную беларускую мову. Грунт для пабудовы нацыяналізму, такім парадкам, ёсць. І ў кнізе я паспрабаваў зрабіць такія-сякія замалёўкі што да беларускай нацыянальнай ідэі – беларускага нацыяналізму.

Аднак я прадбачу няўхільныя ўпікі ад пэўных

людзей пасля знаёмства з маёй кнігай. Нават не ўпікі, а нязгоду, калі не адкрытую варожасць. Я прадбачу, прыкладам, непрыняцце тых раздзелаў, дзе крытыкуецца унія і міф аб уніяцкай веры як нацыянальнай рэлігіі. Час, ведама, нас рассудзіць, але нам усім трэба стаць у нейкую нейтральную пазіцыю і паспрабаваць знайсці пэўную "залатую" сярэдзіну. І тады стане зразумела, чаго віцябчане забілі Язафата Кунцэвіча і што ў той сітуацыі яны больш праўдзілі, чым уніяцкі біскуп. Але разам з тым я бачу і тое, што менавіта Уніяцкая Царква на канец XVIII ст. стала адзіным асяродкам, дзе яшчэ захоўваўся беларускі этнас, дзе яшчэ можна было пачуць народную гаворку сярод прыхаджанаў. Бо паланізацыя ўжо абняла на той час вярхі цалком, беларускую шляхту, эліту. Але я бачу і тое, што тая ж Уніяцкая Царква, з грунту, мала рознілася ад Праваслаўнай і ў тыя часы, і пазней, бо захавала ўсходні абрад, а гэта значыць – вяла свае набажэнствы цалком па-праваслаўнаму. Больш за тое, як і цяпер у Беларускай Праваслаўнай Царкве, у тыя часы набажэнствы ў абедзвюх Цэрквах вяліся на царкоўнаславянскай мове. Таму процістаўляць гэтыя дзве канфесіі – чысты нонсэнс і выгадна толькі пэўным палітычным дзеячам.

Мэта гэтых людзей – раздзяліць Беларусь, што, дарэчы, адлюстроўваецца і ў моднай сучаснай тэматыцы накшталт разважанняў на тэму рассечаных краін, куды яны адносяць і Беларусь. Наадварот, мала такіх маналітных краін, як Беларусь. І паводле нацыянальнай прыкметы – мы вельмі аднародная краіна, бо большая частка нас – беларусы. І паводле веравызнання – мы хрысціяне і, найхутчэй, – усё ж прыхільнікі "ўсходняга абраду", праваслаўнага. Але і беларускія каталікі, гэта зусім не польскія паны, і праваслаўныя жыхары суседніх вёсак, вельмі часта даводзяцца ім сваякамі. І канфесійная прыхільнасць для беларуса мае вельмі малое значэнне. Ён аддасць перавагу гаспадарцы таго ж суседа, яго адукацыі, практычнасці і розуму. Вось на якім рэлі-

гійным грунце, як мне бачыцца, мусіць будавацца беларускі нацыяналізм. А калі канкрэтней – праваслаўе, але не маскоўскае, а сваё, беларускае, вытокі якога ў Кіеўскай Русі і еўрапейскіх хрысціянскіх традыцыях Візантыі і Грэцыі, Афона і Жыровіцаў.

Аснову кожнага нацыяналізму складаюць нацыянальныя міфы, і сярод іх – нацыянальныя героі. Я лічу сапраўднымі нацыянальнымі беларускімі героямі літоўскіх князёў, пачынаючы ад Міндоўга і Гедыміна, польскіх каралёў (Ягайла) ды тых геніяў (як, прыкладам, Дастаеўскі), што сталі набыткам культур іншых народаў. А гэта ўносіць у скарбніцу пад назвай *нацыянальная ідэя* набытку на некалькі парадкаў больш, чым геройствы рэвалюцыянераў мінулай эпохі, якія афарбавалі свет у крывавы чырвоны колер камунізму.

І яшчэ. Тэндэнцыя апошняга перыяду найноўшай гісторыі, што пачалася ў 90-я гг. XX ст. і працягваецца да нашага часу, характарызуецца небывалым уздымам беларускага нацыянальнага руху, пасіянарным скокам у працэсе фармавання беларускай нацыі. Але цікавая выйшла сітуацыя – усё, што звязваецца з беларускасцю, стала ўзурпавацца вылучна каталіцкай меншасцю Беларусі. Гэтаму нямала спрыяла і беларуская мова ў касцёлах, і адраджэнне уніяцтва і веравызнанне лідэраў беларускага руху, такіх, як Пазняк, Хадыка, Вячорка, Баршчэўскі, якія, калі не каталікі, дык людзі непрыхільныя да праваслаўя. Гэтаму спрыяла і суцэльная "атэізацыя" насельніцтва, што за гады бальшавіцкае ўлады адышло ад Бога і хутчэй прымае астралогію і экстрасенсаў, чым духоўныя праўды, чым Хрыстову ратавальную ахвяру.

Дайшло да таго, што беларуская нацыянальная ідэя стала ў вялікай ступені суадносіцца з гэтай каталіцкай меншасцю, а сціплыя выступы беларусаў сведамых, але праваслаўных паводле веравызнання, заўсёды звязваліся альбо з працай расійскіх спецслужбаў, альбо з здрадай на карысць Масквы. Вялізная колькасць беларусаў некаталіцкага веравызнан-

ня, сельскіх жыхароў, настаўнікаў, лекараў, простых рабочых найбуйнейшых заводаў і адукаваных функцыянераў былой партыйнай праслойкі не прынялі ідэяў БНФ. І сама трагічнае – яны засталіся ўбаку ад нацыянальнай ідэі, бо яна ў вялікай ступені стала ўтаесамляцца з тым жа Фронтам. Нездарма карыстанне беларускай мовай стала прыкметай апазіцыйнасці. На такім тле яшчэ большым становіцца адасабленне ад нацыянальнай ідэі многіх ідэолагаў Праваслаўнай Царквы, якім нічога не замінала адкрыта прыняць прарасійскую пазіцыю. Яно б нічога, каб не адна акалічнасць – гэтае поле прарасійскіх і антыбеларускіх гульцоў у Беларусі нашмат большае, чым поле каталіцкай меншасці, што прысвоіла сабе беларускую нацыянальную ідэю.

Але ж гісторыя сведчыць, што праваслаўная беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае праз стагоддзі было адметнай еўрапейскай дзяржавай і ніколі не скарылася ані на карысць Масквы, ані на карысць Польшчы ці іншай якой краіны. І мы, сучасныя беларусы, грамадзяне краіны Рэспубліка Беларусь – чыстай спадкаемцы ВКЛ – не маем ніякага права аддаваць каму сваю нацыянальную ідэю і веру. Ні каталіцкай меншасці, ні пратэстанцкай. І мова бацькоў у нас мусіць застацца той самай, што была сотні гадоў назад, мусіць быць адзінай дзяржаўнай мовай, і не папушчаць “другой дзяржаўнай мове” – расійскай.

Гэтая кніга, спадзяюся, дапаможа зразумець тым грамадзянам Беларусі, якія ўваходзяць у статыстыку 80 % праваслаўных ад усяго насельніцтва, што беларуская нацыянальная ідэя ёсць, і яна – іх ідэя, а не толькі тых, хто вызнае крыху іншыя сімвалы веры.

# ДАДАТАК І

**Зварот № 1**

*Апазіцыі БНФ у Вярхоўным Савеце Беларусі, грамадска-палітычных арганізацыяў, партыяў і рухаў да грамадзян Рэспублікі Беларусь, да усіх народаў – ахвяраў камуністычнага тэрору*

Шаноўныя суайчыньнікі, браты й сёстры зь іншых краёў!

Злачынствы, учыненыя камуністычным рэжымам Савецкай Імпэрыі ад путчу 1917 г. да путчу 1991 г. пераўзыходзяць злачынствы нацысцкай Германіі. Ад гэтага дэманічнага рэжыму пацярпелі ўсе народы сьвету. Толькі на тэрыторыі былога Савецкага Саюзу ад камуністычнага тэрору загінула больш як 60 млн. чалавек. Насельніцтва Беларусі зараз складае толькі палову таго, якое магло б быць пры натуральным шляху разьвіцьця. Улічваючы, што дзеі фашысцкай Германіі, аналагічныя балышавіцкім, ужо аб'яўлены злачынствамі супраць чалавечнасьці, а Нямецкая нацыянал-сацыялістычная рабочая партыя, СС, гестапа – злачыннымі арганізацыямі, – неабходна юрыдычна прызнаць злачынствы, арганізаваныя бальшавіцкай партыяй, – злачынствамі супраць чалавечнасьці, якія ня маюць тэрміну даўнасьці. Камуністычную ідэалёгію (вучэньне аб клясавай нянавісьці й дыктатуры пралетарыяту) неабходна прызнаць злачыннай ідэалёгіяй і асудзіць яе.

Мы падтрымліваем ініцыятыву Нацыянальна-дэмакратычнай партыі Беларусі аб правядзеньні міжнароднай канфэрэнцыі па падрыхтоўцы Міжнароднага суду па фактах бальшавіцкіх злачынстваў супраць чалавечнасьці і заклікаем грамадзян Беларусі прыняць удзел у аргкамітэце па яе ажыцьцяўленьні. Адзначым, што ў многіх краінах сьвету такая праца ўжо вядзецца.

Прапануем наступныя кірункі дзейнасьці.

**1. Ідэалягічны**

Ідэалёгія, якая грунтуецца на культе гвалту, павінна быць прызнаная злачыннай. Вось толькі не-

калькі гвалтоўных акцый, якія зроблены і ўхвалены камуністычай ідэалёгіяй: бальшавіцкі пераварот 1917 года, незаконная экспрапрыяцыя, дыктатура пралетарыяту... Увесь шлях камунізму – гэта шлях падаўленьня свабоды асобы, шляхператварэньня чалавека ў паслухмянага бяспраўнага раба, манкурта. Злачынствы бальшавізму, якi натхняўся камуністычнай ідэалёгіяй, прывялі да жудасных вынікаў як у Савецкім Саюзе, так і у акупаваных ім іншых дзяржавах сьвету. Бальшавікі, па сутнасьці, зьдзейсьнілі духоўны і фізічны генацыд над многімі народамі.

Дзеля папярэджаньня рэцыдыву бальшавізму ў якіх бы ні было формах, неабходна разгледзець пытаньне аб тым, каб прапаганда вучэньня аб дыктатуры пралетарыяту і клясавай нянавісьці у Рэспубліцы Беларусь, а таксама ў заканадаўствах дзяржаваў усяго сьвету (у выпадку міжнароднага разгляду гэтай справы) было прыроўнена да прапаганды вайны, расавай і нацыянальнай нянавісьці.

**2. Дзейнасьць камуністычных структур**

Неабходна асудзіць КПСС, КПБ, КДБ і іншыя арганізацыі гэтага кірунку, як злачынныя арганізацыі, як структуры дзяржаўна-партыйнай мафіі ці бандытызму. Яны павінны быць забароненыя бяз права аднаўленьня дзейнасьці на бястэрміновы час. Каб папярэдзіць магчымасьць адраджэньня камуністычных арганізацый пад любымі іньшымі назвамі, трэба выдаць закон аб забароне арганізацый, дзейнасьць якіх грунтуецца на камуністычнай ідэалёгіі.

**3. Арганізатары й выканаўцы камуністычныга гвалту**

Учынкі асобаў, супраць якіх ёсьць сьведчаньні складу злачынства супраць чалавецтва, павінны быць вызначаны моваю Міжнароднага права. Таму ў народны трыбунал павінен быць перададзены сьпіс гэтых асобаў, а матар'ялы па фактах злачынстваў – для перадачы ў суды пацярпелых краін.

Зразумела, гэта не датычыцца радавых камуністаў, якія павінны быць вызваленыя ад крымiналь-

най адказнасьці за дзеяньні РКП/б/-ВКП/б/-КПСС, ды іншых кампартый. Трэба даравацъ ім вольны ці міжвольны саўдзел у справах, маштабы й характар якіх у поўнай меры стаў зразумелы толькі цяпер. Мы заклікаем да міласэрнасьці ў дачыненьні да тых, хто рабіў камуністычныя злачынствы не ўсьведамляючы гэтага і хто усьвядоміў гэта цяпер. Але ўсім ім патрэбна пакаяньне, хоць перад самім сабой.

### 4. Рэестар бальшавіцкіх злачынстваў

Неабходна скласьці як мага больш поўны сьпіс злачынстваў, учыненых бальшавікамі і камуністамі наогул.Сярод іх наступныя:

– гвалтоўны захоп улады шляхам ваеннага перавароту;

– разьвязваньне грамадзянскай вайны і тэрору;

– гвалтоўная калектывізацыя;

– масавыя рэпрэсіі 20-х – 50-х гадоў;

– развал прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, ператварэньне некалі ўрадлівых зямель у няжыцьцядайныя тэрыторыі;

– разьвязваньне разам з нацыстамі 2-й Сусьветнай вайны;

– захоп Прыбалтыкі;

– усталяваньне савецкага панаваньня над народамі Усходняй Эўропы;

– халодная вайна;

– экалягічная катастрофа;

– злачынная вайна супраць афганскага народу;

– Чарнобыльская катастрофа;

– зьдзек з рэлігіі і маральнасьці, што прывяло да росквіту амаральных і антыхрысьціянскіх рысаў у чалавеку;

– вынішчэньне культуры, мовы, гістарычнай памяці і нацыянальнай сьвядомасьці беларускага і іншых народаў, што трапілі пад бальшавіцкае ярмо.

Гэты сьпіс мусіць быць падоўжаны.

Мы цалкам усьведамляем цяжар і далікатнасьць узьнятых пытаньняў і заклікаем кожнага, каго трывожыць небясьпека нэабальшавізму, далучыцца да

нас. Мы зьвяртаемся да ўсіх партыяў і рухаў, да ўсіх, хто падзяляе нашу заклапочанасьць, аб'яднацца і стварыць дзеяздольны аргкамітэт дзеля правядзеньня Міжнароднай канфэрэнцыі, як першага кроку да Міжнароднага трыбуналу па фактах камуністычных злачынстваў супраць чалавечнасьці. Задача канфэрэнцыі – выяўленьне сацыяльных і духоўных прычын, што прывялі да магчымасьці гэтых злачынстваў, вызначэньне іх сутнасьці, цяперашніх і будучых вынікаў для нашага народу.

Асноўная мэта будучага Міжнароднага трыбуналу – ня помста, ня новыя ахвяры, не каменяваньне грэшнікаў, а падвядзеньне рысы – найперш юрыдычнай пад усімі злачыннымі скрыўленьнямі шляхоў чалавечай гісторыі, без чаго не мажліва сапраўднае пакаяньне, трывалая гармонія паміж людзьмі, прыродай і Богам.

**Жыве Беларусь!**

Менску 30 сакавіка 1992 г.

Старшыня Апазіцыі БНФ у Вярхоўным Савеце Беларусі — Зянон Пазьняк

Намесьнік старшыні БНФ — Юрась Хадыка

Старшыня Нацыянальна-дэмакратычнай партыі Беларусі — Анатоль Астапенка

Старшыня Беларускай сялянскай партыі — Яўген Лугін

Сустаршыня-каардынатар Беларускай Хрысьціянска-дэмакратычнай Злучнасьці — Пятро Сілка

Прэзідэнт Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў — Адам Мальдзіс

Старшыня Вольнага прафсаюзу «Рабочая салідарнасць» — Анатоль Мацвеенка

Старшыня Аб'яднанай дэмакратычнай партыі Беларусі — Алесь Дабравольскі

(Зварот быў надрукаваны ў газеце “Свабода”, № 5, 1992 г.)”

# ДАДАТАК II

## Зварот № 2. “Беларускага МАК “Нюрнберг-2”

*“Літасьці хачу, а не ахвяры.*
(Мф.,9:13.)

## МІЛАСЭРНАСЬЦЬ, ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ЧАЛАВЕЧНАСЬЦІ, МІЖНАРОДНАЕ ПРАВА

Зварот
*да грамадзян Рэспублікі Беларусь, да іншых народаў*
*Шаноўныя суайчыньнікі, браты й сёстры зь іншых краёў!*

На завяршэньні ня толькі веку XX-га, але й II тысячагоддзя Хрыстовае эры, калі “прывід камунізму”, дзякаваць Богу, адыйшоў ад Эўропы, але прадказаныя ў Эвангельлі сконныя знаменьні яўна ўвайшлі ў наша жыцьцё, – мы заклікаем тэолагаў, юрыстаў, дзеячоў культуры, палітыкаў, людзей іншых прафесій абмеркаваць ідэю скліканьня на Беларусі, якую найболей кранула сконная зорка-Палын – Чарнобыль, – ТРЫБУНАЛУ ПРЫМІРЭНЬНЯ Й ПАКАЯНЬНЯ, – на якім была б падведзена міжнародна-прававая и духоўная рыса пад **усімі** злачыннымі шляхамі чалавечай гісторыі.

Кульмінацыя гэтых шляхоў лягла на век XX, які ўнаявіў самыя жудасныя – пасьля ўкрыжаваньня Хрыста – гістарычныя катастрофы: бальшавізм і нацызм.

Мы прапануем засяродзіцца на наступным:

1. Марксізм-ленінізм і нацызм – на узроўні сфармуляваных вучэньняў – гэта хула на Духа Сьвятога, адзінае, што не даруецца душам і ў Вечнасьці.

2. На ўзроўні практычнай рэалізацыі – на тэрыторыях, што былі захопленыя бальшавікамі й нацыстамі, – гэта злачынствы супраць чалавечнасьці, якія ня маюць тэрмінаў даўнасьці.

3. На ўзроўні **умыслу** саміх творцаў гэтых

вучэньняў і сьвядомых выканаўцаў – гэта бясоўская спакуса ліквідавацъ Божыя запаветы: НЕ ЗАБІ, НЕ ПАЖАДАЙ ДАБРА СВАЙГО БЛІЖНЯГА, – толькі ў глабальным маштабе, – спалучаная з прыняцьцем дэманскае прапановы, якую ён адрасаваў Самому Хрысту: "... паказаўшы Яму ўсе царствы сьвету і славу іх. І кажа Яму: усе гэта дам Табе, калі ўпаўшы паклонішся мне." ( Мф., 4: 8-9).

Мы ўсе, – што ў той ці іншай меры "... упалі й пакланіліся..." – павінны на гэтым своеасаблівым ТРЫБУНАЛЕ і ў час падрыхтоўкі да яго паспрыяць не только удасканаленьню правах нормаў – міжнародных і нацыянальных, – але найперш даравацъ **у с і м** , хто саграшыў у мінулых катастрофах гісторыі, і пакаяцца ў грахох **у л а с н ы х** .

У Менску, 25 лютага 1992 г.
*Ініцыятыўная група*."

## ДАДАТАК III

### Сучасная канцэпцыя філасофіі ненасілля

Сучасная канцэпцыя філасофіі ненасілля вылучае ***шэсць прынцыпаў***.

***Першы***. Трэба найперш падкрэсліць вельмі важную ісціну: палітыка ненасілля – гэта не шлях баязліўцаў, гэта сучасны і цывілізаваны метад супраціўлення рэжыму. Калі нехта выкарыстоўвае нешта накшталт ненасільнага супраціўлення толькі таму, што ён баіцца ці не мае магчымасці (жадання) выкарыстаць гвалт, то гэта яшчэ не ёсць сапраўднае ненасілле. Невыпадкова Гандзі казаў, што калі баязлівасць – адзіная альтэрнатыва насіллю, то лепш не ўступаць у бойку. Сцвярджаючы гэтак, Гандзі разумеў, што ёсць і іншая альтэрнатыва: ні адзін чалавек ні група людзей не павінны паводзіць сябе не па сумленні, не павінны звяртацца да насілля нават дзеля вялікай справы, бо заўсёды існуе шлях ненасілля.

У рэшце рэшт, ненасілле – гэта шлях моцных людзей. Ненасілле – гэта не бяздзейная пасіўнасць. І таму дзеянне пад назвай «пасіўнае супраціўленне» не трэба разумець як метад «поўнага бяздзеяння», пры якім чалавек ціха і спакойна мірыцца з злом. Прыхільнік ненасільнага супраціўлення пасіўны толькі ў тым сэнсе, што ён не выкарыстоўвае фізічнае насілле да сваіх ворагаў, але яго розум і эмоцыі актыўныя, таму што ён заўсёды шукае шляхі, каб пераканаць праціўніка ў тым, што той паводзіць сябе дрэнна. У гэтым метадзе няма актыўнасці фізічнай, затое ёсць вялізная духоўная актыўнасць.

***Другі.*** Гэта адсутнасць знявагі да супраціўнага боку; мэта не ў тым, каб знішчыць праціўніка, а ў тым, каб заваяваць ягоную любоў і разуменне. Прыхільнікі гэтай палітыкі могуць выказваць свой пратэст байкотам ці адмовай ад супрацоўніцтва, але самыя дзеянні не з'яўляюцца самамэтай. Сапраўднай мэтай з'яўляецца выкупленне і прымірэнне. Канцавая мэта ненасілля – стварэнне дастойнага грамадства, тады як насілле можа нарадзіць толькі трагедыі і журбу.

***Трэці.*** Дзеянні апазіцыі рэжыму павінны быць скіраваныя супраць саміх сілаў зла, а не супраць канкрэтных людзей, якія аказаліся яго носьбітамі. Ненасілле змагаецца са злом, а не з тымі, хто стаў ягонай ахвярай.

***Чацверты.*** Характэрная рыса палітыкі ненасілля – гатоўнасць прыняць пакуты, не думаючы пра пакаранне і гатоўнасць прымаць удары і не адказваць ударам на удар. Гандзі неяк сказаў сваім суайчыннікам: «Магчыма, пральлюцца рэкі крыві, перш чым мы дасягнем свабоды, але гэта павінна быць нашая кроў». Прыхільнік ненасільнага супраціўлення прымае насілле, калі так склаліся абставіны, але ніколі не нараджае яго. Ён не ўхіляецца ад турмы. І калі турэмнае зняволенне непазбежнае, ён прымае яго «з радасцю жаніха, які ўводзіць у спальню нявесту».

Можна задаць законнае пытанне: «Што дазваляе нам апраўдаць тыя цяжкія выпрабаванні, да якіх мы заклікаем людзей, у чым сутнасць масавага выкарыстання хрысціянскага прынцыпа «падстаў другую шчаку»? Адказ у тым, што незаслужаныя пакуты з'яўляюцца выкупленнем. Гандзі пісаў: «Пакуты нашмат больш дзейсны сродак, чым закон джунгляй, для таго, каб змяніць праціўніка, прымусіць яго прыслухацца да голасу здаровага сэнсу».

***Пяты.*** Палітыка ненасілля ў тым, што яна выключае не толькі ўсякае вонкавае фізічнае насілле, але і нутранае насілле над духам чалавека. Прыхільнік ненасілля не толькі адмаўляцца забіваць свайго праціўніка, ён адмаўляецца таксама яго ненавідзець. Краевугольным каменем гэтай палітыкі з'яўляецца любоў.

Мы гаворым тут пра любоў. Але, што мы разумеем пад любоўю? Зразумела, што мы не маем на ўвазе сентыментальную і пяшчотную прывязанасць. Было б смешна чакаць ад прыгнечаных, што яны будуць ласкава любіць сваіх прыгнятальнікаў. Тут маецца на ўвазе любоў як разуменне.

У грэцкай мове ёсць тры розныя словы, якімі азначаецца любоў.

А. «*Эрас*». У вучэнні Платона эрас азначаецца як імкненне душы ў боскае царства. Цяпер гэтым словам абазначаюць і эстэтычную, і рамантычную, і фізічную любоў паміж жанчынай і мужчынам.

Б. «*Філія*». Душэўная блізкасць паміж сябрамі. Гэта ўзаемная прывязанасць, калі чалавек любіць таму, што самога яго любяць.

В. «*Агапэ*». Трэці від любві, пра які мы і вядзем гаворку. Калі мы гаворым пра любоў да нашых прыгнятальнікаў, то мы не маем на ўвазе «эрас» ці «філію», мы гаворым пра трэці тып любові, які грэкі называлі «*агапэ*». Агапэ азначае разуменне, добрую волю ў дачыненні да ўсіх людзей, гатоўнасць да выкуплення. Гэта любоў усёабдымная, бескарыслівая і творчая. Яна не залежыць ад учынкаў таго, на каго

яна скіраваная. Гэта любоў Бога ў сэрцы чалавека.

Агапэ не розніць людзей на добрых і дрэнных, патрэбных і непатрэбных, для яе не маюць значэння асабістыя якасці чалавека. Гэта любоў да людзей дзеля іх саміх, «любоў да бліжняга ў найвышэйшай сваёй праяве, дзе кожны чалавек «бліжні» нам. Таму агапэ не падзяляе людзей на сяброў і ворагаў: яна скіравана на ўсіх.

Агапэ – зусім не слабая бяздзейная любоў. Гэта любоў актыўная. Агапэ – любоў, заклікаваная ствараць і захоўваць чалавечую грамаду. Гэта гатоўнасць дараваць не сем разоў, а семдзесят раз па сем дзеля захавання гэтай чалавечай супольнасці – у адпаведнасці з тым, як навучаў Ісус Хрыстос свайго найлепшага вучня апостала Пятра. Місія Хрыста ў тым, што ён узышоў на крыж, каб аб'яднаць людзей. Уваскрэсенне сімвалізуе ягоную перамогу над сіламі, што спрабуюць раз'яднаць людзей. Адказваючы нянавісцю на нянавісць, мы толькі раз'ядноўваем людзей, а адказваючы любоўю на нянавісць, мы іх аб'ядноўваем.

І, нарэшце, агапэ – гэта і прызнанне таго, што ўсё ў жыцці ўзаемазвязана. Усе мы – дзеці адзінага гістарычнага працэсу, і ўсе мы – браты. Калі мы прыносім шкоду свайму бліжняму, як бы ён да нас ні ставіўся, мы прыносім шкоду і сабе. Каб падкрэсліць сутнасць гэтай любові-агапэ ў Бібліі, сучасныя багасловы, навукоўцы і інжынеры, выкарыстоўваючы сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі, стварылі універсальны варыянт Бібліі, які называецца "Агапэ-Біблія".

***Шосты.*** Гэты прынцып палягае на ўпэўненасці ў тым, што сусветны парадак знаходзіцца на баку справядлівасці. З гэтага вынікае наша ўпэўненасць у будучым. Гэта дапамагае нам прыняць пакуты і не думаць аб помсце. Мы верым у тое, што мы не адзіныя ў нашай барацьбе, за нас увесь сусвет. Сярод нас могуць быць людзі, якія не ўспрымаюць ідэю Бога, ідэю Бога ў душы кожнага чалавека, аднак і яны ўпэўнены, што існуе нейкая ўсяленская творчая сіла. І ў якой бы форме яна не існавала – можа, гэта падсвядомасць,

бястварны Брахман ці Асоба з вялізнымі магчымасцямі і бясконцай любоўю – у любым выпадку гэтая стваральная сіла ёсць, і яна пераўтварае раскіданыя элементы рэчаіснасці ў гарманічнае цэлае.

### Маральныя прынцыпы ненасілля

А. А. Гусейнаў сцвярджае, што Нагорная пропаведзь прызначаная для ідэальнага свету і патрэбна быць святым, каб здолець прыняць яе "перавернутую логіку". Але ж гэта далёка не так. Тысячы, мільёны людзей з часоў Хрыста прымаюць гэтую зусім не перавернутую логіку. Хрысціяне розных канфесій аднолькава адзіныя ў прыняцці хрысціянскіх прынцыпаў. Іншая справа, што свет, на жаль, яшчэ далёка не адзіны, і як 2000 гадоў таму мы маем тых, што скажуць: "укрыжуй яго".

Кожная этычная тэорыя павінна ўтрымліваць у сабе дзве рэчы: ***сістэму норм і спосаб іх рэалізацыі***. Ажыццяўленне практычных мадэляў зводзіцца да двух крайніх тыпаў – альбо яны ахопліваюць усю паўнату асабістага быцця – і тады іх ажыццяўленне будзе вельмі рэдкім і звязаным з адыходам ад рэальнага свету, альбо гэтыя мадэлі абмяжоўваюцца сферай матывацыі, нутранага настрою, і тады яны звязваюцца з канструяваннем нейкага іншага, ідэальнага свету.

Этыка ненасілля знаходзіцца ў прынцыпова іншых адносінах да рэчаіснасці. Яна валодае моцай, сілай, якія дазваляюць прызнаць грахоўнасць, сапсаванасць рэчаіснасці і адначасова дазваляе ўзяць на сябе адказнасць за пераўтварэнне гэтай рэчаіснасці. Яна пераводзіць думку ў практычную праекцыю. Найбольш значным вынікам такога працэсу з'яўляецца тое, што этыка ненасілля прасочваецца ў палітыку, якая найбольш далёкая ад усялякай маральнасці і робіць гэта без якога-небудзь зніжэння самой маральнасці.

Такім чынам, этыка ненасілля сцвярджае новую парадыгму паводзін чалавека ў сучасным свеце: ненасілле – гэта *ўсеагульная* і *тэхналагічная* парадыгма жыцця.

## Тэорыя ненасілля

Аб ненасільных дзеяннях як альтэрнатыве сілавога, гвалтоўнага вырашэння спрэчных палітычных, эканамічных і сацыяльных пытанняў пачалі гаварыць адносна нядаўна. Уся гісторыя чалавецтва – гэта ланцуг войн, забойстваў, гвалту над людзьмі, гэта тое, што можна аб'яднаць адным словам – насілле. У гэтым людзі не шмат адышлі ад жывёльнага свету, дзе ўсё вырашае культ сілы.

Аднак найбольш крывавае за ўсю гісторыю чалавецтва XX ст. прынесла і новы погляд на будучае суместнага сужыцця людзей на планеце Зямля. Гэты погляд падсумоўваецца простымі словамі – ненасільныя, альбо негвалтоўныя спосабы вырашэння канфліктаў.

Палітыка, альтэрнатыўная культу насілля, якая прызваная пазбегнуць небяспекі вайны, носіць назву *грамадскай абароны*. Гэтая палітыка скіравана на стрымліванне і процідзеянне іншаземнай агрэсіі, акупацыі, а таксама спробам нутранай узурпацыі ўлады.

Грамадская абарона павінна праводзіцца насельніцтвам на падставе папярэдняй падрыхтоўкі, планавання і навучання. У 1992 г. у Тайландзе адбылася ненасільная змена ваеннага рэжыму Сучынды Капрайона на карысць дэмакратычнай і прававой дзяржавы. Сулак Шываракса, вядучы актывіст апазіцыі, казаў: "Вучачыся ненасільнаму супрацыву, мы аб'ядналіся з іншымі будыстамі, з хрысціянамі і мусульманамі розных краін. Я праходзіў такое навучанне ў Мехіка і Філадэльфіі, іншыя настаўнікі прыязджалі ў Тайланд. Такая дзейнасць працягвалася на працягу 15 гадоў. І калі ў 1992 г. пачаліся пратэсты, менавіта гэтае навучанае ядро ўзяло на сябе лідэрства – сціпла, незаўважна, выкарыстоўваючы такія метады, як галадоўкі, богаслужэнні і г. д. Таму нашы дзеянні і аказаліся настолькі эфектыўнымі – людзі добра ведалі спосабы мірных дзеянняў".

Прыведзены прыклад добра ілюструе важкасць ведаў аб ненасільных метадах і паказвае, якіх вялікіх поспехаў можна з іх дапамогай дасягнуць.

Якім часам можна датаваць узнікненне ненасільных метадаў? А. Красніцкі лічыць, што грамадскаму непадпарадкаванню не менш як 150 гадоў. Але больш правільным будзе ўсё ж лічыць пачаткам філасофіі ненасілля прыход хрысціянства 2000 гадоў таму. Менавіта ў Нагорнай пропаведзі Хрыста ўпершыню былі сфармуляваныя прынцыпы ненасілля: непраціўленне злу насіллем, любоў да сваіх ворагаў і іншыя. Але больш падрабязна аб гэтым ніжэй. Нас зараз цікавіць іншае – час надыходу канкрэтных падзей, што сталі вынікам ненасільных дзеянняў. І першым такім актам, што ўвайшоў у гісторыю – была кампанія непадпарадкавання, якую праводзіў Мохандас (Махатма) Гандзі супраць апартэіду індусаў у Паўднёвай Афрыцы ў 1906 г. і потым – супраць саляной манаполіі брытанскага ўраду ў Індыі. М. К. Гандзі быў першым, хто стварыў вучэнне аб ненасільных дзеяннях, якое атрымала назву Сацьяграха (Satyagraha). Сацьяграха – гэта не фізічная сіла, яна ніколі не звяртаецца да зброі. Сацьяграха не прыносіць пакут праціўніку, яна чыстая сіла духу. “Ненасілле – гэта спакой, а актыўнае ненасілле – гэта любоў”, – казаў М. Гандзі.

Прыклады палітычнай ненасільнай барацьбы сягаюць даволі даўніх часоў. Згадаем, напрыклад, ненасільную рэвалюцыю ў 1765–1775 гг. у амерыканскіх калоніях, якая ліквідавала большасць брытанскіх урадаў у паўночнаамерыканскіх калоніях і прынесла значную перамогу амерыканцам. Можна згадаць таксама венгерскае пасіўнае супраціўленне аўстрыйскаму кіраванню ў 1850–1867 гг. і адмову ад палітычнага супрацоўніцтва фінаў з Расіяй у 1898–1905 гг. і г. д.

Аднак сапраўднага росквіту дасягнулі ненасільныя метады супраціву ў XX ст. Прывядзем толькі некалькі прыкладаў з найбліжэйшай гісторыі XX ст.

1. Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. у Расіі.
2. Ненасільны пратэст карэйцаў супраць японскага ўладарства ў 1919–1922 гг.

3. Германія. 1923 год. Барацьба Германіі ў Руры супраць франка-бельгійскай акупацыі ў 1923 г. уяўляе першы прыклад выкарыстання афіцыйнай дзяржаўнай палітыкі з пазіцый ненасілля супраць іншаземнага ўварвання.

4. Выступленні за незалежнасць Індыі ў 1930–1931 гг. пад кіраўніцтвам М. Гандзі.

5. Забастоўкі ў варкуцінскіх лагерах ў 1953 г.

6. Паўстанне 1956–1957 гг. у Венгрыі.

7. Чэхаславакія, 1968–1969 гг. Чэхаславацкія падзеі гэтых гадоў уяўляюць найбольш значную спробу выкарыстання грамадзянскай барацьбы ў мэтах нацыянальнай абароны. На працягу васьмі месяцаў чэхі і славакі не давалі магчымасці савецкім ўладам

8. Рабочы рух "Салідарнасць" у Польшчы ў 1980–1989 гг., які прывёў да выхаду краіны ад савецкага панавання і ўтварэння дэмакратычнай, незалежнай польскай дзяржавы.

9. Негвалтоўныя рэвалюцыі 1989 г. у шэрагу краін Усходняй Еўропы (ГДР, Чэхаславакія, Балгарыя), якія прывялі да краху камуністычнай савецкай сістэмы. Усходняя Германія ў выніку аб'ядналася з Заходняй Германіяй, утварыўшы ФРГ.

Практычныя вынікі заканамерна прывялі і да стварэння тэарэтычнага афармлення ідэі ненасільнага супраціву.

Найбольш фундаментальна даследаваў праблему ненасілля сучасны амерыканскі палітолаг, прафесар Джын Шарп. Яго творы "Грамадская абарона. Сістэма ўзбраення ў эпоху постмілітарызма", "Ад дыктатуры да дэмакратыі. Канцэптуальныя асновы вызвалення" і іншыя сталі класічнымі, і менавіта па працах Д. Шарпа вучацца метадам ненасілля цяпер ва ўсім свеце.

Нарэшце трэба адзначыць і працы па філасофскім абгрунтаванні ненасільнага дзеяння. Сярод іх "Тэалогія канфлікту" каталіцкага святара Дамініка Барбе, "Глабальныя і агульначалавечыя каштоўнасці" французскага сацыяпсіхолага Ж. Семлена, "Этыка

ненасілля" А. Гусейнава і шмат іншых аўтараў.

*Формы ненасільнай барацьбы: ненасільны пратэст і перакананне, несупрацоўніцтва, ненасільная інтэрвенцыя.*

**А) Ненасільны пратэст і перакананне**

Сюды ўваходзяць спробы выражэння на словах, але да несупрацоўніцтва справа не даходзіць. Гэта самая мяккая ненасільная "зброя". Да гэтага класа адносяцца: дэманстрацыі, публічныя выступленні, дэкларацыі, адмова ад узнагарод, сімвалічныя публічныя акты, пікетаванне, семінары, жалобныя мітынгі і мітынгі пратэсту.

Галоўная мэта такіх метадаў – паказаць, што дэманстранты змагаюцца *супраць* ці *за* што-небудзь, і ўздзейнічаць на праціўніка.

Прыклады ненасільнага пратэсту і пераканання.

1. Прэзідыум нацыянальнага сходу Чэхаславакіі выпусціў дэкларацыю, звернутую да ўрадаў і парламентаў пяці краін-удзельніц Варшаўскай дамовы, якія ўдзельнічалі ва ўварванні ў Чэхаславакію. У дэкларацыі асуджалася ўварванне і ўтрымлівалася патрабаванне "неадкладнага вываду" войскаў.

2. У "Мемарандуме", які быў падпісаны на пачатку лістапада 1956 г. шэрагам выдатных камуністычных пісьменнікаў і працаўнікоў мастацтваў Венгрыі, змяшчалася просьба да ЦК Кампартыі ўтрымаць улады ад выкарыстання "антыдэмакратычных метадаў, якія калечаць нашае жыццё", а таксама заклік "свабоднай, шчырай, здаровай атмасферы, напоўненай духам народнага кіраванняя".

3. У 1942 г. у акупаванай Польшчы немцы разбурылі ўсе помнікі, якія ўвекавечвалі патрыятычныя падзеі і герояў Польшчы. Тыды палякі акружылі гэтыя месцы living рознымі агароджамі і нават праводзілі богаслужэнні, чым выклікалі незадаволенасць нямецкіх акупацыйных улад.

4. У сталіцы Балгарыі Сафіі ў 1943 г. габрэі арганізавалі пратэст супраць планаванай дэпартацыі. Да яго 24 траўня 1943 г. далучыліся многія балгары не

габрэйскага паходжання. Адбыліся сутыкненні з паліцыяй і мноства арыштаў. Мацей Юдзары пісаў: "Баючыся ўнутраных беспарадкаў, фашысцкі ўрад і цар былі вымушаны адмовіцца ад свайго плану высылкі габрэяў з Балгарыі на пагібель у лагерах смерці".

5. 4 лістапада 1989 г. не менш за 500 000 дэманстрантаў прайшлі маршам праз Усходні Берлін, патрабуючы свабодных выбараў, свабоднай прэсы і грамадзянскіх правоў.

**Б) Несупрацоўніцтва**

Большасць метадаў ненасільных дзеянняў утрымліваюць несупрацоўніцтва. Несупрацоўніцтва ўключае наўмыснае спыненне, скарачэнне, змяншэнне ці разбурэнне наяўных узаемаадносін: *сацыяльных, эканамічных ці палітычных*.

***Сацыяльнае несупрацоўніцтва*** можа ўключаць адмову ад выканання прынятых сацыяльных адносін з людзьмі і групамі, якія здзяйсняюць незаконныя дзеянні.

Сярод метадаў сацыяльнага несупрацоўніцтва такія, як адлучэнне ад Царквы, байкот ці прыпыненне грамадскіх ці спартыўных мерапрыемстваў, нявыхад з дому і інш. *Прыклады сацыяльнага несупрацоўніцтва.*

1. Падчас Рурскай капаніі 1923 г. немцы абвясцілі сацыяльны байкот французскім і бельгійскім салдатам і афіцэрам. Калі салдаты заходзілі ў таверну выпіць, нямецкія наведвальнікіт адтуль выходзілі.

2. У Даніі падчас Другой сусветнай вайны датчане шырока выкарыстоўвалі супраць нямецкіх салдат метад " халоднага прыёму" – паводзілі сябе так, нібыта гэтых салдат не існуе.

***Эканамічнае несупрацоўніцтва.***

Яно складаецца ў прыпыненні наяўных эканамічных стасункаў ці ў адмове пачынаць новыя. Гэтыя формы несупрацоўніцтва больш шматлікія, чым сацыяльныя. Яны ўключаюць найперш *эканамічныя байкоты* і *страйкі*.

Эканамічныя байкоты маюць на ўвазе адмову ад куплі, гандлю, захавання тавару ці ад паслуг. Байкоты могуць быць *першаснымі* і *другаснымі*.

*Першасны байкот* – гэта наўпростая адмова ад зносін з праціўнікам.

Прыклады эканамічнага несупрацоўніцтва:

**Першасны байкот:**

· Адмова нямецкіх чыгуначнікаў транспартаваць вугаль у Францыю падчас Рурскай кампаніі 1923 г.

· Тыднёвая адмова жыхароў Прагі купляць газеты, кантраляваныя немцамі.

**Другасны байкот.** Выкарыстоўваецца супраць трэцяга боку, каб пераканаць яго далучыцца да першаснага. Прыклад:

· Байкот крам у ЗША, якія гандлявалі байкатаваным каліфарнійскім вінаградам ці прадукцыяй Паўднёвай Афрыкі.

*Формы эканамічнага байкоту*: адмова ад арэнднай платы, адмова ад выплаты пазыкі ці працэнтаў, водклік банкаўскіх укладаў і г.д.

**Эканамічнае несупрацоўніцтва (страйк):**

Гэта адмова ад працы. Страйк – гэта калектыўнае, абмежаванае часам прыпыненне працы, якое выкарыстоўваюць, каб зрабіць усціск на іншых.

Страйк можа быць сімвалічным для выказвання пэўнага пункту гледжання.

Прыклады эканамічнага несупрацоўніцтва ў форме страйку:

· 15 студзеня 1923 г., праз 4 дні пасля франка-бельгійскага ўварвання ў Рур, насельніцтва правяло 30-мінутны страйк, каб выказаць сваю волю да супраціву.

· 27 лістапада 1989 г. мільёны чэхаў і славакаў падняліся на двухгадзінны страйк для выказвання падтрымкі свабодным выбарам і апазіцыі камуністычнаму рэжыму.

Але найбольш страйк скіраваны на вырашэнне эканамічных пытанняў, напрыклад, павышэння заробку, паляпшэнне умоў працы.

***Палітычнае несупрацоўніцтва.***

Палітычнае несупрацоўніцтва мае на мэце адмову ад звычайных формаў палітычнай дзейнасці.

Формы палітычнага несупрацоўніцтва:

· адмаўленне ў законнасці і ўлады ўраду;

· байкот урадавых органаў і ўказаў;

· тармажэнне работы;

· несупрацоўніцтва дзяржаўных служачых, рабочых і выканаўчых органаў;

· байкот тых арганізацый, якія падтрымліваюцца ўрадам.

Найбольш вядомы спосаб палітычнага несупрацоўніцтва – грамадзянскае непадпарадкаванне, якое вызначае абдуманае, адкрытае, мірнае парушэнне канкрэтных законаў, дэкрэтаў, пастаноў.

Палітычнае несупрацоўніцтва з'яўляецца асноўным фактарам адмовы законнасці ўлады ўнутраных узурпатараў ці акупантаў, бо калі прызнаць законнасць іх праўлення, то гэта прывядзе да ўмацавання іншых важкіх крыніц сілы ўлады, такіх, як народная падтрымка, адміністратыўныя службы, эканамічныя рэсурсы і г.д.

Прыклады палітычнага несупрацоўніцтва:

· Германія (19 студзеня 1923 г.). Урад Германіі забараніў усім дзяржаўным і мясцовым уладам падпарадкоўвацца любым законам франка-бельгійскай акупацыйнай адміністрацыі;

· У Чэхаславакіі ў 1968 г., праз тры дні пасля савецкага ўварвання, мэр Прагі адмовіўся нават сустрэцца для перамоў з прадстаўнікамі акупацыйных войскаў.

**В) Ненасільная інтэрвенцыя**

Ад папярэдніх відаў адрозніваецца тым, што непажаданую сітуацыю мяняюць шляхам наўпростага ўмяшальніцтва з дапамогай ненасільных дзеянняў. Людзі, якія карыстаюцца гэтым метадам, захопліваюць ініцыятыву, непасрэдна ўздзейнічаюць на сістэму ці сітуацыю, і яна не можа заставацца ранейшай.

Формы:

· галадоўкі;

· сядзячыя забастоўкі;

· стварэнне альтэрнатыўных эканамічных арганізацый;

· устанаўленне новых форм грамадскіх паводзін;

· дзеянні, якія правакуюць турэмнае зняволенне;

· стварэнне паралельнага ўраду.

Метады ненасільнай інтэрвенцыі могуць унесці раскол і нават знішчыць устаноўленыя раней мадэлі паводзін, палітыку, узаемаадносіны, якія лічацца непажаданымі.

У параўнанні з іншымі тыпамі ненасільных дзеянняў метады ненасільнай інтэрвенцыі кідаюць наўпросты і непасрэдны выклік агрэсару. Калі інтэрвенцыя канчаецца поспехам, то трэба чакаць, што перамога прыйдзе хутчэй, чым пры несупрацоўніцтве.

*Прыклады ненасільнай інтэрвенцыі:*

· У Амерыцы падчас руху за грамадзянскія правы выкарыстоўваліся сядзячыя страйкі ў мэтах спынення расавай дыскрымінацыі.

· У 1955 г. адбылася масавая ненасільная інтэрвенцыя ў Гоа як акт непрызнання вярхоўнай улады Партугаліі на гэтай частцы Індыі.

· У 1953 г., калі савецкія танкі разганялі натоўп ва Усходняй Германіі, 25 тысяч дэманстрантаў седзячы на зямлі блакавалі танкам шлях.

· Падчас нямецкай акупацыі палякі стварылі альтэрнатыўную, незалежную ад нацысцкага кантролю, сістэму адукацыі.

· У жніўні 1968 г. у Чэхаславакіі на працягу двух тыдняў працавала радыёстанцыя, што адкрыта выступала супраць савецкіх захопнікаў.

· 11 снежня 1989 г. дзесяткі тысяч удзельнікаў акцыі пратэсту акружылі будынак кіравання дзяржаўнай бяспекай у Лейпцыгу і патрабавалі ад галавы мясцовых органаў бяспекі дазволіць «народнай інспекцыі» зрабіць здымкі грамадскай інспекцыі будынкаў органаў бяспекі. 30 «інспектараў» знайшлі

дакументы, якія сведчылі аб «шпіёнстве» за жыхарамі Лейпцыга, і прыпынілі знішчэнне выкрывальных дакументаў.

· 11 красавіка 1995 г. Вярхоўны Савет РБ прызначыў рэферэндум аб неабходнасці вяртання савецкай сімволікі, увядзення двухмоўя, аб інтэграцыі з Расіяй і аб праве прэзідэнта распускаць парламент. Выказваючы пратэст супраць гэтага, група апазіцыйных дэпутатаў Вярхоўнага Савета Беларусі адмовілася пакінуць авальную залу паседжанняў Вярхоўнага Савета і аб'явіла галадоўку.

Важным фактарам у ненасільнай барацьбе можа быць існаванне **паралельнага ўраду**. Гэты паралельны ўрад паступова прысвойвае сабе адпаведныя функцыі, выцясняе стары ўрад, пазбаўляе яго законнасці і, у рэшце рэшт, анулюе яго.

*Прыклады паралельнага ўраду:*

· Класічнымі прыкладам паралельнага ўраду з'яўлецца ўзнікненне такога ўраду падчас амерыканскага руху за незалежнасць у 1765–1775 гг. Каланіяльныя ўлады ў некаторых рэгіёнах пачалі распускаць мясцовыя заканадаўчыя органы, калі лічылася, што яны падтрымліваюць рух супраціву. У адказ каланісты пачалі фармаваць новыя палітычныя структуры. Былі створаны часовыя заканадаўчыя органы і камітэты супраціву. Штуршком да такой тэндэнцыі стала Кантынентальная Асацыяцыя – добра распрацаваная праграма эканамічнага і палітычнага супрацоўніцтва, якая была прынятая першым Кантынентальным Кангрэсам у кастрычніку 1774 г. У асобных выпадках каланіяльныя заканадаўчыя органы адвяргалі вярхоўную ўладу Вялікабрытаніі і станавіліся аўтаномнымі ўрадамі. У іншых выпадках наваствораныя органы дзейнічалі як паралельныя органы ўлады.

· Расійскія рэвалюцыі 1905 і 1917 гадоў. У 1905 г. Земская Управа ўзяла на сябе значную частку функцый дзяржаўнага кіравання. Цэлыя губерні і нацыянальныя акругі выйшлі з-пад кантролю ўраду і ства-

рылі свае асабістыя аўтаномныя ўрады, якія ў асобных выпадках праіснавалі да 1906 г. У 1917 г. да бальшавіцкага перавароту існавалі адначасова незалежныя Саветы і Часовы ўрад, прычым і тыя і другія з'яўляліся органамі дзяржаўнай улады.

· Спробы стварэння паралельнага ўраду нейкі час разглядаліся і беларускай дэмакратычнай апазіцыяй. Дакладней, прапаноўваўся не паралельны ўрад, а "ценявы" ўрад, які, на думку аўтараў канцэпцыі, пры прыходзе да ўлады здолеў бы кіраваць дзяржавай і лепш, чым дзейны. На ўсе ключавыя пасады былі вылучаны вядомыя ў Беларусі людзі, буйныя эканамісты, юрысты, навукоўцы, аграрыі і іншыя неабходныя для дзяржаўнай гаспадаркі людзі. Аднак ва ўмовах дыктатарскага рэжыму ўсе гэтыя праекты толькі чарговая папяровая валтузня і "трасенне паветра".

# ЛІТАРАТУРА


1. *Abramson H.J.* On sociology of social change: a model of rootenes and rooflessness // Econ. A. Soc. Rev. Dublin, 1976. V. 8, № 1. P. 43–59.
2. *Anderson B.* Communities: Reflectins on the Origin and Spread of Mationalism, 1991. 2nd, Verso, London.
3. *Anderson B.* Imagined Communities, London, Versa, 1983.
4. *Badia S.F.* Nacion // Revista de estudios politicos, Madrid, 1975. № 203. P. 5–59.
5. *Colhoun C.* Nationalism and the contradictions of modern // Bercley j. Of Sociology – 1997/1998. Vol. 42, № 1. P. 1–30.
6. *Conner Walker.* A Nation is a Nation, is a State, is an Ethnic Groups, is a ... // Ethnic and Ratial Studies. 1978. 1/4. P. 379–388.
7. *Czaja J.* Prawnomiedzynaradowly status Watykanu. Warszawa, 1983.
8. *Deme L.* Liberal nationalism in Hungary 1988 – 1990 // East Europ. Quart – Boulder (col) 1998. Vol. 32, № 1. P. 57.
9. *Emerson R.* Nationalism in Iran. Pittsburgh, 1967.
10. Encyclapaedia Britanica. London, 1996.
11. *Eriksen Th. H.* Ethnicity and nationalism: Antropological perspectives – L.; East Haven (conn.): Plato press, 1993 – IX, P. 179.
12. *Fukuyama Francis.* The End of History // The National Interest, 1989. 16.
13. *Gellner Ernest.* Nationalism and High Cultures // Nations and Nationalism. Oxford, 1983.
14. *Greenfeld Leon.* Natianalizm i Five Roads to Modernity. Hovard University Press; Cambridge, Mass,1992.
15. *Grzybowsky K., Sobolewska B.* Doktryna polityczna i spoleczna papiestwa (1766–1968). Warszawa, 1971.
16. *Gurr T., Harof B.* Ethnic Conflict in Wold. Politics. N.Y., 1994.
17. *Hajduk M.* Unia Brzeska, Bialystok, 1996.
18. *Hasler O.* Ethnic conflict in the wold today – In: Annals of the Amer. Acad. of polit. And social sciense. – Philadelphia, 1977. V. 434. P.162.
19. *Hayes C.* The historical evolution of modern nationalism. N.Y., 1931. P. 7.
20. *Hegel G.W.F.* Lectures on the Phylosophy of Wold History. Introduction, Cembridge, 1975.
21. *Hertz F.* Natinality in History and Polics. London: Routledge & Kegan Paul, 1944.
22. *Hobsbawn E.* Primitive Rebels, Manchester University Press, Manchester, 1959.
23. *Isaacs H.R.* Nationality: "End of the road"? // Foreign affaire. N.Y., 1975, V. 53, № 3, P. 432–449.
24. *Keyes Ch., ed.* Ethnic Change. Seattle: Univ. of Washington Pr., 1981.
25. *Kohn Hans.* The Idea of nationalism, Macmillan: N. Y., 1945.
26. *Lawental R.* «The Points of the Compose» // Political Change in Underdevoloped Countries, Wiley John, N.Y., 1962. P. 335–347.
27. *Lepsius M. Reiner.* Narod i nacjonalizm w Niemczech // Socjologia polityki w Niemczech. Warsszawa, 1992. T. I. P. 57–73.
28. *Meinrad M.* Das Prinzip Nationalismus // Europaischer Nationalismys ist FortSchrift. Haburg, 1973. S. 7–17.

29. *Molchanov Mikhail A.* Post-communist nationalism as a power recource: A Russia – Ukraine comparison // Nationalities Papers, 2000, V. 28, № 2. P. 263–288.
30. *Mondalski W.* Polesie. Warszawa, 1927.
31. *Mussolini B.* The political and Social Doctrine of Fashizm. Hagarth Press/ London, 1936.
32. *Nairn T.* Faces of nationalism, Janus Revisted. London, N. Y.: Verso, 1997.
33. Natianalism. Edited by John Hutchinson and Anthony D. Smith. Oxford – New York. Oxford Univercity Press, 1994.
34. *Neirn Tom.* The Break-up of Britain: Crisis and Neo-Nacionalism, London: New Lefi Books, 1977.
35. *Oakeshott M.* Rationalism in Politics and other Essayes. Indianapolis, 1991.
36. *Popel L.* Nationalizm wolnosciowy // Mysl narodowa Polska, 1991. № 2(6).
37. *Popper K.* The Open Society and its enemies. London: Routledge & Kegan Paul, 1962.
38. *Racic Vojin.* Nationalisties Papers, 1998. V. 26, № 4.
39. *Radzic Ryszard.* Między zbiorowością etniczną a wspólnotą narodową. Lublin, 2000.
40. *Renan Ernest*, Qu'est-ce qu'une nation? Calman-Levy: Paris, 1882.
41. *Rzewuski Henryk.* Pamiątki Soplicy. Warshwa, 1978.
42. *Shafer B.C.* Faces of nationalism. N.Y. Marcourt, Brace Lovanovich, 1972. XV.
43. *Smith A.* Ethnocentrism, nationalizm and social change // International Joornal of Comparative Sociology. 1972. № 13.
44. *Smith A.* Theories of nationalism. London: Duckworth, 1983. P. 262–163.
45. *Snyder L.* Varieties of nationalism. Acomparative study. N.Y.; Basic books, 1976. P. 326.
46. *Stankewicz A.* Rodnaya mova u swiatyniach. Wilnia, 1929.
47. *Sugar P.* Ethnic Conflict and Diversity in Eastern Europe, Santa Barbara, 1980.
48. *Sugar P.* Five Roads to Modernity. Harvard University Press, Cambridge, Mass., 1992.
49. *Sugar P.* Nationalism in Eastern Europe, University of Washington Press: Seattle, 1969. P. 46–54.
50. *Tamir Yael.* Liberal Nationalism. Prinston, New Jersey, 1993.
51. The Dynamics of Cultural Nationalism, Allen and Unwin: London, 1987. P. 12–19.
52. *Toynbee A.* Surviving the future. N.Y., 1971. P. 65.
53. Unia Brzeska. Przegląd kresowy, № 1. 1991.
54. *Van der Beirghe Pierre.* Race and Ethnicity. N.Y., 1970.
55. *Watkings Frederick W.* The Age of Ideology – Political Thought, 1750 to the Present. Englewood Cliffs. New Jercy Prentice – Hall inc., 1964.
56. *Weber Max.* The Nation // Essays in sociology, London, 1948.
57. *Weiss I.* Conservatism in Europe, 1770–1945, Thames & Hudaon, London, 1977.
58. *Znaniecki F.* Modern Nationalities, University of Illinois Press, Urbana, 1952.

59. *Абдзіраловіч Ігнат.* Адвечным шляхам. Мн., 1994 .
60. *Абдулатипов А.Г.* Природа и парадоксы национального «Я». М., 1991.
61. *Абецедарский Л. С.* Белорусы в Москве XVII в. Мн., 1957
62. *Абецедарский Л. С. і інш.* Гісторыя БССР. Мн., 1961.
63. *Абразцоў З.* Нацыянальная ідэя. Навошта, што, дзеля чаго. Мн., 2007.
64. *Акінчыц Ф.* Актуальнае пытанне // Новы шлях, 1934, № 7(9).
65. *Акудовіч В.* Код адсутнасці. Мн., 2007.
66. *Алексеев Л.В.* Полоцкая земля. М., 1966.
67. *Алексеев Т.А.* Национальная идеология // Октябрь, 1997, № 1.
68. *Алесь Мара.* Аўтаманаграфія. Менск, 2002.
69. *Антанюк І.* Літаратура і мастацтва, 20.09.1996.
70. *Арлоў А., Сагановіч Г.* Дзесяць вякоў беларускай гтсторыі. Вільня, 2002.
71. *Архимандрит Сафроний (Сахаров).* Видеть Бога как он есть. England, Birmongham, 1985.
72. *Бабкоў І.* Генеалогія беларускай ідэі // ARCHE, № 3, 2005.
73. *Багдановіч М.* Поўны сбор твораў. Мн., 1992.
74. *Багдановіч Максім.* Збор твораў у 2-х т. Т. 2. Мн., 1968.
75. *Багушэвіч Ф.* Творы. Мн., 1991.
76. *Баразна Лявон.* Каталёг выставы. Мн., 1998.
77. *Баркашов А.П.* Азбука русского национализма. М., 1994.
78. Беларуская нацыянальная ідэя. Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі. 18–19 красавіка 1999 г. г. Гродна. Мн., 2000.
79. Беларуская Савецкая Энцыклапедыя. Мн., 1969/75. Т. 1–12.
80. Беларуская Энцыклапедыя, Мн., 1996/2004. Т. 1–18.
81. Беларускія летапісы і друкі. Мн., 2004.
82. *Беляев В.Н.* Партийность как антипод соборности // Русская цивилизация и соборность. М., 1998.
83. *Бембель А.* Роднае слова і маральна-эстэтычны прагрэс. Лёндан, 1985.
84. *Бембель А.* Рэха малітвы: Вершы. Ню Ёрк, 1988.
85. *Бембель А.* Уводзіны ў метагісторыю Беларусі // Культура. № 43, 1992.
86. *Бердяев Н.* Судьба России. М., 1918.
87. *Берталанфи Л.* Общая теория систем – критический обзор // Исследования по общей теории систем. М.: Прогресс, 1969.
88. *Бессмертный А.Р.* Национализм и универсализм в руссом религиозном сознании // На пути к свободе совести. М., 1989.
89. *Бжезинский З.* Посткоммунистический национализм. М., 1991.
90. *Бирюков Н.И., Сергеев В. М.* «Соборность» как парадигма политического сознания // Полис. 1997, № 3.
91. Благоверный князь Острожский // Вестник Белорусского экзархата. Альманах. Том 1. Мн., 1998.
92. Большая энциклопедия, под ред. С.Н.Южакова, С.Петербург, 1903. Т. 13.
93. Боская літургія між сьвятымі айца нашага Яна Златауста. Берасьце. 2000.
94. *Брянцев П.* История Литовского государства. Вильно, 1889.

95. *Булат А.* Нацыянальны сацыялізм // Новы шлях, 1933, № 1.
96. *Булгаков С.Н.* Христианский социализм. Новосибирск, 1994.
97. *Булыка. С.М.* Слоўнік іншамоўных слоў. Мн., 1993.
98. *Бурмистрова Т.Ю.* Теория социалистической нации. Ленинград. 1970.
99. *Буфеев К.* Сети "обновлённого" православия. М., 1995.
100. *Вайдлих В.* Социодинамика. М., 2004.
101. *Валіцкі А.* Інтэлектуальныя эліты і зьменлівыя лёсы "вымысленай нацыі" ў Польшчы // Фрагменты, 1999. № 3–4.
102. *Вейник В.* Почему я верю в Бога. Мн., 1998.
103. *Весялкоўскі Ю.* XIX стагодзьдзе на Беларусі і Кастусь Каліноўскі // Дух часу. Беласток – Лёндан, 2005.
104. *Весялкоўскі Юры.* Дух часу. Вільня – Лёндан. 2006.
105. Візантыя і Беларусь // Царкоўны пасланец, № 2, 2/46/56, 1998.
106. Віра бацьків. Львів, 1990, 13.09.1990.
107. *Воробьёвский Ю.* Стук в золотые ворота. М., 1998.
108. Выстаўка твораў мастака Л.Ц.Баразны. Каталог. Мн., 1975.
109. *Гадлеўскі Вінцэнт.* Публіцыстыка. Праблема нацыянальнай ідэі // Спадчына, 1993. № 3.
110. *Гандзі Лідэ.* Ваабражальная супольнасць: праблема нацыяналізму // Фрагменты. 2000. № 1–26.
111. *Гейзінга Е.* Нацыяналізм у сярэднявеччы // Беларускі гістарычны агляд. Мн., 1995. Т. 2.
112. *Геллнер Э.* Нации и национализм. М., 1996.
113. *Геніюш Ларыса.* Ад родных ніў. Прага, 1942.
114. *Геніюш Ларыса.* Невадам з Нёмана. Мн., 1967.
115. *Геніюш Ларыса.* Споведзь. Мн., 1993.
116. *Гізберт-Студніцкі Конрад В.* Dzis. 2004, № 4.
117. Гісторыя беларускай літаратуры: старажытны перыяд. Мн., 1985.
118. *Грыгор'ева В.* і інш. "Уняцтва ў Беларусі; ад Полацкага сабора 1839 г. да нашых дзён" // "З гісторыі уніяцтва ў Беларусі", Мн., 1996.
119. *Грыцкевіч В.* Міф аб уніі. Выбар, № 3, 1993.
120. *Гумилёв Л.Н.* Конец и вновь начало. М., 2001.
121. *Гумилёв Л.Н.* Этногенез и биосфера земли. М., 2001.
122. *Гурвич В.* Национальная идея – идея общечеловеческая // Проблемы национализма в Европе, 1996. № 3.
123. *Гусоўскі М.* Песня пра зубра. Мн.: "БГАКЦ", 1994.
124. *Давідзюк М.* Справа беларусізацыі праваслаўнай царквы ў святле палітыкі польскіх дзяржаўных улад 1919–1939 // Беларускі каляндар, Беласток, 1990.
125. *Данилевский К.* Россия и Европа. М., 1994.
126. *Дашкевич Н.П.* Литовско-Русское государство // Университет. изв. Киев, 1882. № 8.
127. *Джунусов М.С.* Буржуазный национализм: принципы критики. М., 1986.
128. *Джунусов М.С.* Национализм. Словарь-справочник. М., 1998.
129. *Дзюрасель Жан-Батыст.* Еўропа з 1815 года да нашых дзён. Мн., 1996.
130. Дзяржаўны архіў Расійскай федерацыі, г. Масква, Ф.109, вып. 2, стр. 713, арк 4.

131. *Доўнар-Запольскі М.* Асновы дзяржаўнасці беларусаў. Мн., 1927.
132. *Дробаў Л.М.* Беларускія мастакі XIX стагоддзя. Мн., 1971.
133. *Дробяжева Л.* Национализмы в республиках Российской федерации: идеология элиты и массовое сознание // Панорама – форум. Казань, 1997, № 11.
134. Другі Ўсебеларускі Кагрэс. Матэрыялы. Мюнхен, 1954.
135. *Дубянецкі Э.* Беларуская нацыянальная ідэя ў публіцыстыцы Янкі Купалы // Беларуская нацыянальная ідэя. Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі. 18–19 красавіка 1999 г. г. Гродна. Мн., 2000.
136. *Дунін-Марцінкевіч В.* Творы. Мн., 1984.
137. *Дышыневіч В.* Літаратура і мастацтва, 20.08.1996.
138. *Евменов Л. Ф.* Международная идеология прав человека: проблемы – решения. Мн., 2000.
139. *Ермалович М.И.* Где была летописная Литва? // Тезисы к конференции по археологии Белоруссии. Мн., 1969.
140. *Ермаловіч М.І.* Па слядах аднаго міфа. Мн., 1989.
141. *Ермаловіч Мікола.* Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае. Мн., 2000.
142. *Ермаловіч Мікола.* Старажытная Беларусь. Мн., 1990.
143. *Ёрш С.* Вяртанне БНП: Асобы і дакументы Беларускай незалежніцкай партыі. Менск – Слонім, 1998.
144. *Жириновский В.В.* Последний бросок на Юг. М., 1995.
145. *Жыбуртовіч А., Жыбуртовіч В.* Самаарганізацыя – галоўная ідэя развіцця нацыяў // Беларуская нацыянальная ідэя. Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі. Мн., 2000.
146. *Зам Астрыд.* Беларускі нацыяналізм, ці нацыяналізм Беларусі? // Беларускі гістарычны агляд, 2000. Т. 7, сшытак 1(12).
147. *Запруднік Я.* Беларусь на гістарычных скрыжаваннях. Мн., 1996.
148. *Зноско К.* Исторический очерк церковной унии. М., 1993.
149. *Ильин И.* О русском национализме // Наши задачи. М., 1992.
150. *Ильин И.* Основы христианской культуры. СПб., 2004.
151. Исторические известия о возникшей в Польше унии. Вильна, 1866.
152. История имперских отношений. Белорусы и русские. 1772–1991. Смоленск, 2008.
153. *Іваноў І.* Уніяцкая царква: сям гадоў адраджэння // Форум, 1997. № 5.
154. *Ігнатоўскі У.М.* Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мн., 1991.
155. *Калиновский К.* Из печатного и рукописного наследия. Мн., 1988.
156. *Кандель П.* О национализме «с человеческим лицом» // Pro et Contra, 1988. Т. 3, № 3.
157. Канфесіі на Беларусі, Мн., 1998.
158. *Караткевіч У. С.* Зямля пад белымі крыламі. Мн.: “Народныя асвета”, 1992.
159. *Карсавин Л.П.* Восток, Запад и русская идея. М., 1992.
160. *Касяк І.* Гісторыя праваслаўнай аўтакефальнай Царквы. Ню-Ёрк, 1954.
161. *Катлярчук А.* Нацыянальнае канструяваньне Міцкевіча // ARCHE, № 4, 2006.
162. *Каутский К.* Национализм и интернационализм. СПб., 1918.

163. *Клепенин Н.А.* Мысли о религиозном смысле национализма // Путь. Париж, 1927.
164. *Кон Г.* Азбука национализма // “Проблемы Восточной Европы”. Вашингтон, 1994, № 41–42.
165. *Конан В.Н.* О белорусской душе // Нёман, 1993. № 3.
166. *Конан У.М.* Беларуская нацыянальная ідэя: традыцыі, сучасныя праблемы, прагнозы // Беларуская нацыянальная ідэя. Матэрыялы навукова тэарэтычнай канферэнцыі. Мн., 2000.
167. *Конан У.М.* Беларусь на мяжы цывілізацый // ARCHE, № 2, 2005.
168. Конструирование этничности. Этнические общины Санкт-Петербурга. Составители и научные редакторы Виктор Воронков и Ингрид Освальд. Санкт-Петербург: Изд-во “Дмитрий Булавин”, 1998.
169. *Коялович. М.О.* История русского самосознания по историческим и научным сочинениям. Мн., 1997.
170. *Коялович. М.О.* Литовская церковная уния. СПб., 1861.
171. *Коялович. М.О.* Чтения по истории Западной России. СПб., 1884.
172. *Краснянский Д.Е.* К категории «нация» и «этнос» // Философия и общество, 1998. № 6.
173. *Крукоўскі М.І.* Бляск і трагедыя ідэалу. Мн., 2004.
174. *Крушиньский В.Ю., Левенець Ю.А.* Історія України. Киів, 1993.
175. *Крюковский Н.И.* Кибернетика и законы красоты. Мн., 1977.
176. *Крюковский Н.И.* Логика красоты. Мн., 1964.
177. *Крючковскій Ю.* 50-летие воссоединения Западно-русских униятов с православной церквой. Вильно, 1889.
178. *Кс. Ян Станкевіч.* Хрысціянства і беларускі народ. Вільня, 1940.
179. *Кудрявцев И.Е.* Национальное “Я” и политический национализм // Полис, 1997. № 2.
180. *Ластоўскі В.Ю.* Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі. Коўна, 1924.
181. *Ластоўскі В.Ю.* Кароткая гісторыя Беларусі. Вільня, 1910.
182. *Латышонак Алег.* Беларускі нацыяналізм і сутыкненьне цывілізацый // ARCHE. №7, 8. 2007.
183. *Лебон Г.* Психология народов и масс. СПб., 1896.
184. *Леваш И.* Белорусская идея: в поисках идентичности // Беларуская думка, 2001. № 11.
185. *Ленін У.І.*, Творы. Т. 9.
186. *Леонтьев К.* Письма к Владимиру Соловьёву. О национализме политическом и культурном // Избранное. М., 1993. С. 351.
187. *Леонтьев К.* Племенная политика как орудие всемирной революции // Избранное. М., 1993.
188. *Ліцьвінка Васіль.* Святы і абрады беларусаў. Мн., 1998.
189. *Лукашук А.* Філістовіч: Вяртанне нацыяналіста. Мн., 1997.
190. *Луцкевіч Антон.* Выбраныя творы. Мн., 2006.
191. *Лыч Л.* Беларуская нацыя і мова. Мн., 1994.
192. *Лыч Л.* Мова і рэлігія // ЛІМ, 9.08.1991.
193. Ля вытокаў незалежнага грамадзтва: Асобы і падзеі беларускай апазыцыі 1950–1980-х. Каталёг выставы. Мн., 1998.
194. *Макаренко В.П.* Главные идеологии современности. Ростов-на-Дону, 2000.

195.Малая Советская Энциклопедия. М., 1938, Т. 7.
196.*Мальдзіс Адам.* Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя. Мн., 1982.
197.*Мальдзіс Адам.* Падарожжа ў XIX стагоддзе. Мн., 1969.
198.*Марозава С.* Моўная палітыка і практыка уніяцкай царквы ў Беларусі // З гісторыі уніяцтва ў Беларусі. Мн., 1996.
199.*Мартос А.* Беларусь в исторической государственной и церковной жизни. Мн., 1990.
200.*Масленікаў П.В.* Беларускі савецкі тэматычны жывапіс. Мн., 1962.
201.*Махнач В. Л.* Параметры христианской политики // Золотой лев: Издание русской консервативной мысли. Пушкино, 1998. № 3–4.
202.*Мечковская К.Б.* Язык и религия. М., 1998.
203.*Миненков Г.* Проблема религиозно-культурной идентичности в русской мысли XIX–XX веков. Мн., 2003.
204.*Миненков Г.* Европейская идентичность как горизонт белорусского воображения. BelIntellectuals.com., 2006.
205.*Мицкевич А.* Собрание сочинений в 5 т. Т 4, М., 1954.
206.*Микулич А.И.* Геногеография сельского населения Беларуси. Мн., 1989.
207.*Микулич А.И.* Наша генетическая память. Мн., 1987.
208.*Мікуліч А.І.* Беларускі этнас: папуляцыйна-генетычны аспект эпахальнай стабільнасці // Беларуская нацыянальная ідэя. Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Мн., 2000.
209.*Найдзюк Я., Касяк І.* Беларусь учора і сёння: Папулярны нарыс з гісторыі Беларусі. Мн., 1993.
210.*Насевіч В.* Пачаткі вялікага княства Літоўскага. Мн., 1993.
211.Национализм в мировой истории. М., 2007.
212.Неизвестная Беларусь. М., 2005.
213.*Нейрн Том.* Интернационализм и второе пришествие // Нации и национализм. М., 2002.
214.*Нісбэт Роберт.* Кансерватызм. Менск-Вільня, 2000.
215.*Новікава С., Астапенка А.* і інш. Канструяванне ў дзяржаўным будаўніцтве Беларусі. Тэзісы дакладаў навукова- практычнай канферэнцыі "Навука, культура і адукацыя ў развшцці грамадства і станаўлення дзяржаўнасці Беларусі". Мн., БДТУ, 6–7 красавіка 1995 г.
216.Новости НИСЭПИ. 2000. Вып. 2 (16).
217.*Нодия Гия.* Национализм и демократия // Адкрытае грамадства. 2001, № 2 (11).
218.О православных церковных братствах. Санкт-Петербург, 1857.
219.Основы социальной концепции Русской Православной Церкви. М., Изд. Московской Патриархии, 2000.
220.*Падокшин С.* Реформация и общественная мысль Белоруссии и Литвы (вторая половина XII – начало XVII в.), Мн., 1970.
221.*Падокшын С.* Філасофская думка эпохі адраджэньня ў Беларусі. Мн., 1990.
222.*Пазьняк Зянон.* Брейгелеўскі шлях. Звязда. 20 студзеня 1993.
223.*Пазьняк Зянон.* Беларуска-Расейская вайна. Варшава – Нью-Ёрк – Вільня, 2005.

224.*Пазьняк Зянон*. Гутаркі з Антонам Шукелойцем. Варшава – Вільня, 2003.
225.*Пакуцевіч В*. Берасцейская унія. Чыкага, 1972.
226.*Палубятка Я*. Ці варта адраджаць уніяцтва? // ЛІМ, № 48, 1994.
227.*Палявікова Т*. Ад таталітарызму да прававой дзяржавы // Добры вечар, 12 кастрычніка 1993 г.
228.*Панарин А.С*. Православная цивилизация в глобальном мире. М., 2002.
229.Пачынальнікі. З гісторыка-літаратурных матэрыялаў XIX ст. Мн., 1977.
230.*Пліска М*. Лібералізм і кансерватызм у сучаснай Беларусі // Ад тутэйшасці да нацыянальнай дзяржаўнасці. Мн., 1999. С. 18–31.
231.*Подокшин С.А*. Реформация и общественная мысль Белоруссии и Литвы. Мн., 1970.
232.*Позняк З., Борозна Л*. Заботясь о будущем // Правда (Москва). 13.04.1969.
233.Помнікі старажытнай беларускай пісьменнасці. Уклад. А.Ф. Коршунаў. Мн., 1975.
234. *Прат. Гардун. С*. Брэсцкая унія як царкоўна-гістарычная трагедыя беларускага народа // Материалы научно-богословской конференции, Брест, 1996. Мн., 1996.
235.*Прат. Гардун.С*. Якая царква была нацыянальнай? // ЛІМ, 14.02.92.
236.Преподобная Евфросиния игумения Полоцкая, Житие и акафист. Мн., 2000.
237.Принципы партийного строительства РНЕ // Русский порядок, 1994. № 6–7.
238.Пытанні талерантнасці: гісторыя, сучаснасць, перспектывы. Мн., 2005.
239.*Рачила С*. Политическое убийство? // Рэспубліка, 18.09.1992.
240.*Рекуц И*. Памяти преподобномученика Афанасия игумена Брестского // Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі. Брэст, 1996.
241.*Решетников С.В., Антанович Н.А*. Системный подход как методология публичной политики. Мн., 2000.
242.*Ровдо В*. Национальная идея как фактор становления гражданского общества Беларуси // Гражданское общество. Вып.3. Мн., 1997.
243.*Ройда У*. Вытокі нацыяналізму // ARCHE, 2001. № 2 (16).
244.*Ройда У*. Нацыянальная ідэя і фарміраванне грамадзянскай супольнасці ў Беларусі // Грамадзянская альтэрнатыва, 1999. № 2.
245.*Рудкоўскі П*. Ад ідэнтычнасьці да сабornасьці // ARCHE. № 1–2, 2006.
246.*Рудкоўскі П*. Паўстанне Беларусі. Вільня, 2007.
247.Русская цивилизация и соборность. Сб. статей. М., 1994.
248.*Саверчанка І. В*. Публіцыстычная літаратура Беларусі другой паловы XVI–XVII ст. Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені доктара філалагічных навук. Мн., 2000.
249.*Саверчанка І.В*. Aurea mediocritas. Кніжна-пісьмовая культура Беларусі. Адраджэнне і раннее барока. Мн., 1998.

250.*Сагановіч Генадзь.* Невядомая вайна 1654–1667 гг. Мн., 1995.
251.*Сагановіч Генадзь.* Нарыс гісторыі Беларусі. Мн., 2001.
252.*Сваяк Казімір.* Дзея маёй мыслі, сэрца і волі. Мн., 1992.
253.*Свешников В.* Заметки о национализме подлинном и мнимом. М., 1995.
254.*Севярынец Павал.* Нацыянальная ідэя. Фэнамэналёгія Беларусі. Мн., 2005.
255.*Седов В.В.* Славяне верхнего Поднепровья и Подвинья. М., 1970.
256. *Серабракоў Д.* Пра скон марксізму і іншыя філасофскія байкі. «Анталёгія сучаснага беларускага мысьленьня» // Дзеяслоў. 2003.
257.*Сераковский С.* Заграничные известия // Современник, 1857. № 4.
258.*Сіўчык В.* Невядомая вайна супраць Беларусі. Мн., 1992.
259.*Смит. Э.* Национализм и модернизм. М., 2004.
260.*Сміт Энтані.* Нацыяналізм у XX стагоддзі. Мн., 1995.
261.*Смолин Михаил.* Энциклопедии имперской традиции русской мысли. М., 2005.
262.*Смоліч А.* Геаграфія Беларусі. Мн., 1993.
263.*Соловьёв В. С.* Чтения о Богочеловечестве // Сочинения. М., 1994.
264.*Соловьёв В.* Россия и вселенская Церковь // О христианском единстве. М., 1994.
265.*Сталін І.В.* Выбраныя работы па нацыянальнаму пытанню. Мн., 1930.
266.*Сталин И.В.* Марксизм и национально-колониальный вопрос. Партиздат. М., 1937.
267.*Станкевіч А.* Хрысьціянства і беларускі народ: Спроба сынтэзы // Хрысьціянская думка, 1992, № 1.
268.*Станкевіч Я.* Гістарычныя творы. Мн., 2003.
269.Старажытная беларуская літаратура (XII–XVII стст.). Уклад. І.Саверчанка. Мн., 2007.
270.Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г. Тэксты. Даведнік. Каментарыі. Мн., 1989.
271.Статут, праграма БНП. Мн., 1994.
272.*Стральцоў Міхась.* Загадка Багдановіча // На ўспамін аб радасці. Выбранае. Мн., 1974.
273.*Струве П.Б.* На разные темы // Patriotica: Политика, культура, религия, социализм. М., 1997.
274.*Струве П.Б.* Отрывки о государстве // Patriotica: Политика, культура, религия, социализм. М., 1997.
275.*Суліма.* Праф. Здзяхоўскі аб беларускай душы. Вільня, 1924.
276.*Сулима.* Сим победиши!... Очерк критического оптимизма // Нёман, 1992, № 1.
277.*Сыракомля У.* Добрыя весці. Мн., 1993.
278.*Сямашка Я.* Армія Краёва на Беларусі. Мн., 2001.
279.*Тарас А.Е.* Войны Московской Руси с Великим княжеством Литовским и Речью Посполитой в XIV–XVII веках. Москва. Мн., 2006.
280.*Тарасаў К.* Памяць пра легенды. Мн.: 1994.
281.*Татищев В. Н.* Собрание сочинений. Т. 2. М., 1963.
282.*Тишков В. А.* Забыть о нации. (Постнационалистическое понимание национализма) // Этногр. обозрение. М., 1998, № 5.
283.*Ткачёв А.М.* Замки Белоруссии. Мн., 1987.

284. *Трубецкой Е.Н.* Смысл жизни. М., 1994.
285. *Туронак Ю.* Мадэрная гісторыя Беларусі. Вільня, 2006.
286. *Турук Ф.* Белорусское движение. М., 1921.
287. *Тышкевіч С.* Церковь Богочеловека. N.-Y. – Roma, 1958.
288. *Урбан П.* Старажытныя ліцьвіны. Мн., 2003.
289. Фарміраванне і развіццё беларускай сацыялістычнай нацыі. Мн., 1958.
290. *Франк С.Л.* Умственный склад, личность и воззрения П.Б.Струве // Струве П.Б. Patriotica. М., 1997.
291. *Фрейд З.* Психология масс и анализ человеческого “Я”. М., 1925.
292. *Фролов А.С.* Проблема соборности в русской культуре // Русская цивилизация и соборность. М., 1998.
293. *Фролов Кирилл, пресс-секретарь Союза православных граждан.* Мироточивая икона царя мученика // Русская линия. 17 июня. М., 2000.
294. *Хайек Ф.А.* Пагубная самонадеянность. М., 1994.
295. *Хантингтон Самюэль.* Столкновение цивилизаций. М., 2003.
296. *Хобсбаум Эрик.* Нации и национализм. СПб., 1998.
297. *Холмогоров Е.* Русский националист. М., 2006.
298. *Хомяков Д.А.* Православие, самодержавие, народность. Мн., 1997.
299. Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры. Уклад. А.Ф. Коршунаў. Мн., 1959.
300. *Хюбнер Курт.* Нация: от забвения к возрождению. М., 2001.
301. *Цвікевіч А.* “Западно-руссизм”: Нарысы з гісторыі грамадскай мыслі ў Беларусі ў XIX і пачатку XX в. Мн., 1993.
302. *Чарота І.А.* Беларуская мова і царква. Мн., 2000.
303. *Чыжэўскі Д.* Філасофія і нацыянальнасць // Культура, 1993. № 11.
304. *Шафаревич И.* Есть ли у России будущее? М., 1991.
305. *Ширяев Е. Е.* Русь Белая. Русь Черная и Литва в картах. Мн., 1991.
306. *Шмеман А.* Исторические пути православия. М., 1993.
307. *Шпенглер О.* Закат Европы.Т. 1, 2. Мн., 1999.
308. *Шпилевкий П.М.* Путешествие по Полесью и белорусскому краю. Мн., 2004.
309. *Штайнер Юрг.* Еўрапейскія дэмакратыі. Мн., 1996.
310. *Штомпка П.* Социология социальных изменений. М., Аспект Пресс, 1996.
311. *Шчакаціхін Мікола.* Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва. Мн., 1993.
312. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 1993–2001. Т. 1–6.
313. *Эрхард Людвиг.* Благосостояние для всех. М., 1991.
314. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. Мн., 1989.
315. *Яскевіч Алена.* Падзвіжнікі і іх святыні. Мн., 2001.

### ***Творы аўтара па тэме кнігі***

1. Шляхі нацыянальнага адраджэння // Беларуская крыніца, 1991, № 2.
2. Нацыянальная дэмакратыя: яе ідэі, практыка // Літаратура і мастацтва, 20 верасня 1991.

3. Два тэзісы нацыянальнай дэмакратыі // Выбар, 18.03.1992.
4. Дзьве тэзы аб нацыянальнай дэмакратыі // Беларуская крыніца, № 2, 1992.
5. Ёсць такая царква? // Літаратура і мастацтва, 18.04.1992.
6. Ці ёсць будучыня ў Дэмкангрэса? // Літаратура і мастацтва, 20.01.1992.
7. Кааліцыя наццэмаў, хадэкаў і сялянскай партыі // Літаратура і мастацтва, 8.07.1992.
8. Кааліцыя трох і шлях да выратавання беларускага народа. Выбар, 12.08.1992.
9. Послушайте "националиста" // Советская Белоруссия, 11.08.1992.
10. Нюрнберг-2 // Навіны БНФ, 2, 1993.
11. За веліч дзяржавы // Літаратура і мастацтва, 15.04.1994.
12. Талерантнасць беларусаў: міф ці рэальнасць // Маладосць, 1994. № 9. С. 201–211.
13. Яшчэ пра талерантнасць // Літаратура і мастацтва, 25.05.1994.
14. Нюрнберг-2. Канферэнцыя прысвечаная Суду над камунізмам // Пагоня, 9-15.09.1994; Выбар, 20.09.1994.
15. БНП, нацынальная ідэя і кансалідацыя грамадства. Матэрыялы міжнароднай навуковай каферэнцыі "Технология политики. Минск, 9–10 февраля 1995". Мн., 1995.
16. Любоў да свайго народа // Літаратура і мастацтва, 23.08.1996.
17. Пралегомены да ўсякай будучай тэорыі нацыяналізму // Маладосць, 1997. № 4, С. 173–190.
18. Мова Царквы – дадзеная Богам мова // Царкоўнае слова, 1997, № 5.
19. Беларускамоўнаму набажэнству быць! // Наша слова, 1998, № 12.
20. Беларуская мова ў Царкве і палітыка // Наша слова, 1998, № 45.
21. Мова, Царква і...// Царкоўнае слова, 1998, № 12.
22. Партыя не новая, а адроджаная. У каторы раз...// Народная воля, 1998, № 108, 16 чэрвеня.
23. Хрысціянства і нацыянальная ідэя. Мн., 1998, 28 с.
24. Патрэбен "Нюрнберг-2", альбо як вылечыць грамадства ад камунізму? // Народная воля, 1998, 18 красавіка.
25. Роля і месца праваслаўнай царквы ў незалежнай Беларусі // Ад тутэйшасці да нацыянальнай дзяржаўнасці, Мн., 1999. С. 54–69.
26. Ці магчыма рэалізацыя нацыянальнай ідэі ў сучаснай Беларусі? // Наша слова, 1999, 18 жніўня, № 33.
27. Міф аб уніі як нацыянальнай веры // Грамадзянская альтэрнатыва, 1999, № 9. С.26–40.
28. Роля і месца праваслаўнай царквы ў незалежнай Беларусі // Ад тутэйшасці да нацыянальнай дзяржаўнасці. Мн., 1999. С. 54–69.
29. Нацыяналізм і яго хрысціянскія вытокі // Праграма ? тэзісы міжнар. Навукова-практ. канф. "Беларуская нацыянальная ідэя", 17–18 красавіка 1999 г., г. Гродна.
30. Нацыянальная царква: праблема ідэнтыфікацыі. Праграма і тэзісы міжнар. Навукова-практ. канф. "Беларуская нацыянальная ідэя", 17–18 красавіка 1999 г., г. Гродна.
31. Негвалтоўныя дзеянні – асноўны метад рэалізацыі нацыянальнай ідэі // Ненасілле і Беларусь, Мн., 1999. С. 169–177.

32. Сучасная сацыял-дэмакратыя не мае нічога агульнага з марксізмам-ленінізмам // Народная воля, 11 красавіка 2000 г. № 66.
33. Нацыяналізм і яго хрысціянскія вытокі // Беларуская нацыянальная ідэя. Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Мн., 2000. С. 190–195.
34. Стан праваслаўя ў Беларусі // Згода, 2000, № 6.
35. Асаблівасці нацыяналізму ў еўрапейскім кантэксце // Веснік БДУ. Серыя 3. Гісторыя, філасофія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, права. 2000, № 3. С. 52–58.
36. Паслухайце нацыяналіста. Vilnius, Rastijos Draugija, 2000. 176 с.
37. Антропны прынцып – сінтэз навукі і рэлігіі // Христианские ценности в современной культуре. Материалы Международной научной конференции. Мн., 2001. С. 27–29.
38. Ідэалогіі і партыі Беларусі ў наглядным прадстаўленні // Политическая система Беларуси: достижения, проблемы, возможности совершенствования. Материалы Международной научно-практической конференции. Минск, 27 марта 2001 г. Мн., 2001. С. 153–154.
39. Палітычныя працэсы на Беларусі ў гістарычнай перспектыве і іх сувязь з нацыянальнай ідэяй і нацыяналізмам // Адкрытае грамадства. Мн., 2001. № 2 (11). С. 43–49.
40. Нацыі і нацыяналізм праз прызму хрысціянства // Беларусіка = Albaruthenika. Кніга 18. Матэрыялы III міжнароднага кангрэса беларусістаў "Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый", Мн., 2001. С. 39–44.
41. Праблемы славян беларуска-польскага і беларуска-літоўскага памежжа: ментальнасць экуменізм і эканамічныя стасункі // Менталитет славян и интеграционные процессы. Материалы II международной научной каференции. Гомель, 2001. С. 37–38.
42. Беларускі нацыяналізм у кантэксце еўрапейскай цывілізацыі // Беларусіка = Albaruthenika. Кніга 22. Матэрыялы III міжнароднага кангрэсу беларусістаў "Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый", Мн., 2001. С. 112–120.
43. Правы чалавека і правы нацыі // Юридическое, экономическое образование и наука на пороге нового тысячелетия. Материалы международой научно-практической конференции, посвящённой 10-летию Белорусского института правоведения. Мн., 2001. С. 172–173.
44. Сэнс нацыянальнай ідэі і яе здзяйсненне // Праграма і тэзісы міжнар. Навукова-практ. канф. "Беларуская нацыянальная ідэя", 17–18 красавіка 1999 г., г. Гродна, 2000.
45. Сабornасць у хрысціянстве і сабornасць беларускай нацыі // Грамадскія ідэалы: нацыянальныя традыцыі, сучасны стан, погляд у будучыню. Матэрыялы навуковай канферэнцыі. Мінск, 26–27 лістапада 1998 г., Мн., 2002. С. 147–151.
46. Сацыяльна-палітычная канцэпцыя нацыі ў хрысціянстве // Адкрытае грамадства. 2002. № 2 (13). С. 14–17.
47. Нацыянальная ідэя ў сучасным свеце. Манаграфія. Мн., 2003. 186 с.
48. Нацыянальная дзяржава: гістарычная неабходнасць ці прыхамаць асобных людзей? // Разнастайнасць моў і культур у кан-

тэксце глабалізацыі. Матэрыялы Міжнароднага сімпозіума. Мінск, 9–10 ліпеня 2002 г. Кніга 1. Мн., 2003. С. 287–292.
49. Неадназначнасць паняццяў нацыяналізм і фашызм у дыскурсе сучасных ідэалогій // Весці Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. 2003. № 1. С. 11–16.
50. Тэарэтычны і практычны сэнс нацыянальнай ідэі // Міжкультурны дыялог у Беларусі: нацыянальна-культурнае і духоўнае развіццё ва ўмовах глабалізацыі. Матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі. г. Мінск 10–12 снежня 2003 г., Мн., 2004.
51. Инновационные технологии в образовательных структурах государства: системное определение и технология решения // Управление в социальных и экономических системах. Материалы XII международой научно-практической конференции. г. Минск. 5 декабря 2004 г., Мн., 2004.
52. Информационное общество и Homo Informaticus // Управление в социальных и экономических системах. Материалы XII международой научно-практической конференции. г. Минск. 11 декабря 2005 г., Мн., 2005.
53. Нации в иерархических координатах: текущий статус и дизайн новых горизонтов // Человек. Цивилизация. Культура. Тезисы докладов XI межвузовской конференции. Минск, 21 апреля 2006 г. Мн., 2006. С. 171–175.
54. Информационное общество. Информационные технологии и моделирование в политических процессах. Гуманітарна-эканамічны веснік. 2006, № 4 (36). С. 97–105.
55. Вільня і беларуская нацыянальная ідэя // Дні літоўскай і нацыянальнай культуры ў Вільні. 7–8 кастрычніка 2006 г. Vilnius, 2006.
56. Антропный принцип и конструирование «БИГ БЭНГа» // Человек. Цивилизация. Культура. Тезисы докладов XII межвузовской конференции. Минск, 20 апреля 2007 г. Мн., 2007. С. 75–78.
57. Грамадска-палітычнае жыццё // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Мінска ў 5 кн., Кніга 5. Частка 2. Мн., 2007. С. 56–58.
58. Беларускі нацыяналізм: учора, сёння, заўтра // Дзеяслоў, 2007, № 2(27). С. 245–254.
59. Общественные организации, профсоюзы и политические партии // Минская область: Экциклопедия в 2 т. Т. 1. Мн., 2007. С. 122–123.
60. Партии политические // Рэспубліка Беларусь: Энциклопедия. В 6 т. Т. 5. Мн., 2007. С. 732–733.
61. Моделирование политических процессов // Научные труды Республиканского института высшей школы. Философско-гуманитарные науки. Сб. научных статей. Выпуск 5 (10), 2008. С. 160–167.
62. Аб беларускай нацыянальнай ідэі і так званай "беларускай інтэлектуальнай прасторы" // ARCHE, 7–8. 2008. С. 95–101.

# Імянны паказальнік


Абдзіраловіч Ігнат (Канчэўскі І.) 20, 320–323, 659
Абразцоў Зміцер 363–365
Абрамчык М. 143–144
Абрантовіч Фабіян 456
Абуховіч П. 265, 279
Абэцэдарскі Лаўрэн 76, 78–79, 384, 393
Агінскі Клеафас 41
Агуновіч Э. 313
Адамовіч Славамір 250, 253
Адамчык Вячаслаў 175, 475
Айрыкян Паруйр 221
Айтматаў Чынгіз 410
Акінчыц Ф. 149–142
Акоф Р. 516
Аксакаў І.С. 344
Акудовіч Валянцін 5, 21, 122, 303, 333 – 340, 404
Акулаў В.А. 460
Аладзьеў Сяргей 255
Альгерд 20, 100, 556, 593
Аляксандр Яраслававіч (Неўскі) 557
Аляксей, мітрапаліт 593
Андропаў Ю.У. 238, 375
Андрэй, архіепіскап 607
Андрэй Першазваны 534
Андэрсэн Бенедыкт 16, 532
Антанюк І. 620, 622
Антоній, архімандрыт 609
Антоній, Іаан і Яўстафій Віленскія, Святыя Мучанікі 650
Апалінэр Гіём 37, 64
Апанас, епіскап 604
Апрышка Алесь 207
Арлоў Уладзімір 82 – 84
Арлоўскі Я. 306
Арсеннева Наталля 21, 153, 158, 371
Арцішэўскі Павал 149
Арыстафан 444
Арый 270
Арэшкаў Міхась 456, 457, 461
Астрожскі Канстанцін (Васіль) Канстанцінавіч 20, 104–115, 651
Астрожскі Канстанцін Іванавіч 20, 104–115, 261
Астрожскі Фёдар 20, 104–115, 650
Астроўскі Алесь 365–367, 487
Астроўскі Радаслаў 152, 155–156, 571
Аўрам 598
Афанасьеў В.А. 460
Бабкоў Ігар 124, 405–408
Баболя Андрэй 399
Багданкевіч Станіслаў 661
Багдановіч Ірына 456, 461
Багдановіч Адам 287
Багдановіч Максім 20, 32, 134–136, 284–290, 321
Багаслоў Рыгор 263
Багрым Паўлюк 124, 272–273
Багушэвіч Францішак 20, 99, 125, 136, 139, 282–284, 342
Бажанаў Уладзімір 462
Байкоў М. 145
Бакшанскі Юліан 279
Балабан Гедэон 112
Барадулін Рыгор 21, 165, 301, 302, 328
Баразна Лявон 21, 165, 207, 307–311
Баранкевіч Л. 468
Бараноўскі Якаў 604
Барбе Дамінік 671
Баркашоў А.П. 645
Бароўскі М. 570
Баршчэўскі Лявон 8, 487
Баршчэўскі Ян 124, 275
Барыс, князь Тураўскі 542
Барыс, князь Полацкі 539
Барысевіч Ю. 342
Барышкалец К.П. 31
Батальёнак Я. 313
Бауэр Отто 447
Баўгарын Рыгор 596
Бацюшкаў П. 306
Белагаловы Я. 569
Беленькі Юры 468
Бембель Алег 67, 167, 203, 619, 653–656
Бенедыкт VIII 536

Берлін Ісайя 349
Берыя Лаўрэн 238
Бессмертный А.Р. 710
Білінг Лайокл 384
Блауберг І. 516
Бор Нільс 527
Брачыслаў, князь 538
Бракгауз Ф.А. і Эфрон І.А. 50
Брыль Янка 21, 175, 383, 475
Брэжнеў Л.І. 375
Брянцев П. 710
Будны Сымон 29. 98, 111, 265, 386
Бука Павел 252
Булат С. 150
Булгакаў Валер 5, 21, 122, 282, 303, 333, 326, 404
Булгакаў С. 326, 426, 445
Бураўкін А.Г. 247
Буфеев Канстанцін 624
Бухвостаў А. 467
Быкаў Васіль 172, 175, 301–303, 363, 383, 475
Бэндэ Л. 291
Бяляцкі Алесь 172, 477
Бярдзяеў Мікалай 15, 53, 55, 323, 335, 426, 432–433, 454, 529, 602
Вагнер Рыхард 436
Вайдлих В. 517
Валіцкі Анджэй 38
Ван дер Берг П'ер 44
Варвара 542
Васіль Вялікі 263
Васіль, епіскап 607
Васільеў Дзмітры 645
Васюк Уладзімір 8
Вебер Макс 409
Венцлава Дзмітры 645
Вераб'ёў У. 49
Верашчагін В. 163
Верхоўскі А. 647
Весялкоўскі Юры 128
Вецер Элеанора 164
Вівекананда 502, 509
Вік Георг 486, 494
Вірт Герман 436
Вісліцкі Ян 269
Вітаўт 20, 100, 269, 556, 594
Вітушка Міхал 154
Вітушка Сяржук 172, 574
Віцень 20
Войшалк 93, 95
Вольга, княгіня 535
Вольскі Артур 175, 193, 475
Вульф Л. 587, 588
Высоцкі Сяржук 190, 250, 253
Вяршынскі Павел 604
Вярцінскі Анатоль 8
Вярыга-Дарэўскі Арцём 279
Вячорка Вінцук 172, 463, 468, 477
Гадлеўскі Вінцэнт 17, 146, 324–328, 352, 361, 456, 642
Гайдукевіч Сяргей 464, 469
Галамбёўскі Лукаш 121
Галубінскі 540
Гандзі Лідэ 532
Гандзі Махатма 32, 671, 673, 693–695
Ганчар Віктар 462
Ганчарык У.І. 491
Ганько Міхась 152, 154
Гар Т. 31
Гарбачоў М.С. 215
Гардун Сергій, пратаіярэй 551, 553–554, 563, 579, 634
Гарошка Леў 570
Гартны Цішка 20, 140, 291
Гарун Алесь 20, 139
Гарэцкі Радзім 475
Гаўрыіл (Гарадкоў), архіепіскап Разанскі 650
Гаўрыіл Беластокскі, Мучанік немаўля 650
Гегель Г. 532
Гедымін 20, 89, 93, 100
Гейзінга Е. 54, 60
Гейтс Біл 527
Гелнер Э. 43, 55, 357
Генадзі Магілеўскі 650
Геніюш Ларыса 19, 21, 169, 295–299, 651
Георгій (Каніскі), архіепіскап Магілеўскі 589, 645, 650
Герасім 594
Герберштэйн Жыгімонт 130
Гердер Іаган Готфрыд 529
Германовіч Я. 263
Гідэнс Энтані 406
Гізберт-Студніцкі Конрад В. 481
Гілевіч Ніл 21
Гітлер Адольф 436–437
Глінка І. 684

Гогенштаўфены 503
Голасаў П.І. 460
Голубева Таццяна 464
Грозны Іван 613
Грыб Мечыслаў 464
Грыгор'ева В. 567
Грынфельд Лія 44, 54, 416
Грынчык М. 258
Грыцкевіч Анатоль 6, 149, 172, 386
Грыцкевіч Валянцін 562, 711
Грышан Ігар 221
Грэк Максім 596
Гудавічус Э. 92
Гумілёў Леў 16, 174, 497, 505, 516
Гурло А. 291
Гус Ян 444
Гусак С.Г. 460
Гусейнаў А.А. 697
Гусоўскі Мікола 20, 98, 167, 264–265, 343
Гушча Пётр 609
Дабравольскі А.А. 182, 239, 460, 691
Давід, князь 95
Давідзюк М. 571
Дамбоўскі Эдвард 39
Дамейка Ігнат 64, 223
Дамлекін Іаан 263
Данілеўскі М.Я. 645
Дарута В. 102
Дастаеўскі Фёдар 64
Даўгалёў Васіль 462
Дзем'янюк Іван 211
Дзермант А. 71
Дзіяніс, патрыярх 596
Дзюрасель Жан-Батыст 712
Дзяніс, мітрапаліт 606
Дойч Карл 409
Домаш Сямён 3
Доўнар-Запольскі Мітрафан 20, 73, 345, 399
Драянкоў А. 195
Драздовіч Язэп 167, 314
Дракахруст Ю. 349
Драчоў П. 313
Дробаў Л.М. 712
Дробяжэва Л. 712
Дрыгвіч 323
Дрэвінскі Лаўрэнцій 399
Дубавец С. 5, 142, 303–304, 343
Дубейкаўскі Лявон 149
Дубянецкі Эдуард 6, 292
Дудараў А. 464
Дунін Марцінкевіч Вінцэнт 20, 124, 125, 138, 280–281, 341
Дышыневіч В. 619–621
Дыянісій, епіскап Полацкі 650
Дэфа Даніель 364
Езавітаў Кастусь 158
Еліньскі Эма 344
Елісей Лаўрышаўскі 93, 650
Ельцын Барыс 482
Емельянаў Алесь 189, 194, 196–199, 204
Ермаловіч Мікола 28, 89, 91, 93, 70, 78–82, 156, 169, 200–208, 347, 386, 395
Ерчак Валеры 645
Ёрш С. 712
Еўлашэўскі Ф. 265
Еўпраксія Пскоўская, Наўгародская падзвіжніца 650
Ефрасіння Полацкая 20, 85, 543–544, 650
Жарскі І.М. 194
Жевускі Г. 121
Жукоўскі А. 635
Жыбуртовіч А. 429
Жыбуртовіч В. 429
Жыватнюк А.Т. 239, 460
Жыгімонт IV 595
Жыгімонт II 597
Жырыноўскі Уладзімір 439
Забейда-Суміцкі М. 21, 386
Завальнюк Уладзіслаў 328
Зам Астрыд 19
Запруднік Янка 98, 117, 127, 132–133, 143
Захаранка Мікола 8
Захаранка Юры 14, 209
Зізані Лаўрэнці 269
Златауст Іаан 263
Злотнікаў Леанід 370
Зноско К. 562
Зюганаў Генадзь 439, 646
Іаан Кармянскі, Святы праведны 650
Іаан Павел II 610
Іасаф (Жэвахаў), епіскап Магілеўскі 650
Іваноўскі Вацлаў 20, 155

Івашкевіч Віктар 172
Ігнатоўскі Усевалад 140, 169, 323
Ізыдор 595
Ізяслаў, мітрапаліт 607
Ізяслаў, князь 87, 397, 537
Ільін Іван 15, 55, 329, 339, 426, 454, 529, 644
Інакенці II 557
Інакенці IV 557
Іона II, мітрапаліт 597
Іона, епіскап 596,597
Іона, мітрапаліт 598
Іоў Барэцкі, мітрапаліт 598
Ісайя, прарок 66
Іуліанія, Праведная панна, княжна Альшанская 650
Каганец Карусь 37
Казак Генадзь 159
Казлоўскі Генадзь 611
Казлоўскі Уладзіслаў 149, 151–152
Казулін Аляксандр 469, 432
Каліноўскі Кастусь 20, 100, 126–137, 327
Калубовіч Аўген 158
Калякін Сяргей 450, 464, 479
Канашэвіч Н. 347
Кандель П. О.
Каніскі Георгій 589
Каніскі Ісая 598
Капрайон Сучында 698
Каравайчык Іван 250, 463
Караткевіч Аляксандр 609
Караткевіч Уладзімір 21, 161, 168, 201, 299–301
Карбалевіч В.І. 460
Калюкевіч А. 222
Каратынскі Вінцэсь 124, 279
Карл Вялікі 536
Кароль Аляксей 462
Карпенка Генадзь 462, 463
Карповіч Лявон 269
Карскі Г.Ф. 87, 388
Карыцкі Міхал 269
Касмовіч Дз. 154
Кастамараў М.І. 108
Касяк Іван 158, 600
Катлярчук А. 277
Катлярэўскі Іван 273, 345
Каўрус А. 161
Качанка Леанід 8
Кашэн Огюст 504
Каяловіч Міхаіл 287, 341
Кебіч В. 661
Кедуры Е. 430
Кепчошвілі Аўтандзіл 211
Кінг Марцін Лютэр 671, 676
Кіпель Яўхім 157, 158
Кіплінг Р. 364
Кіпрыян 593
Кіркевіч Антон 694
Кіркор А. 588
Кірыла, епіскап Тураўскі 87, 107, 262–263, 542–543, 699, 650
Кірылюк І. 632, 633, 636
Клімент III 551
Кляпенін Мікалай 55, 59, 529
Кожыч Міхась 159
Колас Якуб 20
Кон Ганс 16, 44, 55, 58
Конан Уладзімір 6, 15, 21, 258, 325, 328, 333, 350–353
Косаў Сільвестр 269
Кот Рычард 56
Коўш А. 571
Красніцкі Д. 699
Краўчук Л.М. 682
Крукоўскі Мікалай 6, 8, 15, 21, 183, 243, 320, 327, 353–356, 457
Крукоўскі Уладзімір 313, 315
Крывіцкі Леў 461
Кудраўцаў І.55
Кузьмічоў П. 400
Кулажанка Уладзімір 193, 203
Кулеш Іна 492
Кулік Яўген 165, 166, 313–316
Кулікоўіч М. 386, 684
Кульчыцкі Сцяфан 604
Кунцэвіч Ізафат 117, 136, 343, 399, 560–561, 685
Купава Мікола 313
Купала Янка 20, 290–295, 323
Курак Мікола 247
Кучараў Іван 227, 234, 235
Кучма Л.Д. 482
Кушнер І., пратаіерэй 604
Лабанок Алесь 165, 166
Лабачэўскі М. 684
Лабынцаў Ю. 258
Ландэр К. 142
Лапіцкая Антаніна 313
Ласкоў Іван 89, 394

Ластоўскі Вацлаў 20, 134, 148–149, 167, 169, 328
Латушка Георгій, прратаіярэй 621
Латышонак Алег 660–666
Лаўрэнці, епіскап Тураўскі, 107, 650
Лашкевіч А. 462
Ле Пэн Жан-Мары 438
Лебеда Т. 153
Лебон Г. 713
Левенець Ю.А. 713
Левяш І. 713
Ленін У.І. 27
Леў XIII 452
Лёсік Я. 147, 169
Ліпень Лявон 111
Ліцьвінка Васіль 533
Лобач Уладзімір 604
Лойка Алег 175, 280, 475
Лойка Леанід 462
Лоўентал Р. 443
Лугін Яўген 182, 190, 239–243, 461, 691
Лукашук К.А. 303, 305
Лукашэнка А.Р. 187, 228, 384, 458, 462, 482, 495
Луцкевіч Антон 20, 134, 139, 283
Луцкевіч Іван 20, 139
Луцкевіч Лявон 195
Лыч Леанід 328, 563, 573, 583, 587
Лучына Янка 279
Любішчаў А. 76
Лябедзька Анатоль 467
Лявонцьеў Васіль 515
Лявонцьеў Канстанцін 15, 55, 335, 420, 421, 529, 602
Ляпёхін І.І. 306
Ляўковіч Анатоль 103, 469
Ляўшун Л. 110
Магіла Пётр 268, 599
Мадзіні Джузепе 418–419
Макар II, епіскап Луцкі і Астрожскі 599
Макар, епіскап 597
Макары, ігумен 109
Макары, ігумен Пінскі 650
Макарый, Святы мучанік, мітрапаліт Кіеўскі 650
Макмілін Арнольд 259
Малевіч Казімір 167
Мальдзіс Адам 6, 120, 175, 258, 279, 351, 390, 475, 691
Мандальскі В. 393
Манееў А. 349
Марачкін Аляксей 8, 21, 165, 166, 311–313, 475
Маркавец Віктар 165, 167, 313
Марозава Святлана 566, 583, 587, 632
Марозаў Е. 516
Мартос А. 399, 713
Марцін, пустэльнік Тураўскі 650
Маскевіч С. 265
Масленікаў П.В. 714
Матусевіч М. 469
Махнач В.Г. 639
Мацьвеенка Анатоль 691
Машэраў П.М. 375
Мележ Іван 21
Мельнік У.А. 346
Мельнікава Л. 221
Мельнікаў А. 262
Мельнікаў Барыс 309
Мельхіседэк, мітрапаліт 603, 616
Менцэль Вольфанг 435
Мечкоўская К.Б. 627
Мікалай II 536
Мікалай, інак 67, 127
Мікалай, мітрапаліт 607, 634
Мікуліч А.І. 72, 75
Мікульская Дзіана 193
Мілінкевіч Аляксандр 491–492
Мілошавіч Слабадан 31, 327, 412
Міна, свяціцель, епіскап Полацкі 539, 650
Міньчык Міхась 246, 247
Міндоўг 93, 100
Міненкоў Грыгорый 401
Мірановіч Яўген 284
Місько Сцяпан 161–163, 252
Міхаіл, імператар 536
Міцкевіч Адам 28, 41, 73, 120, 276–278, 343
Мсціслаў Ізяслававіч 87
Мсціслаў Давыдавіч 74
Мудрычэнка Алесь 252–253
Мусаліні Беніта 434
Навуменка І.Я. 209
Навуменка Віктар 174, 179, 189, 194, 207–210, 240
Надсан А., айцец 582

Назарчук Н. 313
Насевіч В. 91
Насута А. 388
Некрашэвіч С.
Неманцовіч Антон 569
Нікіфар Тур, архімандрыд 112
Нікіфар, Святы мучанік, архідыякан 650
Нікольскі Н.М. 596
Нісбэт Роберт 424
Ніцшэ Фрыдрых 675
Новікава Святлана 247, 518, 520, 524
Нэйрн Том 126, 137, 138, 367
Нюнька Хвёдар 195, 224
Нятылкін Анатоль 463, 468
Олсан 489
Павел VI 640
Павел, апостал 626, 677
Падбярэзскі Рамуальд 124
Падокшын С. А. 319, 390
Пажарскі 105
Пазняк Зянон 21, 165, 166, 172, 175, 179, 182, 184, 185–188, 198, 243, 245, 307, 359–363, 379, 463, 490, 620, 657, 661, 691
Пазняк Ян 20, 361, 456, 473
Паклонскі Канстанцін 28
Пакуцэвіч В. 553
Палеалог Іаан 557
Палубятка Я. 575
Палявікова Валянціна 463, 469
Палявікова Т. 715
Панарын А.С. 668–669
Панкрацій (Жэрдзяеў), архімандрыд 647
Паўлін, Святы мучанік, архіепіскап Магілеўскі 650
Пафнуці 596
Пачопка Аляксандр 624
Пашкевіч Ян Казімір 265
Пашута В. 552
Пацей Іпацій 551
Пацюпа Юрась 8
Песнапісец Іосіф 264
Пеціна Людміла 183, 456, 457, 461
Пецюкевіч Алёйза
Пётр I 614
Пій XIII 453
Пілсудскі Юзэф 134
Платон 444
Пліска Міхась 460, 472
Плуг Адам 279
Прашковіч Мікола 161, 298
Прус Баляслаў 41
Пушкін Алесь 316–318
Пыпін А.Н. 134
Пярун 508
Пячорскі Нестар 534
Рабкевіч В. 161
Равенскі Мікола 21, 371, 386
Равінскі Вікенцій 273
Рагвалод 20, 86, 395, 537
Рагнеда 20, 85, 396, 537
Радзівіл Кароль 120
Радзівіл Мікалай Крыштоф 269
Радзівіл Чорны 110
Радзівілы 20
Радзік Рышард 303, 343, 407–408
Радзюкевіч Ганна 115
Разанаў Алесь 165
Райко Э.Г. 460
Ракіц В. 45
Рамакрышна 502, 509
Раман, мітрапаліт 556, 593
Раманаў Я. 273, 282
Рамановіч Кастусь 159
Раманчук Іван 159–160
Раманюк М. 313
Расціслаў, князь 87, 540, 541
Расціслаў-Міхаіл, Благаверны вялікі князь 650
Рафаіл (Раман Турканяк), архімандрыт 114
Родзька Ус. 154
Розэнбэрґ Альфрэд 152
Роуз І.Д. 34
Роўда Уладзімір 14, 333, 356–358
Рубановіч Міхал 604
Рудкоўскі Пётра 5, 21, 333, 346–350, 513–514
Ружанскі Слава 5
Русо Жан Жак 428
Руцкі Язэп 272, 586
Рыжы Юры 610
Рымашэўскі Віталь 458
Рыпінскі А. 343
Рычардсан Л. 515
Рычкоў Ю. 76
Рэнан Эрнэст 36–37, 389

Сааці Т. 522
Сабіла Эрнст 456
Саверчанка Іван 112, 258, 264, 272
Савіцкі Мікола 207
Сагановіч Генадзь 78, 91, 83, 107, 373
Садоўскі Сяргей 604
Садоўскі У. 516
Сайман Г.515
Сакалоў Яфрэм 168
Сакалоў-Кубай Генадзь 165, 166, 313
Саламонаў Аляксей 184
Саланевіч І.Л. 645
Салаўёў Г. 552
Салаўёў Уладзімір 45, 55, 454, 512, 529, 602
Салжаніцын Аляксандр 646
Салодкапевец Раман 264
Салье 194
Самойла Уладзімір 290, 352
Самойла Я. 147
Самойленка Г.І. 460
Санько С. 71, 88
Сапега Леў 269, 352
Сапко Антон 149
Сапуноў А. 306
Саргон, цар 66
Сафія, княгіня Слуцкая 605
Сахараў (архімандрыд Сафроній) 625
Сачанка Барыс 175, 292, 475
Сваяк Казімір (Кастусь Стэповіч) 645
Свентахоўскі У. 313
Свідрыгайла 595
Святаполк, князь 262, 542
Севярынец Павал 64, 458
Семяжон Язэп 265
Серабракоў Д. 654
Серакоўскі, архіепіскап 562
Серакоўскі Сігізмунд 54
Серафім (Шахмуть), прападобнамучанік архімандрыд Жыровіцкі, 608, 650
Сергіевіч Пятро 314
Сергій (Ахатэнка), епіскап 605
Сержпутоўскі А. 282, 306, 406
Серчык Уладзіслаў 399, 401
Сеўрук Міхась 314
Сечка Л. 468
Сёмуха Васіль 638
Сілівон І. 75
Сілка Пятро 182, 183, 190, 241, 456–457, 461, 656, 691
Сімяон, епіскап Полацкі 98, 269, 559, 650
Сітніца Рыгор 313
Сіўчык Вячаслаў 487
Скабей М. 604
Скарабагаты Яўген 218
Скарга Пётр 130, 272, 400
Скарына Францыск 20, 28, 98, 100–104, 264, 352, 386, 558
Скрыпнічэнка Г. 313
Славінскі М.А. 503
Сліњка Таццяна 322–327
Случанін Л. 153
Смалянін Ігнаці 269
Смалянчук А., 5
Смаляціч Клім 269, 540
Сматрыцкі Мялета 113, 272, 598
Сміт Энтані 6, 15, 44, 99, 357, 389, 418, 437, 440, 643
Смоліч А. 716
Снайдэр Луі 55
Сталін Іосіф 76, 375, 412, 445, 607
Стандо Войтэк 211
Станкевіч Адам, ксёндз 20, 146, 147, 328–333, 343, 361, 453, 454, 473, 538–539, 558, 587, 589, 642
Станкевіч Ян 154–155, 343
Стаповіч Альбін 323
Статкевіч Мікола 464, 468
Сташчанюк В. 313
Стравінскі 689
Стральцоў Міхась 21, 284–287, 323
Струве Пётр 426–428, 645
Струкаў З. 306
Стрыжак Віктар 255
Стэповіч Альбін 149
Суднік Станіслаў 64, 73
Сулкоўскі У. 313
Суражскі Васіль 113
Сурвіла Івонка 140, 144
Сурмач Ганна 176, 475
Суша Алесь 205
Сыракомля Уладзіслаў 41, 278–280, 349

Сыс Анатоль 172
Сядоў В.В. 78, 88
Сядоў Валеры 184, 214, 217
Сямашка Язэп 566
Сямёнаў В. 462
Сянкевіч Генрых 41
Талочка Уладзіслаў 642
Талстой Леў 674–675
Тамір І. 46, 422–423
Танк Максім 175, 475
Таразевіч Г.С. 168
Тарас А.Е. 88
Тарасаў Кастусь 717
Тарасаў С. 583
Тарашкевіч Браніслаў 20
Тацішчаў В. Н. 80, 552
Ткачоў Міхась 21, 172, 179, 182, 339, 340, 460, 470, 558
Тойнбі А. 505
Тора Г. 364
Тофлер Э. 524
Трацяк Я. 6
Траяноўскі Алесь 457
Трубяцкі Е.Н. 426
Трус Паўлюк 255, 321
Трусаў Алег 204, 467
Трызна Іосіф 86, 541
Тур, князь 541
Туранкоў А. 153
Туронак Браніслаў 456
Туронак Юры 142, 588
Турук Ф. Ф. 133
Турчанаў Н.П. 460
Тышкевіч С. 717
Тэагност 593
Тэафіл 593
Тэафон, патрыярх 598
Тэйяр дэ Шардэн 509
Тэрэза, імператрыца 589
Уладзімер, князь 83, 85, 86
Уладзіслаў IV 400, 598
Улашчык М. 258
Урбан Паўла 89, 90
Урублеўскі Тадэвуш 323
Усяслаў Чарадзей 20, 352, 396, 543, 556
Уханскі Якуб 400
Фалькенгайн Э. 147
Феафіл, мітрапаліт 556
Фёдараў Анатоль 487
Фёдараў, экзарх 569
Фёдараў Іван 68, 113, 268
Філарэт, епіскап 604
Філарэт, мітрапаліт 542, 616
Філафей, манах 601
Філіповіч Афанасі 20, 107, 266–268, 343, 558, 650
Філістовіч Янка 305
Фоцій 594–595
Франк С.Л. 427
Фраленка Алесь 252
Фралоў А.С. 512
Фрыдрых Людвіх Ян 435
Фукуяма Фрэнсіс 669
Хадыка Юры 163–165, 172, 175, 179, 184, 193, 390, 691
Хайдэр Ёрг 438
Хайек Ф.А. 421
Хайес Карлтан 55, 56
Хакен Г. 364
Халмагораў Ягор 71
Хамякоў Д.А. 28, 439, 645
Хантынгтон Самюэль 6, 16, 659, 665–666, 669
Харанека Макар 609
Харашэвіч Кастусь 313
Харыціна, вялебная князёўна Літоўская 650
Хатчынсон Джон 55
Хатэнка Антаніна 532
Хведарыт 593
Хейслер О. 30
Хмяльніцкі Багдан 105, 400
Хобсбаум Эрык 16, 409
Хокінг Стывен 276
Хрушчоў М.С.
Хрыстос Ісус 671–672, 676, 696
Хюбнер Курт 497
Цамблак Рыгор 269, 556, 594, 595, 606
Цанава Лаўрэн 297
Цандроўскі Я. 265
Церашчатава Вольга 164
Цётка 138, 166
Цімохаў С. 314
Ціхаміраў Л.А. 645
Ціхіня Валеры 209
Цмыг Мікола 189, 193
Цэрэтэлі 214
Цярлецкі Кірыл 551
Цяпінскі Васіль 20, 111, 270–271
Чамярыцкі В. 258

Чарняўскі Міхась 161, 165, 298
Чарот М. 291
Чарота І.А. 717
Чачот Ян 124, 275, 276, 343
Чорны Кузьма 21, 255
Чыкін В. 462, 468
Шалкевіч Віктар 662
Шальманаў Іван 246
Шапэн Фэдэрыка 41
Шарп Джон 670, 671, 700
Шарэцкі Сямён 360, 361
Шатэрнік Алесь 21, 167, 313
Шаўчэнка Тарас 345
Шафарык П. 70, 88, 394
Шафарэвіч Ігар 503, 717
Швайбовіч Франак 196, 198
Шлындзікаў В. 463
Шматаў Віктар 246, 313
Шмеман А. 77
Шпарага Вольга 350
Шпенглер Освальд 16, 33–34, 516
Шпілеўскі Павел 73, 282, 406
Штайнер Юрг 425, 437, 480
Штомпка П. 717
Штыльмарк А. 646
Штэйнер Б. 432
Шунейка Яўген 316
Шухевіч Ю. 483
Шушкевіч Станіслаў 180, 457, 468, 661, 683
Шчаглоў М. 143
Шчакаціхін Мікола 306–307
Шываракса Сулак 698
Шыман Лявон 204
Шынкевіч Аляксей, архімандрыд 615
Шэйфер Бойд 55–57
Шэйн П. 306
Шэляговіч Мікола 389
Эйнштэйн Альберт 527
Экзюперы Антуан де Сент 209
Эмерсон Руперт 44, 56
Эпімах-Шыпіла Б. 290
Эрхард Людзвіг 370
Юдзары Мацей 702
Южакоў С.Н. 50
Юргевіч В. 95
Юры-Святаслаў, князь 543
Юрый Яраслававіч, князь 87, 262, 541
Юхневіч К. 149
Юшчук Пятро 554
Ягайла 78, 683, 686
Ядвігін Ш. 603, 686
Язэп I, 597
Язэп II, 597, 598
Язэп III 598
Ян Павел II 641
Ян XXIII 640
Янаў А. 440
Янушкевіч Фелікс 456, 457, 461
Янушкевіч Язэп 280
Ярашэвіч А. 165
Ярыла 508
Яскевіч Алена 105, 110, 115
Яскевіч Я. 346
Яськова В. 469
Яўменаў Л.Ф. 45

# Змест

Ад аўтара ........ 3
Pro et contra ........ 9
Уводзіны ........ 13

**Раздзел I. Народ, народнасць, нацыя ........ 26**
1. Народ, народнасць, раса, этнас, а таксама нацыянальная ідэя і нацыяналізм ........ 26
2. Нацыя ........ 35
3. Што такое нацыяналізм? ........ 48

**Раздзел II. Гістарычныя падставы ўзнікнення беларускай нацыі і беларускага нацыяналізму ........ 61**
1.Мой пагляд на гісторыю беларускай нацыі ........ 61
2. Старажытнасць беларускага этнасу ........ 70
3. Канцэпцыі беларускай гісторыі.
4. Фармаванне беларускай нацыі і беларускай дзяржаўнасці. Ад Полацкага і Тураўскага княстваў да Рэчы Паспалітай ........ 84
*Незалежныя Полацкае і Тураўскае княствы ........ 84*
*Беларуская дзяржава ВКЛ ........ 87*
*Князі Вялікага княства Літоўскага ........ 90*
*Залаты век Беларусі. Пачатак беларускай нацыі ........ 97*
*Францішак Скарына ........ 100*
*Князі Астрожскія і нацыянальная ідэя ........ 104*
*Што адбывалася з беларускай нацыяй ў часы канфедэрацыі ВКЛ і Польшчы (у Рэчы Паспалітай)? 116*
*Беларускі нацыяналізм XVIII ст. ........ 119*
5. Беларусь у складзе Расійскай Імперыі. Мадэрнісцкі этап фармавання беларускай нацыі ........ 122
*Беларусь пасля падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г. – першая палова XIX ст.) ........ 123*
*Кастусь Каліноўскі: чалавек і герой ........ 126*
*Працэсс нацыянальнай мабілізацыі беларусаў у другой палове XIX – пачатку XX стст. ........ 137*
6. Другі перыяд мадэрнісцкага фармавання беларускай нацыі (1914–1939) ........ 141
*Першы Ўсебеларускі з'езд і БНР ........ 141*
*Рада Беларускай Народнай Рэспублікі (Рада БНР) на эміграцыі ........ 143*

*БССР* .......... 144
*Нацыяналістычныя арганізацыі Заходняй Беларусі* 149
7. Трэці перыяд мадэрнісцкага этапа фармавання беларускай нацыі .......... 152
*Нацыянальнае адраджэнне ў часы Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг.* .......... 152
8. Найноўшая гісторыя нацыяналізму ў Беларусі – пасля Вялікай Айчыннай вайны (1945 г.) да нашага часу. Чацверты перыяд мадэрнісцкага фармавання беларускай нацыі .......... 159
*Пасляваенны перыяд* .......... 160
*Гарбачоўская перабудова і чацвёртая хваля нацыянальнага адраджэння* .......... 168
9. Грамадскія арганізацыі нацыянальнай скіраванасці ў 90-гг. XX ст. .......... 175
*Рух за перабудову "Беларускі Народны Фронт "Адраджэнне"* .......... 178
*Першая беларуская партыя. Стварэнне НДПБ* .......... 188
*Беларуская нацыянальная партыя (БНП)* .......... 244
*Першы з'езд нацыяналістаў* .......... 250
10. Заключныя заўвагі аб мадэрнісцкім этапе беларускай нацыі .......... 253

**Раздзел III. Шуканні нацыянальнай ідэі ў беларускай літаратуры і яе творцамі. Штрыхі да нацыянальнай ідэі ў мастацтве** .......... **255**
1. Нацыянальная ідэя ў беларускай літаратуры праз стагоддзі .......... 256
2. Нацыянальныя матывы ў першых беларускіх літаратурных помніках .......... 258
3. Старабеларуская літаратура .......... 259
4. XVII–XVIII стагоддзі .......... 271
5. Літаратура мадэрнісцкага этапа фармавання беларускай нацыі .......... 272
*Частка 1. XIX стагоддзе* .......... 272
*Частка 2. XX стагоддзе* .......... 284
*Максім Багдановіч* .......... 284
*Янка Купала* .......... 290
*Ларыса Геніюш* .......... 295
*Уладзімр Караткевіч* .......... 299
*Нацыянальны скарб Беларусі – Васіль Быкаў* .......... 301
*...аб сучасных літаратурных крытыках і нацыяналізме* .......... 303
6. Штрыхі да нацыянальнай ідэі ў мастацтве .......... 305

**Раздзел IV. Філасофскія наратывы беларускага нацыяналізму** ........ 319
1. Філосафы першага перыяду мадэрнага фармавання беларускай нацыі (першая палова XX ст.) ........ 320
*Ігнат Абдзіраловіч* ........ 320
*Гадлеўскі Вінцэнт* ........ 324
*Станкевіч Адам* ........ 328
2. Філосафы сучаснасці (пасля 90-х гг. XX ст.) ........ 333
*Частка 1. Аўтары "ARCHE"* ........ 333
*Частка 2. Філосафы класічнага фармату* ........ 350
*Частка 3. Іншыя спробы* ........ 363
3. Фармулёўка беларускага нацыяналізму ........ 368
4. Сфармуляванне беларускай нацыі і беларускага нацыяналізму ў святле постмадэрнізму ........ 381
5. Пра талерантнасць і менталітэт беларусаў ........ 389
6. Пра беларускую ідэнтычнасць ........ 403

**Раздзел V. Палітычны аспект нацыянальнай ідэі (сучаснасць і перспектывы)** ........ 409
1. Дзяржаўнасць і нацыяналізм. Ідэя нацыі-дзяржавы ........ 409
2. Сучасныя ідэалогіі і іх носьбіты – палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі. Дачыненні да нацыянальнай ідэі ........ 416
*Лібералізм і нацыяналізм* ........ 416
*Кансерватызм, лібералізм і нацыяналізм* ........ 423
*Нацыяналізм і фашызм* ........ 430
*Нацыяналізм і камуністычная ідэалогія* ........ 441
*Сацыял-дэмакратыя і нацыянальная ідэя* ........ 444
*Хрысціянская дэмакратыя* ........ 452
3. Сучасныя палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі Беларусі ........ 460
*Станаўленне палітычных партый Беларусі у 90-х гг. XX ст. (храналогія падзей)* ........ 460
*Суадносіны ідэалогіі і палітычных партый у Беларусі* ........ 469
*Грамадскія арганізацыі ў Беларусі* ........ 474
*Лірычнае адступленне. Правыя і левыя ў Беларусі* ........ 478
*Лёс нацыянальнай ідэі ў цяперашняй беларускай палітыцы* ........ 488
*Што засталося ў астатку і што рабіць?* ........ 494

**Раздзел VI. Беларуская нацыя ў свеце мадерных канцэпцый: сістэмны падыход, інфармацыйнае грамадства, Homo Informaticus** ........ 497
1. Этнасы і нацыі праз прызму эвалюцыі ........ 497
2. Тэорыя стадый развіцця грамадства праз прызму нацыі ........ 501
3. Сабарнасць у хрысціянстве і сабарнасць нацыі ........ 511
4. Сістэмны аналіз і мадэляванне ў палітычных працэсах ........ 515
5. Сістэмны падыход ў кантэксте палітычнага мадэлявання і Беларусь у інфармацыйную эпоху ........ 521
6. Інфармацыйнае грамадства і Homo Informaticus ........ 524

**Раздзел VII. Хрысціянскі шлях Беларусі** ........ 529
1. Абгрунтаванне нацыяналізму ў хрысціянстве ........ 529
2. Як з'явілася хрысціянста ў Беларусі? ........ 532
3. Гісторычны шлях уніі ў Беларусі ........ 545
4. У абарону уніі ........ 582
5. Беларуская аўтакефальная Праваслаўная Царква ........ 590
6. Царква і дзяржава ........ 613
7. Сучасны стан праваслаўя ў Беларусі ........ 616
8. Мова і Царква ........ 619
9. Сацыяльна-палітычная канцэпцыя нацыі ў хрысціянстве ........ 639
10. Хрысціянскі нацыяналізм. Праваслаўны нацыяналізм ........ 644
11. Хрысціянскі нацыяналізм у Беларусі ........ 648
12. Зніч і праваслаўная манархія ў Беларусі ........ 653
13. Беларускі шлях. Як фармуляваць хрысціянскі нацыяналізм? ........ 656
14. Беларусь на разломе цывілізацый? ........ 658
15. Хрысціянства і ненасілле ........ 671

**Замкальныя развагі** ........ 681
Дадатак I. Зварот № 1 ........ 688
Дадатак II. Зварот № 2 Беларускага МАК "Нюрнберг-2" ........ 692
Дадатак III. Сучасная канцэпцыя філасофіі ненасілля ........ 693
**Літаратура** ........ 708
*Творы аўтара па тэме кнігі* ........ 717
**Імянны паказальнік** ........ 721

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Анатоль Астапенка**
**Игде зродилися иускормлены суть по Бозе**
Дослед беларускага нацыяналізму

Рэдактары Ю. Пацюпа, Л. Качанка
Карэктар Д. Лымеўскі
Мастак У. Васюк

Падпісана ў друк 26.12.2009 г. Фармат 84x108 $^{1}/_{32}$. Папера афсэтная. Друк афсэтны. Гарнітура «Скулбук». Ум. друк. арк. 38,535. Ул.-выд. арк. 38,535. Наклад 400 асоб.



*Маё пакліканне*

**Навуковец**. Фізік-тэарэтык, кандыдат фізіка-матэматычных навук. Галіна – квантавая тэорыя поля, фізіка элементарных часцінак.

**Палітык.** Старшыня Нацыянальна-дэмакратычнай партыі (1990–1994). Старшыня Беларускай нацыянальнай партыі (1994–1999).

**Палітолаг.** Друкаваўся ў незалежных выданнях, у часопісах "Веснік БДУ", "Весці АН РБ", дзяржаўных энцыклапедыях. Выдаў манаграфію "Нацыянальная ідэя ў сучасным свеце" (2003). Галіна – палітычныя партыі, ідэалогіі, нацыянальная ідэя.

**Публіцыст.** Друкаваўся ў "ЛіМе", "Маладосці", "Дзеяслове", "ARCHE" і інш. Выдаў кнігу "Паслухайце нацыяналіста" (2000). Сябра Саюзу беларускіх пісьменнікаў з 2007 года.

*У кожнай сучаснай дзяржаве* ***кожны нармальны грамадзянін ад пачатку нацыяналіст****. Быць нацыяналістам – гэта натуральны стан чалавека. Чалавека без свайго нацыянальнага пачатку на Зямлі проста не існуе. Кожны нараджаецца альбо эстонцам, альбо рускім, альбо кітайцам... Я нарадзіўся – беларусам. І змяніць гэта я не дам рады. Але калі так, калі Госпад даў мне жыццё ў гэтай нацыі, то значыць так трэба, і ў гэтым маім* ***нацыянальным існаванні і ёсць Найвышні сэнс****.*

***...нацыяналізм ёсць пэўнай ступенню раскрыцця агульнай, сусветнай Любасці****.* Як толькі мы адкінем хоць якую ступень Любасці – мы адразу адчуем непаўнавартасць жыцця. Таму ***нацыяналізм ужо ад нараджэння, натуральна ўласцівы кожнаму чалавеку****.*

...***раз я нарадзіўся тут, то гэта значыць – так пастанавіў Бог згодна з сваёй найвышняй задумай.*** Ён мяне паставіў сюды як свайго салдата і ***тут я павінен пражыць сваё жыццё, тут яго і скончыць...***

9 785947 162257

АНАТОЛЬ
АСТАПЕНКА

...ЙГДЕ ЗРОДИЛИСА
ИОСКОРМЛЕНЫ
СУТЬ ПОБОЗЕ...

